

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР • ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

ГІСТОРЫЯ



9(Бел)
Г51х

В лѣ҃ ҂ѕ҃ф҃ѳ҃.: — Ѯаратиса
Всеславъ сн҃ъ 1067 Брачиславль

МІНСКА

Полочьскѣ и зам҃ Новъгородъ·
Ярославичи же трие·
Изаславъ· Стославъ· Всеволодъ·
совокупивше вои идоша на
Всеслава· зимѣ суши велицѣ· и
придоша ко Мѣньску· и
Мѣнане затворишася в градѣ·
си же бр҃ата взяша Мѣнескъ[и]
исѣкоша мужѣ· а жены и дѣти
вдаша на щиты[45]· и поидоша
к Немизѣ· и Всеславъ поиде
противу· и совокупишася обои
на Немизѣ· мц҃а· марта· въ г҃·
дньь· И баше

пров. 1968
538672
пров 96г

МІНСК 1967

Мінск — сталіца Савецкай Беларусі, палітычны, адміністрацыйны і культурны цэнтр рэспублікі — з'яўляецца адным са старажытных гарадоў нашай Радзімы.

Гэтая кніга прысвячаецца 900-годдзю Мінска. У ёй разглядаецца гісторыя горада са старажытнейшага часу і да нашых дзён. Асноўную ўвагу аўтары ўдзялілі гісторыі горада ў сучасны перыяд, паказу сацыяльна-эканамічных змяненняў, якія адбыліся ў яго развіцці пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

члены-карэспандэнты АН БССР
Н. В. КАМЕНСКАЯ, І. С. КРАЎЧАНКА,
кандыдаты гістарычных навук
З. Ю. КАПЫСКІ, В. Ф. РАМАНОЎСКІ



ПРАДМОВА



інск — сталіца Савецкай Беларусі, палітычны, адміністрацыйны і культурны цэнтр рэспублікі — з'яўляецца адным са старажытных гарадоў нашай Радзімы. Яго шматвяковая гісторыя ўзыходзіць к перыяду ўзнікнення Старажытнарускай дзяржавы. Першае пісьмовае ўпамінанне аб Мінску, якое дайшло да нас, сустракаецца ў «Повести временных лет» і датуецца 1067 годам. Гісторыя Мінска адлюстроўвае характэрныя рысы розных этапаў развіцця, якія прайшоў беларускі народ.

Узнікненне горада звязана з пачаткам перыяду феадальнай раздробленасці Старажытнарускай дзяржавы і стварэння самастойных феадальных княстваў з мясцовымі эканамічнымі, палітычнымі і культурнымі цэнтрамі. Размешчаны ў цэнтры беларускіх зямель, знаходзячыся ў вельмі выгадных геаграфічных умовах, Мінск яшчэ ў пачатку сваёй гісторыі адыгрываў значную ролю як важны пункт на перакрыжаванні ваенна-гандлёвых дарог, якія звязвалі Балтыйскае мора з Чорным, а Захад з Усходам. З пачатку XII стагоддзя Мінск стаў «стольным горадам» самастойнага Мінскага княства. У XIV—XV стагоддзях, знаходзячыся пад уладай літоўскіх феадалаў, Мінск быў адным з буйнейшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага, а з сярэдзіны XVI стагоддзя, пасля аб'яднання Літвы і Польшчы ў Рэч Паспалітую,— цэнтрам аднаго з найбольш буйных у Беларусі ваяводстваў. Гэты перыяд у гісторыі горада напоўнены вострай класавай барацьбой супраць самаўладства феадалаў, якая пераходзіла часам у адкрытыя ўзброеныя выступленні нізоў.

Вялікае эканамічнае, палітычнае і культурнае значэнне ў гісторыі Мінска мела ўз'яднанне беларускіх зямель з Расіяй у канцы XVIII стагоддзя. Горад стаў адміністрацыйным цэнтрам губерні. Пашыраліся яго межы, праводзіліся работы па добраўпарадкаванню, сталі з'яўляцца прамысловыя прадпрыемствы тыпу капіталістычнай мануфактуры.

Больш хуткімі тэмпамі сталі развівацца прамысловасць і гандаль Мінска пасля адмены ў Расіі прыгоннага права. Прамысловасць пачала пераходзіць ад мануфактурнай стадыі к фабрычнай вытворчасці. У 70-х гадах XIX стагоддзя Мінск перасяклі Маскоўска-Брэсцкая і Лібава-Роменская чыгункі. Развіццё капіталізму ў паслярэформенныя гады абумовіла і хуткі рост насельніцтва. К пачатку XX стагоддзя па колькасці насельніцтва Мінск займаў 19-е месца сярод гарадоў Расіі, стаўшы буйнейшым эканамічным і культурным цэнтрам Беларусі.

Разам з развіццём капіталістычнага спосабу вытворчасці адбываўся працэс фарміравання прамысловага пралетарыяту. Як і ў іншых гарадах Расіі, становішча рабочых Мінска было вельмі цяжкім. Нястрымная эксплуатацыя, цяжкія матэрыяльныя і бытавыя ўмовы, палітычнае бяспраўе ўзнімалі рабочых на барацьбу супраць прыгнятальнікаў. Першым буйным выступленнем мінскага пралетарыяту з'явілася забастоўка рабочых майстэрняў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ў 1876 годзе. У 80-х гадах у Мінску пачалі ствараццa сацыял-дэмакратычныя гурткі, якія хутка аб'ядналіся ў нелегальную рабочую арганізацыю. Сацыял-дэмакраты падтрымлівалі сувязь з многімі гарадамі Расіі, дапамагалі перапраўляць рэвалюцыянераў за граніцу, транспартавалі выдадзеную ў іншых краінах палітычную літаратуру. Дзейнасць сацыял-дэмакратычнай арганізацыі яшчэ больш узмацнілася пасля I з'езду РСДРП, які адбыўся ў Мінску ў сакавіку 1898 года.

Востры характар насіў рэвалюцыйны рух у горадзе ў кастрычніку 1905 года, у перыяд Усерасійскай палітычнай стачкі. Рабочы клас Мінска забастовачнай барацьбой аказаў вялікую брацкую падтрымку снежаньскаму ўзброенаму паўстанню ў Маскве. У перыяд Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і яе перарастання ў сацыялістычную рэвалюцыю дзейнасць бальшавіцкай арганізацыі Мінска забяспечыла ператварэнне горада ў цэнтр рэвалюцыйнага руху Беларусі і Заходняга фронту. Мінск быў першым горадам у Беларусі, у якім бальшавіцкі Савет узяў уладу ўжо 25 кастрычніка 1917 года, г. зн. у дзень перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе.

Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі адыграла рашаючую ролю ў лёсе горада, у яго эканамічным, палітычным і культурным

развіцці. Пасля абвяшчэння БССР 1 студзеня 1919 года Мінск стаў сталіцай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

У цяжкія гады грамадзянскай вайны працоўныя Мінска разам з усім савецкім народам самаадданa змагаліся супраць іншаземных захопнікаў і ўнеслі свой уклад у перамогу над імі. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны мінчане, кіруючыся ленінскім планам пабудовы сацыялізма, заняліся мірнай стваральнай працай. Іх намаганні былі накіраваны на аднаўленне горада, разбуранага ў выніку першай сусветнай і грамадзянскай войн, на далейшае развіццё ўсіх галін яго гаспадаркі, паляпшэнне ўмоў працы і быту рабочых і служачых. За гады даваенных пяцігодак Мінск ператварыўся ў буйны адміністрацыйны і культурны цэнтр Беларусі з развітай прамысловасцю. Змянілася і знешняе аблічча горада.

Мірная стваральная праца савецкага народа была перапынена фашысцкім нашэсцем, якое пачалося ў чэрвені 1941 года. Мінчане аднымі з першых прынялі на сябе ўдар нямецка-фашысцкіх войск. Уварваўшыся ў горад, гітлераўцы ўвялі ў ім жорсткі акупацыйны рэжым. Аднак Мінск не скарыўся ворагу. Пад кіраўніцтвам падпольнага гаркома партыі мінчане ўзняліся на барацьбу з захопнікамі.

3 ліпеня 1944 года савецкія войскі выгналі гітлераўцаў з Мінска. Вызвалены горад уяўляў сабой суцэльныя кучы шчэбеню і дымячых руінаў. З першых дзён мінчане пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ўзяліся за адраджэнне свайго роднага горада. Шчодрую брацкую дапамогу яны атрымлівалі ад рускага, украінскага, казахскага, таджыкскага і іншых народаў краіны. Сваёй тытанічнай працай працоўныя не толькі адрадзілі, але і цалкам пераўтварылі родны горад. Шырокі размах атрымала ў ім прамысловае, жыллёвае і культурнабытавое будаўніцтва. За пасляваенны час узведзены дзесяткі клубаў, Палацаў культуры, кінатэатраў, цырк, тэлецэнтр, канцэртная зала філармоніі, Палац спорту, вучэбныя карпусы вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, бібліятэкі, сярэднія школы. Многа зроблена па добраўпарадкаванню і азеляненню, стварэнню зон адпачынку, развіццю прадпрыемстваў камунальнага, бытавога і гандлёвага абслугоўвання насельніцтва. Небывалыя перамены адбыліся ў знешнім абліччы горада.

Уклад мінчан у гераічную барацьбу з гітлераўскімі акупантамі, іх самаадданая праца ў пасляваенныя гады высока ацэнены Камуністычнай партыяй і Савецкім урадам. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 3 снежня 1966 года за мужнасць і гераізм, самаадданую партызанскую барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне і за поспехі, дасягнутыя ў аднаўленні горада і ў развіцці народнай гаспадаркі, Мінск узнагароджан ордэнам Леніна. Сваё 900-годдзе ардэнаносны Мінск сустракае ў шэрагу

лепшых і прыгажэйшых гарадоў Савецкага Саюза. Прапаноўваемая ўвазе чытачоў праца («Гісторыя Мінска» — другое, значна перапрацаванае і дапоўненае выданне) і прысвечана гэтай знамянальнай даце.

Кніга падрыхтавана галоўным чынам супрацоўнікамі Інстытута гісторыі АН БССР. У яе напісанні ўдзельнічалі: З. Е. Абязгауз, В. Н. Антанішын, Ю. І. Афонін, Я. А. Васілеўская, У. І. Вышынскі, М. І. Галенчык, В. Р. Гняўко, Р. Ц. Гарбунова, Ц. С. Гарбуноў, А. П. Грыцкевіч, В. А. Загарульская, М. Я. Завалееў, А. І. Залескі, М. І. Злотнік, Н. В. Каменская, А. М. Карпачоў, А. Е. Казлоўская, З. Ю. Капыскі, Я. І. Карнейчык, Т. М. Каробушкіна, І. С. Краўчанка, Л. П. Ліпінскі, Л. М. Лыч, Ф. С. Марцінкевіч, І. Я. Марчанка, В. І. Мялешка, В. А. Мілаванаў, Л. А. Міхайлоўскі, А. Т. Нятылькін, П. Ц. Петрыкаў, І. У. Палуян, У. С. Пасэ, В. С. Родзін, С. М. Самбук, П. А. Селіванаў, У. Н. Семянькоў, М. Я. Стральцоў, В. Р. Тарасенка, К. І. Фірсава, В. У. Чапко, В. У. Шаціла, С. А. Шчарбакоў, Э. Ф. Языковіч. У асобных раздзелах па савецкаму перыяду выкарыстаны матэрыялы па пытаннях градабудаўніцтва, прадастаўленыя І. Д. Белагорцавым.

Ілюстрацыі, карты і планы падабраны М. І. Галенчыкам, ім жа складзена і храналагічная табліца. У выяўленні ілюстрацый у Цэнтральным архіве кінафотафонадакументаў БССР прымалі ўдзел Ю. А. Капіца, І. С. Лукельеў, Л. Н. Яноўская. Спіс літаратуры і крыніц складзен М. Г. Крэканэ. У падрыхтоўцы кнігі да друку прымалі ўдзел М. І. Галенчык, Р. Ц. Гарбунова, М. Г. Крэканэ.

РАЗДЗЕЛ І

СТАРАЖЫТНЫ ГОРАД МІНСК

1. Летапісныя даныя аб старажытным Мінску

Узнікненне і пачатковы этап гістарычнага развіцця Мінска адносяцца к перыяду феадальнай раздробленасці Старажытнарускай дзяржавы, г. зн. к XI—XIII стагоддзям.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб Мінску сустракаецца ў самым старажытным з дайшоўшых да нас летапісных зводаў «Повести временных лет». Яно адносіцца да 1067 года. У летапісным урыўку гаворыцца: «У год 6575 (1067). Пачаў міжусобную барацьбу Усяслаў Брачыславіч полацкі і заняў Ноўгарад. Трое ж Яраславічаў, Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, сабраўшы воінаў, пайшлі на Усяслава ў моцную сцюжу і падышлі да Мінска, і мінчане закрыліся ў горадзе. Браты ж узялі Мінск і перабілі ўсіх мужчын, а жанчын і дзяцей захапілі з сабой як ваенную здабычу, і пайшлі да Нямігі (ракі), і Усяслаў пайшоў да іх насустрач.

Яны сустрэліся на Нямізе 3 сакавіка; і быў снег вялікі, і войскі пайшлі адно на другое. І быў бой бязлітасны, і шмат людзей загінула, і адолелі Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад. Усяслаў жа кінуўся наўцёкі...» Аўтар «Слова аб палку Ігаравым» адлюстраваў гэту крывавую сечу ў радках, поўных смутку і дакору па адрасу ваюючых між сабою князёў:

На Нямізе снапы сцелюць
Галавамі,
А малоцяць жа стальнымі
Іх цапамі.
На таку жыццё кладзецца
Неспадзейна,
І душу ад цела веюць
Безнадзейна.
Берагі ў крыві Нямігі
Па калені;

Не дабро на іх пасеяў
Сейбіт жменяй.
А былі яны гусценька
Ў процьмах вузкіх
Там засеяны касцямі
Сыноў рускіх [1].

Пасля разбурэння 1067 года Мінск, відаць, параўнальна хутка аднавіўся. Але ў 1084 годзе горад зноў быў спустошаны войскамі князя Уладзіміра Святаславіча (Манамаха), якія «хадзілі з чарнігаўцамі і з полаўцамі-чыцеевічамі да Мінска, захапілі горад і не аставілі там ні чалядзіна, ні жывёліны». Пасля гэтага да пачатку XII стагоддзя ў летапісах Мінск не ўпамінаецца. Вядома, аднак, што к XII стагоддзю працэс феадальнага драблення Старажытнарускай дзяржавы ўзмацняецца. Буйныя княствы, якія выдзеліліся з яе, у сваю чаргу пачынаюць драбіцца на шэраг больш дробных княстваў. Так, у пачатку XII стагоддзя са складу Полацкага княства выдзелілася Мінскае княства і Мінск ператварыўся ў «стольны горад». Яго першым князем становіцца адзін з сыноў полацкага князя Усяслава Глеб Усяславіч. З імем гэтага князя звязаны летапісныя паведамленні аб Мінску першай чвэрці XII стагоддзя.

Як сведчыць летапіс, у канцы 1104 года кіеўскі вялікі князь Святаполк накіраваў супраць мінскага князя Глеба свайго ваяводу Пуцяту, князя Яраполка і северскага князя Алега. Саюзнікі аблажылі Мінск, але, не дамогшыся нічога, вымушаны былі адысці ад горада. Відаць, у гэты час Мінск быў добра ўмацаваны.

З утварэннем самастойнага Мінскага княства горад становіцца палітычным цэнтрам значнай тэрыторыі, якая ўключала залежныя ад мінскага князя Оршу і Копысь. Гэта садзейнічала яго развіццю як цэнтра рамяства і гандлю.

Славалюбівы князь Глеб Усяславіч у 1116 годзе паспрабаваў пашырыць свае ўладанні за кошт Слуцка. У адказ Мінск зноў быў абложаны: на гэты раз войскамі Уладзіміра Манамаха. З ім былі дружыны смаленскага князя Вячаслава, якія авалодалі Оршай і Копыссю, і дружыны чарнігаўскага князя Давыда Святаславіча і пераяслаўскага князя Яраполка Уладзіміравіча, якія ўзялі Друцк. Пасля аблогі Мінска, якая працягвалася амаль два месяцы, Уладзімір Манамах прымусіў Глеба скарыцца і абяцаць у далейшым «по всему послушати Володимира». Аднак неўзабаве мінскі князь зноў паспрабаваў вярнуць страчаныя ўладанні. Але барацьба з кіеўскім князем закончылася для яго трагічна. У 1119 годзе Мінск быў узят войскам кіеўскага князя

[1] Пераклад Я. Купалы.

В лѣ҃ ,г҃·ф҃·о҃в҃·: — Ꙁаратиса[43] Всеславъ сн҃ъ 1067
Брачиславль Полочьскѣ[44]. и[18] зат҃а Новъгородъ.
Ꙗрославичи же трие· Изаславъ· Ст҃ославъ·
Всеволодъ· совокупивше вои идоша на Всеслава·
зимѣ сущи велицѣ· и[18] придоша ко Мѣньску· и
Мѣнане затворишаса в градѣ· си же бра҃т҃а
взаша Мѣнескъ [и][a] исѣкоша мужѣ· а женъı
и дѣти вдаша на щитъı[45]· и поидоша к Немизѣ·
и Всеславъ поиде противу· и совокупишаса ѡбои
на Немизѣ· мц҃а· марта· въ ·г҃·[46] дн҃ь· И баше ||
л. 56 об. снѣгъ великъ· [и][a] поидоша противу собѣ· и
бъı сѣча зла и мнози падоша· и ѡдолѣша·
Изаславъ· Ст҃ославъ· Всеволодъ· Всеславъ же
бежа[1].

Першае летапіснае ўпамінанне аб Мінску

і далучан да яго ўладанняў, а Глеб — вывезен у Кіеў, дзе памёр у тым жа годзе.

У сярэдзіне XII стагоддзя мясцовыя феадалы, выкарыстоўваючы міжусобную барацьбу за Кіеў паміж нашчадкамі Уладзіміра Манамаха і чарнігаўскімі Ольгавічамі, дабіліся прызначэння мінскім князем сына Глеба Расціслава. У 1151 годзе палачане выгналі свайго князя Рагвалода Барысавіча (зяця кіеўскага князя Ізяслава Мсціславіча) і прызвалі на княжанне Расціслава. У Мінску стаў князем малодшы брат Расціслава Валадар. У 1159 годзе ў Полацку зноў пачаў княжыць Рагвалод Барысавіч. Вяртаючыся ў Мінск, на сваё ранейшае княжанне, Расціслаў бязлітасна адпомсціў палачанам за сваё выгнанне, спустошыўшы па дарозе землі Полацкага княства. Аб далейшых палітычных падзеях Мінска летапісы амаль нічога не паведамляюць.

У пачатку XIV стагоддзя аслабленае княжацкімі міжусобіцамі Мінскае княства, як і іншыя княствы заходніх зямель Русі, падпала пад уладу літоўскіх вялікіх князёў. Нашчадкі старажытнарускіх князёў ужо займаюць падначаленае, залежнае становішча.

2. Гістарычная тапаграфія і забудова


Даныя археалагічных раскопак на тэрыторыі сучаснага горада, дапоўненыя пісьмовымі крыніцамі і планамі, якія адносяцца к канцу XVIII і XIX стагоддзю, сведчаць, што старажытны Мінск быў размешчан на правым беразе Свіслачы пры ўпадзенні ў яе Нямігі (цяпер невялікі ручай, замкнуты ў бетонны калектар).

На месцы ранейшага ўпадзення Нямігі ў Свіслач, на невялікім узвышшы вышынёй у сярэднім каля васьмі метраў над сучасным узроўнем Свіслачы, у XI—XIV стагоддзях знаходзіўся «град» — умацаваная частка горада, яго дзядзінец («детинец» — крэмль, княжацкі замак), абкружаны драўлянымі сценамі і абгароджаны земляным валам і ровам. У далейшым гэта частка атрымала назву Замчышча.

На вядомых планах Мінска, самы ранні з якіх адносіцца да 1773 года, тэрыторыя замка абмежавана кругападобным валам, які мае разрывы ў паўднёвай частцы. На поўдзень ад Замчышча праходзіла Замкавая вуліца. З захаду яе агібала паўкругам Падзамкавая вуліца, працягам якой з'яўлялася Завальная вуліца. Унутры вала была зроблена драўляная канструкцыя, якая не давала яму абсыпацца. Яна складалася з дзевяці драўляных накатаў — доўгіх сасновых бярвенняў, пакладзеных упоперак восі вала, зверху якіх было пакладзена некалькі бярвенняў уздоўж вала.

Параўнанне гістарычных планаў Мінска з сучасным планам самай старажытнай часткі горада паказвае, што тэрыторыя крамля значна перавышала плошчу Замчышча, на якой вяліся археалагічныя раскопкі. Замак ляжаў паміж ракой Свіслаччу на ўсходзе і вуліцамі Падзамкавай і Завальнай на захадзе і паўднёвым захадзе. Да ўмацаванага валамі, равамі і драўлянымі сценамі і вежамі «града» старажытнага Мінска з паўднёвага захаду, поўдня і паўднёвага ўсходу прылягалі вуліцы гандлёва-рамеснага пасада. Хоць межы гарадскога пасада пакуль што невядомы, але ёсць падставы меркаваць, што туды ўваходзілі сучасная плошча 8 Сакавіка, раёны вуліц Гандлёвай, Нямігі, Нова-Мясніцкай і інш. Паміж вуліцамі быў размешчаны гарадскі рынак, які называўся яшчэ ў XIX стагоддзі Старым рынкам. Як умацаваны цэнтр горада, так і пасад ляжалі ў параўнальна нізіннай частцы сучаснага горада. Слядоў старажытнай забудовы і рэштак матэрыяльнай культуры не было выяўлена ні на адным з трох узвышшаў, якія прымыкалі да «старога горада»,— плошчы Свабоды, Юбілейнай плошчы і Троіцкай гары. Відаць, засяленне тэрыторыі гэтых узвышшаў адбылося ў больш позні час.

Як і для большасці іншых старажытнарускіх гарадоў, для Мінска XII—XIV стагоддзяў характэрна радыяльная сістэма размяшчэння



План старажытнага Мінска

гарадскіх вуліц, якія сыходзіліся ў напрамку варот крамля. Некаторыя з гэтых вуліц, відаць, пачыналіся яшчэ на тэрыторыі крамля.

Выяўленая ў час раскопак найбольш старажытная з вуліц праходзіла ў напрамку з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад і вяла да варот крамля. Магчыма, ужо ў глыбокай старажытнасці склаліся вядомыя да апошняга часу вуліцы Стара-Мясніцкая, якая перасякала дзядзінец, і Замкавая, якая праходзіла па тэрыторыі дзядзінца ад варот горада на захад па яго цэнтры. Шырыня самай доўгай Замкавай вуліцы не перавышала чатырох метраў, іншых вуліц — тры-тры з паловай метра.

Балоцістая глеба прымушала гараджан пакрываць вуліцы і двары драўляным насцілам. Нароўні з вуліцамі, якія вялі да варот горада, меліся і бакавыя адгалінаванні маставых, якія злучалі вуліцы з сядзібамі асобных гаспадароў.

На месцы струхлелых насцілаў зверху клаліся новыя. Адна з вуліц захавала адзін над другім 13 насцілаў, пакладзеных за перыяд

з XII па XIV—XV стагоддзі. Паміж вуліцамі дзядзінца размяшчаліся сядзібы, абгароджаныя платамі. Памер кожнай з іх больш 200 квадратных метраў. У сядзібе, апрача жылых, былі і гаспадарчыя забудовы — хлявы, клеці і г. д. Унутры кожнай сядзібы двор пакрываўся насцілам, як на вуліцах.

Жылыя і гаспадарчыя забудовы старажытнага Мінска былі драўлянымі, пераважна зрубнага тыпу. Памеры жылых дамоў вагаліся ў межах ад 9 да 25 квадратных метраў. Большасць з іх былі аднакамернымі, з двухсхільнымі дахамі, аднак знойдзены сляды і пяцісценных дамоў, якія мелі, апрача жылога памяшкання, сені, а часамі і клець, якая не апальвалася.

Унутры дамоў клаліся дашчаныя ці рабіліся глінабітныя падлогі, ставіліся глінабітныя печы авальнай формы, якія паліліся «па-чорнаму», г. зн. без выведзенага вонкі коміна. Уздоўж сцяны побач з печчу былі зроблены палаці і нары, а каля процілеглай сцяны — лаўка. Планіроўка сядзібы ў цэлым і ўнутранай прасторы жылога дома ў старажытным Мінску мае шмат агульных рыс з жыллём беларускай вёскі дарэвалюцыйнага часу.

Па меры струхлеласці ці ў выпадку гібелі ад пажару таго ці іншага будынка ніжнія вянкі зруба не выкідаліся, а выкарыстоўваліся ў якасці фундамента пры ўзвядзенні новай забудовы.

Драўляныя маставыя, насцілы ў дварах сядзіб, дрэнажныя збудаванні для адвядзення грунтавых вод прыдавалі Мінску выгляд добраўпарадкаванага для таго часу горада. Сярод жылля гараджан узвышаліся будынкі цэркваў. Пры археалагічных раскопках Мінскага замчышча былі знойдзены рэшткі фундамента каменнай царквы. Па свайму архітэктурнаму плану яна мае аналогіі з храмамі полацкай архітэктурнай школы XII стагоддзя.

Мінскі храм узводзіўся як прамавугольны будынак з цэнтральным паўкругам (апсідай), які моцна вытыркаўся ўперад (на чатыры метры), што з'яўлялася адной з рыс полацкай архітэктурнай школы. Ён быў трохапсідным, меў квадратныя ў плане контуры (12×12 метраў). У сярэдняй частцы ўнутранай прасторы храма захаваліся прамавугольныя падмуркі чатырох каменных слупоў для падтрымання перакрыццяў купала. Сцены храма ўзводзіліся са злёгку абчэсаных валуноў, змацаваных між сабой вапнай. На ўцалелай частцы паўднёвай і заходняй сцен захавалася ўнутраная абліцоўка, якая складалася з цэглападобных плітак вапняку. Такія прыёмы ў будаўнічай тэхніцы старажытнарускіх архітэктараў да мінскіх раскопак не былі вядомы.

Летапісны Мінск не належаў да ліку найбольш буйных гарадоў Полацкай зямлі. Даныя, якія захаваліся, гавораць аб тым, што ён уступаў такім гарадам, як Полацк, Віцебск, Тураў.

3. Матэрыяльная культура і гаспадарка

Асновай эканамічнага развіцця старажытнарускага горада з'яўлялася рамесная вытворчасць. Мінск не быў выключэннем.

Рамеснікі і гандляры пасяляліся ў гарадскім пасадзе і складалі тут асноўную частку насельніцтва. Сляды іх выяўлены і на тэрыторыі гарадскога крамля — Замчышча.

Рамеснікі старажытнарускіх гарадоў пераважна былі свабоднымі людзьмі, аднак, калі меркаваць па некаторых ганчарных кляймах, частка мінскіх майстроў была ў асабістай залежнасці ад князёў, баяр, ад праваслаўнай царквы.

Сярод мінскіх рамеснікаў былі кавалі, ювеліры, цесляры, сталяры, токары, бондары, разбяры па дрэву, косці і рогу, ганчары, ткачы, краўцы, гарбары, шаўцы, збройнікі і інш. Часта адзін і той жа майстар валодаў некалькімі спецыяльнасцямі. Вытворчасць некаторых вырабаў яшчэ насіла характар хатніх промыслаў.

Найбольш важнай галіной гарадской рамеснай вытворчасці была апрацоўка жалеза і сталі. Выплаўка жалеза з балотнай руды, запасы якой на тэрыторыі Беларусі былі ўсюды, рабілася вясковымі кавалямі сыродутным спосабам. Кавалкі «сырога» жалеза-крыцы паступалі ў горад, дзе рамеснікі ўжо рабілі з іх гатовыя вырабы. Аб тым, што значная частка вырабаў з жалеза і сталі рабілася менавіта гарадскімі кавалямі, гавораць выяўленыя ў час раскопак шлакі-адыходы і інструменты, напрыклад абцугі са значнымі слядамі спрацаванасці.

Раскопкі гавораць аб тым, што мінскія майстры рабілі з жалеза і сталі сякеры, сярпы, колы, нажы, нажніцы, цяслы, прабойнікі і іншыя прылады працы, прадметы ўзбраення і амуніцыі воінаў (наканечнікі коп'яў і стрэл, шпоры, цуглі, кальчугі, баявыя сякеры, кінжалы і г. д.), розныя бытавыя рэчы (замкі, ключы, цвікі, скобы для дзвярэй, крэсіва для дабывання агню, спражкі для паясоў, шылы, дужкі для вёдзер, розныя акоўкі драўляных прадметаў і г. д.).

Старажытнарускія кавалі прымянялі складаныя тэхналагічныя прыёмы — зварку, тэрмічную апрацоўку жалеза і сталі, а таксама пакрывалі прадметы каляровымі металамі. Так, некаторыя нажы ў XI і пачатку XII стагоддзя выраблялі шляхам зварвання адной стальной і дзвюх жалезных палос, што павялічвала працягласць іх ужывання.

Пазней ужывалася больш эканомная тэхналогія вытворчасці нажоў: на жалезную аснову клінка наварвалася стальное лязо. Наварка стальнога ляза шырока ўжывалася і пры вырабе сякер, цясел, долатаў, кос, сярпоў, нарогаў і г. д. Выраблялiся і прадметы з даволі складанай

тэхналогіяй, напрыклад вісячыя цыліндрычныя з устаўнымі дужкамі замкі, якія мелі не менш 30 дэталей. Паверхня замка поўнасцю або часткова пакрывалася меддзю. Для абточвання асобных прадметаў і іх дэталей ужываліся тачыльныя брускі і каменныя кругі.

Старажытнарускім кавалям і збройнікам было вядома майстэрства інкруставання жалезных рэчаў каляровымі і высакароднымі металамі. У час раскопак на Мінскім замчышчы знойдзены інкруставаны серабром наканечнік кап'я і дэталь ручкі мяча. Даныя раскопак паказваюць, што рамесная вытворчасць жалезных і стальных вырабаў у Мінску XII—XIII стагоддзяў знаходзілася на дастаткова высокім для таго часу ўзроўні.

У старажытным Мінску сярод гарадскіх майстроў была развіта ювелірная справа. З каляровых металаў рамеснікі выраблялі пярсцёнкі, бранзалеты, розныя падвескі, накладкі, спражкі і іншыя прадметы ўпрыгожвання і бытавыя рэчы. Значная частка знойдзеных у час раскопак вырабаў з высакародных і каляровых металаў, безумоўна, была выканана на месцы, аб чым гавораць каменныя формачкі для адліўкі аздабленняў, ювелірныя шінцэты, незавершаныя апрацоўкай ювелірныя вырабы і гліняныя тыгелькі з нацёкамі металу. На адлітых аздабленнях часта гравіравалі або чаканілі арнамент. Некаторыя кольцы і бранзалеты рабіліся з кручанага сярэбранага або бронзавага дроту. У Мінску таксама былі шырока распаўсюджаны і шкляныя ўпрыгожванні — бранзалеты і нават пярсцёнкі.

Шырока была развіта ў старажытным Мінску апрацоўка дрэва. Апрача ўзвядзення гарадскіх сцен, жылых і гаспадарчых будынкаў, вулічных маставых, з дрэва выраблялася шмат бытавых рэчаў, бочак, вёдзер, каўшоў, лыжак, рознага тыпу драўлянага посуду, грабянёў і іншых прадметаў. Пры раскопках знойдзены сякеры, цяслы, долаты, скоблі, пяропадобныя свёрдлы, спецыяльныя нажы, разцы ад такарнага станка і іншыя прылады і інструменты, якія ўжываліся пры апрацоўцы дрэва.

Мінскія рамеснікі займаліся апрацоўкай косці і рога. Аб гэтым сведчаць шматлікія кавалкі апілаваных косці і рога, а таксама гатовая прадукцыя касцярэзаў: грабяні, касцяныя наканечнікі стрэл, ручкі нажоў, шылаў, розныя накладкі, упрыгожаныя разным арнаментам, фрагмент кісцяня з двума варыянтамі радавых знакаў Рурыкавічаў і г. д. Сярод вырабаў з косці і рога асаблівую цікавасць выклікае разная чалавечая фігурка, якая дае ўяўленне аб характары мужчынскага верхняга адзення. Інструменты касцярэзнай справы былі ў асноўным тыя ж, што і пры апрацоўцы невялікіх драўляных вырабаў. Да іх неабходна толькі далучыць лучковы свердзел і невялікую пілу, якія ўжываліся і ў старажытным Мінску пры вырабе грабянёў і іншых рэчаў з косці, рога і дрэва.

Раскопкі ў Мінску сведчаць і аб развіцці каменячоснай справы. Аб гэтым гавораць сляды апрацоўкі каменняў фундамента і сцен храма, абліцоўка ўнутранай часткі паўднёвай і часткі заходняй сцен, старанна апрацаваныя цэглападобныя пліткі з порыстага вапняку і інш.

У горадзе былі шырока распаўсюджаны гарбарнае і шавецкае рамёствы. Выяўлены рэшткі майстэрняў, дзе знаходзіліся драўляныя капылы, шавецкія нажы, шылы, калода, на якой апрацоўвалася скура, шмат абрэзкаў скуры і скураны абутак на мяккай падэшве. Увесь комплекс знаходак майстэрні сведчыць, што шавец быў адначасова і гарбаром. З выраблены х скур ён шыў боты, паўбоцікі, чаравікі, туфлі, рабіў збрую, ножны.

Мяркуючы па знойдзеных у пахаваннях рэштках, жыхары Мінска насілі адзенне як з ільняных, так і з шарсцяных тканін. Яно, мабыць, мела ўсе адметныя рысы, характэрныя для адзення старажытнарускага гараджаніна, апісаныя на аснове вядомых узораў, знойдзеных у Ноўгарадзе, Кіеве і іншых гарадах.

Аб мужчынскім адзенні таго часу дае ўяўленне ўпамянутая ўжо касцяная фігурка. Яно складалася з кароткай кашулі, падпяразанай рэменем, з абшлагамі на рукавах. Порткі, відавочна, запраўляліся ў боты або шарсцяныя шкарпэткі, а магчыма, абкручваліся анучамі з ільняной тканіны. Знойдзены былі і вышытыя абрыўкі тканіны і паяска.

Значнае месца ў рамеснай вытворчасці гараджан займала ганчарная справа. З гліны з дапамогай ганчарнага круга выраблялися разнастайны посуд: гаршкі, міскі, талеркі, збаны, упрыгожаныя лінейным або хвалепадобным арнаментам.

Разнастайнасць знойдзеных вырабаў не азначае, зразумела, вузкай спецыялізацыі рамяства. У гэты час майстар часта быў яшчэ універсалам, сумяшчаючы некалькі спецыяльнасцей. Некаторыя з іх (прадзенне, ткацтва, шыццё адзення) не выйшлі за рамкі хатніх промыслаў.

Старажытны Мінск быў не толькі рамесным, але і гандлёвым цэнтрам. Шлях па рэках Свіслачы, Бярэзіне і Дняпру звязваў яго з Кіевам. З паўночнага захаду блізка да горада падыходзілі прытокі Віліі, якая ўпадае ў Нёман. Геаграфічнае месцазнаходжанне Мінска вызначала яго ролю як аднаго з перавалачных пунктаў на вялікім гандлёвым водным шляху ад Кіева да берагоў Балтыйскага мора. Са шматлікімі старажытнарускімі гарадамі Мінск злучалі сухапутныя дарогі. Па гэтых гандлёвых шляхах купцы прывозілі ў Мінск каляровыя і высакародныя металы і вырабы з іх. У пластах XI—XIV стагоддзяў знойдзены ўпрыгожанні з янтару, які дабываўся на берагах Балтыкі, прасніца з ружовага шыферу, вытворчасць якіх была скан-

БДУ Інв. № 538642

цэнтравана ў ваколіцах Оўруча на Валыні, буйныя гліняныя пасудзіны (карчагі) з паўднёвых гарадоў старажытнай Русі. Былі выяўлены розныя вырабы кіеўскіх майстроў: флаконы і кубкі з тонкага рознакаляровага шкла, каляровыя шкляныя бранзалеты, пярсцёнкі, колты (род жаночага ўпрыгожання) і завушніца кіеўскага тыпу, медны падсвечнік, пазалочаныя і пасярэбраныя пярсцёнкі, а таксама пацеркі з сердаліку, крышталю, агату, абломак царкоўнага звана, некаторыя прадметы ўзбраення.

У XII—XIII стагоддзях, відаць, склаўся абмен і на ўнутраным рынку буйных гарадоў, таму што шэраг пісьмовых крыніц указвае на аддзяленне горада ад вёскі, што не магло не выклікаць і абмену паміж імі. Але працэс гэты толькі пачынаўся, на што ўказвае сур'ёзная роля, якую ў жыцці гараджаніна адыгрывалі яшчэ земляробства, хатняя жывёлагадоўля, шэраг падсобных промыслаў.

Ф. Энгельс, характарызуючы жыццё раннефеадальнага горада, адзначаў, што асноўным заняткам рамеснікаў была вытворчасць для абмену. Але разам з гэтым, паводле слоў Энгельса, «яны мелі агароды і невялікія палі, пасвілі сваю жывёлу ў абшчынным лесе, які, апрача таго, даваў ім будаўнічы матэрыял і паліва; жанчыны пралі лён, шэрсць і г. д.».

Да археалагічных раскопак нічога не было вядома аб ролі сельскагаспадарчых заняткаў у жыцці гараджан Мінска.

Знаходкі, выяўленыя ў Мінску, пераконваюць нас у тым, што гараджане апрацоўвалі палі і вырошчвалі разнастайныя сельскагаспадарчыя культуры. Ворныя землі знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад горада, прымыкаючы да тэрыторыі пасада.

Асноўныя прылады апрацоўкі глебы — шматзубыя і двухзубыя сохі. Адзін нарог трохзубай сахі знойдзен у пласце XI стагоддзя, другі — XII стагоддзя. Такімі сохамі можна было толькі ўзрыхляць зямлю. Сохі з прыстасаваннем для адкідвання скібаў увайшлі ва ўжытак у больш позні час, прыблізна ў XIV—XV стагоддзях. Да прылад апрацоўкі глебы адносяцца і драўляныя лапаты з жалезнымі акоўкамі, знойдзеныя пры раскопках Мінска.

Даследаванні, праведзеныя А. В. Кір'янавым, даюць нам падставу (па аналогіі з вывучанымі ім матэрыяламі Ноўгарада, Гродна, Браслава) сцвярджаць, што ўжо ў XI стагоддзі Мінск ведаў развітае ворнае земляробства. Аб гэтым сведчаць знойдзеныя зярняты культурных раслін і насенне пустазелля, якія вырасталі толькі на староворных землях. Знойдзеныя зярняты азімага жыта сведчаць, што раннефеадальны Мінск ведаў папарную сістэму земляробства, магчыма, з ужываннем трохполля. Вялікую ролю адыгрывала яравая пшаніца, якая ў знойдзеных зярнятах займае другое месца пасля азімага жыта. Яравы ячмень таксама шырока культываваўся ў старажытным Мінску.

У XI—XIII стагоддзях яравое жыта вырошчвалася ў невялікай колькасці, таму што яго выцесніла азімае жыта, якое аказалася больш ураджайнай і ўстойлівай культурай. Вырошчваліся таксама авёс, проса, а з сямейства бабовых — гарох, віка, бабы, з маслічных — каноплі, лён. Важна адзначыць, што гароднінныя бабы, знойдзеныя ў пластах XI—XII стагоддзяў у Мінску, з'яўляюцца самай ранняй знаходкай пладоў гэтай расліны не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ўсёй Усходняй Еўропы, у той час як драбнаплодныя (конскія) бабы — звычайная знаходка.

Атрыманы ўраджай перапрацоўваўся пры дапамозе розных прылад. Ачышчанае зерне размолвалі на ручных жорнах. У Мінску знойдзены два тыпы жорнаў. У першых камяні шчыльна прылягалі адзін да другога. Жорны другога тыпу ў верхнім камені мелі спецыяльную адтуліну для жалезнай або драўлянай порхліцы. Яна давала магчымасць рэгуляваць адлегласць паміж камянямі. Крупы абдзіраліся ў драўляных ступах. У Мінску былі вядомы драўляныя ручныя і складаныя нажныя ступы. Адна нажная ступа знойдзена ў пласце XII стагоддзя, другая — XIII стагоддзя. Нажная ступа складалася з масіўнай драўлянай плахі з адтулінай для засыпання зерня з аднаго боку і ўмацаванага рычага з другога. У рычаг на ўзроўні адтуліны ў пласе ўстаноўлены драўляны таўкач, які прыводзіўся ў рух шляхам перамяшчэння цяжару цела працуючага з адной нагі на другую. Такія ступы на беларускім Палессі дажылі ў гаспадарцы селяніна да XX стагоддзя.

У ліку земляробчых заняткаў старажытных жыхароў Мінска былі агародніцтва і садаводства. Аб гэтым сведчаць частыя знаходкі костачак вішні, слівы і значнай колькасці абвугленых пладоў грушы.

Вялікае месца ў гаспадарцы гараджаніна займала хатняя жывёлагадоўля. У час раскопак знойдзена шмат касцей кароў, свіней, авечак, коз, коней і інш. Знойдзены косці старажытных спадарожнікаў чалавека — сабак, а таксама кошак.

РАЗДЗЕЛ II

ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ГОРАДА (XIV — XV стагоддзі)

1. Асноўныя заняткі гараджан



Гісторыі Мінска перыяд XIV—XV стагоддзяў найменш вывучаны. Мізэрнасць крыніц не дазваляе стварыць больш ці менш поўны малюнак яго гаспадарчага развіцця і грамадска-палітычнага жыцця. Частыя пажары, якім падвяргаўся сярэдневяковы Мінск, знішчылі шматлікія дакументы і акты па гісторыі горада. Археалагічныя ж даныя недастатковыя, таму што яны адносяцца пераважна да параўнальна невялікай тэрыторыі ўмацаванага дзядзінца, а вялізны гарадскі пасад амаль не даследаваны. Аднак нават тыя нешматлікія пісьмовыя крыніцы і археалагічныя матэрыялы, якія мы маем, дазваляюць вызначыць агульны напрамак і галоўныя характэрныя рысы гісторыі Мінска гэтага перыяду.

У XIV і асабліва ў XV стагоддзях Мінск ператвараецца ў значны гандлёва-рамесны цэнтр. Далейшае развіццё прадукцыйных сіл як у земляробстве, так і ў рамястве, узмацненне ролі грашовай рэнты, пашырэнне сферы тавар-на-грашовых адносін і знешніх гандлёвых сувязей, уцёкі запрыгоненых сялян у межы гарадскога пасада садзейнічалі росту Мінска. У гэты перыяд горад перайшоў на левы бок Свіслачы, у раён Троіцкай гары, і, напэўна, пачаў распаўсюджвацца на тэрыторыю, якая пазней стала называцца Верхнім, або Высокім, рынкам, а таксама пашырыўся ў паўднёва-заходнім напрамку. У дакуменце пачатку XVI стагоддзя сказана, што каля Вазнясенскага манастыра, размешчанага на Троіцкай гары, жывуць «люди церковные монастырские», якія «в месте Меньском торгом обыходят». У тым жа дакуменце гаворыцца, што названыя

манастырскія людзі «здавна за первых архимандритов николи мыт не давали». Значыць, гандлёвае насельніцтва жыло ў гэтым раёне горада задоўга да XVI стагоддзя.

Насельніцтва Мінска павялічвалася галоўным чынам за лік сялян, якія спадзяваліся знайсці тут ратунак ад прыгоннай няволі. У горадзе жылі таксама феадальна залежныя людзі, пераселеныя сюды іх панамі. Больш стала прадстаўнікоў пануючага феадальнага класа — паноў, баяр, у тым ліку літоўскіх, якія атрымалі ад вялікіх князёў уладанні ў Мінску і яго ваколіцах. З канца XIV стагоддзя ўзрасла колькасць яўрэйскага насельніцтва, з'явіліся татарскія пасяленцы.

Ускосным сведчаннем росту эканомікі Мінска ў XV стагоддзі, у прыватнасці яго гандлю, з'яўляецца значнае павелічэнне сумы пошлін (мыта) з тавараў, якія правозіліся праз горад. Так, мінскае мыта ў 1495 годзе было здано ў арэнду за 120 коп грошаў, у 1498 годзе — за 200, у 1510 годзе — за 300, а ў 1525 годзе — за 450. Значна ўзрасла ў канцы XV — пачатку XVI стагоддзя сума арэнды мінскіх корчмаў — з 60 коп грошаў у 1494 годзе да 150 у 1502 годзе.

У сярэдзіне XV стагоддзя Мінск — адзін з буйных гарадоў Вялікага княства Літоўскага. Аднак па колькасці насельніцтва і ўзроўню гаспадарчага развіцця ён значна адставаў ад такіх буйнейшых гарадоў Беларусі, як Полацк і Брэст. Сур'ёзнай перашкодай для развіцця Мінска былі частыя войны і звязаныя з імі стыхійныя бедствы. Так, у перыяд вострай міжусобнай барацьбы літоўскіх князёў на тэрыторыі Беларусі ў 30-х гадах XV стагоддзя горад неаднаразова разбураўся і спусташаўся. У 1433 годзе Мінск спаліў Свідрыгайла, адных жыхароў забіў, другіх павёў у палон. У час нападу крымскіх татар у 1505 годзе горад быў спустошан пажарам і эпідэміяй.

Развіццё рамеснай вытворчасці — адзін з асноўных фактараў росту феадальнага Мінска. Параўнальна высокі ўзровень рамяства, дасягнуты ў папярэдні перыяд (XII—XIII стагоддзі), з'явіўся асновай для яго далейшага ўдасканалення і спецыялізацыі.

Як можна меркаваць па археалагічных матэрыялах і паасобных пісьмовых крыніцах, сярод рамеснікаў Мінска XIV—XV стагоддзяў былі, як і ў XIII стагоддзі, кавалі, ганчары, краўцы, шаўцы, гарбары, кушняры, цесляры, сталяры, бондары, разбяры па дрэву і косці, каменячосы, залатых і сярэбраных спраў майстры, збройнікі, слесары і інш. Большасць рамеснага насельніцтва жыла ў пасадзе, а таксама на гарадскіх і прыгарадных землях свецкіх і царкоўных феадалаў.

Як і ў папярэдні перыяд, адной з важнейшых галін мінскага рамяства з'яўлялася апрацоўка металаў, у першую чаргу кавальская справа. Кавалі-універсалы выраблялі самыя разнастайныя прадметы з жалеза, сталі і бронзы, галоўным чынам прылады працы, розныя

інструменты, шматлікія бытавыя рэчы, неабходныя не толькі гараджаніну, але і селяніну. У час археалагічных раскопак у Мінску (у пластах XIV—XV стагоддзяў) знойдзены нажы, сярпы, косы, вялікія кавальскія клешчы, нажніцы, рыбалоўныя кручкі, шылы, цвікі, бронзавыя лыжкі, бронзавы посуд на трох ножках, спражкі для пояса, жалезныя шпоры, замкі, ключы, металічныя бранзалеты і іншыя прадметы. У грамаце 1499 года гаворыцца, што мінскія рамеснікі рабілі «нароги, и серпы, и защепки, и сокеры, и иные речи». Паступова ў кавальскай справе адбываецца працэс расшчаплення і вылучэння больш вузкіх спецыяльнасцей. Зыходным матэрыялам для майстроў кавальскай і слясарнай справы было жалеза, якое дабывалася з балотнай руды. Пры раскопках Мінскага замчышча знойдзены кавалкі жалезнага шлаку.

Значнага ўзроўню развіцця дасягнула ювелірная справа. У грамаце 1499 года ўпамінаюцца мінскія ювеліры («залатары»), якія «под присудом городским (г. зн. замкавым) мешкають». З каляровых металаў рамеснікі-ювеліры выраблялі бранзалеты, пярсцёнкі, засцежкі, спражкі, гузікі і інш. Гэтыя прадметы нярэдка былі ўпрыгожаны арнаментам.

Вялікая колькасць прадметаў керамікі, знойдзеных у пластах XV—XVI стагоддзяў на тэрыторыі Замчышча, сведчыць аб развітай ганчарнай вытворчасці. Апрача шматлікіх рэшткаў глінянага посуду, цаглін і пячных кафляў, знойдзена ганчарная печ, складзеная з каменя. У ёй абпальваўся гліняны посуд. У канцы XV — пачатку XVI стагоддзя ў ганчарным рамястве Мінска і іншых гарадоў Беларусі адбыліся значныя змены. Паверхня глінянага посуду і пячных кафляў пакрывалася зялёнай або жоўтай палівай, а таксама ўпрыгожвалася раслінным арнаментам, чаго амаль не назіралася раней. Формы ганчарных вырабаў становяцца больш разнастайнымі. Высокага ўзроўню дасягнулі кушнернае і шавецкае рамёствы. Шаўцы пачалі выраблять абутак на абцасах, невядомы раней.

Шматлікія кавалкі апрацаванага дрэва, рэшткі драўляных пабудоў, разнастайныя інструменты, якімі апрацоўвалі дрэва (сякеры, цяслы, долаты, нажы, скоблі, свёрдлы), сведчаць аб развіцці сталярскай, цяслярскай і бандарнай справы. З дрэва выраблялі розныя прадметы хатняга начыння — бочкі, вёдры, карыты, каўшы, кошыкі, кубкі і да т. п., многія прылады і сродкі працы (лапаты, вілы, транспартныя сродкі і г. д.). Дрэва ва ўмовах Беларусі было асноўным будаўнічым матэрыялам на працягу многіх стагоддзяў, праўда, у Мінску ў пластах XV—XVI стагоддзяў сустракаюцца рэшткі пабудоў з цэглы.

Пісьмовыя і археалагічныя крыніцы не дазваляюць вызначыць дакладную колькасць рамесных спецыяльнасцей у Мінску. Як маж-

на меркаваць па наяўных даных, у XV стагоддзі іх налічвалася больш двух дзесяткаў, прычым многія рамесныя прафесіі былі дастаткова шырокага профілю (напрыклад, кавалі, дрэваробы, ганчары і інш.). Такія прафесіі паступова дыферэнцыраваліся на больш вузкія спецыяльнасці, у выніку чаго агульны лік прафесій павялічыўся.

Прававое становішча мінскіх рамеснікаў было розным. Адны (відаць, большасць) лічыліся асабіста свабоднымі людзьмі, другія знаходзіліся ў феадальнай залежнасці ад князя, баяр, царквы. Так, як сведчыць дакумент канца XV стагоддзя, сярод прыватнаўласніцкіх рамеснікаў — падданых Мінскага замка былі кавалі, краўцы, шаўцы, кушняры, ювеліры і інш.

У рамеснай вытворчасці Мінска ў XIV і, магчыма, нават у XV стагоддзях пераважала работа на заказ. Адначасова некаторыя вырабы паступалі на рынак, дзе купляліся не толькі жыхарамі горада, але і сялянамі з навакольных вёсак. Некаторыя тавары рамеснай вытворчасці набываліся таксама прадстаўнікамі пануючага класа. Частка тавараў вывозілася ў іншыя гарады і за межы краіны. Аб'ём вытворчасці на рынак, напэўна, стаў прыкметна ўзрастаць з другой паловы XV стагоддзя. У дакуменце, праўда, некалькі больш позняга часу (1537 год) гаворыцца, што падданыя Вазнясенскага манастыра «ремесло и штоколвек заробивши (зробивши. — С. Ш.) до места на продажу носят».

Па меры развіцця таварна-грашовыя адносіны пачынаюць пранікаць у сферу рамеснай вытворчасці: гарадскі рамеснік усё больш і больш пачынае працаваць на рынак. Аднак гэты прагрэсіўны працэс працякаў вельмі павольна, ён тармазіўся непадзельным панаваннем феадальных адносін, эканамічным і палітычным засіллем феадалаў у горадзе. З дакументаў відаць, што многія мінскія рамеснікі і ў канцы XV стагоддзя абавязаны былі аддаваць свае вырабы (сярпы, нарогі, сякеры, іншыя прадметы) феадальнаму замку ў выглядзе павіннасці. Феадальная залежнасць гарадскіх рамеснікаў стрымлівала развіццё рамяства ў горадзе.

Мінск знаходзіўся на перасячэнні важных гандлёвых шляхоў. У 1498 годзе кароль пісаў мінскаму мытніку, каб ён не дазваляў купцам «объезжати мыта нашего новыми дорогами, а велел бы... им ездити старыми дорогами на Менеск, по давнему». Значыць, нароўні са старымі традыцыйнымі шляхамі ўстанаўліваліся і новыя, якія праходзілі каля Мінска або праз яго.

Важнейшыя гандлёвыя шляхі, якія перасякаліся ў Мінску, праляглі з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Водны шлях праходзіў па Свіслачы, Бярэзіне і Дняпры. Са Смаленска на Мінск дарога ішла праз Дуброўну, Оршу, Друцк, Бобр, Барысаў; з Барысава адзін шлях ішоў праз Мінск, Радашковічы, Маладзечна, Крэва,

Ашмяны на Вільню, другі — праз Гайну на Маладзечна і Вільню. Мінск быў звязан з Гродна праз Койданава і Навагрудак, а з Брэстам — праз Мір, Слонім, Новы Двор, Камянец. Праз Барысаў, Магілёў, Быхаў, Чачэрск, Старадуб праходзіў гандлёвы шлях, які звязваў Мінск з паўднёва-заходнімі рускімі землямі і Украінай. Ёсць звесткі, што ў XV стагоддзі праз Прапойск, з заходам у Мінск, праязджалі рускія купцы, якія накіроўваліся з Крыма. Дарогі злучалі Мінск з Полацкам, Слуцкам, Пінскам і іншымі гарадамі. Такім чынам, Мінск аказаўся размешчаным на вельмі выгадных шляхах унутранага і знешняга (транзітнага) гандлю. Праз гэты горад ішла асноўная маса тавараў з заходнееўрапейскіх і прыбалтыйскіх краін у рускія землі, а яны ў сваю чаргу накіроўвалі тавары на захад таксама праз Мінск. Не быў ён у баку і ад гандлёвых шляхоў, якія звязвалі беларускія, літоўскія і часткова рускія землі з Украінай, Крымам і Турцыяй. Гандаль спрыяў развіццю горада.

Маюцца звесткі аб шырокіх унутраных сувязях мінскіх купцоў. Так, у 1480 годзе кароль Казімір дазволіў «мешчаніну менскаму» Луке Церашковічу гандляваць бяспошлінна ў 53 гарадах і мястэчках Вялікага княства Літоўскага. Апрача Мінска, у пераліку названы наступныя гарады і мястэчкі Беларусі: Глуск, Пагост, Гарадок, Тураў, Пінск, Брэст, Камянец, Слонім, Навагрудак, Орша, Магілёў, Рагачоў, Стрэшын, Рэчыца, Гомель, Чачэрск, Крычаў, Мсціслаў, Мазыр і інш. Гэты мінскі купец мог бяспошлінна гандляваць і ў многіх гарадах за межамі Беларусі: у Луцку, Астрозе, Дубровіцах, Коўне, Смаленску, Дарагабужы, Вязьме, Бранску, Старадубе, Чарнігаве, Кіеве, Пуціўлі, Чаркасах, Жытоміры і інш.

У Мінску гандлявалі купцы з розных гарадоў і краін. Частымі гасцямі тут былі віленскія купцы, якія карысталіся правам бязмытнага гандлю ў многіх гарадах Беларусі. Нярэдка сюды прыязджалі купцы з Рускай дзяржавы. Вядома, што ў другой палове XV стагоддзя праз Мінск неаднаразова праязджалі рускія гандлёвыя людзі «з вазамі і ўюкамі», вяртаючыся «з-за мора». Частку сваіх тавараў яны прадавалі ў Мінску.

Мясцовыя гарадскія купцы і гандляры імкнуліся ахаваць свой гандаль ад канкурэнцыі з боку прыезджых купцоў — «гасцей». Яны гэтага дабіліся ў канцы XV стагоддзя, атрымаўшы ад караля адпаведныя гарантыі. Так, граматай 1499 года ўсім «гасцям», апрача віленскіх, рашуча забаранялася весці рознічны гандаль у Мінску, а таксама рабіць закупкі ў вёсках. Апошняе заставалася правам мінскіх купцоў і скупшчыкаў. Прывезеныя тавары «госці» абавязаны былі збываць купцам оптам у адпаведнасці з устаноўленымі нормамі. Напрыклад, норма аптовага продажу металаў — цэтнар, які складаў 70 кілаграмаў; солі — лашт, або каля 2000 кілаграмаў; сукно пра-

давалася паставам, што адпавядала 20 метрам; віно і піва — бочкамі; нажы і сякеры — па 12 штук («тахром або ў тузін»). Рознічны гандаль скупленымі таварамі ажыццяўлялі мінскія купцы, што прыносіла ім пэўныя гандлёвыя прыбыткі.

У той жа час у каралеўскай грамаце прадугледжваліся буйныя аптовыя закупкі тавараў прыезджымі купцамі на гарадскім рынку Мінска.

Асноўнымі прадметамі вывазу з Мінска з'яўляліся воск, попел, смала, лесаматэрыялы, футра («собаль», «куніца», «тхор», «вавёрка», «гарнастай», «норыца» і інш.); частка футраў прывозілася з Рускай дзяржавы. Прыезджыя купцы абавязаны былі закупляць тавары на гарадскім рынку вялікімі партыямі: напрыклад, футры вавёркі, гарнастая і норкі — па 250 штук; попел і смалу — прыблізна па 2000 кілаграмаў. Вывозіліся гэтыя тавары пераважна ў краіны Заходняй Еўропы.

Прывозіліся ў Мінск соль, віно, піва нямецкае і, як сказана ў адной грамаце, «иншое питье чужое», вострыя прыправы і зеллі (перац, імбір, шафран, мускат, гваздзіка, цытвар і да т. п.). З краін Заходняй Еўропы прывозіліся металы (жалеза, медзь, волава, латунь, цынк) і металічныя вырабы. У значнай колькасці прывозіліся таксама тканіны — сукно, палатно. Аб гэтым сведчыць хоць бы роспіс дзяржаўнага падатку «ардыншчыны» (1501 год), дзе сказана, што Мінск павінен унесці падатак замежнымі тканінамі, а таксама сабалямі. З Рускай дзяржавы паступалі дарагія футры, футравыя і скураныя вырабы, аўчыны і да т. п.

У Мінску меліся «крамніцы», «клеткі» мясныя, хлебныя і інш. Вядома, што ў пачатку XVI стагоддзя на тэрыторыі Мінскага замка «каля маста і двара мітрапольнага» знаходзілася 10 «клетак мяшчанскіх»; пазней (у 1514 годзе) яны, напэўна, былі знесены ў іншае месца, таму што гэта тэрыторыя спатрэбілася землеўладальніку (мітрапаліту кіеўскаму). У каралеўскай грамаце наконт гэтага пісалася: «А клетки местьскии казали есьмо оттол знести долов». Шырока быў распаўсюджаны гандаль спіртнымі напіткамі, які прыносіў вялікі прыбытак. «В месте нашом Менском корчом много»,— гаворыцца ў дакуменце 1494 года.

У канцы XV стагоддзя значнае месца ў гандлі займалі прадукты сельскай гаспадаркі. З дакумента некалькі больш позняга часу відаць, што мінскія купцы скуплялі хлеб за межамі горада і прывозілі на продаж у Мінск. Так, у грамаце 1537 года сказана, што людзі, якія жылі на землях мінскага Вазнясенскага манастыра, «скупаючи збоже и солод, также до Менска то привозят и продают и с того собе поживене мают». У той жа грамаце гаворыцца і аб «людях плебанских», якія «также некоторыи речи на продажу до места привозят

и тым ся живят». У іх ліку маглі быць і сельскагаспадарчыя прадукты.

Прыведзеныя факты і шэраг такіх ускосных доказаў, як значнае павышэнне сумы мытных збораў з тавараў, якія правозіліся праз Мінск, павелічэнне арэнды корчмаў, атрыманне гараджанамі гандлёвых прывілеяў, а таксама існаванне ў горадзе так званай «важніцы», дзе купцы ўзважвалі свае тавары, і спецыяльнай адзінкі вагі — «каменя мінскага» (вядомы з канца XIV стагоддзя), гавораць аб тым, што Мінск XV стагоддзя становіцца значным гандлёвым цэнтрам Беларусі.

Апрача рамяства і гандлю, гараджане працягвалі займацца рознымі старымі промысламі: паляваннем, рыбнай лоўляй, хмеляводствам, бортніцтвам, футравым промыслам і г. д. У горадзе былі такія гаспадарчыя прадпрыемствы, як печ («капніца»), у якой перапаліваўся і кляймiўся воск на экспарт, млын на Свіслачы і «камора пастрыгальная», у якой сукно канчаткова апрацоўвалася.

Вялікую ролю ў эканамічным жыцці сярэдневяковага Мінска адыгрывала сельская гаспадарка. Жыхары горада займаліся земляробствам і агародніцтвам, разводзілі жывёлу. Дакументы сведчаць, што зямлю ў Мінску мелі не толькі феадалы, але і гараджане. Напрыклад, мешчанін Фёдар Пранковіч меў «двор отчинный в месте... Менском с пашнею и з нивами и з сеножатьми» (1500 год). Мешчанін Іван Еўлашкевіч уладаў домам з гумном, зямлёй і сенакосам каля Свіслачы. У канцы XV стагоддзя Мінск атрымаў ад караля новыя зямельныя ўладанні вакол горада «ку осаженью и размноженью людей». Гараджанам была падаравана не толькі ворная зямля, але і лугі для пасьбы жывёлы.

Такім чынам, Мінск у XIV—XV стагоддзях знаходзіўся на шляху ператварэння ў значны рамесна-гандлёвы цэнтр Беларусі, у яго эканамічным жыцці яшчэ адыгрывалі важную ролю сельскагаспадарчыя і прамысловыя заняткі гараджан, што было характэрным для сярэдневяковага горада.

2. Сацыяльныя адносіны. Гарадское самакіраванне

Па свайму сацыяльнаму складу, маёмаснаму і прававому становішчу насельніцтва Мінска было неаднародным. Пануючае становішча ў горадзе займалі феадалы — князі, баяры, паны і так званыя «дваране» (г. зн. саноўнікі вялікакняжацкага двара). Многія з іх уладалі буйной нерухомай маёмасцю ў горадзе, галоўным чынам на тэрыторыі замка, ворнымі землямі, сенажацямі і лясамі за горадам.

Напрыклад, у межах Мінскага замка вялікі зямельны ўчастак належаў буйному магнату — князю Канстанціну Іванавічу Астрожскаму, а ў 1514 годзе гэта ўладанне было падаравана мітрапаліту кіеўскаму Іосіфу «на пашырэнне двара яго», размешчанага тут жа ў замку каля маста.

Феадалы аказвалі вялікі ўплыў на эканамічнае жыццё горада і адыгрывалі вядучую ролю ў яго грамадска-палітычным жыцці. Да ліку прывілеяванага насельніцтва горада належала таксама праваслаўнае духавенства. Яно, як і баяры, мела немалыя зямельныя ўладанні, грашовыя сумы. Напрыклад, архімандрыт Іона (XV стагоддзе) даваў у крэдыт грошы мінскаму мешчаніну Івану Еўлашкевічу. З канца XIV стагоддзя ў Мінску з'яўляюцца ўладанні каталіцкай царквы.

Набыццё шляхтай і духавенствам нерухомай маёмасці ў горадзе адбывалася рознымі спосабамі — купляй, атрыманнем у заклад, шляхам каралеўскіх падараванняў («даніны гаспадарскія»), у тым ліку на аснове так званага кадуковага права, шляхам дарэння па завяшчанню (часцей за ўсё манастырам, касцёлам). Як адзін са спосабаў павелічэння сваіх уладанняў баяры выкарыстоўвалі шлюбы паміж імі і мяшчанамі-землеўладальнікамі. Так, у 1500 годзе баярын Пашко Талаконскі, ажаніўшыся з унучкай мешчаніна, атрымаў у якасці прыданага «двор вотчынны» з угоддзямі.

На гарадскіх участках (плацах), якія былі ўласнасцю свецкіх і царкоўных феадалаў, жылі залежныя ад іх рамеснікі і гандляры, а таксама асабіста вольныя гараджане.

У сацыяльных адносінах гэта частка гарадскіх жыхароў складалася з дзвюх груп. Адны былі пераселены з маёнткаў феадаламі і заставаліся залежнымі ад іх. Жывучы ў горадзе, яны падпарадкоўваліся ўладзе свайго пана. Другія з'яўляліся карэннымі гараджанамі, былі вольнымі і падпарадкоўваліся гарадскім уладам. Разам з гараджанамі, якія жылі на сваіх участках або на ўчастках, што належалі гораду, яны складалі гарадскую абшчыну. Пераважным па колькасці было насельніцтва, якое ўваходзіла ў гарадскую абшчыну. Яно і атрымала ў дакументах XV стагоддзя назву «мяшчане» (жыхары «места» — горада). Яго асноўнымі заняткамі былі рамесная вытворчасць і гандаль.

Сярод мяшчан былі багатыя купцы і землеўладальнікі. Часамі мяшчане з'яўляліся адкупшчыкамі каралеўскай мытніцы, размешчанай у Мінску. Так, у 1495 годзе кароль здаў у арэнду на тры гады мінскае мыта мяшчанам Працкевічу і Сцепановічу.

Значную праслойку насельніцтва Мінска складалі гарадскія нізы, сярод якіх былі немаёмасныя вольныя гараджане і феадальна залежныя людзі. У дакументах сустракаюцца такія назвы, як «людцы цер-

ковные», «люди плебанские», «люди отчизные звечные», «челядь невольная» і г. д., якія адносіліся да розных груп насельніцтва з гарадскіх нізоў. Бедныя і бяспраўныя, яны сурова эксплуатаваліся з боку багачоў і землеўладальнікаў.

Гараджане неслі самыя разнастайныя павіннасці, плацілі падаткі і розныя паборы на карысць дзяржавы. Па даўняму звычаю яны абавязаны былі рамантаваць замкавы млын, і «дерево на тот млын возить», і «греблю сыпати», будаваць і рамантаваць умацаванні, дарогі, масты і г. д. Найбольш цяжкай лічылася павіннасць пастаўляць фурманкі, але з канца XV стагоддзя горад часткова вызваляецца ад яе. Існавала вартавая павіннасць, ад якой гараджане таксама часткова вызваляліся. Цяжкай для горада была ваенная павіннасць: гараджане выстаўлялі пэўную колькасць узброеных коннікаў або замест іх уносілі пэўную суму грошай.

З канца XV стагоддзя Мінск пачаў плаціць казне 60 коп грошаў у год. Гэты агульнагарадскі грашовы падатак замяніў існаваўшыя раней разнастайныя паборы і павіннасці, сярод якіх многія насілі натуральны характар. Апрача таго, горад плаціў дзяржаўныя падаткі, якія ішлі звычайна на ваенныя патрэбы, такія, як серабшчызна, ардыншчына, а таксама ўносіў карчомны чынш. Агульная сума збіраемых з гараджан падаткаў з канца XV стагоддзя павялічылася, хоць лік іх паменшыўся.

Гарадскія рамеснікі, апрача названых падаткаў і павіннасцей, здавалі частку сваёй прадукцыі ў гаспадарку феадальнага замка. Купцы і гандляры плацілі розныя гандлёвыя зборы.

Падаткі і павіннасці ўсім цяжарам клаліся на плечы асноўнай масы працоўнага насельніцтва. Феадалы, якія жылі ў горадзе, не прымалі ўдзелу ў выкананні гэтых павіннасцей; яны, як сказана ў дакуменце, «местских поплаток никоторых» не плацілі. Вельмі нераўнамерна размяркоўваліся дзяржаўныя павіннасці і падаткі і паміж рознымі групамі простых гараджан. Напрыклад, падданыя цэркваў і манастыроў, прыкрываючыся імунітэтнымі правамі сваіх паноў, не неслі цяжкай фурманкавай і вартавой павіннасцей, якія патрабаваліся з горада, не выплачвалі серабшчызны і іншых «поплаток не даимали». Ухіляліся ад гэтых і іншых гарадскіх павіннасцей і падданыя князёў, паноў і баяр. На гэтай глебе адбываліся сутычкі паміж асобнымі групамі гараджан, што аслабляла іх перад пануючым класам феадалаў, тармазіла працэс фарміравання мяшчанскага саслоўя.

Феадальна залежнае насельніцтва, якое жыло ў горадзе на землях свецкіх і царкоўных феадалаў і ўхілялася ад шэрага гарадскіх і дзяржаўных пабораў, выконвала розныя павіннасці (натуральныя, грашовыя, адпрацовачныя) на карысць сваіх паноў. Гэта было адным

з яркіх праяўленняў залежнасці беларускага сярэдневяковага горада ад феадала і разам з тым сведчыла, што феадал па-свойму заказваўся зацікаўленым у развіцці гарадоў як цэнтраў вытворчасці і абмену.

З першай чвэрці XIV стагоддзя Мінск разам з Мінскай зямлёй заказаўся ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Адзін з наўгародскіх летапісаў паведамляе, што ў 1326 годзе прыязджалі ў Ноўгарад паслы з Літвы, у іх ліку быў мінскі князь Васіль, напэўна, як васал («падручнік») Гедыміна. У другой палове XIV стагоддзя ў Мінску правілі сваякі вялікага князя літоўскага, якія змянілі тут князёў мясцовай дынастыі. Так, Ягайла ў 1387 годзе аддаў «город Менск... со всеми людьми и с землею и со всякою пошлиною и с доходом и князи служебные» (г. зн. разам з дробнымі князямі-васаламі) свайму брату Скіргайле. У 1392 годзе Мінск разам з іншымі ўладаннямі перайшоў у рукі Вітаўта.

Пазней, з другой паловы XV стагоддзя, у Мінску правяць прадстаўнікі вялікіх князёў, так званыя намеснікі-дзяржаўцы. Вядома, што ў 1473 годзе Мінскам і паветам правіў князь Іван Заслаўскі. Ён у актах называўся «намеснікам менскім». Яго пераемнікам быў князь Іван Красны з друцкіх князёў. Пры вялікім князю Аляксандру Мінскам спачатку правіў пан Мікалай Ільініч, а потым князь Багдан Заслаўскі (да 1525 года).

Намеснікі-дзяржаўцы выконвалі адміністрацыйна-гаспадарчыя функцыі не толькі ў горадзе і замку, але і ва ўсіх маёнтках і дварах вялікага князя, размешчаных у Мінскім павеце; яны, у прыватнасці, збіралі дзяржаўныя падаткі, гандлёвыя пошліны, ажыццяўлялі суд і г. д. Апрача таго, намеснікі-дзяржаўцы былі военачальнікамі мясцовых узброеных сіл. Такім чынам, яны з'яўляліся паўнапраўнымі правіцелямі горада і павета.

Па меры росту Мінска як гандлёва-рамеснага цэнтра гарадская абшчына імкнулася стварыць сваю асобную ад павета або воласці сістэму кіравання і судова-адміністрацыйную ўладу. Горад імкнецца атрымаць **самакіраванне**. Сістэма гарадскога самакіравання, яе органы ўлады і суда, правы і абавязкі гараджан рэгламентаваліся ў той час нормамі так званага магдэбургскага права. Сутнасцю гэтага права з'яўлялася вызваленне гараджан ад падсуднасці і ўлады вялікакняжацкіх чыноўнікаў-намеснікаў, староста, ваявод і самаўпраўства мясцовых феадалаў.

У 1499 годзе (14 сакавіка) Мінск атрымоўвае самакіраванне па магдэбургскаму праву. У каралеўскай грамаце для жыхароў быў дадзен шэраг прывілеяў, асабліва ў гандлі, вызначаны даходы гарадской абшчыны, рэгламентаваны падаткі і павіннасці, якія патрабаваліся ад гараджан на карысць дзяржавы. Гораду падаравалі дадатко-

ва землі «ку осаженью и размноженью людей»: было пацверджана права гараджан карыстацца лесам у межах трох міль навокал горада, а таксама навакольнымі пашамі. Горад атрымаў дазвол пабудаваць лазню і гарадскі млын, які так і не быў пабудаваны на працягу ўсяго XVI стагоддзя з-за недахопу сродкаў.

Каралеўскім прывілеем абвяшчалася стварэнне ў Мінску сваіх, незалежных ад намеснікаў, органаў кіравання і суда; усе жыхары перадаваліся пад юрысдыкцыю органа гарадской улады, які ствараўся,— м а г і с т р а т а і абавязаны былі судзіцца толькі па нормах магдэбургскага права. Гараджане атрымалі дазвол пабудаваць дом ратушы для размяшчэння магістрата.

Кіраванне горадам ажыццяўлялася радай, якая складалася ў Мінску з 12 чалавек (радцаў). На чале яе знаходзіліся два бурмістры, якія выбіраліся з ліку радцаў. Рада з бурмістрамі і называлася магістратам. Магістрат выконваў судовыя і паліцэйскія функцыі, сачыў за гандлем, правільнасцю меры і вагі, збіраў падаткі і г. д. Членамі гарадскога магістрата былі, як правіла, прадстаўнікі багатай і ўплывовай групы мяшчанства. Рада абараняла і адстойвала інтарэсы эксплуататарскіх вярхоў горада.

Апрача рады, у горадзе ўстанаўлівалася пасада в о й т а. Войты не выбіраліся гараджанамі, а назначаліся вялікім князем з багатых шляхціцаў. Войтаўства нярэдка даравалася каралём пажыццёва, а часам нават з правам перадачы па спадчыне. Так, у 1503 годзе пасаду мінскага войта атрымаў Іван Новакрэшчаны на такіх умовах: «Войтовство минское... держати... вечно и непорушно ему самому и его жоне и их детям и его ближним и напотом будучим их шчадком». І далей у гэтай каралеўскай грамаце сказана, што мінскі войт Іван Новакрэшчаны паводле свайго меркавання можа войтаўства падараваць або прадаць. Войтаўства было самай даходнай гарадской пасадай: згодна з каралеўскай граматай 1499 года, мінскаму войту ішла трэцяя частка ўсіх судовых збораў у горадзе, ён меў права карыстацца даходамі з дзвюх мясных лавак і дзвюх корчмаў «вольных». У далейшым, як сведчаць дакументы, даходы яшчэ больш павялічыліся за кошт даходаў магістрацкіх. З дакумента 1503 года відаць, што на карысць войта кароль аддаў даходы ад гарадской васкабойні і «напіцы».

Паўнамоцтвы войта былі вельмі шырокімі, асабліва ў судавым стве. Ён разам з «лаўнікамі» разглядаў галоўным чынам крымінальныя справы. Войт фактычна стаяў на чале ўсіх іншых органаў гарадскога кіравання. Пакінуўшы за сабой права назначэння войта кароль тым самым даў беларускім гарадам вельмі абмежаванае права на самакіраванне. Але і ў такім стане яно адыграла сваю станоўчую ролю ў жыцці гарадоў.

Стварэнне гарадскога самакіравання паводле магдэбургскага права ўсё ж забяспечвала пэўныя юрыдычныя гарантыі эканамічнай дзейнасці і ўласнасці гараджан, а гэта садзейнічала фарміраванню гарадскога саслоўя, характэрнага для развітага феадальнага грамадства. Аднак рэалізаваць свае правы і толькі што атрыманыя прывілеі гараджанам Мінска было нялёгка. Намеснік і ўплывовыя феадалы, якія жылі ў горадзе, не хацелі ўступаць сваіх пазіцый. Грамадска-палітычныя адносіны ў горадзе сталі абвастрацца.

Перш за ўсё пачалася барацьба за падданых і, значыць, за плацельшчыкаў падаткаў і подацей. Справа ў тым, што граматай караля ад 14 сакавіка 1499 года не зусім дакладна вызначаны групы і катэгорыі гарадскога насельніцтва, на якія павінна распаўсюджвацца ўлада магістрата. У адрозненне, напрыклад, ад граматы на магдэбургскае права Полацку (1498 год), у якой пералічаны ўсе катэгорыі насельніцтва горада і прыгарадаў, што пераходзілі пад юрысдыкцыю магістрата (у тым ліку названы падданыя царкоўных і свецкіх феадалаў), у мінскай грамаце маюцца толькі агульныя ўказанні. У ёй сказана, каб «вси в том... месте Менском мешкаючии на котором-колвек местцу» падпарадкоўваліся магістрату і судзіліся паводле магдэбургскага права. Магістрат быў зацікаўлен у падпарадкоўванні ўсяго насельніцтва горада. Намеснік таксама імкнуўся захаваць пад сваёй уладай як мага больш жыхароў, асабліва ў раёне замка і каля яго. Землеўладальнікі, якія жылі ў горадзе, у прыватнасці царкоўныя феадалы, таксама не збіраліся выпускаць з рук сваіх гарадскіх падданых.

Не прайшло і паўгода пасля атрымання Мінскам самакіравання, як адносіны паміж магістратам і намеснікам настолькі абвастрыліся, што патрабавалася ўмяшанне караля. Са скаргі намесніка Багдана Заслаўскага каралю ў жніўні 1499 года відаць, што мінская рада падпарадкавала сваёй уладзе падданых замка, г. зн. людзей, якія «мешкають под присудом гродским», у тым ліку ўсіх былых замкавых рамеснікаў. З такім становішчам намеснік не мог пагадзіцца. Кароль стаў на бок намесніка: ён загадаў перадаць 15 двароў рамеснікаў «пад прысуд» замка і дазволіў гараджанам, якія пажадаюць, перайсці з гарадской юрысдыкцыі ў замкавую, г. зн. пад уладу намеснікаў. Захавалі сваіх падданых у горадзе і ўладу над імі таксама царкоўныя феадалы (мітрапаліт, архімандрыты, віленскі епіскап) і буйныя свецкія землеўладальнікі. Так пачалі фарміравацца ў Мінску прыватнаўласніцкія юрыдыкі — тэрыторыі, якія не падлягалі юрысдыкцыі гарадскога магістрата. У межах той або іншай юрыдыкі судовая і адміністрацыйная ўлада знаходзілася ў руках яе ўладальніка (так было, напрыклад, на юрыдыках мітрапаліта, ва ўласнасці якога знаходзіўся Вазнясенскі манастыр).

З той жа скаргі вядома, што мяшчане (магістрат) дамагаліся адхіліць намесніка ад удзелу ў судовым разборы, пазбавілі яго судовых пошлін і некаторых іншых даходаў; адмовіліся ад выконвання павіннасцей па рамонту замкавага млына і не згаджаліся «греблю сыпати». Кароль і тут падтрымаў прэтэнзіі і патрабаванні намесніка. Больш таго, ён загадаў гараджанам і магістрату пад пагрозай вялікага штрафу выконваць усе распараджэнні намесніка: «Ажбы наместника нашого послушны были, как и самих нас». Такім чынам, вярхоўная ўлада адной рукой даравала гораду розныя прывілеі і вольнасці, а другой — забірала іх або абмяжоўвала і скарачала.

Мяшчанам Мінска, як і іншых гарадоў Беларусі, што не знайшлі цвёрдай падтрымкі з боку вялікага князя (караля), вельмі цяжка было ажыццяўляць сваё права на самакіраванне і іншыя прывілеі. У пачатку XVI стагоддзя існавала рэальная пагроза ліквідацыі самакіравання ў Мінску. У адной з каралеўскіх грамат (сакавік 1503 года), у якой перадавалася мінскае войтаўства смаленскаму мытніку, ёсць такія словы: «А естли быхмо право майдборское в месте Менском зламали...» І далей гутарка ідзе аб тым, што кароль і ў такім выпадку гарантуе войту належныя яму даходы і г. д. Значыць, такая небяспека мела месца ў сапраўднасці.

Умацаваўшы з дапамогай вярхоўнай улады сваё становішча, мінскі намеснік пачаў наступ на мяшчан. Ён бесцырымонна ўмешваўся ў гарадскія справы, чыніў суд і расправу, патрабаваў празмерныя подаці. У 1509 годзе мінскія мяшчане падалі вялікаму князю скаргу на намесніка, таго ж Багдана Заслаўскага. Яны пісалі, што намеснік, не звяртаючы ўвагі на магдэбургскае права, «нас судить и рядить... теж с свадеб носатки береть и куницы... и иные многии кривды и новины нам делаеть безвинне, кони и иные многии речи в нас грабить через право нашо». Не адставалі ад намесніка і іншыя феадалы. Напрыклад, пан Леў Тышкевіч не пускаў мяшчан у лес, забараняў браць дровы ў лесе, рабаваў і збіваў гараджан.

Такім чынам, станаўленне гарадскога самакіравання, фарміраванне гарадскога саслоўя ў Мінску, як і ў іншых гарадах Беларусі, праходзіла ў вельмі цяжкіх і складаных умовах. Панаванне феадальных адносін, самавольства з боку намеснікаў і буйных землеўладальнікаў, наяўнасць у самім горадзе феадальных уладанняў тармазілі эканамічнае і палітычнае развіццё Мінска, абвастралі грамадска-палітычныя адносіны і барацьбу ў горадзе.

РАЗДЗЕЛ III

МІНСК У ПЕРЫЯД РАЗВІТАГА ФЕАДАЛІЗМУ

1. Рамесная вытворчасць і гандаль



айбольш значна феадальны Мінск развіваўся ў XVI — першай палове XVII стагоддзя. Гэтаму садзейнічаў шэраг акалічнасцей. К пачатку XVI стагоддзя гандлёвы шлях, які злучаў Расію і Польшчу, стаў адным з самых важных і ажыўленых у Вялікім княстве Літоўскім. Ключавое размяшчэнне Мінска на гэтай галоўнай гандлёвай артэрыі садзейнічала росту горада.

Спрыяльна адбілася на развіцці Мінска і яго сувязь з Дняпроўскай воднай сістэмай, па якой вёўся ажыўлены гандаль з гарадамі Украіны. Немалое значэнне мела і адміністрацыйнае становішча горада. К сярэдзіне XVI стагоддзя Мінск стаў цэнтрам вялікага ваяводства, якое ўключала прыкладна чацвёртую частку тэрыторыі Беларусі; на ёй знаходзілася да 60 гарадоў і мястэчак. З 1581 года ў Мінску кожны год на працягу некалькіх тыдняў засядала вышэйшая судовая ўстанова ў Вялікім княстве Літоўскім — Галоўны літоўскі трыбунал; на гэтыя пасяджэнні з'язджаліся феадалы. Мнагалюдны горад заўсёды меў патрэбу ў разнастайных відах тавараў, рамесных вырабаў.

Вядомыя даныя другой паловы XVI і першай паловы XVII стагоддзя сведчаць аб тым, што ў горадзе было больш за 60 відаў рамяства. Вытворчасцю вырабаў з металу былі заняты рамеснікі 16 прафесій: гаплічнікі (выраблялі кручкі і засцежкі для адзення), кацельшчыкі, кавалі, латуншчыкі, майстры па адліву з бронзы (людвісары), меднікі, мечнікі, нажоўшчыкі, алавянікі, збройнікі, пушкары, пабрайцары (выраблялі шпоры, страмёны, цуглі), шабельнікі, слесары, майстры гадзіннікаў,

ювеліры. Апрацоўвалі тканіну і шылі адзенне магерачнікі (магерка — род шапкі), пазументшчыкі, краўцы, пастрыгачы (пастрыгалі сукно), ткачы, панчошнікі, шапавалы, шапачнікі.

Прадукты харчавання і вінаробства пастаўлялі майстры васьмі прафесій: браварнікі, медавары, млынары, мяснікі, пекары, півавары, пірожнікі, саладоўнікі.

Дрэваапрацоўчая вытворчасць налічвала сем прафесій: бондары, карэтнікі, калёснікі, пільшчыкі, цесляры, сталяры, токары. Вытворчасцю скур і вырабам футраў займаліся рамеснікі сямі прафесій: баўтушнікі, дубільшчыкі, замшанікі, кажамякі, футраўнікі, кушняры, сырамятнікі. Вырабы са скур выконвалі башмачнікі, партупейшчыкі, раменшчыкі, шаўцы, саф'яннікі, сёдзельнікі, чахольшчыкі, рымары. Ганчары, каменшчыкі, цагельшчыкі, шкляры вялі апрацоўку мінеральнай сыравіны.

Да іншых прафесій, частку якіх толькі ўмоўна можна залічыць да рамяства, адносіліся адвакаты, аптэкары, лазеншчыкі, васкабойнікі, салатопы, скамарохі, настаўнікі, цырульнікі.

Многія прафесіі патрабавалі не толькі працяглай практыкі, але і тэхнічных ведаў, мастацкага густу. Напрыклад, майстар-каменшчык павінен быў валодаць ведамі архітэктара і, перш чым прыступіць да работы, умець скласці чарцёж. Кацельшчык, вырабляючы медныя катлы, так гладка паяў шоў, што нават, праводзячы пазногцем, нельга было яго выявіць.

Складанай, мудрагелістай канструкцыяй вызначаліся замкі слесара, а калі мінскі майстар рабіў меч, ён вараніў яго, шліфаваў да люстранога бляску, пакрываў інкрустацыяй ручку, гравіраваў на ёй герб горада. Такі выраб уяўляў сабой сапраўдны твор мастацтва, які вызначаўся трываласцю, строгай сіметрыяй ліній, прыгажосцю аздаблення.

Адметнай асаблівасцю гарадскога рамяства ў XVI стагоддзі стаў выраб майстрам кожнай прафесіі невялікага ліку прадметаў. Рамесніка-універсала замяняў майстар параўнальна вузкай спецыяльнасці. Такая важная змена была выклікана працэсам дыферэнцыяцыі рамеснай вытворчасці, раздрабленнем адной прафесіі на шэраг больш вузкіх. Асабліва глыбока дыферэнцыяцыя праявілася ў металічнай і гарбарнай вытворчасці, дзе к сярэдзіне XVII стагоддзя з прафесіі каваля і гарбара выдзелілася 15—20 спецыяльнасцей. У той або іншай ступені гэты працэс закрануў усе без выключэння прафесіі. Напрыклад, раней была толькі прафесія шаўца. Пазней ужо з'яўляюцца шаўцы і башмачнікі. У сваю чаргу шаўцы ў Мінску падзяляліся на майстроў чорнага абутку і так званага «влоскага» («італьянскага»), які прадназначаўся для шляхты. Склаўся і больш дробны падзел сярод шапачнікаў. Адны з іх шылі толькі з сукна,

другія — з дарагой тканіны. Сярод краўцоў адны шылі адзенне з сукна, другія — з шоўку, аксаміту, трэція спецыялізаваліся на пашыве верхняга адзення і г. д.

У дыферэнцыяцыі рамяства выразна выступаў агульны рост вытворчых сіл, паглыбленне грамадскага падзелу працы, развіццё таварнай вытворчасці і абмену. У Мінску гэтыя праяўленні эканамічнага прагрэсу выступалі больш прыкметна, чым у іншых гарадах Беларусі.

Рамеснікі Мінска былі аб'яднаны ў карпарацыі — цэхі. «Неабходнасць аб'яднання супраць аб'яднанага драпежнага дваранства, патрэбнасць у агульных рыначных памяшканнях у перыяд, калі прамысловец быў адначасова і купцом, рост канкурэнцыі з боку збеглых прыгонных, якія сцякаліся ў расквітнеўшыя тады гарады, феадальная структура ўсёй краіны — усё гэта парадзіла цэхі...» [1]

Першае ўпамінанне аб арганізацыі цэхаў у Мінску адносіцца да 1552 года. У каралеўскай грамаце Мінску гаварылася: «Теж войт и бурмистры места нашего тамошнего, на каждое ремесло старост обравши, установити мають, абы кождый в месте тамошнем мешкаючий, от сего часу всякое ремесло в цех уписавшисе робил, а хто бы смел ремесло робити и его вживати не вписавшися в цех, такого ремесло от войта и бурмистра на ратуш забирано быти маеть». З гэтага прадпісання відаць, што раней у Мінску рамесных цэхаў не было, прычынай чаго магла быць параўнальна невялікая колькасць рамеснікаў.

На працягу першай паловы XVI стагоддзя канцэнтрацыя рамёстваў, колькасць рамеснікаў у горадзе настолькі ўзраслі, што арганізацыя цэхаў стала магчымай. У 1591 годзе ўжо існаваў цэх металістаў, які аб'ядноўваў кавалёў, слесараў, мечнікаў, збройнікаў, нажоўшчыкаў, пабрайцараў, майстроў гадзіннікаў, ювеліраў. У 1592 годзе ўзнік цэх краўцоў, у які пазней увайшлі пазументшчыкі, раменшчыкі, капялюшнікі мужчынскія, капялюшнікі жаночыя, якія не мелі свайго цэха. У тым жа годзе ювеліры выдзеліліся з цэха металістаў і заснавалі свой цэх. У 1609 годзе ў цэх аб'ядналіся шаўцы чатырох спецыяльнасцей: майстры чорнага абутку, гусарскага, влоскага, саф'яннікі. У 1622 годзе свой цэх заснавалі рымары, сёдзельнікі, партупейшчыкі, чахольшчыкі. У 1635 годзе лекары горада стварылі цэх цырульнікаў, а ў наступным годзе ў цэх аб'ядналіся ганчары, каменшчыкі і цесляры. Цэх кушняроў, капялюшнікаў, магерачнікаў і баўтушнікаў узнік у 1647 годзе.

Як і ў гарадах феадальнай Еўропы, у цэхах Мінска сістэма правіл рэгламентавала вытворчасць і продаж вырабаў, прыём новых чле-

[1] К. Маркс, Ф. Энгельс. Соч., т. 3, стр. 23.

наў, вучняў і падмайстраў, навучанне і пераход у падмайстры, адносіны паміж майстрам, падмайстрам і вучнем. Статуты мінскіх цэхаў значна адрозніваліся ад нямецкіх і французскіх XIII—XIV стагоддзяў або польскіх цэхаў XIV—XV стагоддзяў. У гэтым адлюстраваліся перш за ўсё тыя канкрэтныя ўмовы, у якіх апынулася рамяство беларускіх гарадоў другой паловы XVI — першай паловы XVII стагоддзя. Цэхі засталі тут значную дыферэнцыяцыю прафесій, якая абазначала, што гарадское рамяство ўжо цесна звязана з рынкам і ўяўляла сабой развітую таварную вытворчасць. Юрыдычнае становішча гарадскіх рамеснікаў было неаднолькавым. Значную частку рамеснікаў складалі падданыя феадалаў, манастыроў, паселеныя ў дамах і на гарадскіх участках, якія належалі іх панам. Напрыклад, у інвентарным вопісу мінскага Вазнясенскага манастыра за 1579 год пералічваюцца «мяшчане таго манастыра»: у спіску 33 прозвішчы, сярод іх 7 кажамякаў, 2 цесляры, шапавал, пірожнік, башмачнік, скамарох. У другой грамаце за 1586 год гаворыцца, што ў Мінску «князи, паное и земляне... духовного и светского стану з давних часов набывши пляцов, подданных своих там осадили, которые в месте мешкаючи, торгов, ремесла, гандлев и вшеляких пожитков местских поспол с подданными нашими мещаны меньскими ужывают...»

Юрыдычна гэта частка гараджан не падпарадкоўвалася гарадскому самакіраванню, што ўскладняла кантроль цэхаў над рамяством горада. Тымі ж рысамі, што і ў Мінску, вызначалася рамяство і становішча рамеснікаў сталіцы Вялікага княства Літоўскага — Вільні. Мінск і Вільню цесна звязваў і гандаль. Гэтым, відаць, і тлумачыцца імкненне мінскіх майстроў будаваць статуты сваіх карпарацый па ўзору статута віленскіх цэхаў. Прамыя ўказанні на статуты Вільні як узор і крыніцы маюцца ва ўсіх статутах мінскіх цэхаў. Аднак, запазычваючы шэраг асобных норм і правіл, мінскія рамеснікі будуюць свае арганізацыі ў адпаведнасці з умовамі, якія склаліся ва ўласным горадзе.

Падзел гарадскога насельніцтва па розных юрысдыкцыях вымушаў майстроў, якія засноўвалі цэх, звяртацца да вярхоўнай улады, каб зацвердзіць статут цэха. Аднаго дазволу гарадскіх улад было недастаткова, каб зрабіць статут абавязковым для ўсіх рамеснікаў горада. Дамагаючыся прымусовага членства, статуты мінскіх цэхаў не маглі стаць на шлях абмежавання прыёму ў члены цэха, бо яны не мелі права рэгуляваць прыток у горад новых рамеснікаў.

Галоўным у статутах мінскіх цэхаў было патрабаванне дыхтоўнасці рамесніцкіх вырабаў. Але выражана яно не ў скрупулёзнай рэгламентацыі тэхналогіі вытворчасці, як гэта часта сустракаецца ў статутах заходнееўрапейскіх цэхаў XIII—XIV стагоддзяў, а ў агульным патрабаванні, каб вырабы выконваліся з дыхтоўнай сыравіны

і мелі добрую якасць. Відавочна, вытворчыя традыцыі, якія трывала ўсталяваліся, рабілі залішнімі больш падрабязныя прадпісанні. Каб процідзейнічаць канкурэнцыі сярод майстроў, статуты мінскіх цэхаў забаранялі ім выпускаць вырабы не сваёй спецыяльнасці, пераваблівать адзін у другога падмайстраў, перахопліваць заказчыкаў. Статуты ж заходнееўрапейскіх цэхаў, каб не дапусціць гэтага, рэгламентавалі яшчэ і аб'ём вытворчасці, што служыла найбольш выразным доказам вузкасці рынку і абмежаванасці збытавых магчымасцей гарадскіх рамеснікаў. Такая рэгламентацыя ў статутах мінскіх цэхаў, як і іншых гарадоў Беларусі, сустракаецца вельмі рэдка. Толькі ў металістаў Мінска кожнаму майстру прадпісвалася мець адзін варштат і адну краму, а статут ганчароў, каменшчыкаў і цесляроў дазваляў майстру браць адначасова не больш двух заказаў.

У статутах прадугледжвалася, каб у гарадскога майстра не было на гарадскім рынку знешняга канкурэнта. Цэхі Мінска катэгарычна забаранялі іншагароднім і сельскім рамеснікам, купецтву пад пагрозай канфіскацыі тавару выпускаць на гарадскі рынак вырабы, якія выпускалі і мінскія майстры. Выключэнне рабілася для кірмашовых дзён, але нават і тады цэхі ганчароў і рымароў патрабавалі, каб той, хто прывёз вырабы, якія выпускаюць і мінскія майстры, прадаваў іх «па сходнай цане» членам цэха, а не непасрэдна пакупніку.

Важнейшым момантам у рэгламентацыі вытворчасці былі нормы ліку падмайстраў і вучняў. Маркс адзначаў, што «цэхавыя законы, строга абмяжоўваючы лік падмайстраў, якім меў права даваць работу адзін майстар, тым самым планамерна перашкаджалі ператварэнню яго ў капіталіста» [1]. Усе статуты цэхаў Мінска змяшчаюць артыкулы аб ліку падмайстраў і вучняў, які можа мець майстар. Менш за ўсё вучняў было ў ганчароў і мечнікаў — па адным на майстра, больш за ўсё ў кавалёў, кацельшчыкаў і слесараў — па тры-чатыры. Майстрам большасці прафесій статуты дазвалялі трымаць па два вучні.

Больш аднастайнай была норма ліку падмайстраў. Апрача ганчароў, якім статут дазваляў трымаць па аднаму падмайстру, майстрам астатніх прафесій статуты прадпісвалі мець па два падмайстры. Гэта абумоўлівалася магчымасцямі збыту вырабаў таго або іншага рамяства, попытам на рынку і тым, якое месца ў дзейнасці майстра займала работа на заказ.

Тут статут найбольш выразна адлюстроўвае характэрную асаблівасць рамеснай вытворчасці ў феадальную эпоху, адзначаную Марксам. «Непасрэднай галоўнай мэтай гэтай вытворчасці,— пісаў Маркс,— з'яўляецца забеспячэнне існавання рамесніка, рамеснага

[1] К. Маркс. Капитал, т. I, 1963, стр. 371.

майстра... Вытворчасць таму ўсюды падпарадкавана спажыванню, на якое яна загадзя разлічвае, прапанаванне падпарадкавана попыту і таму вытворчасць пашыраецца толькі паволі» [1].

Уяўляючы сабой дробнатаварную вытворчасць, гарадское рамяство паступова ўсё больш прыходзіла ў супярэчнасць з натуральнай прыродай феадальнага маёнтка і сялянскай гаспадаркі, якія абмяжоўвалі ўнутраны рынак, унутраны абмен. На працягу XVI — першай паловы XVII стагоддзя горад парушыў былую замкнёнасць сельскай гаспадаркі, уцягнуў яе ў абмен, але стыхія таварнай вытворчасці гарадскога рамяства не магла яшчэ падарваць асновы натуральнай гаспадаркі вёскі. Залежнае ад попыту рамяство непазбежна павінна было стаць аб'ектам рэгламентацыі, таму што попыт заставаўся вельмі абмежаваным.

Перавага ў эканоміцы краіны натуральнай гаспадаркі асноўнай масы сялянства вельмі тармазіла пашырэнне попыту на вырабы гарадскога таваравытворцы і параджала ў ім імкненне ахаваць сябе ад канкурэнцыі, зацвердзіць манапольнае права цэхавага майстра на продаж сваіх вырабаў непасрэдна спажыўцу. Гэтым абумоўлена варожасць цэхаў да купца-скупшчыка, да майстра-скупшчыка. Статут цэха металістаў забараняў кавалю здаваць вырабы на продаж купцу або гандляру, а статут цэха шаўцоў — скупляць у сваіх калег па цэху абутак і потым прадаваць яго на рынку. Кавалям і шаўцам забаранялася выконваць заказы купцоў, калі яны збіраліся прадаваць гэтыя вырабы ў Мінску.

Цікава, што іншыя цэхі не маюць такіх прадпісанняў. Праўда, статут цэха шаўцоў рэгулюе адносіны да купца-скупшчыка больш гібка, чым статут кавалёў: ён дазваляе выконваць заказ купца з яго сыравіны пры ўмове, што закупленую партыю абутку купец будзе прадаваць за межамі Мінска.

Забарона сувязі са скупшчыкам большасцю цэхаў іншых буйных гарадоў не выконвалася, а ў шэрага цэхаў Магілёва работа на скупшчыка-купца нават заахвочвалася. Гэта акалічнасць сімптаматычна для другой паловы XVI — першай паловы XVII стагоддзя, калі таварная вытворчасць у шэрага прафесій пераступіла рамкі гарадскога рынку. Купцы рабілі закупкі мясцовых вырабаў для продажу іх у гарадах Польшчы, Украіны, Расіі, Прыбалтыкі.

З некаторых норм цэхавых статутаў відаць, што ў гэты перыяд зараджаліся эканамічныя формы, якія не ўкладваліся ўжо ў тыпова феадальныя рамкі рамеснай вытворчасці гарадоў. Так, цэх ганчароў забараняў падмайстрам працаваць у пазацэхавага майстра або разам

[1] Из неопубликованных рукописей К. Маркса. «Пролетарская революция», 1939, № 3, стр. 184.

з вучнем дзесьці на баку; статут металістаў патрабаваў, каб майстар не даручаў іншаму майстру, не члену цэха, або падмайстру работу за трэцюю частку заработку. Гэту забарону можна разглядаць як спробу супрацьдзейнічаць учынкам, якія дастаткова часта практыкаваліся майстрамі і былі несумяшчальнымі з цэхавымі патрабаваннямі. Іх эканамічны сэнс не выклікае сумненняў: майстар карыстаецца наёмнай працай, цэхавыя нарматывы аплаты працы ў выглядзе цвёрдай стаўкі ён замяняе здзельнай аплатай ($^1/_3$ заработку). Сам факт эксплуатацыі наёмнай працы пазацэхавых норм і правіл, імкненне замяніць пастаянную плату падмайстру больш стымулюючай формай заработку сведчылі аб глыбокіх змяненнях у гарадскім рамястве. Перш за ўсё ён прымушае думаць аб існаванні прыкметнай маёмаснай дыферэнцыяцыі ў асяроддзі майстроў. Між іншым, гэтаму садзейнічалі і самі статуты некаторых цэхаў. Так, у цэхах ганчароў і металістаў статут вызваляў цэхмістраў ад рэгулярнага пабору ў касу цэха. Аб тым, што сярод майстроў былі бедныя, гаворыць той жа статут ганчароў, абавязваючы дапамагаць ім з касы цэха.

Маёмасная дыферэнцыяцыя сярод майстроў садзейнічала ператварэнню аднаго з разбагацеўшых членаў цэха ў скупшчыка-пасрэдніка, які захапіў у свае рукі рэалізацыю вырабаў калег па рамяству і цэху. Намёк на гэтага роду з'явы відаць з судовай спрэчкі паміж мінскім і віленскім цэхамі рымароў, сёдзельнікаў і партупейшчыкаў.

У 1644 годзе віленскі цэх падаў скаргу магістрату на прывоз мінскімі майстрамі ў Вільню сваіх вырабаў. У скарзе адзначалася, што мінчане вядуць продаж праз «свою челядь, сыновей, учеников и приходней, которых они называют товарищами», а ў 1650 годзе такая ж скарга віленцаў адзначае ў гэтай ролі ўжо аднаго мінскага рымара Васіля Еўлашкевіча. Магчыма, за гэтыя гады функцыя пасрэдніка замацавалася за адным з майстроў цэха, а астатнія маглі апынуцца на становішчы скрытых наёмных работнікаў на пасрэдніка.

Відавочна, у рамястве Мінска і іншых беларускіх гарадоў у канцы XVI — першай палове XVII стагоддзя намеціліся элементы, якія сведчылі аб выспяванні ў нетрах дробнатаварнай вытворчасці першых прызнакаў капіталістычнай вытворчасці. Але іх роля ў эканоміцы рамяства яшчэ зусім нязначная, і цэхавая арганізацыя застаецца непахіснай асновай гарадскога рамяства. Яна вызначае і рэгулюе не толькі вытворчую дзейнасць майстроў, але і папаўненне іх асяроддзя за кошт зноў прыбыўшых падмайстраў, вучняў. Ва ўсіх статутах Мінска прадугледжана складаная працэдура прасоўвання па лесвіцы ўнутрыцэхавай іерархіі: вучань, падмайстар, майстар.

Тэрміны навучання былі рознымі. У ганчароў, напрыклад, вучні ва ўзросце ад шасці да дзесяці год навучаліся шэсць год, а старэй

дзесяці год — чатыры гады. Пры паступленні вучань плаціў уступны ўзнос — тры літоўскія грошы. У каменшчыкаў, цесляроў, слесараў, мечнікаў, рымароў, сёдзельнікаў, партупейшчыкаў тэрмін навучання быў чатыры гады, у ювеліраў, кушняроў, капялюшнікаў, гарбароў — пяць год. Большасць прафесій вызначала тэрмін вучобы тры гады. З шэрага даных па іншых гарадах можна заключыць, што цэхі значна завышалі тэрмін навучання. Каб асвоіць рамяство, дастаткова было паловы вызначанага тэрміну. Але вучань з'яўляўся таннай рабочай сілай — яму не выдавалася плата, ён атрымоўваў толькі ежу і жыллё ў майстра. Натуральна, што, эксплуатуючы вучня, які асвоіў рамяство, майстар з лішкам пакрываў усе затраты на яго.

Статуты цэхаў патрабавалі ад вучня беспярэчнага падпарадкавання майстру «яко пану своему». Аб уцёках вучняў паведамлялася ў іншыя гарады. Вернуты ўцякач бязлітасна караўся. Збіванне было звычайнай нормай адносін майстра да вучня.

Вучань, прайшоўшы ўсе выпрабаванні, далёка не адразу мог разлічваць на тое, каб стаць падмайстрам. У ганчароў, каменшчыкаў і цесляроў ён здаваў спецыяльны экзамен («подмастерский обычай»). Але заслужыць гэта права мог той, хто адпрацаваў у свайго майстра 12 тыдняў, у час якіх майстар плаціў яму «по своей воле». Выканаўшы і гэту ўмову, вучань станавіўся падмайстрам толькі прыняўшы гарадское права, г. зн. прынёсшы прысягу на вернасць гораду. Да прысягі звычайна дапускалі меўшага сваю «оседлость с плацем» у горадзе (уладальніка пляца і дома).

У цырульнікаў вучань, які закончыў вучобу, станавіўся першапачаткова паўпадмайстрам і толькі праз паўгода работы пераходзіў у падмайстры. Цэхі рымароў і кушняроў абавязвалі сваіх вучняў пасля заканчэння тэрміну вучобы адпраўляцца на вывучку ў іншыя гарады, г. зн. рабіць «вандроўку» (у рымароў на два гады, у кушняроў — на адзін год). Пасля вяртання, адпрацаваўшы ў свайго майстра год і прыняўшы гарадское права, вучань станавіўся падмайстрам.

Яшчэ больш складаным быў пераход падмайстраў у майстры. Усе цэхі патрабавалі ад падмайстра, які жадаў стаць майстрам, пэўнага тэрміну (ад аднаго да трох год) работы ў майстра, выпуску на працягу вызначанага статутам тэрміну некалькіх вырабаў свайго рамяства (гэта называлася «рабіць штуку»), выплаты пэўнай сумы ў касу цэха, частавання («коляцыя») майстроў цэха. Вялікай перашкодай для пераходу ў майстры з'яўляліся грашовы ўзнос і частаванне. Сума ўзносу была рознай. У шаўцоў яна складала амаль двухгадовую плату падмайстру. Яшчэ большым быў узнос у цэхах ювеліраў, ганчароў і цырульнікаў. Усе патрабаванні ў адносінах да падмайстраў традыцыйныя для цэхавай рэгламентацыі. Але развіццё таварнай вытвор-

часці і грашовых адносін зрабіла першы пералом: не ўсе рамёствы захавалі абавязковай умовай пераходу ў майстры выраб шэдэўра («штукі»). Кавалі і шаўцы, напрыклад, дазвалялі пры ўступленні ў цэх або пераходзе з падмайстраў у майстры замену шэдэўра грашовым узносам і частаваннем.

Складаная сістэма правіл ставіла вучня і падмайстра ў такое становішча, пры якім прасоўванне па лесвіцы ўнутрыцэхавай іерархіі натыкалася на неадольныя перашкоды. Бесперашкодным быў шлях толькі сыноў майстроў, а таксама падмайстраў, якія жаніліся з дочкамі майстроў або іх удовамі. Для іх статуты прадугледжвалі шэраг ільгот: скарачэнне тэрміну работы падмайстрам, вандроўкі, вызваленне ад вырабу шэдэўра, меншую суму ўступнага ўзносу. Такія абставіны ўнутры цэха непазбежна параджалі вострае нездавальненне, гатовае перарасці ў адкрыты канфлікт паміж майстрамі і эксплуатуемымі імі вучнямі і падмайстрамі. Невыпадкова ў статутах усіх цэхаў ёсць артыкулы, якія вызначалі кару за «взрушене покою» ў цэху, уцёкі ад майстроў, знявагу майстроў, сваркі на сходцы, непаслушэнства старшых.

Для назірання за ўсім жыццём цэха выбіраліся старшыя (цэхмістры). У аб'яднаных цэхах кожная прафесія выбірала аднаго-двух цэхмістраў, у больш буйных, спецыялізаваных — чатырох. У цэхавую старшыну яшчэ ўваходзілі зборшчыкі пабораў (сталовыя, шафары), ключнікі, якія захоўвалі ключы ад цэхавай касы, пісар. У гэты савет старшых цэха выбіралася група асоб (звычайна 12 чалавек) з ліку самых заможных, якая разам з цэхмістрамі складала «старшую брацію» і ажыццяўляла разбор скаргаў, іскаў, судзіла за парушэнне цэхавага статута. Судовыя справы цэхаў, як і магістрацкія кнігі Мінска за XVI — першую палову XVII стагоддзя, не захаваліся, і таму цяжка апісаць больш дэталёва характар узаемаадносін, але сам факт падрабязнага пераліку пакаранняў за замах на майстра, учыненне сварак, непаслушэнства прымушае думаць, што цэх не ведаў ні патрыярхальна-сямейнай ідыліі, адзінства старшых і малодшых, ні роўнасці і міру паміж майстрамі.

Супярэчнасці паміж майстрамі і падмайстрамі раздзялялі цэх на дзве арганізацыі. Артыкулы 6 і 14 статута цэха ганчароў гавораць аб існаванні ў падмайстраў сваёй арганізацыі з уласнай касай і ўзносамі. Аб гэтым жа гаворыць артыкул 24 статута цэха цырульнікаў, статут цэха металістаў. Арганізацыя падмайстраў ганчарнага цэха давала дазвол на пераход падмайстраў у майстры, прымала зноў прыбываўшых у Мінск падмайстраў і вызначала, у якога майстра яны будуць працаваць, раз у месяц збірала свае сходкі.

Нават у гэтых скупых паведамленнях праглядвае факт проціпастаўлення падмайстраў майстрам, пачатак яму неабходна шукаць

ва ўсім ходзе эканамічнага развіцця гарадскога рамяства, якое парадзіла сацыяльныя супярэчнасці і барацьбу паміж эксплуататарамі і эксплуатуемымі ўнутры цэха.

Тым не менш у гэты перыяд цэхавая карпарацыя ў цэлым адыгрывала станоўчую ролю. Яна ўносіла пэўную арганізацыю ў працэс вытворчасці, вызначала цвёрдую сістэму рамеснай вывучкі, якая садзейнічала падрыхтоўцы высокакваліфікаваных майстроў, строга сачыла за якасцю вырабаў. Цэхавая арганізацыя садзейнічала ператварэнню рамяства ў спадчынны занятак, які перадаваўся ад бацькі да сына, фарміруючы свайго роду дынастыі рамесных умельцаў, з якіх узніклі першыя кадры прафесійных рабочых капіталістычнай эпохі.

На працягу XVI стагоддзя ў Мінску ўзніклі таксама прамысловыя ўстановы: мукамольны млын на рацэ Пярэспе (прыток Свіслачы, які выцякаў з Камароўскага балота), два папяровыя млыны на рацэ Крупіцы, пастрыгальня сукна, тапільня і васкабойня, у якіх плавіўся і кляйміўся воск, прызначаны для продажу вялікімі партыямі.

Таварны характар рамяства садзейнічаў ператварэнню Мінска ў буйны гандлёвы горад. К канцу XVI — пачатку XVII стагоддзя ў горадзе былі тры рынкі: Ніжні (у раёне Нямігі), які прылягаў да старажытнага замка, Верхні (зараз плошча Свабоды), Троіцкі (цяпер там будынак тэатра оперы і балета). На кожным з іх былі рады, утвораныя крамамі і ларкамі гарадскіх рамеснікаў і купцоў. Крыніцы называюць ганчарны, хлебны, мясны, рыбны, крамны (купецкі), саляны рады. У сапраўднасці іх было намнога больш, таму што кожны цэх меў свае крамы.

На штотыднёвыя кірмашы, якія адбываліся ў Мінску па традыцыі ў сераду і пятніцу, прывозілі на продаж прадукты сельскай гаспадаркі сяляне, шляхта навакольных вёсак і аддаленых месц Мінскага ваяводства, з'язджаліся жыхары гарадоў і мястэчак. Крыніцы сведчаць аб ажыўленым гандлі, які атрымаў прыкметнае развіццё ў першай палове XVII стагоддзя. Так, у 1571 годзе па просьбе мяшчан гораду было дадзена права на два кірмашы, але з-за Лівонскай вайны яны не праводзіліся. У 1601 годзе сейм зноў пацвердзіў права Мінска на правядзенне кірмашу, якое горад таксама не выкарыстаў, відаць, з-за падзей, якія разгарнуліся ў Рускай дзяржаве. У 1633 годзе новае пацвярджанне права на два кірмашы было выдана гораду па просьбе «ўсяго рыцарства, шляхты, абываталяў ваяводства і мяшчан Мінска... для найбольш зручнага набыцця і куплі рэчаў рыцарамі, абываталямі ваяводства і іншых сумежных паветаў». Мінск, значыць, стаў гандлёвым цэнтрам значнай вобласці, якая ўключала не толькі ваяводства, але і сумежныя паветы. Рынкі горада сталі пашырацца, купецтва пачало будаваць на іх крамы, склады, ларкі. У 1646 годзе

магістрат вымушан быў умяшацца ў парадак забудовы на рынках па супрацьпажарных меркаваннях.

Гандаль ажыўляўся і ў дні пасяджэння ў горадзе Галоўнага літоўскага трыбунала, земскага і замкавага (гродскага) судоў. На гэты час прыезджым купцам, як у дні кірмашоў, дазваляўся рознічны продаж тканін, він і іншых прывазных тавараў.

У Мінск з'язджалася шмат купцоў. Тут спыняліся купцы Віцебска, Магілёва, Оршы, Шклова, Копысі і іншых гарадоў і мястэчак усходу Беларусі, якія выязджалі ў польскія і літоўскія гарады і вярталіся адтуль з таварамі. Шырокія гандлёвыя аперацыі вяло мінскае купецтва. У таможных кнігах Брэста, Гродна, Вільні, Віцебска, Коўна, Кракава другой паловы XVI і пачатку XVII стагоддзя запісаны прозвішчы больш 100 буйных мінскіх купцоў. Галоўнымі гарадамі, у якіх яны вялі гандаль, былі Люблін, Торунь, Гнезна, Кракаў, Вільня і Віцебск. Прычым купцы, якія вялі гандаль з Люблінам, не пашыралі сваёй дзейнасці на іншыя польскія гарады, звязаныя ж з Торунню і Гнезна не вялі гандлёвых аперацый у Любліне і Вільні, а купцы, якія гандлявалі ў Вільні, не ездзілі ў польскія гарады, няма там і купцоў, якія гандлявалі з Віцебскам. Гэта сведчыць аб тым, што ў купецкім гандлі склалася пэўная спецыялізацыя; яна відаць і ў структуры тых тавараў, якімі гандлявалі мінскія купцы ў розных гарадах. Напрыклад, сярод тавараў, якія прывозіліся з Любліна, пераважалі металы (жалеза, сталь, свінец, волава, медзь) і металічныя вырабы (нажы, косы, цвікі), гатовыя вырабы (шапкі, паясы, галантарэя), вострыя прыправы і фрукты. З Гнезна і Торуні купцы везлі тканіны і вострыя прыправы.

Істотна розніліся і вывазныя аперацыі купцоў Мінска. У партыях тавараў, прывезеных у Люблін, пераважалі футры, воск, хмель. Для Торуні і Гнезна галоўнымі таварамі былі казловыя шкура і скура, асабліва замша (цімца), юхт, дубляніна. Напрыклад, з 38 049 замшавых скур, вывезеных усімі купцамі Беларусі праз Гродна ў 1605 годзе, на долю мінскіх купцоў прыпадала 20 694 скуры. У Вільню мінскія купцы везлі жалеза, цвікі, бляху, паперу. У 1605 годзе яны прывезлі ў Вільню 30 408 шын жалеза, 756 000 цвікоў, больш 200 кілаграмаў бляхі. У іх партыях былі таксама нажы, косы, сталь, дрот, шкло і шкляныя вырабы.

З таварамі, прывезенымі з Любліна, Торуні, Гнезна, мінскія купцы адпраўляліся ў гарады і мястэчкі Беларусі. Яны гандлявалі ў Капылі, Лукомлі, Зембіне, Слоніме, Ражанах, Барысаве, Слуцку і інш. У першай палове XVII стагоддзя склаўся пастаянны гандлёвы кантакт паміж рознымі гарадамі Беларусі. Напрыклад, у сярэдзіне XVII стагоддзя шэсць купцоў Мінска і два кушняры мелі свае крамы, г. зн. вялі пастаянны гандаль у Слоніме і Ражанах; у Слоніме

мелі свае крамы тры купцы з Вільні і адзін з мястэчка Жыровіцы. Трываласць гандлёвых сувязей купцоў Мінска ўнутры краіны падцвярджаецца і крэдытнымі аперацыямі. У 1622 годзе мінскі купец даў крэдыт купцу з Капыля, у 1624 годзе другі купец-мінчанін меў даўжнікоў сярод купцоў Оршы, у 1639 годзе бурмістр і буйны купец Мінска пазычыў 60 коп у брэсцкага земскага суддзі і г. д. Гандлёвая дзейнасць купецтва Мінска і іншых гарадоў умацоўвала эканамічныя сувязі ўнутры краіны і садзейнічала кансалідацыі ўнутранага рынку.

Закупленыя ў польскіх гарадах тканіны, гатовыя вырабы купцы прадавалі не толькі ў гарадах Беларусі, але і везлі ў Смаленск, Вязьму, Тарапец і іншыя рускія гарады. Гандлёвая дзейнасць Мінска ў значнай меры залежала ад адносін, якія складаліся паміж Вялікім княствам Літоўскім і Рускай дзяржавай. Так, у пачатку XVI стагоддзя «яшчэ ў той час, як з загранiцы... маскоўскай купцы ездзілі», мінскае мыта давала казне штогадовы даход 400 коп, а ў перыяд вайны з Вялікім княствам Маскоўскім (1506—1514 гады) толькі па 56 коп у год. К пачатку Лівонскай вайны ў 1553 годзе збор мыта складаў 1500 коп, а за гады вайны скараціўся ўдвая — да 700 коп.

Развіццё гандлю садзейнічала пранікненню гандлёвага капіталу ў рамесную вытворчасць. У сярэдзіне XVII стагоддзя ўсталёўваецца купец-пасрэднік паміж мінскім рамеснікам і рынкам; у горадзе склалася група купцоў, якія вядуць гандаль вырабамі рымароў, сёдзельнікаў, раменшчыкаў і футравікоў. Цэх па сутнасці апынуўся ў іх поўным падпарадкаванні, і калі ён спрабаваў весці самастойна гандаль сваімі вырабамі, то купцы Рыгор Якаўлевіч, Улас Зяновіч, Іван Пабока і Пётр Самовіч патрабавалі ад магістрата забараніць цэху весці гандаль і каб майстры цэха здавалі свае вырабы для продажу купцам. Гандлёвы капітал зрабіў, відавочна, першы крок у падпарадкаванні рамяства, што было сур'ёзным зрухам у рамеснай вытворчасці.

Ператварэнне Мінска ў адзін з буйнейшых цэнтраў рамяства і гандлю Беларусі не ўнесла колькі-небудзь сур'ёзных змен у сельскагаспадарчыя заняткі гараджан. Яны раўніва абаранялі свае зямельныя ўчасткі, выганы, сенажаці, на якія пастаянна квапілася навакольная шляхта. Па запатрабаванню гараджан на працягу другой паловы XVI стагоддзя каралеўскія чыноўнікі тры разы праводзілі размежаванне зямельных уладанняў горада, аднаўляючы яго даўнейшае права на землі, захопленыя шляхтай. Бюджэт горада і дзяржаўныя падаткі з гараджан у значнай частцы складаліся з пабораў за ўчасткі, занятыя домам, крамай на рынку, за ворную зямлю, сенажаці, агароды. Сярод мяшчан былі ўладальнікі цэлых фальваркаў. Гэта былі купцы, багатыя рамеснікі з ліку кушняроў, ювеліраў,

металістаў і майстроў іншых прафесій. Ва ўмовах феадалізму горад поўнасцю захаваў уласцівыя яму ў тую эпоху аграрныя рысы, застаючыся паселішчам «напалову заселеным, напалову засеяным».

Ажыўленасць эканамічнага жыцця горада далёка не сведчыла аб дабрабыце ўсіх яго жыхароў. Дзяржаўная ўлада бесцырымонна эксплуатавала гараджан, за іх кошт яна выплачвала субсідыі феадалам, давала шчодрыя падарункі саюзнікам, адкуплялася ад моцнага суседа, трымала войска, вяла войны і расплачвалася за паражэнні. Сродкі на ўсё гэта здабываліся праз сістэму падаткаў, паборaў, прымусовых пазык. У поўнай меры гараджане ўяўлялі сабой падатковае саслоўе. Напрыклад, за кошт розных паборaў з Мінска кароль Казімір у 1486—1489 гадах выдаў феадалам 102 «даніны» на вельмі вялікую для таго часу суму — 680 коп, кароль Сігізмунд I за розныя месяцы 1506 і 1509 гадоў — 52 «даніны» на суму 357 коп.

Гандлёвай дзейнасці купецтва перашкаджалі пастаянныя войны, феадальнае самавольства. Войска бязлітасна рабавала гараджан. У 1571 годзе мяшчане Мінска скардзіліся каралю, што яны ад гетманаў, войска, каралеўскіх паслоў і чыноўнікаў «на маетность свою знищене немалое приняли». Рабунак і разбой на дарогах прынялі такія памеры, што мінскія купцы ў 1591 годзе заявілі каралю аб немагчымасці рабіць паездкі «на многие месца в панствах нашых в Коруне Полской и у Великом княстве Литовском».

Абставіны, якія склаліся ў гэты час, патрабавалі ад беларускага гараджаніна настойлівасці, мужнасці, прадпрымальнасці, каб адстаяць сябе і горад, сваё месца ў грамадстве.

2. Грамадска-палітычнае жыццё

Барацьба гараджан супраць засілля феадалаў была галоўнай рысай грамадска-палітычнага жыцця Мінска ў гэты перыяд. І хоць каралеўская грамата аб дачы самакіравання абвяшчала падпарадкаванне ўсіх жыхароў горада ўладзе гарадской рады, на справе ўсё было інакш. Побач з уладай рады існавала ўлада свецкіх і духоўных феадалаў. Яе асновай была ўласнасць феадалаў на гарадскія ўчасткі, дамы, двары ў горадзе. Гараджане, якія пражывалі на гэтых участках, нярэдка аказваліся прыватна падданымі іх уладальнікаў.

У эканоміцы горада прыватнаўласніцкія гараджане нічога не мянялі — рамесная вытворчасць і гарадскі рынак аб'ядноўвалі ўсіх у адну сацыяльна-эканамічную групу грамадства. Але юрыдычнае становішча гараджан, падпарадкаваных магістрату і феадалам, было

розным. Галоўнае адрозненне заключалася ў тым, што гараджане, на якіх не распаўсюджвалася адміністрацыйная і судовая ўлада гарадскога самакіравання, не плацілі падаткаў і пабораў у казну горада, не выконвалі павіннасцей па рамонту і ахове гарадской крэпасці, добраўпарадкаванню горада, забеспячэнню каралеўскіх паслоў і пасланцоў фурманкамі і прадуктамі, не прымалі на пастой войска і праезджых урадавых чыноўнікаў. У выніку бесперапыннага росту падаткаў абшчына гараджан несла груз празмерных цяжкасцей. Аслабіць яго можна было пашырыўшы юрысдыкцыю магістрата. Невыпадкова гэта імкненне складае пастаянную рысу ўсяго грамадска-палітычнага жыцця горада.

Гарадское самакіраванне павяло наступленне на ўладу прыватных уладальнікаў у горадзе. Але аб'ектам гэтай барацьбы быў выбран не сам уладальнік-феадал, а прыватнаўладальніцкі гараджанін. Супраць яго магістрат прымяняў рэпрэсіўныя меры: выганяў з рынку, прымушаў уносіць паборы, гандлёвыя пошліны, несці павіннасці, а за адмову знявольваў у турму. У гэтай барацьбе вярхоўная ўлада стала на бок феадалаў. Так, усе старанні магістрата прымусіць гараджан, падданых Вазнясенскага манастыра, падзяліць падатковыя цяжкасці і павіннасці з гарадской абшчынай нязменна адхіляліся каралеўскай уладай, якая, прыслухоўваючыся да скарг ігумена, пасылала грозныя граматы з забаронай магістрату ўмешвацца ў права манастыра. Амаль сто год — з 1522 па 1616 — працягвалася гэта барацьба, якая прывяла да паражэння магістрата і гарадской абшчыны. Каб неяк перашкодзіць росту ўласнасці і ўладзе феадалаў у горадзе, абшчына прыняла ў 1590 годзе наступнае рашэнне: калі хто-небудзь «з чужых або з шляхты купіць у Мінску дом і аседласць (г. зн. нерухомасць. — З. К.), якія знаходзяцца пад юрысдыкцыяй ратушы, такі перш за ўсё прынясе прысягу». А калі хто-небудзь з гарадской рады або гараджан «асмеліцца з дамамі і аседласцямі і з усім скарбам сваім, рухомым і нерухомым, розным панам закладваць і, карыстаючыся гэтым, адмовіцца падпарадкавацца гораду і несці павіннасці, выходзячы з юрысдыкцыі горада, у такога, будзь ён з рады або просты чалавек, будзе адабрана ўся яго маёмасць, а сам ён будзе пакараны згодна з законам».

Але і гэта мера не дапамагла. На працягу XVI — першай паловы XVII стагоддзя буйнейшымі ўладальнікамі дамоў, зямельных участкаў у Мінску сталі магнаты Глебавічы, Сапегі, Радзівілы, Крошынскія, Адзінцовічы, Друцкія-Горскія, Слушкі, Саламарэцкія і інш. Каралеўская ўлада, карыстаючыся правам перадачы маёмасці гараджан, якая засталася без нашчадкаў, садзейнічала росту ўласнасці і ўлады феадалаў у горадзе. У 1610, 1622, 1623, 1625, 1651 гадах па кадуковаму праву была перадана феадалам маёмасць шэрага

гараджан Мінска. Пры прамым садзейнічанні феадалаў і вярхоўнай улады ў горадзе расла ўласнасць царквы.

Пацярпеўшы паражэнне ў сацыяльна-юрыдычнай сферы, гарадская абшчына перанесла ажыццяўленне свайго імкнення да кансалідацыі гарадскога насельніцтва ў сферу вытворча-эканамічную. Растучым юрыдыкам феадалаў яна супрацьпаставіла стварэнне цэхаў. Санкцыяніраваныя вярхоўнай уладай і непасрэдна падпарадкаваныя магістрату горада цэхі з іх прынцыпам абавязковага членства незалежна ад юрыдычнай падпарадкаванасці рамесніка ў пэўнай ступені аслаблялі ўплыў феадалаў на ўнутрыгарадское жыццё. Таму невыпадкова ў гэты перыяд адбываецца хуткі рост колькасці цэхаў у гарадах Беларусі. Гараджане змаглі выкарыстаць гэтыя арганізацыі ў барацьбе з засіллем феадалаў.

Праўда, цэхі не змаглі поўнасцю авалодаць становішчам у горадзе і ўтаймаваць феадалаў. Нямала юрысдычан заставалася па-за цэхаў, у іх ліку ўсе рамеснікі-яўрэі, падпарадкаваныя юрысдыкцыі замка. Але ўсё ж праз цэхавую сістэму гораду часткова ўдалося зрабіць тое, што ён беспаспяхова стараўся ажыццявіць прамымі рэпрэсіямі супраць прыватнаўласніцкіх рамеснікаў на рынку.

У барацьбе супраць прыватнаўласніцкіх юрыдык была зацікаўлена ўся абшчына мяшчан магістрата. Але гэта не выключала вострых супярэчнасцей унутры абшчыны — яны ўзнікалі перш за ўсё паміж масай гараджан і заможнай вярхушкай. Апошняя складалася з купецтва, багатых майстроў-рамеснікаў. З іх выбіралася гарадское самакіраванне. У другой палове XVI стагоддзя ў асяроддзе бурмістраў, радцаў, лаўнікаў Мінска ўвайшлі цэхмістры цэхаў металістаў, ювеліраў, кушняроў, цырульнікаў. Усё часцей раздаваліся скаргі на тое, што магістрат не выконвае сваіх абавязкаў, абараняе інтарэсы багатай вярхушкі, дае ім розныя ільготы пры зборы падаткаў і выкананні павіннасцей. Абурэнне гараджан расло. У лютым 1590 года адбыўся агульны сход абшчыны, на якім было прынята рашэнне аб замене існаваўшага раней парадку выбараў васьмі змен рады на тры. Тут жа былі выбраны першыя тры змены на 1590, 1951, 1592 гады; кожная з іх выконвала свае абавязкі на працягу года. Яны складаліся з прадстаўнікоў купецкіх дынастый горада (бурмістры Багдан Савіч, Іван Бабурка, Андрэй Маслянка, радцы і лаўнікі з купецкіх сямей Якімовічаў, Філіповічаў, Левановічаў і інш.). Усе тры змены прынеслі прысягу гораду ў тым, што будуць «чыніць справядліваць аднолькава багатым, бедным і гасцям (г. зн. купцам. — З. К.)». Абшчына агаварыла права адхіляць любога члена рады, дзеянні якога будуць ісці ўразрэз з інтарэсамі горада. Бірчым даручаўся збор паборaў, якія ішлі ў бюджэт горада, а шафарам — падаткаў у каралеўскую казну.

Да войта абшчына выбірала са свайго асяроддзя двух падвойтаў, імкнучыся такім шляхам паставіць пад кантроль дзейнасць галавы гарадскога самакіравання. Была назначана штогадовая плата членам рады: бурмістру — 16 коп, радцу — 3 капы, лаўніку — 1 капа. Магістрату ставілася ў абавязак раз у месяц у чацвер склікаць агульны сход для абмеркавання спраў і савета з усёй абшчынай горада. Сход таксама пастанавіў калектыўна абараняць членаў рады ў выпадку нападу, рабунку. Прынцыпы салідарнасці, выбарнасці, імкненне ўтаймаваць самавольства, супрацьставіць хаосу і беззаконнасці парадак і законнасць — усё гэта знайшло адлюстраванне ў рашэнні мінскіх мяшчан і служыць доказам таго, наколькі гараджанін быў вышэй за феадала ў разуменні норм арганізацыі грамадскага жыцця.

Гарадская вярхушка правяла і патрэбныя ёй палажэнні. На тым жа сходзе абшчына абавязалася ўсе страты, якія могуць узнікнуць па віне рады, аплачваць усім горадам, не перакладваючы адказнасць на адных членаў рады. «Бунтаўшчыкоў», а да іх залічваўся кожны, хто выступаў супраць членаў рады, рада будзе караць згодна з законам. Нарэшце, рада прыняла і такі пункт: «Паколькі немалыя падаткі і пазыкі вялікакняжацкія на горад накладваюцца і для важных патрэб горада прыходзіцца рабіць зборы, таму ўсе прымаюць пастанову, што калі такога роду пабораў трэба будзе сабраць 300, 400 і больш коп, іх абавязваюцца ўносіць як багатыя, так і бедныя».

Які ўплыў мела рашэнне гараджан на ўнутрыпалітычнае жыццё горада, у выніку адсутнасці крыніц сказаць цяжка. Але ў 1613 годзе мяшчане дамагаліся ад караля права выбіраць камісію з 12 чалавек («мужы гмінныя»), абавязаных кантраляваць збор і расходванне магістратам сум з гарадскога бюджэту. Значыць, дзейнасць магістрата выклікала нездавальненне. І яно, відаць, працягвала расці, таму што праз 33 гады абшчына зноў вымушана была адшукваць сродкі, каб утаймаваць самавольства магістрата. У 1647 годзе каралеўскі суд разбіраў скаргу мужоў гмінных, у якой абвінавачваліся лентвойт, бурмістры, радцы за шэраг злоўжыванняў. Яны прысвоілі сабе гарадскія ўчасткі і землі, не плацілі за іх падаткаў, патуралі пераход гарадскіх участкаў пад прыватныя юрыдыкі, не рабілі справаздач аб расходванні гарадскіх сум, бралі з мяшчан розныя паборы, «прысвоілі сабе дамы, крамы, склады, фальваркі, вагі, якія належалі ўсяму гораду, люд бедны як ад духоўных, так і ад свецкіх паноў не абаранялі», рабілі беззаконні, якія вялі да знішчэння гарадской юрысдыкцыі, не неслі ў роўнай ступені з іншымі павіннасці, «парушаючы абавязкі і прысягу сваю». Пад гэтай скаргай падпісалася ўся гарадская абшчына. Няцяжка заключыць, якое напружанае становішча склалася паміж абшчынай і гарадской вярхушкай. Неаднаразовае ўпамінанне

аб прыгнёце людзей бедных сведчыць, што актыўную ролю ў барацьбе супраць гарадскіх багачоў і іх прадстаўнікоў у самакіраванні адыгрывалі гарадскія нізы.

Асаблівае напружанне ўсяму ўнутрыпалітычнаму жыццю горада прыдала рэлігійна-палітычная барацьба, якая абвастрылася з канца XVI стагоддзя. Каталіцкая агрэсія, гвалтоўнае насаджванне уніі выклікалі рашучы пратэст і абурэнне ў асяроддзі гараджан. У адносінах веравызнання гарадское насельніцтва к пачатку XVII стагоддзя ўяўляла сабой даволі стракаты малюнак. Частка гарадскога насельніцтва прыняла каталіцызм, частка прымкнула да уніяцкай царквы. З канца XVI стагоддзя ў горадзе ўзнікла евангелічная абшчына. У 1583 годзе залатых спраў майстар Кандрат Шышка перадаў ёй у падарунак гарадскі ўчастак, а пазней яго брат, таксама залатых спраў майстар, Міхаіл Шышка перадаў сенажаць. Абшчына заснавала вуліцу, якая атрымала назву Збаровая (ад слова «збор», як называлі абшчыну). У 1601 годзе быў у яе ўжо фальварак каля гарадскога вала, некалькі ўчасткаў на рагу рынку, дом абшчыны і восем дамоў, у якіх жылі «розныя рамеснікі». Усе свае ўладанні ў горадзе абшчына ператварыла ў прыватную юрыдыку, забараніўшы тым, хто на ёй жыў, падпарадкоўвацца магістрату. У 1611 годзе ў Мінску існавала евангелічная місія. Мяркуючы па дакументах, у абшчыну ўваходзіла група багатых гараджан, некаторыя члены магістрата. Але асноўная маса гараджан заставалася праваслаўнай.

У канцы XVI і ў першай палове XVII стагоддзя ў Мінску на рэлігійнай глебе неаднаразова ўспыхвалі сутычкі. Барацьба гараджан супраць уніі станавілася ўсё больш вострай і напружанай. 23 жніўня 1616 года пад кіраўніцтвам краўца Данілы Палавінкі гараджане тры разы нападалі на уніяцкі манастыр. У наступныя гады гэта барацьба не спынялася. Ад страху перад растучым рухам народных мас багатая вярхушка гараджан перайшла ва уніяцка-каталіцкі лагер. Да яе прымкнула і частка чыноў магістрата. За гэта гараджане выгналі з магістрата бурмістраў Аляксея Філіповіча і Сямёна Хаткевіча, радцу Хамаковіча, лаўніка Васіля Філіповіча. Кароль спецыяльнай граматай у 1631 годзе патрабаваў ад гараджан вярнуць выгнаных і ўзяў іх пад сваю абарону. Прыхільнікі каталіцкага лагера ўжывалі эканамічныя рэпрэсіі супраць праваслаўных. Так, войт Мінска магнат Тодар Друцкі-Горскі забараніў у 1647 годзе цэху мінскіх шаўцоў «ставіць у рынку крамкі і каморкі». Гэта выклікала ўзрыў абурэння ў горадзе. Праваслаўныя і евангелісты з ліку цэхмістраў, членаў магістрата і мужоў гмінных аб'ядналіся супраць войта, да іх далучыліся мяшчане горада. У ратушы, дзе ўзнік канфлікт, сабралася шмат народу. Як паведамляецца ў дакуменце, яны крычалі войту: «Нам не страшны твой прысуд! Не баімся мы цябе і твой суд не захоўваем!

Рабі суд у сваіх маёнтках над хлопамі сваімі, а тут да суддзяў і судоў ніякіх адносін не маеш, як пажадаем, так і павінен танцаваць!»

У такіх абставінах натуральным вынікам з'явіўся актыўны ўдзел гараджан у барацьбе беларускага народа за ўз'яднанне з Расіяй, у якой яны бачылі сродак збаўлення ад царкоўна-каталіцкага тэрору, феадальнага самавольства, іншаземнага гнёту. Жыхары Мінска ўступалі ў паўстанцкія атрады, якія дзейнічалі ў тыле польскіх войск. Аб рашучасці гараджан не шкадуючы сіл змагацца з ворагам свед-чыць данясенне ў Маскву манаха аршанскага Кутаінскага манастыра вясной 1651 года. Ён паведамляў, што «как де у поляков с черкасы будут бои и учнут поляки черкас осиливать и они де, Смоленского и Оршанского и Минского и Могилевского и иных городов всяких чинов люди, подоймутца на поляков. И учинят у себя таких Хмельницких 10 человек, а войска 100 000 человек и учнут Польшу и Литву воевать... против их поляков стоять и битца покамести их мочи будет».

Барацьба гараджан дапамагла рускім войскам, якія дзейнічалі сумесна з казацкімі атрадамі Залатарэнкі, выгнаць 3 ліпеня 1655 года з Мінска шляхецкае войска. Разам з ім з горада збегла значная частка заможнай вярхушкі горада, уніяцкае і каталіцкае духавенства. Гараджане Мінска разам з навакольнымі сялянамі стварылі полк, якім камандаваў «мінскі палкоўнік Пашко».

Вастрыня і настойлівасць барацьбы супраць каталіцкага лагера ў Мінску ў значнай ступені з'явіліся вынікам дзейнасці царкоўных брацтваў. Першае брацтва ўзнікла ў Мінску ў 1591 годзе. У 1613 годзе было створана брацтва пры Петрапаўлаўскай царкве, а ў 1616 годзе ў горадзе ўзнікла Саборнае брацтва. К сярэдзіне XVII стагоддзя ў Мінску існавала сем брацтваў.

Брацтвы мелі сур'ёзны ўплыў у горадзе і дабіліся незалежнага ад духавенства становішча. Згодна з прывілеем ад 18 сакавіка 1633 года, дамы, якія належалі Петрапаўлаўскаму брацтву, вызваляліся ад падаткаў і павіннасцей, яму дазвалялася мець сваю судовую юрысдыкцыю. Невыпадкова Саборнае брацтва ў Слуцку дамагалася, каб «наша брацтва карысталася такой жа ўладай і правамі, якімі карыстаюцца ў іншых гарадах брацтвы, напрыклад у Вільні, Мінску, Магілёве... без перашкоды з боку духавенства».

Брацтвы ставілі перад сабою не толькі рэлігійныя, але і шырокія грамадскія задачы. Яны адкрывалі школы, друкарні. У 1633 годзе Петрапаўлаўскае брацтва дамагалася дазволу адкрыць «школы для навукі людзей хрысціянскіх і дзетак іх... друкарню для друкавання ўсялякіх кніг».

Брацтвы ўладалі значнай уласнасцю. Петрапаўлаўскаму брацтву, напрыклад, належалі маёнтак Пярэспа, дамы, крамы і пляцы ў самім горадзе. Даходы з гэтых уладанняў траціліся на ўладкаванне

школ, друкарняў, арганізацыю дамоў прытулку. Грамадская дзейнасць брацтваў рабіла іх вельмі ўплывовай сілай, арганізуючым цэнтрам унутрыпалітычнай барацьбы ў Мінску.

К сярэдзіне XVII стагоддзя уніятам удалося аслабіць пазіцыі праваслаўных брацтваў; у 1653 годзе уніяцкаму Вазнясенскаму манастыру была перададзена маёмасць і школа шпітальнага брацтва. У тым жа годзе Святадухаўская уніяцкая царква адкрыла сваю школу. Аднак праваслаўныя брацтвы захавалі ўплыў на шырокія гарадскія масы, якія не спынялі на працягу ўсяго XVII стагоддзя барацьбы з іншаземным гнётам і феадальным самавольствам за ўз'яднанне з Расіяй.

РАЗДЗЕЛ IV

ЗАНЯПАД І АДНАЎЛЕННЕ ГОРАДА

1. Агульны стан горада

У сярэдзіне XVII стагоддзя Мінск быў моцна разбураны ў выніку народна-вызваленчай і руска-польскай войн. Значная частка жыхароў пакінула горад. У 1656 годзе ў ім налічвалася ўсяго каля 150 сем'яў мяшчан.

Са спыненнем ваенных дзеянняў у цэнтральнай частцы Беларусі насельніцтва Мінска прыкметна павялічылася. У 1667 годзе ў горадзе было ўжо больш за 300 двароў, г. зн. каля 2000 жыхароў.

Далейшае аднаўленне Мінска, як і іншых беларускіх гарадоў, стрымліавалася агульнымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі, якія склаліся ў Рэчы Паспалітай і вельмі ўскладнялі яе эканамічнае развіццё.

І ўсё ж Мінск аднаўляўся значна хутчэй, чым многія іншыя беларускія гарады. Бергард Танер, які апісаў падарожжа пасольства Рэчы Паспалітай у Маскву, адзначаў, што ў 1678 годзе ў Мінску ўжо «прыкметны былі сляды аднаўлення». Горад выглядаў «большым, ён шырока раскінуўся на ўзгорках і ў логах».

Новыя няшчасці прынесла Мінску Паўночная вайна. Шведскія войскі, захапіўшы горад у маі 1707 года, абклалі яго жыхароў цяжкай кантрыбуцыяй. Насельніцтва Мінска пацярпела не толькі ад шведскіх войск, але і ад пастояў арміі Рэчы Паспалітай, а таксама ад надзвычай моцнай эпідэміі чумы 1710—1711 гадоў.

Мінск яшчэ доўга заставаўся разбураным і спустошаным горадам і толькі ў другой палове XVIII стагоддзя пачаў прыкметна адбудоўвацца. Пашыраецца тэрыторыя горада, асабліва за кошт

забудовы ўскраін у напрамку трактаў, якія ішлі на Вільню і Барысаў, цяперашняй Юбілейнай плошчы і Старажоўкі.

Ёсць падставы меркаваць, што Мінск выйшаў са стану заняпаду к апошняй чвэрці XVIII стагоддзя. У тарыфе збору падымнага па датку ў Мінску за 1775 год (праўда, не зусім поўным) было адзначана «пустымі» ўсяго толькі некалькі сядзібных участкаў. Калі ў 1676 годзе магістрат здаваў у арэнду на год «гарадскія даходы поўнасцю» за 1400 злотых, то ў 1771 годзе за арэнду ўсіх даходаў, якія паступалі ў казну магістрата, было заплочана 6550 злотых, г. зн. амаль у 3 разы больш.

Аднак уздым эканамічнага стану Мінска, відавочна, трэба аднесці толькі к канцу XVIII стагоддзя. У 1786—1789 гадах толькі за арэнду млыноў з гандлёвага, маставога і рэчавага збораў мінскі магістрат браў 6710 злотых у год. Як адзначаў англійскі падарожнік Вільям Кокс, Мінск у пачатку 80-х гадоў XVIII стагоддзя быў «вялізным горадам» і найбольш «прыстойным» з усіх іншых гарадоў, якія заставаліся ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1790 годзе ў Мінску было каля 40 вуліц і завулкаў, на якіх стаяла 980 «дымаў» (у тым ліку 14 манастыроў). У 1800 годзе горад займаў 308 гектараў.

У 1797 годзе ў горадзе налічвалася 5794 жыхары. Каля 12 працэнтаў насельніцтва горада складала шляхта, 2,5 — духавенства і 4,5 працэнта — «разначынцы» і людзі, якія часова жылі ў ім.

Прыкметнае паляпшэнне эканамічнага стану і рост насельніцтва Мінска ў канцы XVIII стагоддзя, як і ў шэрагу іншых беларускіх гарадоў, перш за ўсё былі звязаны з аднаўленнем і далейшым развіццём вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы, ростам агульнай колькасці яе насельніцтва, усё большай таварызацыяй гаспадаркі маёнткаў і асабліва развіццём шляхецкай прадпрымальнасці, паляпшэннем шляхоў зносін і правядзеннем некаторых прагрэсіўных эканамічных рэформ. Сюды ж трэба аднесці і сувязь Беларусі з усерасійскім рынкам, якая асабліва ўзрасла з 1772 года, пасля ўз'яднання ўсходняй часткі Беларусі з Расіяй. Указам расійскага ўрада 1773 года быў дазволен бяспошлінны правоз прадуктаў і сыравіны з Рэчы Паспалітай у Прыбалтыку і беларускія губерні Расійскай імперыі, а таксама бяспошлінны правоз праз беларускія губерні прамысловых тавараў з Рыгі. З сярэдзіны 70-х гадоў Расія дазволіла Рэчы Паспалітай весці суднаходства і сплаў лесу па ніжнім цячэнню Дняпра.

Можна меркаваць, што к канцу XVIII стагоддзя Мінск стаў эканамічна больш магутным, чым Гродна, Пінск і Брэст, якім раней ён у гэтых адносінах уступаў. У канцы XVIII стагоддзя па колькасці насельніцтва ён уступае толькі двум гарадам Беларусі — Магілёву і Віцебску.

2. Рост феадальнай уласнасці

У эканамічным і грамадска-палітычным жыцці Мінска другой паловы XVII—XVIII стагоддзя важнай з'явай быў рост нерухомай уласнасці феадалаў і асабліва іх юрыдык. г. зн. уладанняў. Жыхары гэтых уладанняў аддавалі рэнту феадалам як уласнікам зямлі, падпадалі пад іх юрысдыкцыю і, такім чынам, выходзілі з-пад улады і суда магістратаў і ад выконвання гарадскіх павіннасцей.

Феадалы павялічвалі свае ўладанні рознымі спосабамі, шырока выкарыстоўваючы пры гэтым свае саслоўныя прывілеі і сілу. Ва ўмовах растучага наступлення каталіцызму ў складзе феадальных уладанняў у беларускіх гарадах прыкметна павялічваюцца ўладанні каталіцкай і уніяцкай царквы.

Згодна з заявай, дадзенай пад прысягай магістратам у 1667 годзе, у Мінску «ў гарадской юрысдыкцыі» або інакш «пад ратушнай юрысдыкцыяй» было ўсяго толькі 75 двароў, якія неслі гарадскія павіннасці. Невялікая частка двароў, якія належалі яўрэям, былі ў распараджэнні мінскай яўрэйскай абшчыны (кагалу), а ўсе астатнія былі ў складзе замкавай юрыдыкі і юрыдык чатырох свецкіх і сямі духоўных феадалаў. Па іншых звестках, у Мінску ва ўладанні феадалаў знаходзілася больш за 220 двароў.

Рэзкае скарачэнне ў каралеўскіх гарадах Рэчы Паспалітай магістрацкіх юрыдык выклікала прынятае сеймамі ў 1659 і 1676 гадах пастаноў аб падпарадкаванні юрыдык, якія незаконна былі заснаваны феадаламі, асабліва духоўнымі, гарадской юрысдыкцыі.

Гэтыя пастановы вярхоўнай улады і спецыяльныя каралеўскія граматы, безумоўна, дапамаглі мінскай гарадской абшчыне ў вялікай ступені аслабіць рост феадальных юрыдык і нават вярнуць некаторыя сядзібныя землі з іх у падпарадкаванне магістрату, а таксама прыцягнуць частку жыхароў да выконвання гарадскіх павіннасцей. Але і пасля гэтых пастаноў рост феадальных юрыдык у Мінску ўсё ж працягваўся.

Можна меркаваць, што пастанова сейма 1764 года аб ліквідацыі ў каралеўскіх гарадах зямельнай уласнасці духоўных феадалаў і падпарадкаванні жыхароў гэтых юрыдык магістрацкай, або старасцінскай, юрысдыкцыі значна абмежавала пашырэнне ўласнасці і юрысдыкцыі феадалаў у Мінску. Аднак ва ўмовах кансерватыўнага грамадскага ладу Рэчы Паспалітай гэты працэс не мог быць зусім спынены.

Аб выніках гэтага працэсу ў Мінску к канцу XVIII стагоддзя гавораць наступныя даныя. У няпоўным тарыфе 1775 года збору падымнага падатку ў Мінску ўказана 629 дамоў (не лічачы 11 манастыроў, сінагог і ратушы). Каля 400 дамоў было размешчана на землях свец-

кіх і духоўных феадалаў, прычым звыш 200 дамоў знаходзілася ў іх юрыдыках. Толькі ў юрыдыках 6 буйных феадалаў знаходзілася каля 160 дамоў. Па даных «Тапаграфічнага апісання» 1800 года, у Мінску налічвалася 1009 дамоў, з іх толькі 228 дамоў было «абыватальскіх на ўласных землях», 73 дамы стаялі на «гарадской зямлі», 4 дамы знаходзіліся на землях цэхаў і царкоўных брацтваў, 57 дамоў належалі яўрэйскаму насельніцтву. Астатнія 647 дамоў — уласнасць свецкіх і духоўных феадалаў (324 дамы належалі манастырам і цэрквам).

Рост уласнасці феадалаў у гарадах і асабліва іх юрыдык аслабляў эканамічныя пазіцыі гараджан. Але затрымаць эканамічнае развіццё горада ён не мог.

3. Аднаўленне рамеснай вытворчасці

Пры рэзкім памяншэнні колькасці насельніцтва ў сярэдзіне XVII стагоддзя ў Мінску паменшылася і колькасць рамеснікаў, а значыць, скараціўся і аб'ём рамеснай вытворчасці.

У другой палове XVII стагоддзя ў шэрагу галін гарадскога рамяства характар пераважна таварнай вытворчасці ў асноўным захоўваецца. Так, вырабы мінскіх рамеснікаў, якія ўваходзілі ў рымарны і сёдзельны цэх і цэх металістаў, у гэты час у значнай частцы паступалі на продаж. Безумоўна, што якаясьці частка прадукцыі мінскага рамяства вывозілася і за межы горада. У прыватнасці, вядома, што рымары адвозілі свае вырабы на продаж у Вільню.

Рост феадальных юрыдык вёў да павелічэння сярод членаў цэхаў рамеснікаў-юрысдычан, а таксама садзейнічаў развіццю няцэхавага рамяства. У сувязі з гэтым цэхі ў сваіх статутах узмацняюць пункты, якія вызначалі падпарадкаванне ім усіх рамеснікаў горада. Так, пры пацверджанні каралём у 1664 годзе прывілея мінскіх рамеснікаў-металістаў да яго было дабаўлена новае палажэнне аб тым, каб «ніякія ўлады не ўмешваліся ў дзеянні цэхавага суда і не рабілі яму перашкод». У каралеўскім прывілеі 1744 года, у якім зацвярджалася стварэнне ў Мінску цэха саладоўнікаў, піваварaў, медавараў, вінакураў, васкабойнікаў і вадавозаў, прадугледжвалася ўключэнне ў цэх усіх рамеснікаў гэтых прафесій, што жылі «як пад гарадской юрысдыкцыяй мінскай ратушы, так і пад замкам нашым і на ўсякіх юрысдыкцыях царкоўных, манастырскіх, панскіх, шляхецкіх».

Цэхі ўзмацняюць барацьбу з няцэхавымі рамеснікамі, якія жылі ў юрыдыках феадалаў. Напрыклад, у 1680 годзе рымарны цэх абвінавачваў перад магістратам пазументшчыка і футраўніка (які вышываў скураныя вырабы футрай) Яна Паўлоўскага, што жыў у юры-

дыцы мінскай плябані, у тайным занятку рамяством. Магістрат прыняў рашэнне аб канфіскацыі ў яго гатовых рамесных вырабаў.

Цэхі свае галоўныя намаганні накіроўваюць на тое, каб не дапусціць продажу на мясцовым рынку вырабаў мінскіх няцэхавых рамеснікаў і прывазных. Ранейшы прывілей цэха рамеснікаў-металістаў у 1664 годзе быў дапоўнены забаронай мінскім крамнікам гандляваць вырабамі (што выпускаліся і гэтым цэхам), якія прывозіліся з іншых гарадоў або былі куплены без яго дазволу, і правам цэху пабудаваць чатыры крамы для продажу сваіх тавараў. У 1666 годзе цэх рымароў, сёдзельнікаў, пояснікоў і футраўшчыкоў дамогся забароны магістратам мінскім купцам і кушнярам гандляваць у сваіх крамах прывазнымі вырабамі, якія выпускаліся і гэтым цэхам. У адпаведнасці з гэтым рашэннем у тым жа годзе па скарзе цэха рымароў быў асуджан мінскім судом кушнер Даніла Федаровіч, які прадаваў у сваёй краме купленыя ім нізкага гатунку прывазныя рымарныя тавары.

Нягледзячы на настойлівасць, з якой цэхі вялі барацьбу супраць няцэхавага рамяства, яны не маглі яго ліквідаваць нават у асяроддзі мяшчан. Аб гэтым, напрыклад, сведчыць рашэнне мінскага магістрата 1786 года, у якім была адзначана наяўнасць у горадзе мяшчан-каменшчыкаў, саф'яннікаў і «тых, хто вырабляе... усякія мануфактуры», якія павінны былі ўваходзіць у цэхі, аднак «для найменшай платы падаткаў з цэхамі не складваліся» і не плацілі чыншу магістрату.

Але асноўную масу рамеснікаў, што не ўваходзілі ў цэхавую арганізацыю, складалі яўрэі, якія яшчэ ў пачатку XVII стагоддзя атрымалі спецыяльны каралеўскі прывілей аб дазволе ім займацца ў Мінску рознымі рамеснымі вырабамі, не будучы членамі цэхавых арганізацый. З ростам яўрэйскага насельніцтва павялічвалася і колькасць няцэхавых рамеснікаў. К канцу XVIII стагоддзя па-за магістрацкай цэхавай арганізацыяй ужо знаходзілася каля паловы ўсіх рамеснікаў.

Больш за ўсё сярод яўрэяў-рамеснікаў у Мінску было залатых і сярэбраных спраў майстроў, меднікаў, бляхараў, шкляроў, замшанікаў, каменшчыкаў і асабліва краўцоў, хлебнікаў і булачнікаў. Аднак значная частка іх аб'ядналася ў «брацтвы», якія заключалі пэўныя пагадненні з магістрацкімі цэхамі. Вядомы дагавор 1762 года паміж цэхам металістаў і брацтвам яўрэяў-металістаў аб выплаце цэху кожны год па 34 талеры (каля 250 злотых). Цэх у сваю чаргу павінен быў дапамагаць «брацтву» спаганяць плату з яўрэяў-металістаў, якія прыязджалі ў Мінск для часовай работы.

Адзначаны вышэй прыкметны рост у Мінску к канцу XVIII стагоддзя ліку жыхароў быў звязаны ў першую чаргу з развіццём у ім

рамеснай вытворчасці. Згодна з «Тапаграфічным апісаннем», у Мінску налічвалася 1340 мужчынскіх «душ» рамеснага насельніцтва. Апрача рамеснікаў, якія ў гэтым апісанні былі аднесены да «майстравых», у ім мелася значная група прамыслоўцаў (мяснікі, вінакуры, півавары, медавары, саладоўнікі, млынары, аўчыннікі, мылавары, рыбаловы, фурманы). Такім чынам, можна з пэўнасцю сказаць, што ў канцы XVIII стагоддзя рамеснае насельніцтва складала больш паловы агульнага ліку жыхароў Мінска.

Аднаўленне рамеснай вытворчасці шэрага прафесій адбывалася нераўнамерна. Напрыклад, за час з 1666 па 1699 год у цэх шаўцоў было прынята каля 70 чалавек, а ў цэх слесароў — каля 35 чалавек. Хутка развіваліся прафесіі, звязаныя з апрацоўкай дрэва, аб чым сведчыць выдзяленне цэха слесароў. У канцы XVII або ў пачатку XVIII стагоддзя ўзніклі цэхі мяснікоў, ткачоў і ў сярэдзіне 40-х гадоў таго ж стагоддзя — рамеснікаў, якія выраблялі напіткі.

З другога боку, колькасць рамеснікаў, якія займаліся вытворчасцю зброі і воінскіх даспехаў, паменшылася.

Такім чынам, у разглядаемы перыяд, асабліва ў XVIII стагоддзі, у Мінску ў найбольшай ступені развіваліся рамёствы, якія мелі таварны характар і задавальнялі патрэбы шырокіх пластоў насельніцтва.

У «Тапаграфічным апісанні» Мінска 1800 года названа больш за 50 рамесных прафесій.

Найбольшая колькасць рамеснікаў сканцэнтроўвалася ў дзвюх групах рамёстваў — адна была звязана з апрацоўкай жывёльнай сыравіны і выпускам скураных вырабаў, другая — з апрацоўкай металаў і вытворчасцю металічных вырабаў. У кожнай з гэтых галін вытворчасці было занята каля 27 працэнтаў усіх рамеснікаў. Значна менш рамеснікаў займалася выпускам тканін і шэрсці і пашывам з іх адзення (13 працэнтаў), апрацоўкай дрэва і драўляным будаўніцтвам (14 працэнтаў), апрацоўкай каменя і гліны, будаўніцтвам з гэтых матэрыялаў (10 працэнтаў).

Такім чынам, можна лічыць, што, за выключэннем першых дзвюх галін рамеснай вытворчасці, ва ўсіх астатніх была сканцэнтравана прыкладна роўная колькасць рамеснікаў.

З рамеснікаў асобных прафесій больш за ўсё было краўцоў, гарбароў, каменшчыкаў, кушняроў, шаўцоў. Вельмі мала было рукавічнікаў, замшанікаў, суконшчыкаў, цукернікаў, пераплётчыкаў.

З ростам таварнасці рамяства ўзрастала і няроўнасць у эканамічнай самастойнасці рамеснікаў. Безумоўна, што залатых і сярэбраных спраў майстры, кушняры, гарбары ўжо па роду сваіх заняткаў павінны былі мець большыя грашовыя сродкі, чым рамеснікі іншых прафесій. Тое ж можна сказаць аб рамесніках, якія займаліся вытвор-

часцю алкагольных напіткаў, і мясніках. Апошніх у 1724 годзе нават абклалі дадатковым падаткам на патрэбы горада. Але і сярод рамеснікаў іншых прафесій таксама былі багатыя, якія мелі каштоўную нерухомасць, займаліся гандлем і, апрача падмайстраў і вучняў, наймалі яшчэ работнікаў для абслугоўвання іх гаспадаркі. Напрыклад, кравец Іеранім Кісель у 1773 годзе арандаваў у Мінску збор падарожнай пошліны з праязджаўшых па мосце праз Свіслач. Разам з тым былі рамеснікі, якія не мелі нават хаты і чуць забяспечвалі існаванне сваёй сям'і. Так, сярод 8 краўцоў, адзначаных у ліку жыхароў горада, дамы якіх з «усякай маёмасцю» згарэлі ў час пажару ў 1778 годзе, маёмасць чатырох была ацэнена ўсяго толькі ў 400 і 500 злотых.

Найбольш заможныя майстры, займаючы цэхавыя старшынскія пасады на працягу шэрага год, трымалі ў падпарадкаванні астатніх членаў цэха. Так, у цэху шаўцоў цэхмайстрамі былі: Якуб Маслоўскі — з 1666 па 1692 год, Тамаш Лаўрыновіч — з 1668 па 1681 год, Андрэй Філановіч — з 1668 па 1685 год. Марцін Сцяпура тры гады займаў пасаду цэхмістра і два гады сталовага, два гады цэхмістрам і два гады сталовым быў Мікалай Лісоўскі.

Цэхавая вярхушка выкарыстоўвала сваю пасаду для асабістага ўзбагачэння, дапускала беззаконне і самавольства. У 1789 годзе рамеснікі ганчарнага і цагельнага цэха скардзіліся на цэхмістра Антона Каплінскага за тое, што ён трымаў у сябе дома цэхавую пячатку і фабрыкаваў фальшывыя дакументы. У 1777 годзе майстры цэха кушняроў абвінавацілі цэхмістра Аляксандра Сукстровіча ў прысваенні цэхавых грошай. У 1776 годзе кацельшчык Васіль Валовіч скардзіўся на зробленыя яму «вялікія страты ў рамястве і рабоце» і збіванне яго цэхмістрамі слясарнага цэха.

Імкненне цэхаў не дапусціць росту няцэхавага рамяства ў феадальных юрыдыках вяло да паслаблення іх карпаратыўнай замкнёнасці. Доступ у цэхавыя майстры стаў лягчэйшым. Згодна з новымі правіламі, зацверджанымі ў цэху металістаў у 1666 годзе, пры прыёме падмайстраў у майстры ад іх ужо не патрабавалася выкананне пробнага вырабу. Згодна са статутам створанага ў Мінску ў 1744 годзе цэха «саладоўніцкага і ўсякіх рамёстваў да яго належачых», у яго мог уступіць «кожны прыбыўшы ў Мінск чалавек, які валодаў тым рамяством», пры ўмове, што ён абавязваецца выконваць «усякія цэхавыя павіннасці».

Некаторыя змены адбываюцца і ў аплаце працы падмайстраў. У новых правілах цэха металістаў для ўсіх прафесій дэталёва апісваліся работы, за выкананне якіх падмайстар мог браць аплату на сваю карысць, «на выпіўку», а ў пушкароў прадугледжвалася яшчэ і здзельная работа «з трэцяга гроша». У статуце гэтага ж цэха ад

1592 года работа «з трэцяга гроша» была забаронена пад пагрозай штрафу. Безумоўна, што змены ў аплаце працы падмайстраў адбыліся ў сувязі з ростам таварнасці рамеснай вытворчасці, калі майстар імкнуўся павялічыць прадукцыйнасць працы падмайстра.

Але разам з забеспячэннем падмайстрам некаторых магчымасцей для большага заробку ў цэхах узмацняюцца абмежаванні пераходу ад аднаго майстра да другога. У правілах цэха металістаў 1666 года абумоўлена работа падмайстра ў аднаго майстра на працягу года. Калі ж ён паспрабуе ўступіць у майстры, не выканаўшы гэту ўмову, ён павінен будзе заплаціць штраф у касу арганізацыі падмайстраў 6, а ў цэх — 15 злотых. У дагаворы, які быў заключаны ў 1789 годзе паміж майстрам-мечнікам Янам Пагоскім і падмайстрам Янам Залуцкім, апошні абавязваўся адпрацаваць у майстра на працягу года. Поўны разлік яму будзе дадзены толькі пасля заканчэння гэтага тэрміну, калі ён здасць у цэласці інструменты і зробіць справаздачу «аб усіх даходах». У выпадку, калі б Залуцкі не захацеў даслужыць дагаворнага тэрміну або аказаўся «лянівым і нядобрасумленным у рабоце і ў збройным гандлі», то ён не атрымаў бы заробку і, апрача таго, быў бы яшчэ пакараны «згодна з цэхавымі правіламі і артыкуламі».

Такім чынам, падмайстар, як і раней, поўнасцю залежаў ад майстра, эксплуатаваўся і прыгнятаўся. Яшчэ больш цяжкім было становішча вучняў.

Рост эканамічнай няроўнасці цэхавых рамеснікаў вёў да паслаблення цэхавай арганізацыі. Садзейнічала гэтаму і канкурэнтная барацьба, якая разгарнулася з ростам таварнасці рамеснай вытворчасці паміж рамеснікамі, што ўваходзілі ў адзін цэх, за збыт сваіх вырабаў. Напрыклад, вельмі абвастрылася такая барацьба ў мінскім рымарным цэху ў 80-х гадах XVII стагоддзя паміж рымарамі і сёдзельнікамі. У розных адміністрацыйных і судовых інстанцыях рымары абвінавачвалі сёдзельнікаў у выпуску і продажу рымарных вырабаў, а тыя ў сваю чаргу абвінавачвалі рымароў у выпуску і продажу сёдзельных вырабаў. Толькі пасля выдання каралём спецыяльнага рэскрыпта аб размежаванні іх работ яны прыйшлі да згоды.

Імкненне цэхавых майстроў павялічыць аб'ём вытворчасці ўсё часцей штурхае іх на парушэнне цэхавай рэгламентацыі і нават на выхад з цэха. Так, у 1679 годзе быў прыцягнуты да магістрацкага суда за парушэнне «цэхавых правіл» шавец Пракоп Філіповіч. У 1681 годзе цэхмістры рымарнага цэха абвінавачвалі сёдзельнікаў Мацея і Паўла Ламакаў у тым, што яны «бунт і разлад чыняць», прымаюць «чэлядзь» ва ўзросце звыш 16 год без ведама цэха, не плацяць цэхавых узносаў і наогул «не хочуць быць у цэху, выломліваюцца з яго». На сходцы рымарнага цэха ў 1703 годзе цэхавы каз-

начэй («шафар») Васіль Трубяцкой быў аштрафаваны за тое, што ў сябе ў майстэрні «трымаў розных рамеснікаў». Слясарны цэх у 1689 годзе прыцягнуў да магістрацкага суда харунжага гэтага цэха Васіля Мазуркевіча за незахаванне цэхавага статута і, у прыватнасці, за тое, што ён утойваў «гультайскую чэлядзь».

У выніку супярэчнасцей, якія ўсё больш узмацняліся сярод цэхавых рамеснікаў, адбываецца ліквідацыя некаторых цэхаў. Па даных пачатку 80-х гадоў XVII стагоддзя, у Мінску было 10 цэхаў: слясарны, або кавальскі, шавецкі, гарбарны, кушнерны, рымарны, кравецкі, ткацкі, цяслярскі, або сталярны, цэхі каменшчыкаў, мяснікоў. У пераліку цэхаў ужо адсутнічаюць цэхі цырульнікаў, залатых спраў майстроў, шлемнікаў і саладоўнікаў. У другой палове 80-х гадоў ужо не ўпамінаецца і цэх мяснікоў, а ў «Тапаграфічным апісанні» 1800 года названа ўсяго 8 цэхаў, кушняры былі ўключаны ў гарбарны цэх.

Развіццё таварнай вытворчасці прывяло да росту ў канцы XVIII стагоддзя рамесных майстэрняў пазацэхавай арганізацыі і ўзмацнення ролі скупшчыкаў і падрадчыкаў. Ужо ў другой палове XVII стагоддзя ў Мінску вядомы некаторыя багатыя рамеснікі, якія гандлявалі ў крамах і на навакольных кірмашах, а часамі і ў даволі аддаленых гарадах і мястэчках рамеснымі вырабамі на суму ў некалькі тысяч злотых. Вядома, што гэта былі не толькі іх вырабы, але і вырабы, скупленыя ў іншых рамеснікаў. У другой палове XVIII стагоддзя купцы вывозілі з Мінска сотні цэнтнераў юхту. Прычым частка гэтых скур выраблялася гарбарамі са шкур, якія прывозілі ім купцы. Асобныя мінскія мяшчане бралі падрады на выкананне значных работ з выкарыстаннем наёмных работнікаў.

У 1781 годзе ў Мінску налічвалася 32 саладоўні і 70 браварань, г. зн. прадпрыемстваў па вырабу розных напіткаў. Мяркуючы па тым, што ўжо ў статуце мінскага «саладоўніцкага» цэха 1744 года прадугледжвалася шырокае выкарыстанне ўладальнікамі браварняў наёмных майстроў, можна з упэўненасцю думаць, што некаторыя з гэтых прадпрыемстваў значна перавышалі па колькасці работнікаў і аб'ёму вытворчасці звычайныя рамесныя майстэрні, а іх уладальнікі не ўдзельнічалі непасрэдна ў вытворчасці. Прадпрыемствамі такога ж тыпу былі і 4 млыны на рацэ Свіслачы. У 1791 годзе рымарным цэхам быў прыцягнуты да магістрацкага суда мінскі бурмістр купец Феліцыян Каліноўскі за тое, што ён, не з'яўляючыся членам цэха, адкрыў рымарную майстэрню, у якой працавалі толькі падмайстры.

У складзеную мінскай губернскай управай у 1796 годзе «Ведамасць фабрык і мануфактур» было ўключана 12 мануфактур, якія знаходзіліся ў Мінску: 4 капялюшныя, 1 суконная, 4 мыльныя,

8 гарбарныя і 3 цагельні. Яны знаходзіліся «каля горада Мінска». Дзве цагельні заснаваны ў 1795 годзе, адна з іх — купцом Андрэем Макарэвічам — у 1780 годзе. Можна з упэўненасцю сказаць, што некаторыя з мануфактур таксама існавалі ўжо на працягу некалькіх год.

Усе прадпрыемствы, указаныя як «мануфактуры», у сапраўднасці па сваёму характару не былі мануфактурамі. На іх, апрача гаспадара і членаў яго сям'і, працавалі адзін наёмны майстар або адзін-два падмайстры. Але гэтыя прадпрыемствы ўсё ж можна ўжо аднесці да «рамесных зародкаў мануфактуры» [1]. У поўным сэнсе прадпрыемствамі мануфактурнага тыпу можна лічыць толькі цагельні. Пры гэтым іх вытворчасці больш за 100 тысяч штук цэглы ў год на суму звыш 6000 рублёў на іх павінна было працаваць каля 10 чалавек. Безумоўна, што тут быў ужо і значны падзел працы.

Такім чынам, рамесная вытворчасць у канцы XVIII стагоддзя развівалася ў напрамку далейшага росту таварнасці рамяства, паглыблення яго цэхавай арганізацыі і выспявання ў ім капіталістычнай мануфактуры.

4. Гандаль

Важнейшай галіной гаспадарчай дзейнасці жыхароў Мінска, апрача рамяства і промыслаў, быў гандаль. Вярхушку гандлёвага насельніцтва горада складала купецтва. Яно было нешматлікім. У сярэдзіне 90-х гадоў XVIII стагоддзя да купцоў адносілася толькі каля 2,5 працэнта гарадскога насельніцтва. Купцы сваім багаццем рэзка вылучаліся сярод гарадскіх жыхароў. Яны вялі буйны гандаль як у самім Мінску, так і далёка за яго межамі.

Як ужо адзначалася, даволі значны гандаль (з выездам у бліжэйшыя гарады і мястэчкі) вялі багатыя рамеснікі. Купцам і багатым рамеснікам належала большасць рыначных крам і свірнаў у горадзе, прычым некаторыя з купцоў валодалі некалькімі такімі памяшканнямі. Частка крамаў і свірнаў належала магістрату, духоўным і свецкім феадалам, якія здавалі іх у арэнду.

Апрача купцоў і рамеснікаў, многія жыхары Мінска гандлявалі ў невялікіх крамах у дамах, у рознага роду ларках і проста «ў разнос». Для многіх з іх такі дробны гандаль быў толькі дадатковым заняткам да іх асноўнай гаспадарчай дзейнасці. Нарэшце, яшчэ большая група асоб служыла ў купцоў у якасці прыказчыкаў або выконвала работы па транспарціроўцы іх тавараў.

[1] К. Маркс. Капитал, т. I, стр. 347.

У сярэдзіне XVII стагоддзя з разбурэннем горада гандаль рэзка спаў. Аб гэтым сведчаць даныя аб зборы падаткаў з купцоў. У 1673 годзе мінскія купцы павінны былі заплаціць падатак у 750 злотых, з якіх заплацілі толькі 500. Гэта сума прыкладна ў 6 разоў меней за суму таго ж падатку, заплачанага Магілёвам, і ў 2,5 раза меней за сумы, заплачаныя Віцебскам і Полацкам. Нядоімка па выплаце купецкага падатку заставалася за Мінскам на працягу яшчэ доўгага часу.

Толькі з другой паловы XVIII стагоддзя ў гандлі Мінска пачалося прыкметнае ажыўленне. Гэта вельмі добра відаць на прыкладзе гандлю напіткамі. Калі сума збору падатку за напіткі з усіх юрыдык Мінска ўстанаўлівалася 7500 злотых у 1698 годзе, 6000 злотых у 1712 годзе, 6700 злотых у год з 1719 па 1755 год, то ўжо ў пачатку 70-х гадоў XVIII стагоддзя падатак за напіткі складаў каля 12 000 злотых, а ў 80-х гадах каля 20 000 і больш злотых у год. Агульны гадавы абарот знешняга і ўнутранага гандлю Мінска ў канцы XVIII стагоддзя дасягнуў 200—300 тысяч рублёў.

У другой палове XVIII стагоддзя да існаваўшых раней трох гарадскіх рынкаў дабавіўся яшчэ адзін, у прадмесці Раманава, куды з'язджаліся «людзі з фурманкамі з розных трактаў для продажу». У сярэдзіне 90-х гадоў у горадзе было 89 крам, якія размяшчаліся ў гандлёвых радах, больш паловы іх былі каменныя. У іх прадаваліся вырабы мінскіх рамеснікаў, а таксама розныя прывазныя тавары, галоўным чынам шарсцяныя, суконныя і шаўковыя тканіны і «маскацель» (фарбы, клей і да т. п.).

Гандаль у горадзе ажыўляўся ў дні кірмашоў. У гэтыя дні сяляне прывозілі на продаж зерне, жывёлу, сена, гародніну і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты.

Асабліва важнае значэнне ў гандлі Мінска мелі два кірмашы, якія адбываліся ў горадзе кожны год. Адзін з іх — летні — захоўваў традыцыйны характар. На яго з'язджаліся галоўным чынам сяляне з зернем, жывёлай, вясковымі сукнамі, хлебам, драўляным і гліняным посудам. Прадаваліся коні. Працягваўся кірмаш усяго адзін дзень.

Зусім іншы характар меў другі кірмаш, які збіраўся вясной. Ён атрымаў назву «кантрактовы». На яго прыязджала шляхта не толькі з Беларусі і Літвы, але і з Украіны для заключэння рознага роду кантрактаў па продажу, здачы ў заклад і ў арэнду зямельных уладанняў. На кірмашы было многа купцоў з беларускіх і рускіх гарадоў, з Вільні, Варшавы, Гданьска, з прускіх гарадоў, асабліва з Крулеўца. Працягваўся кірмаш 10 дзён і больш.

Прыведзеныя даныя аб зборы ў Мінску падатку за напіткі сведчаць аб тым, што важнае месца ў гандлі займаў продаж алкагольных

напіткаў. Прычым пераважна прадавалі іх мясцовыя гандляры. У спіску плацельшчыкаў падатку за напіткі ў горадзе за 1772 год адзначана больш за 130 чалавек. У пачатку 80-х гадоў у Мінску было 176 «розных трункоў», г. зн. такіх месц, дзе прадаваліся напіткі, а ў 1800 годзе ў ім налічвалася 199 водачных і піўных і 45 мядовых шынкоў. Даволі значным быў таксама гандаль у горадзе соллю, селядцамі, рыбай, алеем, тытунём, смалой, дзёгцем. Гандаль гэтымі таварамі абкладваўся спецыяльным «сосавым» падаткам.

Вялікія змены адбыліся ў знешнім гандлі Мінска. Нароўні з традыцыйным вывазам мясцовых рамесных вырабаў, асабліва скураных тавараў, воску, мёду, шчаціння, мясцовых і рускіх футраў, мінскія купцы сталі ўсё больш экспартаваць лён, пяньку, канаплянае і льняное семя, зерне, лясныя матэрыялы, паташ, смалу, дзёгаць, рагожы.

Адначасова змяняецца і галоўны кірунак вывазу. Асноўнымі пунктамі, куды мінскія купцы везлі свае тавары, сталі Вільня, Гродна, Крулевец і Гданьск. Пунктамі адпраўлення тавараў былі вілейская і стаўбцоўская прыстані. Безумоўна, што некаторыя мінскія купцы прымалі ўдзел у вывазе па рацэ Бярэзіне лясных матэрыялаў і прадуктаў хімічнай перапрацоўкі драўніны ў Рыгу і на Украіну.

З-за мяжы мінскія купцы прывозілі галандскія палотны, сукны, баваўняныя і шаўковыя тканіны, брусковае і паласавое жалеза, соль, селядцы, цукар, каву, вінаградныя віны. Гэтыя тавары звычайна прывозіліся ў Мінск і адсюль ужо накіроўваліся на кірмашы ў іншыя беларускія гарады. Але частку тавараў купцы прадавалі і не завозячы ў Мінск. Напрыклад, вялікія партыі він, прывезеных з Крулеўца, закупляліся на стаўбцоўскай прыстані.

З Украіны па рэках Дняпры і Бярэзіне ў Мінск увозілася ў значнай колькасці крымская соль.

Як відаць, у канцы XVIII стагоддзя мінскія купцы ўстанавілі ажыўленыя прамыя гандлёвыя сувязі з прускімі купцамі без пасрэдніцтва літоўскіх і асабліва польскіх купцоў; узмацніўся іх непасрэдны гандаль з расійскімі купцамі.

Жыхары Мінска ў сваёй гандлёва-прамысловай дзейнасці часта вымушаны былі браць грашовыя пазыкі. Крэдыт меў ліхвярскі характар. Пазыка давалася часцей за ўсё пад заклад («заставу») нерухомасці. Буйнымі крэдыторамі-ліхвярамі былі купцы і багатыя рамеснікі, асобныя феадалы і манастыры. Яны давалі буйныя пазыкі не толькі прыватным асобам, але і гарадской мяшчанскай абшчыне, а таксама яўрэйскай абшчыне.

Большасць жыхароў Мінска, як і раней, былі звязаны з сельскагаспадарчымі заняткамі — мелі агароды, сады, трымалі свойскую жывёлу. У апісанні Мінска 1790 года з пералічаных 966 (без мана-

стыроў) «дымаў» 228 мелі агароды («агародныя») і 202 — зямельныя ўчасткі («грунтавыя»). Для большасці жыхароў земляробства было дадатковым заняткам да іх прамысловай або гандлёвай дзейнасці. З 624 «дымаў», пералічаных у няпоўным апісанні Мінска 1775 года, толькі каля 60 былі названы земляробчымі («ральнічымі»).

У 1800 годзе ворная зямля і сенажаці Мінска складалі каля 1470 гектараў. Значную частку гэтай зямлі займалі фальваркі, якія належалі манастырам, шляхце і купцам.

5. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей


Жыхары Мінска моцна цярпелі ад самавольства феадалаў, якое асабліва ўзрасло ў час войн і пасляваеннага разбурэння краіны. Напрыклад, у 1674 годзе да горада падышоў атрад войск літоўскага гетмана і патрабаваў ад гараджан за «ахову» выплаты гетману звыш 1000 злотых. Мяшчане Мінска ў многіх скаргах каралю і ў розныя суды паведамлялі аб бясчынствах, гвалтах, разбоях і рознага роду беззаконных дзеяннях мясцовых улад і феадалаў.

Як ужо адзначалася, з узмацненнем самавольства феадалаў быў звязан рост іх уласнасці ў гарадах і асабліва ператварэнне іх уладанняў у юрыдыкі. Пашырэнне феадальных юрыдык значна ўзмацняла падатковыя цяжкасці мяшчанскай абшчыны. У сваіх скаргах мінскія мяшчане абвінавачвалі феадалаў у тым, што яны і асобы, якія знаходзіліся пад іх «пратэкцыяй», ухіляліся ад выплаты гарадскіх падаткаў, што прыводзіла мяшчан «да надзвычайнага збяднення» і «ўбоства».

Часамі мінчане аказвалі феадалам прамое супраціўленне. Так, у сярэдзіне XVIII стагоддзя асабліва абвастрыліся адносіны мяшчан са старастам Іосіфам Іваноўскім у сувязі з захопам ім гарадскіх зямель. Узрыў абурэння мяшчан адбыўся вясной 1751 года, калі Іваноўскі пачаў будаваць млын на рацэ Свіслачы, паблізу ад замка, на незаконна атрыманых магістрацкіх зямельных участках. 27 красавіка ноччу пад гукі набату каля тысячы людзей, узброеных ружжамі, коп'ямі, пікамі, кінуліся разбураць недабудаваныя млын і мост, а потым накіраваліся да замка. Тут адбылася ўзброеная сутычка з замкавымі салдатамі.


Абвастраюцца супярэчнасці не толькі паміж гарадской абшчынай Мінска і феадаламі, але і ў асяроддзі самога мяшчанскага насельніцтва.


Улада ў гарадскім самакіраванні замацоўваецца за невялікай групай купцоў і найбольш багатых рамеснікаў. Сярод асоб, якія зай-




Макет варот старажытнага Мінска

Старажытны Мінск. З рысунка С. Мусінскага









Месца старажытнага замка

Падмурак храма старажытнага Мінска



Мінскі храм XII стагоддзя.
Рэканструкцыя А. Т. Міцяніна



Прадметы хатняга ўжытку і ювелірныя вырабы мінскіх рамеснікаў


Нажная ступа



Раскопкі замчышча старажытнага Мінска

Рамесніцкія вырабы








Саборная плошча




Мінск. З гравюры XIX стагоддзя



Від горада з боку старажытнага замка





Екацярынінская **царква.**
Пабудавана **ў 1611 г.**



Магаметанская мячэць

Від на Татарскую слабаду





Аляксандра-Неўская царква на ваенных могілках

Царква былога жаночага манастыра

Від горада з Троіцкай гары



мялі вышэйшыя пасады ў мінскім магістраце, амаль заўсёды быў хто-небудзь з багацейшых купецкіх сем'яў: у другой палове XVII — пачатку XVIII стагоддзя — Грыгаровічаў, Алісевічаў, Шышак, у другой палове XVIII стагоддзя — Шэйбаў, Каліноўскіх.

Члены магістрата ў самавольстве і гвалтах ненамнога ўступалі феадалам. Так, у 1679 годзе бурмістр Міхаіл Алісевіч са сваімі «памочнікамі» ўварваўся ў дом цэхмістра кушнернага цэха, пабіў яго і ўчыніў разгром. Падобныя дзеянні мінскія «магістрацкія асобы» рабілі і стагоддзем пазней. Напрыклад, у 1773 годзе цэхмістр краўецкага цэха Казлоўскі скардзіўся ў магістрацкі суд на бурмістра Таранкевіча, які пагражаў Казлоўскаму турмой і хацеў пазбавіць яго цэхмістэрства.

Сваю пасаду члены магістрата выкарыстоўвалі для асабістага ўзбагачэння. Яны, як правіла, бралі ў арэнду гарадскія даходныя месцы, на ільготных умовах куплялі гарадскую нерухомасць. Былі выпадкі і прамога крадзяжу сабраных магістратам грошай. У 1675 годзе бурмістра Яўзовіча выкрылі ў прысваенні з гарадской касы 200 злотых. У 1776 годзе было ўстаноўлена, што адзін з магістрацкіх падатковых зборшчыкаў Людвіг Марцэнт збіраў грошы на рамонт гарадской ратушы без выдачы квітанцый.

Магістрат, ахоўваючы інтарэсы багатай вярхушкі, перакладваў цяжар падаткаў на астатнюю масу мяшчанскага насельніцтва горада. У рашэнні каралеўскага асэсарскага суда, прынятым у пачатку 70-х гадоў XVIII стагоддзя, адзначалася, што ў Мінску пры абкладанні падаткамі «так адбывалася, што людзі бедныя і немаёмасныя церпелі і церпяць, а багатыя рознымі спосабамі ўхіляліся»; незаконна накладваўся на цэхі гіберновы падатак, некаторыя падаткі збіраліся ў казну ратушы ў большай суме, чым было прынята.

Мяшчане Мінска змагаліся супраць самавольства і фінансавых злоўжыванняў гарадской вярхушкі. У асобных выпадках ім удавалася прыцягваць да адказнасці асабліва бессаромных членаў магістрата. Часамі мяшчане, асабліва цэхавыя рамеснікі, адмаўляліся плаціць накладзеныя на іх грашовыя сумы. Так, у 1675 годзе цэхмістры і паспольства «адмовіліся плаціць падатак» на «войска» па роспісу, складзеным магістратам. У 1776 годзе магістрат абвінаваціў цэхмістраў кавальскага і гарбарнага цэхаў у «непаслушэнстве і падбухторванні цэхавых людзей» пры зборы падаткаў, устаноўленых магістратам. У 1791 годзе да магістрацкага суда прыцягвалася «ўся брацыя» слясарнага цэха за адсутнасць «патрэбнага парадку» ў цэху, нявыплаты подацей у магістрацкую казну і «непаслушэнства ўладам».

Востры характар мелі сацыяльныя супярэчнасці паміж рамеснікамі-майстрамі і іх наёмнымі работнікамі. Ніякія гарадскія правы

і прынялі не абаранялі людзей наёмнай працы. Але нават і такая катэгорыя наёмных работнікаў, як цэхавыя падмайстры і вучні, становішча якіх у якойсьці ступені вызначалася цэхавымі статутамі, фактычна заставалася бяспраўнай.

Пры разглядзе ў цэхах і магістраце канфліктаў, якія ўзнікалі паміж падмайстрамі, вучнямі, з аднаго боку, і іх майстрамі, з другога, гэтыя арганізацыі амаль заўсёды прымалі рашэнні на карысць майстроў. У 1665 годзе ў Мінскім магістрацкім судзе падмайстар-дротнік Крыштор Крайкевіч і двое паўпадмайстраў — слесары Ян і Стэфан Валіцкія абвінавацілі трох цэхмістраў — мечніка, кацельшчыка, слесара і двух майстроў-слесараў у збіванні іх гэтымі асобамі і незаконным выключэнні імі Стэфана Валіцкага з цэхавага рэестра. Суд аштрафаваў вінаватых у збіванні падмайстра, але адначасова і саміх скаржнікаў прысудзіў да чатырох дзён турэмнага зняволення, «каб свавольства не разраслося». Калі ў 1784 годзе падмайстар-мечнік Іосіф Каранавіцкі звярнуўся са скаргай да мінскага лентвойта на майстра, які бязлітасна пабіў яго за тое, што ён не пайшоў да яго служыць, лентвойт яму адказаў: «Майстар правільна паступіў». У 1790 годзе на сходцы слясарнага цэха разбіралася скарга вучня Адама Каржанеўскага аб неаднаразовым збіванні яго майстрам, у якога ён служыў. Было прызнана, што майстар так пабіў «нявіннага хлопца», што той «ад неміласэрнага біцця цяжка захварэў». А рашэнне прынята такое: майстра аштрафаваць, а вучня папярэдзіць, што калі ён «не будзе паслушным, добрасумленным і старанным... ён будзе прыкладна пакараны».

Рознага роду сацыяльны ўціск жыхароў Мінска, як і іншых беларускіх гарадоў, дапаўняўся нацыянальна-рэлігійным прыгнётам большай часткі яго насельніцтва.

У 1696 годзе ў Рэчы Паспалітай было ўстаноўлена абавязковае справаводства ва ўсіх дзяржаўных установах толькі на польскай мове. У сеймавай пастанове 1699 года асобна агавораны права займаць пасады ў гарадскіх магістратах уніятамі, што яшчэ больш ушчамляла інтарэсы праваслаўнага насельніцтва. Праваслаўным купцам чыніліся перашкоды ў іх гандлёвых паездках у рускія гарады. Напрыклад, мінскаму купцу Яўмену Астроўскаму ў 1673 годзе не быў дазволен выезд з таварамі ў Маскву на той падставе, што ён «яўны схізматык» (г. зн. праваслаўны). Але асноўным сродкам падаўлення нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай культуры беларускага народа было, як і раней, распаўсюджанне каталіцызму і уніі.

Каталіцызм і уніяцкія ордэны ў Мінску, атрымоўваючы значныя падарункі ад феадалаў і багатых гараджан, праводзячы буйныя ліхварскія аперацыі, бязлітасна эксплуатуючы сялян у сваіх маёнтках,

збіралі вялікія грашовыя сродкі, на якія будавалі велічныя касцёлы і вялізныя кляштары.

Каталіцкае і уніяцкае духавенства, абапіраючыся на падтрымку феадалаў і ўлад, дамагалася акаталічыць і схіліць да уніі беларускае насельніцтва, нярэдка ўжываючы прамы гвалт. Ігумен мінскага праваслаўнага Пятроўскага манастыра ў скарзе расійскаму Сіноду ў 1756 годзе паведамляў, што уніяцкае духавенства «бязмерна... народ прыгнятае», сілай прымушаючы да пераходу ў каталіцтва і уніяцтва, і такім гвалтам мноства народу з праваслаўнай веры «ў рымскую і унію ператварылі ўжо».

Беларускае насельніцтва ў сваім супраціўленні акаталічванню і апалячванню знаходзіла падтрымку ў рускага ўрада. У прыватнасці, рускі камісар па ахове праваслаўнага насельніцтва і праваслаўнай царквы Рудакоўскі ў 1724 годзе звяртаўся ў Галоўны літоўскі трыбунал з патрабаваннем прыняць меры для спынення здзеку і самавольства каталіцкага і уніяцкага духавенства над праваслаўнымі жыхарамі Мінска.

Нягледзячы на ўсе намаганні каталіцкага і уніяцкага духавенства і ўлад, якія яго падтрымлівалі, поўнасцю выкараніць праваслаўе ў Мінску ім не ўдалося.

Барацьба жыхароў Мінска супраць сацыяльнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту была надзвычай ускладнена рознага роду супярэчнасцямі, якія мелі месца ў асяроддзі насельніцтва. Асабліва паслабляла кансалідацыю жыхароў як адзінага гарадскога стану іх прыналежнасць да розных юрыдык, неаднолькавае падатковае і прававое становішча, нацыянальная і рэлігійная раз'яднанасць.

РАЗДЗЕЛ V

ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД І КУЛЬТУРА ФЕАДАЛЬНАГА МІНСКА

Гістарычна склаўшымся цэнтрам Мінска да XVI стагоддзя заставаліся Замчышча, размешчанае на невялікім узвышшы пры ўпадзенні ракі Нямігі ў Свіслач, і Ніжні рынак. Тут былі сканцэнтраваны адміністрацыйныя і культавыя будынкі, жылыя дамы феадалаў, духавенства.

Горад інтэнсіўна рос у паўднёвым кірунку, і ўжо ў XVI стагоддзі цэнтр яго паступова перамясціўся ў раён Верхняга рынку (цяпер плошча Свабоды). Адначасова расце і прыгарад Мінска, які знаходзіўся на левым беразе Свіслачы на Троіцкай гары (раён тэатра оперы і балета і сумежная з ім каля ракі тэрыторыя). Гэты раён быў заселены ўжо ў XV стагоддзі. Троіцкае прадмесце звязвалася з горадам мостам і грэбляй, а з другой паловы XVI стагоддзя — двума мастамі.

У XV—XVI стагоддзях Мінскі замак, жылыя дамы і іншыя будовы былі драўлянымі. У горадзе часта адбываліся пажары. Адным з найбольш вялікіх пажараў, у выніку якога, як пісаў вялікі князь, «...замок менский и место менское, зо всими маентностями их, подданных наших, погорело», быў пажар 1547 года. Ён так моцна спустошыў горад, што аб ім на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў запар неаднаразова ўпаміналася ў вялікакняжацкіх прывілеях. Неўзабаве пасля пажару ў Мінск прыбылі вялікакняжацкія рэвізоры з заданнем упарадкаваць забудову гарадскіх вуліц і плошчаў. Тады ж асноўны гандлёвы цэнтр горада быў перанесен на плошчу Высокага рынку. Работы па ўпарадкаванню забудовы вуліц у гэтым раёне горада пра-

цягваліся да канца XVI стагоддзя. Так, у каралеўскай грамаце 1589 года прапаноўвалася, каб гараджане «для порадного будованья тому месту домы свои, которые бы были на перешкоде будованью места, зносили...»

Да гэтага перыяду адносіцца апісанне Мінска італьянцам Аляксандрам Гваньіні, камендантам Віцебска. «Мінск,— пісаў ён,— вялізны драўляны горад, замак яго зроблены з дубу, размяшчэнне яго і форма спрыяльныя для абароны, замак абкружаны глыбокім ровам і ракой, на якой ёсць некалькі грэбляў». Маскоўскі дзяк Трыфан Карабейнікаў, які праязджаў на чале пасольства праз Мінск у 1593 годзе, у сваім апісанні параўноўвае Мінск з рускім горадам Вязьмай, у якім на пасадзе ў канцы XVI стагоддзя налічвалася 500 двароў. К канцу XVI стагоддзя тэрыторыя Мінскага замка ў параўнанні з вырасшым гарадскім пасадам складала нязначную частку горада, граніцы якога даходзілі да цяперашніх вуліц Дзімітрава на поўначы, Рэспубліканскай на захадзе, Інтэрнацыянальнай на поўдні і раёна тэатра оперы і балета на ўсходзе.

У старадаўняй частцы Мінска — раёне замка і Ніжняга рынку — планіроўка вуліц захавалася аж да XX стагоддзя. Да нашых дзён засталіся назвы некаторых з гэтых вуліц. Непасрэдна да замка прымыкалі Замкавая, Падзамкавая і Завальная вуліцы. Асноўнай магістраллю старой часткі горада была вуліца Нямігская (або Няміга). Няміга ўзнікла на гандлёвай дарозе з усходу на захад. Працягам асноўнай магістралі старога горада на левабярэжным прадмесці была Троіцкая вуліца (цяпер вуліца Максіма Горкага). Участак цяперашняй вуліцы Максіма Горкага ад моста ўздоўж 2-й клінічнай бальніцы называўся Вялікай Барысаўскай вуліцай. У раёне Ніжняга рынку знаходзіліся вуліцы Зыбіцкая (цяпер Гандлёвая), Казьмадзям'янаўская, якая злучала Нямігу з Верхнім рынкам, Зазыбіцкая. Ад Нямігі на паўночны захад ішла Ракаўская вуліца (цяпер вуліца Астроўскага). У XVI стагоддзі на правым беразе Свіслачы на поўнач ад замка ўзнікла Татарскае прадмесце (або Татарскі канец). Гэты раён горада ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя пачаў даволі інтэнсіўна засяляцца, аб чым сведчыць з'яўленне тут шэрага вуліц, у тым ліку Малой (вуліца Калгасная) і Вялікай Татарскай (вуліца Дзімітрава), якая адыходзіла ад Замкавай вуліцы. На перакрыжаванні «вуліц Татарскіх» былі пабудаваны мячэць і дзве царквы. Паміж Татарскім канцом, замкам і ракою ляжалі так званыя Татарскія агароды. Апрача вялікіх, праезджых вуліц, існавалі маленькія вуліцы і завулкі.

К сярэдзіне XVII стагоддзя забудоўваецца частка горада, сумежная з плошчай Верхняга рынку. Яе забудова праводзілася больш планамерна. Гэтаму садзейнічалі спрыяльныя прыродныя і тапаграфіч-

ныя ўмовы: адсутнасць балота, падземных вод, якія пастаянна затаплялі раён Ніжняга рынку, наяўнасць будаўнічага матэрыялу ў гэтай лясістай мясцовасці, шырокае плато, якое ўзвышалася над акаляючай мясцовасцю і было зручным для забудовы і абароны горада. Вуліцы тут былі прамыя і больш шырокія, чым у старой частцы горада. Некаторыя з іх захавалі да цяперашняга часу кірунак і памеры — Койданаўская (цяпер Рэвалюцыйная), Зборавая (Інтэрнацыянальная), якая атрымала назву ад кальвінскай абшчыны (збору) у XVII стагоддзі. Абедзве вуліцы ў дакументах часта называюцца Вялікая Койданаўская і Вялікая Зборавая ў адрозненне ад вуліц Койданаўская і Зборавая (цяпер не існуюць). Койданаўская і Зборавая вуліцы перасякалі Феліцыянскую вуліцу (цяпер Камсамольская).

Засяленне верхняй часткі Мінска ў XVI стагоддзі стрымлівалася з-за адсутнасці абарончых збудаванняў у гэтым раёне. У сувязі з гэтым у пачатку XVII стагоддзя вакол новых граніц горада быў насыпан земляны вал з бастыёнамі, а перад земляными ўмацаваннямі выкапаны роў. Вал праходзіў прыблізна там, дзе праходзяць цяпер вуліцы Рэспубліканская, Урыцкага, Ленінскі праспект, вуліца Янкі Купалы. З поўначы земляны вал праходзіў па вуліцы Дзімітрава і за Татарскім канцом, а на левым баку ракі Свіслачы — за Стара-Віленскай вуліцай і за Троіцкай гарой. Вядома, што пры выхадзе з горада на магістральных вуліцах будаваліся брамы («Брама Койданаўская» — цяпер рог вуліц Рэвалюцыйнай і Рэспубліканскай). Гэтыя граніцы Мінска заставаліся нязменнымі да канца XVIII стагоддзя.

Унутры гарадскіх умацаванняў у паўднёвай частцы горада, галоўным чынам у раёне Верхняга рынку, узніклі новыя вуліцы. Ад плошчы Верхняга рынку на поўдзень працягнуліся дзве паралельныя вуліцы — Францысканская (цяпер Ленінская) і Дамініканская (цяпер Энгельса). Уніз ад плошчы Верхняга рынку да ракі Свіслачы вялі вуліцы Бернардынская (цяпер Бакуніна), Зазыбіцкая (цяпер Герцана), Валоцкая, або вуліца Валокі Полацкія (цяпер частка Інтэрнацыянальнай вуліцы ад кансерваторыі да Гандлёвай вуліцы), Семінарская (цяпер Музычны завулак).

К сярэдзіне XVII стагоддзя Мінскі замак захаваў сваё абарончае значэнне. У замку размяшчалася рэзідэнцыя старасты і яго «судная изба». У вежы каля замкавай брамы была турма («везене замковое»); трыма сценамі яе служыў земляны вал. Аб таўшчыні земляного вала можна меркаваць па апісанню ўцёку з гэтай турмы ў 1595 годзе чатырох пяршайскіх баяр, якія «глубоко землею, может быть на две сажни, под стену и под поли забитые подкопавшысе... с того везенья поутекали...» Такім чынам, таўшчыня земляного вала Мінскага замка была не менш пяці метраў. Вышыня замкавага вала дасягала

20 метраў. У пачатку XVII стагоддзя побач з ім пабудавалі другі драўляны замак (ніжні), але ў час руска-польскай вайны 1654—1667 гадоў абодва замкі згарэлі ў час штурму горада. Рускія ваяводы ў Мінску ў 1656 годзе спрабавалі аднавіць крэпасць на месцы старога замка і пабудаваць новую крэпасць у раёне Верхняга рынку, выкарыстоўваючы каменныя пабудовы Святадухаўскага мужчынскага базыліянскага кляштара (цяпер месца паміж вуліцай Бакуніна і Домам прафсаюзаў). Але к канцу XVIII стагоддзя захаваўся толькі крапасны вал у раёне старога замка. Па плану 1783 года на тэрыторыі Замчышча і Ніжняга рынку размяшчаўся 41 забудаваны зямельны ўчастак. Незабудаваная нізкая частка замкавай плошчы і Ніжняга рынку была забалочана.

Пасля забудовы тэрыторыі Верхняга рынку к канцу XVIII стагоддзя выразна абазначаліся тры раёны горада — Замчышча, раён Ніжняга рынку з сумежнымі з ім Троіцкім і Татарскім прадмесцямі, а таксама плошча Верхняга рынку з сумежнымі вуліцамі. Чэх Б. Танер, які ў сакавіку 1678 года праязджаў у Маскву, так апісвае Мінск: «Гэта — горад вялікі, які раскінуўся па ўзгорках і ў далінах». Уражанні аб Мінску як аб вялікім горадзе засталіся ў стольніка П. А. Талстога, які праязджаў у 1697 годзе, і ў англійскага падарожніка В. Кокса (70-я гады XVIII стагоддзя).

Тэрыторыя горада ў канцы XVIII стагоддзя складала каля трох квадратных кіламетраў. Згодна з «Тапаграфічным апісаннем Мінскай губерні» 1795 года, прастора Мінска разам з прадмесцямі распасціраецца ўздоўж і ўпоперак ад паўтары да дзвюх, а ў акружнасці да сямі вёрст.

Асноўную масу пабудоў горада складалі драўляныя жылыя дамы гараджан. Але ў горадзе было нямала і каменных будынкаў. П. А. Талстой запісаў у сваім дзённіку: «У Мінску ёсць шмат дамоў каменных, і ў радах, дзе гандлююць, крамы каменныя...» З 1009 жылых дамоў у Мінску ў 1800 годзе было 39 каменных і 970 драўляных. Іншых будынкаў (касцёлы, цэрквы, манастыры, багадзельні, млыны, кузні і інш.) налічвалася ў агульнай складанасці 48.

Зямельныя ўчасткі, якія належалі жыхарам горада, цэрквам і манастырам, называліся пляцамі. Мяркуючы па даных аб забудаваных пляцах гараджан у XVII стагоддзі, на розных вуліцах горада і прадмесця яны былі прыкладна аднолькавымі — па 250 квадратных метраў.

У сядзібе заможнага гараджаніна размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя будынкі, цагляныя скляпы, агароды і сады. Так, у 1582 годзе ў сядзібе мяшчанкі Ганны Крыніцкай, у раёне Ніжняга рынку, былі пякарня, лазня, бровар і склеп, «а ку тому огород овощовый...» У жылым доме яе былі тры святліцы. У 1675 годзе ў сядзібе мешча-

ніна пана Казлоўскага на вуліцы Зазыбіцкай размяшчаліся канюшня і цагляны склеп. Жылы драўляны дом яго складаўся з дзвюх палоў («ізб»). Збоку была дабудавана трэцяя «ізба».

Большасць каменных будынкаў знаходзілася ў раёне Верхняга рынку. Належалі яны багатым гараджанам і духавенству. Апісанне аднаго з такіх дамоў, які размешчаны на рагу Верхняга рынку і вуліцы Койданаўскай (на яго месцы зараз знаходзіцца дом № 1 па вуліцы Рэвалюцыйнай) і належаў багатаму мінскаму мешчаніну Ягору Гегеру, адносіцца да 1654 года. Гэта быў двухпавярховы каменны дом. У цэнтры яго фасада, звернутага да плошчы Верхняга рынку, знаходзіўся парадны ганак з дубовымі дзвярамі. Багата выглядаў фасад будынка. Яго ўпрыгожвалі 15 прамавугольных шкляных вокнаў у чатырохстворчатых свінцовых рамах. Разныя ліштвы абрамлялі вокны дома, што выходзілі на рынак. Знешняя галерэя з точанымі слупкамі і поручнямі абкружала самы вялікі пакой другога паверха.

На даху дома, пакрытым гонтамі, стаялі тры жалезныя пазалочаныя флюгеры. Кожны з іх уяўляў сабой Георгія-Пабеданосца, які сядзеў на кані і паражаў кап'ём дракона, а фігурка на чацвёртым флюгеры, устаноўленым над ганкам, уяўляла сабой казачную фею Мелюзіну, якая іграла на лютні.

Пад домам знаходзілася вялізнае сутарэнне са скляпеністай столлю. На першым паверсе, самым вялікім і багата аздобленым, быў пакой («святліца») з размаляванай столлю, белай кафлянай печчу і разным камінам. Пячная размалёўка і разьба на камінах упрыгожвалі пакоі другога паверха. Усе дзверы ў доме былі зроблены з дубу і ўпрыгожаны разьбой. У двары знаходзіліся канюшня, склеп, стары драўляны дом. Вежавыя брамы складалі разам з домам адзіны архітэктурны ансамбль, у якім спалучаліся драўляныя формы старажытнарускай архітэктуры з элементамі заходнееўрапейскай.

Плошча Верхняга рынку ў другой палове XVII і ў XVIII стагоддзі сваім знешнім выглядам значна адрознівалася ад забудовы старых раёнаў горада. Гэта была вялізная для гарадоў Беларусі таго часу квадратная плошча, старана якой раўнялася 130 метрам. Яе абкружалі шматвежавыя касцёлы. Цэнтральным будынкам у гэтым архітэктурным комплексе з'яўляўся езуіцкі (пазней Кафедральны) касцёл, пабудаваны ў 1709 годзе ў стылі барока. Асобныя архітэктурныя элементы яго фасада і інтэр'ера захаваліся да нашых дзён (цяпер будынак ДСТ «Спартак»).

Амаль у цэнтры плошчы Верхняга рынку стаяў двухпавярховы каменны будынак гарадской ратушы. Як сведчыць Танер (1678 год), «галоўнае ўпрыгожанне плошчы — ратуша, якая стаіць у сярэдзіне і абкружана мноствам крам». Іанійскія невялікія парталы, адзін

з якіх быў у цэнтры будынка, а два іншых абрамлялі яго, вылучалі гэты будынак з агульнага комплексу забудовы плошчы. Ратушу ўвенчвала невялікая вежа з невысокім шпілем.

Сярод культавых будынкаў у раёне плошчы Верхняга рынку вылучаліся сваімі архітэктурнымі формамі мужчынскі і жаночы бернардынскія кляштары. У 1628 годзе мужчынскі кляштар быў пабудаван з дрэва, а праз дзесяць год на яго месцы ўзніклі каменныя будынкі, якія захаваліся да нашых дзён (будынак былога абласнога архіва і побач па вуліцы Бакуніна адміністрацыйны будынак). У 1656 годзе рускі ваявода ў Мінску В. Якаўлеў пісаў аб касцёле бернардынскага мужчынскага кляштара: «А костел... добре велик, каменной и высок». Насупраць мужчынскага кляштара ў 1642 годзе былі ўзведзены каменныя будынкі кляштара і касцёла манахінь-бернардынак (зараз царква і будынак, які знаходзіцца побач на вуліцы Бакуніна). На Зборавай вуліцы знаходзіўся кляштар бенедыктынак. Касцёлы і цэрквы былі і на іншых вуліцах. У 1795 годзе ў Мінску налічвалася 11 каменных культавых будынкаў і 6 драўляных.

Наступленне каталіцызму адлюстравалася на архітэктуры горада. У другой палове XVII і ў XVIII стагоддзі з'явіліся будынкі ў стылі барока і готыкі.

Будаўнічыя работы ў горадзе выконвалі члены цэха ганчароў, каменшчыкаў і цесляроў. У статуце цэха прадугледжвалася, што каменшчык «павінен умець скласці чарцёж будынка і ўзвесці дом у адпаведнасці з чарцяжом».

З пашырэннем граніц горада, забудовай новай тэрыторыі і павелічэннем насельніцтва ўзрасталі патрэбы жыхароў у забеспячэнні пітной вадой, увядзенні элементарных санітарных мер, апекаванні калек, хворых і іх лячэнні.

Жыхары горада карысталіся вадой галоўным чынам са Свіслачы. У горадзе былі і студні, аб якіх упамінаецца ў дакументах XVII стагоддзя. У прывілеі на магдэбургскае права Мінску (1499 года) дадзены дазвол пабудаваць грамадскую лазню. Грамадскія лазні абслугоўваліся лазеншчыкамі. Некаторыя гараджане будавалі лазні на ўласных пляцах.

Жыхары горада часта пакутвалі ад эпідэмій, якія выклікалі масавую смяротнасць. Асабліва вялікія эпідэміі былі ў 1505, 1603, 1633, 1655, 1706, 1741 гадах.

Сярэдневяковая медыцына была бездапаможнай у барацьбе з эпідэміямі. Медыцынскіх устаноў у сучасным разуменні гэтага слова не было. Прататыпам іх з'яўляліся шпіталі — установы пры брацтвах і манастырах, у якіх невялікаму ліку хворых і калек, што пастаянна жылі там, аказваўся прытулак, элементарны догляд і медыцынская дапамога за кошт дабрачыннасці. Першае ўпамінанне аб

адкрыцці ў Мінску такога шпіталю адносіцца да 1513 года, калі архімандрыт мінскага Вазнясенскага манастыра Сергій атрымаў «местце в замку менском на обдилание дому убежища». У тым жа годзе гэты акт быў пацверджаны граматай вялікага князя.

Другі шпіталь у Мінску адкрыўся праз 80 год. У 1592 годзе мінскія мяшчане, заснаваўшы брацтва пры саборнай Раждзественскай царкве (інакш «Бярэзскае брацтва»), прасілі караля зацвердзіць яго і дазволіць адкрыць пры ім шпіталь. Мяшчане матывавалі сваю просьбу тым, што «люди в хоробах и уломные беспечное и спокойное мешкание... дозору и опатренья никоторого не мають и в великом недостатку суть». Шпіталь Раждзественскага брацтва знаходзіўся ў гарадскім замку на правым беразе Свіслачы «...по конец мосту низкого...»

У 1599 годзе ў дакуменце ўпамінаецца трэці шпіталь пры царкоўным Васкрасенскім брацтве. Узнікненне яго было звязана з ахвяраваннем дома на вуліцы Нямізе з гаспадарчымі будынкамі і агародам. Адначасова быў перададзены яшчэ адзін дом з агародам (на Ніжнім рынку) шпіталю Раждзественскага брацтва. Чацвёрты, брацкі шпіталь быў створаны пры Петрапаўлаўскім брацтве ў 1633 годзе.

У руках уніяцкага духавенства з 1616 па 1633 год знаходзіўся шпіталь пры саборнай царкве, які перайшоў у 1633 годзе ва ўладанне праваслаўнага Петрапаўлаўскага брацтва. З 1651 года ў Мінску існаваў шпіталь уніятаў. Усяго ў Мінску ў XVII стагоддзі было шэсць шпіталяў.

У XVIII стагоддзі ў Мінску налічвалася чатыры шпіталі: шпіталі Петрапаўлаўскага і Раждзественскага праваслаўных брацтваў, а таксама два шпіталі каталіцкіх ордэнаў баніфратраў (з 1700 года) і рахітаў (з 1713 года). У 1791 годзе ў Мінску быў адкрыты ваенны шпіталь літоўскага войска.

Колькасць людзей, якія атрымлівалі ў шпіталі прытулак, рэдка перавышала 20 чалавек. Яны па магчымасці даглядалі хворых.

У Мінску, як і ў іншых гарадах Беларусі, шпіталі ўтрымліваліся за кошт узносаў брацтваў, ахвяраванняў феадалаў і даходаў манастыроў, а таксама за кошт прыбыляў з запісаных на іх гандлёвых або рамесных прадпрыемстваў (медаварняў, паперняў і млыноў).

Медыцынскую дапамогу насельніцтву аказвалі галоўным чынам цырульнікі. У статуце мінскага цэха цырульнікаў у 1635 годзе ўказвалася, што цырульнікі павінны займацца «галеннем, стрыжкай, кровапусканнем, хворых лячэннем, лякарстваў даваннем...» У мінскім цэху было не больш сямі-васьмі майстроў, кожны з якіх меў права трымаць у сябе аднаго падмайстра і двух вучняў. Адначасова два майстры з'яўляліся цэхмістрамі (старшынамі). Агульная колькасць

цэхавых цырульнікаў в майстрамі, падмайстрамі і вучнямі складала каля 30 чалавек.

Цырульнікі-майстры ўваходзілі ў прывілеяваную сацыяльную групу гарадскога насельніцтва. Яны вызваляліся ад розных павінасцей. Так, у 1595 годзе «шляхетный Павел Шнель-Скаршевский, цырульник, в науках лекарских добре вицвиченый и везде людем потребный...» быў вызвален ад выплаты падатку («капшчызны»), а дом яго — ад пастою.

Цырульнікі падтрымлівалі аўтарытэт свайго цэха. Калі яны сутыкаліся з выпадкамі складанага захворвання, то абавязаны былі «ўзяць савет» у цэхмістраў і ў іншых майстроў, каб сябе і брацтва не ганьбіць». Член цэха цырульнікаў з павагі да свайго рамяства не меў права выходзіць з дому без плашча і шапкі, з адшпіленымі рукавамі. Над уваходам у дамы цырульнікаў вывешваліся знакі іх рамяства — медныя тазікі для галення.

З сярэдзіны XVII стагоддзя правам лячэння сталі карыстацца і аптэкары. Ім дазвалялася прадаваць карэнні і займацца цырульніцтвам. У дакументах упамінаецца аб дзвюх аптэках у Мінску (у 1659 і ў 1741—1748 гадах). Уладальнік першай — аптэкар Крыштоф Рабец, «человек, потребный для поратованья людского здоровья», другая належала члену мінскага магістрата аптэкару Яну Давыду Шэйбе. Над яго домам быў устаноўлены каралеўскі герб у знак манапольнага права продажу медыкаментаў.

Элементарную медыцынскую дапамогу маглі аказваць лазеншчыкі, але яны мелі права практыкаваць толькі ў лазнях.

Аб стане асветы ў Мінску захаваліся нешматлікія звесткі. Розныя дакументы XV—XVI стагоддзяў, судовыя запісы магістрата сведчаць аб распаўсюджванні пісьменнасці сярод пэўнай часткі насельніцтва горада. Граматнымі былі прадстаўнікі духавенства, чыноўнікі вялікакняжацкай адміністрацыі і гарадскога магістрата, а таксама многія феадалы. Сваё адукаванне некаторыя з іх атрымалі ў школах пры цэрквах і манастырах. Напэўна, адна з такіх школ існавала пры мінскім Вазнясенскім манастыры, у інвентары якога (1579 год) пералічваецца вялікая колькасць друкаваных і пергаментных (перапісных) кніг царкоўна-службовага характару. Некаторыя з іх маглі служыць у якасці вучэбных кніг.

У наступныя гады на развіццё асветы ў Мінску аказвала ўплыў барацьба супраць каталіцкай агрэсіі. Найбольш актыўнай сілай, якая аказвала супраціўленне каталіцызму, былі праваслаўныя брацтвы пры цэрквах і манастырах. У Мінску першае брацтва заснавана ў 1592 годзе пры саборнай царкве. Каралеўскім прывілеем гэтаму брацтву было дазволена адкрыць школу і трымаць пры ёй настаўніка («бакаляра») для выкладання роднай і грэчаскай моў. Гэта была

пачатковая школа, якая давала для «дзетак малых», як сказана ў дакуменце, элементарную асвету.

Праз 20 год (у 1612—1613 гадах) пры Петрапаўлаўскім брацкім манастыры была заснавана школа па ўзору Віленскай. У ёй манахі-паслушнікі бясплатна выкладалі дзецям феадалаў і гараджан беларускую, грэчаскую і лацінскую мовы, а таксама сем «свабодных мастацтваў». Гэта школа карысталася шырокай папулярнасцю і падтрымкай праваслаўнага насельніцтва горада і ваяводства. Праваслаўныя феадалы ўносілі багатыя ахвяраванні на ўтрыманне школы і брацтва пры Петрапаўлаўскім манастыры. З гэтай падтрымкай не мог не лічыцца і ўрад Рэчы Паспалітай. У 1633 годзе кароль Уладыслаў IV зацвердзіў за брацтвам права трымаць школу для людзей хрысціянскіх і іх дзяцей, а таксама мець друкарню.

У пачатку XVII стагоддзя ў Мінску ўзнікла уніяцкая школа пры Казьмадзям'янскім манастыры. Першае ўпамінанне аб ёй адносіцца да 1617 года. У гэты час у школе налічвалася некалькі дзесяткаў вучняў, якія займаліся ў розных класах. Вучні малодшых класаў называліся «хлапятамі», старшых — «выраскамі». Настаўнікамі тут былі манахі-базіліяне. Вядомы імёны двух з іх: Дзяніс Хмяльніцкі і Мікалай Новак. У 1630 годзе кароль даў прывілей манахам уніяцкага базіліянскага ордэна ў Мінску, які дазваляў ім вучыць дзяцей усім навукам і мовам: грэчаскай, лацінскай, царкоўнаславянскай, беларускай і польскай. На уніяцкую школу распаўсюджваліся ўсе ільготы, якімі карысталіся каталіцкія школы. У 1653 годзе гэты прывілей быў зацверджаны.

З другой паловы XVII стагоддзя асвета ў горадзе надоўга пападае ў рукі манахаў розных каталіцкіх ордэнаў. Прыблізна з гэтага часу закрываюцца брацкія школы. У 1727 годзе ў Мінску існавала школа пры кляштары дамініканцаў, у 1771 годзе ў Троіцкім прадмесці была адкрыта школа пры кляштары марыявітак, у якіх выхаванак навучалі мовам, арыфметыцы, дамаводству.

Езуіты аселі ў Мінску ў 1654 годзе. Неўзабаве ім удалося адкрыць невялікую школу, у якой навучаліся дзеці шляхты. У 1682 годзе пры матэрыяльнай падтрымцы магнатаў і шляхты яны пашырылі сваё вучылішча. Граматыка, сінтаксіс, рыторыка і паэзія складалі кола прадметаў, якія выкладаліся ў гэтай школе. К пачатку XVIII стагоддзя ў ёй вучылася звыш 30 чалавек. У сярэдзіне XVIII стагоддзя ў школьную праграму езуіты ўключылі тэалогію, стараяўрэйскую мову, этыку, матэматыку, фізіку, логіку і метафізіку. Навучанне ў школе працягвалася сем год.

У 1773 годзе ў сувязі з рэформай асветы ў Рэчы Паспалітай і ліквідацыяй ордэна езуітаў Мінскае вучылішча пры езуіцкай калегіі было пераўтворана ў шасцікласную школу, падначаленую Эдукацый-

най камісіі. З-за недахопу выкладчыкаў Эдукацыйная камісія павін-
на была аставіць ранейшых настаўнікаў.

Асноўнымі прадметамі сталі матэматыка, фізіка, прыродазнаў-
ства, геаграфія, лацінская, французская і нямецкая мовы, логіка.
Вялікая ўвага ўдзялялася прадметам фізіка-матэматычнага цыкла,
якія давалі практычныя веды. У адрозненне ад езуіцкага вучылішча,
дзе выкладанне вялося на лацінскай мове, у школах Эдукацыйнай
камісіі навучальны працэс ажыццяўляўся на польскай мове. Выкла-
данне тэалогіі ў сценах школы забаранялася. Мінская школа была
сярэдняй навучальнай установай, і паспяховае заканчэнне яе давала
права на паступленне ва універсітэты. Свабодны доступ у гэту шко-
лу мелі толькі дзеці шляхты.

Першае ўпамінанне аб архіве ў Мінску адносіцца да 1612 года,
калі ў Мінскім замку быў узведзены будынак для захоўвання «судо-
вых кніг земскіх і гродскіх».

Да XVII стагоддзя рэгулярнай паштовай сувязі ў Беларусі не бы-
ло. Лісты каралю ад ваявод і іншых службовых асоб перасылаліся
спецыяльнымі кур'ерамі. У 1620 годзе ў Рэчы Паспалітай была ўве-
дзена паштовая служба. Паміж найбольш буйнымі гарадамі дзяржа-
вы (уключаючы Мінск) былі наладжаны паштовыя сувязі з тым, каб
«кожны тыдзень весці перадавацца маглі бы і перасылка лістоў, кож-
наму саслоўю вельмі неабходных, рабілася». У 1717 годзе паштовая
служба пачынае стварацца ў Літве і Беларусі. Адна з буйных пашто-
вых дарог ішла з Вільні «ў Белую Русь, на Мінск, Магілёў, да самых
граніц Маскоўскіх». У другой палове XVIII стагоддзя ў Мінску зна-
ходзілася адна з буйнейшых паштовых станцый у Беларусі з пакоя-
мі для прыезджых. На кожнай станцыі пошту і падарожнікаў чакалі
зменныя коні.

Святкаванні гараджане праводзілі ў культавых будынках і на
дзвюх гарадскіх плошчах — Замкавай і плошчы Верхняга рынку.
Тут жа наладжваліся цэхавыя святы і шэсці. Кожны цэх меў свае
штандар і бубны, і святочнае шэсце членаў цэха, адзетых у яркія
жупаны і курткі, са зброяй, знамёнамі і музычнымі інструментамі
выглядала маляўніча і ўрачыста. У кірмашовыя дні на плошчах вы-
ступалі скамарохі і дрэсіроўшчыкі з мядзведзямі.

Помнікаў выяўленчага мастацтва і народнай творчасці, створа-
ных у Мінску к канцу XVIII стагоддзя, не захавалася. Але ў асобных
дакументах і дзённіках падарожнікаў расказваецца аб старажытных
іконах, фрэсках на сценах мінскіх цэркваў на плошчы Верхняга
рынку, разьбе, якая аздабляла дамы гараджан. Прыгожа выглядалі
дамы рамеснікаў і крамы гандляроў, на якіх віселі знакі рамяства
(«медніцы») і шыльды («табліцы»). Фігурная група на будынку ра-
тушы была лепшым упрыгожаннем плошчы Верхняга рынку.

Многія рамеснікі Мінска былі выдатнымі майстрамі сваёй справы. Сярод іх былі разбяры па дрэву, мастакі-маляры, без работы якіх не ўзводзіўся ні адзін дом багатага гараджаніна, адміністрацыйны або культавы будынак. Аб умельстве мечнікаў сведчаць складаныя патрабаванні, якія прад'яўляліся статутам цэха збройнікаў, залатых спраў майстроў і іншых прафесій да іх вырабаў. Варанёны меч павінен быў зіхацець «як люстэрка». Эфес мяча ўпрыгожваўся каралеўскім і гарадскім (уяўляў сабой дзеву Марыю з шасцю анёламі) гербамі, якія былі выгравіраваны на медных пласцінках. Адным з упрыгожванняў мяча з'яўлялася медная з проразямі гарда на эфесе, якая засцерагала кісць рукі ад сустрэчнага ўдару. «Рыцарскія вузлы» з плеценага меднага дроту, з дапамогай якіх прымацоўвалася ручка, таксама служылі ўпрыгожаннем мяча. Каралеўскі герб і герб горада Мінска майстар павінен быў выгравіраваць і на меднай аправе ножан. Збройнікі ўпрыгожвалі шаблі і каштоўнымі металамі.

У дакументах XVI стагоддзя захаваліся некаторыя звесткі аб быце гараджан Мінска. Так, у завяшчанні мяшчанкі Варушы Яцукоўны (1599 год) пералічаны прадметы хатняга ўжытку, якімі карысталіся багатыя гараджане. З тонкага галандскага або англійскага сукна (фалендыша) і аксаміту былі пашыты казацкі жупан з 27 срэбранымі гузікамі, куртка і іншыя прадметы верхняга мужчынскага адзення. Зброя і даспехі (шышакі, прылбіца, зарукаўі) з'яўляліся неабходнай прыналежнасцю ваеннага ўбору багатага гараджаніна. Посуд быў зроблены з серабра (кілішак і кубак) і волава (талеркі, міскі, кубкі).

Новы этап у гісторыі культуры горада пачаўся пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй.

РАЗДЗЕЛ VI

МІНСК У ПЕРЫЯД РАСПАДУ ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКІХ АДНОСІН

1. Мінск пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй

Ўз'яднанне з Расіяй дабратворна адбілася на эканамічным, палітычным і культурным развіцці Беларусі. Беларусь увайшла ў сістэму ўсерасійскага рынку, што стварыла шырокія перспектывы для развіцця шэрага галін вытворчасці і гандлю. Прыкметна ажывілася гаспадарчая дзейнасць гарадоў.

З увядзеннем адміністрацыйнага падзелу і кіравання па расійскаму ўзору і так званай «Жалаванай граматы гарадам» 1775 года адмянялася юрысдыкцыя свецкіх і царкоўных магнатаў у гарадах. Самавольству феадалаў у горадзе, якое на працягу стагоддзяў перашкаджала іх развіццю, быў пакладзен канец.

Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй спрыяльныя ўмовы склаліся і для развіцця Мінска. Указам 20 красавіка 1793 года на тэрыторыі з гарадамі Мінскам, Слуцкам, Барысавам, Мазыром, Навагрудкам, Пінскам, Рэчыцай утвараецца Мінскае намесніцтва, а са снежня 1796 года — пасля перайменавання намесніцтва ў губерню — Мінск становіцца галоўным горадам губерні.

Каб даць магчымасць гораду папраўіць сваю гаспадарку, урад прымае некаторыя меры заахвочвання: была паменшана частка падаткаў, прадастаўлена пазыка, купцы і рамеснікі на два гады былі вызвалены ад выплаты акладных збораў.

Упарадкоўваліся дарогі, якія злучалі Мінск з гарадамі Расіі.

Усё гэта хутка адбілася на эканамічным жыцці горада.

К пачатку XIX стагоддзя Мінск прыкметна вырас. Колькасць жыхароў

з 1797 па 1800 год павялічылася з 5794 да 7135 чалавек. Колькасць дамоў узрасла да 1009.

Мінск ператвараўся ў адзін з важных цэнтраў эканамічнага жыцця Беларусі. Аднак гэты працэс быў затрыман у выніку нападу напалеонаўскіх полчышчаў. Праз некалькі дзён пасля пачатку вайны французскія войскі падышлі да Мінска. 26 чэрвеня войскі корпуса Даву занялі горад. Па дазволу камандавання Мінск, як і іншыя захопленыя напалеонаўскай арміяй гарады, быў на чатыры дні аддадзены на рабунак салдатам. Аднак і пасля таго, як прайшоў гэты тэрмін, марадзёрства французскіх салдат не спынялася. Французы адбіралі ў жыхароў прадукты і маёмасць, рабавалі і грамілі крамы.

Акупанты сканцэнтравалі ў Мінску правіянцкія склады для забеспячэння войск прадуктамі, стварылі ў горадзе эвакуацыйны пункт і шпіталь для раненых і хворых французскіх салдат. Пад прадуктовыя склады былі заняты, апрача старых правіянцкіх магазінаў, Петрапаўлаўскі сабор і некаторыя касцёлы. У будынках гімназіі, адміністрацыйных устаноў, некаторых манастыроў, Екацярынінскай царквы і нават гарадской турмы размясціліся шпіталі. Але гэтых памяшканняў аказалася недастаткова для размяшчэння ўсё прыбываўшых раненых і хворых, і французскія ўлады занялі шмат прыватных дамоў. Акупанты ператварылі горад ў суцэльны лазарэт.

Французскі інтэндант Сальнье і ваенны камісар Разье гаспадарнічалі ў Мінску з нахабнасцю рабаўнікоў. Паводле свайго меркавання яны займалі дамы гараджан для шпіталяў і для пастояў войск, самавольна вызначалі памер плацяжоў і паставак з насельніцтва губерні. Французскія ўлады стараліся прыцягнуць да ўдзелу ў абсталяванні і ўтрыманні лазарэтаў жыхароў горада, але абрабаванае і прыгнечанае насельніцтва адмаўлялася дапамагаць захопнікам.

Кучка здраднікаў з ліку мясцовай шляхты, рабалепствуючы перад акупантамі, старалася хвалебнымі артыкуламі ў мясцовай «Минской газете» заглушыць растучае абурэнне насельніцтва. З яе дапамогай французскае камандаванне стварыла адміністрацыйныя органы, асноўнай мэтай якіх было правядзенне рэквізіцыі прадуктаў і мер, якія забяспечвалі бяспеку тылу войск акупантаў, збор падаткаў. Але жыхары Мінска ўсё больш рашуча аказвалі супрацьдзеянне французам, адмаўляліся плаціць падаткі, ішлі ў лясы. Гаспадарчае жыццё ў горадзе замерла.

У пачатку кастрычніка 1812 года разбітая, дэзарганізаваная армія Напалеона, адступаючы пад ударамі рускіх войск, прыблізілася да граніц Мінскай губерні. З паўднёвага захаду на Мінск насустрач французам рухалася армія Чычагова.

У Мінску к пачатку лістапада былі сканцэнтраваны нязначныя сілы французаў: там знаходзіўся гарнізон з пяці тысяч чалавек. Гэты

атрад пад камандаваннем генерала Касецкага накіраваўся насустрач рускаму войску. Пад Нясвіжам 1 лістапада французы былі разбіты, а Касецкі з сотняй салдат уцёк у Мінск. Напалеон спрабаваў стрымаць наступленне рускіх войск: да Барысава рухаліся войскі маршала Удзіно, з-пад Бабруйска на Мінск ішоў Дамброўскі. Аднак атрады Чычагова апярэдзілі французаў і дзейнічалі ўжо паблізу Мінска. Да вечара 4 лістапада Мінск быў вызвалены рускімі войскамі. Французы спешна адступілі. У горадзе засталося больш за дзве тысячы хворых і раненых салдат і афіцэраў напалеонаўскай арміі, вялікая колькасць ваеннай маёмасці. Праціўнік не паспеў знішчыць вялікія запасы прадуктаў, сабраныя ў правіянцкіх магазінах, склады пораху і свінцу.

21 лістапада 1812 года, атрымаўшы загад Кутузава неадкладна вярнуцца ў горад і заняцца яго аднаўленнем, мінскі губернатар прыпрапаваць у горадзе губернскія ўстановы.

Французскія акупанты за чатыры месяцы свайго гаспадарніцтва зусім разбурылі горад і парушылі яго гаспадарчае жыццё. Многія дамы былі спалены, разрыты вуліцы, масты разбураны. Насельніцтва Мінска паменшылася больш чым у тры разы.

У 1811 годзе ў горадзе налічвалася 11 200 жыхароў, а ў канцы 1812 года, пасля вызвалення, — усяго 3480 чалавек.

Агульныя страты, прычыненыя Мінску французскімі акупантамі, склалі вялікую суму — звыш 370 тысяч рублёў асігнацыямі.

Аднаўленне Мінска ішло вельмі павольна: больш чым паўгода патрабавалася толькі на ачыстку горада ад смецця, яшчэ доўга многія дамы стаялі паўразбуранымі.

2. Гаспадарчае развіццё

Па меры аднаўлення Мінск паступова набываў значэнне аднаго з буйных цэнтраў эканамічнага жыцця не толькі Беларусі, але і Расіі перш за ўсё як горад з развітай рамеснай вытворчасцю.

Вырабы мінскіх рамеснікаў мелі шырокі попыт не толькі на мясцовым рынку. У першай чвэрці XIX стагоддзя, напрыклад, мінскія капялюшнікі сваю прадукцыю вывозілі ва ўсе часткі ўнутранай Расіі. Вядомы былі за межамі Беларусі мінскі абутак, залатыя і сярэбраныя вырабы.

Найбольшае развіццё ў горадзе атрымалі рамёствы па вырабу адзення і абутку. Напрыклад, у 1840 годзе з 913 цэхавых рамеснікаў 340 былі краўцамі, 153 шаўцамі, 82 капялюшнікамі, 82 ганчарамі, 80 кавалямі і слесарамі і г. д.

К пачатку 60-х гадоў мінскія рамеснікі выраблялі прадукцыю на 570 тысяч рублёў у год.

Рост мясцовага рынку, уключэнне Беларусі ў сістэму ўсерасійскага рынку прывялі да значнага пашырэння рамеснай вытворчасці ў горадзе. На працягу першай паловы XIX стагоддзя ў Мінску значна павялічылася колькасць рамеснікаў. У 1800 годзе іх было 1340, у 1853 годзе — прыкладна 2400, а ў пачатку 60-х гадоў — каля 3160 чалавек. У сярэдзіне XIX стагоддзя з'явіліся новыя рамесныя спецыяльнасці — фартэпіянных спраў майстры, механікі.

У першай палове XIX стагоддзя ў беларускіх гарадах працягвала існаваць сярэдневяковая форма арганізацыі рамеснікаў — цэхі. У 1800 годзе ў Мінску было 9 цэхаў, якія аб'ядноўвалі 1157 рамеснікаў больш за 50 розных спецыяльнасцей. У 40—50-х гадах цэхаў налічвалася ўжо больш за 20.

У рамеснай вытворчасці на працягу першай паловы XIX стагоддзя адбыліся значныя змены, выкліканыя ўзнікненнем элементаў капіталістычнай вытворчасці. Пад іх уплывам усё шырэй прымянялася наёмная праца, расло падпарадкаванне рамеснікаў скупшчыку. Асобныя, найбольш заможныя майстры станавіліся прадпрыемцамі, якія арганізоўвалі вытворчасць на капіталістычных пачатках.

Нярэдка ўладальнік майстэрні выступаў ужо не як майстар — непасрэдны вытворца рамесных вырабаў, а як пасрэднік паміж вытворцамі і спажыўцамі. Пасрэднікам паміж рамеснікамі і рынкам выступаў падрадчык, або «прамысловец». Раздаючы ўзяты ім заказ іншым майстрам па частках, падрадчык па сутнасці ператвараў майстроў цэха ў наёмных хатніх рабочых. К сярэдзіне XIX стагоддзя прадпрыемніцкая дзейнасць у Мінску дасягае вялікіх памераў. Падрадчыкі падпарадкавалі сабе ўсё гаспадарчае жыццё горада. Без іх пасрэдніцтва не праводзілася амаль ні аднаго мерапрыемства на будаўніцтве або добраўпарадкаванні горада. «Минские губернские ведомости» 40-х гадоў запоўнены аб'явамі аб аддачы з торгаў у падрад той або іншай гаспадарчай справы.

Капіталістычныя адносіны нанеслі ўдар па сярэдневяковай цэхавай сістэме арганізацыі рамяства. У ёй адбыліся сур'ёзныя змены. Абмежаванні ў найме майстрам ліку вучняў, падмайстраў, якія раней строга захоўваліся, на працягу першай паловы XIX стагоддзя былі адменены. Некаторыя майстры мінскага цэха кавалёў і слесараў, а таксама шавецкага цэха мелі да васьмі вучняў, якія фактычна з'яўляліся наёмнымі рабочымі ў майстэрні свайго гаспадара. На такім жа становішчы знаходзіліся і падмайстры.

Адпалі характэрныя для цэхаў абмежаванні ў сферы вытворчасці і збыту вырабаў.

У жніўні 1852 года Мінская гарадская дума распрацавала новыя рамесныя пастановы ў адпаведнасці з правіламі, зацверджанымі Сенатам. У Мінску арганізавалася гарадское рамеснае таварыства з мэтай «удасканалення рамёстваў пры дапамозе ўзаемнай парады і дзеяння яго членаў», для чаго кожныя чатыры месяцы склікаўся сход рамеснікаў. Таварыства павінна было купляць за агульны кошт прылады, машыны, інструменты, рабіць розныя спробы, накіраваныя на паляпшэнне спосабаў рамеснай вытворчасці.

Хоць новыя пастановы не ліквідавалі цэхавай арганізацыі, аднак яны паслабілі стрымліваючую ролю цэхаў у развіцці вытворчасці. Была ліквідавана самастойнасць цэхаў у гаспадарчых і юрыдычных пытаннях. Агульнае кіраванне ўсімі цэхамі ажыццяўляў рамесны галава, які падпарадкоўваўся магістрату і даваў справаздачу гарадской думе. Ён ведаў пытаннямі запісу і выключэння з цэха, сачыў за зборам падацей і выкананнем павіннасцей з боку ўсіх рамеснікаў, разбіраў судовыя справы паміж членамі рамеснага таварыства, правяраў цэхавую казну і г. д. У цэх мог запісвацца любы, хто жадаў займацца ў горадзе рамяством. У пастанове ўказвалася, што цэх не меў права «нікому забараніць дзённага пракармлення работаю». Пункт 74 пастаноў дазваляў часова запісвацца ў цэх сялянам і разначынцам, калі яны займаліся рамяством.

Былі адменены нацыянальныя і рэлігійныя абмежаванні пры прыёме ў цэх. Ад запісу ў цэх вызвалялася вялікая колькасць рамесных спецыяльнасцей: мастаўшчыкі, землякопы, каменшчыкі, каменячосы, тынкоўшчыкі, цесляры, падзёншчыкі, чорнарабочыя, фурманы, людзі, якія былі на паслугах, рабочыя фабрык і заводаў і г. д. Адным з важных пунктаў новай пастановы з'явілася прадастаўленне членам цэха права наймацца на фабрыкі і заводы.

Майстрам цэха мог быць такі рамеснік, які (апрача добрага веданя свайго рамяства) быў у стане завесці майстэрню з наяўнасцю інструментаў для работы і не менш двух чалавек. Ён меў права трымаць наёмных работнікаў, колькасць якіх не абмяжоўвалася, і «ад работы іх атрымліваць сабе выгаду».

Майстрам-рамеснікам дазвалялася прадаваць вырабы свайго рамяства «дома або на плошчы», калі ж яны прадавалі свае вырабы ў крамах, то павінны былі запісвацца ў купцы трэцяй гільдыі. Аднак гэты пункт звычайна не захоўваўся: нямала рамеснікаў трымалі крамы, у якіх яны прадавалі свае вырабы без пасведчанняў гільдыі. Ні рамесны сход, ні цэхавая ўправа не мелі права ўстанаўліваць цэны на вырабы: яно належала самому рамесніку. Цэхавая ўправа сачыла толькі за якасцю вырабу і за адпаведнасцю яго вазе і меры, устаноўленым прадпісаннем аб рамястве. Гэта ліквідавала манапольнае становішча цэхаў на рынку.

Цэхавая арганізацыя ў XIX стагоддзі ўжо не з'яўлялася замкнутай карпарацыяй, якой яна была ў папярэдні перыяд, яна згубіла сваю ранейшую эканамічную ролю. Але і ў такім выглядзе цэхі перашкаджалі росту новых з'яў у прамысловай вытворчасці.

Многія рамеснікі і прадпрыемцы стараліся абысці цэхавыя правілы і заводзілі свае майстэрні без атрымання дазволу старшыны цэха. У Мінску існавала нямала майстэрняў, гаспадары якіх не былі членамі цэха. Цэхі спрабавалі змагацца з пашырэннем няцэхавай рамеснай вытворчасці, неаднаразова звярталіся са скаргамі ў гарадскую думу і ў губернскае праўленне, аднак становішча не мянялася.

У гаспадарчым жыцці горада ўсё большае значэнне набывала арганізацыя рамеснай вытворчасці, заснаванай на вольнанаёмнай працы, павялічвалася колькасць буйных майстэрняў, раслі прадпрыемствы мануфактурнага тыпу.

Большасць прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу, якія існавалі ў Мінску ў першай палове XIX стагоддзя, уяўляла сабой пашыраную майстэрню рамесніка. У ёй звычайна працавалі, апрача ўладальніка, тры-чатыры наёмныя рабочыя.

Дзейнасць гэтых прадпрыемстваў абмяжоўвалася нязначнымі заказамі і задавальненнем мясцовых патрэб, вырабы іх збываліся галоўным чынам у горадзе. Агульная сума выпушчанай у 1843 годзе прадукцыі на 13 прадпрыемствах горада (двух палатняных, адным гарбарным, сямі свечкавых і трох тытунёвых) ледзь дасягала 6800 рублёў, а колькасць занятых на іх рабочых не перавышала 50 чалавек.

Найбольш значным было прадпрыемства, якое вырабляла палатно. У год яно выпускала палатняных вырабаў на 1200 рублёў серабром. Працаваў на ім сам гаспадар, выкарыстоўваючы працу чатырох сваіх вучняў. Гарбарнае прадпрыемства вырабляла ў год 950 штук розных скур на суму да 750 рублёў.

Прадпрыемствы па вырабу свечак былі невялікімі рамеснымі майстэрнямі, дзе працавалі ўладальнік з адным памочнікам — вучнем або наёмным рабочым. Кожная з іх выпускала ў сярэднім па 150 пудоў свечак у год на суму 450 рублёў.

Тытунёвыя прадпрыемствы вырабляліцыгары, тытунь для курэння і нюхання з сыравіны, якая закуплялася ў Мінску. На найбольш буйным з іх працавалі чатыры рабочыя, якія выпускалі ў год цыгар і тытуню на 730 рублёў.

З іншых прадпрыемстваў у Мінску існавалі піваварні і медаварні, лік якіх у 40-х гадах вагаўся ад чатырох да сямі.

Усе гэтыя прадпрыемствы прыносілі нязначны прыбытак сваім уладальнікам і існавалі звычайна нядоўга. Напрыклад, большасць прадпрыемстваў, указаных у ведамасцях за 1843 год, у 1847—1848 гадах спыніла сваю дзейнасць. Закрыліся капялюшная майстэрня, гар-

барнае, палатнянае прадпрыемствы, чатыры свечкавыя і адно тытунёвае прадпрыемствы; замест іх узнікалі новыя, якія таксама хутка закрываліся.

Слабасць прадпрыемстваў Мінска тлумачылася рознымі прычынамі. Адна з іх — цяжкасць канкурэнцыі з буйнымі памешчыцкімі мануфактурамі, другая — насычанасць мясцовага рынку таннымі вырабамі буйных прамысловых прадпрыемстваў Расіі.

У пачатку XIX стагоддзя ў горадзе пачалі ўзнікаць мануфактуры. Адной з іх было адкрытае ў 1809 годзе на сродкі Прыказа грамадскага прытулку суконнае прадпрыемства з 38 наёмнымі рабочымі. У час акупацыі Мінска напалеонаўскімі войскамі прадпрыемства было разбурана.

У 1803 годзе ў Мінску купцом першай гільдыі Ляхоўскім былі заведзены дзве невялікія мануфактуры — медная і гарбарная. На іх працавалі мясцовыя наёмныя рабочыя. Гарбарнае прадпрыемства праіснавала нядоўга; у 1808 годзе з-за гаспадарчых цяжкасцей яно было закрыта. На медным прадпрыемстве ў 1815 годзе працавалі 12 рабочых, яго вырабы — катлы, бакі і трубы — прызначаліся для абсталявання вінакурных прадпрыемстваў. Аднак праз чатыры гады прадпрыемства таксама закрылася.

У другой чвэрці XIX стагоддзя колькасць мануфактур у Мінску павялічваецца. У 30-х гадах іх налічвалася восем, на кожнай працавалі пяць-шэсць рабочых. Найбольш буйной была суконная мануфактура: у 1833 годзе лік вольнанаёмных рабочых на ёй дасягаў 20 чалавек (у тым ліку былі чатыры жанчыны). Аднак па-ранейшаму пераважнае месца ў прамысловай вытворчасці займалі дробныя прадпрыемствы. У 1860 годзе 28 такіх прадпрыемстваў выпускалі прадукцыі на суму 120 тысяч рублёў у год. Гэта былі цагельні, гарбарныя, піваварныя і медаварныя, свечкавыя, мылаварныя, тытунёвыя прадпрыемствы.

Пры слабым развіцці прамысловай вытворчасці вядучае месца ў гаспадарчым жыцці горада займаў гандаль. У гандлёвых сувязях Мінска, які стаяў у баку ад важных водных артэрый, галоўную ролю адыгрывалі сухапутныя шляхі зносін. Праз Мінск праходзілі чатыры паштовыя тракты: Радашковічы — Ашмяны — Вільня — Барысаў — Смаленск, Ігумен — Бабруйск — Рагачоў — Магілёў, Новы Свержань — Нясвіж — Брэст або Пінск. Такім чынам, Мінск ляжаў на перакрыжаванні дзвюх асноўных ліній — Віленска-Бабруйскай і Барысаўска-Навагрудскай, якія злучалі яго з Магілёвам, Смаленскам, Вязьмай, Масквой, а таксама з Пінскам, Брэстам, Вільняй і далей з Рыгай. Праз Мінск праходзілі таксама і менш значныя дарогі мясцовага значэння, якія звязвалі яго з гарадамі і мястэчкамі губерні.

У 1846 годзе была закончана пабудова буйнейшай магістралі — Маскоўска-Варшаўскай шашы. Яна перасякала Мінскую губерню. Дарога дабратворна адбілася на развіцці гандлю губерні і ўзмацненні гандлёвых сувязей з Масквой і іншымі рускімі гарадамі. Мінск злучаўся з гэтай важнейшай гандлёвай магістраллю дзвюма паштовымі дарогамі: Мінск — Бабруйск і Мінск — Клецк.

Агульны абарот унутранага і знешняга гандлю Мінска ў пачатку XIX стагоддзя дасягаў 200 тысяч рублёў за кошт кірмашовага гандлю і знешняга вывазу. У іх удзел прымала купецтва Мінска. Агульная сума купецкага капіталу ў горадзе складала ў пачатку XIX стагоддзя значную для таго часу суму — 150 тысяч рублёў.

Замест двух кірмашоў у 30-х гадах у Мінску кожны год стаў праводзіцца адзін, які па-ранейшаму называўся кантрактавым. Працягваўся ён з 25 мая па 25 чэрвеня і быў самым вялікім у губерні. Яго абароты дасягалі 300—500 тысяч рублёў. Сярод тавараў, якія прывозіліся для продажу, асноўнае месца займалі вырабы расійскіх фабрык і мануфактур, галоўным чынам ільняныя, шарсцяныя, шаўковыя тканіны, а таксама галантарэя (у агульнай суме прывазных тавараў яны складалі да 40 працэнтаў). Значным попытам карыстаўся посуд і розныя металічныя вырабы, прадметы раскошы. Цэнтр цяжару знешнегандлёвых сувязей Мінска на працягу першай паловы XIX стагоддзя прыкметна перамяшчаўся з захаду на ўсход. Калі ў 1800 годзе на кірмашы пераважалі купцы з Вільні, Варшавы, Гродна, Кенігсберга, Данцыга, то ў 40-х гадах тут сустракаюцца тавары з Масквы, Казані, Смаленска, Уладзіміра, Ніжняга Ноўгарада, Курска, Тулы, Вязьмы, Калугі, Цвяры, Кіева.

Кірмашы, якія раней адыгрывалі значную ролю, у 40-я гады занепадаюць, памяншаюцца іх гандлёвыя абароты.

Рэзка скараціліся гандлёвыя абароты на мінскіх кантрактах: калі ў 1837 годзе было прывезена тавараў на суму звыш 500 тысяч рублёў (з якіх прададзена на 120 тысяч рублёў), то ў 1850 годзе — усяго на 37 тысяч рублёў, а прададзена толькі на 6230 рублёў.

К канцу 50-х гадоў XIX стагоддзя мінскі кірмашовы гандаль зусім упаў; у 60-х гадах «да вызначанага для кантрактаў тэрміну ў горад прыбыло хіба толькі некалькі бухарцаў з халатамі ды якія-небудзь дзве-тры дробныя крамы з галантарэйнымі таварамі».

Спад кірмашовага гандлю ў Мінску не сведчыў аб заняпадзе гарадскога гандлю. Наадварот, памяншэнне прывозу прамысловых тавараў іншагароднім купецтвам садзейнічала развіццю гандлёвай дзейнасці мясцовых купцоў. Абароты гандлю мінскіх купцоў к сярэдзіне XIX стагоддзя дасягалі 500 тысяч рублёў у год. Агульная сума купецкіх капіталаў у Мінску к гэтаму часу вырасла да 250—300 тысяч рублёў серабром, што ў два разы больш у параўнанні

з пачаткам стагоддзя. Гільдэйскіх купцоў у Мінску ў канцы 30—40 гадоў было каля 50 чалавек.

Колькасць крам у горадзе вырасла. У 1800 годзе працавала 124, у 1833 годзе — 263, а ў 1850 годзе — 306 крам. У 1861 годзе ў Мінску былі ўжо 594 крамы, 100 з іх адносіліся да катэгорыі магазінаў. Большасць крам належала мяшчанам. У руках гільдэйскага купецтва знаходзіўся гандаль прывазнымі прамысловымі таварамі, віном, тытунём і да т. п.

Гандаль Мінска ў першай палове XIX стагоддзя развіваўся галоўным чынам за кошт рознічнага продажу. Аптовы ж гандаль вёўся ў невялікіх маштабах і ўключаў продаж прывазных вырабаў мінскім гандлярам, павятоваму купецтву.

Сярод тавараў, якія прывозіліся ў Мінск, пераважалі фабрычныя вырабы. У Маскве закупляліся баваўняныя тканіны, металічныя вырабы, бакалейныя тавары, галантарэя, у Варшаве — дарагое сукно і шарсцяныя тканіны. З Рыгі ішлі замежныя тавары, галоўным чынам шаўковыя і шарсцяныя матэрыі, прадметы раскошы. Вінаграднымі вінамі Мінск забяспечвалі ў асноўным Пецярбург і Рыга.

Гандаль прывазнымі і мясцовымі вырабамі вялі ўладальнікі невялікіх крам. Звычайна ў крамах гандлявалі «ўсім патроху» — адсолі і селядца да шаўковых тканін і ювелірных вырабаў. Аднак элементы спецыялізацыі ўсё ж пранікалі ў крамныя рады. Так, з агульнага ліку 223 невялікіх крам, якія належалі мяшчанам у 1848 годзе, 150 гандлявалі харчовымі прадуктамі, звыш 80 — вырабамі з мукі і крупамі, каля 25 — мясам і рыбай, звыш 20 — гароднінай і садавінай.

Асноўны гандаль прадуктовымі таварамі быў сканцэнтраваны на Ніжнім рынку. Тут размяшчаліся мясныя і рыбныя крамы і так званыя «сундукі» — часовыя крамы, у якіх прадаваліся хлеб, булкі, мука, крупы, бульба, гарох, цыбуля і г. д. У горадзе вельмі шырока быў распаўсюджан гандаль спіртнымі напіткамі; у 1833 годзе ў Мінску налічваліся тры тракціры і 125 папойных дамоў.

Дробны гандаль у Мінску к сярэдзіне стагоддзя пашыраўся да такой ступені, што гільдэйскае купецтва, устрывожанае канкурэнцыямі, дабілася ў 1848 годзе ад гарадской думы прыняцця асобных пастаноў з пералікам назваў тавараў і іх колькасці, якімі дазвалялася гандляваць мяшчанам.

Мінск з'яўляўся ў губерні галоўным спажыўцом сельскагаспадарчых прадуктаў. Часткова свае патрэбы насельніцтва пакрывала за кошт таго, што некаторая яго частка займалася земляробствам. У канцы 50-х гадоў каля 430 сем'яў у Мінску займаліся выключна земляробствам.

Аднак асноўная частка прадуктаў закуплялася ў сялян.

Мінск уяўляў сабой аптовы склад для закупленых у губерні на вываз прадуктаў сельскай гаспадаркі — пянькі, лёну, воску, мёду, сырых і выпрабленых скур, шэрсці, шчаціння, канаплянага і льняного семя, масла, сала і г. д. Іх нарыхтоўка і вывад за граніцу былі ў руках мінскага гільдэйскага купецтва. Сельскагаспадарчыя прадукты нарыхтоўваліся як на месцы іх вытворчасці — у сёлах, маёнтках і мястэчках, так і на рынку, куды прыязджалі сяляне з навакольных вёсак.

Вялікае месца ў аптовых аперацыях мінскіх купцоў займалі закупкі хлеба ва ўкраінскіх губернях і перапродаж яго ў суседнія губерні. У 1848 годзе ў Мінск было прывезена 330 тысяч кулёў рознай мукі, больш за 182 тысячы чвэрцяў жыта, пшаніцы, аўса і розных круп.

Мінск вёў буйны гандаль соллю. Яна прывозілася з Крыма водным шляхам да Барысава, а адтуль сухім шляхам у Мінск, дзе і прадавалася оптам і ў розніцу ў павятовыя гарады і сёлы, вывозілася ў літоўскія губерні.

Такім чынам, гандлёвая дзейнасць Мінска на працягу першай паловы XIX стагоддзя ўсё больш набывала рысы, уласцівыя капіталістычнаму спосабу вытворчасці.

3. Насельніцтва. Адміністрацыйны лад і знешні выгляд горада

Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй сістэма гарадскога кіравання ў Мінску, як і ў іншых гарадах Беларусі, істотна змянілася.

На падставе «Жалаванай граматы гарадам» у Мінску захоўваўся магістрат, але дадаткова яшчэ выбіралася гарадская дума. Абодва органы гарадскога кіравання падпарадкоўваліся непасрэдна губернатару. Цяпер магістрат з'яўляўся толькі судовай установай па справах гарадскіх купцоў і мяшчан і распараджаўся рэкруцкай павіннасцю гарадскога насельніцтва. У абавязак гарадской думы ўваходзілі раскладка і збор дзяржаўных падаткаў, подацей і зборaў з насельніцтва, кіраўніцтва гаспадарчым жыццём горада, клопаты аб добраўпарадкаванні.

Яўрэйскае насельніцтва беларускіх гарадоў да 1844 года мела сваё кіраванне — кагал, які распараджаўся зборам падаткаў і ўсімі грамадскімі справамі яўрэяў. У 1844 годзе было выдадзена палажэнне аб ліквідацыі кагальнай арганізацыі і падпарадкаванні яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і паветах Беларусі агульнаму кіраванню. Яўрэі Мінска аб'ядноўваліся ў яўрэйскае таварыства на чале са старастам і павінны былі плаціць падатак на роўных падставах

з хрысціянскім насельніцтвам згодна з існаваўшымі ў той час норма-
мі падатковага абкладання.

У распараджэнні думы знаходзіліся землі, якія належалі гораду,
будынкі, карчомныя ўстановы, заезныя дамы, млыны, цагельня
і іншыя прадпрыемствы, гарадскія вагі і да т. п.

Зборы і паступленні ад арэнды зямель, якія належалі гораду,
і прамысловых устаноў складалі галоўнейшыя артыкулы гарадскіх
даходаў Мінска. Гарадскія даходы былі нязначнымі і ледзьве дася-
галі 13—17 тысяч рублёў. Больш паловы даходаў даваў пітны збор,
10—12 працэнтаў — зборы ад гандлёвых аперацый і амаль столь-
кі ж — гарадскія млыны, якія здаваліся ў арэнду.

Галоўнымі расходнымі артыкуламі з'яўляліся: утрыманне роз-
ных гарадскіх устаноў — думы, магістрата, турэмнага замка, упра-
вы, гарадской багадзельні, будаўніцтва і рамонт гарадскіх будынкаў,
ачыстка вуліц і плошчаў, утрыманне гарадскога аркестра і тэатра,
асвятленне вуліц і да т. п. Расходы на добраўпарадкаванне горада
былі нікчэмныя.

У гарадскім кіраванні галоўную ролю адыгрывалі багатыя куп-
цы і мяшчане, уладальнікі буйной нерухомасці. Гарадскім галавой
звычайна выбіраўся прадстаўнік багатага купецтва. Дэпутатамі
гарадской думы (яны звaліся «гласнымі») таксама былі купцы,
уладальнікі буйных рамесніцкіх майстэрняў, заможныя мяшча-
домаўласнікі. Пануючыя вярхі пры садзейнічанні гарадскога сама-
кіравання выкарыстоўвалі сваё становішча ў інтарэсах асабістай
нажывы.

Таксама ж бесцырымонна выкарыстоўвалі сваё становішча чле-
ны кагальнага кіравання, якое складалася з купцоў і буйных прад-
прыемцаў: яны эксплуатавалі яўрэйскую беднату, самавольна ўста-
наўлівалі і бралі падаткі і паборы.

Уся сістэма арганізацыі гарадскога самакіравання Мінска служы-
ла інтарэсам заможнай вярхушкі — купцоў, уладальнікаў прамысло-
вых прадпрыемстваў, багатых мяшчан.

За 60 год, з 1800 па 1860, колькасць насельніцтва горада выраслa
з 7135 да 26 760 чалавек, г. зн. больш чым у 3,7 раза. Павелічэнне
насельніцтва адбывалася часткова за кошт натуральнага прыросту,
але галоўным чынам за кошт папаўнення прышлым элементам. Па
ліку жыхароў Мінск у першай палове XIX стагоддзя займаў другое
месца ў Беларусі (пасля Віцебска).

Асноўную масу насельніцтва складаў рамесніцка-гандлёвы люд.
Аднак пранікненне капіталізму ў сельскую гаспадарку расшырыла
крыніцы папаўнення ліку гараджан за кошт дваранства і сялян.
Праўда, апошняя група, задаўленая прыгонніцтвам, не магла зра-
біць прыкметнага ўплыву на рост гарадскога насельніцтва.

Сацыяльная структура насельніцтва Мінска

Групы насельніцтва	1800 год		1827 год		1861 год	
	мужчыны	жанчыны	мужчыны	жанчыны	мужчыны	жанчыны
Мяшчане	1218	1667	4894	3903	6720	7782
Цэхавыя	1157	1269	не паказаны		2441	1046
Дваране	427	432	544	305	1385	1511
Духавенства	84	94	192	35	163	121
Чыноўнікі, ганаровыя грамадзяне	—	—	279	180	229	340
Купцы	87	94	92	77	310	315
Ваеннаслужачыя	—	—	1489	190	3160	229
Сяляне	80	47	284	280	181	122
Дваровыя ў панскіх дварах	—	—	454	155	71	80
Іншыя	318	161	749	489	317	236
Усяго	3371	3764	8977	5614	15206	11554

Па сацыяльнаму складу насельніцтва Мінск у першай палове XIX стагоддзя з'яўляўся яшчэ горадам дакапіталістычным, аднак працэс фарміравання капіталістычнага ўкладу ў гэты час зрабіў свае першыя прыкметныя адзнакі на сацыяльным абліччы Мінска. Так, у 1861 годзе звыш трох тысяч чалавек (з членамі сем'яў) жылі продажам сваёй рабочай сілы. Гэта былі рабочыя мануфактур, чорнарабочыя, падзёншчыкі, мастаўшчыкі, землякопы, муляры, каменячосы, цесляры, наймiты і да т. п.

Асноўная частка мінскіх мяшчан знаходзілася ў вельмі цяжкіх умовах. Тыя, хто працаваў у майстэрні гаспадара або знаходзіў працу ў час будаўнічых работ у горадзе, з цяжкасцю маглі забяспечыць сябе кавалкам хлеба. Праца ў майстэрнях працягвалася 12 гадзін, і аплачвалася яна вельмі нізка. Многія мяшчане мелі толькі выпадковыя заробкі і літаральна ледзь жылі. Мінск, паводле сведчання сучасніка, быў «багаты бяднейшымі сем'ямі». Аб крайне нізкім жыццёвым узроўні працоўнага насельніцтва Мінска сведчыць мноства спраў у архівах гарадской думы па пытанню нявыплаты падаткаў. Адмаўленне ад выплаты падатку з'яўлялася не толькі сведчаннем беднасці асноўнай масы насельніцтва горада, але і было своеасаблівай формай пратэсту працоўнага люду, змучанага голадам і галечай.

Адсутнасць у Мінску ў першай палове XIX стагоддзя буйных прамысловых прадпрыемстваў і перавага мяшчанскага дробнабуржуаз-

нага слоя наклалі свой адбітак на сацыяльнае жыццё горада. У Мінску ў гэты перыяд не было сур'ёзных выступленняў гарадской беднаты.

Нацыянальны склад жыхароў горада Мінска быў стракатым, аднак вызначыць яго няма магчымасці, паколькі статыстычныя даныя таго часу абмяжоўваліся раздзяленнем насельніцтва паводле вызнання на тры групы — хрысціяне, іудзеі, магаметане. Пераважную большасць хрысціянскага насельніцтва складалі беларусы, палякі і рускія.

На нацыянальны склад насельніцтва Мінска, як і іншых гарадоў беларускіх і шэрага ўкраінскіх губерняў, у канцы XVIII стагоддзя быў вялікі ўплыў зрабіў закон аб устанаўленні так званай «мяжы яўрэйскай аседласці». Паводле Палажэння ад 9 снежня 1804 года, у яе былі ўключаны Мінск і Мінская губерня. Па прычыне гэтага на працягу першай паловы XIX стагоддзя ў складзе гарадскіх жыхароў прыкметна павышаецца працэнт яўрэйскага насельніцтва.

Татары жылі ў так званай Татарскай слабадзе. К сярэдзіне стагоддзя іх налічвалася ў Мінску некалькі больш 300 чалавек.

Рост Мінска як эканамічнага і адміністрацыйнага цэнтра губерні зрабіў вялікае ўздзеянне на яго знешняе аблічча. Горад на працягу першай паловы XIX стагоддзя значна вырас тэрытарыяльна: рост гэты ішоў спачатку ў напрамку на ўсход і поўдзень, а ў 50-х гадах — на паўночны захад.

У 1800 годзе горад распасціраўся ў даўжыню на 2 вярсты 450 сажняў, у шырыню — ад 160 да 940 сажняў, пад засяленнем знаходзілася каля 300 дзесяцін. У 1849 годзе было забудавана ўжо каля 370 дзесяцін.

К сярэдзіне XIX стагоддзя ў Мінску было 42 вуліцы, з якіх 22 забрукаваныя; з шасці плошчаў тры таксама былі забрукаваныя.

У 1800 годзе ў горадзе налічвалася 1009 дамоў (39 цагляных), у 1833 годзе — 1432 дамы (176 цагляных), у 1860 годзе — 2119 дамоў (560 цагляных). Расшыраючыся, Мінск паступова страчваў у знешнім абліччы рысы феадальнага горада: былі скапаны земляныя валы з бастыёнамі, выраўноўваліся крывыя завулкі, забудоўваліся пустэчы.

К канцу першай паловы XIX стагоддзя Мінск з'яўляўся тыповым купецка-мяшчанскім горадам. З 1462 дамоў, якія налічваліся ў горадзе ў 1848 годзе, 26 належалі дзяржаве і таварыствам, 102 — дваранству, духавенству, чыноўнікам, 16 — цэрквам і манастырам, 86 — купцам, 1212 — мяшчанам, цэхавым, адстаўным ваеннаслужачым і да т. п.

Змяненні ў эканамічным жыцці горада, звязаныя з працэсам раскладання феадальных адносін і зараджэння новых, капіталістычных

адносін, знайшлі сваё адлюстраванне ў сацыяльным абліччы горада. У той час як у XVIII стагоддзі ў цэнтральнай частцы горада знаходзіліся «камяніцы і пляцы» буйных феадалаў і каталічных манастыроў, у 30-х гадах XIX стагоддзя ў спісу 65 уладальнікаў дамоў на Высокім рынку, па вуліцах Францішканскай, Дамініканскай, Койданаўскай, Захар'еўскай, Юр'еўскай лічылася толькі пяць сярэднепамесных двараў; усе астатнія ўладальнікі — гэта чыноўнікі, купцы, мяшчане.

На працягу першай чвэрці XIX стагоддзя Мінск рос вельмі павольна. Асаблівых мер па перапланаванню, добраўпарадкаванню і перабудове горада тады яшчэ не прымалася. Адзіным значным мерапрыемствам у галіне добраўпарадкавання з'явілася закладка гарадскога саду (зараз парк імя Горкага).

Некаторая перапланіроўка часткі горада, размешчанай на Троіцкай гары, была зроблена пасля пажару 1809 года. Усе крывыя, вузкія вуліцы, завулкі і тупікі выраўноўваліся і расшыраліся. Забудова кварталаў вялася па новаму плану, распрацаванаму ў кастрычніку 1809 года.

Тэрытарыяльнаму пашырэнню Мінска перашкаджала наяўнасць у горадзе вялікіх царкоўных, манастырскіх і феадальных уладанняў. У пачатку XIX стагоддзя 630 дамоў у горадзе (62 працэнты ўсіх гарадскіх будынкаў) былі пабудаваны на прыватнаўласніцкіх і манастырскіх землях «з выплатай аброку». Толькі аднаму мінскаму архірэйскаму дому перайшло ад ліквідаванага базіліянскага кляштара тры дамы, пяць крам, 44 «дваровых месцы» (пляцы) і два фальваркі. Акрамя таго, ён валодаў яшчэ млынам на Свіслачы. Слабада, Камароўка да вайны 1812 года з'яўляліся юрыдыкай князя Радзівіла.

Росту горада перашкаджалі шматлікія рэшткі сярэдневякоўя. Так, правы Мінска на зямлю з цагельняй у слабадзе Пярэспе аспрэчваў Пінскі багаяўленскі манастыр. Горад вёў судовую справу з памешчыкам Немаршанскім з-за зямлі і лесу ў 1834 годзе. Магістрат дабіваўся перадачы ў сваё распараджэнне прыватных уладанняў, размешчаных на тэрыторыі горада. Так было, напрыклад, з землямі архірэйскага дома. На працягу двух год, з 1798 па 1800, губернскія ўлады адабралі ў архірэйскага дома і перадалі гораду каля 170 дзесяцін зямлі пад розныя пабудовы, казармы, плошчы, гарадскі сад, вуліцы і іншыя патрэбы.

На працягу першай паловы XIX стагоддзя ў Мінску адбывалася павольнае, але ўпартае выцісканне з горада яшчэ панаваўшых тут буйных духоўных і свецкіх землеўладальнікаў. Прыватныя зямельныя ўладанні і нерухомая маёмасць на тэрыторыі горада пераходзілі ў распараджэнне гарадскіх улад. У 1841 годзе ўрад выдаў указ аб канфіскацыі нерухомасці ў каталіцкага духавенства; у выніку да

горада адышла значная колькасць зямлі, будынкаў і іншай маёмасці.

К сярэдзіне XIX стагоддзя з існаваўшых у Мінску ў першыя гады пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй 13 манастыроў, якія валодалі вялікімі зямельнымі ўгоддзямі, дамамі, крамамі і іншай нерухомасцю ў горадзе, засталося толькі тры. Аднак яшчэ і ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў Мінску заставаліся прыватныя зямельныя ўладанні на тэрыторыі горада.

Частыя пажары, асабліва ў 1809, 1813 і ў 1822 гадах, наклалі свой адбітак на гаспадарчае жыццё і знешняе аблічча горада. 30 мая 1835 года ў час кантрактавага кірмашу адбыўся вялікі пажар. Агонь знішчыў амаль усю цэнтральную частку горада: Высокі рынак, Юр'еўскую, Францішканскую, Дамініканскую, частку Захар'еўскай вуліц. Згарэлі Петрапаўлаўскі сабор, гімназія, каталіцкая семінарыя, бернардынскія касцёлы, каля 80 жылых дамоў. Агульная сума страт, панесеных казной і прыватнымі асобамі, склала па самых сціплых падліках 880 тысяч рублёў. Без прытулку засталося звыш 220 сем'яў. Такія бедствы былі невыпадковымі: драўляныя старыя дамы з'яўляліся лёгкай здабычай агню. У пажарнай часці Мінска ў 1826 годзе налічвалася ўсяго два брандмайстры і тры пажарнікі. Ненамнога лепшай была проціпажарная ахова горада і ў наступныя гады.

Дума распараджалася вельмі нязначнай сумай для правядзення рамонтна-будаўнічых работ і добраўпарадкавання вуліц і плошчаў: на год для гэтых мэт выдзялялася не больш дзвюх-трох тысяч рублёў.

Адной з крыніц сродкаў на добраўпарадкаванне горада быў так званы «каменны збор» — грашовы падатак, які збіраўся з усіх, хто праязджаў праз мінскія заставы. Збор гэты ў асобныя гады дасягаў дзвюх тысяч рублёў, якія выкарыстоўваліся затым у асноўным для правядзення работ па забрукоўванню вуліц. У 1835—1836 гадах былі забрукаваны Захар'еўская і Койданаўская вуліцы, добраўпарадкавана плошча Высокага рынку, забрукавана Замкавая вуліца.

У 1836 годзе пачаліся работы па расчыстцы пустэчы, якая называлася Новым месцам, дзе зараз знаходзяцца сквер і тэатр імя Янкі Купалы.

Цэнтральная частка Мінска — Высокая вуліца, вуліцы Дамініканская, Францішканская, Юр'еўская — забудоўвалася пасля пажару двух- і трохпавярховымі мураванымі дамамі, якія належалі багатаму купецтву, дваранам, вышэйшым чыноўнікам. У другой чвэрці XIX стагоддзя была забудавана Захар'еўская вуліца, якая з гэтага часу робіцца галоўнай магістраллю горада, а таксама кварталы, размешчаныя на поўдзень ад яе да ракі Свіслачы.

Цэнтрам горада на працягу першай паловы XIX стагоддзя заставаўся раён Высокага рынку. Ён быў забудаваны вялікімі прыгожымі мураванымі будынкамі: тут знаходзіўся Петрапаўлаўскі сабор, кафедральны каталіцкі касцёл, двухпавярховы будынак ратушы, дом, дзе размяшчаліся губернскія ўстановы, гімназія, гасціны двор, дом губернатара, будынкі манастыроў, вялікія жылыя дамы.

Зусім іншы выгляд мелі кварталы, размешчаныя далей ад цэнтра. С. Кавалеўская пісала, што Мінск у першай палове XIX стагоддзя, «як і іншыя гарады, меў многа брудных дворыкаў, у якіх жылі, як у вёсках». Увесь горад, акрамя цэнтральнай часткі, перараза ўся агародамі, з усіх бакоў яго абкружалі выганы і палеткі. З горадам межавалі слабоды — Камароўка, Пярэспа, Раманава, Ляхаўка.

Ускраіны горада, забудаваныя драўлянымі халупамі, дзе жыло працоўнае насельніцтва — дробныя рамеснікі, чорнарабочыя, заставаліся агіднымі смярдзючымі трушчобамі.

Старая частка горада — Нямігская, Замкавая вуліцы, а таксама Ніжні рынак, дзе тулілася яўрэйская беднота і быў сканцэнтраваны дробязны гандаль, таксама зусім не добраўпарадкавалася.

Па Нямігскай вуліцы працякаў ручай — астатак ракі, якая высахла. Вясной і ўвосень ён разліваўся, затапляючы вуліцу і рыначную плошчу.

Надзвычай дрэнная была справа з водазабеспячэннем Мінска. К сярэдзіне XIX стагоддзя горад меў толькі 90 калодзежаў на 25 тысяч насельніцтва. Большая частка жыхароў карысталася забруджанай вадой са Свіслачы, што з'яўлялася прычынай частых захворванняў.

Пры скучанасці насельніцтва і антысанітарыі пастаяннымі з'явамі ў горадзе былі розныя эпідэмічныя захворванні, якія паражалі галоўным чынам ускраіны горада, дзе жыла беднота. Смяротнасць у горадзе часта перавышала нараджальнасць. Асабліва страшэннымі і згубнымі былі эпідэміі халеры і воспы ў 1830, 1848, 1853 гадах. У 1848 годзе халера ў Мінску лютавала каля трох месяцаў. У горадзе хварэлі каля 3550 чалавек (больш $^1/_6$ часткі жыхароў), з іх каля 1100 чалавек памерлі. Такой жа страшэннай была эпідэмія халеры ў 1853 годзе. С. Кавалеўская ў сваіх успамінах аб Мінску гэтага года пісала: «Неўзабаве ў Мінску людзі пачалі, як мухі, падаць на вуліцах. Асабліва вялікай была смяротнасць у яўрэйскіх кварталах».

Нягледзячы на вялікі рост насельніцтва горада, колькасць лячэбных устаноў заставалася нязменнай. К сярэдзіне XIX стагоддзя горад меў тры невялікія бальніцы (на 30—40 чалавек кожная), дзве багадзельні і дом для псіхічна хворых. Максімальная ўмяшчальнасць усіх бальніц горада складала каля 130 чалавек. На патрэбы аховы здароўя адпускаліся надзвычай мізэрныя сродкі.

4. Культурнае і грамадскае жыццё

У першай палове XIX стагоддзя прыкметна вырасла значэнне Мінска як аднаго з важнейшых культурных цэнтраў Беларусі. У Мінску былі сканцэнтраваны асноўныя навучальныя ўстановы губерні. У 1803 годзе мінская ніжэйшая школа была пераўтворана ў губернскую гімназію. Акрамя яе, у горадзе было яшчэ дваранскае павятовае пяцікласнае вучылішча. Адзінай навучальнай установай, даступнай для дзяцей гарадскіх рамеснікаў, з'яўлялася двухкласная прыходская школа. У гімназію і павятовае вучылішча дзеці «простага людзінаў» не мелі доступу. У 1821 годзе, напрыклад, з 320 вучняў гімназіі 303 былі дзеці дваран.

У навучальных установах Мінска ў першыя два дзесяцігоддзі пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй па-ранейшаму панавала каталіцкае і уніяцкае духавенства, якое насаджала каталіцызм і варожасць да ўсяго рускага.

К канцу першай чвэрці XIX стагоддзя ва ўрадавай палітыцы намецілся паварот у адносінах да пытанняў адукацыі ў Беларусі, што было выклікана распаўсюджваннем рэвалюцыйных ідэй, раскрыццём шэрагу губернскіх гімназій. У сувязі з гэтым у 1824 годзе быў створаны спецыяльны камітэт у складзе Аракчэева, Шышкова і Навасільцава, якому была даручана распрацоўка мерапрыемстваў па рэарганізацыі справы адукацыі ў Беларусі. Пастановы камітэта, зацверджаныя 14 жніўня 1824 года, былі рэакцыйнымі па свайму зместу. З ліку прадметаў гімназічнага курса выключаліся прыродазнаўчыя і палітычныя навукі, узмацнялася вывучэнне лацінскай, грэчаскай моў, зменшылася колькасць урокаў па рыторыцы і паэзіі. Былі ўстаноўлены новыя, больш строгія школьныя правілы, спісы вучняў рэгулярна адсылаліся ў паліцыю з заключэннем аб добранадзейнасці. Мінская гімназія, як і іншыя навучальныя ўстановы Беларусі, таксама падвяргалася гэтай рэфармацыі.

У 1832 годзе, пасля падаўлення польскага паўстання, быў закрыты Віленскі універсітэт, рэарганізавана Віленская навучальная акруга. Мінская губерня ўвайшла ў састаў нанава створанай Беларускай навучальнай акругі (перайменаванай пазней у Віленскую), значна скарочанай. У курс выкладання ў школах Мінска, як і іншых гарадоў Беларусі, была ўведзена руская гісторыя. Выкладанне ўсіх прадметаў стала праводзіцца толькі на рускай мове. Пачалося рашучае выкараненне «вальнадумства», быў узмоцнены нагляд за вучнямі.

Гэтыя змяненні школьнай адукацыі мелі рэакцыйную сутнасць. Але разам з тым пераход да выкладання ўсіх прадметаў на рускай

мове, увядзенне ў праграму курса рускай гісторыі — усё гэта далучала навучэнцаў да рускай культуры.

На працягу першай паловы XIX стагоддзя лік навучальных устаноў у Мінску амаль не змяніўся, выросла толькі колькасць навучэнцаў у іх. У горадзе былі гімназія, дваранскае і прыхадское вучылішчы.

У Мінску не было жаночай гімназіі. Тут існавалі прыватныя пансіёны (у 40-х гадах іх было пяць), дзе атрымлівалі адукацыю дочкі памешчыкаў і чыноўнікаў. Толькі ў 1844 годзе адкрылася школа для пачатковай адукацыі «дзяўчат беднага стану», якую маглі наведваць дзеці мяшчан і рамеснікаў. Колькасць вучаніц у гэтай школе ледзьве дасягала 30—50 чалавек. Тут яны атрымлівалі самыя элементарныя веды: навучаліся чытаць і пісаць, рукадзельнічаць, знаёміліся з асновамі арыфметыкі.

Яўрэйскаму насельніцтву ў 1802 годзе было дазволена ствараць яўрэйскія вучылішчы: у горадзе існавалі дзве яўрэйскія школы.

Акрамя свецкіх навучальных устаноў, у Мінску знаходзілася каталіцкая духоўная семінарыя (закрыта ў 1869 годзе), праваслаўнае духоўнае вучылішча, а з 1840 года са Слуцка ў Мінск была пераведзена праваслаўная духоўная семінарыя. Ва ўсіх навучальных установах у 1848 годзе налічвалася каля 90 настаўнікаў і 1430 навучэнцаў.

У горадзе існавала адзіная бібліятэка, якая належала гімназіі. Толькі ў 1836 годзе была адкрыта публічная бібліятэка. Яна размяшчалася ў адным пакоі ў так званым «гарадскім доме» каля гарадскога саду і знаходзілася, паводле прызнання самога губернатара, ва ўбогім стане. На набыццё кніг адпускалася не больш 100—200 рублёў у год. У канцы 40-х гадоў у бібліятэцы налічвалася ўсяго 2100 кніг. Кнігамі карысталася толькі невялікая частка інтэлігенцыі горада.

Кнігавыдавецкай справы ў Мінску ў першай палове XIX стагоддзя фактычна не існавала. Пры губернскім праўленні працавала казённая друкарня, якая друкавала розныя ўрадавыя распараджэнні, указы, цыркуляры і канцылярскія бланкі. У 1838 годзе тут пачынаюць друкавацца «Минские губернские ведомости», а ў 1864 годзе друкарня выпускае асобнай кнігай «Граматы і акты Мінскай губерні».

У 40-х гадах у Мінску былі заснаваны невялікія прыватныя друкарні і літаграфія.

У грамадскім жыцці Мінска ўсё большую ролю адыгрывала тэатральнае мастацтва. Час ад часу ў горад прыязджалі розныя тэатральныя трупы, якія давалі тут спектаклі. Для тэатральных прадстаўленняў выкарыстоўваліся залы ў ратушы, гімназіі, дамы багацеяў.

Вялікай любоўю мінскіх жыхароў карыстаўся гарадскі аркестр, арганізаваны ў 1803 годзе. З 20-х гадоў яго гаспадарамі і капельмайстрамі з'яўляліся бацька і сын Стэфановічы, вядомыя ў той час музыканты. Дамінік Стэфановіч быў настаўнікам музыкі маладога Манюшкі. Сын Стэфановіча Вікенцій таксама быў добрым педагогам.

У 40-я гады назіраецца ажыўленне тэатральнага і музычнага жыцця ў Мінску. Канцэрты даваліся часам прыезджымі спевакамі і музыкантамі, часцей жа мясцовымі сіламі. Вялікім поспехам на гэтых аматарскіх канцэртах карысталіся харавыя рускія народныя песні, якія выконваліся выхаванцамі пансіёнаў.

Яскравая старонка ў культурным жыцці Мінска — творчая дзейнасць выдатнага кампазітара Манюшкі і аднаго з заснавальнікаў беларускай літаратуры пісьменніка Дуніна-Марцінкевіча. У Мінску пачалося іх творчае сяброўства. Хаця Манюшка з 1842 года жыў пастаянна ў Вільні, дзе служыў арганістам у касцёле св. Яна, ён часта прыязджаў у Мінск. Тут у той час існавала невялікая аматарская тэатральная трупа, якая ставіла драмы, аперэты і невялікія оперы. У 1843 годзе яна паставіла невялікую оперу Манюшкі «Латарэя», напісаную ім у 1840 годзе на лібрэта Карвін-Мілеўскага. У Мінску ставіліся таксама оперы і аперэты Манюшкі на лібрэта Дуніна-Марцінкевіча: «Сельская ідылія», «Рэкруцкі набор», «Сялянка». 10 кастрычніка 1841 года аматарскі тэатр паставіў оперу Манюшкі «Рэкруцкі набор», адну з ролей у якой выконваў Дунін-Марцінкевіч.

У 1846 годзе акцёр Вяржбіцкі стварыў у Мінску трупу акцёраў, якая паклала аснову пастаяннаму мінскаму гарадскому тэатру. На падтрыманне тэатра ў Мінску з гарадскіх даходаў пачалі адпускаць дзве тысячы рублёў на год. Тэатр знаходзіўся ў распараджэнні асобай дырэкцыі, якая назначалася губернатарам, абавязковым членам дырэкцыі лічыўся гарадскі галава. Гэтым забяспечваўся пастаянны нагляд за дзейнасцю тэатра.

Цэнзура старанна выкрэслівала ў рэпертуары ўсё «нядобранадзейнае», на сцэне тэатра ставіліся п'есы галоўным чынам на рускай мове, па свайму зместу «бяспечныя» для ўрада.

Нягледзячы на рэакцыйную русіфікатарскую палітыку царызму, беларуская культура развівалася пад жыватворным уплывам прагрэсіўнай рускай культуры. Прадстаўнікі перадавой інтэлігенцыі горада, добра знаёмыя з творамі рускай літаратуры, імкнуліся задаволіць свае культурныя запатрабаванні аматарскімі спектаклямі, якія рыхтаваліся пад кіраўніцтвам артыстаў пастаяннай трупы. Імі былі пастаўлены «Гора ад розуму», «Узяцце Сінопа» і інш., а ў пачатку 40-х гадоў — «Рэвізор».

Знамянальнай падзеяй у гісторыі мінскага тэатра з'явіўся прыезд вядомага рускага трагіка Каратыгіна, які даў у гарадскім тэатры

некалькі спектакляў. У пачатку 50-х гадоў у Мінску пабывала оперная трупа пад кіраўніцтвам Шміткова, у рэпертуары якой былі вядомыя оперы «Рыгалета», «Фра-дыявала», «Цампа», «Лукрэцыя Борджыя», «Лючыя дэ Ламермур» і інш.

Характэрнай рысай у грамадскім жыцці Мінска першай паловы XIX стагоддзя з'яўляецца яго развіццё пад уплывам перадавой рускай грамадскай думкі. Грамадскія рухі, якія мелі месца ў Расіі ў гэты перыяд, у той або іншай ступені знаходзілі сваё праяўленне ў Мінску. Перадавыя ідэі прасочваліся ў асяроддзе гарадской інтэлігенцыі.

У Беларусі знайшлі водгук падзеі, звязаныя з выступленнем дзекабрыстаў. Спробы да паўстання былі ў Літоўскім корпусе, які знаходзіўся ў Гродзенскай губерні, у Палтаўскім палку, размешчаным у Бабруйску. Тут арганізатарамі паўстання з'явіліся члены «Таварыства аб'яднаных славян». Аднак спроба паўстаўшых захапіць Бабруйскую крэпасць не мела поспеху.

Паўстанне дзекабрыстаў не магло не зрабіць уплыву на перадавую частку насельніцтва горада. У Мінску ў 1821 годзе жылі выдатныя дзеячы «Паўночнага таварыства» М. Мураўёў і А. Бястужаў-Марлінскі, якія былі цесна звязаны з некаторымі прадстаўнікамі мясцовай інтэлігенцыі. У горадзе раслі апазіцыйныя настроі. У Мінску М. Мураўёў напісаў першы варыянт сваёй канстытуцыі, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «Мінскі варыянт». Мінскія жыхары Вайдзевіч і Галуўня сталі сябрамі А. Бястужава, які ў пісьме да маці адзначаў «разумныя і правільныя разважанні Вайдзевіча», а ў 1824 годзе прыслаў яму выдаваемую ім сумесна з К. Ф. Рылеевым «Полярную звезду» са сваім аўтографам: «Пану Вайдзевічу ў знак дружбы ад Бястужава».

Падзеі, звязаныя з польскім паўстаннем 1830—1831 гадоў, таксама не маглі не адбіцца на грамадскім жыцці горада. Мінская губерня была аб'яўлена на ваенным становішчы, устаноўлен стражэйшы нагляд за кожнай падазронай асобай.

У Мінску пад наглядам паліцыі жылі прысланыя сюды з іншых гарадоў Расіі замешаныя ў «хваляваннях» людзі. Так, з 1824 года тут жыў нейкі Іван Шульц, высланы з Пецярбурга «за недапушчальнае складанне просьбаў сялянам» і па падазрэнню ва ўдзеле ў тайных таварыствах, тут жа жыў Канстанцін Вяржбіцкі, студэнт Віленскага універсітэта, высланы ў Мінск па справе аб тайных таварыствах у Вільні; Пётр Гранкевіч знаходзіўся пад наглядам «за складанне просьбаў» халопеніцкім сялянам, якія не падпарадкоўваліся сваім памешчыкам. У сярэдзіне 30-х гадоў у Мінску працаваў настаўнікам гімназіі А. Бялецкі — ураджэнец Беларусі, які закончыў Маскоўскі універсітэт. Ён быў блізка знаёмы з Бялінскім і членамі яго «Гурт-

ка 11 нумара». Бялецкі быў членам «Таїнага польскага літаратурнага таварыства», арганізаванага ў пачатку 30-х гадоў І. Савіпічам — членам гуртка Бялінскага і яго сябрам. Бялінскі ведаў членаў «Тайнага таварыства» і прымаў удзел у яго дзейнасці. Гэта таварыства было выкрыта ў 1833 годзе.

Апазіцыйныя настроі ў асяроддзі перадавой інтэлігенцыі знаходзілі сваё адлюстраванне ў распаўсюджванні забароненай літаратуры. У Мінску ў 1826 годзе ў прыватнай друкарні быў надрукаваны зборнік, на які звярнуў увагу ўрад. Міністр унутраных спраў 10 кастрычніка 1833 года пісаў аб гэтым мінскаму губернатару: «Одни из них (песен) по содержанию своему неприличны святости христианской веры и походят на кощунство, а другие по духу изложения имеют вид политических и могут быть применены к нынешним обстоятельствам» (падзеі 1830—1831 гадоў. — В. Ч.). Міністр загадаў ліквідаваць гэтыя кнігі з агульнага карыстання, «дабы не подать повода неблагонамеренным людям... волновать народные умы сим средством». Па загаду мінскага губернатара было праведзена найстражэйшае расследаванне, а ў выніку вобыску ў кнігарні знойдзена каля 40 недазволеных кніг.

У 40-я гады, у перыяд уздыму сялянскага і грамадска-палітычнага руху ў Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, грамадскае жыццё ў Мінску ажывілася. У 1846 годзе за перапісванне і распаўсюджванне вершаў, якія змяшчалі выпады супраць цара і царквы, былі арыштаваны два чыноўнікі — Жэгота і Лукашэвіч. Віленскі генерал-губернатар Мірковіч «па прычыне асобага становішча Заходняга краю ў палітычных адносінах» хадайнічаў перад міністрам унутраных спраў аб «суровым пакаранні вінаватых».

У перыяд 1846—1848 гадоў у Беларусі дзейнічала тайная арганізацыя «Саюз свабодных братоў». За тры гады свайго існавання саюз ператварыўся ў шырокую арганізацыю, якая ўключала каля 200 членаў, у яго ўваходзілі дробныя дваране, чыноўнікі, прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі, а таксама рамеснікі. Як відаць з матэрыялаў следства, галоўнай мэтай саюза была барацьба супраць тыраніі і прыгнечання, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за стварэнне свабоднай дэмакратычнай Польскай рэспублікі. Цэнтр яго знаходзіўся ў Вільні, аддзяленні існавалі ў Мінску, Гродна, Лідзе, Ашмянах, Навагрудку, Слоніме і іншых гарадах. Асабліва актыўную дзейнасць праводзіла мінскае аддзяленне саюза, якое арганізавала работу сярод навучэнцаў гімназіі, дваранскага вучылішча, прапагандавала сярод насельніцтва ідэі свабоды, распаўсюджвала пракламацыі з заклікам да паўстання. Яно мела сувязі з рэвалюцыйнымі гуркамі Пецярбурга. Члены саюза праводзілі прапаганду ў ваенных гарнізонах. Салдаты мінскага гарнізоннага батальёна, паводле

слоў начальніка 4-га корпуса жандараў Буксгеўдзена, «гатовы былі пры ўтвораным бунце паклясці зброю».

Аднак у рашучы момант у 1848 годзе саюз праявіў непаслядоўнасць у пытанні аб часе пачатку паўстання: адны патрабавалі яго неадкладна, другія хацелі адтэрмінаваць, спасылаючыся на непадрыхтаванасць. У 1849 годзе саюз быў разгромлены.

Рэвалюцыйныя падзеі 1848 года зрабілі ўплыў на навучэнцкую моладзь. У мінскай гімназіі назіраліся сур'ёзныя хваляванні. Школьны савет выключыў з гімназіі двух навучэнцаў, у якіх знайшлі забароненую літаратуру. Была выкрыта сувязь некаторых навучэнцаў з віленскай і мінскай тайнымі арганізацыямі. Пасля следства два вучні былі сасланы. Больш як 60 чалавек былі пакараны розгамі, на экзекуцыі прысутнічалі губернатар і прадстаўнікі мясцовай улады. Пакаранне навучэнцаў рабілі салдаты мінскага гарнізона, тут жа пастроілі вучняў малодшых класаў, для якіх экзекуцыя павінна была з'явіцца «навукай». Пасля экзекуцыі прыехаў архірэй, каб зрабіць павучальную прамову, але ў вокны гімназіі паляцела каменне і архірэй быў вымушаны адмовіцца ад свайго намеру. Неўзабаве пасля гэтага з гімназіі знік партрэт цара. Партрэт знайшлі потым за горадам, ён быў вымазаны і разарваны на часткі.

Генерал-губернатар Бібікаў загадаў кіраўнікам гімназіі «мець над вучнямі найстражэйшы нагляд». Нягледзячы на строгі рэжым, у мінскай гімназіі ў 1850 годзе ўзнікла так званая «школа геаметраў», у састаў якой уваходзіла 50 навучэнцаў; гэты гурток меў сувязі з гуртком Віленскага універсітэта, яго ўдзельнікі чыталі і распаўсюджвалі забароненую літаратуру, накіраваную супраць царызму. «Школа геаметраў» існавала нядоўга: пасля выкрыцця гуртка ў Вільні пачаліся арышты і ў Мінску.

У жніўні 1849 года ў Мінску адбыўся судовы працэс па справе капітана Аляксея Гусева і 13 яго таварышаў, абвінавачаных у арганізацыі «бунту» супраць цара і ўлад. Гэты «бунт» заключаўся ў тым, што яны адмовіліся адправіцца ў Венгрыю для падаўлення там рэвалюцыі. Гусеў і разам з ім яшчэ шэсць чалавек былі пакараны ў Мінску 16 жніўня 1849 года.

Такім чынам, у грамадскім жыцці Мінска толькі з'яўляюцца парасткі палітычнага руху, накіраванага супраць існуючага ладу. Новага ўзроўню і зместу яно дасягнула з развіццём капіталістычнай эканомікі, з узнікненнем і развіццём рабочага класа, з пачаткам класавай барацьбы пралетарыяту.

РАЗДЗЕЛ VII

ПЕРАТВАРЭННЕ МІНСКА Ў КАПІТАЛІСТЫЧНЫ ГОРАД (1861—1900 гады)

1. Развіццё прамысловасці і гандлю

Прамысловасць Мінска ўступіла на капіталістычны шлях развіцця ў дарэформенны час, але гэты працэс адбываўся марудна і выразна праявіўся толькі ў апошняй чвэрці XIX стагоддзя. У 1861 годзе ў горадзе было толькі 32 прадпрыемствы дробнатаварнага і мануфактурнага тыпу, дзе працавала 137 рабочых. Пазней узнікаюць фабрыкі і заводы. У 1879 годзе іх было толькі сем. К 1900 году горад налічваў ужо 58 фабрык і заводаў з 2845 рабочымі. Найбольш буйныя сярод іх мелі ад 50 да 100 і больш рабочых. Такіх прадпрыемстваў было 12.

Самымі буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі Мінска ў 1879 годзе былі тытунёвая фабрыка (35 рабочых), дзве друкарні (50 рабочых), завод земляробчых прылад (24 рабочыя), які выраблял у год 61 малатарню, 75 веялак, 30 барон, 70 плугоў і 20 запашнікаў.

Лік буйных прадпрыемстваў у горадзе прыкметна павялічыўся ў 90-я гады, калі адбываўся рост прамысловасці ва ўсёй Расіі. З існаваўшых у 1900 годзе прамысловых прадпрыемстваў Мінска буйнымі былі Вакзальны машынабудаўнічы і меднажалезаробчы завод (94 рабочыя, сума вытворчасці 110 тысяч рублёў), які выраблял абсталяванне для вінакурных заводаў, турбіны, паравыя катлы, цагельны завод (74 рабочыя, сума вытворчасці 43 тысячы рублёў), крухмала-патачны завод акцыянернага таварыства «Сокал» (62 рабочыя, сума вытворчасці 265 тысяч рублёў).

Прадукцыя Вакзальнага машынабудаўнічага завода збывалася ў межах

Мінскай, Магілёўскай, Віленскай, Віцебскай, Чарнігаўскай і Смален-
скай губерняў.

Заводы і фабрыкі пачынаюць аснашчацца сучасным для таго часу абсталяваннем. Так, на адным з мінскіх цагельных заводаў абпальванне цэглы ўжо рабілася ў бесперапынна дзеючай кальцавой печы сістэмы Гофмана, асобныя прадпрыемствы мелі паравыя машыны, электрычныя і газавыя рухавікі. На фабрыках і заводах Мінска ў 1895 годзе дзейнічала 11 паравых машын магутнасцю 248 конскіх сіл, што складала на адно прадпрыемства ў сярэднім 9,8 конскай сілы. Энергаўзброенасць працы аднаго рабочага складала 0,41 конскай сілы. У цэлым па Беларусі магутнасць механічных рухавікоў, якія прыпадалі на адно прамысловае прадпрыемства, не перавышала 8,49, а энергаўзброенасць працы аднаго рабочага — 0,33 конскай сілы. Аднак прамысловасць Мінска па энергаўзброенасці працы адставала ад агульнарасійскіх паказчыкаў. У канцы XIX стагоддзя магутнасць рухавікоў, якія прыпадалі на аднаго рабочага ў прамысловасці Расіі, складала 0,63 конскай сілы.

У галіновай структуры прамысловасці Мінска вядучае месца займалі харчасмакавыя прадпрыемствы — млыны, дрожджа-вінакурныя, крухмала-патачныя, піваварныя заводы і тытунёвыя фабрыкі. У канцы XIX стагоддзя яны складалі 32,4 працэнта ўсіх прамысловых прадпрыемстваў, сканцэнтроўвалі 22,2 працэнта рабочых і давалі 39,6 працэнта сумы вытворчасці ўсёй гарадской прамысловасці.

Значнае развіццё атрымала прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, якая была прадстаўлена цагельнымі і ганчарна-кафлянымі заводамі. Да канца XIX стагоддзя цагельныя і кафляныя заводы складалі 16,2 працэнта ўсіх прадпрыемстваў горада і сканцэнтроўвалі 14,4 працэнта рабочых. Узровень механізацыі працы на іх быў нізкім, і рост вытворчасці ажыццяўляўся галоўным чынам за кошт павелічэння колькасці рабочых.

Металаапрацоўчая прамысловасць у Беларусі не атрымала значнага развіцця, таму што, працуючы на прывазной сыравіне, яна не магла канкурыраваць з прадпрыемствамі Польшчы і Цэнтральнага прамысловага раёна Расіі. Усё ж з 1861 па 1900 год у Мінску колькасць прадпрыемстваў гэтай галіны вырасла з 3 да 11, а колькасць рабочых — з 23 да 1239. Павелічэнне колькасці рабочых адбылося за кошт двух чыгуначных дэпо (Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгунак) і рамонтных майстэрняў станцыі Мінск. У рамонтных майстэрнях рухомага саставу Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ў 1895 годзе працавала 355 чалавек, а ўжо праз некалькі год — 581. У 1900 годзе на прадпрыемствах па апрацоўцы металу было занята 41,5 працэнта рабочых.

Гарбарная вытворчасць заставалася па-ранейшаму дробнай. У другой палове XIX стагоддзя буйным лічыўся толькі завод Імрата (заснаваны ў 1885 годзе), на якім працавалі 42 рабочыя.

На тэмпах развіцця прамысловасці ў Паўночна-Заходнім краі адбілася дзейнасць так званых «тэхнічных кантор». Першая такая кантора ўзнікла ў Мінску ў канцы XIX стагоддзя. Яна пабудавала ў Мінску чыгуналіцейны і машынабудаўнічы заводы, водаправод у Слоніме, займалася электрыфікацыяй некаторых фабрык і заводаў, будаўніцтвам конных чыгунак ад лясных гаспадарак да чыгуначных станцый.

І ўсё ж фабрычна-заводская прамысловасць Мінска ў параўнанні з буйнымі цэнтрамі краіны не атрымала шырокага развіцця. Гэта тлумачыцца тым, што да 70—80-х гадоў прамысловая буржуазія не мела дастатковых капіталаў, а пазыкамі ў банках магла карыстацца толькі нязначная яе частка. Акрамя таго, вялікае значэнне мела транзітнае становішча Беларусі паміж двума буйнымі прамысловымі раёнамі краіны.

З прычыны гэтага ў Мінску шырокае развіццё атрымала дробная прамысловасць у форме прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу, а таксама рамеснай вытворчасці. У невялікіх рамесных майстэрнях звычайна працаваў сам гаспадар з двума-трыма наёмнымі рабочымі і вучнямі. Сярод рамеснікаў былі пекары, кандытары, булачнікі, мяснікі, краўцы, шаўцы, капялюшнікі, печнікі, сталяры, цесляры, гарбары, слесары, пераплётчыкі і г. д. Усе яны выраблялі прадукцыю, якая ішла на задавальненне бытавых патрэб гараджан. У. І. Ленін называў рамяство «неабходнай састаўной часткай гарадскога быту».

У дробнай прамысловасці Мінска пераважалі рамеснікі, якія выраблялі прадметы харчавання, адзенне, абутак. У 1895 годзе 60,7 працэнта рамеснікаў былі краўцамі, шаўцамі, капялюшнікамі, пальчатнікамі, а 14,5 працэнта — пекарамі, булачнікамі, кандытарамі, мяснікамі. Колькасць рамеснікаў узрасла з 1879 у 1861 годзе да 5985 чалавек у 1900 годзе.

У грашовым выражэнні рамеснікі горада выраблялі прадукцыі больш, чым фабрычна-заводская прамысловасць. Так, у 1890 годзе імі было выпушчана вырабаў на 1302,5 тысячы рублёў, тады як фабрычна-заводскай прамысловасцю толькі на 626,1 тысячы рублёў.

У рамеснай вытворчасці Мінска другой паловы XIX стагоддзя, як і многіх гарадоў Расіі, захавалася цэхавае ўладкаванне. У Мінску колькасць цэхаў нават прыкметна вырасла — з 13 у 1861 годзе да 31 у 1890 годзе. Сваю дзейнасць цэхі будавалі згодна са статутам, у аснову якога было пакладзена «Рамеснае палажэнне» 1785 года, выдадзенае Екацярынай II. Але функцыі цэхаў ужо абмяжоўваліся па

сутнасці толькі сферай падрыхтоўкі кваліфікаваных рамеснікаў і наглядам за якасцю выконваемых імі работ.

З 90-х гадоў XIX стагоддзя эканамічныя пазіцыі цэхаў у Расіі пачалі слабець, паскорыўся іх распад. У 1902—1903 гадах міністэрства ўнутраных спраў ліквідавала цэхавае ўладкаванне і рамесныя ўпраўленні ў большасці гарадоў краіны, у тым ліку і ў многіх гарадах Беларусі — Мінску, Магілёве, Віцебску, Гомелі, Оршы, Рагачове, Чавусах, Шклове.

Дробная прамысловасць у эканоміцы парэформеннага Мінска і Беларусі працягвала адыгрываць вялікую ролю, хоць у пачатку XX стагоддзя ўдзельная вага рамяства змяншаецца.

Прамысловасць Расіі на рубяжы XIX і XX стагоддзяў уступіла ў вышэйшую стадыю свайго развіцця — імперыялізм. У эканоміцы Беларусі, якая развівалася па тых жа законах, што і ўся краіна, рысы, уласцівыя імперыялізму, выяўляліся ў існаванні сіндыкатаў, таварыстваў, акцыянерных таварыстваў, ва ўсё ўзрастаючым значэнні банкаў. У Мінску акцыянерным таварыствам належалі два машынабудаўнічыя, крухмала-патачны, піваварны заводы. У 1894 годзе быў зацверджаны статут таварыства вінакурных заводаў, у 1898 годзе — акцыянернага таварыства запалкавай фабрыкі «Маланка», праўленні якіх знаходзіліся ў Мінску.

Разрастанне банкаўскай дзейнасці зрабіла ўплыў і на эканамічнае аблічча Мінска. У 1873 годзе ў горадзе пачаў сваю дзейнасць камерцыйны банк, у 1881 годзе адкрылася аддзяленне Дзяржаўнага банка, затым свае аддзяленні заснавалі ў Мінску Азова-Данскі, Пецярбургска-Азоўскі і Віленскі прыватны камерцыйныя банкі. Яны мелі свае філіялы ў Магілёве, Пінску, Бабруйску, Гродна, Гомелі.

Дзякуючы дзейнасці гэтых крэдытных устаноў усё большы капітал укладваўся ў мясцовую эканоміку. Акрамя канцэнтрацыі свабодных грашовых сродкаў мясцовай буржуазіі, у эканоміцы Беларусі вялікую ролю пачаў адыгрываць рускі капітал.

У горадзе існавала шмат прыватных банкірскіх кантор і дамоў, якія выдавалі невялікія грашовыя пазыкі пад абавязацельствы. Іх уладальнікі самі карысталіся крэдытам у мясцовым аддзяленні Дзяржаўнага, а таксама ў прыватных банках і вялі значныя грашовыя аперацыі, сярод якіх пераважалі аперацыі па ўліку гандлёвых вэксаляў — дысконту, таму што гандаль у горадзе быў галоўным чынам заснаваны на невялікіх зваротных капіталах і пастаянна меў патрэбу ў крэдыце.

З развіццём капіталістычнай прамысловасці і павелічэннем колькасці гарадскога насельніцтва пашыраўся гандаль у Мінску. На працягу другой паловы XIX стагоддзя галоўнае месца ў ім заняў пастаянны крамавы і магазінны гандаль. Гэта сведчанне таго, што

рыначныя сувязі гарадоў і вёсак Беларусі ўжо вызначаліся патрэбнасцямі капіталістычнай вытворчасці, якая падпарадкавала сваім інтарэсам працэс абмену. Першым вынікам гэтага і з'яўляўся пераход ад эпізадычнага гандлю (кірмашу) да пастаяннага.

Магазіны горада прадавалі прамысловыя тавары як мясцовай вытворчасці, так і прывазныя. Закупляючы вялікія партыі тавараў, уладальнікі буйных магазінаў гандлявалі імі не толькі ў Мінску, але і ў гарадах суседніх губерняў.

Развіццё чыгуначных зносін садзейнічала ператварэнню Мінска ў адзін з важных гандлёвых цэнтраў Беларусі і Расіі. Гэта хутка адбілася на развіцці гандлёвых устаноў у горадзе. У 1896 годзе горад меў ужо 1836 магазінаў і крам, 75 заезных дамоў, а яшчэ праз тры гады — 2126 гандлёвых устаноў, у тым ліку 280 складаў. Мінск падтрымліваў рэгулярныя гандлёвыя сувязі з многімі гарадамі Беларусі, Масквой, Варшавай, Украінай, партамі Прыбалтыкі.

У 90-х гадах Мінск стаў адным з цэнтраў аптовага гандлю ўсяго Паўночна-Заходняга краю, сярод якога галоўнае месца належала мануфактурным таварам. У 1899 годзе ў горадзе было 26 аптовых складаў для мануфактуры. Іх агульны абарот склаў 3,7 мільёна рублёў. Дробныя гандляры бралі тавары на аптовых складах у крэдыт і дастаўлялі іх у павятовыя гарады і мястэчкі.

Вялікае значэнне для Мінска меў і лясны гандаль.

Мінск ператварыўся таксама ў значны цэнтр транзітнага гандлю. Колькасць грузаў, якія прыбылі і былі адпраўлены са станцыі Мінск Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгункамі, узрасла з 5445 тысяч пудоў у 1880 годзе да 10 468 тысяч пудоў у 1900 годзе, а паток транзітных грузаў за гэты ж час павялічыўся з 11 170 тысяч пудоў да 27 860 тысяч пудоў.

Такім чынам, у канцы XIX стагоддзя Мінск стаў адным з буйных цэнтраў капіталістычнай прамысловасці і гандлю ў Беларусі.

2. Насельніцтва. Вонкавы выгляд горада. Гарадское самакіраванне

У канцы XIX стагоддзя Мінск становіцца самым буйным горадам Беларусі. У 1897 годзе ў ім жыве 90 912 чалавек, у той час як у Віцебску 65 871, Магілёве 43 119, Гродна 40 919 чалавек. Павелічэнне насельніцтва Мінска адбывалася як у выніку натуральнага прыросту, так і за кошт прытоку перасяленцаў з паветаў Мінскай і суседніх з ёю губерняў. Нізкі ўзровень капіталістычнай вытворчасці абмяжоўваў прыток сельскага насельніцтва, хоць гэта група ў гарадскім насельніцтве ўзрасла з 1861 па 1897 год з 1,1 да 18,8 працэнта.

Самай шматлікай часткай насельніцтва Мінска былі мяшчане. Гэта саслоўе складалася ў асноўным з дробных домаўласнікаў, гандляроў, рамеснікаў, г. зн. дробнай буржуазіі.

З развіццём капіталізму ў саслоўі мяшчан побач з паўпралетарскімі элементамі ўсё большую ўдзельную вагу набывае пралетарскі пласт. Зусім выразна акрэсліўся і другі антаганістычны клас капіталістычнага грамадства — буржуазія. Паводле даных перапісу 1897 года, 51,7 працэнта насельніцтва горада складалі пралетарыі і паўпралетарыі, 6,8 працэнта — буйная буржуазія і 41,5 працэнта — сярэдняя буржуазія.

Нацыянальны склад насельніцтва Мінска ў другой палове XIX стагоддзя істотна не змяніўся.

У 1897 годзе ў Мінску жылі 46 346 мужчын і 44 566 жанчын. Працаздольнага насельніцтва ва ўзросце ад 20 да 60 год налічвалася 45 023 (24 288 мужчын і 20 735 жанчын).

Хутка пашыралася тэрыторыя горада. Забудова вялася галоўным чынам у паўднёва-заходнім напрамку ў раёне перасячэння Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгунак. К 1899 году горад займаў 3126 дзесяцін 628 квадратных сажняў сядзібнай зямлі. У параўнанні з 1861 годам плошча горада павялічылася амаль у дзесяць разоў. Яго тэрыторыя абмяжоўвалася прыкладна цяперашнімі 6-й лініяй, Маляўшчынскай і Высокай вуліцамі на паўночным усходзе, Грушаўскім пасёлкам — на паўднёвым захадзе, Стара-Віленскай вуліцай на поўначы і Чэрвеньскім рынкам — на поўдні.

Разам з пашырэннем межаў павялічвалася і колькасць дамоў у горадзе. У 1861 годзе іх было 1584, у 1887 годзе — 4516, у 1904 годзе — 6616 (1027 цагляных). У 1880 годзе ў Мінску налічвалася 89 вуліц і завулкаў, 14 урочышчаў, а ў 1899 годзе — 200 вуліц і завулкаў, 33 урочышчы. Агульная плошча гарадскіх вуліц у 1898 годзе складала 574 200 квадратных сажняў, з іх 71 783 квадратных сажняў былі забрукаваны.

Цэнтр горада быў у значнай меры забудаваны двух- і трохпавярховымі будынкамі; паабапал вуліц ляжалі асфальтаваныя тратуары. Тут знаходзіліся гарадскі сад і бульвар, дзейнічаў водаправод і конная чыгунка.

Забудова ўскраін вялася стыхійна.

Новыя раёны былі нядобраўпарадкаваны, вясной і восенню тануліў гразі. «Цяжка сабе ўявіць што-небудзь больш жудаснае,— пісаў у кастрычніку 1899 года «Минский листок»,— як наша Захар'еўская вуліца, якая носіць за Залатой горкай назву Камароўкі... Гэта вуліца ўяўляе сабой ліпкае суцэльнае балота, перайсці праз яго ніякім чынам немагчыма... Урочышчы «Уборкі» і «Добрыя думкі» ўяўляюць сабой рады вуліц без назваў. Жыць у гэтых урочышчах не толькі

дрэнна, але і небяспечна. Вуліцы тут не распланаваны, пасля дажджу ператвараюцца ў непралазную гразь, а ў некаторых месцах яна не высыхае цэлымі гадамі».

У дрэнным стане знаходзіліся масты праз Свіслач. Не было належнага догляду сквераў горада. Мясцовая газета пісала, што гарадскі сад «з кожным годам прыходзіць у заняпад... Сумна глядзець на запусценне гэтага цудоўнага саду, які мае прыродныя вартасці — горы і ўзгоркі, што надаюць яму маляўнічы выгляд». Гарадская дума нават палічыла магчымым частку саду высечы і на гэтым месцы пабудаваць электрастанцыю.

Асвятленне горада да 1895 года рабілася газавымі ліхтарамі. Запальваліся яны з 1 верасня па 15 красавіка і то не заўсёды, а толькі ў цёмныя ночы. Нават у цэнтральных кварталах панаваў паўзмрок. 12 студзеня 1895 года пачала працаваць электрастанцыя, якая асвятліла частку цэнтральных вуліц.

Да збудавання ў 1874 годзе водаправода мінчане карысталіся вадой з калодзежаў і ракі. У калодзежах узвышанай часткі горада вада была добрая, а ў нізінных месцах — брудная і дрэннай якасці. Большасць насельніцтва горада карысталася рачной вадой. Між тым у Свіслач сцякалі нечыстоты з вуліц, двароў, памыйных ям. Крыху вышэй па цячэнню вымочваліся скуры. Тут жа паласкалі бялізну і мылі коней. Зроблены ў 1893 годзе аналіз вады паказаў, што яна ўтрымлівае значную колькасць арганічных рэчываў, аміяку, азотнай кіслаты. Пазней у ёй выявілі вапну і хлор.

Асноўным відам транспарту ў Мінску былі рамізнікі. 10 мая 1892 года пачала працаваць конка. Сетка конкі складалася з трох ліній працягласцю пяць вёрст. Цэнтральная лінія (2,82 вярсты) пачыналася ля Брэсцкага вакзала і ішла па Маскоўскай, Захар'еўскай, Губернатарскай вуліцах да Саборнай плошчы. Перадатачная лінія (0,75 вярсты) — адгалінаванне ад Цэнтральнай лініі да Віленскага вакзала — праходзіла па Каломенскай (цяпер Свярдлова) вуліцы. Трэцяя — Аляксандраўская лінія (1,5 вярсты) пачыналася ад Саборнай плошчы, ішла да Ніжняга рынку, а затым па Аляксандраўскай вуліцы да піваварнага завода.

З 1890 года ў Мінску існуе тэлефонная сувязь. У 1894 годзе дзейнічалі 43 тэлефоны ў адміністрацыйных будынках і 30 на кватэрах.

Мінск неаднаразова падвяргаўся спусташальным пажарам і паводкам. Пажары ў горадзе бывалі амаль штогод, чаму садзейнічалі вялікая скучанасць і пераважанне драўляных будынкаў. Вялікія пажары былі ў 1865, 1877, 1881, 1886, 1887 і 1889 гадах. 40 пажараў зарэгістравана ў горадзе толькі ў 1896 годзе. Яны прычынілі страты на суму каля 45 тысяч рублёў. Выгаралі цэлыя кварталы нават у цэнтры горада.

Вялікія страты горад нёс ад паводак. Мелкаводная і неглыбокая Свіслач і Нямігa вясной выходзілі з берагоў і затаплялі прыбярэжныя вуліцы, масты, двары і дамы.

На нізкім узроўні знаходзіўся медыка-санітарны стан Мінска. У дварах гадамі скапляліся нечыстоты. Толькі дзесятая частка нечыстот, якія павінны былі неадкладна выдаляцца, вывозілася, астатняя пранікала ў глебу, заражаючы яе.

Антысанітарыя з'яўлялася прычынай масавых захворванняў насельніцтва. З ліпеня па кастрычнік 1867 года ў Мінску лютавала эпідэмія халеры. Праз 4 гады эпідэмія ўспыхнула зноў. На 75 тысяч жыхароў у 1890 годзе было толькі 2 бальніцы — Прыказа грамадскага апекавання на 70 ложкаў і яўрэйская — на 65 ложкаў. Бальніцы не мелі спецыялізаваных аддзяленняў і былі дрэнна аснашчаны медыцынскім абсталяваннем.

Рост інфекцыйных захворванняў прымусіў у 1891 годзе гарадскую думу арганізаваць санітарны камітэт і запрасіць на службу санітарнага ўрача. У 1895 годзе адкрыўся радзільны дом на 12 ложкаў. Але гэтых мер было недастаткова. Большасць насельніцтва была пазбаўлена медыцынскай дапамогі. У горадзе пастаянна лютавалі дыфтэрыя, дызентэрыя, брушны тыф, малярыя, воспа. У 1900 годзе на 1330 жыхароў у Мінску прыпадаў толькі адзін урач.

Паводле заключэння таварыства мінскіх урачоў, «для аздараўлення горада патрэбны экстраныя і радыкальныя меры». А гэтыя меры гарадскія ўлады не прымалі. Гэтаму садзейнічала сама сістэма арганізацыі самакіравання ў горадзе.

Да 70-х гадоў XIX стагоддзя гарадское самакіраванне насіла саслоўны характар. Гарадавое палажэнне ад 16 чэрвеня 1870 года з'яўлялася буржуазнай рэформай, якая аддавала ўладу ў горадзе ў рукі растучай буржуазіі. Да выбараў членаў гарадской думы — гласных — дапускаліся ўладальнікі нерухомай маёмасці, якія плацілі з яе падатак на карысць горада. Узроставы цэнз складаў 25 год. Выбаршчыкі падзяляліся на тры разрады (сходы), аднолькавыя па суме выплачваемых падаткаў. Кожны сход выбіраў трэцюю частку гласных, у выніку чаго ў думе пераважалі прадстаўнікі буйной буржуазіі. Гласныя выбіраліся на чатырохгадовы тэрмін. На чале думы стаяў гарадскі галава, які выбіраўся ёю. Выканаўчым органам думы з'яўлялася гарадская ўправа пад старшынствам галавы.

Кола дзейнасці гарадской думы было абмежавана пытаннямі добраўпарадкавання і клопатамі аб развіцці гандлю, прамысловасці, народнай асветы і аховы здароўя. Дума і ўправа знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад губернатара і самастойна не маглі вырашаць ніводнага пытання, нават у межах адведзенай ім кампетэнцыі. Гарадскі галава ў губернскіх гарадах зацвярджаўся міністэрствам унутраных

спраў. Прынятыя думай пастановы падлягалі зацвярджэнню губернатарам, які мог адмяніць любое яе рашэнне.

У Мінску Гарадавое палажэнне ўведзена ў дзеянне ў 1876 годзе. У выбарах прымала ўдзел невялікая колькасць насельніцтва — у 1876 годзе выбарчае права атрымалі 4,2 працэнта, а ў 1888 годзе — 5,2 працэнта гарадскіх жыхароў. У выбарчыя спісы па першаму разраду былі ўнесены 34 чалавекі, другому — 155 і трэцяму — 1983 чалавекі. Кожны разрад выбіраў у думу па 24 гласных, а ўсяго 72.

Многія выбаршчыкі адносіліся да выбараў у думу індыферэнтна. З 2142 выбаршчыкаў, унесеных у спісы ў 1876 годзе, з'явілася на выбары толькі 413, або 19 працэнтаў, прычым найбольшая колькасць адсутных падае на трэці выбарчы сход.

У 1892 годзе Гарадавое палажэнне 1870 года замяняецца новым, па якому выбарчыя правы даваліся ўладальнікам нерухомай маёмасці, ацэнка якой складала не менш чым 1000 рублёў і якія плацілі на карысць горада падатак. Гэтым з ліку выбаршчыкаў выключалася вялікая колькасць сярэдніх гандляроў, прамыслоўцаў і домаўладальнікаў, рэзка зменшыўся лік выбаршчыкаў. Скарацілася і колькасць гласных, а таксама членаў гарадской управы. У студзені 1893 года ў Мінску праводзіліся выбары па новаму Гарадавому палажэнню. Колькасць выбаршчыкаў скарацілася да 248, а гласных да 26. На выбарах 1897 года правам голасу карысталіся 254 чалавекі, што склала 0,5 працэнта ўсяго дарослага насельніцтва горада. Як і раней, шмат выбаршчыкаў байкатавалі выбары — у 1893 годзе ў галасаванні прынялі ўдзел 59 чалавек (23,7 працэнта), а ў 1897 годзе — 64 (25,1 працэнта).

Праводзімыя думай работы па добраўпарадкаванню горада патрабавалі значных сродкаў, якіх яна не мела. Большая частка гарадскога бюджэту ішла на ўтрыманне войска, паліцыі і органаў грамадскага кіравання. У той жа час на ахову здароўя і падтрыманне санітарнага стану горада выдаткоўвалася 1,7 працэнта бюджэту, на ўтрыманне вуліц, бруку і тратуараў — 3,8 працэнта. З гэтых даных відаць, што гарадская дума менш за ўсё клапацілася аб паляпшэнні ўмоў жыцця працоўных, а абараняла інтарэсы буржуазіі. «Бацькі горада», выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, рабілі розныя спекулятыўныя здзелкі і ўзбагачаліся за кошт горада.

3. Мінск у паўстанні 1863 года

Першыя гады пасля адмены прыгоннага права былі адзначаны ў Расіі рэвалюцыйным уздымам. Асабліва востра грамадская барацьба працякала на заходніх ускраінах Расійскай імперыі — у Поль-

шчы, Літве і Беларусі, дзе антыфеадальная барацьба сялянства цесна перапляталася з пратэстам дэмакратычных слаёў мясцовага насельніцтва супраць царызму і барацьбой польскага народа за сваю нацыянальную незалежнасць. Цэнтрамі дэмакратычнага руху ў Беларусі супраць царскага самадзяржаўя сталі гарады, у тым ліку і Мінск. Пратэст супраць царызму тут праяўляўся ў самых разнастайных формах, але найбольш шырокае распаўсюджванне атрымала адкрытае выказванне салідарнасці з барацьбой польскага народа за сваю нацыянальную незалежнасць. У мінскіх касцёлах служылі паніхіды па забітых царскімі войскамі дэманстрантах у Варшаве і Вільні, большасць насельніцтва горада апранулася ў жалобу, нягледзячы на строгія афіцыяльныя забароны і праследаванні з боку царскіх улад. Сярод мінчан былі вельмі пашыраны польскія рэвалюцыйныя песні.

Асабліва ярка пачуцці сімпатыі да барацьбы палякаў супраць царызму праяўляліся ў сустрэчах і провадах палітычных арыштантаў, якіх праз Мінск па этапу гналі з Польшчы ў Сібір. Велізарныя натоўпы мінчан сустракалі ссыльных ля заставы, перадавалі ім прадукты, кветкі, выказвалі ім сваё спачуванне. Асабліва вялікай была дэманстрацыя 2 чэрвеня 1862 года каля Камароўкі. Ведаючы, што царскі ўрад разганяе ўсіх, хто збіраецца для сустрэчы ссыльных, каля пяцісот чалавек схаваліся ў лесе каля дарогі. Як толькі паявіліся фурманкі з палякамі, натоўп мінчан, узброены толькі палкамі, кінуўся да ссыльных, імкнучыся прарвацца праз канвой. Але на гэты раз канвой быў узмоцнены і гараджан адцяснілі.

У антыцарысцкім руху ў Мінску прымалі ўдзел шырокія дэмакратычныя пласты насельніцтва. Гэта былі рамеснікі, дробнае чыноўніцтва, разначынцы, навучэнцкая моладзь.

Стыхійны антыўрадавы рух, які рос і шырыўся па гарадах Беларусі, да канца 1862 года пачынае прымаць усё больш арганізаваны характар і выліваецца ў форму падрыхтоўкі да сумеснага ўзброенага паўстання палякаў, беларусаў, літоўцаў у саюзе з рускім народам супраць царскага самадзяржаўя. Былі створаны рэвалюцыйныя арганізацыі ў Польшчы, Літве і Беларусі з цэнтрамі ў Варшаве і Вільні. Праз выдаўцоў «Колокола» вяліся перагаворы з рускімі рэвалюцыянерамі аб сумесным паўстанні.

Да гэтага часу ў руху вызначыліся два лагеры. Найбольш радыкальны лагер утварыў партыю чырвоных. Яны змагаліся за звяржэнне царызму шляхам узброенага паўстання, за бясплатнае надзяленне сялян зямлёй, якая знаходзілася ў іх карыстанні. Левае крыло чырвоных — рэвалюцыйныя дэмакраты на чале з К. Каліноўскім — выступала за поўную ліквідацыю памешчыцкага землеўладання шляхам аграрнай рэвалюцыі.

Буйныя памешчыкі — белыя — выступалі супраць паўстання і надзялення сялян зямлёй. Яны спадзяваліся дабіцца ўступак у царызму шляхам перагавораў або замежнага ўмяшання.

Кожная з партый мела свае цэнтры ў Варшаве і Вільні, а таксама ўласныя камітэты ў многіх гарадах Польшчы і заходніх губерняў.

У канцы 1862 года такія камітэты былі створаны і ў Мінску. Да нас не дайшлі імёны членаў першага камітэта. Нават калі паліцыя напала на яго сляды, раскрыць арганізацыю яна не змагла. Былі арыштаваны па падазрэнню некалькі чалавек, але следства не дало ніякіх істотных улік. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, у камітэт чырвоных у Мінску ўваходзілі ўрачы, юрысты, чыноўнікі, г. зн. прадстаўнікі разначынных пластоў гарадскога насельніцтва. Так, да мінскай арганізацыі, відаць, належалі дробныя чыноўнікі Карл Станкевіч, Іван Казлоўскі, урач Міхаіл Казлоўскі і інш.

Створаны дэмакратычнымі элементамі камітэт у Мінску павінен быў весці падрыхтоўку да паўстання ўсёй губерні. Збіраліся грошы на зброю, для закупкі харчавання і амуніцыі будучых паўстанцкіх атрадаў. Сярод гарадскіх і сельскіх жыхароў вялася работа па растлумачэнню мэт будучага паўстання, фарміраваліся будучыя паўстанцкія кадры.

Асабліва шырока разгарнулася гэта работа ў Мінску. Сярод рамеснікаў, навучэнцкай моладзі, дробных служачых ствараліся «дзесяткі» паўстанцкай арганізацыі. На чале кожнай стаяў дзесятнік. Дзесяткі фарміравалі сотні. Канспірацыя была пастаўлена настолькі добра, што члены дзесяткі ведалі толькі свайго камандзіра і не ведалі адзін другога. Шырокай вядомасцю і вялікім аўтарытэтам сярод моладзі горада і губерні карысталася дачка пісьменніка Дуніна-Марцінкевіча Каміла Марцінкевіч. Настаўніца музыкі, яна вяла за сабой моладзь, дапамагала палітычным арыштантам, спрабавала весці работу сярод сельскага насельніцтва, для чаго адкрыла школу ў вёсцы, якую царскія ўлады неўзабаве закрылі. Ні праследаванні ўлад, ні дом для вар'ятаў, куды запраторылі яе карнікі, не маглі зламаць гэту мужную жанчыну. Нарэшце, яна была выслана з Мінска. Сам Дунін-Марцінкевіч падазраваўся ў складанні і распаўсюджванні сярод сялян лістовак, накіраваных супраць цара.

Сярод моладзі Мінска вёў работу і студэнт Маскоўскага універсітэта Антон Трусаў, будучы член «Рускай секцыі I Інтэрнацыянала», які прыехаў на радзіму.

Беларускія рэвалюцыянеры-дэмакраты на чале з Каліноўскім асаблівую ўвагу ўдзялялі рабоце сярод сялян. Яны імкнуліся да таго, каб накіраваць стыхійны рух сялян супраць памешчыкаў у рэчышча аграрнай рэвалюцыі супраць усяго існуючага ладу. Вялікую рэвалюцыйную прапаганду вяла першая беларуская нелегальная газета

«Мужицкая правда». Афіцэры, студэнты, разначынцы, пераапрануўшыся ў сялянскую вопратку, ішлі ў вёску, заклікалі сялян рыхтавацца да будучага паўстання.

Сваю работу Мінская паўстанцкая арганізацыя вяла ў канцэ з цэнтрам па падрыхтоўцы паўстання ў Літве і Беларусі — з Літоўскім правінцыяльным камітэтам, які ўзначальваў К. Каліноўскі.

Паўстанне ў Польшчы пачалося 10 студзеня 1863 года. Яго праграма, абвешчаная маніфестам і двума аграрнымі дэкрэтамі, прадугледжвала ліквідацыю саслоўных прывілеяў, устанаўленне буржуазных свабод, перадачу ва ўласнасць сялян зямлі, якая знаходзіцца ў іх карыстанні, пры захаванні ўсіх астатніх зямельных угоддзяў у руках памешчыкаў. Цэнтральны нацыянальны камітэт, які кіраваў паўстаннем, заклікаў насельніцтва Літвы і Беларусі падтрымаць паўстанне польскага народа.

Літоўскі правінцыяльны камітэт 1 лютага выдаў маніфест, у якім заклікаў літоўскі і беларускі народы да зброі.

Па плану, распрацаванаму ў Вільні, першай у Беларусі павінна была паўстаць Гродзенская губерня. Паўстанне ў Мінскай губерні намячалася на красавік. У канцы зімы К. Каліноўскі і яго аднадумцы былі адхілены ад кіраўніцтва паўстаннем. Да кіраўніцтва камітэтам прыйшлі прадстаўнікі памеснага дваранства — белыя. У Мінскай губерні (ваяводстве) таксама ствараецца новы камітэт, дзе пераважалі прадстаўнікі памешчыкаў. Памешчык К. Пялікша прызначаецца начальнікам ваяводства; на пасады начальнікаў паветаў былі пастаўлены таксама памешчыкі. Адзін з іх, Баляслаў Свентаржэцкі, быў прызначаны камісарам ваяводства. Роля ваеннага начальніка Мінскай губерні, г. зн. камандзіра ўсіх паўстанцкіх атрадаў, была даручана падпаручніку Станіславу Ляскоўскаму.

Аднак радавыя члены паўстанцкай арганізацыі Мінска прадстаўлялі дэмакратычныя пласты насельніцтва. Пры першых жа звестках аб паўстанні ў Польшчы тут узмацнілася работа па стварэнню паўстанцкіх атрадаў. У Мінскай гімназіі вучні стварылі свой камітэт, даставалі зброю і рыхтаваліся пайсці ў паўстанцкі атрад па першаму сігналу.

Мінская арганізацыя атрымала загад ад Віленскага камітэта пачаць паўстанне 19 красавіка. У ноч з 18 на 19 красавіка рамеснікі, дробныя чыноўнікі, гімназісты, студэнты невялікімі групамі пакідалі горад і збіраліся ў пэўных пунктах пад Мінскам, дзе былі створаны невялікія склады зброі. Але не ўсе, хто выйшаў у гэту ноч з горада, дабраліся да месца збору. Многія з паўстанцаў не змаглі знайсці праваднікоў і блукалі па навакольных лясах. Частка з іх вярнулася ў горад, некаторыя трапілі ў рукі царскіх улад.

Атрады, якія сабраліся пад Мінскам, напіны былі ісці ў напрамку да вёскі Суцін Ігуменскага павета — месца збору ўсіх паўстанцкіх атрадаў губерні. Агульнае камандаванне прыняў Ляскоўскі.

Нешматлікія і дрэнна ўзброеныя паўстанцкія атрады сустроліся з рэгулярнымі царскімі войскамі яшчэ да таго, як яны злучыліся пад Суцінам. 28 красавіка каля вёскі Пятровічы пацярпеў паражэнне атрад мінскіх паўстанцаў пад камандаваннем Трусава, а 30 красавіка ля вёскі Сініла яго рэшткі былі рассеяны. Толькі з невялікай групай Антон Трусаў змог дабрацца да Ігуменскіх лясоў, дзе далучыўся да Ляскоўскага.

Такі ж лёс напаткаў і другі паўстанцкі атрад мінчан у маі. Пяміогія здолелі далучыцца да дзеючых атрадаў.

У самой губерні большасць атрадаў пратрымалася нядоўга. Толькі ў Багушэўскай пушчы дзейнічаў да восені нешматлікі атрад Ляскоўскага. Рэвалюцыйны камітэт Мінскай губерні на чале з Пялікшай, як і ўсе камітэты іншых губерняў, узначальваемыя памешчыкамі, па сутнасці спыніў сваё існаванне.

Працягваць паўстанне ў Мінскай губерні было немэтаагодным. У Вільні прымаецца рашэнне аб спыненні ўзброеных дзеянняў у Мінскім ваяводстве. Аднак паўстанцкую арганізацыю было вырашана пакуль што не распускаць з тым, каб з надыходам вясны яна зноў змагла выступіць супраць царызму.

Восенню 1863 года К. Каліноўскі зноў узначаліў паўстанне; ён накіраваў у Мінск свайго таварыша І. Ямanта, даручыўшы яму сустрэцца з Пялікшай, высветліць стан спраў у губерні, умацаваць паўстанцкую арганізацыю, асабліва ў Мінску, паставіць перад ёй новыя задачы ў сувязі са змяніўшымісія абставінамі. Акрамя таго, К. Каліноўскі, спадзеючыся зноў узняць паўстанне вясной наступнага года, хацеў прааналізаваць прычыны няўдачы на ўсходзе Беларусі, дзе сяляне не падтрымалі паўстанне, высветліць прычыны гэтага, знайсці такія лозунгі, якія б узнялі сялян на барацьбу з царызмам.

І. Ямант быў сустрэты ў Мінску суха. З перагавораў і сустрэч з членамі камітэта ён зрабіў вывад, што мінская арганізацыя перастала існаваць.

Неўзабаве начальнікам ваяводства прызначаецца Гектар Лапіцкі, а камісарам — І. Ямант. І. Яманту ўдалося адрадзіць мінскую арганізацыю. Але як толькі разгарнулася падрыхтоўка да новага паўстання, пачаліся арышты, якія сарвалі новую задуму барацьбітоў.

Царызм з незвычайнай жорсткасцю падавіў паўстанне ў Беларусі. Не толькі турма, але і будынкі манастыроў у Мінску былі забіты

арыштаванымі. У горадзе працавала следчая камісія, якая разглядала справы ўдзельнікаў паўстання. Сотні жыхароў губерні падвергліся рэпрэсіям. Усяго, паводле афіцыяльных звестак па губерні, прынялі ўдзел у паўстанні каля 1600 чалавек, з іх 12 былі пакараны, а сотні высланы з губерні.

Паўстанне ў Мінскай губерні не стала масавым. Яго праграма знаходзіла гарачую падтрымку галоўным чынам сярод гарадскіх дэмакратычных слаёў насельніцтва і ў першую чаргу Мінска. Менавіта гарадское насельніцтва аказалася тут рухаючай сілай паўстання. Асноўная маса сялян не падтрымала паўстанцаў па прычыне шляхецкай абмежаванасці іх аграрнай праграмы. У гэтым заключалася адна з асноўных прычын паражэння паўстання не толькі ў Мінскай губерні, але і ў Беларусі ў цэлым.

4. Народніцкі рух у Мінску

Ледзьве паспеў царызм расправіцца з паўстаннем 1863 года, як на барацьбу з ім пачалі ўзнімацца новыя сілы, на гэты раз пад уплывам вызваленчых ідэй рускага дэмакратычнага руху.

У пачатку 70-х гадоў у Расіі, ва ўмовах парэформеннага развіцця капіталізму, масавага разарэння сялянства і нарастання яго барацьбы супраць памешчыкаў, у рэвалюцыйным руху з'явіўся новы напрамак, які атрымаў назву народніцтва. Гэта быў рух разначыннай інтэлігенцыі, якая да з'яўлення на гістарычнай арэне пралетарыяту займала «перадавое месца сярод прагрэсіўных плыняў рускай грамадскай думкі».

У. І. Ленін адрозніваў у народніцкім руху два перыяды: перыяд 70-х гадоў, калі народніцтва ў сваёй масе было рэвалюцыйным, і перыяд 80—90-х гадоў, калі народніцтва выродзілася ў ліберальную плынь, адмовілася ад метадаў рэвалюцыйнай барацьбы і прапаведавала мірны прагрэс у рамках законнасці.

Народніцкія гурткі існавалі ў многіх гарадах Беларусі.

Народніцкі гурток у Мінску ўзнік у 1875 — пачатку 1876 года. Першапачаткова ён аб'ядноўваў вучняў гімназіі і духоўнай семінарыі і дзейнічаў пад выглядам «адукацыйнага» гуртка. Яго члены займаліся сацыялістычнай прапагандай, чыталі і распаўсюджвалі забароненую літаратуру — творы Бокля, Дарвіна, Рэнана, Міля, Ласаля, Маркса, кнігі Чарнышэўскага «Што рабіць?», Фляроўскага «Азбука сацыяльных навук», нелегальныя газеты.

Найбольш актыўную прапаганду вялі дачка мінскага інжынера медыцынская сястра А. П. Корба-Прыбылева, у далейшым адна з віднейшых прадстаўнікоў агульнарасійскага народніцкага руху,

член выканаўчага камітэта партыі «Народная воля», а таксама семінарысты К. Пігулеўскі і С. Гаховіч.

У 1876 годзе ў гарадах Паўночна-Заходняга краю, у тым ліку і ў Мінску, паліцыя зрабіла масавыя арышты. Толькі ў 1878 годзе дзейнасць народнікаў у Мінску зноў ажывілася. У гэты час народніцкі гурток налічваў звыш 15 чалавек, галоўным чынам прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

У 1879 годзе адбываецца раскол партыі народнікаў «Зямля і воля» на дзве партыі — «Народная воля» і «Чорны перадзел». Мінскі гурток становіцца на бок «Чорнага перадзелу». Гэтаму садзейнічаў прыезд у Мінск Г. В. Пляханава, які ўзначальваў «Чорны перадзел».

У 1880—1881 гадах арганізацыя народнікаў Мінска займала вуднае месца ў агульнарасійскім народніцкім руху. У пачатку 80-х гадоў у Пецярбургу была раскрыта паліцыяй друкарня партыі «Чорны перадзел». Але неўзабаве чарнаперадзельцы заснавалі новую друкарню ў Мінску. Вялікую дапамогу ва ўладкаванні друкарні аказалі народнікі Гродна. М. Янчэўскі даставіў з Гродна ў Мінск друкарскі станок. Пры яго ж садзеянні друкарня атрымала з Гродна і Вільні шрыфт.

Друкарня знаходзілася ў невялікім двухкватэрным доміку на рагу вуліц Магазіннай (цяпер імя Кірава) і Багадзельнай (цяпер Камсамольская). Яна друкавала выданні, рукапісы якіх дастаўляліся з Пецярбурга. Туды ж адвозілася аддрукаваная літаратура. Транспарт народніцкіх выданняў неаднаразова праводзіў работнік мінскай друкарні Гецаў.

Падпольная друкарня «Чорнага перадзелу» існавала ў Мінску з восені 1880 да канца 1881 года. За гэты перыяд у ёй былі аддрукаваны тры нумары газеты «Черный передел» (3, 4 і 5), чатыры нумары рабочай газеты «Зерно» (3, 4, 5 і 6) і шэсць пракламацый.

Строгая канспірацыя доўгі час не дазваляла паліцыі знайсці друкарню. Аднак ва ўмовах жорсткіх рэпрэсій супраць народнікаў, якія ўзмацніліся пасля 1 сакавіка 1881 года, у снежні 1881 года ёй удалося раскрыць некалькі тайных адрасоў народнікаў у гарадах Паўночна-Заходняга краю, у тым ліку і ў Мінску. Праводзячы арышты, паліцыя ледзь не захапіла друкарню. Але Гецаў, Ляўкоў, Грынфест, якія працавалі ў ёй, паспелі знішчыць абсталяванне. Друкарня перастала існаваць.

Да гэтага часу распалася і сама партыя «Чорны перадзел». Мінская арганізацыя неўзабаве перайшла на пазіцыі «Народнай волі».

Характэрна, што пасля падзей 1 сакавіка 1881 года ў асяроддзі народнікаў назіраюцца расчараванне і разгубленасць, звязаныя з усведамленнем сваёй бездапаможнасці. Паступова звужваецца іх прапаганда ў вёсцы. У 1881 годзе толькі ў асобных месцах рас-

паўсюджваліся народніцкія друкаваныя выданні, галоўным чынам пракламацыі.

Аднак мінская арганізацыя народнікаў неўзабаве аднаўляе свае сілы і ўзмацняе сваю дзейнасць. Як відаць з успамінаў аднаго з яе членаў, настаўніка гімназіі А. Багдановіча, у пачатку 80-х гадоў арганізацыя налічвала звыш 80 чалавек. Яна аб'ядноўвала некалькі асобных гурткоў — семінарскі, які складаўся з вучняў гімназіі і духоўнай семінарыі, настаўніцкі, жаночы, рабочы, польскі і ваенны. У гурткі ўваходзілі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі, а таксама некалькі рабочых.

У першай палове 80-х гадоў члены мінскай групы народнікаў аддавалі шмат сіл наладжванню сувязей паміж народніцкімі групамі розных гарадоў, якія часта абрываліся пад ударамі паліцыі. Гэтай справай займаліся галоўным чынам І. Даманскі і Я. Хургін. Даманскі неаднаразова аднаўляў сувязі паміж кіраўнікамі «Народнай волі», якія знаходзіліся ў Маскве, і народнікамі гарадоў Паўночна-Заходняга краю; Хургін забяспечваў дакументамі асоб, якія знаходзіліся на нелегальным становішчы, не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Як сведчыць А. Багдановіч, мінская група нарадавольцаў мела ў гэтыя гады ў сваім складзе вопытныя кадры, якія прапягвалі вясці прапаганду ў вёсцы. Гэта Соф'я Буракоўская, аграномы Мацвееў і Бяляцкі, А. О. Бонч-Асмалоўскі, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху сярод пецярбургскага студэнцтва канца 70-х гадоў, і яго жонка В. І. Вахоўская, С. Ф. Кавалік. Пасля арышту ў 1882 годзе Бонч-Асмалоўскі быў высланы ў свой маёнтак Блонь Ігуменскага павета пад нагляд паліцыі. З гэтага часу ён і яго жонка аказваюць значную фінансавую дапамогу мінскім народнікам.

У 80-х гадах на грамадска-палітычнай арэне ў Расіі з'яўляецца новая рэвалюцыйная сіла — пралетарыят. У краіне пачынае расці рабочы рух. Гэта абумовіла паварот часткі перадавых прадстаўнікоў народніцтва ў бок рабочага класа, да марксізма.

Такі паварот адбываецца і ў асяроддзі мінскіх народнікаў. Сярод рабочых узмацняецца прапаганда, ствараюцца тайныя самаадукацыйныя гурткі. Сярод падпольных выданняў усё часцей з'яўляюцца марксісцкія творы. Напрыклад, у Мінску ў сакавіку 1884 года на кватэры ў народніка Насовіча паліцыя выявіла вялікую колькасць забароненай літаратуры, у ліку якой былі «Маніфест Камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса, «Праграма работнікаў» Ласаля, вялікая колькасць выданняў польскай рабочай партыі «Пралетарыят» і інш. Тут жа быў рукапісны сшытак, у якім змяшчаўся заклік да садзеяння групе «Вызваленне працы» ў ажыццяўленні пачатага ёю выдання «Бібліятэкі сучаснага сацыялізма».

У 1883—1884 гадах некалькі рабочых гурткоў у Мінску стварыў былы народнік урач Я. Хургін. Паводле яго слоў, у 1885 годзе ў іх налічвалася каля 160 чалавек.

Больш вольным ад уплыву народніцкай ідэалогіі быў рабочы гурток, створаны ў Мінску ў 1884 годзе Э. Абрамовічам. Гурток налічваў некалькі дзесяткаў чалавек.

Рост колькасці рабочых у падпольных гуртках і арганізацыях Мінска, як і ў іншых гарадах Расіі, сведчыў аб тым, што галоўнай сілай у рэвалюцыйным руху станавіўся пралетарыят.

5. Становішча працоўных. Рабочы рух у 70—90-х гадах XIX стагоддзя

У паслярэформенныя гады з развіццём фабрычна-заводскай прамысловасці ў Беларусі адбываўся працэс фарміравання прамысловага пралетарыяту. Шэрагі рабочых у Мінску папаўняліся перш за ўсё за кошт збяднеўшых саматужнікаў і рамеснікаў. Па меры таго як капіталізм пранікаў у сельскую гаспадарку, сялянства таксама станавілася крыніцай росту колькасці рабочых у гарадах.

Аднак пралетарыят Мінска ў 70—90-х гадах быў яшчэ нешматлікім. Колькасць рабочых не перавышала 16 тысяч, што складала каля 15 працэнтаў насельніцтва горада. Гэта былі рабочыя фабрык і заводаў (каля трох тысяч), чыгуначнікі (больш за дзве тысячы), рамонтныя рабочыя (каля пяці тысяч). Каля шасці тысяч складалі рабочыя дробных, саматужнага тыпу прадпрыемстваў.

Рабочае насельніцтва Мінска вызначалася шматнацыянальным складам. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 года відаць, што асноўную масу пралетарыяту горада складалі беларусы, рускія і яўрэі.

Становішча рабочых Мінска ў 70—90-х гадах было выключна цяжкім. Рабочы дзень на ўсіх прадпрыемствах па сутнасці не абмяжоўваўся. Зімою ён працягваўся 15—16 гадзін у суткі, летам — з 6 гадзін раніцы да 10—11 гадзін вечара, а часам і пазней. Нават пасля выдання 2 чэрвеня 1897 года закону, які абмяжоўваў рабочы дзень фабрычна-заводскіх рабочых 11,5 гадзіны, на прадпрыемствах Мінска праца па 13—14 гадзін заставалася звычайнай з'явай. Усюды па-ранейшаму ўжываліся звышурочныя работы.

Заработная плата рабочых Мінска была ніжэй заработнай платы на фабрыках і заводах прамысловых цэнтраў Расіі.

Жаночая і дзіцячая праца аплачвалася на 30—40 працэнтаў ніжэй працы мужчын, занятых на тых жа работах. На гільзавых фаб-

рыках, працуючы па 16—18 гадзін, мужчына атрымліваў у тыдзень 3—4 рублі, жанчына — 1,5 рубля. Зарплата дарослага рабочага мінскіх друкарняў складала каля 20 рублёў у месяц, а падлетка — 2—4 рублі.

Страшэнным няшчасцем для рабочых былі штрафы, якія паглыналі значную частку іх заробку. Сістэма штрафавання ў руках капіталістаў з'яўлялася не толькі сродкам павелічэння сваіх прыбыткаў, але і прыладай яшчэ большага закабалення рабочых.

Згодна з правіламі ўнутранага распарадку, неабавязковыя звышурочныя работы павінны былі праводзіцца па добраахвотнаму пагадненню з кожным асобным рабочым і за асобную плату. Плата за звышурочную работу павінна была запісвацца рабочаму ў яго разліковую кніжку, а таксама адзначацца ў кнізе кантролю звышурочных работ, якая зацвярджаецца фабрычнай інспекцыяй. Але на кожным кроку гэтыя правілы парушаліся ўладальнікамі фабрык і заводаў. Рабочых трымалі ў большасці выпадкаў без разліковых кніжак, а калі яны і былі, то ў іх не ўказваліся ўмовы найму. На гарбарным заводзе Імрата пры рэвізіі старшым фабрычным інспектарам адзначалася, што ў разліковых кніжках рабочых не азначаны ўмовы найму, г. зн. не агаворана, падзённа ці паштучна яны працавалі і за якую плату ў тым і ў другім выпадку.

Ніякай аховы працы на заводах і ў майстэрнях не існавала, што прыводзіла да масавых калецтваў і смяротных выпадкаў. У 1897 годзе, напрыклад, на дрэваапрацоўчым заводзе пры Кальварыйскім шасэ выбухам паравога катла быў забіты качагар; атрымалі цяжкае калецтва сем чалавек, адзін з якіх неўзабаве памёр; абломкі разбуранага будынка завалілі двух чалавек. Калецтвы рабочых былі пастаяннай з'явай на прадпрыемствах Мінска. Адбывалася гэта таму, што большасць прадпрыемстваў горада тулілася ў цесных, дрэнна прыстасаваных для вытворчых мэт памяшканнях. Друкарні Мінска займалі адзін, часам два пакоі, у якіх працавалі 20—30 чалавек.

Не лепшыя ўмовы былі на тытунёвых фабрыках, дзе даводзілася працаваць седзячы шчыльна адзін каля аднаго ў памяшканні без вентыляцыі.

Асабліва цяжкімі былі ўмовы працы рабочых у так званых мокрых, або вапнавых, аддзяленнях гарбарных заводаў. Людзі дыхалі атручаным ад гніласных выпарэнняў паветрам. Яны ўручную ачышчалі смярдзючыя скуры ад поўсці і падскурных рэшткаў, кучы якіх ляжалі ля рабочых месц зранку да вечара. Тут жа рабочыя елі.

Цяжкія былі і жыллёвыя ўмовы рабочых Мінска. Большасць з іх жыла ў бараках, падвалах, тулілася ва ўбогіх хацінах на ўскраінах горада. З-за цеснаты людзі спалі на падлозе, часам проста пад нарамі, спалі не толькі ў пакоях, але ў калідорах і вузкіх праходах.

«Мне даводзілася,— пісаў карэспандэнт газеты «Минский листок»,— бачыць кватэры на Пярэспе, дзе ў пакоях, вельмі невялікіх па памерах, спяць звычайна ад 9 да 12 чалавек, прычым нярэдка бывае, што здаровыя людзі спяць разам з хворымі, дзеці разам з дарослымі».

Становішча мінскіх рабочых і рамеснікаў рабілася яшчэ больш невыносным у гады неўраджаяў і прамысловых крызісаў, калі рэзка ўзрасталі цэны на тавары першай неабходнасці і павялічвалася беспрацоўе. У пачатку 80-х гадоў, напрыклад, у сувязі з неўраджаем і прамысловым крызісам у газетах было шмат паведамленняў аб цяжкім становішчы рабочых і рамеснікаў горада. «У Мінску,— гаварылася ў адной з карэспандэнцый у 1880 годзе,— цэны на хлеб дасягнулі небывалых памераў... Узраслі таксама цэны на бульбу і крупы прыкладна на 40—50 працэнтаў. Усё гэта выклікала рад выпадкаў галоднай смерці».

Рабочыя Мінска, як і ўсе працоўныя Расійскай імперыі, былі пазбаўлены самых элементарных палітычных правоў.

Жорсткая капіталістычная эксплуатацыя, бяспраўнае становішча, цяжкія эканамічныя ўмовы і паліцэйскі рэжым на фабрыках і заводах — усё гэта стварала глебу для рэвалюцыйнага руху і для распаўсюджвання ідэй марксізма сярод рабочых.

З першых сваіх крокаў рабочы рух у Беларусі быў непарыўна звязан з агульнарасійскім. Першым буйным выступленнем пралетарыяту Мінска была забастоўка ў майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ў сакавіку 1876 года, у якой удзельнічала 300 рабочых. Яна ўзнікла як стыхійны пратэст у адказ на спробу адміністрацыі затрымаць заработную плату рабочым. Забастоўка працягвалася больш за суткі. Работа ў майстэрнях аднавілася толькі пасля таго, як начальнік чыгункі аддаў загад аб неадкладнай выдачы заработнай платы.

У канцы 70 і пачатку 80-х гадоў у Мінску стачкі рабочых носяць сістэматычны характар. Часам яны суправаджаліся разгромам кантор, збіваннем фабрычнай адміністрацыі.

Першыя выступленні мінскага пралетарыяту насілі стыхійны, неарганізаваны характар. Аднак у стыхійнасці складваліся элементы свядомасці, рабочыя перастаралі верыць у непахіснасць існаваўшых парадкаў, пераконваліся ўсё больш у неабходнасці калектыўнага адпору прыгнятальнікам.

Стачкі 80-х гадоў у Расіі падрыхтавалі новы этап у развіцці рабочага руху. 80-я гады XIX стагоддзя характарызуюцца ўжо не толькі агульным уздымам рабочага руху, але і нарастаннем у ім свядомасці і арганізаванасці. Яркім доказам гэтага з'явілася славутая стачка 1885 года на Нікольскай мануфактуры Марозава ў Арэхава-Зуеве.

Марозаўская стачка паслужыла магутным штуршком да развіцця стачачнага руху па ўсёй краіне. У Мінску эканамічныя стачкі становяцца больш частымі і арганізаванымі. Летам 1886 года баставалі рабочыя абойна-набіўной фабрыкі і дзвюх буйнейшых майстэрняў горада. Рабочыя абойна-набіўной фабрыкі патрабавалі скарачэння працягласці рабочага дня. Стачка працягвалася некалькі дзён і закончылася перамогай.

У канцы красавіка 1888 года рабочыя слясарна-кавальскіх майстэрняў патрабавалі павялічыць заработную плату або скараціць рабочы дзень. Іх патрабаванні не былі прыняты. Тады яны спынілі работу. Забастоўка праходзіла арганізавана. Каля варот майстэрняў былі выстаўлены пікеты, каб не дапусціць штрэйкбрэхераў. Па ініцыятыве кіраўнікоў забастоўкі больш бедным рабочым аказвалася грашовая дапамога з агульнай касы рабочых. Баставаўшыя наладжвалі за горадам сходкі.

У сувязі з уздымам рабочага руху ў 80-х гадах у многіх прамысловых цэнтрах Расіі ўзнікалі рабочыя і марксісцкія гурткі і групы. Да гэтага ж часу адносіцца з'яўленне першых рабочых арганізацый марксісцкага напрамку і ў Мінску. Тут з 1885 года дзейнічала рабочая арганізацыя пад кіраўніцтвам І. А. Гурвіча. У яе састаў уваходзіла некалькі гурткоў, якія аб'ядноўвалі каля 130 рабочых. Заняткі ў гуртках садзейнічалі выпрацоўцы марксісцкіх перакананняў, фарміраванню навуковага светапогляду ў перадавых рабочых.

Вялікі ўплыў на ідэйнае развіццё рэвалюцыйных гурткоў Мінска аказала група «Вызваленне працы». Тут працы Пляханава і выданні групы «Вызваленне працы» пачалі паяўляцца ў сярэдзіне 80-х гадоў. К канцу 1887 года сацыял-дэмакраты Мінска ўстанаўліваюць непасрэдную сувязь з групай «Вызваленне працы». Сувязь падтрымлівалася праз сацыял-дэмакрата Шмулевіча, які жыў у Швейцарыі і неаднаразова бываў у Мінску. З гэтага часу Мінск становіцца адным з важных пунктаў перавозкі праз мяжу выданняў групы «Вызваленне працы». У Мінску былі пастаянныя карэспандэнты «Работніка», які выдаваўся ў Жэневе.

З канца 80-х гадоў пад уздзеяннем агульнарасійскага сацыял-дэмакратычнага руху ў Мінску расце колькасць рабочых гурткоў. У 1887—1888 гадах тут афармляецца другая даволі буйная рабочая арганізацыя. Яе гурткі і групы меліся ў чыгуначных майстэрнях, дэпо, ліцейным і гарбарным заводах, шчаціннай фабрыцы і ў многіх саматужных майстэрнях. Тут рабочыя вывучалі «Капітал», «Маніфест Камуністычнай партыі», гісторыю рускага і заходнееўрапейскага рабочага руху.

Агульнае кіраўніцтва гуркамі ажыццяўляў створаны ў 1893 годзе камітэт рабочай арганізацыі. Пад непасрэдным уздзеяннем каміт-

тага павялічвалася колькасць рабочых, якія ўступалі ў гурткі, і сама сетка іх на прадпрыемствах горада разрасталася. Арганізацыя мела грашовыя фонды, канспіратыўныя кватэры і нелегальныя бібліятэкі з вялікай колькасцю кніг.

Мінскія сацыял-дэмакраты мелі сувязі з марксістамі іншых гарадоў. З 1895 года была ўстаноўлена сувязь з пецярбургскім «Саюзам барацьбы». Аб гэтым сведчыць той факт, што з Мінска паступалі карэспандэнцыі аб рэвалюцыйных падзеях у падпольную сацыял-дэмакратычную газету «Рабочее дело». Яна рыхтавалася да выдання ў канцы 1895 года пецярбургскім «Саюзам барацьбы». Падтрымлівалася цесная сувязь з сацыял-дэмакратамі Кіева. Мінскія сацыял-дэмакраты прымалі непасрэдны ўдзел у стварэнні друкарні для «Рабочей газеты».

Вялікі ўплыў на дзейнасць сацыял-дэмакратычных гурткоў у Мінску аказала наведанне У. І. Леніным Вільні, калі ён восенню 1895 года вяртаўся з-за граніцы. Тут ён абмяркоўваў з мясцовымі сацыял-дэмакратамі наспеўшыя пытанні і задачы рабочага руху, вёў з імі перагаворы аб выданні зборніка «Работник».

Значную ролю ў развіцці рэвалюцыйнага рабочага руху і распаўсюджванні марксізма сярод працоўных Мінска адыгралі Ф. Э. Дзяржынскі і вядомы сацыял-дэмакрат К. Залеўскі. Рэвалюцыйная дзейнасць іх у другой палове 90-х гадоў звязана з Мінскам. У 1897—1900 гадах Ф. Э. Дзяржынскі неаднаразова наведваў Мінск. К. Залеўскі ў 1894 годзе за актыўную рэвалюцыйную дзейнасць быў высланы з Варшавы ў Мінск пад нагляд паліцыі. Нягледзячы на пераследаванні мясцовых улад, ён на працягу паўгода сумесна з перадавымі рабочымі стварыў падпольныя гурткі сярод слесараў металаапрацоўчага завода і чыгуначнікаў. Члены гэтых гурткоў, асабліва чыгуначнікі, вялі вялікую прапагандысцкую работу. Па характару сваёй прафесіянальнай дзейнасці чыгуначнікі былі цесна звязаны з рабочымі шэрага буйных станцый, у тым ліку Масквы. Гэта садзейнічала росту іх пралетарскай салідарнасці, давала ім магчымасць хутка даведвацца аб рэвалюцыйных падзеях у краіне і распаўсюджваць звесткі аб іх сярод пралетарыяту Мінска.

У другой палове 90-х гадоў мінскія сацыял-дэмакраты ўзмацнілі сваю дзейнасць. Яны распаўсюджвалі пракламацыі, рэвалюцыйную і марксісцкую літаратуру. У 1895—1898 гадах у гуртках Мінска і сярод перадавых рабочых былі шырока вядомы такія працы У. І. Леніна, як «Задачы рускіх сацыял-дэмакратаў», «Як трымаць сябе на допытах», «Новае злачынства самадзяржаўя», «Аб інтэрнацыянальным сацыял-дэмакратычным кангрэсе ў Лондане», газета пецярбургскага «Саюза барацьбы» «Рабочая мысль». У гэты час у горадзе быў надрукаван шэраг рэвалюцыйных лістовак.

Важнае значэнне для палітычнага выхавання мінскіх рабочых у духу класавага адзінства і пралетарскага інтэрнацыяналізму мелі першамайскія палітычныя дэманстрацыі і мітынгі, якія праводзіліся пры непасрэдным удзеле сацыял-дэмакратычных гурткоў. Па прыкладу пралетарыяту Пецярбурга і Масквы рабочыя Мінска ў 1895 годзе ўпершыню адзначаюць дзень міжнароднай салідарнасці. Першага мая адбыўся нелегальны сход рабочых. У 1896 годзе мінскія рабочыя правялі першую нелегальную маёўку, на якой прысутнічала да 300 чалавек. У наступныя гады святкаванне Першага мая ў Мінску становіцца традыцыйным. Напярэдадні і ў дні майскіх свят шырока распаўсюджвалася нелегальная літаратура.

Ад канспіратыўных сходаў і тайных сходак за горадам, у лесе, рабочыя пераходзілі да правядзення першамайскіх стачак.

90-я гады XIX стагоддзя азнаменаваліся шырокай стачачнай барацьбой пралетарыяту Масквы, Пецярбурга, Іванава-Вазнясенска, Арэхава-Зуева і іншых прамысловых цэнтраў Расіі. Па прыкладу рускага пралетарыяту ўзнімаўся на барацьбу і рабочы клас Беларусі. У другой палове 90-х гадоў у рабочы рух уцягваецца значная колькасць працоўных Мінска. Толькі за 1895 год у горадзе адбылося 54 стачкі. Найбольш упартай з іх з'явілася забастоўка ў майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, у якой удзельнічала больш за 350 чалавек. Рабочыя патрабавалі вяртання грошай, незаконна вылічаных з іх у пенсійную касу. Забастоўка працягвалася з 28 студзеня па 14 сакавіка. Адміністрацыя чыгункі вымушана была задаволіць патрабаванні рабочых.

У наступныя гады, асабліва ў 1898—1899, стачачная барацьба не спыняецца. Рабочыя патрабуюць паляпшэння ўмоў працы, змяншэння рабочага дня да 8 гадзін, павышэння заработнай платы. У ходзе забастовак умацоўваліся сувязі паміж рабочымі розных прадпрыемстваў горада, мацнела іх салідарнасць.

Рэвалюцыйны рух у другой палове 90-х гадоў з усёй неабходнасцю вылучаў задачу аб'яднання разрозненых сацыял-дэмакратычных груп у адзіную партыю рабочага класа.

Стварэнне такой партыі ва ўмовах жорсткага рэжыму царскай Расіі было справай незвычайна цяжкай. Першыя паспяховыя крокі ў гэтым напрамку зрабіў У. І. Ленін, стварыўшы ў 1895 годзе пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Гэта арганізацыя — першы сур'ёзны зачатак рэвалюцыйнай марксісцкай партыі, якая абапіралася на рабочы рух. Узнікненне і дзейнасць пецярбургскага «Саюза барацьбы» паслужылі магутным штуршком да ўтварэння такіх жа арганізацый у іншых месцах Расіі. «Саюзы барацьбы» ўзнікалі ў Маскве, Кіеве, Екацерынаславе, Іванава-Вазнясенску і ў многіх іншых прамысловых гарадах краіны.

Пецярбургскі «Саюз барацьбы» не толькі ідэйна рыхтаваў аб'яднанне сацыял-дэмакратычных арганізацый Расіі, але прымаў і практычныя меры для склікання з'езду. Спробы склікаць з'езд рабіліся і іншымі «Саюзамі барацьбы», у прыватнасці маскоўскім «Рабочым саюзам». Але ўсе яны канчаліся няўдачай. Толькі кіеўскай сацыял-дэмакратычнай групе «Рабочей газеты» ўдалося на працягу 1897—1898 гадоў правесці паспяховую работу па скліканню з'езду. Пасля карпатлівай падрыхтоўчай работы ў Мінску збіраецца I з'езд РСДРП.

Ціхі правінцыяльны Мінск выбралі невыпадкова. У ім яшчэ не было ўзмоцненага паліцэйскага сачэння за рэвалюцыйнай дзейнасцю сацыял-дэмакратаў, як у Пецярбургу, Маскве, Кіеве, Екацерынаславе і іншых прамысловых цэнтрах. Акрамя таго, чыгуначныя шляхі звязвалі Мінск з прамысловымі раёнамі Расіі, Украіны і Польшчы. Гэта давала дэлегатам з іншых гарадоў магчымасць своечасова прыбыць на з'езд.

Для работы з'езду, прыблізна за месяц да яго адкрыцця, былі знойдзены дзве кватэры: адна ў доме № 135 па Захар'еўскай вуліцы, другая — на Троіцкай гары па Георгіеўскай вуліцы. Найбольш удалай у сэнсе канспірацыі аказалася кватэра на Захар'еўскай вуліцы. Гэта быў дом чыгуначнага служачага, члена Мінскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі П. В. Румянцава. Сам ён, хоць у мінулым і сядзеў у турме за рэвалюцыйную дзейнасць, быў па-за падазрэннямі.

Выгадна быў размешчан і дом. Насупраць праз вуліцу ў адным з будынкаў размяшчалася конная жандармерыя. Вокны доміка выходзілі ў невялікі сад, за якім пачынаўся лес.

1 сакавіка 1898 года I з'езд сацыял-дэмакратычных арганізацый Расіі пачаў работу. У рабоце з'езду прымалі ўдзел прадстаўнікі шасці арганізацый: па аднаму дэлегату ад пецярбургскага, кіеўскага і екацерынаслаўскага «Саюзаў барацьбы за вызваленне рабочага класа», два — ад «Рабочей газеты» і тры — ад Бунда (Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Расіі і Польшчы, створаны ў 1897 годзе). Усяго было 9 дэлегатаў: С. І. Радчанка — ад Пецярбурга, А. А. Ваноўскі — ад Масквы, К. А. Трусевіч — ад Екацерынаслава, Б. Л. Эйдэльман і Н. А. Вігдорчык — ад «Рабочей газеты», П. Л. Тучапскі — ад кіеўскага «Саюза барацьбы» і рабочага камітэта, А. І. Крэмер, А. Мутнік і Ш. Кац — ад Бунда.

З'езд праходзіў пад выглядам імянін жонкі П. В. Румянцава. У адным з пакояў, дзе засядалі дэлегаты, стаяў па-святочнаму накрыты стол. У суседнім пакоі няспынна палілася ў печы, каб у выпадку неабходнасці можна было хутка спаліць кампраметуючыя матэрыялы.

Адбылося шэсць пасяджэнняў. З канспіратыўных меркаванняў пратаколаў не вялося: запісваліся толькі рэзалюцыі. Старшынёй з'езду, неафіцыяльным, быў Б. Л. Эйдэльман, сакратарамі — Н. А. Вігдорчык і П. Л. Тучапскі.

Галоўным пытаннем парадку дня было пытанне аб стварэнні партыі. З'езд абвясціў стварэнне РСДРП. Першы пункт яго рашэнняў гаварыў: «Арганізацыі «Саюзаў барацьбы за вызваленне рабочага класа», групы «Рабочей газеты» і «Агульнаяўрэйскага рабочага саюза ў Расіі і Польшчы» зліваюцца ў адзіную арганізацыю пад назвай «Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя».

Назваўшы партыю «Расійскай», а не «Рускай», з'езд тым самым падкрэсліў, што сацыял-дэмакраты ставілі задачай аб'яднаць у сваіх радах не толькі рускіх, а пралетарыяў усіх нацыянальнасцей, якія насялялі Расійскую імперыю. У. І. Ленін лічыў такое рашэнне з'езду правільным і надаваў яму вялікае значэнне.

І з'езд прыняў вельмі важнае рашэнне па нацыянальнаму пытанню, прызнаўшы права нацый на самавызначэнне.

Значнае месца ў рабоце з'езду занялі даклады дэлегатаў з месц і асабліва абмеркаванне арганізацыйных пытанняў. На з'ездзе быў выбраны Цэнтральны Камітэт РСДРП. Друкаваным органам партыі была прызнана кіеўская «Рабочая газета».

Праграму і Статут партыі з'езд не прыняў і нават не абмяркоўваў. Было вырашана выдаць Маніфест ад імя партыі. Маніфест і рашэнні з'езду ўпершыню выдадзены асобным лістком у Беластоку ў красавіку 1898 года. У выпушчаным ад імя І з'езду «Маніфесце Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі» падводзіліся вынікі рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класа і намячаліся далейшыя задачы рабочага руху ў Расіі, падкрэслівалася роля сацыял-дэмакратычнай партыі ў справе спалучэння рабочага руху з навуковым сацыялізмам. У «Маніфесце» ўказвалася, што заваяванне палітычнай свабоды — толькі першы крок да ажыццяўлення гістарычнай задачы пралетарыяту, а іменна да стварэння такога грамадскага ладу, у якім не будзе месца эксплуатацыі чалавека чалавекам.

«Маніфест», такім чынам, правільна вызначаў агульны напрамак дзейнасці партыі. У той жа час ён меў рад сур'ёзных палітычных недахопаў. У ім недастаткова выразна праводзіліся асноўныя ідэі аб заваяванні пралетарыятам палітычнай улады, аб кіруючай ролі рабочага класа і яго саюзніках у барацьбе супраць царызму і капіталізму. Рашэнні з'езду па арганізацыйных пытаннях таксама аказаліся не на вышыні. Цэнтральны Камітэт быў вельмі абмежаваны ў сваіх дзеяннях, што ж датычыць мясцовых камітэтаў, то ім прадастаўлялася шырокая аўтаномія, чым аслабляўся ўплыў ЦК на дзейнасць партыйных арганізацый.

Вестка аб I з'ездзе РСДРП абляцела ўсе сацыял-дэмакратычныя гурткі. У. І. Леніну, які знаходзіўся ў ссылцы ў сяле Шушанскім, аб з'ездзе расказала Н. К. Крупская, якая прыехала туды ў маі 1898 года. У сваіх успамінах П. Лепяшынскі пісаў, што Уладзімір Ільіч «з найвялікшай гордасцю заявіў нам, сваім бліжэйшым таварышам па ссылцы і аднадумцам, што цяпер ён член Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Мы таксама ўсе з вялікім задавальненнем падхапілі гэты новы для нас матыў і як быццам адразу выраслі ў сваіх уласных вачах».

Рашэнні I з'езду РСДРП, нягледзячы на іх недахопы, сталі зброяй у руках рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў у барацьбе за стварэнне пралетарскай партыі. Гэта была вялікая перамога марксізма ў Расіі.

РАЗДЗЕЛ VIII

МІНСК У ПЕРЫЯД ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

1. Прамысловасць

Эканоміка Беларусі развівалася на аснове агульных заканамернасцей, уласцівых усёй Расіі. У прамысловасці адбывалася канцэнтрацыя вытворчасці, расло накапленне капіталаў, узмацнялася іх цэнтралізацыя. Стваралася сетка банкаў і розных крэдытных таварыстваў. Узнікалі манапалістычныя аб'яднанні капіталістаў. Буйныя агульнарасійскія манапалістычныя прамысловыя і банкаўскія аб'яднанні ахапілі ў Беларусі многія важнейшыя галіны вытворчасці і збыту.

У той жа час Беларусь мела свае асаблівасці. У параўнанні з буйнымі прамысловымі раёнамі Расіі ў пачатку XX стагоддзя яна працягвала заставацца раёнам з больш нізкім узроўнем прамысловага развіцця. Тут па-ранейшаму пераважалі дробныя і сярэднія прадпрыемствы, захавала сваю ролю саматужна-рамесная вытворчасць. Працэсы накаплення капіталаў, цэнтралізацыі вытворчасці, росту манаполій былі выяўлены слабей, чым у прамыслова развітых раёнах Расіі.

Мінск у пачатку XX стагоддзя заставаўся буйнейшым прамысловым і гандлёвым цэнтрам Беларусі. Колькасць насельніцтва ў горадзе складала ў 1904 годзе 100 260 чалавек, у той час як у Віцебску — 81 220, Магілёве — 49 886, Гомелі — 47 239, Гродна — 43 467 чалавек. У 1913 годзе насельніцтва Мінска павялічылася да 106 673 чалавек. Па нацыянальнаму складу яно было шматлікім. У горадзе ў той час пражывалі беларусы, рускія, яўрэі, палякі, татары, немцы і інш.

У пачатку XX стагоддзя ў горадзе працягваўся рост колькасці прамысловых прадпрыемстваў. Калі ў 1900 годзе іх налічвалася 74, то ў 1913 годзе — 124. Колькасць рабочых вырасла за тоі жа час з 2987 да 5746 чалавек, а сума вытворчасці — з 4667,7 тысячы да 12 157 тысяч рублёў. Праўда, па-ранейшаму гэта былі сярэднія і дробныя прадпрыемствы. Прыкметна ўзраслі тэкстыльная, гарбарная, картонна-папяровая, паліграфічная, металаапрацоўчая вытворчасці. Колькасць прадпрыемстваў у гэтых галінах павялічылася ў 1,5—2 разы, колькасць рабочых у 2—3 разы. Аднак прыведзеныя даныя значна ніжэй даных за апошняе дзесяцігоддзе XIX стагоддзя, калі колькасць прадпрыемстваў узрасла ў 2,5 раза, а колькасць рабочых у 2—7 разоў. Па ўсіх відах вытворчасці тэмп росту колькасці прадпрыемстваў адзін і той жа, але калі за 1890—1900 гады колькасць рабочых павялічылася больш чым у чатыры разы, то за 1900—1913 гады — менш чым у два разы. Знікае рэзкае адрозненне ў развіцці асобных галін, яно ідзе больш раўнамерна, сведчачы, што этап станаўлення капіталістычнай вытворчасці к пачатку XX стагоддзя завяршаўся і ў ходзе канкурэнтнай барацьбы вызначыліся перспектывы развіцця ўсёй прамысловасці горада і асобных яе галін.

Прамыслова-эканамічнае развіццё Мінска тармазілася крызісам, які ахапіў у 1900—1903 гадах многія раёны Расіі. Ён закрануў перш за ўсё лясную прамысловасць і гандаль, якія адыгрывалі важную ролю ў эканоміцы Мінскай губерні і былі цесна звязаны з расійскімі і замежнымі манапалістычнымі аб'яднаннямі. Мінскі губернатар паведамляў у 1901 годзе, што страты лесапрамыслоўцаў Мінскай і Магілёўскай губерняў складалі тры мільёны рублёў. Разладжанасць лясной прамысловасці і лесагандлю адбілася на іншых галінах вытворчасці.

Адлюстраваннем крызіснага стану эканомікі з'явілася рэзкае скарачэнне крэдытных аперацый Мінскага аддзялення Дзяржаўнага банка. За тры гады (1899—1901) уліковыя аперацыі паменшыліся з 22 да 10 мільёнаў рублёў, г. зн. больш чым у два разы.

Значна скарацілася вытворчасць вінакурных заводаў. Абароты «Мінскага таварыства вінакурных заводчыкаў» (асноўны капітал 100 тысяч рублёў) зменшыліся ў гады крызісу амаль удвая. Крызіс лесагандлю і вінакурэння, падзенне эканамічнай кан'юнктуры выклікалі скарачэнне прытоку капіталаў у прамысловасць і гандаль і прывялі да змяншэння попыту на прамысловае абсталяванне для лесапільных і вінакурных заводаў. Гэта ў сваю чаргу адбілася на металаапрацоўчай і некаторых іншых галінах прамысловасці, дзе назіралася скарачэнне вытворчасці і рабочых.

Зімой 1902 года павялічыліся цяжкасці на грашовым рынку. З банкаў і кантор узмоцнена забіраліся ўклады, што рэзка парушы-

ла крэдытную сістэму. Адбыўся рад банкруцтваў. Вайна з Японіяй ускладніла вынікі крызісу.


Старшы фабрычны інспектар Мінскай губерні ў ліпені 1904 года ў данясенні губернатару ўказваў, што большасць фабрык і заводаў перажываюць прамысловы крызіс у сувязі з ваеннымі дзеяннямі на Далёкім Усходзе, вытворчасць скарачаецца «ў выніку скарачэння заказаў і амаль поўнай адсутнасці крэдыту; пры гэтым недахопу ў рабочых нідзе не адчуваецца, а наадварот — адчуваецца іх лішак». У 1904 годзе скараціліся вытворчасць цагельныя, гарбарныя, ганчарныя і іншыя заводы. Некаторыя дробныя прадпрыемствы былі закрыты.

Пасля 1904 года крызіс перайшоў у працяглую дэпрэсію, якая з ваганнямі ў той ці іншы бок працягвалася да канца 1909 года. У 1907—1908 гадах у некаторых галінах прамысловасці зноў назіраецца заняпад. Асабліва значнае падзенне вытворчасці ў Мінску назіралася летам 1908 года. Больш за ўсё пацярпела гарбарная, лесапільная, часткова саматужна-рамесная прамысловасць. У чэрвені 1908 года ў Мінску закрыліся дзве фабрыкі па апрацоўцы шчаціння, амаль поўнасцю спыніліся работы на трох гарбарных заводах. Мясцовая гарбарная прамысловасць адчувала моцную канкурэнцыю варшаўскіх і замежных фірм, якія выцяснялі тавары мясцовай вытворчасці. Газета «Минское эхо» паведаміла ў лістападзе 1908 года: «Моцны эканамічны крызіс перажываюць у цяперашні час мясцовыя нарыхтоўшчыкі абутку. Фабрычная вытворчасць абутку, моцна развіваючыся, захапіла рынак, і саматужнікам цяпер зусім няма чаго рабіць, прынамсі ў нас у Мінску».


У выніку рэзкага падзення цэн на лес на замежных рынках значна скараціўся экспарт лесаматэрыялаў за мяжу і амаль спыніўся іх вываз у паўднёвыя губерні Украіны.

Крызіс у пачатку XX стагоддзя садзейнічаў узмацненню цэнтралізацыі капіталу і росту манапалістычных аб'яднанняў капіталістаў. У 1901 годзе ў Мінску было заснавана акцыянернае таварыства крухмала-патачнага завода «Сокал» з асноўным капіталам у 150 тысяч рублёў. Іншыя крухмала-патачныя заводы падпарадкаваліся больш буйному акцыянернаму таварыству «Прасвет», заснаванаму ў 1903 годзе. Яно мела асноўны капітал у 600 тысяч рублёў. Мінская конная чыгунка знаходзілася ў руках «Акцыянернага таварыства гарадскіх і прыгарадных конных чыгунак у Расіі», праўленне якога размяшчалася ў Маскве. Конная чыгунка злучыла некалькі вуліц у цэнтры горада. Два найбольш буйныя металаапрацоўчыя заводы ўваходзілі ў акцыянернае таварыства «Якабсон, Ліфшыц і К°». У сваю чаргу гэтыя іншыя металаапрацоўчыя прадпрыемствы кантралявалiся «Акцыянерным прамысловым таварыствам механічных заводаў»

План Мінска XVIII стагоддзя



Прамысловая ўскраіна Мінска. Канец XIX — пачатак XX стагоддзя





Дом, у якім адбыўся I з'езд РСДРП






Старажоўская вуліца

Петрапаўлаўская вуліца



Гарадскія гандлёвыя рады





Будынак грамадскага сходу

Будынак масонскага аб'яднання
па вуліцы Захар'еўскай



Вуліца Губернатарская.
Будынак пошты





На кірмашы







Аляксандраўскі сквер

Падгорная вуліца





Прэабражэнская вуліца




Губернатарская вуліца



Губернатарскі сад

Гарадская спартыўная пляцоўка






Будынак акружнога суда на Саборнай плошчы

Від на горад і раку Свіслач з боку Троіцкай гары



Рабочы раён «Ляхаўка»



Перон гарадскога вакзала



з праўленнем у Варшаве, а ў Мінску знаходзіўся яго пастаянны прадстаўнік.

Вострая канкурэнтная барацьба паміж капіталістамі, узмоцненая крызісам, прыводзіла да разарэння эканамічна слабых прадпрыемстваў і паглынання іх больш моцнымі групамі капіталістаў. Прамыслоўцы і гандляры ў пошуках выхаду з эканамічных цяжкасцей станавіліся на шлях стварэння манапалістычных аб'яднанняў. У канцы 1908 года ў Беластоку быў скліканы з'езд гарбарных фабрыкантаў Паўночна-Заходняга краю. У дакладах з'езду канстатаваўся заняпад гарбарнай вытворчасці ў Мінску і Беларусі з прычыны крызісу і моцнай канкурэнцыі варшаўскіх і замежных фірм. З'езд прызнаў неабходным распачаць арганізацыю саюза гарбарных фабрыкантаў. У тым жа 1908 годзе ў Мінску адкрылася аддзяленне «Расійскага таварыства вінакурных заводчыкаў». У лістападзе 1908 года ўтварыўся сіндыкат солепрамыслоўцаў. Уладальнікі цагельных заводаў Мінска ў пачатку 1909 года заключылі пагадненне аб арганізацыі сіндыката цагельных заводчыкаў.

Манапалістычныя аб'яднанні спачатку былі яшчэ слабымі і нярэдка, праіснаваўшы некаторы час, распадаліся. Але затым яны ўзнікалі зноў пад тымі ж ці іншымі назвамі, робячыся больш моцнымі і жыццяздольнымі. Крызіс і дэпрэсія паскорылі працэс узбуйнення манапалістычных аб'яднанняў. У 1908 годзе Мінскі запалкавы сіндыкат аб'яднаўся з Маскоўскім саюзам запалкавых фабрыкантаў. Тады ж вінакурныя заводчыкі Мінска далучыліся да «Расійскага таварыства вінакурных заводчыкаў», праўленне якога знаходзілася ў Маскве. Гэта ўзмацняла залежнасць мясцовай эканомікі ад расійскага манапалістычнага капіталу, больш трывала звязвала Беларусь з усерасійскім рынкам.

Пасля 1908 года ў прамысловасці Мінска намячаецца ажыўленне, якое з 1910 года перайшло ва ўздым. Павялічылася колькасць сярэдніх прадпрыемстваў. Калі ў 1900 годзе ў Мінску было восем прадпрыемстваў з колькасцю рабочых ад 51 да 100 чалавек, то ў 1913 годзе іх стала 14. За той жа час колькасць больш буйных прадпрыемстваў (звыш 100 рабочых) павялічылася з чатырох да 13. На гэтыя 13 прадпрыемстваў прыпадала 49,1 працэнта ўсіх рабочых і больш за 40 працэнтаў прамысловай прадукцыі.

У пачатку XX стагоддзя на многіх прадпрыемствах Мінска выкарыстоўваліся механічныя рухавікі, што сведчыць аб вядомых поспехах развіцця капіталізму ў прамысловасці. У сярэднім на адно прадпрыемства ў цэнзавай прамысловасці прыпадала 8,8 конскай сілы магутнасці механічных рухавікоў, у той час як ва ўсёй прамысловасці Беларусі 2 конскія сілы. Па магутнасці механічных рухавікоў прадпрыемствы Мінска значна адставалі ад прадпрыемстваў Расіі. Асаб-

Зіва вялікае было адставанне металаапрацоўчых прадпрыемстваў. У той час як сярэдняя магутнасць аднаго рухавіка на металаапрацоўчых прадпрыемствах усёй дарэвалюцыйнай Расіі раўнялася 60 конскім сілам, у Мінску яна складала 16,3 конскай сілы. Характэрна і тое, што толькі два рухавікі з 24 улічаных па магутнасці перавышалі 50 конскіх сіл. Пры гэтым прадпрыемствы па апрацоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў мелі 48,2 працэнта агульнай колькасці рухавікоў, а іх магутнасць складала 35 працэнтаў агульнай магутнасці механічных рухавікоў. На прадпрыемствы па апрацоўцы металаў прыпадала 11,1 працэнта агульнай колькасці рухавікоў.

У гады прамысловага ўздыму тэхнічнае аснашчэнне фабрык і заводаў Мінска некалькі палепшылася. Колькасць механічных рухавікоў да 1913 года вырасла з 24 да 37, агульная магутнасць якіх складала 875 конскіх сіл.

Найбольш буйнымі прадпрыемствамі Мінска напярэдадні вайны былі машынабудаўнічы завод фірмы «Якабсон, Ліфшыц і К°», завод Янішэўскага, абойная фабрыка Кантаровіча, чыгуначныя майстэрні і некаторыя іншыя. Кашарскі чыгуналіцейны і машынабудаўнічы завод фірмы «Якабсон, Ліфшыц і К°» даваў у 1900 годзе прадукцыі на 88 тысяч рублёў, а колькасць рабочых на ім складала 102 чалавекі. У 1913 годзе колькасць рабочых тут узрасла да 350 чалавек, а сума вытворчасці да 500 тысяч рублёў. Завод адліваў каля 60 тысяч пудоў чыгунных вырабаў, выпускаў машыны, помпы, а таксама абсталяванне для вінакурных, мукамольных, крухмальных, лесапільных, шкляных і іншых заводаў. Прадукцыя збывалася не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Напрыклад, у 1901 годзе завод атрымаў заказы з Пермі і Сібіры. Другі машынабудаўнічы завод гэтай фірмы выпускаў у 1900 годзе прадукцыі на 110 тысяч рублёў, маючы 94 рабочых. У 1913 годзе колькасць рабочых на ім узрасла да 190 чалавек, а гадавая вытворчасць — да 300 тысяч рублёў. Машынабудаўнічы завод Янішэўскага ў 1903 годзе даваў прадукцыі на суму каля 120 тысяч рублёў. Да 1913 года прадукцыйнасць завода ўзрасла да 300 тысяч рублёў у год. На заводзе было 120 рабочых. Механізацыя яго знаходзілася на нізкім узроўні.

Іншыя, больш дробныя металаапрацоўчыя прадпрыемствы выпускалі асобныя дэталі да машын, выраблялі прасцейшыя сельскагаспадарчыя прылады, рамантавалі рознае машыннае абсталяванне і сельскагаспадарчы інвентар. Прадукцыя металаапрацоўчых прадпрыемстваў Мінска не задавальняла мясцовы попыт на прамысловае абсталяванне і сельскагаспадарчы інвентар. Складанае прамысловае абсталяванне і многія сельскагаспадарчыя машыны ўвозіліся ў Беларусь з прамысловых цэнтраў Расіі і з-за мяжы. У прыватнасці, фірма «Якабсон, Ліфшыц і К°» побач са збытам прадукцыі сваіх за-

водаў пастаўляла на беларускі рынак з цэнтральнай Расіі сартавое, дахавае, кацельнае і рэзервуарнае жалеза, двухтаўровыя бэлькі, рэйкі, жалезныя, чыгунныя і медныя трубы. З-за мяжы фірма ўвозіла лакамабілі, абсталяванне для маслабойных заводаў, жняркі, касілкі, паравыя малатарні.

Фабрыка Кантаровіча (заснавана ў 1899 годзе) мела два невялікія рухавікі агульнай магутнасцю 16 конскіх сіл. У 1900 годзе яна выпускала прадукцыі на 45,5 тысячы рублёў, працавала на прывазной сыравіне, якая паступала з цэнтральнай Расіі. Гатовая прадукцыя рэалізоўвалася на мясцовым рынку. Да 1913 года колькасць рабочых на фабрыцы ўзрасла да 325 чалавек, а гадавая вытворчасць да 350 тысяч рублёў.

У 1910 годзе ў Мінску таварыства руска-амерыканскага механічнага вырабу абутку адкрыла абутковую фабрыку «Арол», на якой было занята 160 рабочых. На ёй былі механічныя рухавікі і спецыяльныя абутковыя машыны, ужывалася раздзяленне працы, шырока выкарыстоўвалася танная жаночая праца. У 1911 годзе маскоўскае акцыянернае таварыства «Шаўрохром» заснавала ў Мінску абутковую фабрыку «Скараход».

Параўнаўча буйной была фабрыка жаночых грабянёў, на якой у 1913 годзе працавала 180 рабочых, быў механічны рухавік у 20 конскіх сіл, гадавая вытворчасць складала 300 тысяч рублёў.

У Мінску працавалі тры чыгуначныя майстэрні па рамонту вагонаў і паравозаў. У майстэрні па рамонту вагонаў Лібава-Роменскай чыгункі ў 1900 годзе налічвалася 133 рабочыя, а сума гадавой вытворчасці складала 250 тысяч рублёў. Да 1913 года колькасць рабочых узрасла да 171 чалавека, гадавая вытворчасць — да 342 тысяч рублёў. У дэпо Маскоўска-Брэсцкай чыгункі колькасць рабочых павялічылася за гэты ж час са 144 да 326 чалавек, гадавая вытворчасць — са 156 тысяч да 580 тысяч рублёў. Найбольш буйной лічылася паравоза-вагонарамонтная майстэрня Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, дзе ў 1913 годзе працавала 480 чалавек. Гадавая вытворчасць яе дасягала 960 тысяч рублёў.

Істотнае месца ў эканамічным жыцці Мінска займала рамесная вытворчасць. У пачатку XX стагоддзя ў горадзе налічвалася звыш шасці тысяч рамеснікаў, выключаючы рабочых на даму, а ў 1913 годзе — каля васьмі тысяч. Большасць рамесных майстэрняў была дробнай. У сярэднім на адну майстэрню прыпадалі адзін-два рабочыя. Структура рамеснай вытворчасці не змянілася.

З развіццём капіталізму рамесныя майстэрні сталі ў многіх выпадках прыдаткам капіталістычнай фабрыкі. У сваю чаргу фабрыка нярэдка выклікала да жыцця дробных «прамыслоўцаў», якія займаліся або выкананнем рада дапаможных вытворчых аперацый, або,

калі фабрыка абмяжоўвалася вытворчасцю паўфабрыкатаў, далейшай іх апрацоўкай.

Другая рыса, якая характарызуе рамесную вытворчасць горада ў пачатку XX стагоддзя,— поўнае падпарадкаванне рамяства гандлёвым прадпрыемствам. У 1913 годзе мінскі паліцмайстар паведамляў фабрычнаму інспектару, што «кожны гаспадар-аптавік мае пэўную колькасць майстроў, якія дастаўляюць яму вырабы сваіх чаляднікаў за даўно ўстаноўленую плату, і пераход да другога гаспадараптавіка па эканамічных разліках немагчымы, таму што апошні яго не прыме да сябе з прычыны салідарнасці і згуртаванасці гаспадароўаптавікоў. Апошнія дыктуюць майстрам цэны за работу, пазычаюць ім грошы, устанаўліваюць рыначныя цэны і наогул трымаюць майстроў у дастатковай залежнасці ад сябе». У другім паведамленні ўказвалася, што ў Мінску «ёсць некалькі аптовых гандляроў, якія вядуць шырокі гандаль вырабамі мясцовых майстроў у гарадах Каўказа і Сібіры». Знаходзячыся ў залежнасці ад буйных прадпрыемцаў і гандляроў, рамеснікі былі ўцягнуты ў сферу дзейнасці фінансавага капіталу, які падпарадкаваў сабе сярэдніх і дробных гаспадароў.

У гады ўздыму на базе росту прамысловасці і канцэнтрацыі вытворчасці пачаўся працэс узбуйнення капіталістычных манаполій. У 1912 годзе асобныя аб'яднанні лесапрамыслоўцаў зліліся ў саюз лесапрамыслоўцаў Паўночна-Заходняга краю, куды ўвайшоў і мінскі сіндыкат. Мінскія металаапрацоўчыя заводы знаходзіліся ў цеснай сувязі з акцыянерным таварыствам Паўночна-Заходніх металічных, механічных і суднабудаўнічых заводаў.

У пачатку XX стагоддзя далейшае развіццё ў горадзе атрымала дзейнасць банкаў. Капіталы і абароты банкаў складалі велізарныя для таго часу сумы.

Капітал Мінскага камерцыйнага банка дасягаў у 1903 годзе больш за мільён рублёў. Агульны ж абарот яго у тым жа годзе ў Мінску быў роўны 203 мільёнам рублёў, у аддзяленнях іншых гарадоў Беларусі — 260 мільёнам рублёў, дывідэнд за 1900 год — 8 працэнтам. Банк знаходзіўся ў залежнасці ад «С.-Пецярбургскага ўліковага і пазыковага банка». Дзейнасць Мінскага камерцыйнага банка, які сам выступаў у якасці буйнейшага манапаліста, накіроўвалася на падтрымку прамысловых манаполій. У той жа час яна сведчыць аб зрашчэнні банкаўскага капіталу з прамысловым.

Пры Мінскім камерцыйным банку ў 1906 годзе быў створаны камітэт фабрыкантаў па камісійнаму продажу запалак, куды ўваходзілі члены запалкавага сіндыката. З дапамогай банка саюз запалкавых фабрыкантаў паспяхова вытрымаў канкурэнцыю сваіх працiўнікаў і падпарадкаваў сабе ўсе беларускія запалкавыя фабрыкі. Больш

таго, саюз расшырыў сферу сваёй гандлёвай дзейнасці далёка за межы Беларусі, збываючы тавары на вялікай тэрыторыі — аж да Чорнага мора, Паўночнага Каўказа і ў Закаспійскім краі. Пазней Мінскі камерцыйны банк быў паглынуты Азоўска-Данскім банкам і ў красавіку 1912 года спыніў сваё існаванне.

Напярэдадні першай сусветнай вайны сетка банкаўскіх устаноў павялічылася, а сфера іх дзейнасці расшырылася. Актыўную фінансавую дзейнасць у Мінску разгарнулі Руска-Азіяцкі, Азоўска-Данскі і іншыя банкі. Аддзяленні Азоўска-Данскога банка ў 1911 годзе адкрыліся ў Мінску, Магілёве і Пінску. У 1913 годзе ў Мінску былі адкрыты Паўночна-Заходні камерцыйны банк і аддзяленне Віленскага камерцыйнага банка. У 1914 годзе ў горадзе існавалі чатыры аддзяленні акцыянерных банкаў. Капітал мясцовых акцыянерных банкаў, уключаючы ўклады і бягучыя рахункі, дасягаў 20 мільёнаў рублёў.

Побач з буйнымі банкамі ў Мінску шырокае развіццё атрымалі розныя дробныя фінансавыя ўстановы — банкірскія канторы, таварыствы ўзаемнага крэдыту, пазыкова-ашчадныя касы, страхавыя таварыствы і іншыя, якія больш поўна ахоплівалі і падначальвалі сабе дробных капіталістаў і гаспадарыкаў. Банкірскія канторы, розныя крэдытныя таварыствы знаходзіліся пад кантролем і кіраўніцтвам буйных банкаў. Мінскі падатковы інспектар паведамляў у 1913 годзе, што ўсе мясцовыя гандляры і прамыслоўцы знаходзяцца ў руках банкаўскіх заправіл.

Пранікаючы ў эканамічнае жыццё горада, фінансавы капітал няўхільна ўцягваў яго ў сістэму агульнарасійскай эканомікі. Буйныя банкаўскія ўстановы падпарадкоўвалі сабе не толькі асобныя прадпрыемствы, але і цэлыя прамысловыя і гандлёвыя аб'яднанні. Адбывалася зрошчванне банкаўскага і прамысловага капіталаў і ўтварэнне фінансавага капіталу, які эксплуатаваў шырокія масы працоўных.

2. Гандаль

Развіццё прамысловасці суправаджалася расшырэннем унутранага рынку і ростам гандлю. У капіталістычным грамадстве, указваў К. Маркс, «гандаль становіцца слугой прамысловай вытворчасці, для якой пастаяннае расшырэнне рынку з'яўляецца ўмовай існавання» [1].

Крызіс 1900—1903 гадоў і наступіўшая затым дэпрэсія адмоўна адбіліся і на гандлі, які ў цэлым перажываў застой. Толькі некаторыя віды гандлёвых аперацый (гандаль хлебам, харчовымі прадук-

[1] К. Маркс. Капитал, т. III, стр. 348.

тамі і інш.) насілі больш ажыўлены характар. У гады прамысловага ўздыму разам з агульным павышэннем дзелавой актыўнасці, ростам вытворчасці і расшырэннем унутранага рынку новы штуршок у сваім развіцці атрымаў і гандаль. Павялічыўся аб'ём гандлёвых аперацый, значна расшырыўся тавараабарот, умацаваліся сувязі Мінска з іншымі гарадамі Беларусі і буйнымі прамысловымі цэнтрамі Расіі. Павысілася канцэнтрацыя і цэнтралізацыя гандлёвага капіталу. Узрастаў аптовы гандаль, хоць апошні ўсё больш прыбіралі да рук агульнарасійскія гандлёвыя аб'яднанні.

Як і раней, Мінск падтрымліваў актыўныя гандлёвыя сувязі з буйнейшымі гарадамі Расіі і замежных краін. Галоўнымі гандлёвымі шляхамі сталі Аляксандраўская і Лібава-Роменская чыгункі, а таксама водныя шляхі. Спірт, лясныя матэрыялы, гарбарныя вырабы і іншыя тавары вывозіліся з Мінска ў Маскву, Пецярбург, Кіеў, Харкаў і за мяжу — Мемель, Данцыг, Кенігсберг. Праз Мінск ішоў таксама гандаль хлебам, жывёлай, мясам, ільном, дзёгцем, пянькой, скурамі, птушкай.

XX стагоддзе прынесла ў сферу гандлю шэраг новых з'яў. Пачаўся працэс узбуйнення гандлёвых устаноў. Ён прывёў да скарачэння іх агульнай колькасці з 2139 у 1908 годзе да 1500 у 1912 годзе.

У галіне збыту прадукцыі пачалі дзейнічаць розныя пасрэдніцкія канторы, абароты якіх складалі сотні тысяч рублёў. На гандаль усё большы ўплыў аказвалі банкі, банкірскія канторы і іншыя крэдытныя ўстановы, якія, фінансуючы гандлёвыя ўстановы, трымалі іх у сваім падначаленні. Як і ў прамысловасці, у сферы тавараабароту дзейнічалі буйныя манапалістычныя аб'яднанні. У большасці сваёй гэта былі буйныя агульнарасійскія манаполіі, якія захапілі мясцовы рынак. У 1911 годзе ў Мінску, Гродна, Кіеве, Рызе і іншых гарадах адкрыліся аддзяленні і склады расійскага акцыянернага выдавецкага і кнігагандлёвага таварыства «Лектар», праўленне якога знаходзілася ў Вільні. Сума асноўнага капіталу таварыства дасягала 400 тысяч рублёў. У 1912 годзе многія ўстановы Мінска, якія займаліся мануфактурным гандлем, уваходзілі ў агульнарасійскае манапалістычнае гандлёвае аб'яднанне, заснаванае ў 1911 годзе ў Харкаве. Сума асноўнага капіталу складала мільён рублёў. Некалькі пазней, у 1914 годзе, у Мінску разгарнула дзейнасць буйная фірма «Гандлёвы дом Г. Б. Веснік з сынамі», якая мела аптовы магазін з шырокім асартыментам розных рускіх і замежных тканін. Гандлем соллю ў Мінску і губерні займаўся сіндыкат солепрамыслоўцаў, дастаўкай і продажам газы — сіндыкат газавых гандляроў. У 1911 годзе арганізаваўся сіндыкат гандляроў лесам.

Значнае месца ў гарадскім гандлі займаў кірмашовы і рыначны гандаль. Апошні заставаўся традыцыйнай формай збыту прадуктаў

харчавання, прадметаў хатняга ўжытку, кармоў, насення. Кірмашы ж сталі галоўным чынам формай спецыялізаванага гандлю. У Мінску адбываліся конны і лясны кірмашы. Асабліва вялікія былі абароты апошняга, дасягаючы мільёна рублёў. Узнікненне яго ў 1910 годзе тлумачыцца тым, што Мінск з'яўляўся буйнейшым цэнтрам лесагандлю Паўночна-Заходняга краю. У 1913 годзе з Мінскай губерні было вывезена 129,9 мільёна пудоў дзелавога лесу і 288 мільёнаў пудоў дроў, што складала 49,1 працэнта ўсяго вывазу лесаматэрыялаў з Беларусі. У той жа час з чыгуначных станцый, размешчаных у межах Мінскай губерні, адпраўлена 2 758 768 пудоў хлебных грузаў і 21 516 612 пудоў іншых грузаў. Акрамя таго, па водных шляхах перавезена розных тавараў на суму 36 416 322 рублі.

3. Гарадское кіраванне. Жыллёва-камунальная гаспадарка

Органы гарадскога кіравання — гэта бюракратычны апарат царызму, дзейнасць якога была накіравана на абарону інтарэсаў пануючых класаў. Гарадская дума і ўправа з'яўляліся па сутнасці падсобнымі звеннямі царскай адміністрацыі, якія ведалі пытаннямі добраўпарадкавання горада, аховы здароўя, народнай асветы, гарадскога гандлю і прамысловасці. У Мінску да 1904 года правам удзелу ў выбарах гласных (членаў) гарадской думы карысталіся асобы, якія мелі маёмасны цэнз у тысячу рублёў. У 1904 годзе цэнз быў павялічаны да 1500 рублёў, у выніку чаго колькасць выбаршчыкаў значна скарацілася. У 1904—1908 гадах правам выбару гласных у Мінскую гарадскую думу карысталіся толькі 326 чалавек, г. зн. 0,3 працэнта ўсяго насельніцтва горада.

У склад гарадской думы і ўправы выбіраліся прадстаўнікі памешчыкаў, чыноўніцтва і буйной буржуазіі. У 1900 годзе ў Мінску старшынёй гарадской думы і гарадскім галавой быў буйны землеўладальнік граф Чапскі. У 1912 годзе гэту пасаду займаў памешчык Хржанстоўскі. З 46 гласных (членаў) думы больш за $^2/_3$ былі памешчыкамі і чыноўнікамі, а астатнія — уладальнікамі фабрык і заводаў, прадстаўнікамі духавенства, паліцэйскага ўпраўлення, урачэбнай інспекцыі і г. д.

Царскія ўлады нярэдка груба ўмешваліся ў парадак выбараў гласных, фальсіфікавалі выбары, адхіляючы непажаданых ім асоб і запаўняючы месцы членаў думы простым прызначэннем зверху. У маі 1905 года гласныя Мінскай гарадской думы Лур'е, Каварскі і іншыя падалі ўладам скаргу, у якой пісалі, што частка гласных не выбіралася ў думу, а прызначалася губернскай уладай. Яны ўказва-

лі, што «гласныя... не могуць лічыцца прадстаўнікамі інтарэсаў усяго гарадскога насельніцтва, а толькі вельмі абмежаванай колькасці багатых домаўладальнікаў, купцоў і прамыслоўцаў, асобы ж так званага трэцяга разраду, якія складаюць велізарную большасць гарадскіх абывацеляў, зусім пазбаўлены права голасу».

У 1911 годзе ў Мінскай губерні ствараюцца земскія ўстановы. Распарадчымі органамі земстваў былі павятовыя і губернскія земскія сходы, якія выбіраліся на трохгадовы тэрмін, выканаўчымі органамі — павятовыя і губернскія земскія ўправы. Губернскае земства ведала гаспадарчымі пытаннямі губерняў і паветаў. Указам Мікалая II ад 14 сакавіка 1911 года Мінская гарадская дума атрымала правы і абавязкі павятовага земскага сходу, а гарадская ўправа — павятовай земскай управы.

Па меры росту гарадской гаспадаркі, развіцця гандлю і прамысловасці ўзрастаў гарадскі бюджэт, асноўныя артыкулы выдаткаў якога адлюстроўвалі антынародную палітыку царызму і памешчыкаў. У 1902 годзе бюджэт Мінска складаў 418,1 тысячы рублёў, а ў 1913 годзе павялічыўся да 1331,6 тысячы рублёў, г. зн. больш чым у тры разы. Асноўную частку даходных крыніц бюджэту складалі ацэначны збор з нерухомай маёмасці і падаткі на гандаль і промыслы. У 1902 годзе яны далі 155,5 тысячы рублёў, г. зн. 37,2 працэнта гарадскіх даходаў. У наступныя гады гэтыя крыніцы давалі да 50 працэнтаў гарадскога бюджэту. Другой важнай крыніцай даходаў былі даходы з гарадскіх маёмасцей і збудаванняў, якія давалі больш за $^1/_3$ бюджэту. Далей ішлі розныя гандлёвыя зборы: пошліны на ўвозімыя ў горад тавары, зборы за права продажу тавараў на гарадскіх рынках, зборы за карыстанне гарадскімі вагамі, мерамі і інш.

Фармальна горад атрымаў дапамогу ад казны. Аднак сумы, што выдзяляліся, прызначаліся толькі для раскватэравання войск. Неаднаразовыя звароты гарадской управы да ўрада з просьбай аб выдачы пазык на санітарна-ўрачэбныя выдаткі, выдаткі па народнай адукацыі, добраўпарадкаванню нязменна адхіляліся. Гарадскі бюджэт з году ў год зводзіўся з вялікім дэфіцытам. Расла запазычанасць розным банкам, у якіх была закладзена значная частка гарадской маёмасці. У 1910 годзе гэта запазычанасць склала 1269,2 тысячы рублёў, што значна перавышала гадавы бюджэт горада. У 1914 годзе запазычанасць дасягнула 1,5 мільёна рублёў, а да 1917 года яна выросла да 4,5 мільёна рублёў, у той час як бюджэтныя паступленні ледзь складалі 1,5 мільёна рублёў. Такім чынам, хоць бюджэт Мінска павялічваўся, даходы не маглі пакрыць выдаткаў, звязаных з вядзеннем гарадской гаспадаркі і іншымі затратамі.

Большая частка бюджэту ішла на ўтрыманне адміністрацыйнага апарату: турмаў, паліцыі, жандармерыі, судовых і іншых устаноў.

Гэта крыніца выдаткаў усё ўзрастала. Напрыклад, у 1900 годзе па гэтай крыніцы выдаткавана 163 тысячы рублёў, а ў 1904 годзе — 233 тысячы рублёў. Рост карнага апарату царызму быў звязаны з абвастрэннем класавай барацьбы і ўзмацненнем рэпрэсій супраць працоўных мас. Калі ў 1903 годзе ўсяго вязняў у Мінску налічвалася 6186 чалавек, то ў 1913 годзе — ужо 23 597 чалавек. Пераважная большасць іх была арыштавана за ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе.

Выдаткі на народную асвету і ахову здароўя былі вельмі недастатковымі. У 1900 годзе на гэтыя мэты было адпушчана 63 тысячы рублёў, у 1904 годзе — 67 тысяч рублёў. У 1908 годзе на ахову здароўя гарадское ўпраўленне выдаткавала толькі 21,2 тысячы рублёў. Сродкі ж на ўтрыманне ўрадавых устаноў, гарадскога кіравання, паліцыі і раскватэраванне войск у 1913 годзе складалі 24 працэнты ўсіх выдаткаў.

Даходы з нерухомай маёмасці члены гарадскога самакіравання выкарыстоўвалі для асабістага ўзбагачэння. Спекуляцыйныя камбінацыі «бацькоў горада» былі звычайнай з'явай. Напрыклад, член гарадской управы Гольдберг, правяраючы правы ўласнікаў на валоданне зямлёй у раёне Юбілейнай плошчы, закупіў частку зямлі за 450 рублёў, ведаючы, што ўправа мае намер яе купіць, а затым прадаў яе ўправе за 7500 рублёў. Выкрываючы спекулятыўнае махлярства членаў гарадской управы, газета «Северо-Западный край» у 1904 годзе пісала, што ўправа рабіла незаконны продаж гарадскіх зямель асобам, якія служылі ў гарадскім упраўленні. Як адзначала газета, нават рэвізійная камісія гарадской думы, далёкая ад спроб выкрыцця, вымушана была прызнаць незаконнымі 111 здзелак па продажу маёмасці, якія нанеслі гораду страты на суму каля 117 тысяч рублёў.

З развіццём капіталізму расла гарадская гаспадарка.

Жыллёвы фонд, які складаў важнейшую частку гарадской гаспадаркі, няспынна ўзрастаў. Калі ў 1904 годзе ў Мінску налічвалася 6616 жылых дамоў, то ў 1910 годзе — 7639. Колькасць дамоў за гэты перыяд павялічылася на 15,5 працэнта. З агульнай колькасці дамоў мураваных у 1904 годзе было 1027, у 1910 годзе — 1262. Кошт нерухомай маёмасці Мінска вырас на працягу 1895—1914 гадоў амаль у пяць разоў. Горад забудоўваўся галоўным чынам драўлянымі аднапавярховымі будынкамі. Толькі ў цэнтры горада, дзе жылі буржуазія, памешчыкі і буйныя чыноўнікі, былі шматпавярховыя цагляныя дамы. Самым буйным будынкам была пяціпавярховая гасцініца «Еўропа», пабудаваная ў 1908 годзе.

У 1904 годзе ў горадзе было чатыры плошчы і 235 вуліц і завулкаў агульнай працягласцю 95 вёрст. Даўжыня тратуараў складала 80 вёрст, бульвараў — 9 вёрст. У 1910 годзе ўпершыню былі заасфаль-

таваны некаторыя вуліцы. На вуліцах горада з'явіліся першыя аўтамабілі, матацыклы, некалькі расшырылася тэлефонная сувязь, якая абслугоўвала ў 1913 годзе больш за 800 абанентаў. Гэта быў значны крок наперад у тэхнічным абліччы горада.

Добраўпарадкаванне не закранула ўскраіны. Яны вызначаліся хаатычнасцю забудовы, скучанасцю пабудоў, якія патаналі ў гразі, антысанітарыяй. Горад па-ранейшаму цярпеў ад пажараў, успышак эпідэмій.

У 1903 годзе Мінск меў (не лічачы ваенных лазарэтаў) усяго пяць невялікіх бальніц на 263 ложкі. У горадзе налічвалася 74 цывільных урачоў і 41 фельчар. У 1913 годзе колькасць бальніц павялічылася да дзевяці, а ложкаў у іх — да 835. Акрамя таго, былі два радзільныя прытулкі, сем лячэбніц, прытулак для ачуньваючых (не лічачы ваенных лазарэтаў). Цывільных урачоў было 86, фельчараў — 42. Колькасць аптэк за 1903—1913 гады выросла з сямі да 13. Нягледзячы на некаторы рост лячэбных устаноў, урачоў па-ранейшаму не хапала, у бальніцах не было самага неабходнага абсталявання, не хапала медыкаментаў і перавязачных сродкаў. Плата за лячэнне была вельмі высокая.

У 1907 годзе ў Мінску зарэгістравана каля 14 тысяч выпадкаў захворванняў. Статыстыка сведчыць аб няўхільным росце смяротнасці. Толькі з 1902 па 1905 год у Мінску яна павялічылася на 29,7 працэнта. Асабліва вялікая была смяротнасць сярод дзяцей працоўных. Каля палавіны ўсіх дзяцей паміралі, не дасягнуўшы пяцігадовага ўзросту.

4. Рэвалюцыйны рух напярэдадні першай рускай рэвалюцыі

У пачатку XX стагоддзя ў Мінску налічвалася больш за 10 тысяч рабочых усіх катэгорый. У горадзе было звыш тысячы беспрацоўных, якія складалі пастаянную рэзервовую армію працы.

Заработная плата не забяспечвала рабочым нават сціплага пражытачнага мінімуму. Паводле даных за 1904 год, дзённы заработак рабочых складаў 50—75 капеек для дарослых мужчын, 30—40 капеек для жанчын і падлеткаў. Але і гэты заробак яны часта не атрымлівалі поўнасцю, таму што капіталісты па-ранейшаму ашуквалі і штрафавалі рабочых.

Рабочыя былі пазбаўлены дапамогі па інваліднасці або хваробе, не мелі пенсіённага забеспячэння ў старасці. У Мінску па закону 1903 года аб аплаце за страту працаздольнасці ўсяго каля 1,5 тысячы рабочых мелі права на дапамогу. Але прадпрыемцы не выконвалі

і гэты куцы закон, абыходзілі яго пры дапамозе прадажных царскіх чыноўнікаў.

Яшчэ горшым было становішча неарганізаванай часткі рабочага класа — рамесных рабочых і надомнікаў. На іх не распаўсюджвалася нават тое мізэрнае заканадаўства, якое было вырвана ў царызму стачачнай барацьбой пралетарыяту. У. І. Ленін называў саматужную прамысловасць і капіталістычную работу на даму сапраўднай сістэмай выціскання поту, сістэмай найбольш напружанай эксплуатацыі [1].

Амаль нічога не змянілася і ў жыллёвых умовах. Працоўныя жылі ў трухлявых, брудных хацінах, размешчаных на ўскраінах горада, у рабочых кварталах — на Пярэспе, Ляхаўцы, Серабранцы, Камароўцы.

Поўнасцю захавалася і сацыяльна-палітычнае бяспраўе рабочых, нацыянальны прыгнёт. Рабочыя былі пазбаўлены свабоды слова, друку, сходаў, не мелі права ствараць свае палітычныя арганізацыі. У такіх умовах непазбежна было далейшае абвастрэнне класавых супярэчнасцей, узмацненне рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту супраць царызму.

Рабочы рух шырыўся і рос, набываючы новыя і больш актыўныя рэвалюцыйныя формы. Прамысловыя цэнтры ў развіцці рэвалюцыйнага руху адыгрывалі вядучую ролю, тут рабочы рух насіў найбольш арганізаваны характар і служыў узорам для пралетарыяту менш развітых раёнаў краіны.

Пралетарыят Мінска ўспрымаў перадавыя формы рэвалюцыйнай барацьбы ў прамысловых цэнтрах Расіі. Побач з эканамічнымі стачкамі ён ужывае такія формы барацьбы, як палітычная стачка і дэманстрацыя.

У 1901 годзе колькасць стачак і колькасць удзельнікаў у іх значна ўзрасла. Многія стачкі насілі палітычны характар. Дзень Першага мая рабочыя Мінска адзначылі забастоўкамі на многіх прадпрыемствах. Напярэдадні была шырока распаўсюджана пракламацыя «Мінскім рабочым!» У ёй гаварылася аб зверскай эксплуатацыі рабочых, аб іх палітычнай бяспраўнасці, указвалася, што адзіны шлях да лепшага жыцця — гэта шлях барацьбы: «Перад дружнай барацьбой рабочых, аб'яднаных разам, ніякая варожая сіла не ўстаіць, і праўда рабочых возьме верх...» У першамайскай стачцы ўдзельнічала каля 400 чалавек. Баставалі рабочыя гарбарнага завода, тытунёвых фабрык і многіх рамесных майстэрняў. Першамайская дэманстрацыя праходзіла на галоўных вуліцах горада — Захар'еўскай і Губернатарскай.

[1] Гл.: У. І. Ленін. Творы, т. 3, стар. 385.

Славутая гераічная «Абухаўская абарона» ў Пецярбургу і царскі суд над рабочымі-«абухаўцамі» аказалі значны рэвалюцыянізуючы ўплыў на рабочых усёй краіны. Ленінская «Искра», гаворачы аб стачках у Заходнім краі ў гэты перыяд, адзначае забастоўку 600 рабочых-сталяроў Мінска. Адным з галоўных патрабаванняў баставаўшых было скарачэнне рабочага дня. Адмова гаспадароў майстэрняў задаволіць патрабаванні рабочых выклікала ўзмацненне стачачнай барацьбы: колькасць баставаўшых да канца чэрвеня дасягнула 1000 чалавек. Рэвалюцыйна настроеная частка рабочых, данесіла паліцыя, «вырашыла пайсці на выклік і патрабаваць свабоды сходаў, друку, слова і да т. п.» Стачка пагражала выліцца ў палітычнае выступленне рабочых. Гаспадары і адміністрацыйна-паліцэйскія органы, напалоханыя выступленнямі рабочых, вымушаны былі пайсці на ўступкі.

Яскравым паказчыкам росту палітычнай свядомасці і рэвалюцыйнай актыўнасці рабочых Мінска з'явіліся маніфестацыі і дэманстрацыі рабочых, якія праходзілі ў 1901 годзе з выпадку перасылкі палітвязняў з мінскай турмы ў Сібір. 15 верасня 1901 года адбыўся нелегальны сход рабочых горада, які пастанавіў правесці на наступны дзень дэманстрацыю спачування палітычным зняволеным. 16 верасня ў 8 гадзін вечара на вуглу Захар'еўскай і Серпухоўскай (цяпер вуліца Валадарскага) сабралася звыш 300 чалавек. Калі паказалася партыя перасыльных, рабочыя сустрэлі іх прывітальнымі воклічамі і крыкамі «ура». Яны суправаджалі партыю перасыльных, якую канваіравалі жандары, непасрэдна да вакзала Лібава-Роменскай чыгункі.

Другая такая дэманстрацыя адбылася 23 верасня 1901 года. Дэманстранты тройчы збіраліся каля турэмнага замка, вітаючы палітычных зняволеных.

Гэтыя дэманстрацыі былі яркім паказчыкам росту незадавальнення і пратэсту мінскіх рабочых супраць палітыкі царызму.

У 1902 годзе ў горадзе на радзе прадпрыемстваў адбыліся стачкі эканамічнага характару. Ва ўмовах крызісу і беспрацоўя нават чыста эканамічныя патрабаванні набывалі асобую вастрыню. Асабліва ўпартай была стачка на тытунёвай фабрыцы ў студзені 1902 года.

Дзень Першага мая ў гэтым жа годзе рабочыя Мінска адзначылі масавай дэманстрацыяй, якая праходзіла пад лозунгам: «Далоў царскае самадзяржаўе!» У горадзе былі распаўсюджаны рэвалюцыйныя лістоўкі з палітычнымі патрабаваннямі.

Узмацненне рэвалюцыйнай барацьбы выклікала неспакой царскіх улад. Распараджэннем міністра ўнутраных спраў у снежні 1901 года Мінск быў аб'яўлены на становішчы «ўзмоцненай аховы». Мінскі губернатар 14 снежня выдае распараджэнне аб забароне схо-

дай. дэманстрацый. Урад працівае масовым уладам «сілай і строгасцю» падаўляць рэвалюцыйныя выступленні, а ўладальнікам фабрык і заводаў — утрымліваць за свой кошт на прадпрыемствах урадніка ў і стражнікаў. Чынам фабрычнай інспекцыі ставіліся ў абавязак некаторыя функцыі паліцэйскага характару. Асабліва шырока мерапрыемствы «па ўстанаўленню цішыні і парадку» праводзіліся ў майскія дні. З шасці гадзін вечара ля ўсіх варот расстаўляліся дворнікі з палкамі; узмацняліся паліцэйскія пасты, па вуліцы раз'язджалі казачыя патрулі.

У горад дадаткова спягваліся войскі. У 1903 годзе мінскі губернатар хадайнічаў аб прысылцы ў Мінск войск. Было выдзелена тры роты для аказання садзеяння грамадзянскім уладам па барацьбе «з крамолай». Акрамя таго, са Скобелеўскага лагера выклікалася яшчэ рота.

Царскі ўрад выкарыстоўвае і больш хітрыя сродкі. Адзін з такіх сродкаў — стварэнне фальшывых рабочых арганізацый пад апякунствам і кантролем жандармерыі і паліцыі, так званых арганізацый «паліцэйскага сацыялізма», або зубатаўскіх арганізацый. У Мінску агенты Зубатава знайшлі сабе дастойнага апякуна ў асобе жандарскага палкоўніка Васільева.

Вялікую паслугу зубатаўшчыне ў Мінску аказала апартуністычная дзейнасць Бунда. Прапаведаванне бундаўцамі буржуазнага нацыяналізму і сепаратызму, імкненне адасобіць яўрэйскі рабочы рух ад агульнарасійскага, а таксама прапаганда эканамізму садзейнічалі пашырэнню зубатаўшчыны сярод адсталых слаёў рамесных рабочых і прыказчыкаў горада. Агенты Зубатава ствараюць у 1901 годзе ў Мінску так званую незалежную яўрэйскую рабочую партыю, у якую ўвайшлі многія бундаўцы. Цэнтральным стрыжнем праграмы гэтай партыі было сцвярджэнне, што «рабочы рух нічога агульнага з рэвалюцыйным не мае і яму процілеглы». У выпадку ўзнікнення стачак «незалежныя» павінны былі іх зрываць, абмяжоўваць толькі эканамічнымі рамкамі.

Мінская іскраўская група ўзначаліла і павяла актыўную барацьбу супраць зубатаўскай арганізацыі. Для выкрыцця «паліцэйскага сацыялізма» рэвалюцыйная сацыял-дэмакратыя выкарыстоўвала любыя магчымасці, як легальныя, так і нелегальныя. Дзейнасць «незалежных» востра крытыкавалася. Асабліва вялікую ролю ў выкрыцці зубатаўшчыны адыгралі выступленні сацыял-дэмакратаў на легальных сходах, якія склікалі самі зубатаўцы. Сацыял-дэмакраты ўказвалі на прамую сувязь «незалежных» з дэпартаментам паліцыі, даказвалі рабочым, што толькі ўзмацненнем рэвалюцыйнай барацьбы яны змогуць палепшыць сваё жыццё. Паліцыя вымушана была спыніць правядзенне падобнага роду сходаў.

«Незалежная яўрэйская рабочая партыя» пацярпела крах. Гэта вымушаны быў прызнаць яе натхніцель і арганізатар Васільеў, які ў снежні 1902 года пісаў, што ў цяперашні час у Мінску абвастрылася стачачная барацьба, але «на стачачнікаў пры цяперашніх умовах уплыву аказаць не магу». Далей ён прызнаецца, што адышоў ад кіраўніцтва і здымае з сябе ўсякую адказнасць за дзейнасць «незалежных», таму што яны не змаглі паралізаваць рэвалюцыйны рух у Мінску. Самі «незалежныя» выпусцілі ў ліпені 1903 года заяву, дзе прызнаваліся, што рабочая маса сустрэла іх як ворагаў, у выніку чаго яны павінны былі спыніць сваю дзейнасць. «Добра была задумана махінацыя Зубатавым, —пісала «Искра» ў студзені 1903 года,— але не заўсёды і ўсюды яе лёгка ўдаецца ажыццяўляць без усякіх перашкод. Мы ведаем, што жандарскаму палкоўніку Васільеву не пашанцавала з падобнымі сходамі...»

Узрастаючы рэвалюцыйны рух змёў са свайго шляху гэтыя паліцэйскія арганізацыі. Ні зверскія расправы, ні заігрыванне царызму не маглі спыніць рэвалюцыйны рух, які нарастаў па ўсёй краіне. «Але ж апрача насілля і заігрывання,— пісаў У. І. Ленін,— трэцяга шляху няма. І кожнае новае праяўленне гэтага несумненнага банкроцтва сучаснага рэжыму будзе ўсё глыбей і глыбей падточваць яго асновы, пазбаўляючы ўрад у вачах індыферэнтных абываталяў усякага аўтарытэту, памнажаючы лік асоб, усведамляючых неабходнасць барацьбы з ім» [1].

Нарастанне рэвалюцыйных падзей, блізкасць рэвалюцыі патрабавалі стварэння баявой марксісцкай партыі, якая была б здольна арганізаваць масы і паспяхова кіраваць іх барацьбой супраць самадзяржаўя і капіталізму. Нягледзячы на тое што I з'езд РСДРП абвясціў стварэнне сацыял-дэмакратычнай партыі, партыі на самай справе не было. Трэба было пераадолець разрозненасць і вузкі мясцовы практыцызм асобных сацыял-дэмакратычных гурткоў і груп, адсутнасць арганізацыйнага і ідэйнага адзінства, разброд і саматужніцтва, разграміць «эканамізм», які з'яўляўся разнавіднасцю апартунізму.

Асноўная цяжкасць у барацьбе за ажыццяўленне гэтай задачы выпала на долю агульнарасійскай палітычнай газеты «Искра», арганізаванай у 1900 годзе У. І. Леніным. «Искра» стала цэнтрам збору і аб'яднання рэвалюцыйных сіл, стварэння ўсерасійскай рабочай марксісцкай партыі. Вакол яе пачалі складвацца марксісцкія гурткі і групы, якія распаўсюджвалі газету, рыхтавалі глебу для стварэння сапраўднай пралетарскай рэвалюцыйнай партыі.

У 1901 годзе ў Мінску ўзнікае іскраўская група, актыўнымі дзеячамі якой былі М. Н. Кузняцоў, Е. Я. Беленькі і інш. Група аказвала

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 6, стар. 65—66.

дапамогу ў перапраўцы ў Расію і распаўсюджванні нелегальнай літ
ратуры, у арганізацыі пераезду праз мяжу партыйных работніка
Марксісцкая агітацыя і прапаганда сярод рабочых Мінска мацнел
і расшыралася з кожным месяцам. Рабочыя Беларусі бачылі ў газец
«Искра» выразніцу сваіх інтарэсаў, аказвалі ёй матэрыяльную пад
трымку. Толькі з 3 ліпеня па 1 верасня 1901 года ў заходніх губерня
працоўнымі было сабрана ў фонд газеты больш за 108 рублёў.

Летам 1903 года адбыўся II з'езд РСДРП, які завяршыў справу
стварэння сапраўднай рэвалюцыйнай партыі. З'езд прыняў Праграму
і Статут партыі. У той жа час на з'ездзе выдзелілася два напрамкі
РСДРП: бальшавіцкі — рэвалюцыйны і апартуністычны — менша
віцкі.

Пасля з'езду ў Беларусі ўзнікаюць, растуць і мацнеюць сацыял-дэ
макратычныя арганізацыі, якія ўзначалілі рэвалюцыйны рух мас.

Восенню 1903 года ў Мінску іскраўцамі была ўтворана сацыял-дэ
макратычная група, якая канчаткова аформілася ў сакавіку 1904 года.
Віднымі кіраўнікамі групы сталі М. Н. Кузняцоў і Е. Я. Беленькі. Арга
нізацыя мінскай групы праходзіла ў складаных і цяжкіх умовах. У го
радзе пераважалі дробныя прадпрыемствы, што прыводзіла да распы
ленасці рабочых. Вялікая колькасць саматужна-рамесных рабочых,
шматнацыянальны склад пралетарыяту ўскладнялі аб'яднанне рэва
люцыйных сіл, садзейнічалі жывучасці дробнабуржуазнай ідэалогіі,
стваралі глебу для дэзарганізатарскай дзейнасці апартуністычных эле
ментаў і перш за ўсё бундаўцаў, якія мелі яшчэ значны ўплыў сярод
адсталай часткі яўрэйскіх рабочых, рамеснікаў і часткі інтэлігенцыі.
Бальшавіцкая газета «Пролетарий» так характарызавала дзейнасць
мінскіх сацыял-дэмакратаў у гэты перыяд: «Цяжкія былі першыя
крокі групы. Нязгоды ўнутры партыі і процідзеянне з боку Бунда
вельмі тармазілі работу».

Нягледзячы на цяжкасці, мінскія бальшавікі здолелі арганізаваць
і згуртаваць асноўную масу рабочых і рамеснікаў. Актыўная растлу
мачальная работа, накіраваная супраць уплыву бундаўцаў і іншых
апартуністаў, мела прыкметны поспех. Да сацыял-дэмакратычнай гру
пы дадаткова далучыліся 40 актыўных рабочых, частка з якіх раней
належала да Бунда.

У канцы 1904 года Мінская група РСДРП мела ў сваім складзе
150 членаў і 200 спачуваючых. Яна праводзіла рэвалюцыйную работу
не толькі ў Мінску, але і ў губерні, накіроўвала сваіх членаў у Бары
саў, Бабруйск для наладжвання агітацыі і прапаганды, забяспечвала
палітычнай літаратурай сельскія сацыял-дэмакратычныя групы. Мін
ская група ўстанавіла сувязі з арганізацыямі РСДРП Масквы, Пецяр
бурга, з зарубежным бальшавіцкім цэнтрам. У пачатку 1904 года ў
Мінску адбылася сустрэча прадстаўнікоў ЦК РСДРП А. Д. Стасавай

і М. М. Эсен з кіраўнікамі мясцовай групы, і ў прыватнасці з М. Н. Кузняцовым. Пазней Стасава ўспамінала: «У Мінску ў нас была добрая арганізацыя і свайго роду невялікі цэнтр... М. Н. Кузняцоў, які вёў работу сярод чыгуначнікаў і мясцовага насельніцтва, а таксама іншыя мясцовыя работнікі не раз прыходзілі да мяне. Акрамя таго, я аднавіла перапіску з Н. К. Крупскай і ўстанавіла пастаянную сувязь Мінска з нашым партыйным цэнтрам».

Мінская група пачала рэгулярна атрымліваць з-за мяжы цыркуляры бальшавіцкага цэнтра, а таксама розную партыйную літаратуру. Яна стала важным цэнтрам сацыял-дэмакратычнай работы ў Беларусі. Царская жандармерыя з трывогай паведамляла, што «пачынаючы з 1903 года партыя гэта (Мінская група РСДРП. — Рэд.) пачала расшырацца і да яе патроху пачалі далучацца рабочыя, студэнты і нават навучэнцы ў сярэдненавучальных установах, і агітацыя яе пранікла не толькі ў павятовыя гарады, але ў мястэчкі і вёскі».

Кіраваў групай камітэт, які называўся Цэнтральнай групай. Склад камітэта перыядычна абнаўляўся. Група мела сваю друкарню, бібліятэку, прапагандысцкую калегію, якая ведала агітацыяй і прапагандай. Пры ёй існавала таксама тэхнічная група, якая займалася друкаваннем лістовак, захоўваннем і распаўсюджваннем літаратуры і г. д. Мінская група складалася з рабочых гурткоў і так званых цэхавых сходак, куды ўваходзілі прадстаўнікі розных дробных прадпрыемстваў і майстэрняў. Гурткі ствараліся на больш буйных прадпрыемствах і аб'ядноўвалі рабочых аднаго прадпрыемства. Сярод рабочых гурткоў найбольш буйным быў гурток у Мінскіх чыгуначных майстэрнях, які налічваў да 30 чалавек. На сходах гурткоў і цэхавых сходках чыталіся даклады на палітычныя і эканамічныя тэмы, абмяркоўваліся бягучыя пытанні.

Некалькі прадстаўнікоў цэхавых сходак і два-тры прадстаўнікі Цэнтральнага Камітэта РСДРП складалі цэнтральную сходку, на чале якой стаяў адказны арганізатар, выдзелены камітэтам.

Кіруючы цэнтр — Цэнтральная група — складалася з васьмі — дзесяці адказных работнікаў (сакратар, літаратар, адказны прапагандыст і агітатар, загадчык арганізацыі навучэнцаў, адказны тэхнік, адказны фінансіст, некалькі арганізатараў і прадстаўнік Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП, куды ўваходзіла група).

Мінская група РСДРП аказвала вялікі ўплыў на грамадскае і палітычнае жыццё горада, арганізоўвала і накіроўвала рэвалюцыйныя выступленні працоўных, хутка адгукалася на патрэбы і запытанні рабочых.

РАЗДЗЕЛ IX

РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА РАБОЧЫХ МІНСКА Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ РУСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

1. Водгукі на падзеі 9 студзеня. Далейшае разгортванне рэвалюцыйнай барацьбы

Падзеі ў Пецярбургу 9 студзеня 1905 года з'явіліся пачаткам першай рускай рэвалюцыі. Крывавая нядзеля развеяла ў рабочых веру ў цара. У гэты дзень, пісаў У. І. Ленін, рабочы клас «атрымаў вялікі ўрок грамадзянскай вайны; рэвалюцыйнае выхаванне пралетарыяту за адзін дзень пайшло ўперад так, як яно не магло б пайсці за месяцы і гады шэрага, будзённага, забітага жыцця. Лозунг геройскага пецярбургскага пралетарыяту: «смерць або свабода!» рэхам перакатваецца цяпер па ўсёй Расіі»[1].

У Мінску аб расстрэле рабочых у Пецярбургу стала вядома 11 студзеня. У гэты ж дзень бальшавікі Мінскай групы РСДРП разгарнулі работу па арганізацыі актыўнага рэвалюцыйнага пратэсту рабочых. У горадзе распаўсюджвалася лістоўка, выдадзеная Паўночна-Заходнім камітэтам РСДРП, «Да ўсіх грамадзян». У ёй гаварылася, што рабочыя Пецярбурга праліваюць сваю кроў за вялікую і святую справу вызвалення ўсёй Расіі, што на нечуванае злачынства царызму рабочым неабходна адказаць стачкай і актыўнай рэвалюцыйнай барацьбой.

11 студзеня на многіх прадпрыемствах горада пачаліся забастоўкі. А ўжо праз два дні баставала большасць фабрык і заводаў. Агульная колькасць стачачнікаў перавышала дзве тысячы чалавек. Вечарам на цэнтральных вуліцах — Губернатарскай і Захар'еўскай — адбываліся дэманстрацыі. Аб развіцці рэвалюцыйных падзей у Мінску бальшавіцкая газета «Вперед» пісала наступнае:

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 8, стар. 76.

«14 студзеня натоўп бастуючых быў яшчэ большы, чым напярэдадні. У настроі натоўпу адчувалася нейкая прыўзнятасць, адчуваўся моцны ўздым духу. Пад лозунгамі «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве рэвалюцыя!» праходзілі дэманстрацыі і 15 студзеня. Да стачкі далучыліся рабочыя электрастанцыі, друкарні, коннай чыгункі. Стачка працягвалася сем дзён. Улады хацелі сілай зброі спыніць палітычнае выступленне рабочых. На радзе прадпрыемстваў была ўстаноўлена воінская ахова, паліцыя не спынялася перад ужываннем зброі. Напрыклад, на абойнай фабрыцы паліцыя адкрыла стральбу па рабочых».

Развіццю стачачнай барацьбы перашкаджала пазіцыя мінскай арганізацыі Бунда, якая спрабавала не дапусціць сумесных выступленняў рускіх, беларускіх і яўрэйскіх рабочых. Бальшавікі ж клікалі рабочых да класавага яднання, да сумеснай барацьбы. «У яднанні наша сіла, мы павінны выступіць усе без адрознення нацыянальнасці і полу... Далоў нацыянальную варожасць» — заклікала адна з лістовак. Пад напорам рабочых Бунд вымушаны быў даць згоду на сумеснае правядзенне з групай РСДРП стачачнай барацьбы ў горадзе.

Пасля студзеньскіх падзей у Мінску ў лютым — сакавіку адбываецца рад новых выступленняў рабочых. 1 лютага забаставалі рабочыя майстэрняў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Яны прад'явілі патрабаванні аб павышэнні заработнай платы, змяншэнні рабочага дня, паляпшэнні медыцынскага абслугоўвання, адкрыцці школы і нядзельных тэхнічных курсаў і інш. 3 лютага пачалася забастоўка на абойных фабрыках. 28 студзеня рабочыя Кашарскага механічнага завода Якабсона, Ліўшыца і К° запатрабавалі павелічэння зарплаты. Адміністрацыя адмовілася зрабіць гэта. Тады рабочыя забаставалі. 8 лютага да іх далучыліся рабочыя другога механічнага завода. У той жа дзень пачалася забастоўка ў майстэрнях і дэпо Лібава-Роменскай чыгункі. 11 лютага пасля задавальнення рада патрабаванняў бастуючых работы ў дэпо аднавіліся.

Аднадушныя дзеянні рабочых піваварнага завода братоў Лекерт таксама прымусілі прадпрыемца 18 лютага пайсці на ўступкі: быў скарочаны рабочы дзень і павышана зарплата.

У канцы лютага баставалі рабочыя ганчарна-кафляных заводаў, шавецкіх майстэрняў, у сакавіку — рамеснікі: бляхары, страхары, краўцы, прыказчыкі.

У выніку стачак рабочыя дабіліся некаторага паляпшэння свайго становішча. Першыя сур'ёзныя перамогі пераконвалі іх у эфектыўнасці стачачнай барацьбы. Колькасць бастуючых расла, у барацьбу ўцягваліся ўсё новыя катэгорыі рабочых. Стачкі мелі велізарнае значэнне і ў справе палітычнага выхавання працоўных. Яны згуртоўвалі рабочых, умацоўвалі пачуццё пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Для забастовачнага руху гэтага перыяду характэрнымі былі не толькі яго шырокі размах і масавасць, але і арганізаванасць рабочых, якая значна ўзрасла, што з'яўлялася вынікам дзейнасці арганізацыі РСДРП. У ходзе стачачнай барацьбы вельмі вырас аўтарытэт рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі. Яе ўплыў станавіўся важнейшым фактарам у нарастаючай барацьбе рабочага класа. Невыпадкова таму нават прадстаўнікі царскай адміністрацыі вымушаны былі прызнаць, што «магчымасць аб'яднання і яго плён у цяперашні час для рабочых — відавочны і не падлягае сумненню. Дасягнутыя поспехі стварылі кіраўнікам руху вялікі маральны аўтарытэт сярод рабочых, які ўжо нічым не можа быць падарваны».

Рэвалюцыйная барацьба пралетарыяту выклікала рост і ажыўленне апазіцыйных настрояў сярод інтэлігенцыі і навучэнцаў. Пад уплывам барацьбы рабочых забастовачны рух ахоплівае навучэнцаў. 16 лютага ў Мінску былі спынены заняткі ва ўсіх навучальных установах. У гэты ж дзень навучэнцы сумесна з рабочымі правялі дэманстрацыю і сходку-мітынг. У рэзалюцыі сходу адзначалася, што «толькі са знішчэннем самадзяржаўнага рэжыму магчыма задавальненне патрэб навучэнцаў. (Сходка) выказвае сваё недавер'е гэтаму рэжыму і патрабуе знішчэння самадзяржаўя».

Перадавая частка інтэлігенцыі вітала рэвалюцыю і адкрыта выказвала пратэст супраць існуючага ладу. На публічным пасяджэнні «Мінскага таварыства ўрачоў» 24 сакавіка былі вылучаны патрабаванні шырокіх палітычных і сацыяльных змен на дэмакратычных асновах. У заяве аб тым, што «медыцына не ў стане змагацца з хваробамі і смерцю, калі ўся дзяржаўная палітыка сістэматычна трымае народ у беднасці, невуцтве і пад прыгнётам», гучаў народжаны рэвалюцыйным рухам пралетарыяту заклік да звяржэння самадзяржаўя.

Інтэлігенцыя Мінска выказала сваю павагу і салідарнасць кампазітару Рымскаму-Корсакаву, якога звольнілі са складу прафесараў кансерваторыі за яго патрабаванні спыніць рэпрэсіі ў адносінах да навучэнцаў і даць кансерваторыі аўтаномію. У яе прывітальным пісьме гаварылася, што мінская інтэлігенцыя просіць прыняць «выказванне пачуцця глыбокага захаплення, якое ахапіла не толькі перадавыя колы музыкантаў, але і ўсю лепшую частку рускага грамадства з прычыны той незалежнай думкі, грамадзянскай мужнасці і высакароднасці сапраўднага артыста, якія вы праявілі ў час апошняга выступлення моладзі кансерваторыі».

Дэмакратычны настрой ахапіў і членаў «Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў». Вечары, якія наладжваліся таварыствам, звычайна выліваліся ў свайго роду мітынгі палітычнага пратэсту супраць існуючага ладу. Напрыклад, 18 лютага, як толькі закончылася лекцыя, на якую сабралася каля тысячы чалавек, на

трыбуну пачалі падымацца рэвалюцыйна настроеныя інтэлігенты і прадстаўнікі Мінскай групы РСДРП. Кожнае выступленне публіка сустракала воклічамі: «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве рэспубліка!» Як даносілі царскія чыноўнікі, драматычныя пастаноўкі і нават маскарады таварыства ператвараліся «ў адкрытую выстаўку карыкатур на ўрад, якія былі ўзяты з сучасных гумарыстычных супрацьурадавых часопісаў».

Уцягваючы ў рэчышча рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху шырокія слаі насельніцтва, бальшавікі Беларусі выкрывалі і ў той жа час выкарыстоўвалі ў інтарэсах разгортвання барацьбы апазіцыю радыкальна настроенай часткі ліберальнай буржуазіі. Мясцовыя лібералы яшчэ ў лістападзе 1904 года склалі апазіцыйную рэзалюцыю па ўзору рэзалюцыі лібералаў Масквы. Гэта рэзалюцыя і была зачытана 12 студзеня 1905 года на публічным пасяджэнні гарадской думы. У зале пачуліся крыкі, што яна не адпавядае сучаснаму моманту, што трэба зачытаць сацыял-дэмакратычную рэзалюцыю. Затым выступіў прадстаўнік Мінскай групы РСДРП. Калі была зачытана сацыял-дэмакратычная рэзалюцыя, зала адказала бурнымі апладысментамі і крыкамі: «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве сацыялізм!»

Аднак у цэлым ліберальная буржуазія і ліберальныя памешчыкі шукалі шляхоў пагаднення з царызмам, каб дабіцца некаторых рэформ і прадухіліць далейшае развіццё рэвалюцыі. У гэтых адносінах вельмі характэрна выступленне «Мінскага сельскагаспадарчага таварыства». У сваім адрасе на імя цара прадстаўнікі таварыства пісалі, што існуючы лад пазбавіў насельніцтва «неабходнай упэўненасці ў ахове правоў усіх і кожнага... стварыў глебу для надыходзячай буры аграрных і грамадскіх беспарадкаў». Таму, каб прадухіліць «навальніцу», царызм павінен пайсці на ўступкі, згадзіцца на некаторыя дэмакратычныя пераўтварэнні.

Бальшавікі выкрывалі класавую сутнасць выступленняў лібералаў. У адной з лістовак Палескага камітэта РСДРП гаварылася, што лібералы мала думаюць аб працоўным народзе, не адстайваюць яго правоў, таму нельга ім верыць. Адзіны шлях да волі — гэта звяржэнне царскага самадзяржаўя намаганнямі рабочых у саюзе з сялянствам.

Ва ўмовах нарастання рэвалюцыі партыя пралетарыяту павінна была выпрацаваць тактыку, якая адпавядала б новай абстаноўцы. Апартунізм меншавікоў і іх раскольніцкія дзеянні прывялі фактычна да расколу РСДРП на дзве фракцыі, на дзве партыі. Дабіцца арганізацыйнага і тактычнага адзінства можна было шляхам склікання чарговага III з'езду РСДРП. Бальшавікі ўзялі на сябе ініцыятыву па скліканню з'езду. Падрыхтоўкай і правядзеннем з'езду кіраваў

У. І. Ленін. У працэсе падрыхтоўкі бальшавіцкая газета «Вперед», якая пачала выходзіць у снежні 1904 года за мяжой, дабілася згуртавання партыйных арганізацый Расіі. Пераважная іх частка займала цвёрдую бальшавіцкую пазіцыю.

Мінская арганізацыя РСДРП, якая ў асноўным складалася з рабочых, што ўжо прайшлі школу рэвалюцыйных баёў, горача вітала выхад газеты «Вперед», лічачы яе добрым прадаўжальнікам ленінскай «Искры». «Падзяляючы арганізацыйныя прынцыпы партыйнай большасці,— указвалася ў рэзалюцыі Мінскай групы РСДРП ад 26 студзеня 1905 года,— мы вітаем паяўленне «Вперед», на старонках якога «большасць» (бальшавікі.— Рэд.) атрымае, нарэшце, магчымасць абараняць і развіваць гэтыя прынцыпы».

Мінская група РСДРП рашуча настойвала на неадкладным скліканні III з'езду. Яна крытыкавала пазіцыю Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП па пытанню склікання III з'езду. Паўночна-Заходні камітэт, у які ўваходзіла група, выказаўся за скліканне з'езду, але пры выбары дэлегатаў заняў прымірэнчую пазіцыю. Мінская група РСДРП прыняла самастойнае рашэнне, якое адлюстроўвала яе рашучую бальшавіцкую пазіцыю: «Стоячы на пункце гледжання партыйнай большасці і недавер'я Паўночна-Заходняму камітэту, як прымірэнчаму ў выбары дэлегата, Мінская група ў пасяджэнні сваім ад 22 сакавіка пастанавіла: «Паслаць свайго дэлегата на з'езд, калі гэта будзе магчыма».

М. М. Літвінаў (быў пад прозвішчам Кузняцова) у сваім выступленні на з'ездзе адзначаў, што Мінская група стаіць на бальшавіцкіх пазіцыях: «Калі я быў у Мінску,— заявіў ён,— асобныя члены Мінскай групы, баючыся, што Паўночна-Заходні камітэт не пашле свайго дэлегата на III з'езд партыі, гаварылі мне аб жаданні Мінскай групы, якая стаіць на пункце гледжання большасці, быць прадстаўленай на з'ездзе хоць бы дарадчым голасам». Мандатная камісія з'езду дазволіла Мінскай групе прыслаць свайго дэлегата на з'езд з правам дарадчага голасу.

III з'езд РСДРП выпрацаваў тактыку рабочага класа і яго партыі ў рэвалюцыі. З'езд лічыў, што, нягледзячы на буржуазна-дэмакратычны характар гэтай рэвалюцыі, у яе поўнай перамозе зацікаўлены перш за ўсё пралетарыят, бо перамога дасць яму магчымасць арганізавацца, вырасці палітычна, набыць вопыт і звычкі палітычнага кіраўніцтва працоўнымі масамі і перайсці ад рэвалюцыі буржуазнай да рэвалюцыі сацыялістычнай.

З'езд арыентаваў партыю на разгортванне рэвалюцыі, на звяржэнне царызму шляхам узброенага паўстання, на саюз пралетарыяту з сялянствам пры гегемоніі рабочага класа, на ізаляцыю ліберальнай буржуазіі, на стварэнне часовага рэвалюцыйнага ўрада як

дыктатуры пралетарыяту і сялянства, на давядзенне рэвалюцыі да пераможнага канца.

Зусім супрацьлеглую, варожую пралетарыяту тактыку прапанавалі меншавікі, якія склікалі ў Жэневе сваю канферэнцыю. Яны лічылі, што на чале буржуазнай рэвалюцыі можа быць толькі ліберальная буржуазія, таму пралетарыят абавязаны ісці ў саюзе не з сялянствам, а з ліберальнай буржуазіяй, у хвасце буржуазіі. Меншавікі імкнуліся раззброіць рабочы клас, вялі да згортвання і паражэння рэвалюцыі.

У кнізе «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», якая выйшла ў свет у ліпені 1905 года, У. І. Ленін, выкрыўшы тактыку меншавікоў, а разам з тым і тактыку міжнароднага апартунізму, развіў вучэнне аб тактыцы марксісцкай партыі ў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, абгрунтаваў асновы марксісцкай стратэгіі і тактыкі ў перыяд пераходу ад рэвалюцыі буржуазнай да рэвалюцыі сацыялістычнай.

Рашэнні III з'езду, тэарэтычнае абгрунтаванне і далейшае развіццё бальшавіцкай тактыкі, дадзеныя У. І. Леніным у кнізе «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», мелі важнае гістарычнае значэнне для развіцця рэвалюцыйнай барацьбы як ва ўсёй Расіі, так і ў Беларусі.

Дзейнасць Мінскай групы РСДРП, узброенай рашэннямі III з'езду партыі, ажывілася. Павысілася яе кіруючая роля ў рэвалюцыйнай барацьбе рабочых.

Майскія дні 1905 года ў Расіі характарызаваліся новым уздымам рэвалюцыйнага руху. Не спыняліся стачкі і дэманстрацыі. У іх удзельнічалі звыш 220 тысяч рабочых.

Масавасцю і арганізаванасцю вызначаліся выступленні пралетарыяту і ў Беларусі. Напярэдадні Першага мая Палескі і Паўночна-Заходні камітэты РСДРП распаўсюдзілі лістоўку бальшавіцкіх цэнтральных органаў «Першае мая», напісаную У. І. Леніным. Яна заклікала рабочы клас Расіі рыхтавацца да ўзброенага паўстання: «Рыхтуйцеся ж да вялікага бою, таварышы рабочыя, спыняйце фабрыкі і заводы 1-га мая, або бярыцеся за зброю адпаведна з парадай камітэтаў сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Гадзіна паўстання яшчэ не прабіла, але яна ўжо недалёка... мы пойдзем праз паўстанне да свабоды, праз свабоду да сацыялізма»[1].

Царскія ўлады ў страху перад надыходзячым моцным рэвалюцыйным рухам сцягнулі ў горад войскі. Каб сарваць першамайскія выступленні рабочых, мінскі губернатар у сваіх аб'явах, якія паліцыя расклеіла па горадзе, пагражаў жорсткай расправай за самыя ня-

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 8, стар. 318—319.

значныя спробы арганізацыі забастовак і дэманстрацый. Аднак ні пагрозы, ні штыкі не маглі запалохаць рабочых.

Бальшавікі Мінска здолелі арганізаваць рабочых горада на правядзенне першамайскіх дэманстрацый. На Губернатарскай, Прэабражэнскай, Серпухоўскай вуліцах і ў скверы ля гарадскога тэатра сабраліся масы рабочых. Толькі на Серпухоўскай вуліцы ў раёне турмы колькасць дэманстрантаў перавышала тысячу чалавек. Яны неслі сцягі, лозунгі: «Далоў самадзяржаўе!», «8-гадзінны рабочы дзень!», «Няхай жыве Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя!»

Першамайскія дэманстрацыі насілі баявы наступальны характар. Нападзенні казакаў, драгунаў і паліцэйскіх сустракалі адпор з боку дэманстрантаў. У казакаў і паліцэйскіх ляцелі каменні, а каля будынка паліцэйскага ўпраўлення былі кінуты самаробныя бомбы.

Першамайскія выступленні рабочых далі штуршок далейшаму разгортванню стачачнага руху ў горадзе. Да сярэдзіны мая забастоўкі ахапілі амаль усе прадпрыемствы Мінска.

Масавасць і арганізаванасць выступленняў пралетарыяту Мінска з'явіліся вынікам вялікай растлумачальнай работы і практычнага кіраўніцтва ім з боку рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі. Бальшавіцкая газета «Пролетарий» пісала, што ўплыў Мінскай групы РСДРП на рабочых і рамеснікаў значна ўзрос. На сходах стачачнікаў рабочыя з вялікай увагай і цікавасцю адносіліся да выступленняў яе агітатараў. Газета ўказвала, што група на працягу мая паспяхова правяла шэраг стачак.

Сацыял-дэмакраты наладжвалі масавыя сходкі рабочых, на якіх абмяркоўваліся іх патрабаванні і метады барацьбы. Адна з такіх сходак адбылася 9 мая ў прыгарадным лесе; у ёй прынялі ўдзел звыш 400 рабочых завода «Тэхнолаг», майстэрняў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі і некаторых іншых прадпрыемстваў.

Сур'ёзнасць і вастрыню рэвалюцыйнай барацьбы ў Мінску не маглі не прызнаць і царскія ўлады. У сакрэтным данясенні губернатар паведамляў, што «горад Мінск робіцца арэнай усякіх праяўленняў рэвалюцыйнага руху — раскідванне пракламацый, сходкі, забастоўкі, хаджэнне натоўпу з песнямі і сцягамі і, нарэшце, узброеныя супрацьурадавыя дэманстрацыі».

Рэвалюцыйная барацьба рабочых Беларусі разгортвалася пад уплывам агульнарасійскіх падзей: стачак у Іванава-Вазнясенску, Адэсе, Рызе, Лодзі, паўстання на браняносцы «Пацёмкін» і інш.

Як адзначаў «Пролетарий», «ідэя класавай салідарнасці рабочых і неабходнасці палітычнай барацьбы атрымала тут (у Мінску.— Рэд.), як і ва ўсёй Расіі, шырокае распаўсюджанне». Яркім адлюстраваннем класавай салідарнасці рабочых Мінска з'явіліся шматлікія сход-

кі, мітынгі, дэманстрацыі ў падтрымку рабочых Варшавы і Адэсы, нарэшце, агульнагарадская палітычная забастоўка пратэсту 28 чэрвеня супраць крывавых злачынстваў царызму ў Лодзі. «Сход мінскіх рабочых, скліканы мясцовай групай РСДРП,— гаварылася ў адной з рэзалюцый,— з вялікай пашанай схіляецца перад святой памяццю лодзінскіх таварышаў, якія загінулі за волю, і выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што набліжаецца час, калі мінскія рабочыя далучаць свае намаганні да намаганняў арганізаванага пралетарыяту, пад напорам якога звергнецца і навек згіне праклятае самадзяржаўе».

У чэрвені — ліпені 1905 года стачкі, мітынгі, палітычныя дэманстрацыі ў Мінску нярэдка пераходзілі ва ўзброеныя сутыкненні з царскімі войскамі. Рабочыя ўсё часцей і часцей вылучалі і адстайвалі палітычныя патрабаванні. Гэтыя новыя рысы ў забастовачным руху — прычына дзейнасці і ўзмацнення кіруючай ролі групы РСДРП, якая дзейсна рыхтавала рабочых Мінска да правядзення палітычнай забастоўкі. Агульнагарадская палітычная забастоўка пачалася 28 чэрвеня. Работа на фабрыках і заводах была спынена. Спыніўся рух гарадскога транспарту. Баставалі рабочыя і служачыя электрычнай і водаправоднай станцый. Да забастоўкі далучыліся служачыя банкаў і іншых крэдытных устаноў.

28 і 29 чэрвеня ў горадзе праходзілі дэманстрацыі, у якіх удзельнічала каля шасці тысяч чалавек. Войскі адкрылі па дэманстрантах агонь. Паліцэйскія і казацкія раз'езды жорстка збівалі дэманстрантаў і прахожых. Трое рабочых былі забіты, многія паранены. Паліцыя арыштавала каля 200 чалавек.

Прысланы царом у Мінск новы губернатар, адзін з найбольш жорсткіх душыцеляў рэвалюцыі, Курлоў заявіў прадстаўнікам ведамстваў Мінскай губерні: «Смута расце з кожным днём, такі час не дапускае з боку ўлад якіх бы там ні было ваганняў». У Мінск былі выкліканы новыя воінскія часці, пачаліся масавыя арышты. Паліцыя і ахранка звярнуліся да ўлюбёнай тактыкі распальвання нацыянальнай варожасці, спрабуючы справакаваць пагромы. Была закрыта газета «Северо-Западный край», якая змясціла рад артыкулаў рэвалюцыйнага характару.

Аднак ніякія рэпрэсіі не маглі затушыць полымя рэвалюцыі. Гэта вымушаны быў прызнаць у жніўні 1905 года Курлоў. «Беспарадкі і хваляванне сярод насельніцтва даверанай мне губерні,— пісаў ён міністру ўнутраных спраў,— не спыняюцца да гэтага часу, нягледзячы на меры, што прымаюцца з боку адміністрацыі...»

Царскі ўрад, імкнучыся адхіліць народныя масы ад рэвалюцыйнай барацьбы, ужываў палітыку лавіравання. 6 жніўня 1905 года ён апублікаваў закон аб скліканні Дзяржаўнай думы, якая, згодна

з праектам міністра ўнутраных спраў Булыгіна, павінна была мець толькі дарадчыя правы. Ліберальная буржуазія Мінска і ліберальныя памешчыкі губерні пісалі вернападданніцкія петыцыі цару, адабраючы гэта рашэнне.

Бальшавікі настойліва выкрывалі контррэвалюцыйныя задумы царскага ўрада. Каб сарваць гэты манеўр царызму, разлічаны на ашуканства народных мас, бальшавікі аб'явілі актыўны байкот Булыгінскай думы. «Пралетарыят змагаецца, буржуазія крадзецца да ўлады» [1],— пісаў У. І. Ленін у гэтыя дні аб тактыцы пралетарыяту і буржуазіі. Пытанне аб адносінах да Дзяржаўнай думы стаяла на з'ездзе груп Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП і абласной канферэнцыі. Па гэтаму пытанню былі прыняты бальшавіцкія рашэнні.

У горадзе распаўсюджваліся пракламацыі Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП, якія заклікалі рабочых байкатаваць Дзяржаўную думу. «Мы будзем усюды наладжваць мітынгі,— гаварылася ў адной з пракламацый,— з вынясеннем пратэсту супраць урадавага ашукання, мы будзем выходзіць на вуліцу, нарэшце, мы са зброяй у руках не дадзім адбыцца выбарам у самадзяржаўную Дзяржаўную думу, будзем дабівацца сваіх правоў. На гнюсную спробу царскага ўрада адкажам: «Далоў Дзяржаўную думу! Няхай жыве Устаноўчы сход на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога і тайнага выбарчага права! Далоў самадзяржаўе! Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка! Няхай жыве сацыялізм!»

У жніўні і верасні Мінская група РСДРП правяла сходкі рабочых. Рабочыя актыўна падтрымлівалі лозунг байкоту Булыгінскай думы. Так, 19 верасня на адной з такіх сходак, на якой прысутнічала 800 рабочых, былі аднадушна прыняты бальшавіцкія рэзалюцыі аб байкоце думы, аб неабходнасці практычнай падрыхтоўкі ўзброенага паўстання.

Бальшавікі Мінска, згодна з рашэннямі III з'езду РСДРП, рыхтавалі масы да ўзброенага паўстання. З рабочых ствараліся баявыя атрады, набывалася зброя, рыхтаваліся кадры кіраўнікоў.

2. Рэвалюцыйныя падзеі ў час кастрычніцкай Усерасійскай стачкі і снежаньскага ўзброенага паўстання

У кастрычніку 1905 года пачалася Усерасійская палітычная стачка. Востра і бурна працякалі кастрычніцкія падзеі ў Мінску. Па ініцыятыве Мінскай групы РСДРП у горадзе праводзяцца сходкі рабо-

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 9, стар. 146.

чых, мітынгі і маніфестацыі. 6 кастрычніка была зроблена спроба арганізаваць дэманстрацыю па Захар'еўскай, Прэабражэнскай і Нова-Маскоўскай вуліцах. Нарады казакаў і паліцыі разганялі дэманстрантаў. У горадзе баставалі рабочыя некаторых друкарняў, гарадскога транспарту, рамеснікі. 11 кастрычніка спыніўся рух на Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, на другі дзень на Лібава-Роменскай чыгункі.

Напалоханы размахам забастоўкі, губернатар Курлоў тэлеграфаваў у дэпартамент паліцыі: «Брэсцкая (чыгунка.— Рэд.) забаставала. Усе друкарні ў Мінску спынілі работу... З навучальных устаноў класічная (гімназія.— Рэд.) і камерцыйнае (вучылішча.— Рэд.) аб'явілі знішчэнне самадзяржаўя». У тэлеграме міністру шляхоў зносін і начальніку Лібава-Роменскай чыгункі паведамлялася: «Сёння 12 кастрычніка спынены заняткі ва ўсіх службах і аддзелах управлення і на тэлеграфе. На станцыі Мінск спынены работы. У дэпо і майстэрнях выпушчана пара з паравозаў...»

13 кастрычніка забастоўка ў Мінску стала ўсеагульнай. Спынілі работу фабрыкі і заводы, друкарні, рабочыя электрычнай і водаправоднай станцый. Да забастоўкі далучыліся рамеснікі, прыказчыкі гандлёвых устаноў, рамізнікі, служачыя розных кантор і банкаў, навучэнцы ўсіх навучальных устаноў горада.

На чале стачачнай барацьбы ў Мінску ішлі рабочыя-чыгуначнікі. Большасць з іх былі членамі Усерасійскага чыгуначнага саюза, які прымаў актыўны ўдзел у кастрычніцкай стачцы. На актыўнасць выступленняў мінскіх чыгуначнікаў у значнай меры зрабіла ўплыў дзейнасць бальшавікоў і агульная кіруючая і накіроўваючая работа Мінскай групы РСДРП. Пачынаючы з 12 кастрычніка штодзённа на фабрыках, у памяшканні вакзала і на прывакзальнай плошчы адбываліся мітынгі і сходы рабочых горада.

У першыя дні забастоўкі быў створаны забастовачны камітэт чыгуначнікаў. 16 кастрычніка ў яго афіцыяльна ўвайшоў прадстаўнік ад Мінскай групы РСДРП. Камітэт фактычна стаў кіруючым цэнтрам.

Рух прыняў востры палітычны характар. Рабочыя выступалі з патрабаваннем змянення існуючага ладу. 14 кастрычніка на шматлюдным мітынгу, у якім бальшавікі Мінскай групы прымалі самы актыўны ўдзел, была выпрацавана рэзалюцыя з патрабаваннямі неадкладнага ўвядзення 8-гадзіннага рабочага дня, свабоды друку, сходак, саюзаў, недатыкальнасці асобы і жылля, усеагульнага выбарчага права, бясплатнага навучання і медыцынскага абслугоўвання і да т. п. Рабочыя выказалі пратэст супраць арыштаў і патрабавалі вызвалення палітычных зняволеных, зняцця воінскай аховы на вакзале і ў іншых пунктах горада. Да гэтай рэзалюцыі далучыліся і на-

вучэнцы Мінска, якія ў сваім пісьме пісалі, што «выказваюць сваю салідарнасць у барацьбе рабочых за палітычную свабоду і ўказваюць, што яны заўсёды будуць ісці з імі поплеч, каб узаемнымі намаганнямі дасягнуць жаданай мэты».

У горадзе распаўсюджваліся лістоўкі і пракламацыі з заклікам да ўзброенай барацьбы з царызмам.

Царскія ўлады прымалі ўсе меры да таго, каб падавіць стачку ў Мінску. 12 кастрычніка таварыш міністра ўнутраных спраў Трэпаў тэлеграфаваў губернатару Курлову: «Прашу прыняць рашучыя меры падаўлення, не спыняючыся (перад) ужываннем узброенай сілы». У гэты ж дзень губернатар на асобай нарадзе ваенных улад горада і гарнізона прама заявіў аб неабходнасці ўжывання ўзброенай сілы для падаўлення рэвалюцыі. Камандзірам воінскіх часцей быў адданы загад «халастых патронаў не браць і ў паветра не страляць». Царскія ўлады ў Мінску рыхтавалі крывавую расправу над народам.

17 кастрычніка агульнарасійская стачка дасягнула свайго апагея. Прамысловае, гандлёвае і дзяржаўнае жыццё Расіі было паралізавана. Наспявала паўстанне. Войскі вагаліся. Стварылася своеасаблівая раўнавага сіл, царызм не ў сілах быў падавіць рэвалюцыйны рух, а рэвалюцыйныя сілы, хоць і маглі процістаяць царызму, не маглі канчаткова задушыць яго.

Напалоханы выступленнямі пралетарыяту, царызм адступіў. 17 кастрычніка Мікалай II падпісаў маніфест, у якім народу былі абяцаны дэмакратычныя свабоды і скліканне заканадаўчай думы.

Вальшавікі растлумачвалі шырокім масам, што царызм, выдаючы маніфест, разлічваў атрымаць перадышку, усыпіць лёгкаверных, выйграць час, сабрацца з сіламі і задушыць рэвалюцыю. Працоўныя Мінска адным з першых пераканаліся ў гэтым.

18 кастрычніка ў 9 гадзін раніцы рабочыя горада сабраліся на сходку ў будынку вакзала. Яны яшчэ нічога не ведалі пра маніфест. Губернатар Курлоў стараўся затрымаць і скрыць яго змест. У 2 гадзіны дня на прывакзальнай плошчы сабралася больш за 15 тысяч чалавек. Прыбывалі ўсё новыя і новыя калоны дэманстрантаў. Адзін з прадстаўнікоў забастовачнага камітэта чыгуначнікаў прачытаў прысутным царскі маніфест. Як даносіў мінскі паліцмайстар, «рабочыя кожнае слова суправаджалі непрыстойнымі воклічамі, звернутымі да асобы гасудара-імператара ...дазвалялі сабе зняважліва выказвацца супраць гасудара-імператара, называючы яго «Мікалашка», а адзін казаў пра неабходнасць аддаць яго пад суд народа і ганебна пакараць».

Рабочыя і прадстаўнікі Мінскай арганізацыі РСДРП, якія выступілі на мітынгу, заклікалі працоўных да далейшай рэвалюцыйнай

барацьбы, да яшчэ больш рашучых дзеянняў супраць самадзяржаўя, да ўзброенага паўстання.

Удзельнікі мітынгу запатрабавалі неадкладнага вызвалення палітычных зняволеных. Была выбрана дэлегацыя, якая накіравалася да губернатара і прад'явіла свае патрабаванні. Курлоў вымушаны быў уступіць і аддаў распараджэнне аб вызваленні палітычных зняволеных. Адначасова ён загадаў расстраляць мітынг рабочых.

Вітаемыя народам, вызваленыя з турмы, палітычныя зняволеныя прыбылі на мітынг. У гэты час войскі, якія знаходзіліся на вакзале, без папярэджання адкрылі агонь па бяззбройных рабочых. Было забіта звыш 80 і паранена да 300 чалавек.

Расстрэл мітынгу на прывакзальнай плошчы ў Мінску яшчэ раз паказаў рабочым неабходнасць звяржэння царызму шляхам узброенага паўстання. «Крывавы Мікалай мог даць толькі крывавую «канстытуцыю», — пісала Мінская група РСДРП,—такую «канстытуцыю», якая пакідае яму магчымасць і свабоду страляць у бяззбройны народ... Няхай кроў забітых пры царскай свабодзе навучыць жывых разумець і змагацца за сапраўдную свабоду, за канчатковае звяржэнне самадзяржаўя і манархіі.

Паўстаньце, бярыцеся за зброю!

Далоў самадзяржаўе, няхай жыве дэмакратычная рэспубліка! Няхай жыве рэвалюцыя! Няхай жыве рабочы клас, які змагаецца, і яго правадыр — сацыял-дэмакратыя!»

На расстрэл сваіх таварышаў рабочыя Мінска адказалі ўзмацненнем барацьбы. У лістоўцы «Да грамадзян горада Мінска», выдадзенай Мінскай групай РСДРП, былі сфармуляваны патрабаванні рабочых: неадкладнае адхіленне губернатара, паліцмайстра і іншых вінаватых у расстрэле ад пасад і прызначэнне суда над імі, забеспячэнне дэмакратычных свабод, вывад з горада казакаў, роспуск паліцыі, перадача аховы грамадскага парадку ў горадзе народнай міліцыі. Гэтыя патрабаванні былі падхоплены шырокімі слаямі насельніцтва Мінска. Абурэнне ў горадзе было настолькі вялікае, што царскія ўлады вымушаны былі выклікаць нібыта для «дакладу» ў Пецярбург губернатара Курлова і даць санкцыю на вядзенне следства. Аднак справу спынілі, і неўзабаве Курлоў зноў працягваў «кіраванне» губерняй.

Царскі ўрад, прыкрываючыся маніфестам 17 кастрычніка, імкнуўся выкарыстаць усе сродкі для падаўлення рэвалюцыі. «За «канстытуцыйным» маніфестам Нікалая Крывавага,— пісаў у гэтыя дні У. І. Ленін,— паследавалі новыя незлічоныя забойствы, арганізаваныя Трэпавым і яго бандай. Шаленствы казакаў, яўрэйскія пагромы, расстрэльванне на вуліцах толькі што «амністыраваных» палітыкаў, грабяжы, учыняемыя чарнасоценцамі пры дапамозе паліцыі,— усё

пушчана ў ход, каб падавіць рэвалюцыйную барацьбу» [1]. Перад пралетарыятам і яго партыяй паўстала задача — паралізаваць чарнасоценныя дзеянні царызму.

Мінская бальшавіцкая арганізацыя праводзіла работу па мабілізацыі і згуртаванню рабочых для актыўнага рэвалюцыйнага адпору чарнасоценцам. На мітынгах, якія адбываліся на ўсіх буйнейшых прадпрыемствах горада, бальшавікі заклікалі рабочых да яшчэ большай арганізаванасці. У рэзалюцыях рабочых сходаў падкрэслівалася неабходнасць адзінства і згуртаванасці пралетарыяту як абавязковай умовы для паспяховага вырашэння рэвалюцыйных задач. 24 кастрычніка рабочыя механічнага завода «Тэхнолаг» прынялі рэзалюцыю, у якой заявілі, што ўсю сваю пралетарскую арганізаванасць і згуртаванасць і ўсе сродкі, якія ёсць у іх распараджэнні, яны накіруюць супраць гнюсных спроб царызму затрымаць магутны рост вызваленчага руху. Удзельнікі сходу звярнуліся да ўсіх рабочых горада з заклікам далучыцца да гэтай рэзалюцыі. Рэзалюцыя была падтрымана чыгуначнікамі, рабочымі механічных заводаў фірмы «Якабсон, Ліўшыц і К°», гарадской конкай чыгункі і іншых прадпрыемстваў горада.

Задачы рэвалюцыі патрабавалі паўсюднай арганізацыі баявых рэвалюцыйных атрадаў. Такія атрады ў кастрычніцкія дні былі створаны ў многіх прамысловых цэнтрах, на чыгуначных вузлах Беларусі. Яны неслі дзяжурствы на канспіратыўных кватэрах, выконвалі іншыя заданні групы РСДРП. У лістападзе ўзброеныя атрады рабочых неаднаразова займалі друкарні, забяспечваючы экстраны выпуск сацыял-дэмакратычных выданняў і лістовак. 16 лістапада ў 7 гадзін вечара такі атрад прыбыў у друкарню Навумава па Прэабражэнскай вуліцы і ад імя Мінскай групы РСДРП аддрукаваў пракламацыю «Да грамадзян».

Газета «Северо-Западный край» паведамляла аб другім падобным выпадку: «Учора а палове дзесятай вечара ў рэдакцыю з'явіліся чалавек 30 узброеных рабочых, занялі ўваход у рэдакцыю, друкарню і кватэру рэдактара, заявілі ад імя Мінскай групы РСДРП, што будуць друкаваць пракламацыі. Надрукаваўшы некалькі тысяч лістовак «Да рускага народа» і «Да салдат», падпісаных Цэнтральным Камітэтам РСДРП, прышэльцы да раніцы пайшлі».

Аднак рабочыя дружыны ў Мінску былі нешматлікія, слаба падрыхтаваныя ў ваенных адносінах, дрэнна ўзброеныя, не мелі адзінага ваеннага цэнтра і агульнага плана дзеяння.

У дні кастрычніцкай усеагульнай палітычнай стачкі ў Мінску, як і ў многіх іншых гарадах Беларусі, дзейнічаў забастовачны камітэт

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 9, стар. 404.

рабочых. Ён абавязваў фабрыкантаў выплачваць рабочым зарплату за дні забастоўкі, усталёўваў цэны на харчовыя тавары, аказваў матэрыяльную дапамогу бастуючым і г. д. Мінскі чыгуначны забастовачны камітэт у час стачкі фактычна ўзяў пад свой кантроль работу чыгуначнага вузла. У кастрычніцкія дні ён у многіх сваіх дзеяннях ажыццяўляў функцыі органаў рэвалюцыйнай улады.

Свядомасць і рэвалюцыйная актыўнасць мас, якая ўзрасла ў ходзе рэвалюцыйнай барацьбы, садзейнічала ўмацаванню і росту Мінскай групы РСДРП. У кастрычніку 1905 года яна налічвала больш за 600 чалавек. Прыток рабочых у партыю асабліва павялічыўся пасля кастрычніцкай усеагульнай стачкі. Гэта сведчыла аб пашырэнні ўплыву і аўтарытэту РСДРП сярод рабочых.

Некаторыя легальныя магчымасці, якія былі заваяваны рабочымі, дазволілі бальшавікам яшчэ шырэй разгарнуць палітычную работу ў масах. На арганізаваных імі адкрытых паўлегальных рабочых сходках і мітынгах яны растлумачвалі рабочым сучаснае становішча ў краіне, раскрывалі сапраўдны сэнс царскага маніфеста і «дарованых свабод», заклікалі пралетарыят да яшчэ большага згуртавання і арганізацыі.

Такія мітынгі прайшлі ў майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, на заводзе «Тэхнолаг», Кашарскім машынабудаўнічым заводзе, на гарбарным заводзе Імрата, піваварным, вінакурным, дражджавым, канатным заводах і іншых прадпрыемствах горада.

У дні ўздыму рэвалюцыі бальшавікі набылі новую магутную зброю — легальныя газеты. Сярод іх вядучае месца займала «Новая жизнь», якая пачала выходзіць 28 кастрычніка 1905 года ў Пецярбургу.

У Мінску і ў іншых гарадах Беларусі вялікай папулярнасцю сярод рэвалюцыйных мас карысталася легальная газета «Северо-Западный край». Дзейнасць Мінскай групы РСДРП і яе сувязь з рэдакцыяй вызначылі рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак газеты. Яна шырока адгукалася на рэвалюцыйныя падзеі. Яе старонкі ператвараліся ў многіх выпадках у трыбуну Мінскай групы РСДРП.

Рэвалюцыйная накіраванасць газеты асабліва яскрава праявілася ў 1905 годзе. У чэрвені 1905 года газета была закрыта, а яе рэдактар Мысаўскі асланы ў Архангельскую губерню. Толькі ў канцы кастрычніка было адноўлена выданне газеты, якая захавала баявы рэвалюцыйны характар. Вітаючы выхад «Северо-Западного края», «Новая жизнь» змясціла наступнае паведамленне: «Выйшаў пасля чатырохмесячнага перапынку «Северо-Западный край» з ранейшай марксісцкай праграмай».

У газеце «Северо-Западный край» друкаваліся артыкулы па надзённых пытаннях палітычнага жыцця краіны, асвятляліся пытанні

рэвалюцыйнага рабочага руху і партыйнага жыцця ў Расіі. Газета выкрывала здрадніцкую ролю ліберальнай буржуазіі і контррэвалюцыйны характар чарнасоценных партый. Яна раскрывала перад масамі сутнасць антынароднай унутранай і знешняй палітыкі царызму, палітыкі жорсткага прыгнечання народаў Расіі.

У газеце перадрукоўваліся артыкулы У. І. Леніна і матэрыялы з бальшавіцкіх газет. У лістападзе 1905 года ў «Северо-Западном крае» (№ 782, 783, 785) быў апублікаваны артыкул У. І. Леніна «Дробнабуржуазны і пралетарскі сацыялізм». У артыкулах «Задачы моманту» (№ 774), «Чаго хоча РСДРП?» (№ 800), «Хто такія с.-д.?» (№ 796) даслоўна перакazваліся тэксты ленінскіх прац.

Шмат увагі газета ўдзяляла партыйнаму жыццю. У канцы лістапада «Северо-Западный край» перадрукаваў з «Новой жизни» план заняткаў па вывучэнню праграмы РСДРП, яшчэ раней, 13 лістапада, была надрукавана праграма Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. У тым жа нумары, у парадку падрыхтоўкі да склікання IV з'езду РСДРП, быў змешчаны артыкул з «Новой жизни» «Да ўсіх партыйных арганізацый і да ўсіх рабочых сацыял-дэмакратаў». Дзейнасць газеты адыграла важную ролю ў распаўсюджванні марксізма і ў справе рэвалюцыйнага выхавання рабочых Мінска.

Бальшавікі Мінскай арганізацыі РСДРП, ведучы барацьбу з меншавікамі і бундаўцамі, кіравалі стварэннем рада прафесіянальных арганізацый рабочых і служачых горада. З найбольш буйных прафесіянальных арганізацый у Мінску дзейнічалі саюз чыгуначнікаў, саюз работнікаў пошты і тэлеграфа, 1-е Мінскае прафесіянальнае таварыства рабочых гарбарных прадпрыемстваў, прафесіянальнае «Таварыства працаўнікоў друкарскай справы г. Мінска», «Таварыства асоб, якія займаюцца канторскай працай у крэдытных і гандлёва-прамысловых установах г. Мінска».

Шырокага размаху арганізацыя прафсаюзаў у Мінску не атрымала. Большасць рабочых механічных, цагельных і ганчарна-кафляных заводаў, а таксама прадпрыемстваў харчовай прамысловасці не была ахоплена прафсаюзамі.

З восені 1905 года Мінская група РСДРП узмацніла рэвалюцыйную агітацыю ў войсках і сялянстве. Былі выпушчаны лістоўкі і пракламацыі. У паветах губерні агітатары праводзілі мітынгі, сходы сялян, распаўсюджвалі рэвалюцыйную літаратуру. Мінскі губернатар, паведамляючы аб узмацненні рэвалюцыйнай агітацыі сярод сялян, пісаў: «Да мяне даходзяць упартыя чуткі аб з'яўленні сярод сялян агітатараў, якія маюць пры сабе пракламацыі і падбухторваюць мясцовае насельніцтва супраць памешчыкаў. Пасля з'яўлення гэтых агітатараў пачынаецца самавольная рубка лесу, захоп зямлі... і пагрозы разгрому памешчыцкіх сядзіб...»

У лістападзе бальшавікі Мінска арганізавалі мітынг салдат-навабранцаў. Яго ўдзельнікі выказалі гатоўнасць змагацца разам з пралетарыятам супраць памешчыцка-самадзяржаўнага ладу. Пад уздзеяннем бальшавіцкай агітацыі расла свядомасць салдат.

Пасля кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачкі рэвалюцыйная барацьба мас у краіне працягвала развівацца з велізарнай сілай. Забастоўкі рабочых не спыняліся па ўсёй Расіі. У лістападзе паштова-тэлеграфныя работнікі Мінска прынялі актыўны ўдзел ва ўсерасійскай паштова-тэлеграфнай забастоўцы. Баставалі таксама рабочыя коннай чыгункі, некаторых іншых прадпрыемстваў, а таксама навучэнцы большасці навучальных устаноў горада.

Царская адміністрацыя ў Мінску, каб сарваць забастоўку работнікаў пошты і тэлеграфа, выкарыстоўвала на разносцы пісьмаў казакаў, на тэлефоннай станцыі дзяжурылі казацкія афіцэры і паліцэйскія чыноўнікі. Аднак бастуючыя сарвалі работу ваенных і паліцэйскіх штрэйкбрэхераў.

Мінская група РСДРП выпусціла пракламацыі і адозвы. Выступаючы на мітынгах і сходах рабочых-чыгуначнікаў, бальшавікі заклікалі іх аказаць дапамогу і падтрымку бастуючым. 18 лістапада на агульнагарадскім мітынгу прысутныя выказалі сваю салідарнасць з паштова-тэлеграфнымі служачымі. Да забастоўкі паштова-тэлеграфных работнікаў горада далучыліся служачыя чыгуначнай пошты і тэлеграфа. Нягледзячы на масавыя звальненні і арышты, забастоўка паштова-тэлеграфных работнікаў у Мінску працягвалася каля трох тыдняў.

Напярэдадні снежаньскіх падзей Мінская арганізацыя РСДРП правяла значную арганізацыйна-падрыхтоўчую работу. Кааліцыйны камітэт выдаваў пракламацыі і лістоўкі з указаннямі Пецярбургскага Савета рабочых дэпутатаў аб падрыхтоўцы да новай усерасійскай палітычнай стачкі.

У снежаньскія дні рабочы клас Беларусі актыўна падтрымаў гераічную барацьбу маскоўскага пралетарыяту. Атрымаўшы вестку аб усеагульнай забастоўцы і ўзброеным паўстанні ў Маскве, Мінскі кааліцыйны камітэт 8 снежня заклікаў рабочых да забастоўкі. У горадзе распаўсюджваліся лістоўкі, на суседнія чыгуначныя станцыі былі накіраваны агітатары. Першымі забаставалі чыгуначнікі. Рух паяздоў па Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгунках на тэрыторыі Беларусі спыніўся.

8 снежня спынілі работу фабрыкі і заводы, гарадскі транспарт. Баставалі навучэнцы навучальных устаноў Мінска.

9 снежня Мінская губерня была аб'яўлена на становішчы надзвычайнай аховы. Дэпартамент паліцыі прадпісваў губернатару «прымаць самыя рашучыя меры супраць рэвалюцыйных саюзаў і іх чле-

наў, падвяргаючы апошніх турэмнаму зняволенню або арышту на магчыма большыя тэрміны, спыніць выданне газет, якія маюць шкодны напрамак, не дапускаць ніякіх сходаў і мітынгаў і наогул дзейнічаць без ваганняў».

У Мінск былі выкліканы войскі, паліцыя атрымала армейскае ўзбраенне. Пачаліся масавыя арышты. Была разгромлена рэдакцыя і спынена выданне газеты «Северо-Западный край». Мінская турма была ў такой меры перапоўнена, што губернатар хадайнічаў аб пераводзе часткі арыштаваных у маскоўскую турму. У ноч на 9 кастрычніка паліцыя арыштавала многіх кіраўнікоў забастоўкі.

Выступленні рабочых былі аслаблены дэзарганізатарскай тактыкай меншавіцка-эсэра-бундаўскай большасці кааліцыйнага савета. 12 снежня савет аб'явіў аб часовым спыненні стачкі. Праз два дні члены кааліцыйнага савета былі арыштаваны.

Бальшавікі Мінска не здолелі хутка арганізаваць наступальныя дзеянні і забяспечыць бяспеку кіруючых цэнтраў. Гэта прывяло да таго, што ў рашучы момант рабочыя не праявілі дастатковай актыўнасці і рэвалюцыйнай энергіі. Раскол і ваганні ў рабочым руху былі выкарыстаны царскімі ўладамі. Яны падавілі забастоўку і папярэдзілі ўзброенае паўстанне ў Мінску.

Пралетарыят, нягледзячы на жорсткія праследаванні, адступаў з баямі. Працягвалі баставаць рабочыя майстэрняў і дэпо Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Толькі сілай зброі рабочых прымушалі да адпраўкі цягнікоў; цягнікі адыходзілі з жандарскай аховай на паравозах.

Рэвалюцыйныя выступленні ў Мінску і губерні працягваліся яшчэ да канца снежня.

3. Рэвалюцыйны рух у 1906—1907 гадах

Пасля паражэння снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве хваля рэвалюцыйнай барацьбы пачала паступова слабець. У краіне лютавалі карныя экспедыцыі. У Мінску, паводле далёка не поўных афіцыяльных даных, пасля снежаньскай стачкі было арыштавана больш за 130 рабочых, пераважна чыгуначнікаў.

Буржуазія адкрыта перайшла ў лагер царызму. Яна спяшалася адабраць у рабочых тыя ўступкі, на якія яна вымушана была пайсці ва ўмовах уздыму рэвалюцыі. Буржуазія стварала контррэвалюцыйныя групы і партыі. У пачатку снежня ў Мінску пачаў дзейнічаць аддзел «Саюза 17 кастрычніка», які меў свой друкаваны орган — газету «Минское слово». У пачатку 1906 года ў горадзе аформілася таксама група кадэтаў.

Яшчэ больш актывізавалася дзейнасць рэакцыйных і шавіністычных элементаў. Духавенства Мінска, вышэйшыя колы чыноўніцтва, буйныя домаўласнікі і памешчыкі ў канцы 1905 года стварылі чарнасоценную арганізацыю «Мінскае праваслаўнае брацтва», якая ставіла на мэце дапамагаць ураду падаўляць рэвалюцыйную барацьбу народных мас.

Прадпрыемцы аб'яўлялі лакауты. Яны звальнялі перадавых рабочых, заводзілі «чорныя спісы», забаранялі сходы, саюзы рабочых. Павялічыўся рабочы дзень, зніжалася заработная плата. У Мінску ў пачатку 1906 года толькі на Лібава-Роменскай чыгунцы было звольнена 850 рабочых. Колькасць беспрацоўных у Мінску ўзрастала.

Наступленне контррэвалюцыйных сіл сустракала супраціўленне пралетарыяту. Рабочы клас адступаў паволі, упарта адстайваючы заваяваныя пазіцыі.

У студзені 1906 года рабочыя Мінска палітычнымі стачкамі адзначылі гадавіну пецярбургскага расстрэлу. Стачкі адбыліся на машынабудаўнічых заводах і іншых прадпрыемствах. Напярэдадні 9 студзеня Мінская група РСДРП спрабавала арганізаваць стачку ў майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгунак. Аднак паліцыя загадзя прыняла меры: майстэрні дэпо і вакзалы былі заняты войскамі і паліцыяй.

Нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, арышты і лакауты, рабочыя нярэдка пераходзілі ў наступленне супраць капіталістаў. У красавіку 1906 года баставалі рабочыя парфумернай фабрыкі. Яны дабіліся павышэння заработнай платы. 41-дзённая стачка ў снежні 1906 — студзені 1907 гадоў на тытунёвых фабрыках таксама закончылася перамогай рабочых.

Стачачны рух пралетарыяту Мінска не спыняўся і ў 1907 годзе. У канцы лютага рабочыя абойнай фабрыкі дабіліся некаторага павышэння заработнай платы; на піваварным заводзе забастоўка рабочых таксама прымусіла ўладальніка пайсці на рад уступак. У майскія дні 1907 года ў Мінску баставалі рабочыя машынабудаўнічых заводаў, друкары, рамеснікі, будаўнічыя рабочыя. Забастоўка ахапіла больш за 1000 чалавек.

Між тым, нягледзячы на асобныя значныя выступленні рабочых, рэвалюцыйны рух ішоў да спаду. Першая руская рэвалюцыя пацярпела паражэнне.

РАЗДЗЕЛ X

МІНСК ПАМІЖ ДЗВЮМА РЭВАЛЮЦЫЯМІ

1. Наступленне рэакцыі

Падавіўшы рэвалюцыю, царскі ўрад 3 чэрвеня 1907 года разагнаў непаслухмяную II Дзяржаўную думу. Гэты акт азначаў наступленне рэакцыі і разгулу контррэвалюцыі ў краіне. Адначасова з роспускам Думы быў аб'яўлены новы выбарчы закон і назначаны новыя выбары на восень 1907 года. Гэты выбарчы закон быў яшчэ больш антыдэмакратычным у параўнанні з ранейшым. Ён уводзіў цэлы шэраг новых абмежаванняў выбарчых правоў працоўных. У выніку толькі 15 працэнтаў жыхароў Расійскай імперыі маглі ўдзельнічаць у выбарах у Думу, галоўным чынам памешчыкі, чыноўнікі і буржуазія. Толькі невялікая частка рабочых і сялян была дапушчана да ўдзелу ў выбарчай кампаніі. У Мінску, напрыклад, па трэцечэрвеньскаму закону атрымалі права ўдзельнічаць у выбранні выбаршчыкаў у губернскі выбарчы сход па выбарах у II Дзяржаўную думу толькі 359 рабочых пяці прамысловых прадпрыемстваў.

Большасць месц у III Думе атрымалі памешчыкі і буржуазія. Выбары замацавалі блок памешчыкаў з вярхамі гандлёва-прамысловай буржуазіі пры захаванні неабмежаванай самадзяржаўнай улады.

Царскі ўрад, памешчыкі і капіталісты жорстка помсцілі масам і ў першую чаргу пралетарыяту за ўдзел у рэвалюцыі. «Помстай за рэвалюцыю адзначана ўся эпоха III Думы,— пісаў У. І. Ленін.— Ніколі яшчэ не было ў Расіі такога разгулу праследаванняў з боку царызму»[1]. Капіталісты забіралі ў рабочых адну за

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 17, стар. 457—458.

другой заваёвы 1905 года. Яны зніжалі заработную плату, падаўжалі рабочы дзень, павялічвалі штрафы, аб'яўлялі масавыя звальненні рабочых.

Рабочы дзень на прадпрыемствах Мінска павялічыўся з 10 да 12—15 гадзін у суткі. Уладальнікі мінскіх машынабудаўнічых заводаў у кастрычніку 1908 года на 15 працэнтаў знізілі расцэнкі. Гаспадары загатовачных майстэрняў горада перавялі сваіх рабочых з пастаянных на становішча сезонных і на трэць скарацілі ім заработную плату.

Становішча рабочых яшчэ пагоршылася ў выніку крызісу і дэпрэсіі ў прамысловасці. У 1908 годзе ў Мінску налічвалася больш за тысячу беспрацоўных.

Ажыўленне ў прамысловасці, якое наступіла ў 1909 годзе, не палегчыла становішча рабочых. Рабочы дзень на прадпрыемствах заставаўся ранейшым, а зарплата трымалася на вельмі нізкім узроўні. Напрыклад, у 1914 годзе сярэдняя гадавая зарплата фабрычна-заводскіх рабочых Мінскай губерні ўпала да 177 рублёў. Усемагчымыя штрафы і ўтрыманні змяншалі і без таго мізэрны заработак рабочага. Сістэма штрафаў у гады рэакцыі атрымала шырокае развіццё і набыла жудасныя, пачварныя формы. Капіталісты штрафавалі рабочых па самых нязначных прычынах. Нават паводле зменшаных даных фабрычнай інспекцыі, колькасць выпадкаў спагнання штрафаў у Мінску і губерні павялічылася з 1901 па 1912 год на 21 працэнт, штрафы былі спагнаны з 53,3 працэнта ўсіх рабочых, занятых у прамысловасці, якая падлягала нагляду фабрычнай інспекцыі.

Рэальная заработная плата зніжалася яшчэ і таму, што рабочых нярэдка прымушалі карыстацца прадуктамі з фабрычных крам, дзе яны адпускаліся па завышаных цэнах і былі нізкай якасці, а часта і зусім непрыгоднымі.

Амаль поўная адсутнасць аховы працы вяла да ўсё большай колькасці калецтваў. Згодна з афіцыяльнымі данымі, толькі за восем год (з 1906 па 1914) колькасць няшчасных выпадкаў на фабрыках і заводах Мінска і губерні павялічылася больш чым у два разы.

Сацыяльнае страхаванне адсутнічала зусім, не аказвалася дапамога па інваліднасці і хваробе, па старасці. Праўда, пад націскам мас царскі ўрад вымушаны быў пайсці на некаторыя ўступкі і выдаў у 1912—1913 гадах законы аб страхаванні ад няшчасных выпадкаў і аб арганізацыі бальнічных кас. Аднак істотнага значэння для аблягчэння лёсу пралетарыяту гэтыя законы не мелі, таму што пашыраліся яны далёка не на ўсіх рабочых, пенсіі пацярпеўшым былі мізэрныя, а сродкі бальнічных кас складаліся поўнасцю за кошт вылічэнняў з мізэрнага заработку самих жа рабочых. У Мінску пад дзеянне закону аб страхаванні ад няшчасных выпадкаў падыходзіла ўсяго 14 прадпрыемстваў з 65. У той жа час многія тысячы рабочых

дробных прадпрыемстваў былі поўнасцю выключаны са сферы дзеяння ўказаных законаў.

Становішча гэтай неарганізаванай і раздробненай часткі рабочых было асабліва цяжкім. Уладальнікі дробных прадпрыемстваў маглі нейкі час вытрымаць націск буйнога капіталу толькі дзякуючы бязлітаснай эксплуатацыі рабочых. Для рамесных рабочых у 1910 годзе ўсё яшчэ дзейнічаў статут екацярынінскіх часоў. Рабочы дзень чаляднікаў і вучняў працягваўся 14—16, а часта і 18 гадзін. У сувязі з крызісам і заняпадам дробнай вытворчасці становішча рамеснікаў яшчэ больш пагоршылася: напалавіну скараціўся іх заработак, а многія зусім страцілі работу. Мінская газета «Копейка» пісала: «Рамеснікі жывуць бедна, жыццё іх поўна пакут і нягод... Украінныя шаўцы «на заказ» жывуць у цесных і нязручных умовах; вельмі часта ў падвалах, куды не пранікае божае святло. У душнай атмасферы крыкі дзяцей і праклёны жонак змешваюцца з дакучлівым стукам малатка».

Выключна жорстка эксплуатаваліся жанчыны і дзеці, праца якіх усё больш выкарыстоўвалася ў прамысловасці. Згодна з данымі фабрычнай інспекцыі за 1912 год, дзеці і падлеткі сярод прамысловых рабочых Мінскай губерні складалі 11,2 працэнта, а дарослыя жанчыны — 19,7 працэнта. Зарплата жанчыны, як правіла, на 30—50 працэнтаў была меншай, чым у мужчыны, занятага на тых жа работах і пры аднолькавай працягласці рабочага дня.

Аховы жаночай і дзіцячай працы на прадпрыемствах не было. Цяжарныя жанчыны працягвалі працаваць да апошняга дня. Годнасць работніц зневажалася і прыніжалася. «Справа буржуазіі,— пісаў У. І. Ленін,— заганяць дзяцей і жанчын на фабрыкі, мучыць іх там, разбэшчваць, асуджаць на крайнюю галечу» [1].

Узмацняючы эканамічны прыгнёт, пануючы клас ужыў супраць працоўных мас, яго палітычных, прафсаюзных арганізацый, органаў друку сістэму рэпрэсіўных мер, якія насілі характар адкрытага тэрору. Партыя бальшавікоў была загнана царызмам у падполле. Сотні і тысячы перадавых, свядомых рабочых царызм запраторыў у турмы, адправіў на катаргу і ў ссылку. «Зноў нас душаць генерал-губернатары, губернатары, жандары, паліцэйскія, міністры і безліч усякай вялікай і малой сволачы,— пісалі мінскія бальшавікі ў 1908 годзе.— За крывавыя грошы, якія шчодра раздае цар-бацюшка, яны стараюцца цяпер вытруціць нават сам успамін аб тых перамогах, якія атрыманы былі рэвалюцыйным народам над царскім урадам у дні перамогі. Шыбеніцы і кулі, турмы і катарга — вось вам «недатыкальнасць асобы».

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 23, стар. 70.

У 1907 годзе паліцыя арыштавала большасць членаў Мінскай бальшавіцкай арганізацыі РСДРП, аднак ужо ў канцы года арганізацыя была адноўлена і працягвала сваю работу.

Царскі ўрад бязлітасна праследаваў прафесіянальныя саюзы і іншыя таварыствы рабочых. К 1908 году ў Мінску былі забаронены амаль усе прафсаюзы. Газета «Социал-демократ» паведамляла ў лютым 1908 года, што царская «адміністрацыя закрывае прафсаюзы пры ўсякім зручным выпадку і робіць павальныя арышты пры першай спробе забастовачнага руху».

Падаўляць рабочы рух і праследаваць актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнай барацьбы царызму дапамагалі розныя контррэвалюцыйныя арганізацыі: «Саюз рускага народа», «Украінны рускі саюз», «Саюз 17 кастрычніка». У жніўні 1907 года, у перыяд падрыхтоўкі да выбараў у III Думу, усе контррэвалюцыйныя арганізацыі аб'ядналіся ў адзіную групу праваакцябрысцкага напрамку, утварыўшы агульны перадвыбарчы камітэт. Гэты камітэт рассылаў звароты да сельскага духавенства і земскіх начальнікаў па пытаннях думскіх выбараў і заваявання галасоў выбаршчыкаў. Чарнасоценцы вялі агітацыю ў вёсках і сярод найбольш адсталай часткі гарадскога па-шавіністычнаму настроенага насельніцтва. Яны дапамагалі царскім уладам высочваць рэвалюцыянераў, арыштоўваць іх, зрывалі забастоўкі, наладжвалі крывавыя расправы над актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйных выступленняў.

І ўсё ж поўнасцю расправіцца з рабочым рухам царызму не ўдалося. Ізаляваныя, разрозненыя выступленні рабочых успыхвалі зноў і зноў, як бы напамінаючы, што пад попелам нядаўна разгромленых і спаленых барыкад тлеюць іскры, гатовыя распаліць новы пажар рэвалюцыйнага штурму буржуазна-ламешчыцкага ладу.

У пачатку 1908 года ў Мінску сярод іншых выступленняў выдзялялася забастоўка рабочых гарадской друкарні. Яна працягвалася з 1 па 3 студзеня і закончылася бясплённа. Арганізатары былі арыштаваны.

Актыўны рэвалюцыйны рух разгарнуўся па ўсёй краіне ў майскія дні 1908 года. Сваё свята пралетарыят буйнейшых прамысловых цэнтраў Расіі адзначыў палітычнымі і эканамічнымі стачкамі.

Мінскія бальшавікі вялі энергічную рэвалюцыйную работу сярод рабочых Мінскай і Гродзенскай губерняў. У лютым 1908 года яны выпусцілі пракламацыю «Таварышы рабочыя!», у якой быў аналіз бягучага моманту, даказвалася, што рэвалюцыя не закончана, бо не знішчаны сілы, якія выклікалі яе. Пракламацыя заклікала рабочых згуртавацца вакол партыі і працягваць барацьбу пад сцягам РСДРП. Бальшавікі Мінска дапамагалі наладзіць рэвалюцыйную работу ў масах партыйным групам і ячэйкам у Бабруйскім, Слуцкім, Навагруд-

скім, Барысаўскім і Рэчыцкім паветах. Агітацыя і прапаганда бальшавікоў аказвалі вялікі ўплыў на масы, арганізуючы іх на рэвалюцыйныя выступленні. Дзень 1 Мая 1908 года рабочыя некаторых прадпрыемстваў Мінска адзначылі палітычнай стачкай.

Пратэстуючы супраць рэпрэсій і самавольства ўлад, рабочыя давалі адпор капіталістам. У кастрычніку 1908 года пачалася забастоўка на машынабудаўнічых заводах фірмы «Якабсон, Ліфшыц і К°». Яна была арганізавана Мінскай групай РСДРП. Прычынай паслужыла зніжэнне расцэнак на 15 працэнтаў і павелічэнне рабочага дня на адну гадзіну. Больш чым месяц баставалі мінскія металісты, аднак голад і рэпрэсіі ўлад прымусілі іх прыняць умовы, прапанаваныя гаспадарамі. Забастоўка металістаў у 1908 годзе была апошнім буйным выступленнем рабочых Мінска пасля паражэння рэвалюцыі.

Барацьба рабочых супраць капіталістаў аслаблялася апартуністычнай дзейнасцю бундаўцаў, эсэраў, меншавікоў і розных нацыяналістычных арганізацый і груп. Буржуазна-нацыяналістычныя партыі — Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), яўрэйскія сіяністы, польскія нацыяналісты — распальвалі нацыянальную варожасць, стараліся раз'яднаць працоўных па нацыянальнасцях, адцягнуць іх ад класавай барацьбы. У газеце «Наша ніва» беларускія нацыяналісты хвалілі сталыпіншчыну, адмаўлялі неабходнасць класавай барацьбы, раілі народу не выступаць супраць царызму і самадзяржаўна-памешчыцкай «законнасці», дзейнічаць толькі мірным шляхам.

Сіяністы сеялі раскол сярод яўрэйскіх рабочых. Яны пераконвалі працоўных-яўрэяў у тым, што іх выратаванне не ў класавай пралетарскай салідарнасці і не ў сумеснай з рабочымі іншых нацыянальнасцей барацьбе супраць сваіх прыгнятальнікаў, а ў перасяленні ў Палестыну і набыцці там «новай яўрэйскай радзімы». Бундаўцы неабходнасць класавай барацьбы падмянялі заклікам да рабочых адасабляцца ў чыста яўрэйскіх арганізацыях, ствараць свае яўрэйскія асветныя і рэлігійныя арганізацыі. Бунд выстаўляў рэакцыйныя патрабаванні рэфармавання сярэдневяковай яўрэйскай абшчыны, устанаўлення абавязковага суботняга адпачынку для яўрэйскіх рабочых, будаўніцтва асобных бальніц.

Бальшавікі вялі барацьбу з апартуністамі ўсіх масцей, выкрывалі дробнабуржуазную сутнасць апартуністычных партый, заваёўвалі на свой бок уцалелыя прафесіянальныя саюзы. Члены Мінскай арганізацыі РСДРП арганізоўвалі гутаркі на палітычныя тэмы з рабочымі і салдатамі, чыталі ім марксісцкую літаратуру. Яны праводзілі рэвалюцыйную работу сярод сялянства. Да канца 1909 года ў Мінску дзейнічала акруговая сялянская арганізацыя РСДРП, члены якой

вялі прапаганду ў сялянскім і ваенным асяроддзі і арганізоўвалі ваенныя камітэты.

Мінская група РСДРП устанавіла сувязі з сацыял-дэмакратычнай партыяй Польшчы. З Варшавы польскімі сацыял-дэмакратамі дастаўлялася рэвалюцыйная літаратура. 29 сакавіка 1908 года ў Мінск было прывезена 13 экземпляраў нелегальнай газеты «Чырвоны штандар» («Чырвоны сцяг») — друкаванага органа сацыял-дэмакратычнай партыі Польшчы і Літвы.

Бальшавіцкія арганізацыі Мінска дапамагалі ЦК РСДРП у перасылцы палітычнай літаратуры з-за мяжы. У вёсцы Ласосна пабліз Гродна дзейнічаў прыёмны пункт па дастаўцы літаратуры з-за мяжы, а ў Мінску, Гродна, Вільні, Клінцах і Новазыбкаве — перадатачныя пункты і групы садзеяння па распаўсюджванню літаратуры. У 1909 годзе ў Мінску знаходзілася кватэра прадстаўніка ЦК РСДРП па перасылцы нелегальнай літаратуры ў Расію. Гэту ролю з 1909 да сярэдзіны 1910 года выконваў Ілья Зофір (Сяргей Майсееў). Мінскія бальшавікі таксама атрымлівалі нелегальную літаратуру і нават мелі ў горадзе дзве падпольныя бібліятэкі, дзе захоўваліся творы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, Г. В. Пляханава, іншая літаратура і амаль усе бальшавіцкія газеты. Мінская публічная бібліятэка імя А. С. Пушкіна служыла да сакавіка 1908 года месцам збору рэвалюцыянераў. Праз яе распаўсюджваліся кнігі Леніна, Маркса, Энгельса, Лафарга.

Бальшавікі верылі ў непазбежнасць надыходу новага рэвалюцыйнага ўздыму ў краіне і рыхтавалі масы да будучых рэвалюцыйных баёў.

2. Уздым рабочага руху

Новы ўздым рэвалюцыйнага руху ў Расіі наступіў з сярэдзіны 1910 года. На працягу 1910—1911 гадоў у краіне баставала больш за 150 тысяч рабочых. У 1912—1914 гадах (першая палова) колькасць стачачнікаў перавысіла 3,8 мільёна чалавек. Рабочы клас Расіі зноў уздымаўся на рэвалюцыйную барацьбу з самадзяржаўем і капіталістамі.

Найбольш моцным рэвалюцыйны ўздым быў на поўдні Расіі, у Пецярбургу і Маскве. У Беларусі ён праявіўся слабей.

Пасля ленскага расстрэлу стачачны рух у Мінску і іншых гарадах Беларусі ўзмацніўся. 12 красавіка 1912 года забаставалі рабочыя 17 мінскіх слясарна-кавальскіх майстэрняў. Прычынай да выступления паслужыла спроба гаспадароў звольніць найбольш актыўных рабочых, якія былі абвінавачаны ў «падбухторванні да беспарадкаў».

Забастоўка праходзіла па загадзя выпрацаванаму рабочымі плану. Яна працягвалася чатыры тыдні, вызначалася стойкасцю і аднадушшам рабочых, якія патрабавалі ўстанаўлення 9-гадзіннага рабочага дня, павелічэння зарплаты на 25 працэнтаў, вяртання звольненых таварышаў. Прадпрыемцы звярнуліся да дапамогі штрэйкбрэхераў, аднак ім удалося наладзіць работу толькі дзвюх майстэрняў. Нягледзячы на арышты рабочых, забастоўка не спынялася.

Вялікую падтрымку бастуючым аказала «Правда», якая натхняла іх на барацьбу да перамогі, вітала іх стойкасць і арганізаванасць. Па закліку газеты рабочыя іншых гарадоў Беларусі аказвалі бастуючым матэрыяльную і маральную падтрымку.

У выніку ўпартай барацьбы рабочых прадпрыемцы адступілі. Рабочы дзень быў зменшаны да 9 гадзін, зарплата павялічана на 15—25 працэнтаў. Забастоўка паказала гатоўнасць мас весці актыўную наступальную барацьбу за свае эканамічныя і палітычныя інтарэсы.

Уздым рэвалюцыйнага руху суправаджаўся актывізацыяй палітычнай работы бальшавікоў у масах. Важную ролю ў гэтым адыграла VI (Пражская) партыйная канферэнцыя, якая адбылася ў студзені 1912 года. Аднак, калі ў буйнейшых пралетарскіх цэнтрах Расіі бальшавікі пасля канферэнцыі парвалі з апартуністамі ўсіх масцей, то ў Мінску і іншых гарадах Беларусі яны працягвалі і пасля канферэнцыі заставацца ў адзіных з меншавікамі арганізацыях. Гэта зрабіла адмоўны ўплыў на кіраўніцтва рабочым рухам. Меншавікі яшчэ карысталіся значным уплывам у масах, таму што ў асяроддзі пралетарыяту Беларусі, дзе былі жывучыя дробнабуржуазныя забабоны і згодніцкія ілюзіі, вытруціць іх са свядомасці было цяжэй. Адчувалася і адсутнасць у мясцовых партыйных арганізацыях добра падрыхтаваных і ідэйна загартаваных кіраўнікоў.

Пасля Пражскай канферэнцыі бальшавікі ўзмацнілі сваю дзейнасць у масах. У перадмайскія дні 1912 года Мінская арганізацыя РСДРП заклікала рабочых да барацьбы з самадзяржаўем. Хоць паліцыя і жандармерыя правялі шматлікія арышты, першамайскія стачкі на некаторых прадпрыемствах і ў рамесных майстэрнях адбыліся.

У канцы 1912 года Мінская група РСДРП выпусціла лістоўку «Таварышы салдаты!», якая была распаўсюджана ў 120-м Серпухоўскім палку. Лістоўкі, рэвалюцыйная літаратура і бальшавіцкая газета «Правда» шырока распаўсюджваліся сярод рабочых, што адыгрывала велізарную ролю ў іх палітычным выхаванні.

Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі ў стачачны рух больш актыўна ўключаліся рабочыя дробных прадпрыемстваў. Эканамічныя забастоўкі з патрабаваннямі скарачэння рабочага дня, павелічэння зарплаты, паляпшэння ўмоў працы адбываліся ў шчотачных, слясар-

ных, кравецкіх майстэрнях Мінска. Найбольш значнай была стачка краўцоў у ліпені 1912 года. Карыстаючыся іх неарганізаванасцю, майстры-пасрэднікі ўвялі празмерна працяглы рабочы дзень — з 8 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара без перапынкаў на снеданне і абед. Кіраўніцтва прафсаюза краўцоў правяло ў майстэрнях сходы, на якіх было вырашана аб'явіць стачку і запатрабаваць ад гаспадароў увядзення 10-гадзіннага рабочага дня, рэгулярнай выдачы зарплаты, адмены штрафаў. Стачка закончылася перамогай рабочых. Усе ўдзельнікі яе далучыліся да прафсаюза краўцоў.

Летам 1912 года III Дзяржаўная дума была распушчана. Выбары ў новую IV Думу праходзілі ў абстаноўцы нарастаючага рэвалюцыйнага ўздыму. Бальшавікі надавалі выбарам у Думу выключна важнае значэнне, імкнучыся выкарыстаць яе для рэвалюцыйнай работы ў масах.

Царскі ўрад і правыя партыі імкнуліся забяспечыць патрэбны ім склад Думы. У Мінскай губерні быў утвораны адзіны выбарчы блок, які аб'яднаў памешчыкаў, духавенства і правыя манархічныя арганізацыі. Гэты блок, які ўзначальваў епіскап Іаан, узяў у свае рукі ўсю справу падрыхтоўкі і правядзення выбарчай кампаніі ў горадзе і губерні. Ён выдаваў рэакцыйную газету «Минское русское слово», выпускаў агітацыйную літаратуру, праводзіў нарады і сходы, распрацоўваў планы перадвыбарнай кампаніі.

Ажывілася і дзейнасць розных буржуазных груповак. Акцябрысты пачалі выдаваць у Мінску газету «Минская речь», праводзілі агітацыю сярод выбаршчыкаў, рассылалі па валасных праўленнях дэмагагічныя адозвы, запрашалі сялян галасаваць за акцябрыстаў.

Яўрэйская буржуазія і буйныя польскія памешчыкі ішлі на пагадненне з рускай буржуазіяй і памешчыкамі, выступаючы толькі супраць абмежаванняў у прававым і маёмасным становішчы, якія былі ўстаноўлены царскім урадам. У Мінску адкрыўся перадвыбарны камітэт польскіх землеўладальнікаў, які прыняў рэзалюцыю аб неабходнасці ўдзелу ў выбарах і вылучэнні сваіх кандыдатаў. У якасці кандыдатаў у Думу былі намечаны князь Друцкі-Любецкі, памешчыкі Скірмунт, Любанскі і Вайніловіч.

Выбары ў IV Думу праходзілі на аснове рэакцыйнага трэцечэрвеньскага выбарчага закону. З больш чым трохмільённага насельніцтва Мінскай губерні права ўдзельнічаць у выбарах у IV Думу атрымалі толькі 55 669 выбаршчыкаў, да ўдзелу ў выбарах у Мінску было дапушчана ўсяго 1019 рабочых. Яны павінны былі выбраць у губернскі выбарчы сход па выбарах у Думу толькі аднаго выбаршчыка са 137. Зразумела, што адзін прадстаўнік ад рабочых не мог зрабіць ніякага ўплыву на ход выбараў у Думу.

З дзевяці выбраных у IV Думу дэпутатаў ад Мінскай губерні было два памешчыкі, два свяшчэннікі, адзін чыноўнік і чацвёра сялян. Апошнія адносіліся да заможна-кулацкай верхавінкі.

Ад буйнейшых рабочых цэнтраў краіны ў IV Думу па рабочай курыі былі выбраны дзевяць дэпутатаў, шэсць з іх — бальшавікі. Яны ўтварылі ў Думе самастойную фракцыю, якая з'яўлялася разам з газетай «Правда» важнейшым агульнарасійскім легальным органам бальшавіцкай партыі. Рабочыя Мінска, Гомеля, Дзвінска ў сваіх наказах заклікалі сацыял-дэмакратычную фракцыю ў Думе адстайваць інтарэсы працоўных, выкрываць меншавікоў-ліквідатараў. Бальшавіцкія дэпутаты Думы адыгралі вялікую ролю ў рэвалюцыйным выхаванні мас.

Неацанімую ролю ў падрыхтоўцы мас да новых рэвалюцыйных баёў адыгрывала «Правда», першы нумар якой выйшаў 5 мая 1912 года. Народжаная новым рэвалюцыйным уздымам, газета выхоўвала масы палітычна, вучыла рабочых і сялян, як трэба змагацца з эксплуататарамі, заклікала іх да арганізацыі і салідарнасці ў барацьбе.

Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі і прапаганды рабочы рух у краіне ў 1913 годзе працягваў нарастаць. У авангардзе ішоў гераічны пралетарыят Пецярбурга і Масквы. У Мінску рабочы рух насіў пераважна эканамічны характар, але ён стаў больш шырокім, актыўным і наступальным, набыў вялікую арганізаванасць і стойкасць. Расце колькасць стачак. У студзені 1913 года забаставалі рабочыя пераплётна-лінявальнай фабрыкі. Забастоўка працягвалася пяць дзён і спынілася толькі пасля таго, як адміністрацыя згадзілася пайсці на ўступкі. 17 студзеня пачалася забастоўка на абойнай фабрыцы. Аднак рабочыя не дабіліся задавальнення сваіх патрабаванняў.

У працэсе барацьбы пралетарыят пераконваўся ў раскольніцкай дзейнасці бундаўцаў і меншавікоў, адхіляў іх спробы раз'яднаць рабочы клас. У рабочым асяроддзі расло імкненне аб'яднацца для сумесных выступленняў, дабіцца адначасовай арганізацыі стачак на многіх прадпрыемствах горада. Для абмеркавання надзённых пытанняў і выпрацоўкі плана ўзгодненых дзеянняў склікаліся тайныя сходкі. Адна з такіх сходак адбылася ў Мінску 27 чэрвеня 1913 года ў доме на Завальнай вуліцы. Паліцыі ўдалося высачыць месца сходкі і акружыць дом. Былі арыштаваны 74 чалавекі.

У барацьбу ўсё больш актыўна ўключаліся рамеснікі, рабочыя дробных прадпрыемстваў, магазінаў, хатнія работнікі. У другой палове ліпеня забаставалі шаўцы і рабочыя абутковай фабрыкі «Праца», спыніліся работы ў абутковых саматужна-рамесных майстэрнях. Рабочыя-абутнікі патрабавалі павышэння зарплаты і паляпшэння ўмоў працы. Гаспадары адмаўляліся ісці на якія-небудзь уступкі.

Забастоўка прыняла зацяжны характар. Тады гаспадары закрылі ўсе прадпрыемствы, а рабочых звольнілі. У канцы 1913 года адбылася забастоўка мінскіх папяросніц, якія працавалі на даму. У ёй удзельнічала 100 чалавек.

Сутыкнуўшыся з ростам стачачнай барацьбы і больш арганізаванымі дзеяннямі рабочага класа, фабрыканты і заводчыкі сталі на шлях аб'яднання сваіх намаганняў у барацьбе супраць рабочых.

Па ініцыятыве прадпрыемцаў Пецярбурга і Масквы ў 1913 годзе была створана арганізацыя буйной буржуазіі «Савет з'ездаў прадстаўнікоў прамысловасці і гандлю», якая ставіла сваёй задачай выпрацоўку мерапрыемстваў па барацьбе з забастовачным рухам. «Савет з'ездаў» заклікаў капіталістаў выступіць супраць рабочых адзіным фронтам, ужываючы супраць іх лакауты.

Фабрыканты і заводчыкі Мінска ахвотна падтрымалі ініцыятыву «Савета з'ездаў» і, беручы прыклад з капіталістаў абедзвюх сталіц, сталі на шлях калектыўных лакаутаў.

У сваю чаргу ўзмацніў паліцэйскія рэпрэсіі супраць стачачнікаў урад. Імкнучыся дэзарганізаваць і аслабіць рабочы рух, улады праследавалі прафсаюзы і іншыя пралетарскія арганізацыі. Толькі за першае паўгоддзе 1913 года ў Мінскай губерні было закрыта шэсць прафсаюзаў.

Мінскі губернатар выдае пастанову, якая забараняе заклікі да забастовак пад пагрозай штрафу ці арышту на тры месяцы. Аднак гэтыя меры царскіх улад толькі ўзмацнялі нездавальненне і абурэнне рабочых, выклікаючы абвастрэнне класавай барацьбы.

Восенню 1913 года ў радзе гарадоў Расіі пракацілася хваля стачак, выкліканая ганеннямі на рабочы друк і рабочыя арганізацыі, а таксама ў сувязі з працэсам па справе Бейліса. Стачкі пратэсту адбыліся і на асобных прадпрыемствах Мінска. 25 верасня рабочыя некаторых майстэрняў правялі аднадзённую забастоўку супраць судовага працэсу над Бейлісам.

У першай палове 1914 года выступленні мінскага пралетарыяту не спыняліся. З 6 па 10 студзеня баставалі рабочыя Мінскай фабрыкі шэўскага, у красавіку — маі забастовачным рухам былі ахоплены майстравыя кравецкай майстэрні, рабочыя-надомнікі, падзёншчыкі аднаго з магазінаў, рабочыя лінявальнага прадпрыемства. Начальнік Мінскага жандарскага ўпраўлення вымушаны быў прызнаць, што забастоўкі выклікаліся «немагчыма цяжкімі матэрыяльнымі ўмовамі жыцця рабочых».

На працягу 1912—1914 гадоў (першая палова) у Мінску ў забастоўках удзельнічала больш за тысячу рабочых. Аднак далейшае развіццё рэвалюцыі было спынена імперыялістычнай вайной.

3. Эканамічнае жыццё горада ў гады вайны

Летам 1914 года пачалася першая сусветная вайна. Яна зрабіла згубны ўплыў на эканамічнае жыццё Беларусі, якая неўзабаве стала арэнай ваенных дзеянняў. Мабілізацыя арміі, велізарныя перакідкі войск і амуніцыі па чыгунках да заходняй граніцы выклікалі амаль поўнае спыненне дастаўкі прыватных грузаў. Недахоп сыравіны і рабочых рук прыводзіў да скарачэння прамысловай вытворчасці. Закрываліся многія прадпрыемствы, не звязаныя з вытворчасцю на вайну. У Мінску да канца ліпеня 1914 года спынілі вытворчасць дрожджа-вінакурны завод, фабрыка грабянёў, чатыры абойныя фабрыкі. Скарацілася вытворчасць на машынабудаўнічых і гарбарных заводах.

Да канца 1914 года ў некаторых галінах прамысловасці намецілася ажыўленне. Расце вытворчасць на машынабудаўнічых заводах, абутковых і іншых фабрыках, пачалі даваць прадукцыю прадпрыемствы, якія спыніліся ў пачатку вайны. Аднак многія з іх з-за недахопу сыравіны, рабочых рук, паліва і цяжкасцей збыту прадукцыі працавалі не на поўную магутнасць. На 12 буйнейшых прадпрыемствах Мінска да ліпеня 1915 года аб'ём вытворчасці скараціўся на 45 працэнтаў, а колькасць рабочых — на 60 працэнтаў. Нават машынабудаўнічыя заводы, якія мелі ваеннае значэнне і працавалі для патрэб фронту, адчувалі цяжкасці ад недахопу рабочых рук, сыравіны і грашовых сродкаў.

Вайна настойліва патрабавала перабудовы прамысловасці на ваенны лад. У краіне ствараюцца розныя камітэты і асобыя нарады — урадавыя органы для эфектыўнага і гібкага кіраўніцтва эканомікай. У 1915 годзе стварае свае арганізацыі — ваенна-прамысловыя камітэты, Усерасійскі земскі саюз і Саюз гарадоў — буржуазія.

Ваенна-прамысловыя камітэты ствараліся ў губернях, абласцях і гарадах. Яны падпарадкоўваліся цэнтральнаму ваенна-прамысловаму камітэту, на чале якога стаяў акцябрыст Гучкоў. У Мінску ваенна-прамысловы камітэт быў створаны ў жніўні 1915 года. У яго склад увайшлі прадстаўнікі мясцовай буржуазіі і гарадской чыноўнай бюракратыі. Прадстаўніком камітэта прызначаецца Самойленка, які з'яўляўся адначасова старшынёй губернска-земскай управы. Камітэт размяркоўваў ваенныя заказы, праводзіў эвакуацыю прадпрыемстваў з раёнаў, якім пагражаў вораг.

Усерасійскі земскі саюз і Саюз гарадоў ведалі справамі дапамогі параненым воінам і бежанцам і выконвалі розныя заказы і даручэнні ваеннага ведамства. Яны адыгралі станоўчую ролю ў дапамозе фронту.

Сярод прамысловых прадпрыемстваў Мінска ў першую чаргу для ваенных патрэб былі мабілізаваны машынабудаўнічыя заводы і чыгуначныя рамонтна-механічныя майстэрні. Яны перайшлі ў веданнe артылерыйскага ведамства і пераключыліся на рамонт артылерыйскіх гармат, вытворчасць снарадаў і гранат і выкананне іншых ваенных заказаў.

У верасні 1914 года пачалі выпуск прадукцыі для арміі мінскія шавецкія майстэрні, суконныя, кравецкія і рымарскія ўстановы, гарбарныя заводы, абутковыя фабрыкі. Велізарны попыт на кравецкія вырабы з боку ваеннага інтэнданцтва, наяўнасць свабоднай рабочай жаночай сілы з бежанцаў рабілі выгадным стварэнне на тэрыторыі Беларусі розных кравецкіх прадпрыемстваў, у фінансаванні і арганізацыі якіх удзельнічаў рускі капітал. Напрыклад, петраградскі банкірскі дом «Пабярэжны і К⁰» адкрыў у 1915 годзе ў Мінску майстэрні па пашыву салдацкіх гімнасцёрак, шараваpаў, патранташаў, чахлоў для біклаг.

К канцу кастрычніка 1915 года рускія войскі адступілі на лінію Дзвінск — Баранавічы — Пінск. Большая частка тэрыторыі Беларусі была акупіравана. Мінск стаў прыфрантавым горадам. Мінскі ваенна-прамысловы камітэт пачаў эвакуацыю важнейшых прадпрыемстваў, а таксама ўстаноў і насельніцтва Мінска. Паўночна-прамысловы камітэт, які перабраўся з Вільні ў Мінск, ведаў эвакуацыяй прадпрыемстваў і насельніцтва ўсёй Мінскай губерні. З Мінска былі эвакуіраваны 16 прадпрыемстваў і 942 найбольш кваліфікаваныя рабочыя.

К канцу восені 1915 года прамысловае жыццё ў горадзе замірае. У данясенні старшага фабрычнага інспектара Мінскай губерні адзначалася, што ў верасні «большасць прамысловых прадпрыемстваў ужо спынілася і толькі невялікая колькасць іх ва ўсходняй частцы губерні працягвае яшчэ працаваць паніжаным тэмпам. Рабочыя, колькасць якіх вельмі скарацілася, цэлымі партыямі кідаюць работу: хто адпраўляецца ў вёскі ратаваць свае сем'і і маёмасць, хто едзе ва ўнутраныя губерні, імкнучыся хутчэй выбрацца ў месцы больш спакойныя і не лічачыся з бедамі, якія чакаюць іх на новых месцах».

У пачатку 1916 года, калі фронт трывала стабілізаваўся, у прамысловасці Мінска зноў наступіла ажыўленне галоўным чынам за кошт аднаўлення і расшырэння вытворчасці на прадпрыемствах, што абслугоўвалі патрэбы фронту. У Мінскіх артылерыйскіх майстэрнях было занята звыш дзвюх тысяч, у майстэрні па рамонту паравозаў і вагонаў — 552, у галоўных майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі — 368, у чыгуначных майстэрнях Лібава-Роменскай чыгункі — 171 чалавек. Пачалі працаваць Цэнтральная механічная майстэрня,

металаапрацоўчы завод «Молат», вывезены з Польшчы, лесапільныя заводы, абойныя, тытунёвыя, пераплётныя, запалкавыя, папяросныя фабрыкі. Былі пушчаны ў ход усе сем гарбарных заводаў (некаторыя з іх нават павялічылі выпуск прадукцыі), большасць цукеркавых, шакаладных фабрык, каўбасных устаноў, крухмала-патачных заводаў. Расшырылі вытворчасць хлебапякарныя, сухарасушыльныя, дрожджа-вінакурныя заводы, пашывачныя ўстановы. Быў арганізаваны масавы пашыў салдацкай бялізны і абмундзіравання з казённых матэрыялаў на даму. Усерасійскі земскі саюз адкрыў у Мінску кравецка-пашывачную майстэрню, у якой працаваў 451 чалавек.

Многія тысячы рабочых былі заняты ў арганізацыях земскага і гарадскога саюзаў, на будаўніцтве чыгунак. Таму, хоць колькасць фабрычна-заводскіх рабочых у гады вайны зменшылася, агульная колькасць рабочага класа ў Мінску ўзрасла. У сакавіку 1917 года ў горадзе налічвалася каля 30 тысяч рабочых.

З канца 1916 года пачасціліся перабоі ў рабоце ваеннай прамысловасці ў выніку транспартных цяжкасцей, адсутнасці сыравіны і паліва. Многія прадпрыемствы вымушаны былі часткова або поўнасцю спыняць работу.

Вайна зрабіла згубны ўплыў на становішча рамесных майстэрняў. Колькасць рамеснікаў скарацілася. Многія з іх разарыліся, былі мабілізаваны ў армію, тыя ж, што засталіся, выконвалі ваенныя заказы, трапілі ў падначаленне буйных фабрыкантаў і фактычна перайшлі на становішча хатніх рабочых.

Вайна парушыла гандлёвае жыццё Мінска. У гэтыя гады насельніцтва горада павялічылася амаль у два разы — галоўным чынам за кошт бежанцаў, войск і ваенных устаноў. У Мінску размяшчалася 25 шпіталяў, у якіх знаходзілася на вылечванні каля дзевяці тысяч параненых.

Наяўнасць велізарнай масы людзей вельмі пагоршыла жыллёва-санітарнае і харчовае становішча горада. З пачаткам вайны ўвоз тавараў у Беларусь з цэнтральных раёнаў Расіі амаль поўнасцю спыніўся. Цэны на прадукты харчавання да вясны 1915 года павялічыліся ў тры-чатыры разы, а да пачатку 1917 года — у пяць-восем разоў.

Рэзкае скарачэнне падвозу прадуктаў, нястрымнае павышэнне цэн, спекуляцыя ў 1915 годзе так пагоршылі харчовае становішча Мінска, што перад ваеннымі і цывільнымі ўладамі паўстала пытанне аб арганізацыі цэнтралізаванага забеспячэння горада і губерні. Была створана Мінская губернская харчовая камісія пад старшынствам намесніка Скірмунта. У абавязак камісіі ўваходзіла арганізацыя закупак вялікіх партый мукі, збожжа, солі, цукру, чаю, запалак, мануфактуры і іншых тавараў і дастаўка іх у губерню. Аднак камісія

дрэнна спраўлялася са сваімі абавязкамі. У верасні 1916 года яна закупіла ў Кіеўскай губерні партыю мукі праз нейкага камісіянера Троцкага. Аднак, калі мука была дастаўлена ў Мінск, аказалася, што яна зусім непрыгодна для ўжывання. Члены камісіі самі былі замешаны ў спекуляцыйных махінацыях.

Становішча ўскладнялася таксама бюракратызмам, прадажнасцю і безадказнасцю чыноўнікаў цэнтральных і мясцовых органаў улады. Напрыклад, у верасні 1916 года міністр земляробства (які з'яўляўся ў той жа час старшынёй Асобай нарады) забараніў увоз у Беларусь мукі, а ў красавіку — цукру, спасылаючыся на тое, што іх не хапае для арміі.

У той жа час спекулянты атрымалі 33 вагоны цукру-рафінаду, які яны адкрыта прадавалі ў горадзе па спекуляцыйных цэнах. Летам 1915 года мінскі купец Гірш Дрэйцар закупіў на Украіне сем вагонаў мукі і пяць вагонаў пшанічнага вотруб'я, якімі адкрыта спекуляваў у горадзе. Між тым цэнтралізаванае забеспячэнне Мінска было пастаўлена дрэнна. У жніўні 1916 года замест неабходных 1290 вагонаў грузаў у горад было дастаўлена толькі 420 вагонаў. Становішча з харчаваннем ускладнялася яшчэ тым, што сельская гаспадарка Беларусі, падарваная вайной, не магла даць гораду значнай колькасці прадуктаў. З другога боку, памешчыкі і гандляры, якія мелі запасы збожжа, наўмысна не пускалі яго ў продаж, спадзеючыся на яшчэ большае павышэнне цэн.

У канцы 1916 — пачатку 1917 года спекуляцыя прыняла нябачаныя памеры. Буржуазная газета «Минская мысль» пісала ў лютым 1917 года, што спекулянты, гандляры, памешчыкі, прадпрыемцы «хаваюць рашуча ўсё: муку, рыбу, цукар, чай, масла, яйкі і інш. Хаваюць медзь, свінец, жалеза, вугаль, нафту, дровы, сукно, паперу і г. д. Гэта ўсерасійская гульня ў хованкі вядзецца пад дэвізам: «цяпер дорага, заўтра яшчэ даражэй будзе». Мясцовыя губернскія ўлады і органы гарадскога самакіравання спрабавалі спачатку неяк змагацца з растучай дарагоўляй, спекуляцыяй і адвольным узвінчваннем цэн. Аднак тут жа высветлілася поўнае банкруцтва прынятых мер. Буйныя памешчыкі, спекулянты-перакупшчыкі, гандляры не падпарадкаваліся распараджэнням улады.

Харчовае становішча Мінска станавілася катастрафічным, забеспячэнне было дэзарганізавана. Калі ў студзені 1916 года ў Мінск было дастаўлена 224 тысячы пудоў мукі, то ў жніўні — толькі 45 тысяч пудоў. У снежні ў горад прыбыло ўсяго 6 вагонаў мукі, у той час як штомесячная норма складала не менш як 200 вагонаў.

Да харчовага неўзабаве далучыўся паліўны голад. Запасаў паліва ў горадзе не было, для ацяплення ж на працягу зімы трэба было не менш як 50 тысяч кубічных сажняў дроў. З гэтай колькасці

ў Мінск было дастаўлена толькі 2 тысячы сажняў, і то толькі на зыходзе зімы. Цана дроў узрасла з 20 да 150 рублёў за кубічны сажань.

Бядоты і нягоды вайны асноўным сваім цяжарам клаліся на плечы працоўных.

4. Рэвалюцыйны рух

У гады вайны эксплуатацыя рабочага класа неймаверна ўзрасла. Рабочы дзень на большасці прадпрыемстваў павялічыўся да 14—16 гадзін у суткі. На фабрыках і заводах дзейнічаў ваенна-каторжны рэжым. Рэзка пашырылася выкарыстанне працы жанчын і дзяцей.

У выніку росту дарагоўлі на прадукты харчавання, паліва, адзенне пакупная здольнасць грошай хутка падала, у той час як намінальная заработная плата рабочых заставалася ранейшай або павысілася ўсяго на 10—15 працэнтаў.

Жорсткая эксплуатацыя працоўных мас, эканамічная разруха і голад, паражэнні на фронце — усё гэта ўзмацняла рэвалюцыйны рух у тыле і на фронце. У авангардзе рэвалюцыйнай барацьбы ішоў рабочы клас. Шавіністычны экстаз захапіў у пачатку вайны толькі нязначную, найбольш адсталую частку рабочых. У цэлым пралетарыят не паддаўся шавіністычнай прапагандзе. «Адзіным класам у Расіі,— пісаў У. І. Ленін,— якому не ўдалося прывіць заразы шавінізму, з'яўляецца пралетарыят» [1].

Акрыяўшы ад удараў рэакцыі, рабочы клас неўзабаве перайшоў у наступленне. Калі ў 1914 годзе (з пачатку вайны) у Расіі, паводле зменшаных афіцыяльных даных, баставала каля 35 тысяч рабочых, то ў 1915 — больш за 500 тысяч, а ў 1916 годзе — звыш мільёна рабочых.

Пад уплывам падзей, якія адбываліся ў буйнейшых пралетарскіх цэнтрах, нарастаў рабочы рух у Беларусі. Толькі ў 1915 годзе тут адбылося каля 100 стачак, у якіх прымалі ўдзел тысячы рабочых. Аднак рабочы рух у Мінску ў гады вайны быў слабы. Адчуліся разладжанасць і скарачэнне прамысловасці, мабілізацыя ў армію найбольш энергічнай, кадравай часткі рабочых, якія прайшлі школу класавай барацьбы. З другога боку, барацьба рабочых у Беларусі неймаверна ўскладнялася з прычыны блізкасці фронту, суровага рэжыму ваеннага становішча, наяўнасці ў гарадах велізарнай колькасці войск. Царскі ўрад прымаў бязлітасныя меры для падаўлення рэвалюцыйных выступленняў, асабліва ў прыфрантавой паласе.

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 21, стар. 289.

У Мінску, як і ў іншых гарадах Беларусі, дзейнічала сакрэтнае прадпісанне паліцыі аб увядзенні строгага нагляду за фабрыкамі і заводамі, аб забароне сходаў і дэманстрацый. Асабліва заўзята царскія шпікі палявалі за падпольнымі бальшавіцкімі арганізацыямі. У першыя дні вайны былі разгромлены сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Брэсце і іншых гарадах. Жорсткімі рэпрэсіямі, масавымі арыштамі, ваенна-палявымі судамі царскі ўрад разлічваў «ачысціць» прыфрантавую паласу ад рэвалюцыйных элементаў, падавіць волю мас да арганізаванага пратэсту, абезгаловіць кіраўніцтва рухам і галоўнае — захаваць армію ад рэвалюцыйнага ўплыву.

Аднак, нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, бальшавіцкая партыя не спыняла рэвалюцыйнай работы сярод мас. Бальшавікі растлумачвалі рабочым і салдатам імперыялістычны характар і грабежніцкія мэты вайны, рыхтавалі масы да барацьбы за звяржэнне самадзяржаўя, за ператварэнне імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую.

Летам 1915 года аднавіла сваю дзейнасць Мінская арганізацыя РСДРП. На першым жа сваім сходзе бальшавікі прынялі рэзалюцыю, якая заклікала рабочых да стачак. Мінская арганізацыя РСДРП устанавіла сувязі з маскоўскай арганізацыяй бальшавікоў. Восенню 1915 года яна накіравала ў Мінск свайго прадстаўніка, які выступіў на нелегальным сходзе з дакладам аб задачах партыйнай работы ў абстаноўцы вайны.

У 1915 годзе ў Мінску дзейнічала таксама латышская сацыял-дэмакратычная група, актыўнымі членамі якой былі бальшавікі К. І. Ландэр, Л. П. Разаўскі і інш. У пачатку 1916 года В. Г. Кнорын стварыў бальшавіцкую партыйную арганізацыю ў 32-м эвакапункце, які быў размешчаны ў Мінску. Летам гэтага ж года бальшавіцкая група была створана ў гаспадарчым аддзеле земскага і гарадскога саюзаў. Царская жандармерыя паведамляла ў лютым 1917 года, што «інтэрнат для служачых ВЗС у гор. Мінску ўяўляў сабой ачаг рэвалюцыйнай прапаганды».

Бальшавікам у гады вайны даводзілася працаваць не толькі ў абстаноўцы жорсткіх праследаванняў і рэпрэсій з боку царскай паліцыі і жандармерыі, але і ва ўмовах жорсткай барацьбы супраць бундаўцаў, меншавікоў, эсэраў, нацыяналістаў, якія выступалі за «класавы мір», за саюз з царызмам і буржуазіяй. Хоць бальшавіцкія арганізацыі Мінска былі яшчэ слабыя і малалікія, яны праводзілі актыўную рэвалюцыйную агітацыю ў рабочым і салдацкім асяроддзі. На прадпрыемствах, у казармах распаўсюджваліся лістоўкі і адозвы, бальшавіцкія газеты. У верасні 1914 года ў адной з лістовак бальшавікі растлумачвалі масам імперыялістычны характар вайны,

заклікалі салдат павярнуць зброю супраць ворагаў народа. У лістападзе антываенная агітацыя вялася сярод салдат 2-га запаснога батальёна.

17 сакавіка 1915 года ля варот станцыі Таварная ў Мінску паліцыя знайшла мноства экземпляраў адозвы «Да салдат», выпушчанай ЦК РСДРП Латышскага краю. 6 красавіка ў горадзе зноў былі раскіданы адозвы «Да салдат». Праз два дні вялікая колькасць тых жа лістовак была знойдзена ў размяшчэнні 375-й пяхотнай Віцебскай дружыны ў Мінску. Летам і восенню 1915 года сярод рабочых Мінска шырока распаўсюджвалася бальшавіцкая «Наша газета», якая выходзіла ў Саратаве.

Бальшавікі выкарыстоўвалі ўсякую магчымасць для палітычнай работы ў масах. У красавіку 1916 года царскай ахранцы ўдалося ўстанавіць, што на Прэабражэнскай вуліцы ў сталовай «рэвалюцыйна настроеныя асобы» распаўсюджваюць сярод рабочых палітычную літаратуру, праводзяць тайныя сходы, абмяркоўваюць праграмныя патрабаванні РСДРП.

Для рэвалюцыйнай работы бальшавікі выкарыстоўвалі прафесіянальныя саюзы, бальнічныя касы і інш. Рэвалюцыйная агітацыя і прапаганда ў 1915 годзе асабліва актыўна вялася ў прафсаюзах друкароў, дрэваапрацоўшчыкаў, краўцоў, шаўцоў, прыказчыкаў у Мінску, Гомелі, Віцебску і іншых гарадах. У лютым 1915 года на нарадзе ўпаўнаважаных Мінскай бальнічнай касы пад уплывам бальшавікоў была прынята рэзалюцыя пратэсту «супраць недапушчэння ўладальнікамі прадпрыемстваў арганізацыі рабочымі сходаў» і ўнесена прапанова аб змяненні некаторых пунктаў статута касы, якія ўшчэмлівалі правы рабочых.

Партыя бальшавікоў надавала велізарнае значэнне рэвалюцыйнай рабоце ў Беларусі. Тут знаходзіўся Заходні фронт з двума мільёнамі салдат, адсюль ішлі прамыя найкарацейшыя шляхі да галоўных палітычных і рэвалюцыйных цэнтраў краіны — Петраграда і Масквы. На Заходні фронт Цэнтральны Камітэт партыі накіроўваў лепшых сваіх работнікаў. У канцы красавіка 1916 года ў Беларусь прыбыў таленавіты арганізатар бальшавік-ленінец Міхаіл Васільевіч Фрунзе. У Мінску Фрунзе сустрэўся з таварышам па падпольнай рабоце бальшавіком І. Е. Любімавым, які кіраваў гаспадарчым аддзелам камітэта Усерасійскага земскага саюза Заходняга фронту. З яго дапамогай Фрунзе пад прозвішчам Міхайлава ўладкаваўся на службу на пасаду статыстыка камітэта.

З прыездам Фрунзе рэвалюцыйная работа ў Беларусі значна актывізавалася. Пад яго кіраўніцтвам была створана ініцыятыўная група бальшавікоў, у якую ўваходзілі такія відныя дзеячы, як Любімаў, Мяснікоў (Мяснікян), Крывашэін, Магілеўскі. Група склала

асноўнае кіруючае бальшавіцкае ядро, якое стала цэнтрам усёй рэвалюцыйнай работы ў Мінскай губерні. У Мінску знаходзіліся штаб Заходняга фронту, шматлікія тылавыя і грамадзянскія ваенныя ўстановы, якія абслугоўвалі фронт. У ваенных майстэрнях працавалі тысячы рабочых, значная частка якіх была мабілізавана царызмам з прамысловых цэнтраў Расіі. Многія з іх раней прымалі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях і цяпер з'яўляліся моцнай апорай бальшавікоў.

М. В. Фрунзе разам з А. Ф. Мясніковым і іншымі падпольшчыкамі шмат часу і сіл аддаваў умацаванню і стварэнню новых бальшавіцкіх арганізацый. К пачатку 1917 года Фрунзе стаяў на чале буйной падпольнай рэвалюцыйнай арганізацыі з цэнтрам у Мінску, якая мела свае аддзяленні ў III і X арміях Заходняга фронту.

Бальшавіцкія арганізацыі Беларусі падтрымлівалі сувязь з Петраградскім і Маскоўскім камітэтамі партыі і Цэнтральным Камітэтам РСДРП. У жніўні 1916 года ў Мінск прыязджаў стары бальшавік Н. Г. Палятаеў.

Царскі ўрад прыкладаў велізарныя намаганні для барацьбы з рэвалюцыйным падполлем. Напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі паліцыі ўдалося з дапамогай правакатара Раманава высветліць, хто скрываецца пад прозвішчам Міхайлава. Камандуючы арміямі Заходняга фронту генерал Эверт распарадзіўся арыштаваць Фрунзе. Аднак гэтаму перашкодзіла Лютаўская рэвалюцыя.

5. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя

27 лютага 1917 года пад ударамі паўстаўшых народных мас царскае самадзяржаўе рухнула. Перамога буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Петраградзе і іншых буйнейшых цэнтрах краіны, пераход арміі на бок народа абумовілі паспяховае пашырэнне рэвалюцыі па ўсёй Расіі. У Мінску аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе стала вядома 1 сакавіка 1917 года. У ноч з 1 на 2 сакавіка была склікана экстраная нарада ініцыятыўнай групы бальшавікоў Мінска, а таксама прадстаўнікоў III і X армій, на якой прысутнічалі М. В. Фрунзе, В. Г. Кнорын, К. І. Ландэр і іншыя. Было прынята рашэнне аб неадкладнай арганізацыі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, мабілізацыі ўсіх рэвалюцыйных сіл для падтрымкі Петраграда. Бальшавікі выйшлі з падполля і адкрыта разгарнулі рэвалюцыйную работу ў масах. У горадзе ствараюцца ўзброеныя дружыны рабочых.

Раніцай 4 сакавіка ў Мінску адбыўся першы легальны сход бальшавікоў горада і прадстаўнікоў партыйных арганізацый III і X армій

Заходняга фронту. З дакладам «Аб бягучым моманце і задачах пралетарыяту» выступіў М. В. Фрунзе. Сход прыняў рашэнне аб разгортванні на прадпрыемствах і ў воінскіх часцях работы па выбарах дэпутатаў у Мінскі Савет. Тут жа быў зацверджаны спіс кандыдатаў бальшавіцкай фракцыі, якая павінна была ўвайсці ў Савет. У гэты ж дзень, 4 сакавіка, Савет рабочых дэпутатаў быў створаны. Савет пачаў выдаваць свой друкаваны орган — «Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов». Адным з рэдактараў газеты стаў М. В. Фрунзе.

У лік арганізатараў і кіраўнікоў Савета ўваходзілі Фрунзе, Позерн, Любімаў, Рэшатаў, Хватаў, Крывашэін, Фішгендлер, Гурэвіч і інш. Савет рабочых дэпутатаў выбраў часовы выканком, старшынёй якога спачатку быў інтэрнацыяналіст-міжраёнец В. П. Позерн, а яго намеснікам — бальшавік І. Е. Любімаў. Пазней Любімаў стаў старшынёй Савета.

5 сакавіка 1917 года ў сталовай служачых земскага Саюза адбыўся другі сход Мінскага Савета рабочых дэпутатаў. На ім прысутнічала 68 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 9180 рабочых ад 23 прадпрыемстваў. Сход аднагалосна пастанавіў паслаць прывітанне Петраградскаму і Маскоўскаму Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў, для аховы рэвалюцыйнага парадку стварыць міліцыю, начальнікам якой зацвердзіць Фрунзе.

З заявай на сходзе Савета выступіў М. В. Фрунзе. Ён указаў на неабходнасць правядзення ўсенароднай маніфестацыі, назначанай на 6 сакавіка.

Пры стварэнні Мінскага Савета ў ім з самага пачатку арганізавалася бальшавіцкае ядро, куды ўвайшлі М. В. Фрунзе, І. Е. Любімаў, С. Г. Магілеўскі, К. І. Ландэр і інш. Аднак да чэрвеня 1917 года ў Мінскім Савеце яшчэ не было асобнай бальшавіцкай фракцыі, а была агульная сацыял-дэмакратычная фракцыя.

У ноч на 5 сакавіка атрады баявой рабочай дружыны і салдат пад кіраўніцтвам Фрунзе раззброілі царскую паліцыю і жандармерыю. Зброя і памяшканні паліцыі і жандараў былі перададзены ў распараджэнне народнай міліцыі, якая ўзяла пад сваю ахову гарадскія ўстановы, пошту і тэлеграф. 6 сакавіка ў горадзе адбылася грандыёзная маніфестацыя працоўных і салдат Мінскага гарнізона, якая вылілася ў сапраўднае свята народа, які скінуў ланцугі самадзяржаўнага рабства. Дэманстранты ішлі па вуліцах з чырвонымі сцягамі і лозунгамі: «Няхай жыве ўлада рабочых і салдат!», «Няхай жыве рэвалюцыйная армія!»

Пад націскам мас грамадзянскі камендант Мінска В. Самойленка вымушаны быў зацвердзіць Фрунзе на пасадзе начальніка гарадской міліцыі. Бальшавікі Мінска разгарнулі энергічную работу па

ўцягненню ў яе рады найбольш стойкіх і адданых справе рэвалюцыі рабочых і салдат. Да 15 сакавіка ў Мінску былі створаны пяць аддзяленняў народнай міліцыі і міліцэйскія ўчасткі на буйных прадпрыемствах. Міліцыя дзялілася на кадравую, якая знаходзілася на дзяржаўным утрыманні, і рэзервавую, якая складалася з узброеных рабочых. На фабрыках і заводах арганізоўваліся рабочыя дружыны, якія прадстаўлялі сабой атрады Чырвонай гвардыі ў Беларусі.

Стварэнне народнай міліцыі мела велізарнае значэнне для далейшага развіцця рэвалюцыі. У. І. Ленін указваў, што гэта мера мае гіганцкае, рашаючае значэнне: «Рэвалюцыя не можа быць гарантавана, поспех яе заваёў не можа быць забяспечаным, далейшае развіццё яе *немагчыма*, калі гэта мера не стане ўсеагульнай, не будзе даведзена да канца і праведзена ва ўсёй краіне» [1].

Народная міліцыя падтрымлівала рэвалюцыйны парадак у горадзе. Яна вяла барацьбу са спекуляцыяй і сабатажам буржуазіі. У сувязі з пагаршэннем харчовага становішча Фрунзе 9 сакавіка 1917 года аддаў міліцыі загад аб строгай забароне вывазу з Мінска прадметаў першай неабходнасці. Па ініцыятыве М. В. Фрунзе быў установлены рабочы кантроль над вытворчасцю і гандлем. На міліцыю ўскладаліся абавязкі весці назіранне за размеркаваннем хлеба і іншых прадуктаў харчавання.

Побач з Саветам рабочых дэпутатаў у Мінску ўтварыўся Савет салдацкіх дэпутатаў. Выбары ў Савет салдацкіх дэпутатаў адбываліся ў часцях Мінскага гарнізона з 4 па 6 сакавіка 1917 года. 8 сакавіка адбылося сумеснае пасяджэнне Савета рабочых і Савета салдацкіх дэпутатаў, дзе было вырашана стварыць адзіны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ад бальшавікоў у Савет былі выбраны М. В. Фрунзе, І. Е. Любімаў і інш.

Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў стаў неўзабаве арганізуючым цэнтрам рэвалюцыйнага руху не толькі Беларусі, але і ўсяго Заходняга фронту. Непасрэдны ўдзельнік гэтых падзей бальшавік І. Е. Любімаў аб гэтым пісаў так: «Ужо з самых першых дзён рэвалюцыі спачатку з часцей, што знаходзіліся паблізу, а затым і з самага фронту ў Мінскі Савет пачалі валам валіць салдацкія і афіцэрскія дэлегацыі: за літаратурай, за ўказаннямі, для разбору канфліктаў, за вырашэннем розных пытанняў. Прывозілі арыштаваных афіцэраў, палкоўнікаў, генералаў. Мінскі Савет стаў арганізуючым цэнтрам усяго фронту».

Аднак у першыя дні пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі палітычная і рэвалюцыйная лінія выканкома Мінскага Савета была няўстойлівай. Гэта тлумачылася тым, што ў Савет праніклі меншавікі,

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 24, стар. 150.

бундаўцы, эсэры, нацыяналісты, якія не кідалі спроб захапіць кіраўніцтва Саветам і ператварыць яго ў прыдатак Часовага ўрада. Меншавікі і бундаўцы выступалі за поўную падтрымку палітыкі Часовага ўрада, дабіваліся раззбраення рабочых дружын. Пад іх націскам выканком прымаў рашэнні, якія нярэдка падтрымлівалі згодніцкую і абарончую палітыку, выказваўся за падтрымку Часовага ўрада. Выканком сумесна з Саюзам афіцэраў надрукаваў нават абарончую лістоўку з заклікам да працягвання вайны.

Асабліва непрымірымую антырэвалюцыйную пазіцыю займалі бундаўцы.

Газета «Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов», якая знаходзілася пад уплывам бальшавікоў, пастаянна ўказвала на памылкі кіраўнікоў выканкома Савета, неаднаразова востра крытыкавала пазіцыю згодніцкіх партый.

Бальшавікам даводзілася весці барацьбу ў даволі складаных умовах. Іх дзейнасць ускладнялася тым, што яны дзейнічалі не самастойна. Яшчэ 9 сакавіка 1917 года ў Мінску адбыўся агульны сход бальшавікоў, меншавікоў, бундаўцаў і латышскіх сацыял-дэмакратаў. Сход прыняў рашэнне аб арганізацыі аб'яднанай арганізацыі РСДРП. Быў выбраны аб'яднаны камітэт, у склад якога ад бальшавікоў увайшоў Фрунзе.

Палітыка «аб'яднанкі» не мела адзінага напрамку, антырэвалюцыйная сутнасць згодніцкіх партый станавілася ўсё больш выразнай, што рабіла для бальшавікоў немагчымым далейшае знаходжанне ў аб'яднанай арганізацыі. Толькі ў чэрвені 1917 года бальшавікі арганізавана парвалі са згоднікамі і выйшлі з «аб'яднанкі», утварыўшы самастойную арганізацыю — Мінскі камітэт бальшавікоў. Старшынёй камітэта стаў А. Ф. Мяснікоў.

У першыя ж дні пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі побач з Саветамі рабочых і салдацкіх дэпутатаў узніклі органы буржуазна-памешчыцкай улады ў асобе буржуазных камітэтаў і губернскіх і павятовых камісараў Часовага ўрада. Буржуазія ліхаманкава збірала сілы, спяшаючыся на месцах захапіць уладу ў свае рукі. 3 сакавіка ў 11 гадзін вечара ў Мінску дзеячамі губернскай земскай управы і гарадской думы сумесна з меншавікамі, эсэрамі і беларускімі нацыяналістамі была склікана экстраная нарада, якая выбрала старшыню губернскай управы кадэта Самойленку грамадзянскім камендантам горада. У той жа дзень галоўнакамандуючы Заходнім фронтам генерал Эверт афіцыяльна зацвердзіў Самойленку на пасадзе каменданта. 4 сакавіка пры грамадзянскім каменданце Мінска быў створаны з прадстаўнікоў буржуазіі і памешчыкаў так званы «Часовы грамадскі камітэт парадку», які ўстанавіў сувязь з Часовым урадам у Петраградзе.

У сакавіку 1917 года пасады губернатара і віцэ-губернатара ў Мінскай губерні былі ліквідаваны. Адміністрацыйнае кіраванне губерняй перайшло ў рукі губернскага камісара Часовага ўрада, абавязкі якога ўскладаліся на старшыню губернскай земскай управы Самойленку. Функцыі мінскага гарадскога камісара Часовага ўрада перадаваліся гарадскому галаве С. Хржанстоўскаму.

Такім чынам, у Мінску, як і па ўсёй краіне, усталявалася двоеўладдзе. Галоўнай апорай буржуазных органаў улады з'яўляліся эсэры, бундаўцы, меншавікі, нацыяналісты. Буржуазныя органы ўлады павялі актыўную барацьбу за кіраўніцтва міліцыяй. Хоць фармальна міліцыя лічылася ў падначаленні гарадской думы, дзе верхаводзіла буржуазія разам са згоднікамі, фактычна яна думе не падпарадкоўвалася, таму што яе начальнік М. В. Фрунзе кіраваўся ў сваіх дзеяннях указаннямі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Неаднаразовыя спробы мінскага губернскага камісара ўзяць міліцыю пад свой кантроль натыкаліся на рашучае процідзеянне з боку Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Перад бальшавіцкімі арганізацыямі ў гэты перыяд стаяла важнейшая неадкладная задача — арганізацыя і выхаванне рабочага класа, згуртаванне ўсіх рэвалюцыйных сіл. Пераадольваючы раздробленасць рабочых, уплыў на іх дробнабуржуазнай, нацыяналістычнай ідэалогіі, бальшавікі разгарнулі ўзмоцненую палітычную работу па арганізацыі мас.

9 сакавіка агульны сход Мінскага Савета і рабочых горада па прапанове бальшавікоў прыняў пастанову аб неадкладнай арганізацыі фабрычна-заводскіх камітэтаў, прафесіянальных саюзаў і палітычных клубаў, а таксама вясковых валасных і павятовых сялянскіх камітэтаў. У Мінску пачалі дзейнічаць прафесіянальныя саюзы чыгуначных рабочых, металістаў, друкароў, краўцоў, шаўцоў, пекараў, сталяроў, рабочых тытунёвых фабрык, прыказчыкаў, гандлёва-прамысловых служачых. На працягу сакавіка — красавіка ў горадзе ўжо было арганізавана каля 20 прафсаюзаў, якія аб'ядноўвалі звыш 10 тысяч рабочых і служачых.

Накіроўваючы работу прафсаюзаў, бальшавікі павялі барацьбу за паляпшэнне становішча рабочых. 17 сакавіка на шматлюдным сходзе Мінскага Савета з удзелам рабочых і салдат па ініцыятыве бальшавікоў была прынята пастанова аб увядзенні на прадпрыемствах 8-гадзіннага рабочага дня без змяншэння зарплаты. Звышурочныя работы дазвалялiся толькі са згоды рабочых арганізацый і за палутарную плату.

Прадметам асаблівых клопатаў Часовага буржуазнага ўрада з'яўляўся Заходні фронт. Вышэйшае ваеннае камандаванне і генералітэт прымалі ўсе меры да таго, каб захаваць армію фронту ў сваіх

руках, не даць магчымасці ўцягнуць салдацкія масы ў палітычную барацьбу. На Заходнім фронце ўрад сканцэнтраваў вялікую колькасць адданых яму часцей — ударных батальёнаў, «батальёнаў смерці», казацкіх дывізій і г. д. Буржуазія навадніла фронт сваімі газетамі («Русское слово», «Биржевые ведомости», «Речь» і інш.). На Заходнім фронце былі сканцэнтраваны вялікія групы буржуазных агітатараў, у тым ліку члены Дзяржаўнай думы, члены ЦК партыі кадэтаў. Ім старанна дапамагалі меншавікі і эсэры. З сакавіка ў Мінск прыязджаў ваенны міністр Часовага ўрада Гучкоў.

Буржуазіі аказвалі ўсякую падтрымку беларускія нацыяналісты. У першай палове сакавіка ў Мінску актывізавалася дзейнасць «Беларускай сацыялістычнай грамады». У той жа час у Маскве ўзнікла «Беларуская народная рада», якая складалася з контррэвалюцыйных буржуазных нацыяналістаў. У канцы сакавіка 1917 года па ініцыятыве БСГ быў скліканы так званы «Беларускі нацыянальны з'езд», на які з'ехаліся прадстаўнікі буржуазіі, памешчыкаў і кулацтва. З'езд выказаўся за падтрымку Часовага ўрада і працяг імперыялістычнай вайны. На з'ездзе быў створаны кіруючы контррэвалюцыйны цэнтр — «Беларускі нацыянальны камітэт».

У абстаноўцы, што склалася, бальшавікам давялося затраціць нямала намаганняў, каб заваяваць масы на свой бок. Ва ўпартай барацьбе са згоднікамі бальшавікі правялі ў Мінскім Савеце сваю лінію па пытанню арганізацыі арміі на дэмакратычных асновах. На пасяджэнні 8 сакавіка Мінскі Савет у адпаведнасці з загадам № 1 Петраградскага Савета, які паклаў пачатак дэмакратызацыі арміі, прыняў пастанову аб стварэнні ў воінскіх часцях салдацкіх камітэтаў — ротных, батальённых, палкавых, эскадронных, дывізіённых, армейскіх. Салдацкія камітэты былі абавязаны па ўсіх палітычных пытаннях падпарадкоўвацца Мінскаму Савету, а па ваенных пытаннях — армейскім уладам.

19 сакавіка Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў па прапанове бальшавікоў прыняў рашэнне аб арганізацыі франтавога камітэта. Савет пастанавіў таксама склікаць з'езд прадстаўнікоў салдат Заходняга фронту, які павінен быў абмеркаваць пытанне аб арганізацыі арміі на дэмакратычных асновах, зацвердзіць статут салдацкіх арганізацый і выбраць франтавы камітэт. Мэта гэтых мерапрыемстваў — рэвалюцыянізацыя арміі, арганізацыя ўсіх дэмакратычных сіл фронту для замацавання і паглыблення рэвалюцыі.

РАЗДЗЕЛ XI

КУЛЬТУРА І АСВЕТА У МІНСКУ

(другая палова XIX — пачатак XX стагоддзя)

1. Народная асвета

Парэформеннае развіццё капіталізму і звязаных з ім новых грамадска-эканамічных адносін паслужыла асновай далейшага развіцця асветы і культуры ў Беларусі.

Праведзеная царскім урадам у пачатку 60-х гадоў школьная рэформа стварыла ўмовы для больш шырокага развіцця народнай асветы ў Расіі. Школа аб'яўлялася бессаслоўнай; навучальныя ўстановы розных ведамстваў перайшлі ў большасці сваёй у веданне Міністэрства народнай асветы. Расшырыліся правы мясцовага самакіравання і сельскіх таварыстваў па адкрыццю школ; для кіравання школамі на месцах ствараліся губернскія дырэкцыі народных вучылішчаў і вучылішчныя саветы. Былі адменены цялесныя пакаранні вучняў. Атрымалі развіццё пачатковыя школы новага тыпу — народныя вучылішчы.

Аднак у беларускіх губернях пад уплывам паўстання 1863 года школьная рэформа была зменена ва ўгоду рэакцыйнай палітыцы царызму. Школьная справа тут рэгламентавалася асобымі «Часовымі правіламі для народных школ». Згодна з гэтымі «Правіламі», народная асвета ў Беларусі знаходзілася пад асабліва строгім кантролем урада і царквы, а сама школа ператворана ў зброю палітыкі русіфікацыі насельніцтва, праводзімай пад флагам барацьбы з паланізацыяй і каталіцызмам. Былі закрыты ўсе польскія школы, якія існавалі раней на тэрыторыі Беларусі, а таксама ўсе прыватныя вучылішчы. Строга забаранялася вывучэнне ў школах не толькі польскай, але і беларускай мовы, якую

царскія чыноўнікі лічылі «прадуктам паланізацыі». Мясцовых настаўнікаў каталіцкага веравызнання ўлады звольнілі, лічачы іх памякамі, а на іх месца запрашаліся «добранадзейныя асобы» з рускіх губерняў. Распараджэннем папячыцеля Віленскай навучальнай акругі ўсім настаўнікам ставілася ў абавязак сачыць за тым, каб вучні ў сценах навучальных устаноў размаўлялі толькі на рускай мове. Уся сістэма навучання строілася так, каб выхоўваць вучняў у духу адданасці цару і пакорлівасці ўладам. За паводзінамі вучняў, асабліва ў сярэдніх навучальных установах і вучылішчах, размешчаных у гарадах, быў установлены строгі паліцэйскі нагляд.

Аднак цяга насельніцтва да адукацыі, звязаная з аб'ектыўным працэсам грамадска-эканамічнага развіцця, узмацнялася. Таму, нягледзячы на рэакцыйныя меры царскіх улад, сетка навучальных устаноў у Мінску паступова расшыралася, колькасць вучняў у іх павялічвалася, хоць і далёка недастаткова.

Паступова расшыралася пачатковае навучанне. У 70-х гадах арганізуюцца навучальныя ўстановы новага тыпу — гарадскія вучылішчы, заснаваныя «Палажэннем аб гарадскіх вучылішчах 1872 года». Гэтыя вучылішчы былі адно-, двух-, трох- і чатырохкласнымі. У Мінску да 1881 года налічвалася 12 ніжэйшых навучальных устаноў: пяць гарадскіх вучылішч, два вучылішчы духоўнага (праваслаўнага) ведамства і пяць прыватных яўрэйскіх вучылішч тыпу пачатковай школы. У іх займалася 1149 вучняў.

Пачатковыя школы Мінска знаходзіліся ў надзвычай дрэнных матэрыяльных умовах. Яны размяшчаліся ў цесных памяшканнях. Гарадскія ўлады адпускалі на патрэбы школ нікчэмныя грошы. Большасць дзяцей школьнага ўзросту, асабліва дзяцей гарадской беднаты, заставалася за межамі школы.

Амаль усе школы былі агульнаадукацыйнымі. Існавала толькі адно рамеснае вучылішча, а таксама два рамесных аддзяленні пры пачатковых яўрэйскіх мужчынскай і жаночай школах.

Надзвычай марудна развівалася ў Мінску сярэдняя адукацыя. У перыяд рэформы ў горадзе былі мужчынская гімназія і духоўная семінарыя. Мінская мужчынская гімназія, як і большасць гімназій Паўночна-Заходняга краю, адносілася да тыпу класічных, у навучальных планах і праграмах якіх пераважнае месца адводзілася такім прадметам, як «закон божы», лацінская і грэчаская мовы. У 1868 годзе ў Мінску адкрылася жаночая гімназія.

У гэтых трох навучальных установах у 1868 годзе навучаліся 567 чалавек. У большасці сваёй гэта былі дзеці дваран, чыноўнікаў і духавенства.

У пачатку 70-х гадоў у краіне адкрываюцца сярэднія навучальныя ўстановы новага тыпу — рэальныя вучылішчы. Курс навучання

ў іх, паводле слоў міністра народнай асветы Д. А. Талстога, прыстасоўваўся «да спецыяльных патрэбнасцей розных родаў прамысловасці і гандлю». У Мінску рэальнае вучылішча было адкрыта ў 1880 годзе.

У 1887 годзе міністр народнай асветы Дзелянаў выдаў славуты цыркуляр аб «кухаркіных дзецях», якім прадпісвалася не прымаць у гімназіі «дзяцей кучараў, прачак, дробных крамнікаў і да т. п.» У сувязі з гэтым цыркулярам перад дзецьмі працоўных дзверы сярэдніх навучальных устаноў, у тым ліку і рэальных вучылішчаў, аказаліся закрытымі. Прыток вучняў у сярэднія навучальныя ўстановы адразу ж скараціўся. Калі ў 1885 годзе ў дзвюх гімназіях, рэальным вучылішчы і духоўнай семінарыі Мінска займалася 1337 чалавек, то ў 1898 годзе — 1077. Гэта былі пераважна дзеці дваран, чыноўнікаў, духавенства, якіх абмежаванні не датычыліся.

Сярэдняя адукацыя для дзяцей працоўных была недаступная не толькі з прычыны абмежаванняў іх прыёму, але і з-за высокай платы за навучанне. Так, дырэкцыя Мінскага рэальнага вучылішча, як відаць з яе справаздачы, у 1886/87 навучальным годзе брала за навучанне з кожнага вучня III і IV класаў па 60 рублёў, а з вучняў V і VI класаў — па 40 рублёў у год. Апрача таго, усе вучні сярэдніх школ абавязаны былі насіць пэўную форму, зацверджаную для таго ці іншага тыпу навучальных устаноў, якую набывалі за свой кошт.

У 1899 годзе ў Мінску адкрываецца яшчэ адна жаночая гімназія, а да 1900 года ў горадзе налічвалася 32 навучальныя ўстановы. Іх наведвала 4175 вучняў. У параўнанні з 1859 годам колькасць навучальных устаноў у горадзе павялічылася ў 2,5 раза, а вучняў у іх — больш чым у 3 разы. Але калі ўлічыць, што за гэты перыяд насельніцтва Мінска выросла ў 3,5 раза, а змены, якія адбыліся ў эканамічным і грамадска-культурным жыцці, парадзілі вялікі попыт на пісьменных людзей, то стане відавочным велізарнае адставанне народнай асветы ў Мінску.

Паводле даных першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года, у саставе насельніцтва Мінска налічвалася 44 612 пісьменных (26 124 мужчыны і 18 488 жанчын), або 49,1 працэнта да агульнай колькасці насельніцтва горада. Асабліва кідаецца ў вочы вялікая колькасць непісьменных сярод дзяцей школьнага ўзросту (34,6 працэнта).

Па ступені адукацыі ўсё пісьменнае насельніцтва Мінска размяркоўвалася наступным чынам: ніжэйшую адукацыю мелі 39 345 чалавек (22 757 мужчын, 16 588 жанчын), сярэднюю — 4739 чалавек (2866 мужчын і 1873 жанчыны). Вельмі мала было асоб з вышэйшай адукацыяй — 0,58 працэнта ўсяго насельніцтва горада. У Беларусі ў той час не існавала ніводнай вышэйшай навучальнай установы.

У пачатку XX стагоддзя ў горадзе працягваўся рост колькасці школ. Ужо ў 1904 годзе ў Мінску налічвалася 50 навучальных устаноў, у іх навучалася 8350 чалавек; ніжэйшых школ было 43, сярэдніх — 7 (адна мужчынская і дзве жаночыя гімназіі, рэальнае і камерцыйнае вучылішчы, духоўная семінарыя і жаночая прагімназія). Значнае развіццё атрымала жаночая адукацыя: у горадзе ў ліку ніжэйшых школ 20 былі жаночымі.

Да 1913/14 навучальнага года колькасць навучальных устаноў у Мінску павялічылася да 62 (49 ніжэйшых і 13 сярэдніх), з іх 6 мужчынскіх і 7 жаночых (5 гімназій і 2 прагімназіі); у іх навучалася 5150 вучняў.

Рост навучальных устаноў Мінска ў значнай ступені адбываўся за лік прыватных вучылішч. Навучанне ў іх было платным і таму даступна толькі дзецям заможных сем'яў.

У канцы XIX — пачатку XX стагоддзя ў Мінску мясцовая гарадская інтэлігенцыя стварае культурна-асветныя таварыствы, якія адыгралі значную ролю ў распаўсюджванні асветы. Найбольш значным было «Таварыства мінскіх урачоў», заснаванае яшчэ ў 1867 годзе. З 1867 па 1892 год у ім знаходзілася 186 членаў. На навуковых пасяджэннях таварыства чыталіся і абмяркоўваліся даклады, лекцыі. Асноўнай іх тэмай былі меры барацьбы з эпідэміямі, грамадская гігіена і санітарыя, стварэнне ў горадзе медыка-санітарных устаноў і да т. п.

У 1890 годзе ўзнікае «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў», якое неўзабаве стала цэнтрам літаратурнага і тэатральна-музычнага жыцця горада. «Таварыства» складалася з чатырох секцый: літаратурнай, драматычнай, музычнай і мастацкай.

Пры садзейнічанні «Таварыства» ў Мінску ў 1899 годзе адкрылася грамадская гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна. Гарадская дума выдзяляла для патрэб бібліятэкі нікчэмныя грашовыя сродкі, таму асноўнай крыніцай яе існавання былі ўступныя ўзносы чытачоў. Гэта дало магчымасць праўленню бібліятэкі стварыць значны кніжны фонд і ператварыць яе ў буйную культурна-асветную ўстанову горада. Як відаць з каталога за 1908 год, у 16 аддзелах рускай і перакладной літаратуры налічвалася 5272 кнігі. Тут былі творы класікаў рускай і сусветнай літаратуры: А. М. Горкага, Т. Р. Шаўчэнкі, А. С. Грыбаедава, М. А. Някрасава, М. Я. Салтыкова-Шчадрына, М. Г. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава. У бібліятэцы меліся працы К. Маркса і Ф. Энгельса, кніга У. І. Леніна «Развіццё капіталізму ў Расіі», творы Г. В. Пляханава, К. Каўцкага, Ф. Ласаля і іншыя творы марксісцкай літаратуры. У ёй быў багаты аддзел замежнай літаратуры. Бібліятэка канцэнтравала вакол сябе перадавую частку інтэлігенцыі Мінска.

2. Літаратура, тэатр і мастацтва

У літаратурным жыцці Мінска да сярэдзіны 80-х гадоў адчуваліся ў значнай ступені вынікі рэакцыйнай палітыкі царызму. Накладзеная ў 1867 годзе забарона на распаўсюджванне твораў беларускай літаратуры заставалася ў сіле. Творы вядомага беларускага пісьменніка В. І. Дуніна-Марцынкевіча, які жыў пад Мінскам пад наглядам паліцыі, распаўсюджваліся толькі ў рукапісах. Напісаныя ім у парэформенныя гады сатырычныя камедыі — «Пінская шляхта» і «Залёты» ўпершыню былі надрукаваны толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Ажыўленне ў літаратурным жыцці пачалося з 1886 года, калі ў Мінску пачала выдавацца грамадска-літаратурная газета «Минский листок», якая аб'ядноўвала вакол сябе лепшыя сілы мясцовай інтэлігенцыі. У газеце супрацоўнічалі гісторык і этнограф М. В. Доўнар-Запольскі, літаратурны крытык і этнограф Е. А. Ляцкі, літаратуразнавец Д. Бохан, этнограф А. Слупскі, археолаг В. Завітневіч і інш. Газета знаёміла чытачоў з творамі рускіх пісьменнікаў — Някрасава, Кальцова, Гогаля, Астроўскага, Талстога, Лермантава, творамі многіх зарубежных пісьменнікаў, вяла рашучую барацьбу супраць прыхільнікаў буржуазнай тэорыі «мастацтва для мастацтва», абараняла ад нападак буржуазных крытыкаў творчасць перадавых рускіх пісьменнікаў М. Я. Салтыкова-Шчадрына, А. П. Чэхава, М. Горкага. Чытачы «Минского листка» знаёміліся з творамі беларускай літаратуры. Так, у 1889 г. «Минский листок» апублікаваў беларускую парадыйна-сатырычную паэму «Тарас на Парнасе», напісаную невядомым аўтарам у пачатку 40-х гадоў XIX стагоддзя. На старонках газеты друкаваліся творы мясцовых паэтаў і пісьменнікаў — К. Багдановскага, Д. Бохана, Палешчука, Беларуса, Адама Бярозы, Рыгора Цягло, у творах якіх моцна гучалі беларускія нацыянальныя матывы.

У «Минском листке» друкаваліся творы беларускага паэта-дэмакрата Янкі Лучыны (1851—1897) — сына мінскага адваката. Першы яго верш на рускай мове — «Не ради славы иль расчета» — быў надрукаваны ў першым нумары газеты і прагучэў як вершаваны пераказ дэмакратычнай платформы газеты. У наступных яе нумарах з'яўляліся вершы Я. Лучыны, напісаныя на рускай і беларускай мовах,— «Заходзіць сонца за горы», «Веснавой парой», «Вясна» і інш.

Творы Я. Лучыны друкаваліся таксама ў «Северо-Западном календаре» — альманаху, які выдаваўся пад рэдакцыяй А. Слупскага ў Мінску ў пачатку 90-х гадоў XIX стагоддзя. Так, у «Северо-Западном календаре» на 1892 год былі апублікаваны яго вершы «Пакуль год новы на свеце не стане», «Горсць пшаніцы» і найбольш папуляр-

ны лірычны твор «Роднай старонцы». У альманаху за 1893 год зна-
ходзім вершы Я. Лучыны «Родной Белоруссии», «Стары ласнік», «Бу-
сел». «Надта салодкія думы» і «Ямшчык».

Рэвалюцыя 1905—1907 гадоў адкрыла новы этап у літаратурным жыцці Мінска. На арэну грамадска-палітычнай і літаратурнай дзей-насці выйшлі разбуджаныя рэвалюцыяй таленавітыя пісьменнікі і паэты — Цётка (А. С. Пашкевіч), Янка Купала (І. Д. Луцэвіч), Якуб Колас (К. М. Міцкевіч), якія ўзначалілі рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у беларускім нацыянальна-вызваленчым і літаратурным руху. Пасля крывавых падзей у Пецярбургу 9 студзеня 1905 года, якія ўзварушылі ўсю краіну, у Мінску пачалі з'яўляцца лістоўкі з рэвалюцыйнымі вершамі Цёткі — «Хрэст на свабоду», «Суседзям у няволі», «Пад штандартам», «Бура ідзе» і іншыя, у якіх палымяная рэвалюцыянерка (яна жыла ў той час у Вільні) заклікала народы Расіі ўзняцца на ўзброенае паўстанне супраць царызму.

15 мая 1905 года ў мінскай газеце «Северо-Западный край» быў надрукаваны першы верш Янкі Купалы «Мужык». У ім малады паэт ад імя працоўнага сялянства гучна заявіў аб праве беларускага му-жыка на лепшую долю. Газета «Северо-Западный край», якая стаяла на марксісцкіх пазіцыях, была трыбунай для выступленняў пачы-наючых рабоча-сялянскіх паэтаў. Яна накіроўвала іх творчасць на шлях рэвалюцыйнай барацьбы.

Яркай фігурай у асяроддзі рабочых паэтаў, што супрацоўнічалі ў «Северо-Западном крае», быў рабочы-друкар Аляксандр Мікуль-чык, актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905 года. З мая па лістапад 1905 года ў газеце былі надрукаваны яго вершы «Гимн весне», «Пес-ня труда», «Рабочий», «Где вы, люди закаленные?», «Не верь вра-гам», «Жертвам 18 октября», «Песня кузнеца» і інш. У 1906 г. у Пецярбургу выйшаў зборнік вершаў А. Мікульчыка «Песни рабо-чего». Вершы яго прасякнуты рэвалюцыйным пафасам.

Вершы беларускіх паэтаў часта ўключаліся ў праграмы аматар-скіх спектакляў, якія ў дні рэвалюцыі часта арганізоўвала мінскае «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў».

Пасля паражэння рэвалюцыі літаратурным сілам Мінска быў нанесен цяжкі ўдар. У снежні 1905 года спынілася выданне газеты «Северо-Западный край». Па распараджэнню мінскага губернатара за «антыўрадавую» дзейнасць было закрыта «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў». Адкрытае былымі яго членамі ў жніўні 1906 года новае «Літаратурна-артыстычнае таварыства» адразу ж аказалася пад строгім наглядам паліцыі. Беларускі паэт Якуб Колас за рэвалюцыйную дзейнасць і ўдзел у настаўніцкім з'ездзе ў верасні 1908 года быў асуджаны на тры гады турэмнага зняволення і пасаджан у мінскую турму.

Аднак прабуджаная рэвалюцыяй у народзе цікавасць да літаратуры, да рэвалюцыйнай і дэмакратычнай паэзіі не згасала. Арганізаваныя мінскім «Літаратурна-артыстычным таварыствам» лекцыі на літаратурныя тэмы (у 1906—1907 гадах было прачытана ў горадзе 24 лекцыі) прыцягвалі вялікую колькасць слухачоў. У мінскай турме працягваў пісаць Якуб Колас. Амаль у кожным нумары «Нашай нівы», якая выдавалася ў Вільні, друкаваліся яго вершы і апавяданні. У 1910 годзе, калі Я. Колас знаходзіўся яшчэ ў турме, рэдакцыя газеты «Наша ніва» выдала частку яго вершаў асобным зборнікам пад назвай «Песні жальбы». Вершы зборніка — «Доля батрачкі», «Першы заработак», «Горкая доля», «За падаткі», «Плытнікі», «Мужык» і многія іншыя — былі шырока вядомы мінскаму чытачу.

У гады рэвалюцыйнага ўздыму (1912—1914) літаратурнае жыццё Мінска захапіла больш шырокія колы насельніцтва. Да гэтага часу ў беларускую літаратуру прыйшлі маладыя таленавітыя паэты: Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Янка Журба (І. Іванішын), Алесь Гурло, Ф. Чарнушэвіч, Альберт Паўловіч і інш. З'явіліся новыя друкаваныя органы. Пачынаючы з 1910 года «Наша ніва» выдавала штогодні «Беларускі каляндар». Вясной 1912 года пецярбургскае беларускае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца» (заснавана ў 1906 г.) пачало выпускаць літаратурны і грамадска-палітычны альманах «Маладая Беларусь». Выйшлі ў свет зборнікі твораў Якуба Коласа — «Апавяданні» (1912) і «Родныя з'явы» (1914). У снежні 1913 года выдавецтва «Нашай нівы» засноўвае ў Мінску літаратурны штомесячнік для моладзі «Лучынка» (выйшла ў свет 5 нумароў). Часопіс неўзабаве аб'яднаў вакол сябе многіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. У ім друкаваліся Янка Купала, Якуб Колас, Цётка, Янка Журба, Цішка Гартны, Алесь Гурло, Змітрок Бядуля, Альберт Паўловіч, У. Галубок, М. Крапіўка і інш. Часопіс «Лучынка» пракладваў дарогу беларускай літаратуры ў шырокія масы народа.


Адной з крыніц культуры, да якой ахвотна далучалася насельніцтва Мінска, з'яўляўся тэатр. На сцэне тэатра трывалае месца занялі творы рускіх класікаў — Астроўскага, Гогаля, Грыбаедава.

У саставе мінскай трупы некаторы час знаходзіліся выдатныя майстры рускага тэатра М. Г. Савіна (Стрэмлянава) і П. Н. Арленеў.

У Мінск часта прыязджалі трупы рускіх тэатраў. У канцы 80-х гадоў пецярбургская трупа на чале з Ізмайлавым ставіла тут оперы Чайкоўскага, Даргамыжскага і Рубінштэйна. Неаднаразова наведвалі Мінск артысты ўкраінскіх тэатраў. У 1889 і 1891 гадах тут выступалі трупы Старыцкага і Крапіўніцкага.


Частыя наведванні Мінска прафесіянальнымі трупамі рускіх і ўкраінскіх тэатраў садзейнічалі развіццю тэатральнага мастацтва

Вуліца Губернатарская. Гасцініца «Европа»



Кафедральны сабор





Камерцыйнае вучылішча


Жаночая Марыінская гімназія






Рэальнае вучылішча

Будынак гарадскога тэатра





Выступленне А. Ф. Мяснікова пры ўзбройванні Першага імя Мінскага Савета рэвалюцыйнага палка 25 кастрычніка 1917 г. (З карціны С. Валуцкага)



А. Ф. Мяснікоў



Прэзідыум І франтавога з'езду. Мінск, 1917 г.

Адпраўка атрадаў на нарыхтоўку прадуктаў харчавання






М. І. Калінін вядзе гутарку
з беларускімі сялянамі. 1919 г.



В. С. Міцкевіч-Капсукас



М. І. Калінін на парадзе часцей Мінскага гарнізона


Камандны састаў 51-й стралковай брыгады 16-й арміі, якая вызвалiла Мінск ад палякаў





М. М. Тухачэўскі праводзіць агляд часцей Чырвонай Арміі на Заходнім фронце. 1920 г.

Дэлегаты I з'езду Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. 1919 г.



і росту акцёрскіх сіл у самым горадзе. У асяроддзі мінскай інтэлігенцыі складваўся калектыў артыстаў — аматараў сцэнічнага і музычнага мастацтва.

Важнай падзеяй у культурным жыцці Мінска з'явілася адкрыццё гарадскога тэатра (цяпер будынак тэатра імя Я. Купалы), якое адбылося 5 чэрвеня 1890 года. На пабудову будынка тэатра значную частку грашовых сродкаў сабралі члены «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў».

Працягвалі ўмацоўвацца сувязі мінскага тэатра з лепшымі майстрамі перадавых тэатраў краіны. У 1891 годзе тут зноў выступала выдатная руская актрыса М. Г. Савіна, якая прыбыла з групай акцёраў Александрынскага тэатра. У 1895 годзе ў Мінску давалі спектаклі акцёры таго ж тэатра на чале з В. П. Далматавым.

Даволі часта прыязджала ў Мінск трупа віленскага драматычнага тэатра на чале з антрэпрэнёрам К. Н. Нязлобіным. У яе саставе былі такія выдатныя акцёры, як В. Ф. Камісаржэўская, П. В. Самойлаў, Н. Л. Ціраспальская, Е. А. Аляксеева, І. І. Міхайлаў-Дольскі, З. Н. Няронаў і інш.

У 1904 годзе на гастролях у Мінску знаходзілася група артыстаў Маскоўскага Малага тэатра на чале з А. А. Яблачкінай.

У 1905—1907 гадах значна актывізавалася прагрэсіўная дзейнасць мінскага «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў». Члены «Таварыства» часта выступалі перад пачаткам спектакляў або канцэртаў з дакладамі на грамадска-палітычныя тэмы. Часам пад маркай бенефісаў ставіліся спектаклі для збору сродкаў на нелегальныя мэты. Пастаноўкі п'ес Горкага і Чэхава часта выліваліся ў дэманстрацыі пратэсту супраць самадзяржаўя і палітычнага бяспраўя.

Царскі ўрад, перайшоўшы ў 1906 годзе ў наступленне на рэвалюцыю, абрушыўся на грамадскія арганізацыі рэвалюцыйнага і апазіцыйнага напрамку. Як ужо адзначалася, у жніўні 1906 года было закрыта «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў». Але неўзабаве яго члены заснавалі новае «Літаратурна-артыстычнае таварыства».

Пры садзейнічанні «Таварыства» ствараліся аматарскія тэатральныя і літаратурна-драматычныя гурткі і таварыствы. Адзін з такіх гуртkоў, створаны пры клубе станцыі Лібава-Роменскай чыгункі, стаў аматарскім тэатрам. Кіраўніком яго была Е. Э. Міронава. У гэтым жа гуртку прымаў удзел пасля вядомы акцёр беларускай сцэны У. І. Крыловіч.

Уздым грамадска-палітычнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі ў гады першай рускай рэвалюцыі паслужыў глебай да стварэння беларускага нацыянальнага тэатра. Першая беларуская тэатральная трупа была арганізавана на Віленшчыне Ігнатам Буй-

ніцкім (1861—1917). Сваю тэатральную дзейнасць І. Буйніцкі пачаў з наладжвання аматарскіх вечарынак, на якіх выконваліся беларускія народныя танцы, песні, дэкламаваліся вершы беларускіх паэтаў.

Неўзабаве вакол Буйніцкага склаўся калектыў таленавітых выканаўцаў беларускіх народных танцаў, песень, тэатральных камедый, дэкламатараў. Пачынаючы з 1907 года трупа Буйніцкага робіць гастрольныя паездкі па мястэчках, гарадах і сёлах Беларусі. Яны стварылі яму шырокую папулярнасць. У 1910 годзе тэатр атрымлівае запрашэнне выступіць у Вільні, а затым у Пецярбургу.

Летам 1911 года тэатр Буйніцкага прадпрымае паездку па Міншчыне і першыя свае выступленні пачынае ў Мінску.

Другі раз тэатр Буйніцкага выступаў у Мінску ў 1913 годзе. Пасля, у 1917 годзе, Ігнат Буйніцкі ў Мінску актыўна ўдзельнічае ў стварэнні першага «Таварыства беларускай драмы і камедыі». Тэатр І. Буйніцкага займае значнае месца ў развіцці беларускай нацыянальнай культуры. Ён паклаў пачатак стварэнню прафесіянальнага беларускага тэатра.

У пачатку XX стагоддзя ў Мінску адкрываюцца кінатэатры. У 1912 годзе ў горадзе працавалі тры кінатэатры — «Гігант», «Эдэн» і «Мадэрн», дзе дэманстраваліся кароткаметражныя неагучаныя фільмы, пераважна загранічнай вытворчасці.

У пачатку XX стагоддзя ў Мінску пачынае развівацца выяўленчае мастацтва. Вялікую ролю ў развіцці жывапісу адыграла «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў», у якім стараннямі мастака А. Папова была створана мастацкая секцыя. Дзякуючы дзейнасці «Таварыства» ў Мінску ў 1891 годзе наладжваецца мастацкая выстаўка, на якой экспанаваліся карціны рускіх, беларускіх і ўкраінскіх мастакоў.

Вялікае значэнне мела выстаўка, арганізаваная ў Мінску ў 1899 годзе «Таварыствам перасоўных выставак». На ёй экспанаваліся карціны І. Рэпіна, Н. Касаткіна, Н. Макоўскага і іншых рускіх мастакоў.

Мастацкія выстаўкі ў Мінску адбыліся ў 1902, 1904, 1907, 1908 гадах. На іх, апрача твораў рускіх мастакоў, экспанаваліся карціны мінскіх мастакоў — Я. Кругера, Э. О. Сукоўскага, Пінуса, І. Яроменкі, Л. Альпяровіча, Ф. Рушчыцы, а таксама творы беларускіх мастакоў дарэформеннага перыяду — Дамеля, І. Трутнева, А. Хруцкага, украінскіх мастакоў — Н. Цімоненкі, П. Леўчанкі і інш.

У 1911 годзе мастакі Мінска — Я. Кругер, І. Яроменка, Л. Альпяровіч, Г. Вейндорф, Ф. Рушчыц выстаўлялі свае творы на самай вялікай у Паўночна-Заходнім краі выстаўцы ў Вільні.

Мастакі Мінска прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада.

3. Перыядычны друк

Да сярэдзіны XIX стагоддзя ў Мінску працавала толькі адна казённая друкарня. Яна друкавала распараджэнні губернскіх улад. Раз у тыдзень выходзілі «Минские губернские ведомости». У 1854 годзе адкрываецца прыватная друкарня І. Дворжаца, а ў 1857 годзе — літаграфія, заснаваная выкладчыкам мінскай гімназіі Адамовічам.

У 1863 годзе ў Мінску пачынае выходзіць мастацка-літаратурны часопіс «Фотографическая иллюстрация». Гэта выданне ўяўляла сабой сшытак на шасці-васьмі старонках з трыма-чатырма ілюстрацыямі.

Пасля падаўлення паўстання 1863 года па загаду графа Мураўёва, назначанага генерал-губернатарам шасці губерняў Паўночна-Заходняга краю, друкаванне прыватных перыядычных выданняў было фактычна спынена. У данясеннях мінскага губернатара ў Галоўнае ўпраўленне па справах друку ў той перыяд паведамлялася адно і тое ж: «У мінскай губернскай друкарні друкуюцца «Минские губернские ведомости» і «Епархиальные ведомости». У астатніх жа друкарнях пачасовых выданняў не друкуецца». Губернская друкарня раз у год выпускала так званыя «Памятные книжки Минской губернии», што ўяўлялі сабой нешта сярэдняе паміж календаром і даведнікам.

Абмежаванні ў галіне друку прывялі да росту нелегальных выданняў. Як ужо адзначалася, у 1881 годзе ў Мінску працавала падпольная друкарня арганізацыі «Чорны перадзел». Яна выпускала часопіс «Черный передел» і газету «Зерно». Дзейнасць друкарні «Чорнага перадзелу» была нядоўгай. У канцы 1881 года паліцыі ўдалося напасці на яе след, друкарня спыніла сваё існаванне.

У 1884 годзе выдаецца нелегальны часопіс «Гоман». Вядомы два нумары гэтага часопіса, аддрукаваныя на гектографе з рукапіснага тэксту. Па некаторых меркаваннях, друкарня «Гомана» знаходзілася ў Мінску.

1886 год быў знамянальны для Мінска тым, што ў гэтым годзе ў горадзе пачала выходзіць першая грамадска-літаратурная газета «Минский листок», якая адразу ж аб'яднала вакол сябе шырокія колы прагрэсіўнай інтэлігенцыі. З 1886 па 1893 год рэдакцыя выпусціла таксама чатыры кнігі «Календаря Северо-Западного края», якія змяшчалі, апрача вершаў і апавяданняў на беларускай мове, беларускіх прыказак і прымавак, багаты даведачны і навуковы матэрыял пра Беларусь, і ў прыватнасці пра Мінскую губерню.

Аб узросшай цікавасці мінскай грамадскасці да друкаванага слова ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя гаворыць і той факт, што з 1889 года «Минские губернские ведомости» сталі выходзіць два разы

ў тыдзень, а «Минский листок» — штодзённа, апрача панядзелка. На старонках «Минского листка» з'яўляюцца заметкі аб цяжкім становішчы працоўных, прычым, не абмяжоўваючыся адным апісаннем, рэдакцыя давала і сваю ацэнку гэтага становішча.

Аб рабоце падпольных друкарняў у Мінску ў гэты перыяд афіцыяльных вестак няма, але ёсць усе падставы меркаваць, што тут праводзіўся перадрук палітычнай літаратуры, якая выдавалася групай «Вызваленне працы», пры перапраўцы якой з-за граніцы Мінск служыў перавалачным пунктам. У запісцы начальніка Галоўнага ўпраўлення па справах друку ў Дэпартамент паліцыі ад 2 ліпеня 1892 года гаворыцца аб затрыманні «500 экземпляраў брашур на беларускай мове польскім шрыфтом, якая па зместу свайму ўзбуджае сялянскае насельніцтва супраць урада».

Падпольныя друкарні выпускалі і пракламацыі. Так, у 1899 годзе ў горадзе распаўсюджвалася лістоўка з заклікам адзначыць Міжнародны дзень працоўных 1 Мая. Шмат лістовак і пракламацый выпускала Мінская група РСДРП.

Рост рэвалюцыйнага руху ў краіне прывёў і да далейшай эвалюцыі мінскіх легальных газет. У 1902 годзе «Минский листок» мяняе сваю назву на «Северо-Западный край», падкрэсліваючы тым самым, што ад гэтага часу газета будзе служыць інтарэсам усяго Паўночна-Заходняга краю і што яна мае намер працягваць лепшыя традыцыі сваёй папярэдніцы. У процівагу ёй у 1904 годзе пачала выходзіць пад рэдакцыяй былога выдаўца «Минского листка» Фацінскага і Смародскага вернападданніцкая газета «Белорусский вестник». Але гэта газета не карысталася шырокай папулярнасцю, нягледзячы на вядомасць сваіх выдаўцоў.

Велізарную папулярнасць заваявала ў чытачоў газета «Северо-Западный край», якая выдавалася М. П. Мысаўскім. Асабліва вялікая яе роля ў перыяд першай рускай рэвалюцыі. У самы разгар сялянскага руху ў Беларусі, 15 мая 1905 года, газета публікуе верш Янкі Купалы «Мужык», у якім паэт кідае выклік існуючаму ладу.

Апрача звычайных нумароў, рэдакцыя газеты выпускала спецыяльны дадатак — «Телеграммы Северо-Западного края». Тут паведамлялася пра ўсе важнейшыя падзеі, што адбыліся ў краіне.

У пачатку 1905 года на старонках «Северо-Западного края» была надрукавана Праграма РСДРП, прынятая на II з'ездзе. Газета апублікавала таксама работы У. І. Леніна «Марксізм і неанароднічтва», «Падзенне Порт-Артура», «Дробнабуржуазны і пралетарскі сацыялізм» і інш.

У друкарні «Северо-Западного края» друкаваліся пракламацыі Мінскай групы РСДРП. 8 снежня 1905 года супраць газеты мінскі акруговы суд узбудзіў справу аб прыцягненні газеты да адказнасці

«за змяшчэнне... артыкулаў злачыннага зместу». Неўзабаве газета «Северо-Западный край» спыніла сваё існаванне.

У 1906 годзе Мінская група РСДРП наладзіла выпуск нелегальнага «Минского летучего листка». Газета стала яе друкаваным органам. Яна распаўсюджвалася сярод рабочых горада, а таксама перасылалася ў вёску.

Апрача «Летучего листка», Мінская група РСДРП працягвала выпуск пракламацый.

У 1906 годзе агульная колькасць газет у Мінску ўзрасла да дзесяці. Апрача «Минских губернских ведомостей» і «Епархиальных ведомостей», пачалі выходзіць такія газеты, як «Голос Белоруссии», «Голос провинции», «Северо-Западный курьер», «Минская речь», «Минская газета», «Наш край», «Эхо Белоруссии» і сатырычная газета «Картечь». Тэрмін існавання ўсіх гэтых выданняў залежаў ад іх сацыяльна-палітычнай афарбоўкі. Напрыклад, «Голос Белоруссии» быў закрыты адразу ж пасля выпуску першага нумара «з прычыны шкоднага напрамку». Такі ж лёс напаткаў і «Минскую газету». У той жа час «Минская речь», якая абвясціла сваім лозунгам «самадзяржаўе, праваслаўе і народнасць», працвітала. Змяніўшы ў лістападзе 1906 года сваю назву на «Минское слово», яна ператварылася ў друкаваны орган чарнасоценцаў-манархістаў і праіснавала да 1913 года.

У гады рэакцыі ў краіне знайшлі для сябе спрыяльную глебу чарнасоценныя арганізацыі. Кожная з іх мела сваю газету, з дапамогай якой прабавала прапагандаваць свае ідэі. Так з'явіліся і ў Мінску «Братский листок», «Православный братчик», якія прапаведавалі надзвычай правыя ідэі. Што датычыць іншых газет гэтага перыяду, то яны спынялі існаванне неўзабаве пасля свайго нараджэння. Найбольш «жывучымі» з іх былі «Минский курьер» і «Минское эхо».

Рост колькасці газет назіраецца ў гады рэвалюцыйнага ўздыму. У 1912 годзе ў Мінску ўжо выходзіла каля 16 перыядычных выданняў, а да пачатку 1914 года — 21. Трэба адзначыць, што ў гэты перыяд у Мінску ўпершыню выпускаюцца выданні на беларускай мове. У лістападзе 1913 года было атрымана права на адкрыццё ў Мінску часопісаў «Саха» і «Лучынка» на беларускай мове, а ў снежні таго ж года — часопісаў «Искрочка» і «Белорусский экономист» (на рускай мове). Найбольш папулярныя з іх — «Искрочка» і «Лучынка», дзе друкаваліся вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча і Цёткі. Часопіс жа «Саха» быў разлічаны на чытачоў з заможнага сялянскага асяроддзя. Ён прапагандаваў новыя формы вядзення сельскай гаспадаркі. Але нават і такая дзейнасць была не патрэбна ўладам, і ў пачатку першай сусветнай вайны гэтыя выданні былі закрыты. З пачаткам вайны большасць выдаваемых у Мінску газет адво-

дзіла максімум месца на сваіх старонках апісанню ваенных дзеянняў, распальванню шавінізму і прапагандзе вайны да пераможнага канца.

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі газеты правячых партый прапагандавалі на сваіх старонках мірнае супрацоўніцтва класаў і вайну да пераможнага канца. Беларускія нацыяналісты выставілі на першы план ідэю аўтанамізацыі Беларусі, бо без аўтаноміі, пісалі яны, «і зямелька не пойдзе нам у карысць». Але ні кадэцкія, ні эсэраўскія, ні нацыяналістычныя лозунгі не маглі задаволіць патрабаванні працоўных мас. Усё большую папулярнасць у народзе заваёўвала ясная і дакладная праграма бальшавікоў. 10 чэрвеня 1917 года ў Мінску пачала выходзіць «Крестьянская газета», якая ператварылася ў рупар ідэй бальшавіцкай партыі ў вёсцы. Галоўным рэдактарам яе быў М. В. Фрунзе. 27 ліпеня выйшаў у свет першы нумар друкаванага органа Мінскага камітэта РСДРП газеты «Звезда», якая аб'явіла бязлітасную вайну буржуазіі, памешчыкам, капіталу. Арганізатарамі і кіраўнікамі газеты былі М. В. Фрунзе і А. Ф. Мяснікоў. 23 жніўня ўрад закрыў газету, але ўжо 15 верасня газета адрадзілася пад назвай «Молот», а пасля закрыцця стала выходзіць пад назвай «Буревестник».

Газета «Звезда» (так змяніла сваю назву газета «Буревестник») з'явілася першай ластаўкай камуністычнага друку ў Беларусі, стала органам, вакол якога групаваліся ўсе прагрэсіўныя сілы Беларусі і салдат Заходняга фронту.

РАЗДЗЕЛ XII

МІНСК У ПЕРЫЯД ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

1. Рэвалюцыйная мабілізацыя мас у перыяд мірнага развіцця рэвалюцыі

Звяржэнне царызму і пераход улады ў рукі буржуазнага Часовага ўрада не пазбавілі рабочых і сялян Расіі ад прыгнёту капіталістаў і памешчыкаў, не палепшылі іх прававога і матэрыяльнага становішча.

Унутранае становішча краіны заставалася вельмі цяжкім. Прамысловасць і транспарт знаходзіліся ў стане развалу. У выніку рэзкага скарачэння пасяўных плошчаў нехапала хлеба. Вострая патрэба адчувалася ў самых неабходных таварах: мыле, запалках, газе, солі і інш. Працвітала нястрымная спекуляцыя, ад якой асабліва цярпела працоўнае насельніцтва гарадоў.

У гэтых умовах партыя бальшавікоў і яе правадыр У. І. Ленін бачылі выратаванне краіны ў перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі, знішчэнні капіталістычнага ладу і перажыткаў феадалізму, ва ўстанаўленні дыктатуры пралетарыяту.

Велізарнае гістарычнае значэнне ў справе далейшага развіцця рэвалюцыі і перарастання яе ў сацыялістычную мела вяртанне У. І. Леніна з эміграцыі. 4 красавіка 1917 года ён выступіў з дакладам «Аб задачах рэвалюцыі» на сходзе бальшавікоў, а затым на аб'яднаным сходзе бальшавікоў і меншавікоў — удзельнікаў Усерасійскай нарады Саветаў. Аснову гэтых дакладаў складалі вядомыя тэзісы, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай Красавіцкіх. «Своеасаблівасць бягучага моманту ў Расіі,— пісаў У. І. Ленін,— заключаецца *ў пераходзе* ад першага этапа рэвалюцыі, які даў уладу буржуазіі з прычыны недастатковай свядомасці і арганізаванасці пралетарыяту,— *да дру-*

года яе этапа, які павінен даць уладу ў рукі пралетарыяту і бяднейшых слаёў сялянства»[1].

У. І. Ленін паказаў, што ў перыяд пераходу ад капіталізму да сацыялізма формай палітычнай арганізацыі грамадства можа быць не парламентарная рэспубліка, вяртанне да якой было б крокам назад ад Саветаў рабочых дэпутатаў, а рэспубліка Саветаў рабочых, батрацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Лозунг «Уся ўлада Саветам!» не азначаў заклікa да неадкладнага звяржэння Часовага ўрада. У. І. Ленін вучыў партыю дабівацца пераходу ўлады да Саветаў мірнымі сродкамі, г. зн. шляхам мірнага развіцця пакончыць з двоеўладдзем, устанавіць адзінаўладдзе Саветаў нават пры ўмове засілля ў іх меншавікоў і эсэраў, якія стаялі за пагадненне з буржуазіяй, маючы пры гэтым на ўвазе далейшую работу па выкрыццю антынароднай дзейнасці дробнабуржуазных партый, ізаляцыю ад іх мас.

Красавіцкія тэзісы Леніна давалі партыі і пралетарыяту новую арыенціроўку ў барацьбе за ўладу, за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі, новы стратэгічны план гэтай барацьбы, новыя стратэгічныя і тактычныя лозунгі пераходу ад буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі да сацыялістычнай, да ўстанаўлення рэспублікі Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў.

Кіруючыся Красавіцкімі тэзісамі У. І. Леніна, бальшавікі Мінска павялі барацьбу за пераадоленне аб'яднаўчых тэндэнцый, якія мелі месца ў іх дзейнасці ў перыяд Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі пад уплывам прымірэнчых адносін да меншавікоў і эсэраў, за стварэнне самастойнай арганізацыі і далейшае развіццё рэвалюцыйнай актыўнасці працоўных горада і салдат гарнізона. Бальшавікам Мінска даводзілася весці палітычную работу ў масах у абстаноўцы вострай класавай барацьбы. У прыфрантавым горадзе, якім з'яўляўся Мінск, былі сканцэнтраваны буйныя рэакцыйныя сілы — органы буржуазнага Часовага ўрада, штаб Заходняга фронту, розныя чарнасоценныя афіцэрскія арганізацыі, «патрыятычныя» саюзы і інш. У антынародным блоку са згодніцкімі партыямі знаходзіліся і буржуазныя беларускія, яўрэйскія і іншыя нацыяналісты.

25—26 сакавіка 1917 года ў Мінску адбыўся з'езд беларускіх нацыяналістычных арганізацый, на якім быў выбраны «Беларускі нацыянальны камітэт» (БНК), што аб'яднаў дзеючыя ў Беларусі і на Заходнім фронце буржуазна-нацыяналістычныя элементы. БНК падтрымліваў Часовы ўрад, асабліва па пытаннях аб вайне, міры і зямлі, патрабаваў для Беларусі «культурна-нацыянальнай краявой аўтаноміі», якая па сутнасці з'яўлялася нічым іншым, як адрывам яе ад рэвалюцыйнай Расіі.

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 24, стар. 4.

Шмат увагі ўдзялялі мінскія бальшавікі выкрыццю контррэвалюцыйнай палітыкі Часовага ўрада і яго прыхільнікаў — меншавікоў, эсэраў, буржуазных нацыяналістаў і іншых рэакцыйных элементаў. Яны растлумачвалі, што буржуазія імкнецца працягваць вайну дзеля нажывы, а працоўнаму народу вайна нясе толькі голад, смерць, разарэнне, што выхад з такога становішча толькі адзін — новая, сацыялістычная рэвалюцыя, на падрыхтоўку якой і нацэліў бальшавікоў і ўсіх працоўных вялікі Ленін.

Надаючы выключна вялікае значэнне справе класавай арганізацыі рабочых, бальшавікі займаліся пытаннямі стварэння прафсаюзаў і фабрычна-заводскіх камітэтаў. Пад іх кіраўніцтвам у красавіку — маі 1917 года на фабрыках і заводах, у майстэрнях Мінска і губерні была праведзена вялікая работа па арганізацыі фабрычна-заводскіх камітэтаў і прафсаюзаў, увядзенню васьмігадзіннага рабочага дня. У гэты перыяд фабрычна-заводскія камітэты ўзніклі на 16 прадпрыемствах Мінскай губерні, а ў Мінску ўтварылася больш за 20 прафесіянальных саюзаў, якія аб'ядноўвалі каля 10 тысяч чалавек.

Прафсаюзы і асабліва іх нізавыя арганізацыі — фабрычна-заводскія камітэты і рэвалюцыйна настроеная частка кіраўніцтва Цэнтральнага бюро прафсаюзаў, у большасці сваёй меншавіцка-эсэраўскага, пад уплывам бальшавіцкай агітацыі актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе рабочых за ўстанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня, павышэнне заработнай платы і паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў працоўных і ў радзе выпадкаў дабіваліся задавальнення сваіх патрабаванняў.

Так, ужо ў красавіку 1917 года 8-гадзінны рабочы дзень быў устаноўлены на 23 фабрыках і заводах Мінскай губерні. У канцы сакавіка — пачатку красавіка забаставалі рабочыя Мінскай фабрыкі капылоў і дабіліся павелічэння заработнай платы спачатку на 20, а затым яшчэ на столькі ж працэнтаў.

Здрадніцкая тактыка меншавікоў і бундаўцаў, якія заселі ў Мінскім ЦК прафсаюзаў, хоць і тармазіла вырашэнне пытанняў працягласці рабочага дня і павышэння заработнай платы, але не магла сарваць рэвалюцыйных выступленняў рабочых супраць антынароднай палітыкі Часовага ўрада.

Віднае месца ў палітычнай рабоце сярод працоўных бальшавікі адводзілі пытанням рэвалюцыйнага выхавання салдат Мінскага гарнізона і Заходняга фронту. Пры гэтым яны няўхільна кіраваліся ўказаннем У. І. Леніна аб тым, што «калі рэвалюцыя не стане масавай і не захопіць самога войска, тады не можа быць і гутаркі аб сур'ёзнай барацьбе» [1]. Формы работы бальшавікоў былі самыя разнастай-

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 11, стар. 150.

ныя — вусная і друкаваная прапаганда, мітынгі і сходы з пастаноў. кай на іх пытанняў аб уладзе, зямлі і міры, выкрыццё антынароднай палітыкі буржуазнага Часовага ўрада і г. д. З мэтай уцягвання ў рэвалюцыйны рух шырокіх салдацкіх мас бальшавікі выкарыстоўвалі і скліканне салдацкіх з'ездаў.

Часовы ўрад і рэакцыйнае камандаванне Заходняга фронту, якія добра разумелі ролю арміі ў рэвалюцыі, імкнуліся адмежаваць салдат ад бальшавіцкага ўплыву. Яны наваднялі фронт газетамі рэакцыйнага напрамку («Речь», «Биржевые ведомости» і інш.), праз сваіх стаўленікаў вялі ўзмоцненую агітацыю за вайну «да пераможнага канца» і г. д. Але перашкодзіць пранікненню ў армію бальшавіцкіх ідэй і лозунгаў рэакцыі было не пад сілу. Агітацыйная работа бальшавікоў прыносіла свой плён — рэвалюцыйныя настроі ў арміі раслі, пачашчаліся антываенныя выступленні салдат, павялічвалася колькасць дэзерціраў.

Яскравым пацвярджэннем росту ўплыву бальшавікоў на салдацкія масы з'явіўся першы франтавы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій тылу і Заходняга фронту.

Рашэнне аб скліканні з'езду было прынята па прапанове бальшавікоў на пасяджэнні Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў 19 сакавіка 1917 года. У ходзе падрыхтоўкі да з'езду паміж партыямі разгарэлася вострая палітычная барацьба. Фронт наваднілі агітатарамі ад усіх партый і палітычных груп. Мінскія бальшавікі накіравалі ў вайсковыя часці свае лепшыя прапагандысцкія сілы. Надаючы выключную важнасць з'езду, ЦК РСДРП накіраваў для ўдзелу ў яго рабоце сваіх прадстаўнікоў А. Е. Бадаева і В. П. Нагіна.

Сваіх прадстаўнікоў на з'езд накіравалі і партыі кадэтаў, эсэраў, меншавікоў. Ад ваеннага камандавання на з'езд прыбыў галоўнакамандуючы Заходнім фронтам манархіст генерал Гурко, ад партыі акцябрыстаў і кадэтаў — ярыя рэакцыянеры Радзянка, Родзічаў, Цэпкін, ад меншавікоў — Чхеідзе, Цэрэтэлі, Скобелеў, Гваздзёў.

З'езд адбыўся ў Мінску 7—17 красавіка 1917 года. На яго прыбылі 1200 дэлегатаў. Яны прадстаўлялі ваенныя і рабочыя арганізацыі Мінска, Барысава, Оршы, Смаленска, Ярцава, Вязьмы, Ржэва, Калугі, Бранска, Гомеля, Магілёва, Бабруйска, Вілейкі, Маладзечна, Койданава, Замір'я, Слуцка, Лунінца. Ад Мінскага Савета дэлегатамі з'езду быў 31 чалавек — 15 ад рабочых, 16 — ад салдат. Ад бальшавікоў Мінска на з'ездзе прысутнічалі М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікоў, І. Е. Любімаў, В. С. Селязнёў, В. В. Фамін. Старшынёй з'езду быў выбраны старшыня Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Б. П. Позерн.

У дзень адкрыцця з'езду газета «Известия Минского Совета» апублікавала артыкул «Прывітанне таварышам з фронту», у якім выказ-

вала ўпэўненасць у тым, што салдаты разбяруцца, дзе праўда і дзе маня, і павядуць праўду ў свае акопы.

Прадстаўнікі Часовага ўрада і штаба Заходняга фронту спрабавалі абмежаваць парадак дня з'езду пытаннямі толькі ваенна-прафесіянальнага характару. Аднак гэтыя спробы пацярпелі паражэнне. На настаянню бальшавікоў, якія правялі ў перыяд падрыхтоўкі да з'езду вялікую агітацыйную работу сярод салдат, з'езд уключыў у парадак дня вострыя палітычныя пытанні аб вайне і міры, аб адносінах да Часовага ўрада, аб ваенных, рабочых і сялянскіх арганізацыях, прававым і матэрыяльным становішчы салдат і іх сем'яў, аб бытавым становішчы рабочых і салдат, г. зн. тыя пытанні, якія не хацеў вырашаць Часовы ўрад і якія хвалявалі працоўных.

Пасяджэнні з'езду сталі арэнай вострай палітычнай барацьбы за ўплыў на салдацкія масы. Прыхільнікі буржуазнага Часовага ўрада і яго курсу на «вайну да пераможнага канца» выступалі за класавы мір, заклікалі салдат быць вернымі палітыцы Часовага ўрада, усяк падтрымліваць яе.

У сваіх выступленнях бальшавікі выкрывалі антынародны характар знешняй і ўнутранай палітыкі Часовага ўрада, растлумачвалі дэлегатам, што толькі перамога сацыялістычнай рэвалюцыі і пераход усёй улады ў рукі Саветаў можа пакласці канец вайне, даць народу мір і палітычныя свабоды. Ім удалося дабіцца ўключэння ў пастановы з'езду патрабавання адмовы Часовага ўрада ад агрэсіўнай палітыкі, перадачы ўсёй зямлі «ў карыстанне тых, хто сам працуе на ёй», неадкладнага ўвядзення 8-гадзіннага рабочага дня на прадпрыемствах, арганізацыі Саветаў сялянскіх дэпутатаў і Саветаў дэпутатаў сельскагаспадарчых рабочых.

Аднак па важнейшаму пытанню парадку дня — аб вайне і міры з'езд па прычыне засілля на ім меншавікоў і эсэраў прыняў згодніцкую рэзалюцыю. Ён далучыўся да пазіцыі «рэвалюцыйнага абаронніцтва» і падтрымаў знешнюю палітыку Часовага ўрада.

Але і пры такім становішчы з'езд меў вялікае значэнне для палітычнага выхавання салдацкіх мас у бальшавіцкім духу. Бальшавікі выкарысталі яго рашэнні для прапаганды свайго курсу на падрыхтоўку сацыялістычнай рэвалюцыі і ўмацавання ў гэтых мэтах саюзу рабочых, салдат і працоўных сялян. У складзе 75 членаў выбранага на з'ездзе выканаўчага камітэта Заходняга фронту (франтавы камітэт) было шэсць бальшавікоў: М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікоў, В. В. Фамін і інш. Яны стварылі сваю фракцыю. Два бальшавікі ўвайшлі ў прэзідыум франтавога камітэта, які складаўся з дзевяці чалавек. Тым самым бальшавікі атрымалі больш магчымасцей непасрэднага ўплыву на салдацкія масы і выхавання іх у духу класавай салідарнасці з рабочымі і працоўнымі сялянамі.

Велізарнае значэнне ў справе рэвалюцыйнага выхавання салдат Заходняга фронту і Мінскага гарнізона, працоўных Беларусі мела агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць мінскіх бальшавікоў, звязаная з выкрыццём імперыялістычнага характару «ноты Мілюкова», якую 18 красавіка 1917 года Часовы ўрад паслаў Англіі і Францыі з заявай аб сваёй гатоўнасці працягваць вайну «да пераможнага канца».

Адгукаючыся на заклік ЦК бальшавіцкай партыі рашуча пратэставаць супраць імперыялістычнай палітыкі Часовага ўрада, бальшавікі Мінска арганізавалі на прадпрыемствах сходы і мітынгі рабочых, растлумачваючы ім ленінскае вучэнне аб тым, што толькі пераход дзяржаўнай улады ў краіне ў рукі Саветаў пакончыць з вайной і дасць працоўнаму народу жаданы мір.

У знак пратэсту супраць «ноты Мілюкова» рабочыя Мінска правялі рад забастовак. Па прапанове бальшавікоў Мінскі Савет на сваім пасяджэнні 22 красавіка выказаўся супраць гэтай ноты, адзначыўшы, што яна супярэчыць волі працоўнага народа. У рэзалюцыі Савета ўтрымліваўся заклік да ўсёй рэвалюцыйнай дэмакратыі цясней згуртаваць свае сілы вакол Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

У сувязі з «нотай Мілюкова» ў часцях Мінскага гарнізона адбыліся сходы салдат, на якіх прымаліся рэзалюцыі пратэсту супраць грабежніцкай імперыялістычнай палітыкі Часовага ўрада. Сярод салдат усё больш узмацняліся антываенныя настроі, расло недавер'е да Часовага ўрада. Гэтаму ў многім садзейнічала ўмацаванне палітычных сувязей мінскіх бальшавікоў з бальшавікамі-франтавікамі і шырокімі салдацкімі масамі Мінскага гарнізона і Заходняга фронту. Яны пасылалі салдатам агітацыйную літаратуру, накіроўвалі да іх сваіх лепшых прапагандыстаў, дапамагалі ствараць рэвалюцыйныя салдацкія арганізацыі.

Відную ролю ў палітычным выхаванні працоўных адыгралі бальшавіцкія газеты «Правда», «Солдатская правда» і інш., у якіх друкавалася шмат матэрыялаў, што асвятлялі рэвалюцыйныя падзеі ў краіне. Вялікай папулярнасцю карысталася і газета «Известия Минского Совета». Артыкулы, якія публікаваліся ў ёй,— «За што мы ваюем?», «Чаму няма хлеба, адзення, абутку?», «Капіталісты і вайна» і шэраг інш.— дапамагалі рабочым, салдатам, сялянам глыбей зразумець антынародны характар знешняй і ўнутранай палітыкі Часовага ўрада і выбраць адзіна прымальны для іх шлях сацыялістычнай рэвалюцыі.

Камандаванне Заходняга фронту спрабавала ачысціць армію і бліжэйшы тыл, у прыватнасці Мінск, ад бальшавікоў, падарваць іх уплыў на салдацкія масы. Лепшымі памочнікамі яму ў гэтай справе

былі меншавікі, эсэры і буржуазныя нацыяналісты. Але іх спробы затрымаць працэс рэвалюцыянізацыі арміі былі марнымі і поспехамі не ўвянчаліся.

Мінскія бальшавікі разумелі, што без трывалага саюзу пралетарыяту з працоўным сялянствам у барацьбе за ўладу Саветаў не абысціся, і прыкладвалі нямала намаганняў да ўцягвання апошняга ў рэвалюцыйны рух. Яны абапіраліся пры гэтым на наступнае ўказанне У. І. Леніна: «Гэтую масу (г. зн. бяднейшае сялянства.— Н. К.) мы павінны цяпер, карыстаючыся адноснай свабодай новага парадку і Саветамі рабочых дэпутатаў, старацца *навучыць* і *арганізаваць* перш за ўсё і больш за ўсё. Саветы сялянскіх дэпутатаў, Саветы сельскагаспадарчых рабочых — вось адна з сур'ёзнейшых задач» [1].

У адпаведнасці з рашэннем нарады сялянскіх дэлегатаў Мінскай губерні (старшынстваваў М. В. Фрунзе), якая адбылася 22 красавіка 1917 года і выбрала губернскі сялянскі камітэт, бальшавікі горада падрыхтавалі скліканне I з'езду сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. На з'езд, які адбываўся 20—23 красавіка 1917 года ў памяшканні мінскага гарадскога тэатра, з'ехалася 800 дэлегатаў. Старшынёй быў выбраны М. В. Фрунзе. З'езд абмеркаваў пытанні, якія хвалявалі сялян, аб зямлі, аб адносінах да вайны і міру, аб сялянскіх камітэтах, аб становішчы сельскагаспадарчых рабочых, нацыянальнае пытанне і інш.

Бальшавікі выкарысталі з'езд для растлумачэння сялянам ленінскай палітыкі ў аграрным і іншых пытаннях рэвалюцыі і, пераадольваючы супраціўленне эсэраў, а таксама часткі дэлегатаў, якія знаходзіліся ў палоне згодніцкіх ілюзій, дабіліся ўключэння ў яго рашэнні патрабавання ліквідацыі прыватнай уласнасці на зямлю, паляпшэння становішча батракоў.

Пад уплывам бальшавікоў з'езд асудзіў спробы нацыяналістычнага «Беларускага нацыянальнага камітэта» гаварыць ад імя ўсяго беларускага народа, які нібыта хоча аддзялення ад Расіі, і рашуча выказаўся супраць аддзялення Беларусі, лічачы яе неадрыўнай часткай Расіі.

На з'ездзе быў выбраны выканаўчы камітэт Савета сялянскіх дэпутатаў з 20 чалавек на чале з М. В. Фрунзе.

Выступленні на з'ездзе бальшавікоў, іх работа з дэлегатамі дапамагалі сялянам лепш зразумець сэнс падзей, якія адбываліся ў краіне, убачыць сапраўдны твар эсэраў, меншавікоў і нацыяналістаў — прыхільнікаў буржуазіі і памешчыкаў. Усё гэта паскарала працэс росту класавай самасвядомасці працоўнага сялянства, яго рэвалюцыйнага выхавання.

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 23, стар. 300—301.

Для больш шырокага разгортвання агітацыйнай работы на сяле патрэбны былі кадры агітатараў. З гэтай мэтай пры Мінскім Савеце бальшавікі арганізавалі спецыяльныя курсы. На іх прайшлі падрыхтоўку некалькі соцень салдат і рабочых. Для курсантаў чыталіся лекцыі на тэмы: «Сацыяльна-эканамічнае вучэнне К. Маркса», «Гістарычны матэрыялізм», «Што такое сацыялізм?», «Аграрная праграма сацыял-дэмакратычнай партыі», «Класавая барацьба» і на інш. Прайшоўшы курс і працуючы непасрэдна ў масах, агітатары неслі народу словы бальшавіцкай праўды, вялікія марксісцка-ленінскія ідэі. Яны дапамагалі сельскім бальшавікам ствараць і ўмацоўваць партыйныя ячэйкі, згуртоўваць вакол іх вясковую беднату і батракоў.

Пры выканаўчым камітэце Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў была створана спецыяльная камісія па рабоце сярод батракоў. Прадстаўнікі батракоў уваходзілі ў склад Мінскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Умацаванне сувязі Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі з бяднейшым сялянствам і батрацтвам значна актывізавала рэвалюцыйныя выступленні сялянскіх мас. Ужо ў красавіку 1917 года ў Мінскай губерні мелі месца факты захопаў сялянамі памешчыцкіх зямель, сенажацей і пашы, рубкі лесу. Вельмі важную ролю прапагандыста і агітатара адыграла ў сялянскім руху «Крестьянская газета» — орган выканкома Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, якая выдавалася ў Мінску. Першы яе нумар выйшаў 10 чэрвеня 1917 года. Рэдактарам газеты некаторы час быў М. В. Фрунзе. Газета змяшчала артыкулы, якія выкрывалі знешнюю і ўнутраную палітыку буржуазнага Часовага ўрада і згодніцкую дзейнасць меншавікоў, эсэраў і буржуазных нацыяналістаў.

Сапраўды гістарычнае значэнне ў справе рэвалюцыйнай мабілізацыі працоўных Расіі на барацьбу за ўладу Саветаў мелі рашэнні VII (Красавіцкай) канферэнцыі РСДРП(б), якая адбылася 24—29 красавіка 1917 года ў Петраградзе. Гэта была першая ў гісторыі бальшавіцкай партыі легальная канферэнцыя. Кіраваў яе работай У. І. Ленін. Ён выступіў і з асноўнымі дакладамі: аб бягучым моманце, аб пераглядзе партыйнай праграмы, па аграрнаму пытанню. Акрамя таго, У. І. Ленін некалькі разоў выступаў з прамовамі па розных пытаннях тактыкі і стратэгіі бальшавікоў у сацыялістычнай рэвалюцыі. У аснову рашэнняў па бягучаму моманту, аб уладзе, вайне, міры і Часовым урадзе, па аграрнаму і нацыянальнаму пытаннях канферэнцыя паклала Красавіцкія тэзісы У. І. Леніна. Канферэнцыя выбрала Цэнтральны Камітэт партыі на чале з У. І. Леніным.

Рашэнні Красавіцкай канферэнцыі з'явіліся кіраўніцтвам у практычнай дзейнасці ўсёй РСДРП(б) па мабілізацыі працоўных на ба-

рацьбу за сацыялістычную рэвалюцыю, у тым ліку для бальшавікоў Беларусі і Заходняга фронту.

Вялікую ўвагу мінскія бальшавікі ўдзялялі дзейнасці Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У сярэдзіне мая 1917 года праходзілі перавыбары Савета, і бальшавікі на чале з М. В. Фрунзе, А. Ф. Мясніковым, К. І. Ландэрам выкарысталі выбарчую кампанію для ўмацнення свайго ўплыву на працоўных горада і салдат гарнізона, для барацьбы супраць згодніцкіх элементаў. Яны разгарнулі шырокую агітацыйную работу сярод салдат, рабочых прадпрыемстваў і чыгуначнага вузла, сярод усіх працоўных горада, растлумачваючы ім курс бальшавіцкай партыі на далейшае развіццё рэвалюцыі, выкрываючы антынародную сутнасць палітыкі меншавікоў, эсэраў і буржуазных нацыяналістаў. Нягледзячы на тое што ў перыяд выбарчай кампаніі бальшавікі фармальна знаходзіліся яшчэ ў «аб'яднанцы», яны імкнуліся праводзіць самастойную палітычную лінію і шляхам вялікай растлумачальнай работы дабіваліся вылучэння ў Савет рэвалюцыйна настроеных рабочых, служачых, салдат і афіцэраў.

Выбарчая кампанія з'явілася для бальшавікоў і ўсіх рэвалюцыйных сіл горада сур'ёзным палітычным экзаменам, які яны вытрымалі з гонарам. З 265 выбраных дэпутатаў прапановы бальшавікоў пастаянна падтрымлівалі ад 160 да 195 чалавек. Бальшавікі атрымалі большасць месц (чатыры з пяці) у прэзідыуме Мінскага Савета і амаль палавіну — у яго выканкоме. Старшынёй Савета быў паўторна выбраны В. П. Позерн, намеснікамі — бальшавік І. Е. Любімаў і эсэр Хітроў, сакратарамі — бальшавікі Кнорын і Мацвееў. Бюро адзінай сацыял-дэмакратычнай фракцыі Мінскага Савета было поўнасцю ўтворана з бальшавікоў. У яго ўвайшлі А. Ф. Мяснікоў, І. Я. Алібегаў, І. Е. Любімаў і інш. Толькі ў выканкоме большасць атрымалі меншавікі і эсэры. Гэта давала ім магчымасць адхіляць прапановы бальшавікоў і працягваць свае, згодніцкія.

Для справы рэвалюцыйнай мабілізацыі працоўных Мінска, салдат Заходняга фронту і працоўных сялян Беларусі і Мінскай губерні, устанаўлення сувязей паміж павятовымі Саветамі і аб'яднання ўсіх Саветаў Беларусі вялікае значэнне меў І абласны з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які адбыўся ў Мінску 23—26 мая 1917 года. На ім прысутнічала 50 дэлегатаў з рашаючым голасам і тры з дарадчым, у большасці сваёй меншавікі і эсэры. Яны прадстаўлялі 113 Саветаў Мінскай, Магілёўскай і Віленскай губерняў. З'езд абмеркаваў пытанні аб вайне, аб адносінах да Часовага ўрада і інш.

Бальшавікі выступалі на з'ездзе з рэзкай крытыкай палітыкі Часовага ўрада і згодніцкай палітыкі эсэраў, меншавікоў і буржуазных

нацыяналістаў, што садзейнічала выкрыццю антынародных дзеянняў гэтага ўрада і яго прыхільнікаў у вачах шырокіх мас працоўных.

На самаму актуальнаму пытанню, якое хвалявала народныя масы, — аб вайне была прынята прапанова бальшавікоў, якія асуджалі працяганне імперыялістычнай вайны. Разам з тым у выніку зацята на з'ездзе меншавікоў і эсэраў з'езд адобрыў рашэнне Часовага ўрада і Петраградскага Савета «аднавіць адпаведнасць рускай арміі да наступлення», выказаўся супраць пераходу ўлады ў рукі Саветаў.

Для далейшага разгортвання класавай барацьбы станоўчым быў і той факт, што з'езд пастанавіў стварыць у кожным павятовым горадзе Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і павятовы Савет сялянскіх дэпутатаў, выбраў выканком Заходняга абласнога Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У склад выканкома ўвайшлі 36 членаў, 22 з іх былі бальшавікамі. У далейшым выканком абласнога Савета папоўніўся дэлегатамі ад Варшавы, Вабруйска, Рагачова, Оршы, Магілёва, Гомеля.

У прамежках паміж пасяджэннямі выканкома яго функцыі ўскладаліся на выканком Мінскага Савета. Гэта давала магчымасць бальшавікам — дэпутатам Мінскага Савета ўстанавіць больш трывалыя сувязі з бальшавікамі іншых гарадоў і сёл Беларусі, разам з імі ўздымаць масы на барацьбу за ўладу Саветаў.

З'езд выбраў дэлегатаў на I Усерасійскі з'езд Саветаў, які адбываўся ў Петраградзе 4—28 мая 1917 года. На ім прысутнічала 20 дэлегатаў ад усходніх беларускіх губерняў на чале з М. В. Фрунзе. Па свайму складу ён быў у асноўным эсэра-меншавіцкім, што адбілася і на яго рашэннях — з'езд адхіліў прапановы бальшавікоў аб перадачы ўлады Саветам і выказаўся за падтрымку імперыялістычнай палітыкі Часовага ўрада. Велізарнае ўражанне на дэлегатаў з'езду зрабіла выступленне У. І. Леніна, які заявіў, што партыя бальшавікоў гатова ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі, і растлумачыў пазіцыю бальшавікоў па важнейшых пытаннях рэвалюцыі, у прыватнасці па аграрнаму пытанню.

Натхнёны падтрымкай, аказанай з'ездам Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Часовы ўрад узмацніў падрыхтоўку да новага наступлення на фронце. Неўзабаве была вызначана і дата яго пачатку — 18 чэрвеня 1917 года. У выпадку ўдачы ў наступленні ворагі рэвалюцыі разлічвалі шляхам ліквідацыі двоеўладдзя і разгрому партыі бальшавікоў узяць уладу ў краіне ў свае рукі. Калі ж яно праваліцца, яны зноў-такі збіраліся ўсю віну зваліць на бальшавікоў і, абвінаваціўшы іх у разлажэнні арміі, разграміць бальшавіцкія арганізацыі.

У гэтых умовах бальшавікі Мінска ўзмацнілі работу па выкрыццю задуманай Часовым урадам авантуры, мабілізацыі мас на рашучую

барацьбу за ўзяцце ўлады Саветамі, далейшаму арганізацыйнаму ўмацаванню сваіх радоў.

Пад кіраўніцтвам М. В. Фрунзе і А. Ф. Мяснікова яны павялі рашучую барацьбу за разрыў з «аб'яднанкай» і стварэнне ў горадзе самастойнай бальшавіцкай арганізацыі. 1 чэрвеня 1917 года адбыўся сход бальшавікоў і меншавікоў-інтэрнацыяналістаў, левае крыло якіх па многіх пытаннях рэвалюцыі падтрымлівала бальшавікоў. У прынятай рэзалюцыі гаварылася, што «прысутныя, з прычыны пераважнай абарончай плыні ў мясцовай аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі, не лічаць магчымым для сябе заставацца ў ёй як палітычным цэлым», што яны «пакідаюць за сабой свабоду дзеяння ў розных палітычных выступленнях і арганізуюцца самастойна». На сходзе быў створаны часовы камітэт у складзе Мяснікова, Кузняцова, Палахавецкага, Магілёўскага, Рыўкіна, Пікеля і Рэйнгольда. Яму было даручана паведаміць аб стварэнні самастойнай бальшавіцкай арганізацыі ўсім сацыял-дэмакратам, «паклапаціцца аб адшуканні памяшкання, сродкаў і распрацаваць пытанні аб выданні ўласнага партыйнага органа».

Каб нанесці ўдар па меншавіках, эсэрах і бундаўцах, якія прыкрывалі сваё супрацоўніцтва з буржуазіяй дэмагагічнымі фразамі не толькі ў арганізацыйных, але і ў ідэйных адносінах, бальшавікі прыйшлі на сход гарадской аб'яднанай арганізацыі, які адбыўся 27 і 30 чэрвеня. Рэзалюцыі бальшавікоў аб пераходзе ўлады ў рукі Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, а таксама аб вайне, якія асуджалі палітыку «служэння захопніцка-грабежніцкім мэтам буржуазіі і гібельную палітыку наступлення», былі адобраны і прыняты большасцю ўдзельнікаў сходу. Меншавікі і бундаўцы, якія выступалі за падтрымку знешняй палітыкі Часовага ўрада, пацярпелі паражэнне. Гэта быў канчатковы канец «аб'яднанкі». У горадзе сфарміравалася самастойная бальшавіцкая арганізацыя, быў выбраны яе пастаянны камітэт на чале з А. Ф. Мясніковым.

17 ліпеня 1917 года Мінскі камітэт РСДРП(б) звярнуўся з адозвай да працоўных горада. «Таварышы,— гаварылася ў ёй,— мы звяртаемся да вас ад імя рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі... Цяпер мы ўжо самастойная арганізацыя паслядоўнай сацыял-дэмакратыі. Мы як перадавы атрад рабочага класа імкнемся да сацыялістычнага ладу шляхам цвёрдай класавай барацьбы пралетарыяту; мы згуртоўваем рабочых як адзіны клас вакол нашага вернага сцяга». Адозва заканчвалася словамі: «Смялей, уперад, без страху і сумнення і мы заваюем свабоду, свабоду палітычную і эканамічную».

Мінскі камітэт РСДРП(б) устанавіў пастаянныя сувязі з Віцебскай, Палескай, Слуцкай, Рэчыцкай і іншымі бальшавіцкімі арганізацыямі, якія таксама парвалі вясной — летам 1917 года з «аб'яднанкамі».

16 чэрвеня па ініцыятыве бальшавіцкай фракцыі быў скліканы сход дэпутатаў Мінскага Савета, на які былі запрошаны многія рабочыя і салдаты. Бальшавікі, якія выступалі на ім, заклікалі рабочых і салдат горада выйсці на дэманстрацыю, што была намечана на 18 чэрвеня, пад лозунгамі барацьбы за мір, перадачы зямлі сялянам, пераходу ўлады ў рукі Саветаў. Меншавікі, эсэры выступалі за правядзенне дэманстрацыі пад лозунгамі давер'я Часоваму ўраду.

18 чэрвеня, у дзень наступлення на фронце і масавых дэманстрацый рабочых і салдат у Петраградзе і іншых гарадах Расіі, якія праходзілі пад лозунгамі «Уся ўлада Саветам!», «Мір без анексій і кантрыбуцый», у Мінску на Саборнай плошчы адбыліся чатыры мітынгі і дэманстрацыя, якія прайшлі пад кіраўніцтвам бальшавікоў і пад іх лозунгамі. Заклікі кадэтаў, меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў да рабочых і салдат не ўдзельнічаць у дэманстрацыі і іх надзеі правесці дэманстрацыю пад сваімі сацыял-здрадніцкімі лозунгамі пацярпелі крах.

М. В. Фрунзе і іншыя бальшавікі ў сваіх выступленнях перад дэманстрантамі выкрывалі згодніцкую палітыку меншавікоў, эсэраў і буржуазных нацыяналістаў, заклікалі рабочых і салдат зрываць імперыялістычныя планы Часовага ўрада, браць уладу ў свае рукі. Аб гэтай дэманстрацыі Мінскі Савет пісаў: «Рэвалюцыйная дэмакратыя г. Мінска паказала 18 чэрвеня поўнае яднанне сваіх сіл і згуртаванасць у барацьбе за дэмакратычны мір і далейшае развіццё рэвалюцыі супраць усіх тых, хто ўсё выратаванне сваё бачыць у зацягванні вайны і ліквідацыі рэвалюцыі».

Як і прадбачылі бальшавікі, наступленне на фронце правалілася. Абурэнню рабочых і салдат, якія патрабавалі спынення імперыялістычнай вайны, не было межаў. У Петраградзе 3 ліпеня яно вылілася ў магутную дэманстрацыю пад лозунгам пераходу ўсёй улады ў рукі Саветаў. Нягледзячы на тое што дэманстрацыя насіла мірны характар, Часовы ўрад выкарыстаў яе як зачэпку для ўзмацнення наступлення на рэвалюцыйных рабочых, салдат і сялян, для рэпрэсій супраць іх кіраўніка — бальшавіцкай партыі. Супраць дэманстрантаў ён накіраваў юнкераў і казакаў. Вуліцы Петраграда афарбаваліся крывёй рабочых і салдат.

Контррэвалюцыя перайшла ў наступленне на рэвалюцыйныя арганізацыі працоўных па ўсёй краіне. На вуліцах Мінска з'явіліся ўдарныя і казацкія часці, «батальёны смерці», накіраваныя сюды Стаўкай вярхоўнага галоўнакамандуючага, якая размяшчалася ў Магілёве, і камандаваннем Заходняга фронту для расправы з рэвалюцыйнымі рабочымі. Генерал Карнілаў аддаў загад па Мінскаму ваеннаму гарнізону адкрываць агонь па салдатах, якія братаюцца, а ў выпадку «пранікнення для братання праціўніка ў наша размяшчэнне ў

палон не браць, а калоць прышэльцаў на месцы і трупы іх выстаўляць уперадзе дротавых агароджаў».

Мінская турма была перапоўнена арыштаванымі за ўдзел у рэвалюцыйным руху рабочымі і салдатамі. Для арыштаваных адвялі дзве гаўптвахты, занялі многія казармы і нават памяшканне жаночай гімназіі. Пад абаронай штаба Заходняга фронту і аховай «ударнікаў» у горадзе актывізаваліся чарнасоценцы, манархісты, былыя паліцэйскія. У друкарні Някрасава, былога старшыні мінскага аддзела «Саюза Міхаіла Архангела», фабрыкаваліся лістоўкі і адозвы пагромнага характару.

Фабрыканты і заводчыкі павялі наступленне на палітычныя і эканамічныя заваёвы рабочых. Яны спрабавалі абмежаваць функцыі рабочых арганізацый, пачалі звальняць з прадпрыемстваў рабочы актыў, уводзіць на фабрыках старыя, дарэвалюцыйныя парадкі. Прадпрыемцы ствараліе свае аб'яднанні з мэтай забяспечыць адзінства дзеянняў у барацьбе з рабочымі. Заключылі паміж сабой дагаворы ўладальнікі папяровых фабрык Мінскага раёна аб адначасовым аб'яўленні лакаута ў выпадку ўзнікнення стачкі на якім-небудзь з гэтых прадпрыемстваў. Аб'ядналіся ўладальнікі гарбарных заводаў горада. Лакауты сталі звычайнай з'явай на прадпрыемствах, у горадзе расло беспрацоўе.

У Мінску быў тэрмінова скліканы з'езд памешчыкаў Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і часткі Віленскай губерняў, на якім быў намечан план дзеянняў супраць сялянскіх выступленняў. Памешчыкі падтрымлівалі цесную сувязь са штабамі воінскіх часцей, каб пры іх садзеянні арганізаваць падаўленне аграрнага руху. Мінская губернская земельная ўправа пастанавіла неадкладна аддаваць пад суд вінаватых у захопе памешчыцкіх зямель.

Актыўнымі памочнікамі контррэвалюцыі з'яўляліся беларускія і яўрэйскія буржуазныя нацыяналісты. У пачатку ліпеня ў Мінску адбыўся другі з'езд беларускіх нацыяналістычных арганізацый, скліканы БНК. На ім была створана «Цэнтральная рада беларускіх арганізацый», якая паставіла сабе на мэце аб'яднанне ўсіх беларускіх буржуазна-нацыяналістычных арганізацый не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і за яе межамі для барацьбы супраць сацыялістычнай рэвалюцыі.

Пераход контррэвалюцыі ў адкрытае наступленне на рэвалюцыю азначаў, што двоеўладдзе ў краіне скончылася. Уся паўната ўлады перайшла ў рукі буржуазнага Часовага ўрада, які ад палітыкі ашуканства і лавіравання перайшоў да палітыкі адкрытага насілля над масамі. Скончыўся мірны перыяд рэвалюцыі. Партыя бальшавікоў, якая зноў пайшла ў падполле, была вымушана змяніць сваю тактыку ў адпаведнасці з абстаноўкай, якая склалася. У артыкуле «Да лозун-

гаў» У. І. Ленін указваў, што палітычнае становішча ў Расіі пасля 4 ліпеня карэнным чынам адрозніваецца ад становішча 27 лютага — 4 ліпеня. Эсэры і меншавікі сваім адраднідтвам сарвалі мірны шлях развіцця рэвалюцыі. Цяпер, пасля пераходу ўсёй улады ў рукі контррэвалюцыі, рабочы клас мог узяць уладу толькі шляхам узброенага паўстання.

2. Падрыхтоўка да ўзброенага паўстання супраць Часовага ўрада

У новай гістарычнай абстаноўцы, калі суадносіны сіл змяніліся не ў карысць бальшавікоў, У. І. Ленін распрацаваў тактычную лінію партыі, якая адпавядала гэтай абстаноўцы. Ён патрабаваў цеснага адзінства легальнай і нелегальнай работы ў масах, перабудовы агітацыі. Указваючы партыі на неабходнасць падрыхтоўкі ўзброенага паўстання, У. І. Ленін папярэджваў аб несвоечасовасці неадкладнага выступлення, адзначаў, што рашучы штурм магчымы толькі пры новым рэвалюцыйным уздыме ў самых глыбокіх масах.

VI з'езд РСДРП(б), які адбыўся 26 ліпеня — 3 жніўня 1917 года, зыходзячы з умоў бягучага моманту і кіруючыся ўказаннямі У. І. Леніна аб новай тактыцы бальшавікоў, пастанавіў часова зняць лозунг «Уся ўлада Саветам!», таму што Саветы, якімі кіруюць меншавікі і эсэры, ператварыліся пасля ліпеньскіх падзей у просты прыдатак Часовага ўрада. Але гэта не азначала, што цяпер бальшавікі пачалі выступаць супраць Саветаў. У. І. Ленін указваў, што прыйдзе час, калі лозунг «Уся ўлада Саветам!» зноў трэба будзе паставіць на парадак дня. «Саветы могуць і павінны будуць паявіцца ў гэтай новай рэвалюцыі, але *не* цяперашнія Саветы, не органы згодніцтва з буржуазіяй, а органы рэвалюцыйнай барацьбы з ёй» [1].

На VI з'ездзе партыі ад Мінскай бальшавіцкай арганізацыі дэлегатам быў А. Ф. Мяснікоў. Ён далажыў аб становішчы ў Мінску і на Заходнім фронце, аб рабоце бальшавікоў сярод рабочых, сялян і салдат, аб тым, што Мінскі Савет «знаходзіцца ў руках бальшавікоў... мае вялікі ўплыў у рабочых колах, ведучы іх за сабой ідэйна».

Для бальшавікоў Беларусі, як і ўсёй краіны, рашэнні VI з'езду партыі сталі праграмай далейшай рэвалюцыйнай работы сярод мас, падрыхтоўкі да ўзброенага паўстання. 20 жніўня ў Мінску адбылася агульнагарадская канферэнцыя бальшавікоў, якая заслухала даклады з месцаў і абмеркавала пытанні: аб бягучым моманце, аб перавыбарах у Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а таксама аргані-

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 25, стар. 172.

зацыйныя пытанні. Было вырашана склікаць 4 верасня абласную і франтавую канферэнцыю бальшавікоў. З мэтай лепшай падрыхтоўкі да яе Мінскі камітэт РСДРП(б) накіраваў сваіх лепшых агітатараў і прапагандыстаў на прадпрыемствы, у прафсаюзы, у воінскія часці, у вёскі для чытання лекцый, дакладаў, удзелу ў дыскусіях на палітычныя тэмы. Для работы сярод арыштаваных салдат была выдзелена спецыяльная група прапагандыстаў.

27 ліпеня ў Мінску пад рэдакцыяй А. Ф. Мяснікова пачала выходзіць бальшавіцкая газета «Звезда» — орган Мінскага камітэта РСДРП(б), якая адыграла велізарную ролю ў палітычным выхаванні мас. Яна выдавалася на сродкі чытачоў — рабочых, салдат, сялян. «На агульным фоне рускай рэчаіснасці і нашага партыйнага будаўніцтва,— пісаў А. Ф. Мяснікоў,— «Звезда» была тым фокусам, адкуль зыходзілі ва ўсе бакі, як на фронт, так і ў правінцыю (маючы на ўвазе цэнтрам вобласці горад Мінск), промні палітычнага выхавання і грамадскага пераўтварэння буйных салдацкіх, батрацкіх і рабочых элементаў Заходняга краю... «Звезда» заклала моцны падмурак нашага будынка. Стройныя камуністычныя ячэйкі і моцныя бальшавіцкія арганізацыі сталі фактам у грамадскім жыцці Заходняй вобласці. Цэнтрам іх служыла «Звезда».

«Звезда» была сапраўдным бальшавіцкім агітатарам і арганізатарам мас. Яна нястомна растлумачвала працоўным рашэнні VI з'езду партыі, выступала вяшчальнікам узброенага паўстання, звяржэння контррэвалюцыйнага Часовага ўрада, улады памешчыкаў і капіталістаў і захопу ўлады пралетарыятам у саюзе з бяднейшым сялянствам.

Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам генерал Балуеў даносіў Часоваму ўраду: «Звезда» аб'явіла бязлітасную вайну буржуазіі, памешчыкам, капіталу. Кожны яе нумар — суцэльны заклік да насілля над гэтымі класамі насельніцтва». Часовы ўрад вырашыў расправіцца з газетай: па сакрэтнаму распараджэнню яна была забаронена. Аднак неўзабаве «Звезда» пачала выходзіць пад назвай «Молот», а калі «Молот» быў закрыты, газета выйшла пад назвай «Буревестник».

У барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў VI з'езду РСДРП(б) бальшавікі Мінска дабіліся сур'ёзных палітычных вынікаў. Па важнейшых пытаннях — аб бягучым моманце, аб адносінах да Часовага ўрада і па некаторых іншых — бальшавіцкая фракцыя забяспечыла прыняцце Мінскім Саветам сваіх рэзалюцый. Меншавікі, бундаўцы і эсэры, якія ўносілі свае рэзалюцыі і папраўкі да рэзалюцый бальшавікоў, былі не ў стане павярнуць абмеркаванне важнейшых палітычных пытанняў у пажаданы для сябе бок. Так, рэзалюцыю эсэраў, якая выказвала поўнае давер'е Часоваму ўраду, Савет адхіліў большасцю галасоў.

Мінскія бальшавікі мелі сваю фракцыю і ў гарадской думе. У яе склад уваходзілі К. Ландэр, А. Неўскі, І. Скуратовіч, В. Голубева і В. Вашкевіч. Фракцыя выкрывала злачынную палітыку Часовага ўрада, згодніцкіх партый, патрабавала прыняцця рашэнняў аб неадкладным заканчэнні грабежніцкай вайны, выступала за прыняцце мер, накіраваных на паляпшэнне эканамічнага становішча рабочых, у абарону іх правоў, настойвала на арганізацыі гарадской гаспадаркі ў інтарэсах працоўных.

Вялікую работу вялі бальшавікі і ў прафсаюзах — самых масавых арганізацыях працоўных. У жніўні 1917 года па ініцыятыве праўленняў прафсаюзаў, фабзаўкомаў і партыйных арганізацый горада адбыліся сходы членаў прафсаюзаў, на якіх абмяркоўваліся пытанні палітычнага становішча ў краіне і задачы пралетарыяту ў данай рэвалюцыі. Удзельнікі сходу заявілі рашучы пратэст супраць рэакцыйнай палітыкі Часовага ўрада, супраць разгрому партыйных і прафсаюзных арганізацый і праследаванняў бальшавіцкай партыі.

Пры актыўным удзеле прафсаюзаў узмацніўся стачачны рух рабочых за павышэнне заработнай платы і 8-гадзінны рабочы дзень там, дзе ён яшчэ не быў уведзены. Павышэння заработнай платы патрабавалі друкары, рабочыя гарбарных заводаў і іншых прадпрыемстваў горада. Пад уплывам мацнеючага рабочага руху Мінскі Савет прыняў рэзалюцыю, у якой патрабаваў неадкладнага выдання закону аб працы і ўстанаўленні рабочага кантролю над вытворчасцю, перанясення цяжару падатковай сістэмы на маёмныя класы.

Ліпень і жнівень 1917 года сталі месяцамі рашучага пералому ў настроі шырокіх мас рабочых, бяднейшых сялян і салдат, павароту іх у бок пралетарскай рэвалюцыі. Старшыня Мінскага Савета К. І. Ландэр у сваіх успамінах пісаў: «Салдаты завальвалі рэдакцыю нашай газеты сваімі пісьмамі. Нашы мітынгі былі перапоўнены, выступленні нашых прамоўцаў заўсёды сустракалі самы спачувальны водгук у масах. Меншавікі ўсё больш і больш адцяняліся на задні план. Эсэры яшчэ трымаліся, але іх уплыў у Савеце пачаў слабець. Прыязджаў ім на падмогу Чарноў — не дапамагло. Нават у сваёй звычайнай аўдыторыі «сялянскі міністр» не меў поспеху. Хутка Савет і, у прыватнасці, яго бальшавіцкая фракцыя сталі цэнтрам і галоўным рычагом палітычнага жыцця не толькі горада Мінска, але і ўсяго краю і Заходняга фронту.

Па ўсёй Беларусі ўзмацняўся рэвалюцыйны рух сялян. Гэтаму ў многім садзейнічалі агітатары, якіх сістэматычна накіроўваў у вёску Мінскі камітэт РСДРП(б). У паветах Мінскай губерні ствараліся новыя батрацкія камітэты. 30 ліпеня ў Мінску сабраўся II з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. Выступаючы на з'ездзе,

бальшавікі растлумачвалі сялянам мэты і задачы сацыялістычнай рэвалюцыі, сутнасць бальшавіцкіх лозунгаў.

Пад уплывам рабочага і сялянскага руху, які нарастаў, агітацыі бальшавікоў узмацніліся рэвалюцыйныя выступленні салдат Мінскага гарнізона. Аб гэтым усё часцей паведамлялася ў данясеннях камандзіраў часцей.

Расійская контррэвалюцыя, якой кіраваў генерал Карнілаў, у жніўні 1917 года зрабіла ўзброеную спробу задушыць рэвалюцыю ў краіне. Бальшавіцкая партыя на чале з У. І. Леніным арганізавала рэвалюцыйныя сілы на падаўленне контррэвалюцыйнага мяцяжу і забяспечыла яго разгром.

У дні барацьбы з карнілаўшчынай газета «Звезда» пісала: «Контррэвалюцыя, кіруемая штабам, аб'явіла паход супраць салдацкіх арганізацый. Чыстка штабаў, гэтых ачагоў контррэвалюцыйнай заразы — вось задача моманту. Замена Кавеньяка — Карнілава рэвалюцыйнымі генераламі, вылучанымі самой арміяй,— вось лозунг дня».

На надзвычайным пасяджэнні Мінскага Савета 24 жніўня бальшавікі выкрылі спробы контррэвалюцыі ў асобе маскоўскай нарады і генералітэту ў асобе Карнілава задушыць рэвалюцыю. «Нам у парадак дня выстаўлен штык,— гаварыў пад апладысменты ўсёй залы А. Ф. Мяснікоў,— але штык гэты будзе павернуты супраць контррэвалюцыйнай буржуазіі».

Перад бальшавіцкімі арганізацыямі Мінска, Заходняга фронту і ўсёй Беларусі стаяла надзвычай адказная задача: мабілізаваць на барацьбу з карнілаўшчынай усіх рабочых і працоўных у прыфрантавой паласе і салдацкія масы фронту, ізаляваць Стаўку ад франтоў і пралетарскіх цэнтраў і не прапусціць у Петраград эшалоны войск генерала Карнілава.

Для барацьбы з карнілаўшчынай у Мінску 28 жніўня быў створаны Часовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт. У склад гэтага камітэта ўваходзілі прадстаўнікі Мінскага Савета і палітычных партый: Кажэўнікаў, Палянскі, Нікалаеў, Зальманаў, Ландэр, Хасін, Несцераў, Галавінскі, Вайнштэйн і Кашчанка. Рэвалюцыйную накіраванасць дзейнасці камітэта вызначала група бальшавікоў — членаў Часовага ВРК, якой кіраваў Ландэр. Рэвалюцыйны камітэт устанавіў сувязі з Саветамі ў тыле і камітэтамі на фронце і патрабаваў ад іх арышту і раззбройвання карнілаўскіх войск, устанавіў кантроль над дзейнасцю ўсіх паштовых і тэлеграфных устаноў, друкарняў, выдавецтваў. Улічваючы, што Карнілаў мог атрымаць падмацаванне з Паўднёва-Заходняга фронту праз Гомель і Оршу, камітэт накіраваў у Оршу, Шклоў, Лотву (пад Магілёвам) рэвалюцыйныя часці і сваіх прадстаўнікоў. У выніку гэтых мер магчымасць руху карнілаўскіх войск з боку Оршы была выключана.

Па прыкладу Петраградскай Чырвонай гвардыі на прадпрыем. ствах Мінска арганізоўваліся ўзброеныя рабочыя атрады. Рашэнне аб арганізацыі чырвонагвардзейскіх атрадаў было прынята рабочымі 31 жніўня на сходзе ўсіх праўленняў прафсаюзаў горада. На чыгунначным вузле былі створаны дзве баявыя дружыны: пры чыгунных майстэрнях (камандзір І. П. Голубеў) і пры дэпо (камандзір І. Н. Барушка). У іх радах налічвалася 230 чалавек. Чырвонагвардзейцы патрулявалі па горадзе і яго ўскраінах. Яны затрымлівалі ўсіх асоб, якія вялі агітацыю за падтрымку выступлення Карнілава.

У ходзе барацьбы з карнілаўшчынай атрады дружыннікаў кольмасна значна павялічыліся. Для каардынацыі іх дзейнасці 26 жніўня быў створаны штаб рэвалюцыйных войск мінскага ўчастка на чале з М. В. Фрунзе. У яго склад уваходзілі Смірноў, Чатырбок, Гаўрылаў.

Контррэвалюцыйнае выступленне Карнілава пацярпела паражэнне дзякуючы самаадданасці рабочых і салдат, якімі кіравала бальшавіцкая партыя. Немалы ўклад у разгром карнілаўшчыны ўнеслі і бальшавікі Мінска. Эшалоны карнілаўскіх войск, якія рухаліся на Петраград і Маскву праз Мінск, Оршу і іншыя чыгуначныя вузлы Беларусі, затрымліваліся рэвалюцыйнымі рабочымі і салдатамі гарнізона. Прыхільнікі Карнілава падвяргаліся арышту. «Петроградская газета» паведамляла: «У Мінску па дарозе к фронту арыштавана 40 афіцэраў, якія выехалі са Стаўкі з паўнамоцтвамі ад генерала Карнілава. У ліку арыштаваных знаходзіўся старшыня саюза афіцэраў Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага Навасільцаў».

Разгром контррэвалюцыйнага мяцяжу Карнілава паказаў, што ўплыў бальшавіцкай партыі на шырокія масы працоўных непамерна вырас. Гэта знайшло сваё адлюстраванне і ў росце бальшавіцкіх арганізацый. На прадпрыемствах і чыгуначных вузлах Беларусі ствараліся партыйныя ячэйкі, афармляліся партыйныя групы і бальшавіцкія фракцыі ў Саветах, у камітэтах воінскіх часцей Заходняга фронту. 15 верасня, напрыклад, бальшавіцкая фракцыя была ўтворана ў франтавым камітэце Заходняга фронту, у яе склад увайшлі Любімаў, Магілёўскі, Крывашэін, Мяснікоў, Шчукін, Фамін, Калмановіч, Селязнёў, Апетэр, Грамашэўскі і інш.

Мінскі камітэт РСДРП(б), які па сутнасці выконваў функцыі абласнога камітэта, склікаў 1 верасня канферэнцыю бальшавікоў Паўночна-Заходняга краю і прадстаўнікоў бальшавіцкіх арганізацый Заходняга фронту. На канферэнцыю прыбылі толькі 46 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 6061 члена партыі. 15 з іх прадстаўлялі 2410 членаў партыі Беларусі, 31 дэлегат быў выбран ад 3651 члена партыі армій Заходняга фронту. Нешматлікі склад дэлегатаў тлумачыўся тым, што многія бальшавікі былі заняты ліквідацыяй карнілаўскага мяцяжу. Улічваючы гэту акалічнасць, было вырашана праводзіць не

канферэнцыю, а нараду, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Заходняя абласная і франтавая нарада».

Нарада адзначыла рост радоў бальшавіцкіх арганізацый, несумненнае павышэнне палітычнай свядомасці мас, іх хуткі адыход ад згодніцкіх партый і згуртаванне вакол бальшавікоў. У прынятай рэзалюцыі ўказвалася, што меншавіцка-эсэраўскія «Саветы і камітэты ўсё больш і больш адрываюцца ад мас і не адлюстроўваюць іх сапраўднай думкі і настрояў... Мы лічым неадкладнай задачай моманту патрабаванне паўсюднага перавыбрання Саветаў і камітэтаў на аснове поўнай свабоды агітацыі і самага шырокага выбарчага права».

Заходняя абласная і франтавая нарада згуртавала, такім чынам, раскіданыя па вобласці і фронту бальшавіцкія ячэйкі, узброіла іх выразнымі партыйнымі дырэктывамі па ўсіх пытаннях. Ацэньваючы вынікі нарады, Я. М. Свярдлоў пісаў: «Вельмі добра, што абласное аб'яднанне стала фактам. Маючы заўсёды вялікае значэнне, яно ў цяперашні час набывае асабліва важнае значэнне, тым больш, калі групы, якія ўваходзяць у арганізацыі, раскіданы ў розных месцах».

Нарада прыняла рашэнне склікаць 15 верасня Паўночна-Заходнюю абласную і франтавую канферэнцыю і выбрала абласное бюро. У яго склад увайшлі А. Ф. Мяснікоў, С. Г. Магілёўскі, В. І. Красноў, В. В. Фамін, В. С. Селязнёў.

Першая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б) адбылася 15—18 верасня 1917 года ў Мінску. На яе прыбылі 88 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 9190 членаў партыі, у тым ліку ад Мінска 17 дэлегатаў. Яна абмеркавала важнейшыя ў той час пытанні: аб рэпрэсіях супраць РСДРП(б), даклады абласнога бюро і даклады з месцаў, аб сучасным моманце, пераглядзе партыйнай праграмы, аб выбарах ва Устаноўчы сход, арганізацыйныя пытанні. Па ўсіх пытаннях былі прыняты рашэнні, накіраваныя на падрыхтоўку ўзброенага паўстання і ўзмацненне дзейнасці бальшавікоў па мабілізацыі мас на сацыялістычную рэвалюцыю.

Канферэнцыя пастанавіла: Паўночна-Заходнюю вобласць лічыць створанай з Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай губерняў, часткі Віленскай губерні і ўсяго Заходняга фронту. Абласны партыйны цэнтр было вырашана назваць Паўночна-Заходнім абласным камітэтам РСДРП(б). У яго склад увайшлі А. Ф. Мяснікоў, М. М. Хатаевіч, Л. В. Грамашэўскі, В. І. Красноў, В. В. Каменшчыкаў, В. С. Селязнёў, В. В. Фамін, І. Я. Алібегаў, С. Е. Шчукін, Пурсэ, Абрамаў, Калмановіч, Раеў, Ціхменеў, Пыжоў, Апетэр, Сцяпанаў, Рагазінскі, Міхаленка, Таганаў, Крапівін, Якубоўскі, Якаўлеў, Сашнікоў, Філатаў, Фішман. Адно месца было пакінута для прадстаўніка партыйнай арганізацыі Віцебска. Старшынёй камітэта быў выбраны А. Ф. Мяс-

нікоў. Канферэнцыя пастанавіла: лічыць газету «Молот» органам Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б). Такім чынам, І канферэнцыя завяршыла афармленне адзінай бальшавіцкай арганізацыі на тэрыторыі Беларусі і Заходняга фронту.

Пасля канферэнцыі, выконваючы яе рашэнні, бальшавікі Мінска яшчэ шырэй разгарнулі работу па падрыхтоўцы мас да ўзброенага паўстання. Асноўная ўвага была звернута на кампанію перавыбараў у Мінскі Савет, завяршэнне якой намячалася на першы тыдзень кастрычніка 1917 года.

Да гэтага часу Петраградскі і Маскоўскі Саветы перайшлі на бок бальшавікоў, што адкрыла новую паласу ў развіцці рэвалюцыі. «Атрымаўшы большасць у абодвух сталічных Саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў,— гаварыў У. І. Ленін,— бальшавікі могуць і *павінны* ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі» [1]. На чаргу дня зноў быў пастаўлены лозунг «Уся ўлада Саветам!». Але гэта быў ужо не ранейшы лозунг пераходу ўлады ў рукі Саветаў, якімі кіравалі эсэры і меншавікі; гэта быў новы лозунг, лозунг узброенага паўстання супраць Часовага ўрада з мэтай перадачы ўсёй улады ў краіне Саветам, якімі кіравалі б бальшавікі.

У ходзе кампаніі па перавыбарах Мінскага Савета бальшавікі правялі вялікую палітычную работу. У газеце «Молот» быў апублікаваны «Праект наказу» ад выбаршчыкаў будучаму дэпутату ў Мінскі Савет. Асноўныя пункты наказу, напісанага А. Ф. Мясніковым у духу Праграмы бальшавіцкай партыі, зводзіліся да наступных патрабаванняў: перадача ўсёй улады Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, неадкладнае заканчэнне вайны, перадача зямлі сялянам, дэмакратызацыя арміі, ажыццяўленне лозунга права нацый на самавызначэнне, устанаўленне рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем, увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня. Агітатары-бальшавікі працавалі непасрэдна ў масах, на прадпрыемствах і чыгуначным вузле. Для рабочых і салдат было прачытана больш за 40 дакладаў па сучаснаму моманту і аб значэнні перавыбараў Саветаў.

У горадзе адбыліся масавыя сходы рабочых і салдат, на якіх давалі справаздачу дэпутаты Савета, выбранага ў маі 1917 года, і абмяркоўваўся бальшавіцкі наказ.

17 верасня, калі пачаліся перавыбары дэпутатаў, газета «Молот» выступіла з перадавым артыкулам, прысвечаным выбарам і ролі Мінскага Савета. «Мінск,— адзначалася ў ім,— дзверы фронту, Мінск — ідэйны цэнтр фронту. Да голасу Мінскага Савета прыслухоўваюцца не толькі рабочыя і салдаты горада... але і тыя нашы таварышы, якія

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 1.

сядзяць у сырых акопах, і тыя, якія вядуць арганізацыйную работу ў часцях». Газета заклікала рабочых і салдат выганяць з Саветаў і камітэтаў меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў і накіроўваць туды бальшавікоў — сапраўдных абаронцаў інтарэсаў працоўных. На пытанне аб тым, каго выбраць у Савет, яна адказвала:

«Тых: Хто за неадкладны мір!
Хто за разняволенне арміі!
Хто супраць пакарання смерцю!
Хто за рэвалюцыйна-дэмакратычную ўладу!
Хто за неадкладны пераход усёй зямлі без выкупу
ў рукі сялянскіх Саветаў і камітэтаў!
Хто за кантроль рабочых арганізацый над
прамысловасцю і харчаваннем!
За гэта ўсё стаяць толькі інтэрнацыяналісты, рэвалюцыйныя сацыялісты, гэта значыць сацыял-дэмакраты бальшавікі».

Перавыбары Мінскага Савета закончыліся 6 кастрычніка 1917 года. Яны прынеслі бальшавікам вялікую палітычную перамогу над згоднікамі, з'явіліся сведчаннем іх вялікага ўплыву на шырокія масы працоўных горада і салдат гарнізона. З 337 дэпутацкіх месц 184 атрымалі бальшавікі, 60 — эсэры, па 21 — меншавікі і бундаўцы, 48 — дэпутаты без пэўнай партыйнай прыналежнасці, 3 — сіяністы. З гэтых суадносін відаць, што бальшавікі атрымалі галасоў амаль у два разы больш, чым дэпутаты ад усіх дробнабуржуазных і нацыяналістычных партый і арганізацый. 8 кастрычніка адбыўся сход новага складу Савета. Старшынстваваў А. Ф. Мяснікоў. Быў выбраны выканком Савета, у якім бальшавікі атрымалі 23 месцы з 36, або 63,9 працэнта. Старшынёй Савета быў выбраны бальшавік К. І. Ландэр.

Пасля перавыбараў Савет стаў надзейнай апорай Мінскай бальшавіцкай арганізацыі ў надзвычайна складанай рабоце па падрыхтоўцы і правядзенню ўзброенага паўстання, на ажыццяўленне якога нацэліў партыю VI з'езд РСДРП(б).

5—7 кастрычніка 1917 года ў Мінску адбылася II Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б), якая ўвайшла ў гісторыю Кампартыі Беларусі як канферэнцыя, непасрэдна звязаная з вялікімі кастрычніцкімі падзеямі. Усе пытанні, у тым ліку і падрыхтоўка да II з'езду Саветаў, абмяркоўваліся і вырашаліся на ёй у сувязі з пытаннямі барацьбы за ўладу. У рашэннях канферэнцыі падкрэслівалася, што «бліжэйшай задачай выратавання рэвалюцыі з'яўляецца ўзяцце ў свае рукі... усёй паўнаты ўлады як у цэнтры, так і на месцах».

На канферэнцыі прысутнічалі 353 дэлегаты, якія прадстаўлялі 28 591 члена партыі, і 27 856 спачуваючых. У цэнтры ўвагі былі пы-

танні бягучага моманту, дзейнасці Абласнога камітэта РСДРП(б), перавыбараў у Саветы, тактыкі партыі ва ўмовах падрыхтоўкі да II Усерасійскага з'езду Саветаў, рашэнне аб скліканні якога было прынята пад націскам бальшавікоў ЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў 23 верасня 1917 года, і інш. Па пытанню аб скліканні II Усерасійскага з'езду Саветаў канферэнцыя абавязала ўсе мясцовыя арганізацыі РСДРП(б) прыкласці максімум намаганняў да забеспячэння склікання з'езду ў прызначаны тэрмін. І бальшавікі выканалі гэту задачу. Яны штодзённа растлумачвалі працоўным, што толькі пераход улады да бальшавіцкіх Саветаў забяспечыць мір, перадачу зямлі сялянам, фабрык і заводаў — рабочым, пазбавіць працоўны народ ад прыгнёту і эксплуатацыі.

Эсэры, меншавікі, бундаўцы, беларускія нацыяналісты павялі злосную кампанію супраць склікання II Усерасійскага з'езду Саветаў. Аднак наперакор намаганням згоднікаў абласная канферэнцыя Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якая была склікана ў Мінску 16 кастрычніка, прызнала скліканне II Усерасійскага з'езду Саветаў неабходным і неадкладным. Абмяркоўваючы на сходах рашэнне гэтай канферэнцыі, рабочыя, сяляне, салдаты паўсюдна прымалі рэзалюцыі аб пераходзе ўсёй улады ў рукі бальшавіцкіх Саветаў і неабходнасці склікання з'езду. 18 кастрычніка 1917 года агульны сход Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў выбраў трох дэлегатаў на II Усерасійскі з'езд Саветаў.

У перыяд падрыхтоўкі да ўзброенага паўстання бальшавікі Мінска не пакідалі без увагі і такое пытанне, як выбары ва Устаноўчы сход, паколькі лозунг аб неабходнасці яго склікання меў яшчэ значную папулярнасць у масах. Пытанні «Аб Устаноўчым сходзе» і «Аб выбарах кандыдатаў ва Устаноўчы сход» абмяркоўваліся на II Паўночна-Заходняй канферэнцыі. Аднак асноўная палітычная работа бальшавіцкіх арганізацый канцэнтравалася на галоўнай мэце — падрыхтоўцы II Усерасійскага з'езду Саветаў.

У гэты час у Мінску пачасціліся рэвалюцыйныя выступленні рабочых, сялян і салдат супраць Часовага ўрада. 9 кастрычніка 1917 года забасталі рабочыя механічнай майстэрні «Молат». З 15 па 28 кастрычніка баставалі чыгуначнікі, рабочыя дрожджа-вінакурных заводаў, пэндзле-шчоткавай фабрыкі і іншых прадпрыемстваў. У паветах Мінскай губерні ўсё больш масавымі станавіліся выступленні сялян, якія патрабавалі перадачы ўлады Саветам, зямлі — сялянам. Бяднейшае сялянства ішло за бальшавіцкай партыяй і з'яўлялася надзейным саюзнікам пралетарыяту ў надыходзячай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Вакол бальшавікоў усё цясней згуртоўваліся салдаты Заходняга фронту і Мінскага гарнізона. Ротныя, палкавыя камітэты паўсюдна

прымалі рэвалюцыі аб перадачы ўлады Саветам і гвяржэнні Часовага ўрада. Аб настроях фронту красамоўна сведчаць данясенні штаба галоўнакамандуючага Заходняга фронту. 30 верасня, напрыклад, ён пісаў: «У сувязі з апошнімі падзеямі ў тыле і ў розных частях гаварылася: «У настрої салдат... за мінулы тыдзень прыкметна пагаршэнне... Рэлігійным поспехам карыстаецца агітацыя, у большасці падмасе...» 22 кастрычніка штаб паведамляў: «Нервовы настрой нарастае з кожным днём, парушэнні дысцыпліны захопліваюць новыя часці. Прапаганда бальшавікоў пераважае і карыстаецца поспехам... ненавісць да афіцэраў расце... настрой войск фронту пагаршаецца».

Контррэвалюцыя вырашыла расправіцца з рэвалюцыйна настроенымі масамі. Штаб Заходняга фронту сцягваў да Мінска ўдарныя батальёны, падраздзяленні казакаў, польскіх легіянераў і іншыя рэакцыйныя часці. Прымаліся меры да расфарміравання воінскіх частак (напрыклад, 37 і 289 пяхотных запасных палкоў), якія поўнасцю падтрымлівалі палітычныя і эканамічныя патрабаванні працоўных. Рыхтавауся разгром Мінскага Савета і камітэта РСДРП(б). Аднак спробы контррэвалюцыі пацярпелі поўны правал.

Пад кіраўніцтвам бальшавікоў рабочыя горада і салдаты гарнізона ўзмоцнена рыхтаваліся да рашаючых сутыкненняў з буржуазіяй. Атрады Чырвонай гвардыі, створаныя яшчэ ў дні карнілаўшчыны, не былі распушчаны, нягледзячы на патрабаванні меншавікоў і будаўцаў. Увесь верасень і кастрычнік чырвонагвардзейцы вывучалі ваенную справу, прымалі ў свае рады новых добраахвотнікаў. З вязняў мінскай турмы бальшавікі стварылі ўдарную баявую адзінку, гатовую ў любы момант уступіць у апошні бой з контррэвалюцыяй.

Падрыхтоўка ўзброенага паўстання ў Мінску праходзіла пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК РСДРП(б). ЦК партыі, распрацоўваючы планы ўзброенага паўстання ў Петраградзе, разумеў, якое велізарнае значэнне для яго поспеху мела становішча на Заходнім і Паўночным франтах, дзе канцэнтравалася пераважная колькасць войск дзеючай арміі. Заходні фронт і Мінск былі тымі раёнамі краіны, на якія звяртałася асаблівая ўвага ЦК партыі. У. І. Ленін высока цаніў дзейнасць бальшавікоў Мінска і Заходняга фронту, якія здолелі завяваць на бок пралетарскай рэвалюцыі шырокія салдацкія масы.

На гістарычным пасяджэнні ЦК РСДРП(б) 10 кастрычніка 1917 года, якое абмяркоўвала пытанне аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання, была заслухана інфармацыя Я. М. Свярдлова аб становішчы ў Мінску і на Паўночным фронце. Свярдлоў гаварыў: «З Мінска па-

ведамляюць, што там рыхтуецца новая карнілаўшчына, Мінск з прычыны характару гарнізона акружан казацкімі часцямі. Ідуць нейкія перагаворы паміж штабамі і Стаўкай падазронага характару. Вядзецца агітацыя сярод асецін і асобных часцей войск супраць бальшавікоў. На фронце ж настрой за бальшавікоў, пойдуць за імі супраць Керанскага» [1].

У. І. Ленін указваў на пасяджэнні, што прапанову мінчан аб пасылцы войск у Петраград трэба выкарыстаць для пачатку рашучых дзеянняў [2]. У прынятай рэзалюцыі гаварылася: «Прызнаючы, такім чынам, што ўзброенае паўстанне непазбежна і зусім наспела, ЦК прапануе ўсім арганізацыям партыі кіравацца гэтым і з гэтага пункту гледжання абмяркоўваць і вырашаць усе практычныя пытанні (з'езду Саветаў Паўночнай вобласці, вываду войск з Піцера, выступлення масквічоў і мінчан і г. д.)» [3].

Прыведзеныя факты паказваюць, што бальшавікі Мінска былі цесна звязаны ў сваёй дзейнасці з Цэнтральным Камітэтам і ўсю работу па падрыхтоўцы ўзброенага паўстання праводзілі пад яго непасрэдным кіраўніцтвам. Для перагавораў і атрымання дырэктыў ад ЦК РСДРП(б) у Петраград ездзіў А. Ф. Мяснікоў.

Становішча ў Мінску з кожным днём рабілася ўсё больш напружаным. Штаб фронту спрабаваў справакаваць мінскіх рабочых і салдат на заўчаснае ўзброенае выступленне, распаўсюджваючы ілжывыя чуткі аб выступленні бальшавікоў, якое нібыта рыхтуецца на 18 кастрычніка. Мінскі Савет рашуча абвергнуў гэтыя чуткі. Ён звярнуўся да насельніцтва з заклікам не паддавацца контррэвалюцыйным правакацыям. «Таварышы рабочыя і салдаты,— гаварылася ў адозве.— Памятайце, што ніводнага рашэння, ніводнага кроку вы не павінны рабіць ні пры якіх акалічнасцях без ведама і дазволу Савета. Самая нязначная неасцярожнасць, самая нязначная памылка з вашага боку можа паслужыць на руку цёмным сілам, якія хочуць нанесці ўдар рэвалюцыі».

Газета «Буревестник», якая выходзіла замест закрытай Часовым урадам газеты «Молот», у гэтыя дні ўзмоцнена прапагандавала неабходнасць пераходу ўсёй улады ў краіне ў рукі Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Контррэвалюцыя спрабавала сарваць выпуск «Буревестника». Штаб Заходняга фронту атрымаў загад ад Керанскага аб закрыцці газеты, але ўжо было позна: у гэты час рашаўся лёс самога Керанскага і буржуазнага ўрада, які ён узначальваў.

[1] Я. М. Свердлов. Избранные произведения, т. II. М., 1959, стр. 66—67.
[2] Гл.: У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 161.
[3] Там жа, стар. 162.

22 кастрычніка Мінскі Савет адзначаў дванаццацігоддзе Петраградскага Савета. З дакладам аб Петраградскім Савеце 1905 года на пасяджэнні выступіў А. Ф. Мяснікоў. Падрабязна ахарактарызаваўшы абстаноўку ў краіне і ў Беларусі, Мяснікоў паставіў пытанне аб неабходнасці неадкладнага ўзброенага паўстання. У пастанове Савета было запісана: «Калі Часовы ўрад не перадасць улады Саветам, мы павінны будзем паўстаць і ўзяць яе».

3. Устанаўленне Савецкай улады

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 года ўвайшло ў гісторыю Савецкай дзяржавы як дзень перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая паклала пачатак новай эпохі ў жыцці чалавецтва — эпохі сацыялізма, камунізма. У гэты дзень перамогай рабочых і рэвалюцыйных салдат, якімі кіравала партыя бальшавікоў на чале з У. І. Леніным, завяршылася ўзброенае паўстанне ў Петраградзе супраць буржуазнага Часовага ўрада.

У апублікаванай раніцай 25 кастрычніка адозве Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта пры Петраградскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў «Да грамадзян Расіі», напісанай У. І. Леніным, паведамлялася, што «Часовы ўрад звергнуты. Дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі органа Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў — Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, які стаіць на чале петраградскага пралетарыяту і гарнізона» [1].

Тэлеграмы аб пераходзе ўлады ў Петраградзе ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ПВРК) былі разасланы па ўсёй краіне і на ўсе франты і з'явіліся сігналам для ўзяцця ўлады бальшавікамі. ПВРК заклікаў рэвалюцыйныя сілы на месцах «не дапусціць адпраўкі з фронту ненадзейных вайсковых часцей на Петраград, дзейнічаць словам і пераканаццем, а дзе не дапамагае — перашкаджаць адпраўцы бязлітасным ужываннем сілы».

А падзеі ў Петраградзе працягвалі развівацца ў імклівым тэмпе. 25 кастрычніка ў 2 гадзіны 35 мінут дня адкрылася экстранае пасяджэнне Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. На ім было заслухана паведамленне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта аб звяржэнні Часовага ўрада і перамозе рэвалюцыі. З дакладам аб задачах Савецкай улады выступіў У. І. Ленін. Ленін сказаў: «Таварышы! Рабочая і сялянская рэвалюцыя, аб неабходнасці якой увесь час гаварылі бальшавікі, адбылася... Ад гэтага часу надыходзіць новая паласа ў гісторыі Расіі, і даная трэцяя руская рэвалюцыя павінна

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 207.

ў сваім канчатковым выніку прывесці да перамогі сацыялізма... Мы павінны заняцца пабудовай... сацыялістычнай дзяржавы»[1].

Позна вечарам 25 кастрычніка ў Смольным адкрыўся II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. На яго прыбылі 670 дэлегатаў ад 402 Саветаў краіны, з іх 380 бальшавікоў. На з'ездзе былі прадстаўлены Саветы як цэнтральных раёнаў краіны, так і яе нацыянальных ускраін — Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі, Каўказа, Сярэдняй Азіі. Дэлегаты нацыянальных раёнаў складалі каля $^1/_3$ з'езду.

З'езд з вялікім рэвалюцыйным уздымам сустрэў паведамленне аб узяцці Зімняга палаца і арышце членаў Часовага ўрада. Пад бурныя апладысменты была прынята напісаная У. І. Леніным адозва «Рабочым, салдатам і сялянам!», якая абвясціла аб пераходзе ўлады ў цэнтры і на месцах да Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

З'езд прыняў велізарнай гістарычнай важнасці дэкрэты аб міры і аб зямлі, аб адмене пакарання смерцю на фронце, аб неадкладным вызваленні з турмаў салдат і афіцэраў, арыштаваных за рэвалюцыйную дзейнасць, і рад іншых пастаноў. З дакладам па пытанню аб міры выступіў У. І. Ленін. Ён сказаў, што «пытанне аб міры ёсць неадкладнае пытанне, балючае пытанне сучаснасці», што «рабочы і сялянскі ўрад, які створаны рэвалюцыяй 24—25 кастрычніка і абапіраецца на Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, прапануе ўсім ваюючым народам і іх урадам пачаць неадкладна перагаворы аб справядлівым дэмакратычным міры»[2].

Выказваючы волю бальшавіцкай партыі, працоўных краіны, У. І. Ленін звярнуўся да свядомых рабочых Англіі, Францыі, Германіі, якія мелі вялікі вопыт рэвалюцыйнай барацьбы, з заклікам дапамагчы народам Расіі «давесці да канца справу міру і разам з тым справу вызвалення працоўных і эксплуатуемых мас насельніцтва ад усякага рабства і ўсякай эксплуатацыі»[3].

У заключным слове У. І. Леніна па дакладу аб міры быў выразна сфармуляваны важнейшы прынцып знешняй палітыкі Савецкай сацыялістычнай дзяржавы — мірнае суіснаванне дзяржаў з розным грамадскім і дзяржаўным ладам[4]. Даклад У. І. Леніна аб міры і яго заключнае слова былі пакладзены ў аснову Дэкрэта аб міры, аднадушна прынятага з'ездам.

З дакладам аб зямлі на з'ездзе таксама выступіў У. І. Ленін. Ён падкрэсліў, што рэвалюцыя патрабуе выразнай пастаноўкі пытання аб

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 208.
[2] Там жа, стар. 217.
[3] Там жа, стар. 220.
[4] Гл.: У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 222—223.

зямлі. што зямля павінна быць перададзена ў рукі сялян [1]. Зачытаны У. І. Леніным праект Дэкрэта аб зямлі гаварыў, што памешчыцкая ўласнасць на зямлю адмяняецца неадкладна без усякага выкупу. Уся зямля аб'яўлялася агульнанароднай дзяржаўнай уласнасцю. Памешчыцкія, удзельныя, манастырскія, царкоўныя землі з усім жывым і мёртвым інвентаром перадаваліся ў бясплатнае карыстанне працоўных. Ва ўласнасць народа пераходзілі ўсе багацці зямлі (нафта, вугаль, руда і г. д.), лясы, воды. Ажыццяўленне дэкрэта павінна было прывесці да фактычнай нацыяналізацыі зямлі ў краіне і ліквідацыі класа памешчыкаў.

На II Усерасійскім з'ездзе былі выбраны вышэйшыя органы Савецкай улады. Заканадаўчую ўладу ў краіне ажыццяўляў Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ВЦВК), выканаўчую — Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з У. І. Леніным. У складзе ВЦВК з 101 члена 62 былі прадстаўнікамі партыі бальшавікоў, 29 месц належала левым эсэрам, якія ў дні падрыхтоўкі і правядзення сацыялістычнай рэвалюцыі падтрымалі бальшавікоў. У СНК увайшлі толькі бальшавікі.

Першыя дэкрэты Савецкай улады, якія адлюстроўвалі карэнныя інтарэсы шырэйшых мас працоўных Расіі, мелі велізарнае значэнне для палітычнага выхавання рабочых і сялян, удзячнення іх у актыўнае грамадска-палітычнае жыццё, у барацьбу за новае жыццё, за сацыялізм.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, пачаўшыся ў цэнтры Расіі, к лютаму 1918 года пашырылася па ўсёй краіне. Гэта сапраўды было, як указваў У. І. Ленін, трыумфальнае шэсце Савецкай улады.

Мінск быў у ліку першых гарадоў у краіне, у якіх улада перайшла ў рукі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў у той жа дзень, што і ў Петраградзе. Ужо 25 кастрычніка па распараджэнню Мінскага Савета з гарадской турмы былі вызвалены салдаты і рабочыя, арыштаваныя Часовым урадам пасля ліпеньскіх падзей за ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях. Яны склалі Першы імя Мінскага Савета рэвалюцыйны полк, які налічваў каля дзвюх тысяч чалавек. Полк складаўся з трох батальёнаў, кулямётнай каманды, каманды сувязі і пешай разведкі, палкавога лазарэта. Каб забяспечыць полк зброяй, члены бальшавіцкай фракцыі Мінскага Савета забралі з гарадскіх артылерыйскіх складаў 30 кулямётаў, 1500 вінтовак, 170 кулямётных стужак, 90 тысяч патронаў.

Член Мінскага камітэта РСДРП(б) і выканкома Савета Я. Ф. Пярно, які з'яўляўся ў той час камісарам зброевых майстэрняў, у сваіх

[1] Гл.: У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 224.

успамінах так апісвае эпізод з узбройваннем вызваленых з турмы: «У самы першы момант выдавалі вінтоўкі тым з салдат, якія першымі выйшлі з турмы. Быў такі хвост за вінтоўкамі, які можна было бачыць толькі каля крам у час голаду».

Чырвонагвардзейскі атрад быў створаны на чыгуначным вузле Мінска ў складзе 400 чалавек. Бальшавікі ўзброілі таксама рабочых мінскіх прадпрыемстваў і салдат 37 і 289-га запасных палкоў, якія былі раскватэраваны ў горадзе і перайшлі на бок рэвалюцыі. Рэвалюцыйныя атрады, а таксама рэвалюцыйна настроеныя салдаты Мінскага гарнізона з'явіліся ўзброенай апорай бальшавікоў у барацьбе за Савецкую ўладу.

Па распараджэнню Мінскага Савета на пошце, тэлеграфе, радыёстанцыі, ля зброевых майстэрняў, на вакзале і ў іншых важных пунктах горада былі расстаўлены рэвалюцыйныя пасты. Успамінаючы аб падзеях першага дня сацыялістычнай рэвалюцыі ў Мінску, іх удзельнік, член КПСС з 1917 года, член Мінскага Савета, рабочы-чыгуначнік І. П. Голубеў піша, што бальшавікі адразу ж «устанавілі групавыя і адзіночныя пасты на важнейшых участках чыгуначнага вузла, узялі пад строгі кантроль дзеянні начальніка станцыі Мінск. Было ўстаноўлена дзяжурства на тэлеграфе і важнейшых месцах па лініі ад Оршы да Баранавіч».

Сваю поўную гатоўнасць падтрымаць Кастрычніцкі рэвалюцыйны пераварот і Савецкую ўладу працоўныя Мінска і салдаты гарнізона прадэманстравалі на мітынгу, які адбыўся 25 кастрычніка на Петраградскай (цяпер Ленінградская) вуліцы. Кіраўнікі мінскіх бальшавікоў аб'явілі аб рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе і пераходзе ўлады ў рукі Саветаў. На ім выступілі з прамовамі А. Ф. Мяснікоў, К. І. Ландэр, Н. І. Крывашэін і інш. На сцягах удзельнікаў мітынгу было напісана: «Далоў суровую бойню!», «Няхай жыве Інтэрнацыянал!», «Няхай жыве Савецкая ўлада!». У прынятай рэзалюцыі гаварылася, што салдаты і рабочыя аднадушна будуць стаяць на варце Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і не дапусцяць замахаў на заваёвы рэвалюцыі. Удзельнік мітынгу бальшавік С. В. Федаровіч у дні Кастрычніка — старшыня ротнага салдацкага камітэта, пісаў: «На гэтым мітынгу на маю долю як прадстаўніка Мінскага гарнізона выпаў гонар павіншаваць салдат, рабочых і ўсіх працоўных Мінска з перамогай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і аб'явіць аб арганізацыі Чырвонай гвардыі для абароны заваёў працоўнага народа». Тут жа на мітынгу камендантам Мінскага гарнізона быў назначаны салдат, член выканкома Мінскага Савета бальшавік Н. І. Крывашэін.

25 кастрычніка ў памяшканні гарадскога тэатра сабралася пасяджэнне выканкома Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Абмяркоўвалася пытанне аб узяцці ўлады ў Мінску. Большасць дэпутатаў Савета — бальшавікі, левыя эсэры, інтэрнацыяналісты — прагаласавалі за гэта рашэнне. Быў зацверджаны тэкст загаду № 1 выканкома Мінскага Савета «Да насельніцтва гор. Мінска і яго ваколіц» — першага дакумента Савецкай улады ў Беларусі, які паведамляў аб пераходзе ўсёй улады ў Мінску ў рукі Савета. Загад абвяшчаў: «Улада ў Петраградзе перайшла ў рукі Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Увесь Петраградскі гарнізон, Балтыйскі флот і іншыя воінскія часці прызналі новую ўладу. Паступаюць адусюль данясенні, што армія і воінскія часці на ўсіх франтах прызнаюць новую ўладу, захоўваючы поўны спакой. У Мінску ўлада перайшла ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які звярнуўся да ўсіх рэвалюцыйных арганізацый і палітычных партый з прапановай неадкладна распачаць арганізацыю часовай рэвалюцыйнай улады на месцах. Аб'яўляючы аб тым, што здарылася, Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў даводзіць да ведама ўсіх грамадзян, што ім прыняты самыя рашучыя меры да аховы рэвалюцыйнага парадку і ўстанаўлення жалезнай дысцыпліны ўсюды. Устаноўлена рэвалюцыйная цэнзура над усімі газетамі, якія выходзяць у Мінску і атрымліваюцца тут, для папярэджання распаўсюджвання чутак, якія хвалююць насельніцтва».

Працоўныя горада адобрылі дзейнасць Мінскага Савета, які ўзяў уладу ў свае рукі. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, рэзалюцыя, прынятая на сходзе рабочых прамысловых прадпрыемстваў і прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання: «Абмеркаваўшы бягучы палітычны момант у сувязі з пераходам улады да Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, пастанавілі: прызнаць уладу Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і выконваць усе іх указанні, абараняць іх да апошняга моманту, хоць бы прыйшлося памерці».

Адной з першачарговых задач Мінскага Савета была арганізацыя барацьбы супраць контррэвалюцыі, якая аб'ядналася вакол штаба Заходняга фронту. Улічваючы той факт, што ў Мінску былі сканцэнтраваны буйныя контррэвалюцыйныя сілы, якія налічвалі каля 20 000 чалавек, выканком Савета 26 кастрычніка 1917 года перадаў усім часцям фронту і Мінскага гарнізона свой загад аб тым, што падлягаюць выкананню загады галоўнакамандуючага Заходнім фронтам генерала Балуева толькі аператыўнага характару, а ўся палітычная дзейнасць штаба кантралюецца Саветам праз яго камісараў — бальшавікоў С. Е. Шчукіна і П. Н. Палукарава.

Такое распараджэнне азначала ўстанаўленне кантролю бальшавікоў над штабам і дыктавалася інтарэсамі рэвалюцыі. Яно выклікала перапалох у камандным саставе штаба. Атрымаўшы загад, генерал

Балуеў адразу ж паведаміў у Стаўку: «У Мінску ўсё ў свае рукі ўзяў Савет салдацкіх і рабочых дэпутатаў... Зараз з'явіўся караул і патрабуе праводзіць работу пад кантролем іхняга рэвалюцыйнага штаба. Становішча дрэннае. Я не ведаю, як з яго выйду... На гарнізон Мінска спадзявацца не магу».

Прызнаўшы на словах кантрольныя правы камісараў Савета, штаб фронту на справе стаў на шлях паспешлівага збірання ў Мінску контррэвалюцыйных сіл і падрыхтоўкі іх да ўзброенай барацьбы супраць Савецкай улады. З камандаваннем штаба Заходняга фронту блакіраваліся ворагі сацыялістычнай рэвалюцыі — меншавікі, правыя эсэры, бундаўцы, беларускія буржуазныя нацыяналісты. На пасяджэнні выканкома Мінскага Савета 26 кастрычніка згодніцкі блок меншавікоў, правых эсэраў і бундаўцаў заявіў свой пратэст супраць узяцця ўлады Мінскім Саветам і запатрабаваў звароту ўлады гарадской думе. Патрэбна была найвялікшая палітычная пільнасць бальшавікоў і працоўных Мінска, рэвалюцыйная арганізаванасць мас, каб не дапусціць контррэвалюцыйнага перавароту, адстаяць заваяваную ўладу.

26 кастрычніка вечарам на пасяджэнні Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) было вырашана стварыць пры выканкоме Мінскага Савета Рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, які ў пачатку лістапада 1917 года быў перайменаваны ў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту. Перад ім была пастаўлена задача па кіраўніцтву барацьбой за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце і ўмацаванню заваёў Вялікага Кастрычніка, а таксама аказання ўсямернай дапамогі рэвалюцыі ў Петраградзе і Маскве. У склад камітэта ўвайшлі: прэзідыум Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, бюро Паўночна-Заходняга абласнога Савета, члены бальшавіцкай фракцыі франтавога камітэта і прадстаўнікі воінскіх часцей Заходняга фронту, відныя дзеячы рэвалюцыйнага руху ў Беларусі — А. Ф. Мяснікоў (старшыня), В. Г. Кнорын, К. І. Ландэр, М. І. Калмановіч і інш.

Абапіраючыся на рэвалюцыйныя рабочыя атрады і воінскія часці, на падтрымку і дапамогу рабочых і сялян, ВРК арганізаваў ахову рэвалюцыйнага парадку і бяспекі насельніцтва, рашуча змагаўся супраць пашырэння розных правакацыйных чутак, праводзіў вялікую работу па стварэнню і ўмацаванню Саветаў на месцах, зрыву спроб контррэвалюцыйнай Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага і штаба Заходняга фронту перакінуць войскі з фронту для падаўлення рэвалюцыі ў Петраградзе і Маскве і ліквідацыі Савецкай улады ў Беларусі. Разам з мясцовымі бальшавіцкімі арганізацыямі ВРК узяў пад кантроль работу чыгунак і чыгуначных вузлоў у Мінску, Оршы, Гомелі і іншых гарадах, праз якія Стаўка магла б перакід-

ваць воінскія часці з Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў да сэрца сацыялістычнай рэвалюцыі — Петраграда — на дапамогу контррэвалюцыі.

На прадпрыемствах Мінска паспешліва фарміраваліся рабочыя дружыны. Пытанне аб становішчы ў горадзе абмяркоўвалася 30 кастрычніка на пасяджэнні цэнтральнага бюро прафсаюзаў. Пад уплывам бальшавікоў пасяджэнне ў рэзалюцыі аб уладзе запісала: «Арганізаваны пралетарыят г. Мінска, бачачы ў Саветах сваю апору, заяўляе, што ўсякая спроба падаўлення Саветаў з якога б там ні было боку сустрэне з яго боку самае рашучае процідзеянне».

З мэтай умацавання ўзброенай апоры Савецкай улады Ваенна-рэвалюцыйны камітэт разгарнуў вялікую работу па стварэнню і ўмацаванню атрадаў Чырвонай гвардыі. Члены ВРК А. Ф. Мяснікоў, К. І. Ландэр, В. Г. Кнорын і іншыя праводзілі нарады з рабочымі, з фабрычна-заводскімі камітэтамі, на якіх распрацоўваліся планы арганізацыі атрадаў Чырвонай гвардыі, іх задачы і парадак залічэння ў іх.

Палітычная і ваенна-арганізацыйная работа бальшавікоў Мінска па мабілізацыі працоўных на барацьбу за Савецкую ўладу асабліва вялікую ролю адыграла ў дні адкрытага выступлення контррэвалюцыі ў Петраградзе, а затым і ў Мінску. Перамога сацыялістычнай рэвалюцыі, якая рашуча парвала ланцугі ранейшай кабальнай залежнасці Расіі ад замежнага капіталу і выратавала краіну ад катастрофы, выклікала шалёную злосць звергнутых эксплуататарскіх класаў Расіі і міжнароднага імперыялізму. Буржуазія і памешчыкі, якія абапіраліся на дробнабуржуазныя контррэвалюцыйныя партыі меншавікоў і эсэраў, выступілі супраць рабочых і сялян са зброяй у руках. На другі ж дзень пасля рэвалюцыйнага пераварота ў Петраградзе былы кіраўнік буржуазнага Часовага ўрада Керанскі рушыў на цытадэль рэвалюцыі войскі пад камандаваннем генерала Краснова. Ашуканыя ім казацкія часці 27 кастрычніка захапілі Гатчыну. У гэты ж час барацьбу супраць Савецкай улады на Доне пачаў генерал Каледзін, аб'явіўшы вобласць Войска данскога на ваенным становішчы.

Спяшаючы на дапамогу Керанскаму, Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага на чале з генералам Духоніным 25 кастрычніка аддала загад аб неадкладнай адпраўцы на Петраград з Паўночнага фронту 1-й Данской і 5-й Каўказскай дывізій, самакатных батальёнаў і рада іншых воінскіх часцей.

26 кастрычніка ў Мінску адбыўся агульны сход членаў Бунда, на якім была прынята рэзалюцыя супраць улады Саветаў. 27 кастрычніка мінская гарадская дума прыняла рэзалюцыю, якая ацэньвала выступленне бальшавікоў у Петраградзе як «яўнае злачынства». Што

датычыць улады, то яна лічыла неабходным стварыць «Часовы ўрад з нетраў дэмакратыі».

У ноч на 26 кастрычніка правыя эсэры і меншавікі стварылі ў Петраградзе контррэвалюцыйную арганізацыю пад дэмагагічнай назвай «Камітэт выратавання радзімы і рэвалюцыі» і ўзнялі антысавецкі мяцеж юнкераў. Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага распарадзілася паслаць на дапамогу контррэвалюцыі франтавыя воінскія часці, у тым ліку з Заходняга фронту. Дыпламатычныя прадстаўнікі капіталістычных дзяржаў, выконваючы заданні сваіх урадаў, займаліся ў Расіі шпіянажам, арганізацыяй антысавецкіх змоў, мяцяжоў і дыверсій. Яны ўступалі ў прамы кантакт з белагвардзейскімі генераламі, накіроўваючы іх на барацьбу супраць Савецкай дзяржавы і забяспечваючы зброяй, боепрыпасамі, амуніцыяй. Амерыканскі імперыялізм, імкнучыся задушыць маладую Савецкую рэспубліку голадам, выступіў ініцыятарам галоднай блакады.

Контррэвалюцыйныя «камітэты», якія аб'ядноўвалі варожыя Савецкай уладзе элементы, правыя эсэры і меншавікі стварылі і ў радзе іншых гарадоў краіны. Такі «Камітэт выратавання рэвалюцыі» быў утвораны 27 кастрычніка і ў Мінску. На чале яго стаяў меншавік Калатухін. У склад «камітэта» ўвайшлі прадстаўнікі буржуазных і дробнабуржуазных партый і арганізацый, рэакцыйных ваенных арганізацый, гарадскога самакіравання і іншых буржуазных арганізацый і органаў Часовага ўрада.

У рэакцыйны паход супраць Савецкай улады ўключыліся беларускія і яўрэйскія нацыяналісты. 27 кастрычніка буржуазна-нацыяналістычная «Беларуская рада» звярнулася з адозвай да беларускага насельніцтва, у якой заклікала яго выступіць супраць сацыялістычнай рэвалюцыі. Кіраўніцтва яўрэйскай буржуазна-нацыяналістычнай партыі Паалей-цыён разаслала членам сваёй партыі дырэктыву, у якой заклікала іх увайсці ў «Камітэт выратавання рэвалюцыі».

Контррэвалюцыя паспрабавала забраць уладу ў Мінскага Савета. У поўдзень 27 кастрычніка на вуліцах і плошчах горада з'явіліся патрулі «камітэта», былі выстаўлены гарматы і кулямёты. У сваіх дзеяннях «камітэт» абапіраўся галоўным чынам на Каўказскую кавалерыйскую дывізію, вядомую сваім чарнасоценным складам, якая была ўведзена ў Мінск 26—27 кастрычніка, на часці польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага і на некаторыя іншыя воінскія падраздзяленні, выкліканыя Балуевым у Мінск ужо ў першыя дні рэвалюцыі. Арганізатары «камітэта» ставілі сабе на мэце захоп улады ў горадзе, разгром бальшавіцкіх Мінскага Савета і Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Беларусі і Заходняга фронту. Для дасягнення гэтай мэты яны выкарысталі самыя гнюсныя прыёмы. Па гарадах і сёлах Бела-

русі, па Заходняму фронту пайшлі пушчаныя контррэвалюцыянерамі ілжывыя чуткі нібыта аб звяржэнні Савецкага ўрада, перамозе Керанскага і г. д. Цэнтрам контррэвалюцыйных сіл у іх барацьбе супраць Савецкай улады стаў штаб Заходняга фронту.

27 кастрычніка «камітэт» праз меншавіка Штэрна прад'явіў Мінскаму Савету ультыматум, пагражаючы ў выпадку яго адхілення крывапраліццем. Ва ультыматуме «камітэт» патрабаваў ад Савета перадаць яму ўсю ўладу ў горадзе. Адначасова Галоўная стаўка паслала загад у дзеючую армію з патрабаваннем зняць з фронту асобныя часці і перакінуць да Масквы і Петраграда на дапамогу мяцежнікам.

Арганізатарам разгрому антысавецкага мяцяжу Керанскага — Краснова з'явілася бальшавіцкая партыя. У гэтыя дні У. І. Ленін указваў, што «на фронце за Керанскім няма нікога», што «нават хісткія элементы, як, напрыклад, члены чыгуначнага саюза, выказваюцца за дэкрэт аб міры і аб зямлі», што «велізарная большасць сялян, салдат і рабочых стаіць за палітыку міру» [1].

З мэтай зрыву спроб контррэвалюцыі арганізаваць новае наступленне супраць Савецкай улады з дапамогай франтавых часцей Петраградскі ВРК апублікаваў адозву «Да ўсяго насельніцтва» з заклікам даць адпор контррэвалюцыйным казакам, якія ішлі на Петраград. На вырашэнні гэтай задачы і сканцэнтравалі свае намаганні бальшавікі Мінска.

Каб перашкодзіць адпраўцы войск з Заходняга фронту ў Петраград і Маскву і прадухіліць на фронце сутыкненне паміж рэвалюцыйнымі войскамі і ашуканымі прыхільнікамі Керанскага, не дапусціць пагромных дзеянняў контррэвалюцыі ў Мінску (у колькасных адносінах яе ўзброеныя сілы перавышалі ў гэтыя дні сілы рэвалюцыі), Мінскі Савет вырашыў пайсці на часовае пагадненне з «камітэтам» і накіраваў у яго сваіх прадстаўнікоў І. Я. Алібегава, Я. І. Пярно. Сутнасць гэтага пагаднення заключалася ў тым, што «камітэт» часова атрымаў уладу ў раёне Заходняга фронту і абавязаўся не пасылаць войскі для падаўлення рэвалюцыі ў Петраградзе і Маскве. Прадстаўнікі Мінскага Савета ўваходзілі ў склад «камітэта» толькі да таго часу, пакуль апошні строга прытрымліваўся ўзятых на сябе абавязацельстваў аб непасылцы войск для падмацавання контррэвалюцыйных атрадаў Керанскага.

Аб прычынах, па якіх у першыя дні рэвалюцыі перавага сіл у Мінску аказалася на баку контррэвалюцыі, І. Я. Алібегаў пісаў: «Наша арганізацыя тады пераацэньвала свае сілы і недаацэньвала сілы і магчымасці праціўніка рабіць уплыў на воінскія часці. У гэтым была наша памылка».

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 26, стар. 235.

Абстаноўка, якая стварылася, патрабавала ад мінскіх бальшавікоў і адпаведнай гібкай тактыкі. Іх часовае пагадненне з «камітэтам» і з'явілася тактычным манеўрам, неабходным у той канкрэтнай абстаноўцы. Паслаўшы сваіх прадстаўнікоў у «камітэт», бальшавікі фактычна заставаліся гаспадарамі становішча як у горадзе, так і на Заходнім фронце. Характэрна, што ахова будынка Савета і вакзала не была здадзена «камітэту». Аб тым, што «камітэт» не стаў фактычным гаспадаром становішча ў Мінску, сведчаць прызнанні самых актыўных дзеячоў контррэвалюцыі. Так, 29 кастрычніка генерал Балуеў у размове па прамому проваду з генералам Духоніным вымушаны быў прызнаць, што, накіраваўшы сваіх прадстаўнікоў у «камітэт», Мінскі Савет «здаўся толькі для бачнасці», што бальшавікі «вядуць узмоцненую прапаганду на фронце», што ўся ўлада знаходзіцца ў руках Мінскага Савета. «Сам я,— заяўляў далей Балуеў,— заняў чакальную пазіцыю і падобны на чалавека, які сядзіць на бочцы пораху з падпаленым шнурам... Становішча вельмі цяжкае».

Паведамляючы аб пагадненні з «камітэтам» усім працоўным Беларусі і салдатам, бальшавікі звярталі іх увагу на неабходнасць узмацнення пільнасці ў барацьбе супраць спроб контррэвалюцыі звергнуць Савецкую ўладу. Разам з тым бальшавікі працягвалі разгортваць работу па мабілізацыі мас на барацьбу за ўмацаванне Савецкай улады, растлумачваючы ім сутнасць дэкрэтаў Савецкага ўрада.

Меншавікі і правыя эсэры, буржуазныя нацыяналісты ўсяк тармазілі ажыццяўленне дэкрэтаў і пастаноў Савецкага ўрада, стараліся ўтаіць ад народа праўду аб сацыялістычнай рэвалюцыі, распаўсюджвалі паклёпніцкія выдумкі аб партыі бальшавікоў і Савецкай уладзе. На сходзе прадстаўнікоў прафесіянальных саюзаў і фабрычна-заводскіх камітэтаў Мінска 31 кастрычніка бундаўцы Вайнштэйн і Фрыд выступілі супраць улады Саветаў. Вайнштэйн нахабна, наперакор фактам, заявіў, што «бальшавіцкі ўрад застанецца ізаляваным, бо большасць народа не ідзе з бальшавікамі».

Старшыня Мінскага Савета К. І. Ландэр, выступаючы на гэтым сходзе, вельмі рэзка крытыкаваў беларускіх і яўрэйскіх нацыяналістаў, якія спрабавалі зганьбіць сацыялістычную рэвалюцыю, і падкрэсліў, што толькі сацыялістычная рэвалюцыя і Савецкая ўлада далі працоўнаму народу мір, зямлю і волю. Ён заклікаў рабочых і ўсіх працоўных горада цясней згуртавацца вакол бальшавікоў і рашуча змагацца супраць контррэвалюцыі.

Контррэвалюцыйны «камітэт» не выконваў прынятых на сябе абавязацельстваў. Спробы перакідкі войск з Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў працягваліся, што выклікала абурэнне працоўных Беларусі і салдат Заходняга фронту. 31 кастрычніка «камітэт»

прад'явіў Мінскаму Савету і Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту Пяў ночна-заходняй вобласці новы ультыматум, у якім патрабаваў неадкладна спыніць друкаванне на тэрыторыі Беларусі і Заходняга фронту ніякіх бы там ні было распараджэнняў урада Савета Народных Камісараў і Петраградскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, разабраенні Першага імя Мінскага Савета рэвалюцыйнага палка, адмовы ад падтрымкі ўрада Савета Народных Камісараў.

Бальшавікі Мінска, абапіраючыся на ўзброеныя атрады рабочых і дапамогу рэвалюцыйных салдат Заходняга фронту, рашуча адверглі гэты ультыматум. Яны надалі дзейнасці ўдзел у «камітэце» шкодным для рэвалюцыі і адазвалі з яго сваіх прадстаўнікоў.

З мэтай ліквідацыі «камітэта» былі ўзмоцнены сувязі з рэвалюцыйнымі часцямі Заходняга фронту. На даручэнне Савета ў дзеючую армію выехала група агітатараў-бальшавікоў у складзе С. Е. Шчукіна, В. С. Селянінова, В. В. Фаміна, Г. В. Салаўёва. Яны правялі сярод салдат вялікую растлумачальную работу і аказалі ім гатоўнасць дапамагчы рабочым Мінска разграміць контррэвалюцыю ў горадзе.

У ноч з 28 на 29 кастрычніка 1917 года з удзелам Г. В. Салаўёва адбылося пасяджэнне бальшавіцкай фракцыі армейскага камітэта 11 арміі, на якім абмяркоўвалася пытанне «Аб становішчы ў Мінску». Для аказання дапамогі мінскім бальшавікам было вырашана зняць з фронту і накіраваць у іх распараджэнне бліндзіраваны поезд, бронемашыны і два палкі пяхоты. Акрамя таго, быў сфарміраваны зводны чырвонагвардзейскі атрад з рэвалюцыйна настроеных салдат 5-й батарэі, батальёна пяхоты і кулямётнай роты 2-й Сібірскай дывізіі, якія дыслацыраваліся на станцыі Аляхновічы. Гэты атрад неўзабаве ўвайшоў у склад Першага імя Мінскага Савета рэвалюцыйнага палка.

30 кастрычніка ў жорсткім баі пад Царскім Сялом чырвонагвардзейцы нашчэнт разбілі мяцежныя войскі Керанскага, а 2 лістапада перад Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам капітуляваў «Камітэт выратавання радзімы і рэвалюцыі» ў Маскве. Паражэнне контррэвалюцыі ў Петраградзе і Маскве яшчэ больш узмацніла пазіцыі мінскіх бальшавікоў. Чырвонагвардзейскія атрады, якія прыбылі ў Мінск у ноч на 2 лістапада, і бліндзіраваны поезд пад камандаваннем бальшавіка В. І. Пралыгіна ўзмацнілі сілы бальшавікоў, і яны сталі на шлях рашучага спынення контррэвалюцыйных дзеянняў «камітэта».

Газета «Звезда» апублікавала зварот Мінскага Савета «Да рабочых, сялян, салдат і ўсяго насельніцтва Заходняга фронту», у якім выкрывалася контррэвалюцыйная сутнасць «камітэта» і паведамлялася, што Мінскі Савет адазваў з яго сваіх прадстаўнікоў, таму што

іх далейшае знаходжанне ў гэтым ачагу контррэвалюцыі прызнаў не толькі бескарысным, але нават шкодным для справы рэвалюцыі.

Днём 2 лістапада адбылося пасяджэнне Цэнтральнага бюро прафесіянальных саюзаў Мінска, на якім падрабязна абмяркоўвалася пытанне аб контррэвалюцыйнай дзейнасці «камітэта». Прадстаўнікі з фабрык і заводаў ад імя рабочых калектываў запатрабавалі прыняцця рашучых мер супраць контррэвалюцыянераў. Наперакор выступленням бундаўцаў, якія стаялі на «чакальных пазіцыях», Цэнтральнае бюро прафсаюзаў пад уплывам бальшавікоў і рэвалюцыйна настроеных рабочых адобрыла мерапрыемствы, намечаныя Мінскім Саветам па ліквідацыі злачыннай дзейнасці «камітэта» і пастанавіла адазваць з яго свайго прадстаўніка. Але паслаць прадстаўніка ў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які з'яўляўся адзіным органам Савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце, згоднікі з Цэнтральнага бюро адмовіліся, прыняўшы рашэнне застацца «нейтральнымі». Гэта было яўным ігнараваннем Савецкай улады, іх адкрытай дапамогай контррэвалюцыі.

Цэнтральнае бюро, меншавіцка-бундаўскае па свайму складу, не адлюстроўвала настрою радавых членаў прафсаюзаў. Гэта відаць хоць бы з таго, што пасяджэнне Цэнтральнага бюро прафсаюзаў Мінска 4 лістапада 1917 года, якое заняло ў адносінах да сацыялістычнай рэвалюцыі «нейтральную» пазіцыю, пакінулі прадстаўнікі дзевяці прафсаюзаў горада. У сваёй заяве яны запатрабавалі ад Цэнтральнага бюро паслаць прадстаўнікоў у Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, каб разам з імі змагацца за Савецкую ўладу.

2 лістапада 1917 года са складу франтавога камітэта выйшла бальшавіцкая фракцыя і звярнулася са спецыяльнай заявай «Да ўсіх салдат фронту», у якой гаварылася аб контррэвалюцыйнай здрадніцкай палітыцы эсэра-меншавіцкай большасці камітэта.

Вечарам 2 лістапада ў гарадскім тэатры адбыўся ўрачысты сход Мінскага Савета сумесна з прадстаўнікамі рабочых і салдат горада. З дакладам аб становішчы ў Мінску выступіў старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) А. Ф. Мяснікоў. Ён паведаміў аб перамозе над контррэвалюцыйным «Камітэтам выратавання рэвалюцыі», сканцэнтраванні ўсёй улады ў горадзе ў руках Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і задачах Савецкай улады. З вялікім натхненнем ўдзельнікі сходу прынялі рэзалюцыю, якая вітала Савецкую ўладу.

У наступныя дні Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які па сутнасці і ў дні вымушанага пагаднення з «камітэтам» не спыняў сваёй дзейнасці, накіраваў галоўную ўвагу на ўмацаванне ўлады Саветаў на тэрыторыі Паўночна-Заходняй вобласці і Заходняга фронту. З лістапада 1917 года ён выдаў загад, у якім заклікаў працоўных і салдат

выконваць распараджэнні толькі Савета Народных Камісараў і ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў, верыць толькі рэвалюцыйным газетам (бальшавіцкім) і не верыць «камітэтам выратавання». У гэтым жа загадзе Мінскі гарнізон заклікаўся да ўмацавання рэвалюцыйнай дысцыпліны, рашучага спынення ўсякага роду правакацый і антысавецкіх дзеянняў. Усім рэстаранам, тракцірам, кафейным, чайным прадпісвалася спыніць продаж спіртных напіткаў і разгул, які панаваў у іх сценах. «Неадкладна і бясспрэчна! — гаварылася ў загадзе.— Інакш будуць прыняты самыя строгія меры, аж да высылкі ўладальнікаў гэтых устаноў з горада».

У сувязі з пераходам усёй улады ў Мінску і на Заходнім фронце ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта ўсім установам, арганізацыям і асобам прадпісвалася выконваць распараджэнні і загады толькі ВРК, важнай чарговай задачай якога стала цяпер задача стварэння пастаянных і адзіных краявых і франтавых органаў Савецкай улады, ажыццяўлення мерапрыемстваў па нармалізацыі гаспадарчага і культурнага жыцця.

Пры ВРК былі створаны аддзелы: ваенны, гаспадарчы, забеспячэння, арганізацыйны і сувязі, мандатны, інфармацыйны. 4 лістапада 1917 года відны дзеяч бальшавіцкай партыі С. І. Берсан быў прызначаны камісарам па ўстанаўленню сувязі з усімі грамадскімі, цывільнымі і ваеннымі арганізацыямі і ўстановамі; паручнік Н. В. Рагазінскі — старшынёй ваеннага аддзела; В. Н. Фрэйман загадваў аддзелам забеспячэння; М. І. Калмановіч — арганізацыйным аддзелам; В. С. Селязнёў — інфармацыйным аддзелам. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыйных падзей у Мінску Г. Ф. Усцінаў у сваіх успамінах расказвае, што ВРК, бальшавікам горада пад кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) прыйшлося весці вялікую работу — і ваенна-палітычную, і арганізацыйную, каб «утрымаць і замацаваць атрыманую ў кастрычніцкія дні 1917 года перамогу». Аднак пры ўсёй разнастайнасці вялікіх і складаных задач будаўніцтва новага жыцця, якія паўсталі перад бальшавікамі Мінска з першых дзён сацыялістычнай рэвалюцыі, у цэнтры іх увагі была барацьба супраць контррэвалюцыі за ўмацаванне Савецкай улады.

З прычыны яўна контррэвалюцыйных дзеянняў былога камісара Заходняга фронту Жданава, якія выявіліся ў пасылцы войск для барацьбы супраць Савецкай улады ў Мінску і ў спробах накіраваць войскі на дапамогу Керанскаму, ВРК 4 лістапада пастанавіў арыштаваць Жданава і адправіць у распараджэнне Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, што і было зроблена. Быў арыштаваны таксама старшыня контррэвалюцыйнага «камітэта» С. Калатухін, а «камітэт» аб'яўлены распушчаным.

Генерал Балуеў 5 лістапада разаслаў усім начальнікам фронту тэлеграму, у якой прызнаваў, што ў Мінску «Камітэт выратавання рэвалюцыі» распаўся і перамогу атрымаў Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Што датычыць самога генерала Балуева, то ён 12 лістапада за адмову распачаць перагаворы аб перамір'і з Германіяй Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам быў адхілены ад пасады галоўнакамандуючага Заходнім фронтам. На пасаду галоўнакамандуючага быў прызначаны член Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта балышавік падпалкоўнік В. В. Каменшчыкаў. 12 лістапада старшыня ВРК А. Ф. Мяснікоў паведаміў У. І. Леніну, што ў Мінску і на Заходнім фронце завершаны рэвалюцыйны пераварот, што генерал Балуеў зняты з займаемай ім пасады, а штаб фронту знаходзіцца поўнасцю ў руках Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

Пацярпелі крах і спробы захопу ўлады ў Беларусі, якія былі зроблены беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі. Скліканы імі ў Мінску 15 снежня 1917 года «ўсебеларускі кангрэс» быў распушчаны Савецкай уладай за яўна контррэвалюцыйныя дзеянні яго арганізатараў — «Беларускай рады» і нацыяналістычнага «Беларускага абласнога камітэта».

У барацьбе за перамогу Савецкай улады на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці ў Мінску, актыўны ўдзел прынялі дзесяткі тысяч польскіх грамадзян. Напярэдадні рэвалюцыі ў Мінску існавала Польскае сацыялістычнае аб'яднанне (ПСА), якое па сваіх палітычных перакананнях хілілася да бальшавікоў. У склад кіруючага органа (праўлення) уваходзілі: С. Гельтман — старшыня, С. Янкоўскі — сакратар, Я. Машынская, С. Берсан, Я. Барыла, Р. Фалькоўскі, В. Клімашэўскі, І. Загорскі і інш.

З пачатку лістапада 1917 года ПСА пачало выдаваць легальную польскую газету «Правда». Газета заклікала польскіх працоўных падтрымліваць Савецкую ўладу, выкрывала падкопы нацыяналістычнай буржуазіі і яе партыі. У пачатку лістапада 1917 года ў Мінску адбыўся мітынг палякаў, на якім прысутнічала больш за 300 чалавек. На мітынгу з заклікам аб падтрымцы Савецкай улады выступілі С. Берсан, С. Гельтман, В. Паньскі, Я. Барыла, С. Янкоўскі. У прынятай рэзалюцыі гаварылася аб тым, што «бальшавікі з'яўляюцца адзінымі выразнікамі надзённых інтарэсаў працоўных мас усіх краін».

19—25 лістапада 1917 года, калі арганізацыя Саветаў на месцах была ў асноўным закончана, у Мінску адбыліся тры з'езды: абласны з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, II з'езд салдацкіх дэпутатаў армій Заходняга фронту і III з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. Яны прахо-

дзілі пад кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б).

Абласны з'езд Саветаў адбываўся 19—21 лістапада. На ім былі прадстаўлены Саветы Мінска, Гомеля, Бабруйска, Барысава, Оршы, Слуцка, Рагачова, Рэчыцы, Мазыра, Жлобіна, Асіповіч і шэрага іншых гарадоў і мястэчак Беларусі. Большасць дэлегатаў (460 з 560) складалі бальшавікі і спачуваючыя ім. Старшынстваваў бальшавік Красноў. З'езд абмеркаваў даклады аб сучасным моманце, аб прадуктовым і зямельным пытаннях, адобрыў пастанову II Усерасійскага з'езду Саветаў аб пераходзе ўсёй дзяржаўнай улады ў рукі Саветаў і заявіў, што адзінай паўнапраўнай уладай у краіне ён прызнае Савет Народных Камісараў і будзе змагацца за захаванне і ўмацаванне гэтай улады. Для кіраўніцтва мясцовымі Саветамі з'езд выбраў абласны Савет у складзе 35 чалавек на чале з бюро з 8 чалавек.

Прызнанне Савецкага ўрада шырокімі масамі працоўных Беларусі і салдат Заходняга фронту і іх гатоўнасць усямерна яго падтрымліваць былі ярка прадэманстраваны і на з'ездах Саветаў армій Заходняга фронту і сялянскіх Саветаў Мінскай і Віленскай губерняў.

II з'езд салдацкіх дэпутатаў армій Заходняга фронту адбыўся 20—25 лістапада 1917 года пад старшынствам А. Ф. Мяснікова. Гэты з'езд меў выключна вялікае значэнне для ўмацавання Савецкай улады ў Беларусі. Неабходна было цясней згуртаваць салдат вакол бальшавіцкай партыі, накіраваць іх намаганні на барацьбу за захаванне і ўмацаванне Савецкай улады, на барацьбу супраць рэакцыйнага генералітэту і афіцэрства, за мір без анексій і кантрыбуцый.

Ад ЦК бальшавіцкай партыі і Савецкага ўрада на з'езд прыехалі Г. К. Арджанікідзе і В. В. Валадарскі, які выступіў з дакладам па сучаснаму моманту. Ён вітаў дэлегатаў з'езду і ў іх асобе ўсіх салдат Заходняга фронту ад імя рэвалюцыйных рабочых і салдат Петраграда. «Вышэйшы орган улады Саветаў ЦВК,— сказаў В. В. Валадарскі,— даручыў мне перадаць, што ён будзе з усёй бязлітаснасцю змагацца з усімі, хто стаіць на шляху народнай улады. Але ніводнага дня гэта ўлада не застанецца на сваім месцы без вашай, таварышы, падтрымкі. Ці магу я перадаць Петраграду і народнаму ўраду, што Заходні фронт за нас?»

Дэлегаты адказалі: «Перадайце! Абавязкова перадайце! Няхай жывуць Саветы!» Салдаты не давалі гаварыць меншавікам і эсэрам, якія выступілі супраць Савецкай улады. Крыкамі «Далоў!», «Вон!», «Ганьба!», «Ганьба здраднікам!» яны праганялі іх з трыбуны.

У прынятай па дакладу Валадарскага рэзалюцыі гаварылася, што «цяпер увесь Заходні фронт з'яўляецца адной з апор Савецкай улады». Дэлегаты аднадушна далучыліся да рашэння з'езду рабочых і салдацкіх дэпутатаў аб стварэнні абласнога органа Савецкай улады

і выбралі франтавы камітэт у складзе 100 чалавек. 80 з іх былі бальшавікамі.

19—20 лістапада 1917 года працаваў III з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. Яго дэлегаты, у большасці сваёй сялянская беднота, аднадушна адобрылі дэкрэты Савецкага ўрада, горача дзякавалі народную ўладу за перададзеную ім у бясплатнае карыстанне зямлю. Яны перадалі з'езду наказы сваіх выбаршчыкаў, у якіх выказвалася агульнае імкненне ўсяго працоўнага сялянства да захавання і ўмацавання Савецкай улады, да цеснага саюзу з рабочым класам братняй Расіі, да ўзаемнай дапамогі і дружбы паміж працоўнымі Расіі і Беларусі.

З'езд прызнаў неабходным перавыбранне і рэарганізацыю старых валасных камітэтаў, указаў на неабходнасць хутчэйшага ўліку забранай у памешчыкаў зямлі, жывога і мёртвага інвентару і перароблення зямлі, лясоў, угоддзяў у адпаведнасці з ленінскім Дэкрэтам аб зямлі.

З'езд выбраў выканаўчы камітэт у складзе 35 чалавек і прыняў рашэнне аб зліцці яго з абласным Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Такім чынам, усе тры з'езды, выказваючы волю рабочых, салдат і працоўных сялян, прызналі неабходным стварыць у Беларусі абласны орган Савецкай улады. Выбраныя на з'ездах выканаўчыя камітэты аб'ядналіся і ўтварылі выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Паўночна-Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкомзах). Да яго перайшла ўся ўлада ў Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і частцы Віленскай губерняў, а таксама на Заходнім фронце.

26 лістапада 1917 года адбылося першае пленарнае пасяджэнне Аблвыканкомзаха, на якім быў выбран прэзідыум, вызначаны аддзелы і назначаны іх начальнікі, утвораны абласны Савет Народных Камісараў пад старшынствам К. І. Ландэра.

Стварэнне абласных органаў Савецкай улады — адзін з важных вынікаў барацьбы працоўных Беларусі і салдат Заходняга фронту за ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады. Аб'яднанне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў з Саветамі сялянскіх дэпутатаў з'явілася вялікай палітычнай перамогай бальшавіцкіх арганізацый. Яно садзейнічала павышэнню ўзроўню кіраўніцтва працоўнымі масамі сялянства з боку рабочага класа, умацаванню саюзу рабочых і сялян — асновы сілы і трываласці савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу.

Пераход дзяржаўнай улады ў Мінску ў рукі Саветаў, разгром контррэвалюцыйнага «Камітэта выратавання рэвалюцыі» паклалі пачатак перабудове гаспадарчага і грамадска-палітычнага жыцця

ў горадзе на новы, сацыялістычны лад. Абапіраючыся на падтрымку працоўнага насельніцтва горада, бальшавікі шырока разгарнулі арганізатарскую работу па ажыццяўленню дэкрэтаў II Усерасійскага з'езду Саветаў і створанага на ім Савецкага ўрада на чале з У. І. Леніным. На працягу кароткага перыяду — з 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 года па люты 1918 года, які У. І. Ленін назваў «перыядам трыумфальнага шэсця Савецкай улады і чырвонагвардзейскай атакі на капітал», былі ажыццёўлены многія важныя мерапрыемствы, накіраваныя на падрыў эканамічнай магутнасці буржуазіі, умацаванне Савецкай улады, стварэнне новага, савецкага дзяржаўнага апарату, паляпшэнне становішча працоўных.

Першым рэвалюцыйным мерапрыемствам у галіне прамысловасці было паўсюднае ўвядзенне 8-гадзіннага рабочага дня і рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем як першага кроку да поўнага пераходу фабрык і заводаў у рукі дзяржавы.

У Мінску не было такіх буйных прамысловых прадпрыемстваў, якія з мэтай сканцэнтравання камандных вышынь у прамысловасці ў руках дзяржавы падлягалі б неадкладнай нацыяналізацыі. Але Савецкая ўлада няўхільна праводзіла палітыку абмежавання і выцяснення сярэдніх і дробных капіталістаў, рыхтуючы разам з тым умовы для іх экспрапрыяцыі ў будучым.

Важнейшым звяном гэтай палітыкі і быў рабочы кантроль над вытворчасцю. На прадпрыемствах Мінска ён быў уведзены ў адпаведнасці з «Палажэннем аб рабочым кантролі», прынятым ВЦВК 14 лістапада 1917 года. «Палажэнне» прадугледжвала ўстанаўленне рабочага кантролю над усімі прамысловымі прадпрыемствамі «ў інтарэсах планамернага рэгулявання народнай гаспадаркі ва ўсіх прамысловых, гандлёвых, банкавых, сельскагаспадарчых, транспартных, кааператыўных, прадукцыйных таварыствах і інш. прадпрыемствах, якія маюць наёмных рабочых або даюць работу на дом».

Рабочы кантроль на прадпрыемствах ажыццяўляўся выбарнымі ўстановамі — заводскімі і фабрычнымі камітэтамі, саветамі старост і да т. п., рашэнні якіх былі абавязковымі для ўладальнікаў прадпрыемстваў.

У лістападзе — снежні 1917 года на прадпрыемствах Мінска спецыяльна былі створаны саветы рабочага кантролю. У іх склад уваходзілі, як правіла, прадстаўнікі прафесіянальных саюзаў, фабрычна-заводскіх камітэтаў і рабочых кааператываў. Яны ўзялі пад свой кантроль вытворчую дзейнасць прадпрыемстваў, фінансавыя аперацыі, вырашалі пытанні прыёму і звальнення рабочых, прызначэння майстроў і брыгадзіраў, праяўлялі клопаты аб павышэнні працоўнай дысцыпліны, аб паляпшэнні ўмоў працы і быту рабочых. Пры непасрэдным удзеле органаў рабочага кантролю на прадпрыемствах быў

практычна ажыццёўлены 8-гадзінны рабочы дзень, а таксама шэраг мер па ахове працы жанчын і падлеткаў.

У сувязі з перабудовай прамысловасці на мірную вытворчасць, якая пачалася пасля сацыялістычнай рэвалюцыі, і скарачэннем па гэтай прычыне аб'ёму работ у ваенных майстэрнях у Мінску павялічылася беспрацоўе. З-за недахопу сыравіны і паліва стаялі некаторыя прадпрыемствы, якія выпускалі прадметы спажывання. Іншыя працавалі з няпоўнай нагрузкай і не маглі забяспечыць работай усіх, хто меў у ёй патрэбу.

Органы рабочага кантролю дабіваліся ў прадпрыемцаў адлічэнняў ад прыбытку ў фонд дапамогі беспрацоўным, прымалі меры да пуску бяздзейнічаючых і да адкрыцця новых прадпрыемстваў і майстэрняў. Так, у першыя дні пасля ўстанаўлення Савецкай улады праўленне саюза гарбароў Мінска сумесна з саветам рабочага кантролю гарбарных прадпрыемстваў арганізавала шавецкую майстэрню, у якую былі накіраваны беспрацоўныя.

Для барацьбы з беспрацоўем пры Мінскім Савеце была створана біржа працы. Яна вяла ўлік беспрацоўных, накіроўвала іх на работу і клапацілася аб аказанні ім матэрыяльнай дапамогі. Пасрэдніцкая кантора па найму, якая існавала раней, была ліквідавана.

У адпаведнасці з дэкрэтам Савецкага ўрада на прадпрыемствах горада было ўведзена страхаванне на выпадак хваробы, страты працаздольнасці і па старасці. Рабочым, якія пацярпелі ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці, устанаўліваліся пенсіі.

Бальшавікі праяўлялі паўсядзённыя клопаты аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавога становішча працоўных горада, павышэнні іх культурнага ўзроўню. Для ўсіх працоўных была ўстаноўлена бясплатная медыцынская дапамога. Пры Мінскім Савеце быў створаны аддзел, які ведаў арганізацыяй аховы здароўя рабочых і служачых. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў перасяліў многія сем'і рабочых з падвалаў і хацін у кватэры буржуазіі.

Вялікую работу праводзіў Савет разам з органамі рабочага кантролю і прафсаюзнымі арганізацыямі па забеспячэнню рабочых і служачых горада харчаваннем. Рашуча змагаючыся з сабатажам чыноўнікаў старых харчовых органаў, Савет правёў улік усіх запасаў харчавання і строга сачыў за выкананнем пастановы Савецкага ўрада аб хлебнай манаполіі і ўстанаўленні цвёрдых цэн на хлеб.

Значнае месца ў дзейнасці партыйных арганізацый Мінска і Мінскага Савета занялі пытанні культурна-асветнай работы сярод працоўных. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя паклала пачатак культурнай рэвалюцыі. Яе галоўнай асаблівасцю было тое, што яна пачалася на базе дыктатуры пралетарыяту, адбывалася па ініцыятыве Савецкай улады пры самай актыўнай падтрымцы шы-

рокіх мас працоўных, у тым ліку і працоўных Мінска. Сам факт актыўнага ўдзелу працоўных горада ў рэвалюцыйным руху з'явіўся яркім сведчаннем іх узросшай палітычнай свядомасці і актыўнасці. У ходзе барацьбы за ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады рабочыя ўключаліся ў актыўнае грамадска-палітычнае жыццё, у работу нанава створаных партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў.

Важным сродкам палітычнага і культурнага выхавання працоўных стаў бальшавіцкі друк. Цэнтральны орган партыі «Правда», орган Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) «Буревестник» і яго пераемніца «Звезда» вялі вялікую работу па растлумачванню народным масам мэт і задач сацыялістычнай рэвалюцыі. Яны друкавалі дэкрэты і пастановы Савецкага ўрада, артыкулы У. І. Леніна, а таксама іншых кіраўнікоў партыі і ўрада, дапамагаючы тым самым працоўным правільна зразумець мэты сацыялістычнай рэвалюцыі, сваё месца і ролю ў ёй.

У Мінск паступалі таксама бальшавіцкія газеты «Известия ВЦИК», «Деревенская беднота», «Советская правда», «Известия Витебского революционного Совета», «Газета Временного рабочего и крестьянского правительства» і інш. У самім горадзе выходзіла газета «Известия Минского Совета». Газеты неслі працоўнаму народу словы ленінскай праўды, паказвалі яму чарговыя задачы і шляхі іх вырашэння, заклікаючы шырэй разгортваць творчую ініцыятыву, смела і рашуча браць у свае рукі кіраванне жыццём горада. Ва ўмовах Савецкай улады бальшавіцкі друк стаў для рабочых і ўсіх працоўных Мінска зброяй «эканамічнага перавыхавання масы», зброяй «азнаямлення масы з тым, як трэба наладжваць працу па-новаму» [1].

Кіруючыся вучэннем У. І. Леніна аб развіцці культуры ва ўмовах перамогшай сацыялістычнай рэвалюцыі, Мінскі гарадскі камітэт РСДРП(б) і Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў удзялялі шмат увагі пытанням народнай адукацыі. Створаныя ў снежні 1917 года пры Мінскім Савеце аддзелы народнай і дашкольнай адукацыі правялі перапіс непісьменных і малапісьменных дарослых, а таксама дзяцей школьнага ўзросту. Уся справа народнай асветы ў горадзе ў адпаведнасці з пастановай СНК ад 11 снежня 1917 года была забрана з духоўнага ведамства. Школа была аддзелена ад царквы. У ёй было забаронена выкладанне рэлігійных прадметаў. З мэтай прыцягнення дзяцей рабочых да вучобы ўсе перавагі, звязаныя з адукацыйным цэнзам, былі адменены.

У горадзе адкрываліся новыя школы. Каб забяспечыць іх адданымі Савецкай уладзе настаўнікамі, было вырашана арганізаваць кароткатэрміновыя педагагічныя курсы. Найбольш рэакцыйныя настаўнікі

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 27, стар. 179.

былі адхілены ад работы. Выдаткаванне сродкаў на патрэбы школьнага будаўніцтва Мінскі Савет узяў пад строгі кантроль. Кіраванне школамі непасрэдна перайшло ў рукі педагагічных саветаў, у якія ўваходзілі прадстаўнікі гарадскога Савета, педагогаў, бацькоўскага камітэта, вучняў. Была ўстаноўлена выбарнасць педагогаў і дырэктараў школ.

З мэтай разгортвання культурна-асветнай работы сярод працоўнага насельніцтва ў Мінску ў канцы 1917 — пачатку 1918 года былі адкрыты рабочыя клубы. Яны сталі ачагамі новай, сацыялістычнай культуры. Іх дзейнасць была накіравана ў гэты перыяд на выхаванне ў рабочых пачуцця гаспадароў новага жыцця, на ўсямернае разгортванне творчай ініцыятывы і самадзейнасці ў барацьбе за сацыялізм, за павышэнне працоўнай актыўнасці і палітычнай свядомасці. Пры клубах арганізоўваліся гурткі ліквідацыі непісьменнасці дарослага насельніцтва, палітграматы, мастацкай самадзейнасці і інш.

Такім чынам, дзейнасць бальшавікоў Мінска ў галіне гаспадарча-арганізатарскай і культурна-асветнай работы была накіравана ў перыяд трыумфальнага шэсця Савецкай улады на ажыццяўленне першых сацыялістычных пераўтварэнняў у гаспадарцы горада, павышэнне працоўнай і палітычнай актыўнасці рабочых і служачых, развіццё іх творчай ініцыятывы ў будаўніцтве новага жыцця. Перад рабочымі Мінска, якія ўзялі ў свае рукі дзяржаўную ўладу, і іх кіраўнікамі — бальшавікамі стаялі задачы поўнага падаўлення супраціўлення звергнутых рэвалюцыяй, але яшчэ не дабітых эксплуататараў, далейшага ўмацавання Савецкай улады і перабудовы жыцця на новых, сацыялістычных асновах.

РАЗДЗЕЛ XIII

МІНСК У ПЕРЫЯД ЗАМЕЖНАЙ ВАЕННАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

1. Барацьба працоўных Мінска супраць нямецкіх акупантаў



а лютага 1918 года ў Мінску, як і на ўсёй краіне, умацавалася Савецкая ўлада. Роля Мінска як эканамічнага, культурнага і палітычнага цэнтра Беларусі прыкметна ўзрастала. Аднак жыццё горада працякала ў складанай абстаноўцы. Урады імперыялістычных дзяржаў, устрывожаныя ўмацаваннем Савецкай улады ў Расіі, ліхаманкава рыхтаваліся да ўзброенага нападу на нашу краіну з мэтай звяржэння ў ёй савецкага ладу. Унутры Расіі саюзнікамі міжнароднага імперыялізму з'явіліся звергнутыя сацыялістычнай рэвалюцыяй эксплуататарскія класы — памешчыкі і буржуазія. Ім актыўна дапамагалі эсэры, меншавікі, нацыяналісты і іншыя ворагі рэвалюцыі. Над маладой Савецкай дзяржавай згушчаліся чорныя хмары ваеннай небяспекі.

У гэтых умовах сур'ёзную паслугу контррэвалюцыі аказаў Троцкі, які, наперакор указанню У. І. Леніна, адмовіўся падпісваць мірны дагавор на ўмовах, якія прад'явіла Германія. Выкарыстаўшы гэта, нямецкае камандаванне 18 лютага 1918 года пачало наступленне на руска-германскім фронце. На Мінскім напрамку наступалі часці 10-й нямецкай арміі. Рэшткі старой рускай арміі не змаглі ўстаяць супраць узброеных да зубоў полчышчаў германскага імперыялізму і пачалі хутка адкочвацца ў глыб краіны.

Над Мінскам, які з'яўляўся прыфрантавым горадам, навісла небяспека варожай акупацыі. Па рашэнню Саўнаркома Заходняй вобласці, у ноч з 18 на 19 лютага ўсе партыйныя, савецкія і ваенныя ўстановы былі эвакуіраваны з Мінска ў Смаленск.

Камандаванне не паспела арганізаваць планамерную абарону Мінска. Горад абаранялі невялікія часці Чырвонай гвардыі і атрады рабочых. Нямецкія войскі, з боем заняўшы Асіповічы, павялі наступленне на Мінск з двух бакоў — з захаду і паўднёвага ўсходу. Ім дапамагалі беларускія нацыяналісты і рэшткі недабітага на тэрыторыі Савецкай Беларусі I польскага корпуса контррэвалюцыйнага генерала Доўбар-Мусніцкага. Буржуазная «Беларуская рада», якая дзейнічала нелегальна, стварыла ў Мінску ўзброеную банду, якая ва ўгоду нямецкім захопнікам перашкаджала эвакуіраваць насельніцтва і матэрыяльныя каштоўнасці. Польскія легіянеры нечакана ўдарылі па абаронцах горада з тылу і 20 лютага ўварваліся ў Мінск. Нямецкія войскі ўступілі ў горад 21 лютага. Далейшы іх рух быў спынены на лініі Орша — Магілёў — Гомель. 3 сакавіка 1918 года ў Брэсце быў падпісаны савецка-германскі мірны дагавор на вельмі цяжкіх для нашай Радзімы ўмовах.

У акупіраваным Мінску нямецкія захопнікі ліквідавалі ўсе заваёвы працоўных, здабытыя ў выніку Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Акупанты вярнулі фабрыкі і заводы капіталістам, устанавілі зверскі ваенна-каланіяльны рэжым. Улада ў горадзе знаходзілася ў руках нямецкага ваеннага каменданта. Жандары чынілі расправы над савецкімі людзьмі. Вуліцы ўзмоцнена патрулявaліся, на іх былі ўстаноўлены гарматы і кулямёты.

Акупанты разграбілі гарадскія склады «Чырвонага крыжа» ў Ніжняй Ляхаўцы, бальніцы па Татарскай вуліцы, шавецка-рымарскую майстэрню па Ракаўскай вуліцы і многія іншыя. Арганізаванаму грабяжу падвяргалася і асабістая маёмасць і запасы харчавання працоўных. Асобым загадам нямецкіх акупацыйных улад жыхарам Мінска дазвалялася мець толькі мізэрны запас прадуктаў. Астатнія прадукты рэквізаваліся без аплаты. За невыкананне загаду жыхароў штрафавалі.

Нямецкія захопнікі пазбавілі працоўных элементарных грамадзянскіх правоў, забаранілі рабочым праводзіць сходы і выдаваць газеты. У той жа час яны падтрымлівалі контррэвалюцыйныя арганізацыі. З першых дзён акупацыі ўсплылі на паверхню і ўзмоцнілі здрадніцкую дзейнасць «Беларуская рада», мясцовыя арганізацыі кадэтаў, меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў, паалей-цыяністаў і іншых контррэвалюцыянераў. 21 лютага 1918 года «Беларуская рада» сабралася ў Мінску і арганізавала марыянетачны контррэвалюцыйны ўрад — так званы «Народны сакратарыят Беларусі». Як у «Беларускую раду», так і ў «сакратарыят» увайшлі прадстаўнікі антысавецкіх партый — «Беларускай сацыялістычнай грамады», эсэраў, Бунда, сіяністаў, меншавікоў. Не маючы ніякай рэальнай улады, антынародная рада стварала бачнасць «дэмакратычнага праўлення» ў паветах Бе-

ларусі, занятых немцамі. Яна з'яўлялася шырмай для прыкрыцця крывавага акупацыйнага рэжыму.

Адпавіла антынародную работу буржуазная мінская гарадская дума, што была распушчана раней, у якую, акрамя памешчыкаў і капіталістаў, уваходзілі эсэры і бундаўцы. Нямецкае камандаванне асобым загадам узаконіла існаванне гэтай думы, паставіўшы ёй у абавязак «выконваць загады і распараджэнні германскіх улад».

«Беларуская рада» і мінская гарадская дума халопскі служылі акупантам, дапамагалі ім закабаляць і грабіць працоўных, насаджаць буржуазныя парадкі.

Акупанты праводзілі ў горадзе масавыя арышты. Толькі ў красавіку яны арыштавалі сотні працоўных і сагналі іх у лагеры. Адзін з такіх лагераў знаходзіўся на Аляксандраўскім вакзале (цяпер Таварная станцыя). Туды было сагнана каля трох тысяч мінчан, дзе іх трымалі ў брудных бараках, без ежы. У другім лагеры, у раёне Старажоўкі, у такім жа жудасным становішчы знаходзілася каля 600 чалавек. З гэтых лагераў амаль усе арыштаваныя былі адпраўлены на прымусовыя работы ў Германію. Нямецкі камендант Мінска палкоўнік фон Франкенберг цынічна назваў насільную высылку арыштаваных у Германію «вялікім аблягчэннем для горада».

«Беларуская буржуазная рада» 25 красавіка 1918 года паслала ганебную прывітальную тэлеграму на імя германскага кайзера Вільгельма. У гэтай ганебнай паперцы гаварылася, што «толькі пад апякунствам германскай дзяржавы бачыць рада добрую долю сваёй краіны ў будучым».

«Беларуская рада», прыслужваючы нямецкім акупантам, у той жа час старалася выдаць сябе за «правамоцны прадстаўнічы орган беларускага народа». Аднак беларускі народ з гневам і пагардай адкідваў усе гэтыя нахабныя дамаганні, справядліва лічачы членаў «рады» прадстаўнікамі звергнутых рэвалюцыяй памешчыкаў і капіталістаў, агентамі нямецкіх імперыялістаў.

Пад аховай кайзераўскіх штыкоў на мінскія прадпрыемствы вярнуліся іх ранейшыя гаспадары — капіталісты. Акупанты прадаставілі ім неабмежаваныя магчымасці для эксплуатацыі рабочых. Камандуючы германскімі войскамі Паўночна-Заходняга фронту генерал Фалькенгейм правёў асобае пасяджэнне з прамыслоўцамі акупіраваных паветаў Беларусі, на якім парэкамендаваў ім яшчэ ў большай меры «эксплуатаваць рабочую сілу».

Абапіраючыся на ўзброеную падтрымку акупантаў, уладальнікі фабрык і заводаў прымушалі працоўных працаваць па 12—14 гадзін у суткі, рэзка скарацілі заработную плату. Яны часова спынялі работу прадпрыемстваў, каб пазбавіцца ад непажаданых рабочых, адмаўляліся прымаць на работу членаў прафсаюзаў. Многія прадпрыемствы

былі закрыты. Не працавалі, напрыклад, тытунёвая фабрыка, лесапільныя, цагельныя і некаторыя іншыя заводы. Спекулянты павялічвалі цэны на прадметы першай неабходнасці.

Катастрафічна расло беспрацоўе. Колькасць беспрацоўных у горадзе дасягала 12 000 чалавек. Тысячы сем'яў хранічна галадалі. На глебе голаду і антысанітарыі вясной 1918 года ўспыхнулі эпідэміі тыфу і іншых інфекцыйных захворванняў, якія забіралі сотні чалавечых жыццяў.

Працоўныя Мінска ўзняліся на барацьбу за вызваленне роднага горада ад акупантаў. Гэту барацьбу ўзначаліла падпольная арганізацыя бальшавікоў.

28 лютага адбыўся сход бальшавікоў горада. На гэтым сходзе быў выбраны Мінскі падпольны камітэт. Старшынёй камітэта быў выбраны Б. З. Райцэс, сакратаром — А. М. Крыніцкі (Бампі), членам камітэта — рабочы-дрэваапрацоўшчык Ш. Ш. Ходаш, якому было даручана наладжваць работу ў прафсаюзах, у кааперацыі, падрыхтоўваць нелегальныя кватэры, загадваць партыйнай касай. Па рашэнню сходу прадстаўнік Мінскай партарганізацыі быў накіраваны ў Смаленск, дзе ўстанавіў сувязь з Паўночна-Заходнім абкомам РКП(б). Абком партыі зацвердзіў Мінскі падпольны партыйны камітэт і пераслаў яму грошы для патрэб арганізацыі.

Камуністы Мінска з дня ў дзень расшыралі сувязь з рабочымі і сялянамі, узмацнялі свой уплыў сярод шырокіх мас працоўных, уздымалі іх на барацьбу супраць нямецкіх акупантаў. На прадпрыемствах нелегальна ствараліся камуністычныя партыйныя арганізацыі. Так, у партыйнай ячэйцы чыгуначнай станцыі налічвалася 12 рабочых чыгуначных майстэрняў. Такія ж ячэйкі былі арганізаваны на тэкстыльнай фабрыцы, на гарбарным заводзе і на некаторых іншых прадпрыемствах. Акрамя таго, на прадпрыемствах горада было створана некалькі гурткоў, у якіх праводзілася бальшавіцкая агітацыя сярод рабочых. Ужо ў чэрвені 1918 года ў бальшавіцкіх ячэйках налічвалася больш за сто камуністаў.

Мінскі партыйны камітэт стварыў невялікую падпольную друкарню. Яна змяшчалася на гары дома Чэкалінскага на ўскраіне горада па Даўгабродскай вуліцы. Там друкаваліся камуністычныя лістоўкі і пракламацыі, якія заклікалі працоўных да барацьбы супраць чужаземных і мясцовых капіталістаў і памешчыкаў, выкрывалі гнюсную здрадніцкую ролю беларускіх нацыяналістаў, меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў і іншых контррэвалюцыянераў, усялялі ў працоўных веру ў хуткі прыход Чырвонай Арміі. У кастрычніку 1918 года ў гэтай друкарні сіламі членаў Мінскага камітэта РКП(б) і камуністаў Русецкага, Стронгіна і іншых быў выпушчаны нумар газеты «Подпольная правда» тыражом шэсць тысяч экземпляраў. Партыйны камітэт меў

значную колькасць камуністычнай літаратуры, якую тайна адпраўлялі у многія акупіраваныя раёны Беларусі.

Вялікую работу камуністы вялі ў прафсаюзных арганізацыях горада. Ад імя прафсаюза дрэваапрацоўшчыкаў яны стварылі легальны «беспартыйны» кааператыў «Рабочы будаўнік». Яго старшынёй стаў Ш. Ш. Ходаш. Гэты кааператыў спачатку адкрыў краму, а затым сталовую, у якой харчавалася вялікая колькасць рабочых. Пад выглядам сталовай там быў створаны нелегальны клуб, дзе праводзілася шырокая балышавіцкая агітацыя сярод рабочых, распаўсюджвалася камуністычная літаратура. У агульным патоку сюды прыходзілі для канспіратыўных сустрэч камуністы-падпольшчыкі.

Выкрываючы здрадніцкую ролю бундаўцаў, паалей-цыяністаў, эсэраў і меншавікоў, мабілізуючы рабочых на барацьбу за інтарэсы працоўных, за Савецкую ўладу, камуністы паступова адваявалі большасць у радзе прафсаюзных арганізацый. Так, яны заваявалі на свой бок прафсаюзныя арганізацыі металістаў, будаўнікоў, чыгуначнікаў, пекараў, павароў, дворнікаў, хатняй прыслугі. Камуністы ўзмацнялі свой уплыў у гарадскім савеце прафсаюзаў, большасць у якім з пачатку нямецкай акупацыі захапілі бундаўцы. Паступова роля згоднікаў у прафсаюзах горада падала. Неўзабаве члены прафсаюзаў правялі ў Цэнтральнае бюро прафсаюзаў Мінска членаў падпольнага балышавіцкага камітэта Ш. Ш. Ходаша, Б. З. Райцэса, А. М. Крыніцкага і іншых камуністаў. Пад уплывам балышавікоў Мінскі савет прафсаюзаў адмовіўся ўвайсці ў склад буржуазна-нацыяналістычнай «Беларускай рады».

Калі ў красавіку 1918 года нямецкія акупанты арганізавалі масавыя арышты рабочых, савет прафесіянальных саюзаў Мінска, які аб'ядноўваў да 10 тысяч рабочых, заявіў рашучы пратэст «супраць парушэння недатыкальнасці асобы і свабод, здабытых рэвалюцыяй».

Пад кіраўніцтвам камуністаў, якія ўзначалілі рад прафсаюзных арганізацый, рабочыя розных прадпрыемстваў горада, нягледзячы на жорсткі акупацыйны рэжым, не раз праводзілі забастоўкі, патрабуючы 8-гадзіннага рабочага дня і аднаўлення незаконна звольненых рабочых.

У сакавіку 1918 года прадпрыемцы дрожджа-вінакурных заводаў паспрабавалі звольніць частку рабочых. На гэта калектывы прадпрыемстваў адказалі забастоўкай. Дзякуючы арганізаванасці рабочых усе спробы заводчыкаў сарваць забастоўку з дапамогай штрэйкбрэхераў і ўзброенай сілы акупантаў пацярпелі правал. Забастоўка працягвалася два тыдні і закончылася перамогай рабочых. Уладальнікі заводаў былі вымушаны адмовіцца ад звальнення рабочых. Крыху пазней адбылася стачка гарбароў Мінска. Пасля ўпартага супраціўлення капіталісты згадзіліся задаволіць патрабаванні рабочых.

У забастоўках удзельнічалі таксама рабочыя пякарняў і іншых прадпрыемстваў горада.

Ад забастовак рабочыя пераходзілі да адкрытых палітычных дэманстрацый. У гэтых адносінах характэрны першамайскія падзеі ў Мінску. Наперакор загаду акупантаў, якія забаранілі адзначаць першамайскае свята, у дзень 1 Мая 1918 года па прапанове бальшавікоў амаль усе прафсаюзныя арганізацыі вывесілі чырвоныя сцягі і прынялі ўдзел у мітынгу. На мітынг, скліканы бальшавікамі ў гарадскім садзе, сабралася звыш тысячы рабочых і сялян, якія прыехалі з бліжэйшых вёсак. У пятліцах дэманстрантаў чырванелі банцікі.

Удзельнікі мітынгу, нягледзячы на пярэчанні бундаўцаў, вырашылі правесці дэманстрацыю. Стройнымі радамі, з рэвалюцыйнымі песнямі выйшлі яны з саду і па Падгорнай вуліцы накіраваліся да цэнтра горада. Ля сквера, на вуглу Падгорнай і Скобелеўскай вуліц (цяпер вугал Карла Маркса і Чырвонаармейскай), на дэманстрантаў напалі конныя нямецкія жандары. Рабочыя кідалі ў твар раз'юшаным жандарам: «Далоў нямецкіх акупантаў!», «Далоў кайзера!», «Далоў нямецкі імперыялізм!». Многія дэманстранты былі арыштаваны.

Першамайская дэманстрацыя наглядна паказала рэвалюцыйную стойкасць працоўных горада, іх гатоўнасць да канца змагацца супраць акупантаў, за родную Савецкую ўладу.

17 мая 1918 года германскія акупацыйныя ўлады закрылі прафесіянальныя саюзы і іншыя рабочыя арганізацыі, забаранілі сходы і мітынгі рабочых. Прафсаюзы, кіруемыя камуністамі, перайшлі на нелегальнае становішча і працягвалі ўздымаць працоўных на барацьбу супраць чужаземных прыгнятальнікаў.

Мінская партыйная арганізацыя пашырыла свой уплыў на працоўнае сялянства акупіраванай зоны Мінскай, Віленскай, Магілёўскай і часткі Гродзенскай губерняў. Ужо ў першыя месяцы нямецкай акупацыі Мінскі партыйны камітэт адправіў групу камуністаў — Сысоева-Смаленскага, Стронгіна, Русецкага і іншых — для падпольнай прапаганды ў сельскай мясцовасці. Асабліва вялікая палітычная, арганізацыйная і ваенная работа праводзілася імі ў вёсках Ігуменскага, Барысаўскага, Ашмянскага, Вілейскага, Навагрудскага, Слуцкага і іншых паветаў. Пры іх удзеле тут ствараліся партыйныя ячэйкі.

15 ліпеня 1918 года ў Мінску адбылася першая падпольная канферэнцыя РКП(б) Мінскага раёна. На ёй былі прадстаўлены 75 вясковых партыйных ячэек з Мінскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Навагрудскага, Ашмянскага і Вілейскага паветаў, якія налічвалі больш за 500 арганізаваных членаў партыі. Канферэнцыя ў сваёй пастанове прызнала «галоўнай і канчатковай задачай партыйнай работы ў акупіраваных абласцях — падрыхтоўку ўзброенага паўстання, якое мела на мэце аднаўленне Савецкай улады... Партыйныя ячэйкі павінны

былі служыць «арганізуючымі цэнтрамі для дружын і атрадаў баявога характару». Раённым камітэтам канферэнцыя зацвердзіла «Мінскі камітэт, які фактычна з'яўляўся такавым, з правам каптацыі работнікаў з месц».

Мінск стаў цэнтрам падпольнай работы камуністаў на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Камуністы гарадской партыйнай арганізацыі ўздымалі на ўзброеную барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў, за Савецкую ўладу шырокія масы беларускага народа. Вакол бальшавіцкіх ячэек складваліся баявыя групы для барацьбы супраць нямецкіх акупантаў, памешчыкаў і буржуазіі. Усе камуністычныя арганізацыі часова акупіраваных раёнаў Беларусі, як адзначаецца ў партыйных дакументах таго часу, «насілі асобы паўстанцкі характар».

Невыпадкова, што іменна ў раёне Мінска з'явіліся першыя ў Беларусі партызанскія атрады, якія наносілі адчувальныя ўдары па тылах нямецкіх захопнікаў. Ужо ў першыя дні варожай акупацыі партызаны рабілі смелыя напады на воінскія часці, часам абяззбройвалі цэлыя падраздзяленні ворага. У канцы лютага 1918 года, напрыклад, партызаны разбілі буйны атрад нямецкіх войск, які рухаўся з Мінска на фронт.

Партызанскія атрады дзейнічалі ў кожным павеце акупіраванай тэрыторыі Беларусі. У атрадах налічвалася па 200—800 байцоў. Для кіраўніцтва ваеннай работай Мінскі партыйны камітэт стварыў Кайсцей і меў у падначаленні некалькі партызанскіх атрадаў. Партызаны каўскі падраённы камітэт, які пашыраў сваю дзейнасць на рад валаўзрывалі масты і чыгуначнае палатно, пускалі пад адхон варожыя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай, перашкаджалі акупантам вывозіць у Германію нарабаванае дабро, грамілі дробныя варожыя гарнізоны.

Для барацьбы супраць партызан нямецкае камандаванне кідала спецыяльныя атрады. Але карнікі не мелі поспеху, таму што партызан падтрымлівалі працоўныя акупіраваных раёнаў. Партызанскія атрады былі рухавыя і няўлоўныя.

Камуністы праводзілі шырокую агітацыю і прапаганду сярод нямецкіх салдат. Для гэтай мэты выкарыстоўваліся лістоўкі, якія друкаваліся на нямецкай мове ў падпольнай друкарні Мінскага партыйнага камітэта. У выніку няўдач на фронце, наспявання рэвалюцыі ў Германіі, а таксама пад уплывам бальшавіцкай агітацыі ў войсках акупантаў раслі незадавальненне і рэвалюцыйныя хваляванні; салдаты імкнуліся да міру.

Да восені 1918 года Савецкая ўлада ў краіне яшчэ больш умацавалася. У той жа час Германія і Аўстрыя вычэрпвалі рэзервы ў вайне супраць краін Антанты. Пад уплывам Кастрычніцкай рэвалюцыі ўнутры Германіі наспяваў крах манархіі, у арміі ўзмацнілася цяга да

міру. Рэвалюцыя, якая разгарэлася ў лістападзе 1918 года, звергнула кайзера Вільгельма і яго ўрад. Германія прызнала сябе пераможанай у вайне з Антантай і запрасіла міру.

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі афіцэры нямецкай арміі спрабавалі ўтойваць ад салдат весткі аб рэвалюцыі ў Германіі. Аднак падпольныя камуністычныя арганізацыі выпусцілі масу лістовак. У іх яны расказалі нямецкім салдатам праўду аб падзеях у іх краіне. Нямецкая армія разлагалася. Салдаты перастаралі падпарадкоўвацца афіцэрам, выбіралі свае саветы і патрабавалі неадкладнай адпраўкі дамоў.

Савецкая Расія атрымала магчымасць павесці адкрытую барацьбу за вызваленне акупіраваных зямель ад прыгнёту нямецкіх імперыялістаў. 13 лістапада 1918 года Савецкі ўрад анулюваў грабежніцкі Брэсцкі мірны дагавор.

Шэйдэманаўскі ўрад Германіі, які ўзнік пасля рэвалюцыі, не выступаючы адкрыта супраць адмены Брэсцкага дагавору, употай ад народа пайшоў на змову з імперыялістычнымі ўрадамі краін Антанты, спрабаваў затрымаць адыход сваіх войск з часова акупіраванай савецкай тэрыторыі да прыбыцця туды англа-французскіх інтэрвентаў або белагвардзейцаў. Аднак нямецкія салдаты рашуча патрабавалі вяртання на радзіму. Германскія войскі вымушаны былі адыходзіць на захад. Чырвоная Армія рухалася ўслед за імі. У такіх своеасаблівых гістарычных умовах вызваленне Беларусі адбывалася ў асноўным мірна. Узброеныя сутыкненні на асобных участках Заходняга фронту адбываліся толькі ў выніку правакацыйных дзеянняў германскага контррэвалюцыйнага афіцэрства.

У гэты час розныя антысавецкія арганізацыі ліхаманкава рыхтаваліся да захопу ўлады ў Мінску. Адразу пасля весткі аб рэвалюцыі ў Германіі яны паспешліва стварылі «савет дэмакратычных арганізацый». У яго склад увайшлі прадстаўнікі земскай управы, буржуазнай гарадской думы, арганізацый эсэраў, Бунда, Паалей-цыёна і іншых згодніцкіх партый. Эсэры і бундаўцы 12 лістапада звярнуліся да нямецкіх ваенных улад з мемарандумам, у якім ставілі пытанне аб перадачы «грамадзянскай улады» ў краі новаспечанаму «выканаўчаму камітэту савета дэмакратычных арганізацый».

У процівагу ўсім гэтым падкопам контррэвалюцыйных сіл Мінскі бальшавіцкі камітэт развіў у тыя дні энергічную дзейнасць па аднаўленню Савецкай улады ў губерні. З камуністаў гарадскіх і сельскіх партарганізацый быў створаны ўзброены атрад пад камандаваннем Шашлоўскага. У Паўночна-Заходні абком партыі, які знаходзіўся ў Смаленску, тэрмінова паслалі прадстаўніка мінскіх камуністаў-падпольшчыкаў для атрымання дырэктыў і падтрымкі. Са Смаленска нелегальна прыбылі два прадстаўнікі абкома партыі. Яны аказалі Мін-

скаму камітэту сур'ёзную дапамогу ў далейшай актывізацыі партый-най і ваеннай работы.

Было вырашана яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі правесці ў Мінску выбары ў гарадскі Савет рабочых дэпутатаў, які павінен быў узяць уладу з адыходам нямецкіх акупантаў. Камуністы-падпольшчыкі ў сярэдзіне лістапада стварылі камісію па арганізацыі выбараў у Савет і разгарнулі актыўную перадвыбарную агітацыю сярод працоўных горада. Выбары, якія адбываліся ва ўмовах падполля, к пачатку снежня былі завершаны. Большасць у Савеце заваявалі камуністы, што сведчыла аб высокім аўтарытэце Камуністычнай партыі сярод працоўных.

3 снежня 1918 года адбылося ўрачыстае адкрыццё сесіі Мінскага Савета. Старшынёй, яго намеснікам і сакратаром Савета былі выбраны камуністы. Нямецкае камандаванне не адважылася выступіць супраць Мінскага Савета, таму што салдаты пад уплывам камуністычнай агітацыі фактычна выйшлі з падначалення афіцэрам. У самім Мінску быў створаны Савет салдацкіх дэпутатаў 10-й нямецкай арміі, прадстаўнік якога вітаў пасяджэнне Мінскага Савета.

Мінскі Савет адразу выступіў як баявы орган дыктатуры пралетарыяту. Ён даў рашучы адпор буржуазнай думе, якая спрабавала падначаліць сабе мясцовую паліцыю і з яе дапамогай захапіць уладу ў горадзе. Савет прызначыў начальнікам гарадской міліцыі камуніста, накіраваў сваіх прадстаўнікоў ва ўсе падраздзяленні міліцыі. У выніку міліцыя аказалася ў руках Савета. Надзейнай узброенай апорай Савета з'яўляліся партызанскія атрады і дружыны, створаныя камуністамі з рабочых горада і працоўных сялян навакольных вёсак. Яны падтрымлівалі парадак у горадзе, ажыццяўлялі ахову прадпрыемстваў і складаў, не давалі немцам вывозіць народнае дабро.

Аўтарытэт Мінскага Савета быў настолькі вялікі, што да яго звярталіся за ўказаннямі і беларускія сяляне з многіх аддаленых валасцей. У адпаведнасці з рашэннем Мінскага раённага бальшавіцкага камітэта работнікі Савета рэкамендавалі сялянам ствараць у сёлах і маёнтках спецыяльныя баявыя групы з мэтай не даць памешчыкам і акупантам абмалаціць і вывезці хлеб. Такія баявыя групы пачалі дзейнічаць у многіх акупіраваных паветах. Напрыклад, у Навагрудскім павеце дробныя баявыя групы з працоўных сялян і батракоў, узначальваемыя камуністамі, рабілі начныя налёты на маёнткі, зрывалі абмалот збожжа і вываз яго ў Германію. Такім чынам былі выратаваны многія сотні тон хлеба, неабходнага для забеспячэння працоўных Беларусі і байцоў Чырвонай Арміі.

Нямецкае камандаванне спрабавала вывозіць у Германію нарабаваную ў Беларусі маёмасць. Мінскі бальшавіцкі камітэт і гарадскі Савет прынялі меры ў адказ. Па іх указанню партызанскія атрады,

узарваўшы чыгуначнае палатно на лініі Мінск — Вільна, не далі магчымасці акупантам вывезці рухомы чыгуначны састаў і нарабаванае дабро. Дзякуючы гэтаму ў Мінску засталося 113 паравозаў і больш за 200 вагонаў.

10 снежня 1918 года часці Чырвонай Арміі ўступілі ў Мінск. Іх з радасцю сустракалі працоўныя на чале з дэпутатамі гарадскога Савета. На плошчы Свабоды адбыўся вялікі мітынг рабочых і чырвонаармейцаў, які выліўся ў яркую дэманстрацыю падтрымкі працоўнымі Беларусі палітыкі Камуністычнай партыі і Савецкай улады. У той жа дзень Мінскі Савет, выказваючы запаветныя пачуцці беларускага народа, прыняў зварот да працоўных Беларусі, у якім гаварылася: «Таварышы, збылося тое, аб чым мы марылі, да чаго імкнуліся, за што змагаліся ў гэтыя чорныя дні безраздзельнай улады разбэшчанай гнюснай дыктатуры імперыялізму. Мы зноў свабодныя. Мы зноў у нашай вялікай роднай рэвалюцыйнай сям'і расійскага пралетарыяту... Няхай жыве Савецкая Беларусь!»

2. Сацыялістычныя пераўтварэнні ў Мінску пасля выгнання нямецкіх акупантаў

Пасля выгнання нямецкіх акупантаў у Мінску, як і на ўсёй вызваленай тэрыторыі Беларусі, аднавілася сацыялістычнае будаўніцтва. Разгарнуў дзейнасць гарадскі Савет. Разам з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі ў горад прыбыў Мінскі губернскі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Ён быў абвешчаны вышэйшым органам Савецкай улады ў межах Мінскай губерні. Савет і рэўком праводзілі вялікую работу па ўстанаўленню і падтрыманню ў горадзе рэвалюцыйнага парадку. «Беларуская рада» і мінская гарадская дума былі распушчаны. Былі прызначаны камісары гарадской гаспадаркі. Працоўныя горача віталі ўсе гэтыя мерапрыемствы.

Уцалелыя рэшткі рады разам са сваімі гаспадарамі — нямецкімі акупантамі ўцяклі ў Гродна. Там «Беларуская рада» пад крылом нямецкіх імперыялістаў стварала з сынкоў памешчыкаў, капіталістаў і крымінальнікаў банды для барацьбы супраць Савецкай улады.

Сацыял-здраднікі — меншавікі, эсэры, бундаўцы, паалей-цыяністы, якія па-халопску поўзалі перад нямецкімі імперыялістамі, бачачы крах нямецкай акупацыі ў Беларусі, пачалі манеўраваць. Іх прадстаўнікі перад адыходам акупантаў заявілі ў Мінскім Савеце, што яны нібыта прызнаюць Савецкую ўладу, але пры гэтым запатрабавалі кааптацыі ў склад Савета членаў контррэвалюцыйных партый, якія пацярпелі банкруцтва. Аднак камуністы, якія складалі большасць Савета, адхілілі нахабныя дамаганні ворагаў рэвалюцыі.

Камуністы Мінска працягвалі выяўляць контррэвалюцыйную сутнасць палітыкі сацыял-здраднікаў, даказвалі, што толькі партыя бальшавікоў да канца адстойвае інтарэсы пралетарыяту і ўсіх працоўных.

У снежні 1918 года, г. зн. пасля завяршэння вызвалення беларускіх зямель ад нямецкіх акупантаў, склаліся ўмовы для ажыццяўлення права беларускага народа на самавызначэнне і стварэнне суверэннай дзяржаўнасці на аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэта пытанне было выстаўлена працоўнымі Беларусі і шырока абмяркоўвалася на розных сходах грамадскіх арганізацый. Так, нарада сялянскіх дэпутатаў Мінскай губерні, якая праходзіла 12 снежня, выказалася «за неабходнасць хутчэйшага склікання з'езду Саветаў Беларусі... які вырашыць усе пытанні дзяржаўнага ўладкавання». ЦК партыі і Савецкі ўрад усяк садзейнічалі дзяржаўнаму ўладкаванню Беларусі. Гутарка аб гэтым ішла ў ЦК РКП(б), на пасяджэннях ВЦВК.

30 снежня 1918 года ў Смаленску адкрылася VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). Прымаючы пад ўвагу, што на ёй былі прадстаўлены ўсе камуністычныя арганізацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, канферэнцыя аб'явіла сябе I з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. З'езд КП(б)Б пацвердзіў сваю непарыўную ідэйную, тактычную і арганізацыйную сувязь з РКП(б) і заявіў, што «камуністы Беларусі і ў далейшым цалкам будуць кіравацца дырэктывамі ЦК РКП(б), лічачы яго сваім вышэйшым парторганам». Так была ўмацавана непарыўная сувязь Кампартыі Беларусі з РКП(б), якая склалася ў ходзе рэвалюцыйнай барацьбы.

I з'езд КП(б)Б абвясціў стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, у склад якой увайшлі Мінская, Магілёўская, Віцебская, Гродзенская губерні і значная частка Смаленскай губерні. Быў сфарміраван Часовы рабоча-сялянскі ўрад БССР на чале з Д. Ф. Жылуновічам. У склад урада ўвайшлі А. Ф. Мяснікоў, А. Г. Чарвякоў і інш. Беларускі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ўпершыню за сваю шматвяковую гісторыю вырашыў пытанне аб дзяржаўным уладкаванні Беларусі.

5 студзеня Часовы рабоча-сялянскі ўрад БССР, які быў сфарміраваны ў дні работы I з'езду КП(б)Б у Смаленску, пераехаў у Мінск. Адначасова сюды пераехала Цэнтральнае Бюро Кампартыі Беларусі. У гэты ж дзень у газеце «Звезда» было апублікавана паведамленне ЦБ КП(б)Б «Да ўсіх арганізацый Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі». У ім гаварылася: «Згодна з пастановай I з'езду Камуністычнай партыі Беларусі, Паўночна-Заходні абласны камітэт партыі свае функцыі перадаў Цэнтральнаму бюро Камуністычнай

партыі (бальшавікоў) Беларусі, якое з гэтага часу з'яўляецца вышэйшым партыйным органам усіх камуністычных арганізацый Беларускай Рэспублікі».

У Мінску разгарнулі дзейнасць рэспубліканскія народныя камісарыяты і іншыя ўрадавыя і грамадскія арганізацыі рэспублікі. Пачалася падрыхтоўка да I з'езду Саветаў Беларусі, які быў закліканы заканадаўча аформіць стварэнне БССР. Ва ўсіх гарадах, воласцях, паветах і губернях у студзені 1919 года прайшлі з'езды Саветаў, на якіх былі выбраны дэлегаты на I Усебеларускі з'езд Саветаў. У наказах дэлегатам з'езды мясцовых Саветаў прадэманстравалі бязмежную адданасць беларускага народа роднай Камуністычнай партыі, сваё імкненне будаваць Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку ў непарыўнай братняй сувязі з Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай.

У гэтыя ж дні адбыліся перавыбары Мінскага Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў. З 320 дэпутатаў новавыбранага Савета 250 былі камуністамі. Усё гэта з'яўлялася паказчыкам далейшага росту ўплыву і аўтарытэту Камуністычнай партыі сярод працоўных сталіцы Беларусі.

2 лютага 1919 года ў Мінску, у памяшканні гарадскога тэатра, адкрыўся I Усебеларускі з'езд Саветаў. У яго рабоце ўдзельнічала 230 дэлегатаў. На з'езд прыбыў старшыня ВЦВК Я. М. Свярдлоў. У асобе Якава Міхайлавіча дэлегаты віталі ЦК РКП(б), Савецкі ўрад, усіх працоўных брацкай Савецкай Расіі.

З'езд правёў велізарную работу па вырашэнню важнейшых пытанняў дзяржаўнага ўладкавання Беларусі. Ён заканадаўча аформіў стварэнне БССР і выказаў упэўненасць у тым, што «самастойная Сацыялістычная Савецкая Беларуская Рэспубліка будзе прызнана ўсімі народамі...» Я. М. Свярдлоў абвясціў пастанову Прэзідыума ВЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР.

З'езд прыняў першую Канстытуцыю БССР, узорам для якой з'яўлялася Канстытуцыя РСФСР 1918 года, што адлюстроўвала «вопыт барацьбы і арганізацыі пралетарскіх мас супраць эксплуататараў і ўнутры краіны, і ва ўсім свеце» [1]. Канстытуцыя БССР заканадаўча замацавала прынцып дзяржаўнага, грамадскага і эканамічнага ладу Беларусі як Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Былі выбраны вышэйшыя органы ўлады рэспублікі — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў.

I Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў важную дэкларацыю аб адносінах да братніх савецкіх рэспублік, прапанаваў стварыць дабраахвотны саюз працоўных незалежных савецкіх рэспублік.

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 28, стар. 128.

На гэтым жа з'ездзе было вырашана пытанне аб аб'яднанні Беларусі і Літвы ў адзіную Літоўска-Беларускую Сацыялістычную Рэспубліку (Літбел).

На аснове рашэнняў I Усебеларускага з'езду Саветаў працягналі развівацца сацыялістычныя пераўтварэнні ў горадзе. Пры Савеце былі створаны аддзелы: гарадской гаспадаркі, народнай адукацыі, сацыяльнага забеспячэння, харчавання, аховы здароўя і інш. Савет праводзіў вялікую работу па арганізацыі сацыялістычнай прамысловасці, гаспадаркі і культуры.

У Мінску, як і ва ўсёй краіне, ажыццяўлялася палітыка ваеннага камунізма, неабходнасць увядзення якой дыктавалася выключна цяжкімі ўмовамі абароны краіны. Пад кантроль Савета былі ўзяты не толькі буйныя, сярэднія, але і дробныя прамысловыя прадпрыемствы. Іх прадукцыя бралася на строгі ўлік і выкарыстоўвалася для забеспячэння арміі і працоўных горада і вёскі. У вёсцы праводзілася харчаразвёрстка. Сяляне павінны былі ўсе лішкі хлеба прадаваць дзяржаве па цвёрдых цэнах.

13 красавіка 1919 года ў сталіцы БССР адбылася першая дэлегацкая нарада прадстаўнікоў бальшавіцкіх арганізацый Мінскай губерні з удзелам усіх камуністаў Мінска. Яна заслухала і абмеркавала даклад А. Ф. Мяснікова аб VIII з'ездзе РКП(б), горача адобрыла рашэнні з'езду і прыняла іх да няўхільнага выканання.

Камуністычная арганізацыя Мінска, якая налічвала ў той час 400 членаў партыі, разгарнула шырокую дзейнасць па мабілізацыі мас на выкананне важнейшых задач, пастаўленых VIII з'ездам партыі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва і абароны савецкай радзімы.

Кіруючыся ўказаннямі У. І. Леніна і рашэннямі VIII з'езду РКП(б), камуністы ўзнімалі працоўных роднага горада на барацьбу за цвёрдую свядомую працоўную дысцыпліну на прадпрыемствах, уздым прадукцыйнасці працы, умацаванне сувязей рабочых з працоўным сялянствам. У гэтым важную ролю адыгралі прафесіянальныя саюзы. 9 красавіка 1919 года ў Мінску адбылася канферэнцыя прадстаўнікоў фабрычна-заводскіх камітэтаў саюза харчавікоў. Канферэнцыя прыняла рашэнне аб правядзенні на фабрыках і заводах сходаў для абмеркавання пытанняў працоўнай дысцыпліны і барацьбы за ўздым прадукцыйнасці працы.

Асаблівая ўвага звярталася на камуністычнае выхаванне маладых рабочых. Паводле пастановы пленума Савета прафесіянальных саюзаў горада ад 17 красавіка 1919 года пры прафарганізацыях былі створаны секцыі маладых рабочых, якія разам з камсамольцамі праводзілі шырокую культурна-асветную і выхаваўчую работу сярод моладзі Мінска.

Работа нацыяналізаваных прадпрыемстваў Мінска паступова наладжвалася. Уводзіліся ў строй дзеючых уцалелыя прадпрыемствы, аднаўляліся разбураныя акупантамі фабрыкі і заводы. На базе былога прадпрыемства «Энергія» быў створаны і пушчаны ў ход Мінскі металаапрацоўчы завод. Працавалі таксама запалкавая і мармаладная фабрыкі, гарбарны завод і іншыя прадпрыемствы. Значная частка іх прадукцыі ішла на патрэбы фронту. З Мінска ў парадку прадуктаабмену накіроўваліся эшалоны прамысловых тавараў на Украіну і ў РСФСР.

У выніку нямецкай акупацыі гарадская гаспадарка Мінска апынулася ў выключна цяжкім становішчы. Многія дамы былі спалены або знаходзіліся ў напаўразбураным стане. Вуліцы былі захламлены. Водаправод працаваў з перабоямі. Усё гэта прывяло да ўспышак эпідэмій тыфу і іншых інфекцыйных захворванняў.


Работу па наладжванню і сацыялістычнаму пераўтварэнню гарадской гаспадаркі даводзілася праводзіць у цяжкіх умовах ваеннага часу. Ужо ў студзені 1919 года пры Савеце быў створаны аддзел гарадской гаспадаркі, які ўзначаліў шырокія работы па ачыстцы і прывядзенню ў парадак вуліц, сквераў і іншых грамадскіх месц, арганізаваў рамонт жылых памяшканняў, будаўніцтва лазняў, пральняў.

У сацыялістычных пераўтварэннях гарадской гаспадаркі відную ролю адыгрывала створаная пры Мінскім Савеце калегія па жыллёвых пытаннях, якая мела шырокія паўнамоцтвы. Яна ўзяла на ўлік увесь жылы фонд, правяла нацыяналізацыю дамоў буржуазіі. На пасяджэнні 9 лютага 1919 года калегія пастанавіла: «Усю беднату, сапраўдны пралетарыят горада Мінска, які жыве ў сырых падвалах, у розных хацінах і на далёкіх ускраінах, перамясціць у лепшыя здаровыя кватэры...» Тысячы сем'яў рабочых са старых дрэнных хацін былі пераселены ў светлыя і прасторныя кватэры, забраныя ў буржуазіі.

На сродкі, адпушчаныя ўрадам рэспублікі для барацьбы з эпідэміямі інфекцыйных захворванняў, у першым квартале 1919 года ў Мінску было пабудавана некалькі дэзінфекцыйных лазняў. Была павялічана колькасць бальніц. Медыцынская дапамога хворым аказвалася бясплатна. Пры актыўнай падтрымцы савецкіх органаў урачы і медыцынскія сёстры вялі гераічную барацьбу супраць тыфу і іншых інфекцыйных захворванняў. Пры гэтым загінулі ад сыпнога тыфу відныя мінскія ўрачы Ульянаў, Шпакоўскі і іншыя, якія шмат зрабілі для выратавання сотняў жыццяў працоўных горада.

Рабочыя Мінска ўдзялялі вялікую ўвагу шэфству над вёскай, праяўляючы самыя ўважлівыя адносіны да сельскагаспадарчых патрэб бядняцка-серадняцкай часткі сялян. У паветы накіроўваліся брыгады рабочых-агітатараў, якія растлумачвалі працоўным сялянам рашэнні

Адкрыццё помніка К. Марксу ў Мінску. 1922 г.





Удзельнікі I з'езду медыцынскіх работнікаў вясковай мясцовасці, сярод якіх нарком аховы здароўя А. А. Сянкевіч. 1922 г.

А. Р. Чарвякоў (другі злева) на пасяджэнні другой сесіі ЦВК БССР. 1929 г.






Пракладка трамвайнай лініі па вуліцы Валадарскага

Дэлегацыя рабочых Чэхаславакіі ў Мінску. 1925 г.



Прэс, які быў выраблен на мінскім станкабудаўнічым заводзе «Энергія» ў 1933 г.




Помнік У. І. Леніну

Рог вуліц Савецкай і Энгельса





Першы Дом Саветаў (рог вуліц Савецкай і Свярдлова)






Дэманстрацыя працоўных у гонар 19-й гадавіны Кастрычніка. 1936 г.


Вуліца К. Маркса






Зборка станкоў на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. 1940 г.


Праверка пад'ёмнага абсталявання на заводзе імя Кірава



Агульны выгляд горада. 1937 г.




Клінічны гарадок






У цэху станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. 1939 г.

Зборка станка ў цэху завода імя Кірава



Дом уряда



партыі аб адносінах да серадняка. Пасланыя Мінскім Саветам прафсаюзаў рабочыя атрады дапамагалі беднякам і сераднякам забіраць лішкі хлеба ў кулакоў, якія адмаўляліся прадаваць яго па цвёрдых цэнах. Рабочыя аказвалі працоўнаму сялянству дапамогу ў ліквідацыі рэшткаў памешчыцкага землеўладання, у барацьбе супраць кулакоў, у арганізацыі першых калектыўных гаспадарак.

У сваю чаргу працоўнае сялянства Беларусі, улічваючы цяжкае харчовае становішча краіны, узмацняла забеспячэнне гарадоў і Чырвонай Арміі хлебам. Напрыклад, з 15 па 23 сакавіка 1919 года ў рэспубліцы паспяхова прайшоў «тыдзень хлеба», у час якога сяляне даставілі шмат абозаў са збожжам для патрэб Чырвонай Арміі і гарадскога насельніцтва.

Беднякі і сераднякі БССР, як і ўсёй краіны, актыўна падтрымлівалі мерапрыемствы Савецкай улады, ахвотна ўступалі ў рады Чырвонай Арміі для абароны Савецкай дзяржавы ад замежных інтэрвентаў і белагвардзейцаў. Ва ўсім гэтым адчувалася ўмацаванне ваенна-палітычнага саюзу рабочага класа і працоўнага сялянства.

Савецкія, партыйныя і прафсаюзныя органы прынялі тэрміновыя меры для наладжвання забеспячэння працоўных горада прадуктамі харчавання. Пастановай Мінскага Савета, нягледзячы на шалёнае процідзеянне эсэраў, быў уведзены «класавы паёк». У выніку кожнаму працоўнаму выдавалі прадуктаў у паўтара-два разы больш у параўнанні з непрацоўнымі элементамі.

Савецкія і партыйныя органы горада вялі рашучую барацьбу супраць прыватнікаў, якія спрабавалі нажывацца на спекуляцыі хлебам і іншымі прадуктамі харчавання. У чэрвені 1919 года Мінскі гарвыканком забараніў прыватны гандаль харчовымі прадуктамі, закрыў прыватныя чайныя і рэстараны. Адначасова была ўзмоцнена работа па арганізацыі грамадскага харчавання. Гарком партыі выдзеліў некалькі камуністаў для работы ў гарпрадкоме і рабочых кааператывах. У Мінску дзейнічала 10 рабочых кааператываў. Урад рэспублікі выдзеліў паўтара мільёна рублёў на расшырэнне агародніцтва ў межах горада, адпусціў 3000 пудоў насеннай бульбы. Беспрацоўным выдавалі грашовыя дапамогі і бясплатныя гарачыя абеды.

Асаблівыя клопаты праяўляліся аб харчаванні і здароўі дзяцей. Урад Літбела толькі ў сакавіку 1919 года асігнаваў паўмільёна рублёў на грамадскае харчаванне дзяцей Мінска і Мінскай губерні. У горадзе была створана сетка дзіцячых садоў і ясляў, а таксама дзіцячых прытулкаў для дзяцей, якія страцілі бацькоў.

У гэты цяжкі час неацанімая братняя дапамога рабочым Мінска і працоўным Беларусі была аказана вялікім рускім, украінскім і іншымі савецкімі народамі. У сакавіку 1919 года з Украіны ў Мінск было адпраўлена 270 вагонаў хлеба, 21 вагон круп, 8 вагонаў махор-

кі, 4 вагоны гародніны, 3 вагоны кандытарскіх тавараў, вагон мыла, некалькі вагонаў цукру і г. д.

У. І. Ленін асабіста клапаціўся аб хутчэйшым следаванні ў Мінск эшалонаў з хлебам. У тэлеграме Наркампроду Украіны ад 3 чэрвеня 1919 года ён патрабаваў усяляк паскараць адпраўку прадуктаў харчавання ў Мінск.

У выніку тэрміновых мер забеспячэнне працоўных горада прадуктамі харчавання было палепшана. Хлебны паёк для рабочых быў павялічаны з адной чвэрці да паўфунта ў дзень на чалавека.

Са жніўня 1919 года сацыялістычныя пераўтварэнні ў Мінску былі спынены польскай акупацыяй.

3. Барацьба супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў у 1919—1920 гадах

З дня вызвалення ад нямецкай акупацыі працоўныя Мінска, ажыццяўляючы сацыялістычныя пераўтварэнні, прыстасоўвалі эканоміку горада да франтавых патрэб, удзялялі вялікую ўвагу ваенным пытанням. Гэта выклікалася ўмовамі грамадзянскай вайны, якая працягвалася, і замежнай інтэрвенцыі. Савецкая краіна знаходзілася ў вогненным кальцы франтоў. З усходу наступалі арміі Калчака. З захаду ўварваліся палякі, узброеныя на сродкі ЗША, Францыі і іншых імперыялістычных дзяржаў Антанты. У лютым 1919 года польскія легіянеры захапілі Брэст, Ваўкавыск і працягвалі прасоўвацца ў глыб Беларусі, неслі савецкім людзям капіталістычнае рабства. Стварылася непасрэдная пагроза новай варожай акупацыі Мінска.

З мэтай абароны ад польскага нашэсця ў пачатку сакавіка 1919 года было завершана аб'яднанне Беларусі і Літвы ў адзіную Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (Літбел). У сакавіку ў Вільні адбыўся з'езд камуністаў Літвы і Беларусі, які прыняў рашэнне аб зліцці ўсіх арганізацый у склад Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Літвы і Беларусі. 9 сакавіка таго ж года камуністы Мінска на агульным сходзе горача адобрылі рашэнне партыйнага з'езду і прынялі яго да выканання.

Працоўныя Мінска на чале з камуністамі рабілі ўсё, каб садзейнічаць хутчэйшаму разгрому ворага. На заклік У. І. Леніна «Усе на барацьбу з Калчаком!» сотні мінчан адправіліся добраахвотнікамі на Усходні фронт. Тысячы працаўнікоў папоўнілі рады Заходняга фронту. Уперадзе ішлі камуністы. Толькі на адным партыйным сходзе Мінска, які адбыўся 9 сакавіка, добраахвотнікамі на фронт запісаліся 43 камуністы. У сярэдзіне сакавіка, калі палякі захапілі Баранавічы, Мінская партыйная арганізацыя мабілізавала на фронт 20 пра-

цэнтаў свайго складу. Атрады чырвонаармейцаў, папоўненыя камуністамі, смела атакавалі палякаў і выбілі іх з Баранавіч.

У арганізацыі абароны Літвы і Беларусі ад нашэсця палякаў важную ролю адыграў стары бальшавік І. С. Уншліхт. Камандзіраваны Цэнтральным Камітэтам РКП(б) у канцы 1918 года ў Мінск, ён быў прызначаны народным камісарам па ваенных справах Літоўска-Беларускай рэспублікі і членам Савета абароны Літвы і Беларусі. На гэтых і іншых буйных пасадах І. С. Уншліхт шмат зрабіў для ўмацавання чырвонаармейскіх часцей Заходняга фронту, для іх паспяховых дзеянняў супраць польскіх захопнікаў.

8 красавіка 1919 года ЦВК Саветаў Літвы і Беларусі аб'явіў рэспубліку на ваенным становішчы. Працоўныя Мінска на чале з камуністамі аддавалі ўсе свае сілы дапамозе фронту. К канцу красавіка па рашэнню агульнага сходу Мінскай партарганізацыі палавіна камуністаў горада адправілася на фронт, а астатнія праходзілі курс ваеннага навучання на месцы.

Беззапаветную адданасць працоўнаму народу паказалі таксама камсамольцы. ЦК камсамола Літвы і Беларусі звярнуўся да моладзі з заклікам стаць грудзьмі на абарону Савецкай Радзімы. Многія камсамольцы адправіліся на фронт. Частка камсамольцаў, што ўваходзіла ў склад рэзервовага палка, несла каравульную службу ў горадзе.

Па прыкладу камуністаў і камсамольцаў мабілізацыю на фронт правялі прафсаюзныя арганізацыі. 24 красавіка 1919 года другая Мінская канферэнцыя прафсаюзаў аб'явіла мабілізацыю ўсіх членаў прафсаюзаў і ўсіх работнікаў па найму ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў. 8 мая рашэннем савецкіх і прафсаюзных арганізацый горада быў створаны Камітэт рабочай абароны Мінска. Ён разгарнуў работу па забеспячэнню фронту і тылу ўсім неабходным для барацьбы з ворагамі Савецкай улады, па мабілізацыі рабочых і служачых у Чырвоную Армію і на розныя абаронныя работы. У маі ў горадзе быў створаны І Мінскі рабочы полк. На гарадскім мітынгу ва ўрачыстай абстаноўцы гэтаму палку быў уручаны Чырвоны сцяг Мінскага Савета прафесіянальных саюзаў. Прымаючы яго, байцы падраздзялення паклялiся вярнуцца з фронту пераможцамі. У мінскіх газетах таго часу адзначалася, што «рэвалюцыйны ўздым рабочых мас значна ўмацаваў дух ваенных часцей, якія дзейнічалі на Літоўска-Беларускім фронце».

2 мая 1919 года Савет абароны Літвы і Беларусі заклікаў сярэдняе і бяднейшае сялянства да абароны рэспублікі ад палякаў, да актыўнай барацьбы з контррэвалюцыяй. Кожная воласць павінна была выдзеліць не менш за 20 стойкіх, мужных, адданых Савецкай уладзе сялян для папаўнення радоў Чырвонай Арміі. Дзякуючы шырокай растлумачальнай рабоце, праведзенай рабочымі-камуністамі

Мінска ў вёсцы, гэта пастанова выконвалася паспяхова. Сяляне, бачачы, што інтэрвенты і белагвардзейцы забіраюць у іх зямлю, атрымануюць ад Савецкай улады, і нясуць уладу памешчыкаў і капіталістаў, ахвотна ішлі ў рады Чырвонай Арміі, на абарону Савецкай краіны. Сотні беларускіх сялян сцякаліся ў Мінск, дзе з іх фарміраваліся новыя падраздзяленні Чырвонай Арміі.

Усё гэта ўмацоўвала становішча савецкіх войск на Заходнім фронце. Нашы войскі ў радзе месц спынілі наступленне палякаў і самі рушылі ўперад. Калі ў першай палове мая 1919 года палякі прарвалі абарону на поўнач ад Панявежа і перасеклі чыгунку на Маладзечна, падраздзяленні Чырвонай Арміі і рабочыя атрады хутка ліквідавалі прарыў і адкінулі праціўніка ад чыгункі на некалькі дзесяткаў кіламетраў.

Аднак становішча на Заходнім фронце было цяжкім. Палякі, падцягнуўшы свежыя воінскія часці, пагражалі сталіцы Беларусі.

Савецкія рэспублікі ўзмоцнілі дапамогу беларускаму народу. У прыватнасці, у Беларусь прыбывалі новыя чырвонаармейскія часці з Расіі. ЦК РКП(б) даў указанне Магілёўскаму і некаторым іншым губкомам партыі спыніць адпраўку папаўненняў на Усходні фронт і правесці новую мабілізацыю камуністаў на Заходні фронт.

Вялікую дапамогу ў мабілізацыі сіл для Заходняга фронту аказаў старшыня ВЦВК М. І. Калінін, які прыбыў у Беларусь з агітпоездам «Кастрычніцкая рэвалюцыя» ў чэрвені 1919 года. Зрабіўшы паездку па шэрагу гарадоў рэспублікі, М. І. Калінін раніцай 20 чэрвеня прыбыў у Мінск. У той жа дзень ён прыняў парад вайсковых часцей горада. Вечарам 20 чэрвеня ў будынку мінскага гарадскога тэатра адбылося аб'яднанае пасяджэнне ЦВК Літвы і Беларусі, Мінскага Савета, Савета і праўленняў прафесіянальных саюзаў. М. І. Калінін, які выступіў на гэтым пасяджэнні з прамовай, вітаў беларускі і літоўскі народы, пралетарыяў і чырвонаармейцаў Мінска. «Расійская Савецкая Рэспубліка,— заявіў М. І. Калінін,— паслала вам ваенную дапамогу. Я не сумняваюся, што ва ўсе цяжкія моманты на Заходнім фронце Расія будзе вас абараняць».

У ліпені 1919 года, калі Дзянікін пачаў наступленне на Паўднёвым фронце, палякі перакінулі з Францыі армію Галера і разгарнулі наступленне на Заходнім фронце. Яны захапілі Вілейку, Маладзечна, Лунінец і рухаліся да Мінска. Часці Чырвонай Арміі і атрады рабочых, камуністаў і камсамольцаў, стрымліваючы ворага, вялі баі на подступах да сталіцы Беларусі.

У гэты цяжкі час ЦК РКП(б) прыняў шэраг мер па ўмацаванню ваеннага і палітычнага кіраўніцтва на Заходнім фронце. Сюды былі прысланы Сярго Арджанікідзе ў якасці члена Рэўваенсавета XVI арміі і іншыя відныя партыйныя і ваенныя работнікі.

17 ліпеня 1919 года ў Мінску адбылося аб'яднанае пасяджэнне ЦВК ССР Літвы і Беларусі, Мінскага Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў, Цэнтральнага праўлення прафсаюзаў, якое мела важнае значэнне для паляпшэння кіраўніцтва фронтам і тылам рэспублікі. З мэтай цэнтралізацыі ваеннага кіраўніцтва было вырашана ліквідаваць Савет абароны ССР Літвы і Беларусі і ўсю справу абароны рэспублікі перадаць Чырвонай Арміі. Уся паўната ўлады на свабоднай тэрыторыі Беларусі была перададзена часоваму Мінскаму губрэўкому. Яго дзейнасць была прыстасавана да патрэб фронту, да барацьбы з контррэвалюцыяй. Створаная ў Мінску ваенная камендатура, выкарыстоўваючы дадзеныя ёй падраздзяленні чэкістаў, ядро якіх складалі камуністы і камсамольцы, занялася ачысткай прыфрантавой паласы ад польскіх шпіёнаў, контррэвалюцыянераў і чужых Савецкай уладзе элементаў.

На Мінскім напрамку палякі мелі буйную перавагу ў жывой сіле. Іх салдаты і афіцэры былі добра ўзброены. Пасля захопу Маладзечна яны разлічвалі заняць Мінск з ходу, але пралічыліся. Савецкія палкі 52-й дывізіі, папоўненыя мінскімі рабочымі, змагаліся геройскі, мужна стрымлівалі шалёны націск пераўзыходзячых сіл ворага і сарвалі яго задуму.

Мінскі бальшавіцкі камітэт накіраваў на фронт новыя сотні камуністаў, у тым ліку многіх работнікаў Саўнаркома і іншых савецкіх органаў Літвы і Беларусі. Часці Чырвонай Арміі, атрады рабочых, многія з якіх былі камуністамі і камсамольцамі, стойка абаранялі кожную пядзю савецкай зямлі. Жорсткія няспынныя баі працягваліся ўвесь ліпень.

Толькі падцягнуўшы новыя буйныя рэзервы, палякі 28 ліпеня прарвалі савецкую лінію абароны і захапілі Заслаўль, Сёмкаў Гарадок і іншыя пункты, якія знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад Мінска. Ля сцен сталіцы завязаліся жорсткія баі. Варожыя снарады рваліся ў самім горадзе. Аднак мужнасць яго абаронцаў не была зламана. Супраць насядаючых палякаў поплеч з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі гераічна змагаліся падраздзяленні Асобага рабочага палка імя Мінскага савета прафсаюзаў, спецыяльна створанага для абароны роднага горада. У ходзе няспынных баёў многія бліжэйшыя да Мінска вёскі — Пыльніца, Паперня і іншыя — неаднаразова пераходзілі з рук у рукі.

У пачатку жніўня да палякаў, якія атакавалі Мінск, прыбыло новае буйное папаўненне. Кінуўшы ў бой свежыя сілы, палякі раніцай 8 жніўня ўварваліся на ўскраіны горада. Парадзеўшыя рады абаронцаў сталіцы змагаліся за кожны квартал. Але ў 6 гадзін вечара працоўнік авалодаў горадам. Часці Чырвонай Арміі разам з падраздзяленнямі рабочых-мінчан адыйшлі за Бярэзіну.

Гераічная абарона Мінска, якая працягвалася 39 дзён, скоўвала і выматвала сілы ворага. Яна дала магчымасць савецкаму камандаванню Заходняга фронту выйграць час, загадзя стварыць у Беларусі магутныя вузлы супраціўлення па лініі Полацк — Барысаў — Бабруйск — Мазыр. Абапіраючыся на гэтыя вузлы супраціўлення, Чырвоная Армія перагарадзіла палякам шлях для руху ў глыб Савецкай краіны.

Цяжка прыходзілася савецкім людзям у раёнах, акупіраваных ворагам. Палякі, захапіўшы Мінск, устанавілі ў ім зверскі каланіяльны рэжым. Вуліцы былі афарбаваны крывёй рабочых. Палякі разграбілі сотні крам і тысячы кватэр працоўных, чынілі насіллі і бясчынствы. На вуліцах яны здымалі з прахожых адзенне і каштоўнасці. За нязначнае супраціўленне жыхароў забівалі на месцы. За першыя тры дні было забіта 150 савецкіх грамадзян. У горадзе пачаў дзейнічаць ваенна-палявы суд, які прыгаворваў савецкіх патрыётаў да пакарання смерцю. На Кальварыйскай вуліцы была зроблена шыбеніца. Усе турмы і арыштныя дамы былі перапоўнены зняволенымі.

Абрушыўшы жорсткі тэрор і праследаванні супраць Камуністычнай партыі і працоўных, палякі ў той жа час усяк абаранялі інтарэсы капіталістаў і памешчыкаў. Прадстаўнік акупацыйных улад, намеснік генеральнага камісара ўсходніх зямель і Мінскай акругі В. Радкевіч выдаў спецыяльнае «Тлумачэнне № 16», якім усе дэкрэты і распараджэнні Савецкай улады аб'яўляліся адменены мі, а права прыватнай уласнасці аднаўлялася «ў поўным аб'ёме». У Мінск вярнуліся капіталісты і памешчыкі. Акупанты вярнулі ім фабрыкі, заводы, памесці і землі, раней нацыяналізаваныя Савецкай уладай.

Абапіраючыся на ўзброеную падтрымку акупантаў, буржуазія ўзмацняла эксплуатацыю працоўных. Рабочы дзень на прадпрыемствах даходзіў да 12—14 гадзін. Прадпрыемцы звярталіся да масавых звальненняў рабочых. У кастрычніку 1919 года беспрацоўе ў Мінску прыняло жудасныя памеры: беспрацоўнымі аказалася 95 працэнтаў усіх рабочых. Цэны на тавары і прадукты першай неабходнасці бязмерна раслі. Напрыклад, цана на хлеб узнялася да 35 рублёў за фунт. Насельніцтва горада галадала.

Польская буржуазія імкнулася ператварыць захопленую савецкую тэрыторыю ў свае каланіяльныя ўладанні, а яе насельніцтва — у бяспраўных рабоў. У гэтай чорнай справе ёй па-халуйску дапамагалі беларускія, яўрэйскія і іншыя буржуазныя нацыяналісты, а таксама меншавікі, эсэры, бундаўцы і іншыя сацыял-здраднікі, якія яшчэ нядаўна прыслужвалі нямецкім акупантам. Па даручэнню палякаў нацыяналісты стварылі ў Мінску магістрат, які садзейнічаў устанаўленню зверскага акупацыйнага рэжыму. Беларускія нацыяна-

лісты з халопскай паслужлівасцю віталі Пілсудскага ў час яго прыезду ў Мінск, называлі гэтага ката «вызваліцелем» Беларусі.

Палякі шырока выкарыстоўвалі нацыяналістаў і сацыял-здраднікаў у сваіх захопніцкіх мэтах. Загадам ад 23 кастрычніка 1919 года Пілсудскі стварыў пры польскім камандаванні «ваенную камісію» са здраднікаў беларускага народа для фарміравання антысавецкіх «беларускіх часцей». У яе склад увайшлі нацыяналіст Аляксюк, меншавік Прушынскі, эсэр Якубецкі і іншыя згоднікі. Аднак спроба захопнікаў з дапамогай нацыяналістаў і сацыял-здраднікаў выкарыстаць працоўных-беларусаў для антысавецкай вайны пацярпела поўны правал. У белыя банды пайшла толькі нязначная кучка прадстаўнікоў эксплуататарскіх класаў.

Для прыкрыцця каланіяльнай палітыкі палякі ў канцы 1919 года аб'явілі аб стварэнні «Беларускай народнай рэспублікі» і сфарміравалі ў Мінску яе марыянетачны «ўрад» на чале з ярым рэакцыянерам Ластоўскім. Працоўныя Беларусі справядліва лічылі гэты «ўрад» простым прыдаткам акупацыйных улад.

Насельніцтва Мінска вяло актыўную барацьбу супраць польскіх захопнікаў і іх памагатых. На чале працоўных стаялі камуністы-падпольшчыкі. Камуністы, якія засталіся для нелегальнай работы, ужо праз два тыдні пасля заняцця горада палякамі стварылі падпольны Мінскі камітэт Камуністычнай партыі. ЦК КП(б) Літвы і Беларусі, які знаходзіўся ў Смаленску, паслаў у Мінск вопытных партыйных работнікаў — Марыяна Дзямбо (партыйная клічка «Ян»), Максімовіча і Рывеса, якія ўвайшлі ў падпольны камітэт і адыгрывалі буйную ролю ў яго рабоце. Падпольны камітэт працаваў на правах краявога цэнтра. Рэгулярна атрымліваючы дырэктывы ад ЦК КП(б) Літвы і Беларусі, ён ажыццяўляў кіраўніцтва Слуцкай, Барысаўскай, Бабруйскай, Маладзечанскай і іншымі падпольнымі партыйнымі арганізацыямі.

Камуністы праводзілі шырокую агітацыю сярод усіх працоўных горада і акупіраваных паветаў Беларусі. У адным з паўразбураных домікаў на Мала-Татарскай вуліцы была створана падпольная друкарня. Тут друкаваліся бальшавіцкія лістоўкі, у якіх расказвалася аб зверствах польскіх акупантаў і іх памагатых — нацыяналістаў і сацыял-здраднікаў. Камуністы заклікалі ў лістоўках да ўзброенай барацьбы супраць захопнікаў, за Савецкую ўладу.

Калі беларускія буржуазныя нацыяналісты, выконваючы волю сваіх гаспадароў, пачалі мітусню са стварэннем беларускіх часцей для польскай арміі, Мінскі камітэт Кампартыі выдаў лістоўку, у якой выкрываў нацыяналістаў як здраднікаў савецкага народа, заклікаў працоўных уступаць у атрады чырвоных партызан, дапамагаць Чырвонай Арміі хутчэй выгнаць польскіх акупантаў. У распаўсюджванні

лістоўкі актыўна ўдзельнічалі камсамольцы. Гэта лістоўка разышлася па ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі, садзейнічала поўнаму правалу задумы нацыяналістаў, прыцягнула ў партызанскія атрады новыя сотні рабочых і сялян.

Сур'ёзную ўвагу Мінскі партыйны камітэт удзяляў рабоце ў прафсаюзных арганізацыях. Палякі, разагнаўшы прафсаюзы, створаныя пры Савецкай уладзе, дазволілі бундаўцам і паалей-цыяністам ствараць свае прафсаюзы. Камуністы ўвайшлі ў гэтыя арганізацыі, разгарнулі ў іх прапагандысцкую і агітацыйную работу і неўзабаве заваявалі іх на свой бок. Прафсаюзы металістаў, будаўнікоў, чыгуначнікаў, хатняй прыслугі і г. д. сталі ачагамі камуністычнай дзейнасці сярод рабочых горада. Пры іх былі створаны падпольныя камуністычныя ячэйкі, праводзіліся чыткі газет «Правда» і «Звезда», якія нелегальна атрымліваліся са Смаленска, вялася работа па вярбоўцы ў партызанскія атрады. Спробы бундаўцаў і паалей-цыяністаў сціхнуць прафсаюзы на шлях згодніцтва з буржуазіяй пацярпелі крах. Справа скончылася тым, што і Цэнтральнае бюро прафсаюзаў Мінска, дзе спачатку заселі бундаўцы, было адваявана бальшавікамі.

Камуністы Мінска вялі агітацыю сярод польскіх салдат. Для гэтай мэты выкарыстоўваліся лістоўкі, надрукаваныя ў падпольнай друкарні на польскай мове. У загадзе польскага камандавання Літоўска-Беларускага фронту ад 30 верасня 1919 года з трывогай адзначалася, што «бальшавікі ўзмацняюць усё больш і больш сваю прапаганду сярод нашых салдат».

Мінскі партыйны камітэт устанавіў сувязь з польскай камуністычнай арганізацыяй Варшавы. З Варшавы прысылаліся камуністычныя лістоўкі, адрасаваныя польскім салдатам.

Пад уплывам паражэнняў на фронце і камуністычнай агітацыі салдаты нярэдка адкрыта выступалі супраць удзелу ў антысавецкім паходзе, выказвалі свае сімпатыі Савецкай уладзе. У пачатку чэрвеня 1920 года, напрыклад, сур'ёзныя «беспарадкі» былі ў польскім палку, размешчаным у Мінску. Салдаты-легіянеры крычалі: «Нех жые ўлада радзецка!» (Няхай жыве Савецкая ўлада!). Афіцэры спрабавалі прыгразіць ім расстрэлам, але гэта не падзейнічала. «Мы зробім так, што ў нас будзе як у бальшавікоў»,— заяўлялі салдаты.

Партыйны камітэт Мінска меў пастаянную сувязь з падпольнымі камуністычнымі арганізацыямі Вільні, Баранавіч, Гродна, Ваўкавыска, Слоніма, Слуцка, Барысава, Бабруйска і іншых гарадоў. Ён накіроўваў у гэтыя арганізацыі кіруючыя партыйныя матэрыялы, лістоўкі і газеты, пасылаў грошы.

Камуністы акупіраванай сталіцы Беларусі непасрэдна наладжвалі падпольную бальшавіцкую работу ў многіх вёсках. Сяляне горача адгукаліся на іх патрыятычныя заклікі і тысячамі ішлі ў партызан-

скія атрады. Для кіраўніцтва імі быў створаны асобы штаб паўстанцкага руху, які знаходзіўся ў Козыраве. Толькі ў Мінскім павеце дзейнічалі партызанскія атрады Пагірэйчыка, Маслыкі, Крывашчокава і іншыя, якія наносілі сур'ёзныя ўдары па тылах праціўніка. Партызаны рабілі смелыя налёты на варожыя гарнізоны, узрывалі масты, наладжвалі крушэнні на чыгунках. У раёне Мінска яны пусцілі пад адхон некалькі эшалонаў ворага. Шырокі партызанскі рух разгарнуўся таксама ў Бабруйскім, Слуцкім, Пінскім і ў іншых акупіраваных паветах. Партызаны падтрымлівалі сувязь з Чырвонай Арміяй, здабывалі для яе разведданыя.

У пачатку мая 1920 года з дапамогай здраднікаў польскія жандары высачылі і арыштавалі групу відных мінскіх падпольных партыйных работнікаў і партызан. Былі схоплены кіраўнікі мінскай камуністычнай арганізацыі — Дзямбо і Максімовіч. 7 мая палякі ў Мінску расстралялі відных партызан — Вячаслава Васілеўскага, Андрэя Кэпе, Васіля Пагірэйчыка, Лявона Путырскага, Мяленція Процкага, Сяргея Плашчынскага, Сямёна Плашчынскага. Перад расстрэлам жандары па-зверску катавалі іх, імкнучыся атрымаць звесткі аб партызанскіх атрадах, але савецкія патрыёты палічылі за лепшае смерць, чым здрадніцтва. Так, Л. Путырскага афіцэры дэфензівы катавалі чатыры дні: палілі цела раскаленым жалезам, заганялі іголкі пад пазногці, білі шампаламі па пятах. Азвярэлыя каты, спаласаваўшы яму ікры ног штыкамі, пасыпалі раны соллю, пілавалі цела ржавай пілой. Знясілеўшы ад болю, сцякаючы крывёй, герой-партызан сказаў катам: «Вы дарэмна стараецеся выцягнуць у мяне хоць бы адно слова аб маіх таварышах, што знаходзяцца на волі. Я пад чырвоным сцягам пакляўся ў вернасці нашай правай справе і свайму слову не здраджу! Я ведаю, што сумленна канчаю жыццё. Я паміраю за бедны люд працоўны, за светлыя ідэі камунізма! Я паміраю, але ведаю, што за мной засталіся многія тысячы маіх братоў, якія не выпусцяць зброі з рук, пакуль не даб'юць праклятую буржуазную пароду».

Ніякія зверствы і рэпрэсіі не змаглі падавіць барацьбу працоўных, якой кіравалі камуністы. На змену загінуўшым героям у партызанскія атрады ўліваліся новыя савецкія патрыёты. У маі 1920 года, калі палякі публічна расстралялі ў Мінску некалькі партызан, па ўказанню мінскіх камуністаў-падпольшчыкаў Маладзечанскі партызанскі атрад зрабіў смелы напад на поезд галоўнакамандуючага польскай арміяй генерала Шаптыцкага. Партызаны ўзарвалі поезд і перабілі 26 штабных афіцэраў. Сам генерал Шаптыцкі выратаваўся толькі таму, што выпадкова знаходзіўся не ў сваім штабным вагоне.

Чырвоная Армія, падцягнуўшы рэзервы, у чэрвені 1920 года разграміла палякаў на Украіне, а 4 ліпеня пачала наступленне на ўсім

Літоўска-Беларускім фронце. Сур'ёзную дапамогу савецкім часцям аказалі мінскія партызаны. Яны падарвалі тры эшалоны, у якіх перабазіраваліся падраздзяленні 5-й дывізіі палякаў. Адначасова былі падарваны многія масты на чыгуначнай лініі Мінск — Беласток, у выніку чаго рух спыніўся. У трох вярстах ад станцыі Жодзіна партызаны разабралі пуць і перашкодзілі акупантам рухацца па гэтай чыгуначнай лініі.

На блізкіх подступах да Мінска палякі стварылі магутную абарончую лінію, якая праходзіла праз вёскі Малінаўка, Баравая, Азярышча, Вялікая Сунклева. Тут, на загадзя падрыхтаваных пазіцыях, якія былі агароджаны чатырма радамі калючага дроту, яны размясцілі буйныя сілы. Аднак 11 ліпеня 1920 года савецкія воіны 17-й і 27-й стралковых дывізій пасля магутнай артпадрыхтоўкі смела рынуліся на пазіцыі ворага, прарвалі абарончую лінію ў двух месцах — ля вёсак Азярышча і Дражын. Палякі пусціліся наўцёкі. Праследуючы адступаючага праціўніка, часці Чырвонай Арміі ў гэты ж дзень вызвалілі Мінск. Працоўныя горада сустрэлі вызваліцеляў з велізарнай радасцю. Мінскі камітэт Кампартыі ў спецыяльнай адозве вітаў Чырвоную Армію і заклікаў працоўны народ дапамагаць арміі-вызваліцельніцы біць адступаючага ворага.

Пасля выгнання ворага працоўныя Мінска працавалі пад лозунгам «Усё для фронту!» Прадукцыя прадпрыемстваў, што ўзнаўляліся, выкарыстоўвалася перш за ўсё для патрэб Чырвонай Арміі. У горадзе была створана «абмундзіровачная майстэрня», якая шыла для чырвонаармейцаў дзесяткі тысяч камплектаў абмундзіравання.

Рабочыя Мінска правялі вялікую работу па аднаўленню разбуранага вайной чыгуначнага вузла, дабіліся бесперабойнага руху паяздоў з ваеннымі грузамі для наступаючых часцей Чырвонай Арміі.

У горадзе быў створаны камітэт дапамогі хворым і параненым чырвонаармейцам. Актыўную ролю ў ім адыгрывалі жанчыны. Работніцы — члены прафсаюза народнага харчавання — на сходзе пастанавілі «аддаць увесь вольны час... дзяжурствам на вакзалах для аказання дапамогі хворым і параненым чырвонаармейцам». У бальніцах параненыя чырвонаармейцы былі акружаны клопатамі і ўвагай.

У гэтыя дні Чырвоная Армія вельмі хутка прайшла амаль да Варшавы, а перадавыя часці засталіся без рэзерваў і боепрыпасаў. Гэта дало магчымасць палякам прарваць Заходні фронт. Чырвоная Армія была вымушана адступіць. У. І. Ленін пісаў: «У польскай вайне мы мелі энергічную смелую Чырвоную Армію, але пайшлі некалькі далей, чым трэба,— да варот Варшавы, а потым адкаціліся амаль да самага Мінска».

21 жніўня ў Мінску адбылося пасяджэнне Беларускага ваенрэўкома, фабзаўкомаў горада і прадстаўнікоў часцей гарнізона. Яно за-

клікала працоўных згуртавацца для аказання падтрымкі Чырвонай Арміі. «Усе сілы на ўмацаванне фронту і прывядзенне тылу ў парадак!» — гаварылася ў рэзалюцыі пасяджэння. У адказ на гэта ў рады Чырвонай Арміі пайшлі тысячы добраахвотнікаў.

У Мінску фарміраваліся польскія камуністычныя часці для барацьбы за новую дэмакратычную Польшчу. Байцы 2-га батальёна 4-га Варшаўскага бальшавіцкага палка на сходзе прынялі рэзалюцыю, у якой пісалі, што яны «прыехалі не для нацыянальных рознагалоссяў, а для барацьбы з міжнароднай буржуазіяй».

Чырвоная Армія адбіла напіск ворага і рыхтавалася да новага контрнаступлення. У лістападзе быў завершаны разгром Урангеля ў Крыму. Буржуазная Польшча, вычарпаўшы рэзервы, пайшла на мірныя перагаворы. Аднак і ў дні перагавораў палякі наперакор умовам перамір'я нечакана аднавілі наступленне і 15 кастрычніка 1920 года зноў уварваліся ў Мінск. Праз дзень савецкія войскі выбілі іх з горада і адкінулі на зыходныя пазіцыі.

18 сакавіка 1921 года ў Рызе паміж Польшчай і Савецкай Расіяй быў падпісаны мірны дагавор, па якому Польшча адарвала ад нашай краіны Галіцыю і Заходнюю Беларусь.

4. Барацьба працоўных Мінска за ліквідацыю вынікаў нямецкай і польскай акупацыі (ліпень — снежань 1920 года)

За час свайго гаспадарання ў Мінску акупанты вельмі разбурылі прамысловасць і гарадскую гаспадарку, разграбілі найбольш каштоўнае прамысловае абсталяванне. Як адзначала газета «Звезда», акупанты пакінулі пасля сябе «шэраг разладжаных і разбураных прадпрыемстваў у лепшым выпадку і кучу руін — у горшым». Пры адступленні яны спалілі чыгуначны вакзал, гарадскую электрастанцыю, абутковую фабрыку «Арол», шмат жылых дамоў, больш за дзве трэці магазінаў і крам. Беспрацоўе і голад у горадзе, якія існавалі пры акупантах, выклікалі масавы прыток рабочых у вёску. У параўнанні з 1914 годам насельніцтва Мінска ў 1920 годзе скарацілася са 115 да 70 тысяч чалавек, а колькасць працоўных у цэнзавай прамысловасці ў параўнанні з 1912 годам зменшылася амаль удвая.

Мінская гарадская партыйная арганізацыя і Савет рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў узнялі рабочых на ліквідацыю цяжкіх вынікаў варожай акупацыі. Шмат рабілася па выяўленню і ўліку абсталявання, інвентару і сыравіны на прадпрыемствах і складах, якія

немцы і палякі не паспелі вывезці або знішчыць. Прымаліся тэрміновыя меры для аднаўлення работы фабрык, заводаў і транспарту.

У жніўні 1920 года пры ЦК КП(б)Б быў створаны Мінскі гарадскі прафсакратарыят, які і ўзначаліў партыйную работу ў Мінску. Пры прафсаюзных арганізацыях металістаў, транспартнікаў, друкароў, будаўнікоў, харчавікоў і іншых былі створаны камуністычныя фракцыі. Яны вялі шырокую масава-палітычную работу з мэтай уцягнення прафарганізацый у гаспадарчае будаўніцтва.

Па ініцыятыве камуністаў 24—25 жніўня ў памяшканні гарадскога тэатра была склікана канферэнцыя чыгуначнікаў Мінскага вузла, якая заклікала рабочых на барацьбу з транспартнай разрухай.

Адраджаючы транспарт, прадпрыемствы і гарадскую гаспадарку, рабочыя Мінска па прыкладу рускіх братоў арганізоўвалі камуністычныя суботнікі. Так, 28 жніўня 1920 года адбыўся суботнік на станцыі Мінск-Заходняя. У ім удзельнічала 146 чалавек, у тым ліку 18 чыгуначнікаў-камуністаў.

Па прапанове губкома КП(б)Б праводзіліся агульнагарадскія камуністычныя суботнікі. Толькі ў чатырох з іх (жнівень — верасень 1920 года) прыняло ўдзел 8000 мінчан. За гэтыя дні працоўныя горада шмат зрабілі для ліквідацыі транспартнай разрухі, аднаўлення прадпрыемстваў, падвозу паліва да электрастанцыі. У час суботніка на будаўніцтве чыгуначнай веткі каля Мінска многія ўдзельнікі павялічылі прадукцыйнасць працы на 75 працэнтаў вышэй планавай. Камуністычныя суботнікі з'явіліся неацанімым укладам у барацьбу з гаспадарчай разрухай, у аказанні дапамогі Чырвонай Арміі.

У барацьбе за ліквідацыю вынікаў варожай акупацыі, за наладжванне работы прамысловасці і іншых галін гаспадаркі працоўныя сталіцы БССР атрымлівалі штодзённую брацкую дапамогу з боку вялікага рускага народа. З РСФСР у Мінск прыязджалі спецыялісты, прыбывала прамысловае абсталяванне, аказвалася дапамога грашыма і да т. п. Напрыклад, у пачатку снежня 1920 года з Смаленска ў Мінск прыбыло некалькі вагонаў жыта, 1000 пудоў мяса, 400 пудоў масла. Па рашэнню Прэзідыума ВСНГ РСФСР на адраджэнне гаспадаркі БССР быў адпушчаны мільярд рублёў. Значная частка гэтых сродкаў пайшла на аднаўленне Мінска.

Дзякуючы гераічным намаганням рабочых і дапамозе вялікага рускага народа, прамысловасць і транспарт горада паступова ажывалі. Ужо за першыя два месяцы пасля выгнання палякаў былі адноўлены і пушчаны чыгуначны вузел і рад прамысловых прадпрыемстваў. Працавалі тры невялікія чыгуналіцейныя механічныя заводы. Адзін з іх абслугоўваў патрэбы Аляксандраўскай чыгункі. Мінская фабрыка «Вулкан» аднавіла вытворчасць запалак. Пушчаныя ў ход два цагельныя і два кафляныя заводы давалі каштоўны будаўнічы

матэрыял для аднаўлення разбураных прадпрыемстваў і жылых дамоў. Пачалі выпуск прадукцыі гарбарныя заводы. Дзейнічалі занава арганізаваныя майстэрні па вырабу мэблі і па пашыву чырвонаармейскага абмундзіравання. Уступіла ў строй дзеючых мармаладная фабрыка, на якой было занята 140 рабочых. Прадукцыя гэтых прадпрыемстваў выкарыстоўвалася для патрэб Чырвонай Арміі і забеспячэння працоўных.

Аднак агульны стан прамысловасці горада быў цяжкім. Большая частка фабрык і заводаў была разбурана або мела патрэбу ў капітальным рамонце. Многія прадпрыемствы — патачныя, крухмальныя, мылаварныя, тытунёвыя — з-за адсутнасці сыравіны бяздзейнічалі. Значная частка рабочых была вымушана саматужнічаць.

Трэці з'езд КП(б)Б, які адбыўся ў Мінску 22—25 лістапада 1920 года, у ліку іншых важных пытанняў абмеркаваў пытанне аб эканамічным становішчы ў Беларусі. Перад партыйнымі арганізацыямі рэспублікі была пастаўлена задача па разгортванню работы з мэтай вяртання на прадпрыемствы рабочых, якія рассеяліся па вёсках, устанаўленню пралетарскага кантролю над дзейнасцю саматужнікаў і паступоваму ўцягненню іх у рады рабочага класа.

13—17 снежня 1920 года ў Мінску адбываўся II з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі. На ім былі выбраны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Саўнарком БССР. З'езд горача падзякаваў вялікаму рускаму народу за ўсебаковую брацкую дапамогу. У прынятай рэзалюцыі асабліва падкрэслівалася, што эканамічная палітыка рэспублікі павінна быць «цесна звязана з эканамічнай палітыкай Савецкай Расіі, будавацца на тых жа эканамічных прынцыпах, якія ляжаць у аснове эканамічнай палітыкі і гаспадарчага будаўніцтва Савецкай Расіі, і падпарадкоўвацца агульнаму гаспадарчаму плану».

Рабочыя Мінска, часта выязджаючы ў вёскі, вялі там агітацыйна-масавую і вытворчую работу, дапамагалі сялянам у правядзенні палявых работ, рамантавалі сельскагаспадарчы інвентар, наладжвалі забеспячэнне вёскі плугамі, сеялкамі і г. д. Летам 1920 года ў Мінскай губерні стварылася пагроза гібелі ўраджаю ў маёнтках, дзе памешчыкі перад уцёкамі знішчылі ці вывезлі ўборачны сельгасінвентар. Сотні рабочых горада выехалі ў гэтыя маёнткі на ўборку ўраджаю і выратавалі вялікую колькасць збожжа. У Мінску была створана сельскагаспадарчая майстэрня, якая працавала выключна для патрэб сяла.

Польскія акупанты моцна падарвалі гарадскую гаспадарку Мінска. Былі спалены многія жылыя кварталы. Тысячы працоўных аказаліся без прытулку. Вуліцы і двары знаходзіліся ў забруджаным антысанітарным стане. З новай сілай успыхнулі эпідэміі.

У жніўні 1920 года Мінскі Савет камунальнай гаспадаркі ганаро-
дзіў каштарыс у 33,5 мільёна рублёў на рамонт і будаўніцтва ў го-
радзе будынкаў камунальных прадпрыемстваў, крам, мастоў, прыст-
дзенне ў парадак садоў і скверaў. Гарадскі аддзел аховы здароўя
адкрыў сем бальніц на 980 ложкаў і пяць участковых бясплатных
амбулаторый. Акрамя таго, былі абсталяваны бальніца на 250 ложка-
каў і ізаляцыйна-прапускны пункт пры вакзале. Мінскі губернскі ка-
мітэт працы ў парадку працоўнага абавязку правёў мабілізацыю
грамадзян на барацьбу з антысанітарным станам горада.

Адраджаючы прамысловасць, транспарт і гарадскую гаспадарку,
працоўныя сталіцы актыўна змагаліся з харчовымі цяжкасцямі. Ра-
бочыя харчатрады наладжвалі падвоз хлеба. Значная колькасць хле-
ба была дастаўлена з савецкіх маёнткаў, якія атрымалі багатыя
ўраджаі. З мэтай барацьбы са спекуляцыяй забараняўся свабодны
гандаль прадуктамі харчавання. У другой палове 1920 года было
закрыта каля 400 прыватных крам, а іх тавары перададзены каапе-
ратывам. Адначасова расшырылася сетка грамадскіх сталовых і ка-
пературнага гандлю. Асаблівая ўвага звярталася на паляпшэнне
харчавання дзяцей. Больш за 20 дзіцячых сталовых штодзённа ад-
пускалі тысячы абедаў.

Савецкія і партыйныя органы горада прымалі ўсе меры, каб па-
лепшыць матэрыяльнае становішча працоўных.

5. Культурнае будаўніцтва

Наладжвалася культурнае жыццё горада. У гэтай галіне пачынаў
адчувацца плённы ўплыў культурнай рэвалюцыі, якая разгарнулася
з кастрычніка 1917 года. Савецкая ўлада нават у цяжкіх умовах
ваеннага часу клапацілася аб тым, каб усе заваёвы культуры сталі
агульнанародным здабыткам. Пад кіраўніцтвам камуністаў право-
дзілася дэмакратызацыя ўсіх сфер культурнага жыцця.

Пачалося будаўніцтва культурна-асветных устаноў, закліканых
весці шырокую выхаваўчую работу сярод працоўных мас. У горадзе
пачалі стварацца рабочыя клубы, народныя дамы, чытальні, чыр-
ныя куткі, у якія быў адкрыты шырокі доступ усім працоўным. Для
гэтых устаноў прызначаліся лепшыя памяшканні. К канцу грама-
дзянскай вайны ў Мінску дзейнічалі 15 клубаў. Культасветустановы
паступова станавіліся цэнтрамі культурнага жыцця працоўных. У іх
чыталіся лекцыі, даклады, праводзіліся мітынгі, дэманстраваліся
кінафільмы, наладжваліся канцэрты, вечары мастацкай самадзей-
насці. Усе культурна-асветныя мерапрыемствы былі падпарадкаваны
задачам разгрому ворага, дапамогі Чырвонай Арміі ў яе барацьбе

з інтэрвентамі і белагвардзейцамі. Камуністы растлумачвалі рабочым і працоўным сялянам унутраную і знешнюю палітыку Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, небяспеку пагровы, якая нависла над краінай, заклікалі працоўных уступаць у рады Чырвонай Арміі, аказваць дапамогу фронту. Пры культурна-асветных установах арганізоўваліся розныя роду гурткі, школы, народныя універсітэты. Першы народны універсітэт быў адкрыты ў Мінску 14 лютага 1918 года. Але працаваць яму давялося ўсяго некалькі дзён — пачалася нямецкая акупацыя. Пасля вызвалення, у канцы снежня 1918 года, універсітэт аднавіў работу. У чэрвені 1919 года лекцыі народнага універсітэта наведвала 450 слухачоў. Яны вывучалі рускую і беларускую мовы, арыфметыку, атрымлівалі веды ў галіне прыродазнаўства і палітычнага жыцця.

Культурна-асветныя ўстановы горада шырока разгарнулі антырэлігійную работу сярод працоўных. На гэту тэму публікаваліся артыкулы ў газетах і часопісах, выдаваліся брашуры, лістоўкі і плакаты, наладжваліся дыспуты.

Гарадскі аддзел народнай адукацыі нацыяналізаваў гарадскую бібліятэку і адкрыў некалькі новых бібліятэк. У пачатку 1919 года працавала ўжо 5 гарадскіх бібліятэк, чытачамі якіх былі тысячы мінчан.

Важнае значэнне для павышэння палітычнага і культурнага ўзроўню працоўных меў перыядычны друк. Акрамя «Звезды», у Мінску пачалі выдавацца новыя бальшавіцкія газеты: «Белорусская коммуна», «Минский пролетарий», «Савецкая Беларусь» і інш. У снежні 1920 года ў рэспубліцы выходзіла 12 перыядычных выданняў. Вялікай папулярнасцю ў мінчан карысталіся цэнтральныя газеты «Правда», «Известия». Аднак газет не хапала. Беднасць сродкаў і запасаў паперы не дазвалялі павялічваць тыражы. Газеты перадаваліся з рук у рукі, вывешваліся на відных месцах, арганізоўваліся іх гучныя чыткі. 12 снежня 1918 года Саўнарком РСФСР прыняў пастанову, на падставе якой праводзілася мабілізацыя пісьменных для чытання газет і дэкрэтаў.

Паступова арганізоўвалася выдавецкая справа. Прыватныя друкарні былі нацыяналізаваны. У снежні 1920 года ствараецца дзяржаўнае выдавецтва рэспублікі, якое аб'яднала дзяржаўную і прыватныя друкарні. Выдавецтва наладзіла выпуск лістовак, плакатаў, выданне брашур і кніг. Але тыраж іх быў малы. Кнігі і брашуры строга размяркоўваліся па бібліятэках.

На базе нацыяналізаваных Савецкай уладай некалькіх прыватных калекцый карцін і царкоўна-археалагічнага музея ў 1919 годзе ствараецца Мінскі абласны музей. Яго наведвалі тысячы працоўных. Музей адыгрываў сур'ёзную выхаваўчую ролю.

Многае было зроблена па ліквідацыі спадчыны царызму — непісьменнасці сярод працоўных. Органы народнай адукацыі зноў правялі ўлік непісьменных. У канцы 1920 года пры Наркамасвеце БССР стваралася рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці (РНК ЛН). Была ўтворана таксама губернская НК ЛН. Скандэнтраванне справы лікбезу ў гэтых надзвычайных органах дазволіла пачаць сістэматычную работу па ліквідацыі непісьменнасці. 11 снежня 1920 года Ваенрэўком БССР абнародаваў загад, згодна з якім усе непісьменныя ва ўзросце ад 8 да 50 год абавязаны былі вучыцца грамаце на роднай ці рускай мове ў існуючых і новаадкрываемых школах.

Барацьба за ліквідацыю непісьменнасці праходзіла ў складаных умовах: не хапала настаўнікаў, грашовых сродкаў, памяшканняў, слабае было матэрыяльнае забеспячэнне, мала было буквароў, папер, алоўкаў, наглядных дапаможнікаў.

Культасветорганы, камісіі лікбезу разгарнулі агітацыю сярод насельніцтва за навучанне грамаце. Лозунгі, плакаты, газетныя старонкі заклікалі працоўных узяцца за буквар, павышаць свой культурны ўзровень. Паўсюдна пачалі адкрывацца пункты ліквідацыі непісьменнасці, а затым — школы пісьменнасці. Да правядзення заняткаў прыцягваліся настаўнікі, мабілізоўваліся прадстаўнікі інтэлігенцыі. Навучанне праводзілася бясплатна. Тым, хто вучыўся, рабочы дзень скарачаўся на дзве гадзіны з захаваннем заработнай платы. Для падрыхтоўкі настаўнікаў школ па ліквідацыі непісьменнасці былі адкрыты курсы. К пачатку аднаўленчага перыяду ў Мінску працавала 108 школ пісьменнасці. У іх вучылася каля 2300 працоўных. Ліквідацыя непісьменнасці з'явілася важнай прадумовай актыўнага свядомага ўдзелу шырокіх мас у справе пабудовы новага, сацыялістычнага грамадства.

Праводзілася рэарганізацыя старой школы, прымаліся меры па стварэнню новай, савецкай сістэмы народнай асветы. Школа назаўсёды вызвалялася ад рэакцыйнага рэлігійнага ўплыву на дзяцей. Пастановай ад 31 мая таго ж года ўводзілася сумеснае навучанне хлопчыкаў і дзяўчынак, што ліквідавала няроўнасць полаў у галіне адукацыі. Дэкрэт ВЦВК ад 18 кастрычніка 1918 года зацвердзіў «Палажэнне аб адзінай працоўнай школе РСФСР». Ліквідавалася разнастайнасць тыпаў старой школы. Ствараласа адзіная працоўная школа, якая дзялілася на дзве ступені.

Гэтыя ўрадавыя пастановы вызначалі сутнасць новых, сацыялістычных асноў навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Савецкая школа стала бясплатнай, абавязковай для ўсіх дзяцей.

14 лютага Нарком асветы БССР аб'явіў аб пашырэнні «Палажэння аб адзінай працоўнай школе РСФСР» на Беларускую Савецкую

Рэспубліку. Перабудова народнай адукацыі вацягнулася да сярэдзіны 1919 года. За гэты час у Мінску і ў рэспубліцы была ліквідавана старая і арганізавана новая, савецкая сістэма народнай адукацыі. У савецкай школе пачалі выкарыстоўвацца новыя метады навучання, пакладзен пачатак спалучэнню навучання з вытворчай працай. Да 1 мая 1919 года ў Мінску працавала 55 школ першай ступені і 29 школ другой ступені, у якіх займалася больш за 15 тысяч вучняў.

Каб укамплектаваць іх выкладчыцкімі кадрамі, гарадскі аддзел народнай адукацыі арганізаваў падрыхтоўку настаўнікаў на спецыяльных курсах. Такія курсы былі адкрыты ў Мінску яшчэ ў студзені 1918 года. Заняткі на гэтых курсах, спыненыя нямецкай акупацыяй, аднавіліся ў сакавіку 1919 года. Працавалі курсы, на якіх рыхтавалі выкладчыкаў па вядзенню працоўных працэсаў у школе. У 1920 годзе на базе былой настаўніцкай семінарыі адкрываецца педагагічны тэхнікум з трохгадовым тэрмінам навучання.

У школах для дзяцей было арганізавана грамадскае харчаванне. Так, школьны аддзел гарана ў канцы сакавіка 1919 года адкрыў у Мінску пяць харчовых пунктаў. Штодзённа на гэтых пунктах дзецям выдавалася 9000 абедаў. Малазабяспечаныя школьнікі атрымлівалі адзенне і абутак.

Вялікую дапамогу савецкай школе аказвала насельніцтва. Бацькі школьнікаў у вольны час рамантавалі школьныя будынкі, абсталяванне і інвентар, нарыхтоўвалі паліва і г. д.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, сістэма народнай адукацыі наладжвалася. Была створана новая, савецкая агульнаадукацыйная школа. Упершыню ў гісторыі беларускага народа пачалі працаваць дзяржаўныя школы, навучанне ў якіх вялося на беларускай мове. Савецкая школа з'явілася асновай камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Поспехі ў справе народнай адукацыі былі адзначаны дэлегатамі Мінскай беспартыйнай рабочай канферэнцыі, якая адбылася 15 верасня 1920 года. У прынятай рэзалюцыі гаварылася: «Дашчэнту разбурана старая, класавая, саслоўная школа, якая атручвала дзяцей ядам рэлігійнага і нацыянальнага фанатызму. Закладзены асновы савецкай працоўнай школы, усім даступнай, пабудаванай на аснове творчай калектыўнай працы, на самакіраванні вучняў, на выхаванні з іх грамадзян працоўнай айчыны».

Арганізоўвалася прафесіянальная адукацыя. У пачатку 1919 года на базе Мінскай сярэдняй політэхнічнай школы быў адкрыты Політэхнічны тэхнікум. Тут пачалі рыхтаваць спецыялістаў па розных тэхнічных прафесіях. Пры тэхнікуме дзейнічалі цэнтральныя майстэрні, дзе студэнты атрымлівалі практычныя навыкі. У лютым таго ж года праводзіцца першы набор у фельчарска-акушэрскую школу.

Складваецца беларуская вышэйшая школа. У снежні 1918 года ў Мінску адкрываецца Інстытут народнай адукацыі на базе настаўніцкага інстытута, які існаваў у гады першай сусветнай вайны. У кавіку наступнага года на сацыяльна-гістарычным, мастацка-літаратурным, фізіка-хімічным, прыродазнаўча-гістарычным і фізіка-матэматычным факультэтах інстытута навучалася 160 студэнтаў. Інстытут працаваў у цяжкіх умовах: не хапала падручнікаў, лабараторый і г. д.

10 снежня 1920 года пачаліся заняткі на механічным, хіміка-тэхналагічным, культурна-тэхнічным, агранамічным і лясным факультэтах новастворанага Мінскага політэхнічнага інстытута.

На базе Камароўскага доследнага поля ў 1919 годзе была арганізавана Мінская доследная балотная станцыя.

Вялася падрыхтоўка да адкрыцця Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пастанова аб стварэнні ў Мінску універсітэта была прынята ЦВК БССР 24 лютага 1919 года. Гэта рашэнне падтрымаў урад РСФСР. У Маскве ствараецца дзяржаўная камісія на чале з акадэмікам В. І. Волгіным, якая вядзе падрыхтоўку да арганізацыі універсітэта. Такая ж камісія была створана і ў Мінску. Яе ўзначаліў відны вучоны-гісторык В. І. Пічэта. ЦВК Беларусі асігнаваў на стварэнне універсітэта мільён рублёў. Камплектавалася універсітэцкая бібліятэка. Адной з крыніц папаўнення яе фондаў з'явіліся бібліятэкі, нацыяналізаваныя ў буржуазіі. Адкрыццё універсітэта адбылося ў чэрвені 1921 года. Яго першым рэктарам быў В. І. Пічэта.

Пачало бурна развівацца літаратурнае жыццё Мінска. У сталіцу рэспублікі з'язджаліся беларускія пісьменнікі. У Мінск пераехалі Янка Купала, Цішка Гартны, Янка Журба. Вершы, апавяданні і нарысы беларускіх пісьменнікаў пастаянна публікавалі на сваіх старонках газеты «Звезда», «Минский пролетарий», «Савецкая Беларусь» і інш.

Наладжваліся сувязі з рускімі савецкімі літаратарамі. У другой палове 1920 года ў Мінску пабываў Дзям'ян Бедны. Тут ён завяршае верш «Упусціш — не вернеш. З беларускімі сялянамі гутарка па душах Дзям'яна Беднага», які быў апублікаваны ў газеце «Звезда». У ім паэт, звяртаючыся да працоўных-беларусаў, усклікаў:

В Белоруссии вольной, народной, советской,
Не бывать никогда уже власти шляхетской...
Все, что ныне отобрано от богачей,
Ваше все — ваши нивы, леса, ваши реки,
Ждите братской подмоги от нас, москвичей...

Дзям'ян Бедны сустракаўся з беларускімі пісьменнікамі, выступаў перад працоўнымі сталіцы з чытаннем сваіх патрыятычных

вершаў. Усё гэта садзейнічала далейшай актывізацыі літаратурнага жыцця горада.

У цяжкіх умовах ваеннага часу ў Мінску складваецца і пачынае развівацца беларускае савецкае мастацтва. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі савецкія мастакі, музыканты, акцёры, архітэктары, пераадольваючы згубны ўплыў фармалізму і натуралізму, уносілі плённы ўклад у ажыццяўленне ленінскай ідэі — сродкамі мастацтва палітычна прасвятляць рабочых і сялян.

Мастакі афармлялі рэвалюцыйныя святкаванні, малявалі плакаты, якія заклікалі да абароны маладой Савецкай рэспублікі, карыкатуры, якія одка высмейвалі ворагаў рэвалюцыі. У пачатку 1918 года пры аддзеле народнай адукацыі Мінскага Савета ствараецца секцыя выяўленчых мастацтваў, якая стала арганізатарам работы мясцовых мастакоў. Асабліва паспяхова яна разгарнула дзейнасць пасля выгнання нямецкіх акупантаў. Са студзеня па жнівень 1919 года ж да акупацыі горада палякамі ў Мінску выдаваўся ілюстраваны часопіс «Заря Запада», у якім публікаваліся работы мясцовых мастакоў. У прыватнасці, у ім рэгулярна выступаў з вострымі карыкатурамі на надзённыя палітычныя тэмы К. С. Елісееў, які стаў у далейшым вядомым у краіне карыкатурыстам. Гэты творчы працэс, спынены польскай акупацыяй, аднавіўся ў другой палове 1920 года.

Новыя гарызонты адкрыліся для развіцця тэатральнага мастацтва. У Мінску дзейнічала Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, якое ўзначальваў рэжысёр Усевалад Фальскі. Таварыства аб'ядноўвала 40 харыстаў і 20 драматычных акцёраў, у ліку якіх былі таленавітыя майстры сцэны Е. Міронава, Л. Ржэцкая, К. Саннікаў, А. Ільінскі, С. Станюта і інш. Два разы ў тыдзень Таварыства наладжвала спектаклі. Яно з поспехам паставіла «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Пінскую шляхту» В. Дуніна-Марцінкевіча, «Рысь» Э. Ажэшкі і інш. Не паспеўшы эвакуіравацца ў савецкі тыл у час наступлення кайзераўскіх войск, члены Таварыства сумленна служылі сваёй савецкай Радзіме і ў цяжкіх умовах нямецкай акупацыі.

Пасля вызвалення Мінска ад нямецкіх акупантаў калектыў Першага таварыства беларускай драмы і камедыі склаў асноўнае ядро Беларускага савецкага тэатра, які быў створаны ў снежні 1918 года па рашэнню гарадскога аддзела народнай асветы. У склад творчых работнікаў гэтага тэатра ўліліся таксама ўдзельнікі драматычнага калектыву клуба «Беларуская хатка» і Беларускага хору. Усяго ў Беларускім савецкім тэатры налічвалася каля 100 акцёраў і харыстаў. Тэатр меў чатыры секцыі: драматычную, харавую, музычную і літаратурна-выдавецкую. Тэатр паставіў рад п'ес, у тым ліку «Раскіданае гняздо», «Паўлінка» Я. Купалы, «Прапанова»,

«Мядзведзь» А. Чэхава і інш. Пры польскай акупацыі гэты тэатральны калектыў распаўся. Зноў ён аднавіў сваю работу толькі ў другой палове 1920 года.

У Мінску былі створаны гарадскі, камерны і польскі тэатры. У жніўні 1920 года з невялікага гуртка пры Мінскім рабочым клубе арганізавалася група беларускіх артыстаў пад кіраўніцтвам В. Галубка. Пачалі даваць канцэрты таксама сімфанічны аркестр і народны хор.

Творчыя калектывы Мінска ставілі спектаклі, наладжвалі канцэрты для працоўных горада, выязджалі ў сёлы і вёскі, у воінскія часці Заходняга фронту. Зразумела, у мастацкіх адносінах многія спектаклі і іншыя сцэнічныя творы былі яшчэ слабыя. Ім былі ўласцівы схематызм і абстрактны паказ героя, але і яны адыгрывалі вялікую ролю ў ідэйна-эстэтычным выхаванні працоўных, адлюстроўваючы рэвалюцыйную эпоху, сеялі веру ў перамогу рэвалюцыі, у светлае будучае камунізма.

Рабіліся крокі да падрыхтоўкі кадраў тэатральнага і музычнага мастацтва. У сакавіку 1919 года ў Мінску былі адкрыты інструктарскія курсы рабоча-сялянскага тэатра. У тым жа годзе пачала працаваць Беларуская дзяржаўная кансерваторыя.

Камуністычная партыя, У. І. Ленін надавалі вялікае значэнне кіно — самаму даступнаму, найбольш масаваму сродку камуністычнай прапаганды і агітацыі. У Беларусі кінамастацтва знаходзілася ў стадыі станаўлення. У Мінску былі нацыяналізаваны тры кінематографы. Усю кінасправу перадалі аддзелу народнай асветы. У кінатэатрах у гэтыя гады дэманстраваліся ў асноўным старыя, дарэвалюцыйныя фільмы, з'яўляліся на экранах і кадры савецкай кінахронікі, якія расказвалі аб Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайне, аб У. І. Леніне, аб рэвалюцыйных падзеях 1917—1920 гадоў у Беларусі. На кінастужцы былі зняты савецка-польскія мірныя перагаворы ў Мінску і іншыя значныя з'явы ў жыцці рэспублікі. Хранікальныя кінафільмы здымаліся маскоўскімі і петраградскімі аператарамі.

У гады грамадзянскай вайны і барацьбы з замежнай інтэрвенцыяй партыйная арганізацыя Мінска, органы Савецкай улады шмат зрабілі ў галіне палітычнага і культурнага выхавання працоўных, што садзейнічала мабілізацыі іх на гераічныя справы ў тыле і на фронце.

РАЗДЗЕЛ XIV

МІНСК У ПЕРЫЯД АДНАЎЛЕННЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ (1921—1925 гады)

1. Пераход да мірнага сацыялістычнага будаўніцтва

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны і іншаземнай інтэрвенцыі Мінск перажываў цяжкія дні. У гады вайны ён некалькі разоў пераходзіў з рук у рукі, спальваўся і разбураўся. Акупанты нанеслі гораду страты, якія раўняліся 5 мільёнам 300 тысячам рублёў золатам. Многія прамысловыя прадпрыемствы і транспарт былі разбураны, а іх абсталяванне вывезена інтэрвентамі. Уцалелыя фабрыкі і заводы бяздзейнічалі з-за адсутнасці сыравіны і паліва. Вытворчасць прамысловай прадукцыі рэзка скарацілася.

Гаспадарчая разруха стварала велізарныя цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва. У Мінску сабралася вялікая колькасць бежанцаў. Адчуваўся востры недахоп прамысловых тавараў і харчавання. Насельніцтва жыло ў цяжкіх умовах. Хлеб выдаваўся па картачках. Многія жыхары засталіся без прытулку, адзення, ежы. На глебе знясілення і недаядання развіваліся эпідэмічныя захворванні, якія забіралі сотні жыццяў.

У пісьме Саўнаркома Беларусі Наркамхарчу РСФСР ад 12 лютага 1921 года паведамлялася: «Горад Мінск перажывае цяжкія дні... Цяжкае харчовае становішча Беларусі і поўная адсутнасць прадметаў шырокага спажывання пазбаўляе нас магчымасці што-небудзь выдаваць рабочаму...» Рэальная заработная плата рабочых і служачых рэзка знізілася. Хлебны паёк і выдача іншых відаў харчавання ўсё больш паменшаліся.

Партыйныя, савецкія, прафсаюзныя органы прымалі ўсе меры, каб палегчыць матэрыяльна-бытавое становішча

працоўнага насельніцтва. Па рашэнню ўрада Беларусі асобным групам працоўных была ўведзена бясплатная выдача прадуктаў і прадметаў першай неабходнасці. Бясплатна атрымлівалі прадукты рабочыя і служачыя, занятыя на дзяржаўных прадпрыемствах, служачыя савецкіх устаноў, інваліды вайны і працы, навучэнцы старшых класаў, цяжарныя жанчыны, непрацаздольныя, беспрацоўныя, якія мелі права на дапамогу па беспрацоўю, рамеснікі, саматужнікі, якія не эксплуатавалі чужой працы. Так, у студзені 1921 года бясплатнымі пайкамі было забяспечана 16 тысяч рабочых і служачых. Пры гэтым норма выдачы ім прадуктаў харчавання была значна вышэйшай, чым іншым пластам насельніцтва.

Для барацьбы з эпідэмічнымі захворваннямі ў Мінску быў створаны спецыяльны санітарна-эпідэмічны атрад, а таксама шырокая сетка ізалятараў і дэзінфекцыйных камер. Дзякуючы гераічным намаганням органаў Савецкай улады і медыцынскага персаналу эпідэмічныя захворванні ў Мінску, а таксама па ўсёй тэрыторыі Беларусі пайшлі на зніжэнне.

Брацкі рускі і іншыя народы, якія самі цярпелі велізарныя цяжкасці і нягоды, аказвалі працоўным Мінска дапамогу харчаваннем, медыкаментамі, таварамі шырокага спажывання. У пачатку 1921 года з цэнтральных раёнаў Расіі для працоўных Мінска было атрымана 75 тысяч пудоў хлеба, 39 вагонаў солі, 200 пудоў масла для шпіталяў і дамоў прытулку, шэсць тысяч пар ботаў, некалькі тысяч пар бялізны і іншых тавараў для рабочых.

Цяжкае гаспадарчае становішча краіны і незадаволенасць сялян палітыкай ваеннага камунізма спрабавалі выкарыстаць унутраныя і знешнія ворагі Савецкай улады. Контррэвалюцыя падымала ў розных раёнах краіны кулацкія мяцяжы. З Польшчы ў Беларусь былі перакінуты ўзброеныя банды Булак-Балаховіча і Савінкава і рыхтаваліся перакінуць яшчэ шэсць тысяч бандытаў. У цесным кантакце з імі дзейнічалі мясцовыя банды. Яны папаўняліся за лік кулакоў, дэзерціраў, розных контррэвалюцыйных і крымінальных элементаў. На чале некаторых з іх стаялі дыверсанты, перакінутыя з-за мяжы.

Бандытызм у Беларусі прыняў шырокія памеры. За адзін толькі год (з верасня 1920 па верасень 1921) зарэгістравана да 250 пагромаў і нападаў.

У шэрагу выпадкаў контррэвалюцыянеры арганізавалі падпалы прамысловых прадпрыемстваў, складскіх памяшканняў. Таму пленум Цэнтральнага савета прафсаюзаў Беларусі, які адбыўся ў сакавіку 1921 года, прапанаваў праўленням прафесіянальных саюзаў, фабзаўкомам арганізаваць пастаянную ахову прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў.

Контррэвалюцыйныя элементы распаўсюджвалі ілжывыя пра-
кацыйныя чуткі, падпольную антысавецкую літаратуру. 10 мая
1921 года Цэнтральнае Бюро КП(б)Б спецыяльна абмеркавала пы-
танне аб барацьбе з распаўсюджваннем контррэвалюцыйных адозваў
у Мінску. ЦБ заклікала працоўных павысіць рэвалюцыйную піль-
насць і актыўнасць у барацьбе з бандытызмам і контррэвалюцыяй,
прапанавала «начальніку гарнізона ўзмацніць абход патрулёў па на-
чах і затрымліваць усіх падазроных асоб». У чэрвені 1921 года ў
Мінску ўводзіцца ваеннае становішча, гарнізон і часці асобага пры-
значэння прыводзяцца ў баявую гатоўнасць.

Цэнтральнае Бюро Кампартыі Беларусі і ўрад БССР, абапіраю-
чыся на падтрымку і дапамогу працоўных рэспублікі, прынялі энер-
гічныя меры па барацьбе з бандытызмам. У ліпені 1921 года ства-
раецца Рэўваенсавет Мінскага раёна. У яго склад увайшлі І. П. Уба-
рэвіч (камандуючы войскамі), І. А. Адамовіч, Я. К. Ольскі (члены
РВС) і Ваянкоў (начальнік штаба РВС).

Партыйная арганізацыя Мінска правяла сярод насельніцтва шы-
рокую растлумачальную работу. Для ўмацавання нізавых ячэек
у паветы і воласці з Мінска былі накіраваны 250 камуністаў і 200
камсамольцаў.

Для нясення каравульнай службы, аховы прадпрыемстваў, ма-
стоў, грамадскіх будынкаў з рабочых, ядро якіх складалі камуністы,
былі створаны атрады асобага прызначэння, якія ўдзельнічалі ў бая-
вых аперацыях супраць бандытаў, быў сфарміраваны полк часцей
асобага прызначэння. Так, Мінскі зводны атрад асобага прызначэн-
ня прымаў удзел у аперацыях супраць бандытаў у Ігуменскім па-
веце. Мінскі атрад і курсанты Віцебскіх камандных курсаў у са-
кавіку 1921 года былі перакінуты на падаўленне мяцяжу ў Кран-
штаце.

З паляпшэннем эканамічнага становішча Беларусі, з умацаван-
нем саюзу рабочага класа і працоўнага сялянства ўмовы для палі-
тычнага бандытызму зніклі. З 1 ліпеня 1922 года ваеннае становішча
ў БССР знімаецца. Рэўваенсавет і штаб войск Мінскага раёна расфар-
міроўваюцца.

Цяжкае эканамічнае і палітычнае становішча Савецкай краіны
спрабавалі выкарыстаць трацкісты і іншыя антыленінскія групкі
з мэтай аслаблення Савецкай улады. Трацкісты навязалі партыі дыс-
кусію аб прафсаюзах. Яны патрабавалі «ператрасання прафсаюзаў»,
былі праціўнікамі метаду пераканання мас і разгортвання ў праф-
саюзах дэмакратыі.

Дыскусія аб прафсаюзах у Мінскай партарганізацыі мела напру-
жаны характар. У некаторых ячэйках абмеркаванне пытання аб ролі
і задачах прафсаюзаў працягвалася па некалькі дзён. Напрыклад,

у партыйнай ячэйцы пры прафсаюзе «Ігла» дыскусія цягнулася 17, 20 і 21 лютага 1921 года.

11 студзеня 1921 года адбыўся партыйны сход Мінскай партыйнай арганізацыі, які разгледзеў пытанне аб ролі прафсаюзаў. Сход асудзіў антыпартыйную дзейнасць фракцыянераў і прыняў ленінскую платформу аб прафсаюзах. У Мінскай павятовай партыйнай арганізацыі з 30 дэлегатаў 28 галасавалі за платформу У. І. Леніна.

Вынікі дыскусіі падвёў IV з'езд Камуністычнай партыі Беларусі, які праходзіў у Мінску ў канцы лютага — пачатку сакавіка 1921 года. З'езд пераважнай большасцю галасоў адобрыў ленінскую платформу і намеціў канкрэтныя задачы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва ў рэспубліцы.

У сувязі з пераходам краіны да мірнага будаўніцтва перад Камуністычнай партыяй паўстала неадкладная задача аднаўлення народнай гаспадаркі. Яе ажыццяўленне трэба было пачаць з сельскай гаспадаркі, каб забяспечыць гарадское насельніцтва харчаваннем, а прамысловасць — сыравінай. X з'езд РКП(б), які адбыўся ў сакавіку 1921 года, прыняў важнейшае рашэнне аб пераходзе ад ваеннага камунізма да новай эканамічнай палітыкі (нэп). Харчовая развёрстка ў вёсцы была заменена харчпадаткам, які даваў сялянам магчымасць свабодна распараджацца прадуктовымі лішкамі са сваёй гаспадаркі. Гэта стварала зацікаўленасць працоўных сялян у развіцці сельскай гаспадаркі.

Новая эканамічная палітыка — палітыка пераходнага перыяду ад капіталізму да сацыялізма — была накіравана на пабудову сацыялізма пры выкарыстанні рынку, гандлю, грашовага абарачэння. Яна была разлічана на ўздым буйной прамысловай індустрыі як галоўнай матэрыяльнай базы пабудовы сацыялізма, на згуртаванне і рост рабочага класа, на перамогу сацыялістычных элементаў над капіталістычнымі. Сутнасцю гэтай палітыкі з'яўляўся эканамічны саюз рабочага класа з сялянствам.

Працоўныя Мінска глыбока вывучалі гістарычныя рашэнні X з'езду партыі. Толькі ў красавіку было праведзена 66 рабочых сходаў, 15 канферэнцый, на якіх было прачытана 219 дакладаў аб новай эканамічнай палітыцы. З дакладамі выступалі члены Цэнтральнага Бюро КП(б)Б, відныя партыйныя і савецкія работнікі. Напрыклад, 29 сакавіка 1921 года на агульным сходзе Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі выступіў сакратар Цэнтральнага Бюро КП(б)Б В. Г. Кнорын.

У Беларусі ўвядзенне новай эканамічнай палітыкі пачалося адразу ж пасля X з'езду РКП (б). 30 сакавіка 1921 года Саўнарком рэспублікі прызнаў, што сяляне, якія выканалі харчразвёрстку, маюць права на свабодны абмен лішкаў, што ў іх засталіся. 9 красавіка СНК

БССР даручыў эканамічнай нарадзе распрацаваць пытанне аб таварааабароце, у маі быў зацверджан праект дэкрэта аб свабодным абмене прадуктаў сельскай гаспадаркі і вырабаў саматужнай прамысловасці.

У чэрвені 1921 года адбыўся IV Мінскі павятовы з'езд Саветаў. У прынятым рашэнні адзначалася, што з'езд вітае новую эканамічную палітыку наогул і харчпадатак у прыватнасці, які дае магчымасць палепшыць сельскую гаспадарку і садзейнічае эканамічнаму адраджэнню краіны.

У сувязі з новым курсам у эканамічнай палітыцы Мінская партыйная арганізацыя вялікую ўвагу ўдзяліла перабудове работы партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў. У выніку прынятых мер партыйная работа ў многіх ячэйках ажывілася. Сходы сталі праводзіцца больш рэгулярна. Калі ў ліпені 1921 года ў ячэйках Гарадскога райкома партыі адбыўся 181 сход, то ў жніўні гэтага ж года — 256 сходаў. На іх абмяркоўваліся важнейшыя гаспадарчыя і палітычныя пытанні, пытанні ўнутрыпартыйнага характару.

Значна пашырылася сетка нізавых партыйных арганізацый. Колькасць партячэек выросла з мая да жніўня 1921 года з 58 да 91, а колькасць камуністаў павялічалася з 1500 да 2000. Асабліва хутка раслі фабрычна-заводскія партыйныя ячэйкі. Калі ў сакавіку 1921 года іх было толькі шэсць, то ў верасні таго ж года — 38. За гэты час былі створаны партячэйкі на дрожджавым, другім гарбарным заводах, гарнізоннай хлебапякарні і г. д.

У сувязі з ростам гарадской партыйнай арганізацыі і ў мэтах паляпшэння кіраўніцтва работай партыйных ячэек Мінская партыйная арганізацыя па рашэнню Цэнтральнага Бюро КП(б)Б была падзелена на тры раёны. У адпаведнасці з гэтым рашэннем было створана тры раённых камітэты партыі: Гарадскі, Аляксандраўскі (пазней Кастрычніцкі) і Ляхаўскі. Райкомы непасрэдна падпарадкоўваліся Цэнтральнаму Бюро КП(б)Б.

Палепшылася партыйна-арганізацыйная і масава-палітычная работа ў горадзе, узмацнела сувязь партыйных арганізацый з шырокімі масамі працоўных, узрос іх аўтарытэт і ўплыў. У паведамленні сакратарыята ЦБ КП(б)Б за студзень 1922 года адзначалася, што ў Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі «заўважаецца імкненне рабочых у партыю. Партячэйкі цесна звязаны з работай прадпрыемства. Працуюць добра».

Важным фактарам, які садзейнічаў умацаванню партыйных радоў, была праведзеная ў 1921 годзе на падставе рашэнняў X з'езду РКП(б) чыстка партыі ад чужых і гнілых элементаў.

Чыстка партыі ў Мінску праводзілася на адкрытых сходах з удзелам беспартыйных рабочых. Яна значна ўмацавала гарадскую парт-

арганізацыю, палепшыла яе сацыяльны склад, узняла аўтарытэт і ўзмацніла давер'е працоўных мас да партыі.

Значна ажывілася работа прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый Мінска. З 7 па 13 мая 1921 года ў сталіцы праходзіў I з'езд прафсаюзаў Беларусі. Ён аднадушна адобрыў пераход да новай эканамічнай палітыкі, прыняў неабходныя меры па ўвядзенню адзінага тарыфу, стварэнню большай адпаведнасці паміж аплатай працы кваліфікаваных рабочых і служачых.

У адпаведнасці з рашэннямі з'езду прафсаюзныя арганізацыі Мінска перабудоўвалі сваю работу. Была спрошчана структура і скарочан састаў платных работнікаў, узрасла асабістая адказнасць кожнага з іх, узрасла роля фабрычна-заводскіх камітэтаў, склад якіх быў абноўлен за лік найбольш ініцыятыўных і здольных работнікаў. Прафсаюзы сталі глыбей унікаць у дзейнасць прадпрыемстваў, прымалі меры па рамонту будынкаў і абсталявання. Была праведзена перарэгістрацыя членаў прафсаюзаў і ўведзена дабравольнае членства. Перабудова работы прафсаюзных арганізацый станоўча адбілася на іх дзейнасці.

На рабочых беспартыйных канферэнцыях і сходах працоўныя абмяркоўвалі пытанні аб замене харчразвёрсткі харчпадаткам, аб павышэнні прадукцыйнасці працы і наладжванні работы прадпрыемстваў, адабралі новую эканамічную палітыку партыі. Так, у перыяд правядзення «Тыдня прафруху» летам 1921 года ў Мінску было праведзена 70 сходаў. На іх прысутнічалі 13 300 членаў прафсаюза.

Партыйная арганізацыя горада правяла шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ажыўленне і паляпшэнне работы Саветаў. Выбары ў Мінскі Савет, якія адбыліся ў верасні 1921 года, з'явіліся яркім выражэннем павышэння палітычнай свядомасці і актыўнасці рабочых і ўсіх працоўных, іх давер'я да палітыкі Камуністычнай партыі. У выбарах прынялі ўдзел каля 19 тысяч выбаршчыкаў. У састаў Савета былі выбраны 274 дэпутаты, з іх 218 камуністаў і 56 беспартыйных. Па сацыяльнаму становішчу 53,6 працэнта членаў гарсавета складалі рабочыя, 11,5 — чырвонаармейцы, 34,9 — служачыя. У ліку выбраных дэпутатаў былі 22 жанчыны. У састаў прэзідыума выканкома былі выбраны А. Х. Гетнер, С. Б. Карп, Н. І. Палонік, І. П. Каранеўскі і А. І. Крыніцкі.

Выбарчая кампанія ў Мінску пацвердзіла правільнасць гаспадарчай палітыкі Савецкага ўрада. Расло давер'е рабочых да камуністаў і недавер'е да згодніцкіх партый. Аб гэтым сведчыць наступны факт. Калі ў 1920 годзе ў саставе Мінскага Савета было яшчэ 33 бундаўцы і 8 паалей-цыяністаў, то ў час выбараў у 1921 годзе ніводзін з іх у Савет не прайшоў.

Мінскі гарадскі Савет вёў вялікую гаспадарчую і культурную работу. На яго пленумах абмяркоўваліся асноўныя пытанні жыцця горада, міжнароднай і ўнутранай палітыкі. Пры Савеце былі створаны секцыі: камунальная, народнай асветы, аховы здароўя, садзейнічання Чырвонай Арміі, рабоча-сялянскай інспекцыі і інш. Секцыі займаліся папярэднім абмеркаваннем планаў, справаздач аддзелаў, праводзілі абследаванне дзейнасці розных прадпрыемстваў і ўстаноў. У саставе секцый налічвалася каля 400 чалавек. Уцягванне ў работу секцый шырокага актыву рабочых і служачых садзейнічала далучэнню працоўных да дзяржаўнага ўпраўлення. Дэпутаты Савета рэгулярна рабілі справаздачы перад сваімі выбаршчыкамі.

Штодзённую дапамогу рабоча-сялянскай інспекцыі ў яе барацьбе з бюракратызмам работнікаў дзяржапарату, пакражамі, рознымі злоўжываннямі аказвалі рабочыя. Калектывы прадпрыемстваў на агульных сходах выбіралі і пасылалі для работы ў РСІ лепшых прадстаўнікоў. Только ў чэрвені 1921 года, напрыклад, 11 прадпрыемстваў Мінска накіравалі ў РСІ 22 рабочых. Значная колькасць рабочых была вылучана ў органы пракуратуры і міліцыі.

У сувязі з пераходам да нэпа ў рэспубліцы была праведзена рэарганізацыя кіравання прамысловасцю. Замест глаўкаў і цэнтраў ствараліся ўпраўленні, якія аб'ядноўвалі прадпрыемствы аднародных галін прамысловасці. З 16 групавых упраўленняў БССР сем размяшчаліся ў Мінску. У выніку перабудовы ліквідаваўся празмерны цэнтралізм у кіраўніцтве прадпрыемствамі, павышалася іх ініцыятыва ва ўздыме вытворчасці.

На працягу 1922—1923 гадоў у Мінску амаль уся прамысловасць, якая знаходзілася ў распараджэнні Саўнаргаса, была трэставана. З восені 1921 года на прадпрыемствах, падпарадкаваных Савету народнай гаспадаркі БССР, пачаў уводзіцца гаспадарчы разлік. Перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік садзейнічаў умацаванню іх фінансавага становішча, росту прыбытковасці і стварэнню ўнутрыпрамысловых накапленняў.

У выніку канцэнтрацыі прамысловасці павялічвалася вытворчая нагрузка прадпрыемстваў, памяншаліся накладныя выдаткі, павысілася прадукцыйнасць працы, знізіўся сабекошт прадукцыі.

У руках дзяржавы заставаліся толькі найбольш буйныя прадпрыемствы, а дробныя і тэхнічна слабаўзброеныя здаваліся ў арэнду кааператыўным арганізацыям і прыватным асобам. Аднародныя дробныя прадпрыемствы аб'ядноўваліся ў больш буйныя. Так, рашэннем прэзідыума СНГБ ад 11 ліпеня 1921 года друкарні Мінска аб'ядноўваліся ў тры дзяржаўныя друкарні, на якіх працавалі 415 чалавек. У Мінску былі закрыты дробныя гарбарныя заводы, а іх абсталяванне і сыравіна перададзены 1 і 2-му гарбарным заводам.

У выніку ўзбуйнення прадпрыемстваў павялічыўся выпуск прадукцыі, колькасць рабочых на 1-м гарбарным заводзе ўзрасла да 240, а на 2-м — да 78 чалавек.

Асноўная, найбольш кваліфікаваная частка рабочых Мінска была занята на дзяржаўных прадпрыемствах. На 1 лістапада 1922 года з 6799 прамысловых рабочых 4178 чалавек працавалі на 58 дзяржаўных прадпрыемствах. Астатнія былі заняты на кааператыўных і прыватных прадпрыемствах.

Прымаліся меры да ліквідацыі ўраўняльнай сістэмы аплаты працы, якая практыкавалася ў гады ваеннага камунізма. З мэтай павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці работнікаў у выніках працы з красавіка 1921 года на прадпрыемствах Мінска ўводзілася натурпрэміраванне. Інакш кажучы, акрамя грашовай аплаты, рабочы атрымліваў яшчэ прадукты сваёй жа вытворчасці. Іх памер залежаў ад кваліфікацыі рабочага і прадукцыйнасці яго працы. Летам 1921 года частка прадпрыемстваў Мінска ў парадку эксперымента пераводзіцца на калектыўнае забеспячэнне. Фонд заработнай платы вылічваецца ў залежнасці ад вытворчых вынікаў, а не ад колькасці ўнесеных у спіс асоб. У выніку пераводу на калектыўнае забеспячэнне першага гарбарнага завода выраб скур узрос з 2326 штук у маі да 4006 у ліпені 1921 года пры скарачэнні штату рабочых з 240 да 146 чалавек. З пераводам Мінскай шчацінна-шчотачнай фабрыкі на калектыўнае забеспячэнне прадукцыйнасць працы рабочых узрасла амаль удвая.

Пераход ад прадуктаабмену да гандлю, перавод прамысловых прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік настойліва дыктавалі змяненне ўсёй тарыфнай палітыкі. З восені 1921 года дэкрэтам Саўнаркома РСФСР адмянялася забеспячэнне на картачках, спісках, а таксама натурпрэміраванне ўсіх работнікаў прадпрыемстваў, якія знаходзіліся на дзяржзабеспячэнні. Усё гэта стварала матэрыяльную зацікаўленасць у выніках працы. К канцу 1921 года картачная сістэма была паўсюдна ліквідавана. Усё больш скарачалася натуральная частка заработнай платы і павялічвалася грашовая. Усеагульная працоўная павіннасць, уведзеная ў перыяд ваеннага камунізма, замянялася добраахвотным наймам рабочых.

Рабочы клас актыўна ўключыўся ў барацьбу за пераадоленне пасляваенных цяжкасцей, за аднаўленне прамысловасці, транспарту. Па ініцыятыве камуністаў у Мінску рэгулярна праводзіліся агульнагарадскія суботнікі, прысвечаныя ў асноўным аднаўленню чыгуначнага транспарту. Актыўны ўдзел у іх прымалі камсамольцы. Былі адрамантаваны дзесяткі кіламетраў чыгуначных путей і значная колькасць паравозаў, адбудаваны чыгуначныя масты. Толькі ў студзені 1921 года ў горадзе было праведзена дзевяць суботнікаў, у якіх

прынялі ўдзел больш пяці тысяч чалавек. Яны выгрузілі каля 60 вагонаў і пагрузілі 131 вагон розных грузаў, ачысцілі ад снегу і смецця некалькі дзесяткаў кіламетраў чыгуначных пуцей.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі горада аказвалі дапамогу сялянству Беларусі ў правядзенні веснавой сяўбы. У красавіку 1921 года праходзіў «Тыдзень чырвонага аратага». Рабочыя брыгады стварылі ў многіх вёсках і сёлах кузні і майстэрні па рамонту сельскагаспадарчага інвентару, укамплектавалі іх інструментам. Бяднейшаму сялянству рабочыя рамантавалі інвентар бясплатна.

Працоўныя Мінска прынялі актыўны ўдзел у аказанні дапамогі галадаючым раёнам Паволжа, Крыма і Украіны, якія пацярпелі ад засухі. Пры Мінскім гарвыканкоме, а таксама ва ўсіх раёнах і на буйнейшых прадпрыемствах былі створаны камісіі дапамогі галадаючым. Работа гэтых камісій праходзіла пад лозунгам «Дзевяць сытых павінны накарміць аднаго галоднага». Для дапамогі галадаючым былі сабраны дзесяткі тысяч рублёў золатам. Акрамя таго, па патрабаванню працоўных былі канфіскаваны і выкарыстаны на закупку прадуктаў для галадаючых каштоўнасці мінскіх цэркваў і касцёлаў.

На прамысловых прадпрыемствах і ва ўстановах горада прафсаюзы арганізавалі штомесячныя адлічэнні ў фонд дапамогі галадаючым у размеры аднадзённага заработку. Для галадаючых паступалі зборы ад сталовых, кафэ, ад канцэртаў, спектакляў і г. д. 30 ліпеня 1921 года адбыўся масавы суботнік. Зароблены грошы (143 700 рублёў) удзельнікі суботніка паслалі ў дапамогу галадаючым Паволжа. Толькі за перыяд з ліпеня па кастрычнік 1921 года ў фонд дапамогі галадаючым ад працоўных Мінска паступіла звыш 24 мільёнаў рублёў. За гэты ж час з Мінска ў Саратаўскую, Кіргізскую губерні, Чувашскую вобласць былі адпраўлены дзесяткі тысяч пудоў харчавання. Апрача дапамогі грашыма і прадуктамі, працоўныя Мінска ўзялі на сваё ўтрыманне больш 2 000 дзяцей з Паволжа.

2. Першыя поспехі ў аднаўленні прамысловасці, гарадской гаспадаркі, развіцці гандлю

У барацьбе за аднаўленне прамысловых прадпрыемстваў рабочыя Мінска праявілі высокую вытворчую актыўнасць. Многія з прамысловых прадпрыемстваў, што распачалі работу, уводзіліся ў строй цаной велізарнага напружання сіл. Вось як ішло аднаўленне машынабудаўнічага і чыгуналіцейнага завода «Энергія» (цяпер мінскі станкабудаўнічы завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі).

Польскія войскі дашчэнту разбурылі завод, вывезлі абсталяванне. Халоднай зімой 1921 года па ініцыятыве прафсаюза металістаў на Ляхаўцы з'явілася першая група рабочых-энтузіястаў, сярод якіх былі токар К. І. Туманоўскі, каваль С. В. Сержановіч, актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі мадэльшчык І. П. Голубеў і інш. Рукамі, якія дубелі ад холаду, рабочыя дасталі з-пад снегу два паламаныя такарныя станкі, кавадла і саматужны горн. Рабочыя прыносілі з дому хто малаток, хто зубіла, хто ціскі. На руінах і звалках збіралі дахавае жалеза, часткі да станкоў, металічны лом. Выпадкова ўдалося выявіць на дне Свіслачы паравы кацёл, некалькі іржавых жалезных бакаў. Іх дасталі з вады, на месцы раскляпалі і перанеслі на завод. На чыгунцы быў узяты сапсаваны лакамабіль. Неўзабаве яго адрамантавалі. Так нараджалася новае, сацыялістычнае прадпрыемства.

Характарызуючы масавы працоўны гераізм рабочых завода «Энергія», газета «Звезда» адзначала: «Не ведалі стомы рабочыя. Адна мэта стаяла перад імі, адна задача: пабудаваць як мага хутчэй свой завод. Днём і ноччу працавалі яны... стварылі першы чыгуналіцейны і машынабудаўнічы завод у Беларусі». Адкрыццё завода ў лютым 1921 года вылілася ў вялізную ўрачыстасць. У гэты дзень на вуліцах Мінска плакаты паведамлялі: «Яшчэ адна перамога на фронце працы». У звароце калектыву завода «Энергія» ад 20 лютага да ўсіх рабочых Беларусі гаварылася: «Сёння ў тры гадзіны дня першы раз пачуецца гудок 1-га Савецкага машынабудаўнічага і чыгуналіцейнага завода Беларусі. Селянін, гэтым гудком рабочы горада вітае вёску.

Будзе работа на заводзе, будуць земляробчыя машыны ў вёсцы. Металісты запрашаюць таварышоў прыняць удзел ва ўрачыстасцях».

У першыя часы магчымасці завода былі невялікія. Ён выпускаў для патрэб сельскай гаспадаркі рэспублікі плугі, бароны, а пазней— конныя прыводы. У 1921—1922 гадах было выраблена 1332 плугі, 161 саламарэзка і 2313 штук рознага ліцця. Завод расшырыўся, папоўніўся абсталяваннем. Былі пабудаваны новы корпус, цэх шырспажыву, механічны, ліцейны і мадэльны цэхі, сталовая і складскія памяшканні, адрамантаваны старыя памяшканні, устаноўлены рухавікі, новыя станкі, паравое ацяпленне. У 1922 годзе станочны парк павялічыўся да 33 адзінак. Прадпрыемства стала асвойваць і выпускаць больш складаныя машыны — абсталяванне для крухмальнай прамысловасці, млыны, абсталяванне для аднаўляемых прадпрыемстваў харчовай прамысловасці рэспублікі. У 1923 годзе на Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы заводу «Энергія» быў прысуджан дыплом чацвёртай ступені.

Па ініцыятыве камуністаў і камсамольцаў рабочыя мінскіх чыгуначных майстэрняў арганізавалі збор металалому, нарыхтоўку лесаматэрыялаў для вытворчых мэт, адрамантавалі станкі. Сярод найбольш актыўных удзельнікаў аднаўлення чыгуначных майстэрняў былі брыгадзір слесараў І. Е. Дрозд, страхары А. І. Падабед, Г. П. Скарабагаты, маляр А. А. Палоўнік, слесары І. К. Мішчук, І. С. Невідовіч і інш.

Акрамя «Энергіі», у гэтыя гады ў Мінску працавалі лесапільны завод і мэблевая майстэрня «Дрэваапрацоўшчык», чатыры гарбарных заводы, шклозавод «Пралетарый», абутковая фабрыка, запалкавая фабрыка «Вулкан», чатыры дрожджа-вінакурных заводы, тры друкарні, 12 млыноў, лямцавая фабрыка, сельскагаспадарчыя, сталярныя і слясарныя майстэрні, цагельныя заводы і шэраг іншых прадпрыемстваў.

Ва ўсіх галінах прамысловасці горада разгортваліся работы па рамонту вытворчых будынкаў і абсталявання. На гарбарных заводах былі ўстаноўлены новыя сілавыя ўстаноўкі, шэсць дубільных барабанаў, пабудаваны сушылкі, адрамантаваны лакамабілі, абсталявана новая электрычная вентыляцыя. Сур'ёзна быў абноўлен дрожджавы завод «Беларусь». Рабочыя з гордасцю заяўлялі: «Гэта не толькі абнаўленне. Завод літаральна перарадзіўся. Не пазнаць яго зусім».

Палепшылася забеспячэнне фабрык і заводаў палівам, сыравінай, дапаможнымі матэрыяламі. На адным з пасяджэнняў эканамічнай нарады Беларусі адзначалася, што к канцу 1922 года вострай патрэбы ў паліве ўжо не мае ні адно прадпрыемства Мінска.

Павялічылася вытворчасць электраэнергіі. Магутнасць гарадской электрастанцыі ўзрасла з 850 кілават у 1913 годзе да 1254 кілават у 1923 годзе.

У выніку павелічэння выпуску прамысловай прадукцыі, змяншэння накладных выдаткаў прамысловыя прадпрыемствы сталіцы ў першым паўгоддзі 1923 года далі 210 тысяч рублёў прыбытку.

Рашаючай умовай, якая забяспечыла ўжо ў 1921—1923 гадах першыя поспехі ў аднаўленні прамысловасці, з'явілася павышэнне прадукцыйнасці працы. У 1923 годзе ў параўнанні з 1921—1922 гадамі прадукцыйнасць працы рабочых цэнзавай прамысловасці горада ўзрасла на 47 працэнтаў.

Аднаўлялася і саматужная прамысловасць. У першыя гады нэпа павялічыўся прыватны капітал у прамысловай вытворчасці. У чэрвені 1922 года ў Мінску налічвалася 540 прыватных прадпрыемстваў, абкладзеных ураўняльным зборам. Гэта былі ў большасці выпадкаў дробныя прадпрыемствы, занятыя вытворчасцю прадметаў шырокага спажывання. К канцу года іх колькасць ужо набліжалася да тысячы. На іх працавала 1870 чалавек.

Адной з форм развіцця прыватнага капіталу стала арэнда. У арэнду здаваліся дробныя і бяздзеючыя прадпрыемствы. К кастрычніку 1921 года ў Мінску было здадзена ў арэнду дзевяць прадпрыемстваў, на якіх былі заняты 193 чалавекі. Аднак удзельная вага прыватнага сектара ў буйной прамысловасці была невялікай. Органы Савецкай улады рэгулявалі і абмяжоўвалі рост прыватнакапіталістычнага сектара. Гаспадары прадпрыемстваў абкладаліся павышаным падаткам.

Важным сродкам паляпшэння работы прамысловасці, павышэння прадукцыйнасці працы, росту актыўнасці рабочых і паляпшэння іх матэрыяльнага становішча з'явілася кампанія па заключэнню калектыўных дагавораў. Дагавор, які заключаўся на дзяржаўным прадпрыемстве паміж адміністрацыяй і калектывам рабочых і служачых у асобе іх прафсаюзных арганізацый, ахопліваў усе бакі іх вытворчага і культурна-бытавога жыцця, мабілізоўваў шырокія рабочыя масы на выкананне вытворчых заданняў. Першы калектыўны дагавор заключылі паміж сабой прафсаюз хімікаў і групавое ўпраўленне шкляной прамысловасці, а ўсяго на ліпень 1922 года ў Мінску было заключана 226 калектыўных дагавораў і 13 тарыфных пагадненняў.

Асабліва важнае значэнне ў абароне інтарэсаў рабочых мела заключэнне калектыўных дагавораў на прыватных прадпрыемствах, дзе прадпрыемцы спрабавалі як мага больш выціснуць для сябе прыбыткаў. Прыватнікі несвоечасова выплачвалі заработную плату, парушалі ўмовы аховы працы. Прафсаюзныя арганізацыі і органы Савецкай улады прымалі рашучыя меры да парушальнікаў савецкіх законаў. Пытаннямі ўрэгулявання спрэчных спраў паміж рабочымі і прадпрыемцамі займаліся канфліктныя камісіі. Ва ўсіх выпадках канфлікты вырашаліся ў карысць рабочых.

Вялася барацьба з кватэрніцтвам, г. зн. раздачай работы на дом, да якой звярталіся прыватнікі, каб ухіліцца ад выплаты страхавых узносаў і выканання пастаноў аб ахове працы. Найбольш развіта было кватэрніцтва ў швейных, шавецкіх і папяросных майстэрнях. Часта работа выконвалася на вышках у празмерна цяжкіх, антысанітарных умовах.

Органы аховы працы, выявіўшы кватэрнікоў і прадпрыемцаў, якія давалі ім работу, прапаноўвалі апошнім заключыць з імі дагавор у адпаведным прафсаюзе, устанавіўшы нармальны рабочы дзень, аплату працы па стаўках саюза, выкананне законаў па ахове працы. Многія прадпрыемцы, выкрытыя ў раздачы работы на дом, адмаўляліся выконваць законы аб працы і закрывалі свае майстэрні.

З аднаўленнем дзяржаўнай прамысловасці Мінска расла колькасць рабочых. На прадпрыемствы вярталіся старыя, кваліфікаваныя рабочыя. Колькасць фабрычна-заводскіх рабочых у 1923 годзе дасягнула сямі тысяч чалавек.

Увесь цяжар барацьбы за аднаўленне фабрык і заводаў, наладжванне работы вынеслі на сваіх плячах кадравыя рабочыя, загартаваныя ў барацьбе з інтэрвентамі і белагвардзейцамі. Яны самаадданазмагаліся з гаспадарчай разрухай, дабіваючыся высокай прадукцыйнасці працы.

Новыя, сацыялістычныя адносіны да працы знайшлі сваё выражэнне ў той павазе, якой партыя і органы Савецкай улады акружалі герояў працы. Пра іх шырока пісаў друк, іх заносілі на Чырвоныя дошкі, ушаноўвалі на сходах. За шматгадовую і бездакорную работу лепшых рабочых узнагароджвалі граматамі, прысвойвалі званне герояў працы.

1 мая 1921 года ў Мінску адбылося ўрачыстае ўшанаванне 180 лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, якія мелі вялікі вытворчы стаж і асабліва вызначыліся на працоўным фронце. Сярод іх былі металісты, чыгуначнікі, друкары, швейнікі, харчавікі, будаўнікі, дрэваапрацоўшчыкі, работнікі камунальнай гаспадаркі. У гарадскім тэатры быў праведзен урачысты сход, на якім сабраліся рабочыя і работніцы сталіцы. За сталом прэзідыума разам з героямі працы сядзелі сакратар Цэнтральнага Бюро КП(б)Б В. Г. Кнорын, старшыня ЦВК БССР А. Г. Чарвякоў і інш. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый горача і сардэчна павіншавалі герояў працы, паднеслі даравальныя адрасы і ўручылі каштоўныя падарункі. Вітаючы ветэранаў працы, сакратар ЦБ КП(б)Б В. Г. Кнорын сказаў: «Камуністы ганарацца тым, што яны на ваенным і мірных франтах заўсёды ўперадзе. Вітаючы доблесных герояў працы чырвонага Мінска, нельга не пажадаць, каб беспартыйная маса рабочых з энтузіязмам і рэвалюцыйнай энергіяй працягвала сваю работу стварэння і адраджэння пад кіраўніцтвам авангарда рабочага класа — Камуністычнай партыі».

У ліку герояў працы былі адзначаны Ф. І. Васанскі — ліцейны майстар завода «Метал», К. І. Паўлоўскі — вагранщчык таго ж завода, П. Х. Пярлоўскі, Г. Позняк, П. Габрыловіч — з мінскай водаправоднай электрычнай станцыі, П. Віткоўскі — машыніст і інш. Многія з іх працавалі на вытворчасці 40 і больш гадоў, актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйным руху: металісты Н. Барбарчук і Я. Заянчкоўскі, харчавікі Г. Рубенчык і В. Чайкоўскі, будаўнікі М. Дзмітрыеў і Х. Каждан, друкары Д. Бялевіч і І. Стронгін, гарбары Ф. Цяболін і М. Мажэйка. Ад імя герояў працы стары металіст заявіў: «Я многа, многа год працую. Дзеці, ведайце, што Камуністычная партыя выведзе нас на светлы шлях свабоднай працы».

Вечарам 1 мая на плошчы Свабоды адбылося ўрачыстае шэсце, а пасля — шматтысячны мітынг працоўных сталіцы. Пад гукі Інтэрнацыянала быў адкрыт абеліск у гонар герояў працы.

З уздымам народнай гаспадаркі паляпшалася матэрыяльнае становішча працоўных. Расла рэальная заработная плата рабочых і служачых. Усё больш укаранялісь заахвочвальныя формы аплаты працы.

У 1921 годзе СНК БССР прадпісаў сачыць за своечасовым прадстаўленнем рабочым і служачым чарговых водпускаў, не дапускаць да работы малалетніх. Народны Камісарыят працы прыняў пастанову, у якой забараніў усім прадпрыемствам і ўстановам звышурочныя і начныя работы без папярэдняга дазволу аддзела аховы працы.

Замена харчразвёрсткі харчпадаткам з'явілася пачаткам пераходу ад сістэмы забеспячэння перыяду ваеннага камунізма да свабоднага і разгорнутага гандлю. У выніку ажывілася прыватнае капіталістычнае прадпрыемніцтва. З прычыны слабасці і недастатковай гібкасці дзяржаўнага і кааператыўнага гандлёвага апарату значная частка гандлю, асабліва рознічнага, трапіла ў рукі прыватных асоб. Ужо ў другой палове 1921 года дзейнічала 620 прыватных гандлёвых прадпрыемстваў, абкладзеных ураўняльным зборам, а ў першым паўгоддзі 1922 года іх колькасць павялічылася да 686. Але прыватнік пераважаў у рознічным гандлі, а ў аптовым галоўнае месца займалі дзяржаўныя органы. Пытаннямі рэгулявання прыватнага гандлю займалася спецыяльная камісія, створаная пры прэзідыуме гарадскога Савета. У яе састаў уваходзілі прадстаўнікі выканкома, аддзела ўпраўлення, адзінага спажывецкага таварыства, Наркамфіна і Наркампрацы.

Разгортвалася дзейнасць па паляпшэнню работы кааперацыі, расшырэнню яе гандлёвай сеткі.

Трэцяя мінская павятовая партыйная канферэнцыя, якая адбылася ў чэрвені 1921 года, прапанавала ўсім партыйным работнікам на месцах прыняць актыўны ўдзел у стварэнні сеткі кааператыўных аб'яднанняў, уцягваючы ў кааперацыю шырокія працоўныя масы. У 1921 годзе ў сталіцы рэспублікі працавала 32 рабочых кааператывы. Мінскае адзінае спажывецкае таварыства адкрывала свае магазіны па продажу прамысловых і прадуктовых тавараў. Абароты таварыства ад студзеня да снежня 1922 года павялічыліся з 4575 рублёў да 1025,3 тысячы рублёў. У 1923 годзе мінскі цэнтральны рабочы кааператыў налічваў больш 10 тысяч пайшчыкаў.

Ведучы барацьбу са спекуляцыяй прыватнікаў, кааператывы арганізоўвалі ўласныя пякарні, гарбарныя, мылаварныя, тытунёвыя і іншыя прадпрыемствы. Так, у канцы 1922 — пачатку 1923 года мінскі саюз рабочай кааперацыі меў у сваім распараджэнні дзевяць гандлёвых устаноў, шэсць сталовых і кафэ, якія адпускалі па 1500 абедаў у дзень, тытунёва-папяросную фабрыку, хлебапякарню, мылаварны завод, шавецкую майстэрню, пральню і інш.

Доля прыватніка ў агульным гандлёвым абароце, якая выцясняласяся дзяржаўным і кааператыўным абаротам, паступова паніжалася.

Прыкметна палепшылася харчаванне рабочых. Важную ролю ў павышэнні матэрыяльнага становішча працоўных адыгрывалі створаныя пры фабзаўкомах камісіі па паляпшэнню быту рабочых. Камісіі арганізоўвалі рамонт жылля рабочых, адкрывалі рамонтныя майстэрні па рамонту адзення, абутку, аказвалі дапамогу беспрацоўным, якія жылі ў нястачы, хворым шляхам выдачы бясплатных абедаў, прадуктаў харчавання. Органамі сацыяльнага забеспячэння Мінска з кастрычніка 1922 па верасень 1923 года было выплачана пенсій, аказана дапамога непрацаздольным і жыўшым у нястачы ў суме 661,3 тысячы рублёў.

Органы Савецкай улады, прафсаюзныя арганізацыі пастаянна клапаціліся аб паляпшэнні жыллёвых умоў працоўных, аказанні ім медыцынскай дапамогі і г. д. У параўнанні з дарэвалюцыйным часам жыллёвае становішча рабочых і служачых прыкметна палепшылася, але насельніцтва горада ўсё ж адчувала вострую нястачу ў жыллі.

З мэтай аслаблення жыллёвага крызісу і паляпшэння жыллёвых умоў працоўных апошнія па рашэнню органаў Савецкай улады перасяляліся ў кватэры, якія раней займалі эксплуататарскія класы. Напрыклад, у Мінску з мая па жнівень 1921 года добраўпарадкаванае жыллё атрымалі 4650 чалавек.

Паступова адбудоўваўся жыллёвы фонд сталіцы, разбураны акупантамі. Але ён быў яўна недастатковы для перасялення рабочых з сырых паўпадвалаў. У верасні 1921 года СНК рэспублікі прыняў пастанову, якая давала камунальным аддзелам права дазваляць «кааператыўным аб'яднанням і асобным грамадзянам забудову гарадскіх участкаў, якія ў бліжэйшы час не могуць быць забудаваны сродкамі мясцовых выканкомаў».

У рабочых раёнах былі электрыфікаваны сотні дамоў. Калі ў 1914 годзе ў Мінску карысталіся электрычнасцю каля 1400 сямей (найбольш заможная частка насельніцтва), то ўжо ў 1922 годзе электрасвятло гарэла ў чатырох тысячах кватэр. Па рашэнню гарсавета праводзіліся «нядзельнікі» і «двухнядзельнікі» па ачыстцы ад бруду і смецця двароў і вуліц. Паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў жыцця працоўных садзейнічала павышэнню іх актыўнасці і арганізаванасці.

Яркім паказчыкам палітычнай актыўнасці і свядомасці працоўных Мінска з'явіліся іх адносіны да працэсу, які адбыўся над правымі эсэрамі ў Маскве ў 1922 годзе. У сваіх шматлікіх рэзалюцыях калектывы рабочых і служачых патрабавалі суровай меры пакарання правых эсэраў за іх контррэвалюцыйную барацьбу супраць Савецкай дзяржавы. «За расстрэлы, за забойствы соцень рабочых, за тэра-

рыстычныя акты супраць правадыроў рабочага класа мы патрабуем для іх належнага пакарання па іх заслугах»,— заяўлялі рабочыя Мінска.

Велізарнае значэнне для паспяховага аднаўлення народнай гаспадаркі ў краіне мела ўтварэнне Саюза ССР. Працоўныя Мінска горача віталі падрыхтоўку да стварэння СССР. Аб гэтым сведчыць рэзалюцыя канферэнцыі рабочых і служачых Мінска, прынятая 10 снежня 1922 года. У ёй гаворыцца: «Прымаючы пад увагу неабходнасць вялікага напружання сіл Савецкай Беларусі для далейшай работы, а таксама ўлічваючы тое, што развіццё і ўзмацненне савецкіх рэспублік, у тым ліку і Савецкай Беларусі, знаходзіцца ў залежнасці ад умацавання Савецкай Расіі ў міжнародных адносінах, дзе Савецкая Расія з кожным днём набывае ўсё большае значэнне, сход лічыць, што з'езд Саветаў Беларусі павінен прыняць рашэнні, якія б стварылі яшчэ больш цесную сувязь усіх савецкіх рэспублік».

У «Наказе» Мінскага Савета ад 14 снежня 1922 года IV з'езду Саветаў Беларусі ўказвалася, што з'езд Саветаў павінен прыняць рашэнне, накіраванае на ўстанаўленне яшчэ больш цеснай сувязі і адзінства савецкіх рэспублік шляхам стварэння Саюза ССР. IV з'езд Саветаў БССР, які адбыўся 18 снежня 1922 года ў Мінску, даручыў дэлегатам, выбраным на X Усерасійскі з'езд Саветаў, даць «у час работы з'езду ўрачыстае абяцанне і выканаць фармальныя акты, якія б замацоўвалі братэрскі Саюз Сацыялістычных Савецкіх рэспублік».

30 снежня 1922 года ў Маскве на I Усесаюзным з'ездзе Саветаў было створана добраахвотнае дзяржаўнае аб'яднанне савецкіх народаў — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Стварэнне СССР з'явілася трыумфам ленінскіх ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму, брацкай дружбы і адзінства народаў Савецкай краіны. Яно адкрыла шырокія перспектывы для росквіту матэрыяльных і духоўных сіл усіх народаў СССР, у тым ліку для развіцця беларускай сацыялістычнай нацыі.

У сувязі з нахабным ультыматумам міністра замежных спраў Англіі Керзана і забойствам у маі 1923 года ў Лазане савецкага дыпламата В. Вароўскага ў Мінску пракацілася хваля мітынгаў і дэманстрацый пратэсту, у якіх удзельнічалі тысячы працоўных. Яны ганьбілі імперыялістаў, праяўлялі непахісную гатоўнасць адстаяць заваёвы Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. «Улічваючы становішча Савецкай Расіі ў цяперашні час,— гаварылася ў рэзалюцыі рабочых-чыгуначнікаў станцыі Мінск,— магчымасць спроб з боку Заходняй Еўропы сарваць зноў наша мірнае будаўніцтва шляхам ваенных пагроз... мы, рабочыя, заяўляем, што на баку Савецкай Расіі ўся сіла і што гэту сілу нікому не ўдасца зламаць».

Дэманстрацыі і мітынгі пратэсту адбыліся на заводах «Энергія», «Пралетарый», «Варшавянка», «Беларусь», «Дрэваапрацоўшчык», у сельскагаспадарчых майстэрнях і іншых прадпрыемствах. Рабочая моладзь Мінска, сабраўшыся на мітынг, заявіла аб сваёй гатоўнасці са зброяй у руках выступіць на абарону сваёй сацыялістычнай Радзімы. Аб павышэнні палітычнай свядомасці працоўных сведчыць рост уплыву і аўтарытэту Камуністычнай партыі. У сакавіку 1923 года наша краіна адзначыла 25-годдзе з дня адкрыцця I з'езду РСДРП. Рабочыя прамысловых прадпрыемстваў і транспарту ў сувязі з юбілеем працавалі звышурочна, наладжвалі мітынгі, сходы. «У Мінску юбілейны дзень прайшоў у працы,— пісала «Правда»,— але к шасці гадзінам вечара рабочыя прама з заводаў і з майстэрняў накіраваліся да невялічкага домікa на Савецкай вуліцы, дзе адбываўся I з'езд партыі. Каля гэтага домікa быў наладжан мітынг. Выступалі галоўным чынам беспартыйныя. Адзін за другім узлазілі яны на невялікую трыбуну, высока падымалі свае чырвоныя сцягі і гаварылі аб сваёй любві і адданасці партыі.

— Ваш юбілей — наша свята! Вы нас вялі па правільнаму шляху. Вы — наша партыя, мы пойдзем з вамі і далей да поўнай перамогі камунізма,— сказалі гарбары.

— Вы далі рабочым Расіі васьмігадзінны рабочы дзень, свабоду і адкрылі шлях да асветы,— гаварылі дрэваапрацоўшчыкі.

— Вы кавалі рэвалюцыі, і мы будзем каваць савецкую прамысловасць,— кляліся беспартыйныя металісты».

3. Прамысловасць Мінска к канцу аднаўленчага перыяду

У 1923 годзе Савецкая краіна перажывала сур'ёзныя гаспадарчыя і палітычныя цяжкасці. Разруха яшчэ не была пераможана. Прамысловасць адставала. Прадукцыйнасць працы і заработная плата рабочых яшчэ былі ніжэй даваеннага ўзроўню. Павольны рост народнай гаспадаркі не дазваляў ліквідаваць беспрацоўе. Гандаль у гэты перыяд развіваўся з перабоямі з прычыны празмерна высокіх цэн на прамысловыя вырабы і нізкіх цэн на прадукты сельскай гаспадаркі. Пачаўся так званы «крызіс збыту».

У Мінску крызіс збыту тавараў выразна праявіўся восенню 1923 года. На валасных сялянскіх канферэнцыях у Мінскім павеце дэлегаты ўказвалі на падаражанне фабрычна-заводскіх тавараў. Яны гаварылі, што селяніну, каб купіць пару ботаў, патрэбна прадаць 25 пудоў жыта.

Рэзкае скарачэнне продажу прамысловых вырабаў пацягнула за сабою фінансавыя цяжкасці прамысловых прадпрыемстваў Мінска. Некаторыя з іх (напрыклад, запалкавая фабрыка «Вулкан») былі спынены, іншыя працавалі з няпоўнай нагрузкай. Заработная плата рабочым на многіх прадпрыемствах выдавалася са спазненнем.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад намецілі шляхі пераадолення гэтых цяжкасцей. Былі зніжаны цэны на прадметы шырокага ўжытку, прыняты меры па разгортванню гандлю праз савецкія і кааператыўныя органы і выцясненню з гандлю прыватнікаў і спекулянтаў. Толькі за шэсць месяцаў, з верасня 1923 па сакавік 1924 года, цана паркалю ў Мінску знізілася на 24, солі — на 30, газы — на 54 працэнты. Адначасова былі павышаны цэны на хлеб і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты. У выніку гэтых рашучых дзеянняў крызіс збыту быў ліквідаваны.

У час гаспадарчых цяжкасцей зноў ажывіліся антыленінскія элементы ў партыі. Выкарыстаўшы хваробу У. І. Леніна, трацкісты восенню 1923 года навязалі партыі агульнапартыйную дыскусію. Барацьба насіла востры характар. У Мінску трацкісты сканцэнтравалі барацьбу супраць партыі ў Ляхаўскім раёне, куды ўваходзілі ячэйкі вышэйшых навучальных устаноў. На партыйных сходах камуністы паказалі высокую палітычную актыўнасць. Партыйная арганізацыя горада адобрыла пастанову ЦК і ЦКК РКП(б) і асудзіла падрыўную дзейнасць трацкістаў. У рашэнні агульнага сходу гарадской партыйнай арганізацыі ўказвалася, што «сход адвяргае фракцыйнасць і групоўкі ўнутры партыі і лічыць неабходным для паспяховага правядзення задач, якія стаяць перад партыяй і кіруемай ёю дзяржавай, яшчэ большае адзінства і згуртаванасць партыі».

Поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР былі азмрочаны цяжкім горам, якое спасцігла партыю, рабочы клас і ўсіх працоўных. 21 студзеня 1924 года памёр вялікі правадыр і настаўнік працоўных усяго свету, стваральнік Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы Уладзімір Ільіч Ленін.

Працоўныя Мінска з пачуццём найглыбейшага смутку сустрэлі паведамленне аб смерці вялікага правадыра. У сталіцы паўсюдна праходзілі жалобныя сходы і мітынгі. На трохтысячным мітынгу працоўных 24 студзеня 1924 года, прысвечаным памяці У. І. Леніна, рабочыя, работніцы, чырвонаармейцы, служачыя і рабочая моладзь далі клятву працягваць вялікую справу Леніна, назаўжды заставацца вернымі яго запаветам, ісці далей па шляху, вызначанаму Леніным. Па рашэнню ўрада Беларусі ў Мінску ўзводзіўся помнік У. І. Леніну.

Камуністычная партыя заклікала рабочы клас яшчэ цясней згуртавацца вакол партыі. Быў аб'яўлен ленінскі заклік у партыю.

У гэтыя дні сотні перадавых кадравых рабочых Мінска падалі заявы аб уступленні ў рады Камуністычнай партыі. У ліку прынятых былі столяр завода «Дрэваапрацоўшчык» Б. А. Ванчук, слесар дэпо А. І. Клімчанка, лінейны наглядчык дэпо Ф. С. Краўчук, рабочы гарбарнага завода А. Р. Нейштадт і многія іншыя.

За кароткі час Мінская гарадская партыйная арганізацыя выросла на 398 чалавек. К 1 мая 1924 года ў яе радах налічвалася 2632 камуністы. Некаторыя партыйныя ячэйкі выраслі амаль удвая. Так, ячэйка завода «Энергія» выросла з 19 да 38 камуністаў, ячэйка цягі і пуці Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі — з 68 да 135 камуністаў і г. д.

Ленінскі заклік значна палепшыў сацыяльны састаў партыйнай арганізацыі Мінска. Калі ў лютым 1924 года сярод членаў і кандыдатаў партыі рабочыя складалі 47 працэнтаў, то ў маі таго ж года — 55 працэнтаў.

Пасля смерці У. І. Леніна трацкісты распачалі новую атаку супраць партыі. Троцкі навязаў партыі новую дыскусію, выступіўшы з артыкулам «Урокі Кастрычніка», у якой скажаў гісторыю партыі, паклёпнічаў на У. І. Леніна, робячы спробы падмяніць ленінізм трацкізмам.

Мінская партыйная арганізацыя, як і ўся наша партыя, яшчэ цясней згуртавалася ў барацьбе супраць трацкісцкай апазіцыі. 26 лістапада 1924 года адбыўся сход гарадской партыйнай арганізацыі. Ён заслухаў даклад сакратара ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкага аб новым антыпартыйным выступленні Троцкага і пастанавіў на бліжэйшым пленуме ЦК РКП(б) прыняць рашучыя меры супраць Троцкага.

Важнай гістарычнай падзеяй у жыцці беларускага народа было першае ўзбуйненне БССР, праведзенае ў сакавіку 1924 года. Па рашэнню Цэнтральнага Камітэта партыі і саюзнага ўрада ў састаў нашай рэспублікі ўключаліся частка Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў РСФСР з пераважаючым беларускім насельніцтвам, з гарадамі Магілёвам, Віцебскам, Полацкам і інш.

Працоўныя Мінска горача віталі пастанову аб узбуйненні БССР. У рэзалюцыі пашыраны пленум гарадскога Савета адзначыў: «У гэтым рашэнні вышэйшай Савецкай улады Мінскі Савет бачыць яркае выражэнне братэрскіх вузаў, якія звязваюць пралетарыят і сялянства РСФСР з рабочым і селянінам БССР, яркае выражэнне пралетарскіх адносін да нацыянальнага пытання на карысць усіх народаў і нацый вялікага Саюза ССР».

13—16 сакавіка 1924 года ў Мінску адбыўся VI Надзвычайны з'езд Саветаў Беларусі. На ім прысутнічаў выдатны дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы старшыня ЦВК СССР Міхаіл

Іванавіч Калінін. Ён выступіў на з'ездзе і заклікаў рабочых і сялян Беларусі ўсімі сіламі ўмацоўваць саюз рабочага класа і сялянства, указаў на вялікае дзяржаўнае значэнне ўзбуйнення тэрыторыі БССР. У прынятай па дакладу М. І. Калініна рэзалюцыі гаварылася: «Аб'яднанне ў складзе Беларусі тэрыторыі з большасцю беларускага насельніцтва з'яўляецца прамым вывадам з агульных асноў палітыкі Камуністычнай партыі і з'яўляецца лепшым доказам брацкага вырашэння самых складаных пытанняў сумеснага жыцця асобных рэспублік, якія ўваходзяць у склад СССР».

Узбуйненне БССР адкрывала новыя магчымасці для завяршэння аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі, росту яе гарадоў, для павышэння культурнага ўзроўню народа. У выніку ўзбуйнення тэрыторыя Беларусі павялічылася больш чым у два разы — з 55,2 да 110,5 тысячы квадратных кіламетраў, а колькасць насельніцтва выросла з 1555 тысяч да 4117 тысяч чалавек. Нацыянальны састаў насельніцтва БССР стаў наступным: 70,4 працэнта складалі беларусы, 16,7 — рускія, 9,7 — яўрэі, 2,2 — палякі і 1 працэнт — рабочыя іншых нацыянальнасцей. Прамысловасць папоўнілася радам буйных прадпрыемстваў, колькасна павялічыўся рабочы клас. Толькі ў цэнзавай прамысловасці рэспублікі ў 1924 годзе працавалі 20 175 чалавек.

7 сакавіка 1924 года Прэзідыум ЦВК СССР прыняў спецыяльную пастанову «Аб мерах садзейнічання беларускім рабочым і сялянам у сувязі з узбуйненнем БССР», у якой намеціў канкрэтныя меры, накіраваныя на тое, каб «арганізацыйныя, бюджэтныя і іншыя пытанні, звязаныя з фактам аб'яднання ў складзе БССР тэрыторыі з большасцю беларускага насельніцтва, былі вырашаны ў паскоранным парадку ў органах Саюза ССР... Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік,— падкрэслівалася ў пастанове,— не сумняваецца, што гэты найвялікшы акт узаемнага давер'я народаў, якія насяляюць Саюз, павагі да самавызначэння кожнага з іх паслужыць заклікам для ўсіх працоўных Беларусі працаваць над сваім эканамічным і культурным адраджэннем і развіццём, над умацаваннем і ўзмацненнем Савецкай Беларусі і ўсяго Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

З узбуйненнем БССР яшчэ больш узрасло эканамічнае, палітычнае і культурнае значэнне Мінска як сталіцы рэспублікі. Перайшоўшыя да Беларусі паветы Гомельскай і Смаленскай губерняў, якія пасля ўзбуйнення не ўяўлялі сабой афармленых у адміністрацыйных адносінах адзінак, кіраваліся непасрэдна з Мінска.

Рашэннем Белбюро ЦК РКП(б) у Мінску і Віцебску былі створаны павятова-гарадскія камітэты партыі. На першай павятова-гарадской партыйнай канферэнцыі, што адбылася 23 сакавіка 1924 года

ў Мінску, для непасрэднага кіраўніцтва партыйнай работай у горадзе і навоце быў выбран Мінскі павятова-гарадскі камітэт партыі, які працягваў сваю работу да жніўня 1924 года (да ўтварэння Акруговага камітэта партыі). Пастановай ЦВК БССР ад 20 сакавіка 1924 года Мінскі гарадскі і павятовыя выканаўчыя камітэты ліквідаваліся, а замест іх ствараўся Мінскі павятова-гарадскі выканаўчы камітэт у саставе 25 чалавек.

Пасля ўзбуйнення БССР былыя групавыя ўпраўленні прамысловасці былі рэарганізаваны ў трэсты, якія аб'ядноўвалі аднародныя на вытворчай аснове прадпрыемствы. Адначасова дапускалася стварэнне асобных гаспадарчых адзінак у выпадку, калі вытворчасць і рэалізацыя прадукцыі гэтых прадпрыемстваў не былі непасрэдна звязаны з трэставымі галінамі прамысловасці. У лік аўтаномных гаспадарчых адзінак выдзяляўся завод «Энергія».

З мэтай канцэнтрацыі вытворчасці на больш буйных прадпрыемствах, паляпшэння забеспячэння іх неабходнай сыравінай і матэрыяламі апошнія заставаліся ў распараджэнні Саўнаргаса, а параўнальна невялікія былі перададзены ў падпарадкаванне акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў.

Узбуйненне фабрык і заводаў, выдзяленне аўтаномных гаспадарчых адзінак дазволіла ўстанавіць больш дакладныя арганізацыйныя формы кіравання прамысловасцю. Гэтыя меры ўмацавалі прамысловасць і садзейнічалі канцэнтрацыі рабочага класа на найбольш вялікіх заводах і фабрыках.

У барацьбе за зніжэнне сабекошту прадукцыі, зніжэнне цаны прамысловых вырабаў, павышэнне прадукцыйнасці працы важную ролю адыгралі вытворчыя нарады і рацыяналізатарскі рух. Вытворчыя нарады, якія ўзніклі яшчэ ў 1921 годзе па ініцыятыве самих рабочых, сталі адной з важнейшых форм сацыялістычнай арганізацыі працы.

Так, на заводзе «Энергія» вытворчыя нарады рэгулярна абмяркоўвалі важнейшыя пытанні дня: аб рабоце асобных цэхаў, змен, брыгад, аб паляпшэнні якасці прадукцыі, аб павышэнні прадукцыйнасці працы, аб асваенні новых відаў прадукцыі і г. д. На вытворчых нарадах завода «Дрэваапрацоўшчык» ішла размова аб пераходзе цэхаў на індывідуальную здзельшчыну, аб пераабсталяванні завода, аб барацьбе за рэжым эканоміі.

Вытворчыя нарады разглядалі рацыяналізатарскія прапановы рабочых. Многія з іх потым укараняліся на прадпрыемствах. Напрыклад, рабочы дрожджа-вінакурнага завода «Чырвоная зара» вынайшаў гільзу для фармоўкі дражджэй, дзякуючы якой выпуск прадукцыі на гэтай аперацыі павялічыўся ўдвая. На дрожджавінакурным заводзе «Пралетарый» рабочыя зрабілі дрожджарэзку,

якая раней увозілася з-за мяжы. У выніку было сэканомлена некалькі дзесяткаў тысяч рублёў.

Вытворчыя нарады выхоўвалі ў рабочых свядомыя адносіны да вытворчага жыцця, дапамагалі ім абагульняць і выкарыстоўваць вопыт перадавікоў, садзейнічалі ліквідацыі недахопаў у дзейнасці заводаў і фабрык. Непасрэднымі арганізатарамі нарад выступалі прафсаюзы. Актывізацыі дзейнасці прафсаюзных арганізацый садзейнічалі перавыбары фабзаўкомаў, якія праходзілі ў чэрвені—ліпені 1925 года.

У 1925/26 гаспадарчым годзе валавая прадукцыя цэнзавай прамысловасці Мінска значна перавысіла ўзровень 1913 года. Калі ў 1912 годзе прадукцыі было выпушчана на 3880 тысяч рублёў, то ў першым квартале 1925 года — на 3 420 356 рублёў. Сацыялістычны сектар у цэнзавай прамысловасці складаў 97,8 працэнта, а прыватнакапіталістычны — усяго толькі 2,2 працэнта. Прадукцыя металаапрацоўчай прамысловасці перавысіла даваенны ўзровень амаль на 20 працэнтаў.

Адбудоўвалася і расла энергетычная база горада. У 1924 годзе пад кіраўніцтвам Маскоўскага электратрэста было праведзена пераабсталяванне Мінскай электрычнай станцыі. Саюзны ўрад асігнаваў для гэтага 300 тысяч рублёў. Турбагенератары і іншае абсталяванне для станцыі зрабілі Ленінградскі і Харкаўскі заводы. У 1926 годзе магутнасць электрастанцыі склала тры тысячы кілават.

На працягу ўсяго аднаўленчага перыяду сталіца рэспублікі атрымлівала з Масквы, Ленінграда і іншых прамысловых цэнтраў абсталяванне (станкі, друкарскія машыны, электраматоры), з Украіны — сыравіну, паліва. Прымаліся меры да стварэння сваёй станкабудаўнічай прамысловасці. Так, у канцы 1925 года калектывам мінскага завода «Энергія» ўпершыню быў выпушчан узор такарнага станка. Пры выпрабаванні ён паказаў добрыя вынікі.

Побач з адбудовай старых прадпрыемстваў, пашырэннем і абсталяваннем іх былі зроблены першыя крокі ў галіне новага прамысловага будаўніцтва. У 1925 годзе ў Мінску пачалося збудаванне дрэваапрацоўчага завода, абутковай і швейных фабрык, цагельнага завода. Дадатковыя сродкі (2162 тысячы рублёў) на гэтыя і іншыя мэты выдзяляў Саўнарком СССР.

У сакавіку 1925 года на базе аб'яднання аўтарамонтных майстэрняў і чыгуналіцейнага завода арандатара Ліхтэрмана быў створан чыгуналіцейны і машынабудаўнічы завод «Метал». Спачатку прадпрыемства выконвала заказы па рамонту абсталявання фабрык і заводаў, а ў 1926 годзе асвоіла выпуск камбінаваных цыркулярных і гантарэзных станкоў, насосаў для крухмальнай прамысловасці, прэсаў, трансмісійнага абсталявання.

Прамысловасць Мінска ў 1925 годзе стала значным фактарам сацыялістычнага будаўніцтва ў рэспубліцы. Удзельная вага цэнзавай прамысловасці горада ў адносінах да цэнзавай прамысловасці БССР склала 16,2 працэнта. Разам з прамысловасцю акругі Мінск даваў амаль $^1/_3$ прамысловай прадукцыі рэспублікі (30,4 працэнта). Паліграфічная прамысловасць складала 63 працэнты ўсёй паліграфічнай прамысловасці Беларусі, вытворчасць гарбарнай прамысловасці — 42,4 працэнта прадукцыі ўсіх гарбарных (цэнзавых) прадпрыемстваў.

Разам з аднаўленнем прамысловасці расла колькасць рабочых горада. У лютым 1924 года ў Мінску налічвалася 29 буйных прадпрыемстваў, на якіх было занята 2300 рабочых. У 1925 годзе колькасць рабочых цэнзавай прамысловасці перавысіла ўзровень 1913 года. З кастрычніка 1924 да кастрычніка 1925 года колькасць будаўнікоў выросла з 1830 да 2600. У 1925 годзе было кааперавана звыш дзвюх тысяч саматужнікаў.

Узмацнілася канцэнтрацыя рабочых на прадпрыемствах горада. Калі ў 1913 годзе ў сярэднім на адно прадпрыемства цэнзавай прамысловасці прыпадала 30 рабочых, то ў 1925 годзе — 65. Такім чынам, рабочыя Мінска па сваёй колькасці і саставу к канцу аднаўленчага перыяду былі значнай сілай, здольнай вырашаць складаныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

З году ў год узмацнялася эканамічная сувязь сталіцы БССР з іншымі раёнамі рэспублікі і краіны. Аб узросшым эканамічным значэнні горада можна меркаваць па грузаабароту чыгуначнага транспарту. У 1925 годзе агульны размер грузаабароту станцыі Мінск па прыбыццю і адпраўленню грузаў склаў 19 551 тысячу пудоў і дасягнуў даваеннага ўзроўню. З Мінска ва ўсе канцы Савецкай Беларусі паступала прадукцыя прамысловасці — адзенне, абутак, сельскагаспадарчыя прылады, металічныя вырабы, кнігі, газеты, часопісы. У сваю чаргу рэспубліка забяспечвала сталіцу харчаваннем, сельскагаспадарчай сыравінай, палівам і г. д.

У перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі яшчэ больш умацаваўся саюз рабочага класа з сялянствам. Мінскія рабочыя аказвалі вёсцы ўсебаковую дапамогу. Прамысловыя прадпрыемствы ва ўсё ўзрастаючых памерах забяспечвалі вёску сельскагаспадарчымі машынамі і прыладамі, прамысловымі таварамі. Для правядзення рамонту сельскагаспадарчага інвентару адкрываліся майстэрні.

Важную ролю ва ўмацаванні саюзу рабочага класа і сялянства, у палітычным выхаванні сялян адыграла шэфства горада над вёскай. Ідэя шэфства знаходзіла гарачы водгук сярод працоўных Мінска. Рабочыя, выязджаючы ў вёску, працавалі на палях сялян, рамантавалі сельскагаспадарчыя прылады, праводзілі палітыка-асветную работу. Яны з'яўліся правадзікамі камуністычных ідэй на сяле.

Так, 1 мая 1923 года быў арганізаваны масавы выезд з Мінска ў вёску членаў шэфскіх ячэек. У валасцях, вёсках шэфы прачыталі даклады, выступілі з канцэртамі, перадалі сялянам сельскагаспадарчыя машыны і прылады, завезлі літаратуру, газеты. Рабочыя завода «Дрэваапрацоўшчык» падарылі бяднейшым сялянам дзве веялкі, партячэйка гарсавета правяла канферэнцыю жанчын, перадала плугі, піяніна, кнігі, газеты і інш.

З мэтай далейшага ўмацавання змычкі паміж горадам і вёскай VIII з'езд Кампартыі Беларусі (май 1924 года) прызнаў мэтазгодным замест існаваўшых раней шэфскіх камісій пры партыйных ячэйках стварыць шэфскія таварыствы, у якіх удзельнічалі б не толькі камуністы, але і шырокія масы беспартыйных. На прадпрыемствах і ва ўстановах горада паўсюдна ствараліся таварыствы «культзмычкі». На заводзе «Энергія» ў склад такога таварыства ўваходзілі ўсе рабочыя і служачыя. Для аказання практычнай дапамогі і ўмацавання сельскіх партыйных арганізацый ЦК КП(б)Б накіраваў у распараджэнне сельскіх райкомаў партыі 200 адказных партыйных работнікаў.

Шэфскае таварыства Гарадскога раёна Мінска ў 1925 годзе налічвала 6500 членаў. Яно праводзіла работу ў чатырох раёнах Мінскай акругі і прыгарадных вёсках. Таварыства арганізавала больш 30 хат-чытальняў, стварыла чырвоныя куткі, гурткі па ліквідацыі непісьменнасці, сельскагаспадарчыя меліярацыйныя таварыствы, праводзіла выезды ў вёску ўрачоў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі. За восем месяцаў 1925 года пры садзеянні шэфскага таварыства Ляхаўскага раёна Мінска, якое налічвала 3700 членаў, у сельсаветах было створана 54 хаты-чытальні, дзевяць сельскагаспадарчых кааператываў і таварыстваў. Усе хаты-чытальні падшэфных вёсак забяспечваліся газетамі і кнігамі.

4. Гарадская гаспадарка і гандаль. Павышэнне жыццёвага ўзроўню працоўных

Савецкая ўлада прымала ўсе меры, каб за кароткі час аднавіць гарадскую гаспадарку, палепшыць жыллёва-бытавое становішча працоўных. На развіццё гаспадаркі сталіцы БССР выдзяляліся значныя сродкі. Аб гэтым наглядна сведчыў рост гарадскога бюджэту. Калі ў 1914 годзе бюджэт Мінска раўняўся 1176,5 тысячам рублёў, то ў 1922/23 фінансавым годзе ён узрос да 4615 тысяч рублёў.

Капіталаўкладанні ў жыллёвую гаспадарку павялічваліся з году ў год. Калі ў 1923 годзе дзяржаўныя органы і кааперацыя зрасхода-

валі на рамонт жылых дамоў 506,1 тысячы рублёў, то ў 1925 годзе на рамонт і новае жыллёвае будаўніцтва было выдаткавана 2700 тысяч рублёў і ўведзена ў строй 31 850 квадратных метраў жылой плошчы.

У 1925 годзе пачалося будаўніцтва новых рабочых пасёлкаў у раёне Ляхаўкі, плошчы Парыжскай Камуны, вакзала і вуліцы імя Крапоткіна. Быў закладзен жылы пасёлак імя Камінтэрна.

Для змяншэння жыллёвай нястачы і паляпшэння стану жылога фонду ў 1924 годзе сталі ствараццa жыллёвыя кааператыўныя аб'яднанні — жылтаварыствы. Праз год у Мінску налічвалася 43 жылтаварыствы, якія рамантавалі новыя дамы. Крэдыт для гэтых мэт давала дзяржава.

Палепшылася работа гарадскога транспарту. Колькасць пасажыраў, перавезеных конкай, узрасла з 653,1 тысячы ў 1922 годзе да 1377,2 тысячы ў 1925 годзе. Вялася падрыхтоўка да пуску мінскага трамвая. У кастрычніку 1924 года адкрыўся аўтобусны рух па двух маршрутах, якія злучалі рабочыя ўскраіны — Камароўку, Старажоўку, Ляхаўку — з цэнтрам горада. Калі ў 1924 годзе аўтобусамі было перавезена 566,8 тысячы пасажыраў, то ў 1925 годзе — 1175,1 тысячы. Аднак насельніцтва ўсё яшчэ адчувала сур'ёзныя цяжкасці ў транспарце. Значная колькасць грузаў па-ранейшаму перавозілася на конях.

У горадзе разгарнуліся работы па добраўпарадкаванню вуліц, плошчаў, садоў, сквераў. Рамантаваліся старыя і будаваліся новыя масты. Калі ў 1924 годзе на добраўпарадкаванне было выдаткавана 90 тысяч рублёў, то ў 1925 годзе — амаль у дзесяць разоў больш. Паспяхова вялася асушка забалочаных раёнаў (Камароўскае і Сляпянскае балоты) і засыпка равоў на ўскраінах.

Знешні воблік сталіцы набыў больш прывабны выгляд. Электрычным святлом асвятляліся многія вуліцы не толькі цэнтра, але і рабочых пасёлкаў. Былі выдзелены спецыяльныя штатныя санітарныя ўрачы і фельчары, якія сістэматычна праводзілі санітарнае абследаванне двароў, вуліц і прадпрыемстваў.

Вялікая ўвага звярталася на паляпшэнне забеспячэння вадой рабочых ускраін. У 1925 годзе працягласць вулічнай сеткі водаправода складала 45 кіламетраў, сярэднесутачны расход вады раўняўся 3345 кубаметрам. Водаправодам карысталіся 80 тысяч чалавек (61 працэнт насельніцтва горада).

Ліквідацыя прыватнай уласнасці на зямлю дазволіла ажыццявіць забудову і планаванне ўсёй гарадской тэрыторыі па адзінаму плану. Рашэннем 2-й сесіі ЦВК БССР (сакавік 1923 года) была ўстаноўлена новая гарадская мяжа, у выніку чаго тэрыторыя Мінска павялічылася больш чым у два разы.

Пад кіраўніцтвам выдатнага маскоўскага архітэктара прафесара В. Н. Сямёнава быў распрацаваны пяцігадовы план добраўпарадкавання, паляпшэння планавання і забудовы Мінска.

У аднаўленчы перыяд у горадзе паспяхова развіваўся гандаль. Доля прыватніка ў агульным гандлёвым абароце зніжалася, выцясняла дзяржаўным і кааператыўным сектарам. Адначасова ішло выцясненне прыватнага сектара з сферы нарыхтовак. Для барацьбы з прыватнікам і забеспячэння насельніцтва хлебам у 1923 годзе ў Мінску было адкрыта аддзяленне дзяржаўнага акцыянернага таварыства «Хлебапрадукт». Гэта арганізацыя закупляла хлеб у сялян і прадавала яго насельніцтву. Выпечка хлеба ў Мінску павялічылася да 1000 пудоў у дзень.

У парадку тавараабмену рабочыя кааператывы Мінска (на 1 кастрычніка 1925 года ім належала 57 магазінаў) адпускалі сялянам Беларусі мануфактуру, соль, газу, сельскагаспадарчыя машыны і г. д. Сяляне ж здавалі ў кааперацыю жыта, ячмень, бульбу, мяса і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты.

Рашаючае значэнне для развіцця кааператыўнага тавараабароту мела далейшае разгортванне сеткі кааператыўнага гандлю і ўцягненне ў кааперацыю насельніцтва. Ужо на 1 студзеня 1923 года ў Мінску і павеце налічвалася 310 спажывецкіх таварыстваў. У 1925 годзе спажывецкай кааперацыяй было ахоплена 67 працэнтаў насельніцтва Мінска. Валавы абарот яе складаў звыш 16 мільёнаў рублёў.

Створаная ў снежні 1922 года мінская таварная біржа была пастаяннай пазаведамаснай гандлёвай арганізацыяй, у дзейнасці якой прымалі ўдзел дзяржаўныя, кааператыўныя і прыватныя прадпрыемствы. З году ў год раслі размеры біржавых абаротаў. У 1924/25 годзе яны дасягнулі 40,7 мільёна рублёў і склалі 215 працэнтаў памераў біржавых абаротаў 1923/24 года. Таварныя біржы мелі значэнне часовых, пераходных органаў па рэгуляванню гандлю.

Мінск з'яўляўся буйнейшым у Беларусі цэнтрам аптовага гандлю. Тут былі сканцэнтраваны буйныя аптовыя прадпрыемствы, якія забяспечвалі амаль усе акругі рэспублікі. Агульны абарот гандлёвых прадпрыемстваў Мінска і акругі за другое паўгоддзе 1923/24 года склаў 36 мільёнаў рублёў з 90 мільёнаў рублёў абароту ўсяго гандлю БССР. З 2627 гандлёвых устаноў па акрузе ў 1923/24 годзе на долю сталіцы прыпадала 1884 з гандлёвым абаротам 33 804 тысячы рублёў.

Цэны на прамысловыя тавары ў кааперацыі былі значна ніжэйшымі, чым у прыватных гандляроў. У сувязі з гэтым павялічваўся аўтарытэт кааперацыі сярод шырокіх працоўных мас. Зніжэнне цэн на тавары масавага спажывання цесна спалучалася з палітыкай выцяснення і абмежавання прыватнага капіталу. Так, у 1925/26 годзе

ўдзельная вага дзяржаўнага сектара ў аптовым гандлі Мінска і акругі склала 72,4 працэнта тавараабароту. На долю кааператыўнага гандлю прыпадала 24,6 і прыватнага — тры працэнты. У руках прыватных гандляроў быў сканцэнтраваны пераважна дробны рознічны гандаль, які складаў каля 48 працэнтаў рознічнага тавараабароту.

У выніку ўздыму народнай гаспадаркі і развіцця гандлю палепшылася і матэрыяльна-бытавое становішча працоўных. У 1925/26 годзе заработная плата рабочых цэнзавай прамысловасці Мінска перавысіла даваенную. Палепшылася харчаванне насельніцтва. Яно стала больш спажываць высокакаларыйных прадуктаў: з 1921 па 1925 год сярэдняе дзённае спажыванне мяса рабочымі павялічылася ў 13 разоў, малака — у чатыры з палавінай раза, масла — у дзевяць разоў.

Безумоўна, цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва былі яшчэ вялікія. Рабочыя горада атрымлівалі дадатковыя ільготы па кватэрнай плаце, ільготныя талоны на электрычнасць, крэдыт у кааперацыі. Калі ў дарэвалюцыйны час расходы на кватэрную плату складалі больш дзесяці працэнтаў бюджэту рабочага, то ў 1926 годзе 86,5 працэнта рабочых і служачых плацілі толькі ад трох да пяці працэнтаў свайго заработку.

Пашырылася сетка медыцынскіх устаноў, палепшылася амбулаторная, хуткая, зубаўрачэбная і фізіятэрапеўтычная дапамога насельніцтву. Ужо ў 1923 годзе ў Мінску працавала 140 урачоў — у два разы болей, чым у 1914 годзе. Праз два гады былі адкрыты чатыры амбулаторыі: па Нова-Маскоўскай вуліцы, на вуліцы Лекерта, Камароўцы і Пярэспе. За год (з кастрычніка 1923 па кастрычнік 1924 года) аптэкамі было адпушчана 471,9 тысячы рэцэптаў.

Савецкая ўлада не шкадавала сродкаў для паляпшэння здароўя працоўных. Аб гэтым сведчыць хоць бы такі факт. Калі ў 1914 годзе расходы на ахову здароўя складалі ўсяго пяць працэнтаў бюджэту мінскай гарадской управы, то па каштарысу Мінскага гарвыканкома ў 1922/23 годзе яны склалі 16,3 працэнта (784,3 тысячы рублёў), а ў 1925/26 годзе ўзраслі да 1528,6 тысячы рублёў.

Вялікая ўвага ўдзялялася прафілактычным мерапрыемствам, абследаванню здароўя працоўных. У 1925 годзе было праведзена абследаванне рабочых і служачых завода «Энергія», шчаціннай фабрыкі, першай і другой дзяржаўных друкарняў, хлебапякарні, цэнтральнага рабочага кааператыву і інш. Рабочыя, якія мелі патрэбу ў лячэнні, атрымлівалі дадатковыя водпускі, накіроўваліся ў санаторыі і дамы адпачынку. Для правядзення санітарна-асветнай работы сярод працоўных быў арганізаван Дом санітарнай асветы.

Пашыралася сетка дзіцячых устаноў — садоў, ясляў, пляцовак; ствараліся жаночыя і дзіцячыя кансультацыі. У 1924 годзе ў Мінску

працавала 25 дзіцячых дамоў. У іх знаходзілася 1740 дзяцей. Для аказання дапамогі беспрытульным было створана таварыства «Друг дзяцей». З верасня 1924 па сакавік 1926 года ад працоўных Мінска ў фонд дапамогі дзецям паступіла 35,4 тысячы рублёў.

Дзякуючы павышэнню матэрыяльнага дабрабыту працоўных, паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання, аздараўленню ўмоў працы павысілася нараджальнасць і знізілася смяротнасць. У 1924 годзе ў параўнанні з 1913 годам захворванне сярод насельніцтва горада скарацілася ў 2,5 раза.

Аднак цяжкасці ў гэтай галіне да канца яшчэ не былі пераадолены. Адной з іх было меўшае ў той час месца беспрацоўе. У сакавіку 1925 года на ўліку ў гарадской біржы працы стаяла больш 4,1 тысячы чалавек. Пераважную большасць іх складалі некваліфікаваныя рабочыя. «Беспрацоўе ў Мінску,— гаварылася ў пастанове гарсавета ад 26 жніўня 1925 года,— у сувязі з невысокай кваліфікацыяй беспрацоўных з'яўляецца ўстойлівым і прымае зацяжны характар, галоўным чынам сярод асоб канторскай працы і чорнарабочых».

Пытанне аб беспрацоўі і мерапрыемствах па барацьбе з ім неаднаразова абмяркоўвалася ў ЦК КП(б)Б, Саўнаркоме Беларусі, ЦСПСБ і іншых органах. У чэрвені 1925 года бюро ЦК КП(б)Б прапанавала ўсім дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам рэспублікі шырока разгарнуць будаўнічыя работы, уцягнуць у іх беспрацоўных, арганізаваць дадатковыя грамадскія работы ў Мінску і іншых гарадах. СНК БССР выдзеліў на гэтыя мэты 600 тысяч рублёў.

У кастрычніку 1924 года ў Мінску быў праведзен месячнік на карысць беспрацоўных. Дапамога беспрацоўным аказвалася шляхам арганізацыі грамадскіх работ, выдачы грашовых дапамог, арганізацыі бясплатнага харчавання. У 1925 годзе на арганізацыю грамадскіх работ было выдаткавана 200 тысяч рублёў. Акрамя таго, саюзны ўрад дадаткова адпусціў на гэтыя мэты 185 тысяч рублёў.

У сувязі з развіццём прамысловасці Мінск станавіўся ўсё больш мнагалюдным. У 1926 годзе ў ім налічвалася 131,8 тысячы чалавек супраць 70 тысяч у 1920 годзе. Змяніўся нацыянальны састаў яго насельніцтва. Па даных перапісу 1897 года, яўрэі складалі 51,1 працэнта, а беларусы — усяго толькі каля $^1/_3$ усяго насельніцтва. К 1926 году беларусаў налічвалася ўжо 42,4 працэнта, у той час як яўрэяў — 40,8 працэнта. Горад рос за лік беларускай вёскі.

У гэтыя гады адбываюцца карэнныя змены ў розных галінах народнага побыту. У жорсткай барацьбе старога і новага адыходзілі ў мінулае многія аджыўшыя бытавыя з'явы, ствараліся новыя, перадавыя. Яны былі звязаны з новымі адносінамі да працы, з удзелам ва ўпраўленні вытворчасцю. Стала традыцыяй ушаноўванне перадавікоў вытворчасці і старэйшых рабочых.

Камсамольцы арганізоўвалі культпаходы за новы быт, сачылі за чыстатой утрымання інтэрнатаў, кватэр, вуліц, двароў, будавалі дзіцячыя пляцоўкі, куткі, адкрывалі хаты-чытальні, наладжвалі калектыўныя паходы ў кіно і тэатры. У быт сталі ўваходзіць вулічныя шэсці і карнавалы. У выніку поспехаў антырэлігійнай прапаганды адмаўляўся ад многіх рэлігійных абрадаў.

Царкоўным абрадам пры нараджэнні дзіцяці былі супрацьпастаўлены «акцябрыны». Звычайна ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці рабочых і служачых нованароджаным давалі імёны, паднослі падарункі. У чэрвені 1923 года адбылася першая агульнагарадская канферэнцыя работніц і жонак рабочых Мінска, якая прыняла спецыяльную рэзалюцыю «Аб новых формах быту». У ёй указвалася на «неабходнасць ажыццявіць у жыцці тыя правы, якія дала працоўным жанчынам Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя». Канферэнцыя заклікала жанчын прымаць актыўны ўдзел у рабоце прафсаюзаў, кааператываў, рабочых клубаў, у ліквідацыі непісьменнасці.

Паляпшэнне культурных і матэрыяльна-бытавых умоў жыцця працоўных садзейнічала павышэнню іх актыўнасці, свядомасці і арганізаванасці.

Працоўныя Мінска ўважліва сачылі за ходам класавай барацьбы замежнага пралетарыяту, аказвалі яму неабходную дапамогу і падтрымку. Па ініцыятыве партыйных і прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах ствараліся ячэйкі МОПРа; на сходах абмяркоўваліся пытанні збору сродкаў у дапамогу рэвалюцыянерам. Яны арганізоўвалі інтэрнацыянальныя вечары, распаўсюджвалі агітплакаты, літаратуру, выступалі з пратэстам супраць зверскага абыходжання з рэвалюцыянерамі.

Так, у 1923 годзе разгортваецца кампанія па аказанню матэрыяльнай дапамогі нямецкім рабочым. У пісьме да нямецкіх рабочых будаўнікі пісалі: «Агульны сход саюза будаўнікоў, заслухаўшы даклад т. Вайнера аб становішчы ў Германіі, гаворыць: «Наша рэвалюцыйнае брацкае вітанне пралетарыям-барацьбітам Германіі.

У выпадку, калі хто-небудзь з буржуазных краін паспрабуе дапамагчы германскай буржуазіі, мы, рабочыя-будаўнікі, станем на барыкады разам з германскім пралетарыятам і будзем змагацца за ўладу працоўных».

У чэрвені 1924 года рабочыя мінскіх сельскагаспадарчых майстэрняў аддічылі свой аднадзённы заработак у фонд аказання дапамогі баставочным металістам Нарвегіі.

28 красавіка 1924 года на ўрачыстае пасяджэнне пленума Мінскага гарадскога савета, прысвечанае святкаванню 1 Мая, прыбыла група польскіх рэвалюцыянераў, вызваленых з турмаў. Звяртаючыся

да іх з прывітаннем, старшыня ЦВК БССР А. Г. Чарвякоў сказаў: «Беларусь працягвае сваю брацкую руку сябрам і братам, рабочым і сялянам Польшчы. З імі разам яна будзе... у барацьбе супраць польскай і міжнароднай буржуазіі».

Працоўныя Мінска аказвалі маральную падтрымку і матэрыяльную дапамогу рэвалюцыйным сілам Кітая. «Агульны сход рабочых-друкароў Мінска,— гаварылася ў рэзалюцыі ад 6 верасня 1924 года,— з абурэннем ганьбіць гнюсную спробу імперыялістычных зграй Англіі, Амерыкі і Францыі шляхам расстрэлаў працоўных Кітая звергнуць нацыянальна-рэвалюцыйны ўрад Сунь Ят-сена».

Па рашэнню ЦСПСБ ад 26 верасня 1924 года ў рэспубліцы быў створан камітэт таварыства «Рукі прэч ад Кітая», у фонд якога паступалі значныя сродкі.

Мінск наведалі дэлегацыі рабочых капіталістычных краін: германская, аўстрыйская, французская, чэхаславацкая і інш. Чэхаславацкая рабочая дэлегацыя перад ад'ездам з Беларусі ў кастрычніку 1925 года заявіла: «Мы клянёмся вам, што, следуючы вашаму прыкладу, будзем імкнуцца, каб у нас дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі рабочых і сялян».

Сталіцу Савецкай Беларусі наведвалі віднейшыя дзеячы культуры рускага і іншых народаў нашай краіны: паэты, пісьменнікі, артысты, кампазітары. 28 студзеня 1925 года ў Доме культуры адбыўся літаратурны вечар У. У. Маякоўскага, на якім ён, цёпла сустрэты мінчанамі, выступіў з чытаннем сваіх вершаў.

На гастролі ў Мінск прыязджалі артысты Акадэмічнага Малага тэатра Саюза ССР і іншых тэатраў краіны, вядомыя спевакі, кампазітары. У кастрычніку 1925 года некалькі канцэртаў для працоўных горада даў народны артыст РСФСР Л. В. Собінаў.

У выніку самаадданай работы працоўных і гарадской партыйнай арганізацыі ў 1921—1925 гадах у эканамічным і культурным развіцці Мінска былі дасягнуты значныя поспехі. Прамысловасць і гаспадарка пераўзышлі даваенны ўзровень. Паспяхова развівалася нацыянальная па форме сацыялістычная па зместу культура. Выраслі і ўмацаваліся камуністычныя ячэйкі на прадпрыемствах. Узрасло палітычнае, эканамічнае і культурнае значэнне Мінска як сталіцы Савецкай Беларусі.

РАЗДЗЕЛ XV

У БАРАЦЬБЕ ЗА ПАБУДОВУ ЭКАНАМІЧНАГА ФУНДАМЕНТУ САЦЫЯЛІЗМА (1926—1932 гады)

1. Мінск у першыя гады рэканструкцыі народнай гаспадаркі

Са завяршэннем аднаўленчага перыяду перад працоўнымі краіны паўсталі новыя задачы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Інтарэсы будаўніцтва сацыялізма настойліва патрабавалі стварэння магутнай індустрыі, падвядзення пад усе галіны народнай гаспадаркі базы перадавой тэхнікі.

У. І. Ленін вучыў, што адзінай матэрыяльнай асновай сацыялізма можа быць буйная машынная прамысловасць, здольная рэарганізаваць і земляробства, што без цяжкай прамысловасці «мы не зможам пабудаваць ніякай прамысловасці, а без яе мы наогул загінем як самастойная краіна» [1].

Тэхнічнае абсталяванне заводаў і фабрык было вельмі адсталым. Многія фабрычныя будынкі не былі прыстасаваны да ўмоў вытворчасці. Зношанасць абсталявання была адной з асноўных прычын, якія затрымлівалі рост прадукцыйнасці працы. У Мінску адсутнічалі прадпрыемствы па вытворчасці станкоў, вельмі неабходных для патрэб народнай гаспадаркі рэспублікі.

У снежні 1925 года ў Мінску адбыўся IX з'езд Кампартыі Беларусі. Ён абмеркаваў тэзісы ЦК ВКП(б) да XIV з'езду і прыняў рашэнне аб неабходнасці хутчэйшай індустрыялізацыі БССР. У красавіку 1926 года адбыўся сход актыву Мінскай партыйнай арганізацыі, які звярнуўся з заклікам да ўсіх камуністаў і рабочых горада актыўна ўключыцца ў барацьбу за правядзенне рэжыму эканоміі, павышэнне прадукцыйнасці працы, павелічэнне выпуску прамысловай прадукцыі. «Толькі гэтым

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 33, стар. 388.

шляхам,— гаварылася ў рэзалюцыі,— мы здолеем утрымаць, а ў далейшым падняць зарплату і адначасова стварыць патрэбныя рэзервы і сацыялістычнае накапленне».

Рабочыя Мінска ўспрынялі пастаўленую партыяй задачу ў галіне сацыялістычнай індустрыялізацыі як сваю баявую праграму, якая адпавядае іх жыццёвым інтарэсам. На прамысловых прадпрыемствах, у дзяржаўных установах і гандлёвых арганізацыях шырока разгарнулася барацьба супраць марнатраўства, за беражнае расходванне сродкаў. Праводзілася скарачэнне, падзешаўленне дзяржаўнага і гаспадарчага апарату. Так, толькі ў 1927/28 годзе ад скарачэння і падзешаўлення савецкага апарату па Мінскай акрузе было сэканомлена 300 тысяч рублёў. «Барацьба за рэжым эканоміі ў Мінску,— паведамляла «Звезда»,— прыняла шырокі размах, ускалыхнула рабочую масу, ахапіла кампаніяй амаль усе галіны прамысловасці, савецкі апарат, многія грамадскія і кааператыўныя арганізацыі».

Партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі праводзілі вялікую работу па выкарыстанню ўсіх магчымасцей для павелічэння ўнутрыпрамысловага накаплення. На прадпрыемствах з рабочых ствараліся брыгады і камісіі па выяўленню нявыкарыстанага абсталявання і сыравіны. Так, на заводзе «Энергія» камісіяй, створанай для праверкі і ўліку наяўных рэсурсаў, была выяўлена вялікая колькасць сартавога жалеза, трансмісійныя часткі, падшыпнікі, шківы, шасцярэнькі і прыгодны для работы вялікі стругальны станок, усяго на суму каля 30 тысяч рублёў. На гарбарным заводзе «Бальшавік» была выяўлена прыгодная для выкарыстання сыравіна, якая не выкарыстоўвалася некалькі год.

У цэнтры штодзённай увагі фабрычна-заводскіх партячэек стаялі важнейшыя пытанні вытворчасці: барацьба за павышэнне прадукцыйнасці працы, правядзенне рэжыму эканоміі, зніжэнне сабекошту, паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі. Напрыклад, партыйная ячэйка дрожджавага завода «Беларусь» у 1926 годзе прыняла канкрэтныя меры па пытаннях павышэння прадукцыйнасці працы, зніжэння сабекошту, рацыяналізацыі вытворчасці, па правядзенню двухнядзельніка зберажэння і другога дня індустрыялізацыі і г. д.

Мінскі акруговы камітэт партыі рэгулярна склікаў нарады сакратароў партыйных ячэек прадпрыемстваў, на якіх асаблівая ўвага ўдзялялася стварэнню вакол партыйных арганізацый шырокага актыву, павышэнню авангарднай ролі камуністаў на вытворчасці. У чэрвені 1927 года бюро Мінскага акруговага камітэта партыі абмеркавала справаздачу сакратара партячэйкі завода «Энергія». Яно абавязала ячэйку палепшыць партыйна-арганізацыйную і партыйна-палітычную работу, узначаліць працоўны і палітычны ўздым рабо-

чых за зніжэнне сабекошту, павышэнне прадукцыйнасці працы, па-
шырэнне дзейнасці вытворчых нарад.

Вялікую ролю ў барацьбе за рэжым эканоміі і павышэнне прадук-
цыйнасці працы адыгрывалі вытворчыя нарады. Па меры росту
актыўнасці рабочых і набыцця вопыту работы праграма вытворчых
нарад станавілася ўсё шырэй і багацей па зместу. На іх абмяркоўвалі
важнейшыя пытанні сацыялістычнай прамысловасці: механізацыя
вытворчасці, скарачэнне накладных выдаткаў, лепшае выкарыстан-
не станкоў, барацьба з бракам і прастоямі і паляпшэнне якасці пра-
дукцыі, утылізацыя адкідаў, павышэнне працоўнай дысцыпліны
і барацьба з прагуламі. Ужо ў 1927 годзе ў вытворчых нарадах
удзельнічала каля 25 працэнтаў усіх прамысловых рабочых горада.

Партыйныя арганізацыі накіроўвалі дзейнасць вытворчых нарад
на рашэнне асноўных задач сацыялістычнай індустрыі. Аб гэтым
ішла размова, напрыклад, у канцы студзеня 1927 года на пашыраным
пленуме Ляхаўскага райкома партыі з удзелам сакратароў партый-
ных ячэек, старшынь фабрычна-заводскіх камітэтаў, гаспадарчых
кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. Пленум ускрыў сур'ёзныя
недахопы ў рабоце па правядзенню рэжыму эканоміі. На радзе прад-
прыемстваў горада гэтаму важнаму пытанню не ўдзялялася што-
дзённай увагі; павольна ўкараняліся рацыяналізатарскія прапановы,
а часам праводзілася эканомія на шкоду матэрыяльнай зацікаўле-
насці рабочых. Так, на мінскім чыгуначным вузле гаспадарчыя
кіраўнікі пад маркай правядзення рэжыму эканоміі зніжалі заработ-
ную плату рабочым шляхам паніжэння іх у разрадах, парушалі ка-
лектыўны дагавор у адносінах павышэння кваліфікацыі і паляпшэн-
ня бытавых умоў рабочых.

Важнае значэнне для паляпшэння партыйнай і масава-палітыч-
най работы на прадпрыемствах горада мела стварэнне цэхавых пар-
тыйных арганізацый. Гэта садзейнічала набліжэнню партыйнай рабо-
ты да вытворчасці, узняццю актыўнасці радавых камуністаў, умаца-
ванню іх сувязі з шырокімі масамі рабочых. Цэнтральны Камітэт
ВКП(б) 26 мая 1927 года зацвердзіў «Палажэнне аб рабоце ячэйкі
ВКП(б)», у адпаведнасці з якім у цэхах, дзе з-за малой колькасці ка-
муністаў немагчыма было стварыць цэхавыя партыйныя арганізацыі,
дазвалялася ўводзіць цэхавых партарганізатараў, а ў дробных вы-
творчых адзінках (брыгадах, майстэрнях, зменах і г. д.) — групавых
партарганізатараў.

Партыйныя ячэйкі прамысловых прадпрыемстваў Мінска вылу-
чылі 43 цэхавых і зменных партарганізатараў. Яны праводзілі гутар-
кі, чыталі газеты, інфармавалі рабочых аб мерапрыемствах партыі
і Савецкай улады, запрашалі іх на адкрытыя партыйныя сходы. Ра-
бота пярвічных партарганізацый дзякуючы актыўнай дзейнасці

партарганізатараў значна палепшылася, умацавалася іх сувязь з шырокімі беспартыйнымі масамі.

На прадпрыемствах Мінска разгарнуўся рух рацыяналізатараў. Яго ўзначалілі партыйныя арганізацыі. У чэрвені 1927 года Гарадскі раённы камітэт партыі склікаў нараду вытворчых партыйных ячэек, на якой абмеркаваў пытанне аб рацыяналізацыі вытворчасці і задачах партыйных ячэек. Райком прапанаваў партыйным ячэйкам палепшыць кіраўніцтва рацыяналізацыяй, растлумачваць рабочым яе значэнне для паляпшэння іх матэрыяльнага становішча, пашырыць вытворчы актыў, асабліва за лік кваліфікаванай часткі рабочых.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі Мінска ўносілі сотні прапаноў, накіраваных на паляпшэнне тэхналогіі вытворчасці, павышэнне прадукцыйнасці працы, скарачэнне непрадукцыйных выдаткаў. Вось некалькі прыкладаў.

Рабочы друкарні Белдзяржвыдавецтва Арлюк унёс дзве рацыяналізатарскія прапановы, якія дазволілі павысіць прадукцыйнасць працы па сшыванню кніг і сшыткаў больш чым на 50 працэнтаў. Акрамя таго, ад кожнай машыны вызваляўся для іншых работ адзін чалавек. Тэхнік электрастанцыі Буры вынайшаў ручны гідраўлічны насос для выпрабавання паветраных балонаў дызельных установак. Бюро садзейнічання рабочаму вынаходніцтву пры ВСНГ Беларусі рэкамендавала яго для масавага ўкаранення ў вытворчасць. Рабочы дрожджавага завода «Беларусь» Лабанаў унёс рацыяналізатарскую прапанову, якая давала звыш сямі тысяч рублёў эканоміі ў год. Слесар завода «Энергія» Паўлоўскі вынайшаў патрон для свідравальнага станка, што дазволіла павялічыць прадукцыйнасць працы ў пяць разоў. Механік шпалернай фабрыкі імя Вароўскага Лушчык са старых машын, якія выйшлі са строю, сабраў восем друкарскіх машын, дзве грунтавальныя, самарэзку, тры гафрыравальныя машыны. Ён жа вынайшаў механізм для аўтаматычнага закрывання пад'ёмнай машыны, зрабіў стругальны станок.

Для заахвочвання вынаходнікаў і аказання ім матэрыяльнай дапамогі рашэннем Саўнаркома БССР ад 16 ліпеня 1928 года пры ВСНГ Беларусі быў створан спецыяльны фонд прэміравання. Саўнарком БССР прапанаваў усім дзяржаўным установам і грамадскім арганізацыям дапамагчы выяўленню творчай ініцыятывы рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, звярнуць асаблівую ўвагу на паляпшэнне ўмоў працы вынаходнікаў.

На рацыяналізатараў, якія ўносілі каштоўныя прапановы, пашыраліся жыллёвыя льготы, установленыя для навуковых работнікаў. Гэта рашэнне садзейнічала яшчэ большаму развіццю вынаходніцтва і павышэнню прадукцыйнасці працы.

У 1928 годзе за выдатныя вытворчыя дасягненні прэзідыум ЦВК БССР прысвоіў званне «Герой працы» вялікай групе перадавых рабочых. Сярод іх былі мінчане, актыўныя ўдзельнікі трох рэвалюцый, старыя работнікі вытворчасці — майстар тэлефонай станцыі А. І. Кахно, майстар дэпо станцыі Мінск Ф. Т. Грыгор'еў і інш.

Прафсаюзныя арганізацыі Мінска разгарнулі дзейнасць па мабілізацыі працоўных на барацьбу за павышэнне прадукцыйнасці працы, паляпшэнне работы прадпрыемстваў. І іх намаганні не прапалі дарма: прадукцыйнасць працы ўзрасла з 1925/26 па 1927/28 год у сярэднім на 39 працэнтаў. У швейнай прамысловасці яна павялічылася ў 1928/29 годзе ў параўнанні з 1927/28 годам на 30 працэнтаў, сабекошт прадукцыі знізіўся на 6,1 працэнта.

Ініцыятарамі і правадзікамі многіх выдатных пачынанняў па павышэнню прадукцыйнасці працы, рацыяналізацыі вытворчасці, рэжыму эканоміі і ўмацаванню працоўнай дысцыпліны былі камсамольскія арганізацыі. Колькасць камсамольцаў Мінска за адзін год (са студзеня 1926 па студзень 1927 года) узрасла з 5,7 да 9,2 тысячы чалавек. На шклозаводзе «Пралетарый» па прапанове камсамольцаў была пераабсталявана топка печаў, у выніку чаго быў ліквідаван брак выпускаемай прадукцыі.

Адным з праяўленняў актыўнасці моладзі ў гэтыя гады з'явіўся рух, які атрымаў назву «лёгкай кавалерыі». Групы «лёгкай кавалерыі» ажыццяўлялі грамадскі кантроль за работай савецкіх, гаспадарчых і кааператыўных арганізацый, дапамагалі змагацца з бюракратызмам і валакітай, выкрывалі злоўжыванні ва ўстановах і на прадпрыемствах. Вынікі абследавання абмяркоўваліся партыйнымі арганізацыямі, адпаведнымі гаспадарчымі органамі, і прымаліся меры для зжывання недахопаў і злоўжыванняў. На заводзе «Камунар» «кавалерысты» выявілі факты антыдзяржаўных злоўжыванняў з боку адміністрацыі.

Важную ролю ва ўмацаванні працоўнай дысцыпліны і барацьбе з прагуламі на прадпрыемствах адыгралі рабочыя таварыскія дысцыплінарныя суды. Іх стварэнне было выклікана тым, што з прыходам на вытворчасць вялікай колькасці новых, неабучаных рабочых пагоршылася працоўная дысцыпліна, пачасціліся прагулы. Пра гэта, у прыватнасці, гаварылася на сакавіцкім (1927 года) пленуме ЦК КП(б)Б. У спецыяльнай пастанове пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што ва ўмовах Беларусі, дзе праслойка індустрыяльных рабочых невялікая, дзе шэрагі рабочых у значнай ступені папаўняюцца за лік сялян і іншых пластоў насельніцтва, перад партыйнымі арганізацыямі востра стаіць задача разгортвання масава-палітычнай работы сярод працоўных, паляпшэння палітычнага выхавання.

Выконваючы рашэнні пленума, партыйная арганізацыя Мінска ўзмацніла масавую работу сярод рабочых, звярнуўшы асаблівую ўвагу на толькі што прынятых. Прыйшоўшыя на вытворчасць уцягваліся ў грамадскае і палітычнае жыццё, у дзейнасць прафесіянальных і камсамольскіх арганізацый. Сярод іх разгортвалася вытворчая прапаганда, для іх арганізоўваліся даклады, лекцыі, вечары і г. д. Былі прыняты меры для павышэння кваліфікацыі рабочых і лепшай арганізацыі працы. Усё гэта прывяло да зніжэння прагулаў і значна павысіла працоўную дысцыпліну: сярэдняя колькасць прагулаў на аднаго рабочага з 1925/26 па 1927/28 год зменшылася з 4,5 да 2,5 дня.

Шырокую кампанію вялі партыйныя арганізацыі па выкарыстанню сродкаў насельніцтва праз ашчадныя касы для ўздыму сацыялістычнай прамысловасці. Па рашэнню Савецкага ўрада ў 1927 годзе праводзіўся двухнядзельнік зберажэнняў. Толькі ў Мінску за першыя тры дні ўкладчыкамі сталі 373 чалавекі. Яны ўнеслі 31,4 тысячы рублёў.

Станоўчую ролю ў справе развіцця сацыялістычнай прамысловасці адыгралі сродкі, якія паступілі ад насельніцтва па дзяржаўных пазыках. У 1928 годзе падпіска на дзяржаўныя пазыкі ў Мінску склала 1614 тысяч рублёў.

X з'езд Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў Мінску ў студзені 1927 года, адзначыў першыя поспехі рэспублікі ў барацьбе за сацыялістычную індустрыялізацыю. Калі ў 1924/25 годзе прамысловасць БССР дала 3537 тысяч рублёў накапленняў, то ўжо ў 1925/26 годзе чысты прыбытак склаў 13 440 тысяч рублёў. З'езд падвёў вынікі гаспадарчага будаўніцтва і звярнуў увагу партыйных арганізацый на неабходнасць далейшага паскарэння тэмпаў развіцця прамысловасці.

Тэмпы росту прамысловасці з кожным годам узрасталі. Прадукцыя цэнзавай прамысловасці Мінска ў 1927/28 годзе павялічылася ў параўнанні з 1926/27 годам амаль на 40 працэнтаў. За два гады выпуск прамысловых вырабаў узрос на 52 працэнты.

У правядзенні рэканструкцыі прадпрыемстваў вялікую ролю адыграў металаапрацоўчы завод «Энергія». У той час ён быў адзіным прадпрыемствам рэспублікі, на якім праводзіўся капітальны рамонт тэхнічнага абсталявання. На яго пашырэнне і пераабсталяванне ў 1926/27 годзе было асігнавана больш 100 тысяч рублёў. Былі пабудаваны два карпусы для ліцейнага і механічнага цэхаў, устаноўлены новыя пад'ёмныя краны, новая плавільная печ на 500 пудоў ліцця ў суткі, новая печ для меднага ліцця. У 1927/28 годзе завод выпусціў першыя металаапрацоўчыя станкі — 200 свідравальных і 15 токарных, а ў 1928 годзе стаў вырабляць складанае абсталяванне для крухмальных заводаў, якое раней прывозілася з-за мяжы.

Важнае значэнне ў паляпшэнні работы прадпрыемстваў, у эканомным расходаванні сродкаў мела аб'яднанне аднародных дробных прадпрыемстваў. Так, у выніку зліцця ў 1928 годзе невялікіх заводаў «Метал», «Усход» і сельскагаспадарчых майстэрняў быў створан машынабудаўнічы завод «Камунар» (цяпер станкабудаўнічы завод імя Кірава). Завод папоўніўся новым прамысловым абсталяваннем і стаў пастаўляць народнай гаспадарцы каменедрабілкі, ціскі, невялікія свідравальныя станкі, перакульныя цялежкі, машыны для вырабу бетону. На працягу года прадпрыемства выпусціла 1200 свідравальных станкоў, 500 зігмашын, 400 бетонных установак і іншае абсталяванне.

На дрожджавым заводзе «Чырвоная зара» былі ўстаноўлены новы напёл, новыя вадзяныя насосы, прэсы, паветрадуўныя машыны, электраматор у 170 конскіх сіл.

Сур'ёзна быў рэканструяваны шклозавод «Пралетарый». У 1925 годзе на ім уступілі ў строй дзве новыя ванныя печы. Завод значна пашырыўся, атрымаў новае абсталяванне. Калі ў 1923/24 годзе тут працавалі 40 чалавек, то ў 1927 годзе — 575. Значна пашырыліся і папоўніліся новым абсталяваннем і іншыя прадпрыемствы.

З ростам капіталаўкладанняў у прамысловасці сістэматычна павялічвалася доля сродкаў, што адпускаліся на новае будаўніцтва.

Будаванне прамысловых прадпрыемстваў разгарнулася і ў Мінску. У 1926 годзе на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада ў раёне Лядаўкі пачалося будаўніцтва буйнейшага ў БССР гарбарнага завода «Бальшавік». Яно працягвалася 15 месяцаў і было закончана на два з палавінай месяцы раней намечанага тэрміну, да 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Завод «Бальшавік»,— пісала штатная газета,— у сэнсе абсталявання і механізацыі стаў адным з лепшых заводаў СССР. Рабочыя і тэхнічны персанал высокай кваліфікацыі».

Хуткімі тэмпамі развівалася мясцовая прамысловасць, прадпрыемствы якой аб'ядноўваліся ў чатыры трэсты: гандлёва-будаўнічы, «Эльвод», сельпром, камунальнага абслугоўвання. З 1925/26 па 1927/28 год капіталаўкладанні ў мясцовую прамысловасць узраслі з 1242 тысяч рублёў да 1671 тысячы рублёў і склалі за тры гады 4461 тысячу рублёў. Выпуск прадукцыі ўзрос з 1166 тысяч рублёў у 1925/26 годзе да 3254 тысяч рублёў у 1927/28 годзе.

Выраслa энергетычная база горада. За кошт пашырэння электрастанцыі і ўстанаўлення новых рухавікоў выпрацоўка электраэнергіі выраслa да сямі мільёнаў кілават-гадзін. Спажыванне электраэнергіі прамысловасцю павялічылася з 1925/26 па 1927/28 год з 733 тысяч да 4,5 мільёна кілават-гадзін, г. зн. больш чым у шэсць разоў. Аднак электраэнергіі ўсё яшчэ не хапала.

Значнае месца ў Мінску займала саматужна-рамесная прамысловасць. У 1926 годзе ў горадзе налічвалася 2440 саматужна-прамысловых прадпрыемстваў, на якіх было занята 4388 чалавек. У тым жа годзе быў створан саюз саматужна-прамысловай кааперацыі (Белсаматужпром), які правёў значную работу па вытворчаму каапераванню саматужнікаў. На кастрычнік 1928 года ў арцелі аб'ядналіся 2220 чалавек — палавіна ўсіх саматужнікаў.

Поспехі рэканструкцыі народнай гаспадаркі садзейнічалі выцясненню прыватнакапіталістычнага сектара ў прамысловасці і гандлю. У 1926/27 годзе на долю прыватніка ў цэнзавай прамысловасці Мінска прыпадала ўсяго 1,3 працэнта. Але ў дробнай вытворчасці вага яго была яшчэ досыць значнай. Прыватнік выяўляў выключную спрытнасць, прыстасоўваўся да ўмоў, спрабуючы з дапамогай невялікіх абаротных сродкаў прыбыткова выкарыстоўваць арандаваныя ў дзяржавы асноўныя сродкі.

Для спынення спекуляцыйнай дзейнасці Дзяржбанк рэзка скарацiў крэдытаванне прыватных прадпрыемстваў. Прадпрыемствы прыватніка не вытрымлівалі спаборніцтва з дзяржаўнай прамысловасцю па тэхнічнай аснашчанасці, па прадукцыйнасці працы. У выніку адбылося перамяшчэнне прыватнага капіталу з цэнзавай у дробную і саматужна-рамесную прамысловасць. Прымаліся меры, якія абмяжоўвалі прыватны капітал як у прамысловасці, так і ў гандлі.

Першыя поспехі сацыялістычнай індустрыялізацыі абумовілі значныя змяненні класавай структуры насельніцтва горада. Рэзка скарацілася колькасць эксплуататарскіх элементаў. Вырасла ўдзельная вага рабочых і служачых. У 1928 годзе ў цэнзавай прамысловасці Мінска працавала 6369 чалавек. Акрамя таго, на будаўніцтве было занята 5419 рабочых, на чыгуначным транспарце — каля трох тысяч чалавек. Некалькі тысяч рабочых працавала на дробных прадпрыемствах.

У гэтыя гады больш шырока праводзілася падрыхтоўка кадраў кваліфікаваных рабочых праз школы ФЗН, прафтэхнічныя школы і кароткатэрміновыя курсы. У 1926 годзе ў сталіцы рэспублікі працавала пяць прафтэхшкол. У іх навучалася 605 чалавек — будучыя токары, слесары, сталяры, будаўнікі. У 1926 годзе былі адкрыты курсы ЦІПа (Цэнтральнага інстытута працы), якія да 1928 года падрыхтавалі 800 кваліфікаваных рабочых.

Прамысловасць Мінска ў сваім развіцці абапіралася на індустрыяльную базу ўсяго Савецкага Саюза. Прадпрыемствы забяспечваліся навейшым абсталяваннем, станкамі, прысланымі з РСФСР і іншых савецкіх рэспублік. У лістападзе 1926 года з Масквы для мінскага завода «Энергія» паступіла абсталяванне, кошт якога перавышаў дзе-

сяць тысяч рублёў (у нязменных цэнах 1926/27 года). У кастрычніку наступнага года для швейнай фабрыкі «Міншвей» было атрымана з Масквы дзесяць новых станкоў, дзве абутковыя і тры швейныя машыны. Вугаль, жалеза, кокс, нафта і г. д. для заводаў «Энергія», «Камунар» і іншых прадпрыемстваў паступалі з прамысловых цэнтраў УССР і РСФСР. У 1927 годзе з дапамогай Ленінградскага электрамашынабудаўнічага трэста была пераабсталявана мінская электрастанцыя.

Для аказання практычнай дапамогі ў арганізацыі работы прамысловых прадпрыемстваў у сакавіку 1928 года ў сталіцу БССР прыязджала камісія ВСНГ СССР, якая наведала заводы «Бальшавік», «Чырвоная зара», шклозавод «Пралетарый», фабрыку «Міншвей» і іншыя прадпрыемствы. Асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням пошукаў мясцовых сыравінных рэсурсаў з мэтай стварэння на іх базе новых прамысловых прадпрыемстваў.

Рабочыя Масквы, Ленінграда і іншых буйнейшых гарадоў прыязджалі на прадпрыемствы Мінска і перадавалі багацейшы вопыт работы на вытворчасці. Востры недахоп у кадрах інжынераў і тэхнікаў для прамысловасці пакрываўся ў значнай ступені за лік спецыялістаў з РСФСР і іншых саюзных рэспублік.

Вялікае значэнне для далейшага палітычнага і эканамічнага развіцця Мінска, як і для ўсёй Беларусі, мела рашэнне ЦК ВКП(б) і саюзнага ўрада аб далучэнні да БССР часткі тэрыторыі Гомельскай губерні, дзе пераважала беларускае насельніцтва. Пастановай ЦВК СССР у снежні 1926 года ў састаў БССР былі ўключаны Гомельскі і Рэчыцкі паветы Гомельскай губерні, у тым ліку горад Гомель. У выніку далучэння да БССР гэтай тэрыторыі валавая прадукцыя прамысловасці рэспублікі павялічылася на 36, а колькасць прамысловых рабочых — на 30 працэнтаў.

Рост колькасці рабочых азначаў умацаванне класавай базы дыктатуры рабочага класа, саюзу рабочых з працоўным сялянствам і ўмацаванне ў гэтым саюзе кіруючай ролі рабочага класа.

2. Ажыўленне дзейнасці гарадскога Савета. Рост палітычнай актыўнасці працоўных

Задача індустрыялізацыі краіны патрабавала далейшага разгортвання актыўнасці працоўных, паляпшэння работы ўсіх масавых арганізацый і ў першую чаргу Саветаў. Партыя працягвала палітыку ажыўлення дзейнасці Саветаў, асновы якой былі вызначаны пастановамі Цэнтральнага Камітэта і Савецкага ўрада яшчэ ў аднаўленчы перыяд.

Формы ўдзелу працоўных у палітычным жыцці былі вельмі шырокія і разнастайныя. Гэта — выбары цэнтральных і мясцовых органаў улады, прафсаюзнага кіраўніцтва, правядзенне беспартыйных канферэнцый, жандэлегацкіх сходаў, работа ў шэфскіх таварыствах, рабселькораўскі рух і г. д.

Мінскі гарадскі Савет і раённыя Саветы, правы якіх былі значна расшыраны, усё цясней звязваліся з працоўнымі масамі. Ажыўленне дзейнасці Саветаў і іх умацаванне было звязана з барацьбой за ўдасканаленне і паляпшэнне дзяржаўнага апарату. Вялікую работу ў гэтым кірунку праводзіла секцыя рабоча-сялянскай інспекцыі. Акрамя таго, пры гарадскім Савеце працавалі секцыі: камунальна-жыллёвая, фінансава-бюджэтная, народнай асветы, аховы здароўя, кааператыўна-гандлёвая, адміністрацыйна-прававая, сацыяльнага забеспячэння. Члены секцый, камісій гарсавета прымацоўваліся да прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў, уцягвалі ў непасрэдную работу Саветаў шырокія працоўныя масы, садзейнічалі ажыўленню работы Саветаў. У 1928 годзе толькі ў саставе камунальна-жыллёвай секцыі працавала 900 чалавек. Па матэрыялах абследавання кааператыўна-гандлёвай секцыі, праведзенага ў снежні 1928 года, была расшырана сталовая на Ляхаўцы, адкрыта 16 новых кааператыўных магазінаў, галоўным чынам на ўскраінах горада.

Пасяджэнні прэзідыума гарадскога Савета часта праводзіліся непасрэдна на прадпрыемствах з удзелам шырокіх рабочых мас. На гэтых пасяджэннях грунтоўна і ўсебакова абмяркоўваліся вынікі работы Савета, пытанні добраўпарадкавання, бытавога і камунальнага абслугоўвання насельніцтва. Так, у студзені 1927 года пасяджэнне прэзідыума праходзіла на дрожджавым заводзе «Чырвоная зара», на якім прысутнічала больш 120 рабочых і служачых. Быў заслуханы даклад праўлення жыллёвага кааператыва рабочага пасёлка «Камінтэрн». Даклад выклікаў ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя ўказалі на сур'ёзныя недахопы ў будаўніцтве жылых дамоў, на недастатковы кантроль з боку Савета. Пасля пасяджэння прэзідыум выдзеліў сродкі на будаўніцтва 82 кватэр для рабочых у пасёлку «Камінтэрн» і абавязаў жыллёва-камунальную секцыю гарсавета палепшыць якасць будаўнічых работ, закончыць электрыфікацыю і добраўпарадкаванне пасёлка, адкрыць сямігадовую школу.

З вялікім палітычным і працоўным уздымам праходзілі выбарчыя кампаніі ў Саветы. Аб гэтым сведчыць у першую чаргу справаздачна-выбарчая кампанія ў Мінскі гарсавет, праведзеная ў лютым — сакавіку 1927 года. Уважліва абмяркоўваліся справаздачы членаў Савета папярэдняга саставу і кандыдатуры ў новы састаў Савета, наказы дэпутатам. Працоўныя ўносілі прапановы па далейшаму развіццю прамысловасці, гарадской гаспадаркі і культуры. Толькі ў са-

кавіку 1927 года ў сталіцы было праведзена 167 сходаў выбаршчыкаў, унесена ў наказ 1500 дапаўненняў.

У выніку правядзення выбараў састаў гарадскога Савета змяніўся. Рабочыя ў ім цяпер складалі 43,3 працэнта. Колькасць камуністаў і камсамольцаў паднялася з 55 да 62, а жанчын — з 20 да 22 працэнтаў. Ганаровымі членамі Мінскага Савета былі выбраны выдатныя дзяржаўныя і партыйныя дзеячы Беларусі, актыўныя ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны А. І. Крыніцкі, А. Г. Чарвякоў.

Узросшая палітычная актыўнасць працоўных Мінска знайшла сваё выражэнне ў гарачай падтрымцы класавых выступленняў пралетарыяту замежных краін. У маі 1926 года англійскія рабочыя вугальнай прамысловасці ў знак пратэсту супраць масавага звальнення і жорсткай эксплуатацыі аб'явілі ўсеагульную забастоўку. Працоўныя Мінска салідарызаваліся з бастуючымі вуглякопамі. Рабочыя шпалернай фабрыкі імя Вароўскага заявілі, што яны «вітаюць гераічную барацьбу англійскіх гарнякоў, якія даюць арганізаваны адпор замахам буржуазіі». Агульны сход рабочых і служачых дрожджавага завода пастанавіў: «Мы гатовы цалкам падтрымаць англійскіх рабочых у іх барацьбе з капіталістамі». Для аказання дапамогі бастуючым вуглякопам былі сабраны дзесяткі тысяч рублёў.

Вялікую работу па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных праводзіла Міжнароднае таварыства дапамогі рэвалюцыянерам (МОПР). Па ініцыятыве МОПРа праходзілі кампаніі супраць працэсу над Беларускай сялянска-рабочай грамадой і працэсу над 126 камуністамі ў Заходняй Беларусі, аказвалася дапамога кітайскай рэвалюцыі.

26 сакавіка 1927 года пленум Мінскага гарадскога Савета горача павіншаваў з перамогай паўстаўшых шанхайскіх рабочых і ўступленнем у горад нацыянальна-вызваленчай рэвалюцыйнай арміі. «Сабраўшыся сёння на першы пленум,— гаварылася ў тэлеграме,— новавыбраны гарсавет, заслухаўшы паведамленне аб узяцці Шанхая, шле прывітанне рэвалюцыйнаму пралетарыяту Кітая, першаму застрэльшчыку пралетарскага рэвалюцыйнага руху ў Кітаі і віншуе ад імя працоўных горада з бліскучай перамогай... Змагаючыся ў далёкім Кітаі, вы робіце адну агульную з намі справу, падрываеце асновы імперыялізму і тым самым садзейнічаеце набліжэнню сусветнай рэвалюцыі... Мы з вамі. Няхай жыве рэвалюцыйны Кітай!».

Поспехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі і яе сталіцы служылі вельмі павучальным прыкладам для працоўных Заходняй Беларусі, якія знаходзіліся пад прыгнётам польскіх памешчыкаў і капіталістаў. «Недарэмна на Мінск і Савецкую Беларусь глядзяць з надзеяй прыгнечаныя ў панскай Польшчы нашы браты

рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі»,— заяўлялі рабочыя Мінска. У 1927 годзе яны сабралі для рэвалюцыянераў Заходняй Беларусі, якія пакутавалі ў турмах, больш 30 тысяч рублёў.

З пачуццём вялікай гордасці сачылі за поспехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР мільёны працоўных капіталістычных краін. З 1925 па 1927 год Мінск наведалі аўстрыйская, французская, галандская, польская і іншыя рабочыя дэлегацыі. Яны аглядалі прамысловыя прадпрыемствы, школы, бальніцы, знаёміліся з умовамі жыцця савецкіх рабочых. У заяве аўстрыйскай рабочай дэлегацыі, якая гасцявала з 30 студзеня па 2 лютага, гаварылася: «У той час як у іншых краінах, а таксама Аўстрыі ўзмацняецца гаспадарчы крызіс, вы ідзеце па шляху гаспадарчага будаўніцтва. Гэта з'яўляецца лепшым доказам таго, што можна абысціся без капіталістаў».

Рабочыя нямецкага горада Рулы вялі перапіску з рабочымі мінскага завода «Камунар». Напярэдадні 11-й гадавіны Кастрычніка ў Мінск прыехаў малады рабочы горада Рулы Карл Фёртш. Ён прывёз шаўковы чырвоны сцяг з эмблемай свайго гадзіннікавага завода. 6 лістапада 1928 года на ўрачыстым сходзе рабочых і служачых завода «Камунар» (цяпер імя С. М. Кірава) адбыўся абмен сцягамі. На наступны дзень, 7 лістапада, яны былі пранесены па вуліцах Мінска ў калоне дэманстрантаў.

Сцяг мінскага завода «Камунар» горда нёс тады Карл Фёртш. Вярнуўшыся на радзіму, ён ва ўрачыстай абстаноўцы перадаў яго на захоўванне калектыву свайго завода. Пакуль не прыйшоў да ўлады фашызм, сцяг кожны раз у дні святкавання Першага мая і гадавіны Вялікага Кастрычніка горда лунаў над калонамі дэманстрантаў нямецкіх пралетарыяў. З прыходам да ўлады фашыстаў сцяг мінчан, рызыкуючы жыццём, хавалі ў сябе Карл Пашэр, а затым Вілі Штэйн, Эдмунд Раух і іншыя рабочыя-патрыёты. І толькі праз 12 гадоў, пасля разгрому фашызму ў Германіі, савецкі сцяг быў пранесен па вуліцах Рулы. У цяперашні час сцяг як гістарычная рэліквія зноў захоўваецца ў ратушы горада.

Чырвоны сцяг, перададзены Карлам Фёртштам у 1928 годзе калектыву завода «Камунар», не захаваўся. У першыя ж дні вайны фашысцкая авіяцыя разбамбіла завод. У агні згарэў тады чырвоны сцяг нямецкіх рабочых.

У 1961 годзе напярэдадні свята Першага мая кіраўцы прымалі дарагіх нямецкіх гасцей з горада Рулы. Як і ў 1928 годзе, ва ўрачыстай абстаноўцы Карл Фёртш уручыў кіраўцам чырвоны сцяг. Гэты сцяг цяпер захоўваецца ў Мінску ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны.

Урачыста і радасна адзначылі працоўныя Мінска дзесяцігоддзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. 5 лістапада

ў Доме культуры адбылося ўрачыстае пасяджэнне Мінскага гарсавета сумесна з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый горада. На пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі Камуністычнай партыі Германіі Пфайфер, Маркоўскі і Зонін. На юбілейныя ўрачыстасці прыбылі актыўныя ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі І. Дзмітрыеў (актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Оршы), В. В. Каменшчыкаў (першы глаўком першай рэвалюцыйнай арміі на Заходнім фронце), М. І. Калмановіч (намеснік старшыні абласнога камітэта), Н. І. Крывашэін (начальнік гарнізона Мінска), Я. Ф. Пярно (член абласнога камітэта), С. Е. Шчукін (член франтавога камітэта), В. В. Фамін (член франтавога камітэта, рэдактар газет «Фронт» і «Звезда») і інш. З дакладам «Кастрычніцкая рэвалюцыя і Савецкая Беларусь» выступіў сакратар ЦК КП(б)Б В. Г. Кнорын.

Ганаровыя госці пабывалі на фабрыках і заводах, у школах горада, знаёміліся з жыццём працоўных, а 7 лістапада прынялі ўдзел у масавай дэманстрацыі.

Поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне радавалі працоўных усяго свету і прыводзілі ў шаленства міжнародную буржуазію. Імперыялісты рыхтавалі адкрытую інтэрвенцыю супраць СССР. У маі 1927 года англійскі кансерватыўны ўрад аб'явіў аб разрыве дыпламатычных і гандлёвых адносін з Савецкім Саюзам. Па ўказцы імперыялістаў пры патуранні польскага ўрада 7 чэрвеня 1927 года ў Варшаве быў забіт пасол СССР П. Л. Войкаў.

Унутры нашай краіны агенты імперыялізму рыхтавалі рад замахаў на кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў. 7 чэрвеня 1927 года каля Мінска (паміж станцыямі Мінск і Ждановічы) была арганізавана чыгуначная катастрофа, у час якой загінуў намеснік паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе член ЦВК БССР І. К. Апанскі. На некаторых прадпрыемствах і ваенных складах выбухалі пажары. У прыватнасці, у чэрвені 1927 года быў падпалены трэці мінскі гарбарны завод, у выніку чаго прадпрыемства панесла страты ў некалькі тысяч рублёў.

На пагрозы імперыялістаў савецкі народ адказаў яшчэ большым умацаваннем абароназдольнасці краіны. На шматлікіх сходах, мітынгах, дэманстрацыях працоўныя Мінска заявілі аб сваёй поўнай гатоўнасці даць рашучы адпор нахабствам імперыялістаў. На прадпрыемствах і ва ўстановах горада праводзіўся збор сродкаў у фонд «Наш адказ Чэмберлену».

Па рашэнню Мінскага гарадскога Савета з 10 да 17 ліпеня праводзіўся «Тыдзень абароны», у час якога былі сабраны грошы на будаўніцтва самалёта «Імя Мінскага Савета».

Абвастрэнне класавай барацьбы ў краіне выклікала ажыўленне апартуністычных элементаў унутры партыі. Выказваючы незадаво-

ленасць вярхоў буржуазнай інтэлігенцыі і дробнай буржуазіі рэжы-
мам дыктатуры пралетарыяту, трацкісты выступалі супраць палітыкі
партыі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва, выказваліся супраць
будаўніцтва электрастанцый, аб'яўлялі нерэнтабельнымі буйныя пра-
мысловыя прадпрыемствы, настойвалі на ўзмацненні падатковага аб-
кладання серадняка. Гэтыя прапановы вялі да падрыву дыктатуры
пралетарыяту, да зрыву пабудовы сацыялізма.

У Мінску трацкісты блакіраваліся з беларускімі і яўрэйскімі бур-
жуазнымі нацыяналістамі, спрабуючы праводзіць падрыўную рабо-
ту. Але ворагі ленінізма пралічыліся, бо наткнуліся на непарушнае
адзінства радоў партыйнай арганізацыі і вернасць рабочага класа
сваёй партыі. Вылазкі трацкістаў на партыйных сходах Ляхаўскага,
Кастрычніцкага раёнаў пацярпелі поўны крах. Так, на заводзе «Баль-
шавік» толькі маленькая групка былых бундаўцаў падтрымала трац-
кістаў. У Беларускім дзяржаўным універсітэце з 456 камуністаў за
трацкісцкую платформу галасавалі толькі 16 чалавек.

Рабочыя-камуністы мінскіх прадпрыемстваў і ўстаноў далі рашу-
чы адпор апазіцыянерам, а месцамі проста выганялі іх са сходаў.
У шматлікіх прывітаннях ад імя цэлых калектываў выказвалася ад-
данасць Камуністычнай партыі. «Мы, беспартыйныя рабочыя,— га-
варылася ў адным з прывітанняў у адрас Мінскай акруговай парткан-
ферэнцыі ў лістападзе 1927 года,— верым і будзем верыць у правіль-
нае кіраўніцтва Камуністычнай партыі. Апазіцыянеры не вераць
у нашу перамогу, яны спускаюцца ўсё ніжэй і ніжэй і апусціліся
ў меншавіцкае балота».

Камуністы і ўсе працоўныя Мінска з вялікім задавальненнем су-
стрэлі рашэнне Цэнтральнага Камітэта аб выключэнні Троцкага і Зі-
ноўева з партыі. Сход партыйнай ячэйкі завода «Энергія» ў прынятай
рэзалюцыі адзначыў, што ён «выказвае сваё глыбокае перакананне
ў тым, што партыя, ачысціўшыся ад раскольнікаў, з яшчэ большай
энергіяй будзе далей працягваць сваю работу па сацыялістычнаму
будаўніцтву».

Беспартыйныя рабочыя ўступалі ў партыю, каб у яе радах зма-
гацца супраць трацкізму і ахоўваць адзінства партыі. У час кастрыч-
ніцкага закліку 1927 года заявы аб прыёме ў ВКП(б) падалі больш
300 перадавых рабочых горада. З кастрычніка 1927 па кастрычнік
1928 года ў рады мінскай партыйнай арганізацыі ўліліся 1524 пера-
давікі вытворчасці. Рабочыя складалі ўжо не 53,3 працэнта партар-
ганізацыі, а 60 працэнтаў. У кастрычніку 1928 года ў яе радах налічвалася 8849 членаў і кандыдатаў партыі.

Велізарная цяга перадавых рабочых да ўступлення ў ленінскую партыю была буйнейшым палітычным фактам, які паказваў рост класавай свядомасці і палітычнай спеласці рабочых сталіцы.

3. Развіццё прамысловасці ў гады першай пяцігодкі. Разгортванне масавага сацыялістычнага спаборніцтва

З кастрычніка 1928 года Савецкі Саюз прыступіў да планавання развіцця народнай гаспадаркі па пяцігодках.

Першы пяцігадовы план быў распрацаваны на аснове дырэктыў, дадзеных XV з'ездам ВКП(б), і з'яўляўся далейшым пераўтварэннем у жыццё ленінскай палітыкі Камуністычнай партыі, накіраванай на індустрыялізацыю краіны, перамогу сацыялістычных элементаў у народнай гаспадарцы і ліквідацыю эканамічнай залежнасці СССР ад капіталістычных дзяржаў. Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб стварыць у краіне такую індустрыю, якая была б здольна ўзброіць не толькі прамысловасць, але і транспарт і сельскую гаспадарку сучаснай тэхнікай і рэарганізаваць іх на базе сацыялізма.

Першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР, распрацаваны на аснове агульнасаюзнага плана, быў зацверджан у маі 1929 года на IX Усебеларускім з'ездзе Саветаў. Ён прадугледжваў паскарэнне тэмпаў і маштабаў індустрыялізацыі рэспублікі, стварэнне ў ёй буйной прамысловасці, хутчэйшае пераадоленне эканамічнай і культурнай адсталасці, якая засталася ў спадчыну ад дарэвалюцыйнага мінулага. У прамысловасць планавалася ўкласці за пяць гадоў 311,2 мільёна рублёў, што складала 34,4 працэнта ад агульнай сумы капіталаўкладанняў рэспублікі. Вялікая ўвага ўдзялялася развіццю Мінска як сталіцы Савецкай Беларусі. Прадугледжвалася, у прыватнасці, будаўніцтва 12 новых прамысловых прадпрыемстваў і карэнная тэхнічная рэканструкцыя дзеючых заводаў.

Разам з усімі народамі нашай краіны працоўныя Беларусі і яе сталіцы актыўна ўключаліся ў барацьбу за выкананне першай пяцігодкі, за стварэнне эканамічнага фундаменту сацыялізма. У горадзе шырока разгарнулася будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў. Ужо ў 1929 годзе здаецца ў эксплуатацыю швейная фабрыка «Кастрычнік», створаная на базе невялікага швейнага прадпрыемства «Міншвей». Цэхі фабрыкі былі аснашчаны новай тэхнікай, усе асноўныя вытворчыя працэсы механізаваны. У тым жа годзе дала першую прадукцыю кушнерская фабрыка «1 Мая», якая забяспечвала паўфабрыкатамі буйныя швейныя прадпрыемствы рэспублікі.

У пачатку першай пяцігодкі ў Мінску была створана па сутнасці новая гарбарна-галантарэйная галіна прамысловасці. Фабрыка «Беларуска», якая ўступіла ў строй у 1929 годзе, выпускала прадукцыю шырокага асартыменту са скуры, косці, цэлулоіду і іншых матэрыя-

лаў. У наступным годзе пачалі работу два цагельных заводы. Іх прадукцыя ішла ў асноўным на забеспячэнне будоўляў горада.

Побач з будаўніцтвам новых заводаў і фабрык у сталіцы ў шырокіх маштабах працягвалася тэхнічная рэканструкцыя старых прадпрыемстваў. На іх адкрываліся новыя цэхі, уводзілася механізацыя вытворчых працэсаў, асвойваліся новыя віды прадукцыі. Са студзеня 1929 года пачалі даваць прадукцыю новыя механічны і зборны цэхі завода «Дрэваапрацоўшчык», новыя цэхі былі створаны на заводзе «Бальшавік», пачалося будаўніцтва вытворчага корпуса абуткоўай фабрыкі (цяпер фабрыка імя Калініна).

Асабліва вялікая ўвага ўдзялялася развіццю металаапрацоўчай прамысловасці. Капіталаўкладанні ў гэту галіну толькі за 1928—1930 гады ўзраслі больш чым у шэсць разоў, у той час як, напрыклад, у швейнай прамысловасці горада яны за гэты час павялічыліся ў 1,2 раза. За кошт гэтых сродкаў адкрыліся новыя ліцейныя, механічныя, зборачныя, такарныя, кавальскія і іншыя цэхі на металаапрацоўчых заводах «Энергія» і «Камунар», абсталяваныя перадавой для таго часу тэхнікай.

Барацьба за выкананне першага пяцігадовага плана суправаджалася павышэннем палітычнай і працоўнай актыўнасці народных мас. 20 студзеня 1929 года ў «Правде» быў надрукаван артыкул У. І. Леніна «Як арганізаваць спаборніцтва». Апублікаванне гэтай працы было заклікам нашай партыі да разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва. У ліку першых адгукнуліся камуністы і камсамольцы. Па пачыну перадавых прадпрыемстваў Масквы, Ленінграда, а затым Поўдня, Урала ў краіне разгарнулася масавае сацыялістычнае спаборніцтва. Яно было падтрымана XVI Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй, якая адбылася ў канцы красавіка 1929 года. У спецыяльным звароце да рабочых і працоўнага сялянства Савецкага Саюза, прынятым канферэнцыяй, падкрэслівалася, што сацыялістычнае спаборніцтва — важнейшая ўмова выканання першага пяцігадовага плана.

Такі ж зварот да працоўных Савецкай Беларусі прыняў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. ЦК заклікаў шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, зрабіць яго метадам усёй работы, дабівацца пры дапамозе сацыялістычнага спаборніцтва зніжэння сабекошту прадукцыі, паляпшэння яе якасці.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый сацыялістычнае спаборніцтва, арганізаванае прафесіянальнымі саюзамі, у гады першай пяцігодкі атрымала шырокі размах ва ўсіх галінах прамысловасці Мінска. Ужо ў 1929 годзе паміж асобнымі рабочымі і цэлымі калектывамі заключаліся сацыялістычныя дагаворы. Рабочыя бралі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па датэрміноваму выкананню дзяржаўных планаў, павышэнню прадукцыйнасці працы і якасці пра-

дукцыі, скарачэнню браку, умацаванню працоўнай дысцыпліны і г. д.

У распрацоўцы сацыялістычных дагавораў актыўны ўдзел прымалі самі рабочыя. У красавіку 1929 года рабочыя завода «Энергія» адными з першых у Мінску выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва калектыў завода «Камунар». Для падрыхтоўкі дагавору была створана спецыяльная камісія. Дагавор быў абмеркаваны і прыняты на агульным сходзе калектываў абодвух прадпрыемстваў. У ім гаварылася, што рабочыя абавязваюцца знізіць да канца года сабекошт прадукцыі па заводу «Энергія» на 8,4 працэнта, а па заводу «Камунар» — на 8 працэнтаў, павысіць прадукцыйнасць працы і якасць прадукцыі, знізіць брак, умацаваць працоўную дысцыпліну. Сваё слова яны стрымалі.

У сацыялістычнае спаборніцтва ўключаліся адно прадпрыемства за другім. К канцу 1929 года ім былі ахоплены рабочыя ўсіх буйнейшых заводаў і фабрык горада.

Уступіўшыя ў спаборніцтва нярэдка самі прасілі знізіць ім расцэнкі за выкананне тых або іншых аперацый і павялічыць нормы выпрацоўкі. Так, у маі таго ж года 189 ударнікаў завода «Бальшавік» заявілі аб добраахвотным зніжэнні расцэнак і павялічылі норму выпрацоўкі ад трох да 15 працэнтаў. На заводзе «Энергія» па патрабаванню рабочых былі зніжаны расцэнкі ад дзесяці да 35 працэнтаў, на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» — на 10—15 працэнтаў. Масавае добраахвотнае зніжэнне расцэнак і павышэнне норм выпрацоўкі мела месца амаль на ўсіх прадпрыемствах горада. Гэта гаворыць аб высокай свядомасці рабочых, няўхільным імкненні дабівацца новых поспехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Ініцыятыва мас была невычарпальная. Рабочыя Мінска прымалі выклік і ўступалі ў спаборніцтва з рабочымі іншых гарадоў Беларусі, а таксама Масквы, Ленінграда і рада прамысловых цэнтраў Савецкага Саюза. У маі 1929 года быў заключан першы сацыялістычны дагавор на лепшыя вытворчыя паказчыкі паміж рабочымі сямі буйных гарбарных і абутковых прадпрыемстваў Мінска, Гомеля, Віцебска і Магілёва. За месяц да гэтага ў сацыялістычнае спаборніцтва ўступілі калектывы дрожджавых заводаў Мінска і Масквы; рабочых мінскага завода «Камунар» выклікалі на спаборніцтва металургі днепрапятроўскіх заводаў. Стваралася, такім чынам, працоўная пераклічка мільённых мас рабочага класа ва ўсіх канцах нашай краіны.

Сацыялістычнае спаборніцтва ператваралася ў магутны рух рабочага класа за выкананне і перавыкананне вытворчых планаў. Аб гэтым пераканальна сведчыць першая праверка сацыялістычных дагавораў, праведзеная ў Беларусі ў верасні 1929 года. Яна паказала, што фабрыкі і заводы перавыканалі планавыя заданні. Калектывы

перадавых прадпрыемстваў выстаўлялі лозунг «Пяцігодку — за чатыры гады!». Калектыў завода «Камунар», уступіўшы ў спаборніцтва, датэрмінова выканаў вытворчы план 1929 года, дабіўся зніжэння сабекошту прадукцыі на 15 працэнтаў. На прадпрыемстве значна ўмацавалася працоўная дысцыпліна.

Ініцыятарамі спаборніцтва на заводзе «Камунар» былі камуністы. Ім актыўна дапамагалі камсамольцы. Газета «Звезда» 2 лістапада 1929 года паведамляла, што за лепшыя паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве камсамол завода атрымаў пераходны Чырвоны Сцяг ВСНГ БССР. У ліку перадавікоў першай пяцігодкі былі І. П. Ліпніцкі, І. Ю. Юшкевіч, А. П. Ціханаў, Ф. А. Івашка, Ю. Г. Аксенкруг, А. В. Верамонька і многія іншыя.

Асноўнай арганізацыйнай формай у гэты перыяд была ўдарная брыгада.

Важную ролю ў разгортванні масавага сацыялістычнага спаборніцтва ў Мінску, як і ў краіне ў цэлым, адыграў Усерасійскі з'езд ударнікаў, які адбыўся ў Маскве ў снежні 1929 года. У Мінску гэтаму з'езду папярэднічалі злёты ўдарнікаў на прадпрыемствах і першая акруговая канферэнцыя ўдарнікаў.

21 студзеня 1930 года ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ звярнуліся да рабочых і служачых Савецкага Саюза з заклікам уступаць ва ўдарныя брыгады. Гэты заклік быў аб'яўлен у дзень шостай гадавіны з дня смерці У. І. Леніна і ўвайшоў у гісторыю як «ленінскі набор ударнікаў». Ён сустрэў шырокі водгук у рабочым класе.

У ленінскія дні ў Мінску ў рады ўдарнікаў улілося новае папаўненне. Калі ў 1929 годзе на прадпрыемствах харчовай прамысловасці горада было 712 ударнікаў, то ў 1930 годзе іх ужо налічвалася 1026. У адносінах да агульнай колькасці рабочых колькасць ударнікаў за гэты час павялічылася з 46,1 да 66,4 працэнта.

У дні «ленінскага набору ўдарнікаў» лепшыя прадстаўнікі рабочага класа звярталіся ў партыйныя арганізацыі з просьбай прыняць іх у партыю. Толькі ў студзені 1930 года ў Мінску ў партыю было прынята звыш 1000 рабочых. У сваіх заявах яны пісалі: «Мы ідзём у ленінскую партыю для таго, каб дапамагчы партыі будаваць сацыялізм, каб дапамагчы партыі ліквідаваць у вёсцы кулацтва і ў горадзе нэпманаў як клас. Мы будзем з усёй партыяй працаваць над пераадоленнем усіх цяжкасцей нашага рэканструкцыйнага перыяду».

Усё гэта сведчыць аб росце палітычнай актыўнасці і свядомасці рабочых, аб іх давер'і ВКП(б). Папаўненне радоў партыі лепшымі людзьмі з вытворчасці значна павысіла ролю камуністаў ва ўдарных брыгадах. На заводзе «Камунар» і фабрыцы «Кастрычнік», напрыклад, да красавіка 1930 года ва ўдарныя брыгады ўступілі ўсе камуністы і камсамольцы. На 19 прадпрыемствах Фрунзенскага раёна

горада да канца красавіка таго ж года ўдарнікамі былі амаль усе камуністы.

Калі на першым этапе свайго развіцця сацыялістычнае спаборніцтва атрымала распаўсюджанне ў форме ўдарных брыгад, то ў далейшым творчасцю рабочага класа нараджаліся і развіваліся новыя формы спаборніцтва: сустрэчнае планаванне, грамадскі буксір, скразныя брыгады, планава-аператыўныя групы і брыгады па паляпшэнню якасці прадукцыі, рацыяналізатарскія групы і інш.

У дні падрыхтоўкі да XVI з'езду ВКП(б) і XIII з'езду КП(б)Б на прадпрыемствах Мінска атрымала распаўсюджанне сустрэчнае планаванне. Сутнасць яго заключалася ў тым, што складзены плануючымі органамі план дэталёва абмяркоўваўся сярод рабочых. Апошнія ўносілі канкрэтныя прапановы, за лік якіх можна было павялічыць вытворчыя праграмы, павысіць прадукцыйнасць працы, знізіць сабекошт прадукцыі; выяўлялі няўлічаныя матэрыяльныя і вытворчыя рэзервы і магчымасці. У 1930 годзе сустрэчныя планы былі высунуты рабочымі заводаў «Энергія», «Камунар», «Бальшавік», фабрык «Кастрычнік», імя Калініна. Напрыклад, калектыў завода «Энергія», вывучыўшы свае магчымасці, абавязаўся выпусціць звыш гадавога задання 200 свідравальных станкоў, 70 каменедрабілак, 100 гравіесартыровак і г. д. Свае абавязацельствы рабочыя выканалі паспяхова.

З 1930 года ў прамысловасці Мінска знаходзіць шырокую падтрымку і такая форма сацыялістычнага спаборніцтва, упершыню ўзнікшая ў Данбасе, як грамадскі буксір. Гэта форма спаборніцтва выражалася ў тым, што перадавыя прадпрыемствы аказвалі дапамогу адстаючым, перадавалі ім свой вопыт работы. У ёй ярка праявілася патрыятычнае імкненне рабочага класа дабіцца агульнага ўздыму вытворчасці. Так, дзве брыгады рабочых фабрыкі «Кастрычнік» аказалі дапамогу ў выкананні вытворчага плана калектывам Гомельскай і Магілёўскай швейных фабрык. Рабочыя завода «Камунар» дапамаглі ліквідаваць прарыў у выкананні задання калектыву фабрыкі «Беларуска».

Цікавай і карыснай формай сацыялістычнага спаборніцтва з'явіліся скразныя ўдарныя брыгады. У адрозненне ад звычайнай брыгады, створанай на тым або іншым вытворчым участку, яны ахоплівалі рад участкаў, занятых выпускам якога-небудзь аднаго віду прадукцыі, забяспечваючы тым самым адзінства і зладжанасць работы прадпрыемства ў цэлым. Да студзеня 1931 года такія брыгады працавалі на заводах «Камунар», «Бальшавік», імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і на іншых прадпрыемствах Мінска. На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, напрыклад, па ініцыятыве фармоўшчыка Ключэнкі была створана скразная брыгада па вырабу дэталей камене-

драбілак. У выніку павысілася вытворчасць працы, значна палепшылася якасць прадукцыі, брак быў даведзен да мінімуму.

Няспынны рост творчай актыўнасці рабочага класа, распаўсюджанне новых, больш эфектыўных форм арганізацыі працы забяспечвалі з году ў год высокія тэмпы развіцця прамысловасці горада. К канцу 1930 года ў параўнанні з 1928 годам валавая прадукцыя металаапрацоўчых прадпрыемстваў сталіцы ўзрасла больш чым у тры разы. У два з палавінай раза павялічылася валавая прадукцыя гарбарна-абутковай, амаль удвая — дрэваапрацоўчай і ў шэсць з палавінай разоў — швейнай прамысловасці.

Гаспадарчыя вынікі першых гадоў пяцігодкі паказалі поўную рэальнасць прынятага плана і магчымасць яго датэрміновага выканання. Гэта адзначыў XIII з'езд Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў Мінску ў 1931 годзе. У цэлым вынікі сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне падвёў XVI з'езд ВКП(б), які праходзіў з 26 чэрвеня па 13 ліпеня 1930 года і ўвайшоў у гісторыю Саюза ССР як з'езд разгорнутага наступлення сацыялізма па ўсяму фронту.

Разгорнутае наступленне сацыялізма па ўсяму фронту праходзіла ў краіне ва ўмовах вострай класавай барацьбы. Частка буржуазных спецыялістаў, якія працавалі ў розных галінах народнай гаспадаркі, займалася злосным шкодніцтвам, імкнучыся перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. Супраць ленінскай палітыкі партыі выступалі апартуністычныя групоўкі трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, якія спрабавалі павярнуць краіну з сацыялістычнага шляху развіцця на шлях рэстаўрацыі капіталізму.

Падрыўная, антысавецкая дзейнасць аджыўшых класаў унутры краіны сустракала падтрымку з боку капіталістычнага акружэння. У пачатку 30-х гадоў імперыялісты сталі актыўна рыхтаваць новую ўзброеную інтэрвенцыю супраць Савецкага Саюза. Яны арганізавалі цэлы ланцуг антысавецкіх правакацый. У красавіку 1930 года была зроблена спроба ўзарваць паўпрэдства ў Варшаве. У 1931 годзе былі зроблены замахі на японскага пасла і германскага саветніка ў Маскве, арганізаваныя агентамі замежнай разведкі.

У складанай і напружанай міжнароднай абстаноўцы рабочы клас Мінска, як і ўвесь савецкі народ, яшчэ цясней згуртаваўся вакол Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, узмацніў пільнасць і працягваў барацьбу за датэрміновае выкананне пяцігодкі. «Мы ўпэўнены,— пісалі рабочыя завода «Камунар»,— што сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва сусветнаму імперыялізму, нашым унутраным класавым ворагам і іх агентам — правым і левым апартуністам не ўдасца, а ўсякім спробам будзе дадзены... дружны і згуртаваны адпор».

Барацьба працоўных Мінска за выкананне першага пяцігадовага плана была звязана з пераадоленнем сур'ёзных цяжкасцей. Прадпрыемствы адчувалі вострую няхватку кваліфікаваных кадраў. Напрыклад, на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі спецыялісты з вышэйшай адукацыяй складалі толькі шэсць працэнтаў ад агульнай колькасці інжынерна-тэхнічных работнікаў. На радзе прадпрыемстваў былі слаба механізаваны вытворчыя працэсы, вялікае месца займала ручная праца. Давалі сябе адчуваць цякучасць рабочай сілы, няправільная арганізацыя заработнай платы, мелкабуржуазная ўраўнілаўка, абязлічка і г. д. Існаваўшыя тарыфныя стаўкі не ўлічвалі розніцы паміж працай кваліфікаванай і некваліфікаванай. Так, на заводзе «Камунар» рабочы першага разраду атрымліваў заработную плату большую, чым слесар сёмага разраду. На фабрыцы «Кастрычнік» рабочыя чацвёртага разраду, выконваючы розныя па складанасці работы, атрымлівалі аднолькавую заработную плату. Гэта прыводзіла да таго, што рабочыя пераходзілі з аднаго прадпрыемства на другое, некваліфікаваныя рабочыя зусім не імкнуліся павысіць вытворчую кваліфікацыю.

На некаторых прадпрыемствах горада была дрэнна арганізавана праца, не было цвёрдых змен, дапускалася абязлічка ў кіраванні вытворчасцю, у выкарыстанні абсталявання, інструменту, не ўдзялялася належнай увагі барацьбе за навядзенне найстражэйшай эканоміі ў выдаткаванні сыравіны, матэрыялаў, электраэнергіі і г. д., што ставіла пад пагрозу выкананне плана трэцяга, рашаючага года пяцігодкі і ажыццяўленне лозунга «Пяцігодку — за чатыры гады!».

Улічваючы ўсе гэтыя акалічнасці, ЦК партыі прыняў рад мер, накіраваных на паляпшэнне работы прамысловасці. Вялікае значэнне ў гэтай справе мела скліканая 22—23 чэрвеня 1931 года нарада гаспадарнікаў, якая намеціла новыя прыёмы і метады сацыялістычнага гаспадарання ў галіне прамысловасці. Яны зводзіліся да наступнага: наладзіць арганізаваны набор рабочай сілы і механізаваць працу, ліквідаваць цякучасць рабочай сілы, а таксама ўраўнілаўку і абязлічку, правільна арганізаваць зарплату, палепшыць бытавыя ўмовы рабочых, шырэй укараняць гаспадарчы разлік. Неабходна было вырасціць новую вытворча-тэхнічную інтэлігенцыю, змяніць адносіны да інжынерна-тэхнічных сіл старой школы, праяўляць да іх больш увагі і клопатаў, смялей прыцягваць іх да работы.

Прынятыя партыяй меры яшчэ вышэй паднялі палітычную і працоўную актыўнасць рабочых, у тым ліку працоўных Мінска. Рабочыя і служачыя дапамагалі партыйным арганізацыям ускрываць безгаспадарчасць, абязлічку, ураўнілаўку ў заработнай плаце і г. д. Разам з тым яны бралі на сябе абавязацельствы, ад выканання якіх шмат у чым залежала паспяховая работа прамысловасці. Так, ка-

лектыў Мінскага дрэваапрацоўчага завода вырашыў стварыць брыгады для правядзення вярбоўкі рабочай сілы ў калгасах, замацавання рабочых за станкамі і абсталяваннем. Рабочыя завода «Камунар» прапанавалі замацаваць майстроў за пэўнымі зменамі і перагледзець у адпаведнасці з узросшымі тэхнічнымі магчымасцямі нормы выпрацоўкі.

Ініцыятыва рабочых сведчыла аб іх імкненні хутчэй пераадолець цяжкасці на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, аб цесным яднанні з Камуністычнай партыяй, аб падтрымцы яе палітыкі, накіраванай на ўздым эканомікі, культуры і дабрабыту савецкага народа.

Барацьбу за ліквідацыю ўраўнілаўкі і абязлічкі ўзначаліла гарадская партыйная арганізацыя. Яна правяла важную работу па арганізаванаму набору рабочай сілы, яе абучэнню прафесіям і пераводу на здзельную аплату працы. У выніку рабочы клас горада павялічыўся на пяць тысяч чалавек, 85 працэнтаў яго было пераведзена на здзельшчыну. На прадпрыемствах пашыралася сацыялістычнае спаборніцтва, расла колькасць ударнікаў, нараджаліся новыя, перадавыя формы арганізацыі працы.

У канцы 1930 года на прадпрыемствах Мінска сталі стварацца гаспадарча-разліковыя брыгады. Праз год на 22 заводах і фабрыках іх ужо налічвалася 212. Яны аб'ядноўвалі ў сваіх радах звыш дзвюх тысяч рабочых. Гэтыя брыгады вялі барацьбу за выяўленне і максімальнае выкарыстанне ўнутраных рэзерваў прадпрыемства, цэхаў, брыгад, за рацыянальную расстаноўку рабочай сілы, супраць ураўнілаўкі і абязлічкі, укаранялі здзельшчыну, прымалі дзейсныя меры да гультаёў і прагульшчыкаў. На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, напрыклад, к студзеню 1932 года дзейнічала 34 гаспадарча-разліковыя брыгады. Найбольш высокіх поспехаў у працы дасягнула гаспадарча-разліковая брыгада Філіповіча, якая працавала на зборцы гравіесартыровак. У гэтым калектыве была ліквідавана абязлічка ў выкарыстанні інструменту і рабочага месца, уведзена прэміяльна-прагрэсіўная здзельная аплата працы, выяўлены і ўведзены ў дзеянне ўнутраныя рэзервы. Усё гэта дазволіла значна павысіць прадукцыйнасць працы і датэрмінова выканаць вытворчы план 1931 года.

Укараненне брыгаднага гаспадарчага разліку дапамагала павысіць у рабочых пачуццё адказнасці за даручаную справу, садзейнічала ўмацаванню ўсёй сістэмы гаспадарчага кіравання.

Актыўны ўдзел у барацьбе за выкананне першага пяцігадовага плана прымалі прафсаюзы Мінска. У 1932 годзе ў сваіх радах яны налічвалі звыш 66 тысяч членаў. Дзейнасць нізавых прафсаюзных арганізацый аб'ядноўваў гарадскі прафсаюзны савет.

У пачатку сакавіка 1932 года адбыўся II з'езд прафсаюзаў Мінска, які ўдзяліў вялікую ўвагу пытанням павышэння прадукцыйнасці

працы, зніжэння сабекошту прадукцыі, павышэння яе якасці. З'езд адзначыў, што прафсаюзы горада дабіліся значных поспехаў у справе росту сваіх радоў, умацавання працоўнай дысцыпліны, павышэння вытворчай актыўнасці рабочых і служачых.

Развіццё прамысловасці Мінска ў гады першай пяцігодкі было цесна звязана з паходам за авалоданне тэхнікай, за павышэнне вытворча-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа. У перыяд рэканструкцыі, калі ў краіне ўжо была створана цяжкая індустрыя і паспяхова развівалася машынабудаванне, тэхніка набыла рашаючае значэнне. Толькі авалодаўшы тэхнікай і стварыўшы кадры новых, савецкіх спецыялістаў, можна было рэканструяваць усе галіны народнай гаспадаркі. Да гэтага заклікала працоўных Камуністычная партыя.

Важную ролю ў вырашэнні гэтай задачы адыграла скліканая ў Маскве 4 лютага 1931 года першая Усесаюзная канферэнцыя работнікаў сацыялістычнай прамысловасці, якая выставіла лозунг «Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі рашае ўсё!».

Партыйная арганізацыя Беларусі ўзначаліла барацьбу мас за авалоданне тэхнікай як у Мінску, так і ў рэспубліцы ў цэлым. У снежні 1931 года ЦК КП(б)Б прыняў спецыяльнае рашэнне «Аб разгортванні вытворча-тэхнічнай прапаганды», у якім намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па павышэнню ўзроўню вытворча-тэхнічнай вучобы.

Вялікую ўвагу пытанню авалодання тэхнікай удзяліла 2-я гарадская партыйная канферэнцыя, якая адбылася ў студзені 1932 года. Канферэнцыя патрабавала ад партыйных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый пашырыць сетку тэхнічнага навучання і забяспечыць шырокую тэхнічную прапаганду сярод рабочых.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый на прадпрыемствах сталіцы Беларусі стала наладжвацца масавая тэхнічная вучоба рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Ствараліся гурткі тэхнічнай вучобы, школы і курсы фабрычна-заводскага вучнёўства, заводскія тэхнікумы, у якіх рабочыя і ІТР настойліва вывучалі тэхніку і павышалі вытворча-тэхнічную кваліфікацыю. У авангардзе гэтай барацьбы ішлі рабочыя металлапрацоўчых прадпрыемстваў — заводаў імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і «Камунар».

Напрыклад, на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі былі арганізаваны курсы перакваліфікацыі ІТР, курсы павышэння кваліфікацыі рабочых і сем тэхнічных гурткоў. У 1932 годзе на гэтых курсах і ў гуртках займалася каля 400 чалавек.

У канцы 1931 года на заводзе «Камунар» адкрыўся вячэрні тэхнікум, дзе без адрыву ад вытворчасці вучыліся рабочыя заводаў «Камунар», імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і «Ударнік». У наступным

годзе ў тэхнікуме займалася 350 чалавек. На заводзе функцыяніравалі таксама падрыхтоўчыя курсы, якія давалі рабочым кваліфікацыю другога-чацвёртага разрадаў і пачатковыя тэхнічныя веды па тэхналогіі, графіцы і спецсправе, рыхтавалі моладзь да паступлення ў вячэрні тэхнікум. Дзейнічала і двухгадовая школа ФЗВ.

Да вытворча-тэхнічнага абучэння рабочых прыцягваліся інжынерна-тэхнічныя работнікі прадпрыемстваў і ўстаноў Мінска. Яны кіравалі гурткамі і курсамі тэхнічнай вучобы, выступалі з лекцыямі і дакладамі па пытаннях укаранення новай тэхнікі, перадавой тэхналогіі, арганізацыі вытворчасці і г. д. Інжынерна-тэхнічныя работнікі завода «Камунар» выпусцілі спецыяльныя «Бюлетэні тэхнікі», серыі папулярных лістовак, у якіх у агульнадаступнай форме тлумачыліся правілы эксплуатацыі станкоў, заводскага абсталявання, інструменту.

На фабрыку «Камунарка» для навучання рабочых былі запрошаны вопытныя майстры з маскоўскіх і кіеўскіх фабрык — Сарокін, Лапцеў, Аляксееў і інш. Тэхнічнай вучобай на фабрыцы ў 1932 годзе было ахоплена 400 чалавек.

Адной з форм барацьбы рабочых за авалоданне тэхнікай у чацвёртым, завяршальным годзе пяцігодкі былі тэхнічныя канферэнцыі, якія праводзіліся на многіх прадпрыемствах горада. На гэтых канферэнцыях абмяркоўваліся пытанні тэхнічнай вучобы, асваення новага абсталявання, рацыяналізацыі вытворчасці, паляпшэння якасці прадукцыі і г. д.

Многія высокакваліфікаваныя спецыялісты ў індывідуальным парадку перадавалі свае веды, вопыт і метады работы рабочым нізкай кваліфікацыі. Сярод такіх майстроў вытворчага навучання патрэбна назваць І. П. Ліпніцкага, А. Ф. Байдакова — рабочых завода «Камунар» і інш. Авалоданне новай тэхнікай і павышэнне культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых і ІТР садзейнічалі далейшаму росту іх творчай ініцыятывы.

У канцы першай пяцігодкі ў прамысловасці Мінска пачаў шырока распаўсюджвацца рух рацыяналізатараў вытворчасці. Інжынерна-тэхнічныя работнікі і радавыя рабочыя, авалодаўшы тэхнікай сваёй справы, уносілі сотні каштоўных прапаноў па ўдасканаленню станкоў і інструментаў, вырабу новых тэхнічных прыстасаванняў, паляпшэнню тэхналагічных працэсаў. На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, напрыклад, у 1930 годзе было ўнесена 322 прапановы, а ў наступным годзе іх паступіла ўжо 452. Укараненне ў вытворчасць толькі 283 прапаноў дало амаль 260 тысяч рублёў эканоміі. Рабочымі і ІТР завода «Бальшавік» у тыя ж гады было адпаведна пададзена 582 і 705 рацыяналізатарскіх прапаноў. За кошт укаранення тэхнічных навін і ўдасканаленняў калектыў прадпрыемства штогод

эканоміў каля васьмі тысяч кілаграмаў сыравіны для вырабу хрому. На хлебазаводзе ў выніку рада рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і механізацыі працэсаў выпуск прадукцыі за змену ўзрос па розных відах вырабаў да 30 працэнтаў.

Ініцыятарамі ўкараненння перадавых метадаў працы, пачынальнікамі ўсяго новага, перадавога выступалі камуністы і камсамольцы. Яны рашуча змагаліся з коснасцю і кансерватызмам, захапляючы сваім творчым энтузіязмам самыя шырокія масы рабочых. Так, у 1931 годзе значных поспехаў у барацьбе за павышэнне якасці прадукцыі і рацыяналізацыю вытворчасці, эканомію сыравіны і матэрыялаў дасягнула камсамольская арганізацыя фабрыкі «Кастрычнік».

У 1931 годзе рабочыя сталіцы Беларусі дабіліся новых важных поспехаў у прамысловым будаўніцтве. У маі на пустэльнай ускраіне, якая называлася тады «Тры карчмы», уступіў у строй новы будынак кандытарскай фабрыкі «Камунарка», будаўніцтва якой было пачата ў 1929 годзе. Галоўны інжынер фабрыкі І. Шур успамінае: «Мне тады быў аказаны высокі гонар — даць першы гудок. І вось ужо доўгі, працяглы гудок у першы раз вырываецца з кацельні фабрыкі, гулка плыве над аколіцай, абвяшчаючы аб уступленні ў строй дзеючых адной з 518 будоўляў першай пяцігодкі, аб новай перамозе рабочых сталічнага Мінска». Па абсталяванню і механізацыі фабрыка адносілася да ліку перадавых прадпрыемстваў харчовай прамысловасці рэспублікі. Прадукцыя яе ўзрасла з 2793 тон у 1930 годзе да 6977 тон у 1931 годзе.

У студзені 1932 года ў Мінску адбыўся XIV з'езд КП(б) Беларусі, які адзначыў дасягненні ў развіцці народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. З'езд указаў на неабходнасць далейшага разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва як на важнейшую ўмову паспяховага выканання пяцігодкі.

У 1932 годзе савецкі народ дабіўся выдатнай перамогі — першы пяцігадовы план быў выканан за чатыры гады і тры месяцы. К гэтаму ж часу быў выканан і пяцігадовы план БССР. У выніку ажыццяўлення пяцігодкі наша краіна ператварылася з адсталай, аграрнай у перадавую, індустрыяльную. У прамысловасці СССР сацыялістычная сістэма гаспадаркі перамагла поўнасцю, а ў галіне сельскай гаспадаркі стала пануючай. У краіне быў пабудаваны эканамічны фундамент сацыялізма.

Вялікія змены за гады першай пяцігодкі адбыліся ў прамысловасці Мінска. Узрасло значэнне горада як прамысловага цэнтра рэспублікі. За пяцігодку аб'ём яго прамысловай прадукцыі павялічыўся з 32 145 тысяч рублёў да 203 752 тысяч рублёў. У 1932 годзе прадпрыемствы выпускалі 23,6 працэнта ўсёй прамысловай прадукцыі

Беларусі. У горадзе налічвалася 13 прадпрыемстваў з колькасцю рабочых ад 500 і вышэй, 19 — ад 200 да 500 рабочых, 24 — ад 100 да 200 рабочых і каля 90 дробных прадпрыемстваў. Прадукцыйнасць працы за пяцігодку ўзрасла на 66 працэнтаў.

Павялічылася насельніцтва Мінска. У 1932 годзе ў ім жыло 180,8 тысячы чалавек. 20 736 з іх працавалі на прамысловых прадпрыемствах, 9757 — на будоўлях і 7437 — на транспарце.

Сур'ёзныя поспехі былі дасягнуты ў металаапрацоўчай прамысловасці. Была праведзена карэнная тэхнічная рэканструкцыя заводаў «Камунар» і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Іх асноўныя вытворчыя фонды за пяцігодку павялічыліся больш чым у тры разы, выпуск прадукцыі ўзрос у восем разоў. Яны выраблялі металарэжучыя станкі, тарфяныя камбайны тыпу «Багер», дрэваапрацоўчыя прэсы, каменедрабілкі і іншую прадукцыю, якая знаходзіла шырокае прымяненне не толькі ў народнай гаспадарцы Беларусі, але і ўсяго Савецкага Саюза.

Буйным прадпрыемствам Мінска, якое выросла за гады першай пяцігодкі на базе фабрыкі «Адраджэнне» і выпускала металічныя ложкі, дзіцячую мэблю, каляскі і г. д., быў вагавы завод «Ударнік».

Папоўніўся новым абсталяваннем і кадрамі завод «Полымя рэвалюцыі» (былыя вагонарамонтныя майстэрні). У 1930 годзе тут працавала каля 500 чалавек.

У буйное прадпрыемства Беларусі ператварыўся Мінскі дрэваапрацоўчы завод. Вытворчыя фонды яго ўзраслі за пяцігодку амаль у дзевяць разоў, а выпуск валавой прадукцыі павялічыўся ў тры з лішнім раза.

Шырокае развіццё атрымала швейная, гарбарна-абутковая, харчовая галіны прамысловасці. У 1932 годзе прадукцыя гарбарна-абутковых прадпрыемстваў горада складала 52,5 працэнта ад агульнага аб'ёму гэтай прадукцыі па БССР. Прадпрыемствы былі абсталяваны новай тэхнікай, асноўныя вытворчыя працэсы на іх былі механізаваны. Так, асноўныя вытворчыя фонды фабрыкі імя Калініна ўзраслі ў сем разоў, а прадукцыі стала вырабляцца ў дзевяць разоў больш. Тут было занята ўжо 905 чалавек.

На гарбарным заводзе «Бальшавік» у 1932 годзе працавала 610 чалавек. Гадавы кошт яго прадукцыі складаў звыш дзесяці мільёнаў рублёў. Па выпрацоўцы хрому ён займаў к канцу першай пяцігодкі трэцяе месца ў гарбарнай прамысловасці СССР і першае месца ў БССР.

Валавая прадукцыя фабрыкі «Камунарка» за гады пяцігодкі ўзрасла больш чым у 68 разоў — з 180 тысяч рублёў у 1928 годзе да 12 708 тысяч рублёў у 1932 годзе. Колькасць рабочых за гэты час павялічылася з 66 да 945 чалавек.

Далейшае развіццё атрымала ў Мінску і дробная саматужная прамысловасць. Было праведзена ўзбуйненне арцелей, значна пашырыўся выраб тавараў шырокага спажывання. У 1932 годзе прадпрыемствы прамысловай кааперацыі далі прадукцыі на 22,2 мільёна рублёў. Прамысловая кааперацыя з'явілася важным дапаўненнем дзяржаўнай прамысловасці ў забеспячэнні працоўных горада і вёскі прадметамі першай неабходнасці.

Пашыралася энергетычная база сталіцы рэспублікі. Магутнасць ЦЭЦ № 1 у 1932 годзе складала 6750 кілават. Аднак пашырэнне энергетычнай базы ў той перыяд усё яшчэ значна адставала ад росту прамысловасці і гарадской гаспадаркі, у выніку чаго патрэбы ў электраэнергіі поўнасцю не задавальняліся. Электрастанцыя працавала з вялікім напружаннем пры адсутнасці вызначаных рэзерваў электраэнергіі.

Вялікую дапамогу ў паспяховым выкананні працоўнымі Мінска заданняў першага пяцігадовага плана аказалі саюзны ўрад і брацкі рускі народ. Фінансавыя асігнаванні Беларусі па лініі саюзнага бюджэту складалі каля $^1/_3$ усіх затрат, укладзеных у прамысловасць рэспублікі. Значная частка гэтых сродкаў была выдзелена для новабудоўляў Мінска. Гэта дапамога з'яўлялася канкрэтным выражэннем нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі, накіраванай на аказанне ўсякай дапамогі раней адсталым нацыянальным раёнам, каб даць ім магчымасць у найкарацейшыя тэрміны дагнаць Цэнтральную Расію ў гаспадарчым і культурным развіцці.

4. Дапамога мінскіх рабочых вёсцы

Рабочы клас Мінска выступіў актыўным змагаром за перабудову сельскай гаспадаркі. Адной з форм дапамогі з'яўлялася шэфства працоўных горада над вёскай, што садзейнічала ўмацаванню саюзу рабочых і сялян.

Сетка шэфскіх таварыстваў у Мінску пастаянна пашыралася. Калі ў кастрычніку 1925 года ў іх налічвалася каля дзесяці тысяч чалавек, то ў 1927 годзе — амаль 15 тысяч чалавек. З 1926 года шэфскія таварыствы поруч з культурна-масавай работай сталі аказваць сялянству вялікую гаспадарчую дапамогу. Так, шэфы дапамаглі стварыць у Мінскай акрузе 24 меліярацыйных і машынных таварыствы, пяць кааператыўных арганізацый. На сродкі шэфскіх таварыстваў набывалася сельскагаспадарчая тэхніка.

У красавіку 1926 года праходзіла ўсесаюзная нарада па шэфству над вёскай. У прынятай рэзалюцыі ўказвалася на неабходнасць

узмацнення з боку шэфскіх таварыстваў арганізацыйна-гаспадарчай дапамогі вёсцы. Гэтым указаннем рабочыя сталіцы нашай рэспублікі кіраваліся ў сваіх дзеяннях.

Абследаваўшы шэфскую работу Ляхаўскага раёна Мінска, райком партыі адзначыў значныя дасягненні ў справе культурнай дапамогі вёсцы, якая выявілася ў арганізацыі хат-чытальняў, забеспячэнні іх літаратурай. У шэфскай рабоце важнае месца заняла і арганізацыйна-гаспадарчая дапамога сялянству. Па ініцыятыве шэфскіх арганізацый у ліпені 1926 года ў падшэфных вёсках было створана машыннае і чатыры меліярацыйных таварыствы, якія асушылі 2000 дзесяцін забалочаных зямель. Рабочыя Ляхаўскага раёна Мінска ў 1926 годзе больш 150 разоў выязджалі ў падшэфныя вёскі Самахвалавіцкага раёна. Яны дапамаглі пабудаваць 28 хат-чытальняў, абсталяваць восем чырвоных куткоў, устанавіць радыёкропкі ў сельскіх Саветах, правесці падпіску на газеты і часопісы.

Пры дапамозе рабочых прамысловых прадпрыемстваў у падшэфных вёсках у 1927 годзе было арганізавана 31 кааператыўнае аб'яднанне, закладзена 23 доследна-паказальных участкі і два плодагадавальнікі.

Вялікую ролю ў актывізацыі дзейнасці шэфскіх ячэек адыграў усесаюзны агляд шэфскай работы, які праводзіўся па ўказанню ЦК ВКП(б) у другой палове 1928 года. У ходзе агляду пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый вывучаліся формы і метады работы шэфскіх таварыстваў, выяўляліся недахопы, намячаліся шляхі іх ліквідацыі. У выніку ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва шэфствам, правядзення вялікай растлумачальнай работы сярод рабочых мас к канцу 1928 года ў значнай меры ажывілася дзейнасць шэфскіх ячэек, узрасла іх колькасць.

Значную культурна-выхаваўчую работу сярод сялян праводзіў Цэнтральны дом селяніна ў Мінску, які пачаў працаваць з 1928 года. Толькі за два гады пасля адкрыцця ў ім адбылося 349 гутарак. На іх прысутнічала 23 тысячы чалавек. Юрыдычныя кансультацыі атрымалі чатыры з палавінай тысячы чалавек, агракансультацыі — больш тысячы чалавек.

Часта выязджалі ў вёску рабочыя брыгады, у склад якіх уваходзілі, акрамя спецыяльных агітатараў і прапагандыстаў, слесары, кавалі, спецыялісты па рамонту сельскагаспадарчага інвентару. Яны чыталі сялянам лекцыі, растлумачвалі палітыку партыі і Савецкай улады аб сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Толькі ў пачатку 1929 года шэфскімі ячэйкамі прамысловых прадпрыемстваў Мінска ў вёсках акругі было праведзена 230 лекцый і дакладаў па пытаннях калектывізацыі.

Працоўнае сялянства з радасцю сустракала сваіх шэфаў, а ў час рэвалюцыйных свят сяляне падшэфных вёсак прыязджалі ў горад, дзе знаёміліся з жыццём рабочых. Гэта дружба мацнела з году ў год і садзейнічала далейшаму ўмацаванню саюзу рабочых і сялян.

З разгортваннем масавага калгаснага руху шэфская дапамога горада вёсцы яшчэ больш узмацнілася. Так, у пасяўную кампанію 1929 года рабочыя заводаў «Камунар», «Энергія», «Бальшавік», фабрыкі імя Калініна адрамантавалі 3500 плугоў, каля 600 барон, зрабілі 189 новых плугоў і 73 бараны.

Працоўнае сялянства вітала шэфскую дапамогу рабочых брыгад і рашуча давала адпор кулацкім элементам. 15 красавіка 1929 года на агульным сходзе сялян вёскі Загай Навасёлкаўскага сельсавета Пухавіцкага раёна кулакі пачалі «даказваць», што можна абысціся без дапамогі рабочых. Бедната пры падтрымцы большасці сераднякоў рэзка выступіла супраць гэтай правакацыйнай вылазкі. У прынятай пастанове сяляне сардэчна дзякавалі шэфам за «праяўленую ініцыятыву ў справе аказання дапамогі беднаце».

Шэфскія арганізацыі Мінска прынялі актыўны ўдзел у правядзенні перадвыбарнай кампаніі сельскіх Саветаў. У студзені 1929 года для ўдзелу ў перавыбарах Саветаў у вёскі Мінскай акругі было паслана 50 рабочых. Яны праводзілі сходы груп беднаты, гутаркі з сялянамі, удзельнічалі ў арганізацыйнай рабоце, звязанай з перавыбарамі. «Сардэчна дзякуем мінскім рабочым, якія дапамаглі нам правесці адну з важнейшых задач — перавыбары Саветаў,— пісалі беднякі вёскі Русакі Мінскага раёна.— Рабочая дэлегацыя пазнаёміла нашу вёску з жыццём і працай горада і замацавала цесную сувязь працоўных горада і вёскі».

Немалую ролю ў прапагандзе калгаснага ладу адыгралі працоўныя прадпрыемстваў сталіцы ў час «Дня ўраджаю і калектывізацыі». Напрыклад, рабочыя завода «Бальшавік» выступілі ініцыятарамі збору сродкаў для будаўніцтва трактарнай калоны імя «Дня ўраджаю і калектывізацыі». Для гэтай мэты імі было адлічана два — пяць працэнтаў месячнай зарплаты. Рабочыя аказвалі дапамогу ў правядзенні сяўбы і ўборкі ўраджаю. Чыгуначнікі мінскага вузла стварылі перасовачныя майстэрні і поўнасцю адрамантавалі сельскагаспадарчы інвентар бядняцкім гаспадаркам і калгасам 18 вёсак Койданаўскага раёна.

Рабочыя завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1930 годзе абсталявалі ў калгасах падшэфнага Смілавіцкага раёна пяць кузняў і адрамантавалі каля дзвюх тысяч адзінак інвентару.

У многіх падшэфных калгасах рабочыя прамысловых прадпрыемстваў арганізоўвалі перасовачныя кухні, якія забяспечвалі харчаваннем калгаснікаў у час уборкі ўраджаю.

Рабочыя адыгралі вялікую ролю ва ўмацаванні калгасаў кіруючымі кадрамі. Выконваючы рашэнне лістападаўскага (1929 года) Пленума ЦК ВКП(б), рабочы клас Беларусі паслаў у вёску 534 чалавекі. Частка іх былі пасланцы Мінска. Калгаснае сялянства ў асобе «дваццаціпяцітысячнікаў» атрымала дастойных змагароў за пераўтварэнне сельскай гаспадаркі на сацыялістычных асновах.

Вялікую дапамогу калгасам ва ўборцы ўраджаю аказвалі прафсаюзныя арганізацыі і ўстановы. Так, саюз работнікаў асветы Мінска накіраваў у падшэфныя калгасы для аказання дапамогі ва ўборцы ўраджаю 410 чалавек. Саюз камунальнікаў паслаў брыгаду для аказання дапамогі ў рамонце інвентару, уборкі ўраджаю. Вясной 1931 года ў калгасы рэспублікі выехала з Мінска для рамонту сельскагаспадарчага інвентару 465 рабочых брыгад.

У пачатку 1931 года на прамысловых прадпрыемствах Мінска сталі ствараццa спецыяльныя брыгады па садзеянню калектывізацыі. Так, на швейнай фабрыцы «Кастрычнік» такія брыгады меліся ў кожным цэху. Яны былі замацаваны за асобнымі сельсаветамі Пухавіцкага раёна і дапамагалі ў арганізацыі калгасаў. Дзякуючы ім у раёне было створана 39 новых калектыўных гаспадарак. Рабочыя брыгады мінскага саюза транспартных рабочых у падшэфным Плешчаніцкім раёне аказалі дапамогу ў арганізацыі дзевяці калгасаў.

З 1931 года кіраўніцтва шэфскімі арганізацыямі ўскладаецца на прафсаюзы. Былі распрацаваны канкрэтныя меры па далейшаму ўзмацненню дапамогі вёсцы. У выніку паляпшэння агітацыйна-прапагандысцкай работы шэфаў сярод сялянскіх мас павялічыўся працэнт калектывізацыі. Рабочыя па-ранейшаму аказвалі дапамогу сялянам ва ўборцы ўраджаю, у правільнай арганізацыі працы, ва ўмацаванні працоўнай дысцыпліны, у арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў. Завод «Бальшавік» накіраваў на ўборку ўраджаю 200 чалавек, завод «Чырвоны хімік» — 150, служачыя дзяржаўных устаноў — 200 чалавек.

З канца 1931 года стала шырока практыкавацца заключэнне дагавораў аб сацыялістычнай узаемадапамозе паміж прадпрыемствамі і падшэфнымі калгасамі. Паспяхова выканалі абавязацельства па дагавору аб сацспаборніцтве калектыў завода «Бальшавік» і іх падшэфныя калгасы. Усе калгасы Самахвалавіцкага сельсавета своечасова выканалі планы нарыхтовак, павялічылася колькасць кааперараваных гаспадарак. Сельскі Савет атрымаў ад сваіх шэфаў чырвоны сцяг.

Рабочыя прымалі актыўны ўдзел у павышэнні ўзроўню культурна-асветнай работы сярод сялянскіх мас. Яны дапамагалі ліквідаваць непісьменнасць насельніцтва, арганізоўвалі вечары пытанняў і адказаў, дэманстрацыю кінафільмаў, пастаноўку спектакляў, вы-

пуск насценгазет, вялі сярод сялян антырэлігійную прапаганду. Так, рабочыя брыгады фабрыкі «Кастрычнік», завода «Камунар» у выніку праведзеных гутарак сярод сялян падшэфных вёсак дабіліся, што ў час веснавой сяўбы 1931 года ўсе працаздольныя калгаснікі ў рэлігійныя святы працавалі на палях.

Дзякуючы дапамозе рабочага класа ў Мінскім раёне ўжо на 1 студзеня 1933 года было калектывізавана 64,5 працэнта сялянскіх гаспадарак.

Сяляне ў адказ на дапамогу рабочых у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі арганізоўвалі чырвоныя абозы з хлебам у фонд індустрыялізацыі, перавыконвалі планавыя заданні. Напрыклад, беднякі і сераднякі вёскі Хазянінкі Смілавіцкага раёна замест 780 пудоў па плану здалі на нарыхтоўчыя пункты 810 пудоў хлеба. А ўсяго сяляне вёсак Мінскай акругі на працягу верасня 1929 года здалі на нарыхтоўчыя пункты больш 1000 тон хлеба, выканаўшы планавае заданне на 136 працэнтаў.

«Працуючы ў вёсцы,— указваў М. І. Калінін,— пралетарыят, несумненна, аказвае адпаведны псіхалагічны ўплыў, уносіць адпаведныя напластаванні ў псіхіку сялянства... робіць сялян блізкімі да псіхалогіі горада; з другога боку, сяляне, маючы зносіны з гарадскім насельніцтвам у асобе рабочых, гэта значыць з самым рэвалюцыйным гарадскім насельніцтвам, міжвольна, непрыкметна для сябе засвойваюць і адпаведныя рысы, адпаведную псіхалогію рабочых» [1].

5. Развіццё гарадской гаспадаркі. Пачатак работ па рэканструкцыі Мінска

Сацыялістычная індустрыялізацыя суправаджалася хуткім ростам гарадоў і гарадскога насельніцтва. Шырокі размах прамысловага і культурнага будаўніцтва выклікаў значны прыток у Мінск сельскага насельніцтва. З 1926 па 1932 год колькасць жыхароў павялічылася на 50 тысяч.

У студзені 1931 года ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову «Аб расшырэнні гарадской мяжы горада Мінска». У ёй адзначалася, што расшырэнне тэрыторыі сталіцы Беларусі будзе садзейнічаць паляпшэнню культурных і бытавых патрэб працоўных, стварэнню вакол горада спецыялізаваных калектыўных гаспадарак па вырошчванню гародніны, фруктаў і забеспячэнню імі насельніцтва.

Істотныя змены адбыліся ў сацыяльным складзе насельніцтва Мінска. У 1926 годзе большасць насельніцтва складалі рабочыя і слу-

[1] М. И. Калинин. Пути культурной смычки с деревней. М., 1928, стр. 15.

жачыя, занятыя ў дзяржаўным сектары. У прыватным сектары было занята 15,5 тысячы чалавек. У наступныя гады, асабліва ў перыяд першай пяцігодкі, колькасць рабочых і служачых у дзяржаўным сектары рэзка ўзрасла.

З пераходам краіны на рэйкі сацыялістычнай індустрыялізацыі перад працоўнымі Мінска паўсталі новыя задачы ў галіне будаўніцтва. Неабходна было разгарнуць работу па пашырэнню, перабудове і развіццю гарадской гаспадаркі ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляліся хуткімі тэмпамі індустрыялізацыі, павелічэннем насельніцтва, ростам бытавых і культурных запатрабаванняў працоўных.

Асабліва нездавальняючым было становішча з жыллём. У 1926 годзе ў Мінску на душу насельніцтва прыпадала ўсяго 4,4 квадратных метра жылой плошчы. У студзені наступнага года сярэдняя норма жылой плошчы на аднаго чалавека складала толькі 70 працэнтаў мінімальнай санітарнай нормы.

Партыйныя і савецкія арганізацыі горада прымалі рашучыя меры для паскоранага развіцця жыллёвай гаспадаркі. Павялічваліся асігнаванні на жыллёвае будаўніцтва. У 1926/27 годзе дзяржаўныя органы і жыллёвая кааперацыя выдаткавалі на новае будаўніцтва 1250 тысяч рублёў. Акрамя таго, жыллёва-арэндная кааперацыя зрабіла рамонт старых будынкаў на 600 тысяч рублёў. Толькі за два гады (1926—1927) было пабудавана 41,4 тысячы квадратных метраў жылой плошчы. У 1930 годзе выдаткі на жыллёвае будаўніцтва ўзраслі амаль да чатырох мільёнаў рублёў.

Вось што паведамляла газета «Рабочий» аб ходзе будаўніцтва: «Горад у рыштаванні будоўляў. Ніколі яшчэ Мінск не ведаў такога размаху будаўнічых работ. 1800 плотнікаў, столяраў, муляроў, тынкоўшчыкаў, чорнарабочых будуюць Універсітэцкі гарадок, рабочыя клубы, новыя фабрыкі. 700 рабочых заняты на будаўніцтве гандлёва-будаўнічага трэста, 200 рабочых пракладваюць трамвайныя лініі». Усяго на будаўніцтве горада ў 1929 годзе працавала 7514 чалавек.

У выніку прынятых мер жыллёвыя ўмовы рабочых і служачых некалькі палепшыліся. Сярэдняя жылплошча на аднаго чалавека складала ў 1930 годзе 5,7 квадратных метра. У далейшым праграма жыллёвага будаўніцтва Мінска яшчэ больш пашырылася.

У кастрычніку 1931 года ЦК КП(б) Б і СНК БССР прынялі пастанову «Аб камунальнай гаспадарцы г. Мінска», у якой былі прадугледжаны паскораныя тэмпы развіцця жыллёвай гаспадаркі ў горадзе.

Вялікую ўвагу пытанню развіцця гарадской гаспадаркі ўдзяліла другая Мінская гарадская партыйная канферэнцыя, якая адбылася ў студзені 1932 года. Канферэнцыя намеціла рад практычных мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэнне жыллёвага будаўніцтва, па-

велічэнне магутнасці гарадской электрастанцыі, пашырэнне водаправода, тэлефанізацыі і радыёфікацыі горада.

Былі павялічаны капіталаўкладанні ў жыллёвае будаўніцтва Мінска. Яны ўзраслі ў 1933 годзе да 6800 тысяч рублёў супраць 2400 тысяч рублёў у 1928 годзе. Пашырылася індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. За гады першай пяцігодкі ў яго было ўкладзена 17 761 тысяча рублёў. Значныя сродкі ўкладвала ў будаўніцтва жылля кааперацыя. На працягу 1931—1933 гадоў жыллёва-будаўнічай кааперацыяй было здана пад засяленне 139 дамоў. Усяго працоўныя Мінска атрымалі за 1928—1932 гады 2180 новых добраўпарадкаваных кватэр.

Адначасова з увядзеннем новых дамоў праводзіўся рамонт старога жыллёвага фонду. У 1931—1933 гадах выдаткі на рамонт толькі па лініі жыллёва-будаўнічай кааперацыі склалі 4788 тысяч рублёў. Аднак планы жыллёвага будаўніцтва адставалі ад тэмпаў будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і росту насельніцтва Мінска. Таму адчуваўся востры недахоп у жылой плошчы.

У 1926 годзе пад кіраўніцтвам маскоўскага архітэктара В. Н. Сямёнава была распрацавана першая ў савецкі час схема рэканструкцыі Мінска, якая лягла ў аснову ўсіх далейшых планіровачных работ. Схема прадугледжвала пераўтварэнне прамавугольнай сістэмы планавання горада, якая склалася за працяглы час, у радыяльна-кальцавую. Пад стварэнне гарадскога цэнтра выдзяляўся раён вакзала — Савецкай вуліцы. Цэнтральныя кварталы горада праектаваліся пад капітальнае будаўніцтва, на ўскраінах размяшчалася аднапавярховая сядзібная забудова. Галоўнымі магістралямі горада ўстанаўліваліся ўзаемаперасякальныя напрамкі Маскоўская — Савецкая — Пушкінская вуліцы і Магілёўская шаша — Даўгабродская вуліца — Даўгінаўскі тракт.

На аснове схемы 1926 года пачалі весціся работы па рэканструкцыі. Былі ўстаноўлены праезныя трасы Савецкай і Пушкінскай вуліц, стала забудоўвацца Вакзальная плошча, узніклі комплексы новых грамадскіх будынкаў — універсітэта і клінічнага гарадка, а таксама новыя жылыя раёны, праектавалася сістэма азеляненння горада.

Па праектах, распрацаваных Інстытутам праектавання гарадоў (Гіпрагорам РСФСР), пачалася забудова плошчаў Леніна, Круглай, Парыжскай камуны.

У значнай меры быў рэканструяван транспарт. З кожным годам пашыраўся пасажырскі аўтобусны рух. У 1926/27 годзе аўтобусамі было перавезена 774 тысячы пасажыраў.

У студзені 1928 года ўрад Беларусі прыняў спецыяльную пастанову «Аб будаўніцтве трамвая ў Мінску», у якой вызначыў тэрміны будаўніцтва і крыніцы фінансавання работ. У чэрвені таго ж года

на будаўніцтва першай чаргі трамвая асігнуецца 2650 тысяч рублёў.

За параўнальна кароткі час было пракладзена дзесяць кіламетраў трамвайнага пуці, пабудаван трамвайны парк. Вялікую дапамогу ў гэтым аказалі рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі Масквы. З Масквы і іншых гарадоў краіны былі атрыманы трамвайныя вагоны, рэйкі, абсталяванне для трамвайнага парка. Першая чарга трамвая была пушчана ў кастрычніку 1929 года. Яна злучала Камароўку з таварнай станцыяй. Мінчане атрымалі зручны і танны від транспарту. Ужо ў 1929/30 годзе трамваем было перавезена каля 11 мільёнаў пасажыраў.

У наступныя гады ў горадзе пракладваліся новыя трамвайныя лініі, якія звязалі ўскраіны горада — Ляхаўку, Старажоўку, Кальварыю — з цэнтрам. Пашыраўся трамвайны парк, які ўжо налічваў у 1933 годзе 43 вагоны. У 1932 годзе трамваем было перавезена пасажыраў амаль у два з паловай раза больш, чым у 1930 годзе.

У горадзе была пашырана сетка водаправода. Магутнасць водаправода за тры гады (1926—1928) узрасла на 20 працэнтаў. Тым не менш забеспячэнне насельніцтва вадой заставалася нездавальняючым: водаправодная станцыя падавала не больш 10—12 тысяч вёдзер вады ў гадзіну пры патрэбе 20 тысяч вёдзер. У 1931—1933 гадах водаправод быў рэканструяван. Магутнасць яго значна ўзрасла, што дало магчымасць падаць ваду на ўскраіны горада — Барысаўскі тракт, вуліцы Дзяржынскага, Розы Люксембург і інш. Працягласць сеткі водаправода склала 60 кіламетраў.

Важную ролю ў правядзенні санітарнага добраўпарадкавання Мінска адыграла будаўніцтва каналізацыйнай сеткі. У 1927 годзе саюзны ўрад асігнаваў на гэтыя мэты звыш двух мільёнаў рублёў. Частку сродкаў адпусціў Мінскі гарадскі Савет. У маі 1930 года каналізацыйная сетка ўступіла ў эксплуатацыю. Працягласць яе склала каля 30 кіламетраў. У наступныя гады каналізацыйная сетка была значна пашырана.

Ажыццяўляліся і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне санітарнага стану горада. Забруджаны Нямігскі канал быў заключан у жалезабетонную трубу. Вялося лазнева-пральнае будаўніцтва. У 1926—1932 гадах былі пабудаваны тры лазні: у раёне Ляхаўкі, Серабранкі і ў Кастрычніцкім раёне. У 1933 годзе была пабудавана механізаваная пральня. Добраўпарадкаваліся вуліцы, будаваліся новыя масты.

Горад азеляняўся. На плошчах 25 Кастрычніка (Юбілейная) і КІМ, па Грушаўскай вуліцы, на вуглу вуліц Рэспубліканскай і Інтэрнацыянальнай былі разбіты новыя скверы, на вуліцах Кастрычніцкай, Карла Маркса, Валадарскага, Універсітэцкай і іншых паса-

джаны дрэвы. У 1933 годзе адкрыт гарадскі парк культуры і адпачынку (цяпер парк Чэлюскінцаў). У ім праводзіліся агульнагарадскія масавыя гулянні і канцэрты, дэманстраваліся кінафільмы. У 1933 годзе ў Мінску мелася 16 паркаў, садоў і сквераў, адзін кветкавы гадавальнік і дзве аранжарэі.

З кожным годам змянялася аблічча Мінска. Усё ярчэй праяўляліся ў ім рысы буйнога савецкага адміністрацыйнага горада, які стаў цэнтрам палітычнага і культурнага жыцця Беларусі.

6. Рост матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва

Адначасова з ростам сацыялістычнай вытворчасці паляпшаўся матэрыяльны дабрабыт працоўных.

Істотным паказчыкам павышэння ўзроўню жыцця рабочых і служачых з'яўляецца рост іх заработнай платы. З 1925/26 па 1927/28 год сярэднемесячная заработная плата рабочых прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці Мінска выраслa на 26 працэнтаў. Сярэднемесячная заработная плата рабочых цэнзавай прамысловасці з 1928 па 1930 год павялічылася на 32 працэнты.

Па меры разгортвання сацыялістычнай індустрыялізацыі скарачалася беспрацоўе. Аднак у гэтыя гады растучая прамысловасць яшчэ не магла ліквідаваць беспрацоўе поўнасцю. У сакавіку 1927 года, напрыклад, у горадзе налічвалася больш дзесяці тысяч беспрацоўных, галоўным чынам з некваліфікаваных рабочых.

Гарадскі Савет і прафсаюзныя арганізацыі прымалі дзейсныя меры для ліквідацыі беспрацоўя. Кваліфікаваныя рабочыя ўладкоўваліся на пашыраемыя і новыя прадпрыемствы. Беспрацоўныя, якія не мелі кваліфікацыі, набывалі новыя спецыяльнасці.

Беспрацоўным аказвалася істотная матэрыяльная дапамога. Асігнаванні гарадскога бюджэту на гэтыя мэты у 1927/28 годзе склалі 262 тысячы рублёў супраць 250 тысяч у 1926/27 годзе. Беспрацоўным адпускаліся танныя і часткова бясплатныя абеды. Для іх былі арганізаваны начлежныя дамы.

У 1929 годзе ў Мінску налічвалася каля сямі тысяч беспрацоўных. К канцу 1930 года беспрацоўе было ліквідавана. Гэта адна з буйнейшых гістарычных заваёў рабочага класа, вынік перамаганоснага наступлення сацыялізма па ўсяму фронту.

Вялікае значэнне для павышэння жыццёвага ўзроўню рабочых меў перавод прамысловых прадпрыемстваў на сямігадзінны рабочы дзень, абвешчаны маніфестам ЦВК СССР у кастрычніку 1927 года (напярэдадні дзесятай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі). На фаб-

рыках і заводах адбыліся сходы і мітынгі. Рабочыя запэўнілі партыю і ўрад, што скарачэнне рабочага дня не будзе адмоўна ўплываць на выпуск прамысловай прадукцыі.

Перавод прадпрыемстваў Мінска на сямігадзінны рабочы дзень быў завершан у гады першай пяцігодкі. У рабочых з'явілася больш часу для ўдзелу ў грамадскай і палітычнай рабоце, для вучобы, культурнага адпачынку, заняткаў фізкультурай і спортам.

Рабочыя штогод карысталіся аплачаным водпускам працягласцю ад 12 да 24 рабочых дзён. Тысячы рабочых і служачых забяспечваліся пуцёўкамі ў санаторыі і дамы адпачынку за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання. Толькі ў доме адпачынку «Ждановічы», які адкрыўся ў 1927 годзе, адпачывала за летні перыяд каля чатырох тысяч мінчан. Многія рабочыя і іх сем'і праводзілі водпуск на курортах і ў санаторыях краіны.

Удзялялася пастаянная ўвага ахове працы і тэхніцы бяспекі.

СНК БССР 25 студзеня 1928 года прапанаваў Народнаму Камісарыяту працы прыняць рашучыя меры да безумоўнага выканання працоўнага заканадаўства на дробных і саматужных прадпрыемствах, узмацніць кантроль за выкананнем санітарных і тэхнічных патрабаванняў на прыватных прадпрыемствах.

З кожным годам павялічваліся асігнаванні на ахову здароўя. У 1933 годзе яны складалі 11,3 працэнта гарадскога бюджэту. Расходы на ахову здароўя, якія да Кастрычніцкай рэвалюцыі складалі 70—80 капеек на душу насельніцтва, выраслі ў 1932 годзе да 29 рублёў.

У Мінску пашырылася сетка амбулаторый, дыспансераў, устаноў па ахове мацярынства і дзяцінства, пунктаў па ахове здароўя на прадпрыемствах, санітарна-эпідэмічных станцый, аптэк, начных санаторыяў. З 1925 па 1927 год былі пабудаваны новыя амбулаторыі ў раёнах Ляхаўкі і Камароўкі. У раёне Камароўкі, на Камсамольскай вуліцы і на Старажоўцы адкрыліся новыя аптэкі. У 1926 годзе створан туберкулёзны дыспансер, пашыраны рэнтгенаўскія кабінеты. У 1931 годзе ў Мінску было 13 бальніц, дзесяць амбулаторый, восем аптэк і 11 спецыяльных медыцынскіх устаноў.

У 1931 годзе закончана будаўніцтва клінічнага гарадка, які аб'яднаў рад клінік, абсталяваных навейшай медыцынскай апаратурай. З увядзеннем яго ў строй у Мінску значна павялічылася колькасць бальнічных ложкаў. З 1928 па 1932 год яна ўзрасла з 872 да 1668.

У бальніцах і клініках Мінска атрымлівалі кваліфікаваную медыцынскую дапамогу не толькі жыхары горада, але і працоўныя іншых гарадоў і вёсак Беларусі. У 1930 годзе ў Мінску працавалі 491 урач і 599 медыцынскіх работнікаў сярэдняй кваліфікацыі. К канцу пяцігодкі ў Мінску было пяць жаночых і тры дзіцячых кансультацыі,

два дзіцячых дамы. На фабрыках і заводах, ва ўстановах і некаторых домакіраўніцтвах былі адкрыты дзіцячыя сады і яслі. У 1932 годзе, напрыклад, у горадзе налічвалася 68 дзіцячых садоў.

У арганізацыі дзіцячых устаноў актыўна ўдзельнічала грамадскасць сталіцы БССР. У кастрычніку 1927 года па ініцыятыве камсамольцаў горада быў праведзен суботнік. Некалькі дзесяткаў тысяч рублёў, зароблены удзельнікамі суботніка, былі перададзены ў фонд дапамогі дзецям.

У выніку росту матэрыяльнага дабрабыту працоўных у Мінску рэзка скарацілася смяротнасць. У 1926/27 годзе яна зменшылася ў параўнанні з даваенным перыядам у два разы. Штогодні натуральны прырост насельніцтва на працягу 1925/26—1928 гадоў склаў у сярэднім больш двух тысяч чалавек.

Хутка развіваліся фізкультура і спорт. У горадзе мелася чатыры стадыёны, 30 спартыўных пляцовак і 40 стралковых ціраў. Штогод пашыралася матэрыяльная база фізкультурных арганізацый.

У Мінску былі пабудаваны кінатэатры «Цэнтральны» і «Перамога» — найбольш буйныя грамадскія будынкі першага перыяду савецкага горадабудаўніцтва ў Мінску. У архітэктуры гэтых будынкаў праявіўся ўплыў рэвалюцыйнай рамантыкі, характэрнай для пачатковага перыяду развіцця савецкай архітэктуры і даволі ўдала спалучаючай знешні пафас архітэктурных форм з задавальненнем функцыянальных патрэб.

Далейшае развіццё атрымаў дзяржаўны і кааператыўны гандаль, які выцясняў з рынку прыватнікаў. У 1928 годзе ў Мінску засталося толькі 25 паўаптовых і аптовых прыватных прадпрыемстваў (у 1926 годзе іх налічвалася 98), а гандлёвы абарот іх зменшыўся ў пяць разоў. На долю прыватнага сектара прыпадала 29,4 працэнта агульнага рознічнага тавараабароту. У наступныя гады прыватнік быў выцеснен поўнасцю. У 1928 годзе ў Мінску налічвалася 843 магазіны і ларкі. Рознічны тавараабарот іх за гады першай пяцігодкі павялічыўся ў чатыры з лішнім раза і склаў у 1932 годзе 126 904 тысячы рублёў.

Урад Савецкага Саюза аказваў Мінску пастаянную дапамогу ў развіцці дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю. Гандлюючыя арганізацыі атрымлівалі з Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў баваўняныя і шарсцяныя тканіны, скураныя тавары, металічныя вырабы, з Украіны і з іншых рэспублік — цукар, селядцы, соль, газу і іншыя тавары. У кастрычніку 1927 года з Сібіры было пастаўлена 2500 пудоў сметанковага масла.

Для паляпшэння рабочага забеспячэння ў пачатку 1932 года ў Мінску было арганізавана 11 закрытых рабочых кааператываў. Ім была дадзена магчымасць рабіць пазапланавыя закупкі сельскагас-

за дзесяць месяцаў 1932 года прадаў амаль на два мільёны рублёў сельскагаспадарчых прадуктаў, нарыхтаваных звыш плана.

Абарот кааператыўнага гандлю з 1926 па 1930 год павялічыўся з 14 600 тысяч да 37 699 тысяч рублёў. Рост спажывецкай кааперацыі паслабляў пазіцыі прыватніка, садзейнічаў росту тавараабароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю. У 1930 годзе ў рабочых кааператывах налічвалася 79 143 пайшчыкі.

Разгортваўся ў Мінску і калгасны гандаль— адна з форм эканамічнай сувязі горада з вёскай. У другой палове 1932 года ў горадзе адкрыліся тры новыя калгасныя рынкі, дзе было пабудавана 85 магазінаў і ларкоў, звыш тысячы палатак і сталоў. Для арганізацыі сустрэчнага гандлю прамысловымі таварамі прадпрыемствы горада адкрывалі на калгасных рынках свае магазіны. Толькі завод «Камунар» пабудаваў і абсталяваў у 1932 годзе тры такіх магазіны. Прамысловыя прадпрыемствы Мінска павялічылі выпуск абутку, адзення, галантарэйных тавараў, кандытарскіх вырабаў.

Аднак у гэты перыяд працоўныя адчувалі яшчэ немалыя матэрыяльныя цяжкасці. Па меры росту гарадоў і гарадскога насельніцтва павялічваўся попыт на хлеб і іншыя прадукты харчавання. Адсталая сельская гаспадарка не магла задаволіць растучыя патрэбы гарадскога насельніцтва.

РАЗДЗЕЛ XVI

МІНСК У ПЕРЫЯД ПЕРАМОГІ САЦЫЯЛІЗМА (1933—1937 гады)

1. Развіццё прамысловасці

Паспяхова выканаўшы першы пяцігадовы план, працоўныя Мінска з вялікім энтузіязмам узяліся за вырашэнне задач, намечаных Камуністычнай партыяй на другое пяцігоддзе.

У лютым 1932 года сход партыйнага актыву Мінска, прысвечаны вынікам XVII канферэнцыі ВКП(б), абмеркаваў задачы гарадской партыйнай арганізацыі па завяршэнню рэканструкцыі народнай гаспадаркі і далейшаму развіццю прамысловасці. Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі горада прарабілі вялікую работу па растлумачэнню задач другога пяцігадовага плана, па мабілізацыі насельніцтва Мінска на паспяховае выкананне вытворчых планаў. На заводах імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і «Бальшавік», на фабрыках імя Тэльмана, «Усход» і іншых прадпрыемствах адбыліся вытворчыя канферэнцыі, на якіх былі абмеркаваны задачы калектываў прадпрыемстваў па павелічэнню выпуску і паляпшэнню якасці прадукцыі.

Вялікая ўвага ўдзялялася распаўсюджанню вопыту калектываў перадавых прадпрыемстваў, наватараў вытворчасці Мінска, іншых гарадоў рэспублікі і Савецкага Саюза. Вялікую ролю адыгралі, у прыватнасці, сустрэчы стаханаўцаў Мінска з перадавікамі спаборніцтва Гомеля і Віцебска, з вынаходнікамі і рацыяналізатарамі Горкаўскай вобласці.

Многа было зроблена па тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасці горада, па асваенню новай тэхнікі і выпуску новых відаў прадукцыі. Карэнным чынам былі рэканструяваны станкабудаўнічыя заводы, абутковая фабрыка,

швейная фабрыка «Кастрычнік» і многія іншыя прадпрыемствы. Узніклі і новыя прадпрыемствы розных галін прамысловасці. Асабліва хутка развівалася машынабудаванне і станкабудаванне. Станкабудаўнічыя заводы імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і імя Кірава пасля рэарганізацыі і рэканструкцыі сталі прадпрыемствамі агульнасаюзнага значэння.

Завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1933 годзе выпускаў свідравальныя станкі, элеватарныя палотны і ланцугі для торфапрадпрыемстваў, брыкетныя прэсы. У 1934 годзе завод упершыню ў Савецкім Саюзе вырабіў пяць багераў. Выкарыстанне багераў давала магчымасць прыкметна павялічыць узровень механізацыі і прадукцыйнасць працы па здабычы торфу.

У перыяд другой пяцігодкі калектыў завода асвоіў выпуск новых станкоў. У якасці кансультанта па выпуску падоўжна-стругальнага станка быў запрошан амерыканскі спецыяліст. Азнаёміўшыся з абсталяваннем і маладымі кадрамі рабочых, ён заявіў, што завод не зможа наладзіць серыйны выпуск гэтага станка ў прадугледжаны кароткі тэрмін. Аднак калектыў завода асвоіў вытворчасць не толькі падоўжна-стругальнага, але і радыяльна-свідравальнага, аднакалонна-стругальнага і іншых навейшых тыпаў станкоў.

На заводзе імя Кірава ў пачатку другой пяцігодкі была наладжана вытворчасць цэнтравальных, нажовачных і працяжных станкоў, якія раней увозіліся з-за мяжы. У 1934 годзе было выпушчана тры тыпы станкоў на суму 589 тысяч рублёў, у 1936 годзе — сем тыпаў станкоў на 3616 тысяч рублёў. Планам 1937 года прадугледжвалася выпусціць 10 тыпаў станкоў агульнай вартасцю 5750 тысяч рублёў.

Значна павялічыўся выпуск і палепшылася якасць прадукцыі на швейнай фабрыцы «Кастрычнік» — буйнейшым у той час прадпрыемстве Мінска. У 1936 годзе, напрыклад, было выпушчана швейных вырабаў на 100 тысяч адзінак больш, чым у 1935 годзе. У канцы пяцігодкі на фабрыцы быў пабудаван і здадзен у эксплуатацыю цэх па вытворчасці галантарэі. У ім працавала 600 рабочых.

Рэканструкцыя і перавод прамысловых прадпрыемстваў Мінска на новую тэхнічную аснову суправаджаліся рэзкім павелічэннем выпуску прадукцыі і ростам прадукцыйнасці працы. Аб'яднанне шчотачнай і шчаціннай фабрык, устанаўленне новых аўтаматычных машын дазволілі павялічыць гадавы аб'ём вытворчасці на 3,5 мільёна рублёў, або на 30,9 працэнта. На галантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава вытворчасць прадукцыі ўзрасла з 1933 па 1940 год амаль у тры разы.

За гады другой пяцігодкі ў Мінску было пабудавана звыш 30 новых прадпрыемстваў. У 1934 годзе ўступіла ў строй магутная для

таго часу цеплаэлектрастанцыя (6400 кілават). Былі здадзены ў эксплуатацыю азбестава-бетонны і клінкерны заводы, электрарамонтны завод, першая ў рэспубліцы фабрыка механізаванага падліку і іншыя прадпрыемствы.

У выніку будаўніцтва новых і рэканструкцыі існуючых прадпрыемстваў адбылося аднаўленне асноўнага капіталу прамысловасці БССР. Так, у студзені 1934 года ўдзельная вага новых і рэканструяваных прадпрыемстваў ва ўсёй прамысловай прадукцыі рэспублікі склала 82,7 працэнта. Аднак, нягледзячы на тэхнічнае пераўзбраенне, многія фабрыкі і заводы працавалі нездавальняюча, выпускалі прадукцыі менш тэхнічных магчымасцей і нізкай якасці.

Рабоце прамысловасці рэспублікі быў прысвечан VII аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які адбыўся ў ліпені 1933 года. Пленум адзначыў, што асноўнымі прычынамі невыканання планаў з'яўляюцца недастатковае выкарыстанне магчымасцей узросшай тэхнічнай магутнасці прадпрыемстваў і нізкая прадукцыйнасць працы. За гады першай пяцігодкі ў прамысловасць з вёскі прыйшло многа новых рабочых, якія не мелі вытворчага вопыту. Частка з іх не авалодала станкамі, абсталяваннем і не выконвала вытворчых заданняў.

Таму авалоданне тэхнікай і павышэнне культурнага ўзроўню рабочых мелі вельмі вялікае значэнне для выканання ўсіх заданняў другой пяцігодкі. У рэзалюцыі ліпеньскага пленума падкрэслівалася неабходнасць «арганізаваць на ўсіх прадпрыемствах масавае вывучэнне рабочымі як працэсаў вытворчасці, так і дагляд за механізмамі — праз гурткі, навучальныя групы, курсы...» Гэтаму пытанню больш увагі аддавалася і на XIV з'ездзе КП(б)Б, які адбыўся ў студзені 1934 года. У яго рашэнні адзначалася, што задача «асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцей... з'яўляецца асноўнай і рашаючай у рабоце прамысловасці».

Дзякуючы мэтанакіраванай працы партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый рух за тэхнічную пісьменнасць рабочых ужо ў 1934 годзе стаў масавым. На фабрыках і заводах ствараліся таварыствы «За авалоданне тэхнікай» (ЗАТ).

У разгортванні масавага руху рабочых за авалоданне тэхнікай вялікую мабілізуючую ролю адыгралі Усебеларускі злёт ударнікаў якасці і герояў авалодання тэхнікай (лістапад 1933 года), канферэнцыі выдатнікаў тэхнічнай вучобы лёгкай і цяжкай прамысловасці (1934 год), конкурс на прадпрыемства суцэльнай тэхнічнай пісьменнасці, аб'яўлены ЦСПСБ і газетай «Рабочий» у сакавіку 1935 года.

У авангардзе барацьбы за авалоданне тэхнічнымі ведамі ішлі рабочыя Мінска. На прадпрыемствах горада ствараліся гурткі тэхнічнай вучобы, вытворча-тэхнічныя курсы для маладых рабочых, тэхнічныя кабінеты, у якіх інжынерна-тэхнічныя работнікі рэгулярна пра-

водзілі заняткі і кансультацыі з рабочымі. У тэхнічным кабінеце і непасрэдна ў цэхах швейнай фабрыкі імя Крупскай у пачатку 1934 года навучаліся 852 чалавекі. На станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў тым жа годзе тэхнічны мінімум на «добра» і «выдатна» здалі 560 рабочых. На гарбарным заводзе «Бальшавік» тэхнічнай вучобай былі ахоплены 411 рабочых. На швейнай фабрыцы «Кастрычнік» навучалася 700 чалавек.

На станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, гарбарным заводзе «Бальшавік», заводзе ланцугоў Галя, Мінскай электрастанцыі і Мінскім мясакамбінаце тэхнічныя экзамены здалі ўсе вытворчыя рабочыя. Добрых вынікаў у вытворча-тэхнічным навучанні дасягнулі калектывы завода імя Мяснікова, гарбарна-галантарэйнай фабрыкі імя Куйбышава, кандытарскай фабрыкі «Камунарка» і іншых прадпрыемстваў горада.

Так, на заводзе «Бальшавік» у 1935 годзе дзейнічалі дзевяць гурткоў, у якіх рабочыя вывучалі станкі, абсталяванне, тэхналогію гарбарнай вытворчасці, асновы планавання. Лепшыя спецыялісты дапамагалі маладым рабочым у асваенні вытворчых працэсаў. 28 рабочых-значкістаў ЗАТ узялі шэфства і падрыхтавалі да здачы дзяржаўных тэхнічных экзаменаў 57 маладых рабочых.

Завод адзін з першых у БССР стаў прадпрыемствам поўнай тэхнічнай пісьменнасці. Дзякуючы павышэнню культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых несупынна ўзрастала прадукцыйнасць працы, паляпшалася якасць прадукцыі. Прадпрыемства з году ў год перавыконвала вытворчую праграму, неаднаразова перамагала ў спаборніцтвах.

Вялікіх вынікаў у выкананні прамфінплана, павышэнні прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі дасягнулі таксама станкабудаўнічыя заводы імя Кірава і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, швейная фабрыка «Кастрычнік» і іншыя прадпрыемствы, якія ўмела арганізавалі тэхнічную вучобу рабочых. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў Мінска заўсёды выкарыстоўвалі вопыт іншых гарадоў у арганізацыі вытворча-тэхнічнай вучобы працоўных. Так, у якасці аднаго з дакладчыкаў на Усебеларускую нараду гаспадарчых, прафсаюзных і партыйных работнікаў (май 1935 года) быў запрошан прадстаўнік аднаго з буйных маскоўскіх заводаў. З новымі дасягненнямі навукі і тэхнікі інжынерна-тэхнічных работнікаў, стаханаўцаў, вынаходнікаў і рацыяналізатараў Мінска знаёмілі акадэмік Лазараў, прафесары Лаўроў, Залескі, Радчанка, Цішэўскі, Чарноў і іншыя вядомыя інжынерна-тэхнічныя і навуковыя супрацоўнікі Масквы і Ленінграда. У час месячніка тэхнікі, які праходзіў у Мінску з 1 кастрычніка да 1 лістапада 1935 года, яны прачыталі 48 лекцый і дакладаў.

Па меры авалодання асноўнай масай рабочых тэхнікай і тэхналогіяй вытворчасці значна менш затрачвалася працы і часу на выраб адзінкі прадукцыі. На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, прыклад, камсамольска-маладзёжная брыгада С. Давідзюка павялічыла выпуск свідравальных станкоў з сямі да 15—20 за месяц. У брыгадзе зборшчыкаў токарных станкоў, якую ўзначальваў Райкес, на зборцы 10 станкоў за месяц колькасць рабочых скарацілася з 22 да 15.

Пасля снежаньскага (1935 года) Пленума ЦК ВКП(б), які ўказаў на неабходнасць «зрабіць навучанне тэхмінімуму ўсеагульным і абавязковым для ўсіх рабочых і работніц, падпарадкаваўшы гэту важную справу задачы ўзрыму культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа», сістэма тэхнічнай падрыхтоўкі прамысловых рабочых Мінска была перабудавана. Замест тэхнічных гурткоў на прадпрыемствах арганізавалі курсы I і II ступені для рабочых і курсы майстроў сацыялістычнай працы для стаханаўцаў.

Рост культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых горада суправаджаўся развіццём іх творчай ініцыятывы, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Авалодаўшыя тэхнікай рабочыя бралі больш высокія абавязацельствы па выкананню вытворчых заданняў. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў Мінска выступілі ініцыятарамі спаборніцтва за датэрміновае выкананне плана першага года другой пяцігодкі. На злёце ўдарнікаў якасці і авалодання новай тэхнікай рабочыя заводаў «Камунар», імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, фабрыкі «Кастрычнік» унеслі прапанову распачаць вытворчы паход за выкананне заданняў 1933 года ўсімі прадпрыемствамі рэспублікі, за аказанне дапамогі адстаючым фабрыкам і заводам.

Гэты пачын атрымаў шырокае распаўсюджанне. Заключаліся дагаворы паміж роднаснымі прадпрыемствамі, паміж цэхамі, брыгадамі, паасобнымі рабочымі.

На прадпрыемствах Мінска выкарыстоўваліся такія формы сацыялістычнага спаборніцтва, як гаспадарча-разліковыя брыгады, брыгадна-зменнае і сустрэчнае планаванне. У студзені 1935 года толькі на дзевяці прамысловых прадпрыемствах, якія налічвалі 6616 рабочых, у спаборніцтве прымалі ўдзел 5170 чалавек. На швейнай фабрыцы «Кастрычнік» ініцыятарамі спаборніцтва выступілі камсамольцы. Іх падтрымала большасць рабочых. На 1 студзеня 1935 года з 1615 рабочых фабрыкі ў спаборніцтве прынялі ўдзел 1562 чалавекі. Усе камсамольцы працавалі без браку.

Выконваючы рашэнні XVII з'езду ВКП (б) аб паляпшэнні якасці выпускаемай прадукцыі, калектывы фабрык «8 Сакавіка», імя Крупскай, «Кастрычнік» прапанавалі правесці ўсесаюзны конкурс прадпрыемстваў швейнай прамысловасці на лепшую фабрычную марку

і выклікалі на спаборніцтва прадпрыемствы ўкраінскага швейтрэста.

У жніўні 1935 года быў заключан дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва паміж калектывамі швейных фабрык Ленінграда і Беларусі. Фабрыка «Кастрычнік» спаборнічала з ленінградскай фабрыкай «Бальшавік», фабрыка імя Крупскай — з фабрыкай «Чырвоная работніца», фабрыка «8 Сакавіка» — з фабрыкай «Камсамолка».

У ходзе сацыялістычнага спаборніцтва раскрываліся лепшыя рысы рабочых — таварыская падтрымка, узаемадапамога, адказнасць за выкананне плана ўсім калектывам. Ударнікі дапамагалі адстаючым рабочым, перадавыя брыгады і заводы — адстаючым калектывам. Завод «Камунар», напрыклад, накіраваў на адстаючы завод ланцугоў Галя брыгаду майстроў і рабочых. Шэфы дапамаглі лепш арганізаваць вытворчыя працэсы, падзяліліся вопытам работы свайго прадпрыемства, адрамантавалі неабходны заводу ланцугоў Галя прэс. Лепшы брыгадзір хромавага цэха гарбарнага завода «Бальшавік» Д. А. Бенгіс быў накіраваны для аказання дапамогі і перадачы вопыту работы гаспадарча-разліковай брыгады на мінскую фабрыку імя Калініна, брыгадзір Мінскай шчотачнай фабрыкі Юспа перадавала вопыт работы калектыву Віцебскага шчотачнага камбіната.

У пачатку 1935 года прадстаўнікі Мінскага цагельнага завода № 1 пабывалі ў Маскве. Выкарыстанне вопыту работы маскоўскіх цагельных заводаў дазволіла ўзняць месячную прадукцыйнасць гофманскіх печаў з 500 да 750 тысяч, прэсаў — з 20 да 27—30 тысяч штук цаглін, сушыльных печаў — у два разы.

У сваю чаргу калектывы цагельных заводаў Масквы і іншых гарадоў краіны пераймалі метады работы лепшых работнікаў вытворчасці Мінскага цагельнага завода № 8.

Тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў і ўздым культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа стваралі неабходныя прадпасылкі для далейшага росту прадукцыйнасці працы. Галоўнай задачай з'яўлялася падрыхтаваць кадры, каб яны змаглі найбольш эфектыўна выкарыстаць новую тэхніку. У 1935 годзе партыя выставіла лозунг «Кадры рашаюць усё!» У адказ на заклік партыі па ўсёй краіне з яшчэ большай сілай разгарнуўся рух наватараў вытворчасці.

Вялікую ролю ў далейшым развіцці творчай ініцыятывы рабочых адыграла новая форма масавага сацыялістычнага спаборніцтва — стаханаўскі рух. У Мінску ён пачаў разгортвацца ў верасні 1935 года. Першымі ў рэспубліцы перайшлі на стаханаўскія метады працы перадавыя рабочыя А. Хаткоўскі, І. Лапін, С. Шаболтас, М. Паўлоўскі, Г. Скобла, З. Скобла і інш. У сярэдзіне кастрычніка стаханаўскі рух ахапіў амаль усе прадпрыемствы.

Па рашэнню Мінскага гарадскога камітэта КП(б)Б пытанне аб разгортванні стаханаўскага руху было абмеркавана на нарадах партыйных камітэтаў, вытворчых канферэнцыях і агульных сходах рабочых. Адбыліся раённыя злёты стаханаўцаў. Шэрагі стаханаўцаў хутка раслі. На 10 студзеня 1936 года на 50 улічаных прадпрыемствах Мінска налічвалася 5000 стаханаўцаў, а ў сярэдзіне снежня таго ж года — 7829.

Поўнасцю выкарыстоўваючы магутнасць станкоў і абсталявання, кожную хвіліну рабочага часу, чотка арганізуючы працэс працы, стаханаўцы дасягнулі нябачнай прадукцыйнасці. Напрыклад, рабочы завода «Бальшавік» С. А. Запольскі ў лістападзе 1935 года апрацаваў за змену 4250 скур замест 1625 па плану. Стаханавец Г. Скобла, які працаваў на зацяжцы наскоў, выконваў зменнае заданне на 240—430 працэнтаў, што значна перавышала выраб рабочых гэтай жа спецыяльнасці на лепшых фабрыках свету. Работніца фармовачнага цэха І механічнай пякарні стаханаўка В. Н. Свірыдовіч першая ў рэспубліцы перайшла на абслугоўванне 24 печаў замест 12. У два-тры разы павялічылі выпрацоўку рабочыя завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі І. Голубеў, Г. Бракарэнка, У. Туманоўскі.

З кожным днём рух наватараў станавіўся ўсё больш масавым. Рэкорднай выпрацоўкі дасягнулі многія рабочыя. Былі створаны ўмовы для арганізацыі стаханаўскіх брыгад, змен і цэхаў. Першая ў Мінску і Беларусі стаханаўская брыгада з шасці чалавек узнікла на абутковай фабрыцы імя Калініна. Раней такі аб'ём работы выконвала брыгада з дзевяці чалавек. У кастрычніку 1935 года пачала працаваць па-стаханаўску брыгада па пашыўцы шаўковых сукенак на фабрыцы «Кастрычнік». Затым з'явіліся стаханаўскія лініі на фабрыцы «8 Сакавіка».

У студзені і лютым 1936 года на ўсіх фабрыках і заводах горада былі праведзены стаханаўскія змены, пяцідзёнкі і дэкады, якія прайшлі пад лозунгам эканоміі сыравіны і матэрыялаў, паляпшэння якасці прадукцыі, уздыму прадукцыйнасці працы. Яны падцягвалі адстаючых рабочых, павышалі вынікі працы ўсяго калектыву. Так, швейная фабрыка «Кастрычнік» выканала прамфінплан 1936 года на 114 працэнтаў. За год яе калектыў сэканоміў 8,7 тысячы метраў верхняга і 11 тысяч метраў падкладачнага матэрыялу. На фабрыцы налічвалася 250 стаханаўцаў і 150 ударнікаў. 200 стаханаўцаў рэгулярна выконвалі па дзве нормы.

Вядучую ролю ў стаханаўскім руху адыгрывалі камуністы і камсамольцы, у студзені 1936 года на вагавым заводзе «Ударнік» стаханаўцамі з'яўляліся 77,7 працэнта камуністаў і 59,2 працэнта камсамольцаў. На фабрыцы імя Куйбышава ўсе камуністы і камсамольцы былі стаханаўцамі. Газета «Звязда» 11 красавіка 1936 года паведам-

ляла: «Як правіла, камуністы не толькі ідуць у авангардзе стаханаўскага руху, але і арганізоўваюць, вучаць беспартыйных рабочых».

У лістападзе 1935 года адбылася першая ўсесаюзная нарада стаханаўцаў. Снежаньскі Пленум ЦК ВКП(б), які адбыўся неўзабаве пасля нарады, разгледзеў стан работы прамысловасці і транспарту ў сувязі з развіццём стаханаўскага руху і намеціў канкрэтныя меры па далейшаму яго разгортванню.

Падтрымка партыі ўзмацніла творчую ініцыятыву наватараў. У ліпені 1936 года разгарнулася спаборніцтва паміж Мінскам, Віцебскам і Гомелем. У студзені 1937 года сталявары Данбаса заклікалі рабочых краіны азнаменаваць 20-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі датэрміновым выкананнем гадавога плана. З такім жа заклікам да рабочых Беларусі звярнуліся калектывы мінскіх заводаў імя Кірава, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, швейнай фабрыкі «Кастрычнік», рэспубліканскі злёт ініцыятараў стаханаўскага руху, які адбыўся 10 студзеня 1937 года.

Заклікі перадавікоў спаборніцтва сустрэлі гарачую падтрымку ў рабочых усіх прадпрыемстваў беларускай сталіцы. На гарбарным заводзе «Бальшавік» уключыўся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва 421 рабочы. На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі спаборнічалі амаль усе цэхі, а на заводзе імя Кірава — цэхі, змены, пралёты.

У гады другой пяцігодкі на прадпрыемствах горада шырока разгарнуўся рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Па іх ініцыятыве праводзіліся рэспубліканскія і галіновыя конкурсы па вынаходніцтву і рацыяналізацыі, арганізоўваліся паездкі лепшых рацыяналізатараў у розныя гарады краіны для вывучэння і перадачы вопыту.

На большасці прадпрыемстваў Мінска былі створаны аддзяленні, а ў цэхах заводаў імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, імя Кірава, «Бальшавік», на швейнай фабрыцы «Кастрычнік» і іншых прадпрыемствах — ячэйкі рэспубліканскага таварыства вынаходнікаў. Яны аб'ядноўвалі вакол сябе рацыяналізатараў і вынаходнікаў, накіроўвалі іх творчую ініцыятыву на вырашэнне актуальных задач вытворчасці. За першае паўгоддзе 1933 года на фабрыцы «Кастрычнік» было ўнесена 203 рацыяналізатарскія прапановы. Укараненне 64 прапаноў дазволіла сэканоміць 189 136 рублёў. На заводзе «Бальшавік» за 11 месяцаў было ўнесена 260 рацыяналізатарскіх прапаноў. Рэалізацыя 102 з іх забяспечыла 50 тысяч рублёў гадавой эканоміі.

У 1934 годзе першынство ва ўсебеларускім конкурсе на лепшую арганізацыю вынаходніцка-рацыяналізатарскай справы заваявалі мінскія заводы імя Кірава і «Бальшавік».

На металаапрацоўчым заводзе імя Кірава дзейнічаў тэхнічны кабінет, дзе выкладчыкі політэхнічнага інстытута і інжынерна-тэхнічныя работнікі завода кансультавалі рабочых-рацыяналізатараў,

чыталі ім лекцыі. Рэгулярна праводзіліся канферэнцыі рацыяналізатараў. Прадстаўнікі заводскага калектыву вывучалі вопыт рацыяналізатараў прадпрыемстваў Масквы, Горкага, Клінцоў і іншых гарадоў краіны. У 1934 годзе калектыў завода падхапіў заклік вінцевских рацыяналізатараў аб стварэнні фонду рацыяналізацыі да 15-годдзя вызвалення Беларусі ад палякаў і выклікаў на спаборніцтва гомельскі металаапрацоўчы завод «Чырвоны пралетарый», мінскі завод ландутараў для абмену вопытам працы і падсумоўвання вынікаў спаборніцтва. На працягу 1933—1934 гадоў ад рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода імя Кірава паступіла 842 прапановы. Значную частку іх укаранілі ў вытворчасць, што дало эканомію больш 183 тысяч рублёў.

У 1936 годзе Цэнтральны савет Усесаюзнага таварыства вынаходнікаў узнагародзіў 25 беларускіх наватараў значком «Лепшаму вынаходніку». Сярод узнагароджаных былі і вынаходнікі Мінска.

Вынаходніцтвы і рацыяналізатарскія прапановы мінскіх умельцаў дазволілі значна ўзняць прадукцыйнасць працы, знізіць сабекошт і палепшыць якасць прадукцыі.

Тэхнічнае пераўзбраенне прамысловасці, замена старога абсталявання новым, высокапрадукцыйным, укараненне перадавой тэхналогіі змянялі характар працы. На многіх аперацыях ручная праца замянялася машыннай. Многія тэхнічныя нормы выпрацоўкі хутка старэлі, і рабочыя перавыконвалі іх у паўтара-два разы. Гэта прыводзіла да перавыдаткоўвання фондаў зарплаты. Па лёгкай прамысловасці рэспублікі, напрыклад, у 1934 годзе выпуск валавой прадукцыі склаў 92,7 працэнта к плану, а фонд зарплаты быў перавыдаткаваны на 2886 тысяч рублёў.

У адпаведнасці з рашэннем партыі і ўрада былі перагледжаны ўстарэлыя, тэхнічна неабгрунтаваныя нормы. У 1933 годзе толькі на 18 мінскіх прадпрыемствах гэта дало эканомію ў 500 тысяч рублёў. Пераглядаліся нормы пры актыўным удзеле пераважнай большасці рабочых. На радзе прадпрыемстваў прапаноўваліся сустрэчныя, больш высокія нормы. Стругальшчык завода «Бальшавік» камуніст С. А. Запольскі добраахвотна павялічыў норму на 23 працэнты. Услед за ім уся брыгада вырашыла апрацоўваць за змену 110 скур замест 90, прадугледжаных старой нормай. У 1934 годзе на гэтым заводзе рабочыя прапанавалі 24 сустрэчныя, больш высокія нормы. На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі брыгада камуніста К. Ланеўскага прапанавала знізіць расцэнкі на зборку свідравальнага станка з 540 да 370 рублёў.

Працоўныя Мінска ўвесь час дапамагалі вёсцы ў завяршэнні калектывізацыі, арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў.

У вёску няспынна паступала новая сельскагаспадарчая тэхніка. Хутка рос парк трактараў, камбайнаў і іншых складаных сельскагаспадарчых машын. Ствараліся дзесяткі новых МТС. Сельскія механізатары, якія не мелі ў той перыяд вопыту эксплуатацыі і рамонту машын, часта не спраўляліся з падрыхтоўкай іх да палявых работ. Акрамя таго, МТС недастаткова забяспечваліся абсталяваннем для рамонту тэхнікі, запаснымі часткамі.

У гэтых умовах вялікае значэнне набылі вытворчыя формы шэфства горада над вёскай. У студзені 1933 года калектыў завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі звярнуўся да ўсіх рабочых металаапрацоўчай прамысловасці рэспублікі з заклікам арганізаваць усебеларускае спаборніцтва за своечасовы рамонт трактараў і выпуск запасных частак. Мінскія прадпрыемствы ўзялі шэфства над Смалявіцкай і Дзяржынскай МТС, Слуцкай МТМ. Рабочыя брыгады заводаў імя Кірава, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, «Ударнік» дапамагалі работнікам МТС арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва за своечасовы і якасны рамонт сельскагаспадарчых машын, перадавалі ім перадавы вопыт арганізацыі працы. Металаапрацоўчыя прадпрыемствы Мінска наладзілі вытворчасць запасных частак для сельскагаспадарчых машын. Так, на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў пачатку пяцігодкі быў асвоен выпуск кольцаў і паршняў для трактараў, наладжана праверка каленчатых валаў.

Калектывы прадпрыемстваў горада дапамагалі таксама працоўным новастворанай аўтаномнай вобласці Бірабіджан. Кіраўцы пастаўлялі падшэфнай вобласці рознае абсталяванне і механізмы, рабочыя шчотачнай фабрыкі пералічылі ў фонд дапамогі Бірабіджану 2-часовы заработак.

Мацнелі і шырыліся інтэрнацыянальныя сувязі працоўных Мінска. У горад прыязджалі зарубежныя дэлегацыі і турысты. У жніўні 1937 года ў Мінску гасцявала група рабочых-камуністаў Парыжскага аўтазавода. Яна наведала завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, цэнтральную рабочую паліклініку, сад Палаца піянераў.

Працоўныя Мінска разам з усім савецкім народам узмацнялі барацьбу за мір ва ўсім свеце. Мінчане горача спачувалі рэспубліканскай Іспаніі. 29 верасня 1936 года адбыўся 30-тысячны мітынг у падтрымку барацьбы іспанскага народа супраць фашызму. На мітынгу адзінагалосна быў прынят зварот да ўрада рэспубліканскай Іспаніі, у якім выражана брацкая салідарнасць з іспанскім народам. Паўсюдна праводзіўся збор сродкаў у фонд дапамогі іспанскім жанчынам і дзецям. Калектывы фабрык «Камунарка» і «Кастрычнік» адлічылі ў гэты фонд адзін працэнт месячнай зарплаты, рабочыя шэрага іншых прадпрыемстваў — 4-часовы заработак.

Самаадданая любоў да Радзімы, імкненне да ўмацавання яе абароназдольнасці выражаліся ў тым, што моладзь асвойвала прафесіі, якія б маглі спатрэбіцца ў выпадку вайны. Маладыя мінчане запісваліся ў аэраклубы, займаліся парашутным, аўтамабільным і матацыклетным спортам. У 1936 годзе Мінская парашутная станцыя рыхтавала звыш 1000 парашутыстаў. У 1937 годзе ў аўтамотаклубе навучалася 1000 вадзіцеляў машын, 200 матацыклістаў.

У апошнія гады другой пяцігодкі партарганізацыі прамысловых прадпрыемстваў паслабілі ўвагу да вытворчых пытанняў. Дзелавая крытыка часта замянялася параднай шуміхай. Недахопы ў рабоце тлумачыліся звычайна шкодніцтвам паасобных людзей. Вытворчыя калектывы ў гэтых умовах не маглі выкарыстаць свае магчымасці.

Дзякуючы высокай працоўнай актыўнасці калектываў прадпрыемстваў, паўсядзённай дапамозе ЦК ВКП(б) і Савецкаму ўраду аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці горада за гады другой пяцігодкі ўзрос у 1,7, а ў параўнанні з 1913 годам — у 23,7 раза. У 1937 годзе вартасць прамысловай прадукцыі горада складала 340 602 тысячы рублёў. Адна гарбарна-галантарэйная фабрыка імя Куйбышава ў 1937 годзе выпускала прадукцыі больш, чым уся гарбарная, абутковая і футравая прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі. Прадукцыйнасць працы ў буйной прамысловасці Мінска ўзрасла за гады пяцігодкі ў паўтара, а ў параўнанні з 1913 годам — у 3,3 раза.

Няўхільнае ажыццяўленне за гады другой пяцігодкі расшыранага сацыялістычнага ўзнаўлення дазволіла павялічыць асноўныя вытворчыя фонды буйной прамысловасці Мінска і вобласці, якія складалі ў 1932 годзе 73 мільёны рублёў. Прамысловасцю была асвоена вытворчасць многіх новых відаў прадукцыі: складаных металарэзных станкоў, дахавага жалеза, высакаякаснага лаку і інш. Расшырылася вытворчасць і палепшылася якасць прадукцыі лёгкай і харчовай прамысловасці.

У выніку самаадданай працы рабочых большасць прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку заводы імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, імя Кірава, «Бальшавік», датэрмінова выканалі план 1937 года. Датэрмінова, за чатыры гады і тры месяцы беларускі народ выканаў другую пяцігодку. Рэканструкцыя прамысловасці і калектывізацыя сельскай гаспадаркі, ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі карэнным чынам змянілі эканоміку і класавую структуру. Яны сведчылі аб тым, што будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне ў асноўным завершана. У дасягненне гэтай сусветна-гістарычнай перамогі савецкага народа вялікі ўклад унеслі і працоўныя сталіцы Савецкай Беларусі.

2. Прыняцце новай Канстытуцыі Саюза ССР і Канстытуцыі БССР. Выбары ў Вярхоўны Савет СССР

Карэнныя пераўтварэнні ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці, якія выкліканы былі перамогай сацыялізма, абумовілі неабходнасць змянення асноўнага закону краіны. Новая Канстытуцыя СССР павінна была заканадаўча замацаваць асновы перамогшага сацыялізма, умацаванне сацыяльнай базы дыктатуры рабочага класа, унесці змены ў дзяржаўны лад СССР.

Лютаўскі (1935 года) Пленум ЦК ВКП(б) унёс на разгляд VII Усесаюзнага з'езду Саветаў прапановы аб унясенні змен у Канстытуцыю СССР у напрамку далейшай дэмакратызацыі выбарчай сістэмы, замены не зусім роўных выбараў роўнымі, шматступенных — прамымі, адкрытых — закрытымі, удакладнення сацыяльна-эканамічнай асновы Канстытуцыі.

VII Усесаюзны з'езд Саветаў, які адбыўся ў лютым 1935 года, адобрыў прапановы Пленума ЦК ВКП(б), прыняў рашэнне аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю СССР, упаўнаважыў ЦВК Саюза ССР выбраць камісію для выпрацоўкі праекта Канстытуцыі. Першая сесія ЦВК СССР сёмага склікання выбрала Канстытуцыйную камісію. Ад Беларускай ССР у яе склад увайшлі Старшыня ЦВК БССР А. Г. Чарвякоў і Старшыня СНК рэспублікі Н. М. Галадзед.

Распрацаваны Канстытуцыйнай камісіяй ЦВК СССР праект Канстытуцыі 1 чэрвеня 1936 года быў адобраны Пленумам ЦК ВКП(б), 11 чэрвеня Прэзідыумам ЦВК СССР і 12 чэрвеня змешчан у друку для ўсенароднага абмеркавання.

Мінчане, як і ўсе працоўныя краіны, з вялікім энтузіязмам сустрэлі праект новай Канстытуцыі СССР і прынялі актыўны ўдзел у яго абмеркаванні.

Ён быў адобран агульнымі сходамі калектываў рабочых і служачых усіх прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў горада.

Пленум Мінскага гарадскога Савета ў прынятым ім рашэнні адзначаў, што аднадушна адобраны працоўнымі сталіцы БССР праект Канстытуцыі яркім агнём асвятляе вялікія дасягненні сацыялізма і адкрывае новую старонку ў гісторыі развіцця чалавецтва. Пленум гарадскога Савета запэўніў ЦК ВКП(б), што працоўныя Мінска, як ніколі з'яднаныя вакол Камуністычнай партыі, дасягнуць яшчэ большых поспехаў у барацьбе за камунізм.

У ходзе абмеркавання праекта Канстытуцыі ў горадзе праводзілася вялікая прапагандысцкая і агітацыйна-масавая работа. У ліпені 1936 года Мінскі гарком КП(б)Б правёў нараду агітатараў і прапагандыстаў, на якой прысутнічала больш 300 чалавек. З ін-

струкцыйным дакладам выступіў Старшыня ЦВК БССР А. Г. Чарвякоў.

Пасля глыбокага вывучэння і ўсебаковага абмеркавання праекта Канстытуцыі рабочыя, служачыя, навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты вышэйшых навучальных устаноў прапанавалі ўнесці ў яго рад дапаўненняў і паправак.

Партыйны і савецкі актыў Мінска аказаў вялікую дапамогу мясцовым партыйным арганізацыям у правядзенні абмеркавання праекта Канстытуцыі ў сельскай мясцовасці. З гэтай мэтай у раёны рэспублікі былі накіраваны 136 кіруючых партыйных, савецкіх і прафсаюзных работнікаў. У чэрвені 1936 года група агітатараў Мінска зрабіла агітацыйны рэйс у 65 раёнаў рэспублікі. За час рэйса яны прачыталі для калгаснікаў і рабочых многа дакладаў, аказалі практычную дапамогу партыйным арганізацыям у паляпшэнні палітычнай работы сярод працоўных.

У кастрычніку 1936 года 50 дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета выязджалі ў раёны рэспублікі і аказалі істотную дапамогу ў арганізацыі абмеркавання праекта Канстытуцыі СССР і правядзенні раённых з'ездаў Саветаў.

У часе ўсенароднага абмеркавання праекта Канстытуцыі СССР працоўныя Мінска ўнеслі шмат прапаноў, накіраваных на паляпшэнне работы гарадскога Савета, устаноў і ведамстваў. Праходзіўшыя ў гэты перыяд выбары ў мясцовыя Саветы садзейнічалі далейшаму ўмацаванню органаў улады, расшырэнню іх сувязей з масамі.

20 лістапада 1936 года ў Мінску адкрыўся Надзвычайны XII Усебеларускі з'езд Саветаў. На ім былі падведзены вынікі абмеркавання праекта Канстытуцыі СССР у рэспубліцы. З дакладам аб праекце новай Канстытуцыі выступіў А. Г. Чарвякоў. У аднагалосна прынятай пастанове адзначалася, што «Надзвычайны XII Усебеларускі з'езд Саветаў усебакова абмеркаваў праект Канстытуцыі СССР і цалкам і поўнасцю яго адобрае».

Па няпоўных звестках, у Беларускай ССР у абмеркаванні праекта новай Канстытуцыі, якое цягнулася пяць з паловай месяцаў, прыняло ўдзел больш трох мільёнаў чалавек. К праекту Канстытуцыі было ўнесена 8826 дапаўненняў і прапаноў.

На агульным сходзе рабочых і служачых завода імя Кірава, прысвечаным абмеркаванню праекта Канстытуцыі, было прынята абавязацельства выканаць гадавы план да адкрыцця VIII Усесаюзнага з'езду Саветаў. У рэзалюцыі сходу адзначалася: «Новая Канстытуцыя натхняе нас на яшчэ большы ўздым стаханаўскага руху, на паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі».

У чэрвені 1936 года паміж трыма прамысловымі цэнтрамі Беларусі — Мінскам, Гомелем і Віцебскам разгарнулася спаборніцтва за

датэрміновае выкананне гадавых вытворчых планаў да дня адкрыцця Надзвычайнага VIII з'езду Саветаў.

Творчая ініцыятыва працоўных мас нараджала новыя формы барацьбы за павышэнне прадукцыйнасці працы, за паскарэнне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Няспынна павялічвалася колькасць стаханаўцаў, якія дасягнулі рэкорднай выпрацоўкі. Работніца швейнай фабрыкі «Кастрычнік» Гапоненка выканала месячную вытворчую норму на 232, Коцікава — на 225, рабочыя хімфармзавода Краско і Ляшчынская — на 200, рабочыя шклозавода «Пралетарый» Шостак і Чэрнак — на 123—130 працэнтаў. Агульная колькасць стаханаўцаў на прамысловых прадпрыемствах Мінска павялічылася на 2090 чалавек.

25 лістапада 1936 года ў Маскве адкрыўся Надзвычайны VIII Усесаюзны з'езд Саветаў. У гэты дзень калектывы многіх прамысловых прадпрыемстваў Мінска рапартавалі аб паспяховым выкананні сацыялістычных абавязацельстваў. Фабрыка імя Куйбышава выканала гадавы план на 129, завод «Пралетарый» — на 102, малочны завод — на 146 працэнтаў. Перавыканалі вытворчыя планы таксама калектывы хімфармзавода, завода «Ударнік», абутковай фабрыкі, завода імя Кірава і многіх іншых прадпрыемстваў горада.

У дзень адкрыцця з'езду 480 маладых рабочых фабрыкі імя Крупскай, 304 рабочых абутковай фабрыкі сталі на ўдарную вахту. У гэты дзень многія стаханаўцы дасягнулі выключна высокай прадукцыйнасці працы. Работніца фабрыкі імя Куйбышава Сонкіна выканала зменную норму на 300, а Макарэвіч — на 254 працэнты. Рабочыя закройнага цэха абутковай фабрыкі выканалі зменнае заданне на 140 працэнтаў. Першы пашывачны цэх фабрыкі выдаў 2088 пар загатовак замест 1700 па заданню.

5 снежня 1936 года Надзвычайны VIII Усесаюзны з'езд Саветаў аднадушна зацвердзіў новую Канстытуцыю СССР. Пасля апублікавання тэксту новай Канстытуцыі, 6 снежня 1936 года, у Мінску адбылася дэманстрацыя працоўных, у якой прынялі ўдзел звыш 70 тысяч чалавек. Гэта было вялікае народнае свята. На ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах горада адбыліся агульныя партыйныя і прафсаюзныя сходы, прысвечаныя вынікам VIII з'езду Саветаў.

З вялікім захапленнем слухалі мінчане расказы дэлегатаў Надзвычайнага VIII Усесаюзнага з'езду Саветаў. На шматлікіх сходах працоўных горада выступалі Н. Ф. Гікала, А. Г. Чарвякоў, Н. М. Галадзед, рабочы Мінскай абутковай фабрыкі Г. Н. Скабло, прафесар М. Ф. Ярмоленка, народныя паэты Я. Купала, Я. Колас, начальнік дэпо станцыі Мінск Досін і інш.

Партыйныя арганізацыі Мінска ўмела ўзначальвалі агітацыйна-прапагандысцкую работу, вывучэнне новай Канстытуцыі СССР.

«Уся агітацыйна-палітычная работа ў нашым раёне,— пісаў сакратар Кастрычніцкага райкома КП(б)Б Мінска А. Варончанка,— была накіравана на тое, каб дапамагчы кожнаму працоўнаму добра вывучыць і ўсвядоміць правы і абавязкі грамадзяніна СССР, кожны радок, кожнае слова новай Канстытуцыі, прасякнутай клопатамі аб савецкім чалавеку».

Палітычная работа, якую праводзілі партыйныя арганізацыі, садзейнічала яшчэ большаму развіццю сацыялістычнага спаборніцтва, творчай ініцыятывы працоўных. Калектывы фабрык і заводаў узялі дадатковыя абавязацельствы па звышпланаваму выпуску прадукцыі. Рабочыя абутковай фабрыкі, напрыклад, абавязаліся даць сверх прадукцыі звыш плана на 100 тысяч рублёў.

Новая Канстытуцыя СССР патрабавала прывесці ў адпаведнасць з ёю канстытуцыі саюзных рэспублік. Праект Канстытуцыі БССР быў папярэдне разгледжан і адобран Прэзідыумам ЦВК БССР і 31 студзеня 1937 года апублікаван у рэспубліканскім друку.

Працоўныя Мінска прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні праекта Канстытуцыі сваёй рэспублікі. Секцыі і дэпутацкія групы гарадскога Савета з 1 па 10 лютага 1937 года наладзілі абмеркаванне праекта Канстытуцыі БССР сярод усіх пластоў насельніцтва Мінска.

15 лютага 1937 года Надзвычайны XII Усебеларускі з'езд Саветаў аднавіў сваю работу. З дакладам аб праекце Канстытуцыі БССР выступіў старшыня Канстытуцыйнай камісіі Н. М. Галадзед. 19 лютага з'езд зацвердзіў тэкст новай Канстытуцыі БССР, якая заканадаўча замацавала асновы і прынцыпы сацыялістычнага грамадства, выпрацаваныя і склаўшыяся ў выніку перамогі сацыялізма ў СССР. Канстытуцыя БССР адлюстравала багаты творчы вопыт, накоплены беларускім народам у ходзе будаўніцтва сацыялістычных форм грамадскага і дзяржаўнага жыцця.

На аснове Канстытуцыі СССР было распрацавана Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Савет Саюза ССР. Пастановай ЦВК СССР выбары ў Вярхоўны Савет Саюза ССР былі намечаны на 12 снежня 1937 года.

Працоўныя Мінска з вялікім натхненнем сустрэлі паведамленне аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Удзельнікі агульнагарадскога мітынгу, на якім прысутнічала больш 70 тысяч чалавек, выразілі пачуццё гонару за сваю Радзіму, бязмежнай адданасці Камуністычнай партыі.

Падрыхтоўцы да выбараў былі прысвечаны пасяджэнні бюро Мінскага гаркома і райкомаў КП(б)Б, прэзідыума гарадскога Савета, нарады секцый і дэпутацкіх груп.

На прадпрыемствах, ва ўстановах, навучальных установах і домакіраўніцтвах складваліся гурткі па вывучэнню Палажэння аб выба-

рах. Па няпоўных звестках, толькі ва ўстановах і пры домакіраўніцтвах Мінска было створана 850 гурткоў, у якіх навучалася больш 25 тысяч выбаршчыкаў.

Для падрыхтоўкі прапагандыстаў пры Мінскім гаркоме КП(б)Б у верасні 1937 года былі арганізаваны трохмесячныя курсы.

Цэнтрамі падрыхтоўкі да выбараў сталі выбарчыя ўчасткі (у Мінску іх было 102). На кожным участку быў створан агітпункт. У агітацыйнай рабоце шырока выкарыстоўваліся лекцыі і даклады, групавыя і індывідуальныя гутаркі на вытворчых участках, на кватэрах рабочых і служачых. Так, напрыклад, гутаркамі аб новым выбарчым законе было ахоплена больш 240 хатніх гаспадынь, якія пражывалі на тэрыторыі выбарчага ўчастка № 61. Выбаршчыкі з вялікай зацікаўленасцю адносіліся да гутарак агітатараў. Агітатар Стрэльніцкая ў паведамленні Мінскаму гаркому КП(б)Б пісала: «Хатнія гаспадыні чакаюць заняткаў з вялікай нецярплівасцю. Мяне, агітатара, сустракаюць як родную».

Партыйныя арганізацыі Мінска аддалі многа ўвагі стварэнню выбарчых камісій, падбору давераных асоб. Ва ўчастковыя выбарчыя камісіі калектывы рабочых і служачых, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі вылучылі больш 700 прадстаўнікоў.

Мінскі гарком КП(б)Б, партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў і ўстаноў горада актыўна ўдзельнічалі ў агітацыйнай рабоце ў сельскай мясцовасці рэспублікі. Гэту важную справу даручылі лепшым работнікам вытворчасці, дэпутатам гарадскога Савета, партыйнаму, прафсаюзнаму і камсамольскаму актыву.

Пад знакам высокай палітычнай актыўнасці, умацавання блока камуністаў і беспартыйных праходзілі перадвыбарчыя сходы па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР.

Агульныя сходы калектываў фабрык імя Куйбышава, «8 Сакавіка», імя Крупскай, імя Фрунзе, заводаў «Бальшавік», «Чырвоная зара», «Ударнік», паравознага дэпо, трамвайнага парка, навуковых супрацоўнікаў АН БССР, студэнтаў, выкладчыкаў, служачых устаноў Мінска, радавога і камандназа саставу часцей Мінскага гарнізона аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР К. Я. Варашылава — Народнага Камісара абароны СССР, Маршала Савецкага Саюза. Кандыдатам у дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР быў вылучан У. Р. Ванееў[1] — старшыня Мінскага гарадскога Савета.

[1] Уладзімір Рыгоравіч Ванееў нарадзіўся ў 1896 годзе ў сям'і селяніна Вяцкай губерні. Уступіў у Камуністычную партыю ў 1918 годзе. Да 1922 года служыў у арміі, а пасля дэмабілізацыі знаходзіўся на савецкай рабоце. У 1930—1932 гадах — старшыня Вяцкага гарадскога Савета, затым — начальнік палітаддзела зернесаўгаса ў Заходне-Сібірскім краі. Пасля заканчэння Пра-

Пасля рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР агіткалектывы і давераныя асобы разгарнулі сярод выбаршчыкаў агітацыю за абранне іх у вярхоўны орган улады краіны.

Побач з палітычнай работай у масах партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі Мінска правялі рад арганізацыйных мераприемстваў, аператыўна ліквідавалі недахопы ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Савет.

Рост палітычнай актыўнасці працоўных Мінска спалучаўся з вялікім вытворчым уздымам. Калектывы заводаў імя Кірава і «Ударнік», напрыклад, 1 снежня 1937 года выканалі гадавы прамфінплан.

Вялікую ролю ва ўздыме вытворчай і палітычнай актыўнасці працоўных мас адыграла адозва Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Да ўсіх выбаршчыкаў, рабочых, работніц, сялян і сялянак, да Чырвонай Арміі, да савецкай інтэлігенцыі», апублікаваная 7 снежня 1937 года. У адозве падкрэслівалася, што Камуністычная партыя не адмяжоўваецца ад беспартыйных, а наадварот, ідзе на выбары ў блоку з беспартыйнымі.

Працоўныя Мінска з вялікім адабрэннем сустрэлі адозву ЦК ВКП (б). У аднагалосна прынятай 9 снежня рэзалюцыі агульнага сходу рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода імя Кірава адзначалася: «Бальшавіцкая партыя можа ўпэўнена разлічваць на тое, што мы ўсе як адзін падтрымаем кандыдатуры ў дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР, вылучаныя блокам камуністаў і беспартыйных». На шматлікіх сходах і мітынгах працоўныя Мінска заяўлялі, што на выбарах у Вярхоўны Савет СССР будуць галасаваць за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных, за палітыку Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, за пабудову сацыялізма.

7 снежня 1937 года на стадыёне «Дынама» адбыўся 120-тысячны перадвыбарчы мітынг працоўных горада, на якім выступілі кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР. Ад імя выбаршчыкаў на мітынгу слова ўзялі стаханаўка завода «Бальшавік» Хвашчэўская, чырвонаармеец Завараў і інш. Іх выступленні былі прасякнуты гарачай любоўю да сваёй Радзімы, бязмежнай адданасцю справе Камуністычнай партыі.

Выбары ў Вярхоўны Савет Саюза ССР 12 снежня 1937 года прайшлі як незабыўнае народнае свята. Працоўныя Мінска разам з усім беларускім народам праявілі вялікую палітычную свядомасць і актыўнасць. У галасаванні прынялі ўдзел 99,6 працэнта выбаршчыкаў

мысловай акадэміі камандзіраваны ЦК ВКП(б) у БССР. У кастрычніку 1937 года абраны старшынёй Мінскага гарадскога Савета. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджан ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Загінуў на фронце. Іменем У. Р. Ванеева названа адна з вуліц Мінска.

горада. На мінскай гарадской выбарчай акрузе дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР былі аднадушна абраны К. Я. Варашылаў і У. Р. Ванееў.

Выбары ў Вярхоўны Савет СССР у Мінску, як і ва ўсіх гарадах і вёсках Беларусі, выліліся ў яскравую дэманстрацыю згуртаванасці працоўных рэспублікі вакол Камуністычнай партыі. Блок камуністаў і беспартыйных атрымаў на выбарах бліскучую перамогу.

3. Развіццё гарадской гаспадаркі. Матэрыяльны дабрабыт гараджан

За гады першай пяцігодкі насельніцтва Мінска значна ўзрасло: на 1 студзеня 1934 года ў ім пражывала 180 870 чалавек. У прамысловасці было занята 20 786, на будаўніцтве — 9757, на чыгуначным транспарце — 7437, усіх рабочых і служачых — 66 326 чалавек. Перад горадам як сталіцай БССР, прамысловым і культурным цэнтрам адчыняліся вялікія перспектывы хуткага росту. Ужо ў гэтыя гады наспела неабходнасць у новай планіроўцы горада.

7 снежня 1933 года Прэзідыум ЦВК СССР у пастанове аб рабоце Мінскага гарадскога Савета адзначыў, што развіццё камунальнай гаспадаркі і жыллёвага будаўніцтва адстае ад тэмпаў росту насельніцтва і культурна-бытавых запатрабаванняў працоўных. Прэзідыум ЦВК прапанаваў гарадскому Савету сканцэнтраваць асноўную ўвагу на добраўпарадкаванні горада, правільнай эксплуатацыі наяўнага і будаўніцтве новага жыллёвага фонду. У пастанове падкрэслівалася неабходнасць добраўпарадкавання і паляпшэння культурна-бытавога абслугоўвання насельніцтва рабочых пасёлкаў.

Прэзідыум ЦВК абавязаў гарсавет закончыць у 1934 годзе састаўленне праекта планіроўкі Мінска. Распрацоўка праекта была даручана ленінградскаму філіялу «Гіпрагор». Генеральны праект рэканструкцыі горада быў завершан у гады трэцяй пяцігодкі. Намёткі, прадстаўленыя ў канцы 1934 года, прадугледжвалі толькі планіроўку плошчы каля Дома ўрада, Савецкай і Пушкінскай вуліц.

За гады другой пяцігодкі ў Мінску былі пабудаваны Дом друку, Палац піянераў, гасцініца «Беларусь», Вялікі оперны тэатр, Акруговы дом афіцэраў.

З 1935 па 1937 год асігнаванні на развіццё прамысловасці, капітальнае будаўніцтва, сацыяльна-культурныя мерапрыемствы ўзраслі (у цэнах адпаведных год) з 35 625 да 58 354 тысяч рублёў. За гады другой пяцігодкі на жыллёвую і камунальную гаспадарку гарсавет выдаткаваў 50,5 мільёна рублёў. Узраслі і расходы жыллёва-будаўнічай кааперацыі. У 1935 годзе, напрыклад, на аднаўленне і будаў-

ніцтва жыллёвага фонду яна выдаткавала больш трох мільёнаў рублёў.

У сувязі з тым што жыллёвае будаўніцтва адставала ад росту насельніцтва горада, гарсавет увесь час клапаціўся аб лепшай эксплуатацыі наяўнага жыллёвага фонду. У 1936 годзе былі арганізаваны вулічныя камітэты. Яны сачылі за рамонтам і захаваннем жыллёвага фонду, дапамагалі гарадской санітарнай інспекцыі падтрымліваць чыстату на вуліцах, у дварах і памяшканнях. У конкурсе на лепшае захаванне жыллёвага фонду і добраўпарадкаванне прымалі ўдзел 70 дэпутацкіх груп і больш дзвюх тысяч іншых актывістаў. У ходзе конкурсу на сродкі кватэранаймальнікаў было адрамантавана 506 кватэр. Па пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР 60 працэнтаў памяшканняў, вызваленых пасля пераезду дзяржаўных устаноў у Дом урада, былі перададзены ў жыллёвы фонд.

К канцу другой пяцігодкі жыллёвы фонд горада значна аднавіўся за кошт будаўніцтва добраўпарадкаваных шматкватэрных цагляных будынкаў. Аднак драўляныя дамы, пабудаваныя яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады, старэлі, станавіліся непрыгоднымі для жылля. У выніку жылая плошча, якая прыходзілася на аднаго жыхара горада, не павялічылася. На 1 студзеня 1938 года жыллёвы фонд Мінска складаў 966 тысяч квадратных метраў — у сярэднім 4,4 квадратных метра на аднаго чалавека.

У горадзе рэканструяваліся і расшыраліся водаправодная сетка, лазнева-пральная гаспадарка, каналізацыя, якія ўсё яшчэ адставалі ад патрэб развіваючайся прамысловасці і растучага насельніцтва. Павялічвалася колькасць шчылін, якія падавалі ў горад ваду, магутнасць помпавага абсталявання, расшыралася вулічная водаправодная сетка.

З кожным годам у горадзе з'яўлялася больш добраўпарадкаваных вуліц, маставых, павялічвалася плошча зялёных насаджэнняў. Дзесяткі вуліц пакрываліся клінкерам і брусчаткай. З 1934 года пачалося асфальтаванне вуліц. Асфальтам былі пакрыты Прывакзальная плошча, Савецкая вуліца, вуліцы Леніна, 11 ліпеня, Свярдлова і інш. Каля парку імя Горкага праз раку Свіслач пабудавалі новы жалезабетонны мост.

Расшыралася электрыфікацыя і радыёфікацыя горада. Пасля пуску новай электрастанцыі выпрацоўка электраэнергіі ўзрасла з 40 да 82 мільёнаў кілават-гадзін у год. Палепшылася забеспячэнне энергіяй прамысловых і камунальна-бытавых прадпрыемстваў, трамвая, ускраінных вуліц, якія раней асвятляліся газавымі лямпамі. У 1935 годзе ў горадзе налічвалася каля 7 тысяч радыёкропак, было радыёфікавана 20 школ, 44 інтэрнаты, 240 клубаў, прадпрыемстваў і ўстаноў. Завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, дрэваапрацоўчы камбінат, фаб-

рыка «Камунарка», ЦЭЦ і іншыя буйныя прадпрыемствы абсталявалі асабістыя радыёвузлы.

Значна палепшылася работа гарадскога транспарту. Толькі ў 1934 годзе на будаўніцтва і расшырэнне трамвайнай сеткі гарадскі Савет выдаткаваў 1400 тысяч рублёў. У шчыльна населеныя раёны на Старажоўку, плошчу Свабоды, Інтэрнацыянальную вуліцу былі пракладзены новыя трамвайныя лініі. Каля завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі пабудавана трамвайнае кальцо. З 1931 па 1937 год даўжыня трамвайнай лініі павялічылася з 18 да 35 кіламетраў, а колькасць перавезеных за год пасажыраў — з 17 да 40 мільёнаў чалавек.

З ростам і развіццём Мінска ўмацоўваліся яго сувязі і сродкі зносін з прамысловымі і культурнымі цэнтрамі краіны, з абласцямі і раёнамі рэспублікі. У 1937 годзе пачалася рэканструкцыя чыгуначнай лініі Масква — Негарэлае, Мінскага вакзала і будаўніцтва першакласнай для таго часу аўтастрады Масква — Мінск. Для хуткай дастаўкі пошты з Мінска ў далёкія раёны выкарыстоўвалася паштовая авіяцыя. У 1937 годзе, напрыклад, яна абслугоўвала 16 раёнаў рэспублікі.

Адначасова з паспяховым развіццём прамысловасці і сельскай гаспадаркі паляпшаўся дабрабыт працоўных. Савецкі ўрад аказваў паўсядзённую дапамогу і садзеянне ў развіцці дзяржаўнага, кааператыўнага і калгаснага гандлю. Рознічны тавараабарот гандлёвай сеткі Мінска за 1933—1935 гады ўзрос з 128,8 да 298,3 мільёна рублёў.

Да адмены картачнай сістэмы ў забеспячэнні працоўных харчаваннем вялікую ролю адыгрывалі дапаможныя гаспадаркі прадпрыемстваў. З 1932 года арганізоўваліся закрытыя рабочыя кааператывы, якім дазвалялася закупаць сельскагаспадарчыя прадукты на рынках і непасрэдна ў калгасах. У 1934 годзе ў сістэме закрытых рабочых кааператываў горада налічвалася 30 612 пайшчыкаў. Прыгарадныя гаспадаркі ў большасці сваёй забяспечвалі прадпрыемствы грамадскага харчавання на фабрыках і заводах. Частка іх прадукцыі размяркоўвалася непасрэдна сярод пайшчыкаў. У 1933 годзе патрэбы працоўных горада ў бульбе больш чым на 40 працэнтаў забяспечваліся за кошт дапаможных гаспадарак і дэцэнтралізаваных закупак.

Шырокае распаўсюджанне атрымала індывідуальнае агародніцтва. У 1934 годзе 3200 рабочых Мінска атрымалі ўчасткі пад індывідуальныя агароды. Ім была аказана грашовая дапамога для набыцця насення, дробнага інвентару.

Істотную ролю ў далейшым паляпшэнні дабрабыту насельніцтва Мінска ў гады другой пяцігодкі адыграла ліквідацыя картачнай сістэмы на прадметы шырокага ўжытку. З 1 студзеня 1935 года быў

уведзен свабодны продаж насельніцтву хлеба, круп, мукі з дзяржаўных і кааператыўных магазінаў. З устанаўленнем адзіных цэн на прадукты харчавання былі павялічаны заработная плата нізкааплачваемым рабочым, стыпендыі студэнтам, пенсіі састарэлым, інвалідам і г. д.

З 1 кастрычніка 1935 года была адменена картачная сістэма на мяса, тлушч, цукар, бульбу, зніжаны цэны на муку, зерне, хлеб і іншыя вырабы з мукі. У 1937 годзе двойчы зніжаліся рознічныя цэны на прамысловыя прадметы шырокага ўжытку.

У выніку павелічэння заработнай платы, адмены картачнай сістэмы, зніжэння цэн на прамысловыя і харчовыя тавары ўзровень спажывання насельніцтва значна павялічыўся. З кожным годам у Мінску павялічвалася спажыванне найбольш каштоўных прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў.

У 1935 годзе мінчанам было прададзена больш, чым у 1934 годзе, мяса і мясапрадуктаў на 61,7, рыбы — на 178, цукру — на 68, тлушчу — на 80 працэнтаў. У сувязі з гаспадарчым умацаваннем калгасаў разгортваўся калгасны рыначны гандаль, які адыгрываў вялікую ролю ў забеспячэнні гарадскога насельніцтва прадуктамі харчавання. У горадзе расшыраліся і добраўпарадкаваліся калгасныя рынкі. Удзельная вага рыначнага гандлю ў трэцім квартале 1936 года па продажу насельніцтву мяса складала 43, смятаны — 48,5, малака — 70 працэнтаў.

Рознічны тавараабарот гандлёвай сеткі Мінска за 1933—1937 гады павялічыўся больш чым у тры разы, склаўшы ў канцы пяцігодкі каля 500 мільёнаў рублёў.

Адмена картачнай сістэмы і расшырэнне гандлю абумовілі хуткі рост гандлёвай сеткі і прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Былі адкрыты дзесяткі новых магазінаў і сотні ларкоў. У 1934 годзе ўступіў у строй новы ўнівермаг з гадавым абарачэннем 50 мільёнаў рублёў. Асаблівая ўвага была звернута на размяшчэнне гандлёвай сеткі з улікам патрэб насельніцтва рабочых пасёлкаў і ўскраін горада.

Усё шырэй выкарыстоўваліся прагрэсіўныя метады абслугоўвання працоўных. Наладжваліся выстаўкі прадметаў шырокага ўжытку, склікаліся канферэнцыі пакупнікоў, нарады перадавых работнікаў гандлю. У 1936 годзе Мінпромгандаль арганізаваў прыём заказаў і дастаўку купленых тавараў на дом. Амаль на ўсіх буйных прамысловых прадпрыемствах, у некаторых установах і навучальных установах працавалі сталовыя.

Побач з ростам заработнай платы ўзрасталі і грамадскія фонды, якія выдаткоўваліся на дапамогу і выплату па сацыяльнаму страхаванню, пенсіі і стыпендыі, на аплату штогодніх адпачынкаў, пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку, на дапамогу мнагадзетным маці, бяс-

платную медыцынскую дапамогу і г. д. У 1936 годзе на фабрыцы «Камунарка», напрыклад, 300 рабочых адпачывалі ў дамах адпачынку, 100 рабочых — у Кіеўскім санаторыі харчавікоў, 50 стаханаўцаў у санаторыях Каўказа і Крыма.

Ствараліся ўмовы для здаровага і культурнага адпачынку навучэнцаў. У 1936 годзе на арганізацыю летняга адпачынку піянераў і школьнікаў выдаткавана больш аднаго мільёна рублёў. 6460 маладых грамадзян Мінска ў час школьных канікул адпачывалі ў добраўпарадкаваных піянерскіх лагерах у Каралішчавічах, Гарадзішчы, Тальцы, Дукорах, Драздах і санаторным лагеры ў Ратамцы.

У гады другой пяцігодкі палепшылася ахова здароўя. З 1933 па 1936 год выдаткі на ахову здароўя ў бюджэце горада ўзраслі з 2,15 да 11,5 мільёна рублёў. Павелічэнне асігнаванняў дазволіла расшырыць клінічны гарадок, які з'яўляўся буйнейшай медыцынскай установай рэспублікі, адкрыць новыя паліклінікі і пункты аховы здароўя на прадпрыемствах. Колькасць бальнічных ложкаў павялічылася да 2500. У медыцынскіх установах налічвалася больш 88 урачоў і звыш 2000 работнікаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй.

У 1936 годзе істотна змянілася сістэма медыцынскага абслугоўвання. Прамысловыя прадпрыемствы горада замацоўваліся за паліклінікамі, якія праводзілі амбулаторны прыём і аказвалі дапамогу на даму незалежна ад месца жыхарства рабочых. З мэтай паляпшэння абслугоўвання рабочых на заводах імя Кірава, «Бальшавік» і іншых прадпрыемствах былі абсталяваны фізіятэрапеўтычныя кабінеты.

Восенню 1934 года створана санітарная авіяцыя. 12 лістапада 1934 года з Хоцімска Касцюковіцкага раёна самалётам быў дастаўлены ў Мінск хлопчык калгасніка Аўхіменка. Гэта быў першы рэйс санітарнага самалёта ў вёску. З 1935 года самалёты санітарнай авіяцыі рэгулярна вылятали ў раёны рэспублікі і за два гады зрабілі 346 вылетаў к хворым.

Пры добраўпарадкаванні горада вялікая ўвага аддавалася будаўніцтву спартыўных збудаванняў. У 1933 годзе быў адкрыт Цэнтральны дом фізкультуры па Інтэрнацыянальнай вуліцы, у 1934 годзе — стадыён «Дынама» на 10 000 месц.

Такім чынам, у гады другой пяцігодкі, якая стала важным этапам ператварэння Мінска ў буйны індустрыяльны цэнтр БССР, адначасова з паспяховым выкананнем плана развіцця прамысловасці ажыццяўляліся мерапрыемствы па рэканструкцыі горада, развіццю гарадской гаспадаркі, паляпшэнню матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

РАЗДЗЕЛ XVII

КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА (1921—1937 гады)

1. Народная асвета

З першых дзён мірнага будаўніцтва шырока разгарнулася работа па стварэнню новай савецкай школы. Усеагульнае абавязковае навучанне дзяцей да 16—17 год было адным з найважнейшых палажэнняў Праграмы партыі. Для ажыццяўлення яго патрабавалася падрыхтаваць кадры выкладчыкаў, пашырыць сетку школ, адрамантаваць старыя школьныя будынкі, забяспечыць іх мэбляй, а навучэнцаў — падручнікамі і г. д. Але ў першыя гады пасля заканчэння грамадзянскай вайны, калі асноўная частка сродкаў выдаткоўвалася на аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі, Камуністычная партыя і Савецкі ўрад вымушаны былі эканоміць, як гаварыў У. І. Ленін, на ўсім, нават на школах [1].

Народны камісарыят асветы БССР у лютым 1922 года зацвердзіў новую сістэму народнай асветы. Аснову яе складала сямігадовая працоўная агульнаадукацыйная і політэхнічная школа, якая ахоплівала дзяцей ад 8 да 15 год і рыхтавала іх да прафесіянальнага навучання ў тэхнікумах. У сувязі з цяжкім эканамічным становішчам краіны школы другой ступені былі ліквідаваны.

У тым жа годзе школы былі амаль поўнасцю пераведзены на мясцовы, пакуль што слабы бюджэт. Дзяржаўная школьная сетка была скарочана напалавіну. Уводзілася плата за навучанне. У Мінску магло навучацца толькі 40 працэнтаў дзяцей. Не хапала абсталявання, мэблі, падручнікаў. Заняткі

[1] Гл.: У. І. Ленін. Творы, т. 45, стар. 287.

ў школах праводзіліся ў некалькі змен. Фізічныя, хімічныя і іншыя навучальныя кабінеты мелі дзве-тры школы горада.

Для ўмацавання матэрыяльнай базы культурна-асветных устаноў і школ у канцы 1921 года былі створаны школьнагаспадарчыя саветы, у выбарах якіх прымала ўдзел усё насельніцтва горада, мясцовыя і фабрычныя камітэты прафсаюзаў. Праз школьнагаспадарчыя саветы ажыццяўлялася самаабкладанне насельніцтва, памеры якога ўстанаўліваліся ў залежнасці ад маёмаснай заможнасці гараджан. Найбольшая плата спаганялася з уладальнікаў прадпрыемстваў, з тых, хто эксплуатаваў чужую працу. Да другой катэгорыі адносіліся людзі, якія мелі нерухомую ўласнасць. З іх бралі меншую плату. Уносілі мінімальную плату або поўнасцю вызваляліся ад яе члены прафсаюза. Усе лепшыя навучальныя ўстановы горада былі прызначаны для навучання дзяцей рабочых.

Вялікую дапамогу школе ў гэтыя цяжкія гады аказвала грамадскасць Мінска. Партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія, гаспадарчыя арганізацыі, культурна-асветныя ўстановы і насельніцтва горада прымалі актыўны ўдзел у правядзенні тыдня дапамогі школе. Кожнай установе і прадпрыемству даваліся заданні па выраб школьнай мэблі, пашыўцы і рамонту дзіцячага адзення, абутку, нарыхтоўцы паліва, рамонту школьных будынкаў, наладжванню вечароў, лекцый, спектакляў для збору сродкаў і г. д. К пачатку 1922/23 навучальнага года былі адрамантаваны ўсе школы Мінска, поўнасцю запасена для іх паліва.

Пачынаючы з 1923 года ў Савецкай дзяржавы з'явілася магчымасць павялічыць асігнаванні на народную асвету. З гэтага часу школьная сетка і колькасць вучняў у Мінску пачалі ўзрастаць. У 1923 годзе ў школах горада навучалася менш 10 тысяч дзяцей. У 1926 годзе іх колькасць перавысіла 16 тысяч.

Умацаванне матэрыяльнай базы дазволіла палепшыць і арганізацыю вучэбнага працэсу. Заняткі праводзіліся па ўстаноўленых праграмах і планах, з поўнай нагрузкай. Пры мінскім клубе «КІМ» у 1921 годзе ўзнікла першая ў горадзе дзіцячая камуністычная група — дзіцячая камуна. Роданачальнікам гарадской піянерскай арганізацыі з'яўляецца атрад юных спартакаўцаў, створаны ў Мінску 20 чэрвеня 1922 года. Першыя піянерскія атрады ствараліся пры прадпрыемствах, клубах, культурна-асветных установах і былі адарваны ад школы. З 1926 года паміж імі пачалі ўстанаўлівацца шчыльныя кантакты, што садзейнічала паляпшэнню як выхаваўчай, так і вучэбнай работы ў школе.

Мінск стаў буйным цэнтрам падрыхтоўкі настаўнікаў для школ рэспублікі. З 1921 года ў горадзе працавалі тры педагагічных тэхнікумы, педагагічнае аддзяленне пры факультэце грамадскіх навук

універсітэта, аднагадовыя і двухгадовыя настаўніцкія курсы. У перыяд летніх канікул ствараліся кароткатэрміновыя курсы, на якіх навучаліся школьныя работнікі з розных раёнаў Беларусі. Так, на кароткатэрміновых курсах, якія распачалі работу ў 1924 годзе пры Мінскім педтэхнікуме, навучаліся настаўнікі Мінска, Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў.

У пачатку 1925 года пры Беларускім педагагічным тэхнікуме былі адкрыты цэнтральныя курсы Наркамасветы РСФСР, якія рыхтавалі настаўнікаў для беларускіх школ Гомельскай губерні.

Па меры пашырэння і ўмацавання сеткі школ, росту настаўніцкіх кадраў ствараліся рэальныя ўмовы для пераходу да ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей.

Вясной 1926 года ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб увядзенні ў 1930/31 навучальным годзе ў гарадах, пагранічных раёнах і раёнах з найбольш развітай школьнай сеткай, а па ўсёй рэспубліцы не пазней 1934/35 навучальнага года ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей ад 8 да 11 год. Мінскі акруговы аддзел народнай асветы распрацаваў план увядзення ўсеагульнага абавязковага навучання па Мінскай акрузе. Ажыццяўленне яго ў Мінску было разлічана на пяць год.

У 1926/27 навучальным годзе абавязковае навучанне ўстанаўліваласа для дзяцей 8-гадовага, у 1927/28 навучальным годзе — для дзяцей 9-гадовага ўзросту, а потым яно паслядоўна распаўсюджвалася на астатнія катэгорыі дзяцей школьнага ўзросту.

Усеагульнае пачатковае навучанне ў Мінску ўводзілася ва ўмовах росту ў нашай краіне сіл сацыялізма. Паспяховаму вырашэнню гэтай задачы садзейнічалі сацыялістычная індустрыялізацыя прамысловасці і калектывізацыя сельскай гаспадаркі.

Вялікую ролю ў ажыццяўленні плана ўсеагульнага навучання адыгралі рашэнні XVI з'езду ВКП(б), які адбыўся ў 1930 годзе. У сувязі з пераходам да разгорнутага наступлення сацыялізма па ўсяму фронту з'езд пастанавіў узмацніць тэмпы культурнага будаўніцтва, паставіў у рад баявых задач партыі на бліжэйшы перыяд ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага першапачатковага навучання ва ўсіх раёнах Савецкага Саюза.

З году ў год павялічваліся асігнаванні на народную адукацыю. У 1930 годзе СНК БССР прыняў пастанову аб вызваленні працоўных ад платы за навучанне ва ўсіх навучальных установах. У гэтым жа годзе СНК БССР вынес пастанову аб забеспячэнні навучэнцаў гарачым снеданнем, абуткам і адзеннем.

Больш бедныя вучні за кошт бюджэту Мінскага гарадскога Савета бясплатна забяспечваліся падручнікамі, школьнымі прыладамі, абуткам, адзеннем, гарачым снеданнем, рознымі дапаможнікамі.

З 1927 на 1934 год гарадскі Савет выдаткаваў на гэтыя мэты звыш 400 тысяч рублёў.

Пры школах былі створаны камітэты садзейнічання ўсеагульнаму навучанню, у рабоце якіх прымалі актыўны ўдзел прафсаюзныя арганізацыі горада. Прафсаюзы выдаткавалі на політэхнізацыю школ спачатку не менш 10 працэнтаў, а з 1930/31 навучальнага года — 15 працэнтаў сродкаў культфондаў. У барацьбу за правядзенне ўсеагульнага навучання ўключыліся камсамол і іншыя грамадскія арганізацыі. Шырокае распаўсюджанне атрымалі паходы за пісьменнасць, грамадскі агляд усеагульнага навучання і г. д.

Для поўнага забеспячэння школ кадрамі педагогаў была расшырана сетка педтэхнікумаў, праведзены датэрміновыя выпускі студэнтаў педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта, тэхнікумаў і іншых навучальных устаноў. Вялікія клопаты праяўляліся аб павышэнні кваліфікацыі, ідэйна-палітычным выхаванні, паляпшэнні матэрыяльнага дабрабыту настаўнікаў.

У 1933/34 навучальным годзе ў школах Мінска працавалі 700 настаўнікаў. Толькі з 1930/31 да 1933/34 навучальнага года колькасць педагогаў з вышэйшай адукацыяй узрасла з 17,3 да 27,6 працэнта.

Умацаванне матэрыяльнай базы школ, актыўны ўдзел усёй грамадскасці ў ажыццяўленні рашэнняў партыі забяспечылі выкананне плана ўсеагульнага навучання ў Мінску ў намечаныя тэрміны. Ужо ў 1930/31 навучальным годзе ўсе дзеці 8—11 год, а таксама падлеткі 12—15 год былі ахоплены пачатковай школай. Прэзідыум Мінскага гарадскога Савета 29 лістапада 1930 года прыняў пастанову аб увядзенні абавязковай сямігадовай адукацыі для дзяцей ад 12 да 16 год. У 1932 годзе ўсе дзеці гэтага ўзросту навучаліся ў сямігадовай школе.

Колькасць навучэнцаў у 1932—1933 гадах у Мінску склала звыш 20 тысяч, г. зн. узрасла за 10 год удвая. З іх звыш 12 тысяч навучаліся на роднай мове ў 21 беларускай школе.

Вялікая ўвага ў гэтыя гады аддавалася вытворчаму навучанню. З 1927/28 навучальнага года ў Мінску пачалося аднаўленне школ другой ступені і школ-дзевяцігодак, якія павінны былі рыхтаваць кваліфікаваныя кадры для народнай гаспадаркі.

Шляхі, формы і метады політэхнізацыі школы былі абмеркаваны на першым усебеларускім з'ездзе па політэхнічнай адукацыі, які адбыўся ў канцы 1930 года ў Мінску. Школы перагледзелі вучэбныя планы, праграмы, падручнікі. Паміж прадпрыемствамі горада і школамі ўстанаўліваліся больш цесныя сувязі. Прымацаванне школ да фабрык і заводаў афармлялася адпаведнымі дагаворамі. Вучні праходзілі ў цэхах вытворчае навучанне, у школах з дапамогай прамысловых прадпрыемстваў ствараліся майстэрні і рабочыя пакоі.

Адмоўна адбілася на развіцці школы захапленне настаўнікаў «новымі», а па сутнасці заганнымі метадамі навучання («брыгадна-лабараторным», «метадам праектаў» і г. д.), якія не давалі дастатковага аб'ёму агульнаадукацыйных ведаў і глыбокага засваення вучнямі асноў навукі. Гэтыя скажэнні былі ліквідаваны ў пачатку 30-х гадоў. 5 верасня 1931 года ЦК ВКП(б) прыняў пастанову «Аб пачатковай і сярэдняй школе», 25 жніўня 1932 года — «Аб вучэбных праграмах і рэжыме ў пачатковых і сярэдніх школах».

Ажыццяўленне гэтых рашэнняў забяспечыла перабудову ў Мінску ўсёй школьнай работы. Выкладанне праводзілася па адзіных падручніках. Быў установлен цвёрды парадак арганізацыі вучэбных заняткаў. Палепшылася вывучэнне гісторыі і геаграфіі, рускай мовы і літаратуры (у беларускіх школах). Была праведзена ў гэты перыяд рэформа беларускага правапісу.

У выніку паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы паглыбіліся веды і паспяховасць вучняў, зменшылася колькасць другагоднікаў, умацавалася дысцыпліна.

Далейшае ўдасканальванне сістэмы адукацыі вызначалася задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, неабходнасцю папаўнення вышэйшых навучальных устаноў моладдзю, якая мае сярэднюю адукацыю. У сувязі з гэтым сямігадовая школа паступова рэарганізоўвалася ў дзесяцігадовую. У 1933/34 навучальным годзе ў школах Мінска пачаліся заняткі ў 17 восьмых і дзевятых класах. У 1934 годзе былі ўстаноўлены тры тыпы агульнаадукацыйнай школы: пачатковая, няпоўная сярэдняя і сярэдняя. Дзякуючы гэтаму ліквідаваўся разрыў паміж сярэдняй і вышэйшай школай, аблегчылася камплектаванне вышэйшых навучальных устаноў пісьменнай моладдзю.

З 1935 па 1937 год у горадзе пабудавана 16 новых школ. Яны былі добра абсталяваны, мелі спартыўныя і актавыя залы, вучэбныя кабінеты, бібліятэкі.

Значна ўзрасла сетка пазашкольных устаноў — піянерскіх лагераў, клубаў, дзіцячых музычных школ, паркаў, стадыёнаў, тэатраў, кінатэатраў і г. д. 7 лістапада 1936 года быў адкрыт першы ў рэспубліцы Палац піянераў — цудоўны падарунак мінскім школьнікам. Дзеці атрымалі магчымасць займацца ў тэхнічных лабараторыях, гуртках мастацкага выхавання.

Бурнае развіццё школьнай адукацыі, паспяховае ажыццяўленне ўсеагульнага пачатковага і сямігадовага навучання, ператварэнне школ у сапраўдныя ачагі камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення — выдатныя культурныя заваёвы працоўных Мінска, якія стварылі рэальныя ўмовы для пераходу да ўсеагульнага навучання дзяцей у аб'ёме сярэдняй школы.

Важнейшай задачай культурнага будаўніцтва была ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва Мінска. Рашэнне яе забяспечвала ўздым культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых, камуністычнае выхаванне працоўных, прыцягванне мас да вырашэння народнагаспадарчых задач, да кіраўніцтва дзяржавай.

У адпаведнасці з дэкрэтам Савета Народных Камісараў ад 29 снежня 1919 года «Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР» Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР 11 снежня 1920 года спецыяльным загадам абавязаў усіх непісьменных ва ўзросце ад 8 да 50 год навучацца грамаце на роднай або рускай мове. Створаная ў Мінску надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці ўзяла на ўчот непісьменных і малапісьменных, правяла растлумачальную работу сярод насельніцтва, арганізавала курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў школ лікбезу. Пісьменныя прыцягваліся да навучання непісьменных у парадку працоўнай павіннасці. Школьныя работнікі былі аб'яўлены мабілізаванымі.

У пачатку 1921 года ў горадзе было адкрыта звыш 90 школ граматы, у якіх навучалася каля сямі тысяч чалавек. 70 працэнтаў навучэнцаў школ лікбезу складалі жанчыны. Непісьменныя вучыліся чытаць і пісаць на роднай мове, атрымлівалі кароткія звесткі па прыродазнаўству, арыфметыцы, палітграмаце, гісторыі і геаграфіі. Да выкладання ў гэтых школах было прыцягнута больш 200 чалавек.

На барацьбу з ліквідацыяй непісьменнасці былі мабілізаваны ўсе грамадскія арганізацыі. Ініцыятарамі шматлікіх добрых пачынанняў у гэтай галіне сталі камсамольцы. У 1922 годзе гарадская камсамольская арганізацыя стварыла групы індывідуальнага навучання і некалькі агульнаадукацыйных школ працоўнай моладзі, у якіх налічвалася звыш 1150 чалавек, у тым ліку каля 500 камсамольцаў.

У сувязі з цяжкасцямі аднаўленчага перыяду колькасць школ граматы, якія ўтрымліваліся на дзяржаўны кошт, значна зменшылася. У 1922 годзе захаваўшыяся пункты ліквідацыі непісьменнасці былі аб'яднаны ў восем раённых школ. У 1922/23 навучальным годзе на дзяржаўныя сродкі ў Мінску ўтрымліваліся толькі тры школы па ліквідацыі непісьменнасці і тры школы малапісьменных, астатнія існавалі за кошт прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый. Пасля 1923 года колькасць школ граматы і пунктаў лікбезу зноў павялічылася.

У 1924 годзе ў Беларусі было створана таварыства «Прэч непісьменнасць». У Мінску першыя ячэйкі таварыства ўзніклі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, Сельскагаспадарчым інстытуце і Доме работнікаў асветы. Члены таварыства з вялікім энтузіязмам збіралі сродкі сярод насельніцтва горада, арганізоўвалі пункты па ліквіда-

ваці непісьменнасці і г. д. На працягу зімы 1924/25 года ў таварыства «Прэч непісьменнасць» уступіла звыш трох тысяч мінчан. К канцу 1925 года ў горадзе налічвалася каля 40 вучэбных таварыстваў, к канцу — каля 60. На працягу 1924 года таварыствы арганізавала каля 150 гуртоў ліквбезу. К канцу 1925 года ў іх прайшлі навучанне дзве тысячы чалавек.

Ліквідацыя непісьменнасці набыла асобае значэнне ў гады індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, калі савецкая ўлада народных мас, іх актыўны ўдзел на ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва адыгрывалі рашаючую ролю ў пабудове сацыялізма.

Адзнак у гэтай рабоце было многа недахопаў. Далёка не ўсе непісьменныя навучаліся. Пункты ліквбезу дрэнна былі забяспечаны наглядапасьбамі, падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі. Дрэнна наведваліся заняткі, часта зрываліся. Мясцовыя партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі не ўдзялялі дастатковай увагі гэтай важнай справе і часта дзейнічалі паасобку.

У канцы 1929 года ЦК ВКП(б) указваў на неабходнасць перабудовы ўсёй работы па ліквідацыі непісьменнасці на аснове адзінага плана і аб'яднання сіл усіх арганізацый. XVI з'езд партыі лічыў ліквідацыю непісьменнасці адной з рашаючых прадпасылак культурнай рэвалюцыі і выставіў яе побач з усеагульным абавязковым пачатковым навучаннем у лік баявых задач партыі на бліжэйшы перыяд.

Узраслі асігнаванні Савецкай дзяржавы на ліквідацыю непісьменнасці. У 1927/28 навучальным годзе на гэтыя мэты ў Мінску было выдаткавана менш дзвюх тысяч, у 1929/30 — звыш 30 тысяч рублёў.

У верасні 1930 года ЦСПСБ, Народным камісарыятам асветы БССР, камсамолам, кааперацыяй і таварыствам «Прэч непісьменнасць» быў падпісан дагавор аб сумесных дзеяннях і правядзенні трохмесячніка па ліквідацыі непісьменнасці. Пункты ліквідацыі поўнасцю забяспечылі падручнікамі. Для падрыхтоўкі работнікаў школ і пунктаў ліквбезу былі арганізаваны спецыяльныя курсы. Пытанні аб ліквідацыі непісьменнасці абмяркоўваліся на рабочых сходах. Цэнтрамі ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сталі фабрыкі, заводы, школы, чырвоныя куткі жактаў. Сталі часцей праводзіцца сумесныя нарады партыйнага і прафсаюзнага актыву, практыкавалася пасылка на прадпрыемствы спецыяльных брыгад для праверкі ходу ліквідацыі непісьменнасці.

У пачатку 1931 года ў горадзе працаваў 271 пункт ліквбезу, у тым ліку 181 — на заводах. Вучобай было ахоплена каля 90 працэнтаў непісьменных і малапісьменных рабочых. На радзе прадпрыемстваў

(«Камунар», «Энергія», «Бальшавік») заняткі на лікпунктах наведвалі ўсе непісьменныя і малапісьменныя.

К канцу першай пяцігодкі былі дасягнуты рашаючыя поспехі ў ліквідацыі непісьменнасці. З 1925 па 1932 год у Мінску было навучана 20 тысяч непісьменных. Аднак пастаянны прыток у горад сельскага насельніцтва, наяўнасць вялікай колькасці малапісьменных выклікалі працяг гэтай работы. Ставілася задача — даць сямігадовую адукацыю малапісьменным ва ўзросце да 35 год і ў аб'ёме пачатковай школы ва ўзросце да 50 год.

XVII з'езд партыі паставіў задачу завяршыць у другой пяцігодцы ліквідацыю не толькі непісьменнасці, але і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва краіны. Аднак многія партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі паслабілі барацьбу за поўную ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) у пастанове ад 16 студзеня 1936 года, адзначыўшы сур'ёзныя поспехі ў барацьбе з непісьменнасцю, указалі ў той жа час на рад буйных недахопаў. Была пастаўлена задача на працягу двух год ліквідаваць непісьменнасць сярод працоўных ва ўзросце да 50 год.

Суцэльная праверка ведаў, праведзеная на ўсіх прадпрыемствах Мінска ў пачатку 1936 года, паказала, што ў горадзе яшчэ былі непісьменныя і малапісьменныя, якія не былі ахоплены вучобай. Мінскі гарадскі камітэт КП(б)Б 22 красавіка 1936 года склікаў нараду, прысвечаную ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Былі заслуханы даклады прадстаўнікоў гарана, ЦСПСБ, гарадскога камітэта камсамола, прадстаўнікоў партыйнай і прафсаюзнай арганізацый дрэваапрацоўчага завода і фабрыкі імя Крупскай. У рабоце нарады прымаў удзел сакратар ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікала. Пасля нарады гарадскі камітэт КП(б)Б ажыццявіў рад мерапрыемстваў па выкананню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб паляпшэнні работы па навучанню непісьменных і малапісьменных.

Пры выканаўчых камітэтах Саветаў былі створаны секцыі па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, а таварыства «Прэч непісьменнасць» ліквідавана. На 14 буйнейшых прадпрыемствах горада ў сакавіку — маі 1936 года ахоп школамі непісьменных павялічыўся з 25 да 68, малапісьменных — з 34 да 48 працэнтаў.

Вялікую ролю ў паляпшэнні якасці навучання адыграла пераўтварэнне ў 1934 годзе сеткі пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў адзіную трохгадовую пачатковую школу дарослых. Быў установлен план навучання, разлічаны на 330 гадзін заняткаў, які забяспечваў цвёрды аб'ём ведаў.

Вячэрнія школы былі рэарганізаваны ў няпоўныя сярэднія і сярэднія. Часта яны ствараліся непасрэдна на прадпрыемствах. Так,

У 1935 годзе сярэднія і няпоўныя сярэднія школы рабочай моладзі працавалі на заводах «Бальшавік», імя Кірава, на абутковай фабрыцы.

Павышэнне агульнай пісьменнасці (у 1939 годзе пісьменнасць у горадзе дасягала 93,2 працэнта) адчыняла шлях да далейшага росту палітычнага і культурнага ўзроўню працоўных Мінска, да актыўнага ўдзелу іх у сацыялістычным будаўніцтве і грамадска-палітычным жыцці краіны.

Дзякуючы ўсеагульнаму навучанню дзяцей, ліквідацыі масавай непісьменнасці і малапісьменнасці дарослых працоўныя сталіцы рэспублікі з кожным годам усё больш далучаліся да перадавой сацыялістычнага грамадства, удасканальвалі свае тэхнічныя веды і выстычнай культуры, уключаліся ў шэрагі актыўных будаўнікоў сацыятворчую кваліфікацыю.

Павышэнне культурнага ўзроўню рабочага класа, падрыхтоўка тэхнічна пісьменных і адукаваных рабочых набылі ў гады сацыялістычнага будаўніцтва першаступеннае значэнне. Гэтым была абумоўлена выключная ўвага партыі і дзяржавы да прафесіянальнай адукацыі. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, у Мінску ўжо ў гады аднаўлення народнай гаспадаркі былі адкрыты прафесіянальна-тэхнічныя школы, якія рыхтавалі кваліфікаваных металістаў, будаўнікоў, дрэваапрацоўшчыкаў, гарбароў, паліграфістаў, абутнікоў, швейнікаў і рабочых іншых спецыяльнасцей. Ствараліся таксама кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы рабочых масавых спецыяльнасцей, практыкавалася індывідуальнае і брыгаднае навучанне.

XI з'езд КП(б)Б, які адбыўся ў лістападзе 1927 года, прапанаваў Народнаму камісарыяту асветы рэспублікі арганізаваць масавае прафесіянальнае тэхнічнае навучанне так, каб поўнасцю задавальняліся патрэбы народнай гаспадаркі ў кваліфікаваных кадрах, захоўвалася адпаведнасць і пераемнасць паміж асобнымі тыпамі навучальных устаноў.

У Мінску, як і ў іншых гарадах Беларусі, школы фабрычна-заводскага навучання і прафтэхшколы будаваліся на базе фабрычна-заводскай сямігодкі. Гэтыя школы ў гады першай і другой пяцігодак з'яўляліся асноўным рэзервам забеспячэння прамысловасці рабочымі, якія добра ведалі сучасную тэхніку. Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых набывала ўсё больш планамерны, арганізаваны характар.

Спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй рыхтавалі тэхнікумы. Ужо к канцу аднаўленчага перыяду ў горадзе працавала шэсць тэхнікумаў — тры педагагічных, архітэктурна-будаўнічы, сельскагаспадарчы і музычны. У 1928 годзе быў створан фізкультурны тэхнікум. У тэхнікумах навучалася больш тысячы студэнтаў.

Шпаркімі тэмпамі развівалася спецыяльная сярэдняя адукацыя ў гады пяцігодак. У гады першай пяцігодкі ў Мінску былі створаны хіміка-тэхналагічны, дарожна-будаўнічы, сувязі, гідратэхнічны і іншыя тэхнікумы. У 1931 годзе ў Мінску налічвалася 13 тэхнікумаў. У іх навучалася 2298 студэнтаў і працавала 304 выкладчыкі. Больш паловы тэхнікумаў рыхтавалі спецыялістаў для прамысловасці і транспарту рэспублікі.

Побач з ростам колькасці вучняў змяніўся іх сацыяльны склад. 54,3 працэнта студэнтаў тэхнікумаў на 1 студзеня 1931 года складалі рабочыя.

Значна ўмацоўвалася матэрыяльная база тэхнікумаў. Адным з лепшых стаў Мінскі будаўнічы тэхнікум, створаны яшчэ ў 1921 годзе. Ён меў багатую навучальна-вытворчую базу, а таксама вялікую тэхнічную бібліятэку. Гэта навучальная ўстанова падрыхтавала сотні тэхнікаў па прамысловаму, грамадзянскаму будаўніцтву і па іншых спецыяльнасцях.

У буйную навучальную ўстанову ператварылася Беларускае педагагічнае вучылішча, якое рыхтавала настаўнікаў і дашкольных работнікаў.

Карэнным чынам змяніўся за гады пяцігодак змест вучэбнай работы. У сярэдняй школе былі ліквідаваны памылкі ў арганізацыі вучэбнага працэсу, зжыты вузкі практыцызм, недаацэнка агульнатэарэтычнай адукацыі, усякія «навіны» ў навучанні студэнтаў, якія перашкаджалі падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў.

Поспехі працоўных Мінска ў галіне народнай асветы: ажыццяўленне ўсеагульнага навучання на роднай мове, рост сярэдняй спецыяльнай адукацыі і культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых — практычныя вынікі культурнай рэвалюцыі, якая была ажыццёўлена ў СССР за гады Савецкай улады.

2. Культурна-асветная работа

Пераход да новай эканамічнай палітыкі патрабаваў далейшага ўзмацнення палітычнага выхавання працоўных. Ставілася задача паляпшэння ўсёй ідэалагічнай, у тым ліку і культурна-асветнай, работы.

Аднак правядзенне культурна-асветнай работы ў першыя гады новай эканамічнай палітыкі было звязана з вялікімі цяжкасцямі. Пасля імперыялістычнай і грамадзянскай войн гарадская гаспадарка знаходзілася ў стане разбурэння. Не хапала самага неабходнага. Вельмі абмежаваны былі фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы. У мэтах хутчэйшага аднаўлення народнай гаспадаркі ў горадзе, як і ва

ўсёй рэспубліцы, праводзіўся строгі рэжым эканоміі. Эканоміць давадзілася на ўсім, у тым ліку і на расходах культурна-асветных устаноў.

Умацненне палітычнай асветы працоўных патрабавалі і асаблівасці класавай барацьбы ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі. Пад уплывам міжнароднай капіталістычнай рэакцыі ажывілася дзейнасць эсэраў, меншавікоў, анархістаў і буржуазных нацыяналістаў. Актывізаваўся буржуазны друк. За мяжой зменавехаўцы пад выглядам прымірэння з Савецкай уладай выступалі за рэстаўрацыю капіталізму.

Варожыя ленінізму плыні і групы (трацкісты, правыя апартуністы і інш.) прапагандавалі капітулянцкія погляды. У абстаноўцы разрухі, голаду і звязаных з імі матэрыяльных нястач недастаткова ўстойлівая частка працоўных пачала вагацца, прыслухоўвалася да антысавецкіх выступленняў буржуазнай агентуры.

Буржуазнаму ўплыву партыя і Савецкі ўрад супрацьставілі цэлую сістэму агітацыйна-прапагандысцкіх мерапрыемстваў, у ліку якіх вялікае значэнне надавалася ўзмацненню культурна-асветнай работы.

Для ўмацавання культурна-асветных устаноў кваліфікаванымі кадрамі СНК БССР у 1921 годзе зацвердзіў спецыяльную камісію, даручыўшы ёй узяць на ўчот усіх культасветработнікаў, якія працавалі не па сваёй спецыяльнасці. У тым жа годзе ЦВК БССР звярнуўся да ўрада РСФСР з просьбай адкамандзіраваць у Беларусь усіх культработнікаў-беларусаў.

Прымаліся меры да расшырэння сеткі і паляпшэння якасці работы культурна-асветных устаноў, створаных прафсаюзнымі і іншымі арганізацыямі. У ліпені 1921 года ў Мінску было 16 прафсаюзных клубаў. Многія з іх праводзілі вялікую работу па ідэйнаму выхаванню рабочых. Многа зрабіў, напрыклад, Цэнтральны міжпрафсаюзны клуб. Ён быў добра абсталяван, меў бібліятэку, чытальню, вялікую глядзельную залу, кінематограф. Добра працавалі створаныя пры клубе драматычная і музычная секцыі, хор.

У гутарках, лекцыях і дакладах, якія праводзіліся ў клубах, бібліятэках, чырвоных кутках, растлумачваліся генеральная лінія партыі, рашэнні Цэнтральнага Камітэта РКП(б) і Савецкага ўрада, выкрывалася здрадніцкая палітыка меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў, буржуазных нацыяналістаў.

Вялікае месца ў прапагандысцкай рабоце аддавалася Праграме Камуністычнай партыі, прынятай на VIII з'ездзе РКП(б). «У нашай праграме,— гаварыў У. І. Ленін,— кожны параграф ёсць тое, што павінен ведаць, засвоіць і разумець усякі працоўны» [1].

[1] У. І. Ленін. Творы, т. 38, стар. 179.

Прапагандысты і агітатары растлумачвалі сутнасць новай эканамічнай палітыкі, выкрывалі варожыя спробы вытлумачыць і выкарыстаць новую эканамічную палітыку ў контррэвалюцыйных, антысавецкіх мэтах. Працоўным растлумачвалі, што нэп — гэта адзіна правільная палітыка, якая забяспечвае перамогу сацыялістычных элементаў над капіталістычнымі. Вялікая ўвага аддавалася паказу перспектыў сацыялістычнага будаўніцтва, магчымасці перамогі сацыялізма ў СССР, умацаванню саюзу рабочага класа і сялянства.

Вялікі размах палітычная асвета працоўных Мінска атрымала ў апошнія гады аднаўленчага перыяду, характэрнай рысай якога з'яўляўся шырокі рух мас за вывучэнне ленінскіх ідэй. Перадавыя рабочыя, імкнучыся паўней выразіць сваю адданасць РКП(б) і яе заснавальніку У. І. Леніну, уступалі ў партыю. Пленум ЦК РКП(б), які адбыўся ў студзені 1924 года, аб'явіў ленінскі заклік у партыю. Адбыліся сходы, на якіх абмяркоўваліся кандыдатуры рабочых, што падалі заявы аб уступленні ў партыю. Ленінскі заклік палепшыў якасна і павялічыў колькасна фабрычна-заводскія партыйныя арганізацыі Мінска. Так, на заводзе «Энергія» да ленінскага закліку працавала 19 камуністаў, а пасля яго іх стала 33. Такая з'ява была характэрна і для шэрага іншых фабрычна-заводскіх партыйных арганізацый.

Шырока разгарнулася прапаганда ленінскай спадчыны. У газетах і часопісах, якія выходзілі ў Мінску, у дакладах і гутарках растлумачвалася ленінскае вучэнне аб партыі, сацыялістычнай рэвалюцыі, дыктатуры пралетарыяту і магчымасці перамогі сацыялізма ў адной, асобна ўзятай краіне. Вялікая ўвага ўдзялялася прапагандзе апошніх ленінскіх артыкулаў: «Старонкі з дзённіка», «Аб кааперацыі», «Як нам рэарганізаваць Рабкрын», «Аб нашай рэвалюцыі», «Лепш менш, ды лепш». У перыядычным друку Мінска рэгулярна змяшчаліся ўспаміны родных Ільіча, яго саратнікаў і памочнікаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Шырокае распаўсюджанне ў 1924—1925 гадах атрымалі гурткі ленінізма. Калі ў 1923 годзе ў Мінску іх налічваліся адзінкі, то з 1924 года яны сталі паўсюднай з'явай. На ўсіх фабрыках і заводах, у навучальных і навукова-даследчых установах, клубах і бібліятэках былі створаны куткі Леніна, вітрыны з яго творамі, рэгулярна чыталіся ўголас артыкулы аб Леніне і яго паасобных працах.

Узбройваючы масы ідэямі ленінізма, партыйныя арганізацыі Мінска разгарнулі барацьбу ў абарону ленінскай спадчыны, далі рашучы адпор трацкістам і іншым апартуністам, ядналі масы вакол партыі, накіроўвалі іх палітычную і працоўную актыўнасць на будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Асобае значэнне культурна-асветная работа набыла ў гады рэканструкцыі народнай гаспадаркі і разгорнутага будаўніцтва сацыялізма ў СССР. Акрамя палітычнай асветы, культурна-асветныя ўстановы актыўна вялі вытворчую прапаганду. Клубы, бібліятэкі, чырвоныя куткі, радыё і друк дапамагалі калектывам фабрык і заводаў Мінска ў барацьбе за выкананне вытворчых планаў, актыўна выступалі супраць недахопаў у рабоце прадпрыемстваў. Вялікае месца займала вусная і наглядная прапаганда. Рэгулярна чыталіся лекцыі і даклады, праводзіліся гутаркі, наладжваліся выстаўкі, фотавітрыны лепшых узораў прадукцыі, праводзіліся злёты ўдарнікаў вытворчасці, на якіх абагульняўся і распаўсюджваўся вопыт лепшых калектываў фабрык і заводаў.

Найбольш моцную сувязь з вытворчасцю ўстанавілі клубы металістаў, чыгуначнікаў, друкароў, дрэваапрацоўшчыкаў, медыкаў, харчавікоў, будаўнікоў, работнікаў дзяржгандлю і кааперацыі. Клуб друкароў, напрыклад, толькі ў 1930 годзе наладзіў звыш 30 вытворчых вечароў. Пры клубе металістаў працавалі лекторый і кабінет рабочага карэспандэнта, бібліятэка. Вялікай папулярнасцю карыстаўся драматычны калектыў. З цікавымі праграмамі выступалі хор і балетны гурток. Разнастайную работу праводзіў літаратурны гурток.

Пры клубах дзейнічалі школы і пункты па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, праводзіліся абмеркаванні твораў савецкай і зарубежнай літаратуры.

Шырока адзначаліся ў клубах Мінска рэвалюцыйныя падзеі і знамянальныя даты. Як усенароднае свята працоўныя Мінска адзначылі 15-годдзе з дня вызвалення Беларусі ад польскіх акупантаў і ўзнагароджанне БССР ордэнам Леніна.

У час выбарчых кампаній у клубах адбыліся сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты, урачыстыя сходы, вечары мастацкай самадзейнасці, кінафестывалі, канцэрты, працавалі гурткі па вывучэнню Канстытуцый СССР і БССР, палажэння аб выбарах.

Агітацыйна-масавая работа ўмела спалучалася з папулярызацыяй вопыту стаханаўцаў, з павышэннем агульнай палітычнай і тэхнічнай пісьменнасці рабочага класа. У 1934 годзе завод «Бальшавік» стаў прадпрыемствам суцэльнай тэхнічнай вучобы. Тэхнічнай вучобай на швейнай фабрыцы «Кастрычнік» было ахоплена 700 рабочых. Масавы паход за авалоданне тэхнікай умела арганізоўвалі на шчотачнай фабрыцы імя Крупскай.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны ў горадзе ствараецца шырокая бібліятэчная сетка. У 1921 годзе арганізуецца бібліятэка Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1922 годзе яна перайменавана ў Беларускую дзяржаўную і універсітэцкую бібліятэку. У 1926 годзе яе вылучылі са складу БДУ ў самастойную дзяржаўную

бібліятэку, а ў 1932 годзе рэарганізавалі ў Дзяржаўную бібліятэку БССР і прысвоілі імя У. І. Леніна. Для бібліятэкі пабудаван спецыяльны будынак на Чырвонаармейскай вуліцы. Тут меліся чытальная зала на 400 чалавек, зала для навуковых супрацоўнікаў, вучэбныя кабінеты, аддзелы кнігасховішча.

За кароткі тэрмін Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна ператварылася ў сапраўдную скарбніцу культуры. Яе кніжны фонд з канца 1932 да пачатку 1938 года павялічыўся з аднаго да 1,8 мільёна тамоў разнастайнай літаратуры. Хутка расла колькасць чытачоў. Штодзённа бібліятэка абслугоўвала 1800 чалавек. Тысячы кніг атрымлівалі працоўныя рэспублікі па міжбібліятэчнаму абанементу.

Пры Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна быў створан даведачна-бібліяграфічны аддзел, Беларуская кніжная палата, у задачу якой уваходзіла распаўсюджанне друкаваных выданняў БССР па кніжных сховішчах рэспублікі. У Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі дзейнічалі філіялы, у раённых бібліятэках — кансультацыйныя пункты.

Буйнымі былі гарадская бібліятэка імя Горкага пры Доме ўрада, Фундаментальная бібліятэка АН БССР, бібліятэка Беларускага дзяржаўнага універсітэта і іншых вышэйшых навучальных устаноў. Шырокая сетка бібліятэк створана на прадпрыемствах і ў клубах горада. Напрыклад, бібліятэка клуба металістаў абслугоўвала рабочых заводаў «Камунар», «Ударнік», ланцугоў Галя, пратэзных майстэрняў і іншых прадпрыемстваў. У яе фондах налічвалася каля 25 тысяч кніг, якімі карысталіся больш 1800 чытачоў.

Бібліятэкі наладжвалі для рабочых літаратурныя вечары, вечары тэхнічнай кнігі, абслугоўвалі іх перасоўкамі, дастаўлялі кнігі на рабочыя месцы.

Важным сродкам выхавання працоўных з'яўляліся музеі. Да 1917 года ў Мінску іх фактычна не было. 20 снежня 1922 года адкрыўся Беларускі дзяржаўны музей. У ім былі сабраны каштоўныя калекцыі па археалогіі і этнаграфіі Беларусі. Толькі на працягу першых трох год музей наведала 1100 экскурсій, каля 45 тысяч чалавек. Наведванне яго ўзрастала з кожным годам.

У 1923 годзе створан Музей I з'езду РСДРП. За 15 год яго наведалі звыш 100 тысяч экскурсантаў з розных гарадоў краіны. У 1926 годзе адкрыўся Музей рэвалюцыі. Працоўныя Мінска выявілі вялікую цікавасць таксама да карціннай галерэі і музея Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У камуністычным выхаванні мае вельмі вялікая роля належыць друку. Створанае ў Мінску ў снежні 1920 года Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выдавала рэспубліканскія газеты «Звезда», «Советская Белоруссия», «Белорусская деревня», «Известия ЦИК Белорус-

сии», «Векер» (на яўрэйскай мове), «Молат» (на польскай мове), часопіс «Известия ЦК КП(б)Б», 10 павятовых газет, а таксама брашуры, кнігі, плакаты. Гадавы тыраж мінскіх газет склаў у 1921 годзе каля 2,5 мільёна, а ў першым паўгоддзі 1923 года — тры мільёны экземпляраў.

У гады разгорнутага будаўніцтва сацыялізма ў Мінску пачынаюць выходзіць маладзёжная газета «Чырвоная змена», піянерская газета «Піянер Беларусі», «Літаратура і мастацтва», часопісы «Большевик Белоруссии», «Полымя рэвалюцыі» і інш. Большая частка газет і часопісаў выдавалася на беларускай мове.

Вялікі попыт у насельніцтва мелі газеты «Правда», «Известия ВЦИК», «Беднота», часопіс «Большевик» і многія іншыя цэнтральныя выданні. У перыядычным друку публікаваліся даклады і выступленні У. І. Леніна на з'ездах і канферэнцыях Камуністычнай партыі, кангрэсах Камінтэрна, з'ездах Саветаў і прафсаюзаў, рабочых сходах.

На старонках газет і часопісаў растлумачваліся важнейшыя рашэнні партыі і Савецкага ўрада, бягучыя гаспадарчыя мерапрыемствы, пытанні рэканструкцыі народнай гаспадаркі і будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Многа месца адводзілася міжнароднаму рабочаму руху, памятным датам, рэвалюцыйным падзеям. У рэспубліканскім друку змяшчаліся ўспаміны дзеячаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб тым, як стваралася, расла і загартоўвалася Камуністычная партыя, як вяла яна працоўных ад перамогі да перамогі. На канкрэтных гістарычных матэрыялах раскрывалася роля народных мас у рэвалюцыйным руху і будаўніцтве сацыялістычнага грамадства. Вялікімі тыражамі выдаваліся лістоўкі, адозвы, плакаты, брашуры, прысвечаныя розным палітычным і вытворчым пытанням.

Партыйныя арганізацыі ўмела выкарыстоўвалі ў выхаванні працоўных шматтыражныя і насценныя газеты. Першая насценная газета з'явілася ў 1923 годзе на заводзе «Дрэваапрацоўшчык». У 1927 годзе на агульнагарадской выстаўцы было прадстаўлена 117 такіх газет. У 1928—1929 гадах выйшлі з друку першыя шматтыражкі. У 1931 годзе ў Мінску выходзіла 20 шматтыражных газет.

Масавымі тыражамі выдавалася палітычная, сацыяльна-эканамічная, мастацкая, навуковая, вучэбная, тэхнічная і сельскагаспадарчая літаратура. Асобая ўвага аддавалася распаўсюджанню твораў класікаў марксізма-ленінізма, перш за ўсё твораў і асобна выданых прац У. І. Леніна.

У 1925 годзе шэраг прац У. І. Леніна, у тым ліку «Аб кааперацыі», «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме», «Задачы саюзаў моладзі» і іншыя, упершыню выдадзены на беларускай мове.

Аб развіцці выдавецкай справы ў Мінску можна меркаваць па даных аб выпуску літаратуры Белдзяржвыдавецтвам. З ліпеня 1924 да ліпеня 1926 года выйшла з друку 412 выданняў агульным тыражом 2652 тысячы экземпляраў. У 1934—1936 гадах колькасць выданняў павялічылася да 1798, тыраж — да 18 465 тысяч экземпляраў.

Важным сродкам ідэалагічнага выхавання стала радыё. Першая шырокавяшчальная радыёстанцыя (імя Саўнаркома БССР) пабудавана ў Мінску ў 1925 годзе. 15 лістапада 1925 года пасля ўрачыстага адкрыцця яна перадала першы радыёканцэрт. У горадзе дзейнічала 20 клубных радыёўстановак з гучнагаварыцелямі, было ўстаноўлена 400 радыёпрыёмнікаў. Радыус дзеяння станцыі не перавышаў 300 вёрст.

У гады першай і другой пяцігодак у Мінску былі радыёфікаваны ўсе клубы, школы, інтэрнаты, прадпрыемствы і ўстановы, шматлікія кватэры працоўных. У 1935 годзе налічвалася звыш шасці тысяч радыёкропак, былі змантіраваны радыёвузлы на радзе прадпрыемстваў. Асаблівая ўвага ўдзялялася радыёфікацыі ўскраін горада і бліжэйшых калгасаў.

Такім чынам, нягледзячы на вялікія цяжкасці, у культурна-палітычнай асвеце ў перыяд 1921—1937 гадоў былі дасягнуты буйныя поспехі. Значна ўзрос культурны ўзровень, павысілася палітычная і вытворчая актыўнасць працоўных. Пераважная колькасць рабочых Мінска актыўна ўдзельнічала ў будаўніцтве сацыялізма. Сацыялістычная ідэалогія атрымала поўную перамогу. Створана маральнае і палітычнае адзінства народа. Гэтыя перамогі мелі вялікае гістарычнае значэнне.

3. Вышэйшая школа і навука

Для Савецкай дзяржавы выключнае значэнне мела падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, цесна звязаных з народам, да канца адданых яму. Не вырашыўшы гэтай праблемы, немагчыма было ажыццявіць будаўніцтва сацыялістычнай народнай гаспадаркі і культуры ў нашай краіне. Таму вышэйшая адукацыя, якая з'яўлялася да рэвалюцыі манаполіяй эксплуататарскіх класаў, была рэарганізавана. Савецкая дзяржава адкрыла рабочым і сялянам шырокі доступ у інстытуты і універсітэты. Для падрыхтоўкі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы працоўных, якія не мелі сярэдняй адукацыі, былі створаны рабочыя факультэты.

Партыя і ўрад у першыя гады Савецкай улады клапаціліся аб стварэнні вышэйшай школы ў нацыянальных рэспубліках, у тым ліку

і ў Беларусі, якая не мела да рэвалюцыі ніводнай вышэйшай навучальнай установы.

У хуткім часе пасля вызвалення Мінска ад польскіх акупантаў быў створан Політэхнічны інстытут. Вострая патрэба ў сельскагаспадарчых кадрах, адсутнасць у Беларусі буйной прамысловасці з'явіліся прычынай рэарганізацыі ў 1922 годзе першай вышэйшай навучальнай установы рэспублікі ў Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай гаспадаркі. У 1925 годзе ён аб'яднаўся з сельскагаспадарчым інстытутам у Горках.

11 ліпеня 1921 года на ўрачыстым пасяджэнні партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый, прысвечаным першай гадавіне вызвалення Мінска ад палякаў, быў зачытан дэкрэт Савецкага ўрада аб заснаванні Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля выступленняў прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый сход паслаў віншавальную тэлеграму У. І. Леніну.

У ліпені 1921 года пачаліся заняткі на рабочым факультэце, 1 лістапада — на медыцынскім факультэце і факультэце грамадскіх навук. На медыцынскі факультэт і факультэт грамадскіх навук (з гісторыка-лінгвістычным, грамадска-педагагічным, эканамічным і прававым аддзяленнямі) было прынята звыш 1000, на рабочы факультэт — 300 студэнтаў. Палавіну студэнтаў універсітэта складалі мінчане, астатнія прыехалі з іншых гарадоў і паветаў Беларусі.

Пры універсітэце былі абсталяваны фізічны кабінет, хімічная лабараторыя, анатамічны тэатр. Вялікую дапамогу прафесарска-выкладчыцкімі кадрамі, лабараторным абсталяваннем, навуковай літаратурай аказалі Маскоўскі, Петраградскі, Кіеўскі і іншыя універсітэты краіны.

Народны камісарыят асветы РСФСР выдаткаваў універсітэту значныя сродкі, перадаў вялікія бібліятэчныя фонды шэрага універсітэтаў краіны, Акадэміі навук і Цэнтральнай кніжнай палаты.

У першым навучальным годзе ва універсітэце працаваў 81 выкладчык, у тым ліку 14 прафесараў, якія прыехалі з Масквы, Петраграда, Смаленска і іншых гарадоў краіны: У. М. Перцаў, М. М. Нікольскі, Ц. М. Годнеў, С. М. Мялкіх, Б. Н. Беркенгейм і іншыя вядомыя вучоныя. Рэктарам універсітэта быў назначан прафесар У. І. Пічэта.

У першыя гады універсітэт цярпеў значныя цяжкасці. Адсутнічалі выкладчыкі па шэрагу спецыяльнасцей. Не хапала лабараторнага абсталявання і мэблі. Універсітэт займаў будынкі, непрыстасаваныя для заняткаў і размешчаныя ў розных канцах горада. Факультэт грамадскіх навук, напрыклад, змяшчаўся ў чатырох пакоях былога прыватнага рэальнага вучылішча. Спачатку не было ні цвёрдых вучэбных планаў, ні праграм. Заняткі праводзіліся ў адпаведнасці з наяўнасцю выкладчыкаў, вечарам.

Студэнты, прафесары і выкладчыкі працавалі з вялікім энтузіязмам. Першыя заняткі нагадвалі публічныя лекцыі. Аўдыторыі былі перапоўнены. Сюды ішлі моладзь і людзі саліднага ўзросту. «У вялікай большасці слухачоў,— пісаў У. М. Перцаў,— адчуваўся вялікі ўздым, літаральна цягаценне да навукі, і гэта захоплівала выкладчыкаў».

Паступова ўмацоўвалася матэрыяльная база універсітэта. У 1925/26 навучальным годзе яго бюджэт павялічыўся у пяць разоў, перавысіўшы адзін мільён рублёў. Наладзіўся вучэбны працэс, паявіліся вучэбныя планы і праграмы. Заняткі к гэтаму часу праводзілі 40 прафесараў, 40 дацэнтаў і выкладчыкаў, 39 асістэнтаў і 50 ардынатараў.

У 1922 годзе факультэт грамадскіх навук раздзялілі на факультэты і аддзяленні з добра акрэсленымі профілямі. Быў адкрыт педагагічны факультэт. У 1925 годзе створан факультэт народнай гаспадаркі і савецкага права.

У 1925 годзе універсітэт выпусціў першую групу спецыялістаў, а ў 1926 годзе адзначыў свой пяцігадовы юбілей. За гэты перыяд падрыхтавана звыш 700 спецыялістаў — юрыстаў, эканамістаў, педагогаў, урачоў. К гэтаму часу ва універсітэце навучалася каля трох тысяч студэнтаў, налічвалася 11 клінік, 8 лабараторый, 17 спецыяльных кабінетаў.

Універсітэт стаў буйным культурным цэнтрам. Яго калектыў праводзіў вялікую навуковую і культурна-асветную работу ў Мінску і сельскай мясцовасці. Выкладчыкі і студэнты, сярод якіх было нямала камуністаў і камсамольцаў, актыўна ўдзельнічалі ў рабоце лектарскіх груп, таварыстваў «Прэч непісьменнасць» і «Бязбожнік». Толькі ў 1926 годзе студэнты і выкладчыкі арганізавалі 316 пунктаў ліквідацыі непісьменнасці, у якіх навучаліся 1339 рабочых горада. У час летніх канікул 1925 года больш тысячы студэнтаў БДУ праводзілі работу сярод камсамольцаў, у хатах-чытальнях, сельсаветах, кіравалі гурткамі па ліквідацыі непісьменнасці, культасветгурткамі, стваралі вячэрнія школы.

У 1925 годзе на базе Вышэйшай партыйнай школы ў Мінску быў арганізаван Камуністычны універсітэт імя У. І. Леніна, які рыхтаваў для рэспублікі кадры партыйных і савецкіх работнікаў. Такім чынам, к канцу аднаўленчага перыяду з чатырох вышэйшых навучальных устаноў Беларусі тры знаходзіліся ў Мінску.

Гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва, ажыццяўленне плана індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі патрабавалі далейшага развіцця вышэйшай адукацыі. Пасля шахцінскай справы (1928 год) праблема падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў з асяроддзя рабочых і сялян стала асабліва востра. Аднак

існаваўшая ў той перыяд сетка вышэйшых навучальных устаноў не магла забяспечыць вырашэння гэтай задачы.

Ліпеньскі (1928 года) і лістападаўскі (1929 года) Пленумы ЦК ВКП(б) намецілі канкрэтную праграму барацьбы за карэннае паляпшэнне ўсёй сістэмы падрыхтоўкі кадраў у адпаведнасці з задачамі і тэмпамі развіцця народнай гаспадаркі краіны. Асобае значэнне надавалася перабудове тэхнічнай адукацыі.

У Мінску ў адпаведнасці з рашэннямі ЦК ВКП(б) была павялічана сетка вышэйшых навучальных устаноў. На базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 1930 годзе быў створан медыцынскі, у 1931 годзе — педагагічны, юрыдычны, планава-эканамічны, фінансава-эканамічны і кааператыўны інстытуты.

Хіміка-тэхналагічны факультэт універсітэта, створаны ў 1928 годзе, рэарганізавалі ў самастойны Хіміка-тэхналагічны інстытут. З'явіліся ў Мінску і галіновыя тэхнічныя вышэйшыя навучальныя ўстановы: будаўнічая, харчовая, энергетычная, тарфяная.

Адпак на практыцы галіновыя інстытуты не апраўдалі сябе. З-за распылення навукова-педагагічных сіл і матэрыяльных сродкаў пагоршылася якасць падрыхтоўкі кадраў. У сакавіку 1932 года II аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б) Беларусі, адзначыўшы значныя дасягненні ў падрыхтоўцы кадраў пралетарскай інтэлігенцыі, указаў у той жа час на памылкі і скажэнні ў рабоце вышэйшых навучальных устаноў, паставіў задачу палепшыць падрыхтоўку спецыялістаў, каб к канцу другой пяцігодкі поўнасцю забяспечыць патрэбы ў іх народнай гаспадаркі рэспублікі.

Партыйныя і савецкія арганізацыі прарабілі вялікую работу па ліквідацыі недахопаў у будаўніцтве вышэйшай школы. На базе дробных вышэйшых навучальных устаноў ствараліся буйныя навуковыя ўстановы. Так, планава-эканамічны, фінансава-эканамічны і кааператыўны галіновыя інстытуты ў 1933 годзе аб'ядналі ў Інстытут народнай гаспадаркі, а вышэйшыя навучальныя ўстановы тэхнічнага профілю — у Політэхнічны інстытут.

У сувязі з неабходнасцю расшырэння і паляпшэння падрыхтоўкі кваліфікаваных кіруючых кадраў для сацыялістычнай сельскай гаспадаркі Камуністычны універсітэт у 1932 годзе быў пераўтворан у Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу. У 1932 годзе створана Кансерваторыя, у 1935 — Настаўніцкі інстытут, затым Камуністычны інстытут журналістыкі і Інстытут фізкультуры.

У гады першай пяцігодкі атрымала пуцёўку ў жыццё завочнае навучанне. Пры педагагічным факультэце БДУ ў 1929 годзе з'явілася першае ў Мінску завочнае аддзяленне. Пры Беларускім камуністычным універсітэце быў створан завочны камвуз, пераўтвораны ў 1931 годзе ў Беларускі інстытут масавага завочнага навучання.

Вялікую работу прарабілі партыйныя і савецкія арганізацыі па паляпшэнню якаснага складу студэнтаў. Першачарговую ролю ў папаўненні вышэйшых навучальных устаноў рабоча-сялянскай моладдзю адыгралі рабочыя факультэты. У 1924 годзе, напрыклад, на рабфаку БДУ займаліся 306 рабочых і 110 сялян. Сярод іх было 138 камуністаў і 152 камсамольцы. За 10 год рабфак БДУ скончылі 850 чалавек.

Сетка рабочых факультэтаў асабліва бурна расла ў гады першай пяцігодкі. Ствараліся яны часта непасрэдна на прамысловых прадпрыемствах. Так, на рабфаку пры Мінскім станкабудаўнічым заводзе ў 1930 годзе займалася звыш 700 рабочых. У 1933 годзе на 11 рабфаках горада навучалася 2,5 тысячы студэнтаў. Вышэйшыя навучальныя ўстановы Мінска стварылі свае рабфакі ў Барысаве, Бабруйску, Дуброўне і іншых гарадах і рабочых пасёлках рэспублікі.

У першыя гады Савецкай улады рабочая праслойка ў вышэйшых навучальных установах была нязначнай. У 1926/27 навучальным годзе сярод студэнтаў рабочых налічвалася 15, сялян 32, служачых 41 працэнт.

Для вызвалення ад класава варожых элементаў і ад студэнтаў, палітычна непісьменных або якія не спраўляюцца з вучэбнай нагрузкай, у вышэйшых навучальных установах перыядычна праводзілася чыстка. Пасля першай чысткі, якая адбылася ў чэрвені 1924 года, з медфака універсітэта было выключана 23, з педфака 21, з факультэта грамадскіх навук 48, з сельскагаспадарчага інстытута 30 працэнтаў студэнтаў. У выніку гэтага значна змяніўся сацыяльны склад студэнтаў, узрасла ўдзельная вага рабочых і сялян.

Сацыяльны склад студэнтаў змяніўся карэнным чынам пасля ажыццяўлення рашэнняў пленумаў ЦК ВКП(б) аб вышэйшай школе. У 1928—1933 гадах праведзена масавая мабілізацыя ў вышэйшыя навучальныя ўстановы сярод членаў і кандыдатаў партыі, камсамольцаў і рабочых. У 1930/31 навучальным годзе сярод паступаючых ва універсітэт рабочыя складалі 50, сяляне-беднякі, сераднякі і калгаснікі 30, служачыя 20 працэнтаў. Пераважалі беларусы.

Беларускі дзяржаўны універсітэт, нягледзячы на рэарганізацыю, працягваў безупынна расці. У сувязі з 10-годдзем універсітэта 24 выкладчыкі за заслугі ў падрыхтоўцы кадраў, развіцці навукі і тэхнікі былі ўзнагароджаны ордэнамі Савецкага Саюза і Ганаровымі граматамі СНК БССР.

За дзесяць год універсітэт падрыхтаваў больш трох тысяч спецыялістаў, у тым ліку 695 урачоў, 528 біёлагаў, 316 фізікаў і матэматыкаў, 336 лінгвістаў, 476 выкладчыкаў грамадскіх навук, 665 юрыстаў і эканамістаў.

У 1931 годзе ва універсітэце былі створаны фізіка-матэматычны, хімічны і біялагічны факультэты. На яго была ўскладзена задача падрыхтоўкі навуковых кадраў і настаўнікаў для сярэдняй школы. У 1934 годзе ў сувязі з пастановамі ЦК ВКП(б) аб выкладанні ў школе гісторыі і геаграфіі былі адкрыты гістарычны і геаграфічны факультэты БДУ.

У 1935 годзе ва універсітэце навучалася 890 студэнтаў. Асігнаванні дзяржавы на БДУ перавысілі ў 1929/30 навучальным годзе 2350 тысяч рублёў.

Беларускі дзяржаўны універсітэт адыграў вялікую ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі, у развіцці навукі, літаратуры і мастацтва ў БССР.

Прафесары універсітэта М. М. Нікольскі, У. І. Пічэта, У. М. Перцаў, М. А. Прыляжаеў, І. Г. Цітоў, Д. А. Маркаў, В. А. Ляонаў, Ц. М. Годнеў, С. М. Мялкіх з'яўляліся правадзейнымі членамі і членамі-карэспандэнтамі АН БССР. Многія выхаванцы універсітэта сталі навуковымі супрацоўнікамі Акадэміі навук БССР. Вялікую дапамогу кадрамі аказаў універсітэт навукова-даследчым інстытутам прамысловасці і сельскай гаспадаркі, вышэйшым навучальным установам, тэхнікумам і сярэднім школам рэспублікі. Выхаванцамі БДУ з'яўляюцца пісьменнікі і паэты Паўлюк Трус, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, вядомыя дзяржаўныя дзеячы і вучоныя.

Буйной тэхнічнай навучальнай установай стаў Беларускі політэхнічны інстытут. Ужо ў 1933 годзе на чатырох факультэтах інстытута рыхтаваліся інжынеры васьмі спецыяльнасцей. На 20 кафедрах працавалі каля 120 выкладчыкаў, у тым ліку шэсць прафесараў і 31 дацэнт. На ўсіх курсах навучалася 1200 студэнтаў. За параўнальна кароткі тэрмін створана матэрыяльна-тэхнічная база, неабходная для вучэбнай і навуковай работы.

Політэхнічны інстытут быў адзінай у Беларусі вышэйшай навучальнай установай, якая забяспечыла рэспубліку кваліфікаванымі тэхнічнымі кадрамі. Ён штогод выпускаў у сярэднім 400 інжынераў металаапрацоўчай, тарфяной, будаўнічай і хімічнай прамысловасці. Яго выпускнікі склалі касцяк нацыянальных інжынерна-тэхнічных кадраў, якія прынялі актыўны ўдзел у індустрыялізацыі рэспублікі.

Сапраўднай кузняй кадраў аховы здароўя стаў Беларускі медыцынскі інстытут.

Сталіца Беларусі за гады сацыялістычнага будаўніцтва стала буйнейшым у рэспубліцы цэнтрам навукова-даследчай работы. Пачатак навуковым даследаванням у Мінску паклаў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Тут у першыя гады Савецкай улады і ўпершыню ў гі-

сторыі Беларусі праводзіліся даследаванні ў галіне хімічных, фізіка-тэхнічных і біялагічных навук, зарадзілася гістарычная навука.

Першай навукова-даследчай установай Мінска быў створаны ў 1922 годзе Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). У ім былі сканцэнтраваны лепшыя навуковыя сілы рэспублікі. У Інбелкульце ў 1926 годзе працавалі секцыі па вывучэнню беларускай мовы і літаратуры, беларускага мастацтва, рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, сацыяльна-гістарычная, медыцынская, сельскагаспадарчая, прыродазнаўства (з падсекцыямі хіміі, фізікі, геолага-глебазнаўчай, матэматыкі, геаграфіі, батанікі, заалогіі). У гэты час у інстытуце налічвалася 224 супрацоўнікі. К рабоце ў ім было прыцягнута таксама каля 200 выкладчыкаў вышэйшай школы рэспублікі.

За час свайго існавання інстытут правёў рад важных даследаванняў. Да стварэння Акадэміі навук БССР ён з'яўляўся цэнтральнай навукова-даследчай установай рэспублікі.

У пачатку 1927 года ў Мінску створан Інстытут сельскай гаспадаркі імя У. І. Леніна, які ўзначаліў навукова-даследчую работу сельскагаспадарчых доследных станцый — Мінскай балотнай, Лошыцкай пладаягаднай, Мінскай машынавыпрабавальнай і інш. Навуковыя даследаванні праводзілі таксама музеі горада, Мікрабіялагічны інстытут, Інстытут фізіятрыі і артапедыі, іншыя медыцынскія ўстановы.

У гады сацыялістычнай рэканструкцыі патрабаванні да навукі вельмі ўзраслі. Развіццё навукі пачалі планаваць у адпаведнасці з запатрабаваннямі народнай гаспадаркі. Умацаваліся сувязі з практыкай. Ствараюцца Навукова-даследчы інстытут прамысловасці, Інстытут харчовай прамысловасці, Гідраметэаралагічны інстытут, Інстытут аховы здароўя, Балотны інстытут і іншыя навуковыя ўстановы. Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі пераўтворан у Інстытут сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. З 42 навукова-даследчых устаноў, якія дзейнічалі ў Беларусі на 1 студзеня 1934 года, 28 знаходзіліся ў Мінску.

Вялікай падзеяй у жыцці беларускага народа было адкрыццё ў Мінску 1 студзеня 1929 года Акадэміі навук БССР, створанай на базе Інбелкульта. Спачатку ў Акадэміі захоўвалася структура Інбелкульта. У інстытутах, камісіях, на кафедрах працавала 239 чалавек. Яны вывучалі геалагічную будову тэрыторыі БССР, праводзілі глебавыя, геабатанічныя здымкі і іншыя даследаванні. У аддзеле гуманітарных навук першаступеннае значэнне надавалася вывучэнню гісторыі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры.

Сярод першых акадэмікаў АН БССР былі віднейшы геолаг нашай краіны А. П. Карпінскі, буйны вучоны-глебавед і аграном В. Р. Вільямс, класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас, бела-

рускі пісьменнік Цішка Гартны, беларускія вучоныя У. І. Пічэта, М. Ф. Вялядуха, С. Я. Вальфсон, С. М. Вышалескі.

Установы Акадэміі навук БССР спачатку былі малалікімі. Найбольш буйнымі лічыліся Інстытут геалогіі (40 чалавек) і Інстытут хіміі (16 чалавек).

У 1931—1932 гадах шматлікія камісіі і кафедры Акадэміі навук рэарганізаваны ў 14 інстытутаў: філасофіі, мовазнаўства, літаратуры і мастацтва, гісторыі, савецкага будаўніцтва і права, эканомікі, яўрэйскай пралетарскай культуры, польскай пралетарскай культуры, біялагічных навук, аграглебавы, хіміі, геалогіі, фізіка-тэхнічны, псіханеўралогіі. Былі таксама створаны літоўскі і латышскі сектары, камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі, выдавецтва, бібліятэка, цэнтральнае краязнаўчае бюро.

Акадэмія навук БССР планавала і кантралявала работу ўсіх навукова-даследчых устаноў Беларусі. У 1931 годзе пры АН БССР створан інстытут аспірантуры. За 1931—1934 гады ён падрыхтаваў для навукова-даследчых устаноў рэспублікі больш 100 навуковых супрацоўнікаў.

К рабоце ў АН БССР прыцягваліся буйнейшыя вучоныя рэспублікі і краіны. У 1932—1936 гадах акадэмікамі былі абраны вялікі савецкі пісьменнік Максім Горкі, вядомыя вучоныя — мовавед М. Я. Мар, гісторыкі М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, А. М. Панкратава, В. А. Сербента, В. К. Шчарбакоў, спецыялісты фізіка-матэматычных навук М. С. Акулаў, Ц. Л. Буретын, Ю. А. Вейс, К. В. Гораў, хімікі А. К. Кедраў-Зіхман, М. А. Прыляжаеў, У. В. Шкатэлаў, медыкі І. Г. Цітоў, Д. А. Маркаў і інш.

За гады першай і другой пяцігодак Мінск ператварыўся ў буйны рэспубліканскі навукова-даследчы цэнтр. К канцу першай пяцігодкі навуковай работай займалася ў горадзе каля 900 чалавек, амаль дзве трэці навуковых супрацоўнікаў Беларусі.

Навуковую работу праводзілі таксама вышэйшыя навучальныя ўстановы горада. З 1922 па 1935 год Беларускі дзяржаўны універсітэт выдаў 28 тамоў навуковых прац («Працы ВДУ»). Вялікую навукова-даследчую работу (вырашэнне тэарэтычных праблем, вывучэнне вопыту эксплуатацыі савецкай і зарубежнай тэхнікі, распрацоўка праектаў новых машын і механізмаў) праводзіў калектыў Політэхнічнага інстытута. Навуковымі супрацоўнікамі Мінскага медыцынскага інстытута было напісана за гады пяцігодак каля дзвюх тысяч навуковых прац (дысертацый, манаграфій, падручнікаў, артыкулаў у навуковых зборніках і часопісах).

Вучоныя Мінска сумесна з навуковымі сіламі рэспублікі праводзілі даследаванні па ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры БССР. Вялікую работу прарабілі яны па вывучэнню энергетычных

і сыравінных рэсурсаў Беларусі, што мела першараднае значэнне для развіцця прамысловасці БССР. Дзякуючы шматгадовым даследаванням энергетыкаў, напрыклад, торф стаў выкарыстоўвацца як энергетычная сыравіна.

Вялікі ўклад у развіццё хімічных навук унеслі прафесары М. А. Прыляжаеў і У. В. Шкатэлаў. Працы У. В. Шкатэлава паклалі пачатак шырокаму развіццю ў нашай краіне надсернай галіны лясной гаспадаркі. Прафесар М. А. Прыляжаеў стварыў новы метад даследавання ажыццяўленнем неарганічных злучэнняў арганічнымі рэакцыямі, які стаў вядомы ў навуцы пад назвай «рэакцыі Прыляжаева». Гэты метад быў шырока выкарыстан у Савецкім Саюзе і за мяжой для атрымання новых арганічных злучэнняў.

Вучоныя Мінска, выкарыстоўваючы новыя метады даследаванняў, якія былі распрацаваны савецкімі геолагамі, у кароткі тэрмін вывучылі асаблівасці геалагічнай будовы тэрыторыі БССР.

Беларускі дзяржаўны універсітэт многа зрабіў для развіцця фізіка-матэматычных навук. У 1920 годзе прафесар Е. Е. Сіроцін са студэнтамі старшых курсаў правёў на тэрыторыі БССР геамагнітныя назіранні. Прафесар Е. В. Спіткоў напісаў першы арыгінальны дапаможнік па радыётэхніцы на беларускай мове.

Няўхільна развіваліся біялагічныя навукі. У 1931 годзе О. С. Паляшэкая апублікавала вялікую працу «Састаў флоры Беларусі». Былі таксама складзены геабатанічныя і флорыстычныя карты рэспублікі, распачаты работы па стварэнню Цэнтральнага батанічнага саду АН БССР.

Сельскагаспадарчыя навукова-даследчыя ўстановы разам з доследнымі станцыямі правялі цэлую серыю даследаванняў па вывучэнню глебавага покрыва рэспублікі, павышэнню ўрадлівасці глеб, больш эфектыўнаму выкарыстанню мінеральных угнаенняў, палепшэнню ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. Паспяхова развівалася ў Мінску медыцынская навука.

Значную работу прарабілі вучоныя Мінска ў галіне грамадскіх навук. У гады Савецкай улады ўпершыню стала сістэматычна, з марксісцкіх пазіцый вывучацца гісторыя БССР. У 1924 годзе апублікавана «Гісторыя Беларусі» — вынік шматгадовай працы акадэміка У. І. Пічэты. У першай палове 20-х гадоў выданы «Гісторыка-археалагічны зборнік» і два тамы дакументаў па гісторыі Беларусі. У 1926 годзе выйшла ў друку праца «Народная гаспадарка Беларусі ў 1861—1914 гадах» М. В. Доўнар-Запольскага. Над гісторыяй Камуністычнай партыі Беларусі працаваў Інстытут гісторыі партыі, створаны ў 1923 годзе. У распаўсюджанні марксісцкай тэорыі вялікую ролю адыгралі Камуна імя У. І. Леніна, «Беларускае марксісцкае таварыства» і «Таварыства гісторыкаў-марксістаў».

Прыкметны ўклад у гістарычную навуку ўнеслі дзве кнігі А. Дудкова па гісторыі развіцця капіталізму ў Беларусі, апублікаваныя ў пачатку 30-х гадоў, працы У. І. Пічэты, А. Ясінскага і іншых вучоных, прысвечаныя гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў XV—XVI стагоддзях. Сур'ёзныя даследаванні па ўсеагульнай гісторыі праведзены М. М. Нікольскім і У. М. Перцавым.

У 1934—1935 гадах выйшлі з друку два тамы «Матэрыялаў да гісторыі мануфактуры Беларусі ў час феадалізму», у 1937 годзе — першы том «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах», зборнік дакументаў аб Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі.

Каштоўны ўклад у гістарычную навуку ўнеслі археолагі, якія праводзілі даследаванні і раскопкі пад кіраўніцтвам К. М. Палікарповіча.

Цэлы рад даследаванняў апублікавалі філосафы. Мовазнаўцы Мінска стварылі руска-беларускі слоўнік, распрацавалі новыя правілы беларускага правапісу. Паспяхова працавалі літаратуразнаўцы і этнографы.

У выніку культурнай рэвалюцыі, ажыццёўленай у нашай краіне, Мінск стаў буйным навуковым цэнтрам. Дасягненні навуковых і вышэйшых навучальных устаноў Мінска садзейнічалі развіццю народнай гаспадаркі, навукі і культуры БССР.

4. Літаратурнае жыццё горада

Пераход ад грамадзянскай вайны да мірнага сацыялістычнага будаўніцтва спрыяльна адбіўся на актывізацыі літаратурнага жыцця Мінска. У тыя гады ў сталіцы адбываўся працэс збірання і росту літаратурных сіл. Тут разгарнулі сваю творчую дзейнасць Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Змітрок Бядуля, Янка Журба, Алесь Гурло, Міхась Лынькоў і іншыя беларускія пісьменнікі.

Пачаўся масавы прыток у літаратуру новых пісьменнікаў з народа. Са сваімі першымі кнігамі выступілі Паўлюк Трус, Кандрат Крапіва, Кузьма Чорны, Пятро Глебка. Беларускія савецкія пісьменнікі імкнуліся глыбей зразумець цяжкое мінулае свайго народа, адлюстраваць гераіку сацыялістычнага будаўніцтва. Абапіраючыся на дэмакратычныя традыцыі беларускай, рускай і сусветнай літаратур, узбагачаючыся творчым вопытам усёй савецкай літаратуры, пісьменнікі Мінска паступова авалодвалі метадам сацыялістычнага рэалізму, больш поўна і ўсебакова адлюстроўвалі жыццё працоўных — барацьбітоў за камунізм. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, у ходзе сацыялістычнага будаўніцтва яны разам з усімі пісьменнікамі рэс-

публікі стваралі і развівалі беларускую савецкую літаратуру, нацыянальную па форме, сацыялістычную па зместу.

Натхнёным песняром Савецкай Беларусі стаў Янка Купала. Ужо ў такіх яго вершах 1921 года, як «На смерць Сцяпана Булата», «З новым годам», «Ад мінскіх дзяцей» выразна акрэсліўся пералом у творчасці паэта, яго імкненне адлюстраваць гераічную яву савецкай рэчаіснасці.

Вершы Янкі Купалы, якія ўвайшлі ў зборнік «Безназоўнае» (1925), былі прасякнуты рэвалюцыйным пафасам і сведчылі аб ідэйна-творчым росце паэта. Верш з гэтага зборніка «Арлянятам» А. В. Луначарскі назваў адным з гімнаў Янкі Купалы, у якім «цалкам адлюстроўваецца яго цяперашняя рэвалюцыйная радасць».

У 1925 годзе за выдатныя заслугі ў галіне літаратуры ўрад рэспублікі прысвоіў Янку Купалу званне народнага паэта БССР.

У 1922 годзе Якуб Колас завяршыў вялікую паэму «Новая зямля», распачатую яшчэ ў 1910 годзе. Пазней ён нанава перапрацаваў паэму «Сымон-музыка» (1924), напісаў аповесць «У палескай глушы» (1923), вялікую колькасць апавяданняў і вершаў. Усе яны сведчылі аб тым, што паэт паспяхова авалодаў метадам сацыялістычнага рэалізму, больш яскрава і ўсебакова паказваў жыццё беларускага народа і яго барацьбу за шчаслівае будучае.

У 1926 годзе за вялікія заслугі перад Савецкай Беларуссю Якубу Коласу прысвоена званне народнага паэта БССР.

Цішка Гартны, Алесь Гурло і Янка Журба ў сваіх вершах услаўлялі новае жыццё і радасць працы вызваленага беларускага народа.

Адзін са старэйшых беларускіх пісьменнікаў Змітрок Бядуля ў пачатку 20-х гадоў паступова вызваляецца ад нацыяналістычных памылак, дапушчаных ім у гады грамадзянскай вайны, стварае творы, у якіх імкнецца правільна асэнсаваць рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў краіне. У радзе вершаў і ў паэме «Беларусь» (1923) паэт услаўляе перамаганосны Кастрычнік і маладую Савецкую Беларусь.

У літаратурным жыцці Мінска ўсё большую ролю пачыналі адыгрываць новыя пісьменнікі. Была апублікавана аповесць Янкі Маўра «Чалавек ідзе». У 1925 годзе выйшлі з друку першыя зборнікі вершаў «Асцё» і «Крапіва» Кандрата Крапівы. Вострае сатырычнае слова паэт выкарыстаў для барацьбы супраць усяго аджылага, за перамогу новага, сацыялістычнага ладу. У 1923 годзе ў друку з'явілася апавяданне «На граніцы», напісанае студэнтам універсітэта Мікалаем Раманоўскім (псеўданім — Кузьма Чорны). У 1925 годзе Кузьма Чорны выдаў тры зборнікі апавяданняў, якія сведчылі аб тым, што ў літаратуру прыйшоў таленавіты малады празаік.

У гэтыя ж гады ў Мінскім педагагічным тэхнікуме вучыліся Паўлюк Трус, Пятро Глебка, Максім Лужанін, Алесь Якімовіч, якія вы-

ступілі з першымі творамі. У іх станаўленні вялікую ролю адыграў Якуб Колас, які з'яўляўся тады выкладчыкам гэтага педтэхнікума. Па-рознаму складваўся творчы шлях гэтых пісьменнікаў, але ўсе яны сталі піснярамі новай, сацыялістычнай явы і занялі віднае месца ў беларускай літаратуры.

Рост шэрагаў беларускіх пісьменнікаў дазволіў распачаць выданне літаратурна-мастацкіх часопісаў. У канцы 1922 года ў Мінску выйшаў першы нумар часопіса «Полымя». Пазней у часопісе рэгулярна змяшчаліся творы Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых пісьменнікаў.

У Мінску ствараюцца літаратурныя аб'яднанні рэспубліканскага значэння. ЦК Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі ў канцы 1923 года стварыў літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», якое ахапіла каля 500 маладых аўтараў. У іх ліку былі К. Крапіва, П. Трус, К. Чорны, П. Глебка, П. Броўка, М. Лынькоў, А. Куляшоў і інш. Аб'яднанне выдавала літаратурна-мастацкі часопіс «Маладняк», які выходзіў з 1923 па 1932 год.

Літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», якое лічыла актыўны ўдзел у стварэнні пралетарскай літаратуры сваёй асноўнай задачай, адыграла значную ролю ў выхаванні пісьменнікаў з рабочай моладзі. У 1928 годзе «Маладняк» быў рэарганізаваны ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў, якая ўвайшла ў УААПП (Усесаюзнае аб'яднанне асацыяцый пралетарскіх пісьменнікаў). У «Маладняк», а пазней у БелАПП уваходзілі маладыя ў сваёй большасці пісьменнікі, якія актыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычным будаўніцтве.

Аднак многія маладыя пісьменнікі мелі слабую ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку. Некаторыя з іх зневажальна адносіліся да старой культурнай спадчыны, пад выглядам стварэння новых форм пралетарскай літаратуры прапаведвалі фармалістычнае трукацтва, падмянялі рэвалюцыйную рамантыку адцягненым касмізмам. У гэтым адбіўся вульгарна-сацыялагічны погляд на літаратуру, характэрны для пэўнай часткі «маладнякоўцаў» і «белапаўцаў».

У Мінску аформіліся і іншыя пісьменніцкія арганізацыі: у 1926 годзе «Узвышша», у 1927 годзе «Полымя». Сацыяльны склад іх быў неаднародны. Часам яны дапускалі палітычныя памылкі. Янка Купала, Якуб Колас і іншыя пісьменнікі, якія ўваходзілі ў гэтыя арганізацыі, рашуча крытыкавалі такія памылкі, сваёй творчасцю актыўна служылі справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Асновай развіцця беларускай літаратуры стала пастанова ЦК РКП(б) «Аб палітыцы партыі ў галіне мастацкай літаратуры» (1925). ЦК РКП(б) патрабаваў, каб літаратура была састаўной часткай агульнанароднай справы барацьбы за сацыялізм, адыгрывала важную ролю

ў ідэйным і эстэтычным выхаванні народа. Кіруючыся гэтым рашэннем, перадавыя беларускія пісьменнікі, якія працавалі ў Мінску, няўхільна змагаліся за партыйнасць літаратуры, супраць буржуазна-нацыяналістычных плыней.

Першыя гады сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі азнаменаваліся павышэннем творчай актыўнасці пісьменнікаў Беларусі. Творча асвойваючы перадавы вопыт усёй савецкай літаратуры, беларускія пісьменнікі значна пашырылі рамкі сваёй творчасці, жыва адгукнуліся на шматлікія з'явы жыцця, услявілі гераічныя будні барацьбы за сацыялізм. Янка Купала стварае шэраг вершаў і паэм, у якіх натхнёна праслаўляе творчую стваральную працу беларускага народа. Якуб Колас у сваёй аповесці «На прасторах жыцця» (1926) адзін з першых у беларускай літаратуры адлюстраваў працэс станаўлення характару маладога савецкага чалавека, гатовага на любыя подзвігі ў імя сацыялістычнай Айчыны.

Паўлюк Трус з асаблівай сілай услаўляў сацыялістычную індустрыялізацыю Беларусі. У паэме «Дзесяты падмурак» (1928) паэт услаўляе песні Асінбуда, цудоўную музыку турбін, росквіт рэспублікі «пад чырвонай зоркай», марыць аб далейшым магутным росквіце яе індустрыяльнай магутнасці.

З гэтага часу тэма горада трывала ўвайшла ў творчасць многіх беларускіх пісьменнікаў. У вершах «Дзве сястры» Я. Купалы, «Горад» П. Броўкі знайшла сваё мастацкае ўвасабленне ідэя саюзу рабочага класа і працоўнага сялянства. У апавяданні «Андрэй Лятун» (1928) і іншых творах Міхась Лынькоў адлюстраваў жыццё рабочых Савецкай Беларусі. Творчай працы рабочых прысвечаны апавяданні Х. Шынклера. Усе гэтыя творы былі прасякнуты пафасам сацыялістычных пераўтварэнняў у рэспубліцы.

Рост ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню беларускіх пісьменнікаў дапамагаў ім паўней і яскравей адлюстроўваць шматлікія падзеі мінулага. Так, Змітрок Бядуля ў сваім лепшым творы — аповесці «Салавей» (1927) паказаў цяжкое жыццё і барацьбу беларускіх сялян у змрочную пару прыгоннага права.

У 1929 годзе Цішка Гартны скончыў раман «Сокі цаліны» — пранікнёны расказ аб жыцці і барацьбе сельскай моладзі ў перадкастрычніцкія гады, аб шляхах яе ўступлення ў рэвалюцыйную барацьбу.

З году ў год пашыраліся і мацнелі сувязі пісьменнікаў Мінска з пісьменнікамі Масквы. У 1925 і 1927 гадах у Мінск прыязджаў Уладзімір Маякоўскі. Ён чытаў свае вершы, сустракаўся з мясцовымі паэтамі, аказваў ім творчую дапамогу. У 1928 годзе, вяртаючыся з-за мяжы, у Мінску спыніўся Максім Горкі. Працоўныя сустрэлі яго з захапленнем. Вялікі пралетарскі пісьменнік сустрэўся з літара-

тарамі Мінска, вельмі цікавіўся іх творчай працай. І ў далейшым ён увесь час клапаціўся аб паспяховым развіцці беларускай савецкай літаратуры.

Магутны ўплыў Максіма Горкага, Уладзіміра Маякоўскага і ўсёй савецкай літаратуры садзейнічаў росту пісьменніцкага майстэрства літаратараў БССР, дабратворна адбіваўся на развіцці беларускай літаратуры.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі дала беларускай літаратуры новыя тэмы. Пісьменнікі Мінска, якія добра ведалі жыццё і быт беларускіх сялян, паказвалі ў сваіх творах карэнныя сацыялістычныя пераўтварэнні ў вёсцы, змены ў псіхалогіі сялян, якія ўступілі ў калгасы. Сваімі творамі яны заклікалі працоўнае сялянства да новага жыцця.

Этапным творам аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі з'явіўся верш Янкі Купалы «Сыходзіш, вёска, з яснай явы...» (1929). Народны паэт, без жалю развітваючыся са старой вёскай, услаўляў калгасную:

Ты сыдзеш, вёска, з яснай явы,
Як сон маркотны, нежаданы,
Бо твой народ вернападданы
Ідзе ўжо, скінуўшы кайданы,
Да лепшай долі, лепшай славы.

Глыбока асэнсаваўшы значэнне сацыялістычных пераўтварэнняў у вёсцы, Янка Купала знайшоў свежыя і яскравыя вобразы для высокамастацкага вырашэння новай тэмы.

Якуб Колас у цыкле вершаў «Калгаснае» (1930) услаўляе беларускага працоўнага селяніна, што ўступіў на калгасны шлях. У 1931 годзе ён напісаў аповесць «Адшчапенец», у якой стварыў тыповы вобраз селяніна-серадняка, які не без ваганняў уступаў на новы жыццёвы шлях.

У тыя ж гады напісаны творы «Вясна» Кузьмы Чорнага і «Спалох на загонах» Платона Галавача, якія адлюстроўваюць сацыялістычную перабудову беларускай вёскі. Міхась Лынькоў у 1932 годзе апублікаваў апавяданні «Салавей-разбойнік» і «Світка», у якіх паказаў сацыялістычнае перавыхаванне селяніна-аднаасобніка ў працэсе барацьбы за ўмацаванне калгаснага ладу.

Эдуард Самуйлёнак у аповесці «Русалчыны сцежкі» (1931) паказаў бязлітасную класавую барацьбу ў вёсцы ў пачатку калектывізацыі, перамогу новага над старым. У наступнай яго аповесці «Паляўнічае шчасце» (1933) створан яскравы станоўчы вобраз простага чалавека калгаснай вёскі.

З новымі творамі аб сацыялістычнай перабудове беларускай вёскі выступілі П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, С. Баранавых і іншыя

паэты і пісьменнікі. Своечасова адгукаючыся на з'явы калгаснага жыцця, адлюстроўваючы гераіку сацыялістычнай перабудовы вёскі, літаратары Мінска садзейнічалі поўнай перамозе калгаснага ладу.

К пачатку 30-х гадоў шэрагі пісьменнікаў Мінска значна ўмацаваліся. Аднак прыналежнасць іх да розных літаратурных аб'яднанняў нараджала групаўшчыну, перашкаджала далейшаму развіццю літаратуры. Наспела неабходнасць стварэння адзінай пісьменніцкай арганізацыі.

У гэтых умовах выключнае значэнне мела пастанова ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 года «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі вырашыў ліквідаваць БелАПП і іншыя дробныя арганізацыі пісьменнікаў, стварыць адзіную літаратурна-мастацкую арганізацыю — Саюз савецкіх пісьменнікаў Беларусі.

У канцы мая 1932 года ў сталіцы рэспублікі быў створан аргкамітэт Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР, які разгарнуў падрыхтоўку да рэспубліканскага і ўсесаюзнага з'ездаў савецкіх пісьменнікаў.

У чэрвені 1934 года ў Мінску адбыўся першы з'езд Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі. На ім прысутнічала каля 100 літаратараў. З'езд прадэманстраваў непарушную згуртаванасць беларускіх пісьменнікаў вакол Камуністычнай партыі, іх гатоўнасць аддаць усе сілы барацьбе за пабудову камунізма.

На Першым усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў, які адбыўся ў Маскве ў жніўні 1934 года, аб стане беларускай літаратуры расказалі Якуб Колас і Міхась Клімковіч. Прынятыя з'ездам рашэнні сталі для пісьменнікаў праграмай барацьбы за далейшы росквіт многанацыянальнай савецкай літаратуры.

Стварэнне Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі значна актывізавала літаратурнае жыццё Мінска. Пісьменнікі глыбей авалодвалі метадам сацыялістычнага рэалізму, больш поўна і ўсебакова паказвалі гераіку беларускага народа ў барацьбе за камунізм. Стала больш з'яўляцца твораў аб рабочым класе, аб індустрыялізацыі рэспублікі. Янка Купала ў 1934 годзе напісаў паэму «Барысаў», якая ўслаўляла сацыялістычныя пераўтварэнні ў горадзе. У вершы «Беларусі ардэнаноснай» ён услаўляў сталіцу БССР — Мінск, дзе «ўсталі фабрыкі, заводы — рэспублікі сіла». Новыя творы аб рабочым класе напісалі таксама Я. Колас, М. Лынькоў, П. Броўка, Х. Шынклер, А. Ушакоў, І. Гурскі, А. Александровіч і інш.

Пісьменнікі Мінска па-ранейшаму вялікую ўвагу аддавалі калгаснай тэматыцы. У вершах «Песня трактарыста», «У нашым полі», «Лён» Янкі Купалы, «Шчаслівая хвіліна», «Радасць» Якуба Коласа, «Вясна і людзі» Петруся Броўкі, у п'есе Эдуарда Самуйлёнка «Пагі-

бель воўка» і іншых творах яскрава адлюстравана жыццё даваеннай калгаснай вёскі Беларусі.

Беларускія пісьменнікі працягвалі асэнсоўваць падзеі перыяду Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, прысвячаючы ім новыя творы. Якуб Колас напісаў вядомую аповесць «Дрыгва» (1933). Вялікія рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў краіне з вялікай мастацкай сілай былі адлюстраваны ў рамане «Трэцяе пакаленне» (1934) і драме «Бацькаўшчына» (1937) Кузьмы Чорнага. Гэтым тэмам былі прысвечаны драма «Партызаны» К. Крапівы, часткова раман «Праз гады» (1934) П. Галавача і некаторыя іншыя творы.

Беларускія пісьменнікі жыва адгукаліся на міжнародныя падзеі, раскрывалі антынародны характар фашызму, змагаліся за мір паміж народамі, выхоўвалі ў працоўных пачуццё савецкага патрыятызму, гатоўнасць гераічна абараняць сацыялістычную Айчыну.

Беларуская савецкая літаратура, якая дасягнула высокага ўзроўню развіцця, стала вядома за межамі рэспублікі. Творы Я. Купалы, Я. Коласа і іншых пісьменнікаў-мінчан выдаваліся на многіх мовах народаў Савецкага Саюза і іншых краін. Голас беларускіх літаратараў гучаў на міжнародных кангрэсах прагрэсіўных майстроў культуры. Так, 24 чэрвеня 1935 года на Сусветным кангрэсе абаронцаў культуры ў Парыжы выступіў Якуб Колас. Ён сказаў: «Народы Савецкага Саюза, якія перанеслі ўсе жахі старога свету, раз і назаўсёды ўвагналі асінавы кол у магілу гэтага старога свету і паставілі над ім апошні крыж. І калі мы чуем пра падрыхтоўку новых імперыялістычных войнаў, пра арганізацыю нападу на Савецкі Саюз, мы ўзнімаем страсны голас пратэсту супраць усіх падпальшчыкаў вайны».

У 30-я гады пісьменнікі Мінска дасягнулі сур'ёзных творчых поспехаў. Яны адлюстроўвалі савецкую рэчаіснасць у яе рэвалюцыйным развіцці і тым самым уносілі важны ўклад у беларускую і ўсю савецкую шматнацыянальную літаратуру.

5. Мастацтва

Пасля разгрому белагвардзейцаў і інтэрвентаў, у перыяд мірнага сацыялістычнага будаўніцтва ў Мінску склаліся больш спрыяльныя ўмовы для развіцця розных відаў мастацтва. Работнікі мастацтваў у сваёй творчасці абапіраліся на дэмакратычныя і сацыялістычныя элементы беларускай нацыянальнай культуры, на слаўныя традыцыі дэмакратычнага рускага мастацтва, на класічную спадчыну сусветнай культуры.

Авалодваючы марксісцка-ленінскай метадалогіяй, пераадольваючы шкодны ўплыў фармалізму і натуралізму, мастакі, музыканты, акцёры, архітэктары развівалі ўсе віды мастацтва — жывапіс, графіку, скульптуру, музыку, тэатр і кіно, архітэктуру — нацыянальныя па форме, сацыялістычныя па зместу.

У Мінску пачало паспяхова развівацца выяўленчае мастацтва. У сталіцы працавалі многія беларускія майстры пэндзаля і разца. Узрасла творчая актыўнасць мастакоў. Ужо ў 1921 годзе адбылася гарадская мастацкая выстаўка.

Перадавыя мастакі Мінска плённа вучыліся майстэрству на слаўных традыцыях рускага рэалістычнага выяўленчага мастацтва, авалодвалі метадам сацыялістычнага рэалізму. З году ў год мацнелі братэрскія сувязі беларускіх мастакоў з майстрамі Масквы і Ленінграда. З. І. Азгур, І. О. Ахрэмчык, А. А. Бембель, Е. А. Зайцаў і многія іншыя скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы Масквы і Ленінграда, прыехалі ў Мінск, сталі выдатнымі дзеячамі беларускага выяўленчага мастацтва. Маскоўскія мастакі, якія неаднаразова прыязджалі ў сталіцу БССР, аказвалі вялікую дапамогу сваім мінскім таварышам.

У 1925 годзе адкрылася першая ўсебеларуская мастацкая выстаўка. На ёй былі шырока прадстаўлены работы мастакоў Мінска, Віцебска, Гомеля, Магілёва і іншых гарадоў рэспублікі. Лепшыя творы выстаўкі адлюстроўвалі жыццё савецкага народа і яго рэвалюцыйнае мінулае. На выстаўцы вылучаліся рэалістычныя карціны В. В. Волкава «Барыкады. 1905 год» і «Кастусь Каліноўскі». Заслужаны поспех мела карціна Б. Уладзімірскага «Беларускія ткачыхі», пейзажы В. Н. Кудрэвіча і Н. В. Дучыца, скульптуры З. І. Азгура і А. М. Бразера.

Аднак многія работы, прадстаўленыя на выстаўцы, былі выкананы на нізкім ідэйным і мастацкім узроўні. На змесце некаторых з іх згубна адбіўся ўплыў рэакцыйных «тэорый» беларускіх і яўрэйскіх нацыяналістаў.

Мастакі Мінска ўдасканальвалі сваё майстэрства. Многія майстры пэндзаля і разца сталі паказваць у сваіх творах героіку сацыялістычнай працы. Гэтай тэме былі прысвечаны, у прыватнасці, карціны В. В. Волкава «Абмен вопытам» і «Рабочы», Я. М. Кругера «Кавальскі цэх» і інш. Новыя тэмы, звязаныя з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі Беларусі, адлюстраваны ў карцінах М. Г. Эндэ «Дзяўчаты ідуць на працу», В. В. Волкава «Малацьба ў калгасе», П. Н. Гаўрыленка «Брыгада працуе ў калгасе». Гэтыя карціны неаднолькавыя па сваіх мастацкіх вартасцях, але ўсе яны сведчылі аб рашучым павароце беларускіх мастакоў да важнейшых тэм савецкай рэчаіснасці.

Мастакі Мінска паспяхова развівалі партрэтны жанр, ствараліпартрэты заснавальнікаў марксізма-ленінізма і вядомых людзей рэспублікі. В. В. Волкаў у 1926 годзе напісаў партрэт У. І. Леніна. Пазней Д. Н. Полазаў напісаў патрэт Янкі Купалы, Я. М. Кругер — партрэт Якуба Коласа.

Мастакі А. П. Марыкс і К. І. Ціханаў паспяхова працавалі ў галіне тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва. Мастацкае афармленне спектакля «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча, створанае па эскізах А. П. Марыкса, з'явілася адным з лепшых рашэнняў гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі ў тэатральна-дэкарацыйным мастацтве 20-х гадоў.

Плённа працавалі мастакі-графікі. Асабліва актывізавалася іх дзейнасць з 1924 года, калі было створана Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. А. Н. Тычына, В. Н. Ціхановіч, М. В. Лебедзева, І. Р. Гембіцкі і іншыя мастакі ілюстравалі кнігі беларускіх і рускіх пісьменнікаў. А. Н. Тычына стварыў цыкл лінагравюр («Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна», «Савецкая вуліца», «Каля дома Чырвонай Арміі»), які адлюстроўваў новае аблічча сталіцы Беларусі.

Ва ўздыме ідэйна-палітычнага ўзроўню і творчага майстэрства мастакоў Мінска вялікую ролю адыграла пастанова ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» (1932). У адпаведнасці з гэтай пастановай у 1933 годзе быў створан Саюз савецкіх мастакоў Беларусі, які павёў рашучую барацьбу супраць фармалізму і натуралізму, за сацыялістычны рэалізм у беларускім выяўленчым мастацтве. Створаная ў Мінску студыя выяўленчага мастацтва разгарнула падрыхтоўку новых мастакоў з таленавітай моладзі рэспублікі. Адкрыўся Дом мастака. Усё гэта стварала спрыяльныя ўмовы для творчасці мінскіх майстроў выяўленчага мастацтва.

К сярэдзіне 30-х гадоў на высокім узроўні стаяла творчасць скульптараў. А. М. Бразер, З. І. Азгур, А. А. Бембель, А. К. Глебаў, А. В. Грубэ, А. Н. Арлоў і іншыя скульптары Мінска занялі ганаровае месца сярод вядомых савецкіх майстроў разца. Скульптары горада аформілі Дом урада БССР, Палац піянераў, Дом Чырвонай Арміі і некаторыя іншыя новыя будынкі, якія ўпрыгожылі сталіцу рэспублікі. Вялікім майстэрствам выканання адрозніваліся скульптура У. І. Леніна мастака А. М. Бразера, скульптурныя групы «Пагранічнік і калгасніца» А. Н. Арлова, «Лявоніха» А. К. Глебава, барэльефы на абаронную тэматыку А. А. Бембеля, партрэтныя бюсты Янкі Купалы, Якуба Коласа З. І. Азгура, статуі «Беларус», «Трактарыстка» А. В. Грубэ. Усе гэтыя скульптуры з поспехам экспанаваліся на выстаўках у Маскве.

Мастацкія выстаўкі, якія часта наладжваліся ў Мінску, паказвалі, як з году ў год узрастала творчая сталасць беларускіх мастакоў і скульптараў, пашыралася і ўзбагачалася тэматыка іх твораў.

Хутка змянілася архітэктурнае аблічча Мінска. Будаваліся новыя буйныя прамысловыя прадпрыемствы, вакол якіх раслі добраўпарадкаваныя пасёлкі, культурна-асветныя ўстановы, школы, бальніцы, бібліятэкі, тэатры. Узводзіліся новыя будынкі дзяржаўных устаноў і вышэйшых навучальных устаноў. Ужо к пачатку 30-х гадоў былі пабудаваны бібліятэка імя У. І. Леніна (архітэктар В. Н. Лаўроў), комплексы універсітэцкага гарадка (архітэктар І. К. Запарожац), клінічных бальніц, Дом партыйных курсаў. Праўда, на гэтых збудаваннях яшчэ ляжаў адбітак канструктывізму, некаторыя з іх прадстаўлялі сабою голыя каробкі без неабходнага архітэктурнага афармлення.

Зодчыя Мінска настойліва пераадольвалі шкодны ўплыў канструктывізму, асвойвалі метад сацыялістычнага рэалізму. У гэтых адносінах характэрна буйнейшае збудаванне даваеннага Мінска — Дом урада. Пры некаторай спрошчанасці фасада, характэрнай для канструктывізму, Дом урада ў той жа час мае выразную кампазіцыю, выгоды, якія неабходны для работы буйной дзяржаўнай установы, і іншыя рысы, якія ўласцівы сацыялістычнаму рэалізму ў архітэктуры. У агульнай кампазіцыі Дома ўрада цэнтральнае палажэнне займае збудаваны на плошчы велічны помнік У. І. Леніну (скульптура М. І. Манізера).

Архітэктары А. П. Воінаў і В. Н. Вараксін пабудовай арыгінальнага Палаца піянераў у Мінску паклалі ў Беларусі пачатак асваенню прынцыпаў класічнай архітэктуры з пазіцый сацыялістычнага рэалізму.

З манументальных будынкаў вылучаліся таксама Дзяржаўны тэатр оперы і балета, акруговы Дом Чырвонай Арміі (архітэктар І. Г. Лангбард) і інш.

Вялікую ролю ў творчым развіцці зодчых Мінска адыграў створаны ў 1934 годзе Саюз архітэктараў Беларусі. Архітэктары шмат зрабілі для рэканструкцыі Мінска. У ходзе сацыялістычнага будаўніцтва паступова сціралася розніца паміж цэнтрам і ўскраінамі горада. Тыповыя змены адбыліся на Камароўцы, якая да рэвалюцыі была найбольш забруджанай і нядобраўпарадкаванай ускраінай Мінска, населенай беднякамі. За першыя дзве пяцігодкі ў гэтым раёне ўзведзены будынкі Акадэміі навук БССР (архітэктар І. Г. Лангбард), Інстытута фізічнай культуры (архітэктары А. П. Воінаў, А. П. Брэгман і В. І. Мураўёў), Політэхнічнага інстытута, Дома друку, клінічнага гарадка. Камароўка хутка добраўпарадкавалася.

Паспяхова развівалася тэатральнае жыццё. Буйнейшай падзеяй у культурным жыцці Мінска і рэспублікі з'явілася адкрыццё 14 верасня 1920 года першага Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра (з 1945 года — Тэатр імя Янкі Купалы). Вакол тэатра аб'яд-

наліся лепшыя акцёры, рэжысёры, мастакі, кампазітары і драматургі Беларусі. Мастацкім кіраўніком тэатра стаў выдатны беларускі рэжысёр Е. А. Міровіч, а творчае ядро яго склалі Г. Ю. Грыгоніс, Е. Э. Міронава, Л. І. Ржэцкая, К. М. Саннікаў, А. К. Ільінскі, С. М. Станюта і іншыя акцёры.

Малады тэатральны калектыў у ліку першых сваіх пастановак паказаў п'есы «Вяселле» А. Чэхава, «На дне» М. Горкага, «Паўлінка» і «Раскіданае гняздо» Я. Купалы. Гэтым быў пакладзен пачатак высакароднай традыцыі выкарыстання ў рэпертуары тэатра твораў як беларускай, так і рускай класічнай драматургіі.

У 1921—1925 гадах на сцэне тэатра ішлі п'есы Янкі Купалы і В. Дуніна-Марцінкевіча, якія яскрава адлюстроўвалі жыццё перадкастрычніцкай беларускай вёскі. Адначасова тэатр ставіў п'есы рускай і сусветнай класікі — «Лес шуміць» У. Караленкі, «Апостал сатаны» Бернарда Шоу, «Ваўкі» Рамэна Ралана і інш.

У 1923 годзе калектыў тэатра ўпершыню гастраліраваў у Маскве, з поспехам паказаўшы гледачу спектаклі «На купалле» і «Машэка», прасякнутыя матывамі багатага беларускага фальклору. Адзначаючы творчыя поспехі калектыву тэатра, ВЦВК узнагародзіў яго ганаровай граматай. Калектыў тэатра трывала стаў на шлях сацыялістычнага рэалізму. Побач з іншымі выдатнымі акцёрамі вялікую ролю ў гэтым адыгралі новыя таленавітыя майстры сцэны, якія ўліліся ў калектыў тэатра,— рэжысёр Л. Г. Рахленка, артысты У. Н. Крыловіч, Г. П. Глебаў, С. С. Бірыла.

Асноўнае месца ў рэпертуары тэатра занялі савецкія п'есы, прысвечаныя тэмам сацыялістычнага будаўніцтва і абароны Радзімы. У спектаклях «Перамога» і «Запяюць верацёны» Е. Міровіча, пастаўленых у 1927—1930 гадах, тэатр адлюстраваў барацьбу беларускага народа за сацыялістычную індустрыялізацыю рэспублікі. П'есу «Лютасць» Е. Яноўскага, якая прысвечана барацьбе за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, тэатр з поспехам паказаў у Маскве.

У наступныя гады тэатр ставіў «Браняпоезд 14-69» Ус. Іванава, «Мяцеж» Д. Фурманава, «Канец дружбы» К. Крапівы, «Ірынка» К. Чорнага і іншыя п'есы, прысвечаныя барацьбе савецкіх людзей супраць усяго аджылага, за перамогу камунізма. Працягвалі ставіць п'есы рускай і сусветнай класікі.

Першы беларускі дзяржаўны драматычны тэатр стаў цэнтрам тэатральнай культуры Беларусі. Для астатніх беларускіх тэатраў ён быў не толькі ўзорам высокага тэатральнага мастацтва, але і месцам падрыхтоўкі акцёрскіх кадраў. З 1932 года пры ім працавалі дзве студыі.

У 1937 годзе ў Мінску створана рэспубліканскае тэатральнае вучылішча, якое займалася падрыхтоўкай акцёрскіх кадраў.

Адначасова з першым беларускім дзяржаўным драматычным тэатрам у Мінску створан Дзяржаўны перасоўны тэатр, які абслугоўваў галоўным чынам раённыя цэнтры, мястэчкі і сёлы рэспублікі. У 30-я гады адкрыўся Беларускі тэатр юнага гледача, які карыстаўся вялікім поспехам у моладзі.

У Мінску паспяхова развіваецца музычная культура. Ствараліся шматлікія самадзейныя калектывы песні і танца. У 1924 годзе ў горадзе адкрыўся музычны тэхнікум, які рыхтаваў музыкантаў і оперных спевакоў. У тэхнікуме атрымалі сярэднюю музычную адукацыю Л. Александроўская, Р. Млодэк, М. Дзянісаў, І. Балоцін. Скончыўшы пазней дзяржаўную студыю оперы і балета, якая адкрылася ў Мінску, яны сталі выдатнымі майстрамі беларускай опернай сцэны.

У развіцці прафесіянальнага беларускага музычнага мастацтва сур'ёзную ролю адыграў Першы беларускі дзяржаўны драматычны тэатр, у складзе якога да 1927 года побач з драматычнымі акцёрамі былі хор, балетная група і аркестр. У 1922—1925 гадах яны самастойна паставілі балет «Капелія» Дэліба, а ў 1927 годзе — оперу «Русалка» Даргамыжскага.

У 1927 годзе вялікая вакальна-харэаграфічная група вылучылася са складу Першага тэатра і выступала самастойна. У 1933 годзе створан Беларускі дзяржаўны вялікі тэатр оперы і балета, творчы калектыў якога склаўся з акцёраў вакальна-харэаграфічнай групы і выпускнікоў студыі оперы і балета.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны ў Мінску паступова стварыўся калектыў беларускіх кампазітараў. Тут працавалі М. М. Чуркін, Н. І. Аладаў, Я. К. Цікоцкі, В. А. Залатароў і інш. Яны рашуча выступалі супраць спроб беларускіх нацыяналістаў, якія імкнуліся адцягнуць майстроў музычнай культуры ад актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, выкрывалі рэакцыйную сутнасць лозунга нацыяналістаў «назад да жалейкі», ствараліреалістычныя музычныя творы, прысвечаныя савецкай тэматыцы. Старэйшы кампазітар М. М. Чуркін стварыў першы беларускі сімфанічны твор (сімфаньету), баладу для голасу з аркестрам «Хто сказаў, што памёр Ленін». У 20-я гады М. І. Аладаў напісаў фартэп'янны квінтэт, сімфаньету, шэраг рамансаў на тэксты Я. Купалы, Я. К. Цікоцкі стварыў Першую сімфонію, прысвечаную вызваленню Беларусі ад польскіх інтэрвентаў.

У 1932 годзе ў адпаведнасці з рашэннем ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» у Мінску створан аргкамітэт Саюза савецкіх кампазітараў БССР.

У 1937 годзе ў Мінску створана Беларуская дзяржаўная філармонія, якая аб'яднала сімфанічны аркестр і некаторыя харэаграфічныя калектывы.

Шэрагі музыкантаў і кампазітараў увесь час павялічваліся за кошт таленавітай беларускай моладзі, якая атрымала музычную адукацыю ў кансерваторыях Масквы, Ленінграда і Мінска. Заслужаным поспехам карысталіся музычныя творы І. І. Любана, Р. К. Пукста, С. В. Палонскага і іншых маладых кампазітараў.

Удасканальваючы сваё майстэрства, кампазітары Мінска ад малых музычных форм пераходзілі да оперы і балета. У 30-х гадах створаны нацыянальныя беларускія оперы «Міхась Падгорны» Я. К. Цікоцкага (лібрэта П. Броўкі), «У пушчах Палесся» А. В. Багатырова (лібрэта Е. Рамановіча па аповесці «Дрыгва» Я. Коласа) і «Кветка шчасця» А. Туранкова, балет «Салавей» М. Е. Крошнера, прасякнутыя матывамі народнай беларускай музыкі. Тым самым кампазітары паклалі пачатак новаму этапу ў развіцці музычнага мастацтва Савецкай Беларусі. У пастаноўцы нацыянальных беларускіх і некаторых твораў рускай і сусветнай оперна-балетнай класікі на сцэне Беларускага дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета з асаблівай сілай праявіўся талент вядучых салістаў оперы: народнай артысткі СССР Л. П. Александроўскай, народных артыстаў БССР М. І. Дзянісава, І. М. Балоціна, вядучай салісткі балета народнай артысткі БССР А. В. Нікалаевай і інш.

Пазней за іншыя склалася ў Мінску кінематаграфія. Мінская студыя кінахронікі, якая ўваходзіла ў склад створанага ў 1926 годзе трэста «Белдзяржкіно», падрыхтавала рад кіначасопісаў і дакументальных фільмаў, што адлюстроўвалі жыццё Савецкай Беларусі. Кінастудыя «Савецкая Беларусь» некалькі год працавала ў Ленінградзе, дзе маладыя беларускія кінаработнікі, навучаючыся ў майстроў рускай савецкай кінематаграфіі, стварылі шэраг мастацкіх фільмаў.

Беларускі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі стварыў багатае мастацтва — сацыялістычнае па зместу і нацыянальнае па форме.

РАЗДЗЕЛ XVIII

МІНСК У ПЕРЫЯД УМАЦАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА (1938 — чэрвень 1941 года)

1. Барацьба працоўных горада за выкананне трэцяй пяцігодкі

У гады трэцяй пяцігодкі творчая актыўнасць працоўных Мінска, накіраваная на павышэнне прадукцыйнасці працы і датэрміновае выкананне вытворчых заданняў, працягвала расці. На прадпрыемствах і будоўлях разгарнулася масавае сацыялістычнае спаборніцтва, папаўняліся рады перадавікоў і наватараў вытворчасці.

Ініцыятарам спаборніцтва за дастойную сустрэчу XVIII з'езду партыі выступіў калектыў гарбарнага завода «Бальшавік». У яго звароце да ўсіх працоўных рэспублікі гаварылася: «Мы, рабочыя, работніцы, інжынеры, тэхнікі і служачыя чырвонасцяжнага гарбарнага завода «Бальшавік», звяртаемся да ўсіх працоўных БССР з заклікам шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар XVIII з'езду ВКП(б). Справа гонару калектыву кожнага завода, фабрыкі, інстытута, установы, калгаса, кожнага працоўнага нашай Радзімы канкрэтнымі справамі дабіцца права рапартаваць з'езду аб сваіх дасягненнях. Мы абавязуемся азнаменаваць XVIII з'езд партыі новымі вытворчымі перамогамі».

Працоўныя сталіцы і ўсёй Беларусі аднадушна падтрымалі пачын рабочых завода «Бальшавік». Значна перавыканалі вытворчыя планы першага квартала 1939 года вагонарамонтны завод імя Мяснікова, завод «Ударнік», фабрыка «Камунарка» і іншыя прадпрыемствы. З пачатку 1938 года амаль удвая павялічылася колькасць ударнікаў на швейнай фабрыцы «Кастрычнік».

Матэрыяльнай асновай сацыялістычнага спаборніцтва з'яўляліся новая тэх-

ніка і перадавая тэхналогія, узросшы культурна-тэхнічны ўзровень рабочага класа. У барацьбу за датэрміновае выкананне трэцяга пяцігадовага плана ўключыліся не толькі асобныя перадавікі і наватары вытворчасці, але і цэлыя калектывы — брыгады, цэхі, прадпрыемствы. Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі паспяхова ўкаранялі ў вытворчасць найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі, дабіваліся высокай прадукцыйнасці працы. Гэтаму садзейнічала вытворча-тэхнічнае абучэнне кадраў, якім непасрэдна кіравалі інжынерна-тэхнічныя работнікі і найбольш вопытныя рабочыя. На працягу некалькіх гадоў працавала стаханаўская школа на швейнай фабрыцы імя Крупскай. Дзесяткі яе выпускнікоў павысілі сваю кваліфікацыю.

Калектывы прадпрыемстваў Мінска вывучалі і шырока ўжывалі перадавы вопыт лепшых прадпрыемстваў краіны. На заводах і фабрыках Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў пабывалі групы рабочых фабрыкі «Кастрычнік», перадавікі вытворчасці кандытарскай фабрыкі «Камунарка» і іншых прадпрыемстваў горада.

Для перадачы вопыту на мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава прыбыла з Масквы брыгада спецыялістаў. Яна дапамагла выявіць нявыкарыстаныя рэзервы, правесці рад арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў.

Вытворчыя кантакты ўмацоўваліся ў сацыялістычным спаборніцтве заводаў і фабрык аднародных галін прамысловасці. Так, завод «Бальшавік» спаборнічаў з Магілёўскім гарбарным заводам.

Творчая актыўнасць мас характарызавалася новымі формамі спаборніцтва, павышэннем яго дзейснасці ў вырашэнні вытворчых задач. У 1939 годзе на прадпрыемствах Мінска пачаўся рух многастаночнікаў, які ўзнік на Уралмашзаводзе і Харкаўскім машынабудаўнічым заводзе. Гэты патрыятычны рух, які сведчыў аб далейшым росце тэхнічнай культуры рабочага класа, садзейнічаў павышэнню прадукцыйнасці працы, забяспечваў эканомію рабочага часу.

У Мінску многастаночнае абслугоўванне ўпершыню ўжылі на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава. Фрэзероўшчыца Леонас спачатку працавала на двух станках, а затым перайшла на абслугоўванне чатырох. На падоўжнашліфавальным і ўнутрышліфавальным станках адначасова працаваў Бладыка. На кожным станку ён выконваў нормы на 150, а пасля пераходу на многастаночнае абслугоўванне — на 326 працэнтаў. Па чатыры станкі абслугоўвалі ўдарнікі Кавалёў і Грышчанка. За кароткі час на гэтым заводзе на многастаночную работу перайшлі 17 чалавек. Яны абслугоўвалі 39 станкоў і давалі прадукцыю высокай якасці.

Затым многастаночнікі з'явіліся на станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. К канцу 1939 года тут налічвалася да 20 рабочых, якія абслугоўвалі па некалькі станкоў.

Адначасова сярод рабочых Мінска пачаўся рух за сумяшчэнне прафесій, якое давала магчымасць кваліфікаваным станочнікам працаваць на рознатыповых станках і скарачала вымушаныя прастоі падсобных рабочых. На чале руху ішлі камуністы і камсамольцы. Вялікую ўвагу гэтаму пытанню ўдзяляла партыйнае бюро швейнай фабрыкі імя Крупскай. Разам з адміністрацыяй камуністы правялі рад арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па навучанню рабочых перадавым прыёмам працы. У пачатку 1940 года на фабрыцы налічвалася 105 рабочых, якія сумяшчалі розныя вытворчыя аперацыі. Прадпрыемства сістэматычна перавыконвала дзяржаўны план.

На радзе прадпрыемстваў горада праводзіліся грамадскія агляды абсталявання і якасці прадукцыі. Плённа працавалі ў гэтым напрамку, напрыклад, камісіі грамадскага агляду абсталявання на заводах імя Кірава, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і іншых прадпрыемствах. За лік лепшага выкарыстання станкоў і механізмаў тут прадоўжылі тэрміны выкарыстання абсталявання і павысілі прадукцыйнасць працы.

На аснове ўкаранення новай тэхнікі і перадавой тэхналогіі, росту культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа шырыўся рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Сур'ёзную дапамогу ў іх творчых пошуках аказваў Мінскі цэнтральны Дом тэхнікі. Тут чыталіся лекцыі на тэхнічныя тэмы, праводзіліся кваліфікаваныя кансультацыі, даваліся даведкі па розных пытаннях машынабудавання і металаапрацоўкі. Паслугамі бібліятэкі, якая налічвала 11 тысяч тамоў найноўшай тэхнічнай літаратуры, карысталіся каля 500 чытачоў.

На працягу 1939 года праз кансультацыйную групу Дома тэхнікі прайшло больш як 100 рацыяналізатарскіх прапаноў. Большасць іх укаранілі ў вытворчасць. З дапамогай спецыялістаў Дома тэхнікі распрацавана канструкцыя машыны для пагрузкі торфу ў вагоны, праект станка для аднаўлення абмотак электраматораў. Гэты станок ужываўся на прадпрыемствах Беларусі, Масквы, Ленінграда, Кіева, Горкага і іншых гарадоў краіны.

У развіцці творчай ініцыятывы мас, мабілізацыі іх на выкананне заданняў трэцяга пяцігадовага плана партыйныя арганізацыі ўмела выкарыстоўвалі дадзенае ім XVIII з'ездам ВКП(б) права кантролю за дзейнасцю адміністрацыі прадпрыемстваў. Яны пачалі глыбей унікаць у арганізацыю вытворчасці, аказваць вялікі ўплыў на вырашэнне канкрэтных вытворчых задач. Умела спалучаючы партыйна-палітычную і гаспадарчую работу, партарганізацыі дабіваліся павышэння адказнасці камуністаў за стан спраў на прадпрыемствах, забяспечвалі іх авангардную ролю ў сацыялістычным спаборніцтве.

Выконваючы рашэнні XVIII з'езду партыі, гарадская партыйная арганізацыя ўзмацніла ўвагу да камуністычнага выхавання працоў-

ных, павысіла ідэйны ўзровень масава-палітычнай работы. У шырокай сетцы палітычнай асветы вывучаліся марксісцка-ленінская тэорыя і гісторыя партыі. Для рабочых і служачых чыталіся лекцыі і даклады на палітычныя і навуковыя тэмы, аб бягучым моманце і міжнародным становішчы, аб савецкім грамадскім і дзяржаўным ладзе.

К маю 1940 года ў 164 пярвічных партарганізацыях Мінска гісторыю партыі вывучаў 5171 чалавек, з іх 2764 камуністы, 1128 камсамольцаў і 1279 беспартыйных. Аб павышэнні цікавасці працоўных да вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі сведчыў вялікі попыт на палітычную літаратуру ў кніжных магазінах і бібліятэках. Так, бібліятэка Дома партактыву за 1939 год выдала чытачам 22,5 тысячы, кабінет палітасветы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР — 30,2 тысячы, бібліятэка Дома ўрада — 18,6 тысячы тамоў твораў класікаў марксізма-ленінізма.

У пачатку 1940 года гарком партыі арганізаваў марксісцка-ленінскі універсітэт выхаднога дня, які наведвалі да 350 чалавек.

Вялікую масава-растлумачальную работу праводзілі партыйныя арганізацыі Мінска ў сувязі з выбарамі ў органы дзяржаўнай улады. 26 чэрвеня 1938 года адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР. Па Мінску ў галасаванні прымала ўдзел 100 працэнтаў выбаршчыкаў. Дэпутатамі Вярхоўнага Савета рэспублікі былі аднагалосна выбраны кіраўнікі партыі і ўрада, знатныя людзі сталіцы, якія праславіліся самаадданай працай, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія работнікі. Сярод іх былі каваль завода імя Кірава А. П. Ціханаў, чыгуначнік П. Я. Сабіла, дырэктар абутковай фабрыкі В. П. Платонаў, кампазітар А. Е. Туранкоў, старшы палітрук адной з воінскіх часцей Чырвонай Арміі А. І. Казлоў і інш.

24 снежня 1939 года ў Беларусі праходзілі выбары ў мясцовыя Саветы. У галасаванні прыняло ўдзел 99,9 працэнта выбаршчыкаў. У гарадскі і раённыя Саветы дэпутатаў працоўных было выбрана 809 чалавек. Сярод дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета было 163 рабочых, 10 прафесараў, сем артыстаў, дзевяць урачоў, чатыры пісьменнікі, партыйныя і савецкія работнікі.

Вынікі выбараў у мясцовыя Саветы, як і выбары ў Вярхоўны Савет БССР, з'явіліся паказчыкам высокага маральна-палітычнага адзінства працоўных беларускай сталіцы, іх згуртавання вакол партыі і ўрада.

Рост грамадска-палітычнай актыўнасці працоўных Мінска выяўляўся і ў той значнай дапамозе, якую яны аказвалі вёсцы ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, у правядзенні агітацыйнай і культурна-масавай работы. Асабліва ярка гэта дапамога вёсцы праявілася ў 1939—1940 гадах, калі калгаснікі перасяляліся з хутароў.

роў на калгасныя сядзібы і пачыналася сацыялістычнае будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі.

З горада ў калгасы выязджалі спецыялісты і шматлікія рабочыя брыгады з аўтатранспартам для перавозкі і пабудовы дамоў калгаснікаў на новых месцах. Калгасам Папярнянскага сельсавета Мінскага раёна, напрыклад, дапамагалі 250 рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў дрэваапрацоўчага завода. Брыгада Кастрычніцкага раёна Мінска (350 чалавек) працавала ў Смалявіцкім і Рудзенскім раёнах. Толькі 18 чэрвеня яна пабудавала 47 дамоў. Калектывы цагельных заводаў Мінска бесперабойна забяспечвалі калгасы цэглай.

У маі 1940 года ў Мінску праходзіў XVIII з'езд Камуністычнай партыі Беларусі. Ён абмеркаваў вынікі двух гадоў пяцігодкі, вызначыў чарговыя задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы. Мінская партыйная арганізацыя прыйшла да XVIII з'езду КП(б)Б яшчэ больш узмацнелай і згуртаванай. Яна папоўнілася за лік перадавых рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, служачых і на 1 сакавіка 1940 года налічвала 9590 камуністаў.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў адпаведнасці з рашэннямі XVIII канферэнцыі ВКП(б) Камуністычная партыя і Савецкі ўрад правялі рад найважнейшых мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне вытворчай дысцыпліны, павышэнне прадукцыйнасці працы, умацаванне абароназдольнасці СССР. Па Указу Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года ў краіне былі ўстаноўлены васьмігадзінны рабочы дзень, сямідзённы тыдзень, забаронен самавольны ўход рабочых і служачых з прадпрыемстваў і з устаноў.

У 1940 годзе прыняты законы аб адказнасці за выпуск недаброякаснай прадукцыі, аб парадку абавязковага пераводу інжынерна-тэхнічных работнікаў і кваліфікаваных рабочых, у выпадку неабходнасці, з адных прадпрыемстваў і ўстаноў на іншыя, аб крымінальнай адказнасці за хуліганства і крадзеж на вытворчасці. Заканадаўчыя акты Савецкай дзяржавы садзейнічалі ўпарадкаванню работы прамысловасці, далейшаму ўмацаванню дысцыпліны на вытворчасці, узмацненню ва ўсіх працоўных пачуцця адказнасці за даручаную справу.

Восенню 1940 года прынята рашэнне аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР. У Мінску былі створаны два рамесных і адно чыгуначнае вучылішчы з 2-гадовым тэрмінам навучання і некалькі школ фабрычна-заводскага навучання.

Вясной 1941 года ў школах ФЗН адбыўся першы выпуск. Яны падрыхтавалі 1625 маладых будаўнікоў — муляраў, арматуршчыкаў, тынкоўшчыкаў і іншых спецыялістаў.

Партыйныя арганізацыі Мінска правялі вялікую работу па выкананню рашэнняў XVIII з'езду КП(б)Б і XVIII канферэнцыі ВКП(б).

На фабрыцы імя Куйбышава па ініцыятыве камуністаў прайшла грамадская праверка матэрыяльных каштоўнасцей. Выяўленыя непатрэбнае абсталяванне і лішнія матэрыялы былі перададзены іншым прадпрыемствам. Калектыў швейнай фабрыкі «Кастрычнік» узмацніў барацьбу за максімальнае ўшчыльненне рабочага дня, дзякуючы чаму амаль усе брыгады пачалі штодзённа перавыконваць вытворчыя заданні. Пры актыўным удзеле партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый на прадпрыемствах уводзіліся сутачныя графікі работы, ажыццяўляліся мерапрыемствы па выкананню як колькасных, так і якасных паказчыкаў плана.

У сакавіку 1941 года сход партыйнага актыву горада абмеркаваў пытанне аб выкарыстанні спецыялістаў на вытворчасці. Сход указаў на нездавальняючае выкарыстанне кадраў вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі. Большая іх частка працавала ва ўстановах наркаматаў і заводакіраўніцтвах. Было адзначана таксама, што на радзе прадпрыемстваў непрадукцыйна выкарыстоўвалася абсталяванне, дапускаўся перарасход сыравіны і матэрыялаў, не выконваліся планы па асартыменту.

Партыйныя арганізацыі ўмацавалі сувязі з масамі, пачалі больш канкрэтна кіраваць вытворчай дзейнасцю прадпрыемстваў, змагаліся за паскарэнне тэхнічнага прагрэсу і павышэнне прадукцыйнасці працы, за хутчэйшае ўкараненне новай тэхнікі і перадавой тэхналогіі. Паспяхова ажыццяўляліся мерапрыемствы, якія садзейнічалі беражліваму выкарыстанню сыравіны, матэрыялаў, электраэнергіі, зніжэнню сабекошту прадукцыі, навядзенню чыстаты і парадку на вытворчасці.

Дзякуючы высокай працоўнай і палітычнай актыўнасці рабочых, умеламу выкарыстанню ўнутраных рэзерваў вытворчасці заводы імя Кірава, «Бальшавік», імя Мяснікова, фабрыкі імя Куйбышава, імя Калініна, «Камунарка» і рад іншых прадпрыемстваў паспяхова выканалі вытворчыя планы. У 1940 годзе калектыў вагонарамонтнага завода імя Мяснікова выпусціў прадукцыі на 2863 тысячы рублёў (у цэнах 1926—1927 гадоў), знізіў сабекошт прадукцыі на дзевяць, а за чатыры месяцы 1941 года — на 12,7 працэнта.

Самаддана працавалі работнікі Мінскага чыгуначнага вузла. Яны аднадушна падтрымалі ініцыятыву машыніста дэпо Новасібірск Томскай чыгункі Луніна. На работу па лунінскаму метаду перайшлі 20 брыгад дэпо, у тым ліку брыгады перадавых машыністаў Баброўскага, Зінова, Чалея і інш. Яны да мінімуму скарацілі аб'ём дэпоўскага рамонту, у два-тры разы менш затрачвалі сродкаў на прамыўку паравозаў. Працуючы па-новаму, мінскія чыгуначнікі павялічвалі прабег паравозаў без рамонту, дабіваліся эканоміі паліва. У сакавіку — красавіку 1941 года машыністы правялі 104 цяжкава-

ганыя паязды і перавезлі звыш нормы 22 620 тон грузу. Палепшылася абслугоўванне пасажыраў, строга захоўваліся графікі руху паяздоў.

Няўхільна павышаючы працоўную і палітычную актыўнасць, працоўныя Мінска паспяхова выконвалі заданні трэцяга пяцігадовага плана, забяспечвалі высокія тэмпы развіцця прамысловасці.

2. Развіццё гарадской гаспадаркі. Далейшы рост матэрыяльнага дабрабыту працоўных

XVIII з'езд КП(б)Б даручыў Цэнтральнаму Камітэту «ўзяць пад свой нагляд і кантроль рэканструкцыю і добраўпарадкаванне горада Мінска — сталіцы ўз'яднанай Беларусі і забяспечыць у бліжэйшыя гады правільнае, комплекснае развіццё ўсёй гаспадаркі горада».

У гады трэцяй пяцігодкі гарадская гаспадарка Мінска папоўнілася шэрагам новых аб'ектаў прамысловага і культурна-бытавога назначэння. Асноўная задача ў гэтай галіне заключалася ў тым, каб у яшчэ большай ступені палепшыць умовы жыцця працоўных, фарсіраваць жыллёвае будаўніцтва, падцягнуць адстаючыя галіны камунальнай гаспадаркі — энерга- і водазабеспячэнне, гарадскі транспарт.

У сувязі з тым што тэмпы жыллёвага будаўніцтва і добраўпарадкавання ў папярэднія гады адставалі ад росту гарадскога насельніцтва, бюро ЦК КП(б)Б у снежні 1939 года прыняло пастанову «Аб развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі, сацыяльна-культурных устаноў і добраўпарадкаванні гор. Мінска». ЦК КП(б)Б звярнуўся ў ЦК ВКП(б) і СНК СССР з просьбай аб дадатковым асігнаванні 35,6 мільёна рублёў на жыллёвае будаўніцтва ў Мінску. Просьба была задаволена. У 1940 годзе было пабудавана 1320 новых кватэр.

Жылы фонд рос таксама за кошт індывідуальнага будаўніцтва. Урад усяляк заахвочваў індывідуальных забудоўшчыкаў. Ім выдаваліся крэдыты і неабходныя будаўнічыя матэрыялы. У 1938 годзе ўласныя жылыя дамы пабудавалі 200 сем'яў. У 1939 годзе дзяржаўныя крэдыты на індывідуальнае будаўніцтва перавысілі мільён рублёў.

На ўскраінах Мінска, у раёнах размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў, з'явіліся новыя вуліцы і добраўпарадкаваныя рабочыя пасёлкі. У межы горада былі ўключаны Камароўка, Козырава, Грушаўскі пасёлак і іншыя былыя ўскраіны.

Новыя прадпрыемствы і будынкі культурна-бытавога назначэння размяшчаліся ў адпаведнасці з задачамі развіцця прамысловасці

і стварэння для насельніцтва лепшых бытавых умоў. Працягвалася закладка паркаў і скверaў.

Значна змяніўся паўночна-ўсходні раён горада. Тут выпрамлялася Пушкінская вуліца, узніклі карпусы радыёзавода і абсерваторыі, будаваўся вучэбны комплекс Політэхнічнага інстытута, забудоўваўся Пушкінскі пасёлак.

У паўднёва-ўсходняй частцы Мінска закладваўся буйны комплекс прадпрыемстваў машынабудаўнічай прамысловасці. Рэканструяваліся раён вакзала і плошча У. І. Леніна. Праектам планіроўкі і забудовы гэтага раёна, складзеным Б. Р. Рубаненкам, намячалася ўзвядзенне шматпавярховых жылых дамоў з ужываннем паточна-скарасных метадаў будаўніцтва. Пачалася забудова Круглай плошчы.

Адным з найбольш значных дасягненняў беларускага горадабудаўніцтва быў будынак ЦК КП(б)Б, пабудаваны ў 1939—1941 гадах па праекту архітэктараў А. П. Воінава і В. Н. Вараксіна. Зручныя планіроўка і размяшчэнне ўнутраных памяшканняў забяспечвалі добрыя ўмовы для работы. Архітэктурная форма і функцыянальны змест будынка — прыклад удалага вырашэння кампазіцыйных і пластычных задач. Прастата афармлення, строгасць суадносін і маляўнічасць фасаду дапаўняліся высокай якасцю будаўнічых і аддзелачных работ.

Архітэктары Мінска распрацавалі рад удалых праектаў будынкаў культурнага і камунальна-бытавога назначэння. Да іх ліку адносяцца школы на вуліцах Чырвонаармейскай (архітэктар Г. В. Якушка), Чкалава і Маляўшчынскім завулку (архітэктар Р. Е. Столер). Па тыповых праектах будаваліся 107-кватэрны дом на Пушкінскай вуліцы, 115 і 127-кватэрныя дамы на Круглай плошчы, 130-кватэрны дом на рагу Пушкінскай і Даўгабродскай вуліц, рад іншых шматпавярховых жылых будынкаў. Архітэктура гэтага перыяду абапіралася пераважна на цагельнае будаўніцтва. Аднак ужо тады будаўнікі карысталіся жалезабетоннымі канструкцыямі, якія дазвалялі перакрываць шырокія зальныя памяшканні.

Адначасова рэканструявалася і расшыралася камунальная гаспадарка. Значна ўзрасла ў параўнанні з 1932 годам агульная даўжыня трамвайных пуцей. У трамвайным парку мелася 70 пасажырскіх вагонаў. За восем гадоў колькасць іх павялічылася ў 2,4 раза, а перавозка пасажыраў амаль падвоілася. Праводзіліся работы па рэканструкцыі трамвайнай гаспадаркі. Канцавыя тупікі, напрыклад, былі заменены паваротнымі кольцамі, што дало магчымасць увесці ў эксплуатацыю прычапныя вагоны.

У гады трэцяй пяцігодкі закончана вялікая работа па рэканструкцыі Мінскага чыгуначнага вузла: пабудаваны новыя пад'язныя пуці, састарэлае абсталяванне заменена больш дасканалым.

У 1940 годзе закончана рэканструкцыя чыгуначнай магістралі Масква — Негарэлае. Гэта дало магчымасць паўней выкарыстаць магутнасць новых паравозаў, павялічыць скорасць руху таварных і пасажырскіх паяздоў. Мінск станавіўся ўсё больш буйным чыгуначным вузлом. Восенню 1939 года былі ўстаноўлены рэгулярныя зносіны з заходнімі абласцямі БССР, а ў 1940 годзе — з рэспублікамі Савецкай Прыбалтыкі. На станцыю Мінск штодзённа прыбывалі і адпраўляліся дзесяткі паяздоў далёкага накіравання. Больш як 30 прыгарадных паяздоў забяспечвалі чыгуначныя зносіны паміж сталіцай і раёнамі рэспублікі. Мінскі вакзал не забяспечваў неабходных выгод для пасажыраў і ўмоў для работы персаналу станцыі. У 1938—1940 гадах вакзал быў пашыран, над усім будынкам надбудаваны другі, а ў цэнтральнай частцы — трэці паверх.

Паспяхова развіваўся аўтамабільны і паветраны транспарт. Напярэдадні вайны ўвайшла ў строй аўтастрада Мінск — Масква, адна з лепшых у краіне, метадам народнай будоўлі пракладзена шасэйная дарога Мінск — Вілейка.

У горадзе праводзіліся значныя работы па рэканструкцыі і далейшаму пашырэнню водаправода, лазня-пральнай гаспадаркі, каналізацыі, якія ўсё яшчэ адставалі ад патрэбнасцей прамысловасці і растучага насельніцтва.

У 1938 годзе на паляпшэнне водазабеспячэння асігнавана каля двух мільёнаў рублёў — у два разы больш, чым у 1933—1935 гадах. Новыя водаправодныя магістралі пралеглі па вуліцах Дзяржынскага, Розы Люксембург, Карла Лібкнехта, Першамайскай, Брылеўскай, Чырвонай, Беларускай і інш. Устаноўлены дзесяткі новых водаразборных калонак на Чэрвеньскім тракце, у Грушаўскім пасёлку і ў іншых раёнах горада. У 1940 годзе ў водаправодную сетку на кожнага жыхара падавалася ў суткі ў сярэднім 120 літраў вады.

За тры гады трэцяй пяцігодкі прапускная здольнасць водаправоднай сеткі Мінска павялічылася больш чым на 700 кубічных метраў у гадзіну. Працягласць вулічнай каналізацыйнай сеткі ў 1940 годзе склала 38,3 кіламетра.

За 1938—1939 гады на развіццё лазня-пральнай гаспадаркі выдаткавана 1607 тысяч рублёў.

Перамога сацыялізма ў СССР карэнным чынам змяніла сацыяльна-эканамічную характарыстыку сталіцы Беларусі. З горада чыноўнікаў, купцоў і саматужнікаў Мінск за гады Савецкай улады ператварыўся ў буйны адміністрацыйны і культурны цэнтр, у горад з развітай прамысловасцю. Яго бурны рост абумоўлен таксама вялікімі поспехамі, якіх беларускі народ дасягнуў у развіцці сацыялістычнай народнай гаспадаркі і нацыянальнай культуры.

Гады трэцяй пяцігодкі былі перыядам далейшага ўздыму матэрыяльнага дабрабыту працоўных. Палепшыліся ўмовы іх жыцця, з году ў год павышалася рэальная заработная плата, павялічвалася пакупная здольнасць.

У дадатак да заработнай платы насельніцтва Мінска, як і ўсе працоўныя краіны, атрымлівала вялікую дапамогу ад дзяржавы ў выглядзе дапамог і выплат па сацыяльнаму страхаванню, пенсій, штогодных водпускаў, бясплатных пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку, дапамог мнагадзетным маці, бясплатнай медыцынскай дапамогі. У 1938 годзе на фабрыцы «Камунарка», напрыклад, на аздараўленчыя мерапрыемствы, дыетычнае харчаванне і грашовую дапамогу рабочым выдаткавана 250 тысяч рублёў, у піянерскіх лагерах адпачывала 150 дзяцей рабочых. У 1939 годзе пуцёўкі на адпачынак і лячэнне атрымалі 395 рабочых і служачых фабрыкі «Кастрычнік». Раслі зберажэнні працоўных у ашчадных касах.

Адным з яркіх паказчыкаў паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту працоўных Мінска з'яўляўся рост іх пакупной здольнасці і павелічэнне абароту ў гандлёвай сетцы. З 1936 па 1939 год спажыванне насельніцтвам горада мяса і мясных вырабаў узрасло на 93, жывёльнага масла — на 96, малочных прадуктаў — на 86, яек — на 132 працэнты. За гэты ж час продаж насельніцтву баваўняных і шарсцяных швейных вырабаў павялічыўся на 45—85 працэнтаў.

Няўхільна расшыралася гандлёвая сетка, павялічвалася колькасць прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Асаблівая ўвага паранейшаму ўдзялялася будаўніцтву магазінаў на ўскраінах горада, у раёнах размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў і рабочых пасёлках Грушаўскім, «Камінтэрн», імя Фабрыцыуса, імя Пушкіна і інш. Усяго ў горадзе налічвался 62 сталовых, два рэстараны, 118 буфетаў і закусачных.

Вялікую ролю ў забеспячэнні працоўных Мінска прадуктамі харчавання па-ранейшаму адыгрываў калгасны гандаль. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і рост даходаў калгаснікаў з кожным годам забяспечвалі ўсё большае паступленне прадуктаў на рынкі. У 1939 годзе ў параўнанні з папярэднім годам завоз у Мінск мясных прадуктаў павялічыўся на 30,4, малака — на 7,3, яек — больш чым на 20,5 працэнта.

Паводле пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б, на тэрыторыі Мінскага і Дзяржынскага раёнаў стваралася прыгарадная зона забеспячэння Мінска гароднінай і бульбай. У 1940 годзе гарсавет заключыў з саўгасамі і калгасамі прыгараднай зоны дагаворы на закладку 34 тысяч парніковых рам, на пасадку гародніны і бульбы на плошчы 13 тысяч гектараў.

Партыйныя і савецкія арганізацыі Мінска ўдзялялі вялікую ўвагу стварэнню ўмоў, якія спрыялі развіццю калгаснага гандлю. Толькі ў 1940 годзе ў горадзе былі адкрыты 22 спецыялізаваных магазіны, 10 новых аддзелаў у магазінах, 27 ларкоў, 22 палаткі — усяго 101 гандлёвая адзінка. У 1941 годзе на бюджэту гарадскога Савета на добраўпарадкаванне існуючых рынкаў і адкрыццё новых выдзелена 754,8 тысячы рублёў — у два з лішнім разы больш, чым у 1937 годзе. Добраўпарадкоўваліся рыначныя плошчы, будаваліся новыя крытыя павільёны, каморы хавання, мяса-малочныя кантрольныя пункты.

Значнае месца ў забеспячэнні працоўных Мінска сельскагаспадарчымі прадуктамі займалі падсобныя гаспадаркі, створаныя пры прадпрыемствах і арганізацыях. У 1940 годзе для арганізацыі прыгарадных гаспадарак прадпрыемствам было выдзелена 1888 гектараў зямлі.

У бюджэце горада з году ў год павялічваліся асігнаванні на ахову здароўя, сацыяльнае забеспячэнне, грамадскае харчаванне. Так, капіталаўкладанні на ахову здароўя працоўных Мінска ў 1940 годзе ў параўнанні з 1934 годам узраслі ў чатыры з лішнім разы і склалі 15 мільёнаў рублёў — амаль чацвёртую частку гарадскога бюджэту.

Горад меў шырокую сетку лячэбных устаноў, укамплектаваных падрыхтаванымі спецыялістамі і абсталяваных найноўшай медыцынскай апаратурай. Былі пабудаваны новыя, расшыраны і пераабсталяваны двойнічаўшыя бальніцы і паліклінікі. Напярэдадні вайны ўступіла ў строй дзіцячая туберкулёзная бальніца, рэспубліканская навукова-даследчая зубная станцыя.

За 1934—1940 гады колькасць бальнічных устаноў павялічылася з 12 да 20, бальнічных ложкаў у іх — з 1750 да 3423, урачоў (без зубных) — з 654 да 953. К канцу 1940 года працавалі 13 жаночых і дзіцячых кансультацый, 47 ясляў на 2,8 тысячы месц.

У сувязі з ростам прамысловасці і ў мэтах далейшага паляпшэння медыцынскага абслугоўвання рабочых няспынна расшыралася сетка фабрычна-заводскіх медыцынскіх пунктаў. Новыя пункты аховы здароўя, у прыватнасці, былі адкрыты на заводзе імя Чкалава, шпалернай фабрыцы, хлебазаводзе і іншых прадпрыемствах.

Сярод гарадскога насельніцтва праводзілася вялікая прафілактычная работа. На абутковай фабрыцы, напрыклад, была абсталявана хлорная камера для папярэджання захворванняў грыпам і процімалярыйны кабінет. У цэхах наладжваліся гутаркі на медыцынскія тэмы, у горадзе адкрылася дыетычная сталовая, што абслугоўвала 200—250 чалавек. У ёй дзяжурылі ўрачы, якія кансультавалі наведвальнікаў, практыкавалася сістэма папярэдніх заказаў.

Пашырылася выкарыстанне санітарнай авіяцыі для аказання тэрміновай дапамогі насельніцтву далёкіх раёнаў Беларусі. Толькі ў 1938 годзе атрадам урачоў санітарнай авіяцыі ў раёнах вылету праведзена 230 хірургічных аперацый, 40 пераліванняў крыві, 67 хворых дастаўлены самалётамі ў бальніцы Мінска. Мацнелі і пашыраліся сувязі паміж медыцынскімі работнікамі сталіцы і раёнаў рэспублікі.

У выніку росту матэрыяльнага дабрабыту, паляпшэння ўмоў працы і быту працоўных, правядзення шырокіх прафілактычных мерапрыемстваў у Мінску з году ў год зніжалася захворванне тыфам, губеркулёзам, трахомай і іншымі хваробамі. Рэзка зменшылася смяротнасць як дарослых, так і дзяцей. Натуральны прырост насельніцтва ў Мінску быў значна вышэй, чым у гарадах капіталістычных дзяржаў. У 1938 годзе ў Мінску адносіны народжаных да памершых складалі 252 працэнты. У 1936 годзе ў Берліне яны складалі 107, а ў Лондане — 110 працэнтаў.

Далейшае развіццё атрымалі фізкультура і спорт. У парадзе фізкультурнікаў, які адбыўся 6 жніўня 1940 года, прымала ўдзел 15 тысяч спартсменаў Мінска і 1100 прадстаўнікоў фізкультурных калектываў абласцей рэспублікі.

3. Культурнае жыццё Мінска

Ва ўмовах завяршэння будаўніцтва сацыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да камунізма партыя ўзмацняла і ідэалагічную работу. 14 лістапада 1938 года ЦК ВКП(б) прыняў рашэнне аб пастаноўцы партыйнай прапаганды, у якім асудзіў пагоню за колькасным ахопам гуркамі ў шкоду якасці і ідэйнаму зместу прапаганды марксізма-ленінізма, указаў канкрэтныя шляхі, формы і метады паляпшэння прапаганды марксісцка-ленінскай тэорыі.

Узмацненню ідэалагічнай работы партыі і яе рашаючай галіны — партыйнай прапаганды — сур'ёзную ўвагу ўдзялілі XVIII з'езд ВКП(б) і XVIII з'езд КП(б) Беларусі. Партыйныя арганізацыі Мінска, узброеныя рашэннямі партыі, правялі вялікую арганізацыйна-прапагандысцкую работу. У лістападзе — снежні 1938 года прайшлі пленумы гаркома і райкомаў партыі, сходы партыйнага актыву, пярвічных партыйных арганізацый, інтэлігенцыі, на якіх разгарнулася вострая крытыка недахопаў у прапагандысцкай рабоце.

Значна палепшылася тэарэтычная падрыхтоўка прапагандыстаў, партыйных і газетных работнікаў. Вышэйшая школа прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б рыхтавала высокакваліфікаваныя кадры прапагандыстаў і партыйных работнікаў для ўсёй рэспублікі. Пры школе

функцыяніравалі таксама кароткатэрміновыя курсы камсамольскіх работнікаў. У студзені 1939 года адкрыліся гадавыя курсы па перападрыхтоўцы журналістаў. Значная колькасць камуністаў Мінска павышала кваліфікацыю ў Вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школе імя У. І. Леніна, на ленінскіх курсах у Маскве і Ленінградзе, у Вышэйшай партыйнай школе пры ЦК ВКП(б), адкрытай у лістападзе 1939 года.

Перабудавана была работа партыйнага апарату, які ведаў ідэалагічнымі пытаннямі. Культпропы Мінскага гаркома, раённых камітэтаў партыі былі рэарганізаваны ў аддзелы прапаганды і агітацыі. У часопісе «Большевик Белорусии», у рэспубліканскіх газетах, якія выдаваліся ў Мінску, створаны аддзелы прапаганды, сістэматычна публікаваліся матэрыялы, кансультацыі і запісы лекцый у дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм.

У прапагандзе марксісцка-ленінскіх ідэй значнае месца належала выдавецтвам. Толькі на працягу 1938—1939 гадоў Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР выпусціла 133 грамадска-палітычныя кнігі тыражом амаль у два мільёны экземпляраў. Вялікая колькасць літаратуры паступала з саюзных выдавецтваў. У 1940 годзе выйшла ў свет і паступіла да падпісчыкаў шостае выданне зборніка «ВКП(б) у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК». У 1941 годзе пачаўся выпуск і рассылка чытачам чацвёртага выдання твораў У. І. Леніна.

Карэнным чынам была перабудавана сістэма партыйнай асветы. Асноўным стаў метад самастойнага вывучэння тэорыі і гісторыі партыі. Рэзка скарацілася сетка гурткоў. Ва ўноўстварэныя гурткі камуністы, камсамольцы і інтэлігенцыя залічваліся толькі ў добраахвотным парадку. Кіраўнікамі гурткоў назначаліся найбольш падрыхтаваныя прапагандысты.

Для самастойна вывучаўшых марксісцка-ленінскую тэорыю рэгулярна чыталіся лекцыі. Вялікую дапамогу ў наладжванні лекцыйнай прапаганды аказвалі партыйным арганізацыям лектарскія групы ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б, Мінскага абкома і гаркома партыі.

Друкаваная і вусная прапаганда марксісцка-ленінскіх ідэй з'яўлялася важнай, але не адзінай формай дапамогі працоўным у палітычнай самаадукацыі. У партыйных арганізацыях Мінска склаліся і атрымалі шырокае распаўсюджванне і іншыя дзейсныя формы — семінары, тэарэтычныя канферэнцыі, таварыскія гутаркі, універсітэты марксізма-ленінізма. У Мінскім універсітэце марксізма-ленінізма, арганізаваным у студзені 1939 года, павышалі ідэйна-тэарэтычны ўзровень работнікі партыйнага і савецкага апарату, педагогі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, медыцынскія работнікі, інжынеры, мастакі, артысты, пісьменнікі.

Партыйныя арганізацыі ўдзялялі пастаянную ўвагу эканамічнай адукацыі партыйна-гаспадарчых кадраў, перш за ўсё кіруючых работнікаў прамысловых прадпрыемстваў. Дзейснымі формамі павышэння ўзроўню эканамічных ведаў з'яўляліся семінары і партыйна-тэхнічныя канферэнцыі, якія атрымалі ў кароткі час даволі шырокае распаўсюджванне. У 1940 годзе ў Мінску менш чым за два месяцы былі праведзены семінары на 17 буйнейшых прадпрыемствах. Побач з тэарэтычнымі праблемамі на іх абмяркоўваліся актуальныя пытанні вытворчай дзейнасці. Гэта ўзнімала творчую актыўнасць рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў, добра ўплывала на работу фабрык і заводаў.

Сур'ёзную дапамогу самастойна вывучаўшым марксісцка-ленінскую тэорыю аказваў Мінскі Дом партыйнай асветы. Тут праводзіліся таварыскія гутаркі, кансультацыі, абагульняўся і пашыраўся вопыт самастойна вывучаўшых тэорыю і гісторыю партыі. Рэгулярна працавалі лекторыі. Толькі ў 1940 годзе на фабрыках і заводах, ва ўстановах і навучальных установах прапагандысты Дома партыйнай асветы прачыталі больш як 400 лекцый. У тым жа годзе праведзены навуковыя сесіі, прысвечаныя 70-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна і 120-годдзю з дня нараджэння Ф. Энгельса.

Прапаганда марксісцка-ленінскай тэорыі, глыбокае вывучэнне гераічнай гісторыі бальшавіцкай партыі адыгралі велізарную ролю ў паляпшэнні ўсёй ідэалагічнай работы ў масах. Вялікі размах атрымала яна ў час выбарчых кампаній. Да агітацыйна-масавай работы былі прыцягнуты тысячы агітатараў, многія з якіх падрыхтаваны ў сетцы партыйнай асветы. Значная колькасць агітатараў і прапагандыстаў прымала актыўны ўдзел у рабоце ўчастковых і акруговых выбарчых камісій.

У сістэме масава-палітычнай работы віднае месца займалі клубы, бібліятэкі, музеі, паркі культуры і адпачынку. Вялікай папулярнасцю сярод выбаршчыкаў Мінска карысталася, напрыклад, агітбрыгада клуба будаўнікоў. Добра працавалі клубы работнікаў харчовай прамысловасці, дзяржгандлю і кааперацыі.

Перадавыя прадпрыемствы Мінска ў азнаменаванне выбараў перавыконвалі вытворчыя планы. Калектыў завода імя Кірава ў 1938 годзе заваяваў пераходны Чырвоны сцяг гаркома партыі і гарсавета. Хутка раслі рады перадавікоў вытворчасці. Павялічвалася колькасць ударнікаў. Дзень выбараў у Вярхоўны Савет БССР рабочыя прадпрыемстваў харчовай і лёгкай прамысловасці азнаменавалі датэрміновым выкананнем планавых заданняў.

У 1940—1941 гадах у Мінску налічвалася звыш 80 бібліятэк. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны кніжны фонд Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна складаў каля двух мільёнаў тамоў. Толькі

ў 1940 годзе яна абслужыла больш як 303 тысячы чалавек, выдаўшы ім каля 600 тысяч кніг.

Для працоўных Мінска наведванне музеяў стала патрэбнасцю. У 1938 годзе ў музеях пабывалі 13,4 тысячы чалавек. Музеі ў сваіх экспазіцыях адлюстроўвалі не толькі гісторыю барацьбы працоўных за вызваленне, але і шырока асвятлялі поспехі беларускага народа ў развіцці народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

У 1938—1941 гадах далейшых поспехаў дабілася агульнаадукацыйная школа. Пасля завяршэння абавязковага сямігадовага навучання вялікая работа праводзілася па ажыццяўленню ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Шырокім фронтам разгарнулася будаўніцтва новых школ. У 1927/28 навучальным годзе ў Мінску былі толькі дзве сярэднія школы, у 1940/41 навучальным годзе — 39. У сярэдніх школах навучалася больш як 92 працэнты вучняў горада.

Па-ранейшаму шмат увагі ўдзялялася павышэнню кваліфікацыі настаўнікаў. Расшыралася сістэма завочнай адукацыі, паляпшалася методыка навучання і выхавання вучняў.

За добрую пастаноўку вучэбна-выхаваўчай работы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР у маі 1939 года ўзнагародзіў многіх настаўнікаў Мінска ордэнамі і медалямі. У жніўні 1939 года Савет Народных Камісараў БССР прысвоіў настаўніцы рускай мовы 12-й сярэдняй школы Р. Г. Барам, выкладчыку геаграфіі 44-й сярэдняй школы Т. П. Вайтовічу, выкладчыку матэматыкі 25-й сярэдняй школы В. П. Гулісу, настаўніцы 9-й сярэдняй школы Ю. А. Лазаравай, настаўніцы 25-й сярэдняй школы З. В. Ліхачовай, настаўніку 2-й сярэдняй школы А. А. Чарняўскаму і многім іншым школьным работнікам ганаровае званне «Заслужаны настаўнік школ БССР».

К 1940/41 навучальнаму году Мінск ператварыўся ў буйны цэнтр па падрыхтоўцы нацыянальных беларускіх кадраў. У 10 ВНУ горада навучалася каля 10 тысяч студэнтаў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў складаў звыш 1000 чалавек. К пачатку 1940/41 навучальнага года на шасці факультэтах (фізіка-матэматычным, гістарычным, геаграфічным, хімічным, біялагічным і філалагічным), завочным аддзяленні і экстэрнаце БДУ навучалася каля дзвюх тысяч студэнтаў. Беларусы сярод іх складалі 51,6 працэнта. Гэта з'яўлялася буйнейшым дасягненнем. Вядома, што ў 1921/22 навучальным годзе сярод студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта беларусаў было толькі 28,6 працэнта.

За перадваенныя гады БДУ падрыхтаваў звыш шасці тысяч розных спецыялістаў і 150 навукова-педагагічных работнікаў. Многія выхаванцы універсітэта сталі вядомымі дзяржаўнымі дзеячамі, работнікамі навукі і асветы. Сярод іх міністр замежных спраў СССР

А. А. Грамыка, акадэмікі АН БССР К. Крапіва, М. Ф. Ярмоленка, праслаўленыя педагогі, ўзнагароджаныя ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, А. П. Сабчанка, І. Е. Атрашэнка, К. І. Шастакоў, Г. М. Хазанава і многія іншыя.

Вырас і ўзмацніў прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта. На яго 33 кафедрах працавала 150 выкладчыкаў. Сярод іх члены-карэспандэнты Акадэміі навук СССР, акадэмікі АН БССР, дактары і кандыдаты навук, прафесары і дацэнты.

На 30 кафедрах Беларускага політэхнічнага інстытута напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працавала каля 200 прафесараў, дацэнтаў і выкладчыкаў. Навучаліся ў інстытуце ў сярэднім 1200—1600 студэнтаў. За перадваенныя гады інстытут падрыхтаваў каля дзвюх тысяч спецыялістаў.

Буйной ВНУ па падрыхтоўцы эканамістаў і таваразнаўцаў з'яўляўся Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава. У 1939—1940 годзе ён выпускаў штогод 170—200 эканамістаў.

У Мінскім медыцынскім інстытуце ў 1941 годзе налічвалася каля 2,5 тысячы студэнтаў. За даваенныя гады ён падрыхтаваў звыш трох тысяч урачоў. Тысячы спецыялістаў скончылі педагагічны, лесатэхнічны і іншыя інстытуты Мінска. У Мінску дзейнічала шырокая сетка сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У 1939 годзе тэхнікумы і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы выпусцілі каля 1,5 тысячы спецыялістаў.

К 1941 навучальнаму году ў Мінску была створана сетка прафесіянальных і рамесніцкіх вучылішч, школ ФЗН, у якіх рыхтаваліся высокакваліфікаваныя кадры рабочых для розных галін народнай гаспадаркі.

На больш высокі ўзровень узнялася навуковая дзейнасць. У пачатку 1941 года тры аддзяленні Акадэміі навук БССР аб'ядноўвалі інстытуты гісторыі, філасофіі і права, эканомікі, літаратуры і мовы, сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, біялогіі, геалогіі, эксперыментальнай фізіялогіі, хіміі, торфу. Пры Акадэміі навук былі арганізаваны Цэнтральны батанічны сад, вегетацыйныя домікі, аранжарэі, доследны торфагідролізны завод.

На 1 студзеня 1941 года ў АН БССР працавалі 437 навуковых і навукова-тэхнічных работнікаў, з іх каля 60 акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў АН БССР, дактароў і прафесараў. Палепшылася падрыхтоўка навуковых кадраў. На 1 кастрычніка 1938 года ў ВНУ і навукова-даследчых установах Мінска рыхтавалася больш як 100 аспірантаў.

Рост кадраў, павышэнне іх навуковай кваліфікацыі стваралі спрыяльныя ўмовы для расшырэння навукова-даследчай работы. Яна асабліва шырока разгарнулася пасля XVIII з'езду ВКП(б).

У цэнтры ўвагі АН БССР і яе навукова-даследчых устаноў знаходзілася вывучэнне прыродных рэсурсаў, геалагічнай будовы зямлі, тарфяных багаццяў, флоры, фауны, клімату, размяшчэння прадукцыйных сіл рэспублікі.

Распрацоўкай праблем размяшчэння прадукцыйных сіл і комплекснага развіцця народнай гаспадаркі займаліся амаль усе навукова-даследчыя ўстановы АН БССР і адпаведныя кафедры вышэйшых навучальных устаноў Мінска. Актыўны ўдзел ва ўказаных работах прымалі Дзяржплан БССР, наркаматы, упраўленні і ведамствы.

Інстытут геалогіі заклаў на тэрыторыі рэспублікі рад шчылін з мэтай выяўлення запасаў нафты і каменнага вугалю. Вялікія работы вяліся па разведцы карысных выкапняў.

Як вядома, торф у нашай рэспубліцы з'яўляўся не толькі асноўнай паліўна-энергетычнай базай, але і важным сродкам угнаення калгасна-саўгасных палёў. У кароткі тэрмін былі створаны «Асінторф», «Бальшавік», «Чырвоны сцяг» і іншыя буйныя торфапрадпрыемствы. Тарфяная прамысловасць рэспублікі ператварылася ў адну з буйнейшых галін народнай гаспадаркі. У 1940 годзе ў БССР здабывалася 3384 тысячы тон торфу, у 1913 — толькі 14 тысяч тон.

Значных поспехаў удалося дасягнуць у механізацыі здабычы, сушкі і транспарціроўкі торфу. Толькі на прадпрыемствах Наркамата мясцовай паліўнай прамысловасці БССР ужывалася сем кранаў гідраторфу, 13 гідраэлеватарных установак, 33 скрэперныя і 32 элеватарныя машыны, каля 200 трактараў.

Серыя даследаванняў вялася ў галіне лесахіміі. Распрацаваны беларускімі лесахімікамі метад гідролізу драўніны, які дазваляў атрымліваць вінны спірт з драўляных апілак, шырока ўжываўся ва ўсёй лесахімічнай прамысловасці СССР.

Вялікія даследаванні вяліся па вывучэнню і сельскагаспадарчаму выкарыстанню забалочаных зямель Палескай нізіны, па вапнаванню глеб, ужыванню арганічных і мінеральных угнаенняў, вывядзенню новых гатункаў збожжавых культур, па барацьбе з хваробамі і шкоднікамі сельскагаспадарчых раслін.

Вывучаліся таксама флора і фауна. Створаныя ў гэты перыяд па ініцыятыве мінскіх вучоных запаведнікі мелі вялікае навуковае і практычнае значэнне. У запаведніку «Белавежская пушча» разводзіліся зубры, на Бярэзіне — бабры, ласі, выдры, куніцы, глушцы. У Вялаўскім запаведніку акліматызавана лань.

Вялікія работы вяліся ў галіне фізіялогіі чалавека і жывёлін, барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі. Актыўны ўдзел у гэтых даследаваннях прымалі А. Я. Пракапчук, Д. А. Маркаў, В. А. Ляонаў, Б. І. Трусевіч і іншыя акадэмікі АН БССР.

Плённа працавалі вучоныя ў галіне грамадскіх навук. Інстытут гісторыі завяршыў работу над першым томам «Гісторыі БССР», у якім раскрывалася развіццё Беларусі з старажытных часоў да рэформы 1861 года. Выйшла з друку работа «Заходняя Беларусь пад прыгнётам панскай Польшчы ў 1919—1939 гг.» У 1940 годзе Інстытут гісторыі падрыхтаваў і здаў у друк 29 работ аб'ёмам больш як 60 друкаваных аркушаў.

Інстытут мовы і літаратуры падрыхтаваў у 1937 годзе граматыку беларускай мовы для сярэдняй школы і руска-беларускі слоўнік. У 1940 годзе выйшлі ў свет падручнік па гісторыі беларускай літаратуры для старэйшых класаў сярэдняй школы, гісторыі старажытнай беларускай літаратуры.

Педагагічны калектыў фізіка-матэматычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, перш за ўсё прафесар Е. В. Святкоў, дацэнт І. Г. Некрашэвіч, праводзілі вялікія даследаванні ў галіне ультракароткіх хваль і рэнтгенаструктурнага аналізу.

Вучоныя кафедры фізіялогіі раслін БДУ шмат увагі ўдзялялі праблемам прыроды і механізму дзеяння апарата раслін, які паглынае сонечную энергію, утварэння і паслядоўнага фарміравання хларафілу. Значную колькасць даследаванняў па першай праблеме выканаў прафесар Ц. М. Годнеў.

Вучоныя кафедры заалогіі пазваночных унеслі значны ўклад у вывучэнне фауны рэспублікі. Рад каштоўных работ апублікаваў прафесар М. Е. Макушок.

Значныя даследаванні ў галіне хіміі выканалі прафесары В. К. Нікіфараў, М. Ф. Ярмоленка, Н. С. Казлоў.

Вялікія даследаванні вяліся вучонымі Мінскага медыцынскага інстытута. У перадваенны перыяд інстытут выдаў 13 зборнікаў навуковых прац, вялікую колькасць манаграфій. Шмат навуковых работ выкладчыкі і вучоныя медыцынскага інстытута апублікавалі ў навуковых выданнях Акадэмій навук СССР і БССР, у часопісах і газетах Савецкага Саюза.

Нельга, аднак, не адзначыць, што ў навуковай рабоце Акадэміі навук БССР і вышэйшых навучальных устаноў Мінска дапускаліся сур'ёзныя недахопы. Праблемы, якія даследаваліся, вывучаліся часта не глыбока і адлюстроўвалі толькі прыватныя пытанні. Вынікі навуковых даследаванняў марудна ўкараняліся ў вытворчасць. Творчы падыход у навуковых даследаваннях, асабліва ў грамадскіх навуках, падмяняўся часам дагматызмам. Рад навуковых работнікаў падвергся неабгрунтаваным рэпрэсіям.

Новых творчых поспехаў у 1938—1941 гадах дабіліся работнікі літаратуры і мастацтва. Мінскія пісьменнікі, артысты, мастакі пачалі паўней раскрываць гераізм народа ў барацьбе за перамогу камунізма.

Павялічылася колькасць твораў, прысвечаных рабочаму класу і яго поспехам у індустрыялізацыі краіны. У зборніку «Беларусі ардэнаносная» Я. Купала праславіў гераічны рабочы клас, сталіцу БССР. Працоўным подзвігам рабочых прысвяцілі свае творы Я. Колас, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка, іншыя беларускія пісьменнікі і паэты.

Шмат увагі ўдзялялася калгаснай тэматыцы. Новае жыццё беларускага сялянства ва ўмовах сацыялістычнага ўкладу, які няўхільна развіваецца, ярка адлюстравана ў паэмах А. Куляшова «У зялёнай дубраве» (1939 год) і П. Броўкі «Кацярына» (1937 год). Зброяй сатыры К. Крапіва працягваў бічаваць перажыткі старога ў быце калгаснай вёскі, заклікаючы калгаснікаў умацоўваць усё новае і перадавое.

У творчасці мінскіх пісьменнікаў нямала месца займалі творы гістарычнага жанру. У драме «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіч адлюстраваў сялянскае паўстанне XVI стагоддзя, паказаў свабадалюбства, мужнасць, адвагу, патрыятызм беларускага народа ў барацьбе з прыгнятальнікамі. Значная колькасць твораў ствараласа па фальклорных матывах. Гэта, напрыклад, п'еса-казка «Цудоўная дудка» (1938) і камедыя «Несцерка» (1940) В. Вольскага. На ўсесаюзным конкурсе 1941 года камедыі «Несцерка» прысуджана першая прэмія. А. Фадзееў пісаў В. Вольскаму, што смех, які так натуральна выклікае камедыя, вельмі блізкі да таго, які выклікаюць вясёлыя народныя казкі або «Вечары на хутары ля Дзіканькі», бо камедыя народная ў сваёй аснове.

Выйшла шмат кніг, прысвечаных Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне. З вялікім уздымам адклікнуліся літаратары Мінска на падзеі, звязаныя з уз'яднаннем беларускага народа ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве. Рад твораў на гэту тэму напісалі Я. Купала, Я. Колас, П. Броўка, П. Панчанка, М. Лынькоў, К. Чорны. Усе яны ярка, маляўніча апісалі вызваленчы паход Савецкай Арміі, хвалюючыя сустрэчы воінаў-вызваліцеляў з насельніцтвам заходніх абласцей Беларусі. Вызваленне аднакроўных братоў-беларусаў паказвалася ў творах пісьменнікаў як акт гістарычнай справядлівасці і глыбокай гуманнасці.

Пасля ўз'яднання Беларусі ў сям'ю пісьменнікаў Мінска і рэспублікі ўліўся новы атрад таленавітых літаратараў: Максім Танк, Піліп Пестрак, Міхась Машара, Мікола Засім, Міхась Васілёк, Ніна Тарас і інш. Стаўшы песнярамі ўсяго беларускага народа, яны стварылі шмат выдатных твораў.

Тэма дружбы народаў стала ў перадваенныя гады адной з вядучых у беларускай літаратуры. Ёй прысвечана большасць твораў прозы, драматургіі і паэзіі. Сярод іх асобнае месца належыць паэме

«Тарасова доля», напісанай Я. Купалам у 1939 годзе да 125-годдзя з дня нараджэння Т. Р. Шаўчэнкі. Я. Купала, Я. Колас і іншыя пісьменнікі перакладалі на беларускую мову творы пісьменнікаў РСФСР і іншых рэспублік Савецкага Саюза. Гэта літаратура мела вялікае палітычнае значэнне, умацоўвала брацкую дружбу паміж народамі нашай краіны.

Імкнучыся паўней асэнсаваць гераічныя подзвігі будаўнікоў камуністычнага грамадства, пісьменнікі Мінска разам з іншымі літаратарамі БССР выязджалі на фабрыкі і заводы, у калгасы і саўгасы, у іншыя рэспублікі. Паездка ў Грузінскую ССР, напрыклад, дала багаты матэрыял для такіх твораў, як «Будучыня» Э. Самуйлёнка і «Дружба» Б. Мікуліча.

Пісьменнікі Мінска, выкрываючы фашысцкіх падпальшчыкаў вайны, рашуча выступалі ў абарону прагрэсу і культуры. Іх голас перасцерагальна гучаў са старонак перыядычнага друку і з трыбун сусветных кангрэсаў. У мастацкіх творах Я. Коласа «Вайна вайне» і «У пушчах Палесся», К. Крапівы «Партызаны», К. Чорнага «Бацькаўшчына», А. Куляшова «Баранаў Васіль» і іншых выкрываліся імперыялістычныя захопніцкія войны, зрываліся маскі з тых, у чыіх інтарэсах яны вяліся.

Барацьба іспанскіх патрыётаў і інтэрнацыянальных брыгад супраць фашысцкіх орд Франко, Гітлера, Мусаліні — усё гэта знаходзіла адлюстраванне ў мастацкіх творах. У вершы «Гераічнай Іспаніі» Я. Коласа, вершы «Іспанія будзе свабоднай», паэме «Хлопцы апошняй вайны» Я. Купалы, у вершах П. Броўкі, П. Глебкі, іншых паэтаў Мінска гучаў гнеўны пратэст супраць злачынстваў імперыялістычных агрэсараў.

У перадваенныя гады паспяхова развівалася дзейнасць Тэатра оперы і балета, Першага беларускага драматычнага тэатра, Рускага драматычнага тэатра, Тэатра юнага гледача імя Н. К. Крупскай. Калектывы тэатраў папаўняліся новымі сіламі. Так, у Першы беларускі драматычны тэатр улілася вялікая група вопытных і маладых акцёраў: Л. Шынко, Р. Кашэльнікава, Б. Кудраўцаў, П. Пекур, З. Браварская, З. Стома і многія іншыя. Рэжысёры тэатраў Р. Рахленка, М. Зораў, К. Саннікаў і іншыя былі перакананымі прыхільнікамі рэалістычнага напрамку ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва.

У тэатрах сталіцы Беларусі па-ранейшаму аддавалася перавага п'есам, у якіх праўдзіва паказвалася барацьба савецкіх людзей за ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады, за пабудову сацыялістычнага грамадства і ўмацаванне абароназдольнасці краіны. Не аслаблялася ўвага і да пастаноўкі твораў рускай і заходнееўрапейскай класікі.

Першы беларускі дзяржаўны драматычны тэатр у перадваенныя гады стварыў нямала добрых спектакляў, такіх, як «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка, «Апошнія» М. Горкага і шэраг іншых.

У Тэатры юнага гледача ішлі спектаклі «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага, «Цудоўная дудка» В. Вольскага, «Ноч у верасні» І. Чэкіна, «Даходнае месца» А. Астроўскага і многія іншыя.

Перад Вялікай Айчыннай вайной калектыў Тэатра оперы і балета вырас да 800 чалавек. Сярод іх было нямала акцёраў вялікага вакальнага і драматычнага таленту.

У чэрвені 1940 года ў Маскву для ўдзелу ў дэкадзе беларускага мастацтва выехалі Тэатр оперы і балета, Першы беларускі драматычны тэатр, Дзяржфілармонія, ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Р. Р. Шырмы, народны хор на чале з Г. І. Цітовічам, ансамбль песні і танца БВА пад кіраўніцтвам Р. Усачова, калектывы мастацкай самадзейнасці.

Тэатр оперы і балета паказаў гледачам Масквы оперы «Міхась Падгорны», «У пушчах Палесся» і «Кветка шчасця», балет «Салавей». Першы дзяржаўны драматычны тэатр паставіў п'есы «Партызаны», «Пагібель воўка», «Хто смяецца апошнім». У заключным канцэрце выступілі музычныя і танцавальныя ансамблі, калектывы мастацкай самадзейнасці і зводны хор з 750 спевакоў. Тэатральная грамадскасць і друк сталіцы высока ацанілі беларускае мастацтва. 18 чэрвеня 1940 года «Правда» пісала: «Можна без перабольшання сказаць, што беларускае мастацтва ў Маскве прадэманстравана з поўным поспехам, прадэманстравана трыумфальна, стала, важка».

За выдатныя дасягненні ў развіцці мастацтва Тэатр оперы і балета быў узнагароджаны ордэнам Леніна, Першы беларускі дзяржаўны драматычны тэатр і Беларуская дзяржаўная філармонія — ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Значнай групе артыстаў былі ўручаны ўрадавыя ўзнагароды, прысвоены ганаровыя званні.

У дырэктывах па трэцяму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі XVIII з'езд ВКП(б) указаў на неабходнасць павелічэння сеткі кінатэатраў, колькасці стацыянарных і перасовачных гукавых кінаўстановак. ЦК КПБ і ўрад Беларускай ССР прынялі рад мер да павелічэння колькасці кінатэатраў. У 1940 годзе ў Мінску дзейнічалі пяць кінатэатраў і 20 клубных кінаўстановак.

Кінамастацтва рэспублікі ў гэты перыяд сканцэнтроўвае ўвагу на сучаснай тэматыцы. Беларуская кінахроніка перыядычна выпускала кіначасопісы і кінанарысы, прысвечаныя найважнейшым падзеям не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Толькі ў 1939 годзе Мінская студыя кінахронікі падрыхтавала 61 гукавы кіначасопіс для мясцовага экрана, два нарысавых фільмы і 40 сюжэтаў для ўсесаюз-

нага экрана. Яны расказвалі аб развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры, умацаванні абароны краіны. Актуальнымі былі, у прыватнасці, хранікальныя фільмы «З хутароў у калгасныя паселішчы» і «Крэпасць абароны».

У кінафільме «Чырвоны дазор», прысвечаным 20-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, нібы падводзіліся вынікі барацьбы і перамог працоўных рэспублікі за ўвесь перыяд Савецкай улады. Яго героямі былі перадавікі вытворчасці першых пяцігодак. Шырока паказваліся новыя фабрыкі і заводы, лепшыя калгасы і саўгасы, ВНУ, навукова-даследчыя і культурна-асветныя ўстановы. Спецыяльны часопіс кінахроніка выпусціла да 20-годдзя Беларускай ССР.

У 1939—1941 гадах кінахроніка аператыўна адлюстроўвала найважнейшыя факты і падзеі, якія адбываліся ў вызваленых Чырвонай Арміяй заходніх абласцях Беларусі. Яны шмат увагі ўдзялялі выбарам у дэпутаты Народнага Сходу, аднаўленню фабрык і заводаў, стварэнню культурна-асветных устаноў, радасным сустрэчам савецкіх воінаў з насельніцтвам.

Студыя «Савецкая Беларусь» выпусціла рад мастацкіх фільмаў. «Дачка Радзімы», «Адзінаццатага ліпеня», «Балтыйцы», «Вогненныя гады» і іншыя фільмы з поспехам дэманстраваліся не толькі на экранах рэспублікі, але і за яе межамі. Гэтыя бясспрэчныя дасягненні з'яўляліся перш за ўсё вынікам таго, што беларускія кінематаграфісты імкнуліся глыбока і ўсебакова адлюстроўваць жыццё савецкага народа.

Аднак студыя магла дабіцца большых поспехаў. Як ужо ўспаміналася, кінастудыя «Савецкая Беларусь» была створана ў 1927 годзе ў Ленінградзе. Неацэнную дапамогу ў яе стварэнні аказаў БССР С. М. Кіраў. У горадзе пралетарскай культуры беларускія кінематаграфісты прайшлі добрую палітычную і мастацкую школу.

У той жа час працяглае знаходжанне ў Ленінградзе парадзіла сярод некаторай часткі кіруючых работнікаў беларускага кіно ўтрыманскія настроі. Яны не ўдзялялі належнай увагі падрыхтоўцы нацыянальных кадраў, аслабілі сувязь з жыццём беларускага народа і творчай інтэлігенцыяй рэспублікі. Намецілася тэндэнцыя адмовы ад стварэння кінатвораў на беларускім нацыянальным матэрыяле. У 1939 годзе кінастудыя «Савецкая Беларусь» перабазіравалася ў Мінск. Гэта станоўча адбілася на ўсёй яе наступнай рабоце.

Разам з іншымі відамі мастацтваў паспяхова развіваліся ў Мінску жывапіс, графіка, скульптура, тэатральна-дэкаратыўнае афармленне. У 1939 годзе адкрылася Дзяржаўная карцінная галерэя БССР. У яе залах экспанаваліся творы класікаў рускага і сусветнага жывапісу, мастакоў і скульптараў БССР і іншых рэспублік. Творы

мінскіх мастакоў, якія таленавіта адлюстроўваюць гісторыю рэвалюцыйнага руху, героіку грамадзянскай вайны, практыку сацыялістычнага будаўніцтва, сістэматычна экспанаваліся на мастацкіх выстаўках як у Мінску, так і за яго межамі.

У 1940—1941 гадах на выстаўках, якія адкрыліся ў Маскве і Мінску, былі прадстаўлены буйныя мастацкія палотны, многафігурныя кампазіцыі, партрэты, скульптурныя творы. Вызначаліся, у прыватнасці, карціны Е. А. Зайцава «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск», І. Л. Давідовіча «Курлоўскі расстрэл», П. П. Гаўрыленкі «Разгром карнілаўскіх эшалонаў» і многія іншыя.

Подзвігам савецкіх людзей у будаўніцтве сацыялізма і абароне Радзімы прысвяцілі свае творы В. Цвірка («Калгасны двор»), І. Давідовіч («Свята ў калгасе»), В. Волкаў («Абмен вопытам»), Я. Кругер («Кавальскі цэх), М. Манасзон («Сустрэча танкістаў у Заходняй Беларусі»), Ф. Мадораў (эскіз «Народны Сход у Заходняй Беларусі») і многія іншыя мастакі.

Шэраг вялікіх работ прыслалі на выстаўку пейзажысты, майстры партрэтнага мастацтва, скульптары. Дастойнае месца сярод іх занялі творы скульптараў А. М. Бразера, А. В. Грубэ, З. І. Азгура, А. А. Бембеля, А. К. Глебава. Увагу наведвальнікаў маскоўскай і мінскай выставак прыцягнулі арыгінальныя работы скульптараў-самавучак, вышывальшчыц, ткачых і іншых народных умельцаў: партрэт У. І. Леніна, абрамлены беларускім арнаментам, карціны школьніка А. Заспіцкага «Савецкая маці», «Муляр», «Шавец», а таксама вытканыя коўдры, сурвэткі, абрусы, ручнікі, фартухі, нацыянальныя касцюмы.

Поспехі майстроў мастацтваў Мінска пераканаўча сведчылі аб тым, што ў краіне Саветаў паспяхова ажыццяўляецца ўказанне У. І. Леніна — мастацтва павінна належаць народу.

4. Уз'яднанне беларускага народа і дапамога працоўных Мінска насельніцтву заходніх абласцей

У той час як працоўныя Савецкай Беларусі будавалі новае светлае жыццё, мільёны іх братоў у Заходняй Беларусі знемагалі пад прыгнётам буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Рыжскі дагавор 1921 года, які замацаваў гэты супярэчыўшы нацыянальным інтарэсам беларускага народа раздзел, асудзіў іх на доўгія годы паўкаланіяльнага жыцця.

Заходняя Беларусь была ператворана ў аграрна-сыравінны прыдатак Польшчы. Імкнучыся атрымаць максімальны прыбытак, поль-

скія капіталісты па-драпежніцку выкарыстоўвалі прыродныя багацці краю, тармазілі развіццё мясцовай прамысловасці. Гэта павялічыла беспрацоўе.

Урад Польшчы імкнуўся вырашыць вострую аграрную праблему за лік беларускага сялянства, шляхам насаджэння «асадніцкіх» гаспадарак. Асаднікі, члены «Саюза былых абаронцаў усходніх ускраін», у асноўным афіцэры і унтэр-афіцэры польскай арміі, атрымалі ад урада зямельныя надзелы на тэрыторыі «ўскраін», населеных беларусамі.

Наколькі шырока насаджалася асадніцтва, можна меркаваць хаця бы па таму, што да 1939 года на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалася 37 000 асадніцкіх гаспадарак. Размеры кожнай з іх складалі ў сярэднім 42 гектары. Значыць, у беларускага сялянства было аднята больш як паўтара мільёна гектараў урадлівай зямлі.

Падаткі, якія беларусы павінны былі плаціць польскаму ўраду, у пяць — сем разоў перавышалі ўсе падаткі, якімі яны абкладаліся да Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Абяздоленыя, прыгнятаемыя польскімі памешчыкамі і капіталістамі, працоўныя Заходняй Беларусі з надзеяй глядзелі на ўсход. І дзень вызвалення настаў. У верасні 1939 года польскі ўрад уцёк у Англію, кінуўшы на волю лёсу сваю краіну і народ. 17 верасня 1939 года па распараджэнню Савецкага ўрада Галоўнае камандаванне Чырвонай Арміі дало загад войскам перайсці дзяржаўную граніцу, узяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Гэты гуманны акт Савецкага ўрада горача адобрылі і аднадушна падтрымалі працоўныя нашай краіны. Справядлівае рашэнне ўрада было асабліва зразумела жыхарам Мінска. Знаходзячыся ў непасрэднай блізкасці ад граніцы з Польшчай, яны лепш, чым хто іншы, ведалі пра пакуты сваіх братоў.

У дзень пераходу часцямі Чырвонай Арміі дзяржаўнай граніцы ў Мінску адбыўся масавы мітынг працоўных, прайшлі сходы партыйнага і камсамольскага актыву. У тэлеграме чырвонаармейцам, камандзірам, камісарам і палітработнікам Беларускага фронту мінскія камсамольцы пісалі: «Уся моладзь Мінска, як і ўвесь савецкі народ, яшчэ цясней згуртаваўшы свае рады вакол свайго авангарда, сваёй партыі... пакажа новыя вытворчыя поспехі ў любых умовах і любых абставінах. Калі ж будзе патрэбна, то мы разам з вамі пойдзем у бой». На наступны дзень дзесяткі маладых мінчан звярнуліся ў ваенкаматы з просьбай залічыць іх добраахвотнікамі ў рады Чырвонай Арміі. Нягледзячы на адыход часткі рабочых на фронт, фабрыкі і заводы Мінска датэрмінова, у верасні месяцы, выканалі свае вытворчыя планы.

Ваенныя дзеянні на Беларускім фронце развіваліся з небывалай хуткасцю. 20 верасня 1939 года часцямі Чырвонай Арміі вызвалены горад Гродна, 21 верасня — Пінск, 22 верасня — Брэст, 28—29 верасня савецкія войскі занялі пазіцыі на ўсёй адлегласці дэмаркацыйнай лініі. Звяртаючыся да байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, газета «Звязда» пісала ў гэтыя дні: «Ад вашых бацькоў, маці, жонак, сясцёр і дзяцей, ад усіх працоўных Мінска шлем вам сардэчнае прывітанне і віншаванні з паспяховым выкананнем вялікай задачы вызвалення працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад векавечнага прыгнёту польскага памешчыцкага і буржуазнага прыгнечання. Разбушаная буржуазія адняла ў працоўных Заходняй Беларусі ўсё: зямлю, палітую іх потам і крывёй, хлеб, здабыты непасільнай працай... знішчыла іх чалавечую годнасць, называючы быдлам. Вы вяртаеце да жыцця гэтых людзей, родных, любімых нашых братоў, за лёс якіх так балела заўсёды наша сэрца».

Разам з савецкімі войскамі на вызваленую зямлю прыйшло новае жыццё. У гарадах, паветах, сёлах ствараліся часовыя ўпраўленні, у якія выбіраліся лепшыя прадстаўнікі мясцовага насельніцтва. Выбраныя народам, дзейнічаючы ў інтарэсах народа, яны актыўна наладжвалі новае жыццё цяпер ужо на сваёй зямлі. Так, адразу ж пасля вызвалення вялікую работу разгарнула часовае ўпраўленне Баранавіцкага павета. Было адкрыта 37 новых школ, пачата будаўніцтва яшчэ 17 школ, санаторыя і амбулаторыі.

Уся краіна горача адклікнулася на заклік аб аказанні дапамогі вызваленым абласцям. Праз Мінск ішлі грузы, у якіх востра мела патрэбу насельніцтва Заходняй Беларусі. Мінскія чыгуначнікі паклапаціліся аб тым, каб усе гэтыя грузы дайшлі да месца назначэння ў найкарацейшы тэрмін. Толькі за два дні імі было адпраўлена на захад Беларусі 6000 тон солі, 700 тон газы, 5000 скрынак запалак, 7150 скрынак махоркі і іншыя прадметы першай неабходнасці. Служба руху Мінскага чыгуначнага вузла працавала бездакорна. Для павышэння інтэнсіўнасці руху і павелічэння грузаабароту ў кастрычніку 1939 года быў уведзен новы пастаянны рэйс Мінск — Баранавічы.

Школы заходніх абласцей Беларусі мелі патрэбу ў падручніках. Белкнігагандаль адправіў ім 150 000 экземпляраў беларускай граматыкі і 200 000 буквароў. Навукова-даследчы інстытут Наркамасветы БССР выслаў настаўнікам новых школ серыю брашур аб выхаванні вучняў. Вучні 4-й сярэдняй школы Мінска арганізавалі збор падарункаў для дзяцей вызваленых абласцей. Бюро ЦК ЛКСМБ парэкамендавала ўсім піянерскім і камсамольскім арганізацыям падтрымаць гэты выдатны пачын, узяць шэфства над школамі заходніх абласцей Беларусі. З якім энтузіязмам быў пад-

хоплен гэты заклік, гаворыць хоць бы той факт, што навучэнцы толькі 47-й мінскай сярэдняй школы сабралі больш як 2000 кніг і падручнікаў.

12 кастрычніка 1939 года адбыліся пасяджэнне бюро Мінскага гаркома КПБ і сход партыйнага актыву. Па рашэнню сходу ў заходнія вобласці былі пасланы 1200 партыйных і камсамольскіх работнікаў, журналістаў, настаўнікаў, урачоў і работнікаў гандлю. 24 верасня ў заходнія вобласці выехаў Беларускі ансамбль песні і танца, у пачатку кастрычніка — яшчэ 300 работнікаў мастацтва.

Мінскія прамсаюзы прынялі шэфства над прамарцелямі Беластоцкай вобласці. Дзякуючы іх дапамозе ўжо да 1 студзеня 1940 года ў вобласці было створана і працавала 41 арцель. Беларускае радыё ў канцы верасня 1939 года наладзіла рэгулярную трансляцыю радыёперадач для жыхароў заходніх абласцей. Беларускае аддзяленне Саюзкінапракату адправіла ў вызваленыя раёны 265 поўнаметражных гукавых фільмаў.

Народны Сход Заходняй Беларусі, скліканы 28 кастрычніка 1939 года ў Беластоку, 29 кастрычніка аднадушна прыняў «Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». «Працоўныя Заходняй Беларусі,— гаварылася ў дэкларацыі,— заўсёды лічылі сябе звязанымі непарыўнымі кроўнымі вузамі са сваімі братамі, якія пабудавалі Савецкую Сацыялістычную Беларусь. Працоўныя Заходняй Беларусі рашуча патрабуюць уз'яднання дагэтуль расчлянёных дзвюх частак адзінага беларускага народа, адзінай беларускай зямлі.

Лічачы волю беларускага народа вышэйшым законам, Беларускі Народны Сход пастанаўляе: Прасіць Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ўз'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа».

Сходам былі абвешчаны таксама «Дэкларацыя аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель» і «Дэкларацыя аб канфіскацыі банкаў і буйной прамысловасці».

Пятая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР пастанавіла: «Задаволіць просьбу Народнага Сходу Заходняй Беларусі і ўключыць яе ў склад Савецкага Саюза з уз'яднаннем яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай». 12 лістапада III нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла рашэнне аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад рэспублікі. Гістарычная несправядлівасць у адносінах да беларускага народа, якая існавала на працягу амаль 20 гадоў, была ліквідавана. Жыхары заходніх абласцей Беларусі сталі раўнапраўнымі грамадзянамі Савецкага Саюза.

Улічваючы патрэбы і запатрабаванні насельніцтва, неабходнасць умацавання заходніх граніц краіны, Савецкі ўрад удзяляў велізарную ўвагу гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву ва ўз'яднаных абласцях. Па дзяржаўнаму плану СССР на 1940 год на аднаўленне і развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях выдзялялася 730 мільёнаў рублёў.

Адной з найбольш важных і неадкладных задач, якія стаялі перад насельніцтвам новых раёнаў Беларусі, была калектывізацыя сельскай гаспадаркі. З гэтай мэтай была створана магутная матэрыяльна-тэхнічная база. У канцы красавіка 1940 года на тэрыторыі заходніх раёнаў Беларусі была арганізавана 101 МТС. Іх парк складалі больш як 500 трактараў, 2000 конных плугоў, 1600 культыватараў, 1000 сеялак. Працоўныя Беларусі, у першую чаргу насельніцтва Мінска, прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы механізатарскіх кадраў для гэтых станцый, у перадачы вопыту калектывізацыі, набытага за гады Савецкай улады. Толькі ў студзені 1940 года з Мінска на работу ў заходнія вобласці Беларусі выехалі 30 работнікаў Наркамзема.

Вялікая арганізатарская работа неўзабаве дала адпаведныя вынікі. Да мая 1940 года на захадзе Беларусі налічвалася 430 калгасаў, якія аб'ядналі 23 247 сялянскіх гаспадарак. Да чэрвеня 1941 года колькасць калгасаў узрасла да 1115.

Для пашырэння пасяўных плошчаў калгасаў было пачата немыслімае ва ўмовах буржуазна-памешчыцкай Польшчы наступленне на балоты. Намячалася ў карацейшы тэрмін асушыць больш аднаго мільёна гектараў балот і забалочаных зямель. Велізарную ролю ў ажыццяўленні гэтай задачы адыграў Навукова-даследчы інстытут балотнай гаспадаркі. У красавіку 1940 года была паслана спецыяльная экспедыцыя для вывучэння балот і ўмоў меліярацыі ў заходніх раёнах Беларусі. Тым жа інстытутам былі сканструяваны і перададзены ў вытворчасць сеялка і ўборачная машына, прыстасаваныя для работы на забалочаных землях.

У сувязі з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі ўзнікла пытанне аб ліквідацыі хутароў, якія ўскладнялі ўкараненне новых форм вядзення сельскай гаспадаркі. За 1939—1940 гады ў калгасныя вёскі пераехалі жыхары 191 000 хутароў. На дапамогу працаўнікам вёскі прыйшлі гараджане. Толькі летам 1940 года на сельскае будаўніцтва з Мінска выязджала каля 2000 рабочых.

Вялікая ўвага ўдзялялася палітыка-выхаваўчай рабоце сярод насельніцтва заходніх абласцей Беларусі. Велізарная колькасць палітычнай літаратуры была адпраўлена Мінскім кніжным выдавецтвам у вызваленыя раёны ўжо ў першыя месяцы Савецкай улады. У 1940 годзе, напярэдадні выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР, з Мінска ў новыя раёны выехала вялікая група лектараў і агітатараў. Разам

з імі ў выбарчай кампаніі прымалі ўдзел 15 дэпутатаў гарадскога і раённых Саветаў Мінска.

У 1940 годзе ў заходніх абласцях налічвалася 1106 пярвічных партыйных і 1534 пярвічных камсамольскіх арганізацыі. На асаблівую важнасць прапаганды марксізма-ленінізма ў вызваленых абласцях указаў XVIII з'езд Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў маі 1940 года. На з'ездзе былі падведзены вынікі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі за сем месяцаў Савецкай улады. У грандыёзных поспехах, дасягнутых у галіне ліквідацыі непісьменнасці, развіцця нацыянальнай культуры і асветы ёсць заслуга і работнікаў культуры з Мінска. За першы год Савецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі было адкрыта сем тэатраў, чатыры ВНУ, восем педвучылішч. Кнігі, сабраныя мінчанамі па ініцыятыве вучняў 4-й сярэдняй школы, склалі фонды 100 бібліятэк. Друкары Мінска дапамаглі арганізаваць выпуск абласных і раённых газет.

Дзякуючы клопатам партыі і ўрада, дапамозе працоўных усяго Савецкага Саюза заходнія вобласці Беларусі ўпэўнена нарошчвалі тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

5. Перад Вялікай Айчыннай вайной

Перамога сацыялізма ў СССР і індустрыялізацыя краіны абумовілі бурны рост гарадоў, карэнным чынам змянілі іх сацыяльна-эканамічную характарыстыку і знешняе аблічча.

За гады Савецкай улады непазнавальна змяніўся і Мінск. У 1940 годзе ў ім налічвалася 332 прамысловых прадпрыемствы, на якіх працавалі 23 833 рабочых. У 1939 годзе прамысловасць горада выпусціла валавой прадукцыі на 424,3 мільёна рублёў супраць 32 145 тысяч рублёў у пачатку першай пяцігодкі. 87,2 працэнта ўсёй прадукцыі далі прадпрыемствы дзяржаўнай прамысловасці.

Найбольшага развіцця дасягнулі станкабудаванне, лёгкая, харчовая, смакавая і металаапрацоўчая галіны. У 1940 годзе ўдзельная вага Мінска ў рэспубліканскай вытворчасці станкоў складала 50, вырабаў гарбарна-абутковай прамысловасці — 48, швейнай — 50,9, харчовай — 18,7, металаапрацоўчай — 16,8 працэнта. Адным з важных паказчыкаў індустрыяльнага развіцця горада з'яўляўся рост яго энергетычнай базы. У 1940 годзе электрастанцыі Мінска выпрацавалі 82,4 мільёна кілават-гадзін электраэнергіі, амаль у 12 разоў больш, чым у 1927 годзе.

За гады перадваенных пяцігодак у Мінску ўзведзены буйныя прадпрыемствы, абсталяваныя найноўшай тэхнікай. Выраслі станка-

будаўнічыя заводы імя Кірава і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1940 годзе іх асноўныя вытворчыя фонды склалі 13,6 мільёна рублёў, сярэднегадавая колькасць рабочых — 1190 чалавек, выпуск прадукцыі — больш як 22 мільёны рублёў.

Мінскія станкабудаўнікі паспяхова асвойвалі вытворчасць новай тэхнікі, укаранялі ў вытворчасць перадавую тэхналогію. Станкі, вырабленыя гэтымі заводамі, ужываліся на заводах усіх рэспублік Савецкага Саюза, экспартаваліся ў многія краіны Заходняй Еўропы.

Апрача станкабудаўнічых, у Мінску працавалі іншыя машынабудаўнічыя і металаапрацоўчыя прадпрыемствы — завод імя Чкалава, які выпускаў ланцугі Галя, вагавы завод «Ударнік», вагонарамонтны завод імя Мяснікова. Найбольш буйным быў вагонарамонтны завод, які выпусціў у 1940 годзе валавой прадукцыі на 2863 тысячы рублёў.

Харчовая прамысловасць базіравалася на перапрацоўшы мясцовай сыравіны. Валавая прадукцыя прадпрыемстваў гэтай галіны ў 1940 годзе склала каля 100 мільёнаў рублёў. Адным з найбольш буйных харчовых прадпрыемстваў горада з'яўлялася кандытарская фабрыка «Камунарка», асноўныя вытворчыя фонды якой складалі 4023 тысячы рублёў. У 1940 годзе на фабрыцы працавалі 629 рабочых. Яна выпусціла прадукцыі на 18 872 тысячы рублёў. Апрача яе, у горадзе дзейнічалі хлебазавод № 1, які штосутачна выпускаў 65—70 тон хлеба-булачных вырабаў, мясны і малочны камбінаты, спіртагарэлачны завод, піўзавод «Беларусь» і іншыя прадпрыемствы.

У лёгкай прамысловасці асабліва вялікіх поспехаў дасягнулі швейная і гарбарна-абутковая галіны. Швейная прамысловасць была прадстаўлена ў асноўным чатырма буйнымі прадпрыемствамі — фабрыкамі «Кастрычнік», імя Крупскай, «8 Сакавіка» і «КІМ». На іх было занята некалькі тысяч рабочых і служачых. За гады другой і трэцяй пяцігодак усе яны былі рэканструяваны, аснашчаны новым высокапрадукцыйным абсталяваннем. Так, на фабрыцы «Кастрычнік», якая займала ў горадзе першае месца па аб'ёму выпускаемай прадукцыі, у 1938—1939 гадах уступілі ў строй два новых пашывачных цэхі. З 1928 па 1940 год калектыў прадпрыемства вырас з 500 да 1760 чалавек. Выпуск прадукцыі павялічыўся за гэты час у восем разоў і склаў звыш 43 мільёнаў рублёў.

Гарбарна-абутковыя прадпрыемствы Мінска ў 1940 годзе далі прадукцыі на 62,7 мільёна рублёў. На іх працавалі 3240 рабочых. Сярод абутковых прадпрыемстваў самым буйным была фабрыка імя Калініна, якую па праву называлі «беларускім «Скараходам». За гады пяцігодак у яе цэхах устаноўлена шмат новых машын. У 1938 годзе ўвайшоў у строй трохпавярховы вытворчы корпус, у швейным цэху пушчан канвеер. Гэта дало магчымасць павялічыць выпуск абутку на

500—600 пар у суткі. У 1940 годзе фабрыка ў суткі выпускала прадукцыі столькі ж, колькі яна дала яе за ўвесь 1921 год. У сярэднім за год на фабрыцы было занята 1370 рабочых, гадавы выпуск прадукцыі склаў 21 687 тысяч рублёў, асноўныя вытворчыя фонды — 4096 тысяч рублёў.

Вялікую вытворчую магутнасць мелі таксама гарбарны завод «Бальшавік», абутковая фабрыка імя Тэльмана, скургалантарэйная фабрыка імя Куйбышава, шчаціння-шчотачная фабрыка імя Крупскай. У 1940 годзе яны далі на 52,8 мільёна рублёў прадукцыі.

Побач з рэканструкцыяй і расшырэннем дзейнічаўшых заводаў і фабрык у перадваенныя гады ў Мінску будаваліся новыя прадпрыемствы. Буйнейшым сярод іх быў радыёзавод, створаны на базе дрэваапрацоўчага завода. Будаўніцтва яго пачалося ў снежні 1939 года. Перад кастрычніцкім святам 1940 года будаўнікі звярнуліся да калектыва радыёзавода з наступным заклікам: «Таварышы рабочыя, інжынеры, начальнікі цэхаў, майстры радыёзавода! Вы сталі ля станкоў, расстаўленых у велізарных, светлых карпусах, узведзеных рукамі нашых будаўнікоў. Наша сардэчнае, шчырае пажаданне вам: працуйце па-стаханаўску, выпускайце прыёмнікі, якія былі б лепшымі ў свеце і якія б разнеслі славу пра наш завод».

Завод быў абсталяваны новай тэхнікай, па вытворчай магутнасці з'яўляўся другім у СССР і адным з буйнейшых у Заходняй Еўропе. У снежні 1940 года першыя 100 радыёпрыёмнікаў тыпу «КІМ» паступілі ў продаж. Неўзабаве калектыў асвоіў вытворчасць найноўшых па таму часу радыёпрыёмнікаў «Піянер» і «Маршал». За 1940 год завод выпусціў 400 радыёпрыёмнікаў, агульны аб'ём яго прадукцыі склаў 1150 тысяч рублёў.

Сярод новабудоўляў Мінска трэба адзначыць хлебазавод «Аўтамат». Гэта высокамеханізаванае прадпрыемства па ліку рабочых уступала іншым хлебазаводам горада, але па аб'ёму выпускаемай прадукцыі намнога іх перавышала. Вытворчая магутнасць прадпрыемства была разлічана на выпечку 100—200 тон хлеба-булачных вырабаў у суткі.

Павялічыла выпуск прадукцыі і мясцовая прамысловасць. Напярэдадні вайны ў горадзе працавала каля 100 прадпрыемстваў мясцовага значэння, у тым ліку 55 арцелей прамкааперацыі. За 1940 год арцелі выпусцілі прадукцыі амаль на 78 мільёнаў рублёў.

У студзені 1941 года СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову «Аб мерапрыемствах па павелічэнню вытворчасці тавараў шырокага ўжытку і харчавання з мясцовай сыравіны». Згодна з пастановай, уся прадукцыя прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці заставалася ў вобласці, раёне, горадзе. Значна павялічвалася дзяржаўнае крэдытаванне мясцовай прамысловасці. Уноў створаныя прадпрыемствы,

якія працавалі на мясцовай сыравіне, на два гады вызваліліся ад падатку з абароту.

Дадзеныя Савецкім урадам ільготы і крэдыты паскорылі развіццё мясцовай прамысловасці горада. Выканком гарсавета арганізаваў новы прамкамбінат у складзе перададзеных яму кафлянага, асфальтав

Генеральным планам рэканструкцыі Мінска прадугледжваліся вялікія мерапрыемствы па развіццю ўсіх галін гарадской гаспадаркі. У бліжэйшыя 15 гадоў насельніцтва Мінска павінна было скласці 500 тысяч чалавек. Тэрыторыя горада ў параўнанні з 1940 годам павялічвалася ў паўтара раза галоўным чынам за лік новых жылых і прамысловых раёнаў. Намячалася карэнная перабудова старой часткі горада, якая вызначалася скучанасцю забудовы, здробненасцю кварталаў, бессістэмным начартаннем вулічнай сеткі з вялікай колькасцю завулкаў, праездаў, тупікоў, нераўнамерным развіццём цэнтра і ўскраін.

У генеральным плане ўлічвалася, што прамысловае развіццё горада пойдзе не толькі па шляху расшырэння існаваўшых, але і будаўніцтва новых прадпрыемстваў. Было запраектавана ўзвядзенне 14 новых прадпрыемстваў, у тым ліку гадзіннікавага завода, завода электрабытавых прыбораў, фабрыкі металафурнітуры, ЦЭЦ, мэблевай фабрыкі. Колькасць рабочых, занятых у буйной прамысловасці, павінна была ўзрасці да 62 тысяч чалавек.

Першай чаргой работ прадугледжвалася расшырэнне і добраўпарадкаванне вуліц Савецкай і Пушкіна — асноўнай гарадской магістралі, забудова ў цэнтры горада вуліц Леніна, К. Маркса, Энгельса, плошчы ля Дома ўрада і плошчы Свабоды.

Пасля ажыццяўлення плана рэканструкцыі жыллёвы фонд горада склаў бы больш чатырох мільёнаў квадратных метраў. Было запланавана будаўніцтва новага будынка драматычнага тэатра на 1000 месц, цырка, трох кінатэатраў, 12 сярэдніх школ, 26 дзіцячых садоў і ясляў, дзвюх гасцініц. Намячалася вялікая праграма работ у галіне камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання і зялёнага будаўніцтва.

Перамога сацыялізма ў СССР далучыла працоўных Мінска да актыўнага грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Насельніцтва горада ў поўнай меры адчувала вялікія клопаты Камуністычнай партыі аб савецкіх людзях, аб максімальным задавальненні іх няспынна растучых патрэбнасцей. Няўхільна павялічваліся рэальная заработная плата і пакупная здольнасць насельніцтва, развіваўся тавараабарот, палепшылася медыцынскае абслугоўванне.

У 1940 годзе рознічны тавараабарот гандлёвай сеткі горада склаў 77 мільёнаў рублёў. У Мінску налічвалася 790 магазінаў, ларкоў і кіёскаў рознічнага гандлю і 258 прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Выросла спажыванне насельніцтвам высокакаларыйных прадуктаў харчавання, а таксама адзення, абутку, прадметаў культурна-бытавога назначэння. Жыхароў Мінска абслугоўвалі 20 бальнічных устаноў, 1083 урачы, 1610 фельчараў і медыцынскіх сясцёр.

Выдатных поспехаў дасягнула беларуская сталіца ў культурным будаўніцтве. Горад стаў самым буйным культурным цэнтрам рэспублікі, дзе сканцэнтраваліся асноўныя сілы нацыянальнай творчай інтэлігенцыі — пісьменнікі, кампазітары, вучоныя, мастакі, артысты.

У пачатку 1940/41 навучальнага года ў Мінску працавалі 49 агульнаадукацыйных школ, 10 ВНУ, 17 тэхнікумаў і іншых сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 30 навуковых устаноў, 81 бібліятэка, 78 клубаў і дамоў культуры, пяць тэатраў і чатыры музеі. У школах налічвалася 32 952 вучні, у ВНУ — 9821 і ў тэхнікумах — 5083 студэнты.

Хуткае развіццё Мінска як прамысловага, культурнага і адміністрацыйнага цэнтра абумовіла павелічэнне колькасці рабочага класа і ўсяго насельніцтва горада. Напярэдадні вайны ў сталіцы Савецкай Беларусі жыло больш як 250 тысяч чалавек супраць 134,5 тысячы ў 1917 годзе. Паводле даных за верасень 1940 года, у народнай гаспадарцы горада было занята 123,3 тысячы рабочых і служачых. Па галінах гэтыя кадры размяркоўваліся наступным чынам: прамысловасць 37,5, будаўніцтва 10,7, транспарт 23,3, сельская гаспадарка 1,6, сувязь 3,1, гандаль і грамадскае харчаванне 12,2, ахова здароўя 5,9, асвета 7, навука 1,8, крэдытныя і страхавыя ўстановы 0,9, апарат органаў дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання 9,7 тысячы чалавек. Колькасць прамыслова-вытворчых рабочых дасягнула 23 833, членаў арцелей прамкааперацыі — 6100 чалавек. На прадпрыемствах, транспарце і будоўлях горада працавала шмат спецыялістаў, якія атрымалі адукацыю ў гады Савецкай улады і што вылучыліся на практычнай рабоце.

Працоўныя Мінска, як і ўвесь савецкі народ, з энтузіязмам змагаліся за выкананне трэцяга пяцігадовага плана, за далейшы ўздым народнай гаспадаркі і завяршэнне будаўніцтва сацыялізма ў СССР. Савецкая ўлада стварыла ўсе ўмовы для росквіту іх творчых сіл, талентаў і дараванняў. Аднак разбойніцкі напад нямецка-фашысцкіх захопнікаў спыніў мірную стваральную працу савецкіх людзей.

РАЗДЗЕЛ XIX

МІНСК У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945 гады)

1. Першыя дні вайны. Акупацыя Мінска

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія вераломна парушыла дагавор аб ненападзе і развязала вайну супраць Савецкага Саюза.

У той жа дзень у 14 гадзін у Мінску адкрыўся сход партыйнага актыву горада. З дакладам аб задачах партарганізацыі і ўсіх працоўных горада ў сувязі з фашысцкай агрэсіяй выступіў першы сакратар ЦК КП(б) Б П. К. Панамарэнка.

Абставіны для горада склаліся надзвычай цяжкія. 23 і 24 чэрвеня вораг падверг Мінск бязлітаснай бамбардзіроўцы. Горад быў ахоплены пажарам. Пачалася эвакуацыя ўрадавых устаноў, вывозіліся ў глыб краіны каштоўнасці Дзяржаўнага банка і ашчадных кас. Адпраўляліся на ўсход дзіцячыя дамы і піянерскія лагеры. Тысячы гараджан — жанчын, старых і дзяцей — пакідалі палаючы горад і ішлі на ўсход. Не хапала ні транспарту, ні часу, каб дапамагчы насельніцтву пакінуць горад.

Часці і злучэнні Чырвонай Арміі вялі на тэрыторыі Беларусі цяжкія кровапралітныя баі. Навечна захавае памяць гераізм і мужнасць слаўных савецкіх пагранічнікаў. Бессмяротнымі сталі подзвігі абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

Баявыя дзеянні супраць полчышчаў нямецка-фашысцкіх захопнікаў разгортваліся ў неспрыяльных для абаронцаў Беларусі ўмовах. За тры дні вайны войскі 3 і 10-й армій Заходняга фронту панеслі вялікія страты і вымушаны былі адступаць перад пераўзыходзячымі сіламі ворага ў напрамку Ваўкавыск — Мінск.

26 чэрвеня войскі 13-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П. М. Філатава ўступілі ў бой на рубяжах Мінскага ўмацаванага раёна. У баях асабліва вызначылася 100-я ордэна Леніна стралковая дывізія, якая займала абарончыя пазіцыі ў 10—15 кіламетрах на паўночны захад ад горада. 26 чэрвеня байцы гераічнай дывізіі адбілі некалькі лютых атак ворага, а 27 чэрвеня перайшлі ў наступленне і адкінулі гітлераўскія часці на 13—14 кіламетраў на паўночны захад. Але з падыходам свежых танкавых часцей ворага пацярпеўшая вялікія страты дывізія вымушана была адступіць за раку Волму.

28 чэрвеня нямецка-фашысцкія войскі ўварваліся ў Мінск, але баі ў горадзе не спыняліся. На наступны дзень невялікі атрад савецкіх байцоў з дывізіі генерала Русіянава знішчыў вялікую групу фашыстаў у раёне Чэрвеньскага рынку. Невядомы савецкі кулямётчык расстрэльваў фашыстаў каля маста праз раку Свіслач да той пары, пакуль у яго былі патроны. 3 ліпеня танк Т-28 прарваўся ў Мінск з боку Магілёўскай шашы. Танкісты давілі нямецка-фашысцкіх захопнікаў гусеніцамі і расстрэльвалі з кулямётаў. Механік-вадзіцель танка Д. І. Малько ў 1966 годзе ўзнагароджан за гэты подзвіг ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Зараз Д. І. Малько працуе ў Мінску на маторным заводзе.

2. 1100 дзён фашысцкага рэжыму

Мінск быў захоплены ворагам на сёмы дзень вайны, а поўнасцю тэрыторыю Беларусі нямецка-фашысцкія войскі акупіравалі на 63-ці дзень вайны. Над Беларуссю навісла змрочная ноч трохгадовай акупацыі.

1100 дзён Мінск знаходзіўся пад уладай гітлераўцаў. Гэта самая змрочная старонка ў шматвяковай гісторыі горада. Нямецкія фашысты ўстанавілі крывавы, тэрарыстычны рэжым, ператварылі Мінск у горад «асобага значэння». У ім знаходзілася рэзідэнцыя ката беларускага народа гаўляйтара Кубэ, размяшчаліся галоўныя фашысцкія ўстановы, ваенныя ўпраўленні і штабы армій «Цэнтр». Асноўныя кіруючыя пасады ў акупіраваным горадзе займалі найбольш заўзятыя нацысты.

Акрамя пастаяннага гарнізона, які складаўся з пяці тысяч салдат і афіцэраў, тут былі сканцэнтраваны армейскія рэзервы, папаўняліся і перафарміроўваліся патрапаныя на фронце гітлераўскія часці, размяшчаліся штаб корпуса аховы тылу цэнтральнай групы войск, штаб і войскі карнага корпуса СС, упраўленні чыгункамі, паліцыі бяспекі і СД.

У Мінску, як і на ўсёй акупіраванай тэрыторыі, фашысты імкнуліся ўстанавіць «новы парадак». Для насельніцтва была ўведзена прымусовая праца, устаноўлены цяжкія падаткі. Жыхары не забяспечваліся ні харчаваннем, ні палівам. Акупанты загналі дзесяткі тысяч мірных жыхароў, не выключаючы дзяцей, жанчын і старых, у канцэнтрацыйныя лагеры, створаныя ў Мінску і яго прыгарадах. Часта яны расстрэльвалі ваеннапалонных і грамадзянскае насельніцтва, якія выконвалі работы ваеннага характару.

Нямецка-фашысцкія акупанты не лічыліся ні з грамадзянскімі правамі, ні з нацыянальнымі асаблівасцямі і звычаямі насельніцтва. Дэспатызм іх узмацняўся з кожным днём. На вуліцах горада мільгалі аб'явы аб расстрэлах жыхароў за самае нязначнае непадпарадкаванне нямецкім уладам. Пад страхам смерці забаранялася свабоднае перамяшчэнне па гораду, забаранялася хаджэнне па вуліцах уначы.

Мінск быў заліты крывёю народа. Удзень і ўначы дзейнічалі «душагубкі». Задушаных газамі вывозілі за горад і закопвалі. У лагеры на Шырокай вуліцы за перыяд з жніўня 1943 па чэрвень 1944 года гітлераўцамі такім спосабам былі знішчаны тысячы савецкіх грамадзян.

У пяці кіламетрах на паўночны захад ад Мінска быў створаны лагер для савецкіх ваеннапалонных. Тут гітлераўцамі расстраляна і закапана каля 80 тысяч савецкіх воінаў, якія папалі ў палон. Ва ўрочышчы «Уручча» знішчана фашыстамі і пахавана больш 30 тысяч чалавек, ва ўрочышчы «Дразды» — каля 10 тысяч мінчан. Паблізу ад вёскі Малы Трасцянец фашысты расстралялі, спалілі і закапалі ў зямлю больш як 200 тысяч чалавек, на тэрыторыі хутара «Петрашкевічы» — каля 25 тысяч жыхароў Мінска.

Паводле даных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, у Мінску і яго ваколіцах нямецкімі фашыстамі знішчана звыш 300 тысяч савецкіх грамадзян — мужчын, жанчын і дзяцей усіх узростаў.

Замятаючы сляды сваіх крывавых злачынстваў, гітлераўцы ў далейшым раскопвалі многія магілы, трупы складвалі ў штабелі, аблівалі бензінам і спальвалі. Попел спаленых фашысцкая паліцыя выкарыстоўвала для ўгнаення палёў.

Характарызуючы фашысцкі рэжым у Мінску, падпольная камуністычная газета «Звязда» пісала: «Горад Мінск — цэнтр культуры і навукі беларускага народа — ператворан нямецкімі акупантамі ў засценак смерці і катаванняў. Нямецкія варвары апаганілі нашу сталіцу, знішчылі ўсе культурныя ўстановы, вывезлі ўсе каштоўнасці. Пуста і панура ў горадзе. Над горадам вісіць жудасная фашысцкая ноч».

Раніцай на вуліцах горада вельмі часта знаходзілі трупы гараджан, забітых уначы фашыстамі.

На дзвярах кожнага дома на бачным месцы вывешваліся спіскі жыхароў. Калі фашысты пры вобыску ў начны час заўважалі ў доме чалавека, не ўнесенага ў спіс, то яго, як правіла, адпраўлялі ў турму, а потым расстрэльвалі не толькі гэтага чалавека, але і гаспадара кватэры.

Выходзіць з горада і ўваходзіць у яго дазвалялася толькі ў строга вызначаны час, па пэўных вуліцах, маючы адпаведны пашпарт і спецыяльны пропуск. Ідучы па тратуару, неабходна было саступаць дарогу кожнаму немцу, здымаць перад ім шапку. На вуліцах гітлераўцы нярэдка здымалі з гараджан валёнкі, зразалі футравыя каўняры.

У ліпені 1941 года ў Мінску было створана гета, куды гітлераўцы сагналі ўсё яўрэйскае насельніцтва горада. Яно ахоплівала вуліцы Астроўскага, Нямігу, Рэспубліканскую, Абутковую, Апанскага, Сухую, Татарскую, Заслаўскую, Юбілейную плошчу і інш. Неяўрэйскае насельніцтва з гэтага раёна было выселена, тэрыторыя гета абгароджана высокай сеткай з калючага дроту і ахоўвалася паліцэйскімі. Камендант гета Рыдэр, яго памочнікі Готэнбах, Рыхтэр і Бенецке здзекваліся са зняволеных яўрэяў, грабілі, катавалі іх без прычыны. Зняволеных цкавалі сабакамі, калолі штыкамі і кінжаламі, расстрэльвалі, кідалі жывымі ў агонь. Готэнбах абвяшчаў пад музыку тосты за знішчэнне яўрэяў, асуджаных на смерць прымушаў спяваць і танцаваць, а затым уласнаручна іх расстрэльваў.

У мінскім гета знаходзілася звыш 100 тысяч яўрэяў. Частку з іх гітлераўцы прывезлі ў Мінск з Гамбурга. На працягу 1941—1943 гадоў амаль усе яны былі расстраляны. Толькі некаторым удалося ўцячы і выратавацца пры дапамозе насельніцтва і партызан.

Гітлераўцы часта праводзілі перарэгістрацыі мужчынскага насельніцтва горада. Па іх загаду мужчыны павінны былі неадкладна з'яўляцца на біржу працы, праз якую акупанты ўлічвалі і кантралявалі дарослае насельніцтва. Тых, хто з'яўляўся на біржу, накіроўвалі на розныя работы. Звыш 70 тысяч мінчан акупанты вывезлі на катаргу ў Германію.

Адным з метадаў запалохвання насельніцтва з'яўляліся аблавы і вобыскі. «Аблаву за аблавай праводзяць немцы ў горадзе,— пісала газета «Звязда».— Нядаўна ў чатыры гадзіны раніцы гітлераўцы акружылі Камароўку, Пушкінскую, Беламорскую і іншыя вуліцы. У кожнай кватэры рабілі вобыск, падымалі з пасцелі людзей, усіх працаздольных адпраўлялі ў Германію. На Грушаўскім пасёлку яны падпалілі барак, дзе жылі рабочыя, і не далі нікому выйсці з памяшкання».

Адноўленая ў горадзе электрастанцыя забяспечвала электрычным святлом толькі тыя дамы, дзе жылі фашысты. Тэлефонная стан-

цыя таксама абслугоўвала толькі афіцыяльныя нямецка-фашысцкія ўстановы і службовых асоб. Для ацяплення кватэр гітлераўцы высякалі гарадскія паркі. Транспарт быў зусім паралізаваны.

Насельніцтва горада амаль поўнасцю было пазбаўлена медыцынскай дапамогі. Большасць медыцынскіх устаноў не працавала. А дзеючыя амбулаторыі і бальніцы абслугоўвалі ў асноўным акупантаў. Сярод жыхароў распаўсюдзіліся туберкулёз і эпідэмічныя захворванні, лютаваў тыф — пастаянны спадарожнік голаду, холаду і галечы насельніцтва.

Інфекцыйныя хворыя ў канцлагерах не атрымлівалі ніякай дапамогі. Больш таго, гэта служыла для акупантаў прычынай для знішчэння савецкіх людзей.

Услед за войскамі ў акупіраваны горад рынуліся сквапныя да нажывы нямецкія прадпрыемцы і камерсанты. Яны прыбралі да сваіх рук фабрыкі і заводы, створаныя ўпартай працай савецкіх людзей. Пушчаныя ў горадзе прадпрыемствы былі падпарадкаваны гітлераўскім фірмам «Борман», «Шарава-верк», «Трэбец», «Шлахтхоф», «Троль» і інш.

Рабочыя працавалі па 10—12 гадзін у суткі. Іх збівалі палкамі, марылі голадам. Заработная плата кваліфікаванага рабочага не перавышала 60 марак на месяц (адна нямецкая акупацыйная марка прыраўноўвалася да 10 рублёў). Рабочаму выдавалі 100—200 грамаў хлеба на дзень. Чорнарабочы атрымліваў у дзень адну марку, а мізэрны абед у чайной каштаваў тры-пяць марак. Тэхнічны кіраўнік майстэрні па вытворчасці ваенных павозак фірмы «Трэбец» на допыце Надзвычайнай следчай камісіі паказаў: «Я як прадстаўнік фірмы «Трэбец» у Мінску пацвярджаю, што савецкіх грамадзян акупацыйныя ўлады накіроўвалі на работу ў прымусовым парадку... Прадстаўнікі фірмы бязлітасна эксплуатавалі савецкіх грамадзян, прымушалі нават старых працаваць па 10—12 гадзін за малую плату, білі і дрэнна кармілі». Уладальнік фірмы «Борман» уласнаручна збіваў савецкіх людзей, якія працавалі ў яго.

У горадзе адчуваўся востры недахоп прадметаў першай неабходнасці. Такія тавары, як соль, мыла, запалкі, газа, гараджане вымушаны былі купляць на чорным рынку па неймаверна высокіх спекулятыўных цэнах.

Дзеля падаўлення актыўных сіл беларускага народа нямецка-фашысцкія акупанты, акрамя тэрору, выкарыстоўвалі метады подкупу і правакацый. Яны імкнуліся раз'яднаць беларускі народ, шляхам ашуканства прыцягнуць насельніцтва на свой бок, выкарыстаць яго ў барацьбе супраць партызан і Савецкай дзяржавы. Адным з першых фашысцкіх мерапрыемстваў такога роду было ўтварэнне ў Мінску ў кастрычніку 1941 года так званай «Беларускай народнай самада-

памогі» (БНС) на чале з гітлераўскім агентам Ермачэнкам. Летам 1942 года гітлераўцы зрабілі спробу пры дапамозе БНС стварыць беларускі паліцэйскі корпус («Беларуская самаахова») для барацьбы з партызанамі.

Акупанты імкнуліся прыцягнуць на свой бок моладзь. У чэрвені 1943 года імі быў створаны «Саюз беларускай моладзі» (СБМ), адной з задач якога, як абвяшчаў статут, з'яўляўся «адрыў беларускай моладзі ад Усходу і далучэнне яе да арыйскага Захаду». Гэта фашысцкая арганізацыя выдавала ў Мінску штомесячны часопіс «Жыве Беларусь».

У снежні 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты арганізавалі з нацыяналістычных падонкаў марыянетачную «Беларускую цэнтральную раду» (БЦР). Гэта бяспраўная фашысцкая ўстанова павінна была стварыць у народа ілюзію заспакаення і бачнасць нейкага «нацыянальнага беларускага ўрада», пераканаць жыхароў Беларусі ў трываласці становішча нямецка-фашысцкіх авантурыстаў, якія адкочваліся на захад пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі.

Прэзідэнтам «рады» быў прызначаны верны лакей Гітлера фашыст Астроўскі — былы слуцкі памешчык, які з'явіўся ў Мінску ў абозе нямецка-фашысцкай арміі.

Шляхам стварэння розных фашысцкіх арганізацый, а таксама пры дапамозе хлуслівай, выхвальнай прапаганды нямецка-фашысцкія захопнікі спрабавалі ашукаць і дэмаралізаваць беларускі народ, падарваць яго волю да барацьбы. Аднак як гэтыя, так і іншыя спробы гітлераўскіх акупантаў поўнасцю праваліліся.

Па закліку Камуністычнай партыі, як і ўсе народы Савецкага Саюза, жыхары Мінска ўзняліся на свяшчэнную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Працоўныя Мінска ўсімі спосабамі змагаліся з ворагам, мужна і непахісна абаранялі заваёвы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, родную Савецкую ўладу, сваю свабоду і незалежнасць.

3. Мінскае падполле

Нянавісць мінчан да захопнікаў расла з дня ў дзень, рабілася ўсеагульнай. Асобныя патрыёты паступова аб'ядноўваліся ў невялікія падпольныя групы і арганізацыі. Падполле ў Мінску стваралася па ініцыятыве камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных актывістаў. У ліку першых узнікла падпольная партыйная група чыгуначнікаў, у якую ўваходзілі Ф. С. Кузняцоў, А. Д. Балашоў, О. С. Купрыянава, І. І. Івашчонак і інш. У падпольную групу, якая складалася з супрацоўнікаў гарадскіх устаноў і перш за ўсё работнікаў беларус-

кай канторы «Галоўнафтасбыт», увайшлі І. П. Казінец (падпольныя мянушкі «Слаўка», «Пабядзіт»), К. Д. Грыгор'еў («Катай»), В. К. Ніфараў («Вацік», «Максім»), Г. М. Сямёнаў («Жук», «Жорж») і інш. У саставе падпольнай групы, створанай у раёне Камароўкі, дзейнічалі С. І. Заяц (Зайцаў), А. В. Каліноўскі, С. К. Амельянюк (бацька), У. С. Амельянюк (сын), Н. А. Шугаеў, І. М. Цімчук і інш. У падпольную групу выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага юрыдычнага інстытута ўваходзілі М. Ф. Малаковіч, М. Б. Асіпава, А. А. Сакалова, Р. М. Бромберг і інш. У яўрэйскім гета вялі работу падпольшчыкі М. Л. Гебелеў, Г. Д. Смаляр (мянушкі «Яфім», «Скромны», «Сталярэвіч»), Н. Л. Фельдман, Х. М. Пруслiна, М. М. Пруслін і інш. Акрамя таго, дзейнічалі невялікія падпольныя групы, створаныя па ініцыятыве Н. Г. Дземідзенкі, А. Ф. Арндта, А. А. Маркевіча, В. Ф. Мацюшкі і інш. Актыўны ўдзел у стварэнні мінскага падполля прымалі В. І. Нічыпаровіч, В. Г. Вывалы, І. К. Кабушкін (мянушкі «Жан», «Бабушкін», «Сашка», «Назараў»), А. Макаранка, Н. І. Талкачоў, Н. М. Нікіцін, І. З. Рабышаў і іншыя камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў тыле ворага.

Першапачаткова групы дзейнічалі разрознена. Але ў канцы лістапада — пачатку снежня 1941 года Ісай Паўлавіч Казінец (яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза) і яго бліжэйшыя таварышы, у прыватнасці К. Д. Грыгор'еў, С. І. Заяц (Зайцаў), Г. М. Сямёнаў, В. С. Жудро, рашылі арганізаваць агульнагарадскі падпольны партыйны цэнтр. Мяркуючы, што ў горадзе ўжо дзейнічае строга заканспіраваны падпольны гарком партыі, з якім яшчэ не ўдалося наладзіць сувязь, Ісай Казінец і яго таварышы сабраліся на канспіратыўнай кватэры ў доме № 5 (зараз 34) па Лугавой вуліцы і ўтварылі дадатковы партыйны камітэт (дапартком). Пазней, калі высветлілася, што мяркуемага гаркома партыі няма, падпольшчыкі перайменавалі дапартком у гарадскі партком (ГПК). У састаў ГПК уваходзілі І. П. Казінец (сакратар), К. Д. Грыгор'еў, С. І. Заяц (Зайцаў), Г. М. Сямёнаў, В. С. Жудро.

Мінскі ГПК кіраваў шырокай сеткай падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, праводзіў сярод насельніцтва Мінска і яго ваколіц бальшавіцкую прапаганду, арганізоўваў збіранне і адпраўку зброі ў партызанскія атрады, якія дзейнічалі ў ваколіцах Мінска. ГПК наладзіў пастаянную сувязь з бліжэйшымі партызанскімі атрадамі, арганізоўваў дыверсіі супраць акупантаў, разгарнуў работу па выданню і распаўсюджванню лістовак. У пачатку 1942 года ўдалося наладзіць перыядычны выпуск лістка «Вестник Родины».

На кватэры У. С. Амельянюка быў установлены радыёпрыёмнік. Тут слухалі перадачы з Масквы, прымалі і размнажалі зводкі Саўін-

фармбюро. Да У. С. Амельянюка прыходзілі і прыязджалі за зводкамі Саўінфармбюро і лістоўкамі работнікі не толькі падпольных груп Мінска, але і бліжэйшых раённых цэнтраў Мінскай вобласці. Сувязь з Дзяржынскам, напрыклад, падтрымлівалася праз П. Н. Хмялеўскага і Г. Будая.

ГПК устанавіў сувязі з падпольнай арганізацыяй, якая называлася Ваенным саветам партызанскага руху (ВСПР) і дзейнічала ў Мінску з верасня 1941 года. ВСПР аб'ядноўваў каля 300 былых камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі.

Падпольшчыкі добрасумленна, часта з рызыкай для жыцця выконвалі адказныя даручэнні гарадскога партыйнага камітэта. Так, лінатыпістка Вера Мацкевіч набірала на лінатыпе фашысцкай друкарні тэксты савецкіх лістовак. Прыстасоўваючыся да фармату фашысцкай «Мінскай газеты», яна набрала, напрыклад, лістоўку з тэкстам партызанскай прысягі, якая распаўсюджвалася падпольшчыкамі сярод партызан і падпольшчыкаў Беларусі.

Узмацнілася баявая і разведвальная дзейнасць падпольшчыкаў. Падпольная арганізацыя Мінскага чыгуначнага вузла камплектавала дробныя групы чыгуначнікаў і адпраўляла іх са зброяй у партызанскія атрады. За перыяд з лістапада 1941 да сакавіка 1942 года ў пункты фарміравання атрадаў было адпраўлена каля 130 чалавек, пераважна рабочых. З іх ліку быў арганізаваны партызанскі атрад «Мсцівец», які затым вырас у брыгаду «Народныя мсціўцы».

З удзелам Мінскага ГПК і ВСПР былі сфарміраваны і дзейнічалі ў наваколлі Мінска партызанскія атрады № 208, Н. М. Нікіціна, «Штурм», імя Чкалава, імя Будзённага, імя Лазо, імя Фрунзе, імя Суворава, «Бальшавік» і інш. У сувязі з ростам партызанскіх радоў з восені 1942 года з атрадаў ствараюцца партызанскія брыгады.

Мінскія падпольшчыкі з удзелам партызан арганізавалі нямала дыверсій на прадпрыемствах, на чыгунцы і ў фашысцкіх установах горада. У сувязі з разгромам нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой і пераходам Чырвонай Арміі ў снежні 1941 года ў контрнаступленне падпольшчыкі Мінска пачалі рыхтаваць паўстанне з такім разлікам, каб вызваліць горад ад фашыстаў яшчэ да прыходу савецкіх войск. ГПК вёў узмоцненую прапаганду за ўзбраенне народа. Шмат зброі захоўвалася ў каналізацыйных трубах. Праводзілася падрыхтоўка ваеннапалонных да выступлення супраць гітлераўцаў. Была створана ўзброеная ўдарная група. Падрыхтоўка да паўстання выклікала перапалох сярод фашысцкіх улад горада. На перыяд з 5 да 15 студзеня 1942 года акупанты аб'явілі ў Мінску стан «баявой гатоўнасці». Паліцыя бяспекі і СД зрабілі масавыя арышты. Былі арыштаваны сотні ваеннапалонных, ліквідавана звыш 400 вінтовак, многа кулямётаў і ручных гранат. 18 студзеня 1942 года гітлераўцы публічна

расстралялі звыш 1000 ваеннапалонных. Трупы расстраляных на Савецкай і Пушкінскай вуліцах не прыбіраліся на працягу трох сутак.

На дзейнасць падпольшчыкаў Мінска адмоўны ўплыў зрабіла недастатковая канспірацыя. У іх асяроддзе восенню 1941 года фашысцкая разведка заслала свайго агента Барыса Рудзянку, які праводзіў падрыўную работу, выдаваў нямецкім фашыстам савецкіх патрыётаў.

22 сакавіка 1942 года гарадскім партыйным камітэтам была праведзена нарада, на якой прысутнічалі і актыўныя работнікі падполля. Нарада рашыла актывізаваць палітычную прапаганду сярод насельніцтва і дыверсійную дзейнасць сярод акупантаў, перавесці за межы горада падпольную друкарню, дазволіла работнікам гарадскога партыйнага цэнтра выехаць у размяшчэнне партызанскіх атрадаў. А назаўтра падпольшчык, які працаваў у нямецкай паліцыі, паведаміў ГПК трывожную вестку аб тым, што гестапа ведае адрасы многіх работнікаў падполля. У той жа дзень у рукі паліцыі бяспекі і СД трапіла значная частка членаў Ваеннага савета.

25 сакавіка ў горадзе пачаліся арышты работнікаў камуністычнага падполля. Выйсці з горада ім не ўдалося — усюды былі паліцэйскія засады. Паліцыя ачапіла і дамы, дзе былі канспіратыўныя кватэры. У канцы сакавіка — першай палове красавіка былі арыштаваны сотні падпольшчыкаў.

У фашысцкім друку з'явілася афіцыйнае паведамленне «Аб разгроме бальшавіцкага падпольнага камітэта ў Мінску». У ім указвалася, што схоплены 404 чалавекі. У паліцэйскім данясенні ў Берлін гаварылася: «9 мая 1942 года ў Мінску былі публічна пакараны праз павешанне 28 чалавек, якія належалі да арганізацыі партызан Беларусі. У гэты ж дзень быў расстраляны 251 чалавек. У Мінску была праведзена кампанія супраць групы на чыгунцы. Было арыштавана 126 чалавек». У гэтыя дні былі арыштаваны і потым закатаваны ў фашысцкіх засценках сакратар ГПК Ісай Казінец, члены камітэта С. І. Заяц (Зайцаў), Г. М. Сямёнаў, А. Ф. Арндт, Н. Ф. Герасімовіч, Г. Глухаў, Н. Г. Дземідзенка, М. Л. Якельчык, С. Кавалеўскі і іншыя актыўныя камуністы-падпольшчыкі.

У выніку сакавіцкага правалу мінскага падполля загінулі многія адважныя сыны народа, якія мужна змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яны прынялі смерць, ні на хвіліну не сумняваючыся ў справядлівасці сваёй справы і не згінаючы калені перад ворагам. Яны верылі, што распачатая імі барацьба будзе прадоўжана таварышамі, якія засталіся на свабодзе. Так яно і было. Фашыстам не ўдалося разграміць мінскае падполле. Барацьба разгаралася з новай сілай.

У маі 1942 года на адной з канспіратыўных кватэр адбылася нарада актыву падпольшчыкаў, на якой былі абмеркаваны прычыны сакавіцкага правалу і арганізацыйныя прынцыпы далейшай работы падпольнай арганізацыі горада. Падполле перастройвалася па вытворча-тэрытарыяльнаму прынцыпу. Барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў вялі асобныя, не звязаныя паміж сабою і строга заканспіраваныя групы — «пяцёркі». У нанава створаны агульнагарадскі партыйны цэнтр — Мінскі камітэт КП(б) Б — увайшлі В. К. Нікіфараў, У. С. Амельянюк, Д. А. Караткевіч. Яны арганізоўвалі і накіроўвалі барацьбу савецкіх патрыётаў супраць гітлераўскіх акупантаў.

26 мая пры выкананні баявога задання быў забіты фашыстамі У. С. Амельянюк. У камітэт замест яго ўвялі К. І. Хмялеўскага (мянушка «Косця»), які ўзначаліў аддзел разведкі. Прапагандай сярод насельніцтва кіраваў В. К. Нікіфараў.

Мінскі камітэт КП(б) Б арганізаваў пяць падпольных райкомаў партыі: Кастрычніцкі, Чыгуначны, Сталінскі, Варашылаўскі і ў гета. Непасрэдную сувязь з імі мелі Мінскі сельскі райком, Дзяржынскі антыфашысцкі камітэт і рад падпольных пярвічных арганізацый.

Падпольныя пярвічныя партыйныя арганізацыі дзейнічалі на заводзе імя Мяснікова, «Бальшавік», «Ударнік», дрожджа-патачным, піўзаводзе, хлебазаводзе «Аўтамат», радыёзаводзе і іншых прадпрыемствах Мінска.

Падпольшчыкі атрымлівалі ўсебаковую дапамогу ад савецкіх людзей, якія засталіся ў горадзе. Многія мінчане згадзіліся арганізаваць у сваіх кватэрах яўкі падпольшчыкаў, бралі на захаванне літаратуру і зброю. Канспіратыўныя яўкі мінскіх падпольшчыкаў знаходзіліся на вуліцах: Няміга, 25, кватэра 23, дзе жыла сям'я Н. Е. Герасіменкі; Дабралюбава, 1, кватэра В. Ф. Мацюшка; Шорная, 9, кватэра М. П. Воранава; Чарнышэўскага, 11, кватэра У. С. Амельянюка; Камароўская, 55, кватэра І. Х. Казлова; Маскоўская, 29, кватэра 4 (А. І. Сярова); Заслаўская, 33, кватэра Н. П. Дразда; Беламорская, 146, кватэра І. Д. Будаёва і В. А. Будай; Старавіленская, 26, кватэра 3 (П. А. Ляхоўская); Рэвалюцыйная, 11, кватэра 7 (А. К. Януліс); Чкалава, 26, кватэра Ф. С. Кузняцова; 3-я лінія, 26, кватэра сям'і Хадасевіча; Надзеждзінская, 14-а, кватэра Л. Д. Драгун; Някрасава, 4-а, кватэра 2 (сям'я О. П. Барсук); Аранжарэйная, 9, кватэра 2 (Н. Ф. Герасімовіч); Цнянская, 35, кватэра М. П. Рынкевіч; Савецкая, 6 (памяшканне аптэкі) — Г. Г. Фалевіч; Пушкінскі пасёлак, 5, кватэра 2 (М. Б. Еўдакімава) і іншыя.

Побач з партыйным у горадзе было створана камсамольскае падполле. Актыўна дзейнічалі маладыя падпольшчыкі на хлебазаводзе

«Аўтамат», заводзе «Вальшавік», вагонарамонтным заводзе імя Мяснікова, на заводзе «Ударнік» і іншых прадпрыемствах і ва ўстановах горада. Важакамі моладзі сталі адважныя камсамольцы Сяргей Благаразумаў, Захар Гало, Міхаіл Кніжнікаў, Аляксандр Аридт, Мікалай Кедышка, Анатолій Ляўкоў, Валянціна Варанава, Галіна Сасіна і многія іншыя юныя патрыёты, адважныя змагары за свабоду сваёй Радзімы. У сувязі з ростам камсамольскага падполля восенню 1942 года быў створаны Мінскі гарком камсамола, у састаў якога ўваходзілі Н. Я. Нікалаеў (сакратар гаркома), В. Ф. Верхаводзька, Б. Ф. Мярзлікін, В. І. Лебедзева. Пазней у састаў гарадскога камітэта камсамола ўвайшлі Мікалай Кедышка, Леанід Яраш, Паліна Кудраўцава, Максім Зяляеў, Уладзімір Трушко, Пётр Кудраўцаў і інш. Мінскі гарком камсамола знаходзіўся пры партызанскай брыгадзе «Штурмавая» і меў цесную сувязь з падпольшчыкамі, якія дзейнічалі ў горадзе.

Важнай падзеяй у жыцці гарадскога падполля было стварэнне падпольнай газеты «Звязда». Першы нумар «Звязды» быў набраны ў маі 1942 года ў занятай фашыстамі гарадской друкарні наборшчыкамі-патрыётамі Міхаілам Свірыдавым і Барысам Пупко. Друкавалася газета 18 мая на кватэры М. П. Воранава па Шорнай вуліцы, 9. Рэдагаваў першы нумар «Звязды» Уладзімір Амельянюк.

Падпольная друкарня працавала і пасля зладзейскага забойства фашыстамі У. С. Амельянюка, сям'і Воранавых (загінула ў верасні 1942 года) і іншых адважных паліграфістаў.

У чэрвені 1942 года першы нумар «Звязды» быў перавыдадзены. Рэдагаваннем і выхадам у свет газеты і лістовак займаўся член гаркома партыі Вячаслаў Нікіфараў. Актыўны ўдзел у рэдагаванні газеты прымалі Васілій Казачонак, Ядзвіга Савіцкая і Анастасія Карпусенка.

Другі нумар «Звязды» выйшаў у жніўні, трэці і чацвёрты — у верасні 1942 года. Пяты нумар быў набраны, але не надрукаваны.

Набіраў газету Хасен Александровіч. Другі і трэці нумары надрукаваны на Выдавецкай вуліцы, 10, у кватэры Т. Якавенка, чацверты нумар — на 3-й лініі, 26, у кватэры падпольшчыка П. Хадасевіча. Каля газеты згуртаваўся вялікі актыў: М. І. Батурына, Г. В. Будай, С. А. Благаразумаў, А. Ф. Верамейчык, М. М. Воранаў, М. П. Воранаў, Б. Б. Гофман, А. І. Язубчык, Ф. К. Жывалёў, А. С. Грышын, А. А. Карпусенка, Ю. Ю. Крыжавец, А. А. Маркевіч, В. Ф. Мацюшка, Х. М. Прусліна, М. Б. Осіпава, В. Ф. Рубец, М. П. Рынкевіч, В. І. Сайчык, Г. Д. Смаляр, Л. Г. Флейшар, П. Н. Хмялеўскі, П. К. Хадасевіч, П. М. Цвяткоў і многія іншыя савецкія патрыёты. Яны дапамаглі абсталяваць друкарню, хавалі падпольшчыкаў-паліграфістаў, збіралі для газеты заметкі і карэспандэнцыі. Дзесяткі і сотні адважных лю-

дзей, рызыкуючы жыццём, распаўсюджвалі «Звязду» і бальшавіцкую літаратуру сярод насельніцтва горада, дастаўлялі яе ў партызанскія атрады і населеныя пункты многіх раёнаў Беларусі.

Газета «Звязда» з'яўлялася баявым партыйным органам. Яна прапагандавала ідэі Камуністычнай партыі, заклікала беларускі народ шырэй разгортваць партызанскую барацьбу ў тыле ворага, зрываць мерапрыемствы нямецка-фашысцкіх акупантаў, усімі сіламі дапамагаць Савецкай Арміі.

У перадавым артыкуле першага нумара «Звязды» гаварылася: «Партызан! Ты бачыш, на фронт цягнуцца нямецкія эшалоны, нагружаныя салдатамі, боепрыпасамі, тэхнікай. Узрывай чыгуначнае палатно, масты, пускай пад адхон саставы, гэтым ты аблегчыш наступленне Чырвонай Арміі. Бачыш тэлефонны кабель — рві яго, гэтым перарвеш сувязь і ўнясеш замяшанне ў асяроддзе ворага. Ты чуеш, па тваёй краіне крочаць салдаты і афіцэры гітлераўскай арміі. Знішчай іх, як шалёных сабак! Радзіма толькі тады ўздыхне свабодна, калі на яе зямлі не застанецца ніводнага акупанта».

У кожным нумары «Звязды» публікаваліся палымяныя заклікі. Вось некаторыя з іх: «Партызаны і партызанкі! Бязлітасна знішчайце крывавых гітлераўскіх бандытаў»; «Браты і сёстры — беларусы! Разам з партызанамі дапамагайце Чырвонай Арміі хутчэй вызваліць сваю Радзіму! Арганізоўвайцеся ў партызанскія атрады! Смерць нямецкім акупантам! Беларусь была і будзе Савецкай!»

Падпольная група А. А. Маркевіча летам 1942 года выдавала ў Мінску газету «Патриот Родины». Захаваліся, на жаль, нумары гэтай баявой газеты толькі за 22 чэрвеня, 5 ліпеня і 9 жніўня 1942 года.

Рознымі спосабамі друкавалася многа лістовак і зводак Саўінфармбюро.

Дзякуючы гэтаму насельніцтва Мінска атрымлівала праўдзівую інфармацыю з франтоў Вялікай Айчыннай вайны, аб гераічнай працы рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі ў савецкім тыле і партызанскай вайне ў тыле ворага. Падпольны бальшавіцкі друк выкрываў разбойніцкую палітыку фашыстаў і іх лакеяў, выхоўваў у насельніцтва акупіраванай Беларусі пачуццё любві і адданасці сваёй сацыялістычнай Радзіме.

Падпольны рух у горадзе рос. Узмацнялася супраціўленне насельніцтва акупантам, павялічвалася колькасць дыверсій на камунікацыях ворага. Мінчане псавалі прадукцыю радыёзавода, псавалі парашуты, якія выраблялі на фабрыцы імя Крупскай. На лесапільным заводзе яны спалілі дзесяць матораў, сістэматычна псавалі пілараму. З хлебазавода і крухмальнага завода «невядома куды» знікалі дзесяткі тон хлеба і крухмалу. Падпольшчыкі падпалілі абутковую

і лямцавую фабрыкі, якія працавалі на нямецкую армію. У снежні 1941 года чыгуначнікі вывелі са строю дзве вадакачкі і воданапорную сетку і тым самым пазбавілі мінскі чыгуначны вузел вады на 10 дзён.

Замарозіўшы 50 паравозаў, падпольшчыкі зрывалі іх рамонт, вывелі са строю паваротны круг.

Мінскае падполле падтрымлівала цесную сувязь з разведчыкамі Чырвонай Арміі, якія дзейнічалі ў горадзе. У студзені — красавіку 1942 года ў Мінску знаходзілася разведгрупа Наркамата дзяржаўнай бяспекі СССР пад камандаваннем А. М. Гваздзёва. З красавіка і да снежня 1942 года актыўна дзейнічала група пад камандаваннем С. К. Вішнеўскага. Савецкім разведчыкам вялікую дапамогу аказвалі П. Р. і П. А. Ляхоўскія, маці і дачка Лісецкія, Д. А. Максімаў, О. І. Кухта, А. Д. і Т. М. Загорскія і іншыя патрыёты.

Актыўна дапамагалі падпольшчыкам жанчыны. Яны былі выдатнымі, часам незаменнымі сувязнымі і разведчыкамі. Марына Малаковіч і Анастасія Верамейчык арганізавалі для партызан збор зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, дапамаглі многім дзесяткам ваеннапалонных пайсці з горада ў партызанскія атрады. Сувязь паміж падпольным гаркомам партыі і партызанскімі атрадамі падтрымлівалі А. Ф. Верамейчык, М. Б. Осіпава, В. К. Шыкаўка, Н. О. Гурына, А. А. Язубчык, К. Г. Масквічова, А. І. Сярова, Л. С. Суравіцкая, М. І. Траццякова, А. К. Януліс, А. Ф. Шырко, А. Н. Мыцько, В. Ф. Мацюшка, М. І. Батурына і многія іншыя адважныя савецкія патрыёты.

Падпольшчыкі і партызаны заўсёды былі забяспечаны пашпартамі і прапускамі (аўсвайсамі). Камсамолец Захар Гало (падпольныя мянушкі «Зора», «Максім»), які працаваў у мінскім гарадскім камісарыяце, здабываў неабходныя бланкі і ўзоры пячатак. Падпольшчык Іван Казлоў па-майстэрску выраблял пячаткі, пашпарты і іншыя дакументы. Выраблялць дакументы Казлову па даручэнню Мінскага гарадскога камітэта партыі дапамагаў Васіль Сайчык («Стары»). Дацэнт Т. А. Зарубін, які працаваў па заданню гаркома партыі ў карткавым бюро фашысцкага гарадскога камісарыята, забяспечваў падпольшчыкаў і партызанскія сем'і, якія жылі ў Мінску, хлебнымі і прадуктовымі карткамі. Медыцынскія работнікі Мінска прафесар Яўгеній Уладзіміравіч Клумаў («Самарын»), якому пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, урачы М. М. Уладысік, В. І. Гудына, Л. М. Кашачкіна, М. А. Кірзон, Н. І. Мельнікаў, В. І. Паўловіч, М. Г. Піліпушка, С. А. Прылуцкі, А. І. Плавінская, В. К. Шыкаўка, медсёстры В. Ф. Рубец, А. І. Сідаровіч, Ю. І. Сямашка, фармацэўты Л. Ф. Густарнік-Ларына, Г. Г. Фалевіч, прафесар Д. А. Маркаў і многія іншыя, рызыкуючы жыццём, лячылі падпольшчыкаў і партызан,

забяспечвалі партызанскія атрады лякарствамі, перавязачнымі матэрыяламі і медыцынскімі інструментамі.

Горад жыў напружаным, поўным небяспечнасцей, цяжару і нягод жыццём, але не быў пакароны ворагам.

Заняўшы Мінск, гітлераўцы змянілі назвы вуліц, некаторыя з іх назвалі імёнамі фашысцкіх главароў. Аднак ужо ў пачатку 1942 года фашысцкія ўлады вымушаны былі выдаць загад, дзе гаварылася, што неабходна вуліцам, названым імем фюрэра альбо імёнамі германскіх ваенных начальнікаў, неадкладна даць нейтральныя вулічныя назвы па прычыне таго, што «надпісы вуліц, названых памянёнымі імёнамі, як правіла, зрываюцца зламыснымі асобамі з насельніцтва або падвяргаюцца зняважлівым прыпіскам».

Фашысты адчувалі сябе ў Мінску, як на парахавой бочцы, гатовай выбухнуць у кожную мінуту. Баючыся народнай помсты, яны ператварылі горад ва ўмацаваны лагер. На вуглах кварталаў будаваліся доты, узброеныя кулямётамі і артылерыйскімі гарматамі. Службовыя будынкі абносіліся высокімі агароджамі з калючым дротам. У вокнах першых этажоў рабіліся байніцы для стральбы з аўтаматаў і кулямётаў. Днём і ноччу горад ахоўваўся вялікімі нарадамі войск СС.

Фашысцкія карнікі нанеслі новы ўдар падполлю. У ноч з 25 на 26 верасня 1942 года ў Мінску пачаліся масавыя арышты. У засценкі СД былі кінуты члены Мінскага падпольнага гарадскога камітэта КП(б)Б К. І. Хмялеўскі, Д. А. Караткевіч, сакратары гарадскіх райкомаў партыі Н. А. Шугаеў, І. І. Матусевіч, Н. К. Каржанеўскі, Н. Е. Герасіменка (з сям'ёй); актыўныя работнікі Мінскага падполля А. Ф. Арндт, Е. М. Баранаў, І. Л. Беланоўскі, С. А. Благаразумаў, Багданаў, М. Н. Воранаў, С. М. Гапоненка, Т. Герасіменка, І. Герасіменка, А. П. Гук, А. Н. Дзяменцьеў, С. Дуброўскі, І. Дуброўская, Е. Думбро, Н. І. Зехаў, І. І. Івашчонак, Н. М. Качан (з сям'ёй), І. Х. Казлоў, А. Кушалевіч, Н. І. Наркевіч, Л. Е. Адзінцоў, А. В. Пашко, І. Ф. Падабед, В. Ф. Рубец, Г. П. Сапун, С. В. Сержановіч, П. Н. Хмялеўскі, П. К. Хадасевіч (з сям'ёй), П. М. Цвяткоў, Н. Т. Цвяткова, П. І. Чыркун, А. Ф. Шырко, Е. А. Шумская і інш.

Гітлераўскія каты падверглі арыштаваных самым вытанчаным катаванням. Многія падпольшчыкі, у тым ліку Д. А. Караткевіч і К. І. Хмялеўскі, былі замучаны ў засценках гестапа. Некаторых падпольшчыкаў гітлераўцы адпраўлялі ў лагеры смерці, там адны з іх загінулі, а другія былі выратаваны Чырвонай Арміяй.

Можна прывесці нямала прыкладаў здзіўляючай стойкасці і гераізму, бязмежнай адданасці Камуністычнай партыі і Савецкай Радзіме, якія праявілі падпольшчыкі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Аб мужнасці мінскіх падпольшчыкаў, якія стойка пераносілі катаванні да апошняга дня свайго жыцця, сведчыць пісьмо Івана Казлова, напісанае ў мінскай турме 27 снежня 1942 года і перададзенае на волю незадоўга перад пакараннем. Звяртаючыся да падпольшчыкаў, якія засталіся ў горадзе, І. Х. Казлоў пісаў:

«Сапраўдны патрыёт той, хто смела глядзіць у вочы смерці. Не трэба слёз. Не трэба сумаваць. Наша кроў не пральецца дарэмна. Мацуйцеся, мацуйцеся, не бойцеся і не ўпадайце ў роспач. Эх, жыць вельмі хочацца! Помсціць гэтым варварам — вось што трэба рабіць. Ну а калі б мне ўдалося... Можаце сабе ўявіць вы, з якой бясстрашнасцю, з якой жорсткасцю і велізарнай асалодай я знішчаў бы гэтых гадаў ядавітых, а я ж два гады назад не мог зарэзаць курку. Жыць, жыць! Вось як хочацца! Ды не хавацца за спіну таварышаў, а са зброяй у руках, у штодзённай барацьбе з ненавіснымі шакаламі — у гэтым асалода і ўся мэта жыцця. Жыць для Радзімы, для савецкага свабадалюбівага народа, змагацца за гонар і свабоду яго — у гэтым уся асалода жыцця, гэта ў дадзены момант ідэал жыцця.

Гарачае прывітанне жывым, якія са зброяй у руках абараняюць ад лютага ворага свой гонар і незалежнасць. Прывітанне сябрам, таварышам... Ваш Ваня Казлоў».

Многія падпольшчыкі гераічна загінулі ў няроўнай барацьбе з лютым ворагам нашай Айчыны. Аднак зверскія расправы фашысцкіх людаедаў з патрыётамі, якія папалі да іх у лапы, не запалохалі насельніцтва Мінска, не зламалі яго волю да барацьбы з ненавіснымі нямецка-фашысцкімі захопнікамі, яго веру ў перамогу. На змену загінуўшым у барацьбе прыходзілі новыя сотні патрыётаў.

Пасля вераснёўскіх арыштаў падпольшчыкі В. С. Казачонак, І. К. Кабушкін, Х. М. Александровіч, В. І. Сайчык, Е. В. Афнагель і П. К. Калейнікаў надрукавалі і распаўсюдзілі ў горадзе лістоўку «Да насельніцтва Беларусі», на якой стаяла дата 18 кастрычніка 1942 года. Яна напісана ад імя Мінскага камітэта КП(б)Б і Н-скай партызанскай брыгады. У ёй гаварылася:

«Дарагія таварышы! Савецкія грамадзяне! Смяртэльна ранены звер — нямецкі фашызм не спыніцца ні перад чым, каб хоць на хвіліну адтэрмінаваць сваю немінучую пагібель. Яшчэ многа ён можа праліць нашай крыві, прынесці нам слёз і гора. Не чакайце, пакуль гестапаўскія каты павядуць вас на расстрэл або на вісельню. Бярыцеся за зброю! Далучайцеся да партызан! Арганізуйце новыя атрады, групы і ячэйкі па знішчэнню нямецкіх акупантаў і іх прыслужнікаў — паліцэйскіх і правакатараў! Толькі ў барацьбе вы заваюеце сабе права на жыццё і свабоду, а пасля перамогі вы смела і горда зможаце сказаць: «Радзіма, я набываў у барацьбе права быць тваім грамадзянінам!»

Да зброі, таварышы!»

Гітлераўскі камісар Мінска 3 снежня 1942 года ў справаздачы аб становішчы ў горадзе адзначаў: «Настрой шырокіх мас насельніцтва, калі не на сто працэнтаў адмоўны, то ўсё ж халодны, раўнадушны. На некаторых прадпрыемствах, асабліва на хлебазаводзе «Аўтамат», абутковай фабрыцы, выяўлен шырокі камуністычны ўплыў сярод рабочых».

Шырокі камуністычны ўплыў на рабочых Мінска вораг прызнаваў з неахвотай. Ішоў другі год акупацыі горада, а падтрымкі хоць бы ў якойсьці часткі насельніцтва фашысты так і не знайшлі. Больш таго, становішча прадстаўнікоў «новага парадку» рабілася ўсё больш пагражаючым. Дзейнасць мінскага падполля ў 1943—1944 гадах яшчэ больш актывізавалася. Дзякуючы мерам, прынятым Цэнтральным Камітэтам Кампартыі Беларусі, быў наладжан выпуск газеты «Звязда». Газета, з'яўляючыся органам ЦК КП(б)Б і Мінскага абкома КП(б)Б, выдавалася ў партызанскай зоне.

У канцы 1942 — пачатку 1943 года гераічная Чырвоная Армія разграміла буйную групоўку нямецка-фашысцкіх войск пад Сталінградам. Перамога ў бітве на Волзе і ўслед за тым разгром нямецка-фашысцкіх войск пад Арлом і Курскам сведчылі аб карэнным пераломе ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны. Натхнёныя перамогамі Чырвонай Арміі беларускія партызаны і падпольшчыкі ўзмацнілі барацьбу супраць акупантаў. Узмацнялася і барацьба працоўных Мінска.

Па ўказанню ЦК КП(б)Б Мінскі падпольны абком у кастрычніку 1943 года стварыў у месцы размяшчэння партызанскага атрада Градава Мінскі падпольны гарком партыі. У склад гаркома ўваходзілі С. К. Ляшчэня («Савельеў»), Г. Н. Машкоў, С. А. Ваўпшасаў («Градаў») і І. М. Родзін. Новы падпольны гарком разгарнуў вялікую дыверсійную і палітычную работу ў горадзе. Актывізавалася дзейнасць і Мінскага падпольнага гарадскога камітэта ЛКСМБ. Побач з ім у горадзе вёў вялікую работу Мінскі міжрайком камсамола, у склад якога ўваходзілі Я. І. Іўкін, С. А. Пілатовіч, Л. Г. Гайдучонак і інш.

У 1943 годзе ў Мінску дзейнічала звыш 20 камсамольскіх арганізацый. Найбольш буйной і баявой была падпольная камсамольская арганізацыя «Андруша». Яна зрабіла больш 40 дыверсій, знішчыла на вуліцах горада звыш 50 фашыстаў. Узначальваў арганізацыю 18-гадовы рабочы Мінскага будаўнічага трэста Мікалай Кедышка. Ён гераічна загінуў 6 лістапада 1943 года. Яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, яго імем названа адна з новых вуліц Мінска.

Падпольная група камсамолкі Галіны Сасінай зрабіла дзесяткі дыверсій. На аэрадроме гэтай групай было ўзарвана 6 баявых сама-

лётаў. У снежні 1943 года Галіна Сасіна і некаторыя яе баявыя таварышы былі арыштаваны і загінулі ў фашысцкіх засценках.

Увесь 1943 год быў насычаны выдатнымі падзеямі гераічнай барацьбы мінскіх падпольшчыкаў і партызан з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

Рэгулярна ўзрываліся фашысцкія паязды, якія ішлі на фронт. 2 красавіка 1943 года падпольшчыкі падарвалі магнітнымі мінамі састаў з бензінам. Выбух адбыўся ў дарозе паміж Талькай і Верайцамі. Замініраваны ў Мінску варожы эшалон з авіябомбамі 21 мая 1943 года ўзарваўся на станцыі Рудзенск. Згарэў і састаў з гаручым, які стаяў побач. Толькі ў ліпені і жніўні 1943 года ў мінскім дэпо выведзена са строю 155 паравозаў. У ліпені 1943 года ўзарвана гарадская электрастанцыя. 6 верасня 1943 года адважныя падпольшчыцы Капіталіна Гур'ева і Юлія Казлова ўзарвалі афіцэрскую сталоўку. Выбухам забіта 16 і паранена 32 эсэсаўскіх афіцэры.

На Акадэмічнай вуліцы ў памяшканні фашысцкага авіяштаба размяшчалася казіно лётнай групы № 31537. 16 верасня 1943 года тут узарваліся дзве міны, закладзеныя студэнтамі Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута Вячаславай Чарновай і Эдуардам Умецкім з дапамогай групы падпольшчыкаў, узначальваемай Сяргеем Антонавічам Раманоўскім. Выбухам забіта і паранена 30 нямецкіх афіцэраў — лётчыкаў далёкай бамбардзіровачнай авіяцыі.

У казіно на Даўгабродскай вуліцы выбухам, зробленым падпольшчыкамі, былі забіты нямецкі генерал і 39 афіцэраў.

Смелыя дыверсіі праводзіў адважны мінскі падпольшчык малодшы лейтэнант Чырвонай Арміі камсамолец Іван Канстанцінавіч Кабушкін. У Мінскім падпольным камітэце КП(б)Б ён узначальваў аператыўную групу па знішчэнню агентаў фашысцкай разведкі, перадаваў у партызанскія атрады каштоўныя разведвальныя звесткі. Многія фашысты і іх памагатыя былі знішчаны Кабушкіным непасрэдна на вуліцах горада.

У лютым 1943 года гітлераўцы, якія доўгі час палявалі на няўлоўнага «Жана», схапілі І. К. Кабушкіна. У засценках СД яго страшэнна катавалі, марылі голадам, не давалі вады, збівалі да непрытомнасці, але нішто не зламала непахіснай мужнасці адважнага патрыёта. Аб гэтым сведчаць яго пісьмы да падпольшчыкаў з турмы СД. У адным з іх, пасланым да А. К. Януліс, гаворыцца:

«Родныя! Прамень зноў асвятліў маю «келлю». Я рад, што вы жывыя. Так, настрой некалькі пагоршыўся. Як тут весяліцца, у адзін дзень сядзелі ўсе мае, я — дзесяты. Гэта ж усе мае родныя, зразумей! Калі Міля [1] будзе зноў там (у брыгадзе «Старога».— Рэд.), няхай ад

[1] Эмілія Восіпаўна Цытовіч — сувязная партызанскай брыгады «Старога».

мяне перадасць палымянае бальшавіцкае прывітанне Б. Г.[1] і баце галоўнаму[2]... Няхай перадасць — памру, а нягоднікам не буду! Ну, адносна мяне — зацішша. Я мяркую... так, што новага яны не дабіліся, усе катаванні не мелі поспеху, і вырашылі, відаць, проста 1 Мая вывесіць як «падарунак» для народа. Ну, зразумей, як жа інакш? Бо ніводнага чалавека яны не атрымалі, а супраць мяне матэрыял з 1941 года і даволі-такі важны. А як мне паступіць. Я рашыў цвёрда ўсё сваё жыццё прысвяціць барацьбе з ворагамі ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва, за народ, за Радзіму. Усё зраблю і раблю, каб толькі ніхто не пацярпеў. Ну, ты нешта маўчыш адносна Радзімы, дай вестку аб ёй... Трывогі чую і для мяне гэта вялікі і прыемны канцэрт... Моцна ўсіх цалую».

Спроба таварышаў арганізаваць пабег І. К. Кабушкіну не ўдалася. Адважны герой загінуў у фашысцкіх засценках. Да апошняга дня свайго жыцця ён быў палымяным і верным змагаром супраць фашызму.

Мінская падпольшчыца Д. Д. Корсакава-Гамберг, сувязная партызанскага атрада «Буравеснік», даведалася, што з Мінска ў Слуцк выязджаюць вядомыя фашысцкія чыны, і паведаміла аб гэтым у атрад. 10 чэрвеня 1943 года «фашысцкія чыны» былі знішчаны партызанамі паміж Шацкам і Уздой. Газета «Правда» паведамляла 2 ліпеня 1943 года:

«Стакгольм. 1 ліпеня. Гітлераўская газета «Мінскер цэйтунг» паведамляе, што 10 чэрвеня беларускімі партызанамі былі забіты нямецкі «абласны камісар» Людвіг Эрэнлейтнер, «урадавы інспектар» Генрых Клозе, начальнік абласной жандармерыі обер-лейтэнант Карл Кала, обер-вахмейстар Вальтэр Пагарэль, обер-вахмейстар Карл Зандфас, старшы жандар Карл Уедэрліх, обер-вахмейстар Аўгуст Штрасер, а таксама гітлераўскія «гаспадарчыя кіраўнікі» Франц Так, Фрыц Шульцэ і Гюнтэр Беневіц. Газета прызнае, што страх перад партызанамі прымушае многіх гітлераўцаў бегчы з Беларусі».

Фашысцкая газета «Мінскер цэйтунг» у нумары ад 24 чэрвеня 1943 года ўказвала, што на мінскім могільніку пахаваны 1600 немцаў, забітых партызанамі.

Гітлераўскі дырэктар Мінскага хлебазавода Эрнст Вестфаль у пісьме да брата 5 жніўня 1943 года скардзіўся: «З партызанамі пастаянна даводзіцца мець справу, нават у самім горадзе Мінску. У апошнія месяцы многа немцаў застрэлена прама на вуліцах. Па шашы з Мінска на Вільню нельга праехаць. На Баранавічы можна праехаць толькі пры ўмове прыкрыцця танкаў і моцным эскорце. Чатыры ты-

[1] Камісар партызанскай брыгады «Старога» Б. Г. Бывалы.
[2] Камандзір партызанскай брыгады «Старога» В. С. Пыжыкаў.

дні назад у мяне ўкралі грузавік, больш таго, шафёр пагрузіў сваю сям'ю і паехаў да партызан. Гэта паўсядзённыя падзеі. 22 чэрвеня ў гарадскім тэатры была закладзена міна і к заключэнню свята вызвалення міна ўзарвалася. У выніку звыш 30 забітых і 100 параненых. Затым яны ўзарвалі электрастанцыю і паравы кацёл малаказавода. У салдацкім кіно і салдацкім інтэрнаце тры тыдні назад, за паўгадзіны перад адкрыццём, было знойдзена некалькі бомбаў. Маю хлебапякарню партызаны ў мінулую суботу спрабавалі ўзарваць, толькі, як відаць, зарад аказаўся дрэнным. У нядзелю вечарам каля афіцэрскага інтэрната на паветра ўзляцеў легкавы аўтамабіль, а каля вадакачкі — паравоз. Тут бухае штодзённа, часам нават цяжкая гармата».

Падпольшчыкі і партызаны праследавалі і знішчалі гітлераўцаў на кожным кроку. 7 сакавіка 1943 года мінскія падпольшчыкі А. Л. Матусевіч, Г. І. Страшко і А. М. Прылепка знішчылі мацёрага гітлераўскага агента, актыўнага супрацоўніка СД Фабіяна Акінчыца.

У снежні 1943 года савецкія патрыёты са спецгрупы «Мсцівец» А. А. Камінскі і І. Е. Кунцэвіч днём на гарадской вуліцы ўскочылі ў брычку бургамістра Мінска нацыянал-фашыста Іваноўскага і зрабілі спробу вывезці яго да партызан. Сустрэўшы супраціўленне, яны забілі Іваноўскага, захапілі яго пісталет і партфель і паспяхова вярнуліся на базу спецгрупы.

13 снежня 1943 года падпольшчыкі К. І. Немчык і І. В. Шнігір у калідоры памяшкання рэдакцыі забілі буржуазнага нацыяналіста Казлоўскага, рэдактара фашысцкай «Беларускай газеты».

А другой гадзіне ночы 22 верасня 1943 года выбухнула магнітная міна, закладзеная ў пасцель Вільгельма Кубэ, так званага генеральнага камісара Беларусі. Смяротны прыгавор, вынесены мінскімі падпольшчыкамі гэтаму набліжанаму Гітлера, прывяла ў выкананне Алена Мазанік з дапамогай М. Б. Осіпавай, Н. П. Дразда і Н. В. Траян. А. Мазанік, М. Осіпавай і Н. Траян прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Мінскія падпольшчыкі дзейнічалі ў цесным кантакце з партызанскімі атрадамі. За гады вайны з горада да партызан пайшлі каля 40 тысяч мінчан. У радзе партызанскіх атрадаў і брыгад Беларусі жыхары Мінска складалі да 30 працэнтаў. На працягу ўсяго перыяду акупацыі горада партызаны 20 атрадаў, брыгад і спецгруп, з якімі падпольшчыкі мелі непасрэдную і пастаянную сувязь, атрымлівалі з Мінска зброю, боепрыпасы, медыкаменты і медыцынскія інструменты, перавязачны матэрыял, паперу, радыёпрыёмнікі і сілкаванне да іх, вопратку і шмат іншага.

Нямецка-фашысцкія захопнікі не ў стане былі падавіць у Мінску рух народнага супраціўлення. Ні жудасны тэрор, ні ілжывая прапа-

ганда, ні частыя правакацыі — нішто не дапамагала фашысцкім акупантам. Наадварот, чым больш шалеў вораг, знішчаючы мірных савецкіх людзей, тым больш згуртаваным і моцным рабілася мінскае бальшавіцкае падполле.

Адступаючы пад ударамі Савецкай Арміі ўсё далей на захад, нямецка-фашысцкія захопнікі разбуралі нашы гарады і вёскі, гналі на катаргу ў Германію або знішчалі на месцы савецкіх людзей, спяшаліся вывезці награбленае ў народа дабро.

Таму вясной і ў пачатку лета 1944 года падпольныя арганізацыі і партызаны ўзмацнілі ўдары па ворагу. Газета «Минский большевик» паведамляла ў нумары ад 25 чэрвеня 1944 года, што «толькі за апошні час у горадзе праведзена больш 60 дыверсійных актаў, у выніку якіх забіта і паранена 356 афіцэраў, 224 салдаты, 1 генерал і 92 іншых прыхвасняў Гітлера. Падарвана 2 самалёты Ю-88, 2 склады з гаручым, 6 бензацыстэрнаў, 5 паравозаў, больш за 20 аўтамашын і г. д.».

Адначасова з узмацненнем баявой дзейнасці падпольныя партыйныя арганізацыі і партызанскае камандаванне арганізавалі эвакуацыю насельніцтва Мінска ў найбольш бяспечныя раёны партызанскай зоны.

Задача выратавання беларускага насельніцтва ад фашысцкіх акупантаў шырока і ўсебакова асвятлялася ў падпольным бальшавіцкім друку. Газета «Минский большевик» растлумачвала: каб не папасці на катаргу ў фашысцкую Германію і застацца жывым, трэба ісці ў лес, уключацца ў партызанскую вайну супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Нягледзячы на тое што ў горадзе часцей сталі праводзіцца паліцэйскія аблавы, тысячы мінчан выратаваліся ад акупантаў. Толькі ў лясах паўднёвай прыгараднай зоны Мінска пад абаронай партызан знайшлі сабе прытулак звыш 5 тысяч сем'яў працоўных горада.

Для аховы прадпрыемстваў і будынкаў горада ад разбурэння, для ўзмацнення дыверсійнай і тэрарыстычнай дзейнасці супраць акупантаў па заданню гаркома партыі на фабрыках і заводах, чыгуначнай станцыі, аэрадроме, у клінічным гарадку, шпіталях, гандлёвым атранспартным таварыстве, гарадской управе, гебітскамісарыяце і іншых арганізацыях былі створаны новыя баявыя групы. Перад падпольшчыкамі, якія «працавалі» ў эканомцэнтры і гебітскамісарыяце, гарком паставіў задачу захаваць к прыходу Савецкай Арміі не менш 50 працэнтаў запасаў хлеба, не дапусціць знішчэння шэрага важных прадпрыемстваў і цэхаў. Выконваючы гэту задачу, падпольныя баявыя групы знішчылі шэраг гітлераўскіх ваенных аб'ектаў, парушалі камунікацыі ворага, знішчалі яго жывую сілу і тэхніку.

4. Вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

У канцы чэрвеня 1944 года Савецкая Армія прарвала моцную, глыбока эшаланіраваную абарону ворага на Віцебскім, Аршанскім, Магілёўскім і Бабруйскім напрамках. Акружыўшы і знішчыўшы буйныя групоўкі праціўніка ў раёнах Віцебска і Бабруйска, часці і злучэнні Савецкай Арміі хутка рухаліся ўперад, вызваляючы гарады і вёскі Беларусі.

Поспеху наступлення савецкіх войск у значнай ступені садзейнічалі беларускія партызаны. Яны вялі разведку, дапамагалі наступаўшым войскам, наносячы ўдары ворагу з тылу, захоплівалі населеныя пункты, чыгункі, масты, пераправы. На чыгунках партызаны падарвалі дзесяткі тысяч рэек, дэзарганізавалі забеспячэнне і перакідку нямецка-фашысцкіх войск з аднаго ўчастка фронту на другі.

Мінскія партызанскія злучэнні, якія налічвалі дзесяткі тысяч байцоў, вызвалілі рад раённых цэнтраў на шляхах адступлення ворага, захапілі важныя камунікацыі ў раёне Мінска, занялі на рацэ Случы абарончы рубеж працягам 80 кіламетраў і ўтрымлівалі яго да прыходу часцей Савецкай Арміі.

Партызанская брыгада «Дзядзі Колі», якой камандаваў Герой Савецкага Саюза П. Г. Лапацін, актыўна садзейнічала хуткаму перамяшчэнню па лясных дарогах праз Мсціж — Плешчаніцы на Мінск 35-й гвардзейскай танкавай брыгады.

Увечар 2 ліпеня 5-я гвардзейская танкавая армія пад камандаваннем маршала бранетанкавых войск П. А. Ротмістрава завязала баі за паўночную і паўночна-ўсходнюю ўскраіны Мінска.

На досвітку 3 ліпеня на ўсходняй ускраіне Мінска з'явіліся часці 2-га гвардзейскага танкавага корпуса, якім камандаваў генерал-маёр А. С. Бурдзейны. З паўднёвага ўсходу ў горад уступіў 1-шы гвардзейскі танкавы корпус пад камандаваннем генерал-маёра М. Ф. Панова.

Некалькі пазней у горад увайшлі часці 3-й арміі. З выхадам у раён Мінска войскі 1-га і 3-га Беларускіх франтоў завяршылі акружэнне 4-й нямецкай арміі.

Націск савецкіх войск быў настолькі імклівым і моцным, што вораг не змог утрымацца на прамежкавых рубяжах і, паспешна адступаючы на захад, нёс велізарныя страты. На ўсход ад Мінска Савецкая Армія акружыла больш чым 100-тысячную групоўку праціўніка і цалкам разграміла яе ў баях з 5 да 11 ліпеня. Гітлераўцы страцілі забітымі звыш 70 тысяч салдат і афіцэраў. Каля 38 тысяч салдат і афіцэраў, у тым ліку камандуючы групай генерал Мюлер, былі ўзяты ў палон.

3 ліпеня 1944 года Мінск поўнасцю быў ачышчаны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

«Вызваленне Мінска, якое знамянуе хуткае вызваленне ўсёй Беларусі,— указвалася ў перадавым артыкуле «Правды» 5 ліпеня 1944 года,— гэта вялікае, светлае свята беларускага народа... Вызваленне Мінска — гэта радаснае свята для ўсіх народаў нашай краіны... Вызваленне Мінска — гэта радасная падзея для ўсяго перадавога чалавецтва, таму што рушыліся сцены яшчэ аднаго бастыёна, створанага немцамі для абароны сваёй разбойніцкай крэпасці».

Больш чым 50 злучэнням і часцям 1-га і 3-га Беларускіх франтоў, якія вызначыліся ў баях за Мінск, прысвоена ганаровая назва «мінскіх».

З вялікай радасцю сустракалі жыхары вызваленага Мінска воінаў Савецкай Арміі. Немагчыма перадаць словамі тыя глыбокія пачуцці любві і радасці, якія выліваліся з сэрцаў людзей, перанёсшых велізарныя пакуты за гады крывавай гітлераўскай акупацыі. Рассеяўся над горадам змрок фашысцкай, поўнай небяспек і трывог, ночы. Над Мінскам зноў узышло яркае сонца свабоды і шчасця. У сталіцу БССР вярнулася родная Савецкая ўлада.

Вызваліцелі Мінска ўбачылі страшэнную карціну разбурэнняў. Асабліва былі разбураны цэнтр горада і чыгуначны вакзал. На Савецкай вуліцы з 100 буйных жылых і грамадскіх будынкаў захавалася не больш 10. Вялікія будынкі і вытворчыя карпусы прадпрыемстваў, што захаваліся цэлымі, гітлераўцы замініравалі, але не паспелі ўзарваць дзякуючы хуткаму наступленню Савецкай Арміі.

З 332 дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў горада, якія працавалі да вайны, к дню вызвалення захавалася толькі 19. Нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі электрастанцыю, заводы імя Кірава, імя Мяснікова, імя Чкалава, швейныя фабрыкі «Кастрычнік» і імя Крупскай, хлебазаводы і многія іншыя прадпрыемствы, вывезлі абсталяванне тэлефоннай станцыі, падвесную кантактную сетку гарадскога трамвая, сапсавалі водаправод, разбурылі чатыры водаснасосныя станцыі, поўнасцю знішчылі гарадскія лазні, гарадскую гаспадарку і каля 80 працэнтаў жыллёвага фонду.

Яны ператварылі ў руіны універсітэцкі гарадок, узарвалі будынкі амаль усіх вышэйшых навучальных устаноў, 78 школ і тэхнікумаў, Дзяржфілармоніі і кансерваторыі, 8 кінатэатраў і 25 клубаў, Палац піянераў і многія іншыя. Акупанты разграбілі бібліятэкі Акадэміі навук, Беларускага дзяржаўнага універсітэта, політэхнічнага інстытута, навуковую медыцынскую бібліятэку, гарадскую публічную бібліятэку імя Пушкіна. Звыш 1,5 мільёна кніг бібліятэкі імя Леніна гітлераўцы вывезлі ў Германію. Яны разбурылі будынак Дзяржаўнай карціннай галерэі і вывезлі карціны і скульптуры. З Вялікага тэатра

оперы і балета фашысты вывезлі ў Германію дэкарацыі, мэблю, люстры, карціны, дываны, будынак тэатра вельмі пашкодзілі. Гітлераўскія вандалы знішчылі паліклінікі і бальніцы, дзіцячыя сады і яслі, чатыры дзіцячыя кансультацыі, ператварылі ў руіны будынак Інстытута аховы маці і дзіцяці.

Агульныя ўлічаныя страты, нанесеныя фашыстамі Беларусі, складаюць 75 мільярдаў рублёў, з іх страты Мінска па цэнах таго часу — 6 мільярдаў рублёў.

У звароце да народа ў дзень вызвалення сталіцы Беларусі СНК БССР, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР і ЦК КП(б) Беларусі заклікалі працоўных да хутчэйшага аднаўлення сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, фабрык, заводаў, школ, бальніц. «Гэта — цяжкая задача,— указвалася ў звароце,— але беларускі народ вырашыць яе ў самы кароткі тэрмін. Уся краіна, усе брацкія народы дапамагаюць і дапамогуць беларускаму народу хутчэй аднавіць разбураную немцамі гаспадарку, аднавіць культурныя ўстановы і ліквідаваць вынікі нямецкай акупацыі».

Гарадская партыйная арганізацыя разгарнула вялікую арганізатарскую і палітычную дзейнасць. 4 ліпеня ў Мінску аднавілі работу райкомы КП(б)Б і раённыя Саветы дэпутатаў працоўных, Мінскі абласны камітэт КП(б) Беларусі. Фашысты замініравалі гарадскую друкарню, аднак воіны Савецкай Арміі не дазволілі яе ўзарваць. На другі ж дзень пасля вызвалення Мінска друкаваліся газеты «Звязда» і «Советская Белоруссия», лістоўкі, плакаты і зводкі Саўінфармбюро.

7 ліпеня 1944 года ў Мінск вярнуліся многія работнікі ЦК КП(б)Б, Саўнаркома і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Неўзабаве ў сталіцы БССР аднавілі работу ўсе гарадскія, абласныя і рэспубліканскія ўстановы.

Яшчэ дымілася папялішчы, а мінчане ўжо распачалі расчыстку тэрыторый прадпрыемстваў і вуліц горада, а воіны сапёрных падраздзяленняў — размініраванне жылых дамоў, памяшканняў устаноў, карпусоў прамысловых прадпрыемстваў, якія ўцалелі ад разбурэння.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі заводаў імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і «Бальшавік» хуткімі тэмпамі аднаўлялі свае прадпрыемствы. 9 ліпеня рабочыя Мінскага радыёзавода на чале з механікам Буравым і машыністам Драздовічам пусцілі ў ход заводскую электрастанцыю, якая ў першы час забяспечвала электраэнергіяй і рад іншых прадпрыемстваў. 10 ліпеня была наладжана тэлеграфная сувязь паміж Мінскам і Масквой, Гомелем, Вілейкай, Баранавічамі, Віцебскам, Оршай і іншымі гарадамі.

16 ліпеня 1944 года на тэрыторыі іпадрома адбыўся мітынг працоўных горада і партызан Мінскай вобласці, прысвечаны вызваленню сталіцы Беларускай ССР. На ім прысутнічала 50 тысяч мінчан

і звыш 30 тысяч партызан. Усе выступаўшыя на мітынгу горача дзякавалі Савецкую Армію, якая вызваліла горад і рэспубліку ад нямецка-фашысцкай акупацыі. Працоўныя Мінска гаварылі партыі і ўрад, што яны не пашкадуюць сіл для таго, каб аднавіць родны Мінск, зрабіць яго зноў сацыялістычным горадам праці, навукі і культуры.

Пасля мітынгу адбыўся парад партызан. Перад трыбунай у калонах партызанскіх брыгад прайшлі лепшыя сыны і дочкі Савецкай Беларусі, народныя мсціўцы, загартаваныя ў баях з ворагам. У цяжкіх умовах варожага тылу яны гераічна змагаліся з нямецка-фашысцкімі акупантамі і дажылі да светлага дня перамогі.

Аднаўленне Мінска, як і ўсіх іншых гарадоў і вёсак Савецкай Беларусі, здзяйснялася пры велізарнай дапамозе вялікага рускага народа, працоўных усіх саюзных і аўтаномных рэспублік СССР. Працоўныя Урала, Сібіры, Горкаўскай і Яраслаўскай абласцей прыслалі ў 1944 годзе больш 500 вагонаў высакаякасных сталей, каляровых металаў, абсталявання для прадпрыемстваў, будаўнічых матэрыялаў, інструментаў. 37 вагонаў розных грузаў прыслалі ў падарунак Беларусі з Удмурцкай АССР. Атрыманыя рэспублікай матэрыялы дапамаглі аднавіць 32 раённых прамкамбінаты.

У кастрычніку 1944 года мінчане атрымалі 11 вагонаў з падарункамі ад камсамольцаў і моладзі Туркменскай ССР. Камсамольцы і моладзь Ашхабадскага сельскага раёна пісалі: «Дарагія равеснікі, партызаны і партызанкі, камсамольцы і моладзь Беларусі! Вы мужна змагаліся з ненавісным ворагам, абаранялі незалежнасць цудоўнай Радзімы. Вы зведалі і перанеслі ўсе жахі крывавага фашысцкага тэрору, але не сталі на калені перад іншаземнымі захопнікамі. Зараз вы свабодныя. Мы шлём вам разам з нашымі сціплымі падарункамі сваё гарачае прывітанне».

Значную дапамогу аказалі рамесныя вучылішчы і школы ФЗН Башкірыі, якія выдзелілі для школ працоўных рэзерваў Мінска і іншых гарадоў БССР абсталяванне, інвентар, літаратуру, вучэбныя дапаможнікі.

У працэсе аднаўлення горада па ініцыятыве насельніцтва было створана больш 100 вулічных камітэтаў. Яны адыгралі вялікую ролю ў арганізацыі масавых нядзельнікаў па ачыстцы вуліц горада, збору будаўнічых матэрыялаў, металалому, падрыхтоўцы школ да пачатку навучальнага года.

Уся работа па аднаўленню горада лягла ў асноўным на плечы жанчын і падрасткаў. У нерабочы час і ў выхадныя дні ўпарта працавалі мінчане, каб хутчэй аднавіць горад. Так, у масавым нядзельніку 30 ліпеня ў Кастрычніцкім раёне ўдзельнічала шэсць, у Савецкім — восем тысяч чалавек.

Тысячы будаўнікоў прыбылі ў Мінск з раёнаў рэспублікі. «Мы дапаможам адбудаваць дамы,— гаварылася ў пісьме будаўнікоў з Халопеніцкага раёна, надрукаваным у «Звяздзе» 15 жніўня 1944 года.— Сярод нас ёсць і цесляры, і сталяры, і муляры, і шкляры, і кавалі, і слесары. Мы бачылі сталіцу прыбранай, бачым яе зараз зняважанай. Мы дапаможам аднавіць яе. Усё сваё ўмельства аддадзім аднаўленню Мінска, будзем працаваць, не шкадуючы сіл».

На дзяржаўных прамысловых прадпрыемствах і ў арцелях Бабруйска выраблялiся для Мінска мэбля, розныя інструменты, інвентар. Гродненскія прадпрыемствы выпускалі для сталіцы вапну, кафлі, аблiцовачныя плiткі, чарапiцу, жалезабетонныя вырабы.

Лесанарыхтоўчыя арганізацыі рэспублікі далі звыш плана на аднаўленне Мінска 100 вагонаў будаўнічай драўніны. 11 лютага 1945 года рабочыя і калгаснікі Смалявіцкага раёна арганізавалі суботнік па нарыхтоўцы і вывазцы для Мінска паліва. За адзін дзень яны адгрузілі 449 і вывезлі 180 тон торфу.

Многія старыя рабочыя-пенсіянеры вярнуліся на прадпрыемствы, каб перадаць моладзі свой багаты вытворчы вопыт. Разам з маладымі рабочымі яны аднаўлялі фабрыкі і заводы. Выказваючы думку многіх сваіх таварышаў, рабочы цагельнага завода Гаўрылаў заявіў: «Я пенсіянер, да работы раней быў непрыгодны. Але зараз, калі родная Чырвоная Армія вызваліла нас ад фашыстаў, я не магу сядзець дома, зноў прыйшоў на свой любімы завод, каб дапамагчы вярнуць яму былую славу».

Па пачыну калектыву рабочых хлебакамбіната ў горадзе пачаўся збор сродкаў у фонд Савецкай Арміі. Да 1 жніўня 1944 года рабочыя гэтага прадпрыемства сабралі на выраб самалётаў эскадрыллі «Савецкая Беларусь» 182 тысячы рублёў і, акрамя таго, здалі на 31 тысячу рублёў аблігацый дзяржаўных пазык. У жніўні працоўныя Мінска сабралі і здалі ў фонд абароны больш мільёна рублёў, у верасні — звыш трох мільёнаў рублёў грашыма, 860 тысяч рублёў аблігацый і на 22 тысячы рублёў каштоўнасцей.

На прадпрыемствах горада разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва. Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі фабрык і заводаў імкнуліся як мага хутчэй аднавіць прадпрыемствы, наладзіць выпуск прадукцыі для Савецкай Арміі і насельніцтва.

У ліпені 1944 года аднавіў работу хлебазавод «Аўтамат», дала першую прадукцыю фабрыка імя Куйбышава. Завод «Бальшавік» выпусціў у жніўні 18 374 квадратных дэцыметраў хрому. У лістападзе фабрыка «Камунарка» вырабіла першую партыю канфет, а к канцу снежня павялічыла выпуск прадукцыі да трох тон у суткі.

Калектывы прадпрыемстваў, спаборнічаючы за дастойную сустрэчу 27-й гадавіны Вялікага Кастрычніка, дасягнулі значных поспехаў.

Рабочыя фабрыкі імя Тэльмана, аднавіўшы шэсць цэхаў, выканалі перадкастрычніцкія абавязацельствы — вырабілі звыш плана 1600 пар абутку.

Рабочыя кацельнага цэха электрастанцыі № 2 атрымалі заданне за 18 дзён аднавіць адзін з найбольш магутных катлоў. Яны аднавілі кацёл электрастанцыі на шэсць дзён раней тэрміну. Рабочыя паліўна-транспартнага цэха электрастанцыі ачысцілі і аднавілі чыгуначную ветку за 8 дзён замест 15 па плану.

На 1 студзеня 1945 года ў горадзе працавала 21 прамысловае прадпрыемства, у тым ліку заводы імя Кірава, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, аўтарамонтны, імя Мяснікова, «Бальшавік», друкарня, мясакамбінат, хлебазавод.

У аднаўленні прамысловых прадпрыемстваў прымалі ўдзел тысячы маладых рабочых, якія ўпершыню прыйшлі на вытворчасць. У горадзе наладжвалася іх навучанне. У жніўні 1944 года было створана спецыяльнае рамеснае вучылішча для дзяцей воінаў Савецкай Арміі і партызан і залічана на вучобу каля 200 чалавек. У канцы верасня пачаліся заняткі ў чатырох іншых (рамесных і чыгуначным) вучылішчах. У іх навучалася 1250 вучняў. Вытворчае навучанне вучняў школ ФЗН праводзілася непасрэдна на будаўнічых аб'ектах.

На прадпрыемствах ствараліся тэхнічныя гурткі, школы наватараў вытворчасці, шырока распаўсюджваўся метад індывідуальнага навучання. Па ініцыятыве партыйнай арганізацыі завода імя Кірава ў цэхах былі створаны гурткі тэхмінімуму, якімі кіравалі начальнікі цэхаў і вопытныя майстры. За другі квартал 1945 года на заводзе падрыхтавалі 46 спецыялістаў, сярод іх 16 фармоўшчыкаў, 5 ваграншчыкаў, 7 токараў, 10 слесараў-рамонтнікаў. Моладзь, якая працавала на заводзе імя Кірава, мела магчымасць павышаць і агульнаадукацыйны ўзровень. Каля 40 маладых рабочых вучыліся ў вячэрніх сярэдніх школах.

4 верасня 1944 года адбылася першая пасля вызвалення сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных з удзелам прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый. Яна прыняла рашэнне аб прыцягненні ўсяго працаздольнага насельніцтва горада да нарыхтовак будаўнічых матэрыялаў за кошт разборкі разбураных будынкаў, да падрыхтоўкі пляцовак для будаўніцтва жылых дамоў і памяшканняў грамадскіх устаноў, да аднаўлення тратуараў, дарожнага пакрыцця і правядзення зялёных насаджэнняў.

Па рашэнню сесіі працаздольныя рабочыя і служачыя абавязаны былі штомесячна працаваць на аднаўленні горада 30, а студэнты і вучні старэйшых класаў 15 гадзін. Усім удзельнікам аднаўлення горада выдаваліся спецыяльныя працоўныя кніжкі. Арганізацыя ра-

бот і кіраўніцтва імі былі ўскладзены на спецыяльна створаны трэст па разборцы разбураных будынкаў.

Рабочыя, служачыя, хатнія гаспадыні, студэнты і школьнікі аднадушна падтрымалі рашэнне гарсавета, прынялі канкрэтныя абавязацельствы па ўдзелу ў аднаўленні горада. Рабочыя і служачыя друкарні, напрыклад, рашылі па прыкладу гарадоў-герояў Ленінграда і Сталінграда прыняць актыўны ўдзел у аднаўленчых работах і, у прыватнасці, падрыхтаваць будаўнічую пляцоўку для збудавання лабараторнага корпуса Акадэміі навук БССР.

Мнагалюдныя мітынгі адбыліся на вуліцах Мінска. Насельніцтва бралася за аднаўленне горада, дзесяткі тысяч мінчан выходзілі на аднаўленчыя работы.

У масавым нядзельніку 8 кастрычніка 1944 года прымалі ўдзел 33 тысячы гараджан. За адзін дзень было падабрана і складзена ў штабелі 1316 тысяч цаглін, сабрана 1065 тон будаўнічых матэрыялаў, нарыхтавана 2050 кубаметраў шчэбеню, ачышчана 15 500 квадратных метраў плошчы, засыпана ў варонкі 2500 кубаметраў грунту.

Актыўным удзелам у аднаўленчых работах мінчане паказалі, што яны поўныя рашучасці ў найкарацейшыя тэрміны ліквідаваць разбурэнні, нанава адбудаваць свой родны горад, зрабіць яго больш прыгожым і добраўпарадкаваным.

З вялікім працоўным уздымам сустрэлі працоўныя Мінска прапанову металургаў Магнітагорска і Кузнецка аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар перамог Савецкай Арміі. Металургі заклікалі працоўных усёй краіны ўзмацніць дапамогу фронту, каб Савецкая Армія хутчэй разбіла нямецка-фашысцкіх захопнікаў, даваць больш прадукцыі для аднаўлення прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту ў раёнах Савецкага Саюза, якія пацярпелі ад акупацыі.

Калектыў аўтазборачнага цэха Мінскага аўтарамонтнага завода, абмеркаваўшы зварот металургаў, узяў на сябе абавязацельства перавыканаць на 10 працэнтаў план чацвёртага квартала 1944 года, знізіць на 20 працэнтаў кошт машын і навучыць зборцы 20 маладых рабочых. Работнікі хлебазавода «Аўтамат» абавязаліся датэрмінова выканаць план чацвёртага квартала, эканоміць сыравіну, знізіць вытворчыя страты.

На прадпрыемствах і будоўлях горада пашыраўся рух двухсотнікаў і трохсотнікаў, шматстаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій. Перадавыя рабочыя бралі шэфства над навічкамі, ствараліся камсамольска-маладзёжныя брыгады, павялічвалася колькасць рацыяналізатараў і вынаходнікаў.

Калектыў вагонарамонтнага завода імя Мяснікова, уключыўшыся ў спаборніцтва ў гонар перамог Савецкай Арміі, дасягнуў высокай

прадукцыйнасці працы. 60 рабочых-наватараў сістэматычна выконвалі нормы выпрацоўкі больш чым на 200 працэнтаў, 85 рабочых штодзённа выконвалі нормы на 150 працэнтаў. Да вайны на заводзе рамантавалі 20 пасажырскіх вагонаў за месяц. У 1945 годзе пры скарочанай удвая колькасці рабочых штомесячна выпускаліся з рамонту 15 вагонаў.

Завод імя Кірава 8-месячны план у 1945 годзе выканаў на 118 працэнтаў. З 200 рабочых, занятых непасрэдна на вытворчасці, 128 перавыканалі вытворчыя заданні.

На заводзе «Бальшавік» у даваенны час разбівачную машыну абслугоўвалі чатыры работнікі. Л. Завадская і І. Рудакоўскі рашылі працаваць на ёй удваіх. Цяжкасці пачатковага перыяду неўзабаве былі пераадолены і работа наладзілася. Машына дзейнічала бесперабойна, прадукцыйнасць працы ўзнялася да 370—400 працэнтаў. З наватараў узялі прыклад іншыя рабочыя завода.

На аднаўленні ЦЭЦ-2 бетоншчык Прудніка ў норму выпрацоўкі выконваў на 300—365 працэнтаў, цесляры Будай, Свірыдаў, Іваноў, сталяры Багачоў, Гусеў і іншыя будаўнікі штодзённа выконвалі да трох зменных норм.

К канцу 1945 года ў Мінску было адноўлена 56 прамысловых прадпрыемстваў. Валавая прадукцыя іх складала 105 мільёнаў рублёў, або 23,8 працэнта да даваеннага ўзроўню. Аднаўленне прамысловасці не абмяжоўвалася ўвядзеннем у строй фабрык і заводаў, якія існавалі да вайны. Партыя і ўрад прынялі меры да стварэння ў сталіцы БССР новых галін прамысловасці. У 1945 годзе пачалося будаўніцтва аўтамабільнага завода, тонкасуконнага камбіната, завода будаўнічых дэталей і іншых прадпрыемстваў.

Рабочыя горада аказалі значную дапамогу ў аднаўленні і паляпшэнні работы мінскага чыгуначнага вузла. Узяўшы шэфства над чыгуначным вузлом, калектывы аўтарамонтнага і станкабудаўнічых заводаў абавязаліся адрамантаваць вугалепад'ёмны кран, ацяпліць 40 паравозаў, прывесці ў парадак заводскія пад'язныя пуці, выдзеліць для дэпо станкі і інструменты. Па іх прыкладу чыгуначнікам пачалі дапамагаць рабочыя прадпрыемстваў Гомеля, Віцебска, Магілёва і іншых гарадоў.

Работа мінскага вузла палепшылася. У верасні 1945 года станцыя Мінск-Пасажырская адправіла ўсе паязды па графіку, былі скарочаны прастоі паравозаў. Калектыў станцыі заваяваў першынство ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве і атрымаў пераходны Чырвоны сцяг НКШЗ.

Працоўныя горада прымалі ўдзел і ў аднаўленні сельскай гаспадаркі рэспублікі. Нягледзячы на недахоп рабочых рук на прадпрыемствах, калектывы фабрык і заводаў неаднаразова пасылалі ў МТС

і калгасы рамонтнікаў, прымалі ўдзел у правядзенні сельскагаспадарчых работ. У пачатку 1945 года, напрыклад, у МТС Мінскай вобласці 50 дзён працавалі 64 кваліфікаваныя рабочыя. Яны дапамаглі своечасова закончыць рамонт трактараў і сельскагаспадарчых машын да вясенніх палявых работ. Восенню таго ж года 7500 мінчан выязджалі на розныя тэрміны ў калгасы Мінскага, Лагойскага, Дзяржынскага і Смалявіцкага раёнаў на ўборку бульбы.

5. Мерапрыемствы па паляпшэнню бытавых і культурных умоў насельніцтва горада

У вызвалены Мінск кожны дзень прыбывалі партызаны, вярталіся з прыгарадных партызанскіх зон гарадскія жыхары, насельніцтва, эвакуіраванае ў пачатку вайны ў тыл краіны. Колькасць насельніцтва горада, якая складала к дню яго вызвалення менш 40 працэнтаў даваеннай, хутка расла.

Былі прыняты неабходныя меры да размяшчэння насельніцтва, што вярталася ў Мінск, да стварэння ўмоў для яго жыцця. З глыбінных раёнаў СССР у Мінск завозіліся прамысловыя тавары і прадукты, у тым ліку цукар, соль, мыла, тытунь, газа, якія сталі пры фашыстах дэфіцытнымі. Наладжваўся гандаль. Рыхтаваліся да адкрыцця школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, навуковыя і культурна-асветныя ўстановы.

На прадпрыемствах ствараліся цэхі па выпуску тавараў народнага спажывання. На шрафілітавым заводзе і ў дрэваапрацоўчым цэху радыёзавода, напрыклад, выраблялася мэбля: сталы, стулы, буфеты, шафы. У ліпені 1944 года аднавіў работу вытворчы камбінат па вырабу тавараў народнага спажывання. Да 3 жніўня ён даў прадукцыі на 150 тысяч рублёў. У кастрычніку 1944 года ў Мінску працавала 18 розных арцеляў, якія выпусцілі к гэтаму часу прадукцыі на 485 тысяч рублёў.

У горадзе пашыраўся гандаль. На дзесяты дзень пасля вызвалення горада адкрыўся першы магазін, а ў жніўні 1944 года ў Мінску налічвалася 36 адноўленых і нанава пабудаваных магазінаў, 33 ларкі. На пачатак 1945 года сетка магазінаў складалася з 130 адзінак. У сакавіку 1945 года ў горадзе працавала 120 сталовых, якія штодзённа адпускалі да 25 тысяч абедаў.

Ва ўмовах аднаўлення, калі адчуваўся востры недахоп прадуктаў харчавання, на 145 прадпрыемствах і ва ўстановах былі арганізаваны падсобныя гаспадаркі. Іх пасяўная плошча ў 1945 годзе складала каля 5 тысяч гектараў. Прадукцыя падсобных гаспа-

дарак прызначалася для паляпшэння харчавання насельніцтва горада.

20 жніўня 1945 года XI сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных зацвердзіла бюджэт горада на 1945 год у суме 78 813 тысяч рублёў (на 8 з лішнім мільёнаў рублёў больш за бюджэт 1940 года). Каля палавіны гэтай сумы было асігнавана на народную асвету, ахову здароўя і іншыя сацыяльна-культурныя мерапрыемствы, 27 працэнтаў — на жыллёва-камунальную гаспадарку. У тым жа годзе Урад СССР дадаткова выдзеліў на аднаўленне і развіццё Мінска 220 750 тысяч рублёў, з іх 60 687 тысяч на будаўніцтва памяшканняў культурна-бытавых і адміністрацыйных устаноў.

Гарадскі камітэт КП(б)Б і гарсавет пастаянна кіравалі забеспячэннем насельніцтва таварамі першай неабходнасці, паляпшэннем жыллёва-бытавых умоў, будаўніцтвам і аднаўленнем культурна-асветных устаноў. Так, у кастрычніку 1945 года Мінскі гаркам КП(б)Б абмеркаваў пытанне аб матэрыяльна-бытавым абслугоўванні рабочых аўтарамонтнага завода.

Выконваючы рашэнне гарадскога камітэта партыі, дырэкцыя завода ў кароткі тэрмін палепшыла матэрыяльна-бытавыя ўмовы рабочых. Былі адрамантаваны інтэрнаты і будынак завода, наладжана грамадскае харчаванне.

Хутка аднаўляўся жылы фонд. У дзень вызвалення ў Мінску было толькі 768 тысяч квадратных метраў карыснай жылой плошчы, галоўным чынам невялікія жылыя дамы, пераважна на ўскраінах горада. За паўтара года было адноўлена і ўведзена ў эксплуатацыю каля 100 тысяч квадратных метраў жылой плошчы, дзесяткі буйных адміністрацыйных будынкаў, навучальных устаноў, культурна-асветных і медыцынскіх устаноў.

Вялікія работы праводзіліся па аднаўленню камунальнай гаспадаркі. У першыя ж дні пасля вызвалення пачаў працаваць водаправод, насельніцтва горада атрымала ваду. Заводскія электрастанцыі і электрапоезд далі электраэнергію, наладжвалася вулічнае асвятленне. У 1945 годзе адноўлена 14 кіламетраў трамвайнага пуці. Трамвайны парк складаўся з 21 вагона. У кастрычніку 1945 года на вуліцах Мінска з'явіліся пасажырскія аўтобусы.

Савецкая дзяржава ўдзяляла шмат увагі аднаўленню і ахове здароўя працоўных вызваленых раёнаў краіны, ліквідацыі інфекцыйных захворванняў і ачагоў эпідэмій. Неўзабаве пасля выгнання акупантаў у Беларусь было накіравана 1200 кваліфікаваных медыкаў. Акрамя таго, прыбылі 300 урачоў, якія закончылі вузы ў 1944 годзе.

У 1944 годзе ў Мінску аднавілі работу дзве бальніцы, чатыры паліклінікі, была наладжана хуткая медыцынская дапамога. З РСФСР

цыйнымі будынкамі. На гэтай вуліцы былі створаны дзве плошчы — Цэнтральная і Перамогі. Па плану на Цэнтральнай плошчы прадугледжвалася будаўніцтва Палаца культуры прафсаюзаў. Праз Свіслач быў пабудаваны новы арачны жалезабетонны мост.

Вялікія змены адбываліся на Прывакзальнай плошчы. Тут будаваліся два адзінаццаціпавярховых будынкі, якія ўтварылі так званыя «вароты горада». Зусім новымі сталі вуліцы Леніна, Камсамольская, Захарава, Даўгабродская і многія іншыя. Дзесяткі новых вуліц, плошчаў, сквераў паявілася на ўскраінах горада (Наўгародская, Севастопальская, Валгаградская, Канстанціна Заслонава, Зоі Касмадзям'янскай, Суворава, Кутузава, Чайкоўскага, Алейная і г. д.), у раёнах, дзе разгортвалася новае прамысловае будаўніцтва (Панфілава, Даватара, Гастэлы, Рэпіна, Масквіна, Грыбаедава, Чэхава, Гвардзейская і інш.).

Работы па жыллёваму будаўніцтву і добраўпарадкаванню вяліся ва ўсіх раёнах горада. У паўднёва-ўсходняй частцы, у раёне аўтамабільнага, трактарнага і шарыкападшыпнікавага заводаў, выраслі новыя добраўпарадкаваныя пасёлкі з жылымі дамамі, палацамі культуры, стадыёнамі, паркамі, установамі аховы здароўя, навучальнымі, культурна-асветнымі і бытавымі ўстановамі. Толькі за 1950 год трактарны завод выдаткаваў на жыллёвае будаўніцтва 18,5 мільёна рублёў. Трактаразаводцы атрымалі сотні добраўпарадкаваных кватэр.

На аўтамабільным заводзе капітальныя ўкладанні ў жыллёвае будаўніцтва склалі за год 7248 тысяч рублёў, у эксплуатацыю было здадзена каля 5 тысяч квадратных метраў жылой плошчы. Шмат дамоў пабудаваў для рабочых тонкасуконны камбінат.

Аб памерах работ па добраўпарадкаванню горада можна меркаваць па наступных даных. Толькі ў 1950 годзе на добраўпарадкаванне сталіцы было адпушчана каля 20 мільёнаў рублёў, што дазволіла шырэй разгарнуць работу па асфальтаванню вуліц і плошчаў, радыёфікацыі, асвятленню і азеляненню горада. Да 1950 года было забрукавана 88 тысяч квадратных метраў вуліц, заасфальтавана звыш 34 тысяч квадратных метраў тратуараў, наладжана асвятленне вуліц агульнай працягласцю 122 кіламетры.

У адпаведнасці з планам рэканструкцыі праводзіліся велізарныя работы па азеляненню горада. Ствараліся новыя паркі, сады, скверы і значна расшыраліся старыя. Зялёныя масівы горада ўжо ў 1950 годзе займалі 285 гектараў — у чатыры разы больш, чым да вайны.

Работы па добраўпарадкаванню Мінска праходзілі пры актыўным удзеле ўсяго насельніцтва. Любоў працоўных да свайго роднага горада праяўлялася ў масавых нядзельніках, у разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за лепшае добраўпарадкаванне вуліц, двароў, плошчаў.

Шырокім фронтам ішлі работы па аднаўленню і будаўніцтву новых жылых дамоў. За перыяд акупацыі гарадскі жылы фонд быў амаль поўнасцю разбураны. Між тым хуткае аднаўленне і развіццё прамысловасці цягнула за сабой і хуткі рост колькасці гарадскога насельніцтва. На 1 студзеня 1950 года ў Мінску жыло 273,6 тысячы чалавек, хоць да моманту вызвалення горад налічваў каля 80—90 тысяч жыхароў.

Ужо да канца 1945 года было капітальна адрамантавана і адноўлена 53 тысячы квадратных метраў жылой плошчы. У 1946 годзе капітальныя ўкладанні дзяржаўных і кааператыўных арганізацый у жыллёвае будаўніцтва склалі 6,9 мільёна рублёў, было ўведзена ў дзеянне 118,2 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы. Асабліва шырокі размах набыло жыллёвае будаўніцтва ў 1948 годзе. Да гэтага часу Галоўнае ўпраўленне па аднаўленню Мінска, будаўнічыя арганізацыі горада атрымалі значную колькасць тэхнікі, папоўніліся і кадры будаўнікоў.

У 1948 годзе ўзнік новы жылы пасёлак у Чырвоным Урочышчы са шматкватэрнымі жылымі дамамі, сярэдняй школай, дзіцячым садам, рознымі культурнымі і камунальнымі ўстановамі. Вырас і новы рабочы пасёлак уздоўж Заслаўскага шасэ.

У 1950 годзе Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову аб аднаўленні і развіцці гарадской гаспадаркі і добраўпарадкаванні Мінска, намецілі шырокую праграму далейшых будаўніча-аднаўленчых работ. Пастанова паспяхова выконвалася. Толькі ў Савецкім раёне за год было здадзена ў эксплуатацыю 22 жылых дамы агульнай плошчай у 13,7 тысячы квадратных метраў. Разбіты новыя скверы на Усходняй вуліцы, на плошчы 8 Сакавіка, каля тэатра оперы і балета і г. д.

З 1 мая 1945 года па 1 студзеня 1950 года жылы фонд Мінска павялічыўся з 408,6 тысячы квадратных метраў да 1105,9.

Значнага аб'ёму работ патрабавала аднаўленне і развіццё гарадскога транспарту. У 1945 годзе было адноўлена 19,5 кіламетра трамвайнай лініі. Была здадзена ў эксплуатацыю лінія, якая злучыла пасажырскі вакзал з раёнам парка імя Чалюскінцаў.

У наладжванні работы гарадскога транспарту Мінска значную дапамогу аказалі працоўныя Масквы і Ленінграда. У 1947 годзе ленінградцы капітальна адрамантавалі для Мінска пяць маторных і пяць трамвайных прычапных вагонаў, дзве цялежкі, зрабілі да іх запасныя часткі. У сваім пісьме ў ЦК КП(б)Б работнікі ленінградскага трамвая пісалі: «Просім прыняць усё гэта для працоўных сталіцы Беларускай рэспублікі — горада Мінска. Для ўсяго нашага калектыву вялікім задавальненнем з'яўляецца тое, што сваёй сціплай працай мы дапамагаем хутчэй аднаўляць гаспадарку беларускай сталіцы».

Дзесяць маторных і дзесяць прычапных пасажырскіх трамвайных вагонаў прыслалі ў падарунак мінчанам працоўныя Масквы.

У 1950 годзе ў сталіцы ўжо налічвалася сем трамвайных маршрутаў, якія злучылі між сабой асноўныя раёны горада. Працягласць трамвайных ліній дасягнула 31,2 кіламетра, значна перавысіўшы даваенны ўзровень.

Значныя работы праводзіліся па аднаўленню і рэканструкцыі гаспадаркі сталіцы. У канцы 1947 года магутнасць вадапампавых станцый дасягала 27 700 кубічных метраў вады ў суткі, а працягласць вулічнай водаправоднай сеткі склала 106 кіламетраў. У 1950 годзе закончылася будаўніцтва водаправода ў раёне Камароўскага кальца, больш за два кіламетры водаправодных ліній было пабудавана ў раёне Чэрвеньскага тракту. Да канца года працягласць вулічнай водаправоднай сеткі склала 120,4 кіламетра.

Хутка расшыралася гандлёвая сетка Мінска. Ва ўсіх раёнах горада адкрываліся новыя прамтаварныя і прадуктовыя магазіны, ларкі і палаткі. З 1945 па 1950 год колькасць прадпрыемстваў рознічнага гандлю Мінска павялічылася з 333 да 816. За гэты ж перыяд тавараварот рознічнага гандлю павялічыўся амаль у тры разы.

Развівалася сетка грамадскага харчавання. Колькасць сталовых, рэстаранаў, чайных, буфетаў і закусачных у Мінску з 1945 па 1950 год павялічылася з 132 да 218.

З году ў год узрасталі асігнаванні на патрэбы аховы здароўя, адкрываліся новыя лячэбныя ўстановы, аснашчаныя навейшым абсталяваннем, раслі кадры медыцынскага персаналу. Калі ў 1946 годзе выдаткі на аднаўленне сеткі аховы здароўя ў горадзе склалі 18 мільёнаў рублёў, то ў 1950 годзе яны ўзраслі ўжо да 51 мільёна рублёў. У 1950 годзе ў горадзе было 14 бальніц, 70 амбулаторна-паліклінічных устаноў, 16 жаночых і дзіцячых кансультацый, у якіх працавала 1454 урачы.

Такім чынам, за гады чацвёртай пяцігодкі было шмат зроблена для паляпшэння ўмоў жыцця і быту працоўных Мінска.

У горадзе ўсё яшчэ адчуваліся цяжкія вынікі вайны і нямецка-фашысцкай акупацыі, відаць былі сляды разбурэнняў, але з кожным днём іх станавілася ўсё менш і менш. На месцы руін і папялішчаў выраслі цэлыя кварталы добраўпарадкаваных жылых дамоў. Насельніцтва Мінска ў поўнай меры адчувала на сабе клопаты Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб шчасці працоўнага народа.

РАЗДЗЕЛ XXI

МІНСК У ГАДЫ БАРАЦЬБЫ ЗА НОВЫ ЎЗДЫМ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ (1951—1958 гады)

1. Развіццё прамысловасці

Поспехі, дасягнутыя савецкім народам у гады чацвёртай пяцігодкі, падрыхтавалі спрыяльныя ўмовы для завяршэння будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне.

Пятым пяцігадовым планам, распрацаваным у адпаведнасці з дырэктывамі XIX з'езду КПСС, прадугледжваўся далейшы ўздым усіх галін народнай гаспадаркі, рост матэрыяльнага дабрабыту, аховы здароўя і культурнага ўзроўню працоўных на 1951—1955 гады. У прыватнасці, было намечана павысіць узровень прамысловай вытворчасці па краіне на 70 працэнтаў, а па Беларускай ССР — на 75—80 працэнтаў.

Адкрываліся шырокія перспектывы далейшага развіцця прамысловасці Мінска.

Разам з усімі працоўнымі краіны мінчане актыўна ўключыліся ў барацьбу за выкананне пяцігадовага плана. На ўсіх рашаючых участках знаходзіліся камуністы, кіруемыя гарадской партыйнай арганізацыяй, яны ўзнімалі працоўных на датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі. Лепшыя работнікі вытворчасці сістэматычна перавыконвалі свае нормы. Так, электразваршчык трактарнага завода М. Т. Антонік, слесар станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Н. А. Каменскіх і іншыя давалі за змену па тры — чатыры нормы. Узоры калектыўнай высокапрадукцыйнай працы паказвалі станкабудаўнікі-кіраўцы. Ліцейны цэх гэтага прадпрыемства заваяваў званне «цэха калектыўнай стаханаўскай працы». Да жніўня 1951 года на заводзе на калектыўную высокапрадукцыйную

працу перайшлі яшчэ тры цэхі, а ў наступным годзе больш палавіны калектыву былі перадавікамі вытворчасці. У 1952 годзе завод у параўнанні з 1945 годам павялічыў выпуск валавой прадукцыі амаль у 20 разоў, прадукцыйнасць працы — у 5,3 раза.

ЦК КП Беларусі адобрыў пачын кіраўцаў аб пераходзе да калектыўных форм стаханаўскай працы і прапанаваў усім партыйным, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям абмеркаваць і шырока ўкараніць вопыт іх работы на ўсіх прадпрыемствах.

Пачын кіраўцаў быў падхоплен многімі рабочымі калектывамі горада. Асабліва вялікіх поспехаў дабіліся трактаразаводцы. Ужо ў 1952 годзе на трактарным заводзе было два цэхі і 14 участкаў стаханаўскай працы. Апрача таго, рабочыя завода спаборнічалі за выпуск прадукцыі толькі выдатнай якасці. Усе цэхі прадпрыемства перайшлі на гаспадарчы разлік.

На заводзе праводзілася вялікая рацыяналізатарская работа. Толькі ў 1952 годзе было падана 1617 рацыяналізатарскіх прапаноў, а эканамічны эфект ад іх укаранення склаў звыш чатырох мільёнаў рублёў. Завод выпусціў 5097 трактараў — у шэсць з лішнім разоў больш, чым у 1951 годзе.

Выдатных поспехаў у арганізацыі высокапрадукцыйнай працы дабіліся таксама калектывы аўтамабільнага, інструментальнага заводаў і рада іншых прадпрыемстваў горада.

Самааддана працавалі работнікі чыгуначнага транспарту. Усёй краіне стала вядома імя дзяжурнага па Мінскаму аддзяленню чыгункі Паўла Суднікава, удастоенага высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. У пачатку 1951 года ён выступіў ініцыятарам укаранення комплекснага аператыўнага планавання і рэгулявання паяздной работы, што мела вялікае значэнне для забеспячэння зладжанай работы транспарту. Прэзідыум ЦК прафсаюза работнікаў чыгуначнага транспарту прыняў рашэнне аб распаўсюджанні метаду П. Суднікава. Толькі на Беларускай чыгунцы яго ўкараненне за гады пятай пяцігодкі дало некалькі мільёнаў рублёў эканоміі.

У пачатку 1952 года токар дызельнага цэха Мінскага трактарнага завода Павел Арахоўскі прапанаваў арганізаваць спаборніцтва за падоўжанне тэрміну службы інструмента на кожнай вытворчай аперацыі. Улічваючы, што 10 працэнтаў усіх матэрыяльных затрат на выпуск трактараў складалі выдаткі на інструмент, ён распрацаваў метад найбольш рацыянальнага яго выкарыстання. Гэта дало магчымасць у два з лішнім раза скараціць расход разцоў, на 20 працэнтаў павысіць прадукцыйнасць працы і атрымаць значную эканомію сродкаў, якія выдаткоўваліся на выраб інструментаў.

Трактаразаводцы першымі шырока разгарнулі спаборніцтва за эканомію інструмента на кожнай вытворчай аперацыі. У 1952 годзе

ў яго ўключылася 311 рабочых завода. Ініцыятыва наватара была адобрана і падтрымана партыйнымі, прафсаюзнымі і камсамольскімі органамі рэспублікі. ЦК ЛКСМ Беларусі прапанаваў абкомам, гаркомам і райкомам камсамола і пярвічным камсамольскім арганізацыям прадпрыемстваў разгарнуць сярод маладых рабочых масавае сацыялістычнае спаборніцтва за падоўжанне тэрміну службы інструментаў на кожнай вытворчай аперацыі, за далейшае развіццё рацыяналізацыі і вынаходніцтва.

Колькасць паслядоўнікаў Паўла Арахоўскага хутка расла. У 1952 годзе толькі на прадпрыемствах Заводскага раёна сталіцы іх налічвалася больш тысячы чалавек. Калектывы трактарнага, аўтамабільнага і веласіпеднага заводаў у 1952 годзе за кошт падоўжання тэрміну службы інструментаў сэканомілі больш двух мільёнаў рублёў.

На прадпрыемствах горада ўсё шырэй разгортвалася спаборніцтва за выпуск прадукцыі выдатнай якасці. У яго ўключыліся брыгады, цэхі, цэлыя прадпрыемствы. У ліку першых пачалі выпускаць прадукцыю толькі выдатнай якасці шакаладны цэх кандытарскай фабрыкі «Камунарка» і галантарэйная фабрыка імя Куйбышава.

Атрымоўвалі распаўсюджанне і іншыя формы сацыялістычнага спаборніцтва. У 1952 годзе на прадпрыемствах горада каля 2350 чалавек змагаліся за зніжэнне сабекошту прадукцыі на кожнай аперацыі. Яны далі 2638 тысяч рублёў эканоміі. У спаборніцтве за эканомію сыравіны, павелічэнне выхаду гатовай прадукцыі асабліва буйных поспехаў дасягнулі калектывы абутковых фабрык імя Калініна і імя Тэльмана. Тут у 1952 годзе з сэканомленага матэрыялу было выпушчана 120 тысяч пар абутку. З сэканомленай за год шэрсці калектыў Мінскага тонкасуконнага камбіната даў дадаткова дзесяткі тысяч метраў шарсцяных тканін.

Для распаўсюджання і абагульнення вопыту наватараў на заводах і фабрыках ствараліся школы перадавікоў, розныя курсы мэтавага назначэння. Толькі па аднаму Фрунзенскаму раёну Мінска ў 1951 годзе рознымі формамі вытворчай вучобы было ахоплена 2300 чалавек. На гарбарна-галантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава ўсе рабочыя займаліся тэхнічнай вучобай. Гэта ў значнай ступені станоўча адбілася на вытворчых паказчыках прадпрыемства. План 1951 года фабрыка выканала на месяц раней тэрміну і заваявала першае месца ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве прадпрыемстваў Міністэрства лёгкай прамысловасці СССР.

У першыя гады пятай пяцігодкі прамысловасць Мінска папоўнілася радам новых прадпрыемстваў. Увайшоў у строй буйны падшыпнікавы завод. За кароткі тэрмін ён стаў адным з лепшых прадпрыемстваў горада. За 1952 год завод выпусціў сотні тысяч штук падшып-

нікаў розных марак. Да сярэдзіны 1953 года ў яго цэхах працавалі сотні рабочых, у тым ліку 251 інжынерна-тэхнічны работнік.

Увайшлі ў строй заводы жалезабетонных вырабаў, ацяпляльнага абсталявання, цагельны завод № 3, хлебазавод № 3, маргарынавы завод, ЦЭЦ № 3 трактарнага завода.

Адначасова ўтваралася расшырэнне вытворчых магутнасцей дзеючых заводаў і фабрык, асвойвалася новая тэхніка і наладжвалася вытворчасць новых відаў прадукцыі. Трактаразаводцы пабудавалі і ўвялі ў дзеянне два трактарных цэхі, якія пачалі серыйны выпуск прапашнога трактара «Беларусь» і тралёвачнага трактара КТ-12, сталеліцейны і іншыя цэхі. Новы цэх цяжкіх машын пачаў дзейнічаць на аўтамабільным заводзе. Пашыраліся вытворчыя плошчы велазавода. Тут у новапабудаваным галоўным вытворчым корпусе размясціліся аўтаматны, прэсавы, механічны, зборачны, гальванічны і іншыя цэхі па выпуску веласіпедаў. Калектыў завода асвоіў выпуск матацыклаў. За 1953 год ён даў 11 542 матацыклы і 250,5 тысячы веласіпедаў. Гэта ў 3,5 раза больш, чым у 1950 годзе.

Значна павялічыліся магутнасці станкабудаўнічых прадпрыемстваў горада. Так, на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі далі прадукцыю новы ліцейны і мадэльны цэхі. На заводзе імя Кірава ўвайшоў у строй новы зборачны цэх, у выніку карэннай рэканструкцыі ўзраслі магутнасці некаторых раней пабудаваных цэхаў гэтага прадпрыемства. Калектыў завода асвоіў выпуск новых марак металаапрацоўчых станкоў.

У 1953 годзе ўступіў у строй вытворчы корпус швейнай фабрыкі імя Крупскай. Гэта дазволіла намнога павялічыць выпуск швейных вырабаў. За 1954 год фабрыка дала прадукцыі на 203,5 мільёна рублёў супраць 129,7 мільёна рублёў у 1950 годзе. Была рэканструявана і расшырана абутковая фабрыка імя Калініна. Гэта прадпрыемства разам з абутковай фабрыкай імя Тэльмана пачало выпускаць абутку больш, чым уся даваенная прамысловасць Беларусі. У некалькі разоў павялічыў выпуск прадукцыі тонкасуконны камбінат. Уступіў у строй новы хлебазавод у Заводскім раёне горада.

У 1953 годзе пачалося будаўніцтва буйнейшага ў СССР камвольнага камбіната. З розных гарадоў краіны сюды прыбывала абсталяванне. Кадры для яго рыхтаваліся на камвольных камбінатах Масквы.

З першых год пятай пяцігодкі разгарнулася работа па тэхнічнаму пераўзбраенню прамысловасці горада, па замене ўстарэлай тэхнікі новай. Найбольш значныя поспехі ў гэтай галіне былі дасягнуты на прадпрыемствах машынабудавання. Так, на аўтамабільным і трактарным заводах ужо ў пачатку 1953 года больш 60 працэнтаў вытворчых плошчаў займалі паточныя лініі, абсталяваныя спецыялізава-

нымі станкамі. У наступныя гады пяцігодкі перадавая тэхналогія з паточнай вытворчасцю дэталей і канвеернай зборкай атрымала на гэтых прадпрыемствах яшчэ больш шырокае прымяненне.

Барацьбу рабочага класа Мінска за павышэнне ўзроўню вытворчасці, за тэхнічны прагрэс і датэрміновае выкананне заданняў пятага пяцігадовага плана ўзначальвала і накіроўвала гарадская партыйная арганізацыя. У красавіку 1953 года бюро гаркома партыі прыняло рашэнне аб укараненні перадавой тэхналогіі на станкабудаўнічых заводах імя Кірава і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Прадпрыемствы горада пачалі больш шырока ўжываць ліццё па мадэлях, зробленых для гэтай мэты, а таксама халодную штампоўку, аўтаматычную зварку, тэрмічную апрацоўку дэталей токамі высокай частаты і інш. На падшыпнікавым заводзе, напрыклад, некаторыя працэсы былі поўнасцю аўтаматызаваны і створаны паточныя лініі, што дазволіла на асобных аперацыях у чатыры — пяць разоў павысіць прадукцыйнасць працы.

У ходзе барацьбы за выкананне пяцігадовага плана павышалася працоўная актыўнасць працаўнікоў горада, шырэй станавіўся іх удзел у грамадска-палітычным жыцці краіны.

30 ліпеня 1953 года працоўныя сталіцы разам з усім савецкім народам шырока адзначылі 50-годдзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Прысвечаны гэтай знамянальнай даце сход партыйнага актыву Мінска адзначыў гістарычнае значэнне II з'езду РСДРП, які паклаў пачатак заснавання бальшавіцкай партыі — арганізатара ўсіх перамог нашага народа на шляхах сацыялістычнага будаўніцтва. Сход партыйнага актыву запэўніў Цэнтральны Камітэт КПСС, што Мінская гарадская партыйная арганізацыя будзе няўхільна праводзіць у жыццё палітыку Камуністычнай партыі, умацоўваць свае сувязі з масамі, яшчэ цясней згуртоўваць камуністаў і беспартыйных вакол Цэнтральнага Камітэта КПСС.

У лютым 1954 года ў Мінску адбыўся XXI з'езд Кампартыі Беларусі. Ён падвёў вынікі дзейнасці партыйнай арганізацыі і ўсіх працоўных Беларусі за прайшоўшы пасля XX з'езду КПБ перыяд. Дзяржаўны план прамысловасці рэспублікі за 1953 год быў выканан на 103 працэнты. Пасля вераснёўскага (1953) Пленума ЦК КПСС пачаўся ўздым сельскай гаспадаркі. Адбывалася далейшае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця працоўных.

Адзначаючы поспехі ў барацьбе беларускага народа за выкананне плана пятай пяцігодкі, дэлегаты з'езду ўказвалі і на сур'ёзныя недахопы ў рабоце, у прыватнасці, якія мелі месца на радзе прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічых арганізацый беларускай сталіцы. Так, мінскія трактаразаводцы, паспяхова асвоіўшы вытворчасць лепшага ў краіне прапашнога трактара «Беларусь», не выканалі

дзяржаўнага задання па выпуску гэтых машын. Абутковая фабрыка імя Калініна вырабляла недастаткова якасны абутак. Будаўнікі зацягвалі ўвод у строй аб'ектаў камунальнай гаспадаркі.

З'езд патрабаваў ліквідаваць недахопы, паставіў перад беларускай партыйнай арганізацыяй задачу — мабілізаваць намаганні працоўных рэспублікі на датэрміновае выкананне дзяржаўнага плана 1954 года, на далейшы рост прадукцыйнасці працы.

У барацьбе за выкананне рашэнняў XXI з'езду КПБ павысілася творчая актыўнасць мінчан. Усё больш масавым і дзейсным рабілася сацыялістычнае спаборніцтва. У Заводскім раёне горада, напрыклад, у першай палавіне 1954 года налічвалася больш 10 тысяч перадавікоў вытворчасці, якія значна перавыконвалі свае вытворчыя заданні. Разнастайныя формы сацыялістычнага спаборніцтва ахоплівалі амаль усіх рабочых горада і былі накіраваны да адзінай мэты — барацьбы за паспяховае выкананне плана. Так, на машынабудаўнічых і металаапрацоўчых прадпрыемствах горада шырока ўкараняліся скарасныя метады апрацоўкі металу. У цэхах трактарнага завода да 1955 года колькасць скараснікоў узрасла да 600 чалавек. Іх выпрацоўка на токарных і фрэзерных станках у сярэднім павялічылася на 35—40 працэнтаў. На аўтазаводзе скараснікамі сталі 400 рабочых. Свідравальшчыца аднаго з цэхаў завода Ніна Камінская выступіла ініцыятарам спаборніцтва за падоўжанне тэрміну службы прыстасаванняў, што дало магчымасць адкрыць новыя, раней не выкарыстаныя рэзервы росту вытворчасці.

У 1953 годзе на прадпрыемствах Мінска атрымаў пашырэнне новы высокапрадукцыйны спосаб апрацоўкі металу — сілавое рэзанне. Першымі гэты спосаб пачалі ўжываць токары завода «Ударнік» А. В. Камінскі, Б. В. Харытонаў і Н. В. Масюкевіч, фрэзероўшчык аўтазавода А. П. Канапелька і шмат іншых. У пачатку 1955 года толькі на пяці машынабудаўнічых і станкабудаўнічых заводах Мінска на скарасных рэжымах працавала 1135 станкоў, у тым ліку 159 з іх з ужываннем сілавога рэзання. У вырашэнні многіх задач тэхнічнага прагрэсу важную ролю адыгралі рацыяналізатары і вынаходнікі, колькасць якіх на прадпрыемствах Мінска з кожным годам павялічвалася. Толькі за першую палавіну 1955 года на заводах і фабрыках было ўкаранёна 4315 прапаноў, забяспечыўшых атрыманне 10,5 мільёна рублёў умоўна-гадавой эканоміі.

Ажыццяўляючы паўсядзённае кіраўніцтва жыццём горада, сталічная партыйная арганізацыя ўмацоўвала сувязі з масамі, увесь час папаўняла свае рады за лік перадавых працаўнікоў. За перыяд з сакавіка 1951 года па 1 снежня 1955 года партыйная арганізацыя Мінска выросла з 17 535 да 21 700 камуністаў.

Надзейнымі памочнікамі камуністаў былі камсамольцы. Колькасць і авангардная роля гарадской камсамольскай арганізацыі няспынна ўзрасталі. За адзначаны вышэй перыяд камсамольская арганізацыя беларускай сталіцы вырасла з 40 374 да 70 157 членаў ЛКСМ. За гэты ж час колькасць камсамольска-маладзёжных брыгад на прадпрыемствах і будоўлях горада павялічылася з 450 да 2088. Многія з іх заваявалі ганаровае званне брыгад выдатнай якасці.

Для далейшага развіцця прамысловасці Мінска важнае значэнне мела пастанова ліпеньскага (1955) Пленума ЦК КПСС «Аб задачах па далейшаму ўздыму прамысловасці, тэхнічнаму прагрэсу і паляпшэнню арганізацыі вытворчасці». Адзначаючы значныя поспехі сацыялістычнай індустрыі, Пленум указаў і на сур'ёзныя недахопы ў рабоце прамысловасці. У радзе яе галін марудна ўкараняліся ў вытворчасць важнейшыя дасягненні навукі і тэхнікі, дрэнна выкарыстоўваліся рэзервы прамысловасці, недастатковы быў узровень механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў; меліся недахопы ў распрацоўцы і асваенні перадавой тэхналогіі вытворчасці і г. д. Пленум ЦК КПСС намеціў шырокую праграму далейшага ўздыму ўсіх галін прамысловасці на аснове дасягненняў перадавой навукі і тэхнікі.

У канцы ліпеня — пачатку жніўня 1955 года ў Мінску адбыліся рэспубліканскі, гарадскі і раённыя сходы партыйнага актыву, а таксама калектываў прадпрыемстваў, на якіх былі аднадушна адобраны рашэнні Пленума ЦК КПСС і распрацаваны меры па іх ажыццяўленню. Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі Мінска ўзмацнілі ўвагу да пытанняў тэхнічнага прагрэсу. На прадпрыемствах укаранялася ў вытворчасць перадавая тэхналогія, якая садзейнічала павышэнню прадукцыйнасці працы. Трактаразаводцы толькі за першыя два месяцы пасля ліпеньскага Пленума ЦК КПСС узнялі вытворчасць працы на 4,2 працэнта, знізілі сабекошт трактара «Беларусь». У другой палове 1955 года інструментальшчыкі завода імя Чкалава ўкаранілі спосаб халоднага выціску штампаў і прэсформ, што ў некалькі разоў паскорыла працэс іх вырабу ў параўнанні з метадамі, якія раней ужываліся шляхам слесарнай апрацоўкі. Укараненне многастаночнага абслугоўвання на гэтым прадпрыемстве павысіла прадукцыйнасць працы на 30 працэнтаў. На падшыпнікавым заводзе і іншых прадпрыемствах горада ствараліся брыгады павышэння прадукцыйнасці працы.

Значна пашырыліся сувязі вучоных з вытворчасцю. Так, супрацоўнікі Фізіка-тэхнічнага інстытута Акадэміі навук БССР распрацавалі і ўкаранілі ў вытворчасць магнітныя метады кантролю прадукцыі, электраіскравы метад апрацоўкі металу, новыя спосабы аднаўлення зношаных кузнечных штампаў шляхам іх наплаўкі легіраванай

сталлю, новую тэхналогію вырабу дэталей шляхам штампоўкі іх на прэсе з электрамагнітным нагрэвам.

Укараненне ў вытворчасць дасягненняў навукі, тэхнікі і перадавога вопыту, шырока разгарнуўшаеся сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне пятай пяцігодкі станоўча адбіліся на прадукцыйнасці працы. У 1955 годзе яна перавысіла ўзровень 1950 года на 50,2 працэнта. За кошт росту прадукцыйнасці працы ў 1951—1955 гадах на прадпрыемствах Мінска было атрымана на два мільярды рублёў прыросту прамысловай прадукцыі.

Прадпрыемствы Мінска пачалі пастаўляць прадукцыю больш чым трыццаці краінам свету. Асабліва шырокі збыт за межы нашай Радзімы знаходзілі аўтамабілі, самазвалы, трактары, металарэзныя станкі, падшыпнікі, радыёпрыборы і іншыя прамысловыя вырабы.

Пяты пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР быў перавыканан. За 1951—1955 гады наша краіна ўзняла ўзровень вытворчасці прамысловай прадукцыі на 85 працэнтаў замест 70 працэнтаў па плану. Гэта была буйная перамога партыі і народа ў барацьбе за ўмацаванне эканамічнай магутнасці Савецкай дзяржавы, за далейшы рух нашай краіны да камунізма.

У дасягненне гэтай перамогі ўнеслі свой дастойны ўклад працоўныя БССР і яе сталіцы — Мінска. План пятай пяцігодкі Беларускай рэспублікі быў выканан датэрмінова — за чатыры гады і чатыры месяцы. За 1951—1955 гады прамысловая вытворчасць узрасла па ўсёй БССР больш чым у два разы, па Мінску — амаль у тры разы. Валавая прадукцыя прамысловых прадпрыемстваў у 1955 годзе перавысіла ўзровень даваеннага 1940 года па рэспубліцы ў 2,8 раза, па Мінску — у 5,7 раза.

Асабліва буйных поспехаў дасягнула цяжкая індустрыя. У цэлым па краіне ў 1955 годзе ў параўнанні з 1950 годам вытворчасць сродкаў вытворчасці вырасла на 91 працэнт замест 80 працэнтаў па плану. У Мінску пры значным агульным павелічэнні выпуску прамысловай прадукцыі вытворчасць сродкаў вытворчасці ў 1955 годзе склала больш 66 працэнтаў усёй прамысловай прадукцыі горада. Хуткімі тэмпамі развівалася машынабудаванне. Толькі аўтамабільны і трактарны заводы Мінска ў пачатку 1956 года давалі валавой прадукцыі на 60 працэнтаў больш, чым выпускала яе ўся прамысловасць горада да вайны. Удзельная вага машынабудавання і металапрацоўкі ў агульным аб'ёме вытворчасці Мінска павялічылася з 15,4 працэнта ў 1950 годзе да 46 працэнтаў у 1955 годзе.

На аснове магутнага, пераважнага росту цяжкай індустрыі ажыццяўлялася далейшае развіццё лёгкай і харчовай прамысловасці. У цэлым па СССР вытворчасць прадметаў спажывання ў параўнанні з 1950 годам узрасла на 76 працэнтаў замест 65 па плану. Прамыс-

ловасць Мінска выпусціла ў апошнім годзе пяцігодкі тавараў народнага спажывання на суму, роўную кошту ўсёй прадукцыі прамысловасці горада за 1950 год.

Прыкметных поспехаў у вытворчасці тавараў народнага спажывання ў горадзе дасягнула мясцовая і кааператыўная прамысловасць. Мясцовая прамысловасць за гады пятай пяцігодкі павялічыла выпуск прадукцыі амаль у 3,2 раза. У 1955 годзе яна дала тавараў на 57,3 мільёна рублёў. Прамысловая кааперацыя за гэтыя ж гады павялічыла выпуск прадукцыі амаль у два разы, даўшы яе ў 1955 годзе на 304,9 мільёна рублёў.

Удзельная вага прамысловасці Мінска ў агульным уздыме прамысловай вытворчасці Беларусі павысілася з 18,5 працэнта ў 1950 годзе да 26,4 працэнта ў 1955 годзе.

Вялікай падзеяй у жыцці партыі і ўсяго савецкага народа з'явіўся XX з'езд КПСС, які адбыўся ў лютым 1956 года. З'езд зацвердзіў дырэктывы па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1956—1960 гады, прыняў рашэнне аб частковых зменах у Статуце КПСС, аб падрыхтоўцы новай Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Заслухаўшы даклад аб культе асобы і яго выніках, з'езд даручыў ЦК КПСС паслядоўна ажыццяўляць мерапрыемствы, якія забяспечваюць поўнае пераадоленне чужога марксізму-ленінізму культу асобы, ліквідацыю яго вынікаў ва ўсіх галінах партыйнай, дзяржаўнай і ідэалагічнай работы, строгае правядзенне норм партыйнага жыцця і прынцыпаў калектыўнасці партыйнага кіраўніцтва, выпрацаваных вялікім Леніным.

З'езд заклікаў усіх рабочых, калгаснікаў, савецкую інтэлігенцыю разгарнуць усенароднае сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне і перавыкананне заданняў шостага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР.

У чэрвені 1956 года адбыўся III пленум Мінскага гарадскога камітэта КПБ, які абмеркаваў пытанне аб рабоце партыйных арганізацый горада па растлумачэнню рашэнняў XX з'езду КПСС і росце вытворчай актыўнасці працоўных. Рашэнні з'езду абмяркоўваліся і былі адобраны на сходах пярвічных партыйных арганізацый, на гарадскім і раённых партактывах, у калектывах працоўных. Больш 15 тысяч агітатараў і дакладчыкаў праводзілі гутаркі, выступалі перад працоўнымі з дакладамі па матэрыялах з'езду. У вышэйшых навучальных установах і навукова-даследчых інстытутах адбыліся навуковыя сесіі.

Агітацыйна-прапагандысцкая работа партыі сярод працоўных горада садзейнічала росту іх не толькі палітычнай, але і вытворчай актыўнасці. На прадпрыемствах шырылася спаборніцтва за выпуск

прадукцыі выдатнай якасці, за эканомію сыравіны, матэрыялаў і электраэнергіі. У 1956 годзе на камвольным камбінаце, напрыклад, за званне калектываў выдатнай якасці прадукцыі спаборнічала 95 брыгад, 62 з іх заваявалі гэта ганаровае званне. Паспяхова ўкараняласа навейшая тэхналогія. У радзе цэхаў былі адкрыты школы перадавых метадаў працы, дзе навучалася 220 чалавек. Група работнікаў у мэтах вывучэння перадавога вопыту выязджала на падобныя прадпрыемствы Масквы.

Высокая творчая актыўнасць садзейнічала паспяховаму выкананню планавых заданняў вытворчымі калектывамі. Так, план першых пяці месяцаў 1956 года прамысловасць горада выканала па выпуску валавой прадукцыі на 103,2 працэнта і дала больш чым на 64 мільёны рублёў звышпланавай прадукцыі. На працягу 1956 года ўступілі ў строй такія буйныя прадпрыемствы, як завод запасных частак, хлебазавод № 4 і паліграфкамбінат, былі расшыраны вытворчыя магутнасці і павялічыўся выпуск прадукцыі рада дзеючых заводаў і фабрык. Аб'ём прамысловай вытворчасці прадпрыемстваў горада павялічыўся за год на 21 працэнт.

У пачатку 1957 года калектывы заводаў імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, мотавеласіпеднага, падшыпнікавага і гіпсавага, абутковай фабрыкі імя Калініна і іншых прадпрыемстваў горада звярнуліся да ўсіх работнікаў прамысловасці, будаўніцтва і транспарту рэспублікі з заклікам пачаць барацьбу за выкананне і перавыкананне вытворчых заданняў у гонар 40-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Зварот знайшоў шырокі водгук сярод рабочых беларускай сталіцы. У сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 40-гадавога юбілею Вялікага Кастрычніка ў ліку першых уключыўся завод «Ударнік». Змагаючыся за выкананне гэтых абавязацельстваў, калектыў завода ўжо ў першым і другім кварталах 1957 года выйшаў пераможцам у спаборніцтве прадпрыемстваў Савецкага раёна і быў занесены на гарадскую Дошку гонару. Паспяхова працавалі чыгуначнікі Мінска. Напрыклад, калектыў паравознага дэпо вырашыў да 40-годдзя Кастрычніка значна паскорыць сярэднесутачны прабег лакаматываў, перавезці звыш нормы не менш 500 тысяч тон грузу. Камуністы Н. Я. Баранаў, Д. Б. Саладкоў, І. Я. Жукаў, М. К. Шаўцоў, В. А. Каралевіч і іншыя з'явіліся ініцыятарамі барацьбы за поўнае выкарыстанне цягавай сілы паравоза. У дэпо была створана калона паравозаў імя 40-й гадавіны Вялікага Кастрычніка, якую ўзначаліў камуніст Дзмітрый Саладкоў. Шырока ўкараняючы перадавыя метады выкарыстання цягавай сілы лакаматываў, паравознікі да верасня 1957 года паспяхова выканалі свае абавязацельствы, правялі 3661 цяжкавагавы поезд, перавезлі звыш нормы 834 тысячы тон грузаў.

Адной з эфектыўных форм творчай актыўнасці працоўных Мінска, як і ў гады чацвёртай пяцігодкі, працягваў заставацца рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Адчувальны ўклад у рашэнне задач тэхнічнага прагрэсу і павышэнне прадукцыйнасці працы ўносілі рацыяналізатары мотавелазавода і камвольнага камбіната. У 1957 годзе на мотавелазаводзе налічвалася 492 рацыяналізатары, якія ўнеслі за год 1098 прапаноў. За гэты ж тэрмін было ўкаранёна 556 прапаноў з умоўна-гадавой эканоміяй у 2746,4 тысячы рублёў. На камвольным камбінаце на працягу года рацыяналізатары ўнеслі 207 прапаноў, якія дазволілі ўдасканаліць многія вытворчыя працэсы і ўзняць прадукцыйнасць працы. Сярод найбольш актыўных рацыяналізатараў былі майстры А. Ф. Лапуноў, начальнік ЦРМ В. І. Мацецкі, начальнік часальнага цэха І. А. Палякоў і рамантыроўшчык В. А. Касач. Творчую думку калектыву накіроўваў тэхнічны савет камбіната.

Усяго за 1957 год на прадпрыемствах Мінска было ўнесена больш 9 тысяч вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў. Іх эканамічны эфект склаў 37,5 мільёна рублёў.

Росту прадукцыйнасці працы і тэхнічнаму прагрэсу ў прамысловасці і транспарце садзейнічала тэхнічнае навучанне рабочых кадраў, авалоданне імі вопытам перадавікоў і наватараў вытворчасці. Асноўнай формай падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых, як і ў ранейшыя гады, з'явіліся прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. У Мінску былі адкрыты першыя тэхнічныя вучылішчы, што разлічваліся на прафесіянальную падрыхтоўку моладзі, якая скончыла сярэднія агульнаадукацыйныя школы. Гэтыя вучылішчы рыхтавалі рабочых высокай кваліфікацыі, здольных абслугоўваць складаную сучасную тэхніку, валодаючых па сваёй спецыяльнасці тэарэтычнымі ведамі. У лістападзе 1954 года на базе Мінскага трактарнага завода было створана тэхнічнае вучылішча па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных токараў-універсалаў, слесараў па зборцы машын, слесараў-рамонтнікаў, электраслесараў па мантажу і рамонту прамэлектраабсталявання, наладчыкаў такарных аўтаматаў і паўаўтаматаў, фармоўшчыкаў-ліцейшчыкаў, малодшага тэхнічнага персаналу і г. д. За чатыры гады вучылішча выпусціла 1345 рабочых.

Высокакваліфікаваныя кадры для прадпрыемстваў рыхтавала тэхнічнае вучылішча № 9, створанае ў 1955 годзе на базе рамеснага вучылішча пры Мінскім аўтамабільным заводзе. Да 1958 года яно выпусціла 500 токараў і фрэзероўшчыкаў па металу, слесараў па зборцы прамысловай прадукцыі і рамонту прамысловага абсталявання, фармоўшчыкаў-ліцейшчыкаў, электразваршчыкаў, механікаў аўтамабільнага транспарту для сельскай гаспадаркі. Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых праводзілася таксама непасрэдна на прадпрыемствах і будоўлях. Толькі на аўтамабільным заводзе ў 1951—

1958 гадах павышалі вытворчую кваліфікацыю тысячы чалавек. За 1956—1958 гады былі павышаны разрады 967 рабочым, якія скончылі вытворча-тэхнічныя курсы. Павысілі сваю кваліфікацыю 333 інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя.

Перападрыхтоўка кадраў на прадпрыемствах ажыццяўлялася ў цеснай сувязі з выкананнем імі вытворчых праграм, з рашэннем задач па ўкараненню новай тэхнікі і перадавой тэхналогіі, асваеннем новых відаў прадукцыі. Напрыклад, у 1957 годзе перад калектывам падшыпнікавага завода была пастаўлена задача — рэзка павялічыць выпуск прадукцыі, асвоіць выраб новых відаў падшыпнікаў. Для гэтага трэба было за кароткі тэрмін і без адрыву ад вытворчасці абучыць значную колькасць шліфавальшчыкаў, зборшчыкаў, наладчыкаў, рабочых іншых прафесій. На прадпрыемстве была створана шырокая сетка курсаў павышэння кваліфікацыі. Каля 700 рабочых навучалася пад кіраўніцтвам вопытных майстроў. З дапамогай маскоўскіх наватараў вытворчасці Арбатава і Кірухінай на карданным участку завода была арганізавана школа па вывучэнню перадавых метадаў працы шліфавальшчыкаў. Апрача гэтага, звыш 100 чалавек вучыліся завочна ў вышэйшых і сярэдніх тэхнічных навучальных установах, 250 рабочых, майстроў і начальнікаў змен — у вячэрніх школах рабочай моладзі.

На мотавеласіпедным заводзе ў 1958 годзе ў школах па вывучэнню перадавых метадаў працы, шляхам навучання другім прафесіям, на курсах мэтавага прызначэння і на вытворчых тэхнічных курсах 410 рабочых абучаліся новым прафесіям, 929 павысілі кваліфікацыю. У ВНУ, тэхнікумах і школах рабочай моладзі навучалася без адрыву ад вытворчасці 409 рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых. Усяго за 1958 год на прадпрыемствах Мінска новым прафесіям было навучана 15,7 тысячы і павысіла кваліфікацыю 36,5 тысячы рабочых і служачых. Апрача таго, 1,2 тысячы кваліфікаваных рабочых падрыхтавалі прафесіянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. У параўнанні з 1950 годам колькасць кадраў, якія павысілі кваліфікацыю, павялічылася ў 2,6 раза.

Важныя мерапрыемствы, што былі накіраваны на павышэнне культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, праводзіліся і па лініі Рэспубліканскага Дома тэхнікі, арганізаванага ў Мінску ў 1953 годзе. У мэтах прапаганды новай тэхнікі ў ім у 1954 годзе была наладжана выстаўка, якая адлюстравала дасягненні прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі. На ёй было прадстаўлена звыш тысячы экспанатаў дваццаці заводаў і фабрык Беларусі. За 1954—1958 гады Дом тэхнікі арганізаваў каля 2,5 тысячы дакладаў на розныя навукова-тэхнічныя тэмы. У рабоце Дома тэхнікі прымалі актыўны ўдзел вядомыя вучоныя і спецыялісты:

акадэмік Б. І. Сцяпанаў, прафесар Э. Х. Адэльскі, кандыдаты тэхнічных навук Н. А. Юркштовіч, В. А. Бірукоў і І. Ф. Валошын. Яны неаднаразова выступалі перад рабочымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі з дакладамі аб выніках сваіх навуковых даследаванняў. Непасрэдна на прадпрыемствах праводзіліся семінары, «дні навацараў» і «дні абмену вопытам».

Значнае месца ў рабоце па павышэнню культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочых займала друкаваная прапаганда, на прадпрыемствах ажыццяўлялася выданне лістовак навацараў і інфармацыйных бюлетэняў. Лекцыі і брашуры з апісаннем перадавога вытворчага вопыту выдаваліся Домам тэхнікі і таварыствам «Веды». Арганізоўваліся экскурсіі рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў на прадпрыемствы рэспублікі і за яе межы — у Маскву, Ленінград, Кіеў і іншыя гарады.

У 1957 годзе ў СССР была ажыццёўлена перабудова ўпраўлення прамысловасцю і будаўніцтвам па тэрытарыяльнаму прынцыпу. У найбольш буйных эканамічных раёнах краіны былі створаны Саветы народнай гаспадаркі.

У маі 1957 года адбылася пятая сесія Вярхоўнага Савета БССР, якая прыняла Закон «Аб далейшым удасканаленні арганізацыі ўпраўлення прамысловасцю і будаўніцтвам у Беларускай ССР». У Мінску быў створан Савет народнай гаспадаркі Беларускага эканамічнага раёна, у веданне якога перайшло 835 найбольш буйных прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі.

Партыйныя арганізацыі горада праводзілі вялікую масава-выхаваўчую работу, накіраваную на павышэнне камуністычнай свядомасці працоўных, мабілізацыю іх творчых сіл на выкананне вытворчых заданняў. У павышэнні ідэйна-палітычнага ўзроўню мінчан важную ролю адыгрывалі перыядычны друк, радыё, кіно.

Асабліва вялікую ўвагу надавала партыйная арганізацыя горада выхаваўчай рабоце сярод моладзі. На прадпрыемствах прамысловасці, транспарту і будоўлях працавала больш 35 тысяч юнакоў і дзяўчат, звыш 1,5 тысячы камсамольска-маладзёжных брыгад, участкаў і змен. Большасць маладых рабочых перавыконвалі нормы выпрацоўкі, звыш трох тысяч чалавек удзельнічалі ў рацыяналізацыі вытворчасці і вынаходніцтве. На радзе заводаў і фабрык былі створаны камсамольскія пасты і рэйдавыя брыгады, якія змагаліся за рытмічную работу прадпрыемстваў, за ахову сацыялістычнай уласнасці. Тысячы маладых людзей працавалі ў сферы абслугоўвання, навучаліся ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах горада.

У сакавіку 1957 года адбыўся пленум гарадскога камітэта партыі, які абмеркаваў пытанне аб стане і мерах паляпшэння выхаваўчай

работы сярод камсамольцаў і моладзі горада, вызначыў задачы партыйных і камсамольскіх арганізацый горада.

Развіццё савецкай дэмакратыі на аснове рашэнняў XX з'езду КПСС аказвала дабратворны ўплыў на павышэнне грамадска-палітычнай актыўнасці працоўных Мінска, іх ролі ў дзяржаўных справах і кіраўніцтве вытворчасцю. Сотні перадавых рабочых і служачых вялі работу ў якасці дэпутатаў Саветаў, выбіраліся ў склад кіруючых партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх органаў. Важнай школай камуністычнага выхавання працоўных, сродкам прыцягнення іх да кіравання вытворчасцю з'явіліся створаныя ў 1957 годзе пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады.

Пад кіраўніцтвам партыі актывізавалася дзейнасць прафсаюзаў Мінска. Яны арганізоўвалі і кіравалі сацыялістычным спаборніцтвам, праводзілі сярод рабочых і служачых культурна-асветную работу, ажыццяўлялі мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне ўмоў іх працы і быту.

Адбыўшаяся ў студзені 1958 года XVI Мінская гарадская партыйная канферэнцыя адзначыла значныя дасягненні рабочага класа ў развіцці прамысловасці горада. За год аб'ём прамысловай вытворчасці сталіцы ўзрос на 18 працэнтаў, былі перавыкананы заданні па росту прадукцыйнасці працы і зніжэнню сабекошту прадукцыі. Прадпрыемствы толькі звыш плана далі на 395 мільёнаў рублёў розных відаў вырабаў.

У 1958 годзе на прадпрыемствах і будоўлях Мінска разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXI з'езду КПСС і 40-годдзя ўтварэння Беларускай ССР. Ініцыятарам спаборніцтва выступіў калектыў аўтамабільнага завода. Аўтазаводцы абавязаліся датэрмінова выканаць дзяржаўны план 1958 года, даць на 12 мільёнаў рублёў звышпланавай прадукцыі, павысіць прадукцыйнасць працы на 1,5 працэнта, знізіць страты ад браку на 30 працэнтаў і г. д.

ЦК Кампартыі Беларусі адобрыў патрыятычны пачын калектыву аўтазавода. Ініцыятыву аўтазаводцаў падтрымалі рабочыя і служачыя трактарнага завода, мотавелазавода, станкабудаўнічага завода імя Кірава і іншых прадпрыемстваў. Трактарабудаўнікі абавязаліся датэрмінова выканаць дзяржаўны план і выпусціць звыш плана прадукцыі на 17 мільёнаў рублёў. 6 мая трактаразаводцы выпусцілі свой стотысячны трактар. Калектыў асвоіў вытворчасць новых удасканаленых марак трактараў МТЗ-5.

У авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 40-годдзя БССР ішлі камуністы і камсамольцы, якія паказалі шматлікія прыклады высокапрадукцыйнай творчай працы. На 1 студзеня 1959 года ў Мінску налічвалася 27 782 камуністы, аб'яднаных у 781 пярвіч-

ную партыйную арганізацыю, і 74 747 камсамольцаў. 7662 члены партыі працавалі ў прамысловасці, 2064 — на транспарце, 1468 — на будаўніцтве, 1003 — у гандлі і грамадскім харчаванні, 2373 — у сістэме народнай асветы, ВНУ і навуковых установах і г. д. У параўнанні з 1946 годам (на 1 студзеня) колькасць гарадской партыйнай арганізацыі павялічылася больш чым у чатыры разы.

Узоры высокапрадукцыйнай працы паказваў знатны сталявар Д. І. Барашкін, які працаваў на заводзе з першых дзён яго заснавання. У дасканаласці авалодаўшы майстэрствам сталеварэння, ён значна павялічыў колькасць плавак за змену, сэканоміў за першае паўгоддзе 1958 года 160 тысяч кілават-гадзін электраэнергіі, якой хапіла б на вытворчасць 50 плавак. За поспехі ў працы Урад СССР узнагародзіў наватара ордэнам Леніна.

На працоўнай вахце ў гонар 40-годдзя БССР значных поспехаў дасягнулі будаўнікі Мінска. У жніўні 1958 года многія з іх былі ўдастоены ўрадавых узнагарод. Брыгадзіру муляроў Д. Г. Булахаву, брыгадзіру комплекснай брыгады М. К. Макарэвіч і бульдазерысту С. М. Місунову было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Прамысловасць Мінска ішла па шляху няўхільнага ўздыму. План першага паўгоддзя 1958 года па выпуску валавой прадукцыі яна выканала на 105 працэнтаў. У параўнанні з гэтым перыядам 1957 года аб'ём вытворчасці павялічыўся на 17 працэнтаў. Да пачатку кастрычніка 1958 года ўжо 20 тысяч рабочых горада датэрмінова выканалі свае гадавыя планы і пачалі працаваць у лік наступнага года.

У канцы 1958 года па пачыну маладых рабочых дэпо Масква — Сартыровачная ў Мінску разгортваецца рух брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы. Галоўнай асаблівасцю гэтай новай вышэйшай формы сацыялістычнага спаборніцтва з'яўлялася арганічнае спалучэнне барацьбы за дасягненне найвышэйшай прадукцыйнасці працы, выхаванне новага чалавека, фарміраванне ў яго камуністычных вытворчых адносін.

Адным з першых у гэты рух уключыліся комплексная брыгада будаўнікоў УНР-12 будаўнічага трэста № 4, якую ўзначальваў камуніст Аркадзь Дзігілевіч, камсамольска-маладзёжная брыгада завода аўтаматычных ліній Н. П. Галавачова, брыгада прадзільшчыц тонкасуконнага камбіната на чале з Сілівестрам Лучкіным. Калектыў комплекснай брыгады будаўнікоў, налічваўшай 24 чалавекі, узяў абавязацельства ўзняць прадукцыйнасць працы ў параўнанні з 1958 годам не менш чым на 15—20 працэнтаў, значна павысіць дзённую выпрацоўку, сэканоміць да канца года тры тысячы рублёў, а ў 1959 годзе — не менш 20 тысяч рублёў. Будаўнікі паставілі задачу — няспынна павышаць ідэйны, агульнаадукацыйны і культурны ўзровень членаў брыгады, умацоўваць дружбу ў калектыве.

На трактарным заводзе ініцыятарам руху за камуністычныя адно-сіны да працы выступіла брыгада абрубшчыкаў чыгуна ліцейнага цэ-ха, якую ўзначальваў В. Гаўрыловіч. Ініцыятыву перадавых рабочых падтрымаў партком завода, заводскі камітэт прафсаюза і камітэт камсамола. Следуючы прыкладу брыгады Гаўрыловіча, у спаборніцтва за камуністычную працу ўступілі брыгады Міхаіла Будая, Эдуарда Куліка і іншыя. Да канца 1958 года ў спаборніцтве ўжо ўдзельнічала 18 участкаў і брыгад завода.

У спаборніцтва за камуністычную працу ўключыўся і калектыў падшыпнікавага завода. Прадукцыя гэтага прадпрыемства адгружа-лася ў дзве тысячы адрасоў, у тым ліку 102 саюзнаргасам, 121 кан-торы галоўаўтатрактаразбыту, у 12 дэмакратычных і 9 капіталістыч-ных краін. Калектыў прадпрыемства спаборнічаў з Мінскім мотаве-ласіпедным і Гомельскім падшыпнікавым заводамі. Па выніках рэспубліканскага спаборніцтва ў першым квартале 1958 года заводу было прысуджана другое месца, а ў другім квартале — першае месца і пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў БССР і Беларускага рэс-публіканскага савета прафсаюзаў. Асноўным метадам барацьбы ка-лектыву падшыпнікавага завода за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі з'явілася сацыялістычнае спаборніцтва. На яго аснове і разгарнуўся на прадпрыемстве рух за камуністычную працу, у які ўжо да канца 1958 года ўключылася 15 брыгад. Па выніках работы за 1958 год на першае месца ў спаборніцтве выйшаў цэх ролікавых падшыпнікаў, якому неаднаразова прысуджаўся пераходны Чырвоны сцяг. Пераможцамі ў спаборніцтве сталі 50 зменных майстроў, 500 ра-бочым было прысвоена званне «Лепшы рабочы па прафесіі». Сярод іх былі наладчык Н. В. Ніжіцін, шліфавальшчыца А. Т. Бурая, сле-сары І. І. Пуч, Я. Д. Крукавер, канструктар В. Н. Пагадаеў і іншыя.

16 снежня 1958 года адбыўся пленум Мінскага гаркома партыі, які абмеркаваў пытанне аб выкананні сацыялістычных абавязацель-стваў, узятых вытворчымі калектывамі горада ў гонар XXI з'езду КПСС. К гэтаму часу на прадпрыемствах і будоўлях сталіцы больш 200 брыгад, вытворчых участкаў, змен і цэхаў уключыліся ў спабор-ніцтва за права называцца калектывамі камуністычнай працы. За дзесяць месяцаў 1958 года заводы і фабрыкі Мінска асвоілі 227 но-вых відаў прадукцыі, укаранілі ў вытворчасць 9337 рацыяналізатар-скіх прапаноў з умоўным эканамічным эфектам у 54,9 мільёна руб-лёў у год.

У 1958 годзе ўступілі ў строй завод аўтаматычных ліній і кам-бінат буйнаблочных будаўнічых матэрыялаў, на многіх прадпрыем-ствах пачалі працаваць новыя цэхі. Прамысловасць горада датэрмі-нова, да 15 снежня, выканала гадавы вытворчы план. Капіталаўкла-

данні ў прамысловасць за гэты год склалі 126,2 мільёна рублёў і былі найвышэйшымі за ўсе пасляваенныя гады.

1 студзеня 1959 года беларускі народ урачыста адзначыў 40-годдзе БССР і Камуністычнай партыі Беларусі. Напярэдадні юбілею Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за поспехі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве ўзнагародзіў Беларусь вышэйшай у краіне ўзнагародаі — ордэнам Леніна. З выпадку юбілею ў Мінску адбылося ўрачыстае пасяджэнне Вярхоўнага Савета БССР і Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі сумесна з прадстаўнікамі працоўных рэспублікі.

На аснове ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, дружбы і брацкага супрацоўніцтва народаў Беларусь зрабіла вялікі скачок у сваім развіцці. У 1958 годзе аб'ём яе прамысловай вытворчасці павялічыўся ў параўнанні з 1913 годам у 27 разоў. У рэспубліцы была створана магутная энергетычная база, развітае машынабудаванне і будаўнічая індустрыя, значнага ўзроўню дасягнула лёгкая, харчовая і дрэваапрацоўчая прамысловасць. На долю Беларусі прыходзілася 12 працэнтаў агульнасаюзнай вытворчасці трактараў, 11 працэнтаў металарэжучых станкоў, 9 працэнтаў матацыклаў. Далёка наперад зрабіла крок сельская гаспадарка. У 1958 годзе пасяўныя плошчы Беларусі амаль на мільён гектараў перавысілі дарэвалюцыйны ўзровень. На палях калгасаў і саўгасаў працавала 52 тысячы трактараў, 11 тысяч збожжавых камбайнаў і дзесяткі тысяч іншых сельскагаспадарчых машын. Павысіўся ўзровень матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

Працоўныя Мінска таксама прыйшлі да 40-годдзя рэспублікі з вялікімі дасягненнямі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. У 1958 годзе ў параўнанні з 1950 годам аб'ём валавой прамысловай прадукцыі горада павялічыўся ў 4,8 раза і ў 9,4 раза перавысіў даваенны ўзровень.

Высокія тэмпы развіцця прамысловасці Мінска забяспечваліся асваеннем буйных капітальных укладанняў, якія з году ў год павялічваліся. За восем год (1951—1958) яны склалі 724,9 мільёна рублёў, у тым ліку 381 мільён рублёў за гады пятай пяцігодкі. У прамысловай вытворчасці горада вядучая роля належала буйной прамысловасці.

Асабліва хутка расла машынабудаўнічая і металаапрацоўчая прамысловасць. Аб'ём яе вытворчасці ў 1958 годзе склаў 46,3 працэнта ўсёй валавой прадукцыі горада, яна мела 57,9 працэнта асноўных прамыслова-вытворчых фондаў і 59,8 працэнта прамысловых рабочых. За год машынабудаўнічыя заводы сталіцы далі 26 тысяч трактараў і на 13 022 тысячы рублёў запасных частак да іх, тысячы аўтамабіляў, 38 017 матацыклаў, 565,4 тысячы веласіпедаў, 10 410 тэ-

левізараў, 105 894 радыёлы, 448 тысяч наручных гадзіннікаў і г. д.

Сведчаннем вялікіх поспехаў індустрыяльнага развіцця Мінска з'яўляліся яго эканамічныя сувязі з зарубежнымі дзяржавамі і перш за ўсё з краінамі народнай дэмакратыі. За пасляваенныя гады, і асабліва ў 1951—1958 гадах, Мінск стаў буйным экспарцёрам прамысловай прадукцыі. У вялікай колькасці вывозіліся ў зарубежныя краіны трактары, аўтамабілі, металарэжучыя станкі, гадзіннікі, інструменты і другія вырабы. Прадукцыя прадпрыемстваў беларускай сталіцы атрымала высокую ацэнку спажыўцоў за мяжой. Напярэдадні 40-й гадавіны Вялікага Кастрычніка рабочыя румынскага прадпрыемства «Ісар» пісалі калектыву Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава: «Папярэчна-стругальныя станкі мадэлі 736, выраблены на вашым заводзе, аказалі нам неацэнную дапамогу ў рабоце. Гэтыя дасканалыя станкі, беззаганныя, высокапрадукцыйныя і трывалыя».

Уздым прамысловасці і ўсёй гарадской гаспадаркі быў непарыўна звязан з расшырэннем энергетычнай базы Мінска. За кошт уводу ў строй новых сілавых установак і агрэгатаў магутнасць электрастанцый горада значна павялічылася. У 1958 годзе яны далі 904 мільёны кілават-гадзін электраэнергіі, павялічыўшы яе выпрацоўку за восем год амаль у 4,3 раза, а ў параўнанні з даваенным узроўнем — у 11 разоў.

Далейшае развіццё атрымалі прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, асвоіўшая вытворчасць жалезабетонных вырабаў, сухая гіпсавая тынкоўка, выраб мінеральнай ваты і іншых. На асобных прадпрыемствах гэтай галіны былі зроблены значныя рэканструкцыйныя работы, устаноўлена новая тэхніка, механізаваны і электрыфікаваны шмат якія вытворчыя працэсы і аперацыі. За 1958 год было выраблена 227,9 мільёна штук цэглы, 100,4 тысячы тон гіпсу, 236,2 тысячы кубічных метраў жалезабетонных вырабаў, 126 тысяч кубічных метраў мінеральнай ваты і рад іншых матэрыялаў. У параўнанні з 1950 годам аб'ём вытворчасці цэглы ўзрос амаль удвая, гіпсу — у 2,4 раза, жалезабетонных вырабаў (за тры гады) — амаль у чатыры разы, толю дахавага — утрая.

Няўхільна развіваліся таксама лёгкая і харчовая прамысловасць Мінска, якая спецыялізавалася на выпуску шырокага асартыменту тавараў масавага спажывання. На долю гэтых галін прыходзілася 39,4 працэнта ўсёй валавой прадукцыі горада і 24,8 працэнта прамысловых рабочых. Асабліва павялічылі выпуск прадукцыі абутковая фабрыка імя Тэльмана, фарфора-фаянсавы завод, мясакамбінат, кандытарская фабрыка «Камунарка», гарбарны завод «Бальшавік». У 1958 годзе прадпрыемствы сталіцы далі 2016 тысяч пагонных метраў шарсцяных тканін, 7710 тысяч пар скуранога абутку, адзін

мільён штук трыкатажу для бялізны, 14,2 тысячы тон мяса (прамысловая выпрацоўка), 16,2 тысячы тон маргарынавай прадукцыі, 109,6 тысячы тон хлеба і хлебабулачных вырабаў, 64 112 тон цэльнамалочнай прадукцыі і г. д. За прайшоўшыя пасляваенныя гады прадукцыя лёгкай і харчовай прамысловасці Мінска павялічылася ў некалькі разоў.

Разам з ростам прамысловасці павялічылася колькасць рабочага класа і ўсяго насельніцтва Мінска. Паводле даных перапісу на 1 студзеня 1959 года, у горадзе пражывала 509,5 тысячы чалавек, удвая больш, чым да вайны. У 1958 годзе налічвалася 246,4 тысячы рабочых і служачых. За пасляваенныя гады колькасць прамыслова-вытворчага персаналу выросла ў 12 разоў і ўтрая перавысіла даваенны ўзровень. У прамысловасці і гарадской гаспадарцы на 1 снежня 1957 года працавала 35,9 тысячы спецыялістаў, у тым ліку 6,3 тысячы інжынераў і 8,1 тысячы тэхнікаў. Толькі ў параўнанні з 1954 годам колькасць інжынераў і тэхнікаў узрасла амаль удвая.

1951—1958 гады з'явіліся перыядам далейшага індустрыяльнага росту Мінска, пераважнага развіцця яго буйной прамысловасці і асабліва машынабудавання і металаапрацоўкі. Рабочы клас беларускай сталіцы ўнёс дастойны ўклад ва ўмацаванне індустрыяльнай магутнасці краіны, у справу завяршэння будаўніцтва сацыялізма ў СССР.

2. Далейшае развіццё гарадской гаспадаркі і павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных

На працягу 1951—1958 гадоў былі праведзены значныя работы па забудове і далейшаму ўпарадкаванню Мінска. Сума капіталаўкладанняў у гарадскую гаспадарку за гэты перыяд склала 724,9 мільёна рублёў. У гэтыя гады працягваліся вялікія работы па рэканструкцыі і застройцы цэнтральнай часткі горада, якая вызначыла архітэктурна-мастацкае аблічча Мінска. Цэнтральны праспект горада — Ленінскі — стаў лепшым упарадкаваным яго раёнам. Суадносіны паміж вышынёй будынкаў і шырынёй яго такія ж, як на асобных участках Неўскага праспекта ў Ленінградзе. На цэнтральнай частцы праспекта з'явіліся такія манументальныя збудаванні, як Галоўны паштамт, гасцініца «Мінск» і два васьміпавярховых дамы на перакрыжаванні Ленінскага праспекта і вуліцы Янкі Купалы.

На Цэнтральнай плошчы былі пабудаваны Палац прафсаюзаў, вялікі жылы дом, будынак аблвыканкома і Цэнтральнага тэлеграфа.

У 1951—1958 гадах закончыліся работы па забудове часткі праспекта ад вуліцы Янкі Купалы да Даўгабродскай, а таксама плошчы

Перамогі, на якой у памяць аб воінах Савецкай Арміі і партызанах, якія аддалі сваё жыццё ў баях за вызваленне Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, быў збудаваны 38-мятровы помнік-абеліск, увянчаны ордэнам Перамогі. На Ленінскім праспекце і сумежных да яго вуліцах з'явіліся манументальныя будынкі грамадскага прызначэння і жылыя дамы.

Ажурная вежа пабудаванага і ўведзенага ў эксплуатацыю Мінскага тэлецэнтра арганічна ўпісалася ў сілуэт горада і ўпрыгожыла яго.

Пачаліся работы па рэканструкцыі Ленінскага праспекта на ўчастку ад плошчы Якуба Коласа да парку імя Чалюскінцаў. Нанава быў перабудаваны раён Камароўкі. На месцы старых драўляных хат узнікла прамавугольная плошча з вялікім скверам. Трамвайныя лініі з Ленінскага праспекта былі перанесены на вуліцу Якуба Коласа, якая зрабілася буйнейшай транспартнай магістраллю Мінска ў гэтым раёне.

Новай забудове і карэннай перабудове падвяргаліся і іншыя вуліцы і раёны сталіцы. Было завершана будаўніцтва многіх адміністрацыйных памяшканняў: ЦК ЛКСМБ, Мінскага абкома КПБ, Інстытута народнай гаспадаркі, Мінскага аэрапарта і інш. Працягвалася забудова буйных жылых раёнаў аўтамабільнага, шарыкападшыпнікавага, трактарнага, веласіпеднага заводаў і завода запчастак. Вялікія работы былі зроблены ў раёне Магілёўскай магістральнай шашы, якая стала цэнтральнай магістраллю ўсходняй часткі Мінска.

Дасягнуты значныя поспехі ў жыллёвым будаўніцтве. Аб'ём дзяржаўных капіталаўкладанняў ў жыллёвае будаўніцтва Мінска з кожным годам павялічваўся. Калі ў 1951 годзе сума капіталаўкладанняў у яго склала 15,2 мільёна рублёў, то ў 1958 годзе яна дасягнула 38,8 мільёна рублёў. Усяго за 1951—1958 гады на жыллёвае будаўніцтва Мінска было выдаткавана 203,7 мільёна рублёў.

Вялікае значэнне ў паляпшэнні якасці і зніжэнні кошту будаўніцтва мела пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 4 лістапада 1955 года «Аб устараненні празмернасцей у праектаванні і будаўніцтве».

Крытыка ў адрас архітэктараў і праектыроўшчыкаў мела станоўчыя вынікі. Сродкі, якія адпускаліся на жыллёвае будаўніцтва, пачалі скарыстоўвацца больш эфектыўна. Ужо ў 1956 годзе ў Мінску толькі за кошт спрашчэння і падзешаўлення архітэктурных праектаў новых будынкаў была дасягнута эканомія ў 10 мільёнаў рублёў. Будаўнічыя арганізацыі пачалі больш актыўна змагацца за павышэнне якасці і зніжэнне кошту жылля. Узрасло ўжыванне тыповых праектаў у жыллёвым будаўніцтве, хоць і ў 1957—1958 гадах каля палавіны жылых дамоў яшчэ будаваліся па індывідуальных праектах.

Асабліва вялікае значэнне ў справе разгортвання жыллёвага будаўніцтва мела прынятая ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР 31 ліпеня 1957 года пастанова «Аб развіцці жыллёвага будаўніцтва ў СССР» і пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 20 ліста-пада 1957 года «Аб развіцці жыллёвага будаўніцтва ў Беларускай ССР». У гэтых пастановах вызначаліся шляхі вырашэння жыллёвай праблемы, указвалася на неабходнасць пераходу да будаўніцтва дамоў з добраўпарадкаванымі кватэрамі на адну сям'ю, выкарыстан-ня ў будаўніцтве сучасных індустрыяльных метадаў, што дало б маж-лівасць расшырыць маштабы жыллёвага будаўніцтва.

Значную ролю ў будаўніцтве адыграла традыцыйнае спаборніцтва паміж будаўнікамі Мінска і Валгаграда. Прэзідыум ЦК прафсаюза камунальна-жыллёвага будаўніцтва 11 сакавіка 1953 года, абмерка-ваўшы вынікі гэтага спаборніцтва за пяць год, прызнаў пераможцамі калектыў будаўнікоў Мінска. Пераможцы ў спаборніцтве былі ўзна-гароджаны Ганаровымі граматамі ЦК прафсаюза. Сярод іх муляры Д. Булахаў, А. Філіпаў, тынкоўшчык Я. Навіцкая і іншыя.

Будаўнікі Мінска пачалі шырока выкарыстоўваць у сваёй рабоце навейшыя машыны і механізмы, ужываць жалезабетонныя зборныя канструкцыі, буйныя блокі і г. д.

У горадзе ўваходзяць у строй вялікія домабудаўнічыя прадпры-емствы. Гэта дазволіла перайсці на буйнапанельнае і буйнаблочнае будаўніцтва. Вядучае месца ў агульнай забудове горада заняло тыпо-вае будаўніцтва пяціпавярховых жылых дамоў. У Мінску ўпершыню ў Саюзе былі ўжыты тыпавыя праекты шматпавярховых дамоў з ма-ламетражнымі кватэрамі на адну сям'ю.

На працягу 1951—1958 гадоў у сталіцы рэспублікі за кошт дзяр-жаўных капіталаўкладанняў было ўведзена ў эксплуатацыю 1248,6 тысячы квадратных метраў жылой плошчы. За адзін толькі 1953 год быў пабудаваны 91 шматкватэрны жылы дом агульнай пло-шчай у 110 тысяч квадратных метраў, на капітальны рамонт жылфон-ду выдаткавана 6,8 мільёна рублёў, аб'ём капітальных укладанняў на камунальнае будаўніцтва склаў 32 мільёны рублёў. Тысячы сем'яў рабочых і служачых пераехалі ў новыя добраўпарадкаваныя дамы. Толькі ў 1957 годзе атрымалі жыллё 8 тысяч сем'яў мінчан. Гэта зна-чыць, што кожны дзень 22 сям'і ўсяляліся ў новыя кватэры.

Вялікае жыллёвае будаўніцтва праводзілася Міністэрствамі, ве-дамствамі і прадпрыемствамі. У 1951—1958 гадах мінскі аўтамабіль-ны завод, напрыклад, штогод выконваў і перавыконваў планы жыллё-вага будаўніцтва. У дамах аўтазавода ў 1957 годзе пражывала 4,5 тысячы сем'яў (каля 16 тысяч чалавек) рабочых, ІТР і служачых завода. Створаная агульназаводская камісія садзейнічання ажыццяў-ляла пастаянны кантроль за ходам жыллёвага будаўніцтва; аказвала

дапамогу будаўнікам у арганізацыі спаборніцтва і павышэнні працоўнай дысцыпліны, чым садзейнічала выкананню плана будаўніцтва ў вызначаныя тэрміны.

IV пленум Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў, які адбыўся 4 чэрвеня 1957 года, абмеркаваў і адобрыў вопыт жыллёвага яго на іншых прадпрыемствах.

Пачынаючы з 1956 года, на прамысловых прадпрыемствах Беларусі атрымаў распаўсюджанне метад гаркаўчан, па якому яны ўзводзілі дамы шляхам народнай будоўлі. Прымаючы ўдзел у будаўніцтве жылых памяшканняў, рабочыя і служачыя набывалі права на атрыманне кватэр у гэтых дамах. Толькі ў 1957 годзе рабочымі і служачымі трактарнага завода метадам гаркаўчан было пабудавана 25 дамоў, у якія засяліліся 136 сем'яў. У 1958 годзе колькасць жылой плошчы, пабудаванай у Мінску па метаду гаркаўчан, склала 35 тысяч квадратных метраў.

У горадзе працягвала развівацца і індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. За 1951—1958 гады індывідуальнымі забудоўшчыкамі было пабудавана 146,7 тысячы квадратных метраў жылой плошчы.

Усяго за 1951—1958 гады дзяржаўнымі арганізацыямі і індывідуальнымі забудоўшчыкамі Мінска было ўведзена ў эксплуатацыю 1395 тысяч квадратных метраў жылой плошчы.

Адначасова працягваліся работы па газіфікацыі і цеплафікацыі кватэр. Ужо ў 1958 годзе было газіфікавана каля шасці тысяч кватэр і пракладзена цеплафікацыйная магістраль па Ленінскаму праспекту.

Паспяховае ўжыванне тыпавых праектаў у будаўніцтве, выкарыстанне зборных канструкцый і дэталей, сілікатных блокаў і іншых новых будаўнічых матэрыялаў дазволілі знізіць кошт і скараціць тэрміны жыллёвага будаўніцтва, што дало дадатковыя магчымасці для павелічэння аб'ёму жыллёвага будаўніцтва, паляпшэння жыллёва-бытавых умоў працоўных.

Шырокі фронт будаўніцтва ўключаў у сябе ўвесь комплекс работ па добраўпарадкаванню горада. Уноў забудоўваліся і добраўпарадкоўваліся не толькі цэнтральныя вуліцы сталіцы, але і яе ўскраіны, дзе ствараліся новыя раёны з жылымі дамамі, бульварамі, скверамі, палацамі культуры, магазінамі, сталовымі, майстэрнямі бытавога абслугоўвання, спартыўнымі і дзіцячымі пляцоўкамі.

Працягваліся работы па пракладцы, машчэнню і асфальтаванню вуліц. У 1958 годзе працягласць забрукаваных і асфальтаваных вуліц раўнялася 193,8 кіламетра. Толькі ў 1957 годзе на 42 вуліцах горада вяліся работы па брукаванню і асфальтаванню, пракладцы водаправода, устаноўцы электраасвятляльных кропак.

У 1951—1958 гадах у горадзе былі праведзены вялікія работы па азеляненню вуліц і плошчаў, стварэнню новых паркаў і скверaў. Горад упрыгожылі Камсамольскі і Ленінскі бульвары, скверы ля Прывакзальнай плошчы і плошчы Свабоды, на вуліцах Пуліхава, Чайкоўскага, Захарава, Валгаградскай, Кіеўскай. Створан дзіцячы парк у пасёлку аўтазавода. Плошча зялёных масіваў і насаджэнняў агульнага карыстання ў Мінску да 1959 года дасягнула 840 гектараў.

Актыўны ўдзел у азеляненні, як і ў папярэднія гады, прымала насельніцтва горада. Так, аўтазаводцы толькі ўвосень 1956 года і ўвясну 1957 года на тэрыторыі пасёлка высадзілі 2177 дрэў і 13 600 кустоў. Вакол кожнага з вытворчых карпусоў ствараліся зялёная зона з шматгадовых ліп і таполяў. Уздоўж галоўнага корпуса былі высаджаны фруктовыя дрэвы. На галоўных вуліцах раёна аўтамабілебудаўнікоў з'явіліся алеі з шматгадовых ліп і рабіны.

Вясной 1958 года ў суботніках і нядзельніках па добраўпарадкаванню горада прыняло ўдзел больш 60 тысяч мінчан. Толькі ў дзень «зялёнага друга» на плошчах, вуліцах і скверах было высаджана каля 15 тысяч дрэў і кустоў. Усяго ў 1958 годзе ў парках, скверах, бульварах і на вуліцах было пасаджана 144 тысячы дрэў і 257 тысяч кустоў.

У 1951—1958 гадах была зроблена поўная рэканструкцыя трамвайнага дэпо і значна павялічыўся яго парк. Працягласць трамвайных ліній у 1958 годзе ўзрасла да 60,4 кіламетра. У гэты перыяд былі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю трамвайныя лініі па вуліцах Мяснікова, Якуба Коласа, а таксама ў напрамку завода ацяпляльнага абсталявання і г. д.

У 1952 годзе ў Мінску адкрылася першая тралейбусная лінія, якая прайшла ад вакзала да парка Чалюскінцаў. Працягласць яе склала шэсць кіламетраў. У 1958 годзе працягласць тралейбусных ліній сталіцы дасягнула 21,8 кіламетра. У горадзе курсіравала 345 аўтобусаў і 231 таксі.

Праводзіліся работы па расшырэнню водаправоднай і каналізацыйнай сеткі. Працягласць водаправода на канец 1958 года склала 23,1 кіламетра. Сярэднесутачная падача вады раўнялася ў гэтым годзе 85,9 тысячы кубічных метраў.

1951—1958 гады характарызаваліся далейшым паляпшэннем матэрыяльнага становішча савецкага народа. Тры чвэрці нацыянальнага даходу рэспублікі былі выдаткаваны на задавальненне матэрыяльных і культурных патрэб насельніцтва. Па меры росту нацыянальнага даходу Савецкі ўрад змог асігнаваць сродкі на павышэнне заработнай платы нізкааплачваемых рабочых і служачых. З студзеня 1957 года гэтай катэгорыі людзей яна была павышана ў сярэднім на 33 працэнты. Гэта пацягнула за сабой павелічэнне сярэдняга

ўзроўню заработнай платы працоўных. Так, напрыклад, сярэднемесячная зарплата рабочых Мінскага трактарнага завода вырасла ў 1958 годзе на 24 працэнты ў параўнанні з 1950 годам. Рэальная заработная плата рабочых і служачых буйной прамысловасці БССР узрасла ў 1958 годзе на 63 працэнты ў параўнанні з 1950 годам.

Росту рэальнай заработнай платы і ўздыму матэрыяльнага дабрабыту працоўных спрыяла сістэматычнае зніжэнне цэн на тавары народнага спажывання, спыненне ў 1958 годзе надпіскі на дзяржаўныя пазыкі, змяншэнне падатковых плацяжоў. Насельніцтва БССР, у тым ліку і Мінска, толькі ў выніку змяншэння падатковых плацяжоў у 1953 і 1958 гадах атрымала выгаду больш чым у 77 мільёнаў рублёў.

Мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне заработнай платы ў СССР, праводзіліся адначасова з паступовым скарачэннем рабочага дня. З сакавіка 1956 года па ўсёй краіне быў уведзен скарочаны рабочы дзень у перадвыхадныя і перадсвяточныя дні, установлен шасцігадзінны рабочы дзень для падлеткаў і пачаўся пераход да масавага сямігадзіннага рабочага дня. Заработная плата рабочых у выніку гэтага не толькі не зменшылася, а нават павялічылася. Гэта павелічэнне адбывалася галоўным чынам за кошт росту прадукцыйнасці працы.

Рост рэальнай заработнай платы садзейнічаў пашырэнню пакупной здольнасці савецкіх людзей. Так, толькі па лініі дзяржаўнага гандлю ў 1957 годзе насельніцтву Мінска было прададзена мясапрадуктаў у 3,4 раза больш у параўнанні з 1952 годам, прамысловых тавараў і прадуктаў харчавання — на 38,4 працэнта больш, чым у 1954 годзе.

Агульны аб'ём рознічнага тавараабароту і кааператыўнага гандлю, уключаючы грамадскае харчаванне, склаў у 1958 годзе 322,6 мільёна рублёў і павялічыўся на 184,8 мільёна рублёў у параўнанні з 1950 годам.

Паляпшэнню гандлю і грамадскага харчавання ў горадзе садзейнічала пастанова IX пленума Мінскага гарадскога камітэта КПБ ад 26 верасня 1957 года «Аб стане і мерах паляпшэння гандлю і грамадскага харчавання ў горадзе Мінску». Пленум указаў на неабходнасць прыняць усе захады для задавальнення растучых матэрыяльных патрэб савецкіх людзей, пастаянна развіваць і ўдасканальваць гандаль, павялічваць колькасць гандлёвых кропак, змагацца за распаўсюджанне і далейшае развіццё прагрэсіўных форм у гандлі і грамадскім харчаванні.

У 1959 годзе ў Мінску налічвалася ўжо 1048 прадпрыемстваў рознічнага гандлю, у тым ліку 588 магазінаў, або на 232 прадпрыемствы больш, чым у 1950 годзе. Адначасова з расшырэннем гандлё-

вай сеткі адбывалася аснашчэнне гандлюючых прадпрыемстваў сучасным тэхнічным абсталяваннем.

Вялікую ўвагу ўдзялялі партыйныя, савецкія і гандлюючыя арганізацыі грамадскаму харчаванню. У горадзе значна выросла колькасць сталовых, кафэ, рэстаранаў, буфетаў, закусачных. Да 1959 года ў Мінску налічвалася 482 прадпрыемствы грамадскага харчавання, гэта значыць на 263 больш, чым у 1950 годзе.

Яркім праяўленнем клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб людзях з'явіўся Закон аб дзяржаўных пенсіях, які быў прыняты ў 1956 годзе. У адпаведнасці з гэтым законам значна павялічваліся размеры пенсій усіх відаў. Быў устаноўлен пенсіённы ўзрост: для жанчын — 55 год, для мужчын — 60 год. Прадугледжваліся асобыя ільготы для рабочых цяжкіх прафесій.

Сума пенсій, што выплачваліся пенсіянерам Мінска, на 1 студзеня 1959 года склала 1044,3 тысячы рублёў і ўзрасла больш чым у два разы ў параўнанні з 1956 годам.

Палепшылася медыцынскае абслугоўванне працоўных Мінска. У 1958 годзе ў горадзе налічвалася 18 бальніц з колькасцю ложкаў — 4940, па амбулаторна-паліклінічнаму абслугоўванню насельніцтва працавала 85 паліклінік і філіялаў, гарадская станцыя хуткай дапамогі, некалькі пунктаў неадкладнай дапамогі і г. д. У горадзе знаходзіліся лячэбныя ўстановы рэспубліканскага значэння — анкалагічны, псіханеўралагічны, процівазобны дыспансеры. На буйных прадпрыемствах горада функцыяніравалі медыка-санітарныя часці.

Працоўныя Мінска шырока карысталіся магчымасцю адпачываць у санаторыях і дамах адпачынку рэспублікі і краіны. Напрыклад, рабочыя і служачыя станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі толькі летам 1956—1957 гадоў атрымалі 297 пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку, прычым большасць з гэтых пуцёвак была ільготнымі або бясплатнымі.

Прадметам асобых клопатаў партыі і ўрада з'яўляецца ахова здароўя дзяцей. У Мінску была створана шырокая сетка дзіцячых ясляў і садоў. Колькасць месц у яслях узрасла ў 1958 годзе да 4040, а ў дзіцячых садах да 11 860.

Школьнікам Мінска былі прадастаўлены піянерскія лагеры, дзіцячыя санаторыі. У 1957 годзе, напрыклад, у 114 лагерах Мінска і Мінскай вобласці адпачыла 32 449 вучняў. Уласныя піянерскія лагеры мелі аўтамабільны, трактарны, мотавеласіпедны, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і іншыя заводы.

У 1958 годзе былі пабудаваны цэлыя комплексы спартыўных збудаванняў: стадыёны «Дынама», ручных гульняў, плавальны басейн, спартыўныя залы ў тэхнікумах электрасувязі, энергетычным, Белпрамсавета, тэатральна-мастацкім інстытуце. Пачалося будаўніц-

тва Палаца спорту працоўных рэзерваў, адкрытага плавальнага басейна, спартыўнай базы спартыўнага таварыства «Ураджай».

Мерапрыемствы, якія былі праведзены па развіццю гарадской гаспадаркі, добраўпарадкаванню сталіцы і бытавому абслугоўванню насельніцтва, далі магчымасць перайсці да рашэння новых задач у галіне павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных Мінска.

3. Дапамога працоўных горада вёсцы

Пяцідзесятыя гады характарызаваліся расшырэннем маштабаў, удасканаленнем форм і метадаў дапамогі рабочага класа калгаснаму сялянству. Умацоўваліся эканамічныя і грамадска-палітычныя сувязі паміж работнікамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, горадам і вёскай.

Для сельскай гаспадаркі Беларусі да пачатку пяцідзесятых гадоў характэрным была слабая тэхнічная аснашчанасць, нізкі ўзровень механізацыі асноўных вытворчых працэсаў. Калгасная вёска атрымала недастатковую колькасць сучасных машын і механізмаў, што адмоўна адбілася на прадукцыйнасці ўсіх галін сельскай гаспадаркі. Рост механізацыі калгаснай вытворчасці ў многім залежаў ад работы прадпрыемстваў, занятых вырабам машын і прылад для земляробства.

Хуткімі тэмпамі нарошчваліся вытворчыя магутнасці на Мінскім трактарным заводзе, прадукцыя якога непасрэдна прызначалася для калгасаў і саўгасаў. У 1958 годзе завод даў краіне 26 тысяч сучасных машын.

Поспехі беларускіх трактарабудаўнікоў істотна адбіліся на тэхнічным аснашчэнні калгаснай вёскі. Трактарны парк у калгасах і саўгасах рэспублікі налічваў у 1958 годзе больш 29 тысяч машын супраць 11,6 тысячы ў 1950 годзе.

Добра папрацавалі для задавальнення патрэб сельскай гаспадаркі і мінскія аўтамабілебудаўнікі, станкабудаўнікі, рабочыя многіх іншых прадпрыемстваў. Яны давалі на сяло не толькі складаныя машыны, станкі, абсталяванне, але і забяспечвалі калгасы, саўгасы і МТС запаснымі часткамі, інструментам і г. д. У сувязі з вострым недахопам запчастак для трактараў іх выраб арганізаваў рад мінскіх прадпрыемстваў: аўтамабільны, трактарны, падшыпнікавы, мотавелясіпедны, інструментальны, рамонтна-механічны і іншыя заводы. За кароткі тэрмін яны выпрабілі іх на мільёны рублёў.

Надзвычайна каштоўнай і важнай для калгаснай вёскі была дапамога горада, яго рабочых калектываў кадрамі. Мінскія інстытуты

механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, лесатэхнічны, часткова політэхнічны давалі сельскай гаспадарцы сотні кваліфікаваных спецыялістаў.

Але вельмі вялікай была патрэба калгаснай вёскі, каб яе маглі задаволіць толькі спецыяльныя навучальныя ўстановы. Паўстаўшыя перад калгасамі вялікія і складаныя задачы патрабавалі неадкладнай і больш значнай дапамогі.

Важнай падзеяй у эканамічным і палітычным жыцці краіны з'явіўся вераснёўскі (1953) Пленум ЦК КПСС. Ён намеціў канкрэтныя меры па ўздыму сельскай гаспадаркі, адной з якіх была дапамога вёсцы кадрамі арганізатараў і спецыялістаў калгаснай вытворчасці.

Як і ў мінулым, працоўныя горада зноў прыйшлі на дапамогу працаўнікам палёў. У 1954 годзе звыш паўтары тысячы пасланцоў мінскіх прадпрыемстваў, будоўляў і ўстаноў выехалі на сталую працу ў вёску. Больш 300 з іх сталі старшынямі калгасаў, 55 — дырэктарамі машынна-трактарных станцый, 89 — галоўнымі інжынерамі і 140 — загадчыкамі майстэрняў і механікамі МТС. Толькі калектыў Мінскага трактарнага завода накіраваў на вёску больш 100 спецыялістаў. На работу ў МТС выехалі з Мінска сотні механізатараў.

Да снежня 1957 года колькасць спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія працавалі ў калгасах, саўгасах і МТС рэспублікі, узрасла да 14,5 тысячы чалавек. З 1953 па 1957 год колькасць механізатараў масавых прафесій у сельскагаспадарчай вытворчасці павялічылася з 47,8 да 75,2 тысячы чалавек.

Працоўныя Мінска не былі ў баку і ад выканання такой важнай задачы, як асваенне новых зямель ва ўсходніх раёнах краіны. Ужо ў пачатку лютага 1954 года для работы на цалінных землях паехала з Мінска 133 чалавекі. Сярод іх — трактарысты, камбайнеры, механікі, шафёры, рамонтныя рабочыя і іншыя. У 1955 годзе на асваенні цалінных і абложных зямель у Казахстане працавала каля дзвюх тысяч маладых мінчан.

У 1957 годзе ва ўборцы цаліннага ўраджаю прынялі ўдзел чатыры тысячы юнакоў і дзяўчат Мінска і Мінскай вобласці. З вялікім патрыятычным уздымам працавалі ў Рузаеўскім раёне Какчэтаўскай вобласці студэнты Беларускага політэхнічнага інстытута. У саўгасе «Заходні» яны пабудавалі тры жылых дамы, клуб, лазню, пляцоўкі для гульняў выхаванцам дзіцячых ясляў і вучняў школы, падрыхтавалі два двары да зімоўкі жывёлы. Іх сіламі было нарыхтавана дзве тысячы кубічных метраў будаўнічых матэрыялаў, вылажан плітамі ток у 1800 квадратных метраў, абсталявана восем калодзежаў, адрамантавана шэсць дамоў. У саўгасе «Берлікскі» будаўнічая брыгада гэтага ж інстытута пабудавала зернесклад ёмістасцю 1400 тон збожжа.

Паспяхова працавалі мінчане на палях саўгасаў «Бароўскі», «Альгабскі», «Межынскі» і іншых гаспадарках Цаліннага краю. Далёка за межамі Рузаеўскага раёна стала вядома імя рабочага Мінскага трактарнага завода П. Хадасевіча. Працуючы камбайнерам, ён скасіў 500 гектараў пшаніцы, затым перасеў на трактар і падняў сотні гектараў зяблівa.

Нямала папрацавалі на ўборцы цаліннага ўраджаю студэнты лесатэхнічнага і педагагічнага інстытутаў, інстытута замежных моў і Мінскага палітэхнікума. Іх праца, як і студэнтаў політэхнічнага інстытута, была адзначана ганаровымі граматамі Какчэтаўскага абкома камсамола. Дзесяткі мінчан былі ўзнагароджаны значкамі ЦК ВЛКСМ «За асваенне новых зямель», Ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМ Казахстана і медалямі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

У радзе калгасаў Мінскай вобласці, куды на пасады старшынь сельгасарцеляў і дырэктараў МТС былі накіраваны з Мінска спецыялісты, становішча ў гаспадарках прыкметна змянялася к лепшаму. Так адбылося, напрыклад, у Замастоцкай МТС Чэрвеньскага раёна, дырэктарам якой стаў былы старшыня прэзідыума Белметалпрамсаюза А. І. Хвастоўскі. Ён актыўна ўзяўся за работу, праявіў добрыя арганізатарскія здольнасці, сумеў згуртаваць механізатараў, накіраваць іх энергію на рашэнне вытворчых задач. Неўзабаве былі атрыманы і станоўчыя вынікі. Зімой 1953/54 года паспяхова быў праведзен рамонт машынна-трактарнага парка, палепшан догляд за сельгастэхнікай. На высокім агратэхнічным узроўні МТС правяла вясенне-пасяўную кампанію 1954 года.

Горнаўскую МТС Плешчаніцкага раёна ўзначаліў былы галоўны металург завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Л. І. Кабаў. Ён дабіўся значнага ўмацавання працоўнай і вытворчай дысцыпліны, заахвочваў творчую ініцыятыву работнікаў, клапаціўся аб павышэнні іх кваліфікацыі і агульнакультурнага ўзроўню. У МТС былі арганізаваны тэхнічная вучоба, гурткі па вывучэнню перадавых дасягненняў агратэхнікі. Усё гэта дало свае станоўчыя вынікі ў выкананні задач, што стаялі перад механізатарамі.

Апраўдалі давер'е калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў і тыя, хто, прыехаўшы ў вёску на пастаянную работу, узначаліў сельскагаспадарчыя арцелі. У канцы мая 1955 года старшынёй калгаса імя Леніна Смалявіцкага раёна быў выбран В. І. Маляўка, працаваўшы да гэтага начальнікам планава-эканамічнага аддзела Мінскага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. Калгасная гаспадарка тут была ў заняпадзе. Ураджайнасць збожжавых не перавышала 4 цэнтнеры з гектара, надоі малака былі невялікія: ад каровы надойвалі 700 літраў, нізкай была працоўная дысцыпліна і мізэрнай аплата працадня

калгаснікаў. Праўленне калгаса на чале з В. І. Маляўкам, абапіраю-
чыся на камуністаў, правяло сярод хлебаробаў вялікую растлума-
чальную работу, вырашыла пытанне аб матэрыяльным стымуляванні
лепшых калгаснікаў. Вынікі сказаліся хутка — сельгасарцель у най-
карацейшыя тэрміны завяршыла веснавую сяўбу, добра тут быў арга-
нізаваны догляд пасеваў, у сціслыя тэрміны была праведзена ўборка
ўраджаю. І як вынік, арцель выйшла на першае месца ў раёне па
выкананню ўсіх відаў сельскагаспадарчых работ. Упершыню за
пасляваенныя гады калгас своечасова і поўнасцю разлічыўся з дзяр-
жавай па ўсіх відах сельскагаспадарчых прадуктаў і грашовых пла-
цяжоў, забяспечыў сябе ўласным насеннем. Калгаснікі атрымалі на
працадзень па кілаграму збожжа і па аднаму рублю грашыма, што
значна перавышала аплату іх працы ў параўнанні з папярэднімі га-
дамі. Калгас з году ў год ішоў у гору і стаў у ліку перадавых гаспа-
дарак не толькі ў сваёй вобласці, але і ў рэспубліцы.

Важнай формай дапамогі вёсцы, як і раней, заставалася шэфства прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў горада над калгасамі, саўгасамі і машынна-трактарнымі станцыямі. У радзе выпадкаў яно насіла характар матэрыяльнай дапамогі калектыўным гаспадаркам. Прадпрыемствы вылучалі падшэфным калгасам спісаныя, але адрамантаваныя ў нерабочы час станкі, запасныя часткі, перадавалі ім некаторыя лішкі будаўнічых матэрыялаў, прыгодныя для гаспадарак прамысловыя адыходы і шмат іншага.

Больш істотнае значэнне мела дапамога шэфствуючых калектываў у арганізацыі работы па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі сельскагаспадарчых кадраў, арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, правядзенню палітмасавай і культурна-выхаваўчай работы сярод працаўнікоў вёскі.

Шэфствуючыя калектывы з'явіліся памочнікамі партыі ў правядзенні яе палітыкі на вёсцы. Так, у пачатку пяцідзесятых гадоў яны прынялі актыўны ўдзел у рашэнні такой важнай арганізацыйна-гаспадарчай задачы, як узбуйненне дробных калгасаў.

Да пачатку 1951 года працоўныя сталіцы шэфствавалі над 386 калгасамі і 35 МТС Мінскай вобласці. Аўтамабілебудаўнікі, напрыклад, многа зрабілі для ўмацавання калгаса імя М. Горкага Бягомльскага раёна. На заводзе была створана спецыяльная камісія, якая ўзначаліла работу ўсяго шэфскага калектыву. Прадстаўнікі партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай арганізацый выязджалі ў калгас, дапамагалі праўленню ў правядзенні гаспадарча-арганізацыйных мерапрыемстваў. Аддзел галоўнага механіка завода дапамог калгасу адрамантаваць сельскагаспадарчую тэхніку і інвентар, аддзел галоўнага энергетыка — электрыфікаваць калгас, бухгалтэрыя — наладзіць улік і справаздачнасць. Была праведзена вялікая работа

аўтазаводцамі і па стварэнню калгаснай бібліятэкі, разгортванню палітмасавай і культурна-выхаваўчай работы сярод калгаснікаў.

Цесная дружба ўстанавілася паміж калектывамі Мінскага трактарнага завода, калгасам «Іскра Ільіча» і МТС Плешчаніцкага раёна. Трактаразаводцы аказвалі сваім падшэфным вялікую дапамогу ў рамонце тэхнікі, будаўніцтве гаспадарчых памяшканняў. Пры іх дапамозе было электрыфікавана пяць з дзевяці вытворчых брыгад. Работнікі завода неаднаразова выступалі перад калгаснікамі з лекцыямі і дакладамі.

У перыяд вясенне-палявых работ 1951 года значную дапамогу падшэфнаму калгасу «Спартак» Чэрвеньскага раёна аказалі работнікі рамонтна-будаўнічай канторы Савецкага раёна сталіцы. Яны прынялі актыўны ўдзел у будаўніцтве грамадскіх памяшканняў, вывазцы на палі ўгнаенняў, дапамаглі наладзіць сацыялістычнае спаборніцтва калгаснікаў і г. д.

Вялікую шэфскую работу праводзілі супрацоўнікі Акадэміі навук БССР, Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна, політэхнічнага інстытута і многіх іншых арганізацый і ўстаноў горада.

Шырокія гарызонты далейшага ўздыму адкрывалі перад сельскай гаспадаркай рашэнні вераснёўскага (1953) Пленума і наступных Пленумаў ЦК КПСС. Перад працаўнікамі вёскі, усім савецкім народам паўставала важнейшая дзяржаўная задача — паспяхова ажыццявіць гэтыя рашэнні. Аднаму сялянству рашыць гэту задачу было не пад сілу. Патрабавалася актыўная падтрымка і дапамога горада.

Раённыя і гарадскі камітэты партыі Мінска неаднаразова абмяркоўвалі пытанні шэфскай работы на сваіх пасяджэннях, выносілі іх на абмеркаванне партыйных актываў і канферэнцый. У кастрычніку 1953 года ЦК КПБ прыняў рашэнне «Аб шэфстве прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў над МТС і калгасамі». У ім былі намечаны канкрэтныя меры, накіраваныя на паляпшэнне шэфскай дапамогі вёсцы.

Ажыццяўляючы рашэнне ЦК КПБ, партыйныя арганізацыі рэспублікі перабудавалі шэфскую работу. Кожнаму гарадскому раёну было даручана шэфства над групай сельскіх раёнаў вобласці. Буйным прамысловым прадпрыемствам і будоўлям даручалася шэфства над зонамі МТС. Цэхі гэтых прадпрыемстваў шэфствавалі над асобнымі калгасамі. У гэту работу больш шырока, чым у ранейшыя гады, уключыліся не толькі прамысловыя прадпрыемствы, але і ўстановы, ВНУ і навукова-даследчыя інстытуты.

Станоўчыя вынікі перабудовы шэфскай работы выявіліся адразу. Значна пашыраліся маштабы яе, палепшыўся змест, больш разнастайнымі сталі формы. Калі напярэдадні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС шэфства ажыццяўлялі 196 прадпрыемстваў і арганізацый

горада, то ў 1954 годзе іх колькасць перавысіла 450. У той жа час колькасць падшэфных калгасаў вырасла да 478.

Калектывы мінскіх прадпрыемстваў і будоўляў аказвалі машына-трактарным станцыям дапамогу ў вырабе запасных частак, інструментаў, рамонце абсталявання, трактараў, сельскагаспадарчых машын, збудаванні і абсталяванні майстэрняў, гаражоў і г. д. Толькі на працягу першай палавіны 1954 года шэфы перадалі МТС і калгасам Мінскай вобласці каля 120 розных станкоў, вялікую колькасць інструменту, больш 150 тон жалеза і іншых матэрыялаў. У калгасах было пабудавана 39 цяпліц, вялікая колькасць жывёлаводчых памяшканняў, электрастанцый, памяшканняў культурна-бытавога прызначэння. У час веснавых работ шэфы вывезлі сваім транспартам на калгасныя палі больш 20 тысяч тон угнаенняў, 6 тысяч тон насення. На працягу 1954 года шэфы абсталявалі 80 калгасных кузняў, адрамантавалі 41 аўтамашыну, 30 рухавікоў, 10 лакамабіляў, абсталявалі 30 перасоўных майстэрняў, 38 кармакухняў, 300 аўтапаілак. З іх дапамогай у Мінскай вобласці было электрыфікавана 55 калгасаў. Істотным укладам працоўных Мінска ў развіццё грамадскай жывёлагадоўлі з'явілася будаўніцтва ў 1955 годзе ў калгасах вялікай колькасці сіласных збудаванняў. Іх агульны аб'ём дазваляў нарыхтаваць больш 195 тысяч тон сакавітых кармоў.

Партыйныя арганізацыі мабілізавалі працоўных горада на непасрэдны ўдзел у вытворчым жыцці вёскі. Дзесяткі тысяч рабочых, служачых, навучэнцаў ВНУ сталіцы штогод прымалі ўдзел у правядзенні летняй і асенняй уборкі ўраджаю. Цэлымі тыднямі, а калі і месяцамі, працавалі яны на калгасных палях. Толькі ў 1954 годзе ў перыяд уборкі зернавых і бульбы працоўныя горада адпрацавалі каля паўтара мільёна чалавекадзён.

Дзейсную дапамогу падшэфным калгасам і МТС Бягомльскага раёна і ў гэтыя гады аказваў мнагатысячны калектыў Мінскага аўтамабільнага завода. Адразу пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС партком і дырэкцыя завода арганізавалі сустрэчу з кіраўнікамі падшэфных гаспадарак. Разам з праўленнямі калгасаў яны распрацавалі канкрэтныя меры па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню арцеляў, развіццю паляводства і жывёлагадоўлі. На сумеснай куставой нарадзе былі абмеркаваны і прыняты абавязацельствы калгасаў і шэфствуючых цэхаў завода, накіраваныя на выкананне рашэнняў Пленумаў ЦК КПСС.

Жаданымі гасцямі ў калгасе імя К. Маркса былі прадстаўнікі прэсавага цэха. Яны аказалі дапамогу ў радыёфікацыі вёскі, у абсталяванні калгаснай кузні. Шэфы з інструментальнага цэха дапамаглі калгасу імя Чапаева механізаваць падачу вады на жывёлагадоўчыя фермы.

Актыўна дапамагаў падшэфнай Кастрычніцкай машынна-трактарнай станцыі і дзесяці калгасам Плешчаніцкага раёна калектыў трактарнага завода. Сіламі трактаразаводцаў ва ўсіх калгасах былі абсталяваны кузні, у радзе гаспадарак наладжана механічнае пі-ленне лесаматэрыялаў, механізаваны найбольш працаёмкія працэсы на жывёлагадоўчых фермах. МТС была аказана значная дапамога ў абсталяванні рамонтнай майстэрні. Для гэтай мэты завод выдзеліў шэсць металарэжучых станкоў і дапамог іх зманціраваць, на 150 тысяч рублёў накіраваў розных запчастак, выканаў работы па праклад-цы водаправода і наладжванню цэнтральнага ацяплення. У калгасе «Камінтэрн» была пабудавана электрастанцыя. Партарганізацыя завода неаднаразова накіроўвала ў калгасы і МТС спецыялістаў для аказання дапамогі ў рамонце сельскагаспадарчых машын, дапамагла працаўнікам вёскі ў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Значнай была дапамога заводскага калектыву ў падрыхтоўцы кадраў механізатараў. Для кіруючых работнікаў МТС трактаразаводцы арганізоўвалі шасцідзённыя семінары, на якіх знаёмілі слухачоў з лепшымі дасягненнямі ў трактарабудаванні, з перадавым вопытам тэхнічнага абслугоўвання і эксплуатацыі машын, вучылі эфектыўнай арганізацыі работы машынна-трактарнага парка.

Вялікую гаспадарчую дапамогу аказвалі падшэфным калгасам радыёзавод, заводы імя Кірава, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, імя Мяснікова, «Ударнік», тонкасуконны камбінат, трэст «Аўтапрам-буд», будтрэст № 3 і г. д.

З рэарганізацыяй машынна-трактарных станцый калгасы сутыкнуліся з некаторымі цяжкасцямі. Ім даводзілася вырашаць задачы, звязаныя з абслугоўваннем і эксплуатацыяй тэхнікі. Кожны калгас стаяў перад неабходнасцю мець хоць бы невялікую рамонтную майстэрню і адпаведныя кадры рамонтнікаў.

У гэтых умовах умацаванне вытворчых сувязей паміж прамысловымі прадпрыемствамі і калгасамі набывала асабліва важнае значэнне. І цяпер рабочы клас прыйшоў на дапамогу працаўнікам вёскі. Калектывы трактарнага і станкабудаўнічага заводаў, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі выступілі ініцыятарамі аказання практычнай дапамогі калгасам у стварэнні ўласных майстэрняў, у падрыхтоўцы кадраў рамонтнікаў. Бюро Мінскага гарадскога камітэта партыі адобрыла гэту ініцыятыву і прапанавала райкомам, пярвічным партарганізацыям і кіраўнікам прадпрыемстваў горада палепшыць шэфскую работу, звярнуўшы асаблівую ўвагу на аказанне калгасам дапамогі ў аснашчэнні рамонтных майстэрняў і падрыхтоўцы кадраў станочнікаў і рамонтнікаў.

Пачынанне трактаразаводцаў і станкабудаўнікоў падтрымалі калектывы многіх прадпрыемстваў Мінска. На прамысловых

прадпрыемствах разгарнуўся рух за аказанне тэхнічнай дапамогі сялу.

Выконваючы прынятыя абавязацельствы, калектывы трактарнага і станкабудаўнічага заводаў і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі прадалі падшэфным калгасам на ўзаемавыгадных умовах станочнае абсталяванне для майстэрняў, неабходны інструмент, некаторыя віды загатовак, дапамаглі зманціраваць і наладзіць гэта абсталяванне. Яны абучылі калгаснікаў спецыяльнасцям станочнікаў і рамонтнікаў, дапамаглі ім арганізаваць правільную эксплуатацыю набытай тэхнікі.

Прыкладу трактаразаводцаў і станкабудаўнікоў следвалі калектывы аўтамабільнага завода і завода імя Кірава. Істотную дапамогу калгасам у абсталяванні рамонтных майстэрняў, у гаспадарчым будаўніцтве, у арганізацыі рамонту сельскагаспадарчых машын і інвентару аказалі Галоўнае ўпраўленне аўтамабільнага транспарту пры Савеце Міністраў БССР, тэхнічнае вучылішча № 1, будаўнічая школа № 11 і іншыя прадпрыемствы і ўстановы горада.

Калектывы прадпрыемстваў і ўстаноў Мінска не абмяжоўваліся, безумоўна, толькі гаспадарчай дапамогай. Гэта форма шэфства спалучалася з вялікай арганізацыйнай і палітмасавай работай. Шэфы накіроўвалі на вёску лектараў і дакладчыкаў, канцэртныя брыгады, дапамагалі арганізаваць на месцах мастацкую самадзейнасць, укамплектаваць літаратурай калгасныя бібліятэкі. Яны аказвалі дапамогу ў наладжванні работы сельскіх клубаў і хат-чытальняў, у правядзенні розных грамадска-палітычных кампаній. Толькі за 1954 год у калгасах і МТС Мінскай вобласці было прачытана звыш чатырох тысяч лекцый і дакладаў, праведзена столькі ж гутарак, арганізавана 625 канцэртаў мастацкай самадзейнасці. Напрыклад, прадпрыемствы і арганізацыі Савецкага раёна горада ў першай палове 1954 года накіравалі ў калгасныя бібліятэкі больш васьмі тысяч розных кніг і брашур. У 1955 годзе шэфы прачыталі для калгаснікаў звыш васьмі тысяч лекцый і дакладаў, далі больш 400 канцэртаў. Вялікую прапагандысцкую і культурна-масавую работу праводзілі шэфы на вёсцы і ў наступныя гады.

Значную дапамогу сельскім бібліятэкам аказваў калектыў Мінскай абласной бібліятэкі імя Пушкіна. Сельскіх бібліятэкараў нярэдка запрашалі ў горад і знаёмілі з перадавым вопытам арганізацыі бібліятэчнай справы. Апрача таго, работнікі абласной бібліятэкі самі выязджалі ў вёску для аказання практычнай і метадычнай дапамогі.

Істотнае значэнне для развіцця сельскай гаспадаркі мела работа, якая праводзілася ў калгасах і саўгасах вучонымі Мінска. Інстытуты сельскагаспадарчага профілю Акадэміі навук БССР садзейнічалі вывучэнню і ўкараненню ў сельскагаспадарчую вытворчасць Беларусі квадратна-гнездавога спосабу пасадкі бульбы і іншых прапашных

культур. Ужо ў 1954 годзе квадратна-гнездавая пасадка бульбы была зроблена на плошчы ў 494 тысячы гектараў. У наступныя гады сяўба бульбы квадратна-гнездавым спосабам яшчэ больш распаўсюдзілася.

Навуковыя супрацоўнікі Акадэміі навук арганізавалі ў рэдкалгасаў вопытныя насенняводчыя ўчасткі, дапамагалі вырашаць важную праблему забеспячэння калгасаў гатунковым насеннем. Праводзілася значная навукова-даследчая работа на паляшэнню народнасці жывёлы. Калектыў Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі склаў прыкладны вытворчы план, табліцу севазваротаў і глебавую карту для зоны падшэфнага калгаса. Інстытут хіміі дапамог падшэфнай сельгасарцелі ў вырабе і наладжванні работы ўстаноўкі па гідролізу грубых кармоў. Сіламі навуковых супрацоўнікаў АН БССР быў распрацаван рад новых канструкцый сельскагаспадарчых машын.

Вучоныя Беларускага політэхнічнага інстытута склалі схему абсталявання выпрабавальнага ўчастка МТС, распрацавалі інструкцыі па халоднай і гарачай абкатцы трактарных рухавікоў, захаванню акумулятарных батарэй у зімовых умовах. У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна была распрацавана тэма аб мерах барацьбы з паляганнем злакавых культур на тарфяніках. Навуковымі работнікамі лесатэхнічнага інстытута рабілася даследаванне глебы, распрацоўваліся рэкамендацыі па ўжыванню ўгнаенняў. Тут жа былі распрацаваны праект па азеляненню МТС і праект асушэння Палескай нізіны.

Вучоныя часта выступалі перад працаўнікамі вёскі з лекцыямі і дакладамі, знаёмілі іх з важнейшымі рашэннямі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, з дасягненнямі навукі і перадавой тэхнікі.

Дапамога, якую аказалі працоўныя Мінска сельскай гаспадарцы, садзейнічала не толькі эканамічным поспехам калгасаў, саўгасаў і МТС, але і, што самае галоўнае, умацаванню саюзу рабочага класа і калгаснага сялянства.

РАЗДЗЕЛ XXII

КУЛЬТУРА МІНСКА (1946—1958 гады)

1. Народная асвета і навука

У першыя пасляваенныя гады была праведена вялікая работа па аднаўленню і далейшаму развіццю народнай асветы беларускай сталіцы. У гэты перыяд узмоцнена ішла адбудова разбураных нямецка-фашысцкімі акупантамі будынкаў навучальных устаноў, будаўніцтва новых школ, тэхнікумаў, інстытутаў. Прымаліся захады, каб забяспечыць навучальныя ўстановы неабходным абсталяваннем, падручнікамі, вучэбна-наглядным дапаможнікамі, а таксама кваліфікаванымі педагагічнымі кадрамі.

На патрэбы народнай асветы Мінска Савецкі ўрад асігнаваў буйныя грашовыя сродкі. Так, ужо ў 1947 годзе дзяржаўным бюджэтам рэспублікі было прадугледжана на гэту мэту каля 2852 тысячы рублёў, а ў 1958 годзе асігнаванні на народную асвету складалі 8379 тысяч рублёў.

Партыйныя і савецкія органы сталіцы праяўлялі паўсядзённыя клопаты аб народнай адукацыі, прымалі захады, каб у школах, тэхнікумах і ВНУ сталіцы навучальны год распачынаўся своечасова і арганізавана. Так, для гэтай мэты сумесным рашэннем Мінскага гаркома КПБ і выканкома гарадскога Савета дэпутатаў працоўных ад 13 чэрвеня 1946 года за райсаветамі горада былі замацаваны заводы і фабрыкі і іншыя прамысловыя прадпрыемствы, якія ў парадку шэфскай дапамогі ўтваралі рамонт будынкаў навучальных устаноў, забяспечвалі школы неабходным абсталяваннем. У выніку гэтых захадаў заняткі ў школах былі распачаты своечасова і арганізавана. Аднак агульнаадукацыйныя школы горада ў

пачатку першай пасляваеннай пяцігодкі адчувалі вялікія цяжкасці. Не хапала абсталявання, падручнікаў, сшыткаў, вучэбных дапаможнікаў. Востры недахоп адчуваўся ў педагагічных кадрах, асабліва настаўнікаў вышэйшай кваліфікацыі. Так, у 1946 годзе з 780 педагогаў толькі 400 мелі вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю. Школы працавалі ў тры і нават у чатыры змены, што пазбаўляла магчымасці праводзіць якую-небудзь пазакласную работу з вучнямі. Напрыклад, у 1946 годзе з 30 мінскіх школ восем не мелі ўласных памяшканняў і праводзілі заняткі ў іншых школьных памяшканнях і то ў трэцюю змену. Нават у 1947 годзе большасць школ горада працавала ў тры змены. Усе гэтыя недахопы адмоўна адбіліся на вучэбна-выхаваўчым працэсе, зніжалі яго ўзровень, паралізавалі другагодніцтва.

З ростам эканомікі рэспублікі і матэрыяльнага дабрабыту працоўных і становішча агульнаадукацыйнай школы прыкметна паляпшалася, стваралася неабходныя прадпасылкі для далейшага развіцця народнай асветы ў сталіцы.

XIX з'езд Камуністычнай партыі Беларусі, адзначыўшы поспехі ў развіцці агульнаадукацыйнай школы рэспублікі, прыняў рашэнне аб увядзенні з 1949/50 навучальнага года ўсеагульнага сямігадовага навучання дзяцей школьнага ўзросту. 12 жніўня 1949 года Савет Міністраў Беларускай ССР прыняў пастанову «Аб усеагульным абавязковым сямігадовым навучанні ў БССР». У Мінску была значна павялічана колькасць школ, умацавана іх вучэбная база. У выніку навучаннем былі ахоплены ўсе дзеці 7—15 год. У 1949/50 навучальным годзе ў школах займалася значна больш дзяцей, чым да Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікае значэнне ў развіцці агульнаадукацыйнай школы мелі рашэнні XIX з'езду КПСС, якімі ў сталіцах саюзных рэспублік і буйных гарадах краіны прадугледжваўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. З'езд даў дырэктыву прыступіць да ўвядзення політэхнічнага навучання ў школах.

У гэтыя гады ў Мінску была пабудавана значная колькасць новых школ. Калі ў 1945/46 навучальным годзе іх налічвалася 30, то ў 1958/59 навучальным годзе іх было 64, а лік вучняў за гэтыя гады вырас амаль у 2,5 раза (з 23,7 тысячы да 56,1 тысячы чалавек).

У першыя пасляваенныя і пачатку 50-х гадоў палову агульнаадукацыйных школ горада складалі пачатковыя і сямігадовыя. У 1958/59 навучальным годзе ўсе яны былі ператвораны ў сярэднія.

Для рабочых і служачых, якія не мелі неабходнай адукацыі, ствараліся вячэрнія школы рабочай моладзі. У 1945/46 навучальным годзе такіх школ у горадзе працавала шэсць, а ў 1958/59 — ужо 31. У іх займалася больш васьмі тысяч чалавек.

У сувязі з ростам колькасці школ, увядзеннем усеагульнага сямігадовага навучання і пераходам да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі намнога вырасла патрэба ў педагагічных кадрах. У гэтых мэтах у 1958 годзе была значна расшырана падрыхтоўка настаўнікаў сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі. Напрыклад, у 1946 годзе педагагічнымі інстытутамі БССР было падрыхтавана нямногім больш адной тысячы педагогаў, а ў 1958 годзе — больш трох тысяч. У выніку ў 50-х гадах пераважная большасць настаўнікаў школ Мінска мела вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю.

У Мінску ў гады пасляваенных пяцігодак была створана шырокая сетка спецыяльных навучальных устаноў. У 1958 годзе ў горадзе працавала 25 тэхнікумаў, вучыліш ч і іншых спецыяльных школ. Большасць з іх рыхтавала кадры для народнай гаспадаркі.

У сталіцы ўдзялялася велізарная ўвага дзецям дашкольнага ўзросту. У Мінску было адкрыта 102 дзіцячых сады, якія наведвала 11 тысяч дзяцей. Вялікімі клопатамі былі акружаны дзеці-сіраты, страціўшыя сваіх бацькоў. Для іх у горадзе было адкрыта чатыры дзіцячых дамы.

Значная работа была праведзена па ўмацаванню і расшырэнню вучэбна-матэрыяльнай базы вышэйшай школы. У сталіцы былі адкрыты новыя ВНУ. У 1945/46 навучальным годзе пачаў працаваць Беларускі тэатральны інстытут. У 1948 годзе на базе факультэта замежных моў Мінскага педагагічнага інстытута створан Інстытут замежных моў. У 1954 годзе быў адкрыт Беларускі дзяржаўны інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

У Мінску працавала Рэспубліканская партыйная школа пры ЦК КПБ і завочнае аддзяленне Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС. За дзесяць пасляваенных год Рэспубліканскую партыйную школу закончылі 2457 чалавек.

Усяго ў 1958 годзе ў сталіцы БССР налічвалася 12 вышэйшых навучальных устаноў. За 13 пасляваенных год колькасць студэнтаў, якія толькі навучаліся стацыянарна, у параўнанні з даваеннымі гадамі павялічылася амаль у тры разы і дасягнула 19 тысяч чалавек. Тысячы рабочых і служачых атрымалі вышэйшую адукацыю на вячэрніх і завочных аддзяленнях.

З кожным годам усё шырэй разгортваўся фронт навуковай работы, цэнтрам якой у рэспубліцы з'яўлялася Акадэмія навук БССР. У пасляваенныя гады яе структура падвяргалася значным зменам. Уноў былі створаны інстытуты фізіка-матэматычнага і тэхнічнага профілю (фізіка-тэхнічны, энергетыкі, фізікі і матэматыкі, механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі), умацаваны і расшыраны інстытуты Аддзялення грамадскіх навук. У 1957 годзе створан Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Да канца 1958 года

ў склад Акадэміі навук уваходзіла 15 навукова-даследчых інстытутаў, Батанічны сад, шэсць самастойных аддзелаў і лабараторый, два літаратурных музеі, бібліятэка, выдавецтва, эксперыментальныя майстэрні. У інстытутах акадэміі вялі навуковую работу 46 акадэмікаў і 32 члены-карэспандэнты АН БССР, 60 дактароў навук і 321 кандыдат навук.

Вучоныя з кожным годам расшыралі навуковыя даследаванні, узбагачалі савецкую навуку сваімі новымі адкрыццямі і працамі. Асабліва плённай стала навуковая дзейнасць вучоных пасля XX з'езду КПСС. Звыш 50 праблем, якія распрацоўваліся вучонымі ў 1958 годзе, мелі агульнасаюзнае значэнне. Буйны ўклад у навуку ўнеслі ў пасляваенныя гады ўсе навукова-даследчыя інстытуты акадэміі.

Вялікую навуковую работу прарабілі інстытуты Аддзялення грамадскіх навук. Інстытут гісторыі выдаў двухтомную працу «Гісторыя БССР». Сярод апублікаваных работ Інстытута філасофіі звяртаюць на сябе ўвагу калектыўныя манаграфіі «Аб філасофскіх сшытках У. І. Леніна», «Узнікненне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі». У выніку працяглай і карпатлівай работы калектыву лінгвістаў быў створан і выдан «Руска-беларускі слоўнік», які ахоплівае звыш 80 тысяч слоў. Рад тэарэтычных прац напісалі беларускія літаратуразнаўцы. У 1958 годзе новастворaны інстытут пачаў выдаваць першыя працы па мастацтвазнаўству, этнаграфіі і фальклору.

Значны ўклад зрабілі ў навуку вучоныя-біёлагі. У 1958 годзе імі завершана выданне пяцітомнай працы «Флора БССР», апублікавана навуковая работа «Млекакормячыя БССР».

Плённа працавалі інстытуты Аддзялення фізіка-матэматычных і тэхнічных навук.

У 1957 годзе ў Мінску была створана Акадэмія сельскагаспадарчых навук БССР, куды ўвайшоў рад інстытутаў, што знаходзіліся ў складзе АН БССР. Змагаючыся за паспяховае выкананне рашэнняў партыі і ўрада, накіраваных на далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, вучоныя Беларусі зрабілі многа навуковых даследаванняў, якія маюць вялікае практычнае значэнне для калгасаў і саўгасаў.

Вялікую навуковую работу праводзіў Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ, які адначасова з'яўляецца філіялам Інстытута марксізма-ленінізма ЦК КПСС.

У Мінску працавалі ведамасныя навукова-даследчыя інстытуты: педагогікі, харчовай прамысловасці, азёрна-рачной і рыбнай гаспадаркі, будаўнічых матэрыялаў, эпідэміялогіі, мікрабіялогіі і гігіены, скурна-венералагічны, аховы мацярынства і дзяцінства, пералівання крыві, туберкулёзны, санітарны, неўралогіі і нейрахірургіі, артапедыі і траўматалогіі, навукова-даследчая станцыя Міністэрства сельскай

гаспадаркі СССР і БССР. Навукова-даследчай работай займаліся супрацоўнікі Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Немалую навукова-даследчую работу праводзілі таксама супрацоўнікі ВНУ сталіцы. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 1955 годзе распрацаваў 150 навуковых тэм у галіне матэматыкі, фізікі, біялогіі, глебазнаўства, геалогіі, геаграфіі, гісторыі, фізіялогіі, філасофіі, прававодства і інш. Вялікае народнагаспадарчае значэнне мелі навуковыя праблемы, якія распрацоўваліся вучонымі Беларускага політэхнічнага інстытута.

2. Культурна-асветная работа. Друк

Побач з гаспадарчым будаўніцтвам у пасляваенныя гады праводзілася вялікая культурна-асветная работа сярод насельніцтва сталіцы. Яна заўсёды стаяла ў цэнтры ўвагі гарадской партыйнай арганізацыі. Толькі ў першым паўгоддзі 1947 года культурна-асветнай рабоце былі прысвечаны тры пасяджэнні бюро гаркома партыі. У рашэнні бюро ад 22 мая была станоўча адзначана работа ў гэтым напрамку партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый аўтамабільнага завода. Тут быў абсталяваны клуб, стацыянарная кінаўстаноўка, створаны бібліятэкі мастацкай і тэхнічнай літаратуры, у якіх налічвалася 9,5 тысячы кніг, арганізаваны гурткі мастацкай самадзейнасці. У клубе сістэматычна чыталіся для рабочых лекцыі і даклады на палітычныя, літаратурныя і іншыя тэмы, дэманстраваліся кінафільмы, ставіліся спектаклі, арганізоўваліся канцэрты, камсамольска-маладзёжныя вечары.

У снежні 1954 года стан і меры паляпшэння культурна-асветнай работы ў Мінску абмяркоўвала спецыяльная сесія гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

Пастаянныя клопаты і ўвага з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый садзейнічалі расшырэнню сеткі культурна-асветных устаноў горада, паляпшэнню іх дзейнасці. Настойліва ажыццяўляючы ўказанні Камуністычнай партыі, культасветныя ўстановы праводзілі вялікую работу па камуністычнаму выхаванню працоўных, павышэнню свядомасці і актыўнасці мас.

Важная роля ў культурна-асветнай рабоце належала друкаванай прапагандзе. У пасляваенныя гады Камуністычная партыя прыняла рад мер па пашырэнню выданняў перыядычнага друку, палепшанню ідэйнага зместу газет і часопісаў. Да пачатку 1946 года ў Мінску

выдавалася дзевяць газет і восем часопісаў. У наступныя гады іх колькасць павялічылася, і, такім чынам, у канцы 1958 года ў сталіцы ўжо выдавалася 11 газет і 12 часопісаў. Некаторыя з іх выходзілі адначасова на беларускай і рускай мовах.

Вялікая колькасць перыядычных выданняў распаўсюджвалася сярод насельніцтва Мінска. За 13 год (з 1946 па 1958) колькасць газет, якія атрымлівалі мінчане па падпісцы, павялічылася больш чым у шэсць, а часопісаў — амаль у 38 разоў. Разавы тыраж перыядычных выданняў па падпісцы ў Мінску да канца 1958 года склаў: газет — больш 183 тысяч, часопісаў — 140 тысяч экземпляраў.

З кожным годам усё шырэй разгортвалася работа па выданню кніжнай прадукцыі. Побач з аднаўленнем прамысловых прадпрыемстваў аднаўляліся выдавецтвы і паліграфічная база. Апрача існаваўшых з часу заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Дзяржаўнага выдавецтва БССР і выдавецтва «Звязда», на працягу 13 пасляваенных год былі адкрыты Вучэбна-педагагічнае (1951), Выдавецтва Акадэміі навук БССР (1947) і Акадэміі сельскагаспадарчых навук, а таксама Белдзяржуніверсітэта.

Дзякуючы велізарнай дапамозе вялікага рускага народа ў кароткі тэрмін былі адноўлены і аснашчаны першакласным паліграфічным абсталяваннем усе друкарні Мінска. Гэта дало магчымасць з кожным годам павялічваць выпуск кніжнай прадукцыі.

У пасляваенны час (да 1958 г.) у Мінску было выдана 8305 назваў палітычнай, мастацкай і навуковай літаратуры агульным тыражом 156 тысяч экземпляраў.

Хуткімі тэмпамі вяліся работы па радыёфікацыі. Да канца 1959 года ў сталіцы налічвалася звыш 66 тысяч радыёкропак.

З пачатку 1956 года пачаў працаваць тэлевізійны цэнтр, перадачы якога ўжо ў першыя месяцы яго работы пачалі прымаць і жыхары Мінскай вобласці і некаторых раёнаў за яе межамі. З кожным днём павышаўся ідэйна-палітычны, мастацкі і тэхнічны ўзровень радыё- і тэлеперадач.

У культурным жыцці мінчан з году ў год узрастала роля кіно. Важную ролю ў развіцці кінасеткі адыграў XX з'езд КПСС, які абавязаў мясцовыя партыйныя органы прыняць меры да павелічэння вытворчасці кінакарцін, па павышэнню іх ідэйна-мастацкага ўзроўню і расшырэнню кінасеткі.

У верасні 1958 года выканком Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных прыняў спецыяльнае рашэнне «Аб паляпшэнні кінаабслугоўвання насельніцтва горада Мінска», у якім былі намечаны канкрэтныя меры па шырокаму ўкараненню кіно ў быт працоўных.

Ажыццяўляючы рашэнні з'езду, у сталіцы няспынна расла сетка кінаўстановак, вялося будаўніцтва летніх кінатэатраў і пляцовак. За

1950—1958 гады было адкрыта 16 гарадскіх кінатэатраў і да пачатку 1959 года ў Мінску іх налічвалася 18. Апрача таго, фільмы дэманстраваліся ў клубах і Палацах культуры. Усяго ў 1958 годзе ў сталіцы працавала 56 кінаўстановак.

Вялікая работа была праведзена і па аднаўленню і стварэнню новых бібліятэк, расшырэнню іх фондаў. У камплектаванні мінскіх бібліятэк аказалі велізарную дапамогу бібліятэкі многіх гарадоў Савецкага Саюза. Гордасцю працоўных Беларусі з'яўляецца бібліятэка імя У. І. Леніна — буйнейшая скарбніца кніг рэспублікі. Яе будынак, які пацярпеў у гады фашысцкай акупацыі, быў поўнасцю адноўлен. Была таксама праведзена вялікая работа па аднаўленню кніжнага фонду, што быў знішчаны і разграблены фашыстамі. У бібліятэцы побач з усёй сучаснай літаратурай, якая выдаецца ў СССР, і лепшымі творамі, што выходзяць за рубяжом, захоўваліся вельмі рэдкія выданні мінулага. Сярод іх можна было сустрэць кнігі вядомых беларускіх асветнікаў Георгія Скарыны, «Граматыку» Мілеція Сматрыцкага, а таксама кнігі з уласнай бібліятэкі вядомага вучонага Я. Ф. Карскага. За пасляваенныя гады кніжны фонд бібліятэкі стаў значна большым, чым ён быў да вайны. За гэты час чытальныя залы бібліятэкі штодзённа наведвала каля дзвюх тысяч чытачоў, сярод іх вучоныя, аспіранты, студэнты, рабочыя, служачыя і інш.

Вялікую культурна-асветную работу вялі музеі горада. Пасля вайны быў адноўлен Дом-музей I з'езду РСДРП, адкрыт Геолага-мінералагічны і Заалагічны музеі БДУ, Геалагічны музей АН БССР. У 1957 годзе пачаў працаваць Дзяржаўны мастацкі музей БССР па вуліцы Леніна, дзе размясцілася адноўленая пасля вызвалення Мінска карцінная галерэя. Была праведзена значная работа з мэтай папаўнення яе новымі экспанатамі па гісторыі дарэвалюцыйнага рускага, беларускага і савецкага мастацтваў. Удалося набыць таксама творы заходнееўрапейскага і ўсходняга мастацтва.

Важнае месца ў сістэме вуснай прапаганды займала лекцыйная дзейнасць. У 1947 годзе было арганізавана Рэспубліканскае таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў, а ў 1949 — створана мінскае абласное аддзяленне гэтага таварыства. Апрача таго, лекцыйную прапаганду сярод працоўных горада праводзіла Цэнтральнае лекцыйнае бюро Міністэрства культуры БССР, якое ў 1957 годзе было аб'яднана з Таварыствам па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў.

Вялікую культурна-асветную работу ў Мінску разгарнулі клубныя ўстановы. Свае клубы або Дамы культуры мелі ўсе буйныя прамысловыя прадпрыемствы, навучальныя ўстановы і многія іншыя арганізацыі і ведамствы. У 1958 годзе налічвалася 43 клубныя ўстановы, у тым ліку некалькі Палацаў і Дамоў культуры.

Пасля вайны адноўлены Акруговы дом афіцэраў і Палац піянераў. У 1949 годзе пабудаван Дом культуры трэста «Аўтапрамбуд», а ў 1956 закончана будаўніцтва на Цэнтральнай плошчы Палаца культуры прафсаюзаў. У яго выдатным і добраабсталяваным памяшканні з 1958 года працуе універсітэт культуры, дзе працоўныя горада набываюць веды ў галіне навукі і тэхнікі, музыкі, харэаграфіі, выяўленчага мастацтва і кінематаграфіі. Чытанне лекцый тут суправаджаецца кінафільмамі, дэманстрацыяй навінак навукі і тэхнікі. Палац прафсаюзаў стаў адным з сапраўдных цэнтраў культурна-асветнай работы сталіцы.

3. Літаратура

Дзякуючы няспынным клопатам партыі аб творчасці савецкіх пісьменнікаў, аб ідэйнай накіраванасці іх твораў новых поспехаў дасягнула літаратура Беларускай ССР. Амаль усе члены Саюза пісьменнікаў БССР жылі і працавалі ў беларускай сталіцы. У снежні 1945 года ў Мінску адбыўся пленум Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР, які абмеркаваў задачы беларускай літаратуры ў перыяд аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. У рашэнні пленума было адзначана, што асноўнай задачай беларускіх літаратараў павінен быць яркі і праўдзівы паказ жыцця і барацьбы народа-воіна, народа-стваральніка.

Вялікай падзеяй у літаратурным жыцці горада былі другі (1949) і трэці (1954) з'езды пісьменнікаў БССР, што праходзілі ў Мінску. У справаздачных дакладах П. У. Броўкі быў дадзен усебаковы глыбокі аналіз развіцця ўсіх жанраў беларускай літаратуры ў гады пасляваенных пяцігодак, вызначаны задачы пісьменнікаў у сацыялістычным будаўніцтве.

За пасляваенны час сталічны атрад літаратараў Беларусі папоўніўся маладымі пісьменнікамі. Далёка за межамі рэспублікі сталі вядомы імёны таленавітых празаікаў і паэтаў І. Шамякіна, І. Мележа, М. Ткачова, І. Грамовіча, А. Вялюгіна, К. Кірэенкі і многіх іншых. У цэлым пісьменніцкая арганізацыя рэспублікі за гэтыя 13 год выраслa больш чым у два разы, да канца 1958 года налічвала ў сваіх радах 170 чалавек.

У параўнанні з другімі перыядамі свайго развіцця беларуская літаратура пасляваеннага часу стала больш разнастайнай і шырэйшай па сваёй тэматыцы. Ідучы па шляху сацыялістычнага рэалізму, яна ў пасляваенныя гады ўзнялася на новую ступень, узбагацілася многімі новымі выдатнымі творамі, у якіх адлюстраваны гераіка і подзвігі савецкіх людзей у гады вайны і мірнага пасляваеннага часу.

Раманы «Векапомныя дні» М. Лынькова, «Мінскі напрамак» І. Мележа, «Глыбокая плынь» І. Шамякіна, «Згуртаванасць» М. Ткачова, п'есы «З народам» К. Крапівы, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча і іншыя з'яўляюцца творамі, у якіх адлюстравана гераічная барацьба беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Добры пачатак беларускай мемуарнай літаратуры пакладзен творамі «Партызанскі край» В. Лівенцава, «Людзі асобага складу» В. Казлова, «Партызанскія агні» Г. Шчарбатава. У гэтых кнігах узноўлены падзеі з жыцця і барацьбы беларускага народа ў тыле ворага ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі, расказана пра баявую дзейнасць людзей асобага складу — камуністаў і савецкіх патрыётаў, якія ўзнімалі на барацьбу народ супраць германскага фашызму.

Гераічнае мінулае беларускага народа знайшло сваё адлюстраванне ў трылогіі Я. Коласа «На ростанях», якую скончыў аўтар у 1954 годзе. У ёй дана шырокая карціна жыцця беларускага сялянства і сельскай інтэлігенцыі ў пачатку XX стагоддзя.

У аповесцях «Цёплае дыханне» М. Паслядовіча, «Гартаванне» А. Кулакоўскага, «Зарава над лесам» В. Лютавай, у п'есе «Зацікаўленая асоба» К. Крапівы, у нарысах і апавяданнях І. Грамовіча і Я. Брыля, у лірычных вершах П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, К. Кірэенкі, А. Вялюгіна пакладзен пачатак паказу подзвігаў рабочага класа Беларусі на франтах мірнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Больш шырока і ўсебакова распрацоўвалася ў пасляваенны час беларускімі пісьменнікамі тэма калгаснага будаўніцтва. Ёй былі прысвечаны раманы «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча, «У добры час» І. Шамякіна, «Шырокія гарызонты» А. Стаховіча і многія іншыя літаратурныя творы.

Высакароднай працы сельскай інтэлігенцыі прысвечаны паэмы «Добры друг» і «Родныя берагі» П. Броўкі. У 1957 годзе выйшаў у свет яго раман «Калі зліваюцца рэкі», у якім адлюстравана дружба трох братніх народаў — беларускага, літоўскага і латышскага. У 1958 годзе гэты твор выйшаў у перакладзе на рускую мову.

Паэма Я. Коласа «Рыбакова хата», раман П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», аповесць Я. Брыля «У Забалоцці днее», зборнік лірычных вершаў М. Танка «На камні, жалезе і золаце» прысвечаны барацьбе працоўных Заходняй Беларусі. У іх адлюстраван працэс сацыялістычных пераўтварэнняў у гэтых абласцях БССР.

Творы, якія адлюстроўваюць барацьбу савецкага народа за мір, стварылі М. Танк (паэма «За мір»), А. Куляшоў (паэмы «Простыя людзі», «Толькі ўперад», верш «Слова да Аб'яднаных Нацый»), П. Броўка («Размова з папай Піем»), П. Панчанка (зборнікі «За шчасце, за мір», «Сцяганосцы міру») і іншыя пісьменнікі.

У паслявaенныя гады праводзіліся дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. Першая пасля вайны дэкада адбылася ў сувязі з 30-годдзем БССР у 1949 годзе, другая — ў лютым 1955 года. У час дэкады на выстаўцы беларускай кнігі ў Цэнтральным доме літаратараў былі прадстаўлены лепшыя творы беларускай мастацкай літаратуры. У пісьменніцкіх арганізацыях сталіцы Радзімы з удзелам шырокай грамадскасці праходзілі выступленні беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, праводзілася грунтоўнае абмеркаванне іх твораў.

Дэкады з'явіліся сур'ёзным аглядам майстэрства і творчых магчымасцей беларускіх пісьменнікаў і адыгралі важную ролю ў далейшым уздыме беларускай савецкай літаратуры, яшчэ больш умацавалі братнія сувязі беларускага і рускага народаў. Сведчаннем росту братніх сувязей беларускага народа з іншымі народамі Савецкай краіны, адным з паказчыкаў узмацнення інтэрнацыянальных сувязей з краінамі народнай дэмакратыі з'яўляецца выданне твораў беларускіх пісьменнікаў за межамі нашай рэспублікі на рускай, украінскай, літоўскай, польскай, венгерскай, румынскай, балгарскай і іншых мовах.

Многія творы беларускіх пісьменнікаў атрымалі прызнанне савецкай грамадскасці. За 1946—1953 гады 11 кніг пісьменнікаў БССР былі ўдастоены дзяржаўных прэмій. Лаўрэатамі дзяржаўных прэмій сталі Я. Колас, К. Крапіва, П. Броўка, М. Танк, І. Шамякін, А. Кулешоў, Я. Брыль. Асабліва высока была адзначана творчасць выдатнага беларускага драматурга і байкапісца Кандрата Крапівы. У 1956 годзе ўрад Беларускай ССР прысвоіў яму званне народнага пісьменніка рэспублікі.

Беларуская савецкая літаратура перыяду 1946—1958 гадоў зрабіла значны крок уперад, яна ішла ў нагу з жыццём па шляху сацыялістычнага рэалізму, адлюстроўваючы шматграннае жыццё свайго народа.

4. Мастацтва. Народная творчасць

Мінск — буйнейшы цэнтр беларускага мастацтва. Тут пасля вайны зноў сталі працаваць оперны і драматычныя тэатры, прафесіянальныя канцэртныя выканаўчыя калектывы, кінастудыі, музычныя і тэатральна-мастацкія навуковыя ўстановы, філармонія і творчыя саюзы кампазітараў, мастакоў, архітэктараў.

За паслявaенныя гады дзеячы музычнага мастацтва стварылі рад новых таленавітых твораў. Так, кампазітар Я. Цікоцкі ў 1948 годзе ўзяўся за перапрацоўку оперы «Алеся», напісанай ім яшчэ ў гады

Вялікай Айчыннай вайны. Паклаўшы ў аснову лепшыя вакальныя нумары з «Алесі», аўтар стварыў к канцу 1952 года оперу «Дзяўчына з Палесся» па новаму лібрэта П. Броўкі і Я. Рамановіча. Музыка оперы, у якой шырока выкарыстаны беларускія народныя мелодыі, з вялікім эмацыянальным уздымам перадае пафас усенароднай барацьбы за свабоду і незалежнасць сацыялістычнай радзімы. Жыццёва праўдзівая опера Я. Цікоцкага, па-майстэрску пастаўленая тэатрам у 1953 годзе, з'яўляецца яркім сведчаннем таго, што мастацтва беларускага народа вырасла, узмужнела, стала багацейшым і прыгажэйшым, а яго патрыятычная тэма стала гучаць больш моцна, ярка, палымяна. Опера «Дзяўчына з Палесся» была цёпла сустрэта гледачамі і атрымала высокую ацэнку на дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1955 г.), а яе аўтару Я. Цікоцкаму было прысвоена высокае званне народнага артыста Саюза ССР.

У 1955 годзе новую оперу «Марынка» напісаў кампазітар Р. Пукст. У гэтым творы расказваецца пра слаўныя гераічныя подзвігі юных патрыётаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1957 годзе была пастаўлена беларуская опера «Надзежда Дурава» А. Багатырова. Значнай падзеяй у музычным жыцці рэспублікі было з'яўленне ў 1958 годзе на сцэне новай оперы А. Туранкова «Яснае світанне». Яна прысвечана барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту ва ўмовах буржуазна-памешчыцкай Польшчы. У гэтай оперы аўтар стварыў арыгінальную нацыянальную музыку, блізкую па стылю да беларускай народнай песні.

Вялікая роля ў развіцці беларускай балетнай музыкі належыць кампазітару старэйшага пакалення народнаму артысту БССР прафесару В. Залатарову. Ім напісан па матывах беларускіх паданняў балет «Князь-возера». Некалькі зменены варыянт гэтага балета пад назвай «Палымяныя сэрцы» быў уключан у праграму дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1955 г.).

У пасляваенныя гады тэатр аднавіў балет М. Крошнера «Салавей». У адрозненне ад даваеннай пастаноўкі спектакль у новай рэдакцыі больш ярка раскрываў барацьбу беларускага народа супраць сваіх прыгнятальнікаў. У канцы 1958 года быў пастаўлен балет Г. Вагнера «Падстаўная нявеста». Драматург Я. Рамановіч у сваім лібрэта для гэтага твора шырока выкарыстаў народныя традыцыі і вобразы. Сюжэт балета «Падстаўная нявеста» адлюстроўвае класавую барацьбу ў Заходняй Беларусі ў пачатку XX ст.

Оперным тэатрам таксама былі паказаны ў абноўленай рэдакцыі спектаклі рускай класікі «Русалка», «Яўгеній Анегін», «Пікавая дама», «Царская нявеста», «Князь Ігар» і зноў пастаўлены «Чаравічкі»,

«Мазепа», «Іаланта» Чайкоўскага, «Іван Сусанін» Глінкі, «Алека» Рахманінава, «Дэман» Рубінштэйна, «Барыс Гадуноў» Мусаргскага. З опер заходнееўрапейскіх кампазітараў трывала ўвайшлі ў рэпертуар тэатра «Кармэн», «Фауст», «Травіята», «Рыгалета».

Вялікім поспехам у беларускага гледача карысталіся пастаноўкі опер украінскага кампазітара Гулак-Арцямоўскага «Запарожац за Дунаем», чэшскага кампазітара В. Сметаны «Праданая нявеста» і польскага кампазітара С. Манюшкі «Страшны двор». Апошняя была ўключана ў дэкадны рэпертуар тэатра ў 1955 годзе.

На сцэне тэатра з поспехам ішлі класічныя творы рускага балета «Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня», «Шчаўкунчык». Тэатр ставіў таксама лепшыя творы савецкага опернага і балетнага мастацтва. Была адноўлена на сцэне ў новай пастаноўцы опера «Ціхі Дон», паказаны гледачу савецкія балеты «Бахчысарайскі фантан» і «Чырвоны мак».

Заслужаным поспехам карысталіся ў пастаноўцы тэатра беларускія нацыянальныя спектаклі.

У тэатры працавалі таленавітыя майстры опернага і балетнага мастацтва. Сярод іх Л. Александроўская, Р. Млодэк, М. Зюванаў, М. Дзянісаў, І. Балоцін, С. Друкер, С. Дрэчын, А. Нікалаева, Н. Сярдобаў, Л. Ражанава, Т. Ніжнікава, К. Кудрашова, Н. Давыдзенка, В. Міронаў, Н. Младзінская, Т. Пастуніна, Г. Цэпава, Т. Шымко і інш. За поспехі, дасягнутыя ў развіцці опернага мастацтва Беларусі ў 1946—1959 гадах, 29 творчых работнікаў тэатра оперы і балета былі ўдастоены ганаровых званняў народнага артыста БССР, заслужанага артыста БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў.

За гэтыя гады беларускія кампазітары стварылі шэраг буйных сімфанічных твораў. Лепшымі з іх з'явіліся 1-я сімфаньета М. М. Чуркіна і 3-я сімфонія М. Аладава. Яны выконваліся ў дэкадным канцэрце 1955 года ў Вялікай зале Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя Чайкоўскага і атрымалі ўсеагульнае адабрэнне сярод музычнай грамадскасці сталіцы. Сімфанічны жанр беларускай музыкі пасля вайны ўзбагаціўся буйнымі творамі Я. Цікоцкага, У. Алоўнікава, П. Падкавырава, А. Багатырова.

У пасляваенныя гады былі дасягнуты таксама поспехі ў далейшым развіцці іншых жанраў беларускага музычнага мастацтва. Напісаны новыя кантаты, творы для народнага аркестра, камерна-інструментальнай музыкі, харавыя і сольныя песні.

Майстрам кантатна-аратарыяльнага жанру праявіў сябе А. Багатыроў. Яго кантата «Беларусь» на словы Я. Купалы, П. Броўкі, П. Труса вылучаецца меладычнасцю мовы, блізкай да народнай песні. Шырокую папулярнасць набылі беларускія песні Н. Сакалоўскага, І. Любана, Ю. Семянякі. Усенароднае прызнанне атрымалі песні

кампазітара У. Алоўнікава «Радзіма мая дарагая», «Лясная песня», «Песня аб Заслонаве» і інш.

Ішло ў нагу з жыццём і драматычнае тэатральнае мастацтва сталіцы. Асабліва вялікія дасягненні Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. У яго калектыве выраслі і вядуць шматгадовую творчую працу таленавітыя артыстычныя сілы. На сцэне тэатра выступалі народныя артысты СССР Г. Глебаў, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, У. Уладамірскі і П. Малчанаў, народныя артысты БССР К. Саннікаў, І. Ждановіч, В. Галіна, В. Пола, У. Дзядзюшка і інш.

У пасляваенны рэпертуар драматычнага тэатра ўвайшлі творы рускай і замежнай класічнай драматургіі, сучасныя п'есы савецкіх пісьменнікаў і нацыянальныя творы беларускіх драматургаў. Тэматыка рэпертуару тэатра стала багатай і разнастайнай па свайму зместу.

Тэатр пасля вайны паказаў гледачу спектаклі «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «З народам», «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Глыбокія карэнні» Гоу і Д'Юсо, «Маскоўскі характар» А. Сафронава, «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка, «Крылы» А. Карнейчука і інш. У тэатры ставілася п'еса М. Пагодзіна «Крамлёўскія куранты», у якой акцёр П. Малчанаў паспяхова выканаў ролю У. І. Леніна.

Беларускі тэатр імя Янкі Купалы ўжо даўно заваяваў усесаюзную вядомасць, дасягнуўшы вялікіх поспехаў у авалоданні мастацтвам сацыялістычнага рэалізму. Яго палюбілі на Украіне, з ім пазнаёміліся гледачы ў гарадах і сёлах Сібіры. У лютым 1955 года тэатр сёмы раз наведаў Маскву. На дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ён з поспехам выступаў у памяшканні філіяла МХАТа і заслужана заваяваў любоў і павагу гледачоў Масквы.

Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя А. М. Горкага таксама стварыў рад цікавых, глыбока змястоўных спектакляў. Сярод іх заслужаным поспехам карысталіся «Разлом» Б. Лаўранёва, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «За другім фронтам» В. Сабко, «Аптымістычная трагедыя» Ус. Вішнеўскага, а таксама «Цар Фёдар Іаанавіч», «Шалёныя грошы», «Варвары». На сцэне тэатра з поспехам выступалі артысты А. Кістаў, Г. Качаткоў, Я. Карнаухаў, А. Абуховіч, Е. Палосін і інш.

Сведчаннем высокай ацэнкі дзейнасці драматычных тэатраў Мінска з'яўляецца прысваенне акцёрам і рэжысёрам ганаровых званняў. Так, за 1946—1958 гады ўрад Беларускай ССР прысвоіў званні народнага артыста БССР, заслужанага артыста БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў 25 работнікам драматычных тэатраў сталіцы. У 1956 годзе ў Мінску пачаў сваю дзейнасць Беларускі тэатр юнага гледача.

Вялікую работу ў галіне беларускага савецкага мастацтва вялі прафесіянальныя музыкальныя калектывы — Дзяржаўная акадэмічная капела БССР, Беларускі дзяржаўны народны аркестр, Белдзяржфілармонія, Белдзяржэстрада, Ансамбль песні і танца Беларускай ваеннай акругі.

Побач з іншымі відамі мастацтва беларускі народ развіваў і сваё нацыянальнае кінамастацтва.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны кінастудыя «Беларусьфільм» стала паступова наладжваць выпуск мастацкай кінапрадукцыі. На экраны краіны былі выпушчаны «Новы дом», «Дзеці партызана», «Міколка-паравоз», «Палеская легенда», «Шчасце трэба берагчы» і інш. Асабліва вялікім поспехам у гледача карысталіся кінакарціны «Чырвонае лісце» (аб барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі супраць сваіх прыгнятальнікаў) і «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (аб патрыятычнай дзейнасці мінскіх падпольшчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны).

Значны ўклад у культурнае жыццё свайго народа ўнеслі мастакі сталіцы Беларусі, якія стварылі многа новых жывапісных, скульптурных і графічных твораў на розныя тэмы барацьбы і працы савецкіх людзей. За пасляваенны час рады беларускіх мастакоў значна выраслі. Калі ў 1946 годзе ў Саюзе мастакоў БССР быў 41 чалавек, то праз 13 гадоў гэты калектыў вырас да 117.

Вялікае месца сярод твораў розных жанраў выяўленчага мастацтва заняла тэматыка, звязаная з гераічным мінулым савецкага народа, і ў прыватнасці з яго ўдзелам у Вялікай Айчыннай вайне супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З карцін гісторыка-рэвалюцыйнага жанру найбольшай увагі заслугоўвае палатно А. Д. Шыбнёва «Ёсць такая партыя». Карціна старэйшага мастака рэспублікі В. Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года» з'яўляецца адной з лепшых сярод вялікай групы палотнаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. Буйным творам, прысвечаным гераізму Савецкай Арміі ў дні Айчыннай вайны, з'яўляецца палатно Я. Зайцава «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе». Ярка адлюстроўваюць партызанскае жыццё карціны «За родную Беларусь» В. Сухаверхава, «Партызаны ў разведцы» Я. Зайцава, «Палонных вядуць» А. Шыбнёва і інш. Сярод твораў, якія адлюстроўваюць працу, жыццё і быт беларускага народа, вылучаюцца карціны В. Волкава «Вузаўцы», Р. Кудрэвіч «У родным калгасе», Г. Бржазоўскага «На родных палях», творы В. Сухаверхава, Х. Ліўшыца, Я. Ціхановіча і інш. Сярод прац мастакоў-пейзажыстаў цікавымі з'яўляюцца карціны В. Бялыніцкага-Бірулі. Яго пейзажы «Прыцемкі юнага мая», «Па слядах разбітага ворага», «Зноў зацвіла вясна» поўныя прыгажосці і лірыкі. Прыцягваюць увагу і выдатныя пейзажы В. Кудрэві-

ча «Вечар на возеры Палік», Я. Зайцава «Дубкі», В. Цвіркі «Ці...
ня», А. Шыбнёва «Прыцемкі», Ф. Дарашэвіча «Паплавы ракі Вят...
ны» і іншыя творы.

Сярод скульптурных прац з'явіліся вядомыя творы З. Азгура — бюсты Ф. Э. Дзяржынскага, Лу Сіня і інш. Арыгінальнасцю вылу... чаецца партрэт У. І. Леніна працы А. Бембеля. Натхнёным, праўдз... вым і прыемным па пластыцы лепкі з'яўляецца барэльеф гэтага... скульптара «Беларуска». Скульптар А. Глебаў стварыў выдатны... вобраз Георгія Скарыны. Цікавы вобраз пісьменніка М. Я. Салты... кова-Шчадрына стварыў скульптар С. Селіханаў. З прац маладога... скульптара В. Палійчука заслугоўвае ўвагі вобразны, праўдзівы... твор «Ранены воін». Удала выканана скульптура В. Козак «Дзяўчы... на з кнігай».

Плённа працавалі архітэктары горада. Імі ў пасляваенным Мін... ску створан вялікі высокамастацкі архітэктурны ансамбль — Ленін... скі праспект. Забудова праспекта вялася буйнымі комплексамі, якія ўключалі прыгожыя жылыя дамы, што чаргаваліся з грамадскімі будынкамі і зялёнымі масівамі. Яе вырашыла вялікая група архітэктараў: Паруснікаў, Баданаў, Баталаў, Кароль, Гегарт, Асмалоўскі і інш.

Са шматлікіх мінскіх будынкаў пасляваеннага часу высокімі архітэктурнымі якасцямі выдзяляюцца на Ленінскім праспекце адміністрацыйны будынак паміж вуліцамі Урыцкага і Камсамольскай, Галоўпаштамт, жылыя дамы па вуліцы Леніна, адміністрацыйны будынак на Чырвонай вуліцы і інш.

Вялікае ідэйна-мастацкае значэнне мае скульптурнае афармленне Мінска — 40-метравы абеліск на плошчы Перамогі з барэльефамі вакол яго пастамента, бюсты-помнікі Я. Купалу, Ф. Э. Дзяржынскаму, а таксама дэкаратыўныя рэльефы на ўнутраных і знешніх сценах будынкаў.

Павышэнне агульнага ўзроўню адукаванасці насельніцтва, далейшы рост прафесіянальнага майстэрства дзеячаў культуры і мастацтва забяспечылі значныя поспехі беларускага народа ў развіцці яго вуснапаэтычнай творчасці, масавай мастацкай самадзейнасці, усіх відаў народнай творчасці ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У 1955 годзе ў клубах, чырвоных кутках прадпрыемстваў, установ, навуковых устаноў Мінска працавала каля 300 гурткоў мастацкай самадзейнасці, у якіх налічвалася звыш шасці тысяч чалавек. К канцу 1958 года колькасць удзельнікаў мастацкай самадзейнасці дасягнула больш дзевяці тысяч чалавек.

Сярод розных відаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Мінска найбольш шырокае распаўсюджанне атрымала ма-

стацкая вышыўка. Многія аматары гэтага мастацтва былі аб'яднаны ў гурткі пры клубах, Дамах культуры, розных установах.

Вышывальшчыцы Мінска, аб'яднаныя абласным Домам народнай творчасці, з любасцю вышылі мастацкай гладдзю партрэт У. І. Леніна. Высокамастацкія творы створаны ў гуртку вышыўкі пры Мінскім акруговым доме афіцэраў. Найбольш цікавымі з іх з'яўляюцца партрэт народнага паэта БССР Якуба Коласа і пано-габелен «Навекі разам», прысвечаны 300-годдзю ўз'яднання Украіны з Расіяй. Абодва гэтыя творы былі паказаны на дэкаднай выстаўцы 1955 года ў Акадэміі мастацтваў СССР у Маскве.

Добра вядома ў Мінску і мастацкая апрацоўка дрэва — інкрустацыя, мазаіка, разбярства. Таленавітым майстрам інкрустацыі паказаў сябе К. Цяўлоўскі. У яго працах «Уборка ўраджаю камбайнам» і «Зубры Белавежскай пушчы» тонка перададзена прыгажосць беларускай прыроды. Заслужылі ўвагу грамадскасці працы інкрустатара Г. Гебелева. Сярод іх вылучаецца партрэт М. Горкага.

Здольным разбяром па дрэву зарэкамендаваў сябе А. Царкоўскі. Яго творы «Селянін і мядзведзь», «Лесаруб», «Лявоніха» вызначаюцца выразнасцю вобразаў, тонкай назіральнасцю, народным гумарам. Удачным творам з'яўляецца гарэльеф «Іван-царэвіч і шэры воўк», выкананы рабочым Мінскага аўтазавода М. Анішчанкам.

У галіне жывапісу паспяхова працаваў рабочы ліцейнага цэха аўтазавода А. Харэвіч. У яго карціне «Прыезд кінаперасоўкі ў калгас» знайшла сваё досыць удачнае вырашэнне адна з тэм нашай сучаснасці. Таленавіты мастак, які спрабаваў свае сілы і ў скульптуры, А. Харэвіч удзельнічаў у абласных і рэспубліканскіх выстаўках народнай творчасці.

Поспехі працоўных Мінска ва ўсіх галінах культуры сведчаць аб далейшым росце народных талентаў, аб тым, што беларускі народ у брацкай сям'і народаў Савецкага Саюза мае неабмежаваныя магчымасці для далейшага развіцця сваёй культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зместу.

РАЗДЗЕЛ XXIII

МІНСК У ПЕРЫЯД КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА (1959—1965 гады)

1. Прамысловасць Мінска ў сямігодцы

Савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі дасягнуў вялікіх поспехаў у будаўніцтве сацыялістычнага грамадства. Дасягненні ў развіцці народнай гаспадаркі і культуры стварылі ўмовы для ўступлення СССР у новы этап камуністычнага будаўніцтва.

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР падрыхтавалі праект кантрольных лічбаў развіцця эканомікі нашай краіны на 1959—1965 гады.

У агульнанародным іх абмеркаванні прымалі актыўны ўдзел і працоўныя Мінска. 14—15 студзеня 1959 года ў Мінску адбыўся Надзвычайны XXIII з'езд Кампартыі Беларусі. Дэлегаты з'езду зацвердзілі кантрольныя лічбы сямігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі на 1959—1965 гады як важную частку вялікай праграмы пабудовы камунізма ў СССР.

XXI з'езд КПСС, які праходзіў у Маскве з 27 студзеня па 5 лютага 1959 года, падвёў вынікі дасягненняў партыі і савецкага народа ў будаўніцтве сацыялістычнага грамадства і адобрыў план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады. Сямігадовы план вызначыў асноўныя задачы партыі і савецкага народа ў развіцці эканомікі, культуры, народнага забеспячэння, ва ўмацаванні магутнасці савецкай краіны і далейшага павышэння яе абароназдольнасці. У гэтым плане адлюстраваліся ленінскія клопаты Камуністычнай партыі аб развіцці эканомікі і культуры ўсіх рэспублік нашай многанацыянальнай краіны.

На развіццё народнай гаспадаркі БССР было адпушчана 32 мільярды

рублёў — больш чым у два разы ў параўнанні з папярэднім сямігоддзем. Прадугледжвалася павялічыць валавую прадукцыю прамысловасці рэспублікі ў 1,8, выраб электраэнергіі — у 2,6 раза.

На перыяд сямігодкі вялікія задачы ставіліся і перад прамысловасцю Мінска. Яе валавую прадукцыю намячалі павялічыць за сямігоддзе ў 1,8 раза. Такога росту аб'ёму прамысловай вытворчасці можна было дасягнуць не толькі шляхам будаўніцтва і ўвядзення ў эксплуатацыю новых прадпрыемстваў, але галоўным чынам за кошт лепшага выкарыстання вытворчых магутнасцей, комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі працэсаў, укаранення перадавой тэхналогіі, а таксама мадэрнізацыі і замены ўстарэлага абсталявання новым, больш прадукцыйным.

Мінчане актыўна ўключыліся ў барацьбу за выкананне вызначаных сямігадовым планам задач. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў горада бралі абавязацельствы датэрмінова выканаць запланаваныя заданні.

У ліку першых сярод спаборнічаўшых ішлі калектывы і ўдарнікі камуністычнай працы. Да сакавіка 1959 года толькі на прадпрыемствах і будоўлях Заводскага раёна Мінска ў спаборніцтва за званне калектыву камуністычнай працы ўключылася 146 брыгад і ўчасткаў, дзе працавала 2500 рабочых.

Пытанні спаборніцтва сістэматычна абмяркоўваліся на пленумах і пасяджэннях бюро партыйных камітэтаў, на сходах камуністаў і партыйнага актыву. Так, 21 сакавіка 1959 года на бюро Мінскага гаркома КПБ было разгледжана пытанне аб рабоце парткома аўтазавода па кіраўніцтву спаборніцтвам за званне брыгад камуністычнай працы. Бюро звярнула ўвагу ўсіх партыйных арганізацый горада на неабходнасць палепшыць кіраўніцтва спаборніцтвам. Выконваючы рашэнне гаркома КПБ, партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі падшыпнікавага, аўтамабільнага, трактарнага заводаў, завода аўтаматычных ліній і іншых прадпрыемстваў горада пачалі больш займацца пытаннямі спаборніцтва мас. Шырокае распаўсюджанне атрымалі тэматычныя вечары, нарады партыйна-гаспадарчага актыву, сходы членаў брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы. Партыйная арганізацыя Заводскага раёна арганізавала для ўдзельнікаў спаборніцтва чытанне цыкла лекцый. Напрыклад, на падшыпнікавым заводзе чыталіся лекцыі: «Што такое камунізм», «Якім будзе чалавек камуністычнага грамадства», «Тэхнічны прагрэс» і інш.

Важную ролю ў развіцці спаборніцтва адыгралі праводзімыя партыйнымі, прафсаюзнымі і камсамольскімі арганізацыямі рэспубліканскія, абласныя, гарадскія, раённыя, заводскія злёты, а таксама злёты па галінах прамысловасці.

У сакавіку 1960 года па ініцыятыве Мінскага гаркома КПБ быў праведзены гарадскі злёт удзельнікаў руху за камуністычную працу. Да гэтага часу за званне брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы змагалася ўжо звыш 30 тысяч рабочых горада. Вялікая група ўдзельнікаў спаборніцтва была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

XXIV з'езд Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў Мінску 17—19 лютага 1960 года, з задавальненнем адзначыў, што калектывы прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі датэрмінова выканалі план першага года сямігодкі, і ў гэтым вялікую ролю адыграла сацыялістычнае спаборніцтва.

Важнай падзеяй у развіцці ўсенароднага сацыялістычнага спаборніцтва з'явілася Усесаюзная нарада перадавікоў спаборніцтва за званне брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы. Яна праходзіла 27—30 мая 1960 года ў Крамлі.

Заклік удзельнікаў нарады ператварыць рух за камуністычныя адносіны да працы ў сапраўды ўсенародны знайшоў гарачы водгук у сэрцах працоўных Мінска. Рабочыя падшыпнікавага завода ўзялі абавязацельствы яшчэ шырэй разгарнуць спаборніцтва на прадпрыемстве, праявіць упартасць і настойлівасць у вынаходніцтве і выкарыстанні новых рэзерваў вытворчасці. Для іх гэта падзея была асабліва радаснай яшчэ і таму, што член іх калектыву ўдарнік камуністычнай працы Ф. П. Алексяевіч, які прымаў удзел у рабоце Усесаюзнай нарады, быў удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Рух за камуністычную працу набыў шырокі размах, ператварыўся ў магутную сілу. Да сакавіка 1965 года ў ім ужо ўдзельнічала больш 200 тысяч працоўных горада. Званне калектываў камуністычнай працы было прысвоена 992 цэхам, участкам, зменам, брыгадам, дзе працавалі 27 тысяч чалавек. Звання ўдарніка камуністычнай працы былі ўдастоены каля 40 тысяч чалавек.

26—28 верасня 1961 года ў Мінску адбыўся XXV з'езд Кампартыі Беларусі, які ад імя камуністаў і ўсіх працоўных рэспублікі аднадушна адобрыў распрацаваныя ЦК КПСС праекты Праграмы і Статута КПСС. З'езд падвёў вынікі першых год сямігодкі.

Значны ўклад у выкананне заданняў сямігадовага плана зрабілі к гэтаму часу і працоўныя Мінска. За 1959—1960 гады капітальныя ўкладанні дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў і арганізацый горада склалі 278 мільёнаў рублёў. Высокімі тэмпамі развівалася прамысловасць. Так, выпуск валавой прадукцыі склаў у 1961 годзе 147 працэнтаў, а прадукцыйнасць працы — 117 працэнтаў у параўнанні з 1958 годам.

За першыя два гады сямігодкі аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі горада павялічыўся на 37,2 працэнта. У 1960 годзе прадпрыемствы Мінска выпусцілі звыш задання сотні трактараў, аўтамабіляў, 1435 матацыклаў, 25 375 веласіпедаў, 9 тысяч наручных гадзіннікаў, мільёны штук падшыпнікаў і шмат іншай прадукцыі. Значна павялічыўся выпуск вырабаў лёгкай і харчовай прамысловасці. Сярэднегадавая колькасць рабочых у прамысловасці вырасла з 92,5 тысячы чалавек у 1958 годзе да 123,4 тысячы чалавек у 1961 годзе. На прамысловых прадпрыемствах у 1960 годзе працавала 4047 інжынераў і 7339 тэхнікаў. У 1961 годзе ў горадзе працавала 310 буйных і дробных прамысловых прадпрыемстваў.

У кастрычніку 1960 года быў датэрмінова ўведзены ў эксплуатацыю газаправод Дашава — Мінск, у выніку чаго прамысловыя прадпрыемствы і насельніцтва Мінска атрымалі прыродны газ. Неўзабаве сталіца рэспублікі атрымала электраэнергію Васілевіцкай ДРЭС.

У студзені 1961 года ў Заводскім раёне горада пачалося будаўніцтва новага буйнога прамысловага прадпрыемства — завода па вытворчасці дызельных маторaў. Яго будаванне ажыццёўлена за нябачана кароткі тэрмін — два гады. Першынец беларускага маторабудавання быў забяспечаны высокапрадукцыйным абсталяваннем, прызначаным для працы па аўтаматычнаму і паўаўтаматычнаму цыклу. Высокі ўзровень механізацыі і аўтаматызацыі панізіў працаёмкасць вырабу аднаго рухавіка ў тры разы ў параўнанні з іншымі заводамі такога ж тыпу. У канцы 1965 года маторны завод заняў адно з першых месц у спаборніцтве беларускіх прадпрыемстваў. Маторы з маркай ММЗ ідуць у многія раёны краіны.

У пачатку сямігодкі ў Мінску разгарнулася работа па тэхнічнаму пераабсталяванню прадпрыемстваў. На заводах і фабрыках былі распрацаваны планы комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў, і ў гэтым актыўны ўдзел прыняла грамадскасць. Ужо ў 1959 годзе на прадпрыемствах машынабудавання і прыборабудавання працавала 55 канвеерных і паточных ліній, было ўкаранёна 40 транспартных канвеераў, уведзена звыш 150 механізмаў на пагрузачна-разгрузачных работах, устаноўлена звыш 250 аўтаматаў і паўаўтаматаў, у тым ліку 25 станкоў з праграмным упраўленнем. Праводзілася механізацыя ліцейнай, кавальскай вытворчасці і зварачных работ. У 1960 годзе аўтазаводцы ўкаранілі 17 механізаваных паточных ліній па апрацоўцы дэталей. Калектыў падшыпнікавага завода зманціраваў тры аўтаматычныя лініі на базе дзеючага такарнага і шліфавальнага абсталявання. На заводзе запчастак была зроблена спецыяльная ўстаноўка для кансервацыі дэталей з ужываннем лятучых інгібітараў, што дало вялікую эканомію сродкаў. Наватары гадзіннікавага завода стварылі аўтаматычную лінію па апрацоўцы

вузла анкернай вілкі наручных гадзіннікаў «Зара», у выніку прадукцыйнасць працы на гэтай аперацыі павялічылася ў пяць разоў.

Праводзілася работа і па мадэрнізацыі абсталявання. На трактарным заводзе, напрыклад, у 1961 годзе было мадэрнізавана 197 адзінак абсталявання. Ад гэтага завод атрымаў эканамічны эфект у 166 тысяч рублёў, у той час як выдаткі склалі 70 тысяч рублёў.

У цэлым за сямігоддзе прадпрыемствы горада ўдасканалілі больш чатырох тысяч адзінак вытворчага абсталявання, выканалі вялікі аб'ём работ па павышэнню прадукцыйнасці дзеючых станкоў, прэсаў, машын і механізмаў.

Важнай падзеяй у жыцці мінчан, як і ўсяго савецкага народа, з'явіўся XXII з'езд КПСС, што праходзіў у Маскве 17—31 кастрычніка 1961 года. Пастановы XXII з'езду КПСС натхнілі калектывы прамысловых прадпрыемстваў Мінска на далейшую барацьбу за выкананне вытворчых планаў.

У час спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў сямігодкі на прадпрыемствах Мінска ўзнікла нямала каштоўных пачынаў, якія мелі важнае народнагаспадарчае значэнне. Далёка за межамі рэспублікі сталі вядомы імёны Герояў Сацыялістычнай Працы расточніка завода аўтаматычных ліній А. Н. Віташкевіча і шліфавальшчыка падшыпнікавага завода Ф. П. Алексяевіча, якія ў маі 1959 года першымі ў рэспубліцы адмовіліся ад паслуг наладчыкаў і перайшлі на самаабслугоўванне станкоў. Распаўсюджанне гэтага пачыну прынесла прадпрыемствам вялікую эканомію сродкаў. Так, на падшыпнікавым заводзе на другія ўчасткі было пераведзена 140 наладчыкаў, што забяспечыла на працягу трох год сямігодкі каля 1 мільёна рублёў умоўнай гадавой эканоміі.

З патрыятычным пачынам «навучыўся сам — навучы другога» выступіў у чэрвені 1960 года стругальшчык завода аўтаматычных ліній ударнік камуністычнай працы Л. І. Патаповіч. Следуючы яго прыкладу, на аўтамабільным заводзе ў 1963 годзе больш тысячы перадавікоў вытворчасці бясплатна навучалі рабочых розным спецыяльнасцям. Слесар-зборшчык гэтага завода ўдарнік камуністычнай працы В. В. Прыходчанка прапанаваў пачаць спаборніцтва за тэхнічны прагрэс на кожным рабочым месцы. Да сакавіка 1961 года яго пачын падтрымалі 191 брыгада і змена, дзе працавала 2029 чалавек. Наватары вытворчасці ўнеслі 1320 рацыяналізатарскіх прапаноў, укараненне часткі якіх дало прадпрыемству 143 096 рублёў эканоміі. Наватар падшыпнікавага завода Э. К. Квілінскі прапанаваў пачаць спаборніцтва за рытмічную працу, за работу па гадзіннаму графіку, за эканомію рабочага часу. Усёй краіне вядома імя ткачыхі Мінскага тонкасуконнага камбіната ўдарніцы камуністычнай працы Е. С. Лазарэнка, якая выступіла з заклікам разгарнуць спаборніцтва

за выдатную якасць прадукцыі і асваенне новых відаў вырабаў у скарочаныя тэрміны без паніжэння прадукцыйнасці працы і абсталявання. Прыкладу Е. С. Лазарэнка паследавалі многія рабочыя не толькі лёгкай, але і іншых галін прамысловасці, і не толькі на прадпрыемствах Мінска і Беларусі, але і шмат якіх гарадоў нашай радзімы.

Калектыў Мінскага падшыпнікавага завода выступіў ініцыятарам спаборніцтва за павышэнне трываласці і даўгавечнасці вырабляемай прадукцыі. Хутка знайшліся паслядоўнікі пачыну падшыпнікаўцаў не толькі на прадпрыемствах Мінска, але і на многіх заводах і фабрыках Беларусі. У снежні 1963 года Мінскі прамысловы абком КПБ і Дзяржкамітэт Савета Міністраў БССР па каардынацыі навукова-даследчых работ правялі ў Мінску абласную навукова-тэхнічную канферэнцыю, на якой быў абагульнены вопыт работы па павышэнню трываласці і даўгавечнасці машын, станкоў і прыбораў. Для таго каб каардынаваць праводзімыя ў гэтым напрамку работы, быў створаны на грамадскіх пачатках гарадскі тэхнічны савет па трываласці і даўгавечнасці машын, у які ўвайшлі высокакваліфікаваныя спецыялісты і вучоныя.

Шматлікіх паслядоўнікаў на мінскіх прадпрыемствах знайшлі каштоўныя пачыны, што зарадзіліся ў іншых гарадах рэспублікі і краіны. Так, рабочыя сталіцы горача падтрымалі выдатны прыклад камуністычнай свядомасці, праяўлены вышневалоцкай прадзільшчыцай Героем Сацыялістычнай Працы В. Гаганавай, якая перайшла на адстаючы ўчастак для таго, каб узняць яго да ўзроўню перадавых. Сярод першых паслядоўнікаў В. Гаганавай былі перадавікі мінскіх прадпрыемстваў — наладчыца трактарнага завода Герой Сацыялістычнай Працы Р. К. Прусава, майстар аўтазавода А. С. Сакалоў, майстар УНР-4 П. Падкапаеў, памочнік майстра камвольнага камбіната А. Гаўрылаў і многія іншыя. На Мінскім камвольным камбінаце к пачатку 1960 года на адстаючыя ўчасткі перайшлі 135 чалавек.

Шырокае распаўсюджанне ў прамысловасці Мінска атрымала ўзнікшая па ініцыятыве саратаўцаў сістэма бездэфектнага вырабу прадукцыі і здачы яе аддзелу тэхнічнага кантролю пасля першага прад'яўлення. Пачын саратаўцаў горача падтрымалі калектывы завода аўтаматычных ліній, трактарнага завода, камвольнага камбіната і іншых прадпрыемстваў горада, і гэта садзейнічала значнаму павышэнню якасці выпускаемых прамысловых вырабаў. На станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі сістэму бездэфектнага вырабу прадукцыі і здачы яе пасля першага прад'яўлення ўкаранілі ва ўсіх цэхах. Для большасці станочнікаў прадпрыемства галоўным кантралёрам якасці працы стала іх працоўнае сумленне.

Творчая актыўнасць рабочага класа Мінска ў барацьбе за датэрміновае выкананне сямігадовага плана ярка праявілася ў новым размаху руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў. На заводах, фабрыках, транспарце, будоўлях, у навукова-даследчых установах Мінска к маю 1965 года працавала каля 22 тысяч рацыяналізатараў — на восем тысяч больш у параўнанні з 1959 годам. У 1964 годзе яны ўнеслі 33 тысячы прапаноў, з якіх 20 700 укаранілі на прадпрыемствах, і гэта дало звыш 11 мільёнаў рублёў эканоміі.

9 кастрычніка 1959 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР былі ўстаноўлены ганаровыя званні «Заслужаны вынаходнік БССР» і «Заслужаны рацыяналізатар БССР». Гэтыя ганаровыя званні прысвоены шасці вынаходнікам і 61 рацыяналізатару рэспублікі, у тым ліку вялікай групе наватараў Мінска.

Добрымі справамі праславіўся ў гады сямігодкі слесар трактарнага завода заслужаны рацыяналізатар БССР Л. І. Свістун. У яго больш ста вынаходніцкіх прапаноў, укарананне якіх садзейнічала павышэнню прадукцыйнасці працы і дало заводу дзесяткі тысяч рублёў эканоміі.

Нястомны творчы пошук, імкненне прынесці больш карысці грамадству — характэрныя рысы ўдарніка камуністычнай працы рацыяналізатара аўтамабільнага завода В. Л. Гардзіеўскага. На яго рахунку больш 80 укаранёных прапаноў, 30 000 рублёў эканоміі. В. Гардзіеўскі — адзін са шматлікай арміі рацыяналізатараў завода, вынаходніцтвы якіх добра вядомы на многіх заводах краіны. Мінскія аўтазаводцы адаслалі за гады сямігодкі машынабудаўнікам розных гарадоў 1300 чарцяжоў са сваімі навінкамі, накіраванымі на паскарэнне тэхнічнага прагрэсу, павелічэнне выпуску прадукцыі, эканоміі матэрыялаў, энергіі, на далейшы ўздым прадукцыйнасці працы.

Заслужаны вынаходнік БССР галоўны канструктар СКБ-8 завода аўтаматычных ліній Ю. Н. Татараў, ствараючы канструкцыі аўтаматычных ліній, распрацаваў арыгінальную сілавую галоўку, якая працуе па прынцыпу электрамеханічнага дзеяння, сканструяваў кромкастругальны станок і ўкараніў рад іншых вынаходніцтваў, якія далі эканамічны эфект на суму каля 100 000 рублёў.

Значны ўклад у стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма ўнеслі за гады сямігодкі наватары мінскіх прадпрыемстваў В. С. Карпоўскі (домабудаўнічы камбінат № 1), П. М. Котаў (швейная фабрыка імя Крупскай), В. Н. Корбут (аўтазавод), Р. К. Жаўток (радыёзавод) і многія іншыя.

У сакавіку 1963 года ў Мінску быў створаны гарадскі савет наватараў. Толькі ў 1963 годзе па рэкамендацыях савета прадпрыемствы горада ўкаранілі звыш 20 тэхнічных навін (і гэта стварыла магчы-

масць сэканоміць дзесяткі тысяч рублёў), прынялі каля 60 рэкамендацый новых, больш дасканалых прылад і інструментаў.

Мінскія наватары прынялі актыўны ўдзел у дэманстрацыі работ рацыяналізатараў і вынаходнікаў Беларусі, якая была праведзена ў жніўні 1964 года ў Маскве на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Мінчане падрыхтавалі для ВДНГ больш 160 экспанатаў, якія характарызуюць дасягненні наватараў у металаапрацоўцы, радыётэхніцы, прамысловай энергетыцы і іншых галінах народнай гаспадаркі. Выстаўка-агляд сведчыла аб узросшай тэхнічнай пісьменнасці і майстэрстве беларускіх наватараў.

У гады сямігодкі на прадпрыемствах горада ўзніклі і атрымалі шырокае распаўсюджанне разнастайныя грамадскія творчыя аб'яднанні: грамадскія канструктарскія і тэхналагічныя бюро, творчыя комплексныя брыгады, бюро і саветы эканамічнага аналізу, нарміровачныя бюро і іншыя аб'яднанні рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў; гэтыя аб'яднанні з'явіліся новай формай барацьбы шырокіх мас за павышэнне прадукцыйнасці працы, за паскарэнне тэмпаў развіцця прамысловасці.

Мінчане аднымі з першых у краіне падтрымалі ініцыятыву свярдлоўскіх працаўнікоў аб стварэнні грамадскіх канструктарскіх бюро (ГКБ). У 1965 годзе на прадпрыемствах Мінска ў 232 ГКБ працавала ўжо больш дзвюх з паловай тысяч чалавек. З дапамогай ГКБ у 1964 годзе на мінскіх заводах змантіравалі 61 механізаваную паточную лінію, укаранілі каля сямі тысяч пагонных метраў сродкаў бесперапыннага транспартавання матэрыялаў, загатовак, вырабаў, наладзілі звыш 600 прыстасаванняў для механічнага прыбірання стружкі і адходаў, 12 аўтаматычных і паўаўтаматычных ліній, 133 станкі-аўтаматы і паўаўтаматы і г. д. Укараненне гэтага абсталявання дало 2,4 мільёна рублёў эканоміі.

Добрых поспехаў дасягнуў грамадскі канструктар завода аўтаматычных ліній ударнік камуністычнай працы фрэзероўшчык Аляксандр Філіч. Ён спраектаваў некалькі прыстасаванняў, якія дазволілі значна павысіць прадукцыйнасць працы. Няспынныя пошукі новага, садружнасць з інжынерамі і канструктарамі дапамагалі А. Філічу паспяхова выконваць вытворчыя заданні. Ужо ў 1961 годзе наватар першым на заводзе выканаў сваю сямігодку па прадукцыйнасці працы, за чатыры гады ён даў больш дзесяці гадавых норм.

Актыўны ўдзел у рабоце грамадскіх канструктарскіх бюро прымалі вучоныя Акадэміі навук БССР, выкладчыкі, аспіранты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў, і гэта сведчыла аб мацнеючых сувязях навукі з вытворчасцю.

Разам з грамадскімі канструктарскімі бюро ў гады сямігодкі ствараюцца грамадскія нарміровачныя (ГНБ) і эканамічныя бюро.

У 1965 годзе ў Мінску ў 88 грамадскіх бюро нарміравання працы супрацоўнічала 2400 чалавек. Добрых вынікаў дасягнулі грамадскія нарміроўшчыкі трактарнага завода. Па прапановах 19 дзеючых на заводзе ГНБ у 1962 годзе было перагледжана больш чатырох тысяч норм выпрацоўкі, і ў выніку гэтага працаёмкасць вырабу трактара МТЗ-50ПЛ панізілася на 164,9 норма-гадзіны. Асабліва актыўна працавала грамадскае нарміровачнае бюро механічнага цэха № 3, які ўзначальваў ударнік камуністычнай працы слесар С. Б. Снітко. Укараненне распрацаваных у 1962 годзе гэтым ГНБ прапаноў дазволіла павысіць прадукцыйнасць працы ў цэху на 13 працэнтаў.

Стварэнне грамадскіх бюро і саветаў эканамічнага аналізу (ГБЭА) — вынік клопатаў працаўнікоў прамысловасці аб захаванні рэжымаў эканоміі на прадпрыемствах. Першыя ГБЭА былі арганізаваны па ўзору перадавых прадпрыемстваў краіны ў 1960 годзе на аўтамабільным, трактарным, мотавеласіпедным, гадзіннікавым і некаторых іншых заводах. А ў 1965 годзе ў прамысловасці Мінска было ўжо 232 ГБЭА, якія налічвалі 2360 чалавек.

Цікавы вопыт кіраўніцтва грамадскімі формамі эканамічнай работы мае Заводскі райком КПБ. Створаны пры райкоме эканамічны савет практычна дапамагаў рабоце грамадскіх творчых аб'яднанняў. На прадпрыемствах Заводскага раёна ў 1964 годзе на грамадскіх пачатках працавала 110 эканамічных бюро і саветаў, а нарміровачныя бюро меліся ва ўсіх буйных цэхах. У іх удзельнічала звыш 2700 рабочых, эканамістаў, інжынераў, майстроў.

Адной з найбольш характэрных асаблівасцей у жыцці рабочага класа Мінска ў гады сямігодкі было масавае імкненне да навукі, тэхнікі, культуры. Многія прадпрыемствы распрацавалі і паспяхова ажыццяўлялі сямігадовыя планы навучання рабочых і служачых. Зладжаная і разнастайная сістэма падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў была створана, напрыклад, на трактарным заводзе. У яе склад уваходзіла ўнутрызаводскае навучанне: індывідуальнае навучанне рабочых, вытворча-тэхнічныя курсы, школы перадавога вопыту, курсы мэтавага прызначэння, навучанне другой спецыяльнасці і г. д. З другога боку, многія рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя вучыліся ў завочных і вячэрніх тэхнікумах і вышэйшых навучальных установах, у школах рабочай моладзі, на курсах падрыхтоўкі ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Па ініцыятыве ўдзельнікаў руху за камуністычныя адносіны да працы за гады сямігодкі ўзніклі школы перадавога вопыту, вячэрнія універсітэты па павышэнню кваліфікацыі інжынерна-тэхнічных работнікаў, арганізаваныя на грамадскіх пачатках, інстытуты перадавых метадаў працы, школы камуністычнай працы. У гэтых новых формах навучання працоўных адбілася непасрэдная сувязь навучан-

ня з камуністычным будаўніцтвам, якая садзейнічае гарманічнаму развіццю асобы. Створаны ў 1959 годзе інстытут перадавых метадаў працы на аўтазаводзе за два гады скончылі больш 550 чалавек. На чатырох факультэтах інстытута тэарэтычныя заняткі на грамадскіх пачатках праводзілі найбольш кваліфікаваныя інжынерна-тэхнічныя работнікі завода, выкладчыкі Беларускага політэхнічнага інстытута, навуковыя супрацоўнікі Акадэміі навук БССР. Практычныя заняткі непасрэдна на месцы праводзілі наватары вытворчасці. На трактарным заводзе дыпломы аб сканчэнні інстытута перадавых метадаў працы атрымалі больш 1000 рабочых разнастайных спецыяльнасцей.

Мінск быў адным з першых гарадоў краіны, дзе ўзніклі школы камуністычнай працы. У 1965 годзе ў горадзе дзейнічала ўжо больш 700 такіх школ, дзе навучалася звыш 20 000 чалавек.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі цэхавыя, заводскія, міжзаводскія, галіновыя школы перадавога вопыту. Атрымалі прызнанне грамадскія універсітэты дырэктараў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў, універсітэты культуры.

На барацьбу за паспяховае выкананне сямігадовага плана была накіравана асноўная ўвага Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі. Канкрэтна, аператыўна займаліся пытаннямі спаборніцтва, актыўна ўздзейнічалі на яго і пярвічныя партарганізацыі. На заводзе абагравальнага абсталявання, напрыклад, партком, цэхавыя партыйныя арганізацыі разам з камсамольскімі і прафсаюзнымі камітэтамі шырока распаўсюджвалі вопыт перадавікоў. Гэта садзейнічала росту актыўнасці калектыву, паляпшэнню вытворчых паказчыкаў. К канцу сямігодкі на заводзе 130 чалавек працавалі па метаду бездэфектнага вырабу прадукцыі і здачы яе ў аддзел тэхнічнага кантролю пасля першага прад'яўлення. Прадпрыемства выконвала і перавыконвала вытворчыя планы, павышала якасць вырабаў. У 1964 годзе, напрыклад, калектыў даў звыш плана больш чым на 400 000 рублёў прадукцыі.

Вялікую работу па абагульненню і распаўсюджанню ўсяго новага, перадавога праводзілі прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, гарадское аддзяленне таварыства «Веды», інстытут тэхнічнай інфармацыі, культурна-асветныя ўстановы.

Знаходзілі выкарыстанне такія формы работы па распаўсюджанню перадавога вопыту, як «Дні наватара», «Дні цэха», злёты і вечары ўдарнікаў і калектываў камуністычнай працы, канферэнцыі рацыяналізатараў і вынаходнікаў, пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады і г. д.

Баявымі памочнікамі гарадской партыйнай арганізацыі ў барацьбе за паспяховае выкананне сямігадовага плана былі камсамольцы. Шмат выдатных спраў на іх рахунку — выкананне зменнага задан-

ня за шэсць гадзін замест сямі, удзел у рэканструкцыі прадпрыемстваў, мадэрнізацыі абсталявання, аўтаматызацыі і механізацыі вытворчасці, барацьба за высокую культуру вытворчасці, барацьба з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны, павышэнне кваліфікацыі маладых рабочых і г. д. Па прапанове камсамольцаў круцільнага цэха камвольнага камбіната разгарнулася спаборніцтва за масавы пераход на самакантроль. Маладыя прадзільшчыцы першымі ў сваім цэху адмовіліся ад паслуг прыбіральшчыц і перайшлі на самаабслугоўванне.

Карысную работу на прадпрыемствах Мінска праводзілі Саветы маладых спецыялістаў. Памочнікамі партыйных арганізацый і адміністрацыі былі штабы «Камсамольскага пражэктара». «Камсамольскі пражэктар» трактарнага завода, напрыклад, мабілізаваў моладзь на выкарыстанне такога рэзерву, як разумнае размяшчэнне абсталявання на існуючых плошчах. Толькі ў прэсавым цэху камсамольцы, вызваліўшы цэх ад непатрэбных дэталей і абсталявання, вынайшлі дадаткова 100 квадратных метраў карыснай плошчы.

Вытворчая актыўнасць працоўных, паўсядзённая, накіроўваючая і арганізуючая дзейнасць партыі забяспечылі паспяховае выкананне заданняў сямігадовага плана. За чатыры гады і сем месяцаў прамысловасць Мінска дасягнула ўзроўню, запланаванага на сем год. Выраблена трактараў за гэты час узрос у 2,1 раза, аўтамабіляў на 46 працэнтаў, падшыпнікаў на 89, матацыклаў на 96 працэнтаў, тэлевізараў у 20,7 раза. Значна павялічыўся выпуск тавараў народнага спажывання.

Па аб'ёму вытворчасці валавой прадукцыі заданне сямі год было выканана прамысловасцю Мінска ў лютым 1965 года — на 10 месяцаў раней тэрміну. Асноўныя вытворчыя фонды ў канцы 1964 года ўзраслі ў параўнанні з 1958 годам на 65 працэнтаў. Выпуск валавой прадукцыі павялічыўся ў машынабудаванні ў тры разы, а па асобных відах тавараў народнага ўжытку — амаль у 20 разоў. Вытворчасць працы ў прамысловасці ўзрасла больш чым на 30 працэнтаў. Звыш задання былі выпушчаны сотні аўтамабіляў, тысячы трактараў, матацыклаў, веласіпедаў, радыёпрыёмнікаў і радыёл, сотні тысяч падшыпнікаў, больш мільёна метраў шарсцяных тканін, звыш 1,5 мільёна пар скуранога абутку, шмат кандытарскіх і іншых прамысловых вырабаў.

У 1965 годзе на прадпрыемствах горада было выраблена прадукцыі на сотні мільёнаў рублёў, або ў 20 разоў больш, чым у 1940 годзе. Удзельная вага прамысловай прадукцыі Мінска ў агульным аб'ёме прамысловай прадукцыі Беларускай ССР склала каля 40 працэнтаў. У канцы сямігодкі прадпрыемствы Мінска пастаўлялі прыкладна кожны шосты выраблены ў Савецкім Саюзе матацыкл, кожны вось-

мы веласіпед, кожны трынаццаты радыёпрыёмнік і тэлевізар, кожную адзінаццатую аўтаматычную лінію.

За сем год аб'ём капітальнага будаўніцтва ў горадзе склаў 1100 мільёнаў рублёў. Да ліку дзеючых далучылася каля 20 новых прамысловых прадпрыемстваў. Магутнасці аўтамабільнага, трактарнага, падшыпнікавага, гадзіннікавага, станкабудаўнічых заводаў імя Кірава і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, завода запасных частак, камвольнага камбіната ўзраслі за гэтыя гады на 40—80 працэнтаў.

За сямігоддзе прамысловасць горада наладзіла выпуск новых падоўжна-фрэзерных і плоскашліфавальных станкоў, універсаяьных трактараў МТЗ-50 і МТЗ-52, грузавых аўтамабіляў МАЗ-500 і МАЗ-503, электронна-вылічальных машын, асоба плоскіх мужчынскіх наручных гадзіннікаў, тэлерадыёл «Беларусь-110» і шмат іншых вырабаў.

Прыкметна змянілася структура прамысловасці горада. Вядучымі галінамі разам з машынабудаваннем і металаапрацоўкай сталі прыборабудаванне і радыёэлектроніка. З добрымі вынікамі прыйшлі к канцу сямігодкі мінскія трактарны і аўтамабільны заводы. Выпуск трактараў за сем год дасягнуў 337,7 тысячы штук: кожны дзень 250 трактараў з канвеера. Аўтамабільны завод пачаў спецыялізавацца на вытворчасці самазвалаў з грузападымальнасцю 7—7,5 тоны. З 1963 года завод распачаў выраб аўтамашын МАЗ-500, МАЗ-503 і МАЗ-504, хуткасць у іх павялічана на 15—20 працэнтаў, а расход гаручага паменшыўся на 12—13 працэнтаў.

Значнае месца ў прамысловасці горада займалі прадпрыемствы будаўнічай індустрыі: заводы па вырабу зборнага жалезабетону і будаўнічых дэталяў, камбінат будаўнічых матэрыялаў, гіпсавы завод, камбінат буйнаблочных будаўнічых канструкцый, два цагельныя заводы. Развіццё індустрыяльнай базы буйнапанельнага домабудавання і шырокае выкарыстанне буйных сценавых блокаў дазволіла значна павысіць удзельную вагу поўназборнага жыллёвага будаўніцтва ў горадзе, паменшыць тэрміны будавання жылых дамоў і кошт жыллёвага будаўніцтва.

Вялікім попытам карысталася прадукцыя падшыпнікавага завода, які вырабляў падшыпнікі вагою ад некалькіх грамаў да 60 кілаграмаў, а таксама вырабляемыя на заводах Мінска меліярацыйныя і дарожнабудаўнічыя машыны, абагравальнае абсталяванне, бытавыя электрахаладзільнікі, радыёпрыёмнікі, тэлевізары, гадзіннікі, матацыклы, шматлікія вырабы лёгкай і харчовай прамысловасці.

Мінск — буйны экспарцёр прамысловай прадукцыі. Больш 5,5 тысячы магутных грузавікоў з эмблемай зубра працавалі ў ААР, Афганістане, Гвінеі, Інданезіі, Індыі, Камбоджы і іншых краінах. Добра зарэкамендавалі сябе на палях і фермах многіх краін свету

трактары «Беларусь». Вядомы за межамі таксама мінскія веласіпеды і матацыклы, станкі і разнастайныя вырабы прыборабудавання, медыкаменты і рад іншых тавараў.

Дасягненні калектываў прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічых арганізацый Мінска атрымалі высокую ацэнку партыі і ўрада. За паспяховае выкананне заданняў сямігадовага плана, стварэнне новых канструкцый машын, укараненне перадавой тэхналогіі, дасягненне высокіх тэхнічна-эканамічных паказчыкаў у працы трактарны і аўтамабільны заводы і будтрэст № 5 узнагароджаны ордэнам Леніна, завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і мясакамбінат — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. За вялікія заслугі ў выкананні заданняў сямігадовага плана і дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў лепшым перадавікам вытворчасці прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, многія ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі. Сярод тых, хто ўдастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы, слесар-лякальшчык Е. І. Клімчанка і брыгадзір кавалёў Ф. К. Самусеў з трактарнага завода, сталявар Д. І. Барашкін і шафёр-выпрабавальнік К. Г. Паўлянковіч з аўтазавода, слесар завода трактарных запасных частак Н. В. Харытановіч, слесар-лякальшчык станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Н. Ф. Каменскіх, кіраўнік трэста № 5 І. А. Юркоў, брыгадзір комплекснай брыгады будаўнічага ўпраўлення № 2 трэста № 1 А. М. Громаў і інш.

За сем год адбыліся якасныя змены ў асяроддзі рабочага класа. Павысілася агульнаадукацыйная і прафесіянальная падрыхтоўка рабочых, павялічылася колькасць інтэлігенцыі. На 15 лістапада 1965 года ў народнай гаспадарцы Мінска працавала 48,1 тысячы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і 41,1 тысячы — з сярэдняй спецыяльнай.

Вялікае значэнне для далейшага ўздыму ўсіх галін прамысловасці Мінска, як і для ўсёй краіны, мелі пастановы вераснёўскага (1965) Пленума ЦК КПСС аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканальванні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці.

12 кастрычніка 1965 года ў Мінску адбыўся Пленум ЦК КПБ, які адобрыў пастановы вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, прааналізаваў стан прамысловасці ў рэспубліцы і вызначыў канкрэтныя шляхі па ўстараненню меўшыхся недахопаў. 21 кастрычніка 1965 года сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон аб змяненні сістэмы органаў кіравання прамысловасцю і пераўтварэнні некаторых іншых органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР. Для кіраўніцтва галінамі прамысловасці створана сем саюзна-рэспубліканскіх і тры рэспубліканскіх міністэрствы БССР, а таксама адпаведныя ўпраўленні. Скасаваны Савет народнай гаспадаркі БССР.

У ходзе абмеркавання пастаноў Пленума на прадпрыемствах, будоўлях, ва ўстановах Мінска выяўляліся новыя рэзервы павышэння прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі, эканамічнага вядзення гаспадаркі.

2. Шэфская дапамога працоўных Мінска вёсцы

Шэфская дапамога працоўных Мінска вёсцы ў сямігоддзі няспынна развівалася, мяняла свае арганізацыйныя формы, рабілася больш шматгранай і разнастайнай.

Шэфская работа звычайна праводзілася прадпрыемствамі і ўстановамі горада па планах, якія складалі на кожны квартал і ў цэлым на год. Нярэдка ў іх складанні прымалі ўдзел сакратары партыйных арганізацый і старшыні калгасаў, прадстаўнікі сельскіх райкомаў партыі падшэфных раёнаў.

На многіх прадпрыемствах працавалі камісіі і саветы, якія праводзілі арганізацыйную работу па ажыццяўленню шэфскіх абавязацельстваў, прынятых калектывамі. Уся дзейнасць, звязаная з аказаннем шэфскай дапамогі сялу, праходзіла пад кіраўніцтвам і кантролем партыйных арганізацый фабрык і заводаў, райкомаў, гаркома і абкома КПБ. Нярэдка на пасяджэнні бюро райкомаў, а таксама на праводзімыя імі нарады па абмену вопытам шэфскай работы запрашаліся сакратары партыйных арганізацый, старшыні калгасаў, сакратары сельскіх райкомаў партыі падшэфных раёнаў. Асобныя райкомы партыі (Савецкі, Ленінскі, Кастрычніцкі) неаднаразова праводзілі нарады па абмену вопытам шэфскай работы, слухалі справаздачы некаторых кіраўнікоў арганізацый непасрэдна ў падшэфных раёнах, дзе, акрамя прадстаўнікоў гарадскіх прадпрыемстваў, прысутнічаў шырокі актыў калгасаў, саўгасаў і раённага звяна савецкіх і партыйных работнікаў.

Адной з распаўсюджаных форм шэфскай дапамогі было стварэнне на сяле баз для рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі і транспарту. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў дапамагалі працаўнікам сяла абсталяваць механічныя майстэрні і кузні, забяспечвалі іх неабходнымі станкамі і інструментамі, выраблялі запасныя часткі да трактараў, аўтамашын, камбайнаў і іншай тэхнікі, аказвалі практычную дапамогу ў рамонце інвентару і сельскагаспадарчых машын. У першы год сямігодкі адзін толькі Мінскі маторны завод, які шэфствуе над 15 калгасамі Капыльскага, Слуцкага і Старобінскага раёнаў, у пяці гаспадарках абсталяваў механічныя майстэрні, забяспечыўшы іх такарнымі, свідравальнымі, наждачнымі станкамі, газа-

зварачным апаратам, і цалкам укамплектаваў іх неабходным інструментам. У калгасе «Шлях камуны» Капыльскага раёна шэфы зрабілі і наладзілі ў кузні вентылятары для горна з электраматорам, помпу для падачы вады на фермы, перадалі сельскім механізатарам ацэтыленавы апарат і наждачны станок. На працягу года завод перадаў хлебаробам дзесяць газазварачных апаратаў, больш 30 камплектаў інструменту і восем помп з электраматорамі.

Яшчэ больш ажывілася шэфская работа ў другім годзе сямігодкі. Трактаразаводцы, напрыклад, узялі абавязацельствы да вясенне-палявых работ у 1960 годзе ў падшэфных калгасах і саўгасах Плешчаніцкага і Капыльскага раёнаў адрамантаваць трактары «Беларусь», пераабсталяваць дзесяць трактараў ДТ-54 пад бульдозеры, зрабіць 15 валакуш для ачысткі палёў ад камення, дапамагчы абсталяваць і забяспечыць станкамі і інструментамі калгасныя майстэрні.

Прынятыя абавязацельствы калектыў трактарнага завода выканаў з гонарам. Бюро Заводскага райкома партыі, разглядаючы пытанне аб аказанні шэфскай дапамогі калгасам і саўгасам у 1960 годзе і падводзячы вынікі выканання ўзятых абавязацельстваў прадпрыемствамі раёна па шэфству, станоўча ацаніла дзейнасць трактарабудаўнікоў.

Паспяхова выканалі свае абавязацельствы і калектывы іншых мінскіх фабрык, заводаў, арганізацый і ўстаноў, якія ўзялі шэфства над 400 калгасамі і саўгасамі вобласці. Толькі калгасным механічным майстэрням шэфы перадалі 157 розных станкоў, адрамантавалі пяць сельскіх электрастанцый, абсталявалі і цалкам укамплектавалі інструментам дзесяткі новых кузняў, дапамаглі адрамантаваць трактары, камбайны і іншыя сельскагаспадарчыя машыны.

Пленум ЦК КПСС, які адбыўся ў студзені 1961 года, заклікаў партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, працаўнікоў сяла і горада памножыць намаганні ў барацьбе за далейшы ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці, за ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялістычнага земляробства.

Пасля XXII з'езду партыі і сакавіцкага (1962) Пленума ЦК КПСС пытанні шэфскай дапамогі пачалі часцей абмяркоўвацца на бюро і пленумах Мінскага гарадскога і абласнога камітэтаў КПБ, райкомы партыі і партыйныя арганізацыі мінскіх прадпрыемстваў узмацнілі непасрэдныя сувязі з падшэфнымі раёнамі і калгасамі. Больш актыўнай стала дзейнасць шэфскіх камісій, якія былі створаны на большасці буйных прадпрыемстваў сталіцы. Вынікі шэфскай работы ў шэрагу партыйных арганізацый пачалі падводзіць не ў канцы года, а ў кожным квартале.

Адказваючы практычнымі справамі на рашэнні сакавіцкага Пленума ЦК КПСС, трактаразаводцы абяцалі ў 1962 годзе значна

расшырыць матэрыяльна-тэхнічную дапамогу калгасам і саўгасам. Ініцыятыву трактаразаводцаў адобрылі Мінскі абласны камітэт партыі, гарком КПБ і абласны савет прафсаюзаў, падтрымала грамадскасць сталіцы.

Завод аўтаматычных ліній перадаў калгасам Пухавіцкага раёна 2200 адзінак рэжучага інструменту, адрамантаваў дзесяць аўтамашын, пяць такарных і свідравальных станкоў, абсталяваў дзве новыя механічныя майстэрні. Калектыў электратэхнічнага завода для калгасаў Уздзенскага раёна зрабіў 86 буракапад'ёмнікаў і 154 тракторныя вілы для раскідвання ўгнаенняў. З гонарам выканалі прынятыя абавязацельствы і трактаразаводцы. Толькі ў асенні перыяд 1962 года рабочыя завода адрамантавалі ў падшэфных калгасах 47 трактараў і зрабілі 3000 аўтапаілак. Дзесяткі тон дахавай бляхі, зборнага жалезабетону і металаадходаў, сотні кілаграмаў карбіду, электродаў, цвікоў і іншых матэрыялаў атрымалі саўгасы Слуцкага, Барысаўскага і Старобінскага раёнаў ад сваіх шэфаў — працаўнікоў прадпрыемстваў Фрунзенскага раёна.

Вялікую дапамогу хлебаробам аказвалі аўтамабільны завод, завод імя Кірава, радыёзавод і г. д. Толькі ў калгасах Чэрвеньскага раёна калектыў аўтазавода ў 1963 годзе забяспечыў металарэзнымі станкамі і інструментам шэсць калгасных майстэрняў, накіраваў поўны камплект інструментаў у тры кузні, капітальна адрамантаваў восем калгасных аўтамашын, сем электрарухавікоў і тры рухавікі да аўтамашын ЗІЛ-150, вырабіў вялікую колькасць дэталяў і запасных частак для рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі і інвентару.

Выконваючы шэфскія абавязацельствы, прынятыя ў гонар лютаўскага (1964) Пленума ЦК КПСС, калектыў завода ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы правёў механічную апрацоўку 1200 дэталяў, капітальна адрамантаваў восем аўтамашын, 13 аўтамабільных і 12 электрычных рухавікоў. У цэхах завода шэфы адлілі 1,7 тоны разнастайных чыгунных і сталёвых дэталяў. Для рамонту сельгасмашын і аўтамабіляў калгасам і саўгасам былі выдзелены станкі, інвентар, падшыпнікі і звыш 32 тон карысных металаадходаў. Значную шэфскую дапамогу аказвалі аўтазаводцы і ў наступныя гады.

За гады сямігодкі калектывы прамысловых прадпрыемстваў Мінска правялі значную работу ў падшэфных калгасах і саўгасах па механізацыі працаёмкіх працэсаў на жывёлагадоўчых фермах і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Калектывы прадпрыемстваў аднаго толькі Заводскага раёна механізавалі ў падшэфных калгасах працаёмкія працэсы на 30 жывёлагадоўчых фермах, электрыфікавалі часткова або цалкам 15 аб'ектаў. У калгасах і саўгасах вобласці ў пачатку 1964 года ўстаноўлена каля 600 тысяч светакропак, элек-

трыфікавана звыш трох тысяч населеных пунктаў. У канцы сямігодкі пры дапамозе механізаванага водазабеспячэння абслугоўвалі 65 працэнтаў пагалоўя буйной рагатай жывёлы і 66 працэнтаў пагалоўя свіней, было электрыфікавана цалкам або часткова 90,4 працэнта калгасаў і саўгасаў вобласці.

Калектывы прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый Мінска аказвалі працаўнікам сяла практычную дапамогу ў будаўніцтве жылых дамоў, грамадскіх, культурных і вытворчых памяшканняў. Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі Будтрэста № 1 у 1960 годзе аказалі калгасу «Рассвет» Любанскага раёна тэхнічную і практычную дапамогу ў будаўніцтве лазні, калгаснага клуба, бальніцы і кароўніка. Шэфы Мінскага камвольнага камбіната ў калгасе імя Фрунзе Чэрвеньскага раёна сваімі сіламі пабудавалі летні свінарнік, механізаваную свінакармушку, рамонтна-механічную майстэрню.

Калектыў праектнага інстытута «Белгіпрасельбуд» у 1964 годзе на грамадскіх пачатках распрацаваў схемы планавання для 12 калгасаў Слуцкага раёна, на падставе якіх прадугледжвалася будаўніцтва пасёлкаў гарадскога тыпу. Ініцыятыву «Белгіпрасельбуда» падтрымалі іншыя праектныя арганізацыі сталіцы. Яны абавязаліся ў шостым годзе сямігодкі падрыхтаваць на грамадскіх асновах для калгасаў Мінскай вобласці каля 40 такіх схем планавання. Усяго за гады сямігодкі шляхам шэфскай дапамогі ў сёлах вобласці пабудавана звыш 27 тысяч жылых дамоў, уведзены і зданы ў эксплуатацыю сотні жывёлагадоўчых і гаспадарчых будынкаў.

Тысячы мінчан прымалі непасрэдны ўдзел ва ўборцы ўраджаю. Асабліва масавымі былі нядзельнікі. Напрыклад, у нядзельніку 8 кастрычніка 1961 года ў падшэфных калгасах Мінскага раёна прымалі ўдзел 2585 жыхароў сталіцы толькі з аднаго Ленінскага раёна. На ўборцы ўраджаю ў калгасах Валожынскага, Мядзельскага і Вілейскага раёнаў увосень 1964 года працавала 9664 чалавекі з Савецкага раёна горада. Вялікую практычную дапамогу працаўнікам сяла аказвалі студэнты вышэйшых навучальных устаноў у час летніх канікул.

Партыйныя арганізацыі Мінска з увагай адносіліся і да павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню працаўнікоў вёскі, падрыхтоўкі з ліку калгаснікаў спецыялістаў розных прафесій для работы ў калгасных механічных майстэрнях. На буйных прадпрыемствах горада былі створаны спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі сельскіх механізатараў. У 1959 годзе толькі ў цэхах трактарнага завода прайшлі падрыхтоўку па эксплуатацыі гідрасістэмы трактара «Беларусь» каля 400 сельскіх механізатараў. Такія ж курсы ў 1960 годзе на заводзе скончылі каля 800 механікаў РТС і работнікаў абласных упраўленняў сельскай гаспадаркі. На

прамысловых прадпрыемствах Фрунзенскага раёна Мінска, якія шэфствуюць над калгасамі Старобінскага, Крывічскага, Уздзенскага і Клецкага раёнаў, яшчэ ў 1960 годзе сіламі рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў арганізавана пяць груп па навучанню калгаснікаў спецыяльнасцям токара, каваля, слесара і электраманцёра. Прадпрыемствы Кастрычніцкага раёна сталіцы ў пятым годзе сямігодкі падрыхтавалі для сваіх падшэфных калгасаў токараў, электразваршчыкаў і электраманцёраў.

Каштоўная ініцыятыва належала знатнаму электразваршчыку Мінскага трактарнага завода ўдарніку камуністычнай працы М. Т. Антоніку. Ён неаднаразова выязджаў у калгасы і саўгасы, каб перадаць набыты на працягу многіх год багаты вопыт механізатарам сяла непасрэдна на месцах іх работы. Беручы з яго прыклад, у калгасы і саўгасы для перадачы вопыту неаднаразова выязджалі перадавікі вытворчасці аўтамабільнага і электратэхнічнага заводаў, камвольнага камбіната, мотавелазавода і іншых прадпрыемстваў горада.

Шырокае распаўсюджанне ў апошнія гады атрымалі абмен вопытам работы і сустрэчы заводскіх і калгасных рацыяналізатараў, ударнікаў камуністычнай працы і перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці. Падшэфныя калгасы і саўгасы часта наведвалі перадавікі вытворчасці і рацыяналізатары заводаў імя Кірава, аўтаматычных ліній, запасных частак, трактарнага завода і г. д.

Асноўнае месца ў шэфскай рабоце займала масава-палітычная, арганізатарская і культурна-асветная работа на сяле. Для сельскага насельніцтва чыталіся лекцыі на разнастайныя палітычныя, эканамічныя, навукова-атэістычныя і іншыя тэмы, праводзіліся тэарэтычныя канферэнцыі па марксісцка-ленінскай філасофіі і актуальных пытаннях сучаснасці. Перад працаўнікамі сяла часта выступалі перадавікі і наватары прамысловай вытворчасці, ударнікі камуністычнай працы, інжынерна-тэхнічныя работнікі. Яны расказвалі аб перадавых метадах працы, аб навуковых дасягненнях у галіне тэхнікі, аб найважнейшых падзеях у нашай краіне і за мяжой.

У сувязі са святкаваннем 90-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна Мінскі абласны камітэт КПБ накіраваў у калгасы і саўгасы вобласці звыш 300 прапагандыстаў. Толькі з Акадэміі навук БССР у падшэфныя калгасы Нясвіжскага раёна выязджала каля 60 чалавек, якія прачыталі больш 130 лекцый і дакладаў. Для шырокай прапаганды матэрыялаў сакавіцкага (1965) Пленума ЦК КПСС, V Сесіі Вярхоўнага Савета СССР і IV Сесіі Вярхоўнага Савета БССР, а таксама ў сувязі з выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных у 1965 годзе ў раёны вобласці выязджала 430 лектараў і дакладчыкаў Мінска, якія правялі і прачыталі 1495 гутарак, лекцый і дакладаў.

Важнае значэнне меў таксама абмен вопытам партыйнай работы паміж партыйнымі арганізацыямі прамысловых прадпрыемстваў і калгасаў. На партыйных сходах трактарнага, аўтамабільнага і іншых заводаў часта прысутнічалі прадстаўнікі сельскіх парткомаў, калгасных і саўгасных партыйных арганізацый. Сакратары і члены партбюро, парткомаў гарадскіх прадпрыемстваў, выязджаючы ў падшэфныя калгасы, аказвалі сельскім партыйным арганізацыям практычную дапамогу ў наладжванні арганізацыйна-партыйнай і масава-палітычнай работы.

З дапамогай партыйных арганізацый горада на сяле стваралі сельскія лекторыі і кабінеты палітычнай асветы. Так, па ініцыятыве камуністаў трактарнага завода ў саўгасе «Іскра» Плешчаніцкага раёна яшчэ ў 1960 годзе пачаў працаваць на грамадскіх пачатках кабінет палітычнай асветы.

Партыйныя камітэты і партыйныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў вобласці пачалі аддаваць больш увагі прапагандзе эканамічных ведаў. Ужо ў 1963 годзе пытанні канкрэтнай эканомікі на сяле вывучала каля адной трэцяй часткі слухачоў, што займаліся ў сістэме палітычнай асветы. На базе лепшых гаспадарак працавала 18 абласных школ перадавога вопыту і сістэмы курсаў, дзе праходзілі навучанне 7739 кіраўнікоў, спецыялістаў і кадраў масавых прафесій калгасаў і саўгасаў.

Да канца сямігодкі шырокае развіццё ў вобласці атрымалі многія формы вучобы сельскага насельніцтва. У 1965 годзе на сяле працавала 300 народных універсітэтаў для бацькоў, дзевяць універсітэтаў прававых і 35 медыцынскіх ведаў, 32 культуры і 26 універсітэтаў сельскагаспадарчых ведаў, навучаннем у якіх было ахоплена каля 45 тысяч чалавек. Акрамя таго, рэгулярна працавалі 140 кіналекторыяў, 124 школы мінімуму ведаў аб прыродзе і грамадстве, 91 школа перадавога вопыту і 41 сельскі вучэбны камбінат, дзе налічвалася 17 442 слухачы. Каля 40 тысяч чалавек займалася агразаатэхнічнай вучобай.

Вялікую ролю адыгрывае горад і ў развіцці культуры ў вёсцы. Толькі ў калгасах і саўгасах Мінскай вобласці за гады сямігодкі з дапамогай шэфскіх арганізацый пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю 163 агульнаадукацыйныя школы на 68 516 вучнёўскіх месц, новыя бальніцы на 2660 ложкаў, звыш 350 Дамоў культуры, сотні сельскіх клубаў, чырвоных куткоў і іншых памяшканняў культурнабытавога прызначэння. Мастакі аўтазавода дапамаглі калгасам Валожынскага раёна абсталяваць чырвоныя куткі на жывёлагадоўчых фермах. Для трох сельскіх клубаў Бягомльскага і Мінскага раёнаў аўтазаводцы перадалі вялікі тэатральны рэквізіт — касцюмы, дэкарацыі.

Не засталіся па-за ўвагай шэфаў дзіцячыя ўстановы і сельскія бібліятэкі. Калектыў завода імя Кірава свайму падшэфнаму калгасу «Іскра» Дзяржынскага раёна выдзеліў 55 ложкаў для дзіцячага сада.

Вялікую ролю адыгралі гарадскія культурна-асветныя ўстановы і перш за ўсё Палацы і Дамы культуры буйных прамысловых прадпрыемстваў у развіцці сельскай мастацкай самадзейнасці.

Значную работу па разгортванню культурнага шэфства над сялом праводзілі тэатры і іншыя творчыя арганізацыі Мінска. Яны таксама выязджалі на сяло са спектаклямі, аказвалі дапамогу ў стварэнні і наладжванні работы сельскіх калектываў мастацкай самадзейнасці. Калектыў Тэатра юнага гледача толькі на працягу 1965 года паказаў сельскім працаўнікам 120 спектакляў, на якіх прысутнічала звыш 69 тысяч калгаснікаў і працаўнікоў саўгасаў. На калгаснай сцэне артысты тэатра паказалі свае лепшыя п'есы: «У пошуках радасці», «Каханне Ані Бярозка», «Не верце цішыні», «Няроўны бой», «Над хвалямі Серабранкі», «Любіць — не любіць».

Часта на калгаснай сцэне выступаў калектыў Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. У многіх спектаклях галоўныя ролі выконвалі вядучыя артысты тэатра — Г. Глебаў, Б. Платонаў, В. Пола, К. Саннікаў. Актыўным шэфам з'яўляецца і Беларускі ансамбль песні і танца. У пачатку 1964 года 147 творчых работнікаў тэатраў, музычных і тэатральных навуковых устаноў, пісьменнікаў і мастакоў, узяўшы шэфства над калектывамі мастацкай самадзейнасці раёнаў вобласці, выступілі з ініцыятывай аказваць ім пастаянную і неабходную дапамогу ў творчым росце. Гэту каштоўную ініцыятыву шырока падтрымалі ўсе работнікі мастацтва сталіцы Беларусі. У шэфскай рабоце прынялі ўдзел усе творчыя калектывы. Тэатр оперы і балета, напрыклад, пачаў ажыццяўляць шэфства над 22 калектывамі мастацкай самадзейнасці. Многія артысты выязджалі ў раёны вобласці і на месцах праводзілі творчыя кансультацыі са сваімі падшэфнымі. Дырэктар Акадэмічнай капелы А. С. Контраў і артыст П. П. Мільто сістэматычна працавалі з хорам калгаса «Прамень камуны» Слуцкага раёна.

Майстры мастацтва Б. В. Платонаў, І. Ф. Ждановіч, З. Ф. Стома паставілі на сцэне Дома культуры калгаса «Чырвоны кастрычнік» тры аднаактовыя п'есы. Пастаянную метадычную дапамогу мастацкай самадзейнасці калгаса аказваў заслужаны артыст БССР Б. З. Ямпольскі.

Раслі і мацнелі сувязі паміж спартыўнымі калектывамі горада і сяла.

Шэфская дапамога працоўных і перш за ўсё рабочых прамысловых прадпрыемстваў Мінска сялу ў гады сямігодкі адыграла значную ролю ў далейшым уздыме сельскагаспадарчай вытворчасці.

3. Павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных

Паспяховае развіццё народнай гаспадаркі за гады сямігодкі дало магчымасць партыі і ўраду ажыццявіць рад мер па выкананню намечанай у Праграме партыі задачы — забяспечыць у Савецкім Саюзе самы высокі жыццёвы ўзровень у параўнанні з любой краінай капіталізму.

Нацыянальны даход краіны, выкарыстаны ў 1965 годзе на спажыванне і накапленне, перавысіў узровень 1958 года на 53 працэнты.

Як і ў папярэднія гады, асноўнай крыніцай уздыму матэрыяльнага дабрабыту працоўных быў рост заработнай платы ў спалучэнні з паніжэннем рознічных цэн, адменай і зніжэннем падаткаў з насельніцтва. За гады сямігодкі праведзена ўпарадкаванне зарплаты, і ў выніку гэтага значна паменшылася розніца ва ўзроўні заработнай платы нізка- і сярэднеаплачваемых катэгорый работнікаў. Ужо ў 1962 годзе мінімум заработнай платы рабочых і служачых, занятых у галінах матэрыяльнай вытворчасці, павысіўся з 27—35 да 40—45 рублёў у месяц. У наступныя гады была павялічана зарплата ў работнікаў невытворчых галін народнай гаспадаркі. Так, у 1964 годзе ў сярэднім на 23—25 працэнтаў узрасла заработная плата работнікаў асветы і аховы здароўя, а ў 1965 годзе павысілася больш чым на 20 працэнтаў заработная плата рабочых і служачых гандлю, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і іншых галін сферы абслугоўвання насельніцтва. Сярэдняя месячная зарплата рабочых і служачых павялічылася за сямігоддзе прыкладна на 26 працэнтаў.

Росту зарплаты нязменна спадарожнічала памяншэнне разрыву паміж акладамі нізка- і высокааплачваемых катэгорый работнікаў, рэзкім памяншэннем колькасці асоб, якія маюць зарплату да 60 рублёў у месяц. Калі ў сакавіку 1959 года, напрыклад, зарплату да 60 рублёў у месяц мелі 33,6 працэнта працоўных Мінска, дык у сакавіку 1964 года — менш 21 працэнта. У цэлым у горадзе сярэднемесячная зарплата ў разліку на аднаго працуючага ўзрасла за гэты час на 12,5 працэнта.

Павышэнню рэальных даходаў рабочых і служачых, галоўным чынам нізкааплачваемых, садзейнічала адмена падаткаў з заработнай платы да 60 рублёў у месяц і зніжэнне на 40 працэнтаў падаткаў з заработкаў ад 60 да 70 рублёў у месяц.

У выніку ўвядзення скарочанага рабочага дня для рабочых і служачых значна скарацілася і працягласць рабочага тыдня. Адначасова адбывалася павелічэнне сярэдняй працягласці водпускаў рабочых і служачых. У 1964 годзе, напрыклад, яна складала ў Мінску 19 ра-

бочых дзён, а трэцяя частка работнікаў мела водпуск 24 і больш рабочых дзён.

Немалую выгаду атрымала насельніцтва ад сістэматычна праводзімага зніжэння рознічных цэн. За гады сямігодкі былі паніжаны цэны на гадзіннікі, фотаапараты, радыёпрыёмнікі, швейныя машыны, тканіны, медыкаменты, швейныя вырабы і рад іншых тавараў народнага ўжытку. Новае значнае паніжэнне цэн на шматлікія прамысловыя тавары і некаторыя прадукты харчавання праведзена ў красавіку 1965 года. Аднак у якасці часовай меры ў 1962 годзе Савецкі ўрад прыняў рашэнне аб павышэнні рознічных цэн на мяса і мясапрадукты ў сярэднім на 30 працэнтаў і масла — на 25 працэнтаў з мэтай павысіць дзяржаўныя закупачныя цэны на прадукты жывёлагадоўлі і стымуляваць далейшае развіццё сельскай гаспадаркі. Але дзякуючы росту заработнай платы, паніжэнню падаткаў, расшырэнню грамадскіх фондаў спажывання рэальныя даходы працоўных у разліку на аднаго працуючага ў цэлым па краіне павялічыліся за пяць год сямігодкі на 20 працэнтаў.

Сведчаннем росту грашовых даходаў насельніцтва з'яўляецца павелічэнне колькасці ўкладчыкаў працоўных ашчадных кас і сумы ўкладаў у іх. За сямігоддзе колькасць укладчыкаў узрасла з 151,8 да 255 тысяч чалавек, а сума ўкладаў з 39,9 да 97,5 мільёна рублёў.

Важнай крыніцай росту народнага дабрабыту, акрамя заработнай платы, з'яўляюцца грамадскія фонды спажывання, значэнне якіх прыкметна ўзрасло за апошнія гады. У 1965 годзе насельніцтва рэспублікі атрымала разнастайных выплат і льгот з грамадскіх фондаў прыкладна 145 рублёў у разліку на кожнага працуючага. Выплаты з грамадскіх фондаў на пенсіі і дапамогі, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і адукацыю, утрыманне дзіцячых устаноў і г. д. складаюць амаль чацвёртую частку ўсіх даходаў рабочых і служачых. Асігнаванні на сацыяльна-культурныя патрэбы ўзрастаюць хуткімі тэмпамі, абганяючы тэмпы росту заработнай платы насельніцтва. Расходы на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы па Мінску ўзраслі за сем год прыкладна ў 2,4 раза і дасягнулі 47,7 мільёна рублёў. У канцы сямігодкі ў Мінску правам на атрыманне пенсій і дапамог карысталіся каля 57 тысяч чалавек. На працягу года толькі пенсіянерам, якія не працуюць, было выплачана амаль 18 мільёнаў рублёў, 248 тысяч рублёў пайшло на дапамогу мнагадзетным і адзінокім маці.

Новым праяўленнем няспынных клопатаў дзяржавы аб матэрыяльным забеспячэнні савецкіх людзей з'явілася павышэнне ў 1965 годзе мінімальных памераў пансій для інвалідаў працы і вайны і для сем'яў загінуўшых воінаў. Акрамя таго, інваліды Айчыннай

вайны атрымалі дадаткова рад ільгот па пытаннях працаўладкавання, медыцынскага абслугоўвання, забеспячэння жыллём і г. д.

Вялікай увагай і любоўю карыстаюцца юныя мінчане. У 1965 годзе больш чым у 300 дзіцячых садах і яслях сталіцы выхоўваліся 50 тысяч малышоў, г. зн. кожнае трэцяе дзіця дашкольнага ўзросту.

Удвая павялічылася за сем год колькасць піянерскіх лагераў. У 1965 годзе ў 71 піянерскім лагеры адпачыла звыш 50 тысяч школьнікаў сталіцы. Расходы бацькоў на набыццё пуцёвак у піянерскія лагеры не пакрываюць і трэцяй часткі выдаткаў на ўтрыманне дзяцей у іх.

За кошт грамадскіх фондаў тысячы мінчан карысталіся бясплатнымі або ільготнымі пуцёўкамі ў дамы адпачынку, санаторыі і курорты краіны. Колькасць месц у дамах адпачынку і санаторыях за сямігодку павялічылася больш чым у паўтара раза і склала каля дзесяці тысяч. Значна павялічылася колькасць санаторыяў-прафілакторыяў.

Гады сямігодкі былі перыядам далейшага развіцця аховы здароўя ў сталіцы рэспублікі. Значную ролю ў гэтым адыграла прынятая ў студзені 1960 года Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання і аховы здароўя насельніцтва СССР». Сетка медыцынскіх устаноў Мінска пашырылася з увядзеннем у эксплуатацыю чацвёртай, пятай, шостай клінічных бальніц, галоўнага корпуса другой клінічнай бальніцы, пяці паліклінік для дарослых і сямі для дзяцей, туберкулёзнага, анкалагічнага і сурдалагапедычнага дыспансераў, радыёлагічнага корпуса першай клінічнай бальніцы, дзесяці аптэк і г. д. Колькасць ложкаў у бальнічных установах горада склала ў пачатку 1966 года звыш сямі з палавінай тысяч, або ў паўтара раза больш, чым у 1958 годзе.

Палепшылася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва.

З 1960 года на прамысловых прадпрыемствах пачалі выкарыстоўваць цэхавы прынцып абслугоўвання рабочых і служачых. Усяго ў пачатку 1966 года было створана 82 цэхавых урачэбных участка.

Значныя сродкі адпускаліся на ахову працы і тэхніку бяспекі. Па рэспубліцы за сямігодку выдаткавана на гэтыя мэты звыш 80 мільёнаў рублёў. У выніку аздараўлення ўмоў працы колькасць выпадкаў вытворчага траўматызму на тысячу працуючых паменшылася на 28 працэнтаў, а на прадпрыемствах прамысловасці і будаўніцтва — адпаведна на 48 і 38 працэнтаў.

Павысіўся ўзровень медыцынскага абслугоўвання дзяцей, аховы здароўя маці і дзіцяці. К канцу 1965 года ў Мінску працавала 18 дзіцячых паліклінік, дзве дзіцячыя бальніцы, дзіцячыя аддзялен-

ні пры клінічных бальніцах, 15 жаночых кансультацый. Наладжана кругласутачнае дзяжурства пунктаў па аказанню дзецям неадкладнай медыцынскай дапамогі. Ва ўсіх агульнаадукацыйных школах горада ўведзена медыцынская дапамога навучэнцам.

Значным мерапрыемствам па паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання дзяцей было разбуйненне педыятрычных урачэбных участкаў, пашырэнне спецыялізаванай дапамогі дзецям як амбулаторна-паліклінічнай, так і стацыянарнай, развіццё сеткі малочных кухняў і г. д. Дзякуючы добра наладжанай прывівачнай прафілактыцы дзіцячых інфекцыйных захворванняў зусім зніклі захворванні поліямі-літам, значна зменшылася захворванне дзяцей дыфтэрытам, коклюшам і іншымі хваробамі. Палепшыліся паказчыкі фізічнага развіцця дзяцей: рост, вага, акружнасць грудной клеткі.

У горадзе праводзіцца вялікая прафілактычная і санітарна-асветная работа. Пры Мінскім гарадскім доме санітарнай асветы арганізаваны пастаянна дзеючыя курсы санітарнага мінімуму для работнікаў гандлю і грамадскага харчавання і дзіцячых устаноў. У горадзе працуюць дзесяць універсітэтаў здароўя і каля 330 школ здароўя. З 1965 года ў сталіцы кожны год праводзіцца Дзень здароўя.

У выніку паляпшэння пастаноўкі медыцынскага абслугоўвання стала значна меншым захворванне сярод насельніцтва Мінска.

З году ў год узрастае колькасць медыцынскіх работнікаў. У 1965 годзе ў сталіцы працавала 5165 урачоў і больш васьмі тысяч чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. Колькасць урачоў за сямігоддзе ўзрасла ў 1,8 раза і сярэдняга медыцынскага персаналу — у 1,9 раза. У сярэднім на аднаго ўрача ў 1964 годзе ў горадзе прыходзілася 317 жыхароў. Вялікай павагай насельніцтва карыстаюцца галоўны ўрач першага клінічнага аб'яднання А. І. Шуба, неўрапатолаг Л. А. Стахоўская, галоўны ўрач гарадскога раддома А. І. Багданава, участковы ўрач В. Б. Кандрацьева і інш.

За гады сямігодкі прыкметна палепшылася спартыўна-масавая работа. У 1965 годзе ў горадзе працавала чатыры стадыёны, некалькі дзесяткаў комплексных спартыўных пляцовак, звыш 600 баскетбольных, валейбольных і тэнісных пляцовак, 150 спартыўна-гімнастычных залаў, чатыры штучных плавальных басейны, чатыры лодачныя станцыі і г. д. 435 фізкультурных калектываў сталіцы налічваюць звыш 170 тысяч чалавек. За сем год падрыхтавана больш 650 майстроў спорту.

Хуткімі тэмпамі развівалася жыллёвае будаўніцтва. За сямігодку дзяржаўнымі і кааператыўнымі арганізацыямі і насельніцтвам горада пабудавана звыш 2400 тысяч квадратных метраў жылой плошчы, што ў 2,2 раза перавышае ўвесь даваенны жыллёвы фонд Мінска. Такі аб'ём будаўнічых работ стаў магчымы дзякуючы вялікім капі-

талаўкладанням, якія за 1959—1965 гады склалі звыш 280 мільёнаў рублёў.

Шырокае распаўсюджанне атрымала будаўніцтва жылых дамоў на кааператыўных пачатках з дапамогай дзяржаўнага крэдыту. Усяго за сем год індывідуальнымі забудоўшчыкамі ўзведзена 190 тысяч квадратных метраў жылой плошчы.

Вялікія сродкі выдаткоўваюцца на капітальны рамонт, добраўпарадканне і ўтрыманне жыллёвага фонду, прычым расходы дзяржавы на ўтрыманне жылля перавышаюць кватэрную плату. У 1965 годзе ўжо было газіфікавана амаль 113 тысяч кватэр, сотні прамысловых і камунальна-бытавых прадпрыемстваў, лячэбных, дзіцячых і навуковых устаноў.

З павелічэннем рэальных даходаў працоўных павялічваўся і рост народнага спажывання. У параўнанні з 1958 годам рознічны тавараварот за шэсць год сямігодкі ўзрос на 56 працэнтаў (у супастаўленых цэнах) і склаў у 1964 годзе 505,5 мільёна рублёў. За перыяд з 1950 па 1963 год продаж мясапрадуктаў узрос у дзевяць, тлушчу жывёльнага і раслінnага — у шэсць, малака і малочных прадуктаў — у трынаццаць, рыбы — у два, цукру — больш чым у тры разы.

Значна павысіўся попыт насельніцтва на прамысловыя тавары і тавары культурна-бытавога прызначэння. У 1963 годзе, напрыклад, было прададзена халадзільнікаў у трынаццаць разоў больш, чым у 1955 годзе, пральных машын — у дваццаць сем, тэлевізараў — у восем, матацыклаў і матаролераў — у пяць разоў. Павялічыўся таксама продаж швейных вырабаў, скуранога абутку, мэблі і г. д.

За гады сямігодкі пашырылася і сетка прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. У 1965 годзе ў Мінску было 1129 гандлёвых прадпрыемстваў, у тым ліку 680 магазінаў. Сярод іх пабудаваныя ў сучасным стылю, цудоўна абсталяваныя магазіны: «1000 дробязей», «Дом абутку», гастраном «Сталічны», спецыялізаваныя магазіны «Крышталь», «Астра», «Прырода», «Шчасце», «Лянок», «Сінтэтыка», «Мінск» і інш. Акрамя таго, працавала 619 сталовых, кафэ, рэстаранаў, буфетаў.

Асаблівай увагай карысталася будаўніцтва гандлёвых прадпрыемстваў у новых мікрараёнах горада.

З мэтай паляпшэння гандлёвага абслугоўвання насельніцтва далейшае развіццё атрымала спецыялізацыя гандлёвых прадпрыемстваў і ўкараненне новых прагрэсіўных форм гандлю. Агульная колькасць спецыялізаваных магазінаў і ўнівермагаў склала ў 1965 годзе звыш 72 працэнтаў. У рабоце гандлёвай сеткі шырока выкарыстоўваецца адкрытая выкладка тавараў і свабодны доступ пакупнікоў да іх, продаж па ўзорах, раскрой тканін, прыём папярэдніх заказаў, дастаўка на дом. У многіх магазінах створаны бюро доб-

рых паслуг, якія на грамадскіх пачатках абслугоўваюць пенсіянераў, хворых і састарэлых. Удзячнасць мінчан заслужылі магазіны, пераведзеныя на самаабслугоўванне, магазіны-аўтаматы, магазіны па выдачы тавараў напракат. З кожным годам павялічваўся продаж тавараў у крэдыт, арганізаваны ў кастрычніку 1959 года.

Шырока карыстаецца насельніцтва Мінска паслугамі дамавых кухняў, а таксама магазінаў і павільёнаў, дзе быў арганізаваны продаж паўфабрыкатаў. За шэсць год сямігодкі продаж прадукцыі прадпрыемстваў грамадскага харчавання ўзрос у 1,8 раза, у 1964 годзе было прададзена звыш 120 мільёнаў страў.

Выключна важнае значэнне надавалася арганізацыі харчавання школьнікаў, студэнтаў і навучэнцаў тэхнікумаў. У школах сталіцы арганізаваны сталовыя і буфеты, якія забяспечваюць дзяцей гарачым харчаваннем.

За гады сямігодкі прыкметна палепшылася бытавое абслугоўванне насельніцтва. Аб'ём паслуг, аказваемых насельніцтву прадпрыемствамі бытавога абслугоўвання, за сем год узрос удвая. Ажыццёўлены мерапрыемствы па спецыялізацыі і аснашчэнню сучасным тэхналагічным абсталяваннем прадпрыемстваў быту. Далейшае развіццё атрымалі такія формы бытавога абслугоўвання, як выдача ў пракат прадметаў хатняга ўжытку, прыём заказаў на месцы работы або месцы жыхарства, стварэнне перасоўных майстэрняў і прыёмных пунктаў, дамавых пральняў і г. д.

Павышэнне рэальных даходаў працоўных, шырокае развіццё аховы здароўя, узрост народнага спажывання, сістэматычнае паляпшэнне ўмоў працы і быту ў Мінску садзейнічалі захаванню высокага ўзроўню нараджальнасці і нізкай смяротнасці насельніцтва. Звычайны прырост насельніцтва беларускай сталіцы значна перавышаў тэмп прыросту насельніцтва ў буйнейшых гарадах найбольш развітых капіталістычных краін. Усё гэта сведчыць аб няспынным павышэнні матэрыяльнага дабрабыту жыхароў сталіцы Беларускай ССР.

4. Рост гарадской гаспадаркі і добраўпарадкаванне Мінска і яго ваколіц

Тэрыторыя Мінска ў межах горада складала ў канцы сямігодкі 12,4 тысячы гектараў. Насельніцтва на 1 студзеня 1966 года налічвалася 739 тысяч чалавек.

У 1958—1965 гады працягваліся работы па далейшаму добраўпарадкаванню Мінска і яго ваколіц.

Праведзены карэнныя змены планіроўкі многіх частак горада. У цэнтральным раёне сталіцы пракладзены магістралі скразнога руху: Магілёўскае шасэ — вуліца Янкі Купалы, Чэрвеньскі тракт — вуліцы Маякоўскага — Свярдлова, Рэвалюцыйная, Ульянаўская — Першамайская — Высокая, Мяснікова — Няміга — Горкага.

У 1960—1962 гады Ленінскі праспект злучылі па новаму пуцеправоду з Маскоўскай вуліцай, якая працягвае трасу праспекта на захад да выхаду на Брэсцкае шасэ.

У гады сямігодкі працягвалася архітэктурнае афармленне плошчаў, якія размешчаны па Ленінскім праспекце. На плошчы Леніна, якая па сваіх памерах перавышае на 2,7 гектара плошчу Згоды ў Парыжы, на 0,7 гектара Дварцовую плошчу ў Ленінградзе, на 2 гектары Чырвоную плошчу ў Маскве, узведзены велічныя будынкі Мінскага гарадскога Савета і галоўны вучэбны корпус Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У цэнтры плошчы размешчаны сквер партэрнага тыпу.

Праведзены значныя работы па добраўпарадкаванню Цэнтральнай плошчы, дзе ўзведзены новы будынак Дзяржаўнага музея Беларускай ССР, плошчы Перамогі з абеліскам у цэнтры, ля падножжа якога гарыць агонь славы, запалены 3 ліпеня 1961 года ў дзень 17-й гадавіны вызвалення Мінска Савецкай Арміяй ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Працягваліся работы па ўпарадкаванню плошчы Якуба Коласа, якая ператварылася ў буйны транспартны вузел. У цэнтральнай частцы плошчы, занятай скверам, будзе ўзведзены помнік народнаму паэту Якубу Коласу. У 1963 годзе тут быў пабудаваны будынак Беларускай філармоніі. Плошча Якуба Коласа непасрэдна мяжуе з вялізнымі мікрараёнамі па вуліцах Бандараўскай і Веры Харужай. У гады сямігодкі забудавалі ансамбль плошчы Калініна.

Характэрнай рысай гарадскога будаўніцтва апошніх год з'яўляецца пераход да забудавання буйных масіваў — мікрараёнаў на плошчы 25—50 гектараў з паркам і спартыўным комплексам у іх цэнтры. Прыгожыя жыллёвыя масівы такога тыпу створаны за гады сямігодкі ў раёне вуліц Арлоўскай, К. Лібкнехта, Р. Люксембург, Магілёўскага шасэ. Хуткімі тэмпамі ідзе будаўніцтва ў раёнах Зялёнага Луга, Харкаўскай вуліцы, Ракаўскага і Дзяржынскага шасэ і інш. У жніўні 1959 года распачалі буйное будаўніцтва ў мікрараёне цяперашняй Валгаградскай вуліцы. Наяўнасць магутнай будаўнічай індустрыі дала магчымасць у найкарацейшыя тэрміны пабудаваць і засяліць першымі навасёламі да лютага 1960 года два дамы па вуліцы Кядышкі. Зараз у гэтым мікрараёне тэрыторыя ў 33,8 гектара забудавана дзесяткамі шматпавярховых будынкаў, у якіх жыве больш 20 тысяч насельніцтва. У мікрараёне ўзведзены цэлы комплекс будынкаў культурна-бытавога прызначэння. Грамадскасць гэтага

раёна прыклала шмат намаганняў па добраўпарадкаванню і азеляненню тэрыторыі. Тут пасаджана 3200 дэкаратыўных і 676 фруктовых дрэў, 33 400 кустоў, кожны год вырошчваецца мноства разнастайных кветак. Да канца забудовы гэтага мікраёна яшчэ больш 18 гектараў тэрыторыі мікраёна будзе азелянёна.

Паступова ажыццяўлялася перабудова самага старажытнага раёна Мінска, які размешчаны па вуліцах Нямізе, Вольнай, Падзамкавай і інш. Жамчужынай Мінска будзе Паркавая магістраль, дзе ўжо створаны вялікі спартыўны комплекс з футбольным полем і трыбунамі на 15 тысяч месц, Палацам спорту на шэсць тысяч чалавек і іншымі спартыўнымі пабудовамі.

Непазнавальна змяніўся раён горада — Ляхаўка (цяпер Заводскі). У пасляваенныя гады гэты раён пашырыўся далёка на паўднёвы ўсход, уздоўж Магілёўскага шасэ і злучыўся з новым прамысловым раёнам, дзе ўзніклі аўтамабільны, трактарны, маторны, падшыпнікавы заводы, а разам яны ўтварылі вялікі жылы масіў. Багацце зеляніны, шырокія, прасторныя вуліцы з бульварамі, кветнікамі, добраўпарадкаваныя кварталы ствараюць добрыя ўмовы для жыцця працоўных. У гэтай частцы горада ёсць прыродны сасновы лесапарк, і з ім удала спалучаюцца зялёныя насаджэнні ліставых дрэў. Галоўная магістраль гэтага раёна — Магілёўскае шасэ — выглядае як вялікі бульвар шырынёй у 95 метраў. Раён расце ўздоўж шасэ, якое ўжо забудавана ад аўтазавода да былой ускраіны Мінска, дзе зараз размешчаны мотавелазавод, а сама магістраль ператварылася ў адну з найпрыгажэйшых вуліц Мінска. Заводскі раён звязваюць з цэнтрам тралейбусныя і трамвайныя лініі, аўтобусныя маршруты. Ён займае зараз першае месца па выпуску прамысловай прадукцыі, другое — па колькасці насельніцтва і жыллёвай плошчы сярод пяці адміністрацыйных раёнаў горада.

У апошнія гады для Мінска характэрна будаўніцтва дамоў з павышанай паверхавасцю. Гэта дазваляе больш эфектыўна выкарыстоўваць гарадскія землі, палепшыць транспартнае абслугоўванне, паменшыць выдаткі на будаўніцтва і палепшыць планіроўку кватэр.

Пашыраецца тэрыторыя Мінска. У апошнія гады ў межы горада ўвайшлі прыгарадныя вёскі Малая Сляпянка, Зацішша, Сцыклява, Вялікая Слепня, Будзілава, Дражня і многія іншыя населеныя пункты. Яны змяняюць свой выгляд: паяўляюцца каменныя будынкі, цвёрдыя маставыя, пракладваецца водаправод.

У гады сямігодкі працягвалася будаўніцтва прадпрыемстваў бытавога і камунальнага абслугоўвання. У 1963 годзе, напрыклад, уведзены ў эксплуатацыю новы камбінат бытавога абслугоўвання па вуліцы Ціміразева, а ў 1964 годзе — у пасёлку «Усходні». Пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю фабрыка хімічнай чысткі і афарбоў-

кі адзенне, буйны лазнева-пральны камбінат, шэсць новых камунальных лазняў і г. д.

Значна павялічылася прапускная здольнасць камунальных пральняў, змяніліся і формы абслугоўвання імі насельніцтва. У асобных раёнах горада ўзніклі механічныя пральні самаабслугоўвання.

За апошнія гады ў Мінску пабудаваны дзве новыя гасцініцы: «Чайка» па вуліцы Талбухіна і «Спадарожнік» на 308 месц па вуліцы Брылеўскай. Усяго ў Мінску дзевяць гасцініц, з іх шэсць камунальных. У 1965 годзе яны забяспечвалі месцамі звыш дзвюх тысяч чалавек.

У 1959—1965 гады паспяхова праходзілі работы па газіфікацыі прамысловых прадпрыемстваў, культурна-бытавых аб'ектаў і жыллёвага фонду. Асабліва хуткімі тэмпамі газіфікаваўся горад пасля сканчэння будаўніцтва газаправода Дашава — Мінск. У пачатку 1966 года 407 прамысловых прадпрыемстваў працавалі на прыродным газавым паліве. Акрамя таго, газіфікавана 114 абагравальных кацельняў, шмат лячэбных, дзіцячых, бытавых і іншых устаноў. У 1965 годзе было газіфікавана 112,7 тысячы кватэр. Працягласць газавых сетак сталіцы ў студзені 1966 года складала 517,6 кіламетра.

Газіфікацыя горада Мінска абумовіла поўную перабудову паліўнага балансу, дзе газ зараз займае больш палавіны ўдзельнай вагі. У выніку гэтага значна ачысцілася паветра ад шкодных адпрацаваных прамысловых газаў.

Развівалася і водаправодная сетка горада. У апошнія гады сямігодкі для павелічэння водазабеспячэння сталіцы асвоены новыя водазаборы, пабудаваны дадатковыя помпавыя станцыі. Сярэднесутачная падача вады к 1966 году павялічылася да 257 тысяч кубічных метраў супраць 85,9 тысячы кубічных метраў у 1958 годзе. Працягласць водаправоднай сеткі і водаправодаў у канцы 1965 года ў параўнанні з 1958 узрасла ў 1,8 раза.

Далейшае водазабеспячэнне горада будзе ажыццяўляцца з групавых водазабораў, якія размешчаны ў раёнах населеных пунктаў перыферыйнай часткі сталіцы, а магутнасць водазаборных збудаванняў даведзена да 739 тысяч кубічных метраў вады ў суткі.

Значныя работы ажыццёўлены па стварэнню каналізацыі і ачышчальных збудаванняў. У канцы сямігодкі даўжыня сеткі калектараў і вулічнай каналізацыйнай сеткі павялічылася больш чым у два разы. У 1965 годзе ўведзена ў эксплуатацыю станцыя аэрацыі па абясшкоджванню каналізацыйных вод у раёне вёскі Шабаны. Магутнасць яе 215 тысяч кубічных метраў каналізацыйных вод у суткі. У далейшым магутнасць ачышчальных збудаванняў будзе дасягаць 595 тысяч кубічных метраў у суткі, што значна палепшыць санітарны стан ракі Свіслачы і іншых вадаёмаў і ў цэлым горада.

Сур'ёзная ўвага надавалася развіццю гарадскога транспарту. У канцы сямігодкі ў горадзе працавала сем трамвайных і дзевяць тралейбусных маршрутаў.

Значна павялічылася працягласць эксплуатацыйных тралейбусных ліній. У 1963 годзе быў адкрыты сёмы маршрут ад плошчы Веры Харужай у мікрараён вуліцы Арлоўскай, у 1965 — восьмы ад плошчы Якуба Коласа ў раён вуліцы Лермантава і дзевяты ад Ленінскага праспекта ў мікрараён па вуліцы Харкаўскай. Тралейбусны парк у студзені 1966 года меў 180 тралейбусаў.

Горад мае развітую сетку аўтамабільнага пасажырскага транспарту. Па гораду кожны дзень па ўсіх маршрутах курсіруе больш 400 аўтобусаў. Гарадскі таксаматорны парк налічвае звыш 400 легкавых аўтамабіляў. Пасля ўвядзення ў эксплуатацыю новага трамвайнага дэпо на 250 вагонаў прыкметна павялічыліся транспартныя перавозкі ў межах горада.

Вялікае значэнне ў жыцці сталіцы Беларусі мае знешні транспарт. Праз Мінск праходзяць найважнейшыя чыгуначныя магістралі, аўтамабільныя дарогі і паветраныя трасы, якія звязваюць цэнтральныя і паўднёвыя раёны краіны з Прыбалтыйскімі рэспублікамі, Польскай Народнай і Германскай Дэмакратычнай рэспублікамі. У склад Мінскага чыгуначнага вузла ўваходзіць сем станцый: Мінск-Пасажырская з двума вакзаламі (далёкага напрамку і прыгараднай сувязі), Мінск-Таварны, Мінск-Усходні, Мінск-Паўночны, станцыі Сцяпанка, Козырава, Заводская і інш.

У снежні 1963 года пушчаны ў эксплуатацыю электрыфікаваны ўчастак чыгункі да станцыі Аляхновічы працягласцю 48 кіламетраў.

З кожным годам усё больш важнае значэнне набывае Мінскі аэрапорт. Мінск мае прамыя паветраныя сувязі з усімі абласнымі цэнтрамі і многімі прамысловымі гарадамі рэспублікі. Існуюць рэгулярныя паветраныя зносіны з Масквой, Ленінградам, Кіевам, Львовам, Адэсай, Сімферопалем, Краснадарам, Мінеральнымі Водамі, Вільнюсам, Рыгай і іншымі гарадамі краіны. Праз Мінск праходзіць магістральная паветраная траса Масква — Варшава — Берлін. Агульная працягласць паветраных ліній, якія абслугоўвае Мінскі аэрапорт, складае звыш шасці тысяч кіламетраў.

Як і раней, у гады сямігодкі вяліся работы па добраўпарадкаванню Мінска. Уведзены ў строй пуцепровод з плошчы Леніна на Маскоўскую вуліцу, пуцеправоды па вуліцы Апанскага і з Суражскай вуліцы на Чыгуначную, ад плошчы Свабоды да Паркавай магістралі. Пабудаваны масты па вуліцы Я. Купалы, Першамайскай, Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1964 годзе быў адкрыты праезд па такіх важных магістралях, як Магілёўскае шасэ. Выхад на цэнтральныя магістралі горада атры-

малі вуліцы Харкаўская, Прылукская, Уманская, Валгаградская і многія іншыя.

У 1965 годзе былі добраўпарадкаваны пад'езды ў мікрараёны. За гады сямігодкі працягласць замошчаных вуліц узрасла з 193,8 кіламетра ў 1958 годзе да 282,5 кіламетра ў 1965 годзе.

У адпаведнасці з планам рэканструкцыі праводзіліся вялікія работы і па азеляненню горада. Плошча зялёных насаджэнняў агульнага карыстання ўзрасла больш чым у 15 разоў у параўнанні з 1940 годам. Па колькасці зялёных насаджэнняў Мінск становіцца ў рад такіх добраўпарадкаваных гарадоў, як Кіеў, Рыга і інш. У канцы 1965 года ў Мінску было 9 паркаў, 97 сквераў, 12 бульвараў, 39 лясных і зялёных масіваў. Паркі, лесапаркі, скверы і бульвары горада займаюць плошчу ў 850 гектараў. Азеляненне горада праводзілася з такім разлікам, каб стварыць зялёныя калідоры, якія забяспечылі б доступ чыстага паветра да найбольш заселеных раёнаў. Парк імя Горкага рэканструяваны ў Цэнтральны дзіцячы парк. Там ёсць стадыён для масавых дзіцячых спартыўных спаборніцтваў, велатрэк, тэнісныя корты, культурна-відовішчныя ўстановы, скончана будаўніцтва і абсталяванне планетарыя, пабудаваны дзіцячыя атракцыёны, штучныя вадаёмы і іншыя збудаванні.

За гады сямігодкі праведзены вялікія работы па добраўпарадкаванню прыгараднай зоны Мінска, якая ператворана ў зону адпачынку працоўных.

Прыгарадная зона займае раён радыусам 30—40 кіламетраў вакол Мінска. Тут пабудаваны прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Прадпрыемствы харчовай прамысловасці пастаўляюць у Мінск свежамалочныя прадукты, масла. У кар'ерах здабываюцца гравій і пясок для вытворчасці бетону. У прылягаючых да Мінска раёнах размешчаны асноўныя торфаздабываючыя прадпрыемствы, буйная цеплавая электрастанцыя. Пятая частка пасяўной плошчы прыгараднай зоны занята пасевамі бульбы і гародніны. Гэта дазваляе круглы год забяспечваць насельніцтва горада свежымі прадуктамі.

Каб палепшыць забеспячэнне Мінска сельскагаспадарчымі прадуктамі і панізіць сабекошт іх вытворчасці, паблізу ад горада арганізаваны спецыялізаваныя малочныя і малочна-гароднінныя гаспадаркі: калгасы «Савецкая Беларусь», імя Кірава, імя Калініна, імя Гастэлы і шмат іншых.

Шырока вядомы спецыялізаваныя гароднінна-малочныя саўгасы «Волма» і «Рассвет». Кожны год толькі «Волма» пастаўляе Мінску да 15 тысяч тон бульбы, 2 тысячы тон гародніны.

Парнікова-цяплічны камбінат, які размешчаны на ўскраіне горада, кожны год пастаўляе ў Мінск тысячы цэнтнераў ранняй гародні-

ны і зеляніны, сотні тысяч штук расады, зялёную цыбулю, шчаўе, а ранняй вясной — агуркі, памідоры, радыску і іншую гародніну.

У 1964 годзе пачала даваць прадукцыю другая Мінская гародніна-ная фабрыка. Пасля сканчэння будаўніцтва яна будзе самым буйным прадпрыемствам па вытворчасці гародніны ў Беларусі.

Вакол Мінска ў апошнія гады паявілася многа фруктовых садоў. У радыусе да 20 кіламетраў ад яго толькі калгасныя сады займаюць плошчу больш 2 тысяч гектараў. Створана таксама больш 30 садовых кааператыўных аб'яднанняў, плошча якіх складае звыш 300 гектараў.

Развіваюцца буйныя спецыялізаваныя птушкагадоўчыя і рыбныя гаспадаркі. Так, Мінская птушкафабрыка кожны дзень пастаўляе гораду да 70 тысяч яек і 2500 кілаграмаў мяса. У найбліжэйшы час прадугледжваецца павялічыць магутнасць фабрыкі да 30 мільёнаў яек і адну тысячу тон мяса птушкі ў год.

У ваколіцах горада размешчан рад рыбных гаспадарак, якія забяспечваюць горад рыбай. Рыбгас «Волма» на працягу года вырошчвае да 7,5 тысячы цэнтнераў люстранога карпа і серабрыстага карася. Недалёка ад Мінска, ля Астрашыцкага гарадка, створана першая ў Беларусі фарэльная гаспадарка.

Вакол Мінска ствараюцца гарады-спадарожнікі. Адзін з іх — Жодзіна. Узнікненне яго звязана з будаўніцтвам буйной цеплавой электрастанцыі на торфе і Беларускага аўтамабільнага завода па выпуску вялікагрузных аўтамабіляў. У перспектыве намячаецца развіццё ў якасці горада-спадарожніка раённага цэнтра Дзяржынска.

У прыгарадзе ствараюцца навуковыя і лячэбныя цэнтры.

Лепшыя месцы адпачынку мінчан знаходзяцца на паўночным захадзе ад горада. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца Заслаўскае вадасховішча (Мінскае мора), якое размешчана ўсяго толькі ў 12—14 кіламетрах ад Мінска. Гэта самае буйное штучнае вадасховішча Беларусі. Яго плошча складае 3400 гектараў, а берагавая паласа, занятая сасновым і змешаным лесам, пляжамі, зялёнымі лугамі, цягнецца на 20 кіламетраў. Спалучэнне вялізнай воднай паверхні і лесу стварае асобы мікраклімат, карысны для здаровага, прыемнага адпачынку. Уздоўж берагоў Мінскага мора і ракі Свіслачы размешчана звыш 20 піянерскіх лагераў, 15 дзіцячых садоў-дач, дамы адпачынку, чатыры спартыўных лагеры, тры дачных пасёлкі.

Зона адпачынку займае вялікі раён ад Заслаўля на паўночным захадзе да Сёмкава Гарадка на ўсходзе і Ждановіч на поўдні. У 30 кіламетрах на поўдзень ад Мінска размешчаны другі дачны раён горада. У вёсцы Каралішчавічы, на беразе Свіслачы, знаходзяцца Дом адпачынку пісьменнікаў, спартыўны і піянерскі лагеры. Спартыўны лагер «Стайкі» ў летні перыяд адначасова абслугоўвае тысячу чала-

век. Ён займае плошчу 74 гектары, на тэрыторыі лагера ёсць стадыён з усімі спартыўнымі пляцоўкамі. Для адпачынку скарыстоўваюць таксама раён Астрашыцкага гарадка на поўнач ад Мінска.

На захад ад горада па шасэ Мінск — Брэст у прыгожай лясной мясцовасці размешчаны лагер аўтатурыстаў «кемпінг».

Вакол Мінска нямала гістарычных мясцін, з якімі звязана жыццё выдатных людзей. На паўночны захад ад Заслаўля, на адлегласці чатырох кіламетраў ад Радашковіч, размешчана вёска Вязынка — радзіма народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Паблізу ад Стаўбцоў у сяле Мікалаеўшчына, дзе ў 1882 годзе нарадзіўся народны паэт Беларусі Якуб Колас, створаны філіял літаратурнага музея. У 50 кіламетрах на захад ад Мінска ў б. вёсцы Пятрылавічы (зараз Дзяржынава) знаходзіцца радзіма мужнага рэвалюцыянера, выдатнага дзеяча партыі і Савецкай дзяржавы Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага. Працоўныя шануюць памяць свайго славутага земляка. У 1951 годзе на яго радзіме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка, а ў 1953 годзе ў Івянцы — помнік. У дзень 80-годдзя з дня нараджэння Фелікса Эдмундавіча адкрыўся музей Ф. Э. Дзяржынскага.

Такім чынам, работы, праведзеныя ў 1958—1965 гады па добраўпарадкаванню Мінска і яго ваколіц, рост гарадской гаспадаркі садзейнічалі стварэнню найлепшых умоў для жыцця працоўных сталіцы. За гады сямігодкі Мінск стаў адным з найпрыгажэйшых гарадоў краіны, буйным прамысловым і культурным цэнтрам.

РАЗДЗЕЛ XXIV

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ГОРАДА

1. Грамадска-палітычнае жыццё горада

Задачы камуністычнага будаўніцтва патрабавалі павышэння творчай актыўнасці і ініцыятывы працоўных, шырокага ўдзелу народных мас у кіраванні дзяржавай, ва ўсёй гіганцкай арганізатарска-гаспадарчай рабоце, якая праводзілася ў краіне.

Пасля XX з'езду КПСС грамадскае, палітычнае і культурнае жыццё Мінска значна актывізавалася. Рабочыя і служачыя, настаўнікі, урачы, работнікі іншых прафесій прымалі непасрэдны ўдзел у рашэнні гаспадарчых і культурных пытанняў.

Яскравым сведчаннем высокай палітычнай актыўнаеці працоўных Мінска з'явіўся іх удзел у абмеркаванні найважнейшых праектаў пастаноў партыі і ўрада.

Так, у перыяд падрыхтоўкі да XXII з'езду партыі ў абмеркаванні праекта Праграмы КПСС прымалі актыўны ўдзел не толькі камуністы, але і шырокія слаі насельніцтва горада.

Асабліва разнастайнымі былі формы грамадска-палітычнай дзейнасці насельніцтва ў час выбараў у Саветы дэпутатаў працоўных. Сотні выбаршчыкаў непасрэдна працавалі ва ўчастковых, акруговых выбарчых камісіях, з'яўляліся актыўнымі прапагандыстамі і агітатарамі.

На перадвыбарных сходах і ў час сустрэч з кандыдатамі ў дэпутаты выбаршчыкі адкрыта выказвалі свае думкі па ўсіх пытаннях грамадскага, палітычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Наказы і прапановы працоўных абагульнялі і аналізавалі органы дзяржаўнай улады ў далейшай сваёй дзейнасці.

Саветы дэпутатаў — найбольш прадстаўнічыя і масавыя арганізацыі працоўных. Так, у сакавіку 1965 года ў Мінскі гарадскі Савет было абрана 500 дэпутатаў. З гэтай колькасці 273 чалавекі, г. зн. больш палавіны, рабочыя. У Савеце прадстаўлены людзі розных прафесій: 14 работнікаў гандлю і грамадскага харчавання, 27 выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў, 18 дырэктараў школ, 64 работнікі савецкіх і партыйных органаў і г. д. У пяці раённых Саветах Мінска (Заводскім, Ленінскім, Кастрычніцкім, Савецкім і Фрунзенскім) 1189 дэпутатаў, у тым ліку 624 рабочых.

Выбарчая кампанія, як і ў папярэднія гады, прайшла арганізавана, у абстаноўцы вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму. У час выбараў у гарадскі Савет у галасаванні прынялі ўдзел 456 442 выбаршчыкі, або 99,71 працэнта, з іх 99,65 працэнта аддалі свае галасы за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных. Такім чынам, вынікі выбараў сведчылі аб перамозе савецкай сацыялістычнай дэмакратыі, адзінстве і згуртаванасці працоўных Мінска вакол Камуністычнай партыі.

Партыйная арганізацыя сталіцы аддавала шмат увагі ўмацаванню кадрамі раённага звяна. Дзеля гэтай мэты апарат райкомаў партыі папоўнілі вопытнымі партыйнымі работнікамі, якія забяспечвалі выкананне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва горада.

Партыйная арганізацыя сталіцы стала больш займацца развіццём грамадскай ініцыятывы ва ўсіх сферах вытворчага і духоўнага жыцця насельніцтва горада. За гады сямігодкі яе рады значна выраслі. Так, калі ў 1959 годзе Мінская партыйная арганізацыя налічвала 26 963 камуністы, дык у 1965 годзе колькасць членаў і кандыдатаў партыі павялічылася да 55 880 чалавек.

Пад кіраўніцтвам ЦК КПБ Мінскі гарадскі камітэт партыі палепшыў работу па ўцягванню мас у кіраўніцтва дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтвам. Камуністаў і беспартыйных пачалі шырэй далучаць да падрыхтоўкі пытанняў, якія выносіліся на абмеркаванне пленумаў і бюро гаркома і райкомаў партыі, савецкіх і гаспадарчых органаў горада.

Узмацненне грамадскіх пачаткаў у дзейнасці партыйных, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый прывяло не толькі да паляпшэння работы грамадскіх камісій, якія існавалі пры гаркоме і райкомах партыі, выканкоме гарадскога і раённых Саветаў, але і да стварэння шэрага новых камісій і аддзелаў, працуючых на грамадскіх пачатках. Шырока выкарыстоўваў новыя формы работы, садзейнічаў развіццю грамадскай ініцыятывы, накіраванай на далейшы ўздым творчай актыўнасці і самадзейнасці камуністаў і ўсіх працоўных, на пашырэнне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, Кастрычніцкі РК КПБ Мінска. Тут

да дзейнасці на грамадскіх пачатках ужо ў 1962 годзе было прыцягнута больш 500 камуністаў.

Апарат райкома абапіраўся ў сваёй рабоце на грамадскія аддзелы адміністрацыйных і гандлёва-фінансавых органаў, аддзел будаўніцтва і аддзел па рабоце школ, тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў. Вялікую дапамогу райкому аказвалі камісіі па арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай рабоце, папярэдняму разгляду матэрыялаў аб прыёме ў партыю і персанальных спраў камуністаў, па кантролю за выкананнем рашэнняў партыйных і савецкіх органаў. Акрамя гэтага, да падрыхтоўкі пытанняў на бюро райкома прыцягвалі каля 30 пазаштатных інструктараў. Пад кіраўніцтвам райкома працавалі раённыя — тэхнічны, эканамічны і жаночы саветы, больш 30 грамадскіх канструктарскіх бюро, каля 50 тэхнічных саветаў і іншыя грамадскія аб'яднанні.

У сакавіку 1962 года Мінскі гарком адобрыў ініцыятыву Кастрычніцкага раённага камітэта партыі аб развіцці грамадскіх пачаткаў у партыйнай рабоце і прыняў рашэнне аб распаўсюджанні гэтага вопыту ў дзейнасці ўсіх райкомаў партыі Мінска. Гарком КПБ указаў таксама на неабходнасць правядзення семінараў з работнікамі аддзелаў, камісій, саветаў з мэтай абмену вопытам практычнай работы.

Усё новае і перадавое, накіраванае на паляпшэнне стылю, форм і метадаў работы, гарадскі камітэт партыі імкнуўся ўкараніць у работу савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх органаў.

Асаблівую ўвагу надавалі пры гэтым дзейнасці Мінскага гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных.

Усё гэта станоўча адбілася на паляпшэнні работы сесій Саветаў. Перш за ўсё дэпутаты пачалі абмяркоўваць на іх больш шырокае кола пытанняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Перыядычна заслухоўвалі справаздачы выканкомаў і кіраўнікоў ведамстваў аб выкананні прынятых раней рашэнняў Саветаў. Гэта павышала адказнасць выканаўча-распарадчых органаў за няўхільнае выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў. Абмеркаванне на сесіях пытанняў сацыяльна-культурнага і жыллёва-камунальнага будаўніцтва, паляпшэння бытавога абслугоўвання, аховы грамадскага парадку і іншых патрабавала ад дэпутатаў больш цесных кантактаў з выбаршчыкамі, высвятлення іх запатрабаванняў.

У адпаведнасці з рашэннямі нашай партыі павысілася роля пастаянных камісій Саветаў дэпутатаў працоўных. Пасля выбараў 1965 года Мінскі гарадскі Савет стварыў 14 пастаянных камісій (мандатная, бюджэтна-эканамічная, транспарту і сувязі, бытавога абслугоўвання, культурна-асветная, народнай асветы, аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння, будаўнічая, гандлю і грамадскага харчаван-

ня, камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкавання, сацыялістычнай законнасці і аховы грамадскага парадку, аховы прыроды і азеляне-ня, фізкультуры і спорту, жыллёвая). У іх рабоце прымаюць удзел 443 дэпутаты. У пяці раённых Саветах горада ў 1965 годзе было ство-рана 60 пастаянных камісій, у складзе якіх былі 1084 дэпутаты рай-саветаў. Такім чынам, да работы ў камісіях прыцягваюцца амаль усе дэпутаты.

Пастаянныя камісіі займаліся вырашэннем самых разнастайных пытанняў жыцця горада: жыллёвым будаўніцтвам і добраўпарадка-ваннем, работай школ, бальніц, клубаў, бібліятэк, іншых прадпрыем-стваў і ўстаноў. Яны ажыццяўлялі кантроль за работай падначаленых Саветам арганізацый, за выкананнем наказаў выбаршчыкаў і прыня-тых Саветамі рашэнняў. Напрыклад, пастаянная камісія гарадскога Савета па народнай асвеце ў 1963—1965 гадах сканцэнтравала сваю работу на паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу і вытворчага на-вучання вучняў, узмацненні пазашкольнай работы сярод іх. У яе склад уваходзіла больш 30 дэпутатаў. Амаль усе яны — работнікі на-роднай асветы. Камісія праводзіла работу ў цесным кантакце з іншы-мі пастаяннымі камісіямі гарадскога і раённых Саветаў, аддзеламі на-роднай асветы і школамі.

Камісія па народнай асвеце кантралявала таксама ход выканання рашэнняў сесій гарадскога Савета па пытаннях пазашкольнай работы сярод дзяцей і ўзмацнення барацьбы з дзіцячай безнагляднасцю. Яна дапамагала арганізаваць харчаванне навучэнцаў у школьных стало-вых і буфетах, забяспечыць дзяцей дапаможнікамі, займалася многімі іншымі пытаннямі народнай асветы.

Большасць пастаянных камісій Саветаў дэпутатаў працоўных горада Мінска глыбока ўнікала ў работу аддзелаў і управленняў выканкомаў, падтрымлівала цесную сувязь з калектывамі прадпрыемстваў і ўстаноў.

У рашэннях XXII з'езду КПСС, Праграме партыі ўказваецца на неабходнасць перадаць пастаянным камісіям Саветаў дэпутатаў працоўных рад пытанняў, якія раней адносіліся да кампетэнцыі выканаўчых органаў улады і ўпраўлення.

Кіруючыся праграмнымі палажэннямі, раённыя Саветы Заводска-га, Савецкага і Фрунзенскага раёнаў Мінска ўжо перадалі частку пы-танняў на разгляд пастаянных камісій. Так, Савецкі раённы Савет даў права пастаяннай жыллёвай камісіі вызначаць дамы, якім патрэбны капітальны рамонт, камісіі па народнай асвеце даручыў арганізацыю работы бацькоўскіх камітэтаў школ і дзіцячых дашкольных устаноў, пастаяннай камісіі камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкавання — кіраўніцтва работай вулічных камітэтаў, камісіі па культурна-асвет-най рабоце — дзейнасць грамадскіх саветаў устаноў культуры, каміс-

сіі сацыялістычнай законнасці — дзейнасць таварыскіх судоў пры домакіраўніцтвах.

Пастаянныя камісіі рабіліся па сутнасці своеасаблівым апаратам Саветаў, які працуе на грамадскіх пачатках. Надзяленне камісій больш шырокімі паўнамоцтвамі павысіла іх адказнасць за становішча спраў у адпаведных галінах гаспадаркі, забяспечыла далейшае развіццё грамадскіх пачаткаў у дзейнасці Саветаў дэпутатаў працоўных.

Вялікая роля ў арганізацыйнай рабоце мясцовых Саветаў належыць тэрытарыяльным дэпутацкім групам, якія аб'ядноўваюць усіх дэпутатаў Саветаў. У 1965 годзе ў сталіцы рэспублікі працавалі 24 дэпутацкія групы, у склад якіх увайшло каля 550 дэпутатаў гарадскога і раённых Саветаў. Створаны яны былі галоўным чынам у мікрараёнах і заводскіх пасёлках. Стварэнне такіх груп дазволіла каардынаваць намаганні дэпутатаў у вырашэнні многіх пытанняў, узмацняла сувязі паміж дэпутатамі, павышала іх арганізацыйную ролю сярод выбаршчыкаў.

Асноўнае кола пытанняў, якімі займаліся дэпутацкія групы,— гэта аказанне дапамогі і ажыццяўленне кантролю за работай домакіраўніцтваў і жыллёва-камунальных аддзелаў, добраўпарадкаванне рабочых пасёлкаў, арганізацыя кантролю за выкананнем наказаў выбаршчыкаў, выяўленне і ўстараненне недахопаў у рабоце прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі, бытавога абслугоўвання і гарадскога транспарту.

Удасканальваючы формы работы, выканкомы гарадскога і раённага Саветаў кожны год усё больш прыцягвалі да непасрэднай работы ў Саветах перадавікоў вытворчасці, служачых, дзеячаў культуры і навукі. Калі ў 1960 годзе ў складзе актыву Саветаў дэпутатаў працоўных было каля 30 тысяч чалавек, дык у 1965 годзе ён вырас да 50 тысяч чалавек. Шырокі ўдзел працоўных мас у дзяржаўнай дзейнасці ажывіў работу Саветаў, іх выканаўчых камітэтаў, аддзелаў і ўпраўленняў, павысіў аўтарытэт органаў дзяржаўнай улады.

У 1961 годзе па рэкамендацыі гаркома партыі ў выканкомах раённых Саветаў дэпутатаў працоўных Мінска былі створаны грамадскія або пазаштатныя аддзелы гандлю. Хутка такія аддзелы ўзніклі і ў іншых галінах управлення. У 1965 годзе ў Мінску іх налічвалася 12, у тым ліку аддзелаў гандлю — пяць, аддзелаў культуры — пяць, аховы здароўя — адзін, бытавога абслугоўвання — адзін. Пазаштатныя аддзелы камплектаваліся з пенсіянераў, савецкіх і партыйных работнікаў, служачых гандлёвай сеткі, работнікаў культуры, перадавых рабочых.

Пазаштатныя аддзелы гандлю ўзяліся выконваць функцыі, якія раней аднаму штатнаму інструктару выканкома ажыццявіць было

цяжка. Яны карысталіся ўсімі правамі штатных аддзелаў і паспяхова кіравалі работай падначаленай ім гандлёвай сеткі.

Пазаштатны аддзел гандлю Фрунзенскага райвыканкома ў першы ж год свайго існавання праверыў работу 97 гандлёвых прадпрыемстваў. З дапамогай пакупнікоў прадстаўнікі выканкома выяўлялі факты абвешвання і аблічвання пакупнікоў, няўважлівых, а часам і грубых адносін да іх з боку асобных работнікаў прылаўка. Некаторыя гандлёвыя пункты па рэкамендацыі грамадскага аддзела былі вызвалены ад выпадковых і несумленных людзей.

Аддзел праводзіў пасяджэнні, на якія запрашаліся загадчыкі магазінаў і работнікі прылаўка. Супрацоўнікі аддзела аналізавалі прычыны недахопаў у арганізацыі гандлёвага абслугоўвання і ўказвалі шляхі іх ліквідацыі. Да гэтай работы яны прыцягвалі грамадскасць. У шасці магазінах былі праведзены канферэнцыі пакупнікоў, якія выбралі саветы магазінаў раёна з ліку іх работнікаў і пакупнікоў. У чэрвені 1961 года пазаштатны аддзел правёў нараду загадчыкаў магазінаў раёна з удзелам прадстаўнікоў гандлёвых арганізацый і пастаўшчыкоў, і гэта дапамагло вырашыць некаторыя пытанні работы гандлёвых арганізацый і гандлёвых прадпрыемстваў раёна.

Пазаштатны аддзел гандлю Ленінскага райвыканкома сумесна з пастаяннай камісіяй па гандлю і грамадскаму харчаванню сачыў за тым, як захоўваюцца правілы гандлю, за тым, ці ёсць у наяўнасці ў гандлёвай сетцы абавязковы асартымент тавараў і як прытрымліваюцца культуры абслугоўвання пакупнікоў. У 1963—1964 гадах аддзелам і пастаяннай камісіяй праведзена сумесная праверка работы 51 магазіна і 12 школьных буфетаў. Пазаштатны аддзел і пастаянная камісія падрыхтавалі рад важных пытанняў і вынеслі іх на разгляд выканкома, правялі сумесную праверку выканання рашэнняў выканкома гандлёвымі арганізацыямі.

Добра зарэкамендавалі сябе таксама пазаштатныя аддзелы гандлю Заводскага, Кастрычніцкага і Савецкага выканкомаў Мінска. Яны вельмі дапамаглі партыйным і савецкім арганізацыям у рабоце па паляпшэнню гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Значную дапамогу культурна-асветным установам аказалі пазаштатныя аддзелы культуры. Яны дапамагалі арганізоўваць работу бібліятэк, клубаў, кінатэатраў, паркаў, іншых устаноў культуры і месцаў масавага адпачынку працоўных горада. У цэнтры іх увагі — арганізацыя выхаваўчай работы з насельніцтвам па месцапражыванню.

Для больш шырокага прыцягвання насельніцтва да ўдзелу ў кіраванні дзяржавай пры штатных аддзелах і ўпраўленнях выканкомаў Саветаў створаны грамадскія саветы. Пры аддзелах і ўпраўленнях выканкома гарсавета ў 1965 годзе працавала, напрыклад, 26 грамадскіх саветаў. У іх склад уваходзілі спецыялісты ўпраўленняў і аддзелаў,

інжынерна-тэхнічныя і медыцынскія работнікі, настаўнікі, наватары вытворчасці, дэпутаты гарадскога Савета. З'яўляючыся дарадчымі органамі, грамадскія саветы аказваюць аддзелам і ўпраўленням дапамогу ў кіраўніцтве падначаленымі арганізацыямі і ўстановамі, садзейнічаюць павышэнню культуры ў рабоце.

У пачатку 60-х гадоў у Мінску пачалі стварацца разнастайныя самадзейныя арганізацыі насельніцтва, якія сталі надзейнай апорай Саветаў у вырашэнні пытанняў сацыяльна-культурнага і жыллёва-камунальнага будаўніцтва. Узніклі новыя або ўзнавілі сваю дзейнасць на больш шырокай аснове існаваўшыя раней многія органы грамадскай самадзейнасці: навуковыя і тэхнічныя саветы, саветы здароўя, культуры, работнікаў гандлю, грамадскіх прафесій, грамадскія інстытуты і універсітэты, добраахвотныя народныя дружыны, дамавыя і вулічныя камітэты, таварыскія суды, саветы аўтаінспектараў і інш. Гэтыя аб'яднанні працоўных аказваюць дапамогу партыйным, камсамольскім, савецкім і прафсаюзным арганізацыям у практычным ажыццяўленні самых разнастайных мерапрыемстваў.

Шмат карыснага робяць вулічныя і дамавыя камітэты. Разам з іншымі грамадскімі арганізацыямі яны займаюцца пытаннямі праўладкавання і выхавання грамадзян, добраўпарадкаваннем вуліц і двароў. Дамавыя камітэты пры домакіраўніцтве № 19, напрыклад, рэгулярна праводзілі свае пасяджэнні і сходы жыхароў, на якіх абмяркоўваліся пытанні рамонту кватэр, паводзін дзяцей і падлеткаў, узаемаадносін паміж жыхарамі і інш. З дапамогай дамавых камітэтаў пры домакіраўніцтве былі створаны на грамадскіх пачатках дзве рамонтныя брыгады, якія рамантавалі лесвіцы, дзверы, абсталяванне дзіцячых пляцовак і іншых месц грамадскага карыстання. Чатыры брыгады на грамадскіх пачатках рамантавалі бойлеры. Пры домакіраўніцтве працавалі фота-, музыкальны, танцавальны і спартыўныя гурткі. Вялікую работу праводзіла грамадская бібліятэка, якая налічвала больш 10 тысяч кніг. З іх каля 9 тысяч сабралі самі чытачы.

У горадзе налічвалася вялікая армія добраахвотных народных вартавых грамадскага парадку — каля 400 народных дружын, якія аб'ядноўваюць больш 39 тысяч чалавек. Першыя дружыны былі створаны ў 1959 годзе. З таго часу яны праводзяць вялікую работу па аказанню дапамогі органам аховы грамадскага парадку ў барацьбе супраць хуліганаў, дармаедаў, усіх парушальнікаў норм савецкага супольнага жыцця. Найважнейшы абавязак народных дружыннікаў — выхаванне савецкіх людзей, і асабліва моладзі, у духу маральнага кодэкса будаўніка камунізма. Кіраўніцтва народнымі дружынамі ажыццяўлялі гарадскі і раённыя штабы. Яны абагульнялі вопыт работы дружыннікаў, праводзілі сярод іх выхаваўчую работу. Для актыву дружыннікаў быў створаны вячэрні універсітэт прававых ве-

даў пры юрыдычным факультэце БДУ, рэгулярна праводзіліся семі-
нарскія заняткі.

Многія дружыны горада добрасумленна адносіліся да выканання
свайго грамадскага абавязку, у іх ліку дружыннікі абутковага вытвор-
чага аб'яднання «Луч», упраўлення Беларускай чыгункі, Мінскага
мотавелазавода, домакіраўніцтва № 13 і інш. Народная дружына пры
домакіраўніцтве № 13 у 1964 годзе налічвала 50 чалавек. Дружына
дапамагала арганізаваць вольны час дзяцей, ажыццяўляла пастаянны
кантроль за паводзінамі падлеткаў. Штаб дружыны меў юных памоч-
нікаў, якія вялі работу сярод школьнікаў. Дзякуючы дапамозе гра-
мадскасці, у тым ліку і дружыннікаў, на тэрыторыі домакіраўніцтва
ў 1964 годзе колькасць парушэнняў грамадскага парадку паменшыла-
ся амаль у тры разы.

У 1965 годзе ў горадзе працавала больш 230 грамадскіх саветаў
пры ўстановах культуры, аховы здароўя, на прадпрыемствах гандлю
і грамадскага харчавання, якія налічвалі каля 2 тысяч чалавек. Яны
вырашалі самыя разнастайныя пытанні. Напрыклад, грамадскія саве-
ты пры медыцынскіх установах удзельнічалі ў распрацоўцы і ажыц-
цяўленні мерапрыемстваў па паляпшэнню лячэбна-прафілактычнай
работы сярод насельніцтва, аздараўленню ўмоў працы і быту, прыма-
лі меры да зніжэння захворванняў.

У 1964 годзе ў горадзе было 36 народных універсітэтаў, два клубы,
тры кнігарні, 27 бібліятэк, якія працавалі на грамадскіх пачатках.
У канцы сямігодкі ў Мінску было 5,5 тысячы разнастайных самадзей-
ных арганізацый, у рабоце якіх прымалі ўдзел некалькі дзесяткаў ты-
сяч чалавек.

Работу шматлікіх грамадскіх самадзейных арганізацый накіроўва-
лі і кантралявалі партыйныя арганізацыі, выканаўчыя камітэты, па-
стаянныя камісіі гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных.

Узрасла роля прафесіянальных, камсамольскіх, спартыўных арга-
нізацый у гаспадарчым будаўніцтве, камуністычным выхаванні пра-
цоўных і асабліва моладзі. У прафесіянальных і камсамольскіх орга-
нах, у арганізацыях ДТСААФ таксама сталі ствараць шматлікія гра-
мадскія аддзелы, камісіі, бюро, штабы, пасты і г. д.

Роля прафсаюзаў, якія цесна звязаны з вытворчасцю, асабліва
ўзрасла ў распрацоўцы і рэалізацыі планаў развіцця прамысловасці
і культуры. Прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў, устаноў і бу-
доўляў Мінска актыўна садзейнічалі планавым дзяржаўным органам
у распрацоўцы праектаў планаў, уносілі прапановы і папраўкі, нака-
раваныя на лепшае выкарыстанне рэзерваў і наяўных магчымасцей.
Яны займаліся сістэматычным рэгуляваннем вытворчасці і заработ-
най платы рабочых і служачых. У цэнтры іх увагі стаялі пытанні,
якія былі звязаны з распрацоўкай умоў сацыялістычнага спаборніцтва

і кіравання ім. Для выканання задач, ускладзеных на прафсаюзы партыяй і дзяржавай, выкарыстоўваліся разнастайныя формы работы: агульныя сходы, вытворчыя нарады, камісіі, заводскія і міжзаводскія школы перадавога вопыту, дні наватара, вечары працоўнай славы, прыцягненне грамадскасці да работы дзяржаўнага і народнага кантролю і г. д.

Значнае месца ў кіраванні дзяржаўнымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі занялі пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады. Яны займаліся пытаннямі планавання, арганізацыі вытворчасці, працы, заработнай платы, тэхнічнага нармівання, заслухоўвалі паведамленні кіраўнікоў аб выніках іх дзейнасці і бягучай работы і г. д. У канцы сямігодкі ў рабоце вытворчых нарад Мінска прымалі ўдзел больш 60 тысяч чалавек.

Пасля снежаньскага (1957) Пленума ЦК КПСС, які ўказаў на неабходнасць сумеснага рашэння адміністрацыі і прафсаюзных камітэтаў пры размеркаванні жылой плошчы на прадпрыемствах і ва ўстановах, прафсаюзныя арганізацыі Мінска пачалі актыўна ўдзельнічаць у размеркаванні кватэр, якія будуюць па лініі мясцовых Саветаў. Для падрыхтоўкі пытанняў аб размеркаванні жыллёвага фонду пры выканкомах раённых і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных, а таксама ў мясцовых і фабрычна-заводскіх камітэтах прафсаюзаў былі створаны жыллёва-бытавыя камісіі. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый выконвалі і выконваюць у гэтых камісіях вялікую работу, папярэдне разглядаючы заявы аб вызначэнні чаргі і размеркаванні кватэр, паляпшэнні жыллёвых умоў работнікаў сваіх калектываў і г. д.

Дзейнасць прафсаюзаў садзейнічала паскарэнню тэмпаў развіцця прамысловасці, культуры і выхаванню людзей будучага камуністычнага грамадства. У прафесіянальных арганізацыях рабочыя і служачыя фабрык і заводаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый праходзяць ленінскую школу кіравання грамадска-палітычным і культурным будаўніцтвам, школу камунізма.

Баявымі памочнікамі партыі былі камсамольскія арганізацыі горада. Іх уплыў і аўтарытэт узрасталі з году ў год. Калі ў 1959 годзе ў складзе камсамольскай арганізацыі сталіцы было 78 422 члены ВЛКСМ, дык у 1965 годзе — 111 218 юнакоў і дзяўчат.

У гады сямігодкі камсамольскія арганізацыі Мінска актыўна ўдзельнічалі ў вырашэнні актуальных пытанняў гаспадарчага і культурнага жыцця. Праз камсамольска-маладзёжныя штабы на прадпрыемствах, ва ўстановах, пры домакіраўніцтвах і г. д., пасты камсамольскага «Пражэктара», рэйдавыя брыгады, разнастайныя камісіі камсамольскія арганізацыі аказвалі вялікі ўплыў на паспяховае выкананне дзяржаўных планаў, павышэнне ўзроўню выхаваўчай работы сярод моладзі. Сумесна з выканкомамі Саветаў і прафсаюзнымі

арганізацыямі яны ажыццяўлялі кіраўніцтва спаборніцтвам камсамольска-маладзёжных брыгад на прадпрыемствах, у будаўнічых арганізацыях, камунальнай гаспадарцы, гарадскім транспарце і сувязі.

Камсамольцы Мінска сталі ініцыятарамі руху за званне калектываў і ўдарнікаў камуністычнай працы ў рэспубліцы. Адной з першых у Беларусі ў барацьбу за камуністычныя адносіны да працы ўключылася камсамольска-маладзёжная брыгада будаўнікоў Мінска, узначальваемая А. Дзігілевічам.

Камсамольскія арганізацыі бралі шэфства над будоўлямі, з дапамогай адміністрацыі і партыйных органаў праводзілі разнастайныя грамадскія агляды і конкурсы, маладзёжныя навукова-тэхнічныя канферэнцыі. Яны прымалі самы актыўны ўдзел у забеспячэнні асноўных участкаў гаспадарчага будаўніцтва маладзёжнымі кадрамі з ліку лепшых членаў сваёй арганізацыі. Па камсамольскіх пуцёўках толькі ў 1965 годзе 2700 юнакоў і дзяўчат працавалі на цалінных землях. На будаўніцтва электрастанцый, буйных прадпрыемстваў і іншых найважнейшых будоўляў рэспублікі па камсамольскіх пуцёўках было накіравана каля трох тысяч камсамольцаў-мінчан.

Выхаванне ў моладзі пастаяннай гатоўнасці да працы на карысць грамадства і пераадоленне любых цяжкасцей займала значнае месца ў дзейнасці камсамольскіх арганізацый горада Мінска.

Кіруючыся пастановамі з'ездаў партыі, Праграмай КПСС, Мінскі гарадскі камітэт партыі ажыццяўляў непасрэднае кіраўніцтва дзейнасцю гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, прафсаюзнымі, камсамольскімі і іншымі грамадскімі аб'яднаннямі працоўных. Далейшае развіццё форм грамадска-палітычнага жыцця павышала актыўнасць працоўных мас у рашэнні актуальных задач камуністычнага будаўніцтва.

Грамадска-палітычная дзейнасць савецкіх людзей цесна звязана з іх вытворчай дзейнасцю. Яна робіць уплыў на развіццё сацыялістычнай дэмакратыі, эканомікі і культуры.

2. Народная асвета

Гады сямігодкі былі адзначаны новымі поспехамі і ў развіцці народнай асветы. Вялікую ролю ў гэтым адыграў прыняты Вярхоўным Саветам СССР у 1958 годзе Закон «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай асветы». «Галоўнай задачай савецкай школы,— адзначаецца ў Законе аб школе,— з'яўляецца падрыхтоўка навучэнцаў да жыцця, грамадска карыснай працы, далейшага павышэння ўзроўню агульнай і політэхнічнай адукацыі, падрыхтоўка адукаваных людзей, якія добра ведаюць асновы

навук, выхаванне моладзі ў духу высокай павагі да прынцыпаў сацыялістычнага грамадства, у духу ідэй камунізма.

Асновай навучання і выхавання ў сярэдняй школе павінна быць цесная сувязь навучання з працай, з практыкай камуністычнага будаўніцтва».

Ажыццяўленне Закону аб школе было накіравана на перабудову ўсёй сістэмы народнай асветы ў рэспубліцы такім чынам, каб агульнаадукацыйная спецыяльная сярэдняя і вышэйшая школы больш эфектыўна рыхтавалі маладое пакаленне да працоўнай стваральнай дзейнасці на карысць грамадства.

Выконваючы Закон аб школе, урад Беларусі кожны год павялічваў асігнаванні на развіццё агульнаадукацыйнай школы рэспублікі. Калі дзяржаўны бюджэт на народную асвету сталіцы (без вышэйшай і прафесіянальна-тэхнічнай школы) у 1959 годзе склаў больш 11,1 мільёна, дык у 1964 годзе ён ужо быў роўны 18,6 мільёна рублёў. Усяго за гады сямігодкі на народную асвету горада (на школы ўсеагульнага навучання, школы-інтэрнаты, дзіцячыя дамы, школы рабочай моладзі і дзіцячыя сады) было выдаткавана толькі дзяржаўных сродкаў больш 106,3 мільёна рублёў.

Вялікая работа праведзена па ўмацаванню вучэбна-матэрыяльнай базы агульнаадукацыйных школ. За 1959—1965 гады пабудавана 47 школьных памяшканняў з добра абсталяванымі вучэбнымі кабінетамі, лабараторыямі і майстэрнямі. Усяго ў 1964/65 навучальным годзе ў сталіцы працавала 111 агульнаадукацыйных (без школ рабочай моладзі і школ дарослых), у тым ліку 32 васьмігадовыя і 74 сярэднія школы. Колькасць навучэнцаў у іх з кожным годам узрастала. Так, калі ў 1959 годзе ў агульнаадукацыйных школах сталіцы навучалася 56,1 тысячы чалавек, дык ужо ў 1965 іх было каля 101 тысячы.

Па колькасці навучэнцаў у разліку на 10 тысяч насельніцтва Беларуская ССР пакінула далёка за сабой такія капіталістычныя краіны, як Англія, Францыя, Італія.

У выніку шырокага школьнага будаўніцтва ліквідавана трохзменнасць заняткаў, хаця да гэтай пары большасць школ працягвае працаваць на дзве змены.

Ужо ў 1962 годзе паспяхова завершаны пераход да ўсеагульнага васьмігадовага навучання. Гэта быў новы буйнейшы крок уперад у развіцці народнай асветы па ўсёй Беларусі і ў горадзе Мінску ў прыватнасці. Ажыццяўленне ўсеагульнага навучання ў аб'ёме васьмігадовай школы стварыла ўмовы для пераходу ў бліжэйшае дзесяцігоддзе да ўсеагульнай і сярэдняй адукацыі, намечанай Праграмай КПСС.

У 1959—1965 гадах далейшае развіццё набыў новы тып агульнаадукацыйных школ — школы-інтэрнаты. Першыя тры школы-інтэрнаты былі адкрыты ў Мінску ў 1957/58 навучальным годзе, а ўжо ў па-

чатку 1965 працавала 11 такіх школ, у тым ліку дзве сярэдн
і дзесяць васьмігадовых.

З кожным годам узрастала колькасць навучэнцаў у школах-інт
натах. Калі ў першыя гады работы ў іх навучалася толькі 711 дзяц
дык у 1964/65 навучальным годзе колькасць навучэнцаў узрасла
3800 чалавек, г. зн. больш чым у пяць разоў.

У пачатку сямігодкі ўзніклі і атрымалі далейшае распаўсюджанн
школы з прадоўжаным днём і групамі прадоўжанага дня, якія ўдал
спалучаюць грамадскае выхаванне дзяцей з выхаваннем у сям'і. Такі
школы і групы карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў насельніцтва
Аб гэтым сведчыць рост колькасці навучэнцаў у іх. Калі ў 1960/61 на
вучальным годзе ў гэтых школах знаходзілася каля трох тысяч нав
чэнцаў, дык у пачатку 1964/65 навучальнага года іх ужо было больш
шасці тысяч.

У гады сямігодкі значна пашырылася вячэрняя адукацыя. Коль
касць школ рабочай моладзі ўзрасла з 30 да 35. Колькасць навучэн
цаў у вячэрніх (зменных) школах павялічылася больш чым у два ра
зы: з 7,7 тысячы чалавек у 1958 да 16,6 тысячы ў 1965 годзе.

З 1962 года на базе асобных вячэрніх (зменных) школ у парадку
вопыту пачалося стварэнне трохгадовых школ майстроў, дзе кваліфі
каваныя рабочыя, майстры-практыкі павышаюць свой агульнаадука
цыйны ўзровень і дзелавую кваліфікацыю. Пасля заканчэння такой
школы навучэнцы атрымліваюць атэстат сталасці і званне майстра.

Школы і класы майстроў працуюць на аўтамабільным, трактар
ным, веласіпедным, падшыпнікавым заводах, на радыёзаводзе і за
водзе запасных частак і іншых прадпрыемствах сталіцы. У 1964/65
навучальным годзе ў школах і групах майстроў навучалася больш
тысячы чалавек.

У радзе школ рабочай моладзі былі створаны класы са скарочаным тэрмінам навучання, дзе навучэнцы за 2,5 года вучобы атрымліваюць адукацыю ў аб'ёме васьмігадовай школы.

За сямігоддзе школы рабочай моладзі скончыла больш 8,5 тысячы чалавек.

У сувязі з перабудовай агульнаадукацыйнай школы, ажыццяўленнем усеагульнай адукацыі ў аб'ёме васьмігадовай школы значна павялічылася колькасць настаўнікаў. За сямігоддзе ў школы горада прыйшло каля трох тысяч новых педагогаў. Усяго ў 1964/65 навучальным годзе ў мінскіх школах працавала каля 5 тысяч настаўнікаў, большая частка з іх мела вышэйшую і незакончаную вышэйшую педагагічную адукацыю (73%). Сярод іх больш 40 маюць званне заслужанага настаўніка школы БССР.

Закон «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай асветы ў БССР» патрабаваў павышэння ўзроў-

ню вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе, паслядоўнага ажыццяўлення прынцыпу злучэння навучання з вытворчай працай.

Базай для політэхнічнага навучання, працоўнага выхавання і вытворчай практыкі навучэнцаў сталі школьныя кабінеты і майстэрні, а таксама прамысловыя прадпрыемствы горада. На радзе заводаў і фабрык былі створаны спецыяльныя ўчасткі — майстэрні і вучнёўскія змены, аснашчаныя сучасным абсталяваннем. Да кіраўніцтва вытворчай практыкай вучняў старэйшых класаў былі прыцягнуты вопытныя інжынеры і майстры, наватары вытворчасці. У пачатку 1964/65 навучальнага года ў Мінску было 38 вучэбных участкаў і цэхаў, 12 вучэбна-вытворчых майстэрняў і г. д.

Добрыя ўмовы для вытворчай практыкі вучняў старэйшых класаў школ № 11 і 22 створаны на трактарным заводзе, для навучэнцаў сярэдняй школы № 17 — на мотавелазаводзе, а таксама на Мінскім аўтамабільным і заводзе аўтаматычных ліній, радыёзаводзе, станкабудаўнічым імя Кірава і заводзе Кастрычніцкай рэвалюцыі, на фабрыцы імя Тэльмана і г. д.

Паспяховай арганізацыі прафесіянальнай падрыхтоўкі навучэнцаў садзейнічала ўвядзенне ў школах курса асноў вытворчага навучання і вытворчай спецыялізацыі. Толькі за 1960—1964 гады больш пяці тысяч мінскіх школьнікаў разам з атэстатамі сталасці атрымалі пасведчанне аб набыцці той або іншай прафесіі.

У школах горада значна палепшылася пастаноўка вучэбна-выхаваўчай работы. Мінскія настаўнікі, змагаючыся за трывалыя веды, высокую паспяховасць навучэнцаў, за ліквідацыю другагодніцтва, значна перабудавалі вучэбны працэс. Больш увагі яны пачалі аддаваць самастойнай рабоце навучэнцаў, нагляднасці ў навучанні, увязцы вывучаемага матэрыялу з жыццём, з практыкай камуністычнага будаўніцтва. У вучэбна-выхаваўчай рабоце пачалі шырэй выкарыстоўваць вучэбнае кіно, грамзапісы, магнітафоны, шматлікае праекцыйнае абсталяванне (фільмаскопы, эпідыяскопы). У многіх школах сталіцы ёсць кінаўстаноўкі.

Узорнай для школ Мінска і рэспублікі з'яўляецца работа настаўніцкага калектыву сярэдняй школы № 50, дзе дырэктарам працуе заслужаны настаўнік школы БССР А. Е. Точын. У гэтай школе амаль няма другагоднікаў. Большасць навучэнцаў школы займаецца толькі на «4» і «5». Добрых вынікаў у навучанні і выхаванні дзяцей дасягнулі настаўнікі школы М. А. Канасевіч, Г. К. Мальцава, М. Ф. Сіманаў, М. М. Сяміжон і інш. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 верасня 1966 года за поспехі, дасягнутыя ў навучанні і камуністычным выхаванні навучэнцаў, развіцці ініцыятывы і творчасці дзяцей сярэдняя школа № 50 узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Перадавы вопыт работы педагогаў школы № 50 вывучаюць і ўка-
раняюць не толькі настаўнікі горада і рэспублікі, але і Бранскай
і Новасібірскай абласцей, Куйбышава, Рыгі, Тбілісі і іншых гарадоў
краіны. Трывалыя веды навучэнцам дае педагагічны калектыў
49-й сярэдняй школы. Асабліва добрых вынікаў у рабоце дабіваюц-
ца настаўнікі пачатковых класаў. У 1963/64 навучальным годзе
з 21 пачатковага класа 20 не мелі другагоднікаў, у 1964/65 навучаль-
ным годзе толькі пяць вучняў малодшых класаў засталіся на другі
год. Шмат год без другагоднікаў працуюць педагогі К. Т. Клопава,
В. П. Калека, В. М. Раготнер і інш.

Добрых вынікаў у навучанні і выхаванні навучэнцаў дабіваюцца
заслужаныя настаўнікі школы БССР Р. Г. Барысава — завуч сярэдняй
школы № 25, В. В. Ізмайлаў — настаўнік сярэдняй школы № 55,
Р. П. Казімірава — завуч школы № 33, І. І. Палій — настаўнік шко-
лы рабочай моладзі № 26 і многія іншыя.

За гады сямігодкі значна палепшылася эстэтычнае і фізічнае вы-
хаванне школьнікаў.

Актыўную выхаваўчую работу сярод вучняў вядуць настаўніцкія
партыйныя, школьныя камсамольскія і піянерскія арганізацыі, зма-
гаючыся за глыбокія і трывалыя веды, арганізацыю культурнага ад-
пачынку навучэнцаў. У школах Мінска шырока практыкуюцца та-
кія формы работы, як школьныя лекторыі, клубы цікавых сустрэч
і выхаднога дня.

Па ўсебаковаму развіццю навучэнцаў праводзяць значную работу
пазашкольныя ўстановы горада — дзіцячыя бібліятэкі, Мінскі Па-
лац піянераў і школьнікаў, Рэспубліканская станцыя юных тэхні-
каў, станцыя юных натуралістаў, Тэатр юнага гледача, дзіцячыя
кінатэатры, Дзяржаўны мастацкі музей БССР і інш. Для школьнікаў
у Мінску адкрыты дзіцячы планетарый.

Станоўчыя вынікі работы школ рэспублікі, у тым ліку і горада
Мінска, адзначыў X Пленум ЦК КПБ, які адбыўся ў канцы ліпеня
1964 года. Абмеркаваўшы пытанне «Аб ходзе выканання пастановы
чэрвеньскага (1963) Пленума ЦК КПСС», Пленум канстатаваў, што
ў школах рэспублікі значна палепшыліся змест і якасць вучэбна-вы-
хаваўчага працэсу, больш грунтоўнымі сталі веды навучэнцаў, праве-
дзена значная работа па ажыццяўленню закону аб умацаванні сувязі
школы з жыццём, з практыкай камуністычнага будаўніцтва.

Станоўчая ацэнка работы школ рэспублікі даецца і ў справаздачы
ЦК КПБ XXVI з'езду Камуністычнай партыі Беларусі. Разам з тым
у рэзалюцыі з'езду адзначалася, што ў сярэдняй школе ўсё яшчэ не
пераадолены разрыў паміж навучаннем і выхаваннем.

Разам са значнымі поспехамі ў развіцці агульнаадукацыйнай
школы ў Савецкім Саюзе і рэспублікі ў кіраўніцтве народнай асве-

тай, у арганізацыі працоўнага выхавання былі дапушчаны сур'ёзныя памылкі. Неапраўданым было падоўжанне тэрміну навучання ў сярэдняй школе на адзін год.

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР, крытычна ацаніўшы пяцігадовы вопыт работы школ у 1959—1964 гадах, прынялі пастанову аб рэарганізацыі з 1 верасня 1964 года адзінаццацігадовых школ у дзесяцігадовыя агульнаадукацыйныя працоўныя політэхнічныя школы.

З году ў год у сталіцы расце колькасць дашкольных дзіцячых устаноў, з 1958 па 1965 год яна павялічылася больш чым у тры разы. У студзені 1965 года ў Мінску працавала 233 ясляў, дзіцячых садоў і садоў-ясляў, дзе выхоўвалася больш 35,5 тысячы дзяцей.

Па шляху далейшага пашырэння і ўдасканалення ішло развіццё вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі беларускай сталіцы. У Мінску зараз працуе 13 вышэйшых навучальных устаноў і 23 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Мінска паспяхова ажыццяўлялі галоўную задачу — падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі краіны. На падставе закону «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём» у Мінску, як і па ўсёй краіне, пачынаючы з 1959/60 навучальнага года праведзена вялікая работа па расшырэнню падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў, перабудове вучэбна-выхаваўчага працэсу ў вышэйшых навучальных установах, тэхнікумах і вучылішчах.

У краіне было рэарганізавана ўпраўленне вышэйшымі і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі. У Беларусі ў сувязі з гэтым у 1959 годзе было створана Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР. У 1966 годзе гэта Міністэрства было пераўтворана ў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, а для кіраўніцтва прафесіянальна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі створана самастойнае ўпраўленне пры Савеце Міністраў БССР.

У апошнія гады ў сталіцы значна пашырылася і ўмацавалася вучэбна-матэрыяльная база вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Пабудаваны новыя карпусы Беларускага політэхнічнага і педагагічнага інстытутаў, інстытута замежных моў. У 1961 годзе ўступіў у строй новы корпус Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У нанава пабудаваных вучэбных карпусах — светлыя прасторныя вучэбныя кабінеты і лабараторыі, аснашчаныя найноўшым сучасным абсталяваннем і прыборамі. Толькі Беларускі політэхнічны інстытут зараз налічвае 7 вучэбных карпусоў, у якіх размешчана 88 лабараторый, дзесяткі вучэбных кабінетаў, бібліятэка з паўмільённым кніжным фондам.

Пабудаваны новыя вучэбныя карпусы, студэнцкія інтэрнаты для рада сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

У сувязі з запатрабаваннямі і хуткім ростам народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі, а таксама патрэбы ў спецыялістах новых прафесій былі ўнесены некаторыя змены ў структуру вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў горада. Так, у Беларускім політэхнічным інстытуце былі адкрыты новыя радыётэхнічны і інжынерна-педагагічны факультэты, створана кафедра педагогікі. У 1964/65 навучальным годзе на базе радыётэхнічнага факультэта створаны самастойны радыётэхнічны інстытут, які рыхтуе спецыялістаў па радыётэхніцы і тэлемеханіцы, матэматычных машынах і вылічальна-рашаючых прыборах і канструкцыях. У Беларускім універсітэце імя У. І. Леніна працуюць новыя кафедры радыёфізікі, электронных вылічальных машын і іншыя, на якіх рыхтуюць спецыялістаў па вылічальнай матэматыцы, радыёэлектроніцы, радыёфізіцы і іншых відах спецыяльнасцей.

Беларускі лесатэхнічны інстытут рэарганізаваны ў тэхналагічны інстытут. З 1961/62 навучальнага года там пачалі рыхтаваць спецыялістаў для прадпрыемстваў папяровай прамысловасці, тэхналогіі вытворчасці пластычных мас. Статыстыкаў і эканамістаў па працы пачаў рыхтаваць Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава. Навуковых работнікаў і спецыялістаў, а таксама кадры выкладчыкаў для школ, вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў рыхтуюць БДУ імя У. І. Леніна, педагагічныя інстытуты імя А. М. Горкага і замежных моў. Кузняй інжынерных кадраў разнастайных спецыяльнасцей стаў Беларускі політэхнічны інстытут, які мае свае філіялы ў Заводскім раёне Мінска і ў Віцебску, у 1966 годзе пачаў працаваць філіял інстытута пры Беларускім аўтамабільным заводзе ў г. Жодзіна.

У гады сямігодкі значна пашырылася падрыхтоўка спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі. У 1960 годзе быў створаны радыётэхнічны тэхнікум, які налічвае зараз больш дзвюх тысяч студэнтаў; вячэрні машынабудаўнічы тэхнікум быў рэарганізаваны ў дзённы з вячэрнім аддзяленнем, а індустрыяльны ў індустрыяльна-педагагічны, дзе вядзецца падрыхтоўка настаўнікаў працы для 5—8 класаў школы і г. д. Былі дадаткова адкрыты філіялы мінскіх тэхнікумаў у Лідзе, Жодзіна, Крычаве.

У 1959—1965 гадах значна павялічылася колькасць студэнтаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах сталіцы. Калі ў 1958/59 навучальным годзе ў вышэйшых навучальных установах Мінска навучалася 32 тысячы студэнтаў і 17 тысяч чалавек у тэхнікумах і іншых сярэдніх спецыяльных навучальных установах, дык у канцы 1965 года колькасць студэнтаў у інстытутах

узрасла да 59,7 тысячы, у сярэдніх навучальных установах дасягнула амаль 30 тысяч.

У гады сямігодкі ў вышэйшых навучальных установах, тэхнікумах і вучылішчах Мінска хутка расла колькасць студэнтаў, якія навучаліся без адрыву ад вытворчасці. На завочных і вячэрніх аддзяленнях вышэйшых навучальных устаноў у 1964/65 навучальным годзе навучалася 29 тысяч чалавек, і гэта склала больш 52 працэнтаў агульнай колькасці студэнтаў.

Падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі без адрыву ад вытворчасці садзейнічала прадастаўленне вялікіх ільгот для асоб, якія займаюцца на вячэрніх і завочных аддзяленнях, у выглядзе скарочанага рабочага дня або рабочага тыдня, а таксама дадатковых аплачваемых водпускаў.

Каб палепшыць кіраўніцтва завочным і вячэрнім навучаннем, павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, створана адзіная, факультатыўная сістэма, якая аб'ядноўвае дзённыя, вячэрнія і завочныя аддзяленні. Для аказання дапамогі ў вучобе студэнтам-завочнікам, якія жывуць за межамі Мінска, у радзе гарадоў рэспублікі (Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна і інш.) адкрыты міжвузаўскія кансультатыўныя пункты.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы сталіцы забяспечаны высококваліфікаванымі педагагічнымі кадрамі. Так, у канцы 1964 года ў вышэйшых навучальных установах працавала 3245 выкладчыкаў, сярод якіх 81 доктар навук і прафесар, 1008 кандыдатаў навук.

Галоўным у рабоце вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у гады сямігодкі была, як і раней, барацьба за паляпшэнне тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, за іх камуністычнае выхаванне.

У ходзе перабудовы вучэбна-выхаваўчай работы былі перагледжаны і зменены вучэбныя планы і праграмы, уведзены новыя курсы, павялічана колькасць гадзін на лабараторныя работы і практыкумы, палепшылася арганізацыя вытворчай практыкі. У апошнія гады ў вучэбнай рабоце пачалі шырэй выкарыстоўвацца машыны-экзаменатары і іншыя тэхнічныя сродкі навучання.

У фарміраванні навуковага светапогляду, у ідэйнай падрыхтоўцы маладых спецыялістаў вялікая роля належыць грамадскім навукам. У вышэйшых навучальных установах уведзен курс асноў навукова-га камунізма, у тэхнікумах і вучылішчах — курс грамадазнаўства. Зараз студэнты ВНУ вывучаюць чатыры самастойных курсы грамадскіх навук: гісторыю КПСС, марксісцка-ленінскую філасофію, палітычную эканомію, асновы навуковага камунізма.

Чэрвеньскі (1963) Пленум ЦК КПСС, які абмеркаваў пытанні ідэалагічнай работы, асабліва падкрэсліў выхаваўчую ролю працы ў ву-

чобе студэнтаў, якая становіцца арганічнай часткаі вучэбнага працэсу. Студэнты тэхнічных вузаў у перыяд вытворчай практыкі звычайна працуюць на буйнейшых і добра аснашчаных прадпрыемствах Мінска і многіх гарадоў рэспублікі і краіны. Яны знаёмяцца там з новай тэхнікай, авалодваюць рабочымі прафесіямі.

Студэнты вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў актыўна ўдзельнічаюць у розных гуртках, у навуковых студэнцкіх таварыствах, вядуць навукова-даследчую работу. У тэхнічных вышэйшых навучальных установах створаны грамадскія канструктарскія бюро, у работу якіх шырока ўцягваюцца лепшыя студэнты. Так, канструктарскае бюро, якое цалкам складаецца са студэнтаў Беларускага політэхнічнага інстытута, з 1960 года працуе на заводзе аўтаматычных ліній. Значная частка ўнесеных студэнтамі рацыяналізатарскіх прапаноў укаранёна ў вытворчасць. У 1964/65 навучальным годзе 2038 студэнтаў інстытута вялі навукова-даследчую работу.

Яркім прыкладам непасрэднага працоўнага ўдзелу беларускіх студэнтаў у камуністычным будаўніцтве з'яўляецца іх работа ў сельскім будаўніцтве на цаліне ў час летніх канікул. У 1963 годзе ў саўгасах Уральскай вобласці Казахстана працавала амаль 2700 беларускіх студэнтаў, у 1964 годзе — ужо сем тысяч чалавек. Вялікую частку іх складалі студэнты мінскіх вышэйшых навучальных устаноў. За два гады беларускія студэнты пабудавалі больш 400 жылых дамоў, 11 школ і школ-інтэрнатаў, 324 культурна-бытавыя і вытворчыя аб'екты. Некаторыя атрады мінскіх студэнтаў працавалі ўлетку на вінаградных плантацыях Крыма.

За гады сямігодкі народная асвета атрымала далейшае развіццё. Толькі вышэйшыя навучальныя ўстановы і сярэднія спецыяльныя школы Мінска за 1959—1964 гады падрыхтавалі 60 тысяч спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі. Больш пяці тысяч навучэнцаў у 1960—1964 гады скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную школу.

Такім чынам, за гады сямігодкі ў народную гаспадарку, культуру і навуку рэспублікі ўлілася новая шматтысячная армія адукаваных людзей, высокакваліфікаваных спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.

3. Навука

За гады сямігодкі прыкметна ўзрасла роля Мінска як навуковага цэнтра рэспублікі.

Кампартыя Беларусі, гарадская партыйная арганізацыя ўсямерна садзейнічалі далейшаму разгортванню навуковых даследаванняў,

укараненню ў практыку навейшых дасягненняў навукі. З году ў год павялічваліся асігнаванні на будаўніцтва новых і расшырэнне існуючых навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, набыццё сучаснага абсталявання, апаратуры і г. д.

Вялікая работа праводзілася ў Мінску па падрыхтоўцы навуковых кадраў. У аспірантуры Акадэміі навук БССР, 12 навукова-даследчых інстытутах міністэрстваў і ведамстваў і 12 вышэйшых навучальных установах у 1965 годзе навучалася 2000 аспірантаў — амаль у тры разы больш, чым у 1958 годзе. Падрыхтоўка навуковых кадраў вялася па 15 галінах навукі і больш чым па 50 спецыяльнасцях. Значную дапамогу аказвалі навуковым установам і вышэйшым навучальным установам сталіцы вучоныя братніх рэспублік РСФСР і УССР. У гэты ж час у Мінску праходзілі навучанне ў аспірантуры нямала пасланцаў з акадэмій і вышэйшых навучальных устаноў іншых саюзных рэспублік.

Колькасць навуковых супрацоўнікаў сталіцы ўзрасла ў параўнанні з 1958 годам больш чым у тры разы. У навукова-даследчых інстытутах і ўстановах і вышэйшых навучальных установах у канцы сямігодкі было 9530 навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку 173 дактары і 2085 кандыдатаў навук. З агульнай колькасці навуковых супрацоўнікаў 3774 былі жанчыны.

У Мінску працуюць 60 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук БССР. У 1959—1965 гады акадэмікамі былі абраны вядомыя вучоныя Г. В. Багамолаў, І. А. Булыгін, Ф. П. Вінакураў, А. К. Красін і іншыя — усяго 12 чалавек, членамі-карэспандэнтамі — 15 чалавек, сярод іх І. І. Бардышаў, А. С. Вечар, Н. В. Каменская, І. С. Краўчанка, А. С. Махнач, І. М. Сяржанін і інш.

Цэнтрам навуковай думкі сталіцы і рэспублікі з'яўляецца Акадэмія навук БССР. У 1965 годзе ў акадэміі працавала 1894 навуковыя супрацоўнікі, у тым ліку 59 дактароў і 472 кандыдаты навук.

У гады сямігодкі ў сувязі з узросшымі патрабаваннямі, якія прад'явіла навуцы бурна развіваючаяся народная гаспадарка, неабходны былі і новыя арганізацыйныя формы ў яе кіраўніцтве. У інстытутах, аддзелах і лабараторыях Акадэміі навук былі ўдакладнены іх профіль і структура з мэтай спецыялізацыі ўстаноў і канцэнтрацыі сіл і сродкаў на асноўных навуковых напрамках.

У гады сямігодкі ў адрозненне ад мінулых год надавалі шмат увагі праблемам фізіка-тэхнічных, фізіка-матэматычных і хімічных навук. Рад інстытутаў Акадэміі навук — Інстытут цепла- і масаабмену, фізікі і іншыя па тэматыцы даследаванняў і яе важнасці занялі вядучае месца ў Саюзе.

Калектывам вучоных Інстытута цепла- і масаабмену пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР А. В. Лыкава праведзены фундаменталь-

ныя даследаванні па праблемах тэрмадынамікі нестацыянарнага высокаінтэнсіўнага цепла- і масапераносу з улікам хуткасці перано-су цяпла і масы. На Міжнародным сімпозіуме па тэрмадынаміцы ў г. Трыры (ФРГ) вынікі гэтых даследаванняў былі адзначаны як леп-шыя даследаванні апошніх год. Новы метад тэорыі электрамагнітна-га сушэння драўніны і лакафарбавых пакрыццяў іншых матэрыялаў укаранёны на 300 прадпрыемствах Савецкага Саюза. Ён дае магчы-масць скараціць сушэнне матэрыялаў у тры-дзесяць разоў з гадавой эканоміяй сродкаў у 54 мільёны рублёў. Калектыў гэтага ж інстыту-та распрацаваў пнеўмагазавы метад сушэння калійных солей, які зараз ужываецца на Салігорскім калійным камбінаце. Вучонымі інстытута створаны зернесушылкі з высокай прадукцыйнасцю — 50 тон зерня ў гадзіну. Зернесушылка экспанавалася на міжнароднай выстаўцы ў Дэлі, а таксама на ВДНГ, дзе яна была адзначана зала-тым медалем.

Даследаванні актуальных народнагаспадарчых праблем праведзе-ны ў інстытутах фізікі і матэматыкі Акадэміі. Калектыў вучоных-фізікаў пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР Б. І. Сцяпанава зрабіў прыкметны ўклад у новую галіну навукі — квантавую электроніку, распрацаваўшы тэорыю аптычных квантавых генератараў і прапана-ваўшы метад іх інжынернага разліку.

Фізікамі Белдзяржуніверсітэта распрацаваны арыгінальны спек-тральна-люмінесцэнтны метад, які можа быць выкарыстаны пры аналізе прэпаратаў рэдказямельных элементаў.

Вучоныя Мінска шмат увагі аддалі аўтаматызацыі працаёмкіх працэсаў у прамысловасці. Аўтаматызацыя праектавання ў машына-будаванні з дапамогай электронна-вылічальных машын з'яўляецца асноўным напрамкам навуковай работы створанага ў 1965 годзе Інстытута тэхнічнай кібернетыкі. Гэты інстытут з'яўляецца міжгалі-новай галаўной арганізацыяй СССР па ўкараненню матэматычных метадаў і вылічальнай тэхнікі для аўтаматызацыі працэсаў інжынер-най падрыхтоўкі вытворчасці ў машынабудаванні. Яго навуковыя даследаванні цесна звязаны з вытворчасцю. Распрацоўкі інстытута па аўтаматызацыі тэхнічнага нармівання станочных работ з дапа-могай электронна-вылічальных машын паспяхова ўкараняюцца на Мінскім трактарным, станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, а таксама за межамі рэспублікі — на Чалябінскім трак-тарным заводзе і Уралмашзаводзе.

Вялікі ўклад у развіццё прамысловасці ўносіць адзін са старэй-шых інстытутаў Акадэміі — Фізіка-тэхнічны. У яго лабараторыях распрацавана шмат важных для народнай гаспадаркі праблем. Так, Мінскі завод запасных частак асвоіў і ўкараніў у вытворчасць рас-працаваны інстытутам метад павышэння трываласці ковачных штам-

паў метадам паўторнай загартоўкі з прымяненнем індукцыйнага нагрэву. Вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне мелі даследаванні вучонымі інстытута працэсаў крышталізацыі і рэкрышталізацыі металаў і сплаваў у залежнасці ад розных фактараў.

Важныя даследаванні ў гады сямігодкі праведзены вучонымі-хімікамі. Развіццю хімічнай навукі ў рэспубліцы садзейнічала створаная матэрыяльна-тэхнічная і сыравінная база — Салігорскі калійны камбінат, Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод і інш.

У Інстытуце агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР распрацаваны новыя метады абагачэння калійных солей у цяжкіх суспензіях і электрастатычны. Доктарам хімічных навук І. М. Ярмоленкам завершаны цыкл работ па акісляльных пераўтварэннях цэлюлозы. Пад яго кіраўніцтвам у лабараторыі інстытута распрацаваны метад атрымання высокатэмпературных валакністых матэрыялаў, якія вытрымліваюць тэмпературу белага гартавання і маюць вялікае значэнне для новай сучаснай тэхнікі. У інстытуце таксама атрымалі важныя рэзультаты па сінтэзу і даследаванню новых відаў адсарбентаў, па сінтэзу нізкатэмпературных эмаляў і бязборнага высакаякаснага шкла для шкловалакна.

У Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН БССР атрымалі новыя даныя аб механізме рэакцый у цвёрдых фазах, стварылі прэпарат, які паляпшае вытворчасць цэлафанавай плёнкі, распрацавалі тэхналогію атрымання якаснай каніфолі, прынятай у вытворчасць кабельнай прамысловасцю.

Важнай падзеяй у навуковых даследаваннях з'явілася атрыманне атамнай энергіі. У 1962 годзе быў уведзены ў строй першы беларускі атамны рэактар. У 1965 годзе быў праведзены пуск другога атамнага рэактара, пабудаванага пры Інстытуце цепла- і масаабмену. У 1965 годзе на базе гэтых рэактараў створаны Інстытут ядзернай энергетыкі Акадэміі навук БССР, дзе навуковыя даследаванні праводзяцца пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР А. К. Красіна. Пасля стварэння інстытута адкрыліся вялікія магчымасці для шырокага кола даследаванняў па фізіцы, хіміі, біялогіі.

У Лабараторыі геахімічных праблем пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР К. І. Лукашова праведзены важныя даследаванні. У выніку геахімічнага вывучэння покрыўных парод і ландшафтаў Беларускага Палесся выяўлены асноўныя заканамернасці і спецыфічныя асаблівасці распаўсюджання і паводзін элементаў у горных пародах, водах, раслінnасці, у працэсах выветрывання і інш.

Вучоныя абагульнілі матэрыялы па вывучэнню нафтагазаноснасці Прыпяцкага прагібу, далі рэкамендацыі па ўзмацненню комплексных даследаванняў у заходняй частцы Прыпяцкага прагібу і вывучэнню рэльефу падсолевых адкладанняў. Звярнулі ўвагу на развіццё пошу-

кавых работ у межах Брэсцкага, Аршанскага, Полацка-Віцебскага прагібаў, якія маюць геалагічныя і геахімічныя прадпасылкі выяўлення нафты і газу.

На новую ступень у сваім развіцці выйшла біялагічная навука, і гэтаму шмат у чым садзейнічала пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 9 студзеня 1963 года «Аб мерах па далейшаму развіццю біялагічнай навукі і ўмацаванню яе сувязі з практыкай». Гэта пастанова прадугледжвала расшырэнне навуковых даследаванняў па найбольш важных раздзелах біялогіі, якія непасрэдна звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю, і забеспячэнне ўкаранення атрыманых вынікаў у практыку.

У выніку шматгадовых даследаванняў па праблеме «Лясы БССР» вучоныя Інстытута эксперыментальнай батанікі і мікрабіялогіі завяршылі работу па геаграфіі, тыпалогіі і раяніраванню лясной расліннасці. Яны прааналізавалі лесараслінныя ўмовы БССР, абагульнілі звесткі па лясному фонду рэспублікі і саставу драўняных і хмызняковых відаў, выказалі каштоўныя меркаванні па павышэнню прадукцыйнасці лясоў БССР, вызначылі асноўныя задачы і перспектывы развіцця лясной гаспадаркі БССР на 20—25 год.

Вучоныя Аддзела фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін паспяхова працавалі над праблемамі біялагічных асноў рацыянальнага выкарыстання, пераўтварэння і аховы расліннага свету і паталагічнай фізіялогіі раслін. Акадэмікам АН БССР В. Ф. Купрэвічам і Т. А. Шчарбаковай упершыню ў Савецкім Саюзе ўстаноўлены колькасны састаў і дынаміка свабодных амінакіслот у выглядзе мінеральных і тарфяна-балотных глеб рэспублікі.

Праведзены вялікія даследаванні іхтыяфауны рэспублікі. У выніку шматгадовай працы доктарам біялагічных навук П. І. Жукавым апублікавана манаграфія «Рыбы БССР». У ёй апісана больш 50 відаў рыб, уключаны кароткія звесткі аб вадаёмах, гісторыі іхтыялагічных і рыбагаспадарчых даследаванняў.

Біялагічная навука дасягнула пэўных поспехаў і ў вывучэнні фотасінтэзу, фізіялогіі харчавання і развіцця раслін, пазнанні фізіка-хімічных і структурных асноў жыццёвых з'яў і інш. Шырокае выкарыстанне на практыцы атрымалі праведзеныя акадэмікам АН БССР Ц. М. Годневым і яго вучнямі даследаванні аб стварэнні пігменту хларафілу, які забяспечвае сінтэз разнастайных рэчываў, што ўжываюцца для харчавання чалавека і жывёлы.

У гады сямігодкі значна пашырылася сувязь інстытутаў Акадэміі навук БССР з прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Вучоныя выканалі рад даследаванняў, вынікі якіх укаранёны ў прамысловасць і сельскую гаспадарку рэспублікі і краіны.

Вялікую навукова-даследчую работу праводзяць вучоныя вышэйшых навучальных устаноў сталіцы. Важнай падзеяй у жыцці вышэйшай школы з'явілася пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 20 лютага 1964 года «Аб далейшым развіцці навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах». Яна намеціла канкрэтную сістэму мер па забеспячэнню далейшага развіцця навукова-даследчай работы, умацаванню сувязі вышэйшай школы з вытворчасцю, з галіновымі навукова-даследчымі інстытутамі і іншымі навуковымі ўстановамі. Характэрнай рысай у даследаваннях вучоных вышэйшых навучальных устаноў з'яўляецца набліжэнне тэматыкі непасрэдна да вытворчасці. У планах навуковых даследаванняў Беларускага політэхнічнага інстытута, напрыклад, тэматыка, абумоўленая гаспадарчымі дагаворамі, у 1959 годзе займала 40 працэнтаў. Яе выкананне з'яўляецца адной з найважнейшых форм тэхнічнай дапамогі прадпрыемствам прамысловасці і будаўніцтва. Навуковыя супрацоўнікі кафедры тэхналогіі металаў стварылі лабараторыю на машынабудаўнічым заводзе «Ударнік». Зараз яна рэарганізавана ў цэнтральную базавую лабараторыю парашковай металургіі. Інстытут падтрымліваў сувязь з 250 прамысловымі прадпрыемствамі, будоўлямі і арганізацыямі Беларусі і рада саюзных рэспублік. Многія вядучыя вучоныя інстытута (Г. М. Якаўлеў, А. П. Воінаў, А. У. Роман і іншыя) прымалі ўдзел у рабоце тэхніка-эканамічных і тэхнічных саветаў прамысловых прадпрыемстваў і праектных інстытутаў. Са снежня 1959 года па прапанове вучоных П. І. Яшчарыцына, В. П. Севярдзенка, Л. С. Ляховіча, М. А. Бараноўскага і іншых кіраўніцтва базавымі лабараторыямі прадпрыемстваў пачалі ажыццяўляць на грамадскіх пачатках. Іх пачынанне пазней падтрымалі многія вучоныя рэспублікі. Выкладчыкі матэматычнага і фізічнага факультэтаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ў супрацоўніцтве з інжынерна-тэхнічнымі работнікамі Мінскага трактарнага завода паспяхова распрацоўвалі пытанні паляпшэння апрацоўкі стальнога ліцця. У выніку ўкаранення прапанаваных рэкамендацый фактычны расход рэжучага інструменту пры апрацоўцы адлівак быў паніжаны ў два-тры разы пры адначасовым павышэнні якасці апрацоўваемага прадмета.

У створаным у гады сямігодкі вылічальным цэнтры БДУ праводзіліся распрацоўкі матэматычных метадаў для вырашэння народнагаспадарчых задач.

Важную па сваёй значнасці навукова-даследчую работу праводзяць ведамасныя вышэйшыя навучальныя ўстановы і даследчыя інстытуты.

Вучоныя-медыкі свае намаганні накіроўвалі на ўкараненне навейшых дасягненняў медыцыны ў практыку лячэння. У Мінску навуко-

ва-даследчая работа ў галіне медыцыны праводзілася ў медыцынскім інстытуце і дзевяці навукова-даследчых інстытутах. У адным толькі медінстытуце працавала 318 навуковых супрацоўнікаў, сярод іх 23 дактары і 163 кандыдаты навук. У інстытуце распрацоўваліся праблемы рэўматызму, фізіялогіі і паталогіі сардэчна-сасудзістай сістэмы, гіпертанічнай хваробы, атэрасклерозу і інш. Навукова-даследчыя інстытуты Міністэрства аховы здароўя БССР распрацоўвалі праблемы мікрабіялогіі і гігіены, рацыянальныя схемы лячэння туберкулёзу лёгкіх і інш.

У 1960 годзе ў Мінску быў адкрыты Навукова-даследчы інстытут анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, дзе ўпершыню ў рэспубліцы пачалі праводзіцца даследаванні па раку малочнай залозы, а таксама ранняй дыягностыцы злаякасных пухлін.

Інстытут неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі з 1962 года распрацоўвае праблему рассеянага склерозу і іншых захворванняў нервовай сістэмы.

Вучоныя ўнеслі вядомы ўклад у развіццё сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Яны праводзілі даследаванні па праблемах эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, земляробства і раслінаводства, меліярацыі і воднай гаспадаркі, механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і г. д. Узмацніліся сувязі з вытворчасцю Навукова-даследчага інстытута пладаводства, агародніцтва і бульбы, які ўзначальвае акадэмік АН БССР М. А. Дарожкін. У гэтым інстытуце плённа працуе член-карэспандэнт Усесаюзнай Акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна доктар сельскагаспадарчых навук Герой Сацыялістычнай Працы П. І. Альсмік. Сартамі бульбы «Зазерскі», «Агранамічны» і «Скараспелка-1», якія вывелі Альсмік і яго вучні, кожны год у рэспубліцы засяваюць дзесяткі тысяч гектараў. Групай вучоных Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР М. В. Турбіна выведзены і ўжо раяніраваны ў дзвюх абласцях рэспублікі новы высокаўраджайны сорт кукурузы «Мінскі-1». У дзяржаўнае сортавыпрабаванне перададзены яшчэ два створаныя гібрыды кукурузы.

Важныя па народнагаспадарчаму значэнню работы праводзілі галіновыя навукова-даследчыя інстытуты. Каштоўныя рэкамендацыі па ўкараненню новых метадаў і канструкцый у вытворчасць прапанавалі навуковыя супрацоўнікі Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР. Імі распрацаваны і ўкаранёны праект жалезабетонных скляпенняў. У 1962 годзе ў Мінску было пабудавана 10,6 кіламетра цеплатрас з ужываннем гэтых скляпенняў, дзякуючы чаму сэканомілі 254 тысячы рублёў, 296 тон арматурнай сталі і 5400 кубаметраў бетону. Гэтыя канструкцыі ўкараняюць таксама пры будаўніцтве цеплатрас у Маскве, Кіеве, Рызе, Туле і іншых гарадах краіны.

Пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН БССР І. М. Ахвердава ў інстытуце распрацавана тэхналогія вырабу жалезабетонных напорных труб.

Беларускі навукова-даследчы інстытут лёгкай прамысловасці прапанаваў новую тэхналогію атрымання танных дабрыякасных тканін для касцюмаў, паліто, трыкатажных вырабаў. Яна ўкаранёна зараз на мінскіх камвольным і тонкасуконным камбінатах.

Значных поспехаў дасягнулі гістарычная, філасофская, эканамічная і іншыя грамадскія навукі. Спрыяльныя ўмовы для іх творчага развіцця былі створаны пасля XX з'езду КПСС. Вучоныя пачалі больш смела ставіць і вырашаць актуальныя пытанні камуністычнага будаўніцтва. Праводзілася работа па пераадоленню памылак, якія мелі месца ў перыяд культу асобы ў асвятленні гістарычных падзей мінулага, асабліва ў работах па гісторыі грамадскай думкі, рэвалюцыйнага руху і сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Актывізавалася дзейнасць інстытутаў аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, якія выканалі нямала важных даследаванняў, стварылі каштоўныя навуковыя працы.

Так, навуковымі супрацоўнікамі Інстытута эканомікі АН БССР праведзены даследаванні па гаспадарчаму разліку, размяшчэнню і спецыялізацыі вытворчасці, цэнаўтварэнню, жыццёваму ўзроўню жыцця працоўных рэспублікі, гісторыі яго народнай гаспадаркі і іншых пытаннях. Сярод апублікаваных інстытутам работ — кніга Ф. С. Марцінкевіча «Размяшчэнне і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларускай ССР» (1961), калектыўныя манаграфіі: «Цэнаўтварэнне на прадметы ўжытку», «Фінансы прамысловых прадпрыемстваў і гаспадарчы разлік», «Эканоміка Беларусі ў эпоху імперыялізму» і інш.

Калектыў супрацоўнікаў кафедры эканомікі прамысловасці Інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава выканаў важную тэму — «Хімізацыя прамысловай вытворчасці БССР». Імі даследаваны стан і перспектывы хімічнай прамысловасці рэспублікі, напрамкі хімізацыі ў найважнейшых яе галінах, методыка вызначэння эфектыўнасці выдаткаў, прызначаных для хімічнай прамысловасці.

Гісторыкі сталіцы працавалі над стварэннем фундаментальнай працы — пяцітомнай «Гісторыі БССР» ад старажытных часоў да нашых дзён. У гады сямігодкі выйшлі ў свет калектыўныя працы «Гісторыя БССР» у двух тамах (2-е выданне, 1961), апублікавана «Гісторыя Полацка». Выйшлі ў свет «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі». Выдадзены рад манаграфій, зборнікаў дакументаў і матэрыялаў.

Вялікі ўклад у развіццё славянскага мовазнаўства ўнёс Інстытут мовазнаўства АН БССР імя Я. Коласа, які выдаў двухтомны дыялек-

талагічны атлас беларускай мовы. Апублікавана нарматыўная акадэмічная «Граматыка беларускай мовы», завершаны даследаванні па тэме «Фанетычная сістэма беларускіх народных гаворак», выдадзена манаграфія М. В. Бірылы «Беларуская антрапанімія».

Па праблеме «Заканамернасці развіцця беларускай савецкай літаратуры на шляхах сацыялістычнага рэалізму» Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы завершана праца над важнай калектыўнай тэмай «Беларуская савецкая проза на сучасным этапе». У працы праследжваюцца заканамернасці развіцця асноўных празаічных жанраў, раскрываюцца тыя новыя якасці, якія яскрава выявіліся ў сучаснай беларускай прозе. Пасля выхаду ў свет другога тома «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1941—1964 гады) цалкам завершана выданне навуковага курса гісторыі беларускай савецкай літаратуры. У выданнях абагульняецца амаль паўвекавы вопыт беларускай літаратуры — ад Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі да нашых дзён. Завершана вялікая работа над капітальнай навуковай працай «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры».

Значную навуковую каштоўнасць прадстаўляюць працы Інстытута філасофіі і права АН БССР — «З гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі», «Сацыяльная структура савецкага грамадства» і інш.

З году ў год пашыраюцца навуковыя сувязі вучоных Мінска з дзеячамі навукі замежных краін, перш за ўсё краін сацыялістычнага лагера.

4. Літаратура, мастацтва. Народная творчасць

У рашэнні велічных задач камуністычнага будаўніцтва, пастаўленых перад савецкім народам Праграмай КПСС і сямігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі, вялікая роля адводзілася літаратуры і мастацтву. «Галоўная лінія ў развіцці літаратуры і мастацтва,— гаворыцца ў Праграме партыі,— умацаванне сувязі з жыццём народа, праўдзівае і высокамастацкае адлюстраванне багацця і мнагастайнасці сацыялістычнай рэчаіснасці, натхнёны і яркі паказ новага, сапраўды камуністычнага, і выкрыццё ўсяго таго, што перашкаджае руху грамадства наперад»[1].

Беларускія пісьменнікі і дзеячы мастацтва сваёй творчай працай

[1] Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск, 1961, стар. 133.

уносіі неацэнны ўклад у духоўнае жыццё народа, усямерна садзей-
нічалі выкананню заданняў сямігадовага плана.

У апошнія гады сталічная пісьменніцкая арганізацыя намнога
выраслa ў асноўным за лік маладых таленавітых літаратараў.
У 1959 годзе з 170 пісьменнікаў рэспублікі 142 працавалі ў Мінску.
У сярэдзіне 1965 года ў Беларусі налічвалася 240 пісьменнікаў, з іх
200 займаліся творчай працай у сталіцы рэспублікі, у тым ліку такія
відомыя пісьменнікі, як П. Броўка, Я. Брыль, А. Вялевіч, П. Глебка,
К. Губарэвіч, К. Крапіва, А. Куляшоў, М. Лужанін, М. Лынькоў,
І. Мележ, П. Панчанка, П. Пестрак, М. Танк, І. Шамякін і многія
іншыя. Разам з імі паспяхова выступала сталічная таленавітая мо-
ладзь — Р. Барадулін, Н. Гілевіч, І. Навуменка, Б. Сачанка і інш.
У сваіх творах беларускія пісьменнікі пачалі больш смела ставіць
і вырашаць шырокае кола найважнейшых праблем мінулага і сучас-
насці, шырэй стала тэматыка твораў літаратуры. У большасці яны
былі прысвечаны працоўным подзвігам будаўнікоў камунізма і ге-
раічнаму мінуламу беларускага народа, паказу жыцця працоўных
за мяжой — у краінах сацыялістычных і капіталістычных, у бараць-
бе народаў за мір ва ўсім свеце.

У справаздачы на V з'ездзе пісьменнікаў Беларусі Пятрусь
Броўка гаварыў, што для сучаснага этапа беларускай літаратуры
характэрна яе сапраўдная сталасць, якая вызначаецца значным
расшырэннем гарызонтаў і значна ўзросшымі яе мастацкімі
якасцямі.

Найбольш шырокае развіццё ў літаратуры атрымаў жанр рамана.
Праўдзівому адлюстраванню нашай савецкай рэчаіснасці, паказу
самаадданай працы рабочых, сялян і інтэлігенцыі на розных участ-
ках сацыялістычнага будаўніцтва прысвечаны раманы «Серадзібор»
П. Пестрака, «Чакай у далёкіх Грынях» П. Пташнікава, «Сэрца на
далоні» І. Шамякіна.

Адлюстраванню сацыялістычнай рэвалюцыі і першых год існа-
вання Савецкай улады ў рэспубліцы прысвечаны творы І. Гурскага
«Уся ўлада Саветам», І. Мележа «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», якія былі добра сустрэты савецкімі чытачамі і крытыкай. Калі народны паэт Якуб Колас у сваёй славутай трылогіі «На ростанях» паказаў жыццё беларускага сялянства на Палессі напярэдадні Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, дык Іван Мележ адлюстраваў у сваім рамане «Людзі на балоце» змены ў жыцці палескага сялянства, якія адбыліся ўжо ў першыя гады ўстанаўлення Савецкай улады ў Беларусі.

Важная тэма беларускай літаратуры апошніх год — барацьба савецкага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Беларускія пісьменнікі імкнуліся больш глыбока

раскрыць псіхалогію савецкага чалавека, вытокі яго патрыятызму і гераізму. Гады сямігодкі ў іх працы адзначаны імкненнем паглыбіць наіўна-рамантычнага паказу падзей ваенных год, іх прыхарошвання.

Падзеям, якія адбываліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прысвечаны раманы «Партызаны» і «Вайна над дахамі» А. Адамовіча (1960), «Нямігі крывавыя берагі» У. Карпава (1962), «Сасна пры дарозе» І. Навуменкі (1962), тэтралогія «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна (1960), дакументальная аповесць «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» І. Новікава і інш. У гэтых творах шырока паказаны гераізм савецкіх людзей, вытокі і сіла савецкага патрыятызму. Глыбока і пераканаўча выявіў прычыны ўзнікнення фашызму ў сваім творы «Птушкі і гнёзды» Я. Брыль (1963).

Галоўнай тэмай беларускай паэзіі ў гады сямігодкі сталі гераічныя працоўныя будні савецкага народа — будаўніка камунізма. Іменна гэтай тэме прысвечаны зборнікі вершаў і паэм «Высокі поўдзень» А. Бялевіча, «Жывыя ідуць наперад», «Новая кніга» А. Куляшова, «Глыток вады» і «Хлеб мой надзённы» М. Танка і інш.

Багатая па зместу і яркая па мастацкай форме кніга вершаў П. Броўкі «А дні ідуць...», за якую паэту ў 1962 годзе прысуджана Ленінская прэмія.

Прэміяй імя Я. Купалы ў 1965 годзе адзначана паэма А. Вялюгіна «Вецер з Волгі», якая прысвечана дзяцінству і юнацтву У. І. Леніна, а таксама зборнік вершаў М. Аўрамчыка «Сустрэча былых канагонаў».

Арыгінальныя па форме і цікавыя па зместу кнігі — «Колас расказвае пра сябе» і «Вачыма часу» М. Лужаніна, «Роздум і словы» Я. Брыля. Многія беларускія празаікі і паэты ў сваіх творах закранаюць вострыя праблемы класавай няроўнасці і класавай барацьбы ў ЗША і іншых капіталістычных краінах, а таксама праблемы барацьбы за мір і дружбу паміж народамі.

Беларускія празаікі і паэты стварылі рад цікавых твораў для дзяцей.

Усяго за гады сямігодкі ў Беларусі было выдадзена 507 кніг тыражом у 12,5 мільёна экземпляраў. У жанры літаратуры для дзяцей і юнацтва паспяхова працавалі Я. Маўр, А. Якімовіч, Э. Агняцвет, А. Вольскі, А. Пальчэўскі, А. Васілевіч і многія іншыя.

Беларуская літаратура ўзбагацілася новымі драматургічнымі творамі. Сярод іх п'есы А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце» і І. Шамякіна «Выгнанне блудніцы». У гэтых творах у жыццёва вострых канфліктах паказана барацьба з недахопамі ў нашым грамадстве, барацьба за новыя, камуністычныя адносіны паміж людзьмі.

За заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і актыўную грамадска-палітычную дзейнасць П. Броўку ў 1962 годзе прысвоена ганаровае званне народнага паэта БССР, М. Лынькову — ганаровае званне народнага пісьменніка БССР.

Значна пашырыліся сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі саюзных рэспублік. Яны развіваліся шляхам узаемнага публікавання лепшых мастацкіх твораў, асабістых кантактаў пісьменнікаў, правядзення дэкад і тыдняў мастацкай кнігі і рада іншых мерапрыемстваў. Толькі ў Маскве ў 1964 годзе было выдадзена 13 кніг беларускіх празаікаў і паэтаў, у тым ліку раман «Серадзібор» П. Пестрака, «Колас расказвае пра сябе» М. Лужаніна, «Мой хлеб надзённы» М. Танка, «Калі зліваюцца рэкі» П. Броўкі, «На ростанях» Я. Коласа, «Сасна пры дарозе» І. Навуменкі і інш. На рускай мове і на мовах іншых братніх народаў мільённымі тыражамі выдадзены кнігі «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» І. Мележа.

У 1963—1965 гадах у Мінску адбыліся тыдні рускай, літоўскай, латышскай, польскай і балгарскай кнігі. У гэты ж час тыдні беларускай кнігі праводзіліся ў Маскве, Латвіі, Літве, Польшчы, Балгарыі і ў іншых савецкіх рэспубліках і братніх сацыялістычных краінах.

Беларуская літаратура заваявала прызнанне чытачоў не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

Значныя зрухі адбыліся ў развіцці выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі.

Пэўных дасягненняў дабіліся ў сямігодцы беларускія кінематаграфісты.

За сямігоддзе прыкметна расшырылася тэматыка беларускага кіно, больш стала фільмаў, прысвечаных праблемам сучаснасці, значна вырас іх ідэйна-мастацкі ўзровень. Дзякуючы клопатам партыі і ўрада аб развіцці беларускай кінематаграфіі значна ўзмацнілася яе матэрыяльная база. Замест адной кінастудыі з 1961 года пачалі працаваць дзве — Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў і студыя «Беларусьфільм», якая выпускае мастацкія кінакарціны.

Павялічылася колькасць кінафільмаў вытворчасці беларускіх кінематаграфістаў. Цікавасць гледачоў абудзілі кінафільмы «Вуліца малодшага сына», які расказаў аб барацьбе крымскіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны, і «Першыя выпрабаванні», створаны па матывах трылогіі народнага пісьменніка Якуба Коласа «На ростанях». У фільме (аўтары сцэнарыя А. Куляшоў, М. Лужанін, рэжысёр У. Корш-Саблін) паказаны шлях дарэвалюцыйнай беларускай інтэлігенцыі ў рэвалюцыі, яе палітычнае выспяванне.

На Усесаюзным фестывалі мастацкіх фільмаў у 1958 годзе адзначаны трэцяй прэміяй беларускі фільм «Гадзіннік спыніўся апоўначы», прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны.

Паспяхова прайшла не толькі на экранах нашай краіны, але і за яе межамі кінакарціна «Дзяўчынка шукае бацьку» (1959), прысвечаная барацьбе народных мсціўцаў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На Усесаюзным кінафестывалі ў 1960 годзе гэта кінакарціна атрымала першую прэмію сярод дзіцячых кінафільмаў. Высокую ацэнку гледачоў атрымалі таксама кінафільмы «Трэцяя ракета» (1963) (сцэнарый В. Быкава, рэжысёр-пастаноўшчык Р. Віктараў), «Крыніцы» (1964) — па матывах аднайменнага рамана пісьменніка І. Шамякіна.

Гераічнай барацьбе беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў прысвечаны фільм «Праз могілкі», створаны па сцэнарыю П. Ніліна.

Найвялікшае прызнанне крытыкі і грамадскасці атрымаў кінафільм «Масква — Генуя» (1964), пастаўлены А. Спешневым з удзелам У. Корш-Сабліна і П. Арманда. На Усесаюзным кінафестывалі ў 1964 годзе гэты фільм удастоены другой прэміі.

У 1959—1965 гадах беларускімі кінематаграфістамі было створана даволі многа дакументальных фільмаў і кіначасопісаў. Толькі ў 1961 годзе ў рэспубліцы было выпушчана 36 навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў і 52 кіначасопісы. У іх раскрываецца высакароднасць савецкіх людзей, іх стваральная праца, прыгажосць прыроды і багацце нашай рэспублікі. На Усесаюзным кінафестывалі спецыяльным прызам адзначана хранікальная кінакарціна «Урок даўжынёй у год», якая праўдзіва паказвае фарміраванне дзіцячых характараў.

Выкрывае рэакцыйную сутнасць рэлігіі дакументальны кінанарыс «Праўда аб сектантах-пяцідзесятніках». На кінафестывалі Прыбалтыйскіх рэспублік і Беларусі ў 1959 годзе гэта карціна адзначана першай прэміяй сярод дакументальных фільмаў.

У гады сямігодкі плённа працавалі тэатральныя калектывы сталіцы. З 11 тэатраў рэспублікі пяць знаходзяцца ў Мінску: тэатр оперы і балета, два драматычныя тэатры, тэатр лялек і тэатр юнага гледача. На сцэне тэатраў прадстаўлены разнастайны рэпертуар. Вядучай тэмай яго стала наша савецкая рэчаіснасць. Напрыклад, Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паставіў спектаклі «Дні нашага нараджэння» па п'есе І. Мележа, «Лявоніха на арбіце» па п'есе А. Макаёнка, прысвечаны жыццю людзей калгаснай вёскі. Тэатр ажыццявіў пастаноўку такіх высокаідэйных твораў, як «Рускія людзі» К. Сіманава, «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна, «Дзівак» Назыма

Хікмета, а таксама твораў рускай і сусветнай класікі — «Живы труп» і «Уваскрэсенне» Л. Талстога, «Жывы прастаты» і «Жаніцьба Бялугіна» А. Астроўскага, «На ўсякага мудраца хапае вянец» В. Шэкспіра і інш. Толькі за 1959—1961 гады тэатрам было пастаўлена каля 20 спектакляў-прэм'ер.

Плённа працаваў калектыў Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета. Ім былі пастаўлены новыя нацыянальныя оперы «Калючая ружа» Ю. Семянякі і «Яснае світанне» А. Туранкова ў новай музычнай рэдакцыі кампазітара Г. Вагнера, а таксама рад опер і балетаў вялікіх кампазітараў Расіі: «Заручыны ў манастыры» С. Пракоф'ева, «Арэстэя» С. Танеева, «Пікавая дама», «Чараўніца», «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага і інш. Добрую ацэнку гледачоў атрымалі пастаноўкі балетаў «Святло і цені» Г. Вагнера, створанага па матывах рамана П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі», і «Мара» Я. Глебава.

За 1964 год мінскія тэатры паказалі каля трох тысяч спектакляў, на якіх прысутнічала 1400 тысяч гледачоў.

Вялікай падзеяй у жыцці калектыву тэатра оперы і балета былі яго гастролі ў Маскве ў лютым 1964 года. Беларускія артысты паказалі масквічам тры нацыянальныя спектаклі (оперу «Яснае світанне», балеты «Святло і цені» і «Мара»), два класічныя творы («Арэстэя» і «Атэла»). За 12 дзён гастроляў спектаклі беларускіх артыстаў праглядзела 90 тысяч масквічоў.

Савецкі ўрад высока ацаніў мастацтва артыстаў Беларускага тэатра оперы і балета: тэатру было нададзена званне акадэмічнага, многія творчыя работнікі тэатра былі ўдастоены ўрадавых узнагарод, атрымалі ганаровыя званні народных і заслужаных артыстаў БССР.

Шмат цікавых спектакляў паказаў і Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя А. М. Горкага. Ім пастаўлены новыя спектаклі — «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча, «Дзень нараджэння Тэрэзы» Г. Мдзівані, «Іркуцкая гісторыя» А. Арбузава і шмат іншых, што нязменна карысталіся поспехам у гледачоў.

За 1959—1965 гады тысячы вечароў сімфанічнай музыкі і эстрады правяла Беларуская дзяржаўная філармонія.

На сцэне Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача ішлі спектаклі «Не верце цішыні» І. Шамякіна, аб юным беларускім патрыёце Мараце Казеі па аднайменнай п'есе В. Зуба, «Клоп» У. Маякоўскага, «Том — вялікае сэрца» і рад іншых цікавых пастановак, якія маюць выхаваўчае і пазнавальнае значэнне для нашага юнацтва.

У Маскве на заключным аглядзе лепшых спектакляў тэатраў юнага гледача і тэатраў лялек краіны, прысвечаным 40-годдзю пія-

нерскай арганізацыі, Беларускаму рэспубліканскаму тэатру юнага гледача быў прысуджаны дыплом другой ступені.

У дні святкавання 40-годдзя БССР у Мінску быў адкрыты Беларускі цырк. Цёпла сустрэлі гледачы Мінска і многіх іншых гарадоў краіны яго праграму «Бывайце здаровы», створаную на нацыянальных матывах. На Усесаюзным аглядзе цыркавых калектываў у Маскве, які адбыўся ў пачатку 1964 года, калектыў Беларускага цырка атрымаў заслужаную перамогу — быў узнагароджаны дыпломам першай ступені.

За гады сямігодкі значна пашырыліся творчыя сувязі мінскіх тэатраў з тэатрамі іншых рэспублік, асноўнай формай гэтых сувязей былі гастрольныя паездкі. Мінскія тэатральныя калектывы неаднаразова былі гасцямі Масквы і многіх іншых гарадоў РСФСР, Латвіі, Літвы, Украіны і іншых рэспублік.

Вялікі ўклад у развіццё мастацтва Савецкай Беларусі ўносяць харавыя і танцавальныя калектывы. Заслужанай славай у працоўных Мінска і рэспублікі карыстаецца Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР, Дзяржаўны народны хор БССР, Дзяржаўны ансамбль танца БССР. Паспяховая творчая праца харавых і танцавальных калектываў непарыўна звязана з дзейнасцю кампазітараў Беларусі, якія абагачаюць музычнае мастацтва новымі творамі. Беларускую музыку ведаюць і любяць у рэспубліках Савецкага Саюза і за мяжой. Прыкметных поспехаў дабіліся беларускія кампазітары ў галіне сімфанічнай музыкі. У апошнія гады напісаны Першая сімфонія Л. Абеліёвічам, Сёмая сімфонія М. Аладавым, Другая і Трэцяя сімфонія Я. Глебавым, Шостая сімфонія Я. Цікоцкім, а таксама канцэрт для віяланчэлі з аркестрам А. Багатыровым і інш. Ёсць дасягненні ў стварэнні опернай і песеннай музыкі.

Тэма сучаснасці стала вядучай у творчасці майстроў жывапісу, скульптуры і графікі.

Аб прыгажосці мірнай стваральнай працы, лепшых людзях — будаўніках камунізма — стварылі карціны мастак П. Гаўрыленка «На лясах», М. Данцыг «Кірмаш», «Абавязацельства», «Хлеб», «Я ведаю, горад будзе». Прыгажосць беларускай прыроды, плошчаў, сквераў і вуліц беларускай сталіцы адлюстроўваюць у сваіх творах мастакі В. Цвірка («На возеры Свір»), А. Волкаў («Дзіцячы садзік»), а таксама мастакі І. Давідовіч, М. Манасзон, С. Раманаў і інш. У творах жывапісу знайшлі адлюстраванне і гісторыка-рэвалюцыйная тэматыка, гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ёй прысвечаны карціны М. Данцыга і А. Кроля «Разгром фашысцкіх захопнікаў пад Мінскам», А. Кроля «Выступленне А. Ф. Мяснікова на VI з'ездзе ваенных арганізацый Заходняга фронту ў Мінску ў 1917 годзе» і інш.

Плённа працавалі і мінскія скульптары. Імі створана галерэя партрэтаў дзеячаў рэвалюцыі і культуры рэспублікі і іншых народаў, перадавікоў сацыялістычнай працы. Сярод іх партрэты народнага пісьменніка Якуба Коласа (граніт), рэвалюцыянера-дэмакрата К. Каліноўскага (граніт) і беларускага пісьменніка XIX стагоддзя Францішка Багушэвіча (мармур), якія стварыў скульптар народны мастак БССР З. Азгур; партрэт заслужанага настаўніка БССР І. Пісарчыка (гіпс) стварыў народны мастак БССР А. Бембель.

Пад жыватворным уздзеяннем прафесіянальнага мастацтва ў Мінску паспяхова развіваецца народная творчасць. Найбольшага росквіту дасягнула мастацкая самадзейнасць. З'яўляючыся ў наш час масавай школай мастацтваў, мастацкая самадзейнасць у спалучэнні з прафесіянальным мастацтвам з'явілася яркім паказчыкам росквіту культуры горада.

У 1959—1965 гады прыкметна ўзрасло мастацкае майстэрства самадзейных артыстаў. Вялікай частцы мастацкіх калектываў прысвоена званне народных, і гэта з'яўляецца найвышэйшай ацэнкай узроўню развіцця самадзейнага мастацтва. Калі ў 1962 годзе ў Мінску было дзевяць народных ансамбляў і хораў, адзін народны тэатр, дык у пачатку 1965 года ў сталіцы ўжо працавала 12 народных ансамбляў, аркестраў і хораў і два народныя тэатры. У іх ліку такія вядомыя сваім майстэрствам мастацкія самадзейныя калектывы, як народная харавая капэла і народная студыя Палаца культуры прафсаюзаў БССР, народная харавая капэла Мінскага трактарнага завода, народны хор Дома культуры будтрэста № 5, народны ансамбль танца працоўных рэзерваў, народны тэатр Мінскага аўтамабільнага завода і інш.

Лепшыя самадзейныя калектывы выступалі на сцэне тэатраў і канцэртных залаў Мінска, Масквы і іншых гарадоў, ставілі оперы, балеты, выконвалі складаныя вакальна-сімфанічныя творы. Напрыклад, оперная студыя пры Палацы культуры прафсаюзаў ажыццявіла пастаноўку опер «Алека» С. Рахманінава, «Кветка шчасця» А. Туранкова, «Рыгалета» і «Травіята» Дж. Вердзі. Рад спектакляў паставіла тэатральная студыя.

Для выяўлення народных талентаў і здольнасцей, для прапаганды самадзейнага мастацтва праводзіліся агляды і дэкады мастацкай самадзейнасці. Найбольш цікавай была III дэкада народнай творчасці Беларусі, якая адбылася ў Мінску ў сакавіку 1965 года. У праграму гэтай дэкады, у адрозненне ад мінулых год, акрамя песень, музыкі, танцаў і мастацкага чытання, былі ўключаны творы самадзейных майстроў выяўленчага і прыкладнога мастацтва, а таксама лепшых народных тэатраў. Мінчане паказалі цікавую змястоўную канцэртную праграму.

У дні дэкады ў новым памяшканні Дзяржаўнага музея БССР была адкрыта рэспубліканская выстаўка народнай творчасці, дзе экспанавалася каля 1500 лепшых твораў. У палацы прафсаюзаў была адкрыта выстаўка работ народных умельцаў Мінска. Дэманстраваліся лепшыя працы разьбы па дрэву Г. Гуткоўскага, А. Царкоўскага, А. Шчалавіцелева, скульптурныя партрэты К. Гелашвілі, самадзейных мастакоў І. Сшрыдонава, А. Чэрнікава, Ф. Хадасоўскага, А. Кадэр, А. Ананенка.

Такім чынам, у гады сямігодкі адбывалася далейшае развіццё культуры Мінска. З кожным годам расла і мацнела яго роля не толькі як адміністрацыйнага і эканамічнага цэнтра рэспублікі, але і як цэнтра беларускай савецкай культуры.

5. Культурна-асветная работа

Гады сямігодкі азнаменаваліся далейшым разгортваннем дзейнасці культурна-асветных устаноў Мінска. Бібліятэкі, клубы, Палацы культуры, музеі з'яўляліся апорнымі пунктамі Камуністычнай партыі ў выхаваўчай рабоце сярод працоўных, сталі больш актыўна весці прапаганду важнейшых рашэнняў партыі і ўрада, дасягненняў навукі і тэхнікі, перадавога вопыту, разнастайную работу па арганізацыі культурнага адпачынку працоўных.

Важную культурна-асветную і масава-палітычную работу сярод насельніцтва праводзяць бібліятэкі горада. У пачатку 1958 года ў горадзе дзейнічала 111 масавых бібліятэк, у 1965 годзе — 173. Колькасць кніг і часопісаў за гэтыя ж гады павялічылася з 1700 тысяч да трох мільёнаў экземпляраў.

У Мінску працуе буйнейшая ў рэспубліцы Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна. Да 40-годдзя бібліятэкі (1962) дадаткова быў пабудаваны новы будынак з чатырма заламі і вялікім кнігасховішчам. У 1965 годзе бібліятэка мела восем чытальных залаў, у яе кнігасховішчы налічвалася каля чатырох мільёнаў экземпляраў кніг і часопісаў. Гэта ў 8 разоў больш, чым мелі ўсе бібліятэкі дарэвалюцыйнай Беларусі ў 1913 годзе.

Каля 1200 тысяч экземпляраў кніг і часопісаў сабрана ў Фундаментальнай бібліятэцы імя В. Р. Бялінскага Акадэміі навук Беларускай ССР, амаль мільён кніг і часопісаў — у бібліятэцы імя М. Горкага.

Бібліятэкі горада вядуць прапаганду палітычнай і мастацкай літаратуры. Яны часта наладжваюць тэматычныя выстаўкі, прысвечаныя важнейшым падзеям у жыцці краіны і рэспублікі, літаратурныя вечары, дыспуты, вечары сустрэч чытачоў з перадавікамі вытворчасці і г. д.

У культурна-масавай рабоце горада ў гады сямігодкі значна ўзрасла сетка клубаў, Дамоў і Палацаў культуры. Іх колькасць узрастае з кожным годам. К маю 1965 года быў пабудаваны цудоўны будынак Палаца культуры мінскіх трактаразаводцаў. У ім ёсць канцэртная зала на 800 месц, малая канцэртная зала на 300 месц, зала для танцаў, бібліятэка, 50 пакояў для работы калектываў мастацкай самадзейнасці. Добры будынак Палаца культуры летам 1965 года атрымалі рабочыя і служачыя камвольнага камбіната.

У сваёй рабоце клубныя ўстановы ўдала спалучаюць культурна-адпачынак працоўных з распаўсюджаннем сярод іх палітычных, прыродна-навуковых ведаў, дасягненняў літаратуры і мастацтва. Яны актыўна дапамагаюць партыйным і прафсаюзным арганізацыям у развіцці сацыялістычнага спаборніцтва, прапагандзе перадавых метадаў працы. У клубах, Дамах і Палацах культуры праводзяцца для працоўных лекцыі і гутаркі, наладжваюцца вечары пытанняў і адказаў, вечары па прафесіях, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці.

Цікава будуе сваю работу Палац культуры прафсаюзаў. Тут створаны народны універсітэт культуры, народная оперная студыя, студыя выяўленчага мастацтва, харавая капэла, студыя класічнага танца, дзіцячая тэхнічная школа і г. д. У Палацы культуры часта чытаюцца лекцыі аб міжнародным становішчы, наладжваюцца камсамольскія і маладзёжныя вечары, вечары выпускнікоў сярэдніх школ, вечары адпачынку пенсіянераў, агляды мастацкай самадзейнасці, выстаўкі народнай творчасці і г. д. Добра арганізуюць сваю работу Палац культуры Мінскага аўтазавода, Палац культуры будаўнічага трэста № 1 і інш.

Цікавую культурна-асветную работу праводзяць музеі горада. К пачатку 1959 года ў горадзе дзейнічала пяць музеяў, зараз іх стала восем.

У 1959 годзе адчыніў свае залы для наведвальнікаў Літаратурны музей Якуба Коласа. У 1961 годзе пабудаван новы будынак для Літаратурнага музея Янкі Купалы. У цудоўным будынку на Цэнтральнай плошчы горада размясціўся Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Музеі горада штогод наведваюць тысячы людзей. Асабліва многалюдна бывае ў Доме-музеі I з'езду РСДРП, Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. У 1957 годзе музеі горада наведала 170 тысяч чалавек, а ў 1964 годзе лік наведвальнікаў дасягнуў 329 тысяч.

Адзіным у краіне музеем такога профілю з'яўляецца Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку 1965 года музей меў больш 100 тысяч экспанатаў, у якіх адлюстравана гераічная гісторыя барацьбы беларускага народа за пабудову сацыялізма ў рэспубліцы. Музейныя матэрыялы раскрываюць гераізм беларускага наро-

да ў сумеснай барацьбе з вялікім рускім народам і іншымі народамі краіны на франтах, у партызанскім руху і камуністычным падполлі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады другой сусветнай вайны. Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў 1964—1965 гады наведалі А. І. Мікаян і прэзідэнт СФРЮ І. Броз Ціта, партыйна-ўрадавая дэлегацыя Манголькай Народнай Рэспублікі на чале са старшынёй Савета Міністраў МНР Ю. Цэдэнбалам, Маршалы Савецкага Саюза І. Х. Баграмян, К. К. Ракасоўскі, Маршал авіяцыі С. І. Рудэнка і інш.

Вядомае месца ў павышэнні палітычнага і культурнага ўзроўню мінчан займаюць народныя універсітэты. Яны пачалі ствараццa ў канцы 1958 года. У пачатку 1964 года дзейнічала 64 народных універсітэты. У іх навучалася 17 тысяч мінчан.

Самае вялікае распаўсюджанне ў горадзе атрымалі універсітэты культуры, педагагічных, навукова-тэхнічных, медыцынскіх ведаў. Пры юрыдычным факультэце БДУ імя У. І. Леніна ўпершыню ў краіне адкрыта спецыяльнае аддзяленне для актывістаў народнага кантролю. У 1963/64 навучальным годзе на аддзяленні навучалася больш 300 чалавек. Па ўзору мінчан падобныя універсітэты і факультэты шырока ствараюцца па ўсёй краіне.

Для кіраўніцтва народнымі універсітэтамі, аказання ім дапамогі ў рабоце ў 1962 годзе створан Рэспубліканскі грамадскі савет народных універсітэтаў, у які ўвайшлі вучоныя, партыйныя і камсамольскія работнікі.

Мінск з'яўляецца цэнтрам кнігадрукавання рэспублікі. Тут працуюць шэсць рэспубліканскіх і некалькі ведамасных выдавецтваў, у іх ліку — старэйшыя выдавецтвы «Беларусь», «Народная асвета», «Навука і тэхніка», «Вышэйшая школа», «Ураджай» і інш. З кожным годам узрастае выпуск палітычнай, навуковай, вучэбна-педагагічнай, мастацкай і іншай літаратуры. Калі ў 1959 годзе ў горадзе было выдадзена 1200 назваў кніг, то ў 1964 годзе — амаль 1800. За 1959—1964 гады было выпушчана каля 9 тысяч назваў кніг тыражом больш 98 мільёнаў экземпляраў.

У сталіцы рэспублікі выдаюцца дзесяць рэспубліканскіх газет, адна абласная газета «Мінская праўда», каля 30 часопісаў.

Кнігі, газеты, часопісы ўвайшлі ў быт кожнай савецкай сям'і. Падпіска мінчан на газеты і часопісы павялічылася з 331 тысячы экземпляраў у 1959 годзе да 700 тысяч экземпляраў у студзені 1965 года. У 1959 годзе на кожную тысячу чалавек у горадзе прыходзілася 654 экземпляры газет і часопісаў, а ў 1964 годзе — амаль 1044 экземпляры.

Магутным сродкам у камуністычным выхаванні савецкіх людзей з'яўляецца кіно. У гады сямігодкі ў Мінску ўзведзены будынкі для

чатырох новых і некаторых старых кінатэатраў. Так, былі адкрыты новыя кінатэатры «Мір» (1959), «Ракета» (1960), «Камсамолец» (1962), «Радзіма» (1963); новы будынак быў пабудаваны для кінатэатра «Беларусь» (1963). У 1964 годзе было распачата будаўніцтва шырокаэкраннага кінатэатра на тысячу месц на рагу вуліц Кавалерыйскай і Талбухіна. У горадзе ў канцы 1965 года было 18 кінатэатраў, акрамя таго, працавала 50 стацыянарных і перасовачных кінаўстановак.

У апошнія гады значна павялічылася цікавасць мінчан да кінамастацтва. Аб гэтым сведчыць рост колькасці гледачоў у кінатэатрах. Напрыклад, у 1959 годзе кінатэатры горада наведала 9,5 мільёна чалавек, у 1964 годзе — 11,5 мільёна чалавек.

Мінскія кінатэатры побач з паказам фільмаў наладжваюць вечары адпачынку працоўных, сустрэчы са знатнымі людзьмі, артыстамі і пісьменнікамі, выстаўкі, выдаюць вусныя часопісы, чытаюцца лекцыі, даклады.

У апошнія гады сямігодкі пры кінатэатрах сталі стварацца кінаўніверсітэты. Такія кінаўніверсітэты дзейнічаюць пры кінатэатрах «Мір» і «Дзіцячы».

У жыццё і быт мінчан трывала ўвайшлі радыё і тэлебачанне. У горадзе штогод павялічваецца колькасць радыёкропак, прыёмнікаў і асабліва тэлевізараў. Калі ў 1959 годзе ў кватэрах мінчан налічвалася 67,4 тысячы радыёкропак і больш 17 тысяч тэлевізараў, то ў пачатку 1965 года — 100 тысяч радыёкропак і 93,5 тысячы тэлевізараў. Такім чынам, кожны год у кватэрах працоўных горада ўстанаўлівалася па 6,5 тысячы радыёкропак, колькасць тэлевізараў за гэтыя гады павялічылася амаль у шэсць разоў.

Новых вялікіх поспехаў у сямігодцы дасягнула народная творчасць, асабліва мастацкая самадзейнасць горада. Узрасла колькасць самадзейных калектываў і ўдзельнікаў у іх. Калі ў канцы 50-х гадоў у Мінску працавала 300 калектываў мастацкай самадзейнасці, у 1962 годзе — 830, то ў пачатку 1965 года іх стала каля тысячы. Колькасць удзельнікаў мастацкай самадзейнасці на прадпрыемствах і ўстановах сталіцы з 8 тысяч чалавек у 1958 годзе павялічылася да 10 тысяч у 1965 годзе.

У апошнія гады значна ўзрасло майстэрства самадзейных выканаўцаў. Многім самадзейным калектывам прысвоена званне народных. У іх ліку харавая капэла і студыя Мінскага палаца культуры прафсаюзаў, харавая капэла трактарнага завода, хор Дома культуры будаўнічага трэста № 5 і інш.

Росту культурна-асветных устаноў Мінска і рэспублікі, узмацненню іх ролі ў камуністычным выхаванні насельніцтва вялікую ўвагу ўдзялялі Камуністычная партыя і ўрад Беларусі.

Так, пытанне «Аб стане і мерах паляпшэння работы культурна-асветных устаноў рэспублікі» ў канцы кастрычніка 1965 года было разгледжана на шостай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У прынятай пастанове адзначана, што культурна-асветныя ўстановы за апошнія гады павысілі сваю ролю ў камуністычным выхаванні працоўных. Яны сталі цясней увязваць сваю дзейнасць з канкрэтнымі задачамі работы прадпрыемстваў і будоўляў, калгасаў і саўгасаў, палепшылі прапаганду дасягненняў навукі і перадавога вопыту ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Гэта станоўчая ацэнка культурна-асветнай работы ў рэспубліцы поўнасцю адносіцца да работы культурна-асветных устаноў сталіцы.

Вярхоўны Савет БССР намеціў шырокі план паляпшэння работы культурна-асветных устаноў рэспублікі.

Такім чынам, у Мінску ў гады сямігодкі культурна-асветная работа значна расшырылася і стала больш разнастайнай.

РАЗДЗЕЛ XXV

ЗАРУБЕЖНЫЯ СУВЯЗІ МІНСКА

1. Эканамічныя сувязі

Поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі і культуры Беларусі і яе сталіцы Мінска, дасягнутыя ў пасляваенныя гады, садзейнічалі далейшаму расшырэнню і ўмацаванню эканамічных і культурных сувязей працоўных горада з зарубежнымі, асабліва з сацыялістычнымі, краінамі.

Вялікае месца ў эканамічных адносінах Мінска з замежнымі дзяржавамі займаў гандаль. Да канца 1965 года прамысловую прадукцыю мінскіх прадпрыемстваў закуплялі 52 краіны свету, у тым ліку Польшча, Балгарыя, Венгрыя, Чэхаславакія, Румынія, Германская Дэмакратычная Рэспубліка, Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам, Куба і іншыя. На знешнім рынку знаходзіць шырокі збыт такая прадукцыя мінскіх прадпрыемстваў, як падшыпнікі, матацыклы, веласіпеды, гадзіннікі, фота- і кінаапараты, радыёпрыёмнікі, сілавыя трансфарматары, камплектныя трансфарматарныя падстанцыі, электрапанелі, прыборы высокай дакладнасці, медпрэпараты і іншыя тавары.

Шырокі попыт у больш чым 46 краінах свету знаходзіць трактар «Беларусь». Толькі ў Венгерскую Народную Рэспубліку трактарабудаўнікі Мінска паставілі на працягу апошніх год 10 тысяч машын. Больш шасці тысяч трактараў «Беларусь» баразняць палі Балгарыі. «Мы ў Балгарыі,— гаварыў на мітынгу мінскіх трактаразаводцаў Першы сакратар ЦК Кампартыі Балгарыі Тодар Жыўкаў,— добра ведаем аб Мінскім трактарным заводзе. Балгарскія сяляне з удзячнасцю адзываюцца аб беларускіх машынах, якія працуюць на палях Балгарыі».

Вялікую славу на міжнародным рынку заваявала таксама прадукцыя Мінскага аўтамабільнага завода. Ужо ў 1957 годзе аўтазавод адправіў свае машыны ў 21 краіну, у тым ліку ў Афганістан, Бірму, Егіпет, Іран, Індыю, Сірыю, Судан, Турцыю і Фінляндыю. Аўтамашыны маркі МАЗ шырока выкарыстоўваюцца на буйных будаўнічых аб'ектах і ў горназдабываючай прамысловасці Чэхаславакіі, Венгрыі, Балгарыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі і ў іншых краінах сацыялістычнай садружнасці. На Кубе аўтамашыны мінскіх аўтамабілебудаўнікоў паспяхова выкарыстоўваюць на вывазцы цукровага трыснягу і перавозцы грузаў на будаўніцтве буйнейшай у краіне электрастанцыі Марыэль-і-Рэнці.

Колькасць краін-спажыўцоў аўтамашын сямейства МАЗ павялічваецца з кожным годам. Зараз велікагрузныя аўтамашыны з эмблемай зубра, цягачы, прычэпы і паўпрычэпы можна сустрэць на дарогах і прамысловых будоўлях больш 40 краін Еўропы, Афрыкі, Азіі, Лацінскай Амерыкі.

Асабліва цесныя эканамічныя сувязі Савецкага Саюза з сацыялістычнымі краінамі. Яны прадстаўляюць сабой новы тып міжнародных эканамічных адносін, што заснаваны на прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму, агульнасці інтарэсаў, узаемнай дапамогі і дружбы.

У развіцці машынабудавання металаапрацоўчай прамысловасці краін народнай дэмакратыі вялікую дапамогу аказваюць пастаўкі гандлюючымі арганізацыямі Мінска сучасных высокапрадукцыйных станкоў. У Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы, Румыніі, Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, на Кубе цяжка зараз знайсці прамысловыя прадпрыемствы, не аснашчаныя станкамі, якія зроблены мінскімі прадпрыемствамі. Асобныя заводы Мінска выконваюць заказы машынабудаўнічай прамысловасці братніх нам краін. Завод імя Кірава на працягу некалькіх год выпускае вялікую колькасць станкоў са спецыяльнымі настройкамі для аўтамабільных заводаў Чэхаславакіі, для будаўніцтва трактарных заводаў у Польшчы і Балгарыі. Нямала прадпрыемстваў машынабудаўнічай прамысловасці Манголіі, Венгрыі, Югаславіі і іншых сацыялістычных краін укамплектаваны падоўжна-стругальнымі і фрэзернымі станкамі мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Сотні тысяч падшыпнікаў розных тыпаразмераў і мільёны шароў розных дыяметраў пастаўляе сацыялістычным краінам Мінскі падшыпнікавы завод.

На важнейшых будоўлях Карэі, В'етнама, Чэхаславакіі, Румыніі, ГДР шырока скарыстоўваюцца бульдозеры і многакаўшовыя аўтапагрузчыкі, бур-слупаставы і іншыя будаўнічыя машыны мінскага завода «Ударнік».

З году ў год у краіны сацыялістычнай садружнасці павялічваецца экспарт тавараў для насельніцтва. Вялікай, напрыклад, папулярнасцю карыстаюцца мужчынскія і жаночыя гадзіннікі вырабу мінскага гадзіннікавага аб'яднання «Прамень». У значных размерах экспартуюцца таксама веласіпеды і матацыклы, тэлевізары і радыёпрыёмнікі, электратэхнічныя вырабы і шарсцяныя тканіны. У апошнія гады вялікай вядомасцю за рубяжом пачалі карыстацца таксама медыцынскія прэпараты, якія вырабляюцца ў Мінску. Сярод іх важнае месца ў экспарце займаюць поліглюкін, біяміцын, ацыалінін, эндакрынныя прэпараты.

У сацыялістычныя краіны Мінск пастаўляе таксама электронна-вылічальныя машыны. Вытворчасць гэтай самай сучаснай і складанай тэхнікі з'яўляецца яркім паказчыкам велізарных навукова-тэхнічных дасягненняў, якіх дабіўся беларускі народ за гады Савецкай улады.

Знешнія сувязі сталіцы Беларусі з сацыялістычнымі краінамі ідуць не толькі па лініі экспарту, але і імпарту. Так, з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі мінскія станкабудаўнічыя заводы і прадпрыемствы машынабудавання атрымліваюць кузнечна-прэсавае абсталяванне, гідраўлічныя прэсы, некаторыя тыпы металарэжучых станкоў, светакапіравальныя апараты. Асобныя віды абсталявання, якое выраблена ў ГДР, выкарыстоўваюцца прадпрыемствамі харчовай, тэкстыльнай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Германская Дэмакратычная Рэспубліка пастаўляе ў Беларускую ССР, у тым ліку і ў Мінск, кампрэсары для халадзільнікаў, чыгуначнае і пад'ёмна-транспартнае абсталяванне (электракары, ліфты, маставыя краны і інш.). Мінскаму заводу эндакрынных прэпаратаў ГДР паставіла навейшае абсталяванне, заводу медыцынскіх прэпаратаў — таблетачныя машыны. На мінскіх камбінатах бытавога абслугоўвання працуюць установкі з ГДР для хімічнай чысткі адзення.

На прадпрыемствах Мінска шырока выкарыстоўваюцца асобныя тыпы металарэжучых, агрэгатных, такарных і фрэзерных станкоў, а таксама станкоў з праграмным кіраваннем, якія пастаўляюцца ў Беларусь Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікай. Абсталяванне з ЧССР выкарыстоўваецца таксама ў дрэваапрацоўчай, абутковай і хімічнай прамысловасці рэспублікі і Мінска.

Розныя віды станкоў, светакапіравальныя апараты, кампрэсары для халадзільнікаў, пад'ёмна-транспартнае абсталяванне, электракары паступаюць у Мінск з Венгерскай Народнай Рэспублікі. Прадпры-

ёмствы Народнай Польшчы пастаўляюць станкі і абсталяванне, трансфарматары, пасажырскія і таварныя вагоны.

Добра вядомы мінчанам таксама тавары народнага спажывання, якія экспартуюцца краінамі народнай дэмакратыі. З Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Балгарыі, Румыніі, Югаславіі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, Манголіі ў Мінск паступаюць швейныя і футравыя вырабы, тканіна, абутак, мэбля, хрусталь, фарфоравы посуд, дываны, фарбы і лакі, музычныя інструменты, электрапрыборы, мыла і сціральныя парашкі, харчовыя тавары, кансервы з плодагародніны, сухафрукты, віна-град, віны, цукеркі і г. д.

Такім чынам, паміж Мінскам і сацыялістычнымі краінамі адбываецца ўзаемавыгадны абмен пастаўкамі тавараў. Шырокія гандлёвыя сувязі сталіцы Савецкай Беларусі ў гэтым напрамку з'яўляюцца важным укладам у справу брацкага супрацоўніцтва Савецкай дзяржавы з краінамі народнай дэмакратыі, садзейнічаюць паспяховаму будаўніцтву ў іх сацыялізма.

Знешнія гандлёвыя сувязі Мінск падтрымлівае не толькі з сацыялістычнымі і капіталістычнымі дзяржавамі, але і з слабаразвітымі краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Сувязі гэтыя пашыраюцца з году ў год. Станкі і станочнае абсталяванне заводаў імя Кірава і Кастрычніцкай рэвалюцыі, якія яны вырабляюць з улікам кліматычных асаблівасцей жаркіх краін, экспартуюцца ў Аб'яднаную Арабскую Рэспубліку, Індыю, Пакістан, Інданезію, Саудаўскую Аравію, Тога. На многіх буйных прамысловых будоўлях Саудаўскай Аравіі, Індыі, Тога і іншых афра-азіяцкіх краін шырока скарыстоўваюцца будаўнічыя машыны (бульдозеры, многакаўшовыя пагрузчыкі і інш.), якія вырабляюцца на мінскім заводзе «Ударнік». Індыя, Бірма, Самалі, Гана, Афганістан, Інданезія, Сірыя, Пакістан, Гвінея, Ірак, Эфіопія, Малі, Судан купляюць прадукцыю мінскага падшыпнікавага і электратэхнічнага заводаў. У Іран, Ліван, Непал, Эфіопію, Індыю і Інданезію Мінск пастаўляе веласіпеды і матацыклы.

Больш чым у 30 краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі вялікім попытам карыстаюцца мінскія трактары і аўтамабілі. Пастаўкі іх у гэтыя краіны з кожным годам узрастаюць. Так, з 1960 года няспынна павялічвае закупку трактараў «Беларусь» і аўтамашын сірыйская фірма «Мехці халед эль-Заіль». Ужо некалькі год узапар усё ў большай і большай колькасці закупляюць трактары і аўтамашыны мінскіх заводаў дзяржаўныя гандлёвыя фірмы ААР «Эн-Насер» і «Саад-эль-Агізі».

Трактары і аўтамашыны, якія пастаўляе Мінск у эканамічна слабаразвітыя краіны, галоўным чынам выкарыстоўваюцца на розных аб'ектах, што будуюцца з дапамогай Савецкага Саюза, а таксама

ў сельскай гаспадарцы. На будаўніцтве вышыннай Асуанскай плаціны, іншых прамысловых аб'ектах і на палях Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі толькі ў 1960—1962 гадах працавала 2250 трактараў «Беларусь», каля 300 аўтамашын сямейства МАЗ, звыш 150 будаўнічых машын, розных станкоў. Сотні аўтамабіляў Мінскага аўтазавода выкарыстоўваліся на будаўніцтве высакагорнай дарогі праз хрыбет Гіндукуш у Афганістане, ірыгацыйнай сістэмы ў Йеменскай Арабскай Рэспубліцы, Бхілайскага металургічнага камбіната, а таксама завода цяжкага і горнарудnага абсталявання ў Індыі, заводаў угнаенняў у Хомсі і каўстычнай соды ў Латакіі (Сірыя). Аўтамашыны з эмблемай зубра можна бачыць на будоўлях Алжыра і Інданезіі, у геалагічных разведках Пакістана, Самалі, Гвінеі. Яны абслугоўваюць народную гаспадарку Ірана, Йемена, Камбоджы, Цэйлона, Лівіі, Эфіопіі, Ганы, Ірака, Малі, Судана. І дзе б ні працавалі МАЗы, будаўнічыя машыны і станкі, зробленыя рукамі мінчан, усюды яны карыстаюцца заслужанай вядомасцю.

У сваю чаргу жыхары Мінска ахвотна купляюць індыйскі і цэйлонскі чай, алжырскія і мараканскія апельсіны, рыс з Бірмы і ААР, розныя спецыі, сухафрукты, скураныя вырабы, абутак з Індыі і іншыя тавары лаціна-амерыканскіх і афра-азіяцкіх краін.

У развіцці знешніх гандлёвых адносін паміж краінамі важнае месца займаюць міжнародныя кірмашы, а таксама гандлёва-прамысловыя выстаўкі. Яны дазваляюць краінам — удзельніцам выставак і кірмашоў непасрэдна знаёміць шырокае кола гандлёвых фірм і іншых пакупнікоў са сваёй прадукцыяй, заключаць гандлёвыя здзелкі на пастаўкі прамысловых тавараў і, такім чынам, садзейнічаюць расшырэнню міжнародных эканамічных сувязей.

Сталіца Савецкай Беларусі пачынаючы з 50-х гадоў прымае актыўны ўдзел у міжнародных выстаўках і кірмашах. Трактарны, аўтамабільны, мотавеласіпедны, электратэхнічны і станкабудаўнічы заводы і іншыя прадпрыемствы штогод дэманструюць свае дасягненні ў многіх краінах свету. У 1955 годзе, напрыклад, яны ўдзельнічалі на міжнародных выстаўках у Ліоне, Лейпцыгу, Бамбеі, Карачы і іншых гарадах. На 14 міжнародных выстаўках 1956 года экспанавалася прадукцыя многіх мінскіх заводаў. У далейшым, па меры росту навукова-тэхнічных дасягненняў і развіцця прамысловасці, удзел у выстаўках набываў усё больш шырокі характар. У 1960—1962 гадах прадукцыя мінскіх прадпрыемстваў экспанавалася на 50 міжнародных кірмашах і прамыслова-гандлёвых выстаўках. Дзелавыя кругі, гандлюючыя фірмы Польшчы, Чэхаславакіі, Балгарыі, Югаславіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Аўстрыі, Бельгіі, Францыі, Італіі, Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, Індыі, Ірака, Пакістана, Сірыі, Лівіі і многіх іншых краін мелі магчымасць у сябе на месцы

азнаёміцца з высокапрадукцыйнымі станкамі, будаўнічымі машынамі, універсальнымі трактарамі «Беларусь», матацыкламі, радыёпрыёмнікамі, прыборамі высокай дакладнасці і больш новымі ўзорамі іншай прамысловай прадукцыі, якую вырабляюць мінскія прадпрыемствы.

Экспануемыя беларускай сталіцай прамысловыя тавары на міжнародных выстаўках і кірмашах, як правіла, атрымліваюць высокую ацэнку ў наведвальнікаў. Асобныя прадпрыемствы за высакаякасную прадукцыю былі ўдастоены высокіх узнагарод. Мінскі аўтамабільны завод, напрыклад, у 1958 годзе быў узнагароджан «Вялікім прызам» сусветнай Брусельскай выстаўкі. На гэтай жа выстаўцы «Ганаровым дыпломам» адзначан і Мінскі трактарны завод.

Важнай формай эканамічных зносін Савецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі з'яўляецца іх навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, у якім Беларуская ССР і яе сталіца Мінск прымаюць актыўны ўдзел.

Нейкі час гэта супрацоўніцтва праяўлялася пераважна ў выглядзе ўзаемнай дапамогі, заснаванай на двухбаковых пагадненнях. У далейшым, у сувязі з велізарнымі навукова-тэхнічнымі поспехамі, дасягнутымі ў сацыялістычных краінах, умацаваннем паміж імі адзінства і непарушнай дружбы, навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, асабліва ў межах СЭУ, стала шматбаковым; яно садзейнічае больш хуткаму развіццю навукі, тэхнікі і ўсёй народнай гаспадаркі ў краінах сацыялістычнай садружнасці.

Формы навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва вельмі разнастайныя. Яны ажыццяўляюцца галоўным чынам па лініі ўзаемнага абмену навукова-тэхнічнымі дасягненнямі, шляхам перадачы праектна-тэхнічнай і тэхналагічнай дакументацыі, будаўніцтва прамысловых і іншых аб'ектаў, падрыхтоўкі спецыялістаў, абмену вытворчым вопытам, супрацоўніцтва навуковых установ і па лініі ўдзелу ў розных навуковых канферэнцыях і нарадах. Цеснае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва ўстанавілася паміж Мінскам і Польшчай, Венгрыяй, Балгарыяй, Чэхаславакіяй, ГДР і іншымі братнімі краінамі. Перадавыя прамысловыя прадпрыемствы беларускай сталіцы ахвотна дзеляцца сваімі поспехамі і аказваюць неабходную дапамогу сацыялістычным краінам. Па просьбе балгарскіх сяброў, напрыклад, ім была перададзена тэхнічная дакументацыя і чарцяжы асобных агрэгатаў і машын, якія меліся на мінскіх камвольным і тонкасуконным камбінатах. Праектная дакументацыя і рабочыя чарцяжы на машыны і дэталі, што зацікавілі польскіх інжынераў і вучоных у час іх знаходжання на мінскіх аўтамабільным і трактарным заводах, а таксама на заводзе агрэгатных станкоў і аўтаматычных ліній, былі перададзены Польскай Народнай Рэспублікі.

У сваю чаргу сацыялістычныя краіны пасылаюць тэхнічную дакументацыю мінскім прадпрыемствам. Так, Чэхаславацкая Сацыялістычная Рэспубліка перадала Мінску неабходныя чарцяжы на матацыклы, машыны і некаторыя прыборы. Узаемавыгадны абмен тэхнічнай дакументацыяй на розныя машыны і прыборы зрабілі між сабой венгерскія і мінскія машынабудаўнікі.

Шырока практыкуецца і шмат іншых форм навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Інжынеры і тэхнікі, высокакваліфікаваныя рабочыя прадпрыемстваў сталіцы аказваюць сацыялістычным краінам вялікую дапамогу ў будаўніцтве прамысловых аб'ектаў, ва ўкараненні ў вытворчасць перадавой тэхнікі і тэхналагічных працэсаў, асваенні новых тыпаў машын, абсталявання і выпуску новай прадукцыі. Вялікую дапамогу, напрыклад, у стварэнні новай галіны прамысловасці — трактарабудавання ў Балгарыі аказаў балгарскім сябрам калектыў Мінскага трактарнага завода. З гэтай мэтай у Карлава, дзе вырас першынец балгарскага трактарабудавання, неаднаразова выязджалі канструктары і іншыя спецыялісты МТЗ.

Мінскія трактаразаводцы аказвалі дапамогу таксама і трактарабудаўнікам польскага завода «Урсус» і румынскага «Трактарул». Між гэтымі калектывамі існуе цесная сувязь і брацкая дружба, якая з году ў год мацнее і развіваецца.

Інжынерна-тэхнічныя работнікі Мінска, якія выязджаюць у братнія сацыялістычныя краіны для аказання практычнай дапамогі на месцы, як правіла, дапамагаюць там рыхтаваць адначасова і тэхнічныя кадры па эксплуатацыі навейшых машын і абсталявання. У той жа час многія спецыялісты краін народнай дэмакратыі праходзяць навучанне і вытворчую практыку непасрэдна на заводах Мінска. Так, з Польскай Народнай Рэспублікі ў 1959 годзе на мінскіх заводах вывучалі вытворчасць трактараў, аўтаматычных ліній і агрэгатных станкоў 20 спецыялістаў. У 50-х і пачатку 60-х гадоў вытворча-тэхнічнае навучанне і практыку на мінскіх прадпрыемствах прайшлі спецыялісты многіх сацыялістычных краін, у тым ліку Балгарыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Манголіі, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і Кубы. На прадпрыемствах сталіцы яны павышалі вытворчую кваліфікацыю, вывучалі навейшую тэхніку на станкабудаўнічым, трактарным, аўтаматычных ліній і іншых заводах, арганізацыю вытворчых працэсаў на гэтых прадпрыемствах.

Шырокі размах у навукова-тэхнічным супрацоўніцтве Мінска з сацыялістычнымі краінамі атрымаў узаемны абмен дэлегацыямі спецыялістаў розных прафесій для азнаямлення з вытворчасцю, вывучэннем тэхнічных дасягненняў у галіне прамысловасці і перадавога вытворчага вопыту.

Сталіцу Беларусі штогод наведваюць дэлегацыі Польшчы, Балгарыі, Румыніі, Чэхаславакіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Венгрыі, Кубы, Манголіі, КНДР, Югаславіі. Мінчане сустракаюць іх як дарагіх гасцей, ахвотна дзеляцца з імі сваімі поспехамі і вытворчым вопытам.

У 1964 годзе, напрыклад, толькі з Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў Мінску знаходзіліся чатыры спецыялізаваныя групы. Чэхаславацкія сябры вывучалі на мінскіх прадпрыемствах вопыт перадавых рабочых, тэхналогію вытворчасці, канструкцыю агрэгатных станкоў і аўтаматычных ліній і іншыя працэсы работы.

Сістэматычна абменьваюцца вытворчым вопытам мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава і завод металарэжучых станкоў у балгарскім горадзе Пернік, Мінскі гадзіннікавы завод і Сафійскі завод слабаточнай апаратуры, мінская кандытарская фабрыка «Камунарка» і кандытарская фабрыка «Іарданка Ніколава» ў Сафіі, Мінскі завод аўтаматычных ліній і Сафійскі завод металарэзных машын і іншыя.

У сваю чаргу для абмену вопытам работы часта выязджаюць у сацыялістычныя краіны спецыялісты мінскіх прадпрыемстваў. Яны пабывалі на многіх заводах і фабрыках Польшчы, Чэхаславакіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Венгрыі і іншых сацыялістычных краін, дзе не толькі перадавалі свой вытворчы вопыт, але і вывучалі вопыт зарубежных сяброў. Расточнік Мінскага завода аўтаматычных ліній Герой Сацыялістычнай Працы А. Віташкевіч і гальванізіст трактарнага завода Герой Сацыялістычнай Працы Р. Прусава ў 1962 годзе наведалі рад прадпрыемстваў Народнай Рэспублікі Балгарыі. З гэтымі ж мэтамі пабывалі ў ПНР мінскія трактаразаводцы і станкабудаўнікі. Работнікі падшыпнікавага завода знаёміліся з працай аднагаліновых прадпрыемстваў у Брно і Прэшчава. Яны перанялі ў чэхаславацкіх сяброў і ўкаранілі ў сябе адзін з новых метадаў апрацоўкі металу, вывучылі арганізацыю працы і многія іншыя тэхналагічныя працэсы.

У навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з сацыялістычнымі краінамі прымаюць удзел і навукова-даследчыя ўстановы. Асобныя інстытуты Акадэміі навук БССР (фізікі і матэматыкі, хіміі, торфу і іншыя) падтрымліваюць цесныя сувязі з такімі ж інстытутамі краін народнай дэмакратыі. Актыўнае і ўзаемавыгаднае навуковае супрацоўніцтва ажыццяўляецца паміж вучонымі — матэматыкамі і фізікамі, якія працуюць у галіне ядзернай фізікі і выкарыстання атамнай энергіі ў мірных мэтах. Яны ў гэтай галіне навукі сістэматычна абменьваюцца вопытам і сваімі навуковымі дасягненнямі. З гэтай мэтай, напрыклад, у Інстытут фізікі і матэматыкі АН БССР прыязджаў кіраўнік аддзела праграмірования і эксплуатацыі вылічальных ма-

шын Чэхаславацкай Акадэміі навук. У сваю чаргу Пражскі інстытут ядзернай фізікі і Інстытут матэматычных машын наведалі акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка і намеснік дырэктара Інстытута фізікі і матэматыкі Акадэміі навук БССР Н. А. Барысевіч.

Шырокія творчыя сувязі з 1959 года ўстанавіліся паміж Беларускім навукова-даследчым інстытутам торфу і такім жа інстытутам у г. Расток (ГДР). Вучоныя абедзвюх навуковых устаноў распрацавалі план навуковага супрацоўніцтва, які прадугледжвае ўзаемную інфармацыю аб стане і перспектывах народнагаспадарчага выкарыстання торфу і каардынацыі работы інстытутаў.

Адной з форм навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі з'яўляецца сумеснае правядзенне канферэнцый і нарад па актуальных пытаннях навукі і тэхнікі. Прадстаўнікі братніх краін абменьваюцца на іх навукова-тэхнічнымі дасягненнямі і творчым вопытам, выступаюць з навуковымі дакладамі па праблемных пытаннях.

У апошнія гады ў Мінску праведзена некалькі такіх нарад і навуковых канферэнцый. У рабоце канферэнцыі па цепла- і масаабмену, якая праходзіла ў маі 1964 года, прымалі ўдзел вучоныя Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Югаславіі. У чэрвені 1962 года па рашэнню камітэта па хімічнай прамысловасці Савета Эканамічнай Узаемадапамогі ў сталіцы Беларусі праходзіла навукова-тэхнічная нарада па калійных солях. У рабоце яе ўдзельнічалі спецыялісты Польшчы, Румыніі, ГДР, Савецкага Саюза.

Больш шырокай і прадстаўнічай была навукова-каардынацыйная нарада ў верасні 1964 года. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі шасці краін — удзельніц Савета Эканамічнай Узаемадапамогі (Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, ГДР і СССР). У гэтым жа годзе ў Мінску адбыліся міжнародны сімпозіум і навукова-тэхнічны савет, у рабоце якіх прынялі ўдзел члены Савета і вучоныя-эксперты краін — членаў СЭУ, спецыялісты іншых навукова-даследчых інстытутаў, якія праявілі цікавасць да распрацоўваемай праблемы. Іх удзельнікі абмеркавалі пытанні сістэмы комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі кіравання вытворчасцю.

Такім чынам, Мінск у эканамічнае і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва сацыялістычных краін уносіць прыкметны ўклад. Гэта бескарыслівае, прасякнутае духам пралетарскага інтэрнацыяналізму супрацоўніцтва садзейнічае выкананню народнагаспадарчых задач, паскарае навукова-тэхнічны прагрэс усёй сусветнай сістэмы сацыялізма.

У апошнія гады вялікую цікавасць да навукова-тэхнічных дасягненняў сталіцы Беларусі пачалі праяўляць капіталістычныя краіны.

У 1959—1965 гадах Мінск наведалі многія спецыялізаваныя групы і асобныя прадстаўнікі розных фірм, навукова-даследчых інстытутаў Англіі, Даніі, Францыі, Італіі, Японіі, ФРГ, Швецыі, ЗША, Грэцыі, Канады і Турцыі. Большасць прадстаўнікоў капіталістычнага свету знаёмілася з перадавымі прамысловымі прадпрыемствамі і тэхнічнымі навукова-даследчымі інстытутамі. Амерыканскага вучонага прафесара Ф. Лепеля, які наведаў Мінск у 1963 годзе, цікавіла, напрыклад, работа лабараторый парашковай металургіі на заводзе «Ударнік» і ў Беларускім політэхнічным інстытуце. Група спецыялістаў па электроніцы, што ўзначальваў саветнік прэзідэнта ЗША па навуцы Д. Ходзінгал, азнаёмілася з дасягненнямі ў галіне радыётэхнікі, а прадстаўнікі мяса-малочных амерыканскіх фірм — з перапрацоўкай малака і вытворчасцю малочных прадуктаў на Мінскім малочным камбінаце.

Вучоных ФРГ і Фінляндыі цікавіла пастаноўка навукова-даследчай работы ў галіне торфу. Яны наведалі Інстытут торфу АН БССР, азнаёміліся з яго лабараторыямі. У красавіку 1963 года Генеральны дырэктар міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі Сігвард Эклунг, які прыехаў у СССР па запрашэнню Дзяржаўнага камітэта па выкарыстанню атамнай энергіі, наведаў атамны рэактар Акадэміі навук БССР. Спецыялісты з Англіі, якія неаднаразова наведвалі Мінск, знаёміліся галоўным чынам з дасягненнямі ў галіне радыёэлектронікі і станкабудавання.

У чэрвені 1964 года ў Мінску знаходзілася італьянская эканамічная дэлегацыя, у складзе якой былі цэнтральны тэхнічны дырэктар і дырэктар адміністрацыйнага кіраўніцтва фірмы «Монтакаціні», Генеральны дырэктар фірмы «Сейфа», камерцыйны дырэктар фірмы «Сачыента-Эдысон» і іншыя прадстаўнікі дзелавых італьянскіх колаў.

Навукова-тэхнічныя сувязі Мінска з капіталістычнымі краінамі, несумненна, з'яўляюцца ўзаемавыгаднымі. Яны не толькі садзейнічаюць эканамічнаму развіццю нашых краін, але і ўзаемаразуменню, збліжэнню народаў.

Мінск аказвае значную тэхнічную дапамогу эканамічна слабаразвітым краінам Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Дапамога гэта ажыццяўляецца ў розных напрамках. Спецыялісты мінскіх прадпрыемстваў прымаюць актыўны ўдзел у будаўніцтве прамысловых аб'ектаў, якое вядзецца ў гэтых краінах з дапамогай Савецкага Саюза, дапамагаюць у падрыхтоўцы нацыянальных тэхнічных кадраў, перадаюць свой вытворчы вопыт. Яны аказваюць дапамогу ў эксплуатацыі новых машын. Напрыклад, намеснік галоўнага канструктара трактарнага завода А. С. Шастапалаў ездзіў у Егіпет і Афганістан, інжынер М. Т. Мерзлякоў амаль два гады знаходзіўся ў Індыі і г. д.

Нямала спецыялістаў для краін Азіі і Афрыкі было падрыхтавана непасрэдна на прадпрыемствах Мінска. Так, у 1962 годзе на тракторным заводзе прайшла практыку група спецыялістаў з Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, на тым жа заводзе вывучалі трактар індыйскія механізатары.

Навукова-тэхнічную дапамогу эканамічна слабаразвітым краінам аказвае Мінск і па лініі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У 1964 годзе, напрыклад, прайшлі навучанне на Мінскай гідраметэаралагічнай абсерваторыі спецыялісты-стыпендыяты ААН з Афганістана. На тракторным заводзе і камбінаце будаўнічых матэрыялаў таксама па лініі ААН павышалі кваліфікацыю спецыялісты розных іншых краін.

У жніўні — кастрычніку 1962 года ў сталіцы Беларусі праходзіў міжнародны семінар па вырабу малочных прадуктаў для спецыялістаў малочнай прамысловасці Індыі, Непала, ААР, Ірана, Турцыі і Югаславіі. Такі ж семінар па просьбе ФАО (харчовай арганізацыі ААН) быў праведзен у Мінску ў 1964 годзе. У яго рабоце прынялі ўдзел спецыялісты малочнай прамысловасці дзесяці краін Азіі, Афрыкі і Еўропы. На працягу двух месяцаў стыпендыяты ААН слухалі курс лекцый па мікрабіялогіі і біялогіі малака, а таксама па тэхналогіі вырабу кісламалочных прадуктаў, праходзілі практыку на малакакамбінаце і іншых прадпрыемствах мяса-малочнай прадукцыі рэспублікі.

Удзельнікі семінара выказалі многа цёплых слоў у адрас працоўных Мінска. «Павінен сказаць,— заявіў удзельнік семінара з ААР Аміль эль-Рыфан,— што нідзе ў капіталістычных краінах перад намі не раскрывалі да канца таго, што называюць сакрэтамі фірмы, г. зн. тэхналагічнымі працэсамі. Тут жа ад нас не было ніякіх сакрэтаў. Наадварот, усе імкнуліся, каб мы як можна больш паўней авалодалі іх вопытам. На семінары ўстанавілася абстаноўка дружбы і супрацоўніцтва. Я на працягу двух месяцаў не адчуваў сябе чужаземцам».

Высокую ацэнку арганізацыі работы семінара даў начальнік аддзела ФАО Ганс Педзерсен. Выступаючы перад удзельнікамі семінара, ён сказаў: «Усе мы павінны быць удзячны беларусам, якія ахвотна, без якіх-небудзь сакрэтаў перадаюць свой вопыт. Гэты вопыт вельмі павучальны».

У жніўні 1964 года ў Мінску праходзіў двухтыднёвы міжрэгіянальны семінар ААН па сацыяльных аспектах індустрыялізацыі, у якім удзельнічалі 20 краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. У дружалюбнай абстаноўцы ўдзельнікі семінара абмеркавалі шырокае кола праблем, якія звязаны з сацыяльнымі вынікамі індустрыялізацыі. Яны таксама азнаёміліся з выдатнасцямі беларускай сталіцы, наведалі прамысловыя прадпрыемствы, навуковыя ўстановы,

ВНУ, школы, бальніцы і месцы адпачынку працоўных у ваколіцах Мінска.

У зарубежных гасцей сталіца рэспублікі выклікала захапленне. «Тут у Мінску,— гаварыў калумбіец Хорхе Бетанкур,— на мяне ўсё робіць вялікае ўражанне». А цэйлонец А. Махідзін сказаў: «Але самае выдатнае — гэта людзі. Яны вельмі дружалюбныя і чулыя, выгляд у іх здаровы і жыццерадасны. Гэта сведчыць аб высокім жыццёвым узроўні».

Усебаковая навукова-тэхнічная дапамога працоўных Мінска, як і ўсяго савецкага народа, эканамічна слабаразвітым краінам Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі садзейнічае ўздыму іх эканомікі, павышэнню дабрабыту насельніцтва і ліквідацыі цяжкіх вынікаў каланіяльнага прыгнёту.

2. Культурнае супрацоўніцтва

Важнае месца ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва побач з эканамічным займаюць культурныя сувязі Мінска з зарубежнымі краінамі. Сувязі гэтыя ахопліваюць усе бакі грамадскага і культурнага жыцця: літаратуру, мастацтва, асвету, спорт, ахову здароўя і г. д. Яны ажыццяўляюцца ў форме ўзаемнага абмену дэлегацыямі партыйных і дзяржаўных органаў, прафсаюзных, кааператыўных, маладзёжных і спартыўных арганізацый, мастацкіх калектываў. Па лініі Міністэрства культуры БССР, Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замяжой з многімі краінамі свету вядзецца ўзаемавыгадны абмен рознымі выстаўкамі, кінафільмамі, радыёпраграмамі і творчымі паездкамі дзеячаў мастацтва. Шырока ажыццяўляецца перапіска паміж многімі асобамі і калектывамі, школамі, прадпрыемствамі, ВНУ і ўстановамі Мінска і зарубежных краін.

Распаўсюджанай формай міжнародных культурных сувязей з'яўляецца таксама правядзенне вечароў дружбы, дэкад культуры і святкаванне знамянальных дат. Шляхам асабістых кантактаў вучоных, іх удзелу ў міжнародных кангрэсах, сумеснай распрацоўкі асобных навуковых праблем, кнігаабмену ажыццяўляюцца міжнародныя навуковыя сувязі даследчых устаноў і Акадэміі навук БССР, ВНУ, бібліятэк Мінска. Шырока выкарыстоўваюцца і такія формы культурных сувязей з замяжой, як пераклад і выданне твораў беларускай літаратуры за рубяжом і замежнай літаратуры ў Мінску, навучанне ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах беларускай сталіцы моладзі многіх краін свету.

У першыя гады пасля вайны культурны абмен Мінска, як і эканамічныя сувязі, з зарубежнымі краінамі не атрымаў шырокага раз-

віцця. Больш паспяхова ён пачаў ажыццяўляцца ў сярэдзіне 50-х гадоў. Ужо ў 1956 годзе колькасць зарубежных дэлегацый, наведаўшых Беларусь і яе сталіцу, узрасла ў параўнанні з 1952 годам з 15 да 45, а да канца дзесяцігоддзя павялічылася да 145. На працягу сямі год, з 1956 па 1962, колькасць краін, з арганізацыямі якіх грамадскасць Мінска падтрымлівае ўсебаковыя культурныя сувязі, узрасла з 22 да 44. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі гістарычныя рашэнні XX і наступных з'ездаў нашай партыі, якія ўказалі на неабходнасць расшырэння міжнароднага супрацоўніцтва як аднаго з важных фактараў ва ўстанаўленні дружбы і ўзаемаразумення паміж народамі. Культурныя кантакты Мінска з зарубежнымі краінамі ажыццяўляюцца на падставе штогодніх і шматгадовых дагавораў і пагадненняў, заключаных паміж Савецкім Саюзам і замежнымі дзяржавамі. У рэалізацыі іх немалая роля належыць Беларускаму таварыству дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, якое было створана ў 1958 годзе на базе раней існаваўшага Беларускага таварыства культурных сувязей.

Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей падтрымлівае цесныя кантакты з такімі ж арганізацыямі за рубяжом, абменьваецца з імі рознай літаратурай, перыядычнымі выданнямі, фотападборкамі і фотавыстаўкамі, грамзапісамі, дакументальнымі кінафільмамі і іншымі інфармацыйнымі і даведчымі матэрыяламі. Таварыства ажыццяўляе абмен рознымі дэлегацыямі, творчымі і мастацкімі калектывамі, дзеячамі культуры, арганізуе фотавыстаўкі, вечары дружбы і іншыя культурныя мерапрыемствы. Беларускае таварыства дружбы актыўна садзейнічае ўстанаўленню дружалюбных адносін, духу ўзаемаразумення і развіццю дзелавых кантактаў паміж народамі. Кантакты гэтыя з кожным годам пашыраюцца, мацнеюць, робяцца пастаяннымі і ўзаемавыгаднымі. У 1964 годзе, напрыклад, колькасць краін, з якімі таварыства культурнай сувязі падтрымлівала культурныя адносіны, павялічылася ў параўнанні з 1956 годам з 22 да 33, а колькасць арганізацый з 40 да 141.

Асабліва паспяхова развіваюцца культурныя сувязі Мінска з братнімі сацыялістычнымі краінамі. Сувязі гэтыя будуюцца на прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму, узаемадапамогі і дружбы, раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага абмену ўсімі культурнымі каштоўнасцямі і дасягненнямі ў галіне навукі. Такія кантакты ў значнай меры ўзбагачаюць нацыянальныя культуры братніх народаў, садзейнічаюць далейшаму паспяховаму росквіту навукі, літаратуры і мастацтва ўсіх народаў сацыялістычных краін.

Для азнаямлення з дасягненнямі беларускага народа ў галіне культуры, абмену вопытам у камуністычным і сацыялістычным будаўніцтве Мінск штогод наведваюць прадстаўнікі партыйных і дзяр-

жаўных органаў, дзесяткі розных арганізацый і творчых калектываў з краін народнай дэмакратыі. Усім ім дзесяцігоддзямі шырокія магчымасці знаёміцца з жыццём і поспехамі працоўных беларускай сталіцы, бываць у гарадах і вёсках, на фабрыках і заводах рэспублікі.

За пасляваенныя гады Мінск наведалі вядомыя дзяржаўныя дзеячы і кіраўнікі камуністычных і рабочых партый сацыялістычных краін: Уладзіслаў Гамулка, Тодар Жыўкаў, Георгі Трайкаў, Антанін Новаціны, Ю. Цэдэнбал, Вальтэр Ульбрыхт, Іосіп Броз Ціта, а таксама прадстаўнікі парламентаў Польскай Народнай Рэспублікі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Венгерскай Народнай Рэспублікі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Рэспублікі Куба і іншыя. І дзе б ні з'яўляліся прадстаўнікі брацкіх краін, будзь гэта на фабрыках, заводах або навучальных установах ці ў іншых арганізацыях, усюды іх цёпла і сардэчна, як самых дарагіх гасцей, прымала грамадскасць беларускай сталіцы.

Незабыўнай, напрыклад, застанецца сустрэча рабочых Мінскага камвольнага камбіната з партыйна-ўрадавай дэлегацыяй МНР на чале з першым сакратаром ЦК МНРП, Старшынёй Савета Міністраў Мангольскай Народнай Рэспублікі Ю. Цэдэнбалам, якая адбылася ў час знаходжання яе ў Мінску ў красавіку 1965 года. У дружалюбнай і шчырай гутарцы рабочых з кіраўнікамі Мангольскай народна-рэвалюцыйнай партыі і дзяржавы мінскія камвольшчыкі расказалі аб сваіх поспехах, гісторыю стварэння гэтага буйнейшага ў рэспубліцы тэкстыльнага прадпрыемства. Яны выказалі задавальненне мацнеючай з году ў год брацкай дружбай савецкага і мангольскага народаў.

Гасцямі Мінска былі таксама многія кіраўнікі і прадстаўнікі камуністычных партый капіталістычных і незалежных краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. У 1961—1965 гадах у беларускай сталіцы гасцілі прадстаўнікі Камуністычнай партыі Францыі, Камуністычнай партыі Швецыі, Камуністычнай партыі Аўстрыі, Камуністычнай партыі Аўстраліі, Камуністычнай партыі Бельгіі, а таксама дэлегацыі камуністычных партый Італіі, ЗША, Канады, Даніі, Фінляндыі, Аргенціны, Бразіліі, Уругвая, Сальвадора, Мексікі, Перу і іншых краін. Прадстаўнікі брацкіх кампартый знаёміліся з горадам, наведалі заводы, дзіцячыя ўстановы, тэатры і музеі, гутарылі з рабочымі, цікавіліся іх жыццём, знаёміліся з вопытам работы партыйных органаў Кампартыі Беларусі і прафсаюзных камітэтаў рэспублікі. Усюды зарубежных камуністаў мінчане прымалі, як самых дарагіх сяброў.

Важнай формай культурных сувязей Беларускай ССР, у тым ліку і Мінска, з сацыялістычнымі дзяржавамі з'яўляецца правядзенне дэкад і дзён беларускай культуры ў краінах народнай дэмакратыі

і вдпаведна дэкад і дзён культуры гэтых краін у БССР. У гэты перыяд асабліва шырока ажыццяўляецца абмен тэатральнымі і музычнымі калектывамі, калектывамі мастацкай самадзейнасці і дэлегацыямі дзеячаў культуры, праводзяцца розныя выстаўкі, кінафестывалі, радыёвіктарыны, вечары дружбы, чытаюцца лекцыі і даклады.

Дні культуры ўзаемна знаёмяць шырокія масы Беларусі і краіны народнай дэмакратыі з жыццём і культурай братніх народаў, садзейнічаюць узаемаабагачэнню і ўзаемаўплыву нацыянальных культур. Мінск як сталіца Беларускай ССР займае асаблівае месца ў правядзенні гэтых масавых мерапрыемстваў. Так, у 1958 годзе ў Мінску праходзілі дні польскай культуры з удзелам групы вядомых артыстаў Польскай Народнай Рэспублікі, Познанскага хору хлопчыкаў і мужчын пад кіраўніцтвам С. Стулігроша.

Шырока дні польскай культуры былі праведзены ў Мінску ў лістападзе 1964 года ў сувязі з дваццацігоддзем ПНР. Для ўдзелу ў іх у Мінск прыязджаў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Польскай Народнай Рэспублікі Эдмунд Пшчулкоўскі з групай супрацоўнікаў пасольства, намеснік Міністра асветы ПНР Міхаіл Галлеўскі, дэлегацыя таварыства польска-савецкай дружбы, работнікі ЦК ПАРП і дзеячы культуры. У беларускай сталіцы таксама знаходзіўся Дзяржаўны народны ансамбль песні і танца «Шлёнск», канцэрты якога наведала больш чатырох тысяч мінчан.

У дні польскай культуры ў Мінску і рэспубліцы экспанавалася каля 150 розных выставак аб ПНР, сярод якіх асаблівую цікавасць у мінчан выклікалі выстаўкі польскай графікі і кнігі, праводзіліся літаратурныя і музычныя вечары, чыталіся лекцыі і даклады. У кінатэатры «Мір» адбываўся фестываль польскіх кінафільмаў. За некалькі дзён іх праглядзела каля 36 тысяч чалавек. Дні польскай культуры далі магчымасць грамадскасці Мінска шырока азнаёміцца з жыццём польскага народа, з дасягненнямі ПНР ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры і перш за ўсё з яе духоўнымі скарбамі.

У 1958 годзе ў Мінску шырока былі адзначаны тыдзень балгарскай музыкі і кінафільмаў, а ў Балгарыі — тыдзень беларускай музыкі і фестываль кінафільмаў. «Тыдзень беларускай музыкі і кіно,— пісала балгарская газета «Літаратурэн фронт»,— даў магчымасць нашаму народу бліжэй пазнаёміцца з культурнымі дасягненнямі беларускага народа. Гэта была сустрэча братніх славянскіх культур».

У 1959 годзе адбыўся ўзаемны абмен дэкадамі румынскай і беларускай культуры, у якіх прынялі ўдзел дзеячы культуры, творчыя і мастацкія калектывы, грамадскасць Мінска і Бухарэста.

У лістападзе 1962 года з вялікім поспехам у Мінску прайшлі дні чэхаславацкай культуры. На прадпрыемствах, у палацах культуры,

вышэйшых навучальных установах беларускай сталіцы праводзіліся вечары савецка-чэхаслававацкай дружбы, у школах — піянерскія ранішнікі, прысвечаныя дружбе савецкіх і чэхаслававацкіх піянераў і школьнікаў. У гарадскіх бібліятэках былі арганізаваны выстаўкі чэхаслававацкай кнігі, у кінатэатрах дэманстраваліся фільмы вытворчасці чэхаслававацкіх кінастудый. Беларускае радыё і тэлебачанне арганізавала серыю спецыяльных перадач аб Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, а таксама музычныя, дзіцячыя і літаратурныя перадачы чэхаслававацкіх пісьменнікаў і кампазітараў. Дні чэхаславацкай культуры ў Беларусі шырока асвятляліся ў рэспубліканскім і абласным друку.

Жывую цікавасць выклікалі ў мінчан дні венгерскай культуры, якія адбыліся ў кастрычніку 1963 года, і дэкада балгарскай культуры, што праводзілася ў верасні — кастрычніку 1965 года. Гэтай падзеі былі прысвечаны многія культурныя мерапрыемствы, як та: фестываль венгерскіх і балгарскіх кінафільмаў, літаратурныя вечары, канцэрты, фотавыстаўкі і выстаўкі кніг, экспанатаў народнага і выяўленчага мастацтва. Не менш паспяхова прайшлі дні беларускай культуры ў Венгрыі ў 1964 годзе і дэкада беларускай культуры ў Балгарыі ў 1965 годзе. Венгерскія і балгарскія сябры мелі шырокую магчымасць азнаёміцца з беларускай музыкай, з тэатральным майстэрствам артыстаў сталіцы, дасягненнямі кінамастацтва, з выстаўкамі твораў беларускіх мастакоў, графікаў, выстаўкамі кнігі, мастацкай фатаграфіі і экспанатамі народнай творчасці.

У апошнія гады абмен выстаўкамі і галоўным чынам фотавыстаўкамі пачаў шырока ажыццяўляцца паміж Мінскам і капіталістычнымі краінамі. Беларускае таварыства дружбы сістэматычна накіроўвае за рубеж фотападборкі, якія экспануюцца ў многіх гарадах капіталістычнага свету і знаёмяць шырокія колы яго насельніцтва з жыццём працоўных Мінска, з дасягненнямі беларускага народа. У Парыжы, Клермон-Феране, Туркуэне і іншых гарадах Францыі ў 1963 годзе, напрыклад, экспанаваліся фотавыстаўкі «Вялікі савецкі горад Мінск», «Мінскі оперны тэатр», «Мінскі завод аўтаматычных ліній» і інш.

Жыхары Ліона, Персана, Туркуэна, Труа, Раменвіля, Сен-Дэні і іншых французскіх гарадоў каля года (з снежня 1962 па кастрычнік 1963) знаёміліся з выстаўкамі беларускай народнай творчасці (разьба па дрэву, ткацтва, вышыўка, інкрустацыя), якія былі арганізаваны па просьбе Таварыства дружбы «Францыя — СССР». З гэтымі выстаўкамі таксама азнаёмілася грамадскасць рада гарадоў Італіі. Таварыства дружбы «Люксембург — СССР» у 1962 годзе на працягу месяца экспанавала фотавыстаўку «Мінскі гадзіннікавы завод». За апошнія тры гады з выстаўкамі, якія адлюстроўваюць развіццё Мін-

ска і беларускую народную творчасць, азнаёмілася насельніцтва многіх гарадоў Англіі, Францыі, Фінляндыі, Новай Зеландыі, Бельгіі, Індыі, Кіпра, Канады.

У сваю чаргу ў Мінску былі арганізаваны выстаўкі капіталістычных краін. Толькі ў 1964 годзе Беларускае таварыства дружбы атрымала з-за рубяжа 130 экземпляраў розных фотавыставак, якія экспанаваліся ў Мінску і іншых гарадах рэспублікі. Зарубежныя выстаўкі прыцягваюць увагу мінчан. Так, выстаўку канадскага фотаклуба Свенсана, што была адкрыта на працягу двух месяцаў у 1962 годзе, наведала больш 23 тысяч мінчан. У сталіцы ў 1963 годзе былі арганізаваны фотавыстаўкі амерыканскім фатаграфічным таварыствам і Маскоўскім домам дружбы з народамі зарубежных краін.

У Мінску таксама арганізуюцца выстаўкі выяўленчага мастацтва, дзіцячага малюнка, кнігі і іншыя, якія знаёмяць грамадскасць сталіцы з жыццём і культурай зарубежных краін. Мінчане з вялікай цікавасцю азнаёміліся з выстаўкамі твораў выяўленчага мастацтва Манчэсцерскага каледжа, прац фінскага скульптара Эсі Рэнвал, малюнкаў дзяцей з Японіі, Індыі і Новай Зеландыі, інданезійскага жывапісу, сучаснай італьянскай графікі.

Грамадскасць Мінска шырока адзначае нацыянальныя святы, знамянальныя падзеі ў жыцці народаў сацыялістычных краін, а таксама юбілейныя даты выдатных дзеячаў сусветнай культуры. У гэтыя дні ў сталіцы Беларусі праводзяцца ўрачыстыя вечары, чытаюцца лекцыі, арганізуюцца выстаўкі, канцэрты і іншыя культурныя мерапрыемствы, што садзейнічае больш шырокаму азнаямленню працоўных сталіцы з гісторыяй, жыццём і культурай братніх і іншых народаў. Шырока, напрыклад, у 1954 годзе адзначылі 10-годдзе, а ў 1964 годзе 20-годдзе Польскай Народнай Рэспублікі. Апрача ўрачыстых вечароў, цёплых і сардэчных сустрэч з польскімі сябрамі, у Мінску былі адкрыты выстаўкі, прысвечаныя ПНР за 10 і 20 год, усе газеты і часопісы друкавалі артыкулы і падборкі аб Народнай Польшчы, аб яе поспехах у гаспадарчым і культурным жыцці, у кінатэатрах дэманстраваліся польскія фільмы, у канцэртных залах гучала польская музыка, па радыё трансліраваліся перадачы аб Польшчы.

Урачыста таксама былі адзначаны гадавіны Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, Венгерскай Народнай Рэспублікі, Балгарскай Народнай Рэспублікі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, перамогі кубінскай рэвалюцыі і юбілейныя даты іншых сацыялістычных краін. Штогод у Мінску праводзяцца вечары дружбы, прысвечаныя падпісанню Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж Савецкім Саюзам і краінамі народнай дэмакратыі.

Традыцыяй у мінчан сталі мерапрыемствы, якія праводзяцца ў сувязі з юбілейнымі датамі выдатных дзеячаў сусветнай культуры. Так, у Мінску былі праведзены вечары, прысвечаныя жыццю і творчасці чэхаслававацкай пісьменніцы Бажэны Нямцовай, памяці Юліуса Фучыка, Элізы Ажэшка, Адама Міцкевіча, 80-годдзю з дня нараджэння чэшскага пісьменніка-рэвалюцыянера Яраслава Гашака. Шырока адзначаліся таксама юбілеі вялікага нямецкага паэта Генрыха Гейнэ, выдатнага амерыканскага вучонага Л. Бербанка, вядомага нарвежскага драматурга Г. Ібсэна, італьянскага кампазітара Джузепе Вердзі, англійскага драматурга і паэта Вільяма Шэкспіра, галандскага мастака Рэмбрандта і інш.

Паспяхова развіваюцца культурныя сувязі і па лініі Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Сталіца Савецкай Беларусі аказвае вялікую бескарыслівую дапамогу братнім народам сацыялістычнага лагера і незалежным краінам Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў падрыхтоўцы кваліфікаваных нацыянальных кадраў. Пачынаючы з 1953 года ў сярэдніх спецыяльных і галоўных навучынам у вышэйшых навучальных установах Мінска штогод навучаецца моладзь многіх краін розных кантынентаў свету. Разам з беларусамі і рускімі, палякамі і венграмі, немцамі і манголамі тут павышаюць свае веды студэнты гераічнай Кубы і змагаючагася В'етнама, пасланцы народаў, скінуўшых каланіяльны прыгнёт і стаўшых на самастойны шлях развіцця.

Колькасць замежных студэнтаў, што навучаюцца ў мінскіх вышэйшых навучальных установах, з кожным годам узрастае. У 1962 годзе яна дасягнула 165, а ў 1963 перавысіла 270 чалавек. У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, політэхнічным, медыцынскім і тэхналагічным інстытутах, у інстытуце народнай гаспадаркі, тэхнікумах сувязі і лёгкай прамысловасці ў 1964/65 навучальным годзе навучалася звыш 300 студэнтаў і аспірантаў з 28 краін. Сярод іх прадстаўнікі Кубы, В'етнама, МНР, ГДР, ПНР, ВНР, Ганы, Бірмы, Гвінеі, Ірака, Нігерыі, Непала, Малі, Інданезіі, Конга, Танганьікі, Занзібара, Кеніі, Тога, Самалі, Паўднёва-Афрыканскага Саюза і іншых краін. Усе замежныя студэнты забяспечаны дзяржаўнымі стыпендыямі. Ім створаны неабходныя ўмовы для паспяховай вучобы. У перыяд летніх канікул многія зарубежныя студэнты мінскіх вышэйшых навучальных устаноў адпачываюць на базе спартыўна-аздараўленчага лагера Беларускага дзяржаўнага універсітэта і політэхнічнага інстытута на возеры Нарач і Мінскім моры. Для іх арганізуюцца таксама экскурсіі і турысцкія паездкі ў сталіцы саюзных рэспублік і іншыя гарады Савецкага Саюза.

У пасляваенны перыяд значна расшырыліся літаратурныя сувязі Мінска з зарубежнымі краінамі. Асабліва паспяхова яны развіваюц-

ца з краінамі народнай дэмакратыі. Многія творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, М. Танка, М. Лынькова, П. Броўкі, П. Глебкі, А. Куляшова, Я. Брыля, І. Шамякіна, П. Панчанкі, П. Пестрака і іншых перакладзены і выдадзены на чэшскай, балгарскай, польскай, нямецкай, румынскай, венгерскай, карэйскай і іншых мовах. Беларуская літаратура ў краінах народнай дэмакратыі заваявала шырокую папулярнасць.

Прыцягвае да сябе ўвагу беларуская літаратура і ў капіталістычным свеце. Яна знаходзіць сабе чытача ў Фінляндыі, Бельгіі, Канадзе, Іране, Індыі і іншых краінах. Больш чым у 40 краінах перакладзены і выдадзены літаратурныя творы больш 20 беларускіх аўтараў.

У той жа час у Мінску, як і ва ўсёй рэспубліцы, шырока вядома зарубежная літаратура. На беларускую мову перакладзены і выдадзены многія творы польскіх, чэшскіх, балгарскіх, румынскіх, нямецкіх, індыйскіх, англійскіх, італьянскіх і іншых пісьменнікаў краін свету.

Такім чынам, міжнародныя літаратурныя сувязі Мінска ажыццяўляюцца досыць паспяхова і плённа. Яны не толькі ўзаемна знаёмяць з жыццём, з лепшымі дасягненнямі нацыянальных культур, але і садзейнічаюць далейшаму развіццю гэтых культур.

З кожным годам шырыцца і такі від культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, як абмен мастацкімі калектывамі, канцэртнымі групамі і асобнымі дзеячамі мастацтва. Грамадскасць беларускай сталіцы мела магчымасць азнаёміцца з дасягненнямі тэатральнага мастацтва многіх краін свету. У Мінску выступалі мастацкія калектывы, вядомыя дзеячы тэатральнага і музычнага мастацтва ўсіх сацыялістычных і рада капіталістычных краін. З вялікім поспехам, напрыклад, праходзілі выступленні артыстаў і музыкантаў Чэхаславакіі і Венгрыі, Польшчы і Югаславіі, Румыніі і Балгарыі, выступленні артыстаў ансамбля песні і танца Народнай Арміі Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, а таксама асобных тэатральных дзеячаў іншых сацыялістычных краін.

Цёпла сустракалі мінчане выступленні харавога ансамбля Аберлінскага каледжа (ЗША) і амерыканскага камернага аркестра «Кларыон-Канцэртс», артыстаў грэчаскай эстрады і Генуэзскага драматычнага тэатра, артыстаў Аргенціны і Канады, Францыі і Фінляндыі, Мексікі і Бразіліі, Галандыі і Швецыі, Гвінеі і Швейцарыі, Ісландыі і Ізраіля, Бірмы і Чылі, якія адбыліся ў розны час 50—60-х гадоў у беларускай сталіцы.

Незабыўнымі для жыхароў Мінска застануцца выступленні ў маі 1964 года калектыву артыстаў «Спяваючыя галасы Японіі», якім дырыжыравала лаўрэат міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» Акіка Сэкі. З выключным майстэрствам

калектыў выконваў песні не толькі свайго народа, але і іншых краін свету, у тым ліку і песні савецкіх кампазітараў. Японскія артысты прадэманстравалі высокую культуру харавога спявання, заваяваўшы тым самым заслужаную павагу і сімпатыі працоўных Мінска.

Аматары музыкі, тэатральнага мастацтва сардэчна віталі выступленні на мінскай сцэне вядомага амерыканскага піяніста Вана Клі-берна, фінскай балерыны Эльзы Сільверсценван і салісга Хельсінскага опернага тэатра Вейка Цюрвейнен, выдатную перуанскую спявач-ку Іму Сумак, аўстралійскага музыканта Мары Верыл Кімбер і інш.

Добра вядомы мінчанам таксама зарубежныя артысты цыркавога мастацтва. На арэне Мінскага цырка не адзін раз выступалі артысты Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Францыі і іншых краін. Асабліва вялікай папулярнасцю ў мінскага гледача карыстаюцца артысты польскага цырка «Варшава». Майстэрства гэтага выдатнага цыркавога калектыву атрымала высокую ацэнку грамадскасці беларускай сталіцы. У 1962 годзе гэты калектыў быў удастоен Ганаровай граматы Міністэрства культуры БССР і Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры. З вялікім поспехам у ліпені 1964 года ў сталіцы Беларусі прайшлі выступленні зборнага цыркавога калектыву «Агні дружбы» з удзелам артыстаў цыркаў Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Польшчы, Манголыскай Народнай Рэспублікі і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

У той жа час за рубяжом шырокай папулярнасцю карыстаюцца беларуская музыка і тэатральнае мастацтва. Артысты Беларускага ансамбля песні і танца, Дзяржаўнай капэлы і Дзяржаўнага ансамбля танца Беларускай ССР неаднаразова выступалі на сцэне зарубежных тэатраў, дэманстравалі свае дасягненні ў гэтай галіне мастацтва. Выступленні беларускіх артыстаў і мастацкіх калектываў карысталіся вялікім поспехам у Венгрыі, Балгарыі, Румыніі, Польшчы, Францыі, Фінляндыі, Швецыі, Італіі, Турцыі і іншых краінах. Калектыў Дзяржаўнага ансамбля танца Беларускай ССР, напрыклад, будучы на гастролях у Чэхаславакіі ў 1961 годзе, пакарыў сваім майстэрствам чэхаславацкага гледача. Яго выступленні ў Празе, Браціславе, Брно, Астраве, Пльзене, Бранска-Быстрацэ і іншых гарадах Чэхаславакіі выклікалі захапленне, аб чым пісаў чэхаславацкі друк. Высокую ацэнку майстэрства гэтага калектыву дала газета «Рудэ права». «Госці з Савецкага Саюза,— пісала яна,— пакарылі сваім мастацтвам сэрцы і заваявалі ўдзячнасць нашага народа». З майстэрствам артыстаў беларускай сцэны пазнаёміліся таксама народы Блізкага Усхода. З вялікім поспехам у верасні 1963 года прайшлі гастролі Дзяржаўнага ансамбля танца Беларускай ССР у Сірыі і Ліване. На працягу 22 дзён знаходжання ў гэтых краінах беларускі маладзёжны

калектыў ансамбля даў 15 канцэртаў, у тым ліку адзін на сцэне міжнароднага Дамаскага кірмашу. Цёпла і сардэчна сустрэлі беларускіх артыстаў жыхары Дамаска, Алепа, Бейрута і іншых гарадоў Сірыі і Лівана. Адна з ліванскіх газет у рэдакцыйнай карэспандэнцыі пісала: «Савецкія людзі пасылаюць нам ансамблі танцаў і песень, ня-суць радасць нашаму народу, кветкі дружбы. Такія калектывы аказваюць нам дапамогу ў развіцці мастацтва. Зараз горад нас — беларускі ансамбль. Гэты ансамбль прыехаў да нас з місіяй «Дружба — мастацтва».

Паміж Мінскам і зарубежнымі краінамі паспяхова развіваюцца навуковыя сувязі. Яны ажыццяўляюцца галоўным чынам шляхам узаемных паездак вучоных для азнаямлення з пастаноўкай і арганізацыяй навуковай работы, з дасягненнямі навукі і абмену вопытам работы, а таксама для стажыроўкі і практыкі. Паміж вучонымі беларускай сталіцы і зарубежных краін практыкуецца ўзаемаабмен друкаванай прадукцыяй і навуковай інфармацыяй. Дзеячы навукі прымаюць удзел у міжнародных і нацыянальных навуковых кангрэсах, нарадах і канферэнцыях, у радзе выпадкаў сумесна распрацоўваюць навуковыя праблемы.

Асабліва цеснае супрацоўніцтва ў галіне навукі існуе паміж даследчымі інстытутамі Акадэміі навук БССР, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Мінска і навуковымі ўстановамі сацыялістычных краін.

Шырокі ўзаемны абмен навуковымі дасягненнямі ажыццяўляюць, напрыклад, Інстытут біялогіі АН БССР і навукова-даследчыя ўстановы Румыніі. З гэтай мэтай Румынскую Сацыялістычную Рэспубліку наведаў акадэмік М. В. Турбін. Ён пазнаёміўся з арганізацыяй і навуковай дзейнасцю інстытута сельскай гаспадаркі, інстытута эндакрыналогіі, румына-савецкага інстытута Акадэміі РСР, біялагічнага факультэта Бухарэсцкага універсітэта, агранамічнага інстытута, батанічнага сада, садова-вінаградчай станцыі і іншых навуковых устаноў. У парадку ўзаемнай дапамогі і абмену вопытам навуковай работы акадэмік М. В. Турбін неаднаразова выступаў у Румыніі з навуковымі дакладамі.

У гэты ж час румынскія вучоныя таксама наведвалі Мінск, дзе знаёміліся з дасягненнямі сваіх беларускіх калег у галіне навукі. У 1962—1963 гадах у аддзеле генетыкі і цыталогіі праходзіла стажыроўку па генетыцы раслін супрацоўніца Інстытута біялогіі Акадэміі навук РСР А. Міхайлеску. Яна асвоіла рад генетычных і цыталагічных методык, азнаёмілася з працамі па праблеме гетэрозіса, з прынцыпамі і метадамі селекцыі на камбінацыйную здольнасць, вывучала метад дысперсійнага аналізу. Вучоныя Румыніі праявілі вялікую цікавасць да навуковых прац акадэміка АН БССР Г. М. Годнева ў га-

ліне фотасінтэзу, к даследаванням па фізіялогіі росту і развіцця раслін на тарфяна-балотных глебах і аб ужыванні радыеактыўных ізатопаў у вывучэнні будовы і біясінтэзу хларафілу.

Інстытут гісторыі АН БССР ужо шмат год плённа супрацоўнічае з Інстытутам гісторыі Польскай Акадэміі навук. Абедзве навуковыя ўстановы сістэматычна абменьваюцца навуковымі выданнямі, узаемнымі паездкамі вучоных з мэтай азнаямлення з навукова-даследчай работай і збору архіўных матэрыялаў, прымаюць удзел у абмеркаванні і рэцэнзаванні падрыхтаваных да выдання навуковых прац. На працягу некалькіх год гісторыкі Беларускай і Польскай акадэмій навук разам з Інстытутам славяназнаўства АН СССР і іншымі навуковымі ўстановамі Савецкага Саюза падрыхтавалі і выдалі ў 1965 годзе зборнік дакументаў аб паўстанні 1863 года.

У пасляваенныя гады Інстытут гісторыі АН БССР наведалі многія гісторыкі Польскай Народнай Рэспублікі. У ім пабывалі вядомыя вучоныя Г. Яблонскі і Г. Лоўмяньскі, Е. Вісьнеўскі і Е. Ахманьскі, Е. Антановіч і іншыя. Двойчы, у 1963 і 1964 гадах, госцем інстытута быў дырэктар бюро навуковага супрацоўніцтва з замяжой Польскай Акадэміі навук доктар Браніслаў Лугоўскі. У сваю чаргу гісторыкі члены-карэспандэнты АН БССР Н. В. Каменская, І. С. Краўчанка і іншыя неаднаразова наведалі інстытут гісторыі, навуковыя таварыствы і ўстановы Польскай Народнай Рэспублікі.

Цеснае супрацоўніцтва існуе таксама паміж вучонымі іншых навуковых устаноў Мінска і краін народнай дэмакратыі. Беларускія і польскія мовазнаўцы, напрыклад, у 1963 годзе сумесна выдалі «Польска-беларускі слоўнік». Зараз яны рыхтуюць да выдання «Беларуска-польскі слоўнік». Па запрашэнню Польскай Акадэміі навук навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства АН БССР М. В. Бірыла два гады чытаў курс лекцый па беларускай мове ў Варшаўскім універсітэце і разам з польскімі моваведамі ўдзельнічаў у дыялекталагічных экспедыцыях па вывучэнню народных гаворак на тэрыторыі Польшчы. Беларускія вучоныя сумесна з польскімі, чэшскімі і балгарскімі вучонымі-моваведамі па адзінай праграме працуюць над падрыхтоўкай агульнаславянскага лінгвістычнага атласа і слоўніка лінгвістычнай тэрміналогіі.

Паспяхова развіваюцца сувязі паміж Мінскім медыцынскім інстытутам і Варшаўскай, Беластокскай, Кракаўскай і Шчэцінскай медыцынскімі акадэміямі, Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна і Варшаўскім універсітэтам і Югаслаўскім універсітэтам у Любляне, Беларускім політэхнічным інстытутам і Беластоцкай інжынернай школай.

Расшыраюцца навуковыя кантакты вучоных Мінска і капіталістычных краін, а таксама з незалежнымі краінамі Азіі, Афрыкі

і Лацінскай Амерыкі. Для азнаямлення з навуковымі даследаваннямі і вывучэння навуковых дасягненняў у беларускую сталіцу ў 1955—1964 гадах прыязджалі вучоныя Англіі, Францыі, Японіі, ЗША, Індыі, Ганы, ФРГ, Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, Уругвая і іншых краін. З гэтай мэтай у 1963 годзе толькі навуковыя ўстановы Акадэміі навук БССР наведалі 40 зарубежных вучоных. У наступным годзе колькасць замежных вучоных, наведаўшых навукова-даследчыя ўстановы Беларускай Акадэміі навук, павялічылася да 43. Апрача таго, 36 зарубежных вучоных, якія з'яўляліся ўдзельнікамі II Усесаюзнай нарады па цепла- і масаабмену, што праходзіла ў Мінску ў маі 1964 года, азнаёміліся з пастаноўкай навуковай работы і яе дасягненнямі ў Інстытуце цепла- і масаабмену АН БССР. З кожным годам павялічваецца колькасць беларускіх вучоных, што наведваюць зарубежныя краіны. Так, калі ў 1957 годзе навуковыя ўстановы за мяжой наведалі 12 супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР, то ў 1963 годзе колькасць іх узрасла да 37.

Важнай формай навуковых сувязей з'яўляюцца міжнародныя і нацыянальныя канферэнцыі, сімпозіумы і кангрэсы, у рабоце якіх вучоныя беларускай сталіцы прымаюць актыўны ўдзел. Так, у 1955 годзе група вядучых вучоных устаноў Мінска на чале з прэзідэнтам Акадэміі навук БССР В. Ф. Купрэвічам удзельнічала ў рабоце Жэнеўскай міжнароднай канферэнцыі па выкарыстанню атамнай энергіі ў мірных мэтах. Для ўдзелу ў рабоце Міжнароднай канферэнцыі 59 краін па ўжыванню радыеізатопаў у навуковых даследаваннях, якая адбылася ў лістападзе 1957 года ў Парыжы, і рабоце V Міжнароднага кангрэсу геолагаў 33 краін па вывучэнню чацвярцічнага перыяду, што праходзіў у жніўні — верасні 1957 года ў Мадрыдзе — Барселоне (Іспанія), выязджалі В. Ф. Купрэвіч, В. І. Вейнік, К. І. Лукашоў, А. А. Шлык. Член-карэспандэнт АН БССР І. С. Краўчанка прымаў удзел у рабоце Міжнароднага кангрэсу сацыялогіі ў Галандыі (1956), Міжнароднай канферэнцыі гісторыкаў у Берліне (1959), III Міжнароднага кангрэсу еўрапейскага супраціўлення ў Чэхаславакіі (1963). У апошнім кангрэсе, які быў прысвечан абмеркаванню палітычных і эканамічных аспектаў гітлераўскай акупацыі, форм і метадаў фашысцкага тэрору і развіцця вызваленчай вайны ў краінах Еўропы, прымаў удзел таксама В. Ф. Раманоўскі. Ён жа ўдзельнічаў у рабоце Міжнароднага калёквіуму, прысвечанага 25-годдзю з часу здрадніцкай мюнхенскай змовы імперыялістычных дзяржаў.

Апрача таго, вучоныя Акадэміі навук БССР прымалі ўдзел у рабоце XX сесіі Міжнароднага геалагічнага кангрэсу ў Мексіцы, V Міжнароднага з'езду славістаў у Сафіі, Міжнароднага кангрэсу па фотабіялогіі ў Аксфордзе, IV Міжнароднага кангрэсу па каталізу ў Амстэрдаме, Міжнароднага кангрэсу па антыбіётыкам у Празе

і многіх іншых навуковых мерапрыемствах. Толькі ў 1964 годзе ў рабоце міжнародных навуковых канферэнцый і кангрэсаў прынялі ўдзел 16 вучоных АН БССР. У рабоце міжнародных і нацыянальных канферэнцый па народнай адукацыі ўдзельнічалі дзеячы асветы сталіцы Беларусі. Для гэтага яны наведалі Фінляндыю. Швейцарыю, Балгарыю, Венгрыю, ГДР, Польшчу, Румынію і іншыя краіны.

Вялікае месца ў навуковых і культурных сувязях Мінска з зарубежнымі краінамі займае кнігаабмен. Навуковыя ўстановы, бібліятэкі і іншыя культурныя арганізацыі беларускай сталіцы вядуць абмен навуковай, мастацкай, сацыяльна-эканамічнай, даведчай і іншай літаратурай з усімі краінамі народнай дэмакратыі і многімі навуковымі і культурнымі ўстановамі капіталістычных дзяржаў, незалежных краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Адна толькі Фундаментальная бібліятэка Акадэміі навук БССР у 1956 годзе ажыццявіла кнігаабмен з 108 бібліятэкамі і навуковымі ўстановамі 28 зарубежных краін. Абмен гэты з кожным годам пашыраецца, робіцца ўсё больш значным. Ужо ў 1964 годзе колькасць краін, з якімі бібліятэка АН БССР устанавіла сталыя сувязі, узрасла да 36, а лік навуковых устаноў і бібліятэк — да 276. Акадэмічная бібліятэка рэгулярна ва ўсе краіны і ўстановы, з якімі робіць кнігаабмен, высылае навейшыя выданні Акадэміі навук і ў сваю чаргу ад іх атрымлівае навуковыя кнігі, часопісы, даведчую і іншую літаратуру. Толькі ў 1963—1964 гадах яна атрымала па кнігаабмену з-за мяжы 15 245 экземпляраў і накіравала за рубеж 11 845 экземпляраў кніг.

Шырокі міжнародны абмен літаратурай і перыядычнымі выданнямі ажыццяўляе таксама Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Яно толькі на працягу 1956—1961 гадоў накіравала за рубеж 27 425 экземпляраў грамадска-палітычнай, мастацкай і іншай літаратуры, 8050 экземпляраў музычнай літаратуры і 5216 гадавых камплектаў перыядычных выданняў. За гэты час Таварыства дружбы атрымала з-за мяжы 8500 кніг і брашур, 3200 гадавых камплектаў газет і часопісаў, 1280 экземпляраў музычнай літаратуры.

Вялікая колькасць зарубежнай літаратуры і перыядычных выданняў паступае ў Мінск праз кнігагандлюючую сетку. Такім жа шляхам адпраўляецца і беларуская літаратура ў зарубежныя краіны. У 1964 годзе, напрыклад, літаратура, выдадзеная ў Беларусі, была накіравана ў 53 краіны свету агульным тыражом 290 тысяч экземпляраў.

У апошнія гады прыкметна пашырыліся міжнародныя спартыўныя сувязі Мінска. Асабліва паспяхова яны развіваюцца паміж спартсменамі беларускай сталіцы і краін народнай дэмакратыі, а таксама Фінляндыі, Швецыі, Японіі, Ісландыі, Аўстрыі, Федэратыўнай

Рэспублікі Германіі, спартсменамі незалежных краін Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Толькі ў 1961 годзе ў Мінску была праведзена 21 міжнародная сустрэча па спорту, у якіх прынялі ўдзел спартсмены Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Югаславіі, Румыніі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і іншых краін. У спартыўных залах і на стадыёнах Мінска ў 1961—1964 гадах адбываліся сустрэчы па вольнай барацьбе паміж камандамі БССР, Фінляндыі і Японіі, па футболу — паміж камандамі «Беларусь» і «Фрам» (Ісландыя), «Беларусь» і футбольнай камандай рэспублікі Малі, па скачках у ваду — паміж камандамі БССР, Аўстрыі, ФРГ, Мексікі і Швецыі, па тэнісу — між камандамі БССР і Фінляндыі.

Неаднаразова таварыскія сустрэчы і спартыўныя спаборніцтвы з удзелам мінскіх майстроў спорту праходзілі за рубяжом. Так, у 1962 годзе спартсмены Мінска прымалі ўдзел у міжнародных сустрэчах па воднаму пола ў Балгарыі, па валейболу і баскетболу — у Польшчы. Яны ж сустракаліся з сваімі партнёрамі на спартыўных пляцоўках Марока, Сенегала, Гвінеі, Фінляндыі.

Развітай формай культурных сувязей Мінска з зарубежнымі краінамі з'яўляецца турызм і абмен рознымі дэлегацыямі. Сталіцу Савецкай Беларусі штогод наведваюць тысячы турыстаў і дзесяткі прафсаюзных, рабочых, маладзёжных і іншых замежных дэлегацый. Гэты від сувязей асабліва паспяхова пачаў развівацца з канца 50-х гадоў, аб чым сведчаць звесткі аб колькасці іншаземцаў, якія пабывалі ў Мінску за гэты перыяд. Калі ў 1958 годзе сталіцу Беларусі наведала каля 4 тысяч іншаземцаў, то ў 1962 годзе колькасць іх дасягнула больш 34 тысяч чалавек.

З году ў год павялічваецца і колькасць краін, турысты якіх прыязджаюць знаёміцца з выдатнасцямі беларускай сталіцы. Толькі ў турысцкі сезон 1962 года Мінск і Мінскую вобласць наведалі турысты з 45 краін свету, у тым ліку Японіі і Венесуэлы, Мексікі і Уругвая, Аўстрыі і Бразіліі, Злучаных Штатаў Амерыкі і Ірана, Новай Зеландыі і многіх іншых краін. За ўвесь пасляваенны перыяд Мінск наведалі іншаземцы з 111 дзяржаў.

Зарубежныя дэлегацыі і перш за ўсё дэлегацыі з братніх сацыялістычных краін не толькі знаёмяцца з выдатнасцямі Мінска, з жыццём і культурай яго насельніцтва, але яны вывучаюць таксама арганізацыю працы, вопыт работы сталічных прадпрыемстваў, устаноў, дзяржаўных, партыйных і грамадскіх арганізацый. У верасні 1954 года, напрыклад, у Мінску знаходзілася польская дэлегацыя работнікаў навукі і культуры, Народных Саветаў і прафсаюзных арганізацый, якую ўзначальваў Генрых Яблонскі. Госці наведалі многія прамысловыя прадпрыемствы, знаёміліся з пастаноўкай там работы грамадскіх арганізацый, вывучалі работу навучальных, культурна-

бытавых, навуковых і дабрачынных устаноў. Для вывучэння вопыту работы мясцовых Саветаў у Мінск у кастрычніку 1963 года прыязджала дэлегацыя кіруючых работнікаў Польшчы, якую ўзначальваў намеснік Старшыні Савета Міністраў Польскай Народнай Рэспублікі Зенон Новак. Дэлегацыя польскіх сяброў азнаёмілася з работай Вярхоўнага Савета і мясцовых Саветаў Беларускай ССР, вывучала развіццё грамадскіх асноў у дзейнасці савецкіх органаў улады, рост эканомікі і культуры горада і рэспублікі. Госці з Польшчы азнаёміліся таксама з выдатнасцямі беларускай сталіцы, наведалі аўтамабільны завод і іншыя ўстановы Мінска. Вывучаць вопыт работы грамадскіх арганізацый сталіцы прыязджала таксама дэлегацыя прафсаюзаў польскіх настаўнікаў, дэлегацыя Прэзідыума Быдгашчцкага гарадскога Савета, партыйна-ўрадавая дэлегацыя Варшаўскага ваяводства, дэлегацыя прафсаюза рабочых лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці Польскай Народнай Рэспублікі і іншыя. Толькі ў 1963 годзе Мінск і рэспубліку наведалі 1000 пасланцоў братняй Польшчы.

У сваю чаргу ў Польскую Народную Рэспубліку неаднаразова выязджалі прадстаўнікі грамадскасці Мінска, кіруючыя работнікі рэспублікі. Так, у ліпені 1964 года ПНР наведала дэлегацыя партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх работнікаў у колькасці 67 чалавек. У выніку ўзаемнага абмену дэлегацыямі ўсталяваліся непасрэдныя сувязі паміж многімі калектывамі прадпрыемстваў, навучальных устаноў і арганізацый Польшчы і сталіцы Савецкай Беларусі.

Цесныя дружалюбныя сувязі ўсталяваліся таксама паміж грамадскасцю Мінска і працоўнымі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Манголіі, Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, рэспублікі Куба. Сталіцу Савецкай Беларусі наведалі дэлегацыі прафсаюзных работнікаў Венгерскай Народнай Рэспублікі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і іншых. У чэрвені 1963 года тры дні ў Мінску гасціла дэлегацыя прафсаюза работнікаў грамадскай дзейнасці Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, якую ўзначальваў намеснік Старшыні ЦК прафсаюза.

Госці з Югаславіі азнаёміліся з пастаноўкай у Мінску і рэспубліцы прафесіянальна-тэхнічнай асветы, арганізацыяй навучання без адрыву ад вытворчасці моладзі, што працуе на прадпрыемствах і ўстановах, наведалі прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча № 32, школу рабочай моладзі № 7, будаўнічы тэхнікум.

Працоўныя Мінска як дарагіх гасцей прымалі дэлегацыі Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі на чале з Дзьюла Калаі, Вен-

герскага камуністычнага саюза моладзі, Таварыства венгера-савецкай дружбы, навуковых работнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, будаўнікоў. З вялікай гасціннасцю ў 1963 годзе сустракалі мінчане дэлегацыю Адзінай партыі сацыялістычнай рэвалюцыі Кубы, якую ўзначальваў намеснік дырэктара Упраўлення школ рэвалюцыйнага выхавання Рэспублікі Куба Карлас Гансалес Эрэра. На працягу некалькіх дзён кубінскія сябры знаёміліся з жыццём працоўных сталіцы Савецкай Беларусі, наведалі рад прадпрыемстваў і навучальных устаноў горада.

Штогод Мінск наведваюць таксама розныя дэлегацыі капіталістычных краін. Так, у 1952 годзе ў сталіцы пабывалі рабочыя дэлегацыі Галандыі і Фінляндыі, дэлегацыі Славянскага Саюза Уругвая, Саюза нямецкай моладзі і іншыя. Усе яны бачылі грандыёзны размах жыллёвага будаўніцтва ў беларускай сталіцы, увачавідкі ўпэўніліся ў велізарных поспехах нашага народа ў камуністычным будаўніцтве, у шчырым імкненні савецкіх людзей жыць у міры і дружбе з усімі народамі свету.

Паездкі ў Мінск, у нашу краіну многім іншаземцам адкрываюць вочы на савецкую рэчаіснасць. Яны лепш пазнаюць праўду аб нашых людзях, аб іх планах на будучае, аб нашым грамадскім ладзе жыцця. Вось што піша аб паездцы французскіх турыстаў у Мінск і рэспубліку ў 1963 годзе сакратар камітэта Таварыства «Францыя — СССР» Дзюбуа: «Паездка выдатная, успаміны незабыўныя — такое ўражанне ўсіх 50 турыстаў... Дзесяткі французаў, якія амаль не ведалі Савецкага Саюза або мелі аб ім хлуслівыя ўяўленні, непасрэдна пазнаёміліся з вашай краінай, што ўсяліла ўпэўненасць у іх розумах і прымусіла зрабіць уласныя вывады накшталт заключэнням вучоных, якія вынікаюць з практыкі. Людзі з нашай групы з абурэннем успамінаюць пра абсурдныя рэчы, якія расказвалі ім турысты, што нядобразычліва адносяцца да вашай краіны».

Сумленныя іншаземцы, наведаўшыя Савецкі Саюз, не толькі самі пазнаюць савецкую рэчаіснасць і перастаюць верыць хлуслівай буржуазнай прапагандзе, але расказваюць праўду аб нашай краіне, аб савецкіх людзях сваім сябрам, сваім суайчыннікам. Англійская турыстка Сюзана Мегані, якая наведала Мінск у 1963 годзе, пісала Беларускаму таварыству дружбы: «Калі я вярнулася ў Англію, сябры мае многа пыталіся пра Савецкі Саюз, і я вельмі рада, што змагла пакласці канец многім фальшывым уяўленням аб Расіі, якія, як аказалася, маюцца ў многіх англічан».

Мінск падтрымлівае непасрэдныя культурныя сувязі з многімі гарадамі капіталістычных дзяржаў. Асабліва цесныя кантакты ўстанавіліся паміж сталіцай Беларусі і англійскім горадам Ноцінгемам. Беларускае таварыства дружбы і ноцінгемскі філіял Таварыства

англа-савецкай дружбы сістэматычна абменьваюцца фотавыстаўкамі, літаратурай, грампласцінкамі, магнітафоннымі лентамі з запісамі нацыянальнай музыкі, а таксама іншымі матэрыяламі, якія знаёмяць грамадскасць абодвух гарадоў з жыццём беларускага і англійскага народаў. Вясной 1963 года жыхары Мінска атрымалі ў падарунак альбом з узорамі ноцінгемскіх карунак. У сваю чаргу мінчане падаравалі жыхарам гэтага англійскага горада альбом узораў тканін Мінскага камвольнага камбіната.

Паміж гэтымі двума гарадамі перыядычна ўтвараецца абмен паездкамі турыстаў і розных дэлегацый. У 1964 годзе, напрыклад, у Ноцінгеме гасціла дэлегацыя Мінскага абласнога савета прафсаюзаў, а ў маі 1966 года ноцінгемскі муніцыпалітэт прымаў дэлегацыю мінчан, якую ўзначальваў старшыня Мінскага гарсавета В. І. Шарапаў, што прыбыла туды па запрашэнню лорд-мэра горада. У той жа час мінчане гасцінна прымалі ў сябе групу англійскіх трэд-юніёнаў з горада Ноцінгема, наведаўшую Мінск у 1964 годзе. У маі таго ж года на працягу пяці дзён у Мінску гасціў вядомы англійскі ружавод, актывіст Таварыства англа-савецкай дружбы, жыхар Ноцінгема Гары Уіткфорт, які падараваў мінчанам саджанцы вырашчаных ім выдатных руж. Усяго за апошнія гады Мінск наведала каля двухсот ноцінгемцаў.

Завязаўшаяся дружба паміж двума гарадамі мацнее з кожным годам. Аб ёй нават напісана песня, аўтарамі якой з'яўляюцца ноцінгемскія актывісты Таварыства англа-савецкай дружбы. Песня гэта ў выкананні хору мінскага радыё не адзін раз гучала ў эфіры як песня дружбы і міру.

Такім чынам, сувязі Мінска з зарубежнымі краінамі вельмі шырокія і шматгранныя. Асабліва паспяхова яны развіваюцца з краінамі народнай дэмакратыі і незалежнымі краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, што садзейнічае іх узаемнаму прагрэсу ва ўсіх галінах эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага жыцця. Цесныя міжнародныя кантакты і дружалюбнае супрацоўніцтва грамадскасці Мінска з зарубежнымі краінамі служыць справе далейшага збліжэння, узаемаразумення і давер'я паміж народамі, умацаванню міру ва ўсім свеце.

РАЗДЗЕЛ XXVI

ПРАЦОЎНЫЯ МІНСКА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫКАНАННЕ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

Як і ўвесь савецкі народ, працоўныя Мінска дабіліся вялікіх поспехаў у выкананні заданняў сямігодкі. Натхнёныя атрыманымі вытворчымі перамогамі, яны актыўна ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне новага пяцігадовага плана, закліканага забяспечыць значны рух нашага грамадства па шляху камуністычнага будаўніцтва, далейшае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, умацаванне эканамічнай і абаронай магутнасці краіны.

На сходзе партыйна-гаспадарчага актыву Мінска, які адбыўся 5 лютага 1966 года, былі падрабязна абмеркаваны і адобраны сацыялістычныя абавязацельствы калектываў прадпрыемстваў і будоўляў сталіцы, у якіх ставіліся яшчэ больш велізарныя ў параўнанні з мінулым годам задачы па далейшаму павелічэнню аб'ёму вытворчасці, павышэнню прадукцыйнасці працы і зніжэнню сабекошту вырабаў, шырокаму ўкараненню новай тэхнікі і прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў. Асаблівая ўвага пры абмеркаванні абавязацельстваў удзялялася павышэнню эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці, укараненню навуковай арганізацыі працы. І хоць аб'ём прамысловай вытворчасці, запланаваны на першы год пяцігодкі, значна перавышаў дасягнуты ўзровень у 1965 годзе, працоўныя Мінска абавязаліся завяршыць гадавы план па аб'ёму прамысловай вытворчасці і большасці важнейшых відаў вырабаў да 27 снежня, даць да канца года звыш плана прадукцыі на суму 26 мільёнаў рублёў, перавыканаць заданне па росту прадукцыйнасці працы

на 20 працэнтаў і атрымаць не менш як 6 мільёнаў рублёў звышпланавых накапленняў, укараніць дзесяць механізаваных і аўтаматычных ліній, выканаць 120 мерапрыемстваў па механізацыі, аўтаматызацыі і ўкараненню перадавой тэхналогіі, мадэрнізаваць 270 адзінак тэхналагічнага абсталявання. У гэтых аднадушна прынятых абавязацельствах знайшло сваё адлюстраванне непахіснае жаданне рабочых, ІТР і служачых сталіцы дабіцца новых вытворчых поспехаў у барацьбе за выкананне заданняў першага года пяцігодкі. Канкрэтна вызначыўшы свае задачы, яны з вялікай энергіяй узяліся за іх ажыццяўленне.

Развіццё руху за датэрміновае выкананне прынятых абавязацельстваў праходзіла ў абстаноўцы высокага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага сацыялістычным спаборніцтвам у гонар XXIII з'езду партыі, якое разгарнулася ў краіне яшчэ ў канцы 1965 года. Гарачае адабрэнне сярод працоўных Беларускай сталіцы знайшоў праект дырэктыў XXIII з'езду КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966—1970 гады, апублікаваны ў друку 20 лютага 1966 года. Пастаўленыя ў праекце дырэктыў задачы па далейшаму значнаму ўздыму сацыялістычнай эканомікі на аснове ўсямернага выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі, індустрыяльнага развіцця ўсёй грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці і прадукцыйнасці працы сталі баявой праграмай для калектываў рабочых, ІТР і служачых заводаў і фабрык, будоўляў, прадпрыемстваў транспарту і сувязі Мінска.

Актыўна ўключыўшыся ў спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXVI з'езду КПБ і XXIII з'езду КПСС, працоўныя сталіцы пад кіраўніцтвам партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый дабіваліся ўсё новых і новых перамог на ўсіх участках гаспадарчага будаўніцтва. Правільна вызначылі сваё месца ў спаборніцтве, якое пачалося, камуністы аўтамабільнага завода. Стаўшы на працоўную вахту ў гонар будучых з'ездаў Камуністычнай партыі Беларусі і Савецкага Саюза, кожны з іх браў на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, канкрэтна ўказваючы, які працоўны падарунак ён мае намер падрыхтаваць да знамянальных дат. Партыйныя арганізацыі цэхаў завода пачалі глыбей унікаць у гаспадарчыя справы, уважлівей сачыць за тым, каб прымаемыя калектывамі абавязацельствы былі абгрунтаванымі і падмацоўваліся эфектыўнымі арганізацыйна-тэхнічнымі мерапрыемствамі. Умела ажыццяўлялі кіраўніцтва разгорнутым спаборніцтвам партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі трактарнага і аўтарамонтнага заводаў, вытворчага абуткового аб'яднання «Прамень», тонкасуконнага камбіната, калектывамі якіх атрыманы значныя перамогі ў сацыялістычным спаборніцтве.

З вялікай увагай працоўныя сталіцы сачылі за работай XXVI з'езду Камуністычнай партыі Беларусі, які адбыўся ў Мінску 3—5 сакавіка. Са справаздачным дакладам аб рабоце партыйнай арганізацыі рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў. Галоўныя задачы развіцця народнай гаспадаркі Беларусі ў новай пяцігодцы былі падрабязна выкладзены ў дакладзе старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва. За 1966—1970 гады намячалася павялічыць аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі прыкладна ў 1,7 раза. Дзяржаўныя капітальныя ўкладанні ў народную гаспадарку рэспублікі ў параўнанні з папярэднім пяцігоддзем павінны былі ўзрасці на 84 працэнты і скласці 5,5 мільярда рублёў.

Працоўныя Мінска разумелі, што пастаўленыя перад імі задачы ў галіне развіцця народнай гаспадаркі могуць быць вырашаны толькі ў выніку няўхільнага ўздыму іх творчай актыўнасці. Добрых паказчыкаў у працы дабіваліся на працягу ўсяго першага квартала настройшчыца радыёзавода Т. С. Агеева, стругальшчык станкабудаўнічага завода імя Кірава І. С. Каспяровіч, слесар мотавелазавода І. І. Караткоў, якія былі пасланы дэлегатамі на XXVI з'езд Кампартыі Беларусі, машыніст цеплавоза Мінскага дэпо Л. П. Сярко, слесары агрэгатнага аддзялення аўтарамонтнага завода П. Б. Раманоўскі, І. І. Коцікаў і іншыя работнікі гэтай брыгады, якая перавыконвала з дня на дзень зменныя заданні на 35—40 працэнтаў. З вялікім апярэджваннем спраўляліся з прынятымі ў гонар XXIII з'езду КПСС абавязацельствамі работнікі тонкасуконнага камбіната. Лепшыя з прадзільшчыц Л. В. Рабінок, Л. В. Курэц і многія іншыя ўжо к канцу лютага завяршылі свае перадз'ездаўскія абавязацельствы. Каля 94 працэнтаў выпускаемых камбінатам тканін здавалася першым гатункам.

Разам з усімі працоўнымі выдатныя ўзоры працоўнага гераізму ў спаборніцтве, якое разгарнулася за дастойную сустрэчу партыйнага з'езду, паказвалі камсамольцы і моладзь горада. На XXIII з'ездзе ЛКСМБ, які адбыўся ў лютым, была станоўча ацэнена работа многіх камсамольскіх арганізацый сталіцы, якія ўмела накіроўвалі ініцыятыву камсамольцаў і моладзі на барацьбу за тэхнічны прагрэс, павышэнне якасці і зніжэнне сабекошту выпускаемай прадукцыі. Вялікая ўвага ўздыму творчай актыўнасці спаборнічаючых ўдзялялася камсамольскай арганізацыяй станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Тут яшчэ ў сярэдзіне лютага на пасяджэнні камітэта камсамола было вырашана пачаць працоўную вахту ў гонар з'езду партыі. Камсамольскі штаб па працоўнай вахце ўзначаліў сакратар камітэта камсамола завода Л. С. Навіцкі. Асвятленне ходу працоўнай вахты вялося па радыё, у маланках «Камсамольскага пражэктара», аб ёй расказвалася ў выпусках фотагазет. Паспяхова

спраўляўся з выкананнем прынятых сацыялістычных абавязацельстваў калектыў работнікаў першага механічнага ўчастка механа-зборачнага цэха № 3, які ўжо да 24 сакавіка рапартаваў аб выкананні ўзятых абавязацельстваў да дня адкрыцця XXIII з'езду КПСС. У асобныя дні камсамолец шліфавальшчык Н. А. Маркоўскі, працуючы на трох станках, выконваў амаль па дзве нормы. Да паўтары нормы і больш даваў за змену токар камсамолец Н. І. Ялесін.

Высокі палітычны і працоўны ўздым панаваў на прадпрыемствах Мінска напярэдадні і ў дні работы XXIII з'езду партыі. Разам з прадстаўнікамі дванаццацімільённай арміі савецкіх камуністаў сюды прыбылі дэлегацыі 86 камуністычных і рабочых, а таксама нацыянальна-дэмакратычных і сацыялістычных партый свету. Сярод пасланых ад мінскай гарадской партыйнай арганізацыі 18 дэлегатаў былі добра вядомыя ў сталіцы перадавікі вытворчасці: зборшчыца плаціна-маставога цэха гадзіннікавага завода Е. А. Бабянкова, сталяр СУ-13 трэста № 4 М. І. Гайдук, брыгадзір будтрэста № 1 А. М. Громаў, расточнік першага механічнага цэха завода аўтаматычных ліній В. П. Нягайчык, гідравыпрабавальнік маторнага завода Л. І. Фаміна і інш.

У справаздачным дакладзе Першага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, дакладзе Старшыні Савета Міністраў СССР А. М. Касыгіна аб дырэктывах XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966—1970 гады і выступленнях дэлегатаў дадзены глыбокі аналіз палітычнай, эканамічнай, ідэалагічнай і арганізатарскай дзейнасці партыі за справаздачны перыяд, падведзены вынікі гераічнай працы савецкага народа і намечаны шырокія перспектывы далейшага руху нашай краіны наперад па шляху камуністычнага будаўніцтва.

Адкрыццё з'езду працоўныя Мінска адзначалі як вялікую падзею ў жыцці краіны і азнаменавалі яго новымі вытворчымі поспехамі. У ліку першых рапартавалі аб датэрміновым выкананні сацыялістычных абавязацельстваў, прынятых у гонар XXIII з'езду КПСС, і плана першага квартала мінскія трактаразаводцы. Звыш плана яны выпусцілі прадукцыі на паўмільёна рублёў, у тым ліку 30 трактараў «Беларусь». Тэкстыльшчыкі тонкасуконнага камбіната дадаткова да плана далі 22 тысячы метраў шарсцяных тканін, абутнікі вытворчага аб'яднання «Прамень» — 52 тысячы пар абутку. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за першы квартал 1966 года калектыву аб'яднання «Прамень» было прысуджана першае месца з уручэннем пераходнага Чырвонага Сцяга Савета Міністраў СССР і ВЦСПС. Да дня адкрыцця з'езду партыі работнікі прамысловасці горада завяршылі квартальны план па агульнаму аб'ёму вытворчасці і выпуску важнейшых відаў прамысловай прадукцыі. У параўнанні з адпавед-

ным перыядам мінулага года прырост вытворчасці прамысловай прадукцыі склаў 11,7 працэнта.

Станоўчыя вынікі даў таксама рух за эканомію сыравіны і матэрыялаў і выпуск звышпланавай прадукцыі з сэканомленых сродкаў, які разгарнуўся з пачатку года па ініцыятыве масквічоў і ленінградцаў. Патрыятычны заклік калектываў прамысловых прадпрыемстваў Масквы і Ленінграда шырока абмяркоўваўся на сходах рабочых і служачых горада. На ўсіх прамысловых прадпрыемствах і будоўлях былі распрацаваны арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы па рацыянальнаму выдаткаванню матэрыяльных рэсурсаў і грашовых сродкаў.

Першымі адгукнуліся на пачын масквічоў і ленінградцаў аўтамабілебудаўнікі Мінска, якія абавязаліся за кошт удасканалення канструкцыі вузлоў і дэталей аўтамабіляў, укаранення прагрэсіўнай тэхналогіі і выкарыстання пластмас сэканоміць да канца года 1776 тон пракату, 155 тысяч метраў амедненых труб і шмат іншых каштоўных матэрыялаў і за кошт гэтага выпусціць звыш плана 625 аўтамабіляў «МАЗ-500». Высокія абавязацельствы па эканоміі сыравіны і матэрыялаў узялі на сябе калектывы трактарнага, маторнага і станкабудаўнічых заводаў, камвольнага і тонкасуконнага камбінатаў, швейнага вытворчага аб'яднання імя Крупскай і інш. Цэнтральны Камітэт КП Беларусі адобрыў сацыялістычныя абавязацельствы калектываў прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, транспарту і сувязі, якія пачалі паход за эфектыўнае выкарыстанне матэрыяльных рэсурсаў, і рэкамендаваў абкомам, гаркомам і райкомам КПБ, міністэрствам і ведамствам БССР, партыйным, савецкім, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям усямерна аказваць дапамогу спаборнічаючым у ажыццяўленні намечаных мерапрыемстваў.

Вынікі першага квартала пераканаўча паказалі, якое важнае значэнне мела разгорнутая работа па зберажэнню сыравіны, матэрыялаў і грашовых сродкаў. За гэты кароткі тэрмін трактаразаводцы, напрыклад, зберагліі 370 тон чорных металаў, 1,4 мільёна кілават-гадзін электрычнай і 9 тысяч мега-калорый цеплавой энергіі. Каля 500 тон пракату, звыш 100 тон ферамарганцу, тры мільёны кілават-гадзін электраэнергіі і 620 тон умоўнага паліва — такі ўклад у эканомію дзяржаўных сродкаў работнікаў аўтазавода. Шмат каштоўнай сыравіны і матэрыялаў сэканомлена на заводзе запасных частак і іншых прадпрыемствах.

Прынятыя з'ездам рашэнні шырока абмяркоўваліся на агульных сходах рабочых і служачых, раённых і гарадскім партыйна-гаспадарчых актывах, якія адбываліся паўсюдна. З дакладамі аб выніках работы з'езду на прадпрыемствах, установах і арганізацыях Мінска выступалі Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў,

Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў, сакратар ЦК КПБ С. О. Прытыцкі, старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў І. Н. Макараў і іншыя партыйныя, савецкія і прафсаюзныя кіруючыя работнікі. Уражаннямі аб форуме савецкіх камуністаў дзяліліся ў сваіх калектывах дэлегаты XXIII з'езду.

У ходзе абмеркавання матэрыялаў з'езду працоўныя горада горача падтрымлівалі палітыку Камуністычнай партыі, накіраваную на хутчэйшае развіццё сацыялістычнай эканомікі, далейшае павышэнне культуры і матэрыяльнага дабрабыту савецкіх людзей. Думку аўтазаводцаў аб значэнні прынятых з'ездам рашэнняў добра выказаў шафёр-выпрабавальнік эксперыментальнага цэха К. Г. Паўлянковіч. У сваім выступленні на сходзе партыйнага актыву аўтамабільнага завода, які адбыўся 18 красавіка, ён заявіў: «Наш мнагатысячны заводскі калектыў, як і кожны савецкі чалавек, з велізарным задавальненнем успрыняў рашэнні XXIII партыйнага з'езду, бо яны адпавядаюць самым патаемным пачуццям і думкам працоўнага чалавека».

У прапагандзе гістарычных рашэнняў XXIII з'езду КПСС актыўны ўдзел прымалі сакратары партыйных камітэтаў, кіруючыя савецкія, гаспадарчыя, прафсаюзныя і камсамольскія работнікі, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, спецыялісты, вучоныя, шматлікі партыйны актыў. Матэрыялы з'езду вывучаліся ў сістэме партыйнай і камсамольскай вучобы, ва ўсіх формах масавай і палітычнай прапаганды. Апрача таго, у горадзе дадаткова было створана каля 700 гурткоў і семінараў і 292 цыклы лекцый.

Пры вывучэнні і абмеркаванні матэрыялаў з'езду выносіліся каштоўныя прапановы па далейшаму павышэнню эфектыўнасці вытворчасці, усебакова аналізаваліся і ўказваліся шляхі вырашэння неадкладных задач у галіне тэхнічнага прагрэсу. Па ініцыятыве перадавых рабочых пачаўся перагляд раней прынятых сацыялістычных абавязацельстваў з улікам тых патрабаванняў, якія вынікалі перад іх прадпрыемствамі з рашэнняў XXIII з'езду КПСС. Характэрнай асаблівасцю ў развіцці творчай актыўнасці мас з'явілася цеснае спалучэнне руху за датэрміновае выкананне планавых заданняў з няўхільным павышэннем якасці выпускаемай прадукцыі. Абутнікі аб'яднання «Прамень», напрыклад, якія абавязаліся завяршыць план двух гадоў да пяцідзесяцігоддзя Савецкай улады, а пяцігодку — да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, не толькі з месяца ў месяц перавыконвалі свае заданні, але і дабіліся таго, што звыш 140 мадэлей выпускаемага імі абутку былі ацэнены мастацкім саветам Міністэрства лёгкай прамысловасці БССР самым высокім балам.

З выдатным пачынам выступілі напярэдадні маючых адбыцца 12 чэрвеня выбараў у Вярхоўны Савет СССР сталявары трактарнага

завода А. І. Азараў, А. І. Бялко, Г. І. Шышко і інш. Яны рашылі выканаць сваё пяцігадовае заданне за чатыры гады. Іх пачынанне неўзабаве было падтрымана на аўтамабільным заводзе сталяварамі В. К. Ладагубцам, В. І. Станкевічам, А. Д. Філіпенкам і ліцейшчыкамі цэха коўкага чыгуну А. А. Важнікам і І. В. Кунцэвічам і рэкамендавана ў чэрвені месяцы на бюро Мінскага абкома КПБ для шырокага распаўсюджвання і на іншых прадпрыемствах.

Колькасць спаборнічаючых за датэрміновае выкананне пяцігадовага плана з кожным днём узрастала. Неўзабаве пад дэвізам «Пяцігодку за чатыры гады!» пачалі працаваць тысячы перадавых рабочых горада. Расточнікі завода аўтаматычных ліній Герой Сацыялістычнай Працы А. Н. Віташкевіч, В. П. Няхайчык і рад іншых наватараў, глыбока вывучыўшы дадатковыя рэзервы павелічэння прадукцыйнасці працы, абавязаліся закончыць пяцігодку за тры з палавінай гады.

З пачуццём глыбокага задавальнення і ўдзячнасці партыі і ўраду ўспрынялі працаўнікі сталіцы вестку аб узнагароджанні Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР шматлікай групы перадавікоў вытворчасці за дасягнутыя імі поспехі ў выкананні заданняў сямігадовага плана. Сярод адзначаных урадавымі ўзнагародамі былі сотні наватараў прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, будаўніцтва, гандлю і сувязі Мінска. У вялікае свята вылілася ўручэнне ордэна Леніна аўтамабільнаму, трактарнаму заводам і будтрэсту № 5, ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга — станкабудаўнічаму заводу імя Кастрычніцкай рэвалюцыі і мясакамбінату, ордэна «Знак Пашаны» — аўтабазе № 11. Выказваючы падзяку за высокую ацэнку працы, выступаючыя на мнагалюдных мітынгах ад імя сваіх калектываў запэўнівалі партыю і ўрад, што яны і надалей будуць аддаваць усе свае сілы справе камуністычнага будаўніцтва. «Узнагароджанне завода ордэнам Леніна,— як справядліва адзначала на мітынгу трактаразаводцаў, які адбыўся 26 ліпеня, работніца інструментальна-штамповачнага корпуса Е. Г. Бухавец,— не толькі радуе нас, але і кліча на новыя працоўныя подзвігі». У заключэнне сваёй прамовы яна заклікала яшчэ з большай энергіяй працаваць над выкананнем заданняў новай пяцігодкі.

Адказам на ўручэнне раду прадпрыемстваў і шматлікай арміі перадавікоў вытворчасці ўрадавых узнагарод з'явілася далейшае ўзмацненне творчай актыўнасці рабочых, ІТР і служачых сталіцы. Імкненне ўнесці як мага большы ўклад у стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма вылівалася ў масавы працоўны гераізм і пастаянна нараджала нямала слаўных пачынанняў. З каштоўнай ініцыятывай, адобранай Цэнтральным Камітэтам Кампартыі Беларусі, выступілі ў верасні работнікі трактарнага завода, якія прапанавалі пачаць спа-

борніцтва сярод аднародных прадпрыемстваў за дастойную сустрэчу 50-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Яны прынялі на сябе высокія абавязацельствы, накіраваныя на паспяховае выкананне вытворчых планаў, далейшы рост тэхнічнага ўзроўню прадпрыемства, умацненне барацьбы за эканомію матэрыялаў, забеспячэнне выпуску новых відаў вырабаў, паспяховае ажыццяўленне комплексу мерапрыемстваў па ўкараненню новых метадаў гаспадарання і навуковай арганізацыі працы. Свае абавязацельствы трактаразаводцы падмацоўвалі канкрэтнымі справамі. Менш чым за дзевяць месяцаў графік выпуску трактараў апярэджан на 147 машын, а запасных частак — амаль на паўмільёна рублёў.

Не разыходзіліся словы са справай і ў многіх іншых калектываў прадпрыемстваў. Самаддана працавалі работнікі завода запасных частак, якому па выніках усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за першы і другі кварталы 1966 года прысуджалася другое месца сярод прадпрыемстваў Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання. Многія штамповачныя брыгады кавальскага цэха ўжо ў верасні месяцы перайшлі рубеж 1966 года, а брыгады, кіруемыя ўдарнікамі камуністычнай працы Н. В. Бараном і В. В. Дзямідавым, за восем месяцаў завяршылі гадавыя нормы. Ад укаранёных на заводзе рацыяналізатарскіх прапаноў атрымана за гэты час каля 150 тысяч рублёў умоўна-гадавой эканоміі.

У спаборніцтве за дастойную сустрэчу 50-годдзя Савецкай улады добрых вытворчых поспехаў дабіліся калектывы рэсорнага, мотавеласіпеднага, гіпсавага заводаў, завода аўтаматычных ліній, станкабудаўнічых заводаў, фабрыкі «Камунарка», камвольнага, тонкасуконнага камбінатаў, галаўных прадпрыемстваў гадзіннікавага і абуткovага вытворчых аб'яднанняў, швейнай фабрыкі імя Фрунзе і іншыя, занесеныя бюро гаркома КПБ і выканкомам гарсавета дэпутатаў працоўных за добрую работу ў другім квартале 1966 года на гарадскую Дошку гонару. Двойчы — за першы і другі кварталы — прысуджаўся пераходны Чырвоны Сцяг Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа энергетыкам Мінскай ЦЭЦ-3. За сем месяцаў яны атрымалі звыш 180 тысяч рублёў эканоміі.

Такога поспеху калектывы пералічаных прадпрыемстваў дасягнулі дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву сацыялістычным спаборніцтвам з боку партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый, пастаяннаму ўдасканаленню вытворчых працэсаў, правільнаму спалучэнню матэрыяльных і маральных стымулаў росту творчай актыўнасці мас. У іх налічваліся дзесяткі і сотні наватараў працы, якія з дня ў дзень перавыконваюць свае зменныя заданні. Высокім уменнем і майстэрствам славіліся зборшчыцы гадзіннікавага завода Л. Я. Доўнар, З. М. Разлукіна, наладчык аўтаматаў В. Н. Войцік. Пры сістэматыч-

ным перавыкананні норм выпрацоўкі ў паўтара-два разы яны забяспечвалі і высокую якасць сваёй прадукцыі, здаючы яе толькі з першага прад'яўлення. Сапраўднае наватарства ў працы паказвалі ткачыхі камвольнага камбіната А. І. Вераменкава, М. П. Дзятко, Л. В. Мачарашвілі, О. П. Чарнушэвіч, Я. П. Шэўчык. Авалодаўшы вопытам абслугоўвання чатырох станкоў, яны значна пачалі перавыконваць планавыя заданні па аб'ёму выпускаемай прадукцыі. За дзевяць месяцаў кожная з іх дала звыш плана больш як 5 тысяч метраў тканін першага гатунку.

У адпаведнасці з рашэннямі вераснёўскага (1965) Пленума ЦК КПСС і XXIII з'езду партыі партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі праводзілася ў 1966 годзе на прадпрыемствах прамысловасці і транспарту, будоўлях горада вялікая работа па ўкараненню новай сістэмы планавання і матэрыяльнага стымулявання. Новыя формы гаспадарання ўзмацняюць ролю эканамічных метадаў кіраўніцтве гаспадаркай, забяспечваюць карэннае паляпшэнне планавання, расшырэнне гаспадарчай самастойнасці і ініцыятывы калектываў прадпрыемстваў і павышаюць іх матэрыяльную зацікаўленасць у выніках сваёй дзейнасці.

Пераходу да работы па-новаму папярэднічала глыбокае вывучэнне ў вытворчых калектывах рабочых і служачых асноў эканомікі. Каштоўную дапамогу ім у авалоданні эканамічнымі ведамі аказваюць вучоныя. Для павышэння эканамічных ведаў дырэктараў, галоўных інжынераў і галоўных эканамістаў прадпрыемстваў і арганізацый прамысловасці, будаўніцтва і транспарту, праектных і навукова-даследчых інстытутаў і канструктарскіх бюро створаны на грамадскіх асновах на базе вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навуковых устаноў эканамічныя курсы з факультэтамі па галінах вытворчасці.

Пытанням правядзення гаспадарчай рэформы была прысвечана эканамічная канферэнцыя, скліканая Мінскім абкомам КП Беларусі і рэдакцыяй штотыднёвіка ЦК КПСС «Экономическая газета», якая адбылася ў сакавіку 1966 года. На ёй глыбока аналізаваліся пытанні аб стане спраў па ўдасканаленню эканамічнай работы на прадпрыемствах сталіцы.

Вялікая арганізатарская работа ў сувязі з пераходам на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання праводзілася на падшыпнікавым заводзе. Для рабочых і служачых была створана шырокая сетка эканамічнай вучобы. Лекцыі чыталі навуковыя супрацоўнікі Інстытута эканомікі АН БССР, семінары па практычных тэмах праводзілі кіруючыя работнікі завода. У 1966 годзе ў 20 вучэбных групах займалася 800 чалавек з саставу кіраўнікоў цэхаў, аддзелаў, сакратароў партыйных, прафсаюзных арганізацый і іншых кі-

руючых работнікаў. Апрача таго, у больш чым 250 вучэбных групах эканамічным навучаннем па 24-гадзіннай праграме былі ахоплены ўсе рабочыя.

Значна павысіліся патрабаванні ў сувязі з пераводам завода на новыя прынцыпы гаспадарання да тэхнічных ведаў рабочых асноўных прафесій. Усе мерапрыемствы па падрыхтоўцы кадраў ажыццяўляліся пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнага камітэта. У цеснай сувязі з аналізам канкрэтнай дзейнасці цэхаў, участкаў праводзіліся эканамічная вучоба і вывучэнне Палажэння аб сацыялістычным дзяржаўным прадпрыемстве на трактарным, мотавеласіпедным, маторным, гадзіннікавым заводах, тонкасуконным камбінаце і інш. Сутнасць новай сістэмы планавання і матэрыяльнага стымулявання даведзена тут да кожнага рабочага, тэхніка, кіраўніка цэха, аддзела.

Ажыццяўленне эканамічнай рэформы запатрабавала далейшага ўдасканалення гаспадарчага разліку, укаранення яго не толькі ў цэхах асноўнай вытворчасці, але і на дапаможных участках, з тым, каб узмацніць матэрыяльную зацікаўленасць кожнага члена калектыву ў выніках сваёй працы. Больш справядліва пачала размяркоўвацца паміж работнікамі прэмія за паспяховае выкананне плана рэалізацыі прадукцыі і плана прыбыткаў, эканомію матэрыялаў і г. д. Ва ўсіх гэтых выпадках размер прэміі залежыць ад асабістага ўдзелу работніка ў вытворчасці.

Высокі ўзровень мерапрыемстваў, праводзімых у сувязі з пераходам на новую сістэму гаспадарання, даў магчымасць ва ўстаноўленыя тэрміны ажыццявіць гэтую важную дзяржаўную задачу. Рад прадпрыемстваў змог укараніць яе нават раней намечаных тэрмінаў. У першым квартале на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання перайшлі калектывы трох аўтагаспадарак горада, у другім — падшыпнікавага і мотавеласіпеднага заводаў і мясакамбіната. Пачалі ажыццяўляць яе ў сябе заводы гадзіннікавы і станкабудаўнічы імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, мукамольны камбінат № 5, тытунёвая фабрыка і інш.

Калектывы рабочых і служачых, якія ўкаранілі ў сябе новую сістэму гаспадарання, змаглі дабіцца значнага павышэння эфектыўнасці вытворчасці, намнога пераўзысці колькасныя і якасныя паказчыкі папярэдніх гадоў. Так, работнікі мотавелазавода, перавыканаўшы план рэалізацыі прадукцыі за другі квартал, змаглі выпусціць дадаткова да задання 455 матацыклаў і 3500 веласіпедаў і атрымаць 14 тысяч рублёў звышпланавага прыбытку. Прадукцыйнасць працы за гэты час узрасла больш чым на чатыры працэнты. У сацыялістычным спаборніцтве прадпрыемстваў аўтамабільнай прамысловасці краіны калектыў завода заняў другое месца. Многае зроблена на заводзе ў 1966 годзе па павышэнню надзейнасці і па-

лоўжанню тэрміну эксплуатацыі машын. Колькасць рэкламацый у параўнанні з мінулым годам зменшылася на 40, а страты ад браку на 15 працэнтаў.

Такой жа высокай эфектыўнасцю вытворчасці вызначалася гаспадарчая дзейнасць і іншых прадпрыемстваў. Усе тры аўтагаспадарвання і эканамічнага стымулявання, дабіліся ў першым паўгоддзі скарачэння парожніх прабегаў аўтамабіляў, зніжэння сабекошту перавозак і ў 1,6 раза павялічылі адлічэнні ад прыбыткаў у бюджэт. Толькі калектывам адной аўтабазы № 11 за шэсць месяцаў работы па-новаму атрымана каля 950 тысяч рублёў прыбытку, або на 300 тысяч рублёў больш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Атрыманая на станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі на працягу двух месяцаў пасля пераходу на новыя ўмовы эканомія ад зніжэння сабекошту прадукцыі была на 17 тысяч рублёў большай, чым за ўсё першае паўгоддзе.

Перавага новай сістэмы гаспадарання далёка не вычэрпвалася толькі паляпшэннем тэхніка-эканамічных паказчыкаў у рабоце прадпрыемстваў. Яна станоўча адбілася на ўзмацненні ролі грамадскіх арганізацый і кожнага работніка ў кіраванні вытворчасцю. Значна ўзрасла самастойнасць і расшырыліся правы вытворчых калектываў у вырашэнні розных гаспадарчых пытанняў. З мэтай павелічэння дадатковай сумы прыбытку, неабходнай для ўтварэння грашовага фонду, з якога праводзяцца выплаты прэмій, пакрываюцца расходы на расшырэнне вытворчасці, жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва, самі прадпрыемствы пачалі выступаць ініцыятарамі павелічэння ім вытворчых планаў. Іменна так рабілі работнікі падшыпнікавага завода, Другога аўтобуснага парка і іншых прадпрыемстваў. Больш увагі пачало звяртацца на зніжэнне сабекошту і паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі, устанаўленне прамых дагаворных адносін са спажыўцамі сваёй прадукцыі. Побач з ростам творчай актыўнасці працоўных Мінска, пастаянным павышэннем тэхнічнай аснашчанасці прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту і будоўляў ажыццяўленне эканамічнай рэформы з'явілася адным з рашаючых фактараў паспяховага выканання задання першага года пяцігодкі.

Выключна важную ролю ў дасягненні высокіх тэмпаў развіцця вытворчасці адыгралі таксама ажыццяўляемыя на прадпрыемствах пасталіцы мерапрыемствы па ўкараненню навуковай арганізацыі працы (НАП), значэнне якой глыбока раскрыта ў рашэннях вераснёўскага (1965) Пленума ЦК КПСС і XXIII з'езду партыі. «Навуковая арганізацыя вытворчасці, укараненне сучасных дасягненняў навукі і тэхнікі ў народную гаспадарку,— запісана ў рэзалюцыі XXIII з'ез-

ду КПСС,— павінны ствараць усё больш спрыяльныя ўмовы для высокапрадукцыйнай працы ўсіх работнікаў».

Каштоўную дапамогу прадпрыемствам ва ўкараненні НАП аказвае навукова-тэхнічны савет пры Савецкім райкоме КПБ, кіруемы дырэктарам фізіка-тэхнічнага інстытута АН БССР акадэмікам В. П. Севярдзенкам. У аб'ядноўваемых Саветам дзевяці секцыях працуе каля 130 вучоных, кіраўнікоў прадпрыемстваў, ІТР і наватараў вытворчасці. Імі распрацавана нямала важных рэкамендацый па ўдасканаленню тэхніка-эканамічнага аналізу, планавання і кіравання вытворчасцю, механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў і працаёмкіх работ, механізацыі інжынернай і ўпраўленчай працы, павышэнню якасці надзейнасці і даўгавечнасці прадукцыі, ўкараненню прамыслова-вытворчай эстэтыкі і г. д. Плённа працуюць і іншыя навукова-тэхнічныя саветы, створаныя пры райкомах партыі.

Прынцыпы навуковай арганізацыі працы знаходзяць шырокае ўжыванне на радыёзаводзе. Для кіраўніцтва работай па ўкараненню НАП ёсць спецыяльнае бюро навуковай арганізацыі працы. У складзе 40 вытворчых брыгад працавала ў 1966 годзе каля 400 майстроў, тэхнолагаў, інжынераў, эканамістаў, нарміроўшчыкаў, перадавікоў вытворчасці. Толькі за кошт ажыццяўлення мерапрыемстваў па планах НАП прадукцыйнасць працы павысілася ў 1966 годзе прыкладна на пяць працэнтаў.

Усё новыя і новыя пазіцыі заваёўвае навуковая арганізацыя працы на заводах трактарным, маторным, мотавеласіпедным і аўтаматычных ліній, камвольным камбінаце, трыкатажнай фабрыцы «Прагрэс», у лакаматыўным дэпо Мінск і на іншых прадпрыемствах, дзе эфектыўна выконваюцца канкрэтныя мерапрыемствы па ўкараненню НАП. Дзякуючы шырокаму ўкараненню прынцыпаў навуковай арганізацыі працы яны дабіліся значных поспехаў у расшырэнні вытворчых магутнасцей сваіх прадпрыемстваў, механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў і працаёмкіх работ і ўздыме агульнай культуры вытворчасці, што ў сваю чаргу дало магчымасць рэзка павялічыць аб'ём выпускаемай прадукцыі, палепшыць яе якасць пры адначасовым зніжэнні сабекошту. Так, на трактарным заводзе ў выніку ўзросшай тэхнічнай аснашчанасці і ўдасканалення тэхналагічных працэсаў выпуск трактараў быў павялічаны ў параўнанні з мінулым годам больш чым на пяць тысяч. Добрыя вынікі тут дасягнуты ад механізацыі інжынернай працы. Створаны яшчэ ў 1965 годзе спецыяльны вылічальны цэнтр займаецца механізацыяй складаных інжынерных і планавых разлікаў, механізацыяй апаратыўнага кіравання і выконвае іншыя віды работ. Умоўна-гадавы эканамічны эфект ад ажыццяўлення на МТЗ мерапрыемстваў НАП склаў у 1966 годзе звыш 100 тысяч рублёў.

Вялікая эфектыўнасць атрымана ад укаранення ў 1966 годзе эксмай па ліку паточнай лініі на камвольным камбінаце. З уводам ёй ў эксплуатацыю аўтаматызавана падача сыравіны да машын і поўнасцю ліквідаваны страты пры яе транспартаванні. На кожнай лініі пачалі эканоміць па сем тон розных валокнаў. На працягу года тут установлена сто бесчаўночных высокапрадукцыйных станкоў, якія ў два-тры разы зніжаюць шум у час работы. У 1966 годзе камбінат выпусціў тканін прыкладна на паўтара мільёна пагонных метраў больш, чым у папярэднім годзе. Звыш мільёна рублёў склаў эканамічны эфект ад ажыццяўлення намечаных арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па новай тэхніцы на радыёзаводзе. Пры гэтым прагае таксама зроблена па ўкараненню найноўшай тэхнікі і ўдасканаленню вытворчых працэсаў у сталічным лакаматыўным дэпо. К канцу першага года пяцігодкі тут ужо ў асноўным была завершана замена паравознай цягі цеплавознай.

Паказальна, што на прадпрыемствах і будоўлях горада ў 1966 годзе пачало больш увагі ўдзяляцца ўздыму агульнай культуры вытворчасці, шырокаму ўкараненню вытворчай эстэтыкі. У гэтым напрамку асабліва плённа папрацаваў калектыў гадзіннікавага завода, якому за перамогу ва ўсесаюзным грамадскім аглядзе культуры вытворчасці прысвоена званне «Прадпрыемства высокай культуры вытворчасці» і прысуджана першая грашовая прэмія, а таксама калектывы маторнага, трактарнага, аўтаматычных ліній і аўтамабільнага заводаў, трыкатажнай фабрыкі «Прагрэс», завода медпрэпаратаў.

Настойліва змагаючыся за ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езду КПСС і дастойную сустрэчу 50-годдзя Савецкай улады, працоўныя Мінска дабіліся ў 1966 годзе выдатных працоўных перамог на фронце гаспадарчага будаўніцтва. Паспяхова выкананы ўсе асноўныя паказчыкі народнагаспадарчага плана 1966 года і дасягнута значнае павелічэнне аб'ёму вытворчасці прамысловай прадукцыі і праведзеных работ па капітальнаму будаўніцтву. Ужо да пачатку кастрычніка гадавое абавязацельства па выпуску звыш планавай прамысловай прадукцыі было перавыканана амаль у 1,3 раза. Аб'ём прамысловай вытворчасці за дзевяць месяцаў 1966 года ў параўнанні з гэтым жа перыядам мінулага года ўзрос на 14 працэнтаў. Вытворчасць электраэнергіі павялічылася на 31,9 мільёна кілават-гадзін, запасных частак для аўтамабіляў — на 2 мільёны рублёў, запасных частак для трактараў — на 5,2 мільёна рублёў, веласіпедаў — на 14,7 тысячы штук, матацыклаў — на 2,6 тысячы штук, тэлевізараў — на 30,4 тысячы штук, халадзільнікаў — на 18 тысяч штук, тканін шарсцяных — на 1211 тысяч квадратных метраў. Аб'ём грузавых перавозак аўтамабільнага транспарту быў вышэйшы, чым у першым паўгоддзі

1965 года, на 10,6 працэнта. Звышпланавая эканомія ад зніжэння сабекошту прамысловай прадукцыі толькі за першае паўгоддзе склала 8,5 мільёна рублёў і атрымала прыбытку на 21 працэнт больш, чым за адпаведны перыяд 1965 года. За 9 месяцаў 1966 года ў народную гаспадарку ўкаранёна каля васьмі тысяч вынаходстваў і рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць амаль 11 мільёнаў рублёў эканоміі ў год.

Яркім сведчаннем атрыманых у першым годзе пяцігодкі вытворчых перамог з'явіліся дасягненні працоўных Мінска ў асваенні выпуску новых відаў больш дасканалых машын, станкоў і рознага абсталявання, якія не ўступаюць па сваіх тэхніка-эканамічных паказчыках лепшым айчынным і зарубежным узорам. Вялікіх поспехаў у асваенні новых канструкцый машын дабіліся аўтазаводцы, якія поўнасцю перайшлі з пачатку 1966 года на выраб грузавых машын «МАЗ-500» замест «МАЗ-200». У адрозненне ад ранейшых машын яны больш быстраходныя і значна надзейныя ў эксплуатацыі. Сабекошт перавозкі грузаў на 25—40 працэнтаў ніжэй, чым машынамі «сям'і» «МАЗ-200». З верасня месяца яны пачалі выпускаць новы лесавозны аўтамабіль «МАЗ-509П» вялікай скорасці, павышанай манеўранасці і праходнасці. На ім установлен рухавік магутнасцю 180 конскіх сіл. За адзін рэйс лесавоз транспартуе 22—25 кубаметраў драўніны з скорасцю 75 кіламетраў у гадзіну. Яго выкарыстанне на лесараспрацоўках дае магчымасць павялічыць прадукцыйнасць працы на 20 працэнтаў. Тут жа выраблены ў пачатку года доследныя ўзоры трохвосевых аўтамабіляў, здольных перавозіць да 20 тон грузаў і больш.

Шэраг каштоўных мерапрыемстваў па ўдасканаленню выпускаемай прадукцыі ажыццёўлен на трактарным заводзе, з канвеера якога сышоў 9 жніўня 1966 года 500-тысячны трактар, на заводах «Ударнік», гадзіннікавым, маторным, мотавеласіпедным і іншых прадпрыемствах. Толькі на рамонце ўдасканаленага маторным заводам рухавіка «Д-50», які ўстанаўліваецца на трактары «Беларусь», калгасы і саўгасы, будаўнічыя і іншыя арганізацыі краіны эканомяць восем мільёнаў рублёў у год. Гарантыйны тэрмін службы рухавіка павялічыўся з 2500 да 4500 мота-гадзін, магутнасць — з 37 да 55 конскіх сіл пры змяншэнні вагі на 200 кілаграмаў. Пакуль не мае сабе роўных у Саюзе створаны ў 1966 годзе на заводзе «Ударнік» снегаачышчальнік «Д-902». Яго ротарны раскідвальнік, прыводзімы ў дзеянне рухавіком у 420 конскіх сіл, за гадзіну раскідвае ў абодва бакі на адлегласць да 45 метраў дзве тысячы тон снегу. Для выканання такога аб'ёму работ спатрэбілася б каля дваццаці стосільных плужных бульдозераў. Машынабудаўнікамі гэтага завода асвоена ў 1966 годзе вытворчасць новага шматкаўшовага пагрузчыка, прадук-

цыйнасць якога ў 1,6 раза вышэйшая і гарантыйны тэрмін службы ўдвая большы ў параўнанні з раней выпускаемымі машынамі. За гадзіну ён выконвае работу больш ста грузчыкаў.

Пытанні далейшага павышэння тэхніка-эканамічных паказчыкаў выпускаемай прадукцыі прадпрыемствамі сталіцы грунтоўна разглядаліся на пленуме Мінскага гаркома КПБ, які адбыўся ў верасні. Пленум адзначыў вялікія дасягненні ў асваенні новых марак аўтамабіляў, трактараў, металарэзных станкоў, матацыклаў, радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў, гадзіннікаў і асобных відаў тканін. Разам з тым падвергліся рэзкай крытыцы калектывы фабрык швейнай імя Крупскай і гарбарна-галантарэйнай імя Куйбышава, завода аўтаручак і іншых прадпрыемстваў, дзе яшчэ недастаткова змагаюцца за гонар заводскай маркі.

Пастаўляючы народнай гаспадарцы больш дасканалыя віды тэхнікі, працоўныя Мінска тым самым уносяць уклад у выкананне пастаўленых XXIII з'ездам партыі задач аб усямерным паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу і павышэнні эфектыўнасці грамадскай вытворчасці.

Першы год новай пяцігодкі быў азнаменаваны не толькі вялікімі вытворчымі поспехамі. Ён з'явіўся таксама годам далейшага павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных Мінска. Сярэднемесячная заработная плата рабочых і служачых у першым паўгоддзі была прыкладна на пяць працэнтаў вышэй, чым за адпаведны перыяд мінулага года. На сацыяльна-культурныя мерапрыемствы па бюджэту горада намечана выдаткаваць каля 48 мільёнаў рублёў, што амаль на 1,2 мільёна рублёў больш, чым прадугледжвалася на 1965 год і ў пяць разоў перавышае расходы на гэтыя мэты ў 1950 годзе.

Толькі на працягу дзевяці месяцаў 1966 года за кошт дзяржаўных сродкаў і жыллёвымі кааператывамі ўведзена ў эксплуатацыю звыш дзвюхсот тысяч квадратных метраў жылой плошчы, прычым больш палавіны яе прыходзілася на дамы з палепшанай планіроўкай. Прыгожыя шматпавярховыя дамы выраслі на Магілёўскай і Ракаўскай шашы, на вуліцах Рэспубліканскай і Апанскага, у мікрараёнах Зялёны Луг і Чыжоўка. Толькі за першае паўгоддзе газіфікавана больш як восем тысяч кватэр.

У розных раёнах сталіцы з'явіліся пабудаваныя ў сучасным стылі новыя бальнічныя карпусы, магазіны і сталовыя, дзіцячыя сады і яслі, прадпрыемствы бытавога абслугоўвання. Колькасць магазінаў толькі за восем месяцаў павялічылася на 14, сталовых, кафэ і закусачных — больш чым на 20. Восенню ў сталіцы працавала каля 1200 прадпрыемстваў рознічнага гандлю. Вялікі магазін «Ягадка», агульнай плошчай звыш 200 квадратных метраў, пабудаваны ў ад-

ным з густанаселеных раёнаў сталіцы — Валгаградскім. Халадазільныя камеры магазіна адначасова могуць змясціць да 50 тон гародніны і фруктаў. Механізавана дастаўка прадуктаў у складскія памяшканні і на прылаўкі. Добрым падарункам для жанчын з'явілася адкрыццё ў веснавыя дні 1966 года на вуліцы Друкарскай «Салона прыгажосці», у якім праводзяцца ўсе віды жаночых цырульных работ. У прасторных залах агульнай карыснай плошчай звыш 700 квадратных метраў адначасова можа абслугоўвацца больш як 30 кліентаў.

Праяўлена нямала клопатаў аб будаўніцтве ясляў, дзіцячых садоў і ясляў-садоў. К канцу 1966 года грамадскім дашкольным выхаваннем было ахоплена звыш 50 тысяч дзяцей.

Многае зроблена ў 1966 годзе па ўдасканаленню транспартнага абслугоўвання насельніцтва, развіццю водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі, азеляненню горада і арганізацыі зон масавага адпачынку мінчан. Пасажырскі парк аўтобусаў, тралейбусаў і трамвайных вагонаў папоўніўся новымі больш камфартабельнымі серыямі машын. Восенню ў пасёлку аўтазаводцаў уведзен у строй першы ў горадзе падземны пераход, які злучыў пад Магілёўскай шашой вуліцы Працоўную і імя Катоўскага, дзе з прычыны вялікага скаплення людзей у гадзіны перазменкі затрымліваўся рух транспарту.

У 1966 годзе было забрукавана звыш 130 тысяч квадратных метраў праезджай часткі вуліц і заасфальтавана 240 квадратных метраў вуліц і тратуараў. У мэтах далейшага азеляненння горада пасаджана больш як 48 тысяч дрэў і каля 430 тысяч дэкаратыўных кустоў. Актыўны ўдзел у пасадцы зялёных насаджэнняў прымалі жыхары беларускай сталіцы. Ідучы насустрач 900-годдзю свайго роднага горада, яны на грамадскіх асновах адпрацавалі ў 1966 годзе больш як 400 тысяч чалавека-гадзін. Асабліва шмат дрэў і дэкаратыўных кустоў было высаджана жыхарамі мікрараёнаў Зялёны Луг і вуліцы Харкаўскай, калектывамі прамысловых прадпрыемстваў Заводскага раёна і г. д.

Праведзена вялікая работа па паляпшэнню арганізацыі культурнага адпачынку насельніцтва як у самім горадзе, так і за яго межамі. Улюбёным месцам масавага адпачынку па праву лічыцца прыбярэжная зона Заслаўскага вадасховішча. У 1966 годзе тут дзейнічала 12 дзіцячых дач, 23 піянерскія лагеры, тры спартыўныя лагеры, тры дамы адпачынку і турысцкая база. Стала традыцыйнай арганізацыя адпачынку мінчан у турысцка-экскурсійных паяздах. К канцу 1966 года завершана электрыфікацыя лініі на ўчастку ад Аляхновіч да Маладзечна, што дае магчымасць яшчэ на некалькі квадратных кіламетраў расшырыць зоны адпачынку насельніцтва Мінска.

Першы год новай пяцігодкі па праву можа быць назван годам вялікіх дасягненняў у развіцці народнай асветы, навукі і культуры.

У гэтым годзе закончылі сярэднюю школу звыш адзінаццаці тысяч вучняў. На працягу трох кварталаў 1966 года пабудавана пяць агульнаадукацыйных школ на 4690 месц. Упершыню ў сваім жыцці пераступілі парог школы ў 1966/67 навучальным годзе шматлікая армія хлопчыкаў і дзяўчынак.

Значна больш шматлікім, чым у папярэднія гады, быў прыём у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы горада. Усяго ў ВНУ прынята 17 257 чалавек, або на 22 працэнты больш, чым у 1965 годзе. На пяць працэнтаў павялічылася ў параўнанні з мінулым годам колькасць прынятых у тэхнікумы. У 1966 годзе былі пабудаваны новыя вучэбныя карпусы для Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, Інстытута замежных моў. Будаўнікі горада паднеслі добры падарунак студэнтам самай маладой у горадзе ВНУ — Мінскага радыётэхнічнага інстытута, здаўшы ў пярэдадзень 49-й гадавіны Кастрычніка ў эксплуатацыю другі вучэбна-лабараторны корпус плошчай звыш дзевяці тысяч квадратных метраў. У ім размясціліся кафедры фізікі, вышэйшай матэматыкі, фізічнай падрыхтоўкі і інш. Апрача таго, ён мае прасторную актавую залу з файэ, памяшканні для бібліятэкі з кнігасховішчам, спартыўную і трэніровачныя залы. Рад навукова-лабараторных карпусоў узведзены для навукова-даследчых інстытутаў Акадэміі навук БССР. Рабочая плошча здадзеных у эксплуатацыю будынкаў склала каля 13 тысяч квадратных метраў.

Далейшыя поспехі дасягнуты ў расшырэнні сеткі культурна-асветных устаноў, будаўніцтве розных спартыўных узвядзенняў. Радасным святам для ўсіх мінчан з'явілася адкрыццё напярэдадні Дня Перамогі на Паркавай магістралі Палаца спорту. Гэта выдатнае збудаванне аб'ёмам у 105 тысяч кубічных метраў выканана па праектах архітэктараў «Белдзяржпраекта» С. Д. Філімонава, В. Н. Малышава і інжынера В. В. Каржэўскага. Зроблена яно ў асноўным са сплаву шкла, жалезабетону і алюмінію. Унутраная частка Палаца прыгожа аддзелана натуральным дубам, мармурам, глазураванай пліткай і іншымі матэрыяламі. У велізарнай глядзельнай зале змяшчаецца шэсць тысяч гледачоў. Устаноўленыя трыста гучнагаварыцелей забяспечваюць добрыя акустычныя ўласцівасці. Незвычайным з'яўляецца адсутнасць у зале апорных калон. Перакрыццё і столь трымаюцца на ўнікальных стальных фермах, кожная з якіх мае даўжыню звыш 60 метраў і вагу — каля 40 тон. Жыхары Мінска ўжо не раз былі сведкамі спартыўных спаборніцтваў, якія праводзіліся тут, выступленняў праслаўленых тэатральных калектываў і іншых мерапрыемстваў.

Памятным днём для школьнікаў было 12 лютага, калі ўрачыста расчыніліся дзверы для іх пабудаванага па праекту заслужанага будаўніка БССР Г. В. Забароўскага шырокаэкраннага кінатэатра «Пія-

нер». А праз восем месяцаў у гэтым жа будынку адбылося адкрыццё тэатра лялек. Архітэктары і будаўнікі добра паклапаціліся аб стварэнні неабходных умоў для работы з дзецьмі. Апрача глядзельных залаў, разлічаных на 800 месц, тут ёсць чытальная зала, пакоі для гуртковай работы, невялікая эстрада. Радуе вока з густам афармленае фае са штучным басейнам, вакол якога зелянее трава і растуць прыгожыя дэкаратыўныя расліны. Сцены фае ўпрыгожвае каляровае пано на тэмы папулярнай песні «Пусть всегда будет солнце!» Арыгінальна выкананы вітражы на сюжэты захапляльных дзіцячых казак, а таксама апяваючыя пакарэнне космасу.

Значнай з'явай у культурным жыцці горада трэба прызнаць і завяршэнне будаўніцтва шырокафарматнага кінатэатра «Партызан» на 1000 месц па вуліцы Талбухіна.

Культурныя патрэбнасці мінчан задавальняліся не толькі шляхам расшырэння сеткі ўстаноў культуры, але і дзякуючы паляпшэнню арганізацыі іх работы, паказу на экранах кінатэатраў, сцэнах прафесіянальных і самадзейных тэатраў лепшых твораў сусветнага і айчыннага мастацтва, якія праўдзіва адлюстроўваюць рэчаіснасць. Вялікім поспехам калектыву Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў новым сезоне з'явіліся прэм'еры па раманах беларускіх пісьменнікаў І. Мележа «Людзі на балоце» і І. Шамякіна «Сэрца на далоні», а таксама аднаўленне пастаноўкі, якая даўно не ішла на нашай сцэне, камедыі Мальера «Мешчанін у дваранстве». Цёпла віталі гледачы пастаўленыя па творах К. К. Крапівы спектаклі, якія ішлі на сцэне тэатра ў дні, калі ў нашай рэспублікі адзначалася 70-годдзе выдатнага беларускага пісьменніка.

З цікавай праграмай азнаёмілі аматараў сцэнічнага мастацтва артысты Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Імі пастаўлены прэм'еры па творах М. Лермантава «Маскарад», Я. Волчэка «Фізікі-лірыкі», М. Шатрова «Шостага ліпеня» і інш.

Плённа папрацавалі над расшырэннем свайго рэпертуару і павышэннем артыстычнага майстэрства калектывы Дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, Тэатра юнага гледача. Шмат новага і цікавага знайшлі для сябе наведвальнікі ў праграмах выступленняў артыстаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР, Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР, Мінскага дзяржаўнага цырка і іншых калектываў.

Цудоўнай з'явай у музычным жыцці Мінска было правядзенне ў кастрычніку цыкла канцэртаў, прысвечаных 60-годдзю выдатнага савецкага кампазітара Дзмітрыя Шастаковіча. Яго лепшыя творы сімфанічнай і камернай музыкі гучалі ў выкананні Дзяржаўнага

сімфанічнага аркестра БССР, зводнага хору басоў Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР, Беларускага радыё і тэлебачання, Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Парадавала вынікамі сваёй працы кінастудыя «Беларусьфільм». На экранах кінатэатраў дэманстраваліся выпушчаныя ёю ў 1966 годзе кінафільмы «Альпійская балада», «Чужое імя», «Колькі год, колькі зім!», «Горад майстроў» і інш. Найбольш высокага прызнання ў гледачоў заслужыў фільм «Альпійская балада», пастаўлены па адноймённай аповесці беларускага пісьменніка В. Быкава.

Як вялікія падзеі ў культурным жыцці горада пастаянна адзначаліся прыезды ў сталіцу Беларусі на гастролі артыстаў з братніх Савецкіх рэспублік. Надоўга запомніліся мінчанам выступленні Варонежскага і Омскага народных хораў, Букавінскага ансамбля песні і танца, гастролі вядомага савецкага піяніста, народнага артыста СССР Паўла Серабракова, заслужанага артыста РСФСР Юрыя Нікуліна і інш.

У сапраўднае свята выліўся тыдзень таджыкскай літаратуры, які праводзіўся ў Беларусі ў кастрычніку 1966 года. Прысутнічаючы на вечарах з пісьменнікамі і дзеячамі мастацтва Таджыкістана, працоўныя Мінска атрымалі магчымасць азнаёміцца з культурнымі дасягненнямі брацкага нам народа. У гэтыя дні ў кінатэатрах горада дэманстраваліся лепшыя фільмы, створаныя таджыкскімі кінематаграфістамі.

У сваю чаргу і артысты Мінска не раз выязджалі ў 1966 годзе на гастролі ў гарады і сёлы іншых рэспублік. Артыстычныя трупы горада прымалі ўдзел у фестывалі беларускага мастацтва ў РСФСР, які праводзіўся з 10 сакавіка па 13 красавіка. Яны пабывалі з канцэртамі на прадпрыемствах прамысловасці, будоўлях, у калгасах і саўгасах чатырох абласцей Расійскай Федэрацыі. Гасцінна сустракалі гледачы таксама выступленні артыстаў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў Кіеве, рускага драматычнага — у Калінінградзе. Паспяхова прайшлі гастролі і іншых сталічных калектываў. Такія ўзаемасувязі паміж дзеячамі мастацтва братніх рэспублік садзейнічалі далейшаму абагачэнню і росквіту савецкай культуры.

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна яшчэ больш разнастайнай і мэтанакіраванай стала работа палацаў і дамоў культуры, клубаў, бібліятэк, музеяў і народных універсітэтаў сталіцы. Па пачыну перадавых калектываў на радзе прадпрыемстваў горада пачалі стварацца народныя музеі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. У 1966 годзе каля ста тысяч мінчан зрабілі паходы па памятных гістарычных месцах, авеяных слаўнымі рэвалюцыйнымі падзеямі,

гераічнай барацьбой нашага народа ў гады Айчыннай вайны. З кастрычніка 1966 года ў Палацы культуры прафсаюзаў арганізаваны Кастрычніцкія чытанні, прысвечаныя 50-годдзю Савецкай улады. З лекцыямі аб сусветна-гістарычным значэнні Кастрычніцкай рэвалюцыі і поспехах савецкага народа ў будаўніцтве камунізма выступалі кіруючыя савецкія і партыйныя работнікі, буйнейшыя вучоныя Акадэміі навук СССР і БССР. Актыўны ўдзел у лекцыйнай рабоце прымалі члены Мінскай гарадской арганізацыі «Веды», якая аб'ядноўвала ў сваіх радах звыш шасці тысяч чалавек, у іх ліку каля пяцідзесяці акадэмікаў, больш ста дактароў навук і прафесараў і звыш тысячы кандыдатаў навук і дацэнтаў.

У калектывах мастацкай самадзейнасці разгарнулася шырокая падрыхтоўка да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Кастрычніка. Вядучае месца ў рэпертуары самадзейных калектываў займалі творы на гісторыка-рэвалюцыйныя, гераіка-патрыятычныя і сучасныя тэмы, якія глыбока раскрываюць змест нашых перамог у сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве. У іх рэпертуары асабліва добра прадстаўлена жыццё Беларускай ССР. Так, у праграму народнага ансамбля танца «Лявоніха» Палаца культуры трактарнага завода, які нядаўна з вялікім поспехам выступаў з канцэртамі ў Балгарыі, уключаны «Нарачанскія рыбакі», «Маладзёжная вясельная», «Зімовыя гульні» і вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Мінскія зоры». У выкананні калектыву народнага мужчынскага хору Мінскага аўтазавода гучаць творы А. Туранкова «Вязень», Н. Сакалоўскага «Нёман». Вялікая тэматычная кампазіцыя «Сыны Беларусі» ўвайшла ў рэпертуар эстраднага ансамбля Палаца культуры камвольнага камбіната. Каштоўную дапамогу клубным гурткам у падрыхтоўцы мастацкай самадзейнасці да 50-годдзя Кастрычніка аказвалі заслужаная артыстка БССР Г. Цэпава, загадчык кафедры Белдзяржканцерваторыі В. Роўда, заслужаныя дзеячы мастацтваў В. Галубовіч, Ю. Семяняка, М. Маслаў і інш.

У 1966 годзе ў Мінску пабывалі многія вядомыя дзеячы мастацтва зарубежных краін. На сцэнах гарадскіх тэатраў з поспехам выступалі артысты балгарскай і нямецкай эстрады, румынскага і польскага цырка. Палюбіліся мінчанам народныя і партызанскія песні ў выкананні групы італьянскіх спевакоў пад кіраўніцтвам былога камандзіра партызанскай брыгады італьянскага Супраціўлення Паола Кастаньіно.

Такім чынам, першы год новай пяцігодкі для працоўных беларускай сталіцы быў годам новых поспехаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Апошнія дні яго супалі з радаснай падзеяй у жыцці ўсіх жыхароў Мінска — узнагароджаннем 3 снежня іх роднага горада ордэнам Леніна за праяўленне працоўнымі мужнасці і гераізму,

самаадданую барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Айчыннай вайны і за дасягнутыя поспехі ў аднаўленні горада і развіцці народнай гаспадаркі.

Атрыманыя ў першым годзе пяцігодкі поспехі ў галіне гаспадарчага, жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ўсяляюць законную гордасць у сэрцы працоўных Мінска. Яны поўныя рашучасці і далей з неаслабнай энергіяй працаваць над выкананнем стаячых перад імі ў бягучым пяцігоддзі задач з тым, каб ператварыць свой родны горад у яшчэ больш развіты індустрыяльны і культурны цэнтр рэспублікі, а сваё жыццё зрабіць яшчэ больш радасным і шчаслівым. Запланаваныя на 1966—1970 гады маштабы прамысловай вытворчасці, жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва значна перавышаюць заданні адпаведных перыядаў мінулых гадоў. Выпуск прамысловай прадукцыі павінен узрасці ў паўтара раза.

За пяцігоддзе на многіх заводах і фабрыках горада ўзнікнуць новыя вытворчыя карпусы, павысіцца ўзровень тэхнічнага аснашчэння асноўных і дапаможных цэхаў, будзе асвоена вытворчасць новых відаў прадукцыі. На аўтамабільным заводзе ўвойдуць у эксплуатацыю новы корпус здачы і выпрабавання аўтамабіляў, тэрмічны і выпрабавальны цэхі, лабараторны корпус і інш. Узрастуць вытворчыя магутнасці трактарнага завода. За пяць гадоў з яго канвеера сыйдзе больш як 400 тысяч трактараў, што амаль роўна іх выпуску за ўсе дваццаць гадоў работы завода. У 1970 годзе кожны пяты трактар краіны будзе мець марку «Беларусь».

Велізарныя работы трэба выканаць па жыллёваму і культурна-бытавому будаўніцтву. За 1966—1970 гады намечана пабудаваць 2,5 мільёна квадратных метраў жылой плошчы, 35 школ, звыш 130 магазінаў і каля 170 прадпрыемстваў грамадскага харчавання. На плошчы Леніна плануецца ўзвесці 16-павярховы вучэбны корпус педінстытута імя А. М. Горкага, рэканструяваць вучэбны корпус медыцынскага інстытута і будынак гасцініцы «Мінск». Адной з лепшых вуліц пасля Ленінскага праспекта стане Паркавая магістраль. Тут будуць пабудаваны 12-павярховая гасцініца «Інтурыст», Дом мадэлей, вышынныя будынкі грамадскага назначэння і комплекс 9—12-павярховых жылых дамоў. Новы мікрараён з 9—16-павярховымі дамамі ўзнікне ў бліжэйшыя два гады на месцы былога балота і раней існаваўшай вёскі Будзілава. Прыгожы ансамбль пабудоў узводзіцца ля самага ўезда ў горад з боку Маскоўскай шашы. Там, дзе цяпер знаходзіцца вёска Вялікая Слепня, з'явіцца жылы раён, забудаваны 9—16-павярховымі будынкамі. З процілеглага боку праспекта ўзводзяцца мемарыяльны комплекс і рэспубліканская выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі, а на месцы

цяперашняга Слепянскага ляснога масіву намячаецца стварыць заапарк.

Значна палепшацца за гэтыя гады ўмовы для арганізацыі спартыўна-масавай работы сярод насельніцтва. У раёнах трактарнага завода і вуліцы Жукоўскага будуць пабудаваны новыя стадыёны. Уступяць у строй плавальныя басейны Інстытута фізкультуры, па вуліцы Даўгабродскай і ў пасёлку трактаразаводцаў.

Вялікая ўвага ў пяцігодцы будзе ўдзелена развіццю гарадскога пасажырскага транспарту, азеляненню вуліц, арганізацыі загароднага адпачынку насельніцтва. Вакол сталіцы, у радыусе 15—20 кіламетраў, намячаецца стварыць вадасховішчы на рэках Вяча і Волма плошчай звыш 7000 гектараў, у выніку чаго горад будзе акружаны своеасаблівым водным кальцом, якое радыкальна пераўтворыць прыродны ландшафт і дазволіць стварыць прыкладна 20 раёнаў масавага адпачынку працоўных. У апошнім годзе пяцігодкі ў Мінск прыйдзе вілейская вада і завершыцца ўзвядзенне Вілейска-Мінскай воднай сістэмы, якая ператворыць Свіслач у паўнаводную раку і палепшыць яе санітарны стан.

Прадугледжаныя на пяцігоддзе задачы цалкам ажыццявімыя. Рэальнасць іх выканання грунтуецца на спалучэнні строга навуковай сістэмы гаспадарання з высокім узроўнем тэхнічнай аснашчанасці прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту і будоўляў і на велізарным працоўным энтузіязме рабочых, ІТР і служачых сталіцы. Працоўныя Мінска поўныя ўпэўненасці ў сваіх сілах і з вялікім творчым уздымам змагаюцца за ажыццяўленне задач, намечаных Праграмай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Паўсюдна разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 50-й гадавіны Вялікага Кастрычніка і 900-годдзя Мінска праходзіць у абстаноўцы высокага палітычнага і працоўнага ўздыму і напоўнена выдатнымі дасягненнямі ва ўсіх сферах гаспадарчага і культурнага жыцця. Разам з усім савецкім народам працоўныя беларускай сталіцы дабіваюцца ўсё новых і новых поспехаў у будаўніцтве камуністычнага грамадства ў СССР.

ХРОНІКА ВАЖНЫХ ПАДЗЕЙ З ГІСТОРЫІ МІНСКА

1067, 3 сакавіка. Першае летапіснае ўпамінанне аб Мінску.

1084. Захоп і разбурэнне Мінска войскамі Вялікага князя Кіеўскага Уладзіміра Манамаха.

1104. Першае летапіснае ўпамінанне аб Мінску як цэнтры ўдзельнага княства.

1104, канец. Напад на Мінск Кіеўскага князя Святаполка.

1116. Асада Мінска войскам Вялікага князя Кіеўскага Уладзіміра Манамаха.

1119. Новы паход Уладзіміра Манамаха, паланенне Глеба Усяславіча і далучэнне Мінска да сваіх уладанняў.

1146. Княжанне ў Мінску сына Глеба Усяславіча — Расціслава.

1159. Паход на Мінск Рагвалода Барысавіча ў саюзе з чарнігаўскім князем Святаславам Ольгавічам.

1326. Падпарадкаванне Мінскага княства ўладзе Вялікага літоўскага князя.

1433. Спаленне Мінска ў выніку нашэсця літоўскіх войск на чале з князем Свідрыгайлам.

1444. Упамінанне Мінска ва Указе караля Казіміра як аднаго з 15 лепшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага.

1499, 14 сакавіка. Горад атрымаў самакіраванне па Магдэбургскаму праву.

1505. Напад крымскіх татар. Моцная эпідэмія ў горадзе.

1508. Асада горада.

1513. Першае ўпамінанне аб адкрыцці медыцынскай установы — «шпіталя».

1547. Моцны пажар, які знішчыў амаль увесь горад.

1552.	Першае ўпамінанне аб утварэнні цэхаў.
1569.	Люблінская унія.
1569.	Мінск — цэнтр ваяводства.
1571.	Прывілей гораду на наладжванне двух кірмашоў у год.
1582.	Стварэнне езуітамі сваёй школы («калегіі»).
1590, 8 лютага.	Скліканне агульнага сходу гарадской абшчыны.
1591.	Першае ўпамінанне аб царкоўных брацтвах.
1591.	Утварэнне цэха металістаў.
1592.	Заснаванне першага брацтва пры Саборнай царкве.
1592.	Выдзяленне з цэха металістаў і ўтварэнне цэха ювеліраў.
1592.	Утварэнне цэха краўцоў.
1593.	Адкрыццё другога «шпіталя».
1597, 1 сакавіка.	Выступленне гараджан супраць уніяцкага мітрапаліта Міхаіла Рагозы.
1599.	Адкрыццё трэцяга «шпіталя».
XVI стагоддзе, канец.	Мінск меў тры рынкі: Ніжні (у раёне Нямігі), Верхні (цяпер плошча Свабоды) і Троіцкі (цяпер плошча каля оперна га тэатра).
1603.	Моцная эпідэмія.
1609.	Утварэнне цэха шаўцоў (абутнікаў).
1612—1613.	Заснаванне пры Петрапаўлаўскім брацтве школы.
1613.	Утварэнне брацтва пры Петрапаўлаўскай царкве.
1616.	Узнікненне саборнага брацтва.
1616, 23 жніўня.	Напад гараджан на уніяцкі манастыр пад кіраўніцтвам краўца Данілы Палавінкі.
1617.	Адкрыццё уніяцкай школы пры Казьмадзям'янскім манастыры.
1622.	Утварэнне цэха рымароў.
1633.	Моцная эпідэмія.
1633.	Адкрыццё чацвёртага «шпіталя» пры Петрапаўлаўскім брацтве.
1635.	Урачы горада ўтварылі цэх цырульнікаў.
1647.	Утварэнне цэха кушняроў.
1655, 3 ліпеня.	Уступленне ў горад рускіх войск у ходзе руска-польскай вайны.
1655.	Моцная эпідэмія.
1659.	Адкрыццё аптэкі.
1694.	Пажар у Мінску, які знішчыў значную частку горада.
1696.	Устанаўленне ў Рэчы Паспалітай абавязковага вядзення справаводства ва ўсіх дзяржаўных установах толькі на польскай мове.
XVII стагоддзе, канец.	Утварэнне падмайстрамі горада сваёй арганізацыі.
1706.	Моцная эпідэмія.

1707, май.	Захоп Мінска шведскімі войскамі.
1707—1711.	Моцная эпідэмія.
1727.	У Мінску існавала школа пры кляштары дамініканцаў.
1771.	У Троіцкім прадмесці адкрылася школа пры кляштары марыавітак, у якой навучалі мове, арыфметыцы і дамаводству.
1783.	Упершыню складзен план забудовы Мінска.
1791.	Адкрыццё ваеннага лазарэта літоўскага войска.
1793.	Уключэнне Мінска ў склад Расіі.
1793, 23 красавіка.	Указ аб утварэнні мінскага намесніцтва.
1795, 6 верасня.	Уключэнне Мінска ў агульнарасійскую сетку паштовай сувязі.
1796, снежань.	Мінск — галоўны горад Мінскай губерні.
1800.	Распрацоўка першага праекта планіроўкі Мінска.
1812, 26 чэрвеня.	Акупацыя горада французскімі захопнікамі.
1820.	Закрыццё езуіцкай школы.
1821.	У Мінску некаторы час жылі відныя дзеячы «Северного общества» М. М. Мураўёў і А. А. Бястужаў-Марлінскі. М. М. Мураўёў напісаў першы варыянт сваёй канстытуцыі, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «Мінскі варыянт».
1835, 30 мая.	У час кантрактовага кірмашу адбыўся вялікі пажар, які знішчыў амаль усю цэнтральную частку горада.
1838.	У Мінскай друкарні друкаваліся «Минские губернские ведомости».
1840, 18 жніўня.	Указ Мікалая I аб забароне ўжывання тэрмінаў «Беларусь», «беларусы».
1841, 10 кастрычніка.	Аматарскім тэатрам упершыню выканана камічная опера Манюшкі «Рэкруцкі набор», адну з роляў у якой выканаў Дунін-Марцінкевіч.
1843.	У горадзе пастаўлена опера Манюшкі «Латарэя».
1846.	Надрукаваны і выдадзены асобнай кнігай «Граматы і акты Мінскай губерні».
1846.	Акцёр Вяржбіцкі стварыў трупу, якая паклала пачатак пастаяннаму Мінскаму гарадскому тэатру.
1848.	У горадзе каля трох месяцаў лютавала эпідэмія халеры, ад якой памерла 1100 чалавек.
1848.	У Мінску налічвалася 14 навучальных устаноў, у якіх працавала 90 настаўнікаў і навучалася 1430 вучняў.
1849, жнівень.	Судовы працэс па справе капітана А. Гусева і яго 13 таварышоў, абвінавачаных у арганізацыі «бунту» супраць цара і ўлад.
1863, з 18 па 19 красавіка.	Мінская арганізацыя атрымала загад ад Віленскага камітэта пачаць паўстанне.

1869.	Закрыццё каталіцкай духоўнай семінарыі.
1873.	Адкрыццё Мінскага камерцыйнага банка.
1874.	У горадзе пабудавалі водаправод.
1875 — пачатак 1876.	Стварэнне народніцкага гуртка.
1876, сакавік.	Першае буйнае выступленне рабочых мінскіх майстэрняў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі.
1879.	У горадзе было 42 прамысловых прадпрыемствы, у тым ліку 7 фабрык, на якіх працавала 165 рабочых. Самым буйным была тытунёвая фабрыка з 35 рабочымі.
1880.	Адкрыццё рэальнага вучылішча.
1880.	У Мінску налічвалася 89 вуліц і завулкаў, 14 урочышч.
1881.	Адкрыццё аддзялення Дзяржаўнага банка.
1885, 1 сакавіка.	Заснаван гарбарны завод Імрата, на якім працавала 42 рабочых.
1886, лета.	Забастоўка рабочых шпалерна-набіўной фабрыкі і дзвюх буйных майстэрняў горада.
1887, канец.	Сацыял-дэмакраты Мінска наладзілі непасрэдную сувязь з групай «Вызваленне працы».
1888, красавік.	Арганізаваная забастоўка рамесных рабочых слясарна-кавальскіх майстэрняў.
1890.	У Мінску наладжана тэлефонная сувязь.
1890, 5 чэрвеня.	Адкрыццё гарадскога тэатра (цяпер будынак тэатра імя Я. Купалы).
1890.	Узнікненне «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў», якое стала цэнтрам літаратурнага і тэатральна-музычнага жыцця горада.
1892, 10 мая.	Адкрыццё конкі.
1895, 12 студзеня.	Пачала працаваць электрастанцыя, якая асвятляла частку цэнтральных вуліц.
1895, 28 студзеня — 14 сакавіка.	Забастоўка рабочых у майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі.
1895.	На прадпрыемствах дзейнічала 11 паравых машын магутнасцю ў 248 конскіх сіл.
1895.	Адкрыццё радзільнага дома на 12 месц.
1895.	Мінскія сацыял-дэмакраты наладзілі сувязь з пецярбургскім «Саюзам барацьбы».
1895.	У горадзе ўпершыню адзначаўся дзень міжнароднай салідарнасці — 1 Мая.
1896.	Рабочыя правялі першую нелегальную масоўку, на якой прысутнічала да 300 чалавек.
1898, 1—3 сакавіка.	У Мінску адбыўся I з'езд РСДРП.
80—90-я гады.	У Мінску выдаваліся газеты «Мінскі лісток» і «Мінскія губернскія ведамасці».

1900, 1 мая.	Забастоўка мінскіх рабочых.
1900, 25 снежня.	Адкрыццё гарадской публічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна, арганізаванай пры садзейнічанні «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў».
1901.	Утварэнне Мінскай іскраўскай групы.
1901, 16 верасня.	Дэманстрацыя ў знак спачування палітычным вязням, якіх адпраўлялі з Мінскай турмы ва Усходнюю Сібір.
1901, 1 снежня.	Мінск аб'яўлен у становішчы «ўзмоцненай аховы».
1902.	У горадзе пачала выходзіць рэвалюцыйна-дэмакратычная газета «Северо-Западный край».
1902.	Дзень 1 Мая рабочыя адзначылі масавай дэманстрацыяй, якая праходзіла пад лозунгам «Далоў царскае самадзяржаўе!» У горадзе былі распаўсюджаны рэвалюцыйныя лістоўкі з палітычнымі патрабаваннямі.
1903.	Утварэнне Мінскай групы РСДРП.
1903.	Крах «зубатаўшчыны» ў Беларусі.
1904, сакавік.	Утварэнне Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП.
1904, 27 мая.	Забастоўка рабочых машынабудаўнічага завода Ліўшыца і Якабсона.
1904.	Гастролі групы артыстаў Малага тэатра на чале з А. А. Яблачкінай.
1905, 11—13 студзеня.	Баставала большасць фабрык і заводаў. Агульная колькасць стачачнікаў перавышала дзве тысячы.
1905, люты — сакавік.	Забастоўкі рабочых.
1905, чэрвень.	Закрыццё царскімі ўладамі газеты «Северо-Западный край».
1905, 28 чэрвеня.	Палітычная забастоўка пратэсту рабочых супраць крывавых злачынстваў царызму ў Лодзі.
1905, 29 ліпеня.	Дэманстрацыя рабочых горада.
1905, кастрычнік.	У Мінску зноў пачала выходзіць газета «Северо-Западный край».
1905, кастрычнік.	Утварэнне кааліцыйнага камітэта для кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой Мінскіх рабочых.
1905, кастрычнік.	Усеагульная стачка ў Мінску.
1905, 18 кастрычніка.	Вызваленне палітычных вязняў у Мінску. Курлоўскі расстрэл.
1905, 15 лістапада.	У горадзе адбылася гарадская партыйная канферэнцыя, якая прыняла новы статут Мінскай арганізацыі РСДРП.
1905, 15—16 лістапада.	Забастоўка паштова-тэлеграфных служачых.
1905, лістапад.	У газеце «Северо-Западный край» надрукаваны артыкул У. І. Леніна «Дробнабуржуазны і пралетарскі сацыялізм» пад назвай «Марксізм і неанародніцтва».
1905, снежань.	Закрыццё газеты «Северо-Западный край» у другі раз.

1905, снежань.	Усеагульная палітычная забастоўка рабочых.
1905, снежань.	Утварэнне аддзела «Союза 17 октября» са сваім друкаваным органам — газетай «Мінскае слова».
1906, студзень.	Палітычная стачка рабочых.
1906, жнівень.	Адкрыта літаратурна-атэістычнае таварыства.
1906, жнівень.	Закрыццё «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў».
1907, май.	Забастоўка рабочых машынабудаўнічых заводаў, друкароў, рамеснікаў, будаўнікоў.
1908.	Утварэнне царкоўнага гістарычна-археалагічнага камітэта.
1908.	Рабочыя некаторых прадпрыемстваў горада адзначылі палітычнай стачкай дзень Міжнароднай салідарнасці працоўных — 1 Мая.
1908, кастрычнік.	Стачка на машынабудаўнічых заводах.
1910.	Адкрыццё таварыствам руска-амерыканскай механічнай вытворчасці абутку абутковай фабрыкі «Арол», на якой працавала 160 рабочых.
1910.	На вуліцах з'явіліся першыя аўтамабілі, матацыклы.
1911, 14 сакавіка.	Мінская гарадская дума атрымала правы і абавязкі павятовага земскага сходу, а гарадская ўправа — павятовай земскай управы.
1912, 12 красавіка.	Забастоўка рабочых 17 слясарна-кавальскіх майстэрняў, якая працягвалася 4 тыдні.
1913.	Заснаванне Паўночна-Заходняга камерцыйнага банка і аддзялення Віленскага камерцыйнага банка.
1913, 2-я палова ліпеня.	Забастоўка рабочых фабрыкі «Труд». Спыненне работы ў абутковых саматужна-рамесных майстэрнях.
1914, 18 ліпеня.	Увядзенне ваеннага становішча ў Мінскай губерні.
1915.	У горадзе даваў канцэрт выдатны спявак А. Собінаў.
1915, лета.	Узнавіла сваю дзейнасць Мінская арганізацыя РСДРП.
1916, канец.	У Мінск прыбыў відны дзеяч бальшавіцкай партыі М. В. Фрунзе.
1917, пачатак года.	М. В. Фрунзе ўзначаліў буйную рэвалюцыйную арганізацыю з цэнтрам у Мінску, якая мела свае аддзяленні ў III і X арміях Заходняга фронту.
1917, 1 сакавіка.	У Мінску атрымана паведамленне аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе.
1917, у ноч з 1 на 2 сакавіка.	Скліканне тэрміновага пасяджэння ініцыятыўнай групы бальшавікоў Мінска сумесна з прадстаўнікамі III і X армій, на якім прысутнічалі М. В. Фрунзе, В. Г. Кнорын, К. І. Ландэр і інш.
1917, 2 сакавіка.	Раззбраенне мінскай паліцыі рабочымі пад кіраўніцтвам М. В. Фрунзе і вызваленне з турмы палітычных вязняў.
1917, 4 сакавіка.	Узнікненне Савета рабочых дэпутатаў, які стварыў свой

друкаваны орган — газету «Известия Минского Совета». Адным з рэдактараў газеты быў М. В. Фрунзе.

1917, 4 сакавіка. Пад кіраўніцтвам М. В. Фрунзе адбыўся першы легальны сход бальшавікоў горада і прадстаўнікоў партыйных арганізацый III і X армій Заходняга фронту.

1917, 4 сакавіка. Стварэнне гарадской міліцыі на чале з М. В. Фрунзе.

1917, 5 сакавіка. Утварэнне Мінскага Савета салдацкіх дэпутатаў.

1917, 5 сакавіка. Выйшаў першы нумар газеты «Известия Минского Совета».

1917, 5 сакавіка. Першае пасяджэнне Мінскага Савета рабочых дэпутатаў.

1917, 6 сакавіка. Масавая дэманстрацыя рабочых і салдат пад бальшавіцкімі лозунгамі.

1917, 8 сакавіка. Адбылося сумеснае пасяджэнне Мінскага Савета рабочых і Савета салдацкіх дэпутатаў, дзе было вырашана стварыць адзіны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

1917, 8 сакавіка. Мінскі Савет прыняў пастанову аб стварэнні ў воінскіх часцях салдацкіх камітэтаў, якія падпарадкоўваліся Савету.

1917, 9 сакавіка. На агульным сходзе Мінскага Савета і рабочых горада па прапанове бальшавікоў была прынята пастанова аб неадкладным утварэнні фабрычна-заводскіх камітэтаў, прафесіянальных саюзаў і палітычных клубаў, а таксама вясковых валасных і павятовых сялянскіх камітэтаў.

1917, 11—18 сакавіка. Арганізацыя прафесіянальных саюзаў чыгуначнікаў, друкароў, лекараў, сталяроў і рабочых іншых спецыяльнасцей.

1917, 17 сакавіка. Пастанова Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў аб увядзенні 8-гадзіннага рабочага дня на прадпрыемствах.

1917, 19 сакавіка. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў прыняў па прапанове бальшавікоў рашэнне аб арганізацыі Франтавога камітэта.

1917, 7 красавіка. Адбыўся I франтавы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту.

1917, 18 красавіка (1 мая). Першамайскі мітынг і дэманстрацыя.

1917, 20—23 красавіка. I з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў пад старшынствам М. В. Фрунзе.

1917, 23 красавіка. Рабочыя мінскіх друкарняў явачным парадкам увялі 8-гадзінны рабочы дзень.

1917, 19 мая. Утварэнне бальшавіцкай фракцыі ў Мінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

1917, 23 мая. Адкрыццё абласнога з'езду Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Мінскай, Віцебскай і Віленскай губерняў.

1917, 4 чэрвеня. Адбыўся сход бальшавікоў, на якім быў выбраны Мінскі гарадскі камітэт РСДРП(б) на чале з А. Ф. Мясніковым.

1917, 12 чэрвеня. Арганізацыя прафсаюза рабочых лесапільных заводаў.

1917, 18 чэрвеня.	Дэманстрацыя рабочых і салдат супраць Часовага ўрада і наступленне на фронце.
1917, 25 чэрвеня.	Утварэнне прафсаюза рабочых-металістаў.
1917, 25—28 чэрвеня.	Забастоўка рабочых пэндзаля-шчотачнай фабрыкі.
1917, 17 ліпеня.	Мінскі камітэт РСДРП(б) апублікаваў адозву да працоўных аб падтрымцы рэвалюцыйных патрабаванняў бальшавікоў.
1917, 27 ліпеня.	Агульны сход Мінскай партыйнай арганізацыі бальшавікоў па пытанню аб бягучым моманце прымае рэзалюцыю ЦК, Петраградскага і Маскоўскага камітэтаў РСДРП(б).
1917, 27 ліпеня.	Выйшаў першы нумар бальшавіцкай газеты «Звезда».
1917, 30 ліпеня.	Адкрыццё II з'езду сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў пад старшынствам М. В. Фрунзе.
1917, 5 жніўня.	Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў прымае рэзалюцыю аб неадкладнай адмене пакарання смерцю.
1917, 9—14 жніўня.	Забастоўка рабочых на фабрыцы «Энергас».
1917, 14 жніўня.	Агульны сход бальшавікоў Мінска адобрыў усе рашэнні VI з'езду РСДРП(б).
1917, 17 жніўня.	Адозва Мінскага камітэта РСДРП(б) да ўсіх партыйных арганізацый аб скліканні 1 верасня абласной канферэнцыі РСДРП(б).
1917, 17—20 жніўня.	Забастоўка друкарскіх рабочых.
1917, 19 жніўня.	Зварот Мінскага камітэта РСДРП(б) да насельніцтва горада аб выбранні бальшавікоў у Савет.
1917, 20 жніўня.	Агульнагарадская канферэнцыя бальшавікоў.
1917, 25 жніўня.	Распараджэннем Часовага ўрада закрыта бальшавіцкая газета «Звезда».
1917, 28 жніўня.	Мінскім Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў створан Рэвалюцыйны камітэт для барацьбы з карнілаўшчынай.
1917, 4—6 верасня.	Забастоўка рабочых гарбарных прадпрыемстваў пад кіраўніцтвам прафсаюза.
1917, 5 верасня.	Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў прымае рэзалюцыю бальшавікоў аб перадачы памешчыцкіх зямель сялянскім камітэтам.
1917, 15 верасня.	Выйшаў першы нумар газеты «Молот» замест закрытай «Звезды».
1917, 15—18 верасня.	Адбылася I Паўночна-Заходняя абласная і франтавая канферэнцыя РСДРП(б).
1917, 5—7 кастрычніка.	Адбылася II Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б).
1917, 6 кастрычніка.	Распараджэннем Часовага ўрада закрыта газета «Молот».
1917, 8 кастрычніка.	Выйшаў першы нумар газеты «Буревестник» замест закрытага «Молота».
1917, 22 кастрычніка.	Урачыстае пасяджэнне Мінскага Савета рабочых і салдат-

кіх дэпутатаў, прысвечанае гадавіне ўтварэння першага Савета ў 1905 годзе.

1917, 25 кастрычніка (7 лістапада). Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пераход улады ў рукі Саветаў. Адкрыццё II Усерасійскага з'езду Саветаў у Петраградзе.

У Мінску раніцай выйшла газета «Буревестник» з заклікам перадаць усю ўладу Саветам. У 12 гадзін дня атрымана паведамленне Петраградскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта аб звяржэнні Часовага ўрада.

1917, 25 кастрычніка (7 лістапада). Вызваленне палітычных вязняў з мінскай турмы. Стварэнне першага імя Мінскага Савета рэвалюцыйнага палка.

1917, 25 кастрычніка (7 лістапада). Загад № 1 Выканкома Мінскага Савета аб пераходзе ўсёй улады ў горадзе ў рукі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

1917, 27 кастрычніка (9 лістапада). Пры Мінскім Савеце створан Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Беларусі і Заходняга фронту на чале з А. Ф. Мясніковым.

1917, 1 лістапада. Зноў пачала выдавацца газета «Звезда».

1917, 2 лістапада. Загад Мінскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта аб роспуску контррэвалюцыйнага «Комитета спасения революции».

1917, 18—20 лістапада. III з'езд сялянскіх Саветаў Мінскай і Віленскай губерняў.

1917, 20 лістапада. II з'езд армій Заходняга фронту.

1917, 25 лістапада. Маніфестацыя салдат, рабочых і сялян у азнаменаванне першых буйных поспехаў у барацьбе за мір.

1917, лістапад — снежань. Увядзенне на ўсіх прамысловых прадпрыемствах 8-гадзіннага рабочага дня.

1917, 19 снежня. Масавая дэманстрацыя рабочых і салдат супраць імперыялістычнай вайны, за падтрымку ўлады Саветаў.

1917, 23 снежня. Адкрыццё III Надзвычайнай Паўночна-Заходняй канферэнцыі РСДРП(б).

1917, 7—11 студзеня. I абласны з'езд зямельных камітэтаў Мінскай і Віленскай губерняў.

1918, 22 студзеня. Пасяджэнне Мінскага Савета, на якім быў зацверджаны дэкрэт аб роспуску гарадской думы, управы і гарадскога харчовага камітэта.

1918, 23 студзеня (5 лютага). Пастанова Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў аб роспуску гарадской думы і ўправы.

1918, (1) 14 лютага [1]. Адкрыццё народнага універсітэта.

1918, 18—19 лютага. Рашэнне Саўнаркома Заходняй вобласці аб эвакуацыі ўсіх партыйных, савецкіх і ваенных устаноў у Смаленск.

1918, 21 лютага. Акупацыя горада нямецкімі войскамі.

[1] З 1 лютага 1918 года даты даюцца па новаму стылю.

1918, 28 лютага.	Падпольны сход камуністаў. Стварэнне Мінскага падпольнага камітэта РСДРП(б).
1918, сакавік.	Двухтыднёвая забастоўка дрожджа-вінакурных заводаў.
1918, 1 мая.	Першамайская дэманстрацыя, масавыя арышты яе ўдзельнікаў нямецкімі акупантамі.
1918, 17 мая.	Распараджэнне германскіх улад аб закрыцці ўсіх прафсаюзаў, рабочых арганізацый, аб забароне сходаў і мітынгаў.
1918, 15 ліпеня.	Адкрыццё першай падпольнай канферэнцыі РКП(б) Мінскага раёна.
1918, 12 кастрычніка.	Выйшаў першы нумар газеты «Подпольная правда», орган падпольнага камітэта Камуністычнай партыі Літвы і Беларусі.
1918, 5 снежня.	Выбары (падпольнага) Мінскага Савета рабочых дэпутатаў.
1918, 10 снежня.	Вызваленне Мінска ад нямецкіх захопнікаў.
1918, 10 снежня.	Загад Мінскага ваеннага Савета аб утварэнні Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.
1918, 10 снежня.	Загад № 1 Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта аб пераходзе ўсёй улады ў яго рукі і роспуску ўрада беларускіх памешчыкаў і капіталістаў «Беларускай рады».
1918, 23 снежня.	Рашэнне ЦК РКП(б) аб утварэнні БССР.
1918, снежань.	Стварэнне камсамольскай арганізацыі.
1918, 30 снежня.	Адкрыццё ў Смаленску VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) (I з'езд КП(б)Б).
1919, 1 студзеня.	Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Апублікаванне маніфеста Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі.
1919, 5 студзеня.	Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад БССР пераехаў з Смаленска ў Мінск.
1919, 19 студзеня.	Выйшаў першы нумар газеты «Известия Временного рабоче-крестьянского советского правительства Белоруссии».
1919, 2—4 лютага.	I з'езд Саветаў Беларускай ССР.
1919, 3 сакавіка.	Напад буржуазнай Польшчы на Савецкую краіну.
1919, 13 красавіка.	Адбылася першая нарада дэлегатаў прадстаўнікоў бальшавіцкіх арганізацый Мінскай губерні з удзелам усіх камуністаў горада.
1919, 8 мая.	Створан I Мінскі рабочы полк для абароны горада ад польскіх інтэрвентаў.
1919, май.	Створан Камітэт рабочай абароны Мінска.
1919, 9 чэрвеня.	Пачаліся лекцыі ў народным універсітэце.
1919, 20 чэрвеня.	Прыбыццё ў Мінск М. І. Калініна.
1919, 20 чэрвеня.	Аб'яднанае пасяджэнне ЦВК Літвы і Беларусі, Мінскага Савета і праўлення прафесіянальных саюзаў з удзелам М. І. Калініна.

1919, чэрвень.	Прыбыццё на Заходні фронт Сяргея Арджанікідзе.
1919.	Створаны абласны музей.
1919, 8 жніўня.	Акупацыя горада польскімі інтэрвентамі.
1919, сярэдзіна жніўня.	Створаны падпольны Мінскі камітэт КП(б) Літвы і Беларусі.
1919, 3 верасня.	Рашэнне ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі аб мабілізацыі сіл на паўстанцкі рух супраць польскіх акупантаў.
1920, 14 мая.	Пачатак контрнаступлення Чырвонай Арміі на беларускім фронце.
1920, чэрвень.	Выступленне салдат польскага палка, размешчанага ў Мінску, у падтрымку Савецкай улады.
1920, 11 ліпеня.	Вызваленне Мінска Чырвонай Арміяй ад польскіх інтэрвентаў.
1920, 25 жніўня.	На станцыі Мінск адбыўся камуністычны суботнік, у якім прынялі ўдзел 793 чалавекі.
1920, 26 жніўня.	Адбылася першая канферэнцыя рабочых кааператываў Беларусі.
1920, 14 верасня.	Адкрыццё Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра (цяпер Акадэмічны тэатр імя Я. Купалы).
1920, 24—27 верасня.	I з'езд камсамола Беларусі.
1920, 6 лістапада.	Агульнагарадскі суботнік, у якім прынялі ўдзел звыш 3000 чалавек.
1920, 22—25 лістапада.	III з'езд КП(б)Б.
1920, 13—17 снежня.	II з'езд Саветаў Беларусі.
1921.	Адкрыццё Беларускага дзяржаўнага політэхнікума.
1921, 20 лютага.	Уступіў у строй дзеючых чыгуначны завод «Энергія».
1921, 25 лютага — 2 сакавіка.	IV з'езд КП(б) Беларусі.
1921, 7—13 мая.	I з'езд прафсаюзаў БССР.
1921, 12 чэрвеня.	Пачаў даваць прадукцыю лесапільны завод «Дрэваапрацоўшчык».
1921, 30 ліпеня.	Масавы камуністычны суботнік.
1921, 15—20 кастрычніка.	V з'езд КП(б) Беларусі.
1921, 30 кастрычніка.	Адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта.
1921, 13 лістапада.	Адкрыццё будаўнічага тэхнікума.
1921, 10—16 снежня.	III з'езд Саветаў БССР.
1922.	Створан Інстытут беларускай культуры.
1922, 15—19 сакавіка.	VI з'езд КП(б) Беларусі.
1922, 13 верасня.	Адкрыццё Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі.
1922, 24 лістапада.	Створан Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КП(б) Беларусі.
1922, 14—18 снежня.	IV Усебеларускі з'езд Саветаў. Прыняццё дэкларацыі аб неабходнасці аб'яднання ўсіх савецкіх рэспублік у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

1923.	Заснаваны Дом-Музей I з'езду РСДРП.
1923.	Стварэнне сельскагаспадарчага інстытута.
1923, 20—24 сакавіка.	VII з'езд КП(б) Беларусі.
1924, 9—15 студзеня.	V з'езд Саветаў БССР.
1924, 13—16 сакавіка.	VI Надзвычайны з'езд Саветаў Беларусі, на якім выступіў Старшыня ЦВК СССР М. І. Калінін.
1924, 12—14 мая.	VIII з'езд КП(б) Беларусі. Увядзенне новага акруговага і раённага адміністрацыйнага дзялення БССР.
1925, 14 кастрычніка.	Адкрыццё Камуністычнага універсітэта імя Леніна.
1925, 3—11 мая.	VII з'езд Саветаў БССР.
1925, кастрычнік.	Пачала працаваць першая шырокавяшчальная радыёстанцыя імя Савета Народных Камісараў БССР.
1925, 8—12 снежня.	IX з'езд КП(б) Беларусі.
1926, май.	Адкрыццё Музея рэвалюцыі.
1927, 3—10 студзеня.	X з'езд КП(б) Беларусі.
1927, 5—12 красавіка.	VIII з'езд Саветаў БССР. Прыняццё новай Канстытуцыі БССР.
1927, 8 чэрвеня.	Масавы мітынг пратэсту працоўных супраць правакацыйных падкопаў імперыялістаў.
1927, кастрычнік.	Адкрыццё рабочага факультэта універсітэта.
1927, 22—29 лістапада.	XI з'езд КП(б) Беларусі.
1929, 1 студзеня.	Заснаванне Акадэміі навук Беларускай ССР.
1929, 28 студзеня.	Гарбарнаму заводу «Бальшавік» уручан рэспубліканскі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.
1929, 9 лютага.	Заводу «Энергія» ўручан рэспубліканскі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.
1929, 15—16 лютага.	XII з'езд КП(б) Беларусі.
1929, 5 сакавіка.	Мінская цэнтральная балотная станцыя ўзнагароджана рэспубліканскім ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.
1929, 4 мая.	Заключан першы сацыялістычны дагавор паміж рабочымі сямі буйных гарбарных і абутковых прадпрыемстваў Мінска, Гомеля, Віцебска і Магілёва.
1929, 8—15.	IX з'езд Саветаў БССР. Прыняццё першага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР.
1929, ліпень.	Уступіла ў строй дзеючых швейная фабрыка «Кастрычнік».
1929, 13 кастрычніка.	Пуск першага трамвая.
1929, 6 лістапада.	Уступіў у дзеянне гарадскі радыёвузел.
1930, 30 мая — 12 чэрвеня.	XIII з'езд КП(б) Беларусі.
1930, 10 жніўня.	Адкрыццё I Усебеларускай сельскагаспадарчай і прамысловай выстаўкі.
1930, 1 верасня.	Адкрыццё медыцынскага інстытута.
1930, 30 верасня.	Арганізавана беларуская оперная студыя.

1931.	
1931, 12 студзеня.	Адкрыццё педагагічнага і юрыдычнага інстытутаў.
1931.	Створан інстытут аспірантуры пры АН БССР.
1931, 2 мая.	Пачаў працаваць першы ў Беларусі тэатр рабочай моладзі.
1931, ліпень.	Уступіла ў строй новая кандытарская фабрыка «Камунарка».
1931, кастрычнік.	Закончана будаўніцтва клінічнага гарадка.
1932.	Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб развіцці камунальнай гаспадаркі Мінска.
1932, 23—29 красавіка.	Прысваенне Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна.
1932, верасень.	XIV з'езд КП(б) Беларусі.
1932, 23 кастрычніка.	Заснаванне Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.
1933, 21—25 сакавіка.	Адкрыўся Дом вучоных.
1933, 25 мая.	І Усебеларускі злёт калгаснікаў-ударнікаў.
1933, 1 ліпеня.	Адкрыццё Беларускага Дзяржаўнага вялікага тэатра оперы і балета.
1933, 7 лістапада.	Пастанова СНК БССР аб арганізацыі Беларускага політэхнічнага інстытута.
1934, 16—22 студзеня.	Адкрыццё ў горадзе помніка У. І. Леніну.
1934, чэрвень.	XV з'езд КП(б) Беларусі.
1934.	І з'езд савецкіх пісьменнікаў Беларусі.
1935, 14—23 студзеня.	Уступіла ў строй першая чарга Мінскай ЦЭЦ № 2.
1935, 15 сакавіка.	XI Усебеларускі з'езд Саветаў.
1935, кастрычнік.	Пастанова ЦВК СССР аб узнагароджанні Беларускай ССР за поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве ордэнам Леніна.
1935.	Пачатак стаханаўскага руху на прадпрыемствах.
1936.	Адкрыццё настаўніцкага інстытута.
1936, 5 сакавіка.	Адкрыццё дзіцячага гукавога кінатэатра.
1936, 25 жніўня.	Усебеларуская нарада перадавікоў сацыялістычнай жывёлагадоўлі.
1937, 19 лютага.	Гарадская нарада стаханаўцаў.
1937, 10—19 чэрвеня.	На Надзвычайным XII з'ездзе Саветаў БССР прынята новая Канстытуцыя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.
1937, 12 кастрычніка.	XVI з'езд КП(б) Беларусі.
1937, 25 кастрычніка.	Злёт стаханаўцаў на фабрыцы «Кастрычнік».
1938, 10—18 чэрвеня.	Адкрыццё Беларускай дзяржаўнай філармоніі.
1938, 26 чэрвеня.	XVII з'езд КП(б) Беларусі.
1939, 10 мая.	Выбары ў Вярхоўны Савет БССР.
1939, ліпень — жнівень.	Уступіў у строй новы будынак опернага тэатра.
1939, 8 лістапада.	На прадпрыемствах пачаўся рух шматстаночнікаў.
1940.	Адкрыццё Дзяржаўнай карціннай галерэі.
1940, 15 мая.	Распрацаваны генеральны план рэканструкцыі Мінска.
	Адкрыццё XVIII з'езду КП(б) Беларусі.

1940, кастрычнік.	Увайшоў у строй новы хлебазавод-аўтамат.
1940, лістапад.	Уступіў у строй дзеючых радыёзавод.
1941, 22 чэрвеня.	Вераломны напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
1941, 28 чэрвеня.	Гітлераўскія войскі ўварваліся ў Мінск.
1941, ліпень.	Пачала дзейнічаць падпольная партыйная арганізацыя на чыгуначным вузле.
1941, жнівень.	Створана падпольная партыйная арганізацыя ў раёне Камароўкі.
1941, кастрычнік.	Пачаў дзейнічаць падпольны гарком партыі.
1942, май.	Створана падпольная бальшавіцкая друкарня.
1942, май.	Пачала выходзіць газета «Звязда» — орган ЦК і Мінскага абкома КП(б) Беларусі.
1943, кастрычнік.	Пачала выходзіць газета «Минский большевик» — орган Мінскага гаркома партыі.
1944, 3 ліпеня.	Часці Савецкай Арміі вызвалілі Мінск ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
1944, 10 ліпеня.	Пачаў работу радыёзавод.
1944, 11 ліпеня.	Завершан разгром групоўкі нямецка-фашысцкіх захопнікаў, акружанай у раёне Мінска.
1944, ліпень.	Адноўлен хлебазавод «Аўтамат».
1944, 7 ліпеня.	Адноўлен радыёвузел Мінска.
1944, 16 ліпеня.	Мітынг працоўных горада і парад партызан вобласці.
1944, 16 ліпеня.	Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца вярнуўся ў Мінск.
1944, 18 ліпеня.	У Мінск пераехалі ЦК КП(б)Б, Саўнарком і Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР.
1944, жнівень.	Адкрыты кінатэатры «Першы», «Беларусь», «Радзіма».
1944, жнівень.	Створана спецыяльнае рамеснае вучылішча для дзяцей воінаў Савецкай Арміі і партызан.
1944, верасень.	Адноўлена і адкрыта карцінная галерэя БССР.
1944, 1 верасня.	Адноўлен станкабудаўнічы завод імя Кірава.
1944, 2 верасня.	Уступіла ў строй дзеючых стацыянарная рэспубліканская радыёстанцыя.
1944, 4 верасня.	Адбылася першая пасля вызвалення горада Сесія Мінскага гарадскога Савета.
1944, 17 верасня.	Вярнуўся Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета.
1944, 20 верасня.	Паведамленне Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Мінску.
1944, 1 кастрычніка.	Пачала работу абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна.
1944, 8 кастрычніка.	Адбыўся першы масавы нядзельнік па аднаўленню горада.
1944, 1 снежня.	Пачала работу рэспубліканская бібліятэка імя У. І. Леніна.

1945, люты.	З Гомеля ў Мінск пераведзен Дзяржаўны лесатэхнічны інстытут.
1945, люты.	Адноўлена работа Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга інстытут фізічнай культуры.
1945, сакавік.	Узнавілі работу Беларускі політэхнічны інстытут і інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава.
1945, май.	Здадзена ў эксплуатацыю першая лінія трамвая.
1945, 20 жніўня.	Адбылася XI сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных, на якой быў зацверджан бюджэт горада на 1945 год.
1945, лістапад.	Адкрыццё Беларускага тэатральнага інстытута.
1946, 15—20 студзеня.	Працэс па справе аб злачынствах, зробленых нямецкімі фашыстамі ў Беларускай ССР.
1946, 11 верасня.	VIII сесія Вярхоўнага Савета БССР першага склікання. Прыняцце закона «Аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946—1950 гады».
1947, 9 чэрвеня.	Мінскі волазавод выпусціў першую прадукцыю.
1947, ліпень.	Увайшоў у строй дзеючых Мінскі тонкасуконны камбінат.
1947, кастрычнік.	Мінскі аўтамабільны завод выпусціў першую прадукцыю.
1948, сакавік.	Адкрыўся пасля аднаўлення Дом-Музей І з'езду РСДРП.
1948, красавік.	Увайшоў у строй гіпсавы завод.
1948, 1 верасня.	Пачаў працаваць Мінскі інстытут замежных моў.
1949, 25 студзеня — 3 лютага.	Дэкада беларускай літаратуры ў Маскве.
1949, 15—18 лютага.	XIX з'езд КП(б) Беларусі.
1949, 20—24 чэрвеня.	II з'езд савецкіх пісьменнікаў БССР.
1950.	Мінскі трактарны завод выпусціў першую прадукцыю.
1950, 17 верасня.	Адкрыццё рэспубліканскай прамысловай выстаўкі.
1951, 25 лютага.	Выбары ў Вярхоўны Савет БССР.
1951, 6 лістапада.	Адкрыццё галоўнага ўнівермага.
1951.	Выпусціў першую прадукцыю Мінскі падшыпнікавы завод.
1952, 2 красавіка.	Дзяржаўнаму рускаму драматычнаму тэатру прысвоена імя М. Горкага.
1952, 20—23 верасня.	XX з'езд КП(б) Беларусі.
1953.	Пачалося будаўніцтва Мінскага камвольнага камбіната.
1953, люты.	Завершана будаўніцтва першай тралейбуснай лініі.
1954, 10—13 лютага.	XXI з'езд Кампартыі Беларусі.
1954, 1 верасня.	Адкрыццё інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.
1954, 15—18 верасня.	III з'езд савецкіх пісьменнікаў БССР.
1955.	Уступіў у строй дзеючых буйны завод жалезабетонных вырабаў.
1955, 11—21 лютага.	Дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве.

1955, 11 ліпеня.	Адкрыта Малая беларуская дзіцячая чыгунка.
1955, верасень.	Здадзена ў эксплуатацыю першая чарга Мінскага камвольнага камбіната.
1955, верасень.	Зацверджан Дзяржаўны гімн Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.
1955, 16 лістапада.	Здадзена ў эксплуатацыю першая чарга Мінскага гадзіннікавага завода.
1956, 1 студзеня.	Увайшоў у строй Мінскі тэлецэнтр.
1956, 12 студзеня.	Здадзен у эксплуатацыю будынак прыгараднага вакзала.
1956, 23 студзеня.	Упершыню ў Мінск прыбыў самалёт з матрыцамі газеты «Правда». Пачалося друкаванне газеты для абласцей рэспублікі.
1956, 24—27 студзеня.	XXII з'езд Кампартыі Беларусі.
1956, 10 красавіка.	Адкрыццё Тэатра юнага гледача.
1956, 3 ліпеня.	Адкрыццё Палаца культуры прафсаюзаў.
1956, 13 жніўня.	Памёр народны паэт Беларусі Якуб Колас.
1957, 1 студзеня.	Здадзен у эксплуатацыю новы хлебзавод.
1957, 2 сакавіка.	На Мінскім аўтазаводзе завершана зборка самага магутнага ў Еўропе аўтамабіля-самазвала МАЗ-530.
1957, красавік.	Пачаў выходзіць журнал ЦК ЛКСМБ «Вясёлка».
1957, 30 чэрвеня — 2 ліпеня.	І Усебеларускі фестываль моладзі.
1957, 31 жніўня.	Адкрыўся кінатэатр «Змена» з глядзельнай залай на 200 месц.
1957, 7 верасня.	Адкрылася новая дзіцячая паліклініка на Мінскім чыгуначным вузле.
1957, лістапад.	Адкрыццё Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.
1958, 21—22 студзеня.	Нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі Беларусі.
1958, 11 лютага.	XX з'езд камсамола Беларусі.
1958, 17 лютага.	Урачыстае адкрыццё новага будынка кансерваторыі.
1958, 14 сакавіка.	У Палацы культуры прафсаюзаў адбылася XII сесія Акадэміі медыцынскіх навук СССР.
1958, 21 мая.	На тыдзень літоўскай літаратуры ў Мінск прыехала вялікая група пісьменнікаў Літвы.
1958, 21—22 мая.	VIII з'езд прафсаюзаў Беларусі.
1958, 14 ліпеня.	Адкрыццё Дзён польскай культуры ў Беларусі.
1958, 26 верасня.	Адкрыццё Тыдня балгарскай музыкі ў Беларусі.
1958, 22 снежня.	Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні БССР другім ордэнам Леніна.
1959, 3 студзеня.	Урачыстае пасяджэнне Вярхоўнага Савета БССР і ЦК КПБ з прадстаўнікамі братніх савецкіх рэспублік, прысвечанае 40-годдзю БССР і КПБ. Уручэнне Беларускай ССР ордэна Леніна.

1959, 14—15 студзеня.	XXIII пазарговы з'езд КП Беларусі.
1959, 11 лютага.	На арэне цырка ўпершыню выступала беларуская цыркавая трупа.
1959, 12 лютага.	Адкрыццё IV з'езду савецкіх пісьменнікаў.
1959, 1 сакавіка.	Выбары ў Вярхоўны Савет Беларускай ССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.
1959, 5—6 сакавіка.	Першы ўстаноўчы сход журналістаў Беларускай ССР.
1959, 14 сакавіка.	Адкрыццё гарадскога Дома народнай творчасці.
1959, 2 красавіка.	Адкрыццё рэспубліканскай нарады работнікаў культуры.
1959, 18—22 красавіка.	III з'езд кампазітараў БССР.
1959, 25 лістапада.	Першы рэспубліканскі злёт членаў брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы.
1959, 17—18 снежня.	XXI з'езд камсамола Беларусі.
1960, 17—19 лютага.	XXIV з'езд Кампартыі Беларусі.
1960, красавік.	Мінскія трактаразаводцы адправілі першую вялікую партыю трактараў для Францыі.
1960, красавік.	З'езд мастакоў Беларусі.
1960, 10 мая.	Сустрэча прафсаюзнага актыву Мінска з членамі прафсаюзных дэлегацый Бельгіі, Балгарыі, Галандыі, Люксембурга, Францыі і Югаславіі.
1960, 14—25 мая.	Трэці Усесаюзны кінафестываль савецкіх фільмаў у Мінску.
1960, 17 мая.	Адкрыццё новага будынку літаратурнага музея Янкі Купалы.
1960, май.	Адкрыццё новага шырокаэкраннага кінатэатра «Ракета» на 500 месц.
1960, 11—13 жніўня.	Першы з'езд настаўнікаў Беларусі.
1960, 13 верасня.	Рэспубліканская нарада вынаходнікаў і рацыяналізатараў БССР.
1960, кастрычнік.	Адкрыццё навукова-даследчага інстытута анкалогіі і медыцынскай радыялогіі.
1960, 23 кастрычніка.	Сталіца Беларусі атрымала электраэнергію Васілевіцкай ДРЭС.
1960, 30 кастрычніка.	Датэрмінова ўведзен у дзеянне газаправод Дашава—Мінск.
1960, 4 лістапада.	IV з'езд хірургаў Беларусі.
1960, 22 снежня.	Мінскі аўтазавод адправіў першую партыю самазвалаў на Кубу.
1961, 19 сакавіка.	Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.
1961, 19 мая.	Першы рэспубліканскі злёт удзельнікаў грамадскіх канструктарскіх бюро.
1961, 14—15 чэрвеня.	Пятая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пятага склікання.
1961, 23 чэрвеня.	З галоўнага канвеера трактарнага завода сышоў 200-тысячны трактар «Беларусь».

1961, 26—28 верасня.	XXV з'езд Кампартыі Беларусі.
1962, 11—12 студзеня.	Рэспубліканская нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі.
1962, 20—21 лютага.	X з'езд прафсаюзаў Беларусі.
1962, 16—23 сакавіка.	IV з'езд кампазітараў Беларусі.
1962, красавік.	Завод аўтаматычных ліній наладзіў серыйную вытворчасць аўтаматычных ліній.
1962, 22 мая.	Уступіў у строй першы ў рэспубліцы даследчы ядзерны рэактар Інстытута энергетыкі Акадэміі навук БССР.
1962, 6—7 верасня.	Знаходжанне ў Мінску Генеральнага сакратара Французскай камуністычнай партыі Марыса Тарэза.
1963, 3 сакавіка.	Выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.
1963, красавік.	Міжзанальная канферэнцыя вучоных — эканамістаў Беларусі, Літвы, Эстоніі і паўночна-заходніх раёнаў нечарназёмнай зоны РСФСР.
1963, май.	Уведзен у строй Мінскі маторны завод па выпуску рухавікоў для трактара «Беларусь».
1963, жнівень.	Адкрыўся шырокаэкранны двухзальны кінатэатр «Радзіма» на 820 месц.
1963, 4 кастрычніка.	Адкрыўся магазін «Тысяча дробязей».
1963, лістапад.	Пабудавана рэспубліканская дзіцячая тэхнічная станцыя.
1963, 7 снежня.	Здадзен у эксплуатацыю электрыфікаваны чыгуначны ўчастак Мінск — Аляхновічы.
1964, 28 лютага.	VIII з'езд Саюза архітэктараў Беларусі.
1964, 3 красавіка.	Мінскі аўтамабільны завод выпусціў 200-тысячны аўтамабіль.
1964, 8 красавіка.	З канвеера Мінскага электратэхнічнага завода сышоў 100-тысячны трансфарматар.
1964, 5 лістапада.	Адкрыўся Цэнтральны ўніверсальны магазін «Мінск».
1965, 9 студзеня.	Адкрыццё Дэкады рускага мастацтва ў Беларусі.
1965, 21 студзеня.	Усесаюзная нарада работнікаў сельскагаспадарчай авіяцыі.
1965, 28 студзеня.	Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР вёска Курасоўшчына ўключана ў межы Мінска.
1965, 2 лютага.	Закончылася Усесаюзная навуковая нарада па ядзернай спектраскапіі і будове атамнага ядра.
1965, люты.	Адкрыццё Інстытута тэхнічнай кібернетыкі АН БССР.
1965, 21 сакавіка.	Адкрыццё III дэкады народнай творчасці Беларусі.
1965, красавік.	Пуск другога беларускага атамнага рэактара, пабудаванага пры Інстытуце цепла- і масаабмену АН БССР.
1965, 30 мая.	Стварэнне новага навуковага цэнтра — Навукова-даследчага інстытута эканомікі і эканоміка-матэматычных метадаў планавання пры Дзяржплане БССР.
1965, 8 чэрвеня.	VII з'езд Саюза мастакоў БССР.

1965, 16—17 чэрвеня.	V сесія Вярхоўнага Савета БССР шостага склікання.
1965, 21 чэрвеня.	III з'езд тэрапеўтаў Беларусі.
1965, 22 ліпеня.	Наведанне Мінска лётчыкам-касманаўтам СССР Андрыянам Нікалаевым.
1965, 29 ліпеня.	Адкрыццё Мінскага планетарыя.
1965, 18 жніўня.	Стварэнне ў саставе Акадэміі навук БССР Інстытута ядзернай энергетыкі.
1965, 21 кастрычніка.	VI сесія Вярхоўнага Савета БССР.
1966, 17 лютага.	Адкрыццё XXIII з'езду ЛКСМБ.
1966, 3—5 сакавіка.	XXVI з'езд Кампартыі Беларусі.
1966, 25 ліпеня.	Узнагароджанне трактарнага завода ордэнам Леніна.
1966, 29 ліпеня.	Урачыстае адкрыццё V Усесаюзных студэнцкіх гульняў.
1966, 20 жніўня.	Узнагароджанне аўтамабільнага завода ордэнам Леніна.
1966, 12—17 лістапада.	V з'езд Кампазітараў Беларусі.
1966, 3 снежня.	Мінск узнагароджан ордэнам Леніна.

ЛІТАРАТУРА

Маркс К. Капитал, т. I. М., 1963.

Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология. Соч., т. 3.

Ленин В. И. Объяснение закона о штрафах, взимаемых с рабочих на фабриках и заводах. Полн. собр. соч., т. 2.

Ленин В. И. От какого наследства мы отказываемся. Полн. собр. соч., т. 2.

Ленин В. И. Развитие капитализма в России. Полн. собр. соч., т. 3.

Ленин В. И. Начало революции в России. Полн. собр. соч., т. 9.

Ленин В. И. Первое мая. Полн. собр. соч., т. 10.

Ленин В. И. Уроки Московского восстания. Полн. собр. соч., т. 13.

Ленин В. И. Империализм, как высшая стадия капитализма. Полн. собр. соч., т. 27.

Ленин В. И. Военная программа пролетарской революции. Полн. собр. соч., т. 30.

Ленин В. И. О задачах пролетариата в данной революции. Полн. собр. соч., т. 31.

Ленин В. И. Седьмая (Апрельская) Всероссийская конференция РСДРП(б) 24—29 апреля (7—12 мая) 1917 г. Полн. собр. соч., т. 31.

Ленин В. И. I Всероссийский съезд Советов рабочих и солдатских депутатов. 3—24 июня (16 июня — 7 июля) 1917 г. Полн. собр. соч., т. 32.

Ленин В. И. Государство и революция. Полн. собр. соч., т. 33.

Ленин В. И. Большевики должны взять власть. Полн. собр. соч., т. 34.

Ленин В. И. Заседание Центрального Комитета РСДРП(б) 10 (23) октября 1917 г. Полн. собр. соч., т. 34.

Ленин В. И. К лозунгам. Полн. собр. соч., т. 34.

Ленин В. И. Удержат ли большевики государственную власть? Полн. собр. соч., т. 34.

Ленин В. И. Второй Всероссийский съезд Советов рабочих и солдатских депутатов 25—26 октября (7—8 ноября) 1917 г. Полн. собр. соч., т. 35.

Ленин В. И. Заседание ВЦИК 4 (17) ноября 1917 г. Полн. собр. соч., т. 35.

Ленин В. И. Разговор с Московским Советом по прямому проводу 20 февраля 1918 г. Полн. собр. соч., т. 35.

Ленин В. И. Первоначальный вариант статьи «Очередные задачи Советской власти». Полн. собр. соч., т. 36.

Ленин В. И. VI Всероссийский чрезвычайный съезд Советов рабочих, крестьянских, казачьих и красноармейских депутатов 6—9 ноября 1918 г. Полн. собр. соч., т. 37.

Ленин В. И. Как нам реорганизовать Рабкрин. (Предложение XII съезду партии). Полн. собр. соч., т. 45.

Ленин В. И. Лучше меньше, да лучше. Полн. собр. соч., т. 45.

Ленин В. И. О нашей революции. Полн. собр. соч., т. 45.

Ленин В. И. Странички из дневника. Полн. собр. соч., т. 45.

Ленин В. И. О национальном и национально-колониальном вопросе. М., 1956.

Ленин В. И. О программе партии. Документы, статьи, речи. М., 1959.

Программа Коммунистической партии Советского Союза. М., 1965.

Устав Коммунистической партии Советского Союза М., 1965.

Брежнев Л. И. Отчетный доклад ЦК КПСС XXIII съезду КПСС. М., 1966.

Косыгин А. Н. Директивы XXIII съезда КПСС по пятилетнему плану развития народного хозяйства СССР на 1966—1970 гг. М., 1966.

Стенографический отчет XX съезда КПСС, тт. 1, 2. М., 1956.

Материалы внеочередного XXI съезда КПСС. М., 1961.

Материалы XXII съезда КПСС. М., 1961.

Материалы XXIII съезда КПСС. М., 1966.

История КПСС. М., 1963.

ДАСАВЕЦКІ ПЕРЫЯД

Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею для разбора древних актов, т. VI—XVI, XVIII, XX, XXII, XXVI, XXVIII—XXXVIII. Вильна, 1865—1915.

Беларускі архіў, т. I (XVI—XVII стст.). Менск, 1927; т. II (XV—XVI стст.). Менск, 1928; т. III (XV— XVIII стст.). Менск, 1930.

Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов, т. I—III.

Военно-статистическое обозрение Российской империи. Минская губерния, т. IX, ч. 4. СПб., 1848.

Генрих Латвийский. Хроника Ливонии. М.— Л., 1938.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах, т. I (IX—XVIII стст.). Мінск, 1936.

Иоанн Георг Корб. Дневник путешествий в Московию (1696 и 1698 гг.). СПб., 1906.

История БССР, т. I. Минск, 1961.

Повесть временных лет. М. — Л., 1950.

Полное собрание законов Российской империи (собрание 3-е), т. XXII. СПб., 1902.

Полное собрание русских летописей, изданное... Археографическою комиссиею, т. 16 и 17. СПб., 1889 и 1907.

Русская историческая библиотека, т. 20. СПб., 1904.

Русская историческая библиотека, т. 27. СПб., 1910.

Русско-ливонские акты, собранные К. Е. Напьерским. СПб., 1868.

Сборник императорского Русского исторического общества, т. 35, СПб., 1882.

Слово о полку Игореве. М. — Л., 1950.

Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Минск, 1848.

Дружчыц В. Места Менск у канцы XV і пачатку XVI ст. Мінск, 1926.

Зеленский И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния, ч. I. СПб., 1864

Ковалевская С. Obrazki Minskie. Вильно, 1912.

Краснянский В. Г. Минский департамент Великого княжества Литовского. (Эпизод из истории войны 1812 г.). СПб., 1902.

Сапунов А. Полоцк, Витебск и Минск в 20-х гг. прошлого века. Витебск, 1901.

Сырокомля В. Л. Хроника города Минска. Исторический очерк города Минска. Период первый, Господство Руси и Литвы. «Вестник Западной России». 1869, т. 3, кн. 8, 9.

Абецедарский Л. С. Торговые связи Белоруссии с Русским государством (вторая половина XVI — первая половина XVII в.). Вопросы истории БССР, вып. 36. Минск, 1957.

Даўгяла З. І. Стары Менск. «Наш край», 1927, № 1 (16); 1928, № 1 (28), 3 (30).

Махнач Н. Н. О подготовке восстания на территории Белоруссии в 1848—1849 гг. (Деятельность Минской тайной организации). Материалы к IX конференции молодых ученых. Серия общественных наук. Минск, 1964.

Сербаў І. Археалагічныя раскопкі ў аколіцах Менску ў 1925 г. (Пятроўшчына і Рылаўшчына). «Гістарычна-археалагічны зборнік». Мінск 1927, № 1.

Смородский А. Летопись города Минска. Краткий перечень исторических известий о Минске с древнейших времен. «Памятная книжка Минской губернии на 1891 и 1892 гг.»

* * *

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі, т. 2. Мінск 1940.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі, т. 3. Мінск, 1954.

Календарь и справочный указатель правительственных учреждений, фабрик, заводов и прочих в городе Минске и окрестностях... на 1895—1896 гг. Минск, 1895—1896.

Каталог Минской городской общественной библиотеки им. А. С. Пушкина, 1908 г. Минск, 1909.

Краткий очерк деятельности Минского городского общественного управления с 1909 по 1913 гг. Минск, 1913.

Краткое историко-статистическое описание города Минска. Минск, 1909.

Листовки большевистских организаций в период русской революции 1905—1907 гг. М., 1956.

Обзор Минской губернии за 1881—1913 гг.

Обязательные постановления Минской городской Думы, ч. I. Минск, 1913.

Отчет Минской городской управы и коммерческого банка о движении денежных сумм города Минска за 1876—1877, 1879, 1890/91, 1900, 1908—1913 гг.

Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Минская губерния, т. XXII. СПб., 1904.

Первое мая в царской России (1890—1916 гг.). Сборник документов. М., 1939.

Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы. Минск, 1955.

Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861—1862 гг. Сборник документов М., 1964.

Сборник сведений о настоящем состоянии городского хозяйства в главнейших городах России. Составили П. Алабин и П. Коновалов. IV, Самара, 1889.

Список фабрик и заводов Европейской России под ред. В. Варзара. СПб., 1903.

Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии, вып. I. Минск, 1870.

Хроника важнейших событий истории КПБ. Документы и материалы. Минск, 1962.

Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861—1862 гг., ч. I. СПб., 1863.

Алибегов И. Я. Под знаменем большевиков. (Партийная организация Минска на путях подготовки к Октябрю). Победа Великой Октябрьской социалистической революции. Сб. воспоминаний участников революции в промышленных центрах и национальных районах России. М., 1958.

Веремейчик О. И. Историко-революционные места г. Минска. Минск, 1958.

Воранава А. І. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. Мінск, 1960.

История КПСС. В шести томах, т. 1 (1883—1903 гг.). М., 1964.

Кириллов М. К. и Арский И. Т. Из истории школы в Белоруссии и Литве. М., 1964.

Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячоў рэвалюцыйнага руху 1863 г. Мінск, 1963.

Лепешинский П. Первый съезд партии. М., 1928.

Меньщиков Л. Охранка и революция. К истории тайных политических организаций, существовавших во время самодержавия, ч. 2, вып. 1, 1898—1903 гг. М., 1928.

Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1. Минск, 1961.

Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Настольная книга для русских людей. Под ред. В. П. Семенова. Т. IX. Верхнее Приднепровье и Белорусссия. СПб., 1905.

Семенова М. Н. Здравоохранение города Минска во второй половине XIX в. «Сборник научных работ», т. 19. Минск, 1957.

Скарабагаты У. В. Бальшавікі Мінска ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Мінск, 1957.

Тикоцкий М. Е. «Минский листок» — первая общественно-литературная газета в Белоруссии (1886—1902 гг.). «Вопросы журналистики». М., 1959.

Бар І. С. Курлоўскі расстрэл у Мінску. «Маладняк», 1927 № 2.

Барашка І. Рэвалюцыя 1905 г. на Міншчыне ў асвятленні губернатара Курлова. (Згодна дакладу Курлова Міністру ўнутраных спраў). «Маладняк», 1926, № 10 (1).

Беленький Е. (Сергей). Воспоминания о большевистской организации в г. Минске в 1903 г. «Пролетарская революция», 1924, № 11 (34).

Беленький Е. (Сергей). К истории Минской организации РСДРП(б) в 1903—1905 гг. «Пролетарская революция», 1925, № 8, 12.

Вальфсон С. «Чорны перадзел» у Мінску. «Полымя», 1925, № 4.

Гапоненко Л. Революционная деятельность М. В. Фрунзе на Западном фронте в 1917 г. «Вопросы истории», 1949, № 2.

Гершуни Г. Заявление Григория Гершуни (Минск) Зубатову. (Из архива Зубатова). «Былое», 1918, № 3 (31).

Из отчета Минской группы РСДРП за июль. «Пролетарий», Женева, 1905, № 18.

Лившиц С. Подпольные типографии 60—70-х гг. «Каторга и ссылка», 1929, № 6.

Любатович О. С. Далекое и недавнее. Воспоминания из жизни революционера 1878—1881 гг. «Былое», 1906, № 6; 1907, № 6.

Любимов И. Февраль на Западном фронте и Минский Совдеп. «Пролетарская революция», 1923, № 5 (17).

Смірноў А. Адзін з паўстанцаў 1863 года (Мінчанін А. Т. Трусаў). «Беларусь», 1958, № 1.

САВЕЦКІ ПЕРЫЯД

КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг). Мінск, 1934.

X съезд КП(б)Б, 3—10 января 1927 г. Стенографический отчет. Минск, 1927.

Стэнаграфічная справаздача XII зъезду КП(б)Б (5—14 лютага 1929 г.). Мінск, 1929.

XIII з'езд КП(б)Б. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1931.

Гусаров Н. И. Отчетный доклад ЦК КП(б) Белоруссии на XIX съезде КП(б)Б. Минск, 1949.

Мазуров К. Т. Отчетный доклад ЦК КПБ XXIV съезду (17 февраля 1960 г.). Минск, 1960.

Мазуров К. Т. Отчетный доклад ЦК КПБ XXV съезду (27 сентября 1961 г.). Минск, 1961.

Машеров П. М. Отчет ЦК КПБ XXVI съезду (3 марта 1966 г.) Минск, 1966.

Справаздача Урада БССР VI Усебеларускаму з'езду Саветаў. Мінск, 1925.

Дзевяты Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1929.

Шестая сессия Верховного Совета БССР, 21—24 марта 1944 г. Стенографический отчет. Минск, 1946.

Восьмая сесія Вярхоўнага Савета БССР, 9—11 верасня 1946 г. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1947.

Першая сесія Вярхоўнага Савета БССР пятага склікання (7—9 красавіка 1959 г.). Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1959.

Девятая сессия Верховного Совета БССР шестого созыва (27—29 декабря 1966 г.). «Советская Белоруссия», 1966, 28—30 декабря.

Резолюция XXIII съезда ЛКСМ Белоруссии. Минск, 1966.

Белорусская ССР в цифрах (1940—1961 гг.). Минск, 1964.

В борьбе за Октябрь в Белорусссии и на Западном фронте. Воспоминания активных участников Октябрьской революции. Минск, 1957.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Сборник документов и материалов, т. 1—2. Минск, 1957.

Второй Всероссийский съезд Советов рабочих и солдатских депутатов. Сборник документов. М., 1957.

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Документы и материалы, т. IV. Минск, 1954.

История БССР, т. 2. Минск, 1961.

Комитеты бедноты Белоруссии. Сборник документов и материалов. Минск, 1958.

Летопись Великого Октября Апрель—октябрь 1917 г. (Воспоминания и документы). М., 1958.

Материалы о состоянии городского хозяйства Минска и о работе Минского городского Совета. К докладу Минского городского Совета на Президиуме ЦИК СССР. Минск, 1933.

Отчет о деятельности Минского Совета рабочих и красноармейских депутатов 6-го созыва (с 1 января по 1 сентября 1922 г.). Минск, 1923.

Отчет о деятельности Минского окружного исполкома за период октябрь—апрель 1924—1925 гг. К 1-му Минскому окружному съезду Советов. Минск, 1925.

Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину, 1917—1924 гг. Минск, 1960.

Промышленность БССР. Итоги и перспективы. Минск, 1928.

Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению Советской власти и организации социалистического строительства (июль—декабрь 1920 г.). Сборник документов и материалов. Минск, 1957.

Триумфальное шествие Советской власти, ч. 1. М., 1963.

Галовенко Л. С. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов (1917 г.). М., 1958.

Горбунов Т. С. Воссоединение белорусского народа в едином Советском социалистическом государстве. М., 1948.

Давыдова Б. С. В битве за отечество (О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны). В кн.: Герои подполья. М., 1965.

20 год ЛКСМ Беларусі (Гістарычная даведка). Мінск, 1940.

Иванов В. Г. Великий Октябрь в Минске. Минск, 1957.

История Великой Октябрьской социалистической революции. М., 1962.

История минской кондитерской фабрики «Коммунарка». Минск, 1957.

Кагал Г. С. «Ударник». История завода. Минск, 1959.

Кулько Л. Этапы большого пути (История минского станкостроительного завода им. С. М. Кирова). Минск, 1958.

Купрэвіч В. Ф. Акадэмія навук Беларускай ССР. Мінск, 1958.

Ленин и Октябрьское вооруженное восстание в Петрограде. М., 1963.

Лобатенко Н. Г. По пути великого почина. Минск, 1968.

Малинин С. Н. и Иппа М. М. Экономика Белорусской ССР и перспективы ее развития. М., 1960.

Мартинкевич Ф. С. Минск (Экономико-географический очерк). М., 1958.

Муратов Х. И. Революционное движение в русской армии в 1917 г. М., 1958.

Носиловский А. Б. Будущее рядом с нами (О руководстве парторганизаций предприятий Минска движением за коммунистический труд). Минск, 1961.

О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944 гг.). Минск, 1961.

Осмоловский М. С. Минск. М., 1952.

Очерк истории белорусской советской литературы. М., 1954.

Петрашкевич А. Л. Комсомол Белоруссии в семилетке. Минск, 1962.

Хохлов А. Красная гвардия Белоруссии в борьбе за власть Советов (март 1917 — март 1918 гг.). Минск, 1965.

Шевченко В. М. Перспективы развития города Минска в 1959—1965 гг. Минск, 1959.

Кержниц А. Октябрьские дни в Белоруссии. «Пролетарская революция», 1927, № 12 (71).

АРХИВНЫЕ МАТЕРИАЛЫ

Архив Института истории АН БССР, ф. 1, 4.

Архив Института литературы АН БССР, ф. 34.

Архив Совета Министров БССР, ф. 7.

Архив Статуправления города Минска, материалы за 1958—1965 гг.

Архив ЦСУ при Совете Министров БССР, материалы за 1958—1965 гг.

Партархив Института истории партии при ЦК КПБ, ф. 4, 12, 63, 438, 439.

Партархив Минского обкома КПБ, ф. 1, 15, 69, 10874.

Партархив ЦК КПБ, ф. 60.

Текущий архив Минского горисполкома, материалы 2, 4, 5-й сессий 7-го созыва 1959 г.; материалы 10-й сессии 7-го созыва 1961 г.; материалы 1-й сессии 8-го созыва 1961 г.; материалы 6, 7-й сессий 9-го созыва 1964 г.

Центральный государственный архив древних актов, ф. 389.

Центральный государственный архив Октябрьской революции БССР, ф. 6, 7, 31, 42, 44, 205, 265, 545, 8080.

Центральный государственный архив Октябрьской революции в г. Москве, ф. 109, 109-И; 5451.

Центральный государственный исторический архив БССР, ф. 1, 10, 14, 21, 23, 24, 295, 358, 497, 694, 1305, 1362, 1562, 1703, 1705, 2828.

Центральный государственный исторический архив в г. Ленинграде, ф. 18, 22, 23, 560, 776, 1263, 1281, 1287, 1290, 1291, 1293, 1350, 1347, 1405.

Центральный государственный исторический архив Литовской ССР, ф. 2, 77, 378, 445, 1248, ДА.

Центральный государственный исторический архив в г. Москве, ф. III Отделения, ДП, 00, 102, 1263, 1284.

Центральный партархив Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, ф. 17.

ГАЗЕТЫ

«Правда». «Искра». «Звязда». «Буревестник». «Бюллетень Минского Совета». «Известия Минского Совета». «Мінская праўда». «Минский листок». «Молот». «Наша ніва». «Рабочий». «Северо-Западный край». «Советская Белоруссия».

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА 5

Раздзел I. СТАРАЖЫТНЫ ГОРАД МІНСК 9

1. Летапісныя даныя аб старажытным Мінску *(В. Р. Тарасенка)* . 9
2. Гістарычная тапаграфія і забудова *(В. Р. Тарасенка)* 12
3. Матэрыяльная культура і гаспадарка *(Т. М. Каробушкіна)* . . 15

Раздзел II. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ГОРАДА (XIV—XV СТАГОДДЗІ) *С. А. Шчарбакоў).* 20

1. Асноўныя заняткі гараджан . . 20
2. Сацыяльныя адносіны. Гарадское самакіраванне 26

Раздзел III. МІНСК У ПЕРЫЯД РАЗВІТАГА ФЕАДАЛІЗМУ *(З. Ю. Капыскі)* . 33

1. Рамесная вытворчасць і гандаль . 33
2. Грамадска-палітычнае жыццё . . 45

Раздзел IV. ЗАНЯПАД І АДНАЎЛЕННЕ ГОРАДА *(А. М. Карпачоў)* . . . 52

1. Агульны стан горада 52
2. Рост феадальнай уласнасці . . 54
3. Аднаўленне рамеснай вытворчасці . 55
4. Гандаль 61
5. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей 64

Раздзел V. ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД І КУЛЬТУРА ФЕАДАЛЬНАГА МІНСКА *(А. П. Грыцкевіч, В. С. Пасэ)* 68

Раздзел VI. МІНСК У ПЕРЫЯД РАСПАДУ ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКІХ АДНОСІН *(В. У. Чапко)* 79

1. Мінск пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй 79
2. Гаспадарчае развіццё 81
3. Насельніцтва. Адміністрацыйны лад і знешні выгляд горада . . 88
4. Культурнае і грамадскае жыццё . 95

Раздзел VII. ПЕРАТВАРЭННЕ МІНСКА Ў КАПІТАЛІСТЫЧНЫ ГОРАД (1861—1900 гады) 101

1. Развіццё прамысловасці і гандлю *(З. Е. Абезгауз)* 101
2. Насельніцтва. Вонкавы выгляд горада. Гарадское самакіраванне *(З. Е. Абезгауз)* 105

Раздзел XIV. МІНСК У ПЕРЫЯД АДНАЎЛЕННЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ (1921—1925 гады) *(М. Я. Завалееў)* 277
1. Пераход да мірнага сацыялістычнага будаўніцтва 277
2. Першыя поспехі ў аднаўленні прамысловасці, гарадской гаспадаркі, развіцці гандлю 285
3. Прамысловасць Мінска к канцу аднаўленчага перыяду 293
4. Гарадская гаспадарка і гандаль. Павышэнне жыццёвага ўзроўню працоўных 300

Раздзел XV. У БАРАЦЬБЕ ЗА ПАБУДОВУ ЭКАНАМІЧНАГА ФУНДАМЕНТУ САЦЫЯЛІЗМА (1926—1932 гады) 307
1. Мінск у першыя гады рэканструкцыі народнай гаспадаркі *(В. Р. Гняўко, М. Я. Завалееў)* 307
2. Ажыўленне дзейнасці гарадскога Савета. Рост палітычнай актыўнасці працоўных *(В. Р. Гняўко, М. Я. Завалееў)* 315
3. Развіццё прамысловасці ў гады першай пяцігодкі. Разгортванне масавага сацыялістычнага спаборніцтва *(В. Р. Гняўко, М. Я. Завалееў)* 321
4. Дапамога мінскіх рабочых вёсцы *(Р. Ц. Гарбунова)* 333
5. Развіццё гарадской гаспадаркі. Пачатак работ па рэканструкцыі Мінска *(В. Р. Гняўко, М. Я. Завалееў)* 337
6. Рост матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва *(В. Р. Гняўко, М. Я. Завалееў)* 341

Раздзел XVI. МІНСК У ПЕРЫЯД ПЕРАМОГІ САЦЫЯЛІЗМА (1933—1937 гады) 345
1. Развіццё прамысловасці *(М. Я. Стральцоў)* 345
2. Прыняцце новай Канстытуцыі Саюза ССР і Канстытуцыі БССР. Выбары ў Вярхоўны Савет СССР *(У. І. Вышынскі)* 356
3. Развіццё гарадской гаспадаркі. Матэрыяльны дабрабыт гараджан *(М. І. Злотнік)* 362

Раздзел XVII. КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА (1921—1937 гады) . . . 367
1. Народная асвета *(Э. Ф. Языковіч)* 367
2. Культурна-асветная работа *(Э. Ф. Языковіч)* 376
3. Вышэйшая школа і навука *(Э. Ф. Языковіч)* 382
4. Літаратурнае жыццё горада *(В. А. Мілаванаў)* 391
5. Мастацтва *(В. А. Мілаванаў)* 397

Раздзел XVIII. МІНСК У ПЕРЫЯД УМАЦАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА (1938 — чэрвень 1941 года) 404
1. Барацьба працоўных горада за выкананне трэцяй пяцігодкі *(І. Я. Марчанка, М. Я. Стральцоў)* 404
2. Развіццё гарадской гаспадаркі. Далейшы рост матэрыяльнага дабрабыту працоўных *(І. Я. Марчанка, М. Я. Стральцоў)* 410
3. Культурнае жыццё Мінска *(В. Н. Антанішын)* 415
4. Уз'яднанне беларускага народа і дапамога працоўных Мінска насельніцтву заходніх абласцей *(Ю. І. Афонін, Ц. С. Гарбуноў)* 426
5. Перад Вялікай Айчыннай вайной *(І. Я. Марчанка, М. Я. Стральцоў)* . 431

Раздзел XIX. МІНСК У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945 гады) 437
1. Першыя дні вайны. Акупацыя Мінска *(І. С. Краўчанка)* 437
2. 1100 дзён фашысцкага рэжыму *(І. С. Краўчанка)* 438

3. Мінск у паўстанні 1863 года *(С. М. Самбук)* 109
4. Народніцкі рух у Мінску *(Я. І. Карнейчык)* 114
5. Становішча працоўных. Рабочы рух у 70—90-х гадах XIX стагоддзя *(А. Т. Наталькін)* 117

Раздзел VIII. МІНСК У ПЕРЫЯД ІМПЕРЫЯЛІЗМУ 126
1. Прамысловасць *(Л. П. Ліпінскі)* 126
2. Гандаль *(Л. П. Ліпінскі)* 133
3. Гарадское кіраванне. Жыллёва-камунальная гаспадарка *(Л. П. Ліпінскі)* 135
4. Рэвалюцыйны рух напярэдадні першай рускай рэвалюцыі *(В. У. Шаціла)* 138

Раздзел IX. РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА РАБОЧЫХ МІНСКА Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ РУСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ *(В. У. Шаціла)* 145
1. Водгукі на падзеі 9 студзеня. Далейшае разгортванне рэвалюцыйнай барацьбы 145
2. Рэвалюцыйныя падзеі ў час кастрычніцкай Усерасійскай стачкі і снежаньскага ўзброенага паўстання 153
3. Рэвалюцыйны рух у 1906—1907 гадах 161

Раздзел X. МІНСК ПАМІЖ ДЗВЮМА РЭВАЛЮЦЫЯМІ *(Л. П. Ліпінскі)* 163
1. Наступленне рэакцыі 163
2. Уздым рабочага руху 168
3. Эканамічнае жыццё горада ў гады вайны 173
4. Рэвалюцыйны рух 177
5. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 180

Раздзел XI. КУЛЬТУРА І АСВЕТА Ў МІНСКУ (другая палова XIX — пачатак XX стагоддзя) 186
1. Народная асвета *(Я. І. Карнейчык)* 186
2. Літаратура, тэатр і мастацтва *(Я. І. Карнейчык)* 190
3. Перыядычны друк *(Ц. С. Гарбуноў)* 195

Раздзел XII. МІНСК У ПЕРЫЯД ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 199
1. Рэвалюцыйная мабілізацыя мас у перыяд мірнага развіцця рэвалюцыі *(Н. В. Каменская)* 199
2. Падрыхтоўка да ўзброенага паўстання супраць Часовага ўрада *(У. Н. Семянькоў)* 212
3. Устанаўленне Савецкай улады *(У. Н. Семянькоў)* 223

Раздзел XIII. МІНСК У ПЕРЫЯД ЗАМЕЖНАЙ ВАЕННАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ 243
1. Барацьба працоўных Мінска супраць нямецкіх акупантаў *(В. А. Мілаванаў)* 243
2. Сацыялістычныя пераўтварэнні ў Мінску пасля выгнання нямецкіх акупантаў *(В. А. Мілаванаў)* 252
3. Барацьба супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў у 1919—1920 гадах *(В. А. Мілаванаў)* 258
4. Барацьба працоўных Мінска за ліквідацыю вынікаў нямецкай і польскай акупацыі (ліпень — снежань 1920 года) *(В. А. Мілаванаў)* . . 267
5. Культурнае будаўніцтва *(В. А. Мілаванаў, П. А. Селіванаў)* . . . 270

3. Мінскае падполле *(І. С. Краўчанка)* 442
4. Вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў *(М. Я. Стральцоў)* 457
5. Мерапрыемствы па паляпшэнню бытавых і культурных умоў насельніцтва горада *(М. Я. Стральцоў)* 465

Раздзел XX. АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ МІНСКА Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1946—1950 гады) *(І. Я. Марчанка, В. А. Мілаванаў, Л. А. Міхайлоўскі)* 468

1. Аднаўленне і далейшы рост прамысловасці 468
2. Аднаўленне і рэканструкцыя гарадской гаспадаркі. Паляпшэнне дабрабыту працоўных 482

Раздзел XXI. МІНСК У ГАДЫ БАРАЦЬБЫ ЗА НОВЫ ЎЗДЫМ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ (1951—1958 гады) 486

1. Развіццё прамысловасці *(І. Я. Марчанка, В. А. Мілаванаў)* 486
2. Далейшае развіццё гарадской гаспадаркі і павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных *(В. А. Загарульская)* 504
3. Дапамога працоўных горада вёсцы *(І. В. Палуян)* 511

Раздзел XXII. КУЛЬТУРА МІНСКА (1946—1958 гады) *(А. І. Залескі)*. . 520

1. Народная асвета і навука 520
2. Культурна-асветная работа. Друк 524
3. Літаратура 527
4. Мастацтва. Народная творчасць 529

Раздзел XXIII. МІНСК У ПЕРЫЯД КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА (1959—1965 гады) 536

1. Прамысловасць Мінска ў сямігодцы *(Я. А. Васілеўская)* 536
2. Шэфская дапамога працоўных Мінска вёсцы *(В. І. Мялешка)* . . . 549
3. Павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных *(А. Я. Казлоўская, Л. М. Лыч)* 556
4. Рост гарадской гаспадаркі і добраўпарадкаванне Мінска і яго ваколіц *(Ф. С. Марцынкевіч, В. С. Родзін)* 561

Раздзел XXIV. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ГОРАДА 569

1. Грамадска-палітычнае жыццё горада *(П. Ц. Петрыкаў)* 569
2. Народная асвета *(К. І. Фірсава)* 578
3. Навука *(М. І. Галенчык)* 586
4. Літаратура, мастацтва. Народная творчасць *(К. І. Фірсава)* . . . 594
5. Культурна-асветная работа *(К. І. Фірсава)* 602

Раздзел XXV. ЗАРУБЕЖНЫЯ СУВЯЗІ МІНСКА *(В. І. Мялешка)* . . 607

1. Эканамічныя сувязі 607
2. Культурнае супрацоўніцтва 618

Раздзел XXVI. ПРАЦОЎНЫЯ МІНСКА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫКАНАННЕ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА *(Л. М. Лыч)* 635

ХРОНІКА ВАЖНЫХ ПАДЗЕЙ З ГІСТОРЫІ МІНСКА 658

ЛІТАРАТУРА 673

На белорусском языке

ИСТОРИЯ МИНСКА

Издательство «Наука и техника»
Минск, Ленинский проспект, 68

Рэдактары: *Ю. Бярозкін, А. Казлоў, А. Крушынскі.* Мастак *В. Валянтовіч.* Мастацкі рэдактар *Б. Яроц.* Тэхнічны рэдактар *І. Валаханоўч.* Карэктар *С. Шынкевіч.*

АТ 16138. Падпісана ў друк 24/IV 1967 г. Тыраж 6500 экз. На тэкст папера друкарская № 1, на ілюстрацыі — папера для глыбокага друку. Фармат 70×90¹/₁₆. Фіз. друк. арк. 43,0+8 арк. ілюстрацый. Ум. друк. арк. 50,3. Уч.-выд. арк. 55,2. Выд. заказ 235. Друк. заказ 50. Цана 4 р. 24 к.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа. Мінск, Чырвоная, 23. Ілюстрацыйны матэрыял надрукаван друкарняй выдавецтва «Звязда». Мінск, Ленінскі праспект, 79.